ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Бел 3/142

А

ПАМЯЦЬ

ЧЭРЫКАЎСКІ РАЁН

МІНСК
«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»
1994

ам/10

ББК 63.3(4Беи)
П15
УДК 947.64

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

В. М. ЕРМАКОЎ, Р. І. МАСЛОЎСКІ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, Ф. Ц. РУДЗІКАЎ

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

В. М. ЕРМАКОЎ (старшыня камісіі), М. А. КНЫШ (намеснік старшыні камісіі), П. А. БУРАЎ, А. І. КНЯЗІЎ, В. С. МАКСІМЕНКА, Ф. Ц. РУДЗІКАЎ, І. І. СУЛІМАЎ, А. І. ХНЫКАВА

Рэдактары: Г. П. БЕРЛІНА, С. А. КАГАДЗЕЕВА, М. І. КРУГМАН, Р. І. МАСЛОЎСКІ (вядучы), Т. М. РУТКОЎСКАЯ (стыліст)

Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Рэцэнзенты: М. З. БАШЛАКОЎ, У. Б. ЛАМЕКА

Навуковы рэдактар матэрыялаў, якія адлюстроўваюць падзеі 1917—1920 гг., канд. гіст. навук П. К. БАШКО.

ГОСУД. ПУБЛИЧНАЯ ИСТОРИЧЕСКАЯ БИБЛИОТЕКА РСФСР
№ 192066-2003г.

П 9470640000—039 / М 304(03)—94 2—93

ISBN 985-06-0020-9

© Выдавецтва «Вышэйшая школа», 1994

А.А. Марачкін „Старажытны Чэрыкаў".

У.Б. Аракчэеў „У Леменскай школе-камуне".

Помнік у в. Рэчыца.

Жывёлагадоўчы комплекс.

На калгасных палетках.



Цэх плодакансервава-
га завода.

Пасёлак „Майскі".

У раённым гісторыка-краязнаўчым музеі.

Магіла М.М. Лепяшынскага.

Этнаграфічны калектыў
калгаса імя Ільіча.

У Чэрыкаўскім паляўні-
чым заказніку.

У адселенай зоне.

ДА ЧЫТАЧА

Гэтай кнігай працягваецца серыя гісторыка-дакументальных Хронік Памяці, якія выдаюцца ў Рэспубліцы Беларусь. Іх паяўленне выклікана патрабаваннем часу. Працэс адраджэння беларускай нацыі, яе самабытнай культуры ўключае ў сябе перш за ўсё беражлівыя адносіны да гістарычнай спадчыны. Вядома, аб захаванні гэтай духоўнай скарбніцы, асабліва калі маюцца на ўвазе малыя гарады і вёскі, доўгія гады ніхто як след не клапаціўся. Згубілася ў небыцці нямала цікавых звестак, паданняў і легенд. На жаль, застаюцца яшчэ невядомыя салдаты, што спачылі на зямлі Беларусі, імёны далёка не ўсіх рэпрэсіраваных у гады сталіншчыны ўстаноўлены. У сувязі з гэтым стваральнікі кнігі не могуць гарантаваць поўную вычарпальнасць прыведзеных пра раён звестак. Але пошукавая работа працягваецца.

У падрыхтоўцы першага раздзела прымалі ўдзел навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Рэспублікі Беларусь. Пры дапамозе грамадскасці складзены адзін з асноўных раздзелаў хронікі — спісы загінуўшых воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, а таксама спісы воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні Чэрыкаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Шмат каштоўных матэрыялаў аб мінулым Чэрыкаўшчыны, яе таленавітых людзях увайшло ў хроніку дзякуючы карпатлівым пошукам мясцовага краязнаўца Ф. Ц. Рудзікава.

У кнізе выкарыстаны матэрыялы і дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага архіва, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Расіі, Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці, Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Выдавецтва ўдзячна рэспубліканскай камісіі (старшыня М. І. Дзямчук) і арганізацыйна-метадычнаму цэнтру па выданню гісторыка-дакументальных Хронік Памяці пры Міністэрстве культуры і друку Рэспублікі Беларусь (кіраўнік А. Л. Петрашкевіч), а таксама архівам, музеям, арганізацыям і прыватным асобам, якія аказалі садзеянне ў працы над гэтай кнігай.



Чэрыкаўскі раён размешчаны ва ўсходняй частцы Магілёўскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. Плошча 1,0 тыс. км^2. Населеных пунктаў 114 (1991), у тым ліку г. Чэрыкаў — цэнтр раёна. 7 сельсаветаў: Вепрынскі, Верамейскі, Лабанаўскі, Рэчыцкі, Сормаўскі, Ушакоўскі, Язёрскі. Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Аршанска-Магілёўскай раўніны, агульны нахіл з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад уздоўж р. Сож. На вышыні 150—170 м над узроўнем мора знаходзіцца 57 % тэрыторыі раёна, 30 % ніжэй, 13 % вышэй. Самая найвышэйшая кропка (189 м) каля в. Новая Беліца Верамейскага сельсавета, ніжэйшая (131 м) на ўрэзе р. Сож. Рака Сож мае прытокі Волчас, Вудагу, Лабчанку, Сянну і іншыя. Густата натуральнай рачной сеткі 0,42 км/км^2. Карысныя выкапні: 3 радовішчы цагельнай сыравіны з агульнымі запасамі 0,8 млн м^3, 2 радовішчы будаўнічых пяскоў — 0,9 млн м^3, 3 радовішчы мелу — 264,1 млн т, радовішча цэментных глін — 14,8 млн т. Сярэдняя тэмпература студзеня — 7,9, ліпеня 18,3 °С. Вегетацыйны перыяд 187 дзён. Ападкаў 594 мм за год. Глебы сельгасугоддзяў дзярнова-падзолістыя (61,2 %), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (17,3), дзярновыя забалочаныя (4,9), тарфяна-балотныя (0,6), алювіяльныя (14,2 %) і інш. З мінеральных глеб 51,0 % суглінкавых, 41,7 супясчаных, 7,3 % пясчаных. Пад лесам 41 % тэрыторыі раёна. У раёне 6 калгасаў, 3 саўгасы, эксперыментальная база «Чэрыкаў», свінакомплекс «Светлы». Раён спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі. Прадпрыемствы пераважна ў Чэрыкаве: плодаконсервавы завод, цагельны завод, масласырзавод, хлебазавод, дрэваапрацоўчы камбінат. У 1986 г. адкрыты гісторыка-краязнаўчы музей. Па тэрыторыі раёна праходзіць чыгунка Магілёў — Крычаў, шаша Крычаў — Бабруйск. Суднаходства ажыццяўляецца па р. Сож. Выдаецца раённая газета «Заклік Ільіча».

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Прырода надзяліла зямлю Чэрыкаўшчыны надзвычай шчодра. Багатыя дзічынай лясы, прыдатныя для рыбалоўства рэкі з мноствам стараррэчаў і заток, урадлівыя глебы, шматлікія пясчаныя пагоркі на поплаве Сожа, незлічоныя запасы крэменевай сыравіны — усё гэта вабіла вока чалавека з далёкай сівой мінуўшчыны. Трапіў ён сюды амаль адразу, як адступіў апошні ледавік. Адбылося гэта зусім нядаўна па геалагічных мерках, недзе 12 тыс. гадоў назад, калі прырода канчаткова абудзілася ад яго жудаснага подыху і пачаўся сучасны перыяд, які завецца галацэнам.

А што было раней? Аб гэтым можна толькі меркаваць па знаходках на суседніх тэрыторыях. Менавіта на Падняпроўі і ў Пасожжы ля весак Абідавічы Быхаўскага, Падлужжа Чачэрскага і ля пас. Свяцілавічы Веткаўскага раёнаў знойдзены адзінкавыя прылады працы (скрэблы, востраканечнікі), дакладны час вырабу якіх геалагічнымі метадамі вызначыць немагчыма. Па форме і тэхніцы апрацоўкі можна меркаваць аб іх прыналежнасці да так званай муст'ерскай культуры (старажытнакаменны век 100—40—35 тыс. гадоў назад). Ужо тады ў басейн Сожа з суседніх рэгіёнаў, відаць, праніклі неандэртальцы (старажытныя людзі), якія, магчыма, наведалі і зямлю Чэрыкаўскага раёна. Мабыць, яны і былі першымі з людзей, нага якіх ступіла сюды. Але гэта падзея магла адбыцца і значна раней, у любы міжледавіковы перыяд, і пазней, у пачатку апошняга абледзянення.

Упэўнена можна сцвярджаць, што людзі з'явіліся на Сожы недзе 24—23 тыс. гадоў назад. Тады яны заснавалі сезоннае паселішча ля в. Падлужжа Чачэрскага раёна, рэшткі якога захаваліся да нашых дзён. Гэта быў час так званага верхняга палеаліту. Людзі гэтай гістарычнай эпохі (краманьёнцы) ужо нічым не адрозніваліся ад нашага сучасніка па сваіх фізічных даных. Яны паляваліі на маманта, валасатага насарога, мядзведзя, пясца, зайца і іншых звяроў, займаліся зборам усяго ядомага з жывёльнага і расліннага царства, будавалі жытлы з костак маманта, шылі вопратку са скур.

Знойдзеныя на тэрыторыі раёна рэшткі гэтых жывёл даюць магчымасць меркаваць аб пранікненні чалавека на тэрыторыю раёна і ў верхнім палеаліце. Тым больш, што тут было ўсё неабходнае для жыцця. Асабліва вабіла ў тыя далёкія часіны першабытных паляўнічых наяўнасць побач са статкамі буйных жывёл лёгкадаступных крэйдавых адкладанняў. У іх было шмат крэменю — сыравіны, якую ў старажытнасці цанілі больш за ўсё. Сустракаліся яны часцей за ўсё на правым беразе Сожа, які звычайна ў адроз-

ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЁНА



ненне ад левага больш стромкі; ля Чэрыкава і Гронава, Мірагошча і ў іншых месцах крэйдавыя адкладанні агаляюцца па схілах берагоў. Ёсць яны і на левым беразе, асабліва паміж вёскамі Ушакі і Бакунавічы. Гэ-



Зуб, шэрсць і косткі маманта, якія былі знойдзены пры раскопках на Чэрыкаўшчыне. Зараз знаходзяцца ў Чэрыкаўскім краязнаўчым музеі.

та найбольш старажытныя з геалагічных утварэнняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі раёна. Там, дзе адкладанні размыты ці размыта марэна старадаўніх часоў, у якой таксама было шмат крэменю, «назбіранага» на ўсім шляху з далёкай Скандынавіі, адкуль ледавікі надыходзілі, крэмень сустракаецца на паверхні глебы вялікімі скапленнямі.

Ці былі тут людзі 20—12 тыс. гадоў назад, невядома. Ніякіх пэўных доказаў няма, адны толькі меркаванні. Летапіс першапачатковага засялення Пасожжа часова спыніўся.

Наступны этап засялення пачаўся са з'яўленнем на тэрыторыі раёна чалавека эпохі мезаліту (сярэднекаменны век, 12—7 тыс. гадоў назад). Да гэтага часу тут сфарміраваліся ўсе галоўныя элементы рэльефу. Утварыліся надпоплаўныя тэрасы. Верхняя (другая) тэраса ёсць амаль на ўсім правым беразе, ля Чэрыкава і в. Журавель яна падыходзіла да самай ракі. Поплаў развіты тут на супрацьлеглым левым беразе Сожа. Першая надпоплаўная тэраса распаўсюджана на левым беразе і толькі кавалкі яе дзе-нідзе захаваліся на правым (ля в. Мірагошч, на поўнач ад в. Журавель і ў іншых мясцінах). Паміж Чэрыкавам і в. Мірагошч Сож прымае мерыдыянальны напрамак, што на ўсім працягу яго цячэння адбываецца яшчэ толькі аднойчы на суседняй Слаўгарадчыне (паміж вусцем р. Проні і в. Гайшын).

На ўсім працягу надпоплаўных тэрас, як і на ўсіх пясчаных пагорках поплава і схілах шматлікіх старарэччаў, можна знайсці рэшткі старажытных паселішчаў. Гэта прылады працы, зброя, прылады побыту, рэшткі пахаванняў і жытлаў, посуд і шмат іншага. З гэтых сціплых знаходак мінулага і складаецца гісторыя далетапіснага часу. Лепш за ўсё захоўваюцца прылады з крэменю, каменю, металу і гліняны посуд. Амаль не захаваліся ў пясчаных глебах Пасожжа рэчы з дрэва і костак. Але і яны дзе-нідзе трапляюць у палон археолагаў. Напрыклад, побач з р. Ляснянкай ля в. Лясная знайшлі свідраваную рагавую сякеру.

У сувязі з інтэнсіўнай паляўнічай дзейнасцю, зменай клімату, жывёльнага і расліннага свету менавіта ў пачатку мезаліту чалавек вынайшаў лук і стрэлы. Тэрыторыя Чэрыкаўскага раёна на тую пару была ўжо абжыта. Амаль без перапынку ўздоўж правага берага Сожа ад в. Горкі да в. Журавель цягнуцца мезалітычныя паселішчы. Упершыню яны былі знойдзены яшчэ ў 20—30-я гады нашага стагоддзя, калі беларускі археолаг Канстанцін Міхайлавіч Палікарповіч крок за крокам пачаў абыходзіць берагі Сожа ў пошуку старажытных помнікаў. Бо да той пары яшчэ ў канцы XIX ст. былі адшуканы і вядомы па літаратурных даных толькі некаторыя курганныя могільнікі. Паступова дзякуючы намаганням даследчыкаў (у даваенныя гады, апрача К. М. Палікарповіча,— А. М. Ляўданскага, А. З. Кавалені, у пасляваенныя —

В. Ф. Капыціна, А. Г. Калечыц, В. Л. Ліпніцкай, В. П. Трэццякова, У. Д. Будзько, Г. В. Штыхава, П. А. Рапапорта і інш.) спіс археалагічных помнікаў раёна значна павялічыўся, і зараз вядома, што іх было да нядаўняга часу больш за 50.

Да мезалітычнай пары асартымент прыладаў працы значна пашырыўся і пачаў налічваць некалькі дзесяткаў тыпаў. Сярод іх можна знайсці прататыпы ўсіх прылад, неабходных нам у гаспадарцы і зараз. Адрозніваюцца яны малымі, па нашых мерках, памерамі і сыравінай, з якой выраблялiся. Многа прылад зроблена з крэменю. Крэмень вельмі добра калоўся, даючы вострыя краі, і таму побач з дрэвам і косткамі жывёл чалавек тысячагоддзямі карыстаўся ім. Паселішчы мезалітычнае пары звычайна размяшчаліся на найбольш высокіх тэрасах і займалі адносна невялікую плошчу ўздоўж іх краёў.

Так, напрыклад, за 1,5 км на паўднёвы ўсход ад в. Горкі, на першай надпоплаўнай тэрасе правага берага р. Сож ва ўр. Угароўка ў 1928 г. К. М. Палікарповічам была адкрыта стаянка, датуемая эпохай позняга мезаліту (8—6 тыс. гадоў назад). З 1974 г. тут праводзіць раскопкі В. Ф. Капыцін. Ім ускрыта 1668 м^2 культурнага пласта, знойдзена больш за 50 тыс. прадметаў, сярод якіх больш за 1000 прылад працы, шмат нуклеусаў, наканечнікаў да стрэл. Да гэтага ж перыяду адносіцца і яшчэ адна стаянка, якая атрымала назву Крынічная. Яна знаходзіцца за 0,5 км на поўдзень ад апісанай вышэй стаянкі і была таксама адкрыта К. М. Палікарповічам у 1928 г. У 1977—1978 гг. яе даследавала В. Л. Ліпніцкая, а ў 1972 і 1984 г.— В. Ф. Капыцін. Ускрыта 334 м^2 культурнага пласта, што залягаў на глыбіні 0,6 м ад паверхні. У знойдзенай калекцыі, якая наліч-



Прылады працы, знойдзеныя на стаянцы ля в. Горкі, на першай надпоплаўнай тэрасе правага берага р. Сож, ва ўр. Угароўка.

Агульны выгляд стаянкі ля в. Горкі, ва ўр. Угароўка.

вае больш за 10 тыс. прадметаў, ёсць нуклеусы, тронкавыя наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы і іншыя прылады. Для іх вырабу выкарыстоўвалі цёмна-шэры мелавы крэмень, паклады якога знаходзяцца на беразе старыцы р. Сож.

Цікавая і стаянка, якая знаходзіцца за 1,5 км на паўднёвы захад ад в. Журавель ва ўр. Мел. Яна таксама датуецца эпохай позняга мезаліту. Выявіў яе ў 1928 г. і даследаваў у 1934 г. К. М. Палікарповіч. Пазней, у 1972—1973 гг. раскопкі тут праводзіў В. Ф. Капыцін. Было даследавана 130 м^2 культурнага пласта на глыбіні 0,5 — 0,6 м. У цэнтры раскопу, у паглыбленні авальнай формы памерам 1,5×2 м, ускрыта майстэрня па апрацоўцы крэменю. Сабрана больш за 6 тыс. расшчэпленых крэменеў, у тым ліку 290 прылад працы: нуклеусы, тронкавыя наканечнікі стрэл, бакавыя, сярэдзінныя і вуглавыя разцы, канцавыя, двайныя і паўкруглыя скрабкі, клінападобныя сякеры, вырабы з выемкамі, праколкі і пласціны з апрацаваным рэтушшу краем.

Да якога перыяду належаць тыя ці іншыя прылады працы з вялікай дакладнасцю вучоныя ўстанаўліваюць з дапамогай трасалагічнага метаду (па слядах спрацаванасці на іх паверхні). Вылучаюцца прылады для палявання (наканечнікі стрэлаў, у пазнейшыя часы дзідаў і дроцікаў), для разбірання забітых жывёл (сякеры, нажы), скрабкі для апрацоўкі скур, прылады для апрацоўкі косці і дрэва (разцы, скоблі, цяслы), для пашыву адзення (праколкі, свярдзёлкі) і шмат іншых. Больш за ўсё ў час раскопак трапляюцца адходы крэменевай вытворчасці.

Для вырабу прылад бралі акруглыя жаўлакі, адсякалі адну ці абедзве вяршыні і потым здымалі з гэтага каменю правільныя доўгія пласціны, ці шырокія няправільнай формы адшчэпы. Гэта і былі асноўныя нарыхтоўкі, з якіх з дапамогай дадатковай аперацыі рэтушавання выраблялі разнастайныя прылады для палявання і побыту. Выкарыстоўвалі і аббітыя жаўлакі, так званыя нуклеусы, часцей за ўсё ў якасці рубячых прылад.

Вельмі шырока ўжываліся косткі і дрэва. З іх выраблялі гарпуны і кручкі, наканечнікі і кінжалы, амулеты, статуэткі і іншыя рэчы. З ця-

Агульны выгляд раскопу стаянкі ля в. Горкі, ва ўр. Угароўка.

гам часу тэхніка апрацоўкі няспынна ўдасканальвалася, але асноўныя этапы крэменеапрацоўкі прайшлі праз увесь каменны век.

Пералічанымі помнікамі мезаліту спіс іх не вычэрпваецца. Мезалітычныя знаходкі ёсць таксама ля в. Горкі ва ўр. Ніўкі, ля в. Гронаў ва ўр. Строў.

У раннім мезаліце пабывалі тут, відаць, плямёны так званай грэнскай культуры, а ў познім мезаліце — сожскай, што наклала адпаведны адбітак на іх інвентар, па якім, у сваю чаргу, археолагі ўстанаўліваюць культурную прыналежнасць і перыяд існавання.

Археалагічная культура — умоўнае паняцце. Яно ўключае ўсю сукупнасць рэшткаў старажытнасці, якія вучоным пашчасціла здабыць. Гэта заўсёды толькі частка таго, што належала і чым карыстаўся жыхар пэўнага адрэзку часу на пэўнай тэрыторыі. Рэканструяваць гэтыя рэшткі і на аснове іх аналізу аднавіць асноўныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця тых ці іншых старажытных плямёнаў — задача археолага.

У канцы V — пачатку IV тысячагоддзя да нашай эры жыхары Пасожжа навучыліся ляпіць гліняны посуд. З яго з'яўленнем звязана станаўленне новай гістарычнай эпохі — неаліту (новы каменны век), часу першага буйнога грамадскага падзелу працы і кардынальных змен у эканоміцы першабытнага грамадства («неалітычная рэвалюцыя»). Посуд рабілі шляхам паслядоўнага налепу гліняных стужак. Пры гэтым атрымлівалі востра- і акругладонныя гаршкі розных памераў. Спачатку сценкі посуду рабілі тоўстымі (да 1,5 см), дно запаўнялі глінай аж на 5—6 см. Венцы заставаліся роўнымі. У цеста, якое складалася з глі-

ны і пяску, дамешвалі шмат раслінных рэштак. Калі такі гаршчок абпальвалі, расліннасць, выпальваючыся, пакідала адметныя сляды. Па іх і слабаму дрэннаму абпалу і можна вылучыць найбольш старажытны посуд.

Першыя гаршкі аздабляліадбіткамі ямак ці наколамі так званага грэбня. Гэта кароткі ланцужок з маленькіх частых чатырохвугольных наколаў. Для нанясення арнаменту выкарыстоўвалі завостраныя палачкі, косткі дробных жывёл, белемніты, ці, як завуць іх у народзе, «чортавы пальцы» з крэйдавых адкладанняў і іншыя акруглыя прадметы. Дзеля ўтварэння грабенчатых адбіткаў больш за ўсё ўжывалі звычайныя рачныя ракавінкі, край якіх лёгка можна было зрабіць шчарбатым. Вынаходніцтва посуду дазволіла чалавеку харчавацца варанай стравай. У залежнасці ад прызначэння посуд меў розныя памеры і розную ступень арнаментацыі. Для захавання запасаў рабілі вялізныя і больш простыя пасудзіны. З цягам часу працэс выпрацоўкі і арнаментацыі посуду значна ўскладніўся. Ад нанясення ўзораў па ўсёй паверхні, ці толькі ў ніжняй і верхняй частках гаршкоў перайшлі да стварэння складаных кампазіцый. Гэта былі рамбічныя, трохвугольныя, зігзагападобныя, дыяганальныя, ялінкавыя і іншыя ўзоры.

Трэба адзначыць, што кожнай неалітычнай культуры належаць асобныя арнаментацыя і форма посуду, а ў некаторых выпадках і своеасаблівы склад цеста. Пасожжа, у тым ліку і Чэрыкаўшчыну, насялялі плямёны верхнедняпроўскай культуры. Каранямі яна паглыбляецца у мясцовы мезаліт, а ў плане гістарычнага лёсу насельніцтва распаўсюджваецца далёка на поўнач. Па некаторых адзнаках можна заўважыць уплыў ад кантактаў з неалітычнымі плямёнамі Палесся, Падзвіння, Падзясення і інш. У канцы неалітычнага перыяду для арнаментацыі посуду, гэтага асноўнага паказчыка культуры, верхнедняпроўскія плямёны ўжывалі каля 40 рознатыпных грабенчатых адбіткаў, больш 10 ямчатых, авальных, каплепадобных, фігурных адбіткаў, розныя трохвугольныя, лапчастыя наколы (канцом палачкі, перавітай тканінай ці шнурам), ногцевыя ўціскання, зашчыпы пальцамі. Усяго больш за 100 элементаў, з дапамогай якіх рабілі не менеў 130 матываў, якія ствараліся сістэмы. Найбольш істотнымі адзнакамі прыналежнасці да верхнедняпроўскай культуры былі тры ты-



Агульны выгляд стаянкі ля в. Журавель, ва ўр. Мел.

пы посуду: шыракагорлыя, прамасценныя, якія звужаліся да вострага дна, вастрадонныя, злёгку выпуклыя з адагнутым вонкі венчыкам, акругладонныя, нізкія. Сустракаюцца сасуды рытуальнага прызначэння. Іх дно арнаментавана з абодвух бакоў. Звычайна увесь посуд меў у 1—2 см ніжэй краёў шэраг цыліндрычных ямак. Вядучы элемент арнамента — адбіткі грэбня, на другім месцы — ямкавыя і на трэцім — лапчастыя ўціскання.

Большасць прыладаў працы па ранейшаму выраблялі з крэменю і некаторую частку з косці і дрэва. Аднак апрацоўка стала больш дасканалай, часцей за ўсё двухбаковай. З'явіліся новыя формы наканечнікаў стрэл (рамбічныя і трохвугольныя), мноства добраапрацаваных сякер, цёслаў (прыладаў для даўбленя лодак). Распаўсюдзіліся прыёмы шліхтавання.

У эпоху неаліта жыхары лясной зоны Еўропы, у тым ліку і Беларусі, працягвалі займацца паляваннем, збіральніцтвам, але паступова асноўным заняткам стала рыбалоўства. Гэта знайшло адлюстраванне і ў тапаграфіі неалітычных стаянак: яны пачалі размяшчацца бліжэй да вады, як правіла, на першых надпоплаўных тэрасах ці на пясчаных пагорках поплава, асабліва ля шматлікіх старарэччаў, заліваў і вусцяў малых рэк.

Значна павялічылася колькасць насельніцтва. Паводле даных К. М. Палікарповіча, на кожныя 1,3 км у сярэднім прыходзілася адно неалітычнае паселішча. На іх жылі больш доўгі час, таму культурны пласт звычайна значна таўшчэйшы, але гэта не абавязкова, таму што побач з доўгатэрміновымі лёгка можна знайсці рэшткі часовых, кароткатэрміновых, лагераў першабытных паляўнічых. У межах Чэрыкаўскага раёна неалітычныя паселішчы знойдзены ля вёсак Гронаў у трох месцах (ур. Строў, Курганне і Града), Ушакі (ур. Барышнева, Прыстань, Вусце, Глінь, Засуха і Кашалькоў Лес), Вусце. Да таго ж тут маецца мноства месцазнаходжанняў, якія не раскопваліся, а ў час збораў на іх паверхні не было знойдзена якіх-небудзь адметных, тыповых для той ці іншай гістарычнай эпохі прыладаў. Таму яны, хоць і ўзяты на ўлік, але дакладна не датаваны і лічацца помнікамі каменнага веку. Сярод іх рэчы, знойдзеныя ў паўднёва-ўсходняй частцы в. Бакаў ля возера; на ўсходняй ускраіне в. Гронаў на схіле левага берага р. Сож; ва ўр. Чорны Бераг, Язёры, Шкутаўская Гара ля в. Журавель; на поўдзень ад дамбы ля дарогі з Краснаполля ў Чэрыкаў побач з вёскай Лімень; на поплаве правага берага р. Сож, насупраць могілак, ля школы в. Мірагошч; ва ўр. Дубовая Пуня і Высокая Грыва, у аколіцах в. Манастырок; на паўночна-заходнім беразе воз. Драбнікі і побач з вусцем р. Сянны ва ўр. Куляшоў Бугор ля в. Ушакі; крыху вышэй вусця р. Лабчанкі, ва ўр. Чырвоная Грыва ля былой в. Чатырохдворка. Можна з упэўненасцю сказаць, што большая частка пералічаных аб'ектаў утрымлівае матэрыялы верхнедняпроўскай неалітычнай культуры, да якіх дамешана частка прыладаў з часоў бронзавага веку. Гэтая заканамернасць тыповая для ўсіх першабытных паселішчаў Пасожжа.

З усіх пералічаных вышэй помнікаў дакладна датаваны толькі той, які размешчаны каля в. Гронаў, дзе праводзіліся раскопкі.

Паселішча ля старарэчча Сожа, якое мае назву Брадок, што знаходзіцца паміж вёскамі Гронаў і Вепрын ва ўр. Курганне і Строў, было знойдзена ў 1974 г. ленінградскім археолагам В. П. Трэццяковым па паведамленню настаўніка П. В. Шамро. У 1975 г. тут праводзіла раскопкі А. Г. Калечыц. Зборы з

паверхні засведчылі наяўнасць матэрыялаў мезаліту і неаліту. У раскопе ва ўр. Строў большасць з іх належала да жалезнага веку, астатнія — да неаліту. На плошчы 56 м^2 сабрана значная колькасць ромбападобных наканечнікаў стрэл, скрабкоў, разцоў, скобляў, сякер, праколак, адыходаў крэменевай вытворчасці. Фрагменты посуду ўпрыгожаны адбіткамі грэбня, ямкамі і лапчастымі ўзорамі ці ўвогуле неарнаментаваныя. Былі знойдзены таксама рэшткі посуду ранняга перыяду бронзавага веку.

Найбольшую каштоўнасць маюць вынікі раскопак на паселішчы ва ўр. Курганне. Яно размешчана побач з першым, па другі бок Брадка. Тут аўтарам артыкула было раскапана 140 м^2, знойдзена амаль 1,5 тыс. вырабаў з крэменю і больш за 2 тыс. фрагментаў ляпнога посуду. Каля 350 прыладаў маюць дадатковую апрацоўку і з'яўляюцца гатовымі прыладамі працы. Сярод іх вялікую колькасць складаюць скрабкі, шмат скобляў, праколак, свярдзёлкаў, ёсць сякеры, цяслы, разцы розных тыпаў, наканечнікі стрэлаў трохвугольнай і рамбічнай формы. Вельмі цікавы булававідны малаток ці грузіла з крэменю, свідраваны ў цэнтры.

Сярод рэшткаў посуду пераважаюць тыя, якія ўпрыгожаны адбіткамі грабенчатага штампа, ёсць з сапраўднымі круглымі ямкамі, лапчастымі адбіткамі, спалучэннем грэбня і ямчатых наколаў, з трохвугольнымі наколамі і рознымі іх спалучэннямі. Частка посуду не арнаментавана. Аналіз атрыманых матэрыялаў дае падставу меркаваць, што мясцовае насельніцтва мела кантакты асабліва з насельніцтвам Волга-Окскага рэгіёна. Гэта найбольш усходняя з раскапаных на Беларусі неалітычных стаянак.

Шляхам збору матэрыялаў з паверхні разбураных плошчаў помніка даследавана яшчэ ў даваенныя гады неалітычнае паселішча ля в. Ушакі. Яно размешчана на краі ніжняй надпоплаўнай тэрасы ля возера Заазер'е, ва ўр. Кашалькоў Лес. Было знойдзена шмат розных рэчаў. Сярод іх скрабкі розных тыпаў, разец, рубячыя прылады. Рэшткі неалітычных паселішчаў знойдзены і ў іншых месцах.

У канцы III — пачатку II тысячагоддзя да н. э. на змену веку каменнаму прыйшоў век бронзавы. На тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна з'явіліся так званыя «шнуравікі». У лік культур са шнуравой керамікай (упрыгожанай адбіткамі шнура) і баявымі сякерамі ўваходзіла і сярэднедняпроўская, распаўсюджаная на Падняпроўі. Узаемаадносіны гэтых прышлых плямёнаў, знаёмых з жывёлагадоўляй і земляробчай працай, з мясцовым насельніцтвам, уплыў іх на грамадскія адносіны і ідэалогію склалі галоўную сутнасць гістарычнага працэсу ў бронзавым веку. Эканамічныя сувязі паміж прышэльцамі і мясцовымі жыхарамі ўвесь час узмацняліся і прывялі да істотных змен у вытворчых адносінах. Бурнымі тэмпамі працякалі этнічныя працэсы. Першабытнаабшчынны лад уступіў у стадыю разлажэння.

Для заняткаў земляробствам і жывёлагадоўляй неабходны былі палі, лугі, урадлівая глеба. Пачалося актыўнае асваенне прырэчных прастораў, высечка і выпальванне лесу. Дзеля гэтага спатрэбілася значная колькасць свідраваных каменных сякер, у тым ліку шліфаваных. Дзірку ў такіх сякерах свідравалі полай трубчатай косткай, папярэдне шліфуючы бакі і асабліва лязо з дапамогай мокрага пяску на паліравальнай пліце. Знойдзены яны на пашы ля вёсак Верамейкі, Забачэў, Наркі, Вусце, Юдаўка, ля Чэрыкава. У народзе іх завуць «грамавымі стрэлами».

Паяўленне маёмаснай няроўнасці стала штуршком да грабежніцкіх

паходаў і ўзброеных сутычак. Частка свідраваных сякер, як і новы тып стрэл (трохвугольных з шыпамі), служыла дзеля гэтых мэтаў. Вельмі рэдка археолагі знаходзяць вырабы з каляровых металаў. На ўсім Пасожжы іх не больш 30. Прычына — адсутнасць руд каляровых металаў. На думку вучоных, руду каляровых металаў прывозілі з Каўказа ці Карпат. Мясцовая бронзаліцейная вытворчасць калі і існавала, дык трымалася на пераапрацоўцы гатовых зліткаў. Істотна ўдасканалілася і дасягнула вяршыні крэменеапрацоўка.

Прынцыпова іншым быў посуд сярэднедняпроўскай культуры. Найбольш характэрныя для яе акруглаі пласкадонныя гаршкі з шырокім адагнутым вонкі венчыкам. Побач з адбіткамі шнура для ўпрыгожання паверхні ўжывалі лінейны штамп, складаючы трохвугольныя, ялінкавыя кампазіцыі. Посуд пачалі рабіць танкасценным і значна лепш абпаленым.

Археалагічныя рэшткі бронзавага веку на тэрыторыі раёна, апрача сякер, прадстаўлены галоўным чынам керамікай. Яны сустракаюцца даволі часта на ўсіх неалітычных помніках, а таксама пераважаюць у зборах з паверхні на паселішчах ля в. Журавель, што на паўднёвы захад ад ур. Мел, на першай надпоплаўнай тэрасе правага берага р. Сож, ва ўр. Затанец; ва ўр. Бярозавая Грыва і Лозскі Барок ля в. Ушакі. На паўночнаўсходняй ускраіне г. Чэрыкава на беразе возера-старыцы ва ўр. Чыгароўшчына таксама ёсць рэшткі паселішча бронзавага веку. Побач знойдзены клінападобныя і ромбападобныя двухлёзныя сякеры, 2 сякеры-кліны, авальная матыка, шарападобная падвеска і іншыя рэчы. Вырабы бронзавага веку былі знойдзены і за 1,5 км на паўднёвы ўсход ад в. Горкі, на ўзвышшы Угароўка. На такіх паселішчах трапляюцца косткі буйной і дробнай рагатай жывёлы, коней, свіней, а таксама зернецёркі, матыкі, посуд з адбіткамі зерня на сценках. Гэта і ёсць доказы існавання земляробства і жывёлагадоўлі.

Аб дыферэнцыяцыі грамадства ў гэты час можна меркаваць пры вывучэнні могільнікаў. Разам з беднымі безынвентарнымі пахаваннямі сустракаюцца і пахаванні, калі побач з нябожчыкам былі пакладзены дзесяткі рэчаў, у тым ліку з металу, косці. Пахавальны абрад быў надзвычай разнастайным. Сярэднедняпроўскія плямёны хавалі нябожчыкаў пад курганнымі насыпамі і ў грунце па абраду трупаспалення і трупапалажэння. Сярод некалькіх з захаваўшыхся курганных могільнікаў магчыма былі і насыпаныя ў бронзавым веку, але яны не вывучаліся.

Тое ж можна сказаць пра помнікі сярэдняга і позняга бронзавага веку. Яны дасюль не адшуканы.

У VII — VI ст. да н. э. на большай частцы тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ў Пасожжы, наступіў жалезны век. Яго пачатак адпавядае шырокаму распаўсюджанню важнейшага вынаходніцтва — здабычы жалеза з балотнай руды, запасы якой на Беларусі былі нязлічоныя. З жалеза кавалі сякеры і нажы, цуглі і сярпы, наканечнікі стрэл і дзідаў, іншыя прылады працы, зброю і ўпрыгожанні. Непараўнальныя з каменнымі аналагамі моц і надзейнасць гэтых вырабаў прывялі да таго, што яны хутка амаль поўнасцю выцеснілі першыя. Пэўны час працягвалі існаваць толькі каменныя свідраваныя сякеры. Рэзка ўзрасла прадукцыйнасць працы. Пашырылася падсечнае (ляднае) земляробства. Добрыя ўраджаі спрыялі і развіццю жывёлагадоўлі, даючы корм на час утрымання статка ў стойле.

У жалезным веку працягваўся рост маёмаснай няроўнасці, які меў

і адмоўны бок. Рэзка ўзраслі ўзброеныя сутычкі, грабяжы. У сувязі з гэтым насельніцтва вымушана было пераходзіць у час небяспекі з адкрытых паселішчаў (адно з іх знойдзена ва ўр. Строў ля в. Гронаў) на ўмацаваныя гарадзішчы. Іх будавалі звычайна на найбольш узвышаных і цяжкадаступных месцах (мысы ў далінах рэк, пясчаныя грады на поплаве і карэнных берагах, сярод балот). Дадаткова ўмацоўвалі валамі, равамі, драўляным частаколам. Паступова гарадзішчы сталі асноўным тыпам паселішчаў.

Археалагічныя знаходкі, якія датуюцца жалезным векам, на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна ў асноўным належаць мілаградскай і зарубінецкай культурам.

Мілаградская культура — гэта археалагічная культура плямёнаў, якія жылі ў Сярэднім і Верхнім Падняпроўі. Сваю назву яна атрымала ад гарадзішча каля в. Мілаград Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Датуецца яна сярэдзінай VII — VI ст. да н. э.— I ст. н. э. Насельніцтва жыло на гарадзішчах і паселішчах у жытлах слупавай канструкцыі і паўзямлянках, якія мелі выступы ў адным з вуглоў ці ля сцен, ужывала жалезныя наканечнікі коп'яў, нажы, сярпы, ляпны кругладонны і пласкадонны гладкасценны посуд, бранзалеты, сасудападобныя прасліцы, падтрымлівала сувязі са скіфамі і плямёнамі культуры штрыхаванай керамікі. Пахавальны абрад — трупапалажэнне і трупаспаленне ў курганных і бескурганных могільніках. У сацыяльна-гістарычным развіцці плямёны мілаградскай культуры знаходзіліся на пачатковай стадыі распаду першабытнаабшчыннага ладу. Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, рыбалоўствам, паляваннем і апрацоўкай жалеза.

На рубяжы нашай эры паўднёва-ўсходняя частка тэрыторыі Беларусі



План гарадзішча ля в. Камаровічы, мясцовая назва Гарадзішча, на правым беразе р. Волчас.

ўвайшла ў сферу распаўсюджання зарубінецкай культуры, якая атрымала сваю назву ад могільніка каля с. Зарубінцы на Кіеўшчыне. Даследаванне помнікаў гэтай культуры паказала, што ў іх аснове ў большасці выпадкаў знаходзяцца мілаградскія слаі. Храналагічна зарубінецкая культура падзяляецца на ранні этап (канец II ст. да н. э.— пачатак II ст. н. э.), якому характэрны гарадзішчы, паселішчы і бескурганныя могільнікі, і позні (II — V ст. н. э.) — з паселішчамі і бескурганнымі могільнікамі. Большасць даследчыкаў выдзяляюць помнікі позняга этапа ў самастойную культуру, якая мае назву кіеўская. Насельніцтва будавала наземныя жытлы слупавой канструкцыі прамавугольнай формы і паўзямлянкі, ужывала жалезныя наканечнікі коп'яў, клінападобныя сякеры, нажы, сярпы, ляпны і глянцаваны пласкадонны посуд, бранзалеты, шкляныя пацеркі, розныя фібулы

і інш. Пахавальны абрад у плямён гэтай культуры — трупаспаленне (вельмі рэдка сустракаецца трупапалажэнне), у магілах трапляюцца прылады працы, посуд, упрыгожанні.

Плямёны зарубінецкай культуры падтрымлівалі сувязі са скіфска-сармацкімі і кельцкімі плямёнамі, гарадамі Паўночнага Прычарнамор'я, з плямёнамі, якія жылі на тэраторыі Польшчы і Прыбалтыкі. У сацыяльна-гістарычным развіцці плямёны гэтай культуры знаходзіліся на стадыі распаду першабытна-абшчыннага ладу і складвання тэрытарыяльнай абшчыны. Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, апрацоўкай жалеза, рабіла бронзавыя ўпрыгожанні. Большасць даследчыкаў лічаць зарубінецкую культуру старажытнаславянскаю.

На тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна знойдзены паселішчы, могільнікі і асобныя рэчы, якія адносяцца да позняга этапа зарубінецкай культуры.

Дакладна датаваць гарадзішчы і курганныя могільнікі, знойдзеныя на тэрыторыі раёна, немагчыма, бо яны не раскопваліся. Гарадзішчы вядомы ля вёсак Камаровічы, Тур'е, Юдаўка і г. Чэрыкава.

Наконт Камаровіцкага гарадзішча, што за 0,5 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе р. Волчас, ёсць даведка аб узросце. Яго датуюць раннім жалезным векам. Трохкутная пляцоўка з двух бакоў абмежавана ярамі, з трэцяга — валам дугападобнай формы.

Гарадзішча ля Юдаўкі знаходзіцца на мысе 8-мятровай тэрасы левага берага р. Козел. Пляцоўка ўмацавана кальцавым валам. Ад карэннага берага яе аддзяляе два равы. Адкрыўшы і даследаваўшы гарадзішча ў 1977 г., Г. В. Штыхаў таксама аднёс яго да ранняга жалезнага веку. Што датычыцца гарадзішча ля в. Тур'е ва ўр. Гарадзец, за 1,5 км на паўднёвы ўсход на правым беразе р. Вудажкі (прыток р. Вудагі), то тут авальная пляцоўка таксама акружана кальцавым валам, але даследаваўшыя яго ў 1936 г. А. Н. Ляўданскі і А. Д. Каваленя не знайшлі тут культурнага слоя і на гэтай падставе аднеслі яго да тыпу гарадзішчаў-сховішчаў. На іх не жылі, а толькі хаваліся ў часы небяспекі. Зараз яно разбурана. У 1989 г. археалагічны атрад Магілёўскага педінстытута імя А. Кулешова пад кіраўніцтвам В. Ф. Капыціна знайшоў на тэрыторыі раёна яшчэ адзін даволі загадкавы аб'ект. Ля в. Піленка захавалася невялікае круглае ў плане гарадзішча-свяцілішча (магчыма гэта быў майдан, дзе атрымлівалі вугаль, спальваючы дрэвы) з выхадам на поўдзень. Па перыметру яно абнесена кальцавым валам вышынёй да 1,5 м. Пляцоўка круглая, дыяметрам 17 м. Культурны слой адсутнічае. Знойдзена толькі вуголле.

Гарадзішча ў г. Чэрыкаў цалкам забудавана.

Больш за ўсё з тых далёкіх часоў уцалела курганных насыпаў. Захавалася 18 насыпаў ля в. Пабеда, ва ўр. Дуброва, побач са старым рэчыцкім пагостам; 44 насыпы ля в. Грамабой, ва ўр. Курганне; 12 — ля в. Вохар, ва ўр. Блевачова, таксама ля сучаснага пагоста; 15 — ля в. Піленка, на правым беразе р. Сяны, ва ўр. Піленскія Курганы; сучэльныя некропалі існуюць за 2,5 км на паўднёвы захад ад в. Журавель, на беразе Сожа (41 насып), ля в. Гронаў, ва ўр. Курганне (74 насыпы). У двух групах ля в. Ушакі налічваецца 58 насыпаў (12 ва ўр. Вусце і 46 ва ўр. Шведскія Горы). 9 насыпаў існуе ля в. Горкі. Яны цягнуцца ўсцяж даліны Сожа і дарогі ў вёску.

Пісьмовыя крыніцы паведамляюць нам, што ў старадаўнія часы

курганныя могільнікі былі вядомы яшчэ ля вёсак Юдаўка, Вусце, Тур'е, Рэчыца, Ржавец, Камаровічы і ў іншых месцах. Зараз колькасць іх значна зменшылася. Паводле апошніх даследаванняў В. Ф. Капыціна (1989 г.), ля вёсак Тур'е і Рэчыца захавалася па аднаму кургану, ля могілак у в. Камаровічы — 7, ля в. Ржавец — 4 насыпы. Таксама ў гэты час знойдзены 4 курганы ля п. Юны Пахар і 7 ля п. Жытнёў. Усім ім пагражае небяспека разбурэння.

У эпоху Кіеўскай Русі (пачалася ў апошняй чвэрці I тысячагоддзя н. э. — скончылася ў XIII ст.) на месцы паселішчаў узніклі вёскі, на месцы гарадзішчаў узводзілі буйныя замкі і крэпасці. Курганы скончылі насыпаць у XIII — XIV ст.

А. Калечыц.

Археалагічныя помнікі каменнага і бронзавага вякоў

1. Бакаў, Язёрскі с/с. У паўночна-ўсходняй частцы каля возера.
2. Верамейкі, цэнтр с/с. Каля вытока р. Вудагі.
3. Вусце, Рэчыцкі с/с. На паўднёва-заходняй ускраіне, на 5-мятровай тэрасе.
4. Горкі I, Сормаўскі с/с. За 1 км на поўдзень, ва ўр. Ніўкі.
5. Горкі II. За 1,5 км на паўднёвы ўсход, ва ўр. Угароўка.
6. Горкі III. За 2 км на поўдзень, ва ўр. Крынічная.
7. Гронаў I, Вепрынскі с/с. На ўсходняй ускраіне, на абрыве левага берага р. Сож.
8. Гронаў II. За 1 км на ўсход, паміж вёскамі Гронаў і Вепрын, ва ўр. Строў.
9. Гронаў III. За 0,3 км на паўднёвы ўсход ад п. 7, на беразе возера-старыцы Брадок, ва ўр. Курганне.
10. Гронаў IV. За 0,2 км на ўсход ад ур. Строў, ва ўр. Града.
11. Журавель I, Сормаўскі с/с. За 0,3 км на ўсход, на пясчаным узгорку правага берага р. Сож.
12. Журавель II. На паўднёвы захад ад ур. Мел, на I тэрасе правага берага р. Сож, ва ўр. Затонец.
13. Журавель III. За 1,5—2 км на паўднёвы захад, на II тэрасе правага берага р. Сож, ва ўр. Мел.
14—16. Журавель IV — VI. За 3 км на паўднёвы захад, ва ўр. Чорны Бераг, Язёры, Шкутаўская Гара.
17. Забачэў, Верамейскі с/с. На беразе р. Вудагі.
18. Лімень, Чэрыкаўскі г/с. На I тэрасе р. Сож, на поўдзень ад дамбы каля дарогі з г. Краснаполле ў г. Чэрыкаў.
19. Мірагошч, Сормаўскі с/с. На пойме правага берага р. Сож, насупраць могілак, каля школы.
20—21. Манастырок I — II, Сормаўскі с/с. У навакольнай мясцовасці, ва ўр. Дубовая Пуня каля в. Глушэц і ва ўр. Высокая Грыва.
22. Наркі, Верамейскі с/с. На беразе р. Вудагі.
23. Ушакі I, цэнтр с/с. Каля вусця р. Сянны ў заходняй частцы ўр. Барышнева Прыстань.
24. Ушакі II. За 0,3 км на поўдзень ад п. 26, ва ўр. Бярозавая Грыва.
25. Ушакі III. За 3 км на захад, ва ўр. Вусце, на паўднёвым беразе воз. Дабрэтава.
26. Ушакі IV. Ва ўр. Глінь (Сасновая Грыва).
27. Ушакі V. На паўночна-заходнім беразе воз. Драбнікі.
28. Ушакі VI. На беразе воз. Засуха.
29. Ушакі VII. На беразе воз. Заазер'е, ва ўр. Кашалькоў Лес.
30. Ушакі VIII. За 0,04 км ад вусця р. Сянны, ва ўр. Куляшоў Бугор.
31. Ушакі IX. За 0,7 км на поўдзень ад п. 28, ва ўр. Лазовы Барок.
32. Чэрыкаў I. На паўночна-ўсходняй ускраіне, ва ўр. Чыгароўшчына.
33. Чэрыкаў II. Каля моста цераз р. Сож.
34. Чатырохдворка (былая). Вышэй вусця р. Лабчанка, ва ўр. Чырвоная Грыва.
35. Юдаўка, Верамейскі с/с. У навакольнай мясцовасці.

Друкуецца па кн: Калечиц Е. Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии. Мн., 1987.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ — 1917

Археалагічныя помнікі жалезнага веку

1. Горкі, Сормаўскі с/с, правы бераг р. Сож, ур. Ніўкі. На месцы стаянкі каменнага веку было паселішча. Знойдзена кераміка «тыпу гарадзішч».

2. Камаровічы, Рэчыцкі с/с. Гарадзішча ва ўр. Гарадзішча на правым беразе р. Волчас, недалёка ад в. Зоры.

3. Гронаў, Вепрынскі с/с. За 1 км на ўсход ад вёскі, на левым беразе р. Сож, ва ўр. Строў і Курганне знойдзена каля дзесятка фрагментаў гладкасценных пасудзін эпохі позняга этапа зарубінецкай культуры, некалькі фрагментаў пасудзін быхаўскай культуры, матэрыялы позняга сярэдневякоўя. Ва ўр. Курганне захаваліся 74 курганы.

4. Журавель I, Сормаўскі с/с. На правым беразе р. Сож, каля яру, паміж паўднёва-заходнім канцом вёскі і могілкамі паселішча, дзе выяўлены абпаленыя камяні. К. М. Палікарповіч лічыць помнік «радзіміцкім паселішчам». Выяўлена ляпная кераміка с расчосамі позняга этапа зарубінецкай культуры і эпохі старажытнай Русі.

5. Журавель II, правы бераг р. Сож, абрыў над ракой, паўночна-ўсходней лугу. Паселішча жалезнага веку, кераміка «тыпу гарадзішч».

6. Журавель III — Язёры, абрыў на правым беразе р. Сож. Сляды паселішча ў кірунку да Язёраў, кераміка «тыпу гарадзішч».

7. Журавель IV, паўднёвая частка ўр. Мел, правы бераг р. Сож. Выяўлена кераміка эпохі неаліта, ляпная кераміка I тысячагоддзя н. э. і бронзавая падвеска. У верхнім слаі знойдзены фрагменты ляпной пасудзіны, характэрнай для помнікаў быхаўскай культуры (VI — IX ст.). Ва ўр. Селішча на поўдзень ад вёскі знойдзена грубаляпная гладкасценная кераміка VI — IX ст. За 1 км на паўднёвы захад ад ур. Мел знаходзіцца курганны могільнік, які налічвае 41 насып.

8. Краснае, былое памесце. У 1925 г. абследаваў Л. Г. Вяржбіцкі. Знойдзена кераміка позняга этапа зарубінецкай культуры.

9. Новае жыццё I — Ушакі, цэнтр с/с, левы бераг р. Сож, ва ўр. Ворлішчы, на лузе. Сляды паселішча ранняга жалезнага веку.

10. Новае жыццё II — Ушакі, левы бераг р. Сож, каля воз. Засуха. Паселішча жалезнага веку, кераміка «тыпу гарадзішч».

11. Новае жыццё III — Ушакі, левы бераг р. Сож, правы бераг р. Сянны, дзе яна ўпадае ў Сож. Паселішча каля курганаў. Выяўлена ляпная кераміка «тыпу ранніх курганаў» і ганчарнай эпохі Старажытнай Русі. Ганчарная кераміка і ва ўр. Куляшоў Бугор.

12. Піленка, Ушакоўскі с/с. Ля вёскі захавалася круглае гарадзішча-свяцілішча з выхадам на поўдзень. Па перыметру яно абнесена кальцавым валам вышынёй да 1,5 м. Пляцоўка круглая, дыяметрам 17 м. Культурны слой адсутнічае.

13. Тур'е, Сормаўскі с/с, ур. Гарадзец. На беразе р. Вудагі, правага прытоку р. Сож, за 5 км паўночней Чэрыкава. За 1 км на поўнач ад в. Гарадзішча (разбурана).

14. Ушакі, цэнтр с/с. Знойдзены дзве групы курганаў. Першая група з 46 курганаў на захад ад вёскі, ва ўр. Шведскія Горы. Другая група з 12 курганаў за 2,5 км на паўночны захад ад вёскі ва ўр. Вусце.

15. Юдаўка, Верамейскі с/с. Гарадзішча мысовага тыпу, за 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, на левым беразе р. Козел, якая ўпадае ў р. Вудагу. Пляцоўка гарадзішча абнесена валам, з напольнага боку умацавана другім валам, мае форму трапецыі, 50×17 м.

16. Чэрыкаў, правы бераг р. Сож. Гарадзішча мысовага тыпу ва ўр. Гарадок (разбурана).

Друкуецца па кн.: Побаль Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век. Мн., 1983.

НАШЧАДКІ РАДЗІМА

З даўніх часоў землі сучаснага Чэрыкаўскага раёна засялялі прадстаўнікі аднаго са славянскіх плямён — радзімічы. Звесткі аб іх змяшчаюцца ўжо на першых старонках летапісу Нестара. «Радимичи и Вя-

тичи из Польши. Было два брата в Польше: Радим и Вятка. Когда они пришли (в Русь), то Радим поселился на Соже и потомки его прозвались радимичами». Яны займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, паляўніцтвам, бортніцтвам. З летапісу мы даведваемся, што яны на язычаскіх «д'ябальскіх гульбішчах» танцавалі і спявалі, кралі сабе жонак, якіх мелі па дзве-тры. Жанчыны радзімічаў карысталіся скроневымі кольцамі складанага абрысу з сямю вузкімі выступамі розных памераў унізе. Такія ўпрыгожанні называюцца сяміпрамянёвымі, і яны з'яўляюцца характэрнай племяннай адзнакай радзімічаў. Калі хто-небудзь паміраў, наладжвалі трызну, потым спальвалі нябожчыка на вогнішчы, попел збіралі ў невялікую пасудзіну-гаршчок і ставілі «на столле на путех», што значыць на кургане ля дарогі. Пазней гэты звычай адышоў. Памёршых сталі хаваць у курганах, кладучы іх на грунт галавой на захад.

Узроўнем эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця радзімічы не адрозніваліся ад сваіх суседзяў. У сярэдзіне IX ст. яны выплачвалі даніну Хазарскаму каганату, а з 885 г.— Кіеўскаму князю. « В 6393 году (от сотворения мира) послал Олег к радимичам спросить: кому дают дань. Они отвечали: Хозарам. От Олега последовал ответ: не давайте Хозарам, а мне платите. И стали Радимичи вносить (ему) по шелягу, как Хозарам давали». На думку вядомага гісторыка М. Ермаловіча, ідылічнасць гэтай гісторыі абверг пазнейшы факт непакорнасці радзімічаў: трэба думаць, што не толькі ў 984 г. (аб гэтым будзе гаворка пазней), але і ў 885 г. не адбылося без гвалту і крыві. Вядома, што ў складзе войска Кіеўскага князя Алега радзімічы прымалі ўдзел у паходзе на Царград у 907 г. «Пошел Олег (войною) на грецию... взяв и Кривичей, и Север, и Древлян, и Радимичей... и опустошил окрестности города, разрушив много домов и сжегси церкви. И возвратился в Киев, добыв золота, дорогих тканей, овощей, вина и разных красивых вещей».

У 944 г. адбыўся паход на Візантыю кіеўскага князя Ігара. Як сцвярджае М. Ермаловіч, радзімічы ў гэтым паходзе ўжо не ўдзельнічалі. Гэта дае падставу думаць, што дзесьці ў прамежку 911—944 гг. яны адкалоліся ад Кіева.

Асаблівую цікавасць складае паведамленне летапісу пад 984 г. У гэтым годзе радзімічы былі поўнасцю ўмацаваны ў складзе Кіеўскай Русі. «Пошел Владимир (войною) на Радимичей. Был у него воевода (по прозванию) Волчий Хвост. Владимир послал этого Воеводу вперед и тот встретил и победил Радимичей на р. Пищане. От этого Русские подсмеиваются над Радимичами, говоря Пищанцы от волчьего хвоста бегают. Радимичи платят дань Руси и доставляют в Киев».

Розныя даследчыкі па-рознаму адносіліся да гэтай падзеі. Адны бачылі ў ёй карную экспедыцыю супраць радзімічаў, якія паўсталі ці адклаліся, другія — сутычку Уладзіміра і яго дружыннікаў у час збору даніны, трэція лічылі, што гэта падзея перанесена з часоў Алега, а чацвёртыя наогул прымалі яе за легенду, створаную для тлумачэння народнай прымаўкі. Як сцвярджае М. Ермаловіч, паход Уладзіміра ў 984 г. трэба лічыць заваёўчым паходам з мэтай вярнуць радзімічаў пад уладу Кіева. Гэта пацвярджаецца і тым, што сутычка адбылася на рацэ Пяшчане (правым прытоку Проні), якая была рубяжом радзіміцкіх паселішчаў, і таму натуральна, што радзімічы менавіта тут сустрэлі праціўніка. Паўторнае заваяванне радзімічаў апроч даніны давала Кіеву яшчэ адну эканамічную выгоду.

Справа ў тым, што тэрыторыя радзімічаў, як і сумежных з ёю раёнаў, была багатая балотнымі рудамі, нават рака Пяшчана мела другую назву — Рудніца. Са шматлікіх радзіміцкіх балотаў здабываўся сырэц для выпрацоўкі металу. Калі гэтая рака не страціла свайго прамысловага значэння яшчэ на рубяжы XVIII — XIX ст., то няцяжка ўявіць, як яна цанілася ў канцы X ст. Не можа быць сумнення, што авалоданне радзіміцкімі руднымі багаццямі было адной з важнейшых мэт пакарання радзімічаў Уладзімірам. Нездарма ж таму Воўчы Хвост найперш накіраваўся на Пяшчану, асабліва багатую рудамі, і нездарма ж радзімічы тут сканцэнтравалі сваю абарону: тут знаходзілася іх найбольшае багацце.

У X — XI ст. у радзімічаў меліся невялікія гарады: Прапошаск, Гомій, Чачурск. Гэта былі маленькія крэпасці-«цвердзі», у якіх абараняласа мясцовае насельніцтва ў час міжусобіц і войн.

Сталіцай у радзімічаў, на думку некаторых гісторыкаў, была Радомля. Так, напрыклад, у кнізе «Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен» А. Турчыновіч піша: «Только одно название нынешнего местечка Чериковского уезда *Радомля* напоминает Радимичей, у которых быть может он был столицею».

Апошні раз радзімічы ўпамінаюцца ў летапісу пад 1169 год.

Без-Корнилович М. И. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся. Спб., 1855.

Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды. Мн., 1990.

Опыт описания Могилевской губернии/Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1. Могилев, 1882.

Турчинович О. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. Спб., 1857.

С. Кагадзеева.

З СІВОЙ ДАЎНІНЫ

Калі перагортваеш старонкі старажытных кніг, летапісаў, дакументаў перад вачамі паўстае карціна старадаўняга жыцця, шэраг цікавых падзей і лёсаў. На жаль, пісьмовыя крыніцы не даюць усебаковага, паслядоўнага асвятлення гісторыі Чэрыкаўшчыны, але і тыя нешматлікія звесткі, якія дайшлі да нас праз тоўшчу стагоддзяў, дазваляюць уявіць падзеі той далёкай пары. Значную дапамогу ў гэтай справе аказваюць ускосныя даныя аб мінулым Чэрыкаўшчыны ў сувязі з гістарычнымі падзеямі, якія мелі месца на суседніх землях.

Як адміністрацыйная адзінка Чэрыкаўшчына вызначылася толькі ў другой палове XVII ст., дакладней у 1678 г., калі Чэрыкаў стаў цэнтрам павета ў Магілёўскім ваяводстве[1]. Да гэтага часу землі Чэрыкаўшчыны ўваходзілі ў розныя княствы, староствы, паветы. Княствы Кіеўскае і Чарнігава-Северскае, Смаленскае і Мсціслаўскае, староствы і паветы: Прапойскае і Магілёўскае, Мсціслаўскае і Крычаўскае — ім у розны час, поўнасцю, ці па частках належалі землі Чэрыкаўшчыны ў сярэднія вякі. У сілу свайго геаграфічнага становішча гэта зямля на працягу многіх стагоддзяў знаходзілася на скрыжаванні ваенных дарог. Яна была амаль пастаянным месцам сутычак князёў смаленскіх, кіеўскіх, полацкіх, чарнігаўскіх. Гінулі людзі, жывёла, маёмасць. Руйнавалася ўсё тое, што было здабыта цяжкай працай. Вось, напрыклад, падзея, якая

датуецца 1142 г., яе апісвае ў сваёй кнізе беларускі гісторык М. Ермаловіч: «Зазначым, што... значна пацярпела радзіміцкая зямля, якая належала чарнігаўскаму князю Ігару Ольгавічу... Смаленскі князь Расціслаў Мсціславіч... напаў на радзіміцкую зямлю і папаліў яе». Менавіта паўднёвая частка сучаснай Чэрыкаўшчыны была падпарадкавана ў той час чарнігаўскаму князю і ў ліку іншых земляў была спустошана. Звесткі аб асноўнай яе тэрыторыі, якая ўваходзіла ў Смаленскае княства, мы таксама знаходзім у М. Ермаловіча. «Найперш трэба адзначыць, што Смаленская зямля ў гэты час дасягнула найбольшых сваіх памераў. Паводле Устаўной граматы Расціслава 1136 г. усходнія межы Смаленшчыны даходзілі да сярэдняга цячэння р. Масквы, а на захадзе яны ўключалі Оршу і Копысь, захопленыя ў Глеба Менскага ў 1116 г. Апошняе асабліва важна было для Смаленска. Заходнія, больш заселеныя, а таму і больш багатыя, раёны Смаленшчыны былі больш каштоўныя, чым усходнія, аддаленыя ад гандлёвых шляхоў і таму маланаселеныя і бедныя...» У гэты час на кароткі тэрмін спыніліся ваенныя сутычкі, так як «здабыццё палітычнай незалежнасці не азначала для Смаленска, як і для іншых земляў, ізаляцыі яго ад палітычнага жыцця, у першую чаргу Кіева, Ноўгарада, Суздаля, Полацка. Смаленску асабліва важна было захоўваць прыязныя адносіны з Кіевам, паколькі ў адваротным выпадку яго прыдняпроўскія землі, праз якія праходзіў вялікі гандлёвы шлях, маглі стаць аб'ектам варожага нападку. У выніку дальнабачнай палітыкі Расціслава велізарная тэрыторыя Смаленскай зямлі ў час зацятых удзельных усобіц з'явілася шчаслівым выключэннем»[2].

У канцы XII ст. на поўдні Смаленскага княства ўзнікла Мсціслаўскае ўдзельнае княства з цэнтрам у Мсціслаўлі. У 1180 г. новапабудаваны Мсціслаў з землямі, якія да яго прылягалі, быў аддадзены ва ўдзел Мсціславу — сыну Смаленскага князя Рамана Расціславіча. Акрамя цяперашняга Мсціслаўскага раёна, ва ўдзел уваходзіла частка зямель Чавускага і Чэрыкаўскага раёнаў. Мсціслаў Раманавіч, стаўшы Смаленскім князем, свой ранейшы ўдзел у 1196 г. далучыў да Смаленскага княства[3].

У 1196 г. адбыўся яшчэ адзін ваенны паход праз Чэрыкаўскія землі: Яраслаў Усеваладавіч Чарнігаўскі ідзе на Віцебск. У гэтае змаганне ўмешваюцца і смаленскія князі[4].

У XIII ст. разбуральныя набегі непрыяцеляў не абмінулі таксама і Чэрыкаўшчыну. На думку некаторых даследчыкаў, літоўскія князі са сваімі дружынамі часта ўрываліся ў межы Смаленскіх зямель, у 20-я гады XIII ст. яны гаспадарылі на Полацкай зямлі, адтуль і рабілі набегі. Вось, напрыклад, што паведамляў аб гэтым у мінулым стагоддзі А. С. Дамбавецкі: «Набегі Літвы на заходнія і паўднёва-заходнія рускія землі ў першай палове XIII ст. можна параўнаць з набегамі Полаўцаў на землі Русі Паўднёва-ўсходняй. Літоўскія князі ваююць з рускімі, міруюцца, радняцца з імі, падобна таму як гэта рабілі князі Паўднёва-Рускія ў адносінах з Полаўцамі. Набегі Літоўцаў, як і палавецкія, робяцца спачатку малымі атрадамі, на невялікай прасторы і з мэтай нажывы. Затым набегі становяцца больш пагражальнымі і бязлітаснымі...»[5] Інакш тлумачыць падзеі тых далёкіх часоў М. Ермаловіч. Ён з упэўненасцю сцвярджае, што «набегі «Літвы» маглі быць толькі ў інтарэсах Полацка, які іх інспіраваў супраць суседніх земляў і якія ажыццяўляліся праз Полацкую зямлю...

Паняцце «палачане» ў пазнейшы час забылася і падмянілася зразумелым тады паняццем «Літва»[6]. Думкі розныя, а вывад можна зрабіць адзін — цярпелі бедствы ад гэтых разбуральных набегаў людзі, што насялялі тую зямлю, магчыма, і продкі чэрыкаўлян.

На думку М. Ермаловіча, другая палова XIII ст. знамянальна для далейшай гісторыі Беларусі: у той час яна развіла сваю дзяржаўнасць. І ў гэтай сувязі нельга не падкрэсліць значэнне Новагародка — калыскі Вялікага княства Літоўскага. Бо менавіта «яго герб «Пагоня» — коннік з мячом над галавой — стаў дзяржаўным гербам Вялікага княства Літоўскага. І, зрабіўшыся пасля сталіцай, Вільна пераймае гэты сімвал, а за ёй і многія беларускія гарады, у тым ліку і Чэрыкаў. З гэтага часу «Пагоня» становіцца выяўленнем дзяржаўнай самабытнасці Беларусі, вайсковай доблесці яе мужных барацьбітоў за волю радзімы.

У час княжання Гедыміна тэрыторыя Вялікага княства значна пашырылася, у яе ўвайшлі тэрыторыі паміж Заходняй Дзвіной, Дняпром і Прыпяццю. У 1352 г. (па іншых звестках — каля 1359 г.) літоўскі князь Альгерд схіліў на свой бок мсціслаўскіх феадалаў і духавенства, заняў Мсціслаў і пакінуў тут свайго намесніка. Горад, застаючыся цэнтрам удзела, увайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага. Спачатку ім валодаў сын Альгерда князь Карыгайла. Тады ў Мсціслаўскае княства ўваходзілі Крычаў, Магілёў, Княжычы, Радамля, Расна, Цяцерын, Дрокаў і Мглін. Безумоўна, і Чэрыкаўская зямля была ў складзе гэтага княства. У хуткім часе Карыгайла загінуў, і Мсціслаў дастаўся яго брату Лінгвену (Лугвену) Сімяону, роданачальніку мсціслаўскіх князёў Альгердава роду.

З дапамогай М. О. Без-Карніловіча прасочым, каму пазней належала Мсціслаўскае княства, а значыць і землі Чэрыкаўшчыны. Пасля Сімяона ўдзел атрымаў у спадчыну яго сын Юрый. Аднак ён «аказаў сябе няўдзячным супраць вялікіх літоўскіх князёў» і быў вымушаны паехаць у Ноўгарад.

Вялікім літоўскім князем Казімірам Мсціслаўскі ўдзел быў аддадзены князю Б. Я. Бароўскаму, які прыехаў з Расіі. Але Барыс Яраславіч не доўга карыстаўся гэтай ласкай. У хуткім часе ён дадзеныя яму гарады вярнуў Казіміру, які згадзіўся аддаць удзел Мсціслаўскі, Крычаў і іншыя гарады Юрыю Сімяонавічу. Пасля смерці Юрыя князем стаў яго сын Іван Юр'евіч. Ён быў апошнім у раду, меў адну толькі дачку. Іван Юр'евіч прасіў караля дазволіць мужу свае дачкі М. І. Жаслаўскаму прыняць тытул князя Мсціслаўскага. Кароль згадзіўся. Пасля смерці свайго цесця ён атрымаў ад караля Аляксандра Мсціслаўскае княства. Аднак Міхаілу Іванавічу недаставала цвёрдасці: адзін раз ён быў саюзнікам польскага караля, другі раз— маскоўскага князя, словам, таго з ваяваўшых паміж сабою, хто перамагаў. Ворагі помсцілі князю за такое непастаянства, але пакутавалі ў асноўным бедныя жыхары. Агнём знішчалася жыллё, а людзей бралі ў палон. Па волі лёсу Міхаіл Іванавіч застаўся без наследнікаў мужчынскага роду і дараваны яму ўдзел мог аддаць каму б захацеў. Па просьбе каралевы Боны (жонкі Жыгімонта I) князь згадзіўся ўсынавіць каралеўскага сына Жыгімонта Аўгуста II і прызнаць яго сваім наследнікам. У сувязі з гэтым, у 1528 г. каралеўскім распараджэннем мсціслаўскі ўдзел быў аддадзены ў арэнднае ўтрыманне сыну брэсцкага старосты Яну Ілінічу з тым, каб палову даніны даваць князю Міхаілу Іванавічу, а палову — усыноўленаму ім каралевічу Жыгімонту Аўгусту.

Пасля смерці Міхаіла Іванавіча Мсціслаў быў прызначаны старостам, з якіх першым быў князь Іван Васільевіч Палубенскі .

Пашырэнне тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, як сцвярджае вядомы беларускі гісторык У. Ігна-

тоўскі, ішло «больш шляхам згоды, чым шляхам уціску і вайны...» Асобныя воласці і гарады самохаць прызнавалі новую ўладу і глядзелі на яе, як на пажаданую ўладу. Як на выключэнне можна паказаць толькі на Смаленск з яго тэрыторыяй: ён быў прылучаны да Літоўска-Беларускага гаспадарства ваяўніцкім шляхам. Але і тут не было дружнага адпору. Яшчэ раней у Смаленску была грамадзянская партыя, якая спачувала і цягнулася да Літвы. Прадстаўнікі гэтай партыі адчынілі гарадскую браму літоўска-рускаму войску, і яно амаль што без перашкод увайшло і заняло Смаленск[8]. Адбылося гэта ў 1404 г.

З XIV ст. гарады, якія ўваходзілі ў Вялікае княства Літоўскае, пачалі атрымліваць ад вялікіх князёў так званае магдэбургскае права, паводле якога эканамічная дзейнасць, маёмасныя правы, грамадска-палітычнае жыццё, саслоўны стан гараджан рэгуляваліся ўласнай сістэмай юрыдычных нормаў, што адпавядалі ролі гарадоў як цэнтраў вытворчасці і грашова-таварнага абмену. У 1641 г. Магдэбургскае права атрымаў і Чэрыкаў[9].

У XIV ст. Вялікаму княству Літоўскаму сур'ёзнай пагрозай стаў Тэўтонскі ордэн. Крыжакі рабілі частыя паходы на землі Вялікага княства.

Змаганне з крыжакамі было, паміж іншым, адной з прычын злучэння Вялікага княства Літоўскага з Каралеўствам Польскім. 14 жніўня 1385 г. вялікі князь Ягайла заключыў саюз з Польшчай (Крэўская унія). Паводле гэтага пагаднення, Ягайла ўступаў у шлюб з польскай каралевай Ядвігай і ў 1386 г. быў абвешчаны каралём Польшчы. Цікавы той факт, што ў канцы XIV і пачатку XV ст. Магілёў з воласцю, куды ўваходзіла і частка Чэрыкаўскіх зямель, належаў каралеве Ядвізе.

Хто ж з'яўляўся ўладальнікам гэтых зямель у наступныя часы?

Пазней, у XV ст., Магілёўшчына знаходзілася ў непасрэдным уладанні вялікіх князёў і аддавалася імі ў кіраванне асобаму намесніку[10].

Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Казімір у сваёй грамаце магілёўскім баярам Ілінічам на зямлю ў Магілёве ўспамінае аб намесніках, старцах і мужах магілёўскага замка. Жонка польскага караля Аляксандра Алёна Іаанаўна пацвердзіла гэту грамату ў 1506 г. У ліку іншых зямель Магілёў з воласцю ўваходзіў у склад яе ўладанняў. Пасля смерці Алёны Іаанаўны, у пачатку 1514 г., кароль Жыгімонт I Магілёўскае староства аддаў Георгію Дзеспату Зяновічу ва ўзнагароду за тое, што той ездзіў паслом да Крымскага хана і заключыў саюз. З гэтага старостава ён атрымаў даход каля 1630 коп грошай Літоўскіх. Пасля яго староства было прылічана Жыгімонтам I да свайго Каралеўскага стала. Стэфан Баторый аддаў Магілёўскае староства ва ўтрыманне Слуцкім князям Сямёну і Аляксандру Алелькавічам на правах арэнды пад заклад за суму, узятую ў іх каралём на ваенныя выдаткі[11].

У розныя гады Магілёўскімі старостамі былі: Ян Шчыт, Юрый Шчытовіч, Іван Нарушэвіч, князі Саламярэцкія, Аляксандр Хадкевіч, Ямантовіч, Дзмітрый Халецкі, Леў Сапега і інш[12].

Прыблізна ў гэты ж час да Падняпроўскіх валасцей Віленскага біскупства належаў і замак Крычаў з воласцю, куды ўваходзілі некаторыя Чэрыкаўскія землі. Ён знаходзіўся ў трыманні асобага намесніка, што быў падначалены Віленскаму ваяводзе як вышэйшай інстанцыі. У 1521 г. Жыгімонт аддаў Крычаў «з месцам і з усімі людзьмі воласці Крычаўскае» князю Васілю Сямёнавічу Жылінскаму на тры гады з усімі даходамі «для выбиранья сумы его», а потым «врядом, до его живота». Князь Жылінскі называецца ў актах спачатку намеснікам, а потым дзяржаўцаю[13].

З 1550 г. Крычаўскае староста каралём было «даравана ва ўзнагароду па смерць» спачатку братам Шалухам, потым князю Саламярэцкаму, пасля яго Лукомскаму, графу Весялоўскаму, Пацу, князям Радзівілам, нарэшце маршалу графу Мнішаку.

У 1410 г. гэтыя мясціны наведаў польскі кароль Ягайла[14].

Паводле уніі 1385 г. юрыдычна землі Вялікага княства Літоўскага на вечныя часы прылучаліся да Кароны Польскай, як бы зусім прыпынялася незалежнае існаванне Вялікага княства, і яно рабілася разам з Польшчаю адным палітычным, дзяржаўным арганізмам. Як падкрэслівае У. Ігнатоўскі, «недарма пасля уніі ўсе літоўска-беларускія князі павінны былі прыняць прысягу на вернасць Кароне Польскай, і літоўска-беларускія баяры-каталікі атрымалі такія самыя правы, якія былі ў польскіх паноў»[15]. Аднак гэта унія была зроблена больш на паперы, чым у жыцці. Праўда, ужо адчыняліся дзверы для палітычнага і рэлігійнага ўплыву, але фундаментальнай змены жыцця ў той час не атрымалася.

У 1430 г. вялікім князем стаў Свідрыгайла — праціўнік уніі з Польшчай. Ён апіраўся на падтрымку праваслаўных феадалаў, якім дарыў землі і дзяржаўныя пасады. Але гэта выклікала нездаволенасць літоўскай арыстакратыі, якая абвясціла вялікім князем Жыгімонта Кейстутавіча (1432—1440). У 1440 г. ён стаў ахвярай змовы. Вялікакняская знаць абвясціла вялікім князем Казіміра IV (1440—1492). З яго імем звязана першае вядомае ўпамінанне аб Чэрыкаве ў 1460 г. «У памяць выратавання Каралевы Елізаветы ад утаплення, 20 ліпеня ў дзень Прарока Ільі, Казімір загадаў пабудаваць на Беларусі некалькі цэркваў праваслаўных на берагах рэк Дзвіны, Дняпра і Сожа: у Віцебску, Бешанковічах, Магілёве, Крычаве, Оршы і Чэрыкаве і дараваў гэтым храмам ва ўладанне пераводы». На жаль, пабудаваная ў Чэрыкаве па загаду Казіміра царква не захавалася. Аб яе лёсе паведамляе А. Турчыновіч. Ён піша, што царква згарэла.

Гісторыя Чэрыкаўшчыны, як і ўсёй усходняй Беларусі, з канца XV ст. непарыўна звязана з узвышэннем Маскоўскага княства, якое ў 1480 г. скінула ярмо мангола-татарскай няволі.

Усе дробныя ўдзельныя княствы ўжо страцілі сваю незалежнасць і ўвайшлі ў склад Маскоўскага гаспадарства. «Уладар Маскоўскі кіруе ў сваёй вялікай дзяржаве так, як некалі яго продкі кіравалі ў сваім удзеле — вотчыне,— пісаў у гэтай сувязі У. Ігнатоўскі.— Ён нават лічыць, што ўсе землі славян ёсць яго вотчына. «Вся Русская земля Божиею волею из старины наша вотчина». Маскоўскі князь ужо забыўся, што «из старины» яго вотчынаю быў невялічкі маскоўскі ўдзел. І, пэўна, справа тут не ў старасвеччыне, а ў моцы. Маскоўскі гаспадар мае цяпер вялікую моц, ён лічыць сябе прадстаўніком і ўласнікам усяе Русі»[16]. Як падкрэслівае О. Турчыновіч, «першым непазбежным вынікам гэтага была сутычка з Літвою. Затым, з часоў Іаана III пачынаецца векапомная вайна, вайна, якая цягнулася амаль 150 гадоў, на працягу якіх Літва і Расія ваявалі на жыццё і смерць за Беларусію і вобласць Паўночную; вайна, якая ператварыла ў журботную пустыню большую частку гэтага краю, выратаванага раннім падданствам Літве, магутнасцю Альгерда і Вітальда ад іга Мангольскага.»[17]

«За працяглую вайну былі спустошаны воласці і гарады, «узятыя на шчыт»: ...Магілёў (1515, 1519, 1535, 1564, 1580, 1588, і 1595), Мсціслаў (1502, 1506, 1508, 1514)»[18].

Моцна пацярпелі ад гэтай вайны Крычаў і прылягаючыя да яго землі. Без-Карніловіч прыводзіць пералік паходаў рускіх войск у гэты край.

«У 1508 г. Маскоўскі вялікі князь Васіль Іванавіч пасылаў да Крычава князя Данілу Шчэню і баярына Якава Захар'іча, дзе яны спалілі многа сёл і пасадаў.

У 1508 г. пад Крычавам адбылася кровапралітная сутычка паміж Літоўцамі і Расіянамі.

У 1514, 1515 і 1516 гг. Крычаў папераменна пераходзіў пад уладу Расіян і Літоўцаў: нарэшце застаўся за апошнімі.

У 1535 г. князь Шуйскі спустошыў ваколіцы Крычава[19].

Шмат вёсак, невялічкіх мястэчак былі зруйнаваны у тым ліку і на Чэрыкаўшчыне за часы гэтага змагання. Усё тое, што зрабіла многавяковая праца народных нізоў, гіне ў часы змагання. У гэтай сувязі У. Ігнатоўскі піша: «Зямля зарастае частым лесам. Людзі бадзяюцца па лясах, хаваючыся там ад забойства і рабавання. Прыпыняецца народная творчасць. Насельнікі краю, бачачы, што барацьбе няма канца-краю, кідаюць сваю родную зямлю і бягуць на Украіну. А барацьба ўсё ідзе. Войны аднаўляюцца ў 1516, 1518,1519, 1534 і 1536 гадах. І тая і другая частка, змучаныя змаганнем, робяць зноў згоду, каторая цягнецца толькі 25 гадоў. Пры Іване IV Грозным у 1561 годзе зноў пачынаецца так званая Лівонская вайна, якая таксама адбывалася на тэрыторыі Беларусі.

Дорага каштавала беларускаму працоўнаму народу думка маскоўскіх гаспадароў, што Беларусь ёсць іх «вотчына».

На перыяд войнаў паміж Масковіяй і Вялікім княствам Літоўскім прыпадаюць яшчэ і бедствы для ўсходніх і паўднёвых раёнаў княства, якія прыйшлі з боку крымскіх татар. Як вядома, у другой палове XV стагоддзя на паўднёвых межах Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага з'явіўся моцны і небяспечны вораг — Крымскае ханства. Яно ўтварылася ў выніку распаду калісь магутнай Залатой Арды. Крымскія ханы, татарская вярхушка жылі за кошт пастаянных нападаў на суседнія землі. Войны і рабункі былі заўжды іхнім рамяством і сродкам існавання. Асаблівую каштоўнасць для татараў уяўлялі палонныя, у першую чаргу маладыя і дужыя людзі, якіх яны потым прадавалі на нявольнічых рынках Крыма і Турцыі. Вялікім попытам карысталіся дзяўчынкі, якія папаўнялі ханскія і султанскія гарэмы.

Галоўным аб'ектам для сваіх спусташальных набегаў крымскія ханы абралі багатыя, урадлівыя землі свайго паўночнага суседа — Вялікага княства Літоўскага.

Акрамя прагі нажывы, да спусташальных набегаў іх падштурхоўвала і палітычная прычына: у 1480 г. паміж крымскім ханам Менглі-Гірэем і маскоўскім уладаром Іванам III было заключана пагадненне аб сумеснай барацьбе з Вялікім княствам Літоўскім. Крымскі хан паабяцаў Маскве ваяваць землі Вялікага князя літоўскага Казіміра.

Аднымі з першых пад удар крымчан трапілі землі Пасожжа, Сярэдняга і Верхняга Падняпроўя. Татары палілі гарады і вёскі, рабавалі нажытае дабро, выводзілі ў палон насельніцтва. Набегі на гэтыя землі рабіліся штогод, а часам некалькі разоў на год. Шматлікія мурзы і князі, ханскія сыны, маючы свае ўласныя войскі, рабілі самастойныя набегі. У 1500—1503 гг. Маскоўскі самадзержац Іван III неаднаразова інструктаваў Менглі-Гірэя, каб крымскія войскі накіроўваліся ў бок Вялікага княства, тым самым ён хацеў паслабіць заплечча абароны на ўсходняй мяжы Вялікага княства Літоўскага. Найбольш буйнымі былі набегі крымскіх татар у 1508, 1510, 1521, 1527 гадах.

Радзейшымі і менш адчувальнымі набегі крымчан сталі толькі пасля 1530 г., калі князь Іван Дубровецкі ў чарговы раз разграміў крымскіх наезнікаў*.

---

* Даныя аб набегах крымскіх татар прадставіў А. П. Ярохін.

Землі сучаснага Чэрыкаўскага раёна ў канцы XVI — пачатку XVII ст. Аўтар М. Ф. Спірыдонаў.

Пасля Крэўскай уніі 1385 г., якая не была рэалізавана ў жыццё, пытанне аб аб'яднанні Вялікага княства Літоўскага з Польшчай падымалася зноў і зноў у наступныя гады: 1401, 1413, 1447, 1451, 1453, 1501, 1503, 1564, 1566, 1567. Як відаць з пераліку гадоў, пытанне аб уніі асабліва падкрэсліваецца і вымагаецца жыццём у 60-я гады XVI ст. Галоўнай з прычын гэтага з'явіўся той польскі сацыяльны і палітычны ўплыў, якому былі адчынены дзверы на тэрыторыю Вялікага княства актам 1386 г. Апрача таго, на унію з Польшчай гоніць і націск з усходу, з боку Маскоўскай дзяржавы. Гэты націск робіцца асабліва моцным якраз у 60-я гады XVI ст., калі ў Маскве развіваецца апрычніна. Ратуючыся ад тэрору Івана IV Грознага, уладары Вялікага княства Літоўскага апошні раз падпісалі унію з Польшчай. Гэта адбылося 1 ліпеня 1569 г. У гісторыі яна вядома як Люблінская. Гэта унія скончыла незалежнае самабытнае існаванне Вялікага княства Літоўскага, якое стала складовай часткай Рэчы Паспалітай. (Трэба адзначыць, што грошы ў Рэчы Паспалітай і ў Вялікім княстве былі асобныя, таксама захавалася асобнае войска, заканадаўства, урад на чале з канцлерам вялікім літоўскім, Вялікае княства збірала і свае асобныя сеймы, мела межы і мытні, свой герб[20].)

Да гэтага часу адбыліся змены і на адміністрацыйнай карце Вялікага княства Літоўскага. Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1565 г. былі ўтвораны новыя ваяводствы, у тым ліку і Мсціслаўскае. Яно ўключала ў сябе тэрыторыі Мсціслаўскага, Чэрыкаўскага, Клімавіцкага, Магілёўскага, Чавускага, частку Быхаўскага раёнаў, а таксама Краснаполле і Радзівілава. Суседнія гарады Рагачоў, Чачэрск і Гомель таксама былі цэнтрамі старостваў, але яны ўваходзілі ў склад Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства, Прапойск — Быхаўскага павета таго ж ваяводства. У канцы XVI ст. чэрыкаўскія вёскі Лобча, Азёры і Чудзінавічы ўваходзілі ў Прапойскае, Вепрын і Глінь — Мсціслаўскае, Паходавічы, Нарковічы, Вудага, Чэрыкаў — у Магілёўскае староствы (гл. карту). Пасля Турэцкай вайны 1621 г. кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Аляксандру Сапегу, старосце Аршанскаму, ва ўзнагароду за заслугі даў староствы: Чачэрскае і Прапойскае [21]. Такім чынам, частка Чэрыкаўскіх зямель стала належаць яму.

Дзяржаўная Люблінская унія забяспечвала для Польшчы палітыка-сацыяльны і часткова культурны ўплыў на Беларусь. Але быў яшчэ адзін факт у жыцці злучаных дзяржаў, які ставіў перашкоды для скасавання асобнага твару Вялікага княства: у Польшчы панавала заходняе хрысціянства, каталіцтва, на Беларусі — праваслаўная вера. Гэты факт, апроч таго, збліжаў Беларусь з праваслаўнай Масковіяй і ставіў яе ў іерархічную залежнасць ад маскоўскага патрыярха, з чым Польшча не магла згадзіцца. За уніяй дзяржаўнай павінна было падняцца пытанне і аб царкоўнай уніі.

Тут будзе дарэчы ўспомніць аб каталіцкім уплыве на праваслаўнае насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, нават і ганенні на праваслаўную веру. Асабліва яны ўзмацняюцца, калі на польскі трон у 1587 г. уступіў Жыгімонт III, які «не адрозніваўся хрысціянскай верацярпімасцю. Нарэшце, у 1595 г. учынілася і славутая Унія: Кіеўскі мітрапаліт і пять епіскапаў падначалілі сябе Папе. З гэтага часу пачалося яўнае праследаванне праваслаўных»[22].

Каталіцтва давала права для заняцця вышэйшых урадавых пасад. На падставе пашырэння уніяцтва і каталіцтва вырастае шмат злачынстваў. Напрыклад, у сваёй прамове на сейме у 1620 г. пасол сейма Лаўрык Дравінскі падкрэсліў, што людзі праваслаўнай веры не маюць магчымасці жыць у гарадах, купцы не маюць права гандляваць, рамеснікі — запісвацца ў цэхі і г. д.[23]

12 студзеня 1650 г. Ян Казімір аб'явіў аб вяртанні праваслаўным некаторых цэркваў, якія былі раней адабраны уніятамі. Аднак ганенне на праваслаўе працягвалася і ў другой палове XVII і нават у XVIII ст. Бедствы ад яго цярпелі, безумоўна, і жыхары Чэрыкаўшчыны. Закрываліся праваслаўныя цэрквы, рабавалася іх маёмасць, у манастырах трымалі жывёлу. На карысць уніі быў адабраны Ануфрыеўскі манастыр. У канцы XVII ст. у с. Язёры была знішчана праваслаўная царква Пятра і Паўла. Прыхаджане спрабавалі абараніць царкву, але былі жорстка пакараны «камісарамі», якія прыехалі з Вільна. Царква гэта была разабрана па бярвёнах. У пачатку XVIII ст., а дакладней у 1724 г., уніятам была перададзена праваслаўная царква ў Чэрыкаве. Аднак прыхаджане гэтай царквы не прынялі ўніяцтва, а пачалі хадзіць у бліжэйшую праваслаўную царкву. У наступныя гады на карысць уніі былі адабраны праваслаўныя цэрквы: 7 мая 1733 г.— у м. Маляцічы, 15 сакавіка 1742 г.— у с. Кашаны, 10 мая гэтага ж года — у с. Верамейкі, 6 сакавіка 1743 г.— у с. Добрае, 20 студзеня 1744 г.— у с. Краснаполле, 5 кастрычніка 1745 г.— дзве царквы у м. Крычаў, 28 студзеня 1746 г.— у с. Красовічы, у маі 1747 г.— у с. Студзянец і г. д. Праваслаўныя свяшчэннікі падвяргаліся праследаванням. Іх пазбаўлялі маёмасці, адбіралі грошы, саджалі ў турмы[24].

Гонячыся за тымі эканамічнымі, сацыяльнымі і палітычнымі карысцямі, якія абяцала прыняцце каталіцтва, некаторыя прадстаўнікі шляхты Вялікага княства Літоўскага паступова пачалі пераходзіць у каталіцкі лагер. Атрымаўшы палітычныя правы і каталіцкую веру, яны пачалі пераймаць і польскі лад жыцця. Польскія звычаі і мова сталі іх ідэалам. Але доўга яшчэ ўрадаваю, дзяржаўнаю мовай на Беларусі заставалася беларуская мова. У гэтым, відаць, ёсць і некаторая заслуга уніяцкай царквы, якая, захаваўшы амаль цалкам усходнюю абраднасць, не перайшла на польскую ці лацінскую мовы. Як падкрэслівае У. Ігнатоўскі, «асобныя групы на Беларусі на працягу данага перыяду не паддаваліся польскаму культурна-нацыянальнаму, рэлігійнаму і сацыяльнаму ўплыву. Завязалася нацыянальна-культурная і нацыянальна-сацыяльная барацьба. У барацьбе гэтай прынялі ўдзел царкоўныя брацтвы і казацтва». У XVII ст. на шлях шырокай грамадзянскай працы выступаюць і брацтвы Магілёўшчыны. Яны існавалі ў Магілёве, Крычаве, у іншых гарадах.

Казацтва вядома яшчэ з канца XVI ст. Яно злажылася на паўднёвай ускраіне Рэчы Паспалітай і атрымала назву ўкраінскага, аднак аб'яднала ў свае рады і беларускіх беглых мужыкоў, якія супраціўлялі-

ся сацыяльна-эканамічнаму, нацыянальнаму і рэлігійнаму ўціску. Асабліва моцна казацкі рух разгарэўся ў 1648 г. пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Ён ускалыхнуў поўдзень і ўсход Беларусі. Ніжэйшыя станы, якія спадзяваліся дабіцца лепшай долі, спачувалі ім. Шляхта глядзела на паўстанне са страхам і абурэннем. Паўстанцы выразалі шляхціцаў, палякаў, не шкадуючы нават старых, малых, жанчын. Вялікія спусташэнні былі зроблены імі пад Магілёвам, Мсціслаўлем. На барацьбу з паўстаўшымі былі накіраваны войскі пад камандаваннем гетмана Януша Радзівіла. Пайшла барацьба, якая была вельмі крываваю[25]. У жніўні 1648 г. атрады казакоў і сялян пад кіраўніцтвам Крывашапкі ўвайшлі ў Чэрыкаў і адсюль грамілі шляхецкія памесці. У гэтым жа годзе ў Чэрыкаве адбылося паўстанне гараджан.

У раёне Старога Быхава, Чачэрска і Чэрыкава дзейнічалі паўстанцкія атрады Гаркушы і Падабайлы. Аднак, карыстаючыся недастатковай арганізаванасцю і раз'яднанасцю паўстанцаў, урадавыя войскі пачалі супраць іх разгорнутае наступленне. Ужо к канцу кастрычніка ў Чэрыкаў былі накіраваны войскі магнатаў Паца і Друцкага-Горскага[26]. Паўстанне было падаўлена. У пачатку 1649 г. зноў успыхнула паўстанне жыхароў Чэрыкава. Яно было таксама люта падаўлена ўрадавымі войскамі. 16 сакавіка гэтага ж года вяземскі ваявода пісаў цару Аляксею Міхайлавічу: «Ляхі ў тых гарадах беларусцаў усіх пасеклі і стаяць у тых гарадах ляхі абозамі». У часы кіравання польскага караля і вялікага князя літоўскага Яна Казіміра і маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча зноў пачаліся войны паміж Масквою і Рэччу Паспалітаю.

У 1654 г. рускія войскі ўступілі на тэрыторыю Беларусі, і «злашчасны Магілёўскі край зноў падвергся спусташэнням і такім жа жорсткім, як і ў вайну XVI стагоддзя». Асабліва пацярпеў г. Крычаў і тэрыторыя вакол яго. Вось што паведамляе аб гэтым А. С. Дамбавецкі: «Пастаўленыя каралём Дзяржаўцы Крычава былі настолькі вядомы сваім вераломствам, што пастаянна атрымлівалі напамінак,— не рабіць ніякай зачэпкі да парушэння спакою. Не падпарадкоўваючыся каралеўскім унушэнням, пастаянна зневажаючы маскоўскіх ваявод, крычаўцы жорстка паплаціліся за гэта. Горад іх, які квітнеў гандлем, асабліва са Смаленскам, карыстаўся Магдэбургскім правам, быў спустошаны і спалены Рускімі. З канца XVII стагоддзя Крычаў ужо не паднімаўся болей»[27]. Аб моцным разарэнні сялян Крычаўскага, Мсціслаўскага, Чавускага і Чэрыкаўскага паветаў паведаміў цару Аляксею Міхайлавічу ў пісьме ад 12 мая 1655 г. наказны гетман Іван Залатарэнка. У гэтым жа пісьме ён піша цару аб далучэнні жыхароў названых паветаў да рускага гаспадарства. За ваенныя заслугі перад царом вёскі «Вербеж з млынам, Глінь, Удоўск, Шароеўка, Паходавічы, Лабанаўка» і іншыя былі падараваны Мікалаю Кгельдзе[28]. Падставай для гэтага паслужыла чалабітная Аляксею Міхайлавічу, датаваная 13 снежня 1654 г.

Руйнаванне Беларусі ішло 13 гадоў. У руках маскоўскага гаспадара апынуліся Магілёўшчына, Віцебск, Менск, іншыя беларускія гарады. «У час гэтай вайны Вялікае княства страціла кожнага другога жыхара. Менавіта ў выніку гэтае вайны ўзмацніліся польскія і каталіцкія ўплывы на Беларусі, а старабеларуская мова перастала быць дзяржаўнаю у Вялікім княстве Літоўскім»,— сцвярджае ў сваім каментарыі да «Кароткага нарыса гісторыі Беларусі» У. Ігнатоўскага Анатоль Сідарэвіч[29]. Вайна з Ра-

сіяй скончылася Андрусаўскім перамір'ем, якое было падпісана 30 студзеня 1667 г. у в. Андрусава, што на мяжы Смаленскага і Мсціслаўскага паветаў. Паводле ўмоў перамір'я Правабярэжная Украіна і Беларусь засталіся ў складзе Рэчы Паспалітай.

К канцу вайны Расіі з Рэччу Паспалітай, а дакладней к 1667 г., адносіцца прывілея Яна Казіміра, якая прадстаўляе інтарэс для тых, хто цікавіцца пытаннямі землеўладання на Чэрыкаўшчыне. Гэтай прывілеяй Чавусы і Чэрыкаў, якія належалі раней Мсціслаўскай каралеўскай эканоміі, былі аддадзены ва ўладанне Васілю Красінскаму[30].

Многа бедстваў цярпелі сяляне і ад пастояў каралеўскіх і магнацкіх вайсковых фарміраванняў (харугваў). Гэтыя пастоі патрабавалі ад прыгоннага селяніна дадатковых выдаткаў са сваёй гаспадаркі ў залік так званай стацыі — павіннасці ў выглядзе прадуктаў харчавання, жывёлы ці грошай. Акрамя таго, жаўнеры харугваў адкрыта рабавалі мясцовае насельніцтва. Вось, напрыклад, ёсць даныя, што ў 1691 г. ў вёсцы Вепрын бачылі двух халопаў Рафея і Міхала, якія салдатамі пана Коркуця былі збітыя, скалечаныя, зраненыя. Яны ляжалі ўжо на смертным одры. У тым жа Вепрыне два халопы Пётр і Восіп жаўнерамі паноў Кулакоўскага і Скрэтуцкага на смерць збітыя. Тут таксама было нямала хат пустых, з якіх людзі падчас кватаравання жаўнераў былі вымушаны разысціся, не сцярпеўшы гвалтаў і мардавання. У 1696 г. у вёсцы Зоры жаўнеры сагналі ўсіх мужчын ў вялізны хлеў і зачынілі. Трымалі іх там пад аховай цэлых тры дні. За гэты час жаўнеры-рабаўнікі канфіскавалі ў сялян усё збожжа, грошы, гаспадарскія прылады і ўвогуле, што толькі магло ім прыдацца. На чацвёрты дзень, калі вёска была поўнасцю разрабавана, зняволеных прыгонных па аднаму выпускалі з хлява-турмы, клалі на зямлю, няшчадна білі бізунамі і прымушалі прысягаць у тым, што яны не будуць звяртацца да князя са скаргамі на харугву[31].

Рабаўніцтва жаўнерамі харугвы гетмана Вялікага княства Літоўскага, якое было ўсчынена ў дачыненні да сялян вёсак Дубяйцы і Крывая Ніва, з'явілася прычынай сялянскіх выступленняў, якія ў 1690—1691 гг. ахапілі тэрыторыю цяперашніх Касцюковіцкага, Краснапольскага, Крычаўскага і Чэрыкаўскага раёнаў. Харугва гэтая мела благую славу і займалася хабарніцтвам і ліхадзействам. Калі жаўнеры з'явіліся ў Дубяйцах, сяляне адразу ж адмовіліся ўзяць іх на пастой, аднак самаўпэўненыя паны-жаўнеры не прынялі гэты пратэст сялян у разлік. Тады ўзброеныя дубальтоўкамі сяляне напалі ноччу на жаўнераў, якія спалі ў вясковай пуні. Халопы лупілі жаўнераў дубовымі каламі і ручніцамі. Справа скончылася тым, што сяляне, павязаўшы няўдачлівых ваяк-хабарнікаў, зачынілі іх да раніцы ў лазні, а потым, на досвітку, выгналі іх з ганьбай з вёскі.

Дабраўшыся праз два дні пешшу да Крычава, жаўнеры далажылі свайму старшаму пану Канажэўскаму аб тым, што з імі адбылося. У той жа дзень у Дубяйцы быў накіраваны конны атрад жаўнераў для ўціхамірвання бунтаўшчыкоў. Але дубянецкія сяляне, уз'яднаўшыся з жыхарамі суседняй вёскі Крывая Ніва, з засады разгромілі асноўную частку гэтага коннага атрада і пачалі праследаваць яго па дарозе на Крычаў. На паўшляху паміж Дубяйцамі і Крычавам сялянская пагоня сустрэла самога Канажэўскага, які сабраў чэлядзь і вырашыў асабіста ўдзельнічаць у расправе над сялянамі. Пачалася бойка. У ход пайшла зброя, і сяляне вымушаны былі адступіць.

Доўгі час ні жаўнеры, ні сам пан

Канажэўскі не паказваліся ні ў Дубяйцах, ні ў Крывой Ніве. У хуткім часе сялянскія хваляванні пачаліся і ў вёсках Брацькавічы, Відуйцы, Вепрын і іншых. Для ўсмірэння сялян Радзівілы кінулі новыя войскі. Летам 1691 г. паўстанне ў названых вёсках было задушана. Многія яго ўдзельнікі былі пакараны смерцю, а вёскі і іх маёмасць разрабаваны[32].

Вялікім бедствам падверглася Чэрыкаўшчына і ў пачатку XVIII ст. Полымя Паўночнай вайны (1700—1721) абпаліла і тутэйшы край. «Зноў нашы продкі паплаціліся за чужыя інтарэсы. Пётр, каб лепш падрыхтавацца да вайны ў сваіх межах, паслаў войскі на Беларусь, каб яны тут затрымлівалі шведаў... Зноў руйнаваліся гарады і вёскі Беларусі, гінулі людзі»[33]. За гады Паўночнай вайны Беларусь страціла каля 700 тыс. чалавек насельніцтва. 7 ліпеня 1708 г. авангард войск шведскага караля Карла XII уступіў у Магілёў. Тут ён прабыў каля месяца, а 4 жніўня, пераправіўшыся цераз Дняпр і дачакаўшыся прыходу ўсіх сваіх часцей, пайшоў да Чэрыкава. У гэты час Пётр I «з паловаю пяхоты прыбыў у Мсціслаў», дзе і даведаўся, што «Карл з часткаю войска, другую адправіўшы да Гомеля, пайшоў да Чэрыкава. Пётр рушыў за ім і ... агледзеўшы тутэйшыя балоты, сам выбраў пераправу і войска сваё перавёў[34]. Калі Карл даведаўся аб перамяшчэнні рускіх войск, ён зрабіў спробу навязаць Пятру генеральны бой. З гэтай мэтай ён павярнуў войскі ад Чэрыкава да Мсціслаўля.

28 жніўня руская армія сканцэнтравалася каля в. Добрае, а 30 жніўня 8 батальёнаў атакавалі шведскі авангард.

Бой працягваўся дзве гадзіны. Шведы не вытрымалі. Аб выніку бітвы Пётр I пісаў сваім прыбліжаным:

«По двучасном непрестанном огне Голицин и Флюк неприятелей сбили и с 3000 трупов, кроме раненых, положили знамена и прочее подобрали. Потом король шведский сам на сикур пришел, однако же наши отошли от них, кроме разорения строю. Надежно вашей милости пишу, что я как почал служить, такого огня и порядочного действия от наших солдат не слыхал и не видал (дай боже и впредь так!) и такого еще в сей войне король Шведский ни от кого сам не видал»[35].

Так быў нанесены першы ўдар па авангарду шведскай арміі. 7 верасня 1912 г. чэрыкаўскі павятовы спраўнік пісаў у губернскае ўпраўленне ўнутраных спраў: «Каля сяла Добрае Маляцікай воласці ў 1708 годзе адбылася бітва рускіх са шведамі, на месцы бітвы засталіся тры земляныя акопы»[36].

Яшчэ адна вядомая ў перыяд Паўночнай вайны бітва адбылася паблізу Чэрыкаўскіх зямель. 28 верасня 1708 г. рускія войскі каля в. Лясная (зараз у Слаўгарадскім раёне) разбілі шведскі атрад генерала А. Левенгаўпта, які рухаўся з Рыгі на злучэнне з асноўнымі сіламі арміі Карла XII. Атрад гэты налічваў 15 тыс. чалавек, меў абоз з прадуктамі харчавання і амуніцыяй. Бітва працягвалася пяць гадзін з пераменным поспехам. Калі прыбыў атрад генерала Р. Х. Баура, ход бітвы вырашыўся на карысць рускіх. Шведы страцілі забітымі 8,5 тыс. чалавек, пакінулі параненых, артылерыю і частку абозу. Бой пад Лясной Пётр I назваў «маці Палтаўскай баталіі».[37]

Аб пакутах, якія выпалі на долю жыхароў усходняй Беларусі, у тым ліку і продкаў сучасных чэрыкаўлян, у выніку ваенных дзеянняў на гэтай тэрыторыі на працягу некалькіх стагоддзяў, з горыччу расказаў М. В. Без-Карніловіч.

«Белоруссия одинаково страдала от опустошения, произведенного войсками враждовавших между собою сторон. Не

менее ей были бедственны войны: Царя Иоанна Васильевича с Польским Королем Сигизмундом Августом и Стефаном Баторием, Царя Михаила Феодоровича с Сигизмундом III и Владиславом IV, Царя Алексея Михайловича с Иоанном Казимировичем, Императора Петра Великого с Карлом XII. В эти-то смутные периоды разоренные жители, лишенные домашнего счастья и покоя, в дремучих лесах искали для себя спасения и приюта; многие их тысячи погибли от меча, болезней, голода, язвы; пожары истребили памятники древности, архивы, акты, летописи.

Белоруссия — страна, где мечом решались споры враждовавших народов между собою; в ней каждая верста была оспариваема мужеством, куплена кровью, ознаменована славою! Эту землю можно назвать обширным кладбищем бесчисленного числа побитых, сражавшихся за веру, права своих властителей, их честь и достояние: селищем мирных жителей — несчастных жертв войны, нашедших себе последний спокойный приют в недрах той самой земли, на которой в первый раз взглянули на свет божий»[38].

Закранула Чэрыкаўшчыну і паўстанне ў Крычаўскім старостве. Андрэй Меер пісаў: «Пры княгіні Радзівілавай здарылася вядомае народная замяшанне, якое працягвалася з 1740 па 1743 год і ў якім не малая колькасць яўрэяў і супраціўляўшыхся бунтаўшчыкам мяшчан ад сваіх жа пабіты былі». Паўстанне ўзначалілі Васіль Вашчыла і яго найбліжэйшыя паплечнікі Іван Карпач, Стась Бачко, Васіль Вецер і іншыя. Доўгія гады сяляне вялі ўпартую барацьбу супраць самавольства адміністрацыі старостава і арандатараў. Кульмінацыйнага пункту хваляванні дасягнулі ў канцы 1743 г. Каб разграміць паўстаўшых, Радзівіл 15 студзеня 1744 г. накіраваў у мяцежныя раёны войскі. «У студзені месяцы каля сярэдніх чысел прысланы ад князя палкоўнік празваннем Пястжэцкі з немалой колькасцю воінскіх людзей, каторы у гарадку Крычаве з камандаю сваёй спыніўся»[39]. У той час галоўныя сілы паўстаўшых знаходзіліся ва ўсходняй частцы староства за р. Сож. 18 студзеня яны падышлі да Крычава і атакавалі горад. Але сілы былі няроўныя, і паўстаўшыя вымушаны былі адступіць. У час бою больш за 100 паўстанцаў загінула, 500 было паранена і 77 узята ў палон[40]. У в. Царкавішча сяляне разбілі новы лагер, у які пачалі ісці людзі. Іх колькасць за кароткі час дасягнула амаль 4 тыс. Але ў ноч на 26 студзеня на лагер нечакана напалі атрады Пястжэцкага. Сяляне адступілі, пакінуўшы на полі бою больш за 200 забітых і шмат параненых; 176 чалавек, у тым ліку і некалькі кіраўнікоў паўстання, трапілі ў палон. «Многіх пакаралі, вешаючы за рэбры, ці садзілі на кол. Вашчыла збег у Маларусію».[41]

Сярэдзіна XVIII ст.— час заняпаду федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай. Асабліва абвастрыўся эканамічны і палітычны крызіс у пачатку 70-х гадоў. Гэта прывяло да таго, што ў 1772 г. адбыўся I падзел Рэчы Паспалітай паміж трыма дзяржавамі: Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй. Для ўсходніх зямель Беларусі, у тым ліку і для Чэрыкаўшчыны, пачаўся новы гістарычны этап — яны былі далучаны да Маскоўскай дзяржавы.

[1] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўскай вобласць. Мн., 1986. С. 368.

[2] Ерамаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды. Мн., 1990. С. 196—197, 203—204.

[3] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся. Спб., 1855. С. 184.

[4] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі//Імя тваё Белая Русь. Мн., 1991. С. 210.

[5] Опыт описания Могилевской губернии/ Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1. Могилев, 1882. С. 20.

[6] Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды. Мн., 1990. С. 229—300.

[7] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белорусии... Спб., 1855. С. 184—188.

[8] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі//Імя тваё Белая Русь. Мн., 1991. С. 235.

[9] БелСЭ. Т. 6. Мн., 1972. С. 491.

[10] Любавский М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания Первого Литовского Статута. М., 1892.

[11] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1885. С. 154.

[12] Живописная Россия. Т. III. Спб. 1882. С. 403.

[13] Любавский М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания Первого Литовского Статута. М., 1892.

[14] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 217.

[15] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі//Імя тваё Белая Русь. Мн., 1991. С. 243—244.

[16] Тамсама. С. 248.

[17] Турчинович О. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. Спб., 1857. С. 115, 116, 284.

[18] Опыт описания Могилевской губернии/ Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1, Могилев, 1882. С. 36.

[19] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 217.

[20] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі/Імя тваё Белая Русь. Мн., 1991. С. 250—251, 266.

[21] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 216.

[22] Турчинович О. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. Спб., 1857. С. 201.

[23] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі//Імя тваё Белая Русь. Мн., 1991. С. 290.

[24] Бантышем-Каменский Н. Историческое известие о возникшей в Польше Унии. Вильна, 1866. С. 70—79, 128, 261—262, 361, 371, 374—375, 379, 381.

[25] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі//Імя тваё Белая Русь. Мн., 1991. С. 292—293, 301.

[26] Вопросы истории. 1954, № 5. С. 32—43.

[27] Опыт описания Могилевской губернии/ Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1. Могилев, 1882. С. 49—50.

[28] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 14. Присоединение Белоруссии (1654—1655). Спб., 1889. С. 450.

[29] Імя тваё Белая Русь. Мн., 1991. С. 308.

[30] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1705, воп. 1, сп. 14, л. 921—924.

[31] Мялешка В. І., Лойка П. А. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Вашчылы Мн., 1988. С. 16—17, 33.

[32] Ярохін А. Сялянскае паўстанне//Чырвоны сцяг. 1989. 14, 16 верасня.

[33] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі//Імя тваё Белая Русь. Мн., 1991. С. 309.

[34] Пушкин А. С. История Петра I//Пушкин А. Исторические заметки. Л., 1984. С. 341—342.

[35] Тельпуховский Б. С. Северная война 1700—1721. Полководческая деятельность Петра I. М., 1946.

[36] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2187, воп. 1, спр. 78.

[37] БелСЭ. Т. 6. Мн., 1972. С. 479.

[38] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 17—18.

[39] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. I. Мн., 1936. С. 634.

[40] БелСЭ. Т. 6. Мн., 1972. С. 150.

[41] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 218.

С. Кагадзеева.

З АПІСАННЯ ГРАМАТЫ СТЭФАНА БАТОРЫЯ, ЗРОБЛЕНАГА Е. РАМАНАВЫМ У ЗБОРНІКУ «МОГИЛЕВСКАЯ СТАРИНА»

Грамата Стэфана Баторыя ад 1 сакавіка 1581 г., якая была дадзена Васілю Няміры ў пацвярджэнне яго праў на ўладанне сяльцамі Галавенчыцы, Цёплае і Любаны.



Грамата Стефана Баторія 1 марта 1581 года, данная Василію Немирѣ въ подтвержденіе правъ его на владѣніе сельцами Головенчицы, Теплое и Любаны.

Подлинник этой грамоты писан на пергаментном листе, в 16 в. длиною и $6^1/_2$ шириною. При документе была висячая печать, но она уничтожена; в листе имеются четыре отверстия от шнурков печати. Документ писан по-русски, хотя писался в Варшаве. Строки расположены параллельно длинным сторонам листа. Всех строк, кроме титульных и подписей, 18. Они занимают 10 вер. в длину и $5^3/_4$ в ширину. Почерк обыкновенный для XVI века, скорописный, смешанный с славянским полууставом, очень разборчивый. Но так как документ имеет пять вертикальных изгибов и два горизонтальных, то многие слова на изгибах истерлись и едва заметны. Впрочем, нами не могло быть прочитано только одно слово, обозначенное в тексте многоточием.

В документе речь идет о трех пунктах нашей губернии: Головенчицах чаусского уезда, Теплом — быховского и Любанах — чериковского. Они были отданы Немире королем Сигизмундом Августом, и настоящим документом Стефан Баторий подтверждает права Немиры на владение названными «сельцами». Документ, таким образом, имеет значение для истории землевладения в нашей губернии. Кроме того, он имеет и некоторый общеисторический интерес, так как в нем заключается упоминание об известной ливонской войне, об отнятии у Ивана Грозного Полоцка, Невеля, Великих Лук.

Весь документ написан на западнорусском актовом языке того времени; подпись Сапеги тоже русская. Король подписался по-латыни. На обороте имеются две надписи: одна року 1625, также русская (совершенно выцвела), и другая 1704 г.— Польская, когда имения Немиры уже принадлежали «чаусовскому кармелитанскому конвенту».

Е. Романов.

Могилевская старина. Вып. 1. Могилев, 1900.

ПІСЬМО НАКАЗНОГА ГЕТМАНА ІВАНА ЗАЛАТАРЭНКІ ДА ГАСУДАРА: ПРАСІЦЬ АКАЗАЦЬ МІЛАСЦІНУ ЖЫХАРАМ ПАВЕТАЎ ЧАВУСКАГА, ЧЭРЫКАЎСКАГА, МСЦІСЛАЎСКАГА І КРЫЧАЎСКАГА, СПУСТОШАНЫХ ВАЙНОЮ

12 мая 1655 г.

Список з белоруского писма, что писал к великому государю царю и великому князю Алексею Михайловичю, всеа Великия и Малыя России самодержцу, наказный гетман Иван Золотаренко в нынешнем в 163 году, мая в 26 день, с Кричевцы.

Божиею милостию, великому государю царю и великому князю Алексею Михаиловичю, всеа Великия и Малыя России самодержцу *(полный титул)* Иван Микифорович, гетман наказной войска вашего царского величества запорожского, униженный челобитный свой поклон под ноги вашего царского величества, яко верный и желателный подданный, смиренно отдаю.

Аще так Господь Бог, по милости своей святой, строити волит над народом православным християнским, которые по вся времяны в великой кручине и разоренье пребывают со всех сторон; однако воля Его святая на всех да будет. Где и тот повет Чеуский, Черяковский, Мстиславский, Кричевский, который был под крепкою высокою рукою вашего царского величества, на вечное и верное подданство и присягу учинили вашему царскому величеству. А что за наступленьем воиска неприятелей и недругов вашего царского величества в те краи, не имеючи так вскоре где приклонитися, з женами и з детми и со всеми пожитки своими пребывали в домах своих, и хотя не из воли, но вяшще по неволе имели врагом и недругом вашего царского величества послугу отдавати; ныне же все единако поддалися под крепкую высокую руку и на верное и вечное подданство вашему царскому величеству, о которых и я, нижайший слуга вашего царского величества, челобитье свое приношу пред пресветлый престол вашего царского величества: изволь ваше царское величество быти милостив на оных бедных и разореных, что не имеют где голов своих поклонити; толко от вашего царского пресветлого престола милости желают и слезно молят вашего царского величества о присланье воеводы до тех мест, чтоб не могли в неволю попасти за наступлением войск от вашего царского величества. При том дай Христе Царю, чтоб есмя ваше царское величество в добром здоровье победителя над неприятели зрели, поспешеством Спасителя нашего Иисуса Христа. Дан из табору из-под Быхова Старого, лета 1655, мая в 12 день.

Вашего царского величества верный слуга и желательный подданный, Иван Микифорович, гетман вашего царского величества запорожского.

И то вашему царскому величеству известно чиним, что мещаня кричевские, как присягу учинили вашему царскому величеству на верное и вечное подданство, и до того времени правдиво додержали, неприятелем и недругом вашего царского величества никакие услуги не отдавали.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 14. Спб., 1889. С. 637—640.

ГАСУДАРАВА ГРАМАТА НАКАЗНОМУ ГЕТМАНУ ІВАНУ ЗАЛАТАРЭНКУ: КРЫЧАЎСКІ ПАВЕТ ВЕДАЦЬ ЯМУ, НАКАЗНОМУ ГЕТМАНУ, А ЧАВУСЫ І ЧЭРЫКАЎ МАГІЛЕЎСКІМ ВАЯВОДАМ

26 мая 1655 г.

Божиею милостию, от великого государя царя и великого князя Алексея Михаиловича, всеа Великия и Малыя России самодержца, и многих государств государя и обладателя, вашего царского величества, войска запорожского наказному гетману Ивану Залотаренку и всему войску запорожскому, при тебе Иван будучему, вашего царского величества милостивое слово. В нынешнем во 163 году, мая в 26 день, писал к нам великому государю, к нашему царскому величеству, ты гетман наш наказный с Кричевцы, с шляхтичем с Юрьем Малаховским да с мещанином с Яковом Алексеевым с товарыщи, что повет Чеушский, Черяковский, Мстиславский, который был под нашею царского величества высокою рукою в вечном и верном подданстве, и за наступлением войска неприятелей и недругов наше-

го царского величества в те краи вскоре з женами и с детми и со всеми пожитки своими приклонитися не имели и в домах своих пребывали, и хотя не из воли, но по неволе имели врагом и недругом нашего царского величества послугу давати; и ныне они все единако поддалися под крепкую и высокую руку нашего царского величества на верное и вечное подданство: чтоб нам великому государю пожаловати их, велети к ним послати наших царского величества приказных людей. И мы великий государь указали Кричев и Кричевский уезд ведати тебе и послати от себя кого пригож, для ведомости и для обереганья; а Чаусы и Черяков наперед сего были Могилевского уезду, и ныне указали ведать и оберегать из Могилева столнику нашему и воеводам Юрью Ивановичю Ромодановскому с товарыщи; а Мстиславский уезд оберегать из Мстиславска. И тебе б, послать в Кричев от себя кого пригож и велеть их оберегать и ведать во всем. А кричевского шляхтича и мещан, пожаловав нашим жалованьем, отпустили к тебе не задержав. Писан в нашем царском стану в деревни Лежнине, лета 7163, маия в 26 день.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 14. Спб., 1889. С. 639—640.

З «МАГІЛЁЎСКАЙ ХРОНІКІ» ТРАФІМА РАМАНАВІЧА СУРТЫ І ЮРЫ ТРУБНІЦКАГА*

У гэтым жа годзе [1681]. Перад Дзесятаю Пятніцаю гаспадарылі страшныя перуны; у Камаровічах, пад Крычавам, забіта рагатага быдла штук 113, што мы самы бачылі. У гэтым жа годзе ў Маляцічах у возеры выбіты ляшчы, і кожны ў правы бок. Што ўсё, як быдла, так і рыба, каб не смярдзелі, пазакопвана ў зямлю.

Года 1699. Месяца студзеня 11-га па-рымску прыйшоў да Магілёва з загадам ад караля ягамосці Аўгуста Першага генерал дэ Бэўст і з ім дванаццаць карнетаў саксонскага войска. Сам, лоўка выгнаўшы Перуту, таксама немца, які быў пакінуты ў магілёўскім замку ад іх мосцяў паноў Сапегаў, стаў у замку, а ўсё войска стала па эканоміі, зімавалі ў Чавусах і Чэрыкаве...

...У гэтым жа годзе [1699] месяца чэрвеня, па Святым Духу, падобна ад немцаў-саксонцаў, бо былі нездаровымі, у Чэрыкаве і па іншых вёсках заразіліся людзі паветрам і нямала людзей павымірала.

Полымя. 1992. № 7.

ПАЦВЯРДЖАЛЬНАЯ ГРАМАТА ПРАЎ І ПЕРАВАЖНАСЦЯЎ ЯЎРЭЯМ МЯСТЭЧКА ЧЭРЫКАВА, ДАРАВАНАЯ ПОЛЬСКІМ КАРАЛЁМ АЎГУСТАМ II

28 сакавіка 1720 г.

Божиею милостию Август второй... Объявляем сею нашею подтвердительною привилегиею что гг. члены совета и придворные сановники наши ходатайствовали пред нами, дабы мы права, дарованныя б. п. всепресветлейшим предместником нашим королем польским Владиславом IV неверным евреям, жителям местечка нашего Черикова, во всех пунктах одобрили и утвердили, которых сущность в следующем: Божиею милостию Владислав IV... Объявляю сею нашею грамотою, что ходатайствовали пред нами о выдаче в экстракт из книг канцелярии нашей в. к. лит. дела, которого, после титула нашего, содержание следующее: Объявляем сею нашею грамотою, кому о том знать следует, что некоторые члены совета и придворные сановники наши ходатайствовали пред нами, дабы мы их (евреев м. Черикова), в то время вновь еще поселившихся в упомянутом местечке, на основании, подлинной нашей привилегии, дарованной во время благополучно совершившейся коронации нашей всем евреям, жительствующим в в. к. лит. сравнили

* «Магілёўская хроніка» Трафіма Раманавіча Сурты і Юры Трубніцкага — выдатны помнік пісьменства Беларусі першай паловы XVIII ст. Праз гады і ліхалецці дайшла яна да нашага часу ў рукапісе, які зрабіў сын Трубніцкага — Аляксандр. Аўтары «Хронікі...» — магілявяне, прыхільнікі праваслаўя, беларусы па духу, але пісалі яе па-польску. Пераклад з польскай мовы зрабіў В. У. Таранеўскі.

с этими евреями во всех преимуществах, в той привилегии нашей изъясненных, и их как к свободе, так к производству торговли и всему нижеизложенному... нашей привилегии допускали. На ходатайство это мы, по докладу гг. членов совета нашего, благосклонно снисходя, означенных евреев, сею нашею привилегиею в сказанную подлинную привилегию нашу включаем, разрешая им, как ныне находящимся, так и в последствии в местечке Чериков могущих проживать, на основании подлинной и ныне вновь нами им жалуемой привилегии: медь, пиво, водку простую, спирт и прочие напитки продавать, также разными товарами и хлебом торговать наравне с прочими тамошними мещанами; дома, лавки, мясные ряды и плацы покупать, продавать и на них строиться, молитвенные дома построить и иметь свое кладбище, и земляные места под молитвенным домом и кладбищем должны быть свободны от всякого рода денежных сборов, а от уволоки и морга отдельно платить не более шести литовских грошей не в город, но в замок... платить и вносить должны. Также, если бы тамошние мещане взяли на себя казенную аренду, то и упомянутые тамошние евреи должны быть допущены к половинной аренде. Что все утверждая, для большей веры, по подписании собственноручно, печать в. к. лит. приложить повелели. Дан в Вильне 27 марта, в лето господне 1648, царствования нашего польского в 16... Владислав Король.— Станислав Нарушевич секретарь...

Затем, как король Август, на ходатайство за евреями жителями местечка нашего Черикова благосклонно нисходя, означенные права во всех пунктах, параграфах и подробностях утверждаем, укрепляем, и настоящею привилегиею нашею конфирмуем; почему, для большей важности, собственноручно подписавши, печать в. к. лит. приложить повелели. Дан в Варшаве 28 марта, в лето господне 1720, царствования нашего в 24. Август Король.

Конфирмация неверных евреев жителей местечка нашего Черикова, могилевской экономии.

Вестник Юго-Западной и Западной России. Т. IV, май. Кіевъ, 1864. С. 20—22.

ПАЦВЯРДЖАЛЬНАЯ КАРАЛЕЎСКАЯ ГРАМАТА НА КАРЫСТАННЕ МАГДЭБУРСКІМ ПРАВАМ, ДАДЗЕНАЯ ГОРАДУ ЧЭРЫКАВУ

15 снежня 1728 г.

Занесение в актовую книгу магдебургского права, служащего местечку Черекову

...Ян Третий... сообщаю этим нашим письмом-подтвердительной привилегией всем, кому следует знать, что святой памяти Их Величества короли — наши предки Владыслав Четвёртый и Ян Казимир мещанам местечка нашего Черекова, находящегося в Могилевской экономии, своими привилегиями (одна с 1641 года от рождения Господа нашего месяца февраля дня пятнадцатого; другая, выданная в Варшаве в 1649 г. месяца декабря 21-го дня) давшие оным магдебургское право, утверждают свободные выборы бургомистров, советников, членов магистрата и допускают к решению всех дел, стоящих перед их судом, но с внесением в наши книги челобитных от тех же черековских мещан и по просьбе господ членов магистрата и наших экономов, на это время остающихся у нас, вышеуказанные права с отческой милостью подтверждаем, которые войт городка нашего Черекова благородный Ян Михал Шаблевский, войский стародубовский по нашему согласию и во время бездействия благородного Кшиштофа Маминского, рожанского стольника, согласно надлежащему порядку должен соблюдать, будучи привилегированным; те же черековские мещане из промеж себя ежегодно должны в присутствии своего вышеуказанного войта выбирать бургомистров, советников, членов магистрата, публичных в управление и суд; а потом черековский войт вместе с тамошним магистратом по причине того, что с каждым разом все более в публичные дела приходит опыт, не только обычные дела, но и более важные, то-есть бунты, распри, убийства, колдовства, кражи, развраты, неповиновения и прочие им подобные отступления — судить и наказывать, и, согласно установленному порядку Магдебургского права следить обязан будет, но с допущением апелляции только по стóящим делам; а аренда с мельницы, копщина от варения мёдов, пив, водок должны оставаться у наших черековских мещан, и из них доход в нашу казну, определяемый ревизорами; а также годовой оброк с влук и городских площадей, описанных в последней ревизии и прочие сеймовые налоги собираются черековским войтом и должны передаваться в наш могилёвский замок; и, наконец, ввиду опустошения нашего

местечка козацкими бунтами, до тла разорённого, от размещения [солдат] на квартиры, на ночлеги, от выпасов, станций [остановки короля, дворян, войска во время походов], подвод и прочих солдацких тягот, согласно нашим Универсалам, изданным для защиты могилёвской экономии, от них мы хотим видеть жителей городка свободными и обращаем на это внимание; для большей веры своей рукой мы подписываем и приказываем приложить печать Великого Княжества Литовского. Выдано в Вильне, лета Господня 1688, месяца апреля, дня четырнадцатого в 12-й год нашего правления.

К этой подтверждающей привилегии возле настоящей печати Великого Княжества Литовского имеется собственноручная подпись Его Величества со словами: Ян, король. И дополнение к этим словам: Подтверждение Магдебургского права местечка Череков с освобождением от ночлегов и солдатских переходов.

В Черекове, дня 22 января месяца 1722 г. Юстын Богуславский, комиссар-секретарь. Эта Привилегия подтверждения, поданная для записи её в городские книги вышеуказанным лицом, принята в городские книги Могилёва и слово в слово вписана.

Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 13. Витебск, 1882. С. 249—251.

ПАЦВЯРДЖАЛЬНАЯ КАРАЛЕЎСКАЯ ГРАМАТА, ДАДЗЕНАЯ ГОРАДУ ЧЭРЫКАВУ

15 снежня 1728 г.

Вписание (в городские книги) привилегии Его Королевского Величества, написанного на пергаменте.

Перед нами и т. д. лично предстал благородный господин Онисим Коробанко, чернковский писарь волею и от имени вельможного пана Якуба-Людвика-Францишка Ганцкова, венденского подкомория, войта чернковского — для подтверждения привилегии, выданной светлейшей памяти короля Его Величества Яна Казимира и служащей городу Черекову,— с целью внести ее в городские могилевские книги (Онисим Коробанко) представил ее, звучащую следующим образом: Ян Казимир... Этим нашим письмом мы сообщаем, кому это следует знать, что нам были представлены привилегии с подписью руки короля Его Величества Владыслава Четвертого, господина брата нашего с печатью Великого княжества Литовского, (привилегии) выданные и служившие мещанам нашего городка Черекова, находящегося в Могилевской экономии, на вольности, права, свободы и порядки, причем выписки из реестра предполагаемых прибылей от сельскохозяйственных угодий Могилевской экономии, описания оброков и других налогов, причитающихся с этого городка казне нашего Великого княжества Литовского, (выписки) являются аутентичными, ни единого сомнения в себе не содержат.

Первая привилегия: Владыслав Четвертый... Сообщаем этим нашим письмом, что благородные Криспин Кершернстейн, тиун поюрский, администратор в тогдашней могилевской экономии, и Павел Сапоцко, ревизор наш согласно нашего письма оставили вольными чернковских мещан, опустошенных и разграбленных проходившим вблизи военным московским походом, сроком на 15 лет, считая с даты письма с 5 февраля 1634 г. господня — до 1648 г., а оброки как с волок, так и за медовую подать увеличили, при этом оставили для 2 церквей — 6 волок, 4 свободных хозяйства, для войта —2 волоки и 2 хозяйства; с площадей городских и с уличных за продажу пива, водки и медов, владельцам магазинов, коморникам и коморницам, мясникам подати и прочие повинности в этом своем ревизорском письме списали; в конце в нем упреждали и постановили, что в пребывание в свободных им можно будет меды, пиво и водку гнать и продавать в корчмах, торговать всякими товарами, покупать и продавать и от этого в казну нашу они не обязаны что-либо платить до тех пор, пока не окончится срок вольности с мельницы, однако, находящейся возле этого городка, брать с сегодняшнего дня по особому решению. В этом случае и мы, Владыслав Четвертый, король, это ревизорское письмо, слово в слово здесь якобы вписанное, силой и уважением нашим королевским утверждаем и оставляем вышеуказанных чернковских мещан при их упомянутых вольностях, выраженных в ревизорском письме; кроме этого даем право и на базар еженедельно в воскресенье и 2 ярмарки в году: один на св. Троицу, а второй на св. Покрова — православные праздники; ярмарки будут продолжаться по недели;

на них как чересковским мещанам, так и приезжающим людям из разных мест и городов можно будет всякие товары, сукна, меха, воск, кожи, мед, жир и все то, что можно купить, продать, заключать сделки; а также во время этих ярмарок можно продавать пиво, меды и водку без помех, в частности, трактиров и барышей наших и аренду нашего могилевского экономa без препон со стороны наших учреждений и людей всякого ремесла и без торговой уплаты, так, однако, чтобы на этих торгах и ярмарках таковые не были, право которых хранить, и прекращать от них отнимать, а к тому же, чтобы не сообщалось в прилегающие города и городки, а также и наших доходов с сельхозугодий. А в конце: для того, чтобы городок мог лучше укрепиться, мы разрешаем им из своих людей выбирать войта и бургомистра, которые, будучи одобрены нашим могилевским экономом, должны соблюдать все текущие дела, подлежащие городку, со свободным образом, судить, и, главным образом, должны отсылать нашему экономy, должны соблюдать всякое управление и хорошее управление народом этого городка. К этому для пущей веры своей рукой подписать и печать Великого кн. Литовского поставить мы приказали. Выдано в Варшаве, дня XV месяца февраля года от рождения Иисуса Христа MDCXLI, IX года нашего польского и шведского царствования. Владислав-Король (по латыни). Поставлена меньшая печать ВКЛ. Марцыян Тризна, референт Вел. кн. Литовского.

Вторая привилегия. Владыслав Четвертый... Этим нашим письмом мы сообщаем всем, что нам был представлен подлинный нормативный акт, выданный королем и касающийся торговли и пошлин, с печатью и подписью руки благородного Михала Казимира Полпяты нашего секретаря подстаростия могилевского, написанный в этом году в июле, 10-го дня по делу выравнивания разницы с основанием границ между угодьями нашего городка Черекова, с одной стороны, и с другой стороны, между угодьями села Глинское и имении благородного Самуэля Велички, подстолия стародубского, находящихся в нашей могилевской экономии; — акт, принятый с согласия обеих сторон; после внесения просьбы некоторых господ — советников и придворных служащих от вышеуказанного благородного Велички, этот акт, будучи правильно составленный во всех пунктах, условиях, договорах и параграфах, был включен слово в слово, мы нашей силой и уважением одобряем, подтверждаем и укрепляем. К чему, для пущей веры, рукой своей подписываемся и печать Вел. кн. Литовского прилагаем.

Выдано в Варшаве, дня XVII месяца декабря лета господня MDCXLVI, XIV года господства наша польского и XV года — шведского, Владыслав-Король (по-латыни). Приложена большая печать Вел. кн. Литовского, Францишек Исайковский, референт и писарь Вел. кн. Литовского.

Третья привилегия. Владыслав Четвертый и т. д. Этим нашим письмом мы сообщаем всем, кому это следует знать, что нам был представлен реестр ревизии благородных Владыславе Кердея, гродненского маршалка, и Габриэля Кимбара, писаря казны Вел. кн. Литовского, секретаря и ревизоров наших, посланных в Могилевскую экономию в прошлом 1647 г. в сентябре, (реестр), в котором определены: положение об уплате оброка с волок и городских усадеб в Черекове, а также доходы с сельхозугодий и аренд капщизны и корчм упомянутого городка Черекова, находящегося в нашей Могилевской экономии. Нам была высказана просьба некоторых господ-советников и чиновников нашего двора от имени наших чересковских мещан, чтобы мы подтвердили и поддержали вышеуказанное решение наших ревизоров. Мы, видя их правильное желание, нашей королевской силой и уважением это указанное положение подтверждаем, утверждаем и одобряем, согласно которого все мещане Черекова должны будут платить в нашу казну все налоги, при этом мещане этого же городка Черекова слезно умоляли, чтобы им в связи с повышением оброка этими ревизорами, особенно в связи с изданием в этом году свободы и не имея пользы от базаров в своем городке, они внесли просьбу, чтобы им разрешили торговать в радиусе 30 миль, т. к. они платят большую пошлину евреям и тамошним арендаторам, когда для большего удобства ездят в города и городки для покупки (товаров). Мы же, желая, чтобы указанные мещане имели более легкое умножение своего имущества, а более бедные могли иметь прибыль от проживающих у них прасолов, мы разрешаем им в этом нашем письме, что они, кроме того, что не платят никакой пошлины, еще и могли вести торговлю в радиусе 30 миль вокруг Черекова, но главные купцы, однако, по примеру иных купцов, пошлину должны платить. Медовые каноны на определенные торжественные праздники, для свечей, в церкви, тамошним мещанам, кроме платы за производство и продажу напитков, мы разрешаем иметь. Для чего для большей веры, рукой нашей мы подписались, приказав печать Вел. кн. Литовского поста-

вить. Выдано в Вильне дня XXV, месяца апреля лета господня MDCXLVIII, в XVI год нашего польского царствования и в XVII год царствования шведского. Владыслав-Король (по-латыни). Большая печать Вел. кн. Литовского поставлена. Станислав Нарушевич, референт и писарь. В конце выдержки этого реестра записаны следующие слова: Выдержка из реестра предположения о количестве налогов всей могилевской экономии и положения, составленного в 1649 году, в которой город Череков описан следующим образом: Городок Череков. Рыночных площадей — 23½ по 8 грошей — 3 копы и 8 грошей; уличных площадей (участков) 226 и половина; из них в 2 церкви — свободных привилегированных, 8 на пана войта, два свободных, 34 издавна пустых, половина и третья часть; из поселенных 181 и ⅔ уплатили 18 коп и 10 грошей; из них после опустошения казаками пану Отрошкевичу, тамошнему войту привилегированных, с представлением свободы до шести лет, то есть до пятьдесят пятого года; двадцать участков; опустошенных казаками, уличных усадеб четыре было вновь принято,— как описано в реестре. Пан Миколай Пешкевич — одна усадьба на месте Лукьяна Ходарынина; одна усадьба на месте Парфена Москаля; половина усадьбы на месте Тишки Хромого; а также Ян Столвановский на месте Марцина и Корнея Сиватонков — пол-усадьбы, при этом у него есть один свой участок. Из этих новых участков казну короля следует удовлетворить, а от мелких городских поборов они освобождаются. Городских чередковских влук — 100. Из них на церкви, свободных — 6, на пана войта, свободных — 2. В 1648 г. мещане уплатили согласно реестру из 90 влук оброка с медовой данью по 3 копы — 270 коп; пан Отрошкевич, тамошный войт, заплатил согласно того же реестра из 2 влук по 2 копы, всего 4 копы; эти 2 влуки пана войта, подвергшиеся казацкому опустошению с добавлением к ним на ново из городских влук — 10 влук были привилегированы пану Отрошкевичу, тамошнему войту с предоставлением свободы на 6 лет, т. е. 1655 года. После вышеуказанного опустошения 2 влуки с четвертью вновь приняли на участке, отмеченном в реестре, пан Миколай Пешкевич на месте Лукьяна Ходарынина — пол-влуки; четверть влуки после Парфена Москаля, четверть влуки после Цишки Хромого; также Ян Столвановский — пол-влуки после Марцина и Корнея Сивотанков, четверть влуки после Цимоха Хадасенойна, плюс своих полторы влуки; из этих вновь обретенных влук они должны будут платить подать в Его Величества казну; освобождаются они от мелких городских поборов; капщизну медовую, пивную и водочную и подать от одной мельницы — до следующего постановления этого местечка Черекова. К этому налогу в течение шести лет, а именно до пятьдесят пятого года, в виду свободы (вольности) тамошнему пану войту, данной нами, из влук и усадеб, описанных выше, в каждом году тридцать шесть коп. Выдано в Могилеве, дня 27 мая месяца 1649 года. К этому реестру поставлено 3 печати. Мы, таким образом, Ян Казимир — король, милостиво склоняемся к просьбе упомянутого благородного Александра Отрошкевича, чередковского войта, а также бурмистра, мещан и всего люду городка Чередков, недавно под междуцарствие, опустошенного казацкими войнами, потому что мы эти наши чередковские мещане, во время насильных набегов казаков и взбунтовавшихся крестьян, должны были мужественно свою преданность Речи Посполитой сохранить, как это выявилось из аттестации рыцарей, обдаренной шляхты нашей могилевской экономии, которые под предводительством своего войта несколько дней мужественно отражали нападение неприятеля,— выше помещенные привилегии святой памяти Короля Его Величества, господина брата нашего, а также реестр майоратов налогов, от них поступающих, во всех пунктах, положениях, оговорках, параграфах и требованиях силой и уважением нашим королевским (этим) настоящим письмом нашу привилегию... мы одобряем, утверждаем и подкрепляем, желая иметь и провозглашая, чтобы благородный войт, а также славный бурмистр, мещане и люд вышеназванного нашего городка Черекова, все вообще и каждый в отдельности, чтобы при соблюдении прав, вольностей, свобод и прерогатив и конституции, посредством ревизоров подати в казну нашу Вел. кн. Литовского от усадеб, влук и от аренд целые и невредимые, не тронутые нашими могилевскими экономами и их наместниками, были сохранены,— ради нашей милости. К чему для пущей веры, своей рукой подписываемся, и приказываем поставить печать Вел. кн. Литовского. Выдано в Варшаве, дня XXXI месяца декабря MDCXLIX года. I года царствования нашего польского и II года царствования шведского. В этой подтвердительной привилегии, возле большой подлинной с подвеской печати Вел. кн. Литовского имеется подпись руки Его Королевского Величества, Ян Казимир, король.

Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 13. Витебск, 1882. С. 257—265.

КАРАЛЕЎСКІ РЭСКРЫПТ, ДАДЗЕНЫ МІКАЛАЮ ПАЦУ, СТАРОСТУ КРЫЧАЎСКАМУ, У АХОВУ ПРАЎ ЧЭРЫКАЎСКІХ МЯШЧАН

15 снежня 1728 г.

Запись в книгу упоминального письма Его Королевского Величества.

Перед нами ... и все остальное, представ лично, шляхетный пан Онисим Коробанко, черековский писарь,— по воле и от имени знатного его милость пана Якуба-Людвика-Францишка Ганцкова, венденского подкомория и черековского войта,— подал упоминальное письмо, выданное Его Королевским Величеством, служившее черековским мещанам по делу, изложенному ниже, для записи в городские могилевские дела и звучащее следующим образом: Владислав Четвертый...— благородному Миколаю Пацу — кричевскому, ракантийскому, ловаришскому старосте и нашему дворянину, верно нам преданному — наша королевская милость. Написали нам челобитную мещане нашей могилевской экономии из городка Черекова о том, что твоя верность ранее установленные границы между землями этого городка Черековского и Кричевским староством попортил, не мало лошадей и крупного рогатого скота с черековской земли забрал насильно и намерился уничтожить этот городок, а также старые дороги, идущие из Севера в Чериков, возле самого городка ты приказал у переезда заложить и вроде бы ты как жалующимся черіковским мещанам, так и купцам, направляющимся в этот городок, через своего кричевского подстаросту ехать запретил; и если так на самом деле, то нас очень должен беспокоить этот Твоей Верности поступок, противоречащий праву и истине; мы хотим, таким образом, Тебе, Твоя Верность, любезно и серьезно напомнить, чтобы Твоя Верность закрытые дороги приказал расчистить и открыть и в дальнейшем ни одному из черековских наших мещан бесправия не чинил, ты прикажи, чтобы к ним во всех вопросах твой подстароста и прочие подначаленные относились спокойно, обязуясь не чинить противоправных обид ради нашей милости. Письмо дано в Вильне, дня XXXI, месяца марта MDCLVIII года от рождения Господа нашего в XVI год нашего царствования в королевствах польском и шведском. На этом напоминальном письме возле печати Вел. Княжества Литовского имеется подпись, сделанная рукой его Королевского Величества в виде слов: Владыслав-Король (по-латыни). И следующая подпись писаря: Франтишек Исайковский, референт и писарь... В Черекове, дня 29 января месяца, 1722 г. Юстын Богуславский, секретарь комиссии. Который же это упоминальное письмо Его Королевского Высочества после подачи и внесения в реєстр вышеупомянутым лицом принял и в могилевские городские книги слово в слово вписал.

Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 13. Витебск, 1882. С. 253—255.

УПАМІНАЛЬНЫ ЛІСТ КАРАЛЯ АЎГУСТА III РЭЧЫЦКАМУ ВАЙСКОМУ МІХАІЛУ КЯЛЧЭЎСКАМУ АБ ТЫМ, КАБ ЁН НЕ КРЫЎДЗІЎ ЖЫХАРОЎ МЯСТЭЧКА ЧЭРЫКАЎ І ВЁСКІ ВЕРБЕЖ

30 ліпеня 1736 г.

Король Август III, вследствии жалобы обывателей столовых королевских имений — Черекова и Вербежа на Речицкого гродского писаря Келчевского, что он захватывает королевские земли и делает жителям разные обиды,— сим листом предписывает ему, под зарукой 10 000 коп. литовских грошей, воздержаться на будущее время от таких своеволий.

В канцелярии его королевского величества Гродненского городского (суда) передо мной, Антонием Мицутой из Ваганова, подстолием и помощником старосты суда Гродненского уезда, назначенным по (его) великой милости господином Михаилом Юзефом Массальским, писарем Вел. княж. Литовского, старостой Гродненского, Радошковичского, Берницкого и т. д., предстал лично его милость господин Андрей Мястковский, администратор Верцелишского поместья, и подал гарантийное или (другими словами) поручительное письмо для приложения его в дела Гродненского замка, требуя, чтобы это письмо было принято и слово в слово включено в документы; текст этого письма следующий:

Август Третий, божьей милостью король польский и т. д.— благородному Михаилу Келчевскому, заместителю кастеляна и судовому писарю Речицкому.

Сообщаем Твоей милости господину, что Нам передана жалоба советниками и экономами, пребывавшими в нашей стороне, от имени всего магистрата и посполитого люда нашего города Черекова, расположенного в Могилевской экономии, о том, что ты, твоя милость, пан, намерился уничтожить это местечко и село Вербеж — наши столовые имения — и не только не уважая древние границы, отнимаешь землю, но и не перестаешь угрожать жизни жалобщиков, поэтому указанное наше местечко Череков и село Вербеж, желая иметь в безопасности свое недвижимое имущество: принадлежащие им земли с давних пор, а также борясь за свою безопастность, прибежали к нам с челобитной, чтобы Мы, взяв их под Нашу защиту, поручительным письмом тебе, Твоя милость пан, напомним; поэтому Мы, король, милостиво склонясь к покорной челобитной Наших подданых из городка Черекова и деревни Вербеж, находя ее справедливой и сообразной с общественным правом, берём под Нашу королевскую защиту упоминаемое местечко Череков и село Вербеж — наши столовые имения с их жителями и землей (о которой идет спор), а также здоровье и имущество упомянутых подданных, и этим Нашим поручительным письмом тебе, благородный Келчевский — заместитель кастеляна и судовый писарь Речицкий, объявляем и ставим на вид, чтобы ни ты сам, твоя преданность, ни подчиненные тебе лица, никаких своеволий в отношении здоровья жалобщиков не чинили, никаких насилий, нападений, вторжений, борьбы, опустошения лесов, обрабатываемых земель, а особенно к хозяйственным землям действий, предпринимать не намеревались — под зарукой 10 тысяч коп литовских грошей,— половина этой суммы за нарушение указанных пунктов и Нашего поручительного письма надлежит в Нашу казну, а половина — потерпевшей стороне; а что касается дела жалобщиков, то ты, твоя преданность, должен законно разобраться и воздерживаться от своеволий, помня об этом.

Написано в Канцелярии Нашей Великой Великого княжества Литовского лета Христова тысяча семьсот тридцать шестого, дня четырнадцатого, июля месяца, на третьем году нашего царствования.

В этом упоминальном письме на месте его Высочества возле Большой литовской печати имеется следующая подпись:

Ян Сапега — Великий Канцлер Великого княжества Литовского.

Это поручительное или упоминальное письмо после подачи его в дела вышеуказанным лицом принято и вписано в городские книги Гродненского уезда.

Акты, изданные Виленской археологической комиссией. Т. VII. Вильна, 1874. С. 162—163.

ПАСЛЯ І ПАДЗЕЛУ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

У 1772 г. імянным указам Екацярыны II ад 1, 12 і 21 верасня было аб'яўлена аб далучэнні да Расійскай імперыі ўсходніх зямель Беларусі. Гэта быў І падзел Рэчы Паспалітай. Гэтымі ж указамі на далучаных тэрыторыях засноўваюцца дзве губерні: Пскоўская і Магілёўская. Граніца паміж Польшчай і Расіяй пасля гэтага падзелу праходзіла па заходняй Дзвіне да Віцебска, затым пагранічная лінія паварочвала на поўдзень і ішла па прамой лініі да вытокаў Друці, праходзіла ўздоўж гэтай ракі да ўпадзення яе ў Днепр і працягвалася па Дняпру.

Згодна з указамі сената ад 23 кастрычніка 1772 г., Магілёўская губерня дзялілася на 4 правінцыі — Магілёўскую, Мсціслаўскую, Рагачоўскую і Аршанскую. Указам ад 22 ліпеня 1773 г. аб раздзеле Беларускіх губерняў на паветы і аб заснаванні ў тых паветах камісарстваў, Чэрыкаў быў назначаны павятовым горадам у Мсціслаўскай правінцыі[1]. У гэтым жа годзе на далучаных да Расіі тэрыторыях быў праведзены пагалоўны перапіс насельніцтва для збору падушнага падатку, які павінен быў замяніць існуючы ў Рэчы Паспалітай падымны падатак[2]. Для таго каб «прыцягнуць да сябе сэрцы новых подданых выяўленнем шчодрасцей, сапраўды бязмерных», Екацярынай

II у 1775 г. маніфестам ад 17 сакавіка «пунктамі 17, 21, 29, 31, 33, 35, 36 і 37 зняты зборы вясельныя (вясельная куніца), бартавыя, са звярыных і птушыных промыслаў, з таварных свіранаў, млыноў, лазняў і з рыбнай лоўлі. Рэзалюцыяй Мая 1-га таго ж года дазволена Беларускаму генералу-губернатару збіраць на працягу яшчэ 3-х гадоў падатак па зменшанаму акладу, ва ўвагу к двухгадовым неўраджаям ва ўсім Беларускім краі і з прычыны прыгнечанага мінулымі ўнутранымі іх неспакоямі становішча землеўладальнікаў і ад агаладання ўсяго тутэйшага краю праходзячымі войскамі і канфедэрацкімі натоўпамі, якімі апошнімі цэлыя жыхарствы (сёлы) былі абрабаваны».

Насельніцтва беларускіх зямель пасля апублікавання ўказа аб уключэнні іх у склад Расіі прыводзілася да прысягі. Так як некаторыя магнаты, уладальнікі атрыманых Расіяй зямель, усялякімі спосабамі стараліся ўтрымаць у Уніі народ гэтых тэрыторый, імператрыца выдала ўказ аб канфіскацыі памесцяў асоб, якія супраціўляліся яе волі.

Услед за распараджэннем аб канфіскацыі маёмасці некаторых памешчыкаў, незадаволеных новым урадам, з'явіліся некалькі ўказаў аб раздачы канфіскаваных памесцяў рускім для ўмацавання рускага элемента ў Краі[3]. Так, напрыклад, Крычаўскае староства (у яго ўваходзілі мястэчка Крычаў, Мілаславічы, Хоцімск, Забычанне і Студзянец) было аднесена да ліку дзяржаўнай уласнасці. «Гасударыня Імператрыца Екацярына II падаравала яго ва ўзнагароду князю Рыгору Аляксандравічу Пацёмкіну»[4].

22 сакавіка 1777 г. «для ўпарадкавання паветаў у прасторы і насельніцтве і ўстаранення нязручнасцяў у адміністрацыйных адносінах зроблена новае размеркаванне паветаў Полацкай і Магілёўскай губерняў. У апошняй загадана быць 12-ці паветам», у тым ліку і Чэрыкаўскаму.

Важнейшым актам царскай волі Екацярыны II было ўвядзенне ў зноў далучаных абласцях тых устаноў, якія існавалі ў Расійскай імперыі на аснове закона ад 7 лістапада 1775 г.

З утварэннем на аснове ўказа ад 10 студзеня 1778 г. Магілёўскага намесніцтва Чэрыкаў застаўся павятовым горадам[5]. У павеце былі створаны: «Павятовы Суд (ці Акруговы); Дваранская Апека і Ніжні земскі Суд. Затым у кожным павеце меркаваўся Спраўнік, Павятовы казначэй, Павятовы прысяжны землямер, Павятовы Доктар і Павятовы Лекар з 2-ма падлекарамі і 2-ма лекарскімі вучнямі. У кожным горадзе быў Гараднічы, Славесны Суд, дзе засядалі суддзі і Старосты, Гарадскі Магістрат, пры якім быў Сіроцкі Суд». З увядзеннем указаных вышэй устаноў ужо не заставалася месца для дзеяння Літоўскага Статута. Адначасова з ім страціла сілу і магдэбургскае права. Прыкладам таму можа служыць цяжба мяшчан крычаўскіх з уладальнікам Крычава князем Пацёмкіным. Ён аб'явіў сябе памешчыкам Крычава, а насельніцтва гэтага горада — сваімі сялянамі і выйграў справу ва ўсіх інстанцыях[6]. У 1787 г. былі праведзены выбары павятовых і губернскіх прадвадзіцеляў дваранства, створаны павятовыя і губернскія дваранскія сходы.

5 жніўня 1786 г. імператрыцай Екацярынай II быў зацверджаны статут народнага вучылішча, які адыграў асаблівую ролю і ў развіцці народнай асветы на Чэрыкаўшчыне. Паводле яго «народныя вучылішчы павінны былі паведамляць наведваючым іх дзецям грунтоўную элементарную адукацыю, але гэтым не павінна была абмяжоўвацца іх задача. Важна развіць у дзі-

цяці разумовыя сілы, але зусім недастаткова для школы развіць толькі разумовыя сілы дзіцяці. Школа павінна паставіць сабе мэтай не толькі паведаміць дзецям вядомую суму ведаў, але і зрабіць іх набожнымі хрысціянамі і вернымі сынамі царквы, сфарміраваць з іх у далейшым карысных членаў грамадства». 3 лістапада 1786 г. імператрыца загадала Полацкаму і Магілёўскаму генерал-губернатару П. Б. Пасеку «прыступіць да ўпарадкоўвання народных вучылішчаў на першы раз па крайняй меры ў губернскіх і знатнейшых гарадах яго генерал-губернатарства на рахунак сум загадаў грамадскага апекавання і гарадскіх дум».

Пасек з ахвотай узяўся за выкананне ўскладзенага на яго даручэння, і ўжо 15 сакавіка 1789 г. галоўнае народнае вучылішча было адкрыта ў Магілёве. Праз два гады «па адкрыцці галоўных вучылішчаў прыступлена было да адкрыцця малых вучылішчаў». У 1791 г. такія вучылішчы былі адкрыты ў некаторых гарадах Магілёўшчыны, напрыклад у Оршы, Копысе, Мсціславе, Чавусах. Чэрыкаўскае малое вучылішча было адкрыта 6 лютага гэтага ж года (па другіх крыніцах яно было адкрыта ў 1790 г.). «І вучылішчы гэтых маленькіх гарадкоў не засталіся без вучняў. Асабліва значная колькасць жадаючых вучыцца знайшлася ў Мсціслаўлі ... іменна 65. За Мсціслаўлем па колькасці выказаўшых жаданне вучыцца ідзе Чэрыкаў — 54»[7].

З далучэннем упамянутых зямель да Расіі было ліквідавана рэлігійнае прыгнечанне беларускага народа. Яму прадстаўлялася права свабоднага выбару хрысціянскага веравызнання. Разам з тым у 1774 г. даравальнай граматай Екацярыны II была заснавана Беларуская каталіцкая епархія. Згодна з гэтай граматай, дазвалялася захаванне каталіцкай веры і свабоднае адпраўленне каталіцкіх абрадаў. Асобныя епіскапствы аб'ядноўваліся ў адну Беларускую епархію на чале з епіскапам і кансісторыяй. Маёмасць каталіцкіх цэркваў і манастыроў заставалася недатыкальнай.

Двойчы на працягу шасці гадоў Чэрыкаўскі павет мяняў сваю губернскую прыналежнасць: у снежні 1796 г. пры ўтварэнні Беларускай губерні ўвайшоў у лік павятовых гарадоў. У 1802 г. пры аднаўленні Магілёўскай губерні пакінуты ў ёй павятовым горадам[8].

10 лютага 1782 г. на Беларусі «загадана ўвясці новыя дарогі», у прыватнасці ад Смаленска да Кіева на Мсціслаў, Лабковічы, Крычаў, Чэрыкаў, да Прапойска, дзе яна злучалася с дарогаю, якая вяла ад Магілёва да Кіева[9].

16 жніўня 1781 г. быў зацверджаны герб г. Чэрыкава. Ён быў падобны да Магілёўскага герба, адрозніваўся залатым загалоўкам «ибо сие место всегда будет подсудно Могилеву». План г. Чэрыкава быў зацверджаны трыма гадамі раней — 21 лютага 1778 г.[10].

1787 г. быў знамянальным для тагачаснай Чэрыкаўшчыны: гэты край наведала імператрыца Екацярына II. Вось як апісвае гэту падзею М. В. Без-Карніловіч:

«Января 20-го в 9 часов утра [Екатерина.— *Прим. ред.*] отправилась в г. Чериков: при въезде в него производилась пушечная пальба; Магистрат Ей поднес ключи. Государыня Императрица, в Черикове, изволила пожаловать на все Православные церкви 300 руб. да на состоящую в Полоцкой губернии Пятницкую церковь 300 руб., Православному монастырю в г. Неведе 200 руб. Из Черикова поехала в Рогалин, оттуда в Пропойск»[11].

Увядзеннем у далучаным пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай краі законаў, агульных для Расійскай імперыі, Екацярына II імкнула-

ся дасягнуць поўнага зліцця зноў далучаных абласцей з дзяржавай, але «сістэма Імператрыцы Екацярыны не доўга мела сілу ў краі». Яна хутка пачала мяняцца з уступленнем на рускі прастол Паўла Пятровіча (1796—1801) — сына Екацярыны II і Пятра III. «Палякі выклікалі ў імператара Паўла моцнае спачуванне да іх журботнай долі. Ён пачаў вяртаць многіх выгнаннікаў з Сібіры і зноў аддаваць канфіскаваныя ў іх памесці»[12].

На рубяжы XVIII і XIX ст. гарады Магілёўскай губерні нельга было лічыць прамысловымі цэнтрамі. У данясенні сенатараў графа Аляксандра Варанцова і Аляксея Нарышкіна аб аглядзе Магілёўскай губерні ў 1784 г. аб кожным горадзе сказана: «Фабрык і заводаў у гэтым горадзе ніякіх няма». «Экономические примечания к генеральному межеванию Могилевской губернии» (па 5-й рэвізіі, складзены ў 1800—1802 гг.) даюць падрабязныя апісанні кожнага горада. Аб г. Чэрыкаве, напрыклад, сказана: «Заводаў няма, а для абываценяў купляюцца штогод свечы з бліжэйшых месц. Гарбарных заводаў няма, але ў адным абывацельскім доме ёсць адзін чан і работа выконваецца самім гаспадаром, а калі і наёмнымі людзьмі, вырабляе 25 чорных і 9 скур падэшвенных ялавічных». У Чэрыкаве з агульнай колькасці насельніцтва мужчынскага полу (2313 чал.) рамеснікаў было 46 чал., гэта значыць менш 2 %[13]. Усё насельніцтва Чэрыкаўскага павета, паводле 5-й рэвізіі, складала 39 109 чал.[14]

Асноўным і самым даходным відам дзейнасці для вотчынных гаспадарак Чэрыкаўшчыны, як і для ўсёй Усходняй Беларусі, было вінакурства. У канцы XVIII ст. тут прыкметна расце колькасць вінакурняў не толькі ў буйных, але і сярэднепамесных памешчыкаў. Так, у адным толькі Чэрыкаўскім павеце іх было 20. Выгаднасць вінакурства заключалася ў асобым праве, якое называлася прапінацыйным і было ўстаноўлена польскімі каралямі яшчэ ў XIII — XIV ст. і распаўсюджана ў XVIII — XIX ст. у Польшчы, Беларусі, на Украіне, у Прыбалтыцы і Бесарабіі. Сутнасць яго заключалася ў тым, што памешчыкі мелі права не толькі гнаць віно ў сваіх вінакурнях, але і прадаваць яго ў сваёй гаспадарцы. Гэта прапінацыйнае права і з'яўлялася крыніцай значнага абагачэння памешчыкаў, якія прадавалі віно ў корчмах. Так, напрыклад, князем А. М. Галіцыным у м. Краснаполле Чэрыкаўскага павета «з 36-ю сёламі ў 1778 г. была аддадзена па кантракту на 2 гады яўрэю Зельману з сынам прадажа віна ў 21 карчме». Прытрымліваючыся прапінацыйнага права, Галіцын за вольны продаж віна ў корчмах плаціў прапінацыйныя грошы ў павятовае казначэйства. У Чэрыкаўскае казначэйства за ўвесь 1780 г. ён заплаціў 489 р. 60 к.

З упамянутага раней данясення графа Аляксандра Варанцова і Аляксея Нарышкіна аб аглядзе Магілёўскай губерні ў 1784 г. вынікае, што пераважная большасць купцоў у гэтых краях былі яўрэямі і ў іх руках быў сканцэнтраваны асноўны гандаль. У Чэрыкаве яўрэі складалі болей 66 % усіх купцоў. Трэба адзначыць, што пасля далучэння гэтага краю да Расіі, прыкметна паскорылася развіццё купецкага гандлю. Для прыкладу, колькасць купцоў у Чэрыкаве з 1776 па 1785 г. вырасла з 1 да 102 чал. [15]

Важную ролю ва ўнутраным гандлі ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. адыгрывалі кірмашы. У сярэдзіне 80-х гадоў на кірмашы ў Крычаўскае графства, напрыклад, прыязджалі купцы з Масквы, Пецярбурга, Кіева, Чарнігава з сукном, шаў-

ковымі вырабамі, шубамі, жалезам, меддзю, тытунём і рыбай. Чэрыкаўскія купцы прадавалі скупленыя імі ў сялян навакольных вёсак сельскагаспадарчыя прадукты і вырабы рамёстваў рослаўльскім, вяземскім, дарагабужскім і ржэўскім купцам.

У першай палове 1801 г. частка прамысловых прадпрыемстваў у Чэрыкаўскім павеце належала памешчыку Івану Галынскаму. Паводле звестак яго ўпраўляючага, гэта былі наступныя заводы: парусінавыя фабрыкі ў м. Крычаў і с. Благоўскім, якія за паўгода выпусцілі «брызендуку бялейшага шт. 440, чарнейшага шт. 541. Мераю кожная штука па 50 аршын». (У канцы XVIII ст. Крычаўскай фабрыкай выпушчана парусіны ад 600 да 1000 кускоў па цане ад 10 да 15 р.) У с. Задробскаўскім — гарбарны завод, на якім выраблялі тавар на боты. «Вырабляецца скур валовых падэшвенных 20, з якіх ва ўсякія скуры выразаецца падэшв пар па 25 ялавічных чорных і шэрых, 278 шт. пад'ялавічных чорных і шэрых 72 шт., конскіх шэрых 228 шт.». У в. Падлужскай — «завод жалезны, на якім вырабляецца лемяшовае жалеза». У в. Батаева працуе шкляны завод, які вырабляе ліставое шкло і шкло для сасудаў. На заводзе за першую палову 1801 г. выраблена «шкла аконнага скрынак 16. Зольнага скрынак 35. Бутэлек шкла зольнага звычайнай меры шт. 200 штофаў, штофаў таго ж шкла 160. Бутэлек шкла сіняга мераю ў чвэрць штофа 70, чарачак шкла зольнага 400, чарачак жа шкла паўхрустальнага шт. 100, шклянак шкла зольнага 100, шклянак жа шкла паўхрустальнага 70».

На рубяжы XVIII і XIX ст. на тэрыторыі Чэрыкаўскага павета дзейнічалі і канатныя мануфактуры, прадукцыя якіх паступала ў Херсон. На адной з гэтых мануфактур працавала 180 рабочых. Найбольш буйным прадпрыемствам была суднабудаўнічая верф у Крычаве, заснаваная ў 1785 г. Тут жа працавала і парусінавая мануфактура Пацёмкіна, на якой было 172 станы. Працавалі на ёй прыгонныя сяляне. Выпрабленая прадукцыя вывозілася ў Херсон і Крамянчуг для аснашчэння ваеннага флоту.

Аб стане сельскай гаспадаркі Чэрыкаўшчыны 24 лютага 1805 г. магілёўскі губернатар паведамляў: «Ураджай наогул па губерні ў 1804 г. быў даволі добры, і хоць у некаторых памесцях Беліцкага, Чэрыкаўскага, Сенненскага, Магілёўскага, Копыскага і Бабінавіцкага паветаў пабіла градам рознага хлеба да 1300 чвэрцяў, але гэта не мела важнага ўплыву, пацярпеўшыя ж атрымалі дапамогу ад памешчыкаў і з запасных сельскіх магазінаў». У справаздачы таго ж губернатара ёсць звесткі і аб тым, што ў Чэрыкаўскім павеце было развіта пчалярства: «Мёд і воск дастаўляўся ў немалой колькасці ў сталічныя гарады Пецярбург і Маскву, а таксама да Рыжскага порта і ў іншыя месцы»[16].

К канцу XVIII ст. павялічыліся адработачныя павіннасці сялян. У пачатку XIX ст. у некаторых памешчыкаў сяляне працавалі на паншчыне да 6 дзён у тыдзень, незалежна ад колькасці і якасці зямлі, якой яны карысталіся. З 1797 па 1812 г. у тры разы былі павялічаны размеры падушнага падатку. Вельмі цяжкім было становішча сялян і ў дзяржаўных памесцях (старостваў). Па сваіх павіннасцях яны падраздзяляліся на паншчынныя і аброчныя. Часта паншчына дапаўнялася яшчэ і аброкам (прадуктовым і грашовым). Акрамя аброку, з сялян браліся і іншыя грашовыя зборы.

Многія казённыя памесці царскі ўрад здаваў у арэнду памешчыкам, якія, здаралася, даводзілі сялян да

поўнага разарэння. Не маючы сіл цярпець такую эксплуатацыю, сяляне выказвалі непаслушэнства сваім уладальнікам. Так, напрыклад, на падставе збірання арандатарам «залішніх супраць кантракта павіннасцяў» у 1804 г. адбылося паўстанне сялян Кашанскага староства ў Чэрыкаўскім павеце. Паўстанне гэта было задушана.

Цяжар паднявольнага становішча сялян узмацніўся ў перыяд Айчыннай вайны 1812 г. Землі Чэрыкаўшчыны падвергліся спусташэнням як пры наступленні французскіх войск, так і пры іх адступленні. У гэтай сувязі М. В. Без-Карніловіч пісаў: «Мясцовыя жыхары не столькі цярпелі бедстваў ад бесперапынных пераходаў войск, як ад грабяжу, буянства, насілля беглых ці адстаўшых салдатаў і марадзёраў. Страх многіх прымусіў пакінуць свае сялібы, дамы і пажыткі і адправіцца далей у глыб Расіі, ці хавацца па лясах, пераносіць нягоды. Жыхары, якія ў час вайны не пакідалі сваіх дамоў, падвергліся вялікім падаткам хлебам, жывёлай, грашыма. Адступленне французаў было страшным. Салдаты адбіралі ў жыхароў апошні мяшок мукі, сцягвалі апошняе адзенне з плеч»[17]. Чатырохмесячнае знаходжанне французаў у Магілёўскай губерні разарыла яе на $33^1/_2$ млн асігнацыямі[18]. Цяжкімі былі і людскія страты. У параўнанні з канцом XVIII ст., напрыклад, колькасць жыхароў мужчынскага полу ў Чэрыкаве скарацілася на 1269 чал. (паводле даных на 1824 г.). К 1825 г. колькасць жыхароў Чэрыкава склала: 1044 мужчын і 1089 жанчын. У гэты час у горадзе было 2 мураваныя і 365 драўляных дамоў, 2 царквы, 2 богаўгодныя ўстановы, 27 крам, 21 піцейны дом, лазня, 43 сады[19]. Аб тэмпах будаўніцтва ў дарэформенным Чэрыкаве, аб яго развіцці і росце колькасці гараджан гавораць скупыя статыстычныя звесткі. К 1829 г. колькасць драўляных дамоў у горадзе ўзрасла ўжо да 380. У 1842 г. там было пабудавана чатыры драўляныя дамы, а ў 1847 г.— яшчэ адзін мураваны. К 1855 г. у Чэрыкаве было ўжо 3 мураваныя казённыя дамы і 437 драўляных, 9 мураваных і 47 драўляных гандлёвых крам, 3 царквы, магазін. У 1854 г. было пабудавана 4 драўляныя прыватныя дамы і 14 драўляных крам[20].

У пачатку 50-х гадоў XIX ст. у Чэрыкаве пражывала 3455 чал. (1720 мужчын і 1735 жанчын). З іх: духавенства — 26 чал. абодвух палоў; дваран і чыноўнікаў — 112 мужчын і 77 жанчын; купцоў трэцяй гільдзіі — 5 мужчын і 5 жанчын; мяшчан і пасадскіх людзей абодвух палоў — 2855 чал. У горадзе былі 2 дабрачынных установы, 2 свецкія навучальныя ўстановы, 2 карчмы, 22 шынкі, папраўчая ўстанова[21]. У Чэрыкаўскім павеце ў 1854 г. пражывала 38 560 мужчын і 37 037 жанчын[22].

К гэтаму часу Чэрыкаў займаў плошчу ў $2919^1/_2$ дзес. зямлі. У Чэрыкаўскі павет уваходзіла: 114 047 дзес. палёў, 13 080 — лугоў, 2104— выганаў і кустарнікаў, 51 838 дзес. будаўнічага лесу і 152 823 дзес. лесу, які ішоў на дровы. Балоты, азёры і рэкі займалі 4197 дзес. зямлі. Чэрыкаўскі павет к сярэдзіне XIX ст. аб'ядноўваў 6 мястэчак і 376 вёсак. У сярэднім на адну душу мужчынскага полу прыходзілася па 9 дзес. зямлі[23].

Фабрычная прамысловасць у дарэформенны час на Чэрыкаўшчыне, як і ва ўсёй Магілёўскай губерні, была развіта слаба. Паводле даных кнігі «Военно-статистическое обозрение Российской империи», якая была выдадзена у 1848 г., у павеце знаходзіліся: парусінавы, 2 шкляныя, 3 меднаплавільныя і 3 гарбарныя заводы. У в. Старынка, якая

належала памешчыку Уладзіміру фон Бенкендорфу, працаваў «меднаплавільны з чыгуналіцейным і механічны завод, які заслугоўвае асаблівай увагі па вытворчасці на ім у значнай колькасці чыгунных, медных і жалезных вырабаў: у мінулым [1846] годзе рыхтавалася на ім вялікая колькасць карабельных рэчаў і артылерыйскіх фур»[24]. Прадукцыя гэтага завода збывалася па падраду для Чарнаморскага флоту, нязначная яе частка — унутры губерні. У 1859 г. гэты завод змяшчаўся ў чатырох мураваных корпусах і ў 10 драўляных пабудовах, «звыш таго маецца магазін 3-павярховы каменны і сушыльняў каменных 6». На заводзе працавалі: адзін чужаземны майстравы і 10 рускіх вольнанаёмных, 60 прыгонных, 98 чаляднікаў, 30 вучняў, чорнарабочых прыгонных і вольнанаёмных — да 500 чал. «На заводзе ўжываліся матэрыялы: жалеза, чыгун, сталь і іншыя металы, якія набываліся пакупкаю з казны ў Маскве, Калузе і другіх месцах». У фальварку Мікалаеўка, які належаў памешчыцы Ганне Камар, працаваў паравы цукровабурачны завод, «які мог апрацоўваць у год да 50 000 беркаўцаў цукровых буракоў на цукар, што збываўся па гандлёвых цэнах у Маскве, розных мястэчках і павятовых гарадах гэтай і суседніх губерняў». На заводзе меліся тры паравыя машыны — адна малая і дзве вялікія, працавалі 2 чужаземныя майстравыя і 200 чал. вольнанаёмных. Размяшчаўся ён у трохпавярховым будынку, у якім адзін паверх быў мураваны, а два — драўляныя[25]. У 1859 г. на заводзе выраблена 1000 пудоў цукру на суму 7500 р.[26] Заводы па выпрацоўцы шкляных вырабаў знаходзіліся: пры фальварках Петруліне, які належаў памешчыку Мечыславу Кастравіцкаму (у 1859 г. там было «спрацавана ліставога шкла звычайнага, прыкладна цаною кожную скрынку ў 120 лістоў, мераю ліст у 15 вяршкоў, па 11 руб. сер.— 650 скрынак, на суму 7150 р.»); Малінаўцы, які належаў памешчыку Антону Калантаю (на заводзе працавалі тры цагляныя печы. На працягу года выраблена шкла ліставога звычайнага, цаною за скрынку ў 120 лістоў па 10 руб. сер.—750 скрынак, на суму 7500 р.); у в. Ляшчынка, якая належала памешчыкам Галынскім (тут за год было выпушчана ліставога шкла на суму 5850 р.). На пералічаных шкляных прадпрыемствах працавала ад 30 да 40 прыгонных[27]. Выраблена шкло збывалі ў асноўным у г. Кіеў. Акрамя шкляных, у Чэрыкаўскім павеце працавалі крупадзёрныя і гарбарныя заводы. Крупадзёрныя заводы памешчыкаў Галынскіх на р. Бесядзі і памешчыка Васілеўскага на р. Сянне сваю прадукцыю прадавалі ў Віцебскай, Смаленскай, Чарнігаўскай, часткова Магілёўскай губернях. Гарбарныя заводы працавалі пры фальварку Міхаліне (в. Гута) і в. Хоцімск. За 1859 г. на іх было выраблена прадукцыі суадносна на 24 000 р. і 1400 р.[28]

Але асноўным заняткам на Чэрыкаўшчыне ў сярэдзіне XIX ст. па-ранейшаму заставалася земляробства з трохпольнай сістэмай сельскай гаспадаркі, якую падтрымлівала вінакурства. Тутэйшыя памешчыкі лічылі вінакурства адзіным сродкам для ўтрымання дастатковай колькасці жывёлы для ўгнаення зямлі. Землі Чэрыкаўскага павета адносіліся ў той час да сярэдняга, другога, разраду (па якасці землі губерні падраздзяляліся на тры разрады). Ворнай зямлі ў павеце было 114 056 дзес. У асноўным сеялі жыта, авёс і ячмень. Пасевы гароху, грэчкі, каноплі, ільну і пшаніцы былі нязначнымі. Сярэднія цэны на прадукты сельскагаспадарчай пра-

цы ў 1848 г. былі наступныя: чвэрць жыта каштавала 4 р. 80 к., пшаніцы — ад 6 да 8 р. 50 к., ячменю — 4—5 р., аўса — 2—3 р., гароху — 7 р. , бабоў — 6 р. і грэчкі — 4 р. Падзённая плата работнікаў залежала ад ураджаю і складала ад 8 да 25 к. сер.; работнікам за год плацілі ад 10 да 15 р. сер. Пры працяглых неўраджаях урад адпускаў у пазыку грошы на прадукты харчавання для насельніцтва, яшчэ дазвалялася браць хлеб з сельскіх запасных магазінаў; беззямельным дваранам, адстаўным салдатам і іх жонкам хлеб таксама адпускаў урад. Для таго каб мець запасны харчовы капітал, у павятовае казначэйства з кожнай рэвізскай душы ўносілі па 3 к. сер.[29]

Асаблівую ўвагу ў Чэрыкаўскім павеце звярталі на развядзенне буйной рагатай жывёлы. Паводле справаздачы магілёўскага губернатара за 1847 г. аб стане сельскай гаспадаркі губерні, датаванай 23 сакавіка 1848 г., у павеце было 42 755 галоў рагатай жывёлы — гэта адзін з самых значных паказчыкаў па Магілёўскай губерні. Акрамя таго, у павеце налічвалася 29 653 кані, 19 461 простая авечка, 18 713 свіней і 2056 коз. (У г. Чэрыкаве было: 650 галоў рагатай жывёлы, 500 коней, 180 авечак, 420 свіней, 100 коз.)[30]

У ліку паветаў Магілёўскай губерні, багатых будаўнічым і карабельным лесам, быў і Чэрыкаўскі павет. Гэта і абумовіла развіццё ў павеце такой галіны, як лесаводства[31].

На асноўныя заняткі жыхароў Чэрыкаўскага павета ўказваў у сваіх справаздачах і магілёўскі губернатар. Ён, у прыватнасці, адзначаў, што жыхары займаліся ў асноўным хлебаробствам, некаторыя з іх займаліся «ляснымі вырабамі». У павеце выраблялiся скуры і гліняная пасуда, якая ўжывалася ў быту простага народа[32].

Аб занятках жыхароў г. Чэрыкава захаваліся звесткі, прыведзеныя ў кнізе «Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861—1862 гг.», выданай у Санкт-Пецярбургу ў 1863 г.

«Ремесленная промышленность в Черикове так ничтожна, что едва удовлетворяет немногосложным потребностям местного населения. Не все жители города находят пропитание на месте, часть уходит для заработков в другие места. Паспортов на отлучки выдано в 1861 г. 76, из того числа: купцам 15, мещанам христианам 35 и евреям 26, и краткосрочных видов: христианам 10 и евреям 12. Хлебопашеством занимаются в городе все вообще мещане христиане; они обрабатывают большею частию собственную землю, частию же арендуют у соседних помещиков. Городу принадлежит земли всего около 2000 дес.; в том числе: усадебной 35 дес. 446½ саж., пахотной и огородной 1853 дес. 18 саж. и сенокосной 112 дес. 1173 саж.»

Паводле звестак губернскага статыстычнага камітэта за 1861 г., у Чэрыкаве «паказана рамеснікаў: хлебнікаў і булачнікаў 28, мяснікоў 9, маслабойнікаў 10, краўцоў 64, шаўцоў 44, печнікоў 4, сталяроў 12, меднікаў 7, кузняцоў 14, сцякольшчыкаў 2, часаўшчык 1, канавал 1, маляроў 2, пераплётчыкаў 2, цесляроў 5; усяго 205, з таго ліку майстроў 127». У горадзе было 72 крамы, гасцініца і 10 корчмаў[33].

Гандлем у павеце займаліся ў асноўным яўрэі. Яны скуплівалі ў памешчыкаў сыравіну, якую часткова прадавалі ўнутры губерні, часткова збывалі ў Чарнаморскія і Балтыйскія порты. Пянька, канаплянае і льняное семя і гарэлка прадаваліся ўнутры губерні; лес сплаўлялі ў Херсон; смалу і дзёгаць — у Малярусію. У павет увозіліся: хлеб, шаўковыя, шарсцяныя і бумажныя тканіны, жалеза, сала, свечкі, цукар[34]. За межы павета ў асноўным

збывалі сваю прадукцыю парусны завод у в. Гута (у г. Рыгу), шкляны ў в. Лысаўка (у г. Крамянчуг). На ўнутрыгубернскі рынак працавалі гарбарны завод у в. Гута, медзеплавільны і гарбарны заводы ў ф. Задобрасць[35].

У сярэдзіне XIX ст. кірмашы паранейшаму заставаліся галоўнымі гандлёвымі цэнтрамі. У 1846 г. у Чэрыкаве былі праведзены чатыры кірмашы: Саборны — 8 сакавіка (было прывезена тавару на 220 р. сер., прададзена на 200 р. сер.); Троіцкі — 8 чэрвеня (прывезена тавару на 196, прададзена на 180); Пакроўскі — 1 кастрычніка (прывезена тавару на 235, прададзена на 220); Красны — 27 снежня (прывезена тавару на 255 р. сер., прададзена на 240 р. сер.). У гэтым жа годзе ў Чэрыкаўскім павеце адбыліся наступныя кірмашы: у м. Крычаў — у 10-ю пятніцу па вялікадні; у м. Краснаполле — Афанасьеўскі (16 студзеня), Духаўскі (у дзень сашэсця Святога Духа), Прачыстай (15 жніўня), Мікалаеўскі (6 снежня)[36]. Самым многалюдным з гэтых кірмашоў быў Афанасьеўскі. На ім ішоў гандаль хлебам і пянькой. Пазней кірмашы праводзіліся і ў с. Самацеевічы[37]. Сяло Горы таксама «вядома сваім кірмашом рагатай жывёлай і коньмі ў дзесятую пятніцу пасля Светла-Хрыстова Уваскрашэння»[38].

Для пераправы цераз р. Сож у сярэдзіне XIX ст. у г. Чэрыкаве выкарыстоўвалі летам плыт на канаце, які паднімаў груз да 400 пуд., а вясной — байдак, які паднімаў 200 пуд. Пры в. Мірагошч для пераправы служыў такі ж плыт, а вясною — 2 паромы. У 1847 г. з прыстаняў, якія знаходзіліся ў Чэрыкаўскім павеце, было адпраўлена грузаў: у м. Крычаў — адно судна, тавару было на суму 1760 р.; у г. Чэрыкаве — адно судна, тавару было на суму 1500 р.; у с. Гронава — два судны і 13 плытоў, тавару было на суму 12 909 р.; у с. Манастырок — адно судна, 47 плытоў, тавару было на суму 20 344 р.; у с. Ушакоўка — 7 суднаў, 41 плыт, тавару было на суму 21 854 р.[39]



«Купчая крэпасць». Дакумент на продаж памешчыкам прыгоншага селяніна з в. Мышкавічы Чэрыкаўскага павета Мацея Зылёва з жонкай Пелагеяй і сынам Андрэем за 100 р. Захоўваецца ў гістарычным архіве ў Магілёве.

У першай палове XIX ст. па тэрыторыі Чэрыкаўскага павета праходзіла дарога з Магілёва да Рослаўля, яна мела разрад малой, ці павятовай, дарогі. На працягу гэтай дарогі было 7 станцый, у тым ліку і ў Чэрыкаве. У гэты ж час ішло будаўніцтва шашы Масква — Варшава, якая таксама пралягла праз Чэрыкаўшчыну. Праз павет пралягалі гандлёвыя дарогі з Маларусіі на поўнач, у прыватнасці з Чарнігаўскай губерні. Па гэтай дарозе з Маларусіі ў Магілёўскую губерню дастаўляліся хлеб, масла, рагатая жывёла і коні. Ад Новага Быхава да Чэрыкава праходзіла так званая «ўнутраная гандлёвая дарога», якая «ідзе праз Палкі, Быхань і Ржаўку да Прапойска па мясцовасці нізіннай, балоцістай і лясістай, а ў Чэрыкаўскім павеце па мясцовасці роўнай і скрозь крытай лясамі». Дарога ад Прапойска да Чэрыкава — былая паштовая. У гандлёвых адносінах гэта дарога служыла для ўнутранай сувязі паміж Чэрыкаўскім, Бы-

хаўскім і Рагачоўскім паветамі[40].

Гісторыя захавала скупыя звесткі аб гарадскіх даходах Чэрыкава. У 1836 г., напрыклад, з-за недастатковасці гарадскіх даходаў было дазволена «на ўтрыманне памяшканняў у гэтым горадзе праводзіць з казны па 2000 р. асігнацый у год»[41]. У 1840 г. гарадскія даходы склалі 4740 р. 66 к. серабром[42]. У 1858 г. у Чэрыкаве «даходы звычайныя склалі 1089 р. 78 к.; расходы бягучыя — 933 р. 75 3/4 к.; капітал непарушны — 65 р. 23 к.»[43]

У сярэдзіне XIX ст. абвастрылася палітычнае становішча ў краіне. Нарастала нездаволенасць сялян прыгонніцтвам. Гэта прымусіла ўрад пайсці на рэформы. У 1861 г. было адменена прыгоннае права. Пачаўся новы этап у гісторыі краіны, які характарызаваўся станаўленнем і развіццём капіталізму.

[1] Городские поселения Российской империи. Т. 3. Спб., 1863. с. 156.

[2] Закалинская Е. П. Вотчинные хозяйства Могилевской губернии во второй половине XVIII в. Могилев, 1958. С. 25.

[3] Опыт описания Могилевской губернии / Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1. Могилев, 1882. С. 119, 120.

[4] Турчинович О. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. Спб., 1857. С. 217.

[5] Городские поселения Российской империи. Т. 3. Спб., 1863. С. 156, 203.

[6] Опыт описания Могилевской губернии / Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1. Могилев, 1882. С. 122.

[7] Белецкий А. Заботы Императрицы Екатерины II о распространении образования в Полоцкой и Могилевской губерниях // Императрица Екатерина II. Сб. истор. статей. Вильна, 1904. С. 442. 452. 459.

[8] Городские поселения Российской империи. Спб., 1863. С. 203.

[9] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 269.

[10] Городские поселения Российской империи. Т. 3. Спб. , 1863. С. 203.

[11] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 193.

[12] Опыт описания Могилевской губернии / Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1. Могилев, 1882. С. 122.

[13] Закалинская Е. П. Вотчинные хозяйства Могилевской губернии во второй половине XVIII в. Могилев, 1958. С. 49, 51.

[14] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 99.

[15] Закалинская Е. П. Вотчинные хозяйства Могилевской губернии во второй половине XVIII в. Могилев, 1958. С. 58, 61, 67—69.

[16] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 114, 128, 138, 139, 144.

[17] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 17—18.

[18] Опыт описания Могилевской губернии / Под ред. А. С. Дембовецкого. Могилев, 1882. Кн. 1. С. 152.

[19] Статистическое изображение городов и посадов Российской империи по 1825 год. Спб., 1830. С. 88—89.

[20] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 512, 529, 534, 543.

[21] Статические таблицы о состоянии городов Российской империи. Спб., 1852.

[22] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 568.

[23] Военно-статистическое обозрение Российской империи. Т. VIII. Ч. 3. Могилевская губерния. Спб., 1848. С. 64.

[24] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 367.

[25] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 290—291.

[26] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 399.

[27] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 289—290.

[28] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 402.

[29] Военно-статистическое обозрение Российской империи. Т. VIII. Ч. 3. Могилевская губерния. Спб., 1848. С. 67.

[30] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 289.

[31] Военно-статистическое обозрение Российской Империи. Т. VIII. Ч. 3. Спб., 1848. С. 69.

[32] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 366.

[33] Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861—62 гг. Ч. 1. Спб., 1863. С. 28—29.

[34] Военно-статистическое обозрение Российской империи. Т. VIII. Ч. 3. Спб., 1848. С. 71.

[35] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 367—368.

[36] Военно-статистическое обозрение Российской империи. Т. VIII. Ч. 3. Спб., 1848. С. 72—73.

[37] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 504.

[38] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 229.

[39] Военно-статистическое обозрение Российской империи. Т. VIII. Ч. 3. Спб., 1848. С. 28—29.
[40] Тамсама. С. 39, 43, 44, 48—49.
[41] Городские поселения Российской империи. Т. 3. Спб., 1863. С. 204.
[42] Статистические таблицы о состоянии городов Российской империи, великого княжества Финляндского и царства Польского. Спб., 1842. С. 21.
[43] Городские поселения Российской империи. Т. 3. Спб., 1863. С. 204.

С. Кагадзеева. Пераклад на бел. мову Т. Рутковскай.

СА СПРАВАЗДАЧЫ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА ЗА 1804 Г. АБ ХВАЛЯВАННІ СЯЛЯН КАШАНСКАГА СТАРОСТВА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

24 лютага 1805.

...Крестьяне Чериковского пов. казенного ведомства Кошанского староства, всемилостивейше пожалованного по смерть г-ну ст. сов. Голынскому с платежом арендных денег, имея от 1798 г. разные претензии к арендаторам их о излишних якобы противу контракта повинностях, о которых земскою полициею вообще с членами казенной палаты окончено исследование 1803 г., и для получения учинения по оному законного положения (передано) в Чериковской поветовый суд минувшего 1804 г. в апреле месяце, когда приказано было от арендатора, чтобы приступили к обрабатыванию полей, отозвались, что как они имеют разные претензии к нему, то никаких повинностей отправлять не будут, а о таковом отзыве донесено земской полиции, которая, тотчас отрапортовав губернскому начальству, командировала в то староство члена своего для водворения тишины и послушания, который хотя и объявлял им, что ежели требования их по рассмотрению суда окажутся справедливыми, то они получат следующее удовлетворение, и внушал им, чтобы, уклонясь от таковых противузаконных поступков, оставались в послушании, но они всему тому не повиновались.

Между тем, по донесению полиции, был от меня командирован советник казенной палаты в помянутое староство для исследования вообще с нижним земским судом как о вновь причиненных обидах, так и об изыскании начинщиков ослушания.

По съезде в то староство советника палаты и нижнего земского суда внушаемы были всем крестьянам обязанности их по контракту и инвентарю своему арендатору, но крестьяне оставались несколько дней в прежнем своем заблуждении, наконец, будто убедившись и раскаясь, объявили, что они будут повиноваться, и приступили некоторые из них к работе. Тогда командированный чиновник, видя их успокоенными, приступил к формальному исследованию для открытия начинщиков неповиновения, также и жалоб крестьян на притеснение; по исследовании открылось, что после произведенного в 1803 г. следствия никаких обид от арендатора крестьянам делано не было; относительно же непослушания, то крестьяне в допросах своих учинили показание, что имели в доме крестьянина Павла Авхимова 2 раза сходбище; в первом старостенский голова Корней Авхимов, поверенный от старостваВасилий Емельянов да крестьяне Павел Тарунь и Петр Шарай присягали один за другого вступаться и даже целовали образ; истинная же цель их намерения была та, чтобы непременно выйти из подаренного владения; а во второй все вообще крестьяне сделали согласие не повиноваться своему арендатору.

Крестьяне, сделавшие взаимные клятвенные присяги, были взяты под стражу и отосланы с следствием для поступления по законам в поветовый суд.

Крестьянам подтверждено оставаться в повиновении и объявлено, что они в справедливых своих желаниях получат удовлетворение, но старостенские крестьяне, видя намерения свои ничтожными и что виновные преданы законному суждению, паки сделались ослушными и при отправлении подсудимых в поветовый суд вслед за ними шли, крича, чтобы всех их брали, а они повиноваться не станут; хотя ж командированный советник и члены полиции убеждали их к послушанию, но старания их оставались тщетны. Получив о сем рапорт, я поехал сам в староство, где, собрав всех их вместе и войдя один в их круг, толковал им, как отец детям, их заблуждение, последствия которого потерпят за непослушание, растолковал им обязанность их по контракту и инвентарю, входил в рассмотрение всех их жалоб и доказал им, что после сделанного уже следствия и которое препровождено в суд, обид им никаких не сделано, но все единогласно мне отвечали, что в арендном содержании у Голынского оставаться не хотят и чтобы я отдал их другому.

Неудобство говорить с толпою 500 человек заставляло меня, избрав из них 3 человек благоразумнейших, которым, повторя все то, что говорил прежде, приказал им растолковать прочим крестьянам долг их повиноваться арендатору, которому высочайше пожалованы в пожизненное владение, что иначе за продолжение их неповиновения строго наказаны будут, за послушание же оставлю при них чиновника, который будет наблюдать, чтобы служба и повинности их исполнялись по контракту, но когда и сих 3 человек внушения над толпою действия не имели, то вторично входил я в их круг и почти поодиночке убеждал, дабы сим способом отделить волнующихся от покорных, но вообще всех нашел закоренелыми и твердыми в намерении своем не повиноваться арендатору.

Как же непослушание их имело сей действительно предмет, других же намерений не найдено, ибо, впрочем, с трудолюбием занимались своими домашними работами, то рассудить, что для лучшего их вразумления должны они быть наказаны по судебному приговору, но которым должно было поспешить, ибо известно мне было, что многие соседственные старостваа, в коих число душ до несколько тысяч простирается, ожидали конца сего дела.

Оставя в сем старостве советника казенной палаты и члена земской полиции, дав им полное наставление, поехал в Чериков, где предложил тамошнему поветовому суду, чтобы о немедленном времени окончен был суд над представленными того старостваа крестьянами, и в то же время донес о всем подробно г-ну белорусскому военному губернатору по нарочной эстафете, прося, что когда сие дело, поступив на ревизию к е. в.-п., то по рассмотрении по эстафете же было возвращено для исполнения.

Вследствие моего предложения дело об ослушании крестьян тотчас было решено в нижней инстанции, обревизировано Главного суда в 1-м департаменте, представлено на утверждение г-на военного губернатора и им утверждено.

Решением же приговорено: крестьян — голову Корнея Авхимова и Павла Вора, по наказании 20 ударами кнутом, сослать в Нерчинск на работу, а Павла Таруна, выборного Семена Родионова и Петра Щаря, по наказании кнутом 20 ударами, оставить на прежнем жилище с тем, ежели б по таковом наказании прочие крестьяне не сделались послушными, то не отсылая их к суждению, наказать плетьми по мере преступления на месте. Таковое решение и исполнено августа 30-го дня.

При исполнении оного многие того старостваа крестьяне не хотели еще повиноваться, но когда из них 7 человек наказаны плетьми от 1 до 20 ударов, то как сии, так и все прочие того старостваа крестьяне объявили, что будут послушны, что они во всей точности исполнят, раскаиваясь в прежнем своем заблуждении.

В продолжение сего неустройства было от меня доносимо г-ну белорусскому военному губернатору; прочих же происшествий, нарушающих гражданский порядок, не было...

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. IV. Мн., 1979. С. 185—188.

З ЗАПІСКІ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ПРАДВАДЗІЦЕЛЯ ДВАРАНСТВА АБ ПАДЗЕЯХ ВАЙНЫ 1812 г. У ГУБЕРНІ

25 студзеня 1837 г.

...Во время кровопролитного сражения, ознаменовавшегося при дер. Салтановке, взят был неприятелем гор. Могилев и окрестные уезды. Пока не установилось устройство, бурный беспорядок был ужасом для каждого на целом пространстве сего края, которое занято уже было неприятелем, происходили разного рода неистовства, а некоторые малодушные крестьяне предавались волнению против власти помещиков (мародеры поселяли в них более такой дух), производили грабеж, разоряли помещичьи усадьбы, расхищали имущества, и, наконец, последнее стремление соделалось в губернии общим, число мародеров постепенно умножалось и алчность их к разорению помещиков немало почти не пресекалась военною властью.

Пожертвования в отношении к подкреплению неприятеля никакого добровольного от Могилевской губ. не было, а даже всякое о том предположение отдалено было от образа ее верноподданнических мыслей. Доставление же отечественных припасов для неприятельских войск происходило... вынужденными военною силою мерами.

От внезапного похищения неприятелем драгоценных имуществ у помещиков, от разрушений строений, и разных коммерческих заведений и фабрик, кои до того

были в цветущем состоянии, от истребления скотоводства, на полях хлеба и сенокосов Могилевская губ. понесла потери до 18 000 000, не говоря о потери той, которая и не могла войти в таковое примерное исчисление, и кроме потери значительного числа людей, подвергшихся в то время смертности.

Никаких частных подвигов от Могилевской губ. в отношении к неприятелю оказываемо не было, а достойно замечания то, что многие семейные фамилии, видев приближение пожара войны, оставляя свои жилища на произвол, удалялись во внутренние государства области, где могли иметь в виду для себя верное прибежище; прочие все, пребыв в верноподданническом непоколебимом духе преданности к законному своему государю императору, выполняли одно только то по воле неприятеля, чему власть его на тот раз их вынуждала...

Потери, исчисленные примерно уездами: Могилевским, Сенненским, Чериковским, Рогачевским, Быховским, Бабиновичским, Копысским и Мстиславским, более потерпевшими от военных действий, показаны выше. Потеря их народонаселения показывается тем, что по ревизии 1811 г. состояло помещичьих и духовных крестьян по губернии мужеска пола 359 946 душ, а по ревизии 1816 г. осталось 287 149 душ, следственно, убыль в одном низшем классе людей, принадлежащих помещикам, состояла из 72 797 душ, но сколько считалось домов до разорения и сколько их осталось после — по давности времени невозможно почерпнуть достоверных сведений...

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. IV. Мн., 1979. С. 51—52.

ДАЗВОЛ НА ПАБУДОВУ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў С. ІНВАНДОР

Управление генерал-губернатора Витебского, Могилевского и Смоленского по канцелярии отделение

Стол 3

19 ноября 1847 года
Г. Витебск

О дозволении построить в селении Инвандор Чериковского уезда Могилевской губернии Р. К. Церковь

Господину Могилевскому Гражданскому Губернатору

В последствие представления Вашего Превосходительства от 14 августа сего года за № 11028, основываясь на полученном мною ныне от Г. Министра Внутренних Дел отношении, предлагаю Вам сделать зависящее от Вас распоряжение о дозволении построить в имении помещика Могилевской Губернии Чериковского уезда Игнатия Голынского, селении Инвандарь, новую каменную Римско-Католическую церковь, вместо ветхой деревянной, по плану и фасаду, рассмотренному Могилевскою Строительною Комиссиею и отосланному Львом Алексеевичем Перовским к духовному Римско-Католическому Начальству, которому предложено для зависящему по сему предмету распоряжения по части духовной.

Генерал-Губернатор,
Генерал-Лейтенант (подпись)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2001, воп. 1, спр. 406, л. 20.

Яны пісалі пра Чэрыкаўшчыну

Без-Карніловіч Міхаіл Восіпавіч [29.9(10.10).1796, Магілёўская губ.— 7(19).1.1862], беларускі гісторык, краязнавец і этнограф, вайсковы тапограф, статыстык, генерал-маёр рускай арміі. Пад яго кіраўніцтвам у 1831—1847 праводзілася тапаграфічнае і вайскова-статыстычнае вывучэнне Мінскай, Наўгародскай, Віцебскай, Валынскай губерняў і Беластоцкай акругі. У час знаходжання на Беларусі збіраў гістарычныя і этнаграфічныя матэрыялы, на падставе якіх выдаў кнігу «Гістарычныя звесткі пра выдатныя месцы на Беларусі з дадаткам іншых

звестак, якія да яе ж адносяцца» (Спб., 1855), у якой разглядаў таксама пытанні этнічнай тэрыторыі, побыту і культуры беларусаў. Тэрыторыю Беларусі абмяжоўваў Віцебскай і Магілёўскай губернямі, астатнія землі называў Літвой. Беларусамі лічыў толькі «нашчадкаў крывічоў», разам з тым гаварыў пра беларусаў як пра асобны народ і ставіў іх у адзін рад з суседнімі народамі. Апісаў яго цяжкае жыццё, аднак прапаноўваў ссяляць сялян у вялікія вёскі, захоўваць патрыярхальныя сем'і і нават злучаць у адну сям'ю (адзін двор) невялікія сем'і суседзяў. Асобныя раздзелы кнігі прысвяціў апісанню народных абрадаў, звычаяў, вытворчай дзейнасці, народнай метэаралогіі.

Аўтар кнігі «Віцебская губерня» (1852).

Дамбавецкі Аляксандр Станіслававіч (1840 — пасля 1914), краязнавец і грамадскі дзеяч. У 1872—1893 магілёўскі губернатар, з 1893 сенатар. Ініцыятар выдання і рэдактар калектыўнай працы «Вопыт апісання Магілёўскай губерні ў гістарычных, фізіка-геаграфічных, этнаграфічных, прамысловых, сельскагаспадарчых, лясных, вучэбных, медыцынскіх і статыстычных адносінах...» (кн. 1—3, Магілёў, 1882—1884), дзе дадзена характарыстыка асноўных заняткаў насельніцтва, матэрыяльнай і духоўнай культуры жыхароў Магілёўшчыны. Змешчана каля 500 калядных (зімовых), веснавых, летніх, вясельных і рэлігійных песень. Апісаны абрады вяселля, хрэсьбін, пахавання, памінак, народныя святы і звычаі, дажынкі, талака, розныя гульні, павер'і, прымхі і забабоны, помнікі археалогіі, архітэктуры, адметныя мясціны губерні, гісторыя значных населеных пунктаў; прыведзены каляндар сямейнага народнага побыту на кожны месяц і на цэлы год, назвы лекавых раслін і іх прызначэнне. Ініцыятар стварэння губернскага гісторыка-этнаграфічнага музея ў Магілёве (1879). Садзейнічаў вывучэнню гісторыі і этнаграфіі Магілёўшчыны, правядзенню археалагічных раскопак у Падняпроўі.

Меер Андрэй Казіміравіч, беларускі краязнавец 2-й пал. XVIII ст. Аўтар працы «Апісанне Крычаўскага графства або былога староства», складзенай у 1786 , у якой побач з характарыстыкай прыродна-геаграфічных умоў, стану сельскай гаспадаркі і мануфактурных прадпрыемстваў, складу насельніцтва па этнічнай і канфесіянальнай прыкметах апісаў народны побыт і культуру беларусаў, змясціў некалькі беларускіх фальклорных твораў. Яго праца — каштоўная крыніца для вывучэння гісторыі і культуры Беларусі. Рукапіс зберагаецца ў архіве Казанскага універсітэта.

Раманаў Еўдакім Раманавіч [30.8(11.9).1855, мяст. Нова-Беліца, цяпер у межах Гомеля — 20.1.1922], беларускі этнограф, фальклярыст, археолаг. Правадзейны член Рускага геаграфічнага таварыства (1886), Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (1888), Маскоўскага археалагічнага таварыства (1890, член-карэспандэнт — 1886), Віцебскага статыстычнага камітэта (1891). Скончыў Гомельскую прагімназію (1870), курсы настаўнікаў рускай мовы і гісторыі (1872). Працаваў настаўнікам (1872—1886), інспектарам народных вучылішчаў Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў (1886—1906), член Часовай камісіі па ўладкаванню Віленскай публічнай бібліятэкі і музея (1906—1916). У 1897—1903 рэдактар неафіцыйнага аддзела газеты «Могилевские губернские ведомости»; у 1900—1903 пад яго рэдакцыяй выдадзены 3 вы-

пускі «Могилевской старины». З 1910 загадчык секцыі этнаграфіі і археалогіі Паўночна-Заходняга аддзялення Рускага геаграфічнага таварыства. З 1917 жыў у Стаўрапалі. Вывучаў матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў: жыллё, адзенне, сямейны побыт, народныя абрады, вераванні, народны каляндар і медыцыну, дзіцячыя гульні. Апублікаваў больш за 200 прац па этнаграфіі, фальклору, гісторыі, археалогіі і мове беларусаў, больш за 10 тысяч фальклорных твораў. Адстойваў права беларускага народа на развіццё нацыянальнай культуры, мовы, навукі і літаратуры. Асноўная фальклорна-этнаграфічная праца — «Беларускі зборнік» (вып. 1—9, 1886—1912) — своеасаблівая энцыклапедыя побыту і культуры беларусаў дарэвалюцыйнага часу. Сярод прац: «Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні» (вып. 1—2, 1911—1912), «Крыніцы для гісторыі Магілёўскага краю» (вып. 1, 1916). У 1886—1894 вёў археалагічныя раскопкі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях, адкрыў помнік эпіграфікі XII ст. Барысаў камень (каля в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна). Склаў археалагічныя карты Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў. Сабраў звесткі пра 1000 гарадзішчаў Беларусі, выявіў шмат стаянак першабытнага чалавека, вёў антрапалагічныя даследаванні. У 1901 апублікаваў (са скарачэннямі) працу А. Меера «Апісанне Крычаўскага графства 1786 года». У 1900 выдаў зборнік «Тарас на Парнасе і іншыя беларускія вершы» (у 1902 дапоўненае выданне).

Севяргін Васіль Міхайлавіч [8(19).9.1765, Пецярбург — 17(29).11.1826], рускі мінералог і хімік, асветнік. Акадэмік Пецярбургскай АН (1793). Ганаровы член многіх рускіх і замежных навуковых таварыстваў, у т. л. Віленскага універсітэта (1803). Скончыў універсітэт у Пецярбургу, удасканальваў веды ў Гётынгенскім універсітэце ў Германіі (1785—1789). Адзін з заснавальнікаў рускай мінералагічнай школы. У пачатку XIX ст. двойчы пабываў у беларускіх губернях. Свае ўражанні адлюстраваў у «Запісках падарожжа па заходніх правінцыях Расійскай дзяржавы...» (1803) і «Працягу запісак...» (1804), дзе змешчаны звесткі пра беларускія гарады і пасёлкі, побыт насельніцтва, стан эканомікі і асветы, апісаны прыродныя, гістарычныя і бытавыя з'явы.

Друкуецца па кн.: Этнаграфія Беларусі. Мн., 1989.

З запісак падарожніка

Повествуют, что уездный город Чериков построен был в 1604 году по велению Короля Польского Сигизмунда III, и был по 1778 год местечком, принадлежащим к дворцовым волостям, определенным на столовое содержание Королю. Монастырей здесь нет. Церквей Грекороссийских две, Католическая одна. Казенных каменных домов два, из коих в одном находится малое народное училище, в коем было 42 ученика.

Обывательских домов деревянных по плану 410. Лавок торговых деревянных 21. В двух верстах от города находится мучная водяная мельница.

Жителей

Купцов	Христиан	12
—»—	евреев	8
Мещан	Христиан	75
—»—	евреев	1576
Разного рода мастеровых		114

Ярмарки бывают две, одна в Троицин день, а другая 1-го Октября, и продолжаются по неделе.

В рассуждении уезда к сему городу принадлежащего, приметить должно: 1) что озер, примечания достойных, в оном нет; 2) реки через сей уезд протекают Сож и Проня, и малыя Ипуть, Беседь, Остръ, Волчас и Удога; 3) рыба в нем щука, караси, окуни, ерши, плотва, лини, налимы, красноперки и иногда вырезуб; 4) лесов довольно, особливо по течению Сожа на левой стороне к малой России, а по правой мало; 5) земля на левой стороне Сожа песчаная, и по правой на глинистом основании чернозем; 6) в сенокосных лугах умеренное изобилие; 7) звери здесь водятся медведи, волки, лисицы, зайцы и рыси.

Я примечу еще, что в Черикове нашел я многих, как взрослых людей, так особливо детей, страдавших глазною болью с опухолью, так как в Чаусах поносами, а в Толочине лихорадкою, почти эпидемическою. Бедные люди едва находили средства к своему исцелению. Надежные лекарства им неизвестны, а искусные врачи редки.

Друкуецца па кн.: Севергин В. Продолжение записок путешествия по западным провинциям Российского государства. Спб.. 1804.

У ПАРЭФОРМЕННЫ ЧАС

У другой палове XIX — пачатку XX ст. тэрыторыя сучаснага Чэрыкаўскага раёна ўваходзіла ў склад Даўжанскай, Камаровіцкай, Лабанаўскай, часткі Беліцкай, Дубровіцкай, Краснапольскай і Старынскай валасцей Чэрыкаўскага павета. Паводле даных Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г., на гэтай тэрыторыі налічвалася 93 населеныя пункты з насельніцтвам 27 786 чал. Акрамя павятовага горада Чэрыкава, тут знаходзілася 5 сёл, 47 вёсак, 15 фальваркаў, 5 хутароў, 5 маёнткаў, а таксама аколіцы, лясныя старожкі, выселкі, паштовыя станцыі. Буйнейшымі населенымі пунктамі з'яўляліся сёлы Язёры (1059 жыхароў), Лабанаўка (995), Камаровічы (581), Доўгае (512), вёскі Вепрын (1197), Наркі (1138), Зоры (756), Глінь (727), Лобча (686), Паходавічы (679), Гіжня (652), Баровая (645), Рагаліна (623), Вусце (586), Вербеж (584), Вохар (567), Шароеўка (556), Ржавец (512). У кожным з іх налічвалася ад 70 да 170 двароў. У 6 вёсках пражывала больш чым 400 чал., у 8 — 300, у 5 — 200, у 11 — 100 чал.[1]

Паводле перапісу, у 16 валасцях Чэрыкаўскага павета* пражывала 150 277 чал. Пераважную большасць насельніцтва складалі беларусы — 134 640 чал. Побач з імі жылі рускія — 1048, украінцы — 510, а таксама яўрэі, палякі, літоўцы, латышы, немцы[2]. Звяртае на сябе ўвагу прыкметная праслойка яўрэйскага насельніцтва — 12 943 чал.[3] Яе наяўнасць тлумачыцца радам гістарычных прычын. На тэрыторыі Беларусі яўрэі з'явіліся на рубяжы XIV—XV ст. Пачынаючы з Пятра I, царызм пастаянна абмяжоўваў тэрыторыю іх рассялення ў Расійскай імперыі. У 1796 г. была ўведзена

* У склад Чэрыкаўскага павета ўваходзіла Беліцкая, Брацькавіцкая, Даўгавіцкая, Даўжанская, Дубровіцкая, Камаровіцкая, Краснапольская, Крычаўская, Лабанаўская, Маляціцкая, Мхінічская, Наваельнінская, Палужская, Самацеевіцкая, Старынская, Студзянецкая воласці. На гэтай тэрыторыі знаходзіліся 690 населеных пунктаў (1 горад, 6 мястэчак, 35 сёл, 301 вёска, 61 маёнтак, 98 фальваркаў, 120 хутароў, 69 пасёлкаў, аколіц, засценкаў, выселкаў, паштовых станцый). У павеце дзейнічала 49 цэркваў, капліц, 5 касцёлаў, стараверскі скіт. У сапраўдны час частка гэтай тэрыторыі ўваходзіць у склад Клімавіцкага, Краснапольскага, Крычаўскага, Мсціслаўскага і Слаўгарадскага раёнаў.

дыскрымінацыйная «рыса аседласці», за межамі якой прадстаўнікам гэтай нацыянальнасці пражываць не дазвалялася. Яна ахапіла Правабярэжную Украіну, Літву, Беларусь. Нават у межах «рысы аседласці» яўрэям забаранялася сяліцца ў вёсках. Гэта прывяло да вялікай колькасці яўрэйскага насельніцтва ў гарадах і мястэчках.

Па канфесіянальнай адзнацы насельніцтва павета размяркоўвалася наступным чынам: праваслаўныя — 135 333 чал., іудзеі — 12 956, рымска-католікі — 1667, пратэстанты — 152 чал.[4]

Чэрыкаўскі павет па праву можна назваць сялянскім. Тут пражывала 129 629 сялян, якія складалі 92 % усяго насельніцтва. У павеце налічвалася 5249 дваран, 558 прадстаўнікоў духавенства, 195 купцоў, 17 094 мяшчан[5].

У павятовым цэнтры — горадзе Чэрыкаве ў 1870 г. пражывала 3853 чал. К 1897 г. колькасць жыхароў выросла да 5249 чал., а праз 10 гадоў — да 6080 чал. Палову жыхароў складалі яўрэі.

У другой палове XIX — пачатку XX ст. Чэрыкаў прадстаўляў сабой тыповы павятовы горад, якіх было нямала на Беларусі. Яго плошча складала 1 вярсту 145 кв. саж. У горадзе было 2 плошчы, 22 вуліцы і завулкі агульнай даўжынёй 8 вёрст 1400 саж. На працягу дзвюх вёрст тратуары былі драўляныя. Упрыгожаннем горада з'яўляўся бульвар плошчай 4100 кв. саж. Чэрыкаў быў забудаваны аднапавярховымі дамамі. Практычна ўсе яны былі драўлянымі (712 з 720). За парадкам у горадзе сачылі паліцэйскі наглядчык і 13 гарадавых.

Прамысловасць горада была прадстаўлена такімі дробнымі прадпрыемствамі, як маслабойныя, крупадзёрныя, цагляны і салатопны заводы. У пачатку XX ст. у Чэрыкаве дзейнічала панчошна-вязальная фабрыка, на якой было занята каля 300 рабочых, з іх 200 працавалі дома.

З навучальных устаноў існавалі 4-класнае мужчынскае вучылішча, гарадское, два прыходскія, пачатковае яўрэйскае, царкоўнапрыходская школа.

У горадзе меліся аптэка, 2 бальніцы, у якіх працавалі 3 урачы, 5 фельчараў, 3 акушэркі.

Чатыры разы ў год у горадзе наладжвалі кірмашы[6].

Другая палова XIX ст.— час глыбокіх перамен ва ўсіх галінах жыцця Расіі. Глыбокі крызіс феадальна-прыгоннай сістэмы і рост вызваленчага настрою выклікалі на рубяжы 50—60-х гадоў першую ў айчыннай гісторыі рэвалюцыйную сітуацыю, якая ў канчатковым выніку прывяла да сялянскай рэформы 19 лютага 1861 г.,— адмены прыгоннага права. Яго падзенне азнаменавала сабой змену прыгоннага ладу буржуазным, устанаўленне ў краіне капіталізму як грамадска-эканамічнай фармацыі.

У Магілёўскай губерні адмена прыгоннага права ажыццяўлялася на падставе «Агульнага палажэння» і аднаго з «Мясцовых палажэнняў».

«Агульнае палажэнне» змяшчала галоўныя палажэнні: сяляне атрымлівалі асабістую свабоду і права свабодна распараджацца сваёй маёмасцю; памешчыкі захавалі ўласнасць на ўсе землі, якія ім належалі, аднак абавязаны былі аддаць у карыстанне сялянам «сядзібную аседласць» і «палявы надзел». Сялянам давалася права выкупу сядзібы і па згодзе з памешчыкам — палявога надзелу. Да ажыццяўлення гэтага яны лічыліся часоваабавязанымі.

Пазямельнае ўпарадкаванне сялян Магілёўскай губерні праводзілася па «Мясцоваму палажэнню» для велікарасійскіх, новарасійскіх і беларускіх губерняў. Паводле гэтага дакумента, уся тэрыторыя, якую

ён закранаў, дзялілася на тры паласы: чарназёмную, нечарназёмную і стэпавую. Кожная паласа па памерах надзелаў дзялілася яшчэ на мясцовасці. Магілёўская губерня адносілася да нечарназёмнай паласы. Для яе былі ўстаноўлены дзве нормы душавых надзелаў — вышэйшая і ніжэйшая. Ніжэйшая норма павінна была быць у тры разы меншай, чым вышэйшая. Душавы надзел адводзіўся толькі мужчынам. У выпадку, калі дарэформенны надзел перавышаў вышэйшую для дадзенай мясцовасці ўстаноўленую норму, памешчык меў права адрэзаць лішак у сваё непасрэднае карыстанне. Калі сялянскі надзел быў меншым, чым ніжэйшая норма, то памешчык меў права ці павялічыць надзел ці паменшыць павіннасць адпаведна памеру надзела. На Магілёўшчыне, у тым ліку і ў Чэрыкаўскім павеце, памеры надзелаў хісталіся — вышэйшы ад 4 да 5,5 дзес., ніжэйшы ад 1 дзес. 800 кв. саж. да 1 дзес. 2000 кв. саж.[7]

Мясцовыя памешчыкі шырока карысталіся магчымасцю рабіць «адрэзкі» сялянскай зямлі. Так, у Чэрыкаўскім павеце ў сялян вёсак Горкі і Мірагошч было адрэзана 24,5 % плошчы дарэформенных надзелаў[8].

Згодна з вышэйназваным «Мясцовым палажэннем», захоўвалася абшчыннае сялянскае карыстанне зямлёй. Яно таксама ўстанаўлівала склад сялянскага надзела, вызначала права сялян на карыстанне лесам, іншымі ўгоддзямі.

На ўсёй тэрыторыі Беларусі лес знаходзіўся выключна ў карыстанні памешчыкаў.

За карыстанне зямлёй сяляне павінны былі выконваць на карысць памешчыка пэўныя павіннасці. Размер іх залежаў ад велічыні надзелу. На Чэрыкаўшчыне за вышэйшы душавы надзел сяляне павінны былі адрабіць на паншчыне 40 дзён мужчынскіх і 30 жаночых ці заплаціць 8 р. аброку ў год. За карыстанне меншым надзелам павіннасці адпаведна памяншаліся. Спраўнае выкананне павіннасцей у сельскіх абшчынах забяспечвалася па названаму вышэй «Мясцоваму палажэнню» кругавой парукай. Згодна з гэтым дакументам, 3/5 дзён на паншчыне сяляне павінны былі адрабляць у летні час. Даўжыня рабочага дня была ў летні час — 12 ч., у зімовы — 9 ч. Паншчыну павінны былі выконваць усе мужчыны ва ўзросце ад 18 да 55 гадоў і жанчыны ад 17 да 50 гадоў. Работы часоваабавязаных сялян вызначаліся спецыяльным палажэннем.

Усё гэта сведчыла аб тым, што ўведзеныя павіннасці мала чым адрозніваліся ад дарэформенных. Рэформа 1861 г. пакінула ўдзелам сялян цяжкую працу за нізкую аплату.

Набыццё сялянамі зямлі ва ўласнасць магло адбыцца толькі праз выкуп. Выкупная сума за палявы надзел вызначалася шляхам капіталізацыі гадавога аброку* з дзесяціны зямлі з разліку 6 % гадавога даходу і фактычна раўнялася кошту зямлі і тых павіннасцей, якіх пазбаўляўся памешчык. У Чэрыкаўскім павеце сяляне павінны былі выплаціць за вышэйшы душавы надзел (4 дзес.) — 133 р. 33 к. Кошт адной дзесяціны складаў 33 р. Сяляне не мелі такіх грошай.

Ператварэнне былога прыгоннага селяніна ў вольнага было абстаўлена так, што яно зацягнулася на доўгія гады, а размеры выкупу амаль у два разы перавышалі той кошт зямлі, якая адводзілася селяніну ў выглядзе надзелу. Пры гэтым фактычна выкуплялася не толькі зямля, але і старыя феадальныя павіннасці — паншчына і аброк. У дадатак

* Капіталізацыя аброку — ператварэнне аброку ў капітал, які даваў магчымасць памешчыку прысвойваць частку яго ў выглядзе працэнтаў.

да ранейшага, і без таго мізэрнага надзелу, адразалася значная частка на карысць памешчыка. Сяляне атрымлівалі зямлю, горшую па якасці. Сялянская гаспадарка і пасля адмены прыгоннага права фактычна не была поўнасцю аддзелена ад памешчыцкай — у руках памешчыкаў заставаліся лясы, лугі, выганы і да т. п., без якіх сяляне не маглі весці самастойную гаспадарку. Усё гэта вяло «вызваліўшагася» селяніна ў кабалу да яго ўчарашняга гаспадара. Разбуральнай для сялян была падатковая сістэма.

Незадаволеныя ўмовамі вызвалення сяляне выказалі свой пратэст масавымі хваляваннямі. Пачынаючы з 1861 г. сялянскі рух становіцца адным з галоўных фактараў гістарычнага развіцця краіны. З гэтага часу асноўнае пытанне — пытанне аб зямлі з усёй вастрынёй ставіцца перад грамадствам.

У зямлі селянін бачыў сродак, з дапамогай якога ён разлічваў вызваліцца ад памешчыцкага прыгнёту, пакончыць са станам уніжанасці і зняважанасці. Пачуцці беларускага мужыка вельмі дакладна выразіў Я. Колас у паэме «Новая зямля»:

А дзе ж той выхад? дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То — наймацнейшая аснова
І жыцця першая ўмова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх не кіне.
Зямля — аснова ўсёй айчыне[9].

Аднак у Чэрыкаўскім павеце першыя пасля адмены прыгоннага права гады не былі насычаны сялянскімі хваляваннямі. 14 чэрвеня 1861 г. магілёўскі губернатар даносіў міністру ўнутраных спраў: «У Чэрыкаўскім п., па афіцыйна атрыманых звестках быў толькі выпадак у маёнтку дробнапамеснай уладальніцы, болей падобны на сварку яе з сялянамі, які і спынены міралюбіва»[10]. У пачатку 1862 г. ён жа адносіў Чэрыкаўскі павет да «болей спакойных паветаў»[11].

У час рэалізацыі сялянскай рэформы, у 1863 г., у Польшчы пачалося паўстанне. Яно значна ўскалыхнула і Беларусь, зрабіўшыся тут, з аднаго боку, рухам сялянскім, накіраваным супраць паноў, з другога боку, нацыянальна-вызваленчым рухам, накіраваным супраць царызму. Адразу пасля ўтварэння ў Варшаве паўстанцкага ўрада у Вільні таксама арганізуецца літоўска-беларускі паўстанцкі ўрад. Ён рэзка дзеліцца на дзве часткі. Адна прадстаўлена вялікімі беларускімі панамі, якія стаялі за ўтварэнне вялікай Польшчы з захаваннем старога сацыяльнага ладу на Беларусі. Другая прадстаўлена дробнай шляхтай, часам ужо беззямельнай, і разначынскай інтэлігенцыяй, настроенай радыкальна-народніцкі. Яны ставілі сабе за мэту радыкальнае развязанне на Беларусі сялянскага пытання і ўтварэнне незалежнай ад Расіі і Польшчы Беларусі. На чале паўстання стаў рэвалюцыянер-дэмакрат Кастусь Каліноўскі[12].

Нацыянальна-вызваленчы рух 1863—1864 гг. ускалыхнуў і Чэрыкаўшчыну. Тут былі сфарміраваны паўстанцкія атрады пад кіраўніцтвам Я. В. Жукоўскага, былога артылерыйскага паручыка, колькасцю 100 чал., і Л. М. Звяждоўскага, былога капітана рускай арміі, колькасцю 200 чал. 24 красавіка 1863 г. гэтыя атрады захапілі Горкі[13].

Напярэдадні, 23 красавіка, адбылося ўзброенае сутыкненне паміж урадавымі войскамі і атрадам Я. В. Жукоўскага каля аколіцы Свіное[14]. Праз пяць дзён у мястэчку Лецягі ротай стралкоў Смаленскага палка быў разгромлены атрад Л. М. Звяж-

доўскага. 140 паўстанцаў былі ўзяты ў палон[15].

Для падаўлення паўстання на Беларусь былі накіраваны ўрадавыя войскі пад кіраўніцтвам Мураўёва, якія патапілі ў крыві народныя хваляванні[16].

17 мая 1863 г. была створана Чэрыкаўская следчая камісія па справе паўстання, якая разгледзела некалькі сот спраў і вынесла цяжкія прыгаворы ўдзельнікам паўстання. Яна спыніла сваю дзейнасць 15 кастрычніка 1863 г.

Згодна з першым перапісам пазямельнай уласнасці ў 1877 г., зямельная плошча Магілёўскай губерні раўнялася 3 871 113 дзес. і размяркоўвалася паміж трыма асноўнымі відамі землеўладання: надзельным, прыватнаўласніцкім і землямі казны, царквы. Асновай сялянскай гаспадаркі з'яўлялася надзельнае землеўладанне, плошча якога складала 1 508 274 дзес., 39 % усіх земляў[17]. У сярэднім на адзін двор прыходзілася каля 12 дзес. З ростам насельніцтва і павелічэннем колькасці двароў забяспечанасць сялян надзельнай зямлёй безупынна пагоршвалася. К 1905 г. сярэдні размер сялянскага надзелу быў значна меншым. У Чэрыкаўскім павеце яго велічыня хісталася ад 6,8 да 7,9 дзес. [18] Тут налічвалася 72 % сялянскіх двароў з такім надзелам. У мясцовых умовах толькі надзел у 20 дзес. мог забяспечыць самастойнае вядзенне сялянскай гаспадаркі[19]. Малазямелле сялян ўзмацнялася церазпалосіцай. Іх землі звычайна былі раскіданы і раздзелены памешчыцкімі. Церазпалосіца, неразмежаванасць землеўладання ставілі сялян у залежнасць ад памешчыкаў.

У той час як дзесяткі тысяч сялянскіх сем'яў пакутавалі ад недахопу зямлі, у руках памешчыкаў былі сканцэнтраваны велізарныя зямельныя масівы. На тэрыторыі Чэрыкаўшчыны буйнейшымі землеўладальнікамі з'яўляліся князь А. А. Абаленскі (8290 дзес.) — фальваркі Язёры, Горкі, хутар Бакова; памешчык М. І. Галынскі (4400) — маёнтак Халоблін, фальваркі Міхалін, Сцяпанава; В. А. Судзілоўскі (1700) — фальварак Аляксандраўка; Н. Д. Панятоўскі (2114) — маёнтак Вусце, хутар Багданаўка; А. А. Барэйша (1347) — маёнтак Юдаўка, фальварак Анюціна; Г. Чэчат (2013) — маёнтак Баровае; М. Зямлянскі (1400) — маёнтак Інвандора; Э. Васілеўская (979 дзес.) — маёнтак Вепрын[20].

Вострая патрэба ў ворных землях, пашах і сенакосах, лясах штурхала сялян у кабалу да буйных зямельных уласнікаў, якія, карыстаючыся гэтым, шырока ўводзілі ў сваіх гаспадарках адработачную сістэму. Існавалі розныя формы адработачнай працы. Асабліва часта сустракаліся адработкі за розныя зямельныя ўгоддзі і кабальная арэнда зямлі з часткі ўраджаю — здольшчына.

Цяжкае эканамічнае становішча сялян, іх палітычнае бяспраўе падмацоўвала шырокія слаі сельскага насельніцтва на барацьбу.

Сялянскі рух у апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. разгортваўся хвалепадобна. Яго пік прыходзіцца на 80-я гады, звязаныя з другой рэвалюцыйнай сітуацыяй, калі рэзкае пагоршанне эканамічнага становішча сялян прывяло да абвастрэння барацьбы за зямлю.

Характэрнай рысай сялянскага руху на Магілёўшчыне, у тым ліку і ў Чэрыкаўскім павеце, з'яўлялася разнастайнасць форм і спосабаў барацьбы. У сялянскім руху пераважала барацьба на глебе пазямельных адносін і супраць памешчыцкага прыгнёту. Найбольш распаўсюджанымі яе формамі былі супраціўленне памешчыцкаму размежаванню зямель, самавольная пасьба, патравы, захоп ворнай зямлі і самавольнае карыстанне ёю, парубка

лясоў. На другім месцы знаходзіліся выступленні супраць улад. У большасці выпадкаў гэтыя хваляванні ўзнікалі на аснове аграрнай барацьбы сялян і з'яўляліся самаабаронай, адказам на дэспатызм і сваволства, што чынілі царскія чыноўнікі. Асаблівую вастрыню барацьба набывала пры выкананні судовых рашэнняў, пастаноў і распараджэнняў адміністрацыйных устаноў. Сялянскія выступленні былі выражэннем стыхійнага пратэсту супраць існаваўшых парадкаў. У шэрагу выпадкаў яны набывалі востры характар і, як правіла, суправаджаліся ўзброенымі сутыкненнямі з паліцыяй і ўладамі. Былі выпадкі выкарыстання войск для падаўлення сялянскіх хваляванняў.

Адно са значных выступленняў чэрыкаўскіх сялян адбылося летам 1881 г. За парубку памешчыцкага лесу і недапушчэнне землямера да працы па размежаванню сялянскіх і памешчыцкіх зямель група жыхароў (21 чал.) в. Старая Буда была прыгавораны да штрафу і сямідзённага арышту. Сяляне адмовіліся прызнаць прад'яўленыя абвінавачанні і схаваліся ў лесе. Мясцовы спраўнік быў вымушаны вызваць воінскую каманду для падаўлення гэтага выступлення. Неабходнасць выкліку войскаў ён матываваў тым, что сяляне «самавольна спрабавалі завалодаць чужой зямлёй, не звяртаюць ніякай увагі на яго неаднаразовыя ўгаворы, гавораць: «Зямля наша, судзіцца не хочам, прысуджаных за яе грошай плаціць не будзем і пад арышт не пойдзем, а калі зямлю адбяруць сілай, то пойдзем у свет, куды вочы глядзяць»[21]. Нягледзячы на экзекуцыю, учыненую войскамі, па прызнанню магілёўскага губернатара А. С. Дамбавецкага, «сяляне застаюцца непакорнымі, разышліся са сваёй вёскі і, назіраючы здалёк, выпрабоўваюць цярпенне ўлад». Паводле яго слоў, «толькі моцныя меры могуць спыніць такое зло, якое хутка развіваецца ў Магілёўскай губерні»[22].

Сутыкненняў сялян з памешчыкамі было вельмі многа. Не ўсе яны зафіксаваны мясцовымі ўладамі. «...Колькасць такіх выпадкаў у сапраўднасці была больш значнай,— адзначаў магілёўскі губернатар,— таму што многія з іх па малаважнасці, па хуткаму аднаўленню парадку не даходзяць да губернскага начальства».

Своеасаблівай формай масавага сялянскага руху была барацьба за права перасялення на вольныя землі Сібіры і Далёкага Усходу. У 80—90-я гады XIX ст. на Чэрыкаўшчыне, як і ва ўсёй Магілёўскай губерні, узнялася хваля перасяленчага руху, якая ахапіла значную частку сялянскага насельніцтва. Магілёўскі губернатар даносіў цару ў 1896 г., што «імкненне да перасялення не прадстаўляе навіны для Магілёўскай губерні... У 1890 г. у Чэрыкаўскім павеце каля 250 сямействаў самавольна ўзняліся з месца і спыніць і пасяліць іх на ранейшыя месцы жыхарства ўдалося толькі з дапамогай самых строгіх мер, пры садзеянні ваенных каманд»[23]. У красавіку 1890 г. адбылося сутыкненне паміж жыхарамі в. Вепрын, якія пажадалі выехаць на ўсход, і паліцыяй, што перашкаджала гэтаму. Мясцовыя ўлады былі настолькі ўстрывожаны гэтымі падзеямі, што восенню губернатар, чэрыкаўскі прадвадзіцель дваранства і іншыя чыноўнікі павета аб'язджалі неспакойныя воласці і пераконвалі сялян спыніць спробы да перасялення[24].

Для другой паловы XIX ст. характэрна развіццё капіталістычных адносін і ў памешчыцкіх гаспадарках. Адным з галоўных паказчыкаў гэтага быў рост гандлёвага земляробства, у тым ліку вінакурства — адной з важнейшых яго форм.

Вінакурства прадстаўляла сабой

такі від капіталістычнай арганізацыі земляробства, які дапускаў спалучэнне тэхнічнай апрацоўкі з сельскай гаспадаркай і суправаджаўся злучэннем двух розных форм наёмнай працы — прамысловай і земляробскай.

Асноўнай сыравінай для вінакурнай прамысловасці служылі жыта і бульба. Калі на першы час пасля рэформы сярод сыравіны, якая перапрацоўвалася заводамі, пераважала жыта, то з 70-х гадоў хутка пачынае расці ўдзельная вага бульбы. У 80-я гады бульбяное вінакурства дасягнула значных поспехаў на Магілёўшчыне, дзе ў 90-я гады ў сярэднім за год перакурвалася 3 млн пудоў клубняў.

Важкі ўклад у вытворчасць спірту ўносілі вінакурныя прадпрыемствы Чэрыкаўскага павета. Да ліку найбольш буйных адносіліся заводы, якія дзейнічалі ў маёнтках Выдранка (18 тыс. вёдзер), Гайдукоўка, Горы, Азёры (па 10 тыс. вёдзер). Больш мелкія вінакурні (да 2 тыс. вёдзер) дзейнічалі ў маёнтках Баровае, Халоблін, Міхалін [25].

Вінакурства было неразрыўна звязана з малочнай і мясной жывёлагадоўляй. Карысць вінакурства памешчыкі бачылі ў перапрацоўцы бульбы ў спірт, які выгадна прадавалі ў казну, і ў здабыванні брагі, якая ішла на корм жывёле.

Прыватнаўласніцкая прамысловая дзейнасць не зводзілася толькі да вінакурнай вытворчасці. Памешчыкі Чэрыкаўскага павета наладжвалі і іншыя прадпрыемствы — шкляныя, смолашкіпінарныя, папяровыя, пенькатрапальныя.

Так, шкляныя фабрыкі працавалі ў фальварку Малінаўка (35 рабочых, 1 тыс. скрынак, 10 тыс. рублёў), в. Лешчынка (87 рабочых, 2 тыс. скрынак, 16 тыс. рублёў). Самым буйным прадпрыемствам гэтай галіны была шкляная фабрыка ўладальніка Галынскага. У 1900 г. 53 рабочыя згатавалі 15 тыс. скрынак шкла на 28 тыс. рублёў.

У павеце таксама працавалі кардонная фабрыка ў Сенненскім заводзе (12 рабочых, 13 тыс. рублёў), пенькатрапальні ў Чэрыкаве (16 рабочых), м. Студзянец (100 рабочых), экіпажная фабрыка ў в. Нікольск (26 рабочых, 40 тыс. рублёў). У в. Вепрын дзейнічаў смолашкіпінарны завод, у фальварку Вусце — сукнавальня. У многіх маёнтках меліся млыны (с. Лабанаўка, фальварках Зябень, Бакунавічы, вёсках Наркі, Прыпёчына, Сакалоўка). Усяго ў павеце працавала 197 млыноў[26].

Прыватнаўласніцкія прамысловыя прадпрыемствы аказвалі капіталізуючы ўплыў на сельскую гаспадарку. Яны паглыналі частку лішняй сялянскай рабочай сілы, садзейнічалі ўмацаванню сувязі сялянскай гаспадаркі з рынкам, паскаралі развіццё гандлёвага земляробства. Прыкладам можа служыць дзейнасць аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў Чэрыкаўскага павета Нікалаеўскага цукровага завода. Ён штогод выпрацоўваў 1100 пудоў цукровага пяску. На заводзе было занята больш 200 рабочых, функцыяніравалі паравыя машыны, прэсы. З 1873 г. прадпрыемства пачало выпускаць цукар-рафінад, які карыстаўся вялікім попытам у Маскве. Пад непасрэдным уплывам завода ў Брацкавіцкай і Студзянецкай валасцях павета хуткімі тэмпамі пачало развівацца гандлёвае буракаводства. У фальварку Нікалаеўка, напрыклад, у пачатку 70-х гадоў плантацыі буракоў займалі да 30 дзес. і давалі да 9 тыс. беркаўцаў буракоў (1 беркавец — 11,5 пуда)[27].

Аб тым, што прадпрымальніцтва адыгрывала прыкметную ролю ў развіцці капіталістычных адносін у мясцовых памешчыцкіх гаспадарках, сведчыць лясны гандаль, які вялі памешчыкі.

Зацяжны сельскагаспадарчы кры-

зіс, які пачаўся ў 70-х гадах і працягваўся да сярэдзіны 90-х гадоў, і звязаныя з гэтым фінансавыя цяжкасці вымушалі ўладальнікаў станавіцца на шлях узмоцненага продажу лесу. Бурнае развіццё расійскай прамысловасці, інтэнсіўнае будаўніцтва чыгунак у апошняй чвэрці XIX ст. патрабавалі многа лясных матэрыялаў. Цэны на лес раслі. Памешчыкі стараліся выгадней прадаць лес і мелі з гэтага продажу значныя барышы.

Чэрыкаўскі лес водным шляхам па р. Сож і далей па Дняпру накіроўваўся ў раёны Сярэдняга і Ніжняга Падняпроўя. У 1900 г. з павета было адпраўлена 7840 тыс. пудоў на суму 1024 тыс. рублёў. У асноўным гэта быў будаўнічы лес (6809 тыс. пудоў), шпалы (888 тыс. пудоў) і дровы. Найбольш буйнымі спажыўцамі чэрыкаўскага лесу былі будоўлі і прадпрыемствы Крамянчуга (2403 тыс. пудоў), Екацярынаслава (2081 тыс. пудоў), Чаркас (933 тыс. пудоў). Невялікія партыі будаўнічага лесу (33 тыс. пудоў) накіроўваліся ў Рыгу па р. Сож, Дняпру да р. Бярэзіны, а адтуль па Бярэзінскаму каналу ў Заходнюю Дзвіну[28].

Драпежная эксплуатацыя наносіла вялікі ўрон мясцовым лясам. З Дубровіцкай воласці паведамлялі, што «лесапрамысловасць з кожным годам прыходзіць у заняпад ад неразумнай высечкі лесу».

Прыкметнай галіной гандлёвага земляробства ў памешчыцкай гаспадарцы было пчалярства. Напрыклад, у Дубровіцкай воласці ўладальнік памесця Інвандора трымаў пчальнік са 120 вуллёў; у маёнтку Вепрын, акрамя пчальніка са 120 вуллёў, мелася мноства борцяў, якія здаваліся ў арэнду сялянам. За кожную борць яны плацілі 3 фунты мёду, у выніку чаго борцевае пчалярства прыносіла памешчыку вялікі даход. Чэрыкаўскія гандляры плацілі за пуд мёду па 4 р., а за пуд воску па 23 р., затым адпраўлялі гэтую прадукцыю ў Маскву і іншыя гарады Расіі[29].

Вядучай галіной сялянскай гаспадаркі на Чэрыкаўшчыне было земляробства, аснову якога складала вытворчасць збожжавых культур. З 60-х гадоў і да канца 90-х гадоў XIX ст. пасевы збожжавых культур на землях мясцовых сялян узраслі. Аднак доля іх у пасяўной плошчы зніжалася ў сувязі з больш інтэнсіўным укараненнем бульбы і такіх тэхнічных культур, як каноплі і лён.

Як і на працягу многіх папярэдніх стагоддзяў, важнейшай збожжавай культурай у сялянскай гаспадарцы працягвала заставацца азімае жыта. Яно з'яўлялася адным з найбольш непатрабавальных збожжавых злакаў: расло на малаўрадлівых глебах, добра пераносіла лішнюю вільгаць і яе недахоп, спёку і холад, не патрабавала вялікіх намаганняў пры вырошчванні. Культываванне яго складала аснову сялянскай земляробчай вытворчасці. Аржаны хлеб быў асноўным прадуктам харчавання селяніна і галоўным прадметам яго гандлю.

Пасля азімага жыта прыкметнымі па значэнні і займаемых плошчах культурамі ў сялянскай гаспадарцы, як і ў памешчыцкай, былі авёс і грэчка. Авёс з'яўляўся важнейшым кормам для жывёлы, у немалой колькасці ішоў на прадукты харчавання, быў другой па важнасці таварнай збожжавай культурай. Як правіла, сялянская беднота восенню прадавала авёс для аплаты налогаў.

Сярэднія ўраджаі з адной дзесяціны ў гаспадарках чэрыкаўскіх сялян складалі: азімае жыта — 37 пудоў, авёс — 55, грэчка — 15, ячмень — 38, бульба — 367, каноплі — 29 (насенне), 20 (валакно), лён — 34 (насенне), 24 пуды (валакно). На памешчыцкіх палях гэтыя паказчыкі адпаведна складалі: 46, 49, 20, 44,

452, 34, 19, 25, 16 пудоў[30]. Ураджайнасць збожжавых у чэрыкаўскіх сялян была ніжэйшай, чым у памешчыцкіх гаспадарках. Гэта было не выпадковай з'явай.

Сяляне карысталіся прымітыўнай тэхнікай. Важнейшай прыладай для апрацоўкі глебы была саха. На Чэрыкаўшчыне ўжывалася так званая палеская саха з дзвюма нерухомымі паліцамі — для парнай вупражы. Другой важнай глебаапрацоўчай прыладай у сялянскай гаспадарцы была барана, якая служыла для рыхлення зямлі пасля ўзворвання і сяўбы, а таксама для забараноўвання насення. Найбольшае распаўсюджанне тут атрымала драўляная плеценая барана. Яна была большменш прыгоднай на лёгкіх пясчаных глебах, характэрных для Чэрыкаўскага павета. Для рыхлення верхняга слоя глебы ў сялян сустракаліся яшчэ больш старажытныя прылады — смык і барана-сукаватка. Смык меў выгляд прымітыўнай бараны з некалькіх звязаных яловых плах з доўга абсечаным суччам, якое служыла зубамі. Ён ужываўся ў першую чаргу пры ляднай сістэме земляробства, калі апрацоўка палёў драўлянай бараной з-за мноства пнёў і карэнняў ускладнялася. Для апрацоўкі глебы і забараноўвання насення, асабліва на расчышчаных ад лесу і кустарніку ўчастках, ужывалася барана-сукаватка (вяршаліна), якая прадстаўляла сабой верхавіну елкі з доўгім завостраным суччам. Уборка збожжа, траў праводзілася ўручную — сярпамі і косамі.

Важнай галіной сялянскага земляробства ў павеце з'яўлялася развядзенне бульбы. Яна была прадуктам харчавання, служыла падмогай збожжавым, ішла на корм жывёле, яе адпраўлялі на бліжнія вінакурныя заводы, крухмала-патачныя заводы, на кірмаш. Пасевы бульбы на Чэрыкаўшчыне сталі павялічвацца ў апошняй чвэрці XIX ст. Гэта было звязана з пашырэннем яе ўжывання сялянамі ў якасці больш таннага, чым хлеб, прадукта харчавання. На малаўраджайных пясчаных і супясчаных землях павета бульба ў параўнанні са збожжавымі культурамі давала больш высокія ўраджаі (у некалькі разоў). У гэтых умовах яна стала для сялян, асабліва для беднаты, другім хлебам. Вельмі важнае значэнне для пашырэння пасеваў бульбы мела вінакурства. Паводле даных М. Доўнар-Запольскага, к пачатку XX ст. памешчыцкія гаспадаркі давалі не болей $^1/_3$ неабходнага для гэтай галіны прадукта. Астатнюю бульбу пастаўлялі сяляне, што сведчыць аб высокай таварнасці гэтай культуры.

Важную ролю ў гаспадарках чэрыкаўскіх сялян адыгрывала канапляводства і льнаводства, якія насілі ярка выражаны гандлёвы характар. «З прадметаў паляводства,— адзначалася ў справаздачы магілёўскага губернатара,— развядзенне якіх значна перавышае мясцовыя патрэбы і складае больш ці менш важны прадмет збыту ў іншыя губерні, важнае месца займае пянька і лён. Гэта амаль адзінкавыя здабыткі, якія з выгадаю збываюць сельскія абывацелі і таму, хоць яны і вельмі спустошваюць глебу, але разводзяцца паўсюдна...»[31]

У першае парэформеннае дваццацігоддзе важнае месца ў земляробстве павета займала канапляводства. Каноплі былі сялянскай культурай. У некаторых выпадках чысты даход ад гэтай галіны ў сялянскай гаспадарцы складаў да 30 р. У асобных валасцях Чэрыкаўшчыны сяляне прадавалі па 15 пудоў канаплянага насення. Значная частка прадуктаў канапляводства ішла на патрэбы сялян — выраб пяньковай пражы і канаплянага масла. Яны збываліся на мясцовыя пенькатрапальні — у г. Чэрыкаў і м. Студзянец, а таксама

на маслабойныя прадпрыемствы, якіх у павеце было больш 10. У Студзянецкай воласці сяляне сеялі лён і каноплі ў вялікай колькасці. Пяньку, канаплянае і льняное семя збывалі купцам, якія гэтую прадукцыю адпраўлялі ў Смаленскую губерню. Кожны год з м. Студзянец вывозілі пянькі 7 тыс. пудоў, канаплянага семені — 4 тыс. пудоў, льнянога семені — 1,5 тыс. пудоў[32].

Сяляне Чэрыкаўскага павета займаліся грубашэрснай авечкагадоўляй. Аднак яна насіла спажывецкі характар, забяспечвала патрэбнасці сялян у прадуктах харчавання, адзенні. З шэрсці выраблялася сукно.

Што датычыцца сялянскіх промыслаў, то ў параўнанні з іншымі паветамі, на Чэрыкаўшчыне яны былі развіты слаба. У Студзянецкай, Самацеевіцкай і Палужскай валасцях сельскае насельніцтва займалася лясным промысламі (нарыхтоўкай лясных матэрыялаў, высечкай і пілаваннем дроў). Сяляне Маляціцкай і Даўговіцкай валасцей выраблялі дзёгаць і драўняны вугаль. У вёсках Самацеевіцкай воласці атрымаў некаторае развіццё ганчарны промысел[33].

Пэўнае развіццё атрымала і сялянскае пчалярства. У Студзянецкай воласці сяляне трымалі 7 асобных пчальнікоў па 10—20 калод кожны. З валаснога цэнтра кожны год вывозілася 130 пудоў воску і 725 пудоў мёду.

Развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы Беларусі прывяло да дыферэнцыяцыі сялянства на беднату і кулацтва, «вымывання» слаба звязанай з рынкам часткі яго — серадняка. Важнейшым паказчыкам гэтага працэсу з'яўлялася абеззямельванне сялян. У вёсцы з'явілася мноства незанятых рабочых рук. Шматлікія пераўыткі прыгонніцтва паскорылі рост колькасці лішняга сялянскага насельніцтва. Малазямелле, нізкая ўраджайнасць палёў, абумоўленая панаваннем трохпольнай сістэмы і апрацоўкай зямлі прымітыўнымі прыладамі, недахоп угнаенняў, падзеж жывёлы, голад — усё гэта паскарала разарэнне сялянства, гнала іх з родных мясцін. Гэта прызнавалі і прадстаўнікі афіцыйных улад. Падатковы інспектар павета пісаў: «Жыць выключна ад эксплуатацыі зямлі стала ўжо немагчыма. Ад земляробства селянін не можа атрымаць тых грашовых сродкаў, што неабходны яму, каб пакрыць свае патрэбы і несці розныя грашовыя павіннасці, якія ляжаць на ім. Таму, акрамя земляробства, крыніцай для атрымання неабходных грашовых сродкаў з'яўляюцца розныя промыслы і заробкі, якія з кожным годам набываюць усё большае значэнне ў эканамічным жыцці насельніцтва»[34].



Група шахцёраў — ураджэнцаў Чэрыкаўскага павета: К. Керчанцаў, Н. М. Боміхаў, К. Кутаў, В. Кутаў. Фота 1914 г.

У пачатку XX ст. сітуацыя пагоршылася. Адзін з кіраўнікоў магілёў-

скага земства адзначаў у 1915 г.: «Недахоп зямлі, з аднаго боку, недасканаласць вытворчасці кустарных вырабаў — з другога, прымушаюць сялян для падтрымання свайго існавання шукаць іншыя шляхі. У гэтых выпадках сялянская моладзь карыстаецца шырока «адыходам на бок»... Такая з'ява будзе дастаткова зразумелай, калі прыняць пад увагу, што колькасць надзельнай зямлі па губерні складае 39 % агульнай колькасці зямлі, а колькасць сялянскіх пасяленняў — 89 %. Забяспечанасць адной сялянскай душы ад сяўбы да сяўбы па звестках губернскага статыстычнага камітэта за 1912 г. раўнялася 11,9 пуд., а за перыяд з 1907 г. па 1911 г. толькі 8,9 пуд. Пры такіх умовах натуральна сялянству прыходзіцца ў большасці выпадкаў «цягнуць на поўдзень», у паўднёвыя каменныя капальні, шахты, руднікі»[35]

У пошуках сродкаў да існавання многія сяляне Магілёўскай губерні накіроўваліся ў паўднёвыя раёны Расіі, галоўным чынам на Украіну. У канцы XIX ст. з некаторых валасцей Чэрыкаўскага павета на каменнавугальныя капальні Данбаса і Крыўбаса адправілася да 700 чал., $^{2}/_{5}$ усяго насельніцтва воласці. Паваткавы інспектар Чэрыкаўскага павета пісаў: «На адыходныя заробкі сяляне ідуць пераважна ў Кіеўскую, Валынскую, Екацярынаслаўскую губерні і Вобласць войска Данскога*. У першых двух губернях сяляне працуюць на цукровых і шклаварных заводах, а ў Екацярынаслаўскай і Вобласці войска Данскога працуюць у каменнавугольных капальнях... Другі від адыходных промыслаў складае сплаў лесу ў Екацярынаслаўскую ці Херсонскую губерні...»[36] У 1901 г. толькі на прадпрыемствах Екацярынаслаўскай губерні і Вобласці войска Данскога працавала каля 4000 чал. На сплаве лесу — 400 чал.[37] Як правіла, у адход ішлі маладыя людзі. Ураджэнцы Чэрыкаўшчыны працавалі на шахтах і металургічных заводах Юзаўкі (Данецк), Луганска, Ясінаватай, Аляксандраўска (Запарожжа), іншых гарадоў Украіны. Факты сведчаць аб тым, што многія з іх не парывалі сувязі з радзімай, вялі перапіску з роднымі і знаёмымі, калінікалі прыязджалі ў родныя мясціны, прывозілі з сабою рэвалюцыйныя выданні. У перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. некаторыя з іх з'яўляліся кіраўнікамі буйных забастовачных выступленняў на Чэрыкаўшчыне.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. ускалыхнула ўсю краіну. На барацьбу з самадзяржаўем за сацыяльнае, палітычнае і нацыянальнае вызваленне ўзняліся рабочыя, сяляне, служачыя ўсіх народаў Расіі.

Першая хваля сялянскіх выступленняў ў Чэрыкаўскім павеце была выклікана магутным пад'ёмам рабочага руху ў пачатку 1905 г. Аднак вёска ўступала ў барацьбу павольна. Рух, які зарадзіўся ў лютым, нарастаў паступова і дасягнуў сваёй вяршыні да сярэдзіны лета. К гэтаму часу тут адбылося 10 выступленняў. Асноўнай формай барацьбы гэтага перыяду была пасьба жывёлы на памешчыцкіх сенажацях. Жыхары амаль усіх вёсак Старынскай воласці — Ушакі, Манастырок, Рагаліна, Мірагошч — пасвілі сваю жывёлу на лугах і палях памесцяў князя Абаленскага. Мясцовы спраўнік паведамляў: «Ніякія ўгаворы сялян аб незаконнасці карыстання пашай не прывялі ні да якіх вынікаў, і сяляне адназначна заявілі, што яны будуць пасвіць жывёлу». Спраўнік прызнаў, што спыніць пасьбу жывёлы сіламі паліцыі немагчыма[38].

Асноўны напрамак сялянскага руху — барацьба за знішчэнне паме-

* Цяпер Растоўская вобласць.

шчыцкага землеўладання, за пераход усёй зямлі ад памешчыкаў да сялян. Сяляне Чэрыкаўскага павета лічылі, што «зямлю ў памешчыкаў патрэбна адабраць і аддаць сялянам без грошай». Аднак, як правіла, яны не звязвалі пераход зямлі ў іх рукі са зменай дзяржаўнай улады.

Восенню 1905 г. стала ўзнімацца новая, больш магутная хваля сялянскага руху, якая дасягнула свайго апагея к канцу года. Выступленнямі быў ахоплены практычна ўвесь павет. Сяляне грамілі маёнткі, прагаянялі паліцыю, адмаўляліся плаціць падаткі, не прызнавалі распараджэнняў валасных улад.

У гэты перыяд сялянскі рух адрозніваўся ўзросшай палітычнай актыўнасцю мас. Вельмі важным паказчыкам гэтага з'яўляюцца выступленні супраць царскіх маніфестаў. Маніфест ад 17 кастрычніка не прынёс спакою ў вёскі. Так, у в. Горы Чэрыкаўскага павета мясцовы свяшчэннік заклікаў сялян «пры даруемай свабодзе жыць у брацкай любві і не замахвацца на ўласнасць іншых». Выслухаўшы маніфест і пропаведзь, сяляне заявілі: «Гэты маніфест не для нас, а для паноў». Пакінуўшы царкву, яны адразу накіраваліся ў суседнія маёнткі «рабіць забастоўку».

Сяляне грамілі панскія маёнткі. Ахопленыя панічнымі настроямі памешчыкі разам з сем'ямі пакідалі іх. Паводле паведамленняў карэспандэнтаў Вольнаэканамічнага таварыства, асабліва актыўна змагаліся сяляне Даўжанскай, Камаровіцкай, Беліцкай і Даўговіцкай валасцей. Згодна з іх данясеннямі, сяляне «былі варожа настроены пераважна супраць буйных уладальнікаў». Карэспандэнты паведамлялі, што нянавісць да буйных уладальнікаў абумоўлена «больш за ўсё тым, што ў гэтых уладальнікаў шырока распаўсюджана сістэма адработак..., а таксама вельмі распаўсюджана здача зямлі з часткі ўраджаю на цяжкіх для сялян умовах». Сур'ёзныя хваляванні мелі месца ў шэрагу населеных пунктаў[39].

У дваццатых числах снежня ў в. Прыпёчына, што на поўначы Чэрыкаўскага павета, сяляне разгралілі дом князя Абаленскага, а з 25 снежня хваляванні распаўсюдзіліся і на паўднёвую частку павета. Асабліва бурна развіваліся падзеі ў Палужскай, Самацеевіцкай і іншых валасцях. 27 снежня сяляне вёсак Бірулі, Горы, Дзернавая і Стайкі знялі ўсіх рабочых і служачых у памесці Стоша Горы, прагналі адміністрацыю, а жывёлу і маёмасць разабралі. Гэтак жа яны паступілі і з памешчыцкімі маёнткамі Беразнякі і Ясінская. У памесце Горы прыбыў атрад паліцыі колькасцю 50 чалавек. Адбылася ўзброеная сутычка. Паліцыя была рассеяна. Спраўнік у сваім данясенні адзначаў: «Гэты выпадак паказаў поўную немагчымасць якіх бы то ні было арыштаў, таму што народ пагалоўна паўстае супраць гэтага і аказвае самае ўпартае супраціўленне».

У наступныя дні былі разгромлены памесці Сілічы, Выдранка, Янаўка, Бакунавічы, Вепрын і іншыя. У памесці Халоблін Камаровіцкай воласці ўладальнік пад націскам сялян падпісаў абавязацельства ў два разы павялічыць плату за падзённую працу. Усяго ж за кароткі перыяд з 26 снежня 1905 г. па 10 студзеня 1906 г. у Чэрыкаўскім і Клімавіцкім паветах поўнасцю было разгромлена 18 памесцяў і 9 — часткова. Размах сялянскіх хваляванняў у гэтых паветах гаварыў аб тым, што яны набывалі характар паўстання.

11 студзеня 1906 г. у Чэрыкаўскі і Клімавіцкі паветы была накіравана карная экспедыцыя на чале з магілёўскім губернатарам Гагманам. Туды ж быў перакінуты атрад з Чарнігаўскай губерні пад камандаваннем начальніка губернскага жандар-

скага ўпраўлення генерал-маёра Рудава.

Сяляне, як правіла, адмаўляліся выдаваць сваіх важакоў. У адказ паліцыя паліла хаты, гаспадарчыя пабудовы, арыштоўвала актыўных удзельнікаў руху. Многія сяляне падвяргаліся цялесным пакаранням публічна.

Паводле афіцыйных даных, за дзесяць дзён толькі атрад Гагмана спаліў 4 хаты, 11 ёўняў і 2 лазні. Не меншую стараннасць праявіў і Рудаў. У Чэрыкаўскім павеце асабліва пацярпелі вёскі Горы, Сілічы, Бірулі.

К 20 студзеня сялянскі рух у павеце быў падаўлены. Усяго за восень 1905 г. і студзень 1906 г. у Чэрыкаўскім павеце адбылося 28 сялянскіх выступленняў.

Вялікую ролю ў хваляваннях адыгралі сяляне, якія вярнуліся з шахт Екацярынаслаўскай губерні, а таксама фабрычныя рабочыя, што прыехалі на каляды дамоў. Агітацыйная і арганізатарская дзейнасць гэтых рабочых садзейнічала бурнаму падъёму сялянскага руху ў Чэрыкаўскім і Клімавіцкім паветах. Павятовы прадвадзіцель дваранства ў тэлеграме міністру ўнутраных спраў ад 6 студзеня 1906 г. паведамляў: «Рэвалюцыйны рух са стыхійнай хуткасцю і сілай ахапіў сялянскія масы. Бахмуцкі павет (Екацярынаслаўскай губ.— У. Ф.) выкінуў да нас некалькі тысяч неўтаймаванай рэвалюцыйна настроенай сялянскай моладзі, шахцёраў, амаль пагалоўна ўзброеных; глеба падрыхтавана мясцовымі і прыезджымі агітатарамі. Дасюль спакойныя сяляне старэйшага ўзросту нястрымна захапляюцца новым рухам... Пагромы памесцяў з разрабаваннем маёмасці штодзённыя, галоўныя агітатары... і падпальшчыкі не могуць быць арыштаваны з прычыны іх з'яднанасці і недастатковасці сіл мясцовай адміністрацыі...»[40]

У выніку гэтых выступленняў у Чэрыкаўскім і Клімавіцкім паветах было разгромлена 20 памесцяў, у шэрагу месц звергнуты мясцовыя ўлады і створаны сялянскія камітэты.

Ураджэнцы Чэрыкаўшчыны прымалі актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях у іншых раёнах краіны.

Буйнае ўзброенае паўстанне ў снежні 1905 г. адбылося ў г. Аляксандраўску (Запарожжа). Для кіраўніцтва палітычнай стачкай і падрыхтоўкі паўстання быў створаны Баявы стачачны камітэт з рабочых майстэрань Екацярынінскай і Курска-Харкаўска-Севастопальскай чыгунак. Адным з кіраўнікоў камітэта быў ураджэнец Чэрыкаўшчыны слесар Ф. Я. Чубанаў[41]. У матэрыялах ахранкі ён характарызаваўся як «галоўны аратар, заклікаўшы да ўзброенага паўстання»[42]. Разам са сваімі таварышамі Чубанаў займаўся фарміраваннем баявой дружыны, вырабам халоднай зброі. Два дні (13—14 снежня) працягвалася паўстанне ў гэтым украінскім горадзе. Узброеныя самаробнымі бомбамі, пікамі і ружжамі рабочыя занялі чыгуначныя станцыі. Накіраваныя ў Аляксандраўск войскі спрабавалі выбіць паўстаўшых з занятых імі пазіцый. Побач з рускімі і ўкраінцамі на барыкадах змагаліся землякі Ф. Я. Чубанава, рабочыя чыгуначных майстэрань І. С. Ясенка, А. Г. Краўцоў, М. І. Бераславіч і іншыя[43]. Дружыннікі аказвалі ўпартае супраціўленне карнікам. Кожную барыкаду прыходзілася браць штурмам. 14 снежня, спрабуючы прарваць акружэнне і тым самым даць сваім таварышам магчымасць адступіць з барыкад, слесар І. С. Ясенка з дзвюма бомбамі ў руках кінуўся на салдат, аднак быў схоплены казакамі. Разам з шасцю сваімі таварышамі Ф. Я. Чубанаў і І. С. Ясенка былі прыгавораны да пакарання смерцю. Супраць гэтага прыгавора, які быў

вынесены ў лістападзе 1906 г. часовым ваенным судом у Екацярынаславе, выступілі рабочыя рада гарадоў Расіі і Украіны. Масавыя выступленні рабочых прымусілі ўлады замяніць пакаранне смерцю катаргай[44].

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. была жорстка падаўлена царызмам. Аднак сацыяльна-эканамічныя перадумовы — аб'ектыўная аснова народнага руху першай расійскай рэвалюцыі — не былі ліквідаваны.

Аграрная рэформа П. Сталыпіна, разлічаная на ўмацаванне ў вёсцы пазіцый капіталістычных элементаў, пацярпела крах, пакінуўшы недатыкальным буйное памешчыцкае землеўладанне.

Галоўнымі прычынамі абвастрэння сацыяльных супярэчнасцей, якія выклікалі павышаную актыўнасць сялян, па-ранейшаму з'яўляліся малазямелле і прыгнёт памешчыкаў.

З ліпеня 1907 па ліпень 1914 г. у Чэрыкаўскім павеце зафіксавана 15 сялянскіх выступленняў[45]. Аднак гэта цыфра не вычэрпвае іх агульнай колькасці, так як ахоплівае толькі тыя з іх, у якіх удзельнічала болей 10 чал. Большасць выступленняў здзяйснялася групамі да 10 чал. Магчыма, што гэта была тактыка сялян, разлічаная на тое, што для спынення мелкіх, але шырока распаўсюджаных патраў і парубак паліцыя і войскі прыцягвацца не будуць. Падлічана некалькі соцень выпадкаў парубак і патраў памешчыцкіх лясоў і ўгоддзяў, здзейсненых групамі па 3—9 чал. Гэты від барацьбы быў шырока распаўсюджаны на Чэрыкаўшчыне.

Распаўсюджанне тут атрымалі і падпалы памесцяў, маёмасці. Аб'ектамі падпалаў часта станавіліся млыны. Толькі ў жніўні 1907 г. у павеце было падпалена 5 млыноў[46].

Меў месца і тэрор супраць памешчыкаў і іх упраўляючых. У жніўні 1908 г. у дом памешчыка Ілініча (памесце Старожня) двое сялян кінулі праз акно бомбу, выбухам якой былі зроблены вялікія разбурэнні[47].

Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю жыхароў Чэрыкаўскага павета ў гады першай сусветнай вайны. Ужо ў 1915 г. тут стаў адчувацца недахоп прадметаў першай неабходнасці, многіх відаў сыравіны, паліва. Цяжар эканамічных вынікаў вайны пануючыя класы ўзвалілі на просты народ. Становішча было цяжкім яшчэ і таму, што Чэрыкаўскі павет знаходзіўся ў прыфрантавой зоне, тут было аб'яўлена ваеннае становішча. Улады атрымалі неабмежаваныя правы падаўляць сілай зброі малейшы выбух нездаволенасці сялян. Звычайны паліцэйскі апарат быў узмоцнены за кошт паліцыі акупіраваных раёнаў. Тысячы мужчын і жанчын былі мабілізаваны на ваенна-акопныя работы, якія вяліся на тэрыторыі Мінскай губерні. Усё гэта разам узятае тлумачыць адсутнасць выступленняў на тэрыторыі павета ў гады вайны.

Развіццё капіталізму ва ўсіх сферах жыцця садзейнічала расшырэнню сеткі школ.

На працягу ўсяго парэформеннага перыяду ў Чэрыкаўскім павеце не было адкрыта ніводнай сярэдняй навучальнай установы. Сістэма асветы была прадстаўлена пачатковымі вучылішчамі, царкоўнапрыходскімі школамі і школамі граматы.

У павятовым цэнтры з 1830 г. дзейнічала двухкласнае вучылішча, пераўтворанае ў 1902 г. у трохкласнае гарадское вучылішча. У 1908 г. у яго сценах вучылася 169 навучэнцаў. У горадзе працавала і аднакласнае прыходскае вучылішча, заснаванае ў 1790 г. З 1865 г. у ім маглі вучыцца і дзяўчынкі. Праз 42 гады ў Чэрыкаве адкрылася прыватнае жаночае чатырохкласнае вучылішча Е. Н. Гардзеевай. Паралельна працавала і прыватнае чатырохкласнае мужчынскае вучылішча Х. К. Кры-

сенкі. З 1886 г. у горадзе функцыяніравала казённае яўрэйскае вучылішча I разраду.

Пачатковыя школы, ці, як яны яшчэ называліся, народныя вучылішчы, працавалі ў 20 населеных пунктах павета, у тым ліку ў с. Камаровічы (заснавана ў 1864 г.), у с. Лабанаўка (заснавана ў 1868 г.). Колькасць навучэнцаў у такіх школах хутка расла. Напрыклад, у дзвюх вышэйназваных школах колькасць вучняў у 1886/87 навучальным годзе выросла: у Камаровіцкай школе з 20 вучняў да 48, у Лабанаўскай з 17 да 34 вучняў.

Павятовыя і народныя вучылішчы знаходзіліся ў распараджэнні Міністэрства народнай асветы. У 1888/89 навучальным годзе ў іх навучалася 900 хлопчыкаў і 50 дзяўчынак. К пачатку XX ст. колькасць школ Міністэрства народнай асветы павялічылася да 25, а колькасць навучэнцаў да 1315. Навучанне ў гарадскіх вучылішчах было платным. Так, у Чэрыкаўскім гарадскім вучылішчы плата за 1911/12 навучальны год складала 12 р., а ў прыватным жаночым вучылішчы Е. Н. Гардзеевай за навучанне ў падрыхтоўчым класе бацькам прыходзілася плаціць у 1907 г. 40 р., у першым і другім класах — па 50 р., у трэцім і чацвёртым — па 60 р.

Перад пачатковай школай, як і раней, ставілася задача ўмацоўваць у народзе рэлігійныя паняцці і распаўсюджваць веды. Яны мелі адзіны вучэбны план, які ўключаў закон божы, чытанне царкоўных і грамадзянскіх кніг, лік, царкоўныя спевы. Навучанне дапускалася на рускай мове.

Настаўнікамі ў гэтай катэгорыі навучальных устаноў (асабліва гарадскіх вучылішчах) нярэдка з'яўляліся дастаткова падрыхтаваныя спецыялісты, выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў. Так, у Чэрыкаўскім трохкласным гарадскім вучылішчы выкладалі І. С. Крышань і М. Е. Шаркевіч — выпускнікі Віленскага настаўніцкага інстытута, У. П. Яшчуржынскі, які скончыў медыцынскі факультэт Кіеўскага універсітэта, Г. П. Сакур — выхаванец Міргарадскай мастацкай школы.

У жаночым прыватным вучылішчы Е. Н. Гардзеевай настаўнікамі дзяўчынак былі выпускніцы Маскоўскага інстытута Імператара Мікалая I — А. А. Цвяткова і З. В. Цвяткова.

У сельскіх народных вучылішчах настаўнікамі, як правіла, з'яўляліся выпускнікі Полацкай настаўніцкай і Магілёўскай духоўнай семінарый[48].

У 1888—1889 гг. у Чэрыкаўскім павеце налічвалася 15 980 дзяцей школьнага ўзросту. З іх 12 860 былі пазбаўлены магчымасці наведваць школу. Тыя, хто меў такую магчымасць, з'яўляліся вучнямі царкоўнапрыходскіх школ і школ граматы. У першых навучаўся 481 вучань (463 хлопчыкі і 18 дзяўчынак), у другіх — 1689 вучняў (1560 хлопчыкаў і 120 дзяўчынак). Усяго на Чэрыкаўшчыне дзейнічала 16 царкоўнапрыходскіх школ і 85 школ граматы. 1 школа ў павеце прыходзілася на 1107 чал., а з улікам навучальных устаноў Міністэрства народнай асветы — на 924 чал.[49]

13 царкоўнапрыходскіх школ павета з 16 мелі ўласныя будынкі. Гэта быў адзін з лепшых паказчыкаў у Магілёўскай губерні. Што ж датычыцца школ граматы, то яны размяшчаліся ў наёмных памяшканнях.

Паводле прызнання мясцовых чыноўнікаў, не ўсе ўласныя памяшканні школ, і асабліва наёмныя, адпавядалі свайму прызначэнню. Многія з іх былі малаўмяшчальнымі, мелі дрэннае асвятленне, нізкую столь. Усе гэтыя недахопы тлумачыліся няхваткай сродкаў. Сродкі на ўтрыманне царкоўнапрыходскіх школ і школ граматы паступалі з розных

крыніц. Сяляне амаль паўсюдна адносіліся да школ са спачуваннем, «усведамляючы сапраўдную карысць ад граматы». Спачувальныя адносіны сялян да школ, паводле слоў кіраўнікоў Магілёўскай епархіі, якой падпарадкаваліся царкоўнапрыходскія школы і школы граматы, выяўляліся ў тым, што яны з году ў год павялічвалі сродкі на іх утрыманне. Асноўную частку сродкаў сяляне збіралі па прыгаворах сельскіх таварыстваў ці па ўзаемнаму пагадненню. У 1888/89 навучальным годзе агульная сума сабраных сельскімі таварыствамі грошай склала 40 773 р. 18 к., а годам раней — 34 531 р. 78 к.[50]

На рубяжы XIX—XX ст. царкоўнапрыходскія школы і школы граматы меліся: ў сёлах Верамейкі (35 навучэнцаў), Язёры (35), вёсках Ржавец (10), Наркі (24), Вербеж (20), Шароеўка (18), Шчацінка (20), Вепрын (25), Гронаў (13), Мірагошч (27), Ушакі (12), Зоры (21), Глінь (24), Удоч (20), Вусце (26), Пільня (15). Почапы (21), Тур'е (14 навучэнцаў)[51].

У царкоўнапрыходскіх школах выкладалі закон божы, царкоўныя спевы, чытанне царкоўнага і грамадзянскага друку, пісьмо, арыфметыку. Матэрыял для чытання быў рэлігійна-манархічнага зместу. Навучанне вялі свяшчэннікі, дыяканы і дзячкі, настаўнікі і настаўніцы, якія скончылі духоўныя вучылішчы.

К 1900 г. колькасць школ граматы ў Чэрыкаўскім павеце выросла да 148, а навучэнцаў да 3647 чал.

Паводле даных перапісу 1897 г. пісьменнасць у павеце склала 12,8 %, а ў павятовым цэнтры — 42,1 %.

У 1912 г. у Чэрыкаве і павеце было: 67 царкоўнапрыходскіх школ, 77 земскіх вучылішч, 1 рамесніцкае, 1 двухкласнае жаночае прыходскае вучылішча, 1 аднакласнае мужчынскае прыходскае, 36 народных вучылішч, 2 школы граматы, 1 чатырохкласнае гарадское вучылішча і 1 двухкласнае яўрэйскае мужчынскае вучылішча; 2 уласныя бібліятэкі[52].

Надзвычай неспрыяльным ў павеце быў стан медыцынскага абслугоўвання жыхароў.

Антысанітарныя ўмовы жыцця, дрэннае і недастатковае харчаванне, цяжкая праца садзейнічалі распаўсюджанню сярод насельніцтва туберкулёзу, рэўматызму, а таксама эпідэмічных захворванняў — тыфу, дызентэрыі, дыфтэрыі, шкарлятыны, адру, коклюшу і іншых. У канцы XIX ст. на Чэрыкаўшчыне функцыяніравалі: 2 бальніцы ў Чэрыкаве (па 36 ложкаў) і 3 сельскія прыёмныя пункты — у Маляцічах (12 ложкаў, Краснаполлі (20 ложкаў), Брацькавічах (20 ложкаў)[53]. У Чэрыкаве ў 1893 г. працавалі 3 урачы, 3 фельчары і бабка-павітуха. У павеце лячэннем хворых займаліся 6 урачоў, 13 фельчараў (двое аплачваліся сельскімі таварыствамі), 6 бабак-павітух.

У 1893 г. да ўрачоў і фельчараў звярнулася за дапамогай 30 788 жыхароў павета. У 1911 г. колькасць звярнуўшыхся да медыцынскіх работнікаў склала 104 240 чал.[54]

Лякарствамі насельніцтва забяспечвалі 3 аптэкі, 4 аптэчныя лаўкі, у якіх працавалі 2 правізары і 4 аптэкарскія памочнікі, 2 аптэкарскія вучні.

[1] Подсчитано по материалам Первой всеобщей переписи населения Российской империи 1897 г. ЦДГА Расіі, ф. 1290, воп. 11, спр. 1375.

[2] Белоруссия в эпоху капитализма. Сборник документов и материалов. Т. 2. Мн., 1990. С. 71.

[3] Тамсама. С. 61.

[4] Тамсама. С. 59.

[5] Тамсама. С. 60.

[6] Опыт описания Могилевской губернии/ Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 2. Могилев, 1882.

[7] Подсчитано по материалам Первой всеобщей переписи населения Российской империи.

[8] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 437—444.

[9] Колас Я. Збор твораў: У 14 т. Т. 6. С. 223.

[10] Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862 гг.). Мн., 1959. С. 409.

[11] Тамсама. С. 441.

[12] Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991. С. 170.

[13] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986. С. 308.

[14] Очерки мятежного движения Могилевской губернии. Вильно, 1863. С. 33.

[15] Миловидов А. И. Перечень боевых столкновений русских войск с польскими повстанцами в кампании 1863—1864 гг. в пределах Северо-Западного края. Вильно, 1915. С. 33.

[16] Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991. С. 170.

[17] Статистика поземельной собственности и населенных мест Европейской России. Вып. V. Спб., 1882.

[18] Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962. С. 24.

[19] Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. Могилевская губ. Спб., 1908. С. 32.

[20] Подсчитано по: Список населенных мест Могилевской губ. Могилев, 1908.

[21] Крестьянское движение в России в 1881—1889 гг.: Сборник документов. М., 1960. С. 67.

[22] Тамсама. С. 203.

[23] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 811.

[24] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2001, воп. 1, спр. 1668, л 14.

[25] Указатель фабрик и заводов Европейской России/ Под ред. П. Орлова. Вып. III. Спб., 1894; Список фабрик и заводов Европейской России/ Под ред. В. Е. Варзара. Спб., 1903.

[26] ЦДГА Расіі, ф. 1290, воп. 11, спр. 1375; Опыт описания Могилевской губернии. /Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 2. Могилев, 1882. С. 166.

[27] Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии в 1795—1861 гг. Мн., 1966. С. 113—115.

[28] Торговля и промышленность Европейской России. Вып. II. Северо-Западная земледельческая полоса. Спб., 1903. С. 185; Леса БССР. Мн., 1954. С. 42.

[29] Липинский Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии. Мн., 1971. С. 141.

[30] Энциклопедический словарь Ф. А. Брокгауза и И. А. Эфрона. Т. XXXVII А. Спб., 1903. С. 571.

[31] ЦДГА Расіі, ф. 1291, воп. 6, спр. 8, л. 9.

[32] Раевский М. Западный район экспедиции по изучению хлебной торговли и производительности России. Ч. 2. С. 15; ЦДГА Расіі; ф. 398, воп. 37, спр. 12840, л. 36; ф. 1284, воп. 67, спр. 118, л. 18.

[33] Вестник Могилевского земства. 1915. № 3. С. 5.

[34] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 359, воп. 1, спр. 69, л. 435—435 ад.

[35] Вестник Могилевского земства. 1915. № 3. С. 7.

[36] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2176, воп. 1, спр. 51.

[39] Тамсама.

[38] Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962. С. 213. Прилож. 7.

[39] Аграрное движение в России в 1905—1907 гг. Ч. I. Спб., 1908. С. 376—377.

[40] Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.: Документы и материалы. Мн., 1955. С. 487—488.

[41] Революция 1905—1907 гг. в России: Документы и материалы. Высший подъем революции 1905—1907 гг. Ч. III. Кн. 1. С. 135; Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 102, ОО, спр. 2455, т. V, л. 185.

[42] ЦДГА Украіны, ф. 313, воп. 2, спр. 1251, л. 63.

[43] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 102, 7-е д-во, 1905 г., спр. 7324, л. 7.

[44] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 102, ОО, 1906, спр. 5, н. 15, л. 11—12; ЦДГА Украіны, ф. 313, воп. 2, спр. 1251, л. 62 ад., 176, 176 ад.

[45] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 102, 7-е д-во, 1905 г., спр. 7324, л. 10 ад.; Історія міст і сіл Української РСР. Запорізька область. Київ, 1971. С. 72.

[46] Подсчитано по книге: Липинский Л. П. Классовая борьба в белорусской деревне 1907—1914 гг. Мн., 1981. С. 77, 139.

[47] Могилевский вестник. 1908. 2.18 сент.

[48] Могилевский вестник. 1907. 4 авг.

[49] Памятная книжка Виленского учебного округа на 1877 г. Вильна, 1877. С. 469—471; Памятная книжка Виленского учебного округа на 1908/1909 учебный год. Вильна, 1908. С. 328—329.

[50] Отчет о церковно-приходских школах Могилевской епархии на 1889/1890 учебный год. Могилев, 1891. С. 5—6, 21, 24, 25.

[51] Таксама. С. 32.

[52] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2001, воп. 1, спр. 2070, л. 23.

[53] Больницы в губерниях и областях Российской империи по сведениям за 1887 год. Спб., 1890. С. 6.

[54] Обзоры Могилевской губернии за 1893 и 1909 гг.

У. Філякоў.

ДАНЯСЕННЕ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ АДНОСІНАХ ДА РЭФОРМЫ СЯЛЯН І ПАМЕШЧЫКАЎ ГУБЕРНІ

18 ліпеня 1862 г.

Объехав до настоящего времени более 50 вол. Могилевского, Чаусского, Чериковского и Быховского уу., я считаю долгом довести до сведения в. в. п. о результате моих поездок. Результат этот доныне один и тот же, т. е. везде крестьяне объявляют желание выкупить вместе с усадьбами и полевую землю, т. е., как говорят они, идти на царский выкуп. Нельзя, однако, сказать, чтоб согласившиеся крестьяне были приготовлены уже к этому роду бытового своего устройства, по большей части и в особенности в местах, отдаленных от губернского города, к границам Черниговской губ., мне стоило большого труда добиться этого результата, т. е. вообще побудить их высказать, чего они желают. Действия мои по-прежнему, как я имел честь доносить в. в. п. от 22 июня № 1119*, ограничиваются подробным толкованием Положения и разъяснением возбуждаемых крестьянами вопросов не указывая им на преимущество того или другого способа установления их отношений с владельцами. Эта осторожность в действиях, как я уже убедился, совершенно согласна с духом и характером крестьян: они стоят за свободу, желают, чтобы переворот в их быту совершился по их желанию, и на преждевременные советы смотрят вообще подозрительно. К барщинной повинности имеют полное отвращение и предпочитают выкуп, как действительно более для них выгодный и ставящий их в прямое соотношение с правительством. Общее их в этом отношении желание выражается в поговорке, не раз мною слышанной: «Одному богу молиться, одному царю служить, а на всех панов не наслужишься». Связь здешних крестьян с правительством, царем — сильна. Случалось, что слова: «Это царская воля, царский закон» — разрешали все недоразумения и колебания крестьян. Доверие крестьян губернатору, как царскому слуге, велико, зато связь их с владельцами и доверие к ним совершенно рушились. Лучшим этому доказательством служит то, что крестьяне охотнее верят и скорее готовы слушать всякого носящего звание или костюм чиновника, потому что он, рассуждают они, царский слуга. Скажу еще более, они готовы верить всякому, но только не помещику. Это недоверие крестьян, к сожалению, перешло и на мировых посредников, как помещиков. Мне случалось встречать, что те помещики, которые в прежнее время были любимы крестьянами и имели на них сильное влияние, ныне, как посредники, совершенно без влияния. Это грустное, но, быть может, выработанное временем убеждение крестьян о помещике сильно препятствует успешному ходу дела: парализуя действия мировых посредников и некоторых действительно благомыслящих владельцев, оно допускает прививаться в среде их самым нелепым толкам лишь бы они вышли не из помещичьих уст. Сильнее других распространены между ними слухи, что по истечении 2 лет царь подарит им землю: «Царь дал нам волю, царь даст нам и землю, без земли человек не родился. Прежде не верили, что будет воля, а она дана, быть может так и будет и с землею». Нужно при этом заметить, что хотя крестьяне не ощущают еще, так сказать, физически последствий дарованной им монархом свободы, но нравственно сознают и предвкушают ее блага и сердечная их в этом отношении благодарность и любовь к государю — беспредельны.

Действия мировых учреждений удовлетворительны. Несмотря на поспешность, с которой производился выбор сельских властей, и на новость этого дела, в посещенных мною волостях мне редко встречалось видеть сельских старост и волостных старшин, которые не отвечали бы своему назначению. Правда, встречаются между ними люди с слабым характером и без влияния, но между волостными старшинами встречались люди с прекрасным направлением, вполне уразумевшие сущность Положения и имеющие на крестьян огромное благодетельное влияние. К чести крестьян должно заметить, что при перемене мировыми посредниками порочных и вообще несоответствующих своему назначению старост и старшин, они не только не высказывают неудовольствия, но много помогают в этом посредникам.

Из разговоров моих с крестьянами я убедился, что они весьма мало знакомы с Положением, что также много вредит делу, и если встречается поэтому крайняя необходимость распространения между ними основных начал Положения, то тем

* Не публикуется.

не менее необходимость эта чувствуется и по отношению к помещикам. Между последними случилось мне встречать людей, не читавших Положения и знающих о нем только по слухам. Некоторые из них даже не верят в уничтожение крепостного права и убеждены в сохранении на долгое еще время прежних отношений их к крестьянам. Мне случилось иметь дело с помещиком, который не соглашался на выкуп крестьян только потому, что не знал, что крестьяне и без его согласия будут иметь возможность перейти на оброк, и с другим, который весьма удивился, услышав, что выкупные свидетельства приносят проценты. Говоря о понятиях и действиях помещиков Могилевского, Чаусского, Чериковского и Быховского уу. в крестьянском деле, я имею основания разделить в этом отношении помещиков на 3 категории. Одни из них, впрочем весьма малая часть, или охотно, или после долгого убеждения соглашаются на выкупную операцию, другие твердо стоят за барщинную повинность в уверенности, что как бы ни были тяжелы их требования по отношению к крестьянам, они найдут в будущем сильную поддержку со стороны правительства, наконец, третьи; самая большая часть — выжидающие, как это дело решится и пойдет у других, это последнее обстоятельство еще более убеждает меня в необходимости делать поездки по губернии с промежутками в той цели, чтобы начинающему выкупному делу дать более гласности и свободы...

Гражданский губернатор *Беклемишев.*

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862 гг.). Док. и мат. Мн., 1959. С. 420—422.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ МАГІЛЁЎСКАЙ ПАЛАТЫ КРЫМІНАЛЬНАГА СУДА ПА СПРАВЕ АБ МАСАВЫХ ПАРУБКАХ ПАМЕШЧЫЦКАГА ЛЕСУ СЯЛЯНАМІ в. ВАРОДКАВА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

30 ліпеня 1862 г.

По указу е. и. в. Могилевская палата уголовного суда слушала: записку из жалобного дела, представленного на ревизию палаты Чериковским уездным судом 16 июля, о казенных крестьянах дер. Вородково Демьяне Иванове, Иване Иванове, Фоме Демьянове, Трофиме Федосове и Петре Андрееве, судимых за порубку леса помещика Москевича*.

Обстоятельства дела сего следующие:

Объявление. Ботвинов-Ботвитевская, помещица Алекской экономии, представляя 27 февраля 1861 г. в Чериковский земский суд лошадь с санями и упряжью, взятую у казенных крестьян дер. Ботвиновки по самовольной порубке дровяного леса, принадлежащего помещику Москевичу, просила лошадь по оценке с санями и упряжью выдать экономии, а с вырубившими до 6 дес. дровяного леса поступать, взыскав с них понесенные через то убытки...**

А потому палата полагает:

1. Подсудимых казенных крестьян Демьяна Иванова 50, Ивана Иванова 36, Трофима Федосова 44, Петра Андреева 33 и Фому Демьянова 20 лет за их вину, на основании приведенных законов, первых 4 лишить всех особенных лично и по состоянию присвоенных им прав и преимуществ, а последних — без лишения сих прав наказать розгами при земской полиции 40 ударами каждого и потом отдать под особый надзор общества на 2 года. Кроме сего, взыскать поровну с их имущества, им принадлежащего, по оценке за вырубленный лес 60 руб., деньги эти обратить на удовлетворение помещика Москевича. Если же кто из подсудимых окажется несостоятельным к платежу упадающей на него части взыскания, то эту часть взыскать с имущества состоятельных (ст. 64 Уложения).

2. Крестьян Григория Игнатьева, Льва Иванова, Петра Николаева, Ивана Иванова и Андрея Степанова, как не сознавшихся и не уличенных в порубке леса, согласно 304 ст. XV т., оставить от суда и взыскания свободными.

3. Находящуюся у управляющего Ботвинской экономии дворянина Ронандзинского по поручительной расписке лошадь с упряжкой и санями подсудимого Демь-

* Опущено перечисление документов по делу.

** Опущено 10,5 листа текста с показаниями подсудимых и свидетелей.

яна Иванова возвратить Иванову в том лишь случае, если упадающее с него и его товарищей взыскание будет ими исполнено, в противном случае обратить ту лошадь с упряжью и санями на удовлетворение присужденного взыскания с подсудимых.

4. Прогонные деньги, выданные кандидату судебного следователя, взыскать с подсудимых, а в случае несостоятельности их принять на счет казны.

5. По делу этому допущена медленность становым приставом Буйвидом, заключающаяся в том, что земским судом поручено было ему произвести осмотр порубленному лесу 2 марта, а приступил едва 22 сентября, за что виновному на основании 455 ст. Уложения определяется замечание, или выговор, более или менее строгое, а потому медленность эту подать на положение губернского правления, согласно с 255 ст. II т. Сводов губернских учреждений, но, не приводя сие решение в исполнение, вместе с делом представить на рассмотрение г-на начальника губернии, и, когда будет утверждено, привести в исполнение.

За председателя
заседатель Королев.
Заседатель Абалалович.

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862 гг.). Мн., 1959. С. 423—424.

АДРЭЗКІ ЗЯМЛІ Ў СЯЛЯН ВЁСАК МІРАГОШЧ І ГОРКІ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

Устаўная грамата.
1862. XII.II.

Могилев. губ. Чериковского у. дер. Мирогоща и Горки генерал-адъютанта графа Сергея Павловича Сумарокова.

I.

1. В дер. Мирогоще и Горки значится по 10-ой народной переписи мужеска пола душ крестьян 133.

2. Из этого числа не подлежат наделению землею, как отказавшийся от оного, на основании 8 ст. местного положения 1 мужеска пола душа.

3. За сим должны, на основании положения, получить в пользование поземельный надел 132 ревизские мужеска пола душ.

II.

1. Всей земли состояло в пользовании крестьян до обнародования положений о крестьянах пахотной 709 десятин и сенокосной по реке Сожу 59 чверток (чвертка — десятина или более).

2. Из них собственно под крестьянскою оседлостью 27 десятин (в числе которых входит около 11 десятин выпуска, 9 дес. в Мирогоще и 2 десятины в Горках, состоящей в общем пользовании крестьян и помещика).

3. Для местности, где находятся деревни, определен местным положением о поземельном устройстве крестьян высший размер душевого надела 4 дес. 1200 саж., а по числу душ в деревнях, желающих получить надел, высший размер надела на все крестьянское общество составляет 594 десятины.

4. Так как крестьяне пользуются ныне землею в большем против высшего размера количестве, то им предоставляется в постоянное пользование полное количество земли по расчету высшего размера душевого надела 594 дес., а затем остальная земля, сверх сего количества, бывшая в их пользовании в количестве около 174-х дес. (по р. Сож частью из лугов, возле полосы, 2 $^1/_2$ десятины, где кирпичный завод) отрезывается от их надела и обращается в непосредственное распоряжение помещика.

Примечание. Означенное количество земли определено на основании плана приблизительно.

III.

1. Бичевник по левой стороне р. Сожа с паромным перевозом через реку, а равно и рыбная ловля на всем протяжении реки Сожа, озерах и горковском пруде остают-

ся в непосредственном распряжении помещика. 2. Право устраивать переправу через реку Сожа исключительно остается за помещиком.

3. Постоялый двор в д. Мирогоще остается в распоряжении владельца. 4. Состоящий в общем пользовании выгон остается впредь до раздела в общем пользовании крестьян и помещика.

IV

1) За предоставленную в постоянное пользование крестьян землю в количестве 4 десятины 1200 саж. на душу, причитается на основании положения рабочих дней с каждого душевого надела 24 мужеских летних, 16 муж. зимних, 18 женских летних, 12 женских зимних, итого 70. А со всех 132 душевых наделов рабочих дней: мужеских летних 3168, мужеских зимних 2112, женских летних 2376, женских зимних 1584, итого 9240 для последующего перехода крестьян на оброк причитается на основании положения с каждого душевого надела оброка 8 руб. сереб. в год, а со всех 132-х душевых наделов 1056 руб. сереб. в год.

Из состоящего... оставлено в непосредственном владении и распоряжении помещика возле помещичьего при дер. Мирогоще парома три десятины.

Из числа душевого надела приходится на усадьбу 1 руб. 25 к. серебр., так как она причисляется к первому разряду (потому что имение земледельческое), вследствии чего повинность за пользование всею усадебною оседлостью кретьянского общества составляет 165 руб. сереб. в год. Так как усадьба даруется помещиком (в указанной цене) в вечную собственность крестьянам и рабочих дней причитается со всех 132 душевых наделов мужеских летних 2673, мужеских зимних 1782, женских летних 2005, женских зимних 1335,— итого 7795; то причитается также со всех 132 душевых наделов 891 руб. сереб. в год. (Оброк этот на основании высочайшего указа 2.XI.1863 г. понижен на 20 % и определен в 5 р. 20 к. с души, а со всех душ в 696 руб. 80 к. серебром.) 2) С уничтожением барщины или издельной повинности оставляются на крестьянах обязанности в отношению к помещику в случаях указанных 234 и 235 стат. местн. полож. 3) Так как у крестьян находится мало зарослей, то отпуск топлива из валежника предоставляется крестьянам за плату, какая будет назначена от правительства, но с тем, чтобы крестьяне не продавали дров на сторону. 4) Оброк крестьяне обязаны вносить в два срока по 445 р. 50 к. сереб.— именно: в первых числах января и июля месяцев. Срок для перехода крестьян на оброк назначается первое число сентября месяца.

5) За исправную уплату оброка и отбывание издельной повинности ответствует круговою порукою все общество на основании правил, установленных местным положением.

Вновь составлено мая 10 дня 1862 года по доверенности графа Сумарокова коллежский секретарь Владимир Воницкий — при поверке на месте этой уставной грамоты последовало между обеими сторонами в отношении отрезка излишней от надела земли добровольное соглашение, о чем составлен 30 августа сторонами акт с пояснением — в оном подробно отрезки земель, и в каких местах и границах должна быть оная произведена. А как в этой же уставной, из числа душевого надела, отнесено на усадьбы, оброка менее 1 рубля 50 копеек, и предмет этот, в высоч. утвержденных в 19 день февраля 1861 года положениях о крестьянах не разрешен, и поэтому представлено было о том могилевскому Губернскому по крестьянским делам Присутствию, в разрешении чего оное предложением от 31 октября за № 2383 дало знать, что оно не считает себе возможным допустить взыскание оброка по 6 руб. 75 коп., а поэтому согласно отношению Чериковского уездного Мирового Съезда от 17 ноября с. г. полагаю из числа душевого надела на усадьбу 1 руб. 50 коп. следует по этой уставной за предоставленную в оной, кроме дара в надел землю отбывать в год издельной повинности со всех 132 душевых наделов рабочих дней мужеских летних 2574, муж. зимних 1716, жен. летних 1980, жен. зимних 1237. А всего 7507 дней, а оброка причиталось со всех 132 душевых наделов 858 рублей, о чем обеим сторонам для исполнения, а также и о том, что по всем прочим пунктам этой уставной грамоты, и по обозначенному выше акту, последовало добровольное соглашение, и оное утверждено уездным Мировым Съездом, объявить с подписками. Декабря 11 дня 1862 г. Чериковского уезда Мировой посредник (подпись).

При введении в действие этой уставной грамоты находились соседствующих селений добросовестных: д. Александровки — Иван Семенов, д. Ушаков — Карп Сидоров, д. Монастырина — Степан Анисимов и д. Верблина — Юрий Листратов,

в вместо их, как неграмотные по их личной и рукоданной просьбе росписуюсь *Назарий Ларионов Велиналив.*

Понижение определенных в этой уставной грамоте денежных повинностей крестьян, на основании 3 ст. высоч. указа 2 ноября 1863 года и приложенных к сему указу правил сделана.

Мировой посредник Чериковского уезда 2 участка И. Бибиков. Сентября 21 дня 1867 года.

Председатель Мирового Съезда (подпись)

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 442—444.

ЗАПІСКА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА ПРАДВАДЗІЦЕЛЯ ДВАРАНСТВА АБ НЕІСНАВАННІ Ў ПАВЕЦЕ ПАМЕШЧЫЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ЯКІЯ ЗАЙМАЛІСЯ Б СУПРАЦЬПРАЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ

М. В. Д.
Чериковского
Уездного Предводителя
Дворянства
13 Апреля 1863 г.
№ 218

Господину Начальнику
Могилевской губернии

О несуществовании обществ
противных законам

В отзыв к предместнику моему от 15 февраля № 1,444, Ваше Превосходительство просили принять меры к уничтожению Помещичьих кружков, называемых колки, если они существуют, так как эти колки имеют вид обществ и съездов, существование которых без надлежащего разрешения, противно Законам.

Вследствии сего, имею честь уведомить, что таких кружков или съездов дворян-помещиков, которые имели бы вид обществ противных законам, в Чериковском уезде не существует и как мне известно, то слухи о колках распространялись напрасно: что Гг. Помещики, находя важным обеспечение крестьян угодьями согласно новым положениям, посещали себя для того, чтобы посоветоваться о удобнейшем составлении и введении в действие Уставных Грамот и выкупных договоров в смежных и одинаковых местностях своих, но как Уставные Грамоты уже представлены и введены, то частные посещения эти общею пользою вызванные, о коих не безызвестно Вашему Превосходительству от предместника моего, сами по себе миновались.

Предводитель [Подпись]

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2001, воп. 2, спр. 2, л. 20—21.

РАЗГРОМ СЯЛЯНАМІ ПАМЕШЧЫЦКАГА ДВАРА Ў ЧЭРЫКАЎСКІМ ПАВЕЦЕ І АБОЗА ПАЎСТАНЦАЎ

1863 г. V.10. Пісьмо упраўляючага маёнткамі графа С. П. Сумарокава, Вінніцкага Магіл. губернатару.

У нас такая скверная кутерьма в Черикове, что описать ее довольно долго,— я выехал из Езарь с семейством в г. Чериков, о чем я уже донес Сергею Павловичу, был я с отрядом в первом деле и видел расположение крестьян, их собралось к отряду до 400 человек с дубьем и с ружьями и много помогли отряду в проводе.

Беда наша в том, что здесь, в уезде, все начальники поляки, мировые посредники тоже, сам же представитель дворянства Костровицкий еще 20 марта закупил для инсургентов 3 воза ветчины, 1 воз сала и два воза кож для сапог, что я узнал совершенно случайно, но теперь подтвердилось на деле потому, что там (у Костровицкого имение Петрулино) собираются и живут дня по два, это в 6 верстах от имения е. сиятельства Сергея Павловича.

Еще страннее, что здешний исправник, называет содействие крестьян отряду возмущением и уже просил губернатора, чтобы ему дано было войско, для усмирения крестьян (возмутившихся). Наш губернатор так доверчив, что здесь все боят-

ся, что он согласится на просьбу исправника. Вот главная причина, почему я обращаюсь к вам о помощи. Насчет выражения исправника есть свидетели и главное начальник батареи, которому он это сказал в присутствии многих лиц.

С своей стороны, я должен сказать, что крестьяне против поляков, но что достаточно слова русского, чтобы крестьяне исполнили чего от них требует долг. Поводом же к выражению исправника послужило разграбление крестьянами дома помещика Висковского, у которого пировала шайка. Когда его взяли, то он сам просил взять его под конвой. Крестьяне спросили выпить водки и когда подпили, то перебили в доме окна и прочее, где, кроме прислуги, никого не было из членов семейства помещика, ибо он холост.

Буйства же при этом никакого не было и совершилось это в то время, когда отряд был занят за 4 версты разграблением обоза инсургентов, успевших переправиться через реку и уничтожить паром. Обоз истреблен совершенно, крестьяне вплавь через реку переправились к обозу, куда их скоро собралось до тысячи человек. Примите уверение ваше превосходительство во всегдашнем к вам почтении и преданности вашего усердного слуги Винницкого.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 521.

ПРАТАКОЛ ДАЗНАННЯ, ЯКІ СКЛАДЗЕНЫ ПРЫСТАВАМ 2-га СТАНУ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА П. І. СІЛІНІЧАМ, АБ ЗНАХОДЖАННІ ПАЎСТАНЧАГА АТРАДА Я. ЖУКОЎСКАГА («КОСЫ») У ім. ХОДАСАВА І АБ ДАЛУЧЭННІ СЯЛЯН ДА ПАЎСТАЎШЫХ

4 верасня 1863 г.

1863 г. сентября 4 дня Чериковского у. становой пристав 2-го стана вследствие поручения чериковского уездного исправника от 22 истекшего августа за № 69, съехав в им. Ходосово, помещика Голынского, делал дознание о последствиях набега на фольв. Ходосов, принадлежащий помещику Голынскому, шайки мятежников по заборе* крестьян Федора Андреева, Ивана Лукьянова, Ивана Игнатова и Игната Евменова, по которому открывается следующее: после праздника Егорова дня на третий день, т. е. 25 апреля в четверг, шайка мятежников под предводительством Яна Косы** расположилась на бивак в лесу под названием Зеленая дубрава, принадлежащем помещику Александру Голынскому, неподалеку от фольварка его, называемого Ходосов. Весть об этом смутила местных жителей, староста этого им. Ходосова Тимофей Илларионов ту же минуту занялся было собирать народ к преследованию шайки и сбережению деревни от набега ее, но едва успел собрать людей, предводительствовавший шайкою под названием Ян Косы с дружиною своею человек более 30 прибыв в фольварок, потребовал управляющего фольв. Ходосовым Лютынского и его старосту, в лице их собравшемуся тут народу объявил: «Что уже теперь в здешнем крае управление польского короля, русского же царя законы не имеют никакого значения; король польский дал совершенную свободу крестьянам, и поэтому крестьяне уже свободны совершенно от всех повинностей, на них до сих пор лежавших, никто не имеет права с них взыскивать ни податей, ни пригона, и если управляющий и староста с сего дня будут требовать от крестьян каких-либо послуг на экономию или уплаты податей и других денежных сборов, то они за это от него же получат пулю в лоб». Такая весть и распоряжение этого мятежника хотя и показалась крестьянам лестною, но в истине ее все сомневались и начали было между собою о сем поговаривать, тогда этот же Коса приказал отпустить водки народу, убеждал их в истине его распоряжений, приглашал следовать с ним вместе, предложил каждому по рублю серебром жалованья в сутки. Цель предпринятого ими намерения есть единственно та, чтобы крестьян сделать совершенно свободными и уравнять их происхождение с прочими сословиями. Такое угощение Косы, как объясняются крестьяне, отняло у них присутствие самосознания и расположило к нему, с этого только поводу крестьяне в числе до 20 человек: Иван Пахомов, Федор Андреев, Иван Лукьянов, Иван Игнатов, Игнат Евменов, Сергей Терехов, Василий Леонов, Федор Якимов, Ефим Павлов, Василий Иванов, Евмен Андреев, Яков Пахомов, Антон Яковлев, Дмитрий

* Т. е. после ареста.
** В тексте здесь и далее Косса.

Напярэдадні першай сусветнай вайны насельніцтва горада дасягнула 6198 чал. (1910). У гэты час агульны лік жылых пабудоў склаў 748 (12 мураваных і 736 драўляных), вуліц і завулкаў — 22 (выбрукаваных вуліц 25 %, тратуараў 32,5 %). Асвятлялі іх 42 газавыя ліхтары. Працавала 7 гасцініц, рэстаран, карчма, 6 харчэвен, сталовых, чайных, буфетаў, 3 вінныя лаўкі. Дзейнічалі 3 ашчадныя касы, страхавое таварыства, натарыяльная кантора, бібліятэка-чытальня, друкарня, фотаатэлье[35]. Напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Чэрыкаве працавалі мужчынская гімназія, 2 пачатковыя вучылішчы[36].

[1] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. Спб., 1882. Т. 9. С. 482.
[2] Е. Зябловский. Землеописание Российской империи для всех состояний. Спб., 1810. С. 108.
[3] Городские поселения Российской империи. Спб., 1863. Т. 3. С. 203.
[4] Жучкевіч В. А. Чаму так названа. Мн., 1969. С. 116.
[5] Заклік Ільіча. 1988. 31 сакавіка.
[8] Опыт описания Могилевской губернии/ Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1. Могилев, 1882. С. 19—20.
[7] Географическо-статистический словарь Российской империи. Спб., 1885. Т. V. С. 630.
[8] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986. С. 368.
[9] Заклік Ільіча. 1988. 31 сакавіка.
[10] Абецедарский Л. С. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией // Воссоединение Украины с Россией. М., 1954. С. 194.
[11] Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 37; Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии (вторая половина XVII — XVIII вв.). Мн., 1975. С. 15.
[12] БелСЭ. Т. 11. Мн., 1974. С. 265.
[13] Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1972. Т. 1. С. 324—325.
[14] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... Спб., 1855. С. 230.
[15] Полное собрание законов Российской империи. Т. XIX, № 14014. Спб., 1773; Т. XX, № 14603. Спб., 1777; Т. XX, № 14693, 14707. Спб., 1778; Т. XXI, № 15206. Спб., 1781; Т. XXIV, № 17702. Спб., 1796; Т. XXVII, № 20162, 20325. Спб., 1802.
[16] ЦДАСА, ф. 1355, спр. 735, л. 1—2.
[17] Тамсама, ф. 543, спр. 767, л. 41.
[18] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества/ Под ред. В. П. Семенова. Т. IX. Спб., 1905. С. 481; Географическо-статистический словарь Российской империи. Спб., 1885. С. 630; Путешествие Ея Императорского Величества в полуденный край России, предприемлимое в 1787 году. Спб., 1786. С. 23.
[19] Севергин В. Продолжение записок путешествия по западным провинциям Российского государства. Спб., 1804. С. 118.
[20] Статистические таблицы о состоянии городов империи. Спб., 1840. С. 24—25.
[21] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. IV. Мн., 1979. С. 361.
[22] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1297, воп. 1, спр. 16 645, л. 1—5.
[23] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 289.
[24] Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861—62 гг. Ч. I. Спб., 1863. С. 27—28.
[25] Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861). Мн., 1966. С. 97; Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 г. Могилев, 1861. С. 102.
[26] Географическо-статистический словарь Российской империи. Т. V. Спб., 1885. С. 630—631; Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861—62 гг. Спб., 1863. С. 29; Городские поселения в Российской империи. Т. 3. Спб., 1863. С. 204; Могилевские губернские ведомости, 1865, № 36. С. 246; Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. Могилев. 1861. С. 102.
[27] Могилевские губернские ведомости. 1865, № 36. С. 245—247.
[28] Опыт описания Могилевской губернии/ Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 2. Могилев, 1882. С. 139—140.
[29] Первая всеобщая перепись населения Российской империи. 1897, XXIII. Могилевская губерния. Спб., 1903. С. 2, 3, 131, 138—139.
[30] Памятная книжка Могилевской губернии на 1901 год. Могилев, 1901. С. 313; Памятная книжка Могилевской губернии на 1903 год. Могилев, 1903. С. 309.
[31] Города России в 1904 году. Спб., 1906. С. 64, 70—71, 76—77, 86—87, 93, 108—111, 116—117, 120, 123, 127, 129, 130.
[32] Известия Гомельского губернского комитета РКП. 1923. № 58. С. 87—90; Гісторыя Беларускай ССР. Т. 2. Мн., 1972. С. 291—292.
[33] Известия Гомельского губернского комитета РКП. 1924. № 63—64. С. 92—94.
[34] Революционное движение в Белоруссии. 1905—1907 гг. Мн., 1955. С. 155—156.

[35] Города России в 1910 году. Спб., 1914. С. 80—81, 86—87, 92—93, 98—99, 102, 106, 126—127, 130, 133, 135, 140—141, 144, 150—151, 154, 161, 163.

[36] Календарь-справочник Могилевского земства за 1917 год. Могилев, 1916. С. 213, 216, 219.

А. Шчарбатаў.

Чэрыкаў у пачатку XX стагоддзя — вачыма сведкі

З успамінаў Л. І. Валюжэніча

Чэрыкаў меў прыгожы від з боку Крычава, Прапойска, Чавус і Засожжа. Праз яго праходзіла вядомая Маскоўска-Варшаўска-Венская шаша. Уздоўж і перасякаючы яе пралягалі вуліцы з дамамі, у асноўным пяцісценкамі. Ля дамоў — драўляныя тратуары. Сядзібы выгараджаны, ля іх — садовыя насаджэнні. Самы вялікі сад плошчай 3—4 гектары належаў Белафаставу — былому начальніку пошты. Вызначаліся памерамі таксама сады Касановіча, Кошура, Лобава, Гутарава і іншых.

Самай добраўпарадкаванай часткай горада быў яго цэнтр. Тут размяшчаліся дзяржаўныя ўстановы — паліцэйскае ўпраўленне, на чале якога стаяў павятовы спраўнік са сваімі памочнікамі і прыставамі, упраўленне воінскага начальніка, дзяржаўнае казначэйства, земская ўправа з усімі пададдзеламі.

У горадзе былі мужчынская і жаночая гімназіі, гарадское чатырохкласнае вучылішча, тры пачатковыя школы (2 беларускія і яўрэйская). У беларускіх школах выкладанне вялося на рускай мове, у яўрэйскай — на яўрэйскай.

Дзейнічала бальніца, якую абслугоўвалі два ўрачы, фельчар, акушэрка. Галоўным урачом бальніцы і ўсяго павета быў Ілья Аляксандравіч Ахіезер. Працавалі ў горадзе і два прыватныя ўрачы — Рагалер і Белафастаў. Пры гарадской бальніцы працавалі зубалячэбны кабінет і два прыватныя дактары. Лекі можна было атрымаць у гарадской аптэцы, якой ведаў правізар Рыўлін з двума памочнікамі. Апрача таго, былі два аптэкарскія магазіны Злотнікава і Когана. Коган меў яшчэ і невялікую друкарню, якая выконвала заказы гарадскіх устаноў і прыватных асоб. Працавала фатаграфія Замскага. Рамонтам і продажам гадзіннікаў займаўся Цёмкін. Невялікі магазін канцтавараў Ліфшыца быў да паслуг вучняў і дарослых.

Заводаў не было, апрача рэціфікатна-гарэлачнага. Дзве смалакурні выпрацоўвалі дзёгаць і шкіпінар. Двума воднымі млынамі і крупадзёркай валодаў Дубровін.

У Чэрыкаве таго часу пражывалі беларусы і яўрэі, якія складалі значную частку гараджан. Сельскай гаспадаркай яўрэі не займаліся, а на дзяржаўную службу іх не прымалі. Яны займаліся, як правіла, гандлем, былі добрымі кавалямі, сталярамі, краўцамі, кандытарамі, шаўцамі. Беларусы займаліся сельскай гаспадаркай і служылі ў розных установах горада. У вольны час некаторыя гараджане займаліся дастаўкай тавараў на чыгуначныя станцыі і прыстані і адваротна. Перавозку пасажыраў ажыццяўляў Маховер, які трымаў канторы ў Крычаве, Рослаўлі, Чавусах, Магілёве, Прапойску, Доўску і Гомелі. У яго было шмат коней і дыліжансаў. Рэйсы адбываліся штодзённа ў трох напрамках: на Рослаўль, Магілёў і Гомель.

Гараджане выбіралі старасту. Доўгія гады ім быў Анатоль Ялоза. Але ўсім запраўляла гарадская знаць: дваране, духавенства, вышэйшыя чыноўнікі. Яны выбіралі свайго

правадыра, воля якога распаўсюджвалася на ўсе ўстановы горада і павета. Доўгі час на гэтай пасадзе знаходзіўся нехта Кашура-Масальскі. Дваране мелі свой клуб, які размяшчаўся ў двухпавярховым цагляным будынку, ля яго быў гарадскі сад-бульвар. Непадалёку ад яго знаходзілася невялікая азярынка-сажалка. Па выхадных днях ля яе іграў духавы аркестр.

Сярод мясцовага насельніцтва вялікай павагай карысталіся прозвішчы Цілюпа, з сямей якіх выходзілі служачыя пошты, настаўнікі, аграномы; Ананіч — служачыя землеўпарадкавальных камісій; Руткоўскія, Шавялёвы, Круглікавы — служачыя земскай управы, казначэйства, суда і другіх установ горада.

З успамінаў Г. К. Сотнікава

Амаль усё жыццё, за выключэннем службы ў царскай арміі і перыяду грамадзянскай вайны, я пражыў у родным Чэрыкаве. На маіх вачах адбылося многа змен і падзей як у знешнім выглядзе горада, так і ў жыцці чэрыкаўлян. Многае сцёрлася з памяці, але самыя яркія эпізоды запомніліся назаўсёды.

Найбольш памятныя падзеі майго дзяцінства адносяцца да 1905—1906 гг. 10-гадовым хлапчуком я ўпершыню пачуў словы «рэвалюцыя», «камуніст», «крывавая нядзеля» і г. д. У той час наша сям'я жыла ў в. Зоры. Я вучыўся ў мясцовай школе. У вёску прыехаў новы настаўнік, паводзіны якога палічылі нейкімі незвычайнымі. Такая думка склалася не толькі ў нас, вучняў, а і ў дарослых. Асцярожна, але з сапраўдным педагагічным тактам і ўменнем ён растлумачваў нам сэнс адбываўшыхся ў той час у Петраградзе падзей. Настаўнік яўна спачуваў рэвалюцыі. І хоць некаторыя лічылі яго дзіваком, ён змог пасеяць у душах сваіх вучняў зярняты пратэсту супраць існуючага ладу. Прозвішча гэтага настаўніка Кухарэнка Рыгор Маркелавіч. У памяці я пранёс яго праз усё жыццё.

А падзеі ў далёкім Петраградзе закранулі і нашу вёску. Зайздросную папулярнасць сярод яе жыхароў, асабліва моладзі, атрымалі рэвалюцыйныя песні «Марсельеза», «Смело, товарищи, в ногу!».

На маё дзяцячае ўсведамленне падзейнічаў такі выпадак. Па вуліцы праязджалі конныя жандары, усемагчымыя драгуны і ўраднікі, якія вышуквалі спачуваўшых рэвалюцыі. Адзін з іх, здаравенны з чырвоным тварам дзяцюк, у доўгім шынялі, з шабляй на баку нібы ўвасабляў сабой сілу і моц царызму.

На вуліцы гулялі падлеткі. І трэба ж было ў гэты час камусьці з іх крыкнуць слова «Марсельеза». Умомант жандар узняў каня на дыбы, крута развярнуўся і рушыў у натоўп дзяцей. «Дзе Марсерьеза, а ну, да мяне!» — загарлапаніў царскі служака. У адным гэтым слове ён адчуў крамолу, хоць добра і не ведаў яго сэнсу, бо не змог правільна нават вымавіць.

Хлопцы кінуліся наўцёкі, але жандар затрымаў некалькіх. Суд ён ажыццявіў на месцы: да паўсмерці збіў іх плёткай.

У 1909 г. у маім жыцці адбылася знамянальная падзея. Бацька прывёў мяне ў Чэрыкаўскую школу. Апранут я быў па-сялянску: у саматканых штанах і ў новых лапцях. Больш багатыя вучні глядзелі на мяне фанабэрыста. На ўступных экзаменах мне выпала сядзець побач з нейкім Славуціным, сынам мясцовага буйнога лесапрамыслоўца. Я даволі лёгка справіўся з заданнем. А мой сусед ніяк не мог напісаць дыктант. Тады ён дастаў з кішэні пятак і папрасіў мяне дапамагчы. Прапанова была вельмі спакуслівая, і я даў суседу спісаць. Але браць

пятак за паслугу пасаромеўся. Тым больш, што ўсё роўна той нарабіў памылак і не здаў экзамен.

Памятаецца яшчэ адзін эпізод са школьнага жыцця. Гэта было ў 1911 г. Поп Стратановіч выкладаў у нас закон божы. Адзін з вучняў адказваў заданне. Калі ён на момант запнуўся, я нечакана для сябе варухнуў губамі. Гэта заўважыў поп. Ён быў глухаваты і падумаў, што я падказаў. Каршуном накінуўся на мяне і пачаў драць вуха. Кроў залі-ла белую сарочку. Я плакаў ад болю і ад таго, што шкада было новай сарочкі. Выручыла мяне гаспадыня, у якой я жыў на кватэры. Яна дала пераапрануць кашулю сына. Пасля гэтага выпадку спастылеў мне і поп, і закон божы. Па-іншаму сталі адносіцца да папа і другія вучні.

У 1914 г. я паспяхова закончыў вучылішча. На захадзе ішла вайна, старэйшы брат Піліп ваяваў на фронце. Сямейнае становішча было цяжкім. Бацькам нялёгка давалася забеспячэнне маёй вучобы. Наступіла і мая чарга зарабляць грошы. Па рэкамендацыі Івана Шахоўскага, пісьмавода натарыяльнай канторы, я ўладкаваўся туды на работу.

У той час многіх забіралі на вайну, і ўсемагчымыя раздзелы, перадача маёмасці і зямлі родзічам афармляліся ў натарыяльнай канторы.

Добра ўрэзаўся ў памяць выпадак, калі зімой 1915 г. да канторы пад'ехалі двое багатых саней. У кожныя былі запрэжаны па 4 кані. Кучары дапамаглі седакам выйсці, і ў канторы зайшлі пан Восіп Васілеўскі і два яго сыны — Станіслаў і Уладзіслаў. Стары пан распрануўся сам. А яго сыны, прывыкшыя да паслуг лакеяў, стаялі і чакалі. Я, вясковы хлопец, нічога не разумеў і, разгубіўшыся, глядзеў на паноў. Тады натарыус, дарэчы, паляк па нацыянальнасці, сказаў: «Георгій Кузьміч, дапамажы панам распрануцца».

Неяк боязна было падыходзіць да выпешчаных, укормленых паноў. Нарэшце, я зняў з іх кенгуровыя футры і павесіў на вешалку. У гэты дзень быў афармлен раздзельны акт паміж сынамі Васілеўскага, з маёнткамі ў Вепрыне і Лімені.

Апісанне валасцей Чэрыкаўскага павета*

Брацькавіцкая воласць. Населеных месц 60: 20 вёсак, 2 сялы, 3 хутары, 11 пасёлкаў, 11 аколіц, 13 фальваркаў. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Брацькавіцкае, Калодзезскае, Какойскае, Жалязніцкае, Шалухоўскае, Сасновіцкае 1-е, Сасновіцкае 2-е, Дубраўскае, Асоўскае, Лысаўскае, Студзянецкае, Савініцкае, Гразівецкае, Забачанскае, Наркінскае, Галачэўскае, Крываніўскае 1-е, Крываніўскае 2-е, Брацькавіцкае 2-е. Праваслаўныя цэрквы знаходзіліся ў Брацькавічах і Осаве, рымска-каталіцкі касцёл — у Блудзімлі. Вучылішчы Міністэрства народнай асветы і царкоўнапрыходскія (далей у тэксце — вучылішчы): у Брацькавічах, Савінічах, Гарадзешні, Скаліне, Жалязніцы. Школ граматы — дзве. У Брацькавічах знаходзілася лячэбніца. У воласці было тры запасныя хлебныя магазіны, чатыры казённыя вінныя лаўкі — у Брацькавічах, Какойску, Сасновіцы і Савінічах. Млыны былі размешчаны ў Брацькавічах, Шышкоўцы, Савінічах, Дубраўцы, Блудзімлі, Крывой Ніве, ак. Сасновіца і в. Сасновіца. У маёнтку Доўгі Лог знаходзіўся вінакурны завод.

* Складзена С. Кагадзеевай па кн.: «Список населенных мест Могилевской губернии». Могилев, 1910. Пераклад на бел. мову Т. Руткоўскай.

Беліцкая воласць. Населеных месц 63: 2 сялы, 32 вёскі, 16 фальваркаў, 6 маёнткаў, 6 хутароў, аколіца. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Беліцкае, Няжкоўскае, Слабадское, Рабяткаўскае, Асінаўскае, Альхоўскае, Чарнасосенскае, Прыбярэжскае, Лыкінкскае, Верхавецкае, Ратнаўскае, Касцюковіцкае, Вародзькаўскае 1-е, Вародзькаўскае 2-е, Асавецкае, Волкаўскае, Ракіцінскае, Забалоцкае, Баеўскае, Грабалаўскае, Петрынскае, Верамееўскае, Паходавіцкае, Каркаўшчынскае, Ляхаўскае. Праваслаўных цэркваў — 3: у Вярхоўцах, Вародзькаве, Забалоцці, рымска-каталіцкі касцёл у Вародзькаве. Вучылішчы знаходзіліся ў Беліцы, Няжкоўцы, Рабятках, Чорнай Сасне, Вярхоўцах, Вародзькаве, Забалоцці, Баеўцы, Верамейках. З лячэбных устаноў на тэрыторыі воласці быў толькі адзін прыёмны пакой у Беліцы. Працаваў адзін запасны хлебны магазін. Казённыя вінныя лаўкі знаходзіліся ў Беліцы, Вародзькаве, Паходавічах, млыны — у Беліцы, Рабятках, Вародзькаве, Ракіцінцы, Забалоцці, Баеўцы. У Беліцы працаваў дзягцярна-шкіпінарны завод.

Даўговіцкая воласць. Населеных месц 69: 40 вёсак, 4 сялы, 9 фальваркаў, 12 маёнткаў, 2 аколіцы, 2 хутары. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Старынкскае, Грозскае, Пячковіцкае, Есьманаўскае, Навасельскае, Лукініцкае, Кісялёўскае, Успольскае, Ходасаўскае 1-е, Ходасаўскае 2-е, Юшковіцкае, Цярэньскае, Кошскае, Шыркоўскае, Вальшчанскае, Басценавіцкае, Рудодзімскае, Мішнеўскае, Андраноўскае, Тышчанскае, Краткоўскае, Бяскоўскае, Даўговіцкае, Валымірскае, Бязводзіцкае. Праваслаўныя цэрквы і капліцы знаходзіліся ў Ходасаве, Басценавічах, Даўговічах, Валыміры і Бязводзічах. Школ граматы ў воласці было 5. Прыёмны пакой працаваў у Даўговічах. Існаваў адзін запасны хлебны магазін. У Басценавічах знаходзілася казённая вінная лаўка. Млыны працавалі ў Пячковічах, Ходасаве 1-м, Ходасаве 2-м, Юшковічах, Кошы, Рудодзіме, Кротках, Даўговічах, Валыміры.

Даўжанская воласць. Населеных месц 35: 4 сялы, 18 вёсак, 5 фальваркаў, 6 хутароў, маёнтак і паштовая станцыя. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Аляксандраўскае, Бярозаўскае, Гіжнёўскае, Гіжэнскае, Даўжанскае, Язёрскае, Журавельскае, Забалоцкае, Закрупецкае, Заглінскае, Ляцяжскае, Лобчанскае, Мірагашчанскае, Прыпёчынскае, Рагалінскае, Рынкоўскае, Сакалоўскае, Трасліўскае, Целяшоўскае, Усохскае. У Доўгім, Язёрах, Целяшах і Ляцягах знаходзіліся праваслаўныя цэрквы. Працавала 9 вучылішчаў: у Доўгім, Ляцягах, Сакалоўцы, Бярозаўцы, Гіжанцы, Рудні, Язёрах, Целяшах і Гіжні. Школ граматы — 2. У воласці не было лячэбных пунктаў. Працаваў адзін запасны хлебны магазін. Казённыя вінныя лаўкі знаходзіліся ў Доўгім, Гіжні і Бярозаўцы. Млыноў у воласці было 9: у Доўгім, Прыпёчыне, Сакалоўцы, Гіжанцы, Целяшах, Бярозаўцы. Прамысловых прадпрыемстваў — 2: вінакурны завод у Язёрах і кафельны завод у Аляксандраўцы. Па тэрыторыі воласці праходзіла шаша Масква — Варшава.

Дубровіцкая воласць. Населеных месц 61: мястэчка, 21 вёска, сяло, 14 хутароў, 5 маёнткаў, 4 старожкі, заезны дом, манастыр, 3 памесці, 8 дамоў, касцёл, народнае вучылішча. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Дубровіцкае, Барысавіцкае, Бароўскае, Ігнатаўскае, Жаркоўскае, Халмянскае, Чудзянскае, Высакабудскае, Вепрынскае, Яноўскае, Гронаўскае, Красовіцкае. У Дубровіцы і Красовічах

знаходзіліся праваслаўныя цэрквы, у Інвандоры — рымска-каталіцкі касцёл. Вучылішчы працавалі ў Дубровіцы, Барысавічах, Жарках, Халмах, Чудзянах, Высокай Будзе, Вепрыне, Красовічах. Таксама ў воласці знаходзіліся дзве школы граматы, у Дубровіцы — лячэбніца. Запасных хлебных магазінаў было 2. Казённыя вінныя лаўкі працавалі ў Дубровіцы, Вепрыне, Красовічах. Млыны знаходзіліся ў Дубровіцы, Барысавічах, Баровай, Жарках, Чудзянах, Вепрыне, Яноўцы, Красовічах.

Камаровіцкая воласць. Населеных месц 70: 3 сялы, 24 вёскі, 26 хутароў, 8 маёнткаў, 6 фальваркаў, 2 памесці, паштовая станцыя. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Камаровіцкае, Халоблінскае, Бліжнерэчыцкае, Дальнерэчыцкае, Волчаскае, Гойкаўскае, Вудажскае, Вохарскае, Вусцеўскае, Зорскае, Гліньскае, Балванаўскае, Лушчэеўскае, Юркаўскае, Прусінскае, Батвінаўскае, Сечыхскае, Горкаўскае, Губіншчынскае. Праваслаўныя цэрквы знаходзіліся ў Камаровічах, Волчасе і Батвінаўцы, вучылішчы — у Камаровічах, Бліжняй Рэчыцы, Волчасе, Вудазе, Вохары, Вусці, Зорах, Гліні, Лушчэеўцы, Прусіне, Батвінаўцы, Губіншчыне, Дальняй Рэчыцы. Школ граматы ў воласці было 6. Фельчарскі пункт знаходзіўся ў Камаровічах. Працаваў адзін запасны хлебны магазін. Казённыя вінныя лаўкі знаходзіліся ў Камаровічах, Дальняй Рэчыцы і Губіншчыне. Млыны працавалі ў Камаровічах, Вусці, Лушчэеўцы, Юркаўцы і Губіншчыне. З прамысловых прадпрыемстваў у воласці былі вінакурныя заводы ў наступных населеных пунктах: у Міхліне, Вусці, Лушчэеўцы і Халобліне. Праз воласць праходзіла шаша Масква — Варшава.

Краснапольская воласць. Населеных месц 37: 20 вёсак, сяло, 7 фальваркаў, мястэчка, пасёлак, 6 хутароў, заезны дом. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Бярдзіцкае, Гарадзецкае, Князеўскае, Клясінскае, Лютнянскае, Маластоўскае, Пачапоўскае, Раманькоўскае, Сенска-заводскае, Трубільнянскае, Тур'еўскае, Траўнінскае, Хутароўскае, Халмянскае, Ясянкоўскае. Праваслаўныя цэрквы былі ў Краснаполлі і Маластоўцы. У Краснаполлі таксама знаходзілася яўрэйская сінагога і малітоўныя школы. Вучылішчы працавалі ў Маластоўцы, Почапах, Лютні, Тур'і, Вялікіх Хутарах, Краснаполлі. Школ граматы ў воласці было дзве, запасных хлебных магазінаў — таксама два. У Краснаполлі і Почапах працавалі казённыя вінныя лаўкі. Млыны знаходзіліся ў наступных населеных пунктах: у Гарадзецку, Князеўцы, Клясіне, Почапах, Раманьках, Трубільне, Тур'і, Траўне, Вялікіх Хутарах, Халмах, Ясенцы, Маластоўцы і Мар'інскай ферме. У маёнтку Елізавеціна працаваў вінакурны завод.

Крычаўская воласць. Населеных месц 34: мястэчка, сяло, 12 вёсак, выселак, 2 маёнткі, 3 заезных дамы, 4 фальваркі, 9 аколіц, адна шашэйная будка. У воласці было 13 сельскіх таварыстваў: Крычаўскае, Варонеўскае, Галушнёўскае, Бельскае, Свінянскае 1-е, Свінянскае 2-е, Гарбацкае, Камароўскае, Замсовіцкае, Касцюшковіцкае, Хацілавіцкае, Сакольніцкае, Новасакольніцкае. Праваслаўныя цэрквы знаходзіліся ў Крычаве і Залесавічах; рымска-каталіцкі касцёл — у Крычаве, там жа былі яўрэйская сінагога і малітоўныя школы. Вучылішчы працавалі ў Крычаве, Хацілавічах, Залесавічах, Камароўцы, Гарбатцы, Белі, Свіной, Сакольнічах і Макоўі. Акрамя гэтага, у воласці было дзве школы граматы. З лячэбных устаноў у воласці быў толькі прыёмны пакой у Крычаве. Запасных хлебных мага-

зінаў было 3. Казённыя вінныя лаўкі працавалі ў Крычаве і Камароўцы. Млыны былі ў Крычаве, Вароневе, Камароўцы, Макоўі. У Крычаве знаходзіўся мылаварны і 4 гарбарныя заводы. Праз воласць праходзіла Маскоўска-Варшаўская шаша.

Лабанаўская воласць. Населеных месц 28: 15 вёсак, 3 хутары, сяло, 5 маёнткаў, 3 вадзяныя млыны, паштовае аддзяленне. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Тур'еўскае, Ржавецкае, Вербежскае, Шароеўскае, Лабанаўскае, Дашкоўскае, Наркоўскае, Шчацінскае, Дубраўскае, Ялоўскае, Касарскае, Забачэўскае. Была адна праваслаўная царква — у Лабанаўцы. Вучылішчаў працавала 6: у Лабанаўцы, Нарках, Шароеўцы, Любанах, Касарах, Шчацінцы; школ граматы — адна. У Лабанаўцы знаходзіўся прыёмны пакой. Запасных хлебных магазінаў у воласці было два. У Лабанаўцы працавала казённая вінная лаўка. Млыны былі ў Забачаве, Рэкце, Жытневе, Юдаўцы, Тур'і, Нарках, Лабанаўцы, Шароеўцы, Васькоўцы. Фабрык і заводаў у воласці не было.

Маляціцкая воласць. Населеных месц 64: мястэчка, 5 сёл, 30 вёсак, 3 аколіцы, пасёлак, 7 маёнткаў, 10 фальваркаў, хутар, 5 засценкаў, слабада. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Ананіцкае, Антонаўскае, Бельскае 1-е, Бельскае 2-е, Беразуйкаўскае, Беражысцянскае, Валаўніцкае 1-е, Валаўніцкае 2-е, Глупецкае 1-е, Глупецкае 2-е, Дабранскае, Ермакоўскае, Залачэўскае, Кашанскае, Лабковіцкае, Лута-Брадкоўскае, Лапацінскае, Маляціцкае, Мышковіцкае, Паўловіцкае, Палоніцкае, Сарачынскае, Сялецкае, Старасельскае, Целяткоўскае, Шчарбацкае. Праваслаўныя цэрквы і капліцы знаходзіліся ў Маляцічах, Добрым, Паланіцы, Кашанах, Белі 1-й, Ануфрыеве. Яўрэйская сінагога была ў Маляцічах. Вучылішчы працавалі ў Маляцічах, Кашанах, Ануфрыеве, Добрым, Лабковічах, Белі 1-й, Паланіцы, Сяльцы, Глупіках 2-х. Працавала адна школа граматы. У Маляцічах знаходзіўся прыёмны пакой. У воласці было два запасныя хлебныя магазіны. Казённыя вінныя лаўкі знаходзіліся ў Маляцічах, Добрым і Ануфрыеве. Млыны працавалі ў Маляцічах, Залачове, Добрым, Мышковічах, Бальшах, Ануфрыеве, Глупіках, в. Белі, с. Белі.

Мхініцкая воласць. Населеных месц 29: 11 вёсак, 3 сялы, валасная ўправа, 4 фальваркі, 5 маёнткаў, аколіца, 4 хутары. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Мхініцкае, Сабалеўскае, Выдранскае, Горкаўскае, Аўчынскае, Жураўскае, Старабудскае, Буглаеўскае, Арцяхоўскае, Свярбілаўскае, Драгамілаўскае, Мар'інабудскае, Гатавецкае, Дуброўскае. Праваслаўныя цэрквы знаходзіліся ў Мхінічах, Сабалях і Выдранцы. Вучылішчы працавалі ў Мхінічах, Выдранцы, Сабалях, Горках. Школ граматы было тры. У Выдранцы працавала сельская лячэбніца. У воласці быў адзін запасны хлебны магазін. Казённыя вінныя лаўкі знаходзіліся ў Мхінічах, Выдранцы і Горках. Млыны працавалі ў Мхінічах, Гатоўцах, Горках, Свярбілаўцы, Завадзе, Глыбаве, Аўчынцы, Выдранцы. На тэрыторыі воласці знаходзіліся піваварны і вінакурны заводы ў Выдранцы, вінакурны завод у Завадзе.

Наваельнінская воласць. Населеных месц 43: 16 вёсак, 3 сялы, 15 хутароў, 4 маёнткі, 5 фальваркаў. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Наваельнінскае, Асоўскае, Раўнішчанскае, Беразянскае, Кляпінскае, Валынцаўскае, Якушоўскае, Драгоцінскае, Крывеліцкае, Кармянскае, Усцінавіцкае, Казельскабудскае. На тэрыторыі воласці праваслаўныя цэрквы

знаходзіліся ў Новай Ельні, Драгоціне, Кляпіне, вучылішчы — у Новай Ельні, Вялікім Осаве, Кляпіне, Папаратках, Крывеліцку, Казельскай Будзе. Школ граматы было 13. Лячэбная ўстанова ў воласці была адна і знаходзілася ў Новай Ельні. Запасны хлебны магазін быў адзін. Казённыя вінныя лаўкі працавалі ў Новай Ельні і Кляпіне. Млыны знаходзіліся ў Новай Ельні, Кляпіне, Прудку, Якушоўцы, Крывеліцку.

Палужская воласць. Населеных месц 62: 3 сялы, 18 вёсак, 3 маёнткі, 5 фальваркаў, 33 хутары. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Палужскае 1-е, Брылёўскае, Малюшынскае, Грыбоўскае, Гніліцкае, Стайкоўскае, Бірулінскае, Гораўскае, Галузаўскае, Дзярноўскае, Горанскае, Палужскае 2-е, Горнаўскае, Жамеж'еўскае, Гарэзінскае, Зябеньскае, Галаўчынскае, Ляшчэнскае. Праваслаўных цэркваў у волаці — 4: у Палужы, Горах, Гарэзне, Галоўчыцах. Вучылішчы знаходзіліся ў наступных населеных пунктах: у Палужы, Малюшыне, Грыбах, Гніліцы, Бірулях, Горне, Горанцы, Зябіне, Галоўчыцах. У Палужы знаходзіўся санітарна-фельчарскі ўчастак. У воласці быў адзін запасны хлебны магазін. У Палужы і Горне працавалі казённыя вінныя лаўкі. Млыны мелі ўсе сельскія таварыствы, усяго ў воласці іх было 28. У Горанцы быў вінакурны завод, цагельны завод знаходзіўся ў Галузах, у маёнтку Горы — вінакурны і цагельны заводы.

Самацеевіцкая воласць. Населеных месц 37: мястэчка, 2 сялы, 17 вёсак, 4 хутары, 5 маёнткаў, 8 фальваркаў. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Самацеевіцкае, Папаратнянскае, Курбакскае, Відуіцкае, Сініцкае, Яноўскае, Казельскабудскае 1-е, Казельскабудскае 2-е, Казельскае, Рудапольскае, Рвенскае, Кляткоўскае, Клеявіцкае, Прудкоўскае, Кісялёўскае 1-е, Кісялёўскае 2-е, Хоцімскае 1-е, Хоцімскае 2-е, Зелянковіцкае. У Самацеевічах і Сілічах знаходзіліся праваслаўныя цэрквы. Рымска-каталіцкі касцёл — у маёнтку Гайдукоўка. У Самацеевічах — яўрэйская сінагога. Вучылішчы працавалі ў Самацеевічах, Сілічах, Курбаках, Відунцах, Хоцімску, Казельскай Будзе, Кісялёўцы, Клеявічах і Зелянковічах. У Самацеевічах працаваў фельчарскі пункт. У воласці быў адзін запасны хлебны магазін. Казённыя вінныя лаўкі працавалі ў Самацеевічах, Сілічах і Курбаках. Млыны знаходзіліся ў наступных населеных пунктах: у Прудку, Кісялёўцы, Самацеевічах, Зелянковічах, Папаратнай, Курбаках, Відуйцах, с. Сілічы, маёнтку Сілічы, Яноўцы, Казельскай Будзе, Рвенску і Казеллі. З прамысловых прадпрыемстваў на тэрыторыі воласці былі: кардонная фабрыка «Марына» ў Хоцімску і вінакурны завод у маёнтку Гайдукоўка.

Старынская воласць. Населеных месц 24: сяло, 14 вёсак, 5 фальваркаў, 4 хутары. У воласць уваходзілі наступныя сельскія таварыствы: Бакунавіцкае, Дубнаўскае, Стараканменскае, Навакаменскае, Кліноўскае, Крамянскае, Старынскае, Ушакоўскае, Вялікашышкаўскае, Нямілінскае, Хрыстафораўскае, Старынскадваравое. Праваслаўная царква знаходзілася ў Старынках. Вучылішчаў у воласці было 4: у Бакунавічах, Крамянцы, Старынках і Нікольску. Школ граматы — 8. Запасных хлебных магазінаў — 2. У Старынцы была адзіная ў воласці казённая вінная лаўка. Таксама адзіны млын знаходзіўся ва Ушаках.

Студзянецкая воласць. Населеных месц 21: 3 сялы, 11 вёсак, 6 фальваркаў, мястэчка. У воласць уваходзілі наступныя таварыствы: Бароўскае, Беладуброўскае, Вётухнаўскае, Гібальскае, Кубраковіцкае,

Дзеражанскае, Дубецкае, Касцюковіцкае, Красніцкае, Мялокаўскае, Негінскае, Студзянецкае. Праваслаўныя цэрквы знаходзіліся ў Студзянцы, Белай Дуброве, Дзяражне, Касцюковічах. Яўрэйская сінагога знаходзілася ў Студзянцы. Вучылішчы працавалі ў Студзянцы, Белай Дуброве, Бароўцы, Касцюковічах, Дзяражне, Вётухне, Гарбовічах, Негіне. Лячэбная ўстанова была ў Студзянцы. У воласці былі два запасныя хлебныя магазіны і дзве казённыя вінныя лаўкі — у Студзянцы і Дзяражне. Млыны знаходзіліся ў Студзянцы, Белай Дуброве, Дзяражне, Бароўцы, Вётухне.

Мястэчкі Чэрыкаўскага павета

Дмитриевск. Местечко Дмитриевск, более известно под именем Самотеевичи, принадлежит помещику Голынскому. Расположено при ручье Липовце в 60 верстах от Черикова.

Жителей в местечке к 1880 г. считалось 280 душ мужского и 289 женского пола; в том числе православных (местных крестьян) 235 мужч. и 238 женщ. и евреев 45 мужч. и 51 женщ.

Домов деревянных 83 (в том числе принадлежащих христианам 62 и евреям 21); лавок 4 и одна каменная православная церковь.

Здесь помещается волостное правление и мещанский староста.

Одна в году незначительная ярмарка — Ильинская, 20 Июля. Торговля в местечке началась только в 1867 году [1; 140].

Краснополье, или **Маластовка.** Принадлежит действительному статскому советнику фон Бенкендорфу. Расположено в 30 верстах от Черикова, на транспортной дороге из м. Пропойска в Черниговскую губернию, при ручье Туре, отделяющем Краснополье от крестьянского селения, называемого тоже Маластовкою. Краснополье в статистическом описании губернии 1784 г. упоминается в числе местечек [1; 140].

К 1863 г. здесь проживало 2163 человек обоего пола [3; 234].

Жителей к 1880 г. считалось 1198 душ мужского и 1112 женского пола; в том числе православных 105 мужчин и 92 женщины, католиков 6 мужчин и 9 женщин и евреев 1087 мужчин и 1011 женщин.

Домов деревянных 412 (в том числе принадлежащих христианам 94 и евреям 318); лавок 60; одна православная церковь каменная и 5 деревянных еврейских молитвенных школ.

В местечке находятся: камеры мирового судьи 3 участка Чериковского округа, судебного следователя Чериковско-Климовичского участка; квартиры пристава 3 стана, помощника акцизного надзирателя 4 округа, судебного пристава Чериковского округа; волостное правление, народное училище, сельский врач 2 участка Чериковского уезда, сельская лечебница, мещанский староста. Кроме того, здесь открывается ежегодно присутствие по воинской повинности, по 2-му призывному участку Чериковского уезда. Имеется вольная аптека, 3 кожевенных и 9 маслобойных заводов, водяная мельница.

Четыре в году ярмарки: Афанасьевская — 18 Января, Духовская — в день Сошествия Св. Духа, Успенская — 15 Августа и Введенская — 21 Ноября [1; 140—141].

Красовичи. Принадлежит баронессе Фитингоф и ее детям. Расположено при речке Жадунке, в 40 верстах от Черикова.

Совершенно бедное местечко, причисленное по мещанскому к Кричеву; в статистическом описании гу-

бернии 1784 г. упоминается в числе сел [1; 141]. В 1863 г. насчитывало жителей 93 души обоего пола [3; 234].

Кричев. Расположено в 24 в. к востоку от Черикова по Московско-Варшавскому шоссе на границе Климовичского у. Оно лежит на правом берегу р. *Сожа*, при впадении речки *Кричевки* или *Кривиченки* в 111 в. от Могилева. Кричев под именем Кречют упоминается еще в уставной грамоте кн. Ростислава Мстиславича, данной им смоленской епархии в 1157 г. По народному же преданию, Кричев в незапамятные времена носил имя Кривичев и был основан кривичами. До сих пор сохранились следы его укреплений в виде городища на возвышенном берегу Сожа. Природная малая доступность местности для нападений была еще усовершенствована руками человека; была сделана высокая насыпь и проведен ров, сообщавшийся с р. Сож. По всей вероятности, на том месте, где некогда стоял идол Перуна, на крутом берегу Сожа возвышается церковь св. Ильи; здесь существуют подземные ходы: из окраины замка в подземелье проведен был ход в реку со сводом из прочного кирпича, сохранившийся и поныне. В половине XIV в. Кричев был завоеван в. кн. Ольгердом и присоединен к княжеству Мстиславскому. С конца XV в. Кричев переходил под власть то московских, то литовских князей. В 1653 г. городу было даровано магдебургское право. В 1708 г. Карл XII переправлялся здесь через Сож со своей армией. Здесь же стояло лагерем и русское войско с Петром I во главе; место, где был расположен лагерь Петра, известно и ныне под названием «Петрова луга». В половине XVIII в. с 1740 по 1743 г. в Кричеве происходило народное смятение: «мещанин Карпач и воском торговавший купец Вощила, вознамерившись истребить всех евреев, которые их, по причине своих откупов, без малейшего сожаления изнуряли, воздвигнули большую часть крестьян против правителей и евреев...» В конце концов против них предприняты были энергичные действия: Вощила спасся бегством, но Карпач был пойман, обшит в медвежью кожу и затравлен собаками. По присоединении к России Кричевское староство было пожаловано императрицей Екатериной II кн. Потемкину. 19 января 1787 г. она посетила Кричев и здесь ночевала. Церквей православных в местечке 5, римско-католический костел, первоначально основанный еще в 1628 г. королевой Боной, с фундушем в 2 тысячи талеров; на месте старого костела, сгоревшего в 1855 г., построен нанешний. Жителей в Кричеве до 6 тысяч душ, в том числе евреев более 2.100. Местечко торгует хлебом, пенькой, льном и мелочным товаром. В Кричеве два народных училища, волостное правление, становая квартира, мещанская управа и почтово-телеграфное отделение. К северо-западу от Кричева верстах в 25 расположено довольно значительное местечко Малятичи [2; 482—483].

Малятичи. Принадлежит вдове генерал-майора Богушевской, а прежде принадлежало знаменитому пособнику Екатерины II в деле примирения с католиками, митрополиту римско-католическому Сестрженцевичу-Богушу. Сюда он удалился из Могилева в опале от Императора Павла Петровича.

Малятичи расположены при речке Черной Натоне, на купеческой дороге из Черикова в Мстиславль, в 25 верстах от Черикова и в 20 от Мстиславля. В статистическом описании губернии 1784 г. они упоминаются под названием местечка.

Жителей в местечке в 1863 г. было 213 душ обоего пола [3; 234], к

1880 г. население местечка увеличилось, в нем проживало 155 душ мужского и 172 женского пола; в том числе православных 90 мужчин и 98 женщин и евреев 65 мужчин и 74 женщины.

Домов деревянных 62 (в том числе принадлежащих христианам 5 и евреям 57); лавок 10; одна православная церковь каменная (Церковь эта обращает на себя внимание особенностью архитектуры. Она заключается в двух отделениях: холодном и теплом; построена бывшим владельцем местечка Сестрженцевичем по плану римского собора Петра и Павла, уменьшенному в 32 раза, и в 1835 г. из римско-католической обращена в православную) и одна деревянная еврейская молитвенная школа.

Здесь помещаются: волостное правление, сельская лечебница для 7 волостей, народное училище, мещанский староста.

Имеется водяная мельница и суконвальня [1; 144—145].

Студенец. Принадлежит дворянину Терещенко. Расположено при речке Жадунке, в 65 верстах от Черикова.

В статистическом описании губернии 1784 г. Студенец упоминается в числе местечек. В 1863 г. здесь проживало 186 человек [3; 235].

Жителей к 1890 г. считалось 780 душ мужского и 791 женского пола; в том числе православных 682 мужч. и 710 женщ. и евреев 98 мужч. и 81 женщ.

Домов 130 (из них принадлежит христианам 111 и евреям 19); две православные церкви, из коих одна кладбищенская, и одна еврейская молитвенная школа. Все постройки деревянные.

В местечке помещается волостное правление и мещанский староста.

Имеется два маслобойных завода [1; 145].

1. Опыт описания Могилевской губернии/ Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 2. Могилев, 1884.
2. Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. Т. 9. Спб., 1895.
3. Городские поселения Российской империи. Т. 3. Спб., 1863.

С. Аляксеева.

З гісторыі вёсак Чэрыкаўшчыны

У кожнага чалавека ёсць свой родны кут, дзе ён нарадзіўся, дзе прайшло яго дзяцінства, адкуль пачаў свой жыццёвы шлях. Любоў да бацькаўшчыны, да роднай вёскі нясе чалавек праз усё сваё жыццё. Многіх цікавіць гісторыя сваёй маленькай Радзімы, час узнікнення роднай вёскі, пасёлка, горада.

Не шмат звестак захавалі пісьмовыя крыніцы пра вёскі Чэрыкаўшчыны, таму ў нашым артыкуле пойдзе гаворка толькі аб «багатых» у гістарычным плане населеных пунктах, вядомых яшчэ некалькіх стагоддзяў назад. Ёсць у артыкуле і звесткі пра вёскі, якія больш за іншыя пацярпелі ад чарнобыльскай бяды і якія падлягаюць захаванню. Нельга, каб іх назвы з цягам часу былі сцёрты не толькі з геаграфічных карт, але і з чалавечай памяці. Вёскі гэтыя адзначаны зорачкай.

У артыкуле парушаны прынцып храналагічнасці, які ляжыць у аснове ўсёй кнігі. Зроблена гэта для больш поўнага ўспрымання чытачом маленькіх зарысовак пра асобную вёску. Зарысоўкі складаюцца як з гістарычных звестак, так і з сучасных даных, што прыводзяцца па становішчу на 1.01.1986 г. і прадстаўлены С. П. Бараноўскай, супрацоўніцай Інстытута эканомікі АН Рэспублікі Беларусь.

АНЮЦІНА, вёска ў Сормаўскім сельсавеце. У 1862 г. памешчык меў 567 дзес. зямлі, вадзяны млын і карчму. У 1909 г. фальварак (1 двор, 3 жыхары) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета, у 1926 г.— хутары, 19 двароў, 111 жыхароў, у 1940 г.— вёска, 20 двароў, 66 жыхароў. З пачатку жніўня 1941 г. па кастрычнік 1943 г. 62-гадовы вясковец Д. М. Цяпін хаваў Чырвоны Сцяг, якім у 1918 г. ВЦВК узнагародзіў Самара-Ульянаўскую жалезную дывізію. Калі вёска была вызвалена, ён перадаў сцяг савецкаму камандаванню. Цяпін быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і навечна занесены ў спіскі дывізіі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 20 двароў. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе калгаса «Іскра». У ёй 19 двароў, 42 жыхары.

БАКАЎ, вёска ў Язёрскім сельсавеце. У 1909 г. хутар (1 двор, 1 жыхар) у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1931 г. створаны калгас «Авангард», працавалі кузня і ваўначоска. У 1940 г.— 45 двароў, 142 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. Зараз адноўленая вёска ў складзе калгаса «Прагрэс». У ёй 38 двароў, 131 жыхар.

БАКУНАВІЧЫ, вёска ва Ушакоўскім сельсавеце. Вядома ў XVI ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала сенатару князю А. М. Галіцыну (27 двароў, 230 жыхароў). У 1855 г. памешчык меў тут 653,5 дзес. зямлі і вадзяны млын. У 1880 г.— 35 двароў, 267 жыхароў. Акрамя земляробства, частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам. У снежні 1905 г. сяляне спалілі памешчыцкі свіран. Паліцыя сумесна з вайсковым падраздзяленнем задушыла хваляванне, 1 чалавек быў сасланы на катаргу, 25 чалавек секлі розгамі. Вясною 1906 г. жыхары захапілі памешчыцкія лугі, для іх разгону прыцягвалася паліцыя. У 1909 г.— 64 двары, 503 жыхары, у Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 20-я гады адчынена 4-гадовая школа. У 1924 г. арганізавана меліярацыйнае таварыства. У 1926 г.— 114 двароў, 621 жыхар. У 1931 г. створаны калгас «Бальшавік». У 1940 г.— 100 двароў, 380 жыхароў. У лістападзе 1942 г. гітлераўцы спалілі 95 двароў, забілі 32 жыхары. Вызвалена 30.09.1943 г. воінамі 324-й стралковай дывізіі 50-й арміі пры ўдзеле партызан 720-га і 721-га атрадаў. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе калгаса «Маладая гвардыя». У ёй 101 двор, 265 жыхароў. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца малочнатаварная ферма, клуб, бібліятэка, фонд якой налічвае 5664 кнігі, крама.

Вёска — радзіма беларускага пісьменніка І. С. Сіўцова.

За 1,5 км на ўсход ад вёскі размешчана Бакунавіцкае радовішча мелу (прагнозныя запасы 17,4 млн т).

БАРОВАЯ, вёска ў Вепрынскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) уладанне Восіпа Важынскага (31 двор, 150 жыхароў). Заснавана прыгонніцкая мануфактура, якая дала ў 1825 г. 900 аршынаў палатна. У 1848 г.— 46 двароў, у 1889 г. адкрыта земская школа, у 1909 г. вёска (111 двароў, 730 жыхароў) і маёнтак (2 двары, 4 жыхары) у Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Існаваў вінакурны завод (у 1913 г.— 7 рабочых). У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа (у 1925 г.— 47 вучняў). У 1926 г.— 170 двароў, 1023 жыхары. Зараз у складзе саўгаса «Сцяг». У ёй 94 двары, 224 жыхары. У вёсцы знаходзяцца ферма, клуб, бібліятэка, фонд якой налічвае 5129 кніг, крама.

БЛІЖНЯЯ РЭЧЫЦА*, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце. Вядома ў XVIII ст. У 1880 г.— 12 двароў, 21 жыхар. Частка жыхароў займа-

лася кравецкім промыслам. У 1909 г.— вёска (24 двары, 148 жыхароў) і фальварак (1 двор, 3 жыхары) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа. У 1926 г.— 53 двары, 227 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя К. Я. Варашылава. У 1940 г.— 28 двароў, 11 жыхароў, у час вайны гітлераўцы спалілі 21 двор. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе калгаса імя Ільіча. У ёй 33 двары, 67 жыхароў.

ВАСЬКОЎКА, вёска ў Лабанаўскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) уладанне Быкоўскіх (5 двароў, 32 жыхары). У 1880 г.— 9 двароў, 63 жыхары. Частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам. У 1893 г.— вёска (9 двароў, 63 жыхары) і фальварак (60 дзес. раллі, 20 дзес. лугу, 200 дзес. лесу), у 1909 г.— вёска (20 двароў, 135 жыхароў) і 2 хутары (13 двароў, 74 жыхары; 1 двор, 7 жыхароў). У 1926 г.— 46 двароў, 272 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Хваля рэвалюцыі», працавала кузня. У 1940 г.— 49 двароў, 166 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 46 двароў. Пасля вайны вёска аднавілася. Зараз у складзе саўгаса «Лабанаўка». У ёй 37 двароў, 81 жыхар. У вёсцы знаходзіцца ферма.

ВЕПРЫН, вёска, цэнтр Вепрынскага сельсавета (з 20.08.1924) і калгаса «Кастрычнік». У сярэдзіне XVI ст. з'яўлялася вялікакняжацкім уладаннем у Вялікім княстве Літоўскім. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай належала стацкаму саветніку І. В. Галынскаму (49 двароў, 574 жыхары), меўся панскі дом. У 1858 г. памешчык меў тут 218, у 1882 г.— 421 дзес. зямлі. У 1883 г. заснаваны смалакурна-шкіпінарны завод (у 1890 г.— 5 рабочых). У 1880 г.— 141 двор, 810 жыхароў, вадзяны млын. Акрамя земляробства, частка сялян займалася кавальскім і кравецкім промысламі. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка, у 1907 г.— аднакласная царкоўнапрыходская школа. У снежні 1905 г. сяляне разгромілі памешчыцкі маёнтак. У 1909 г.— 202 двары, 1293 жыхары, у Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета, у 1926 г.— сяло (172 двары, 971 жыхар) і былы маёнтак (26 двароў, 117 жыхароў). У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік», а ў 1930 г.— калгас «Экспарт» (пазней — імя І. В. Сталіна). Дзейнічалі нафтавы (заснаваны ў 1927 г., 2 рабочых) і ветраны млыны, кузня, дзіцячы дом. У 1940 г.— 402 двары, 1692 жыхары. У час гітлераўскай акупацыі фашысты спалілі 256 двароў, забілі 6 жыхароў. Вызвалена 30.09.1943 г. воінамі Дальнеўсходняй стралковай дывізіі 50-й арміі. На ўсходзе вёскі ў брацкай магіле пахаваны 68 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць акупантаў. Зараз у вёсцы 386 двароў, 928 жыхароў. На цэнтральнай сядзібе калгаса знаходзяцца 3 фермы, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, піларама, ёсць сярэдняя школа, дзіцячы сад-яслі, Дом культуры, музычная школа, бібліятэка, фонд якой налічвае 11 165 кніг, 2 крамы, ашчадная каса, сталоўка.

Каля вёскі знаходзіцца Вепрынскае радовішча глін (разведаныя запасы 17,1 млн т).

ВЕРАМЕЙКІ, вёска, цэнтр сельсавета (з 20.08.1924) і саўгаса «Ударнік». Вядома ў XVI ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у прыватнай уласнасці ў Быкоўскіх (37 двароў, 260 жыхароў), мелася царква. У 1880 г.— 30 двароў, 183 жыхары. Акрамя земляробства, частка жыхароў займалася бандарным промыслам. У 1893 г.— 30 двароў, 183 жыхары. У 1909 г.— 59 двароў, 325 жыхароў, у Беліцкай воласці

Чэрыкаўскага павета. Існавала царкоўнапрыходская школа. У аднаўленчы перыяд адкрыты 4-гадовая школа, хата-чытальня. У 1926 г.— 71 двор, 343 жыхары. З 1927 г. існуе чыгуначная станцыя Верамейкі. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоная зорка». У 1938 г. пачала дзейнасць Ударная МТС, якая абслугоўвала 5 сельсаветаў (рэарганізавана 31.03.1958). Былі адкрыты аптэка, яслі, працавала калгасная кузня. У 1940 г.— 115 двароў, 415 жыхароў. У жніўні 1941 г. гітлераўцы расстралялі старшыню сельсавета А. І. Фядосенку, сакратара партарганізацыі сельсавета П. П. Карнюшчанку і старшыню калгаса «Чырвоная зорка» І. А. Гузнякова. На брацкай магіле савецкіх актывістаў устаноўлены помнік. У час акупацыі ў вёсцы дзейнічала падпольная патрыятычная група (кіраўнік Я. Кавалёў). У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 96 двароў. Вызвалена 5.10.1943 г. воінамі 385-й Крычаўскай стралковай дывізіі 50-й арміі Бранскага фронту. У брацкай магіле, што каля будынка чыгуначнай станцыі, пахавана 96 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941—1943 гг. Зараз у вёсцы 460 двароў, 1042 жыхары. На цэнтральнай сядзібе калгаса знаходзяцца ферма, лазня, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, піларама. У вёсцы ёсць сярэдняя школа, дзіцячы сад-яслі, Дом культуры, бібліятэка, фонд якой налічвае 14 070 кніг, 3 крамы, музычная школа, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт, ашчадная каса, бальніца, аптэка.

ВЕРБЕЖ, вёска ў Язёрскім сельсавеце. Вядома ў XVII ст. У студзені 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч дараваў М. Кгельдзе, войту Магілёўскаму, сяло Вербеж з млынам (раней належала С. Срадзінскаму, які ўцёк у Літву). Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у валоданні Магілёўскай казённай палаты (49 двароў, 145 жыхароў), потым належала графу Маркаву. У 1880 г.— 62 двары, 261 жыхар. Апрача земляробства, сяляне займаліся калёсным, бандарным і гарбарным промысламі. У 1909 г.— 105 двароў, 667 жыхароў, у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1920-я гады адкрыты хата-чытальня, 4-гадовая школа. У 1926 г.— вёска, 145 двароў, 795 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Будаўнік», працавала кузня. У 1940 г.— 115 двароў, 409 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 40 двароў. Зараз вёска ў складзе саўгаса «Язёрскі». У ёй 98 двароў, 252 жыхары. У вёсцы знаходзяцца малочнатаварная ферма, пачатковая школа, клуб, крама.

Вёска — радзіма Героя Сацыялістычнай Працы шахцёра А. І. Царкова.

ВОХАР, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце. Вядома ў XVII ст. У XIX ст. дзейнічаў Вохарскі мужчынскі праваслаўны манастыр. У 1909 г.— 84 двары, 631 жыхар, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1910 г. адкрыта школа. У аднаўленчы перыяд створана 4-гадовая школа (у 1925 г.— 75 вучняў), працавала хата-чытальня. У 1933 г. створаны калгас «Ленінскі шлях», працавала кузня калгаса. У 1940 г.— 82 двары, 271 жыхар. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 70 двароў. Вызвалена воінамі 238-й стралковай дывізіі 50-й арміі. Зараз у складзе калгаса імя Ільіча. У ёй 104 двары, 230 жыхароў. Ёсць ферма, клуб, крама.

ВУДАГА, вёска ў Верамейскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Іскра». Вядома ў XVI ст. У студзені 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч дараваў М. Кгельдзе, войту Магілёўскаму, вёску, якая раней належала С. Срадзінскаму, што ўцёк у Літву. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай ка-

зённай палаты (54 двары, 380 жыхароў), потым належала жонцы генерал-маёра Максімовічавай. Памешчык меў тут у 1840 г. 1130,5 дзес, зямлі і карчму. У 1880 г.— 52 двары, 305 жыхароў. Апрача земляробства, частка вяскоўцаў займалася кравецкім промыслам. У 1893 г.— вёска і маёнтак (600 дзес. лесу, 200 дзес. раллі, 60 дзес. лугу), у 1909 г.— 71 двор, 579 жыхароў, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Існавала школа граматы. У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа. У 1926 г.— 97 двароў, 679 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас імя М. І. Калініна. У 1940 г.— 48 двароў, 152 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 46 двароў. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у вёсцы 81 двор, 206 жыхароў. Тут знаходзяцца малочнатаварная ферма, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, пачатковая школа, дзіцячы сад-яслі, клуб, бібліятэка, фонд якой налічвае 6811 кніг, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт, крама.

У вёсцы нарадзіўся Герой Савецкага Саюза генерал-лейтэнант авіяцыі Я. М. Нікалаенка.

ВУСЦЕ, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце. Вядома ў XVIII ст. У 1880 г.— 47 двароў, 342 жыхары. Апрача земляробства, частка сялян займалася кравецкім промыслам. У 1892 г.— вёска (47 двароў, 342 жыхары) і фальварак (200 дзес. лесу, 60 дзес. раллі, 80 дзес. лугу). Меліся вадзяны млын і сукнавальня. У 1909 г.— вёска (91 двор, 719 жыхароў) і маёнтак (1 двор, 2 жыхары) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1913 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У студзені 1918 г. у былым маёнтку арганізавана камуна. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа (у 1925 г.— 40 вучняў). З 1928 г. дзейнічала сыраробчая вытворчасць. У 1933 г. арганізаваны калгас «2-я пяцігодка». Працавалі вадзяны млын і кузня. У 1940 г. — 165 двароў, 512 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 140 двароў. У брацкай магіле, што каля вёскі, пахаваны 2 савецкія воіны, якія загінулі ў 1941 г. Зараз вёска ў складзе калгаса імя Ільіча. У ёй 188 двароў, 304 жыхары. У вёсцы знаходзяцца ферма, бібліятэка, фонд якой налічвае 7768 кніг, крама, аддзяленне сувязі.

ГОЙКАЎ*, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты (14 двароў, 97 жыхароў), потым належала маёру Бардукову. У 1909 г.— 32 двары, 243 жыхары, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 45 двароў, 307 жыхароў, дзейнічалі 4-гадовая школа, хата-чытальня, сельскагаспадарчая арцель «Серп і молат». У 1931 г. створаны калгас імя К. Я. Варашылава, працавала кузня. У 1940 г.— 22 двары, 68 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе калгаса «Краіна Саветаў». У ёй 4 двары, 6 жыхароў.

Вёска — радзіма Героя Савецкага Саюза П. І. Кавалёва.

ГАЛОЎЧЫЦЫ, вёска ва Ушакоўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Чырвоны араты». Вядома ў XVI ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала Ануфрыеўскаму базыліянскаму кляштару (13 двароў, 76 жыхароў). У 1909 г.— 23 двары, 197 жыхароў, у Палужскай воласці Чэрыкаўскага павета. У гэтым жа годзе адкрыта школа. У 1926 г.— 41 двор, 297 жыхароў. Працавала 4-гадовая школа (у 1925 г.— 42 вучні). У 1934 г. створаны калгас «Чырвоны араты». З ліпеня 1941 г. да першага кастрычніка 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у вёсцы 71 двор, 187 жыхароў.

ГАРАДЗЕЦ, пасёлак у Верамей-

скім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у валоданні сенатара князя А. М. Галіцына (16 двароў, 174 жыхары). У 1853 г. памешчык меў тут 227 дзес. зямлі і вадзяны млын. У 1909 г.— маёнтак у Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. З 1928 г. дзейнічала радыёўстаноўка. У 1940 г.— 17 двароў, 52 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі пасёлак. Пасля вайны адноўлены. Зараз у складзе саўгаса «Ударнік». У пасёлку 16 двароў, 20 жыхароў.

ГІЖНЯ, вёска ў Лабанаўскім сельсавеце. Вядома ў XVI ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала сенатару князю А. М. Галіцыну (17 двароў, 166 жыхароў). У 1880 г.— 79 двароў, 290 жыхароў. Апрача земляробства, частка сялян займалася калёсным, гарбарным, бандарным і сталярным промысламі. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г.— 118 двароў, 576 жыхароў, у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа. У 1926 г.— вёска, 122 двары, 754 жыхары. У 1931 г. створаны калгас імя К. Маркса. Працавалі вадзяны млын, конная крупарушка, кузня і ваўначоска. У 1940 г.— 75 двароў, 348 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 72 двары. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе саўгаса «Наватар». У вёсцы 53 двары, 120 жыхароў.

ГЛІНЬ, вёска ў Сормаўскім сельсавеце. Вядома ў XVII ст. У студзені 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч дараваў Мікалаю Кгельдзе, войту Магілёўскаму, вёску Глінну, што раней належала Станіславу Срадзінскаму, які ўцёк у Літву. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты (66 двароў, 535 жыхароў), потым належала жонцы генерал-маёра Максімовічава. У 1865 г. памешчык меў тут 815 дзес. зямлі і карчму. У 1880 г.— 75 двароў, 468 жыхароў. Апрача земляробства, сяляне займаліся кравецкім і кавальскім промысламі. У пачатку XX ст. адкрыта школа (у 1907 г.— 57 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі). У 1909 г.— 106 двароў, 860 жыхароў, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд існавала 4-гадовая школа. У 1926 г.—132 двары, 817 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Іскра», працавалі кузня, ваўначоска. У 1940 г.— 86 двароў, 260 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 81 двор. У цэнтры вёскі ў брацкай магіле пахавана 14 савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні раёна ці памерлі ад ран у шпіталі. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе калгаса «Бальшавік». У ёй 122 двары, 276 жыхароў. У вёсцы знаходзяцца малочнатаварная ферма, сярэдняя школа, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, крама, сталоўка.

ГОРКІ, вёска ў Сормаўскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у валоданні Магілёўскай казённай палаты (23 жыхары), потым у прыватным уладанні. Напярэдадні адмены прыгоннага права належала генерал-ад'ютанту графу С. П. Сумарокаву. У 1880 г.— 12 двароў, 63 жыхары. Апрача земляробства, частка сялян займалася калёсным і бандарным промысламі. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г.— вёска (19 двароў, 106 жыхароў) і фальварак (2 двары, 32 жыхары), у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1923 г. арганізавана сельскагаспадарчае таварыства. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа. У 1926 г.— 26 двароў, 167 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Іскра». Зараз у складзе калгаса «Маладая гвардыя». У вёсцы — 54 двары, 135 жыхароў.

Вёска — радзіма беларускага акушэра-гінеколага, доктара медыцынскіх навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь І. М. Старавойтава.

ГРОНАЎ, вёска ў Вепрынскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала стацкаму саветніку І. В. Галынскаму (14 двароў, 106 жыхароў). У 1909г.— 58 двароў, 341 жыхар, у Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Дзейнічала школа граматы. У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа. У 1926 г.— 98 двароў, 481 жыхар. У 1931 г. створаны калгас «3-ці рашаючы». У 1940 г.— 92 двары, 362 жыхары. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 61 двор, загубілі 2 жыхароў. У памяць аб загінуўшых у барацьбе супраць фашызму ў 1977 г. каля будынка Дома культуры ўстаноўлены помнік. Зараз вёска у складзе калгаса «Кастрычнік». У ёй 143 двары, 438 жыхароў. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца лясгас з дрэваапрацоўчай вытворчасцю, пачатковая школа, дзіцячы сад-яслі, фельчарска-акушэрскі пункт, Дом культуры, бібліятэка, фонд якой налічвае 5870 кніг, крама.

Вёска — радзіма Героя Сацыялістычнай Працы шафёра М. І. Суворава.

ДОЎГАЯ, вёска ў Лабанаўскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты (29 двароў, 208 жыхароў), потым у прыватнай уласнасці. Тут знаходзіўся панскі дом, царква. У 1864 г. адчынена школа (у 1889 г.— 41 хлопчык і 4 дзяўчынкі, у 1907 г.— 57 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі), дзейнічала школьная бібліятэка. У 1886 г.— цэнтр воласці, 53 двары, 345 жыхароў. Тут знаходзіліся валасное праўленне, царква, школа, 2 вадзяныя млыны. Апрача земляробства, сяляне займаліся сталярным і бандарным промысламі. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г.— 79 двароў, 582 жыхары, у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа, у 1925 г. адкрыта бібліятэка, у 1926 г.— фельчарска-акушэрскі пункт. У 1926 г.— 96 двароў, 586 жыхароў. У 1930-х гадах арганізаваны калгас «Чырвоная Беларусь», працавалі кузня і ваўначоска. У 1940 г.— 75 двароў, 313 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 73 двары. Зараз у складзе саўгаса «Наватар». У ёй 77 двароў, 188 жыхароў. У вёсцы знаходзяцца ферма і крама.

ДРАГУНСКІЯ ХУТАРЫ, вёска ва Ушакоўскім сельсавеце. У 1926 г.— хутары, 42 двары, 270 жыхароў, дзейнічала школа. У 1931 г. створаны калгас «Камунар». У 1940 г.— 35 двароў, 147 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 2 двары. Зараз у складзе калгаса «Чырвоны араты». У ёй 34 двары, 71 жыхар.

ДУБРАЎКА,* вёска ў Лабанаўскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты (30 двароў, 202 жыхары), потым у прыватным уладанні. У 1880 г.— 27 двароў, 188 жыхароў. Апрача земляробства, частка сялян займалася сталярным промыслам. У 1909 г.— 53 двары, 335 жыхароў, у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 63 двары, 375 жыхароў. Дзейнічала пачатковая школа. У 1940 г.— 58 двароў, 234 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 56 двароў. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе саўгаса «Наватар». У вёсцы 23 двары, 41 жыхар.

ЖУРАВЕЛЬ*, вёска у Сормаўскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у валоданні Магілёўскай казённай пала-

ты (19 двароў, 137 жыхароў), потым у прыватным уладанні. У 1880 г.— 40 двароў, 156 жыхароў. Апрача земляробства, частка сялян займалася сталярным і бандарным промысламі. У 1909 г.— 57 двароў, 426 жыхароў, у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 73 двары, 462 жыхары, дзейнічала 4-гадовая школа. У 1929 г. створаны калгас «Светлы шлях» (у 1929 г.— 18, у 1935 г.— 90 гаспадарак). У 1940 г. калгас меў 150 галоў буйной рагатай жывёлы, 80 коней, 170 авечак. У 1940 г.— 60 двароў, 273 жыхары. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 40 двароў, загубілі 3 жыхароў. У вёсцы пахаваны член Чэрыкаўскага падпольнага райкома КП(б)Б, камандзір групы асобнага Чэрыкаўскага партызанскага атрада В. П. Шчаўлікаў, які загінуў у снежні 1941 г. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе калгаса «Маладая гвардыя». У ёй 62 двары, 120 жыхароў, ёсць ферма, клуб, крама.

ЖЫТНЁЎ, пасёлак у Лабанаўскім сельсавеце. У 1847 г. тут заснавана сукнавальнае прадпрыемства, якое ў 1884 г. выпрацавала 1500 аршын сукна. У 1897 г.— фальварак (300 дзес. раллі, 20 дзес. лугу, 838 дзес. лесу), мелася 2 вадзяныя млыны, сукнавальня і карчма. У 1909 г.— маёнтак (1 двор, 14 жыхароў), у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 4 двары, 16 жыхароў. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўвайшлі ў калгас, працаваў вадзяны млын калгаса «Ударнік». У 1940 г.— 11 двароў, 49 жыхароў. Зараз пасёлак у складзе саўгаса «Лабанаўка». У ім 7 двароў, 15 жыхароў.

ЗАБАЧЭЎ, вёска ў Верамейскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у прыватнай уласнасці, уладанне Быкоўскіх (20 двароў, 139 жыхароў), меўся панскі дом. У 1832 г. заснавана сукнавальня. У 1880-х гадах належала тытулярнаму саветніку М. Смяройскаму, было 19 двароў, 122 жыхары (1880). Апрача земляробства, частка сялян займалася бандарным промыслам. Меўся вадзяны млын, сукнавальня. У 1909 г.— 41 двор, 248 жыхароў. У Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— вёска, 63 двары, 359 жыхароў, дзейнічала 4-гадовая школа. У 1931 г. створаны калгас імя К. Я. Варашылава, працаваў калгасны вадзяны млын. У 1940 г.— 44 двары, 197 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 7 двароў. Зараз вёска ў складзе саўгаса «Ударнік». У ёй 30 двароў, 58 жыхароў.

ЗОРЫ, вёска ў Сормаўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Бальшавік». Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала жонцы стацкага саветніка В. Х. Галынскай (51 двор, 360 жыхароў). У 1909 г.— 123 двары, 964 жыхары, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 198 двароў, 1114 жыхароў, мелася 4-гадовая школа. У 1929 г. створаны калгас «Пераможца» (у 1929 г.— 30, у 1930 г.—240 гаспадарак), працавала кузня. У 1940 г.— 86 двароў, 265 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 12 двароў. На могілках у брацкай магіле пахаваны 4 савецкія воіны, якія загінулі ў ліпені 1941 г. Зараз у вёсцы 157 двароў, 429 жыхароў. Тут знаходзяцца комплекс буйной рагатай жывёлы, малочнатаварная ферма, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, піларама, 8-гадовая школа, дзіцячы сад-яслі. Дом культуры, бібліятэка, фонд якой налічвае 7922 кнігі, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт, фельчарска-акушэрскі пункт, крама.

За 0,2 км на поўдзень і паўднёвы захад размешчана Зорскае радовішча мелу (прагнозныя запасы 10 млн т).

ЗЯБЕНЬ*, вёска ва Ушакоўскім

сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала сенатару князю А. М. Галіцыну (6 двароў, 74 жыхары). У 1828 г.— у фальварку Зябень пачала дзейнічаць прыгонніцкая суконная мануфактура (у 1859 г.— 39 рабочых). У тым жа годзе была заснавана і мануфактура па вырабу ліставога шкла. Памешчык меў у 1870 г. 4114 дзес. зямлі, вадзяны млын, карчму і 2 таўчэі для лазовай кары. У 1874 г. заснаваны 2 прадпрыемствы па вырабу таўчэі, неабходнай для апрацоўкі лазовай кары. Апрача земляробства, частка сялян займалася бандарным промыслам. У 1897 г.— вёска (28 двароў, 202 жыхары) і маёнтак (з 1870 г. уласнасць стараабрадца Лістападава, 79 дзес. раллі, 79 дзес. лугу, 3650 дзес. лесу). Меліся вадзяны млын, карчма. У 1907 г. адкрыта школа, навучалася 37 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі. У 1909 г.— вёска (45 двароў, 326 жыхароў), фальварак (1 двор, 5 жыхароў) і маёнтак (1 двор, 6 жыхароў), у Палужскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд адкрыты 4-гадовая школа (у 1925 г.— 66 вучняў), хата-чытальня. З 20.08.1924 г. да 8.07.1960 г. цэнтр сельсавета Чэрыкаўскага раёна. У 1926 г.— вёска, 60 двароў, 412 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Дабраволец». У 1940 г.— 27 двароў, 85 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 13 двароў, загубілі 5 жыхароў. У вёсцы дзейнічала падпольная антыфашысцкая група (10 чалавек, кіраўнік — настаўніца мясцовай школы В. Я. Цітовіч). У памяць аб ёй у вёсцы, на будынку школы, у 1966 г. устаноўлена мемарыяльная дошка. Зараз у складзе калгаса «Чырвоны араты». У вёсцы 31 двор, 74 жыхары.

КАЛЮЦІН*, вёска ў Вепрынскім сельсавеце. У 1926 г.— хутары (17 двароў, 125 жыхароў). Зараз у складзе саўгаса «Сцяг». У вёсцы 6 двароў, 7 жыхароў.

КАМАРОВІЧЫ, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Краіна Саветаў». Вядома ў XVI ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала жонцы стацкага саветніка В. Х. Галынскай (43 двары, 301 жыхар). Мелася царква. У 1880 г.— 65 двароў, 383 жыхары. Працавала сукнавальня, знаходзілася валасное праўленне, царква, школа, вадзяны млын. Апрача земляробства, частка сялян займалася кравецкім, бандарным і кавальскім промысламі. У 1862 г. адкрыта школа (у 1889 г.— 34, у 1907 — 75 вучняў), дзейнічала бібліятэка. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г.— 88 двароў, 700 жыхароў, цэнтр Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа (у 1925 г.— 58 вучняў). Дзейнічалі пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых, хата-чытальня і бібліятэка. З 1926 г. адкрыты фельчарска-акушэрскі пункт. У 1931 г. створаны калгас «Краіна Саветаў», працавалі кузня, вадзяны млын, на якім у 1938 г. была змацніравана ўстаноўка па выпрацоўцы электраэнергіі для патрэб калгасаў «6-ы з'езд Саветаў» і «Краіна Саветаў». У 1940 г.— 72 двары, 220 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 70 двароў. У цэнтры вёскі ў брацкай магіле пахаваны савецкія воіны, якія загінулі ў 1941—1945 гг. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у вёсцы 121 двор, 312 жыхароў, ёсць дзіцячы сад-яслі, клуб, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт, фельчарска-акушэрскі пункт, крама.

КАМЕНКА*, вёска ў Вепрынскім сельсавеце. У 1909 г.— 26 двароў, 191 жыхар, у Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 41 двор, 205 жыхароў, у 1940 г.— 45 двароў, 291 жыхар. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 42 двары. Зараз вёска ў складзе саўгаса

«Сцяг». У ёй 41 двор, 78 жыхароў.

КАСАР, вёска ў Верамейскім сельсавеце. Вядома ў XVIII ст. У 1880 г.— 28 двароў, 138 жыхароў. Апрача земляробства, частка сялян займалася сталярным промыслам. У 1909 г.— 47 двароў, 290 жыхароў, у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета, адкрыта земская школа. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа (у 1925 г.— 43 вучні). У 1926 г.— вёска (65 двароў, 441 жыхар). У 1930 г. створаны калгас імя І. В. Сталіна, працавала кузня. У 1940 г.— 47 двароў, 312 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 2 двары. Зараз у складзе саўгаса «Ударнік». У вёсцы 14 двароў 22 жыхары.

КЛІНЫ*, вёска ў Вепрынскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала сенатару, князю А. М. Галіцыну (4 двары, 29 жыхароў). Памешчык у 1871 г. меў ва ўрочышчы Кліны і Крамянка 6136 дзес. зямлі і вадзяны млын. У 1909 г.— 13 двароў, 126 жыхароў, у Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 23 двары, 158 жыхароў. Зараз у складзе саўгаса «Сцяг».

КНЯЗЁЎКА*, вёска ва Ушакоўскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала сенатару, князю А. М. Галіцыну (13 двароў, 110 жыхароў). У 1909 г.— 16 двароў, 113 жыхароў, у Палужскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 28 двароў, 176 жыхароў. У 1930 г. сяляне вёсак Князёўка і Піленка арганізавалі калгас «Чырвоны пераможнік». Зараз вёска ў складзе калгаса «Чырвоны араты». У ёй 13 двароў, 19 жыхароў.

ЛАБАНАЎКА, вёска, цэнтр Лабанаўскага сельсавета (з 20.08.1924) і саўгаса «Лабанаўка». У студзені 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч дараваў войту магілёўскаму М. Кгельдзе в. Лабанаўку, што раней належала С. Срадзінскаму, які ўцёк у Літву. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты (81 двор, 658 жыхароў), потым належала графу Маркаву, мелася царква. У 1886 г.— 102 двары, 656 жыхароў, знаходзіліся валасное праўленне, царква. Апрача земляробства, частка сялян займалася бандарным промыслам. У 1862 г. адкрыта школа, у якой у 1889 г. навучалася 44 хлопчыкі і 4 дзяўчынкі, у 1907 г.— 107 хлопчыкаў і 14 дзяўчынак, дзейнічала бібліятэка. У 1892 г. заснаваны 2 стайні, дзе размяшчаліся чыстакроўныя жарабцы, купленыя ў Варонежскай губерні для паляпшэння мясцовых пародаў коней. У 1909 г.— сяло, 183 двары, 1078 жыхароў, цэнтр Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета, працавала паштовае аддзяленне. У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа (у 1925 г.— 117 вучняў). З 1924 г. працавала хата-чытальня. На кірмашы, якія праводзіліся раз у год, 13 ліпеня, прыязджалі сяляне з многіх вёсак Чэрыкаўскага і часткі Чавускага раёнаў, гандлявалі сельскагаспадарчым інвентаром, сельскагаспадарчымі прадуктамі, вырабамі саматужнікаў. У 1926 г.— сяло, 255 двароў, 1321 жыхар. У гэтым жа годзе адкрыты ўрачэбны ўчастак. У 1934 г. пабудавана памяшканне для сямігадовай школы. У 1940 г.— 129 двароў, 779 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 2 двары, загубілі 2 жыхароў. У цэнтры вёскі ў брацкай магіле пахавана 12 савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні раёна ці памерлі ад ран у шпіталі. Зараз у вёсцы 155 двароў, 416 жыхароў. Тут знаходзяцца комплекс буйной рагатай жывёлы, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, піларама, лазня, 8-гадовая школа, дзіцячы сад-яслі. Дом культуры, бібліятэка, фонд якой налічвае 8372

кнігі, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт, ашчадная каса, крама, сталоўка, фельчарска-акушэрскі пункт, аптэка.

Вёска — радзіма Героя Сацыялістычнай Працы, прадзільшчыцы Магілёўскага завода штучнага валакна Е. С. Белавусавай.

ЛОБЧА, вёска ў Лабанаўскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Навагар». У сярэдзіне XVI ст. з'яўлялася вялікакняжацкай уласнасцю. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у валоданні Магілёўскай казённай палаты (39 двароў, 291 чал.), потым у жонкі калежскага саветніка Залатухінай. У 1880 г.— 81 двор, 385 чалавек. Апрача земляробства, частка сялян займалася бандарным промыслам. У 1909 г.— 113 двароў, 816 жыхароў, у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд адчынена 4-гадовая школа, пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1923 г. арганізавана меліярацыйнае таварыства. У 1926 г.— 147 двароў, 789 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны ўсход», працавала кузня. У 1940 г.— 260 двароў, 670 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 114 двароў. На могілках у брацкіх магілах пахаваны 3 савецкія лётчыкі (загінулі ў ліпені 1941) і 12 воінаў, якія загінулі пры вызваленні вёскі ці памерлі ад ран у шпіталях. Зараз у вёсцы 147 двароў, 374 жыхары. Тут знаходзяцца комплекс буйной рагатай жывёлы, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, піларама, фельчарска-акушэрскі пункт, 8-гадовая школа, дзіцячы сад-яслі, клуб, бібліятэка, фонд якой налічвае 8857 кніг, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт, крама.

ЛЫСАЎКА, вёска ва Ушакоўскім сельсавеце. У канцы XVIII ст. у вёсцы разам з фальваркам было 15 жыхароў. У першай палове XIX ст. працаваў завод па вырабу шкла (на 6,5 тыс. р. у год), якое спажывалася як унутры губерні, так і вывозілася ў Крамянчуг. У 1909 г.— 17 двароў, 150 жыхароў, у Брацкавіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 21 двор, 116 жыхароў. У 1934 г. жыхары вёсак Лысаўка, Астравы, Сененка, Гутка арганізавалі калгас «7-ы з'езд Саветаў». У час Вялікай Айчыннай вайны з канца 1941 г. у вёсцы дзейнічала падпольная група. Зараз вёска ў складзе калгаса «Чырвоны араты».

ЛЮТРАЎКА, вёска ў Сормаўскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты (4 двары, 27 жыхароў), потым у прыватнай уласнасці. У 1909 г.— 6 двароў, 44 жыхары, у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 17 двароў, 112 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Культура», працавала кузня. У 1940 г.— 24 двары, 97 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 12 двароў. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Чэрыкаў». У вёсцы 9 двароў, 14 жыхароў.

МАЛІНАЎКА*, вёска ў Вепрынскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Сцяг». Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты, у 1790 г. аддадзена ў прыватную маёмасць капітан-лейтэнанту рускага флоту (3 двары, 36 жыхароў). У 1841 г. заснавана шкляная мануфактура, дзе ў год выраблялася 750 скрынак ліставога шкла (у 1859 г. працавала 40 масцеравых, дзейнічалі 3 печы). Прадукцыя накіроўвалася галоўным чынам у Кіеў. У 1909 г.— 3 двары, 15 жыхароў, у Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1920-я гады адкрыта 4-гадовая школа. У 1926 г.— 4 двары, 31 жыхар. З 1927 г. цэнтр Халмянскага сельсавета. У 1930 г. створаны калгас «Камінтэрн». Зараз у вёсцы 148 двароў, 364 жыхары.

Тут знаходзяцца комплекс буйной рагатай жывёлы, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, лазня, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фонд якой налічвае 9078 кніг, крама, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт, ашчадная каса, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад-яслі.

МІРАГОШЧ, вёска ў Сормаўскім сельсавеце. Вядома з XVII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты (27 двароў, 193 жыхары), потым у прыватным уладанні. Напярэдадні адмены прыгоннага права належала генерал-ад'ютанту графу С. П. Сумарокаву. У 1880 г.— 53 двары, 253 жыхары. Апрача земляробства, сяляне займаліся бандарным промыслам. У 1909 г.— 81 двор, 534 жыхары, у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд пачала работу 4-гадовая школа (у 1925 г.— 53 вучні). Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. З 20.08.1924 г. да 8.07.1960 г. цэнтр сельсавета. У 1926 г.— 116 двароў, 685 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Сцяг працы», працавала калгасная кузня. У 1940 г.— 135 двароў, 567 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 119 двароў. Вызвалена 30.09.1943 г. воінамі 1320-га палка 431-й стралковай дывізіі (камандзір І. Ф. Мілёхін) 50-й арміі. На могілках у брацкай магіле пахавана 12 савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні раёна ці памерлі ад ран у шпіталі. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Чэрыкаў». У вёсцы 85 двароў, 195 жыхароў. Тут знаходзяцца 8-гадовая школа, клуб, бібліятэка, фонд якой налічвае 9716 кніг, крама, аддзяленне сувязі.

МІХАЛІН, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце. У 1840 г. тут заснавана скураная прыгонніцкая мануфактура, дзе ў 1859 г. працавала 36 рабочых. Памешчык меў у вёсках Міхалін і Халоблін 5513,5 дзес. зямлі, вадзяны млын, сукнавальню, карчму і вінакурны завод. У 1876 г. другі памешчык меў у вёсках Міхалін і Нізкі 2000 дзес. зямлі. У 1898 г. створана вінакурнае прадпрыемства, дзе ў 1900 г. пачала працаваць паравая машына. У 1909 г.— 7 жыхароў, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У лістападзе 1918 г. у фальварку створана камуна. У 1926 г.— 12 двароў, 65 жыхароў. У 1930-я гады створаны калгас «Чырвоная зорка». У 1940 г.— 33 двары, 98 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе калгаса імя Ільіча. У ёй 32 двары, 85 жыхароў.

НАРКІ, вёска ў Верамейскім сельсавеце. Вядома ў XVI ст. У 1604 г. польскі кароль Сігізмунд III дараваў вёску выхадцам з Маскоўскай дзяржавы Хрыпуновым. У студзені 1655 г., калі Магілёўшчына была захоплена рускімі войскамі, цар Аляксей Міхайлавіч аддаў Наркі М. Кгельдзе, войту магілёўскаму. Да гэтага вёска належала С. Радзінскаму, які ўцёк у Літву. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала Магілёўскай дварцовай воласці (257 жыхароў), потым стацкаму саветніку Дамакруеву. У 1880 г.— 113 двароў, 716 жыхароў. Апрача земляробства, частка сялян займалася бандарным промыслам. З 1888 г. да 1911 г.— каля 60 сямействаў выехала ў пошуках лепшай долі з Наркоў у Сібір. У 1909 г.— вёска (186 двароў, 1154 жыхары) у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Дзейнічаў вадзяны млын, школа граматы. У 1922 г. створана сельскагаспадарчае кааператыўнае і закупачна-збытавое таварыства. У аднаўленчы перыяд працавалі 4-гадовая школа, хата-чытальня і бібліятэка. У 1926 г.— вёска (211 двароў, 1345

жыхароў). У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны сормавец», куды ўвайшлі асобныя гаспадаркі з пасёлкаў Карма, Чырвоны і інш., але неўзабаве калгас развалiўся. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны сцяг». У 1933 г. у вёсцы паявіўся першы трактар, быў паказаны першы кінафільм. У 1936 г. праводзіліся работы па паляпшэнню грунтавога шляху Верамейкі — Чэрыкаў праз Наркі. У 1940 г.— 112 двароў, 574 жыхары. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 74 двары. Зараз вёска ў складзе саўгаса «Ударнік». У ёй 118 двароў, 247 жыхароў, ёсць ферма, пачатковая школа, клуб, дзіцячы сад-яслі, крама.

НОВА-МАЛІНАЎКА*, вёска ў Вепрынскім сельсавеце. У 1909 г.— 18 двароў, 142 жыхары, у Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета, у 1926 г.— вёска (29 двароў, 175 жыхароў). Зараз у складзе саўгаса «Сцяг». У вёсцы 30 двароў, 73 жыхары.

ПАБЕДА*, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце. У 1926 г.— 60 жыхароў. У 1940 г.— 24 двары, 72 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 22 двары. Зараз у складзе калгаса «Краіна Саветаў». У вёсцы 16 двароў, 35 жыхароў.

ПІЛЕНКА*, вёска ва Ушакоўскім сельсавеце. У 1909 г.— 9 двароў, 90 жыхароў, у Палужскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 18 двароў, 115 жыхароў. У 1930 г. жыхары вёсак Піленка і Князёўка арганізавалі калгас «Чырвоны пераможнік», дзейнічалі ветраны млын, кузня, 2 ваўначоскі. Зараз у складзе калгаса «Чырвоны араты». У вёсцы 11 двароў, 29 жыхароў.

ПІЛЬНЯ, вёска ва Ушакоўскім сельсавеце. З пачатку XIX ст. дзейнічала медналіцейная прыгонніцкая мануфактура (у 1812 г. працаваў 31 рабочы). З 1882 г. працавала кардонна-папяровая фабрыка (у 1890 г.— 6 рабочых). У 1909 г.— вёска (42 двары, 312 жыхароў) і фальварак (1 двор, 24 жыхары) у Краснапольскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд існавала 4-гадовая школа. У 1926 г.— 60 двароў, 331 жыхар, у 1940 г.— 60 двароў, 300 жыхароў. У час гітлераўскай акупацыі дзейнічала падпольная маладзёжная камсамольская група. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 58 двароў, загубілі 4 жыхароў. Вызвалена 30.07.1943 г. воінамі 324-га стралковага палка 413-й дывізіі 50-й арміі пры ўдзеле партызан 720-га і 721-га атрадаў. На могілках у брацкай магіле пахаваны савецкія воіны, якія загінулі ў ліпені 1941 г. Зараз у складзе калгаса «Маладая гвардыя». У вёсцы 39 двароў, 83 жыхары.

ПРЫПЁЧЫНА, вёска ў Язёрскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) была ў ведамстве Магілёўскай казённай палаты (25 двароў, 176 жыхароў), потым у прыватным уладанні. У 1880 г.— 41 двор, 225 жыхароў. Апрача земляробства, вяскоўцы займаліся калёсным, сталярным і бандарным промысламі. Існавала сукнавальня (заснавана ў 1824 г.), што давала 1000 аркушаў сукна ў год. Меўся вадзяны млын. 27.12.1905 г. сяляне разгромілі дом князя Абаленскага, а пры арышце зачыншчыкаў аказалі супраціўленне паліцыі. У 1909 г.— 68 двароў, 443 жыхары, у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа. У 1926 г.— 87 двароў, 556 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Праўда». Працавалі крупарушка, вадзяны млын, кузня. У 1940 г.— 85 двароў, 337 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. На могілках у брацкай магіле пахавана 65 воінаў і партызан. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе калгаса «Прагрэс». У вёсцы 73 двары, 161 жыхар. Ёсць крама.

РАГАЛІНА, вёска ў Язёрскім сельсавеце. Пасля першага падзелу

Рэчы Паспалітай (1772) у валоданні Магілёўскай казённай палаты (33 двары, 230 жыхароў), потым ва ўласным уладанні. У 1880 г.— 65 двароў, 305 жыхароў. Апрача земляробства, частка сялян займалася бандарным промыслам. У 1898 г. адкрыта школа. У 1909 г.— 105 двароў, 719 жыхароў, у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа (у 1925 г.— 68 вучняў). У 1926 г.— 135 двароў, 792 жыхары. У 1928 г. створаны калгас, дзейнічалі калгасныя кузня і ваўначоска. У 1940 г.— 150 двароў, 465 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі вёску, загубілі 26 жыхароў. Вызвалена 1.10.1943 г. часцямі 50-й арміі. У памяць аб земляках, якія загінулі ў барацьбе супраць фашызму, каля будынка школы ўстаноўлены абеліск. Зараз вёска ў складзе калгаса «Прагрэс». У ёй 83 двары, 238 жыхароў, ёсць ферма, пачатковая школа, бібліятэка, фонд якой налічвае 7747 кніг, крама.

РЖАВЕЦ, вёска ў Язёрскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай была ў ведамстве Магілёўскай казённай палаты (33 двары, 234 жыхары, потым належала жонцы калежскага саветніка Залатухінай. У 1880 г.— 49 двароў, 339 жыхароў. Апрача земляробства, частка сялян займалася калёсным промыслам. У 1909 г.— 90 двароў, 616 жыхароў, у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Мелася школа граматы. У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа. У 1926 г.— вёска (85 двароў, 489 жыхароў), у 1940 г.— 94 двары, 334 жыхары. Зараз у складзе саўгаса «Язёрскі». У вёсцы 82 двары, 189 жыхароў. Тут знаходзяцца малочнатаварная ферма, крама.

РЫНКОЎКА, вёска ў Лабанаўскім сельсавеце. Вядома ў XVII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у прыватнай уласнасці (128 жыхароў). У 1880 г.— 33 двары, 218 жыхароў. Апрача земляробства, частка жыхароў займалася калёсным, сталярным і бандарным промысламі. У 1909 г.— 52 двары, 416 жыхароў, у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. Існавала школа граматы. У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа. У 1926 г.— вёска (71 двор, 505 жыхароў). З 20.08.1924 г. да 16.07.1954 г.— цэнтр сельсавета. У 1940 г.— 43 двары, 129 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 40 двароў. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе саўгаса «Наватар». У ёй 33 двары, 65 жыхароў. Тут знаходзіцца малочнатаварная ферма.

Вёска — радзіма Героя Савецкага Саюза У. Р. Яўсеенкі.

РЭЧЫЦА, вёска, цэнтр Рэчыцкага сельсавета (з 20.08.1924) і калгаса імя Ільіча. Вядома ў XVIII ст. Пасля пракладкі ў 1851 г. Маскоўска-Варшаўскай шашы тут размяшчалася паштовая станцыя, якая мела 11 коней. У 1880 г. памешчык тут меў 89 дзес. зямлі. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка, у 1911 г.— паштовае аддзяленне. У пачатку XX ст.— у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У лістападзе 1918 г. створана камуна, у 1924 г. адкрыта 4-гадовая школа (у 1925 г.— 50 вучняў). У 1940 г.— 81 двор, 250 чалавек. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 71 двор. У цэнтры вёскі ў брацкай магіле пахавана 26 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні раёна ці памёрлі ад ран у шпіталі. Вызвалена 29.09.1943 г. воінамі 238-й стралковай дывізіі 50-й арміі. У памяць аб земляках, якія загінулі ў барацьбе супраць фашызму, у цэнтры вёскі ўстаноўлена стэла. Зараз у вёсцы 170 двароў, 484 жыхары. Тут знаходзяцца 2 фермы, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, піларама, млын, сярэдняя школа, дзіцячы сад-яслі, бібліятэка,

фонд якой налічвае 11 462 кнігі, лазня, 2 крамы, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, фельчарска-акушэрскі пункт.

За 1,4 км на паўднёвы захад ад вёскі знаходзіцца Рэчыцкае радовішча мелу (перспектыўныя запасы 19,2 млн т). Паміж вёскамі Рэчыца і Міхалін размешчана Сожскае радовішча мелу (разведаныя запасы 108,9 млн т).

САКАЛОЎКА, вёска ў Язёрскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Прагрэс». Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у валоданні Магілёўскай казённай палаты (23 двары, 167 жыхароў), потым у прыватнай уласнасці. Пасля пракладкі ў 1851 г. Маскоўска-Варшаўскай шашы тут размяшчалася паштовая станцыя, якая мела 9 коней. У 1880 г.— 47 двароў, 260 жыхароў. Апрача земляробства, частка сялян займалася калёсным, сталярным і бандарным промыслам. У 1909 г.— 75 двароў, 531 жыхар, у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. Існавала школа граматы. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа. У 1926 г.— вёска (95 двароў, 636 жыхароў). У 1931 г. створаны калгас «Іскра», працавала калгасная кузня. У 1940 г.— 95 двароў, 380 жыхароў, дзейнічаў клуб. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны вёска адноўлена. У памяць аб земляках, якія загінулі ў барацьбе супраць фашызму, у цэнтры вёскі ўстаноўлена стэла. Зараз у вёсцы 113 двароў, 368 жыхароў. Тут знаходзяцца ферма, піларама, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, сярэдняя школа, дзіцячы сад-яслі, клуб, бібліятэка, фонд якой налічвае 7161 кнігу, крама, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт, ашчадная каса, фельчарска-акушэрскі пункт.

Вёска — радзіма Героя Савецкага Саюза П. В. Дземянкова.

СТАРАЯ БЕЛІЦА, вёска ў Вераемейскім сельсавеце. Вядома ў XVIII ст. У 1880 г.— 44 двары, 278 жыхароў. Апрача земляробства, частка сялян займалася бандарным промыслам. У 1909 г.— вёска (67 двароў, 422 жыхары) і маёнтак (1 двор, 14 жыхароў), цэнтр воласці Чэрыкаўскага павета. У 1929 г. створаны калгас «12-годдзе Кастрычніка». У сярэдзіне 1930-х гадоў да яго далучыўся калгас «16-годдзе Кастрычніка», што існаваў у в. Новая Беліца. Працавала калгасная кузня. У 1940 г.— 75 двароў, 341 жыхар. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 59 двароў, загубілі 6 жыхароў. Зараз у складзе саўгаса «Ударнік». У вёсцы 27 двароў, 52 жыхары, ёсць ферма.

СЦЯПАНАЎ*, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце. У 1926 г.— 25 двароў, 143 жыхары. У 1933 г. жыхары вёсак Сцяпанава і Белая Дубрава арганізавалі калгас «Праца Леніна». У 1940 г.— 39 двароў, 93 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 35 двароў. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе калгаса імя Ільіча. У вёсцы 42 двары, 76 жыхароў.

ТАРЖОЎ*, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце. У 1926 г.— 24 двары, 135 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «На варце». У 1940 г.— 28 двароў, 84 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны адноўлена. Зараз у складзе калгаса імя Ільіча. У вёсцы 6 двароў, 12 жыхароў.

ТУР'Е, вёска ў Сормаўскім сельсавеце. У снежні 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч дараваў М. Кгельдзе, войту магілёўскаму, вёску Туры, якая раней належала С. Радзінскаму, што ўцёк у Літву. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала Магілёўскай дварцовай воласці, потым сапраўднаму стацкаму саветніку А. В. Макавецкаму. У 1862 г. пачала працаваць вінакурня (10 рабочых). Памешчык меў

тут у 1863 г. 966 дзес. зямлі і карчму. У 1910 г. адкрыта школа. У лістападзе 1918 г. створана камуна. У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа (у 1925 г.— 70 вучняў), хата-чытальня. У 1926 г.— 117 двароў, 634 жыхары. У 1931 г. створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік». У 1940 г.— 120 двароў, 428 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 87 двароў, загубілі 7 жыхароў. У брацкай магіле пахаваны савецкія воіны, якія загінулі ў 1941—1943 гг. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Чэрыкаў». У вёсцы 82 двары, 221 жыхар. Тут знаходзяцца пачатковая школа, клуб, крама.

УШАКІ, вёска, цэнтр Ушакоўскага сельсавета (з 20.08.1924) і калгаса «Маладая гвардыя». Вядома ў XVII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) належала стацкаму саветніку І. В. Галынскаму (13 двароў, 97 жыхароў). У 1865 г. памешчык меў тут 2572 дзес. зямлі. У 1880 г.— 50 двароў, 288 жыхароў. Апрача земляробства, частка вяскоўцаў займалася кравецкім промыслам. Мелася 2 карчмы, прыстань на р. Сож для пагрузкі лесу. У 1884 г. адкрыта школа граматы, якая ў 1917 г. ператворана ў земскую. У 1909 г.— 72 двары, 588 жыхароў, у Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд працавалі 4-гадовая школа (у 1925 г.— 56 вучняў), хата-чытальня, пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г.— 114 двароў, 681 жыхар. У 1929 г. арганізавана камуна, у 1931 г. калгас «Чырвоны штурмавік». Дзейнічалі вадзяны млын, кузня, суконнавальня. У 1940г.— 95 двароў, 480 жыхароў. У чэрвені 1943 г. гітлераўцы спалілі 90 двароў, загубілі 5 жыхароў. У памяць аб загінуўшых земляках пастаўлена стэла. У брацкай магіле, што ў вёсцы, пахавана 12 савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941—1945 гг. Зараз у вёсцы 132 двары, 340 жыхароў. Тут знаходзяцца малочнатаварная ферма, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, піларама, сярэдняя школа, дзіцячы сад-ясліі, клуб, бібліятэка, фонд якой налічвае 11 377 кніг, крама, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, комплексны прыёмны пункт, лазня, фельчарска-акушэрскі пункт.

Вёска — радзіма беларускага савецкага крытыка і літаратуразнаўцы Алеся Яскевіча.

ХАЛМЕНКА*, вёска ва Ушакоўскім сельсавеце. У 1926 г.— 18 двароў, 111 жыхароў. Дзейнічала 4-гадовая школа. У 1933 г. жыхары вёсак Халменка і Міхайлаўка арганізавалі калгас «Перамога». Зараз у складзе калгаса «Чырвоны араты». У вёсцы 22 двары, 50 жыхароў.

ХАЛОБЛІН, вёска ў Рэчыцкім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) секвестравана ў графа Мнішка, належала жонцы стацкага саветніка В. Х. Галынскай. Тут знаходзіўся панскі дом, 35 двароў, 246 жыхароў. У 1855 г. памешчык меў у вёсках Халоблін і Міхалін 1513,5 дзес. зямлі, вадзяны млын, сукнавальню, карчму і вінакурны завод. У 1862 г. заснавана вінакурня (у 1879 г.— 11 рабочых, у 1895 г. устаноўлена паравая машына). У 1880 г.— 36 двароў, 278 жыхароў. Апрача земляробства, частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам. У час першай рускай рэвалюцыі, у снежні 1905 г., сяляне самачынна правялі высечку памешчыцкага лесу. У 1909 г.— вёска (60 двароў, 447 жыхароў) і маёнтак (1 двор, 4 жыхары) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У маёнтку ў 1923 г. было створана таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, адкрыта школа (у 1925 г.— 98 вучняў). У 1926 г.— 51 двор, 368 жыхароў. У 1940 г.— 89 двароў, 267 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 7 двароў. Зараз у складзе

калгаса «Краіна Саветаў». У вёсцы 99 двароў, 226 жыхароў. Тут размешчаны малочнатаварная ферма, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фонд якой налічвае 8281 кнігу, фельчарска-акушэрскі пункт, крама.

ЧУДЗЯНЫ*, вёска ў Вепрынскім сельсавеце. Вядома ў XVI ст. У XVII ст. цэнтр Чудзянскага староства, пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) знаходзілася ў прыватнай арэндзе. У 1880 г.— 54 двары, 375 жыхароў. Апрача земляробства, частка вяскоўцаў займалася кавальскім промыслам. У 1900 г. адкрыта школа, дзе ў 1907 г. навучаліся 62 хлопчыкі і 2 дзяўчынкі. У 1909 г.— 92 двары, 548 жыхароў, у Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд адкрыта 4-гадовая школа (у 1925 г.— 72 вучні). У 1926 г.— 61 двор, 625 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «13-годдзе Кастрычніка», працавалі кузня, ветраны млын. Зараз у складзе саўгаса «Сцяг». У 1976 г. да вёскі далучана в. Чудзянская Слабада. Зараз вёска ў складзе саўгаса «Сцяг». У ёй 137 двароў, 323 жыхары. Ёсць ферма, бібліятэка, фонд якой налічвае 5533 кнігі, крама.

ШАРОЕЎКА, вёска ў Сормаўскім сельсавеце. У студзені 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч дараваў М. Кгельдзе, войту магілёўскаму, вёску Шароеўку, якая раней належала С. Срадзінскаму, што ўцёк у Літву. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у валоданні Магілёўскай казённай палаты (42 двары, 321 жыхар). У 1880г.— 56 двароў, 344 жыхары. Апрача земляробства, частка вяскоўцаў займалася калёсным і бандарным промысламі. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г.— 100 двароў, 595 жыхароў, у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа. У 1926 г.— 122 двары, 689 жыхароў. З 20.08.1924 г. да 8.07.1960 г.— цэнтр сельсавета. У 1931 г. арганізаваны калгас імя І. В. Сталіна, працаваў ветраны млын. У 1940 г.— 95 двароў, 287 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны вёска адноўлена. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Чэрыкаў». У вёсцы 84 двары, 184 жыхары. Тут знаходзяцца ферма, 8-гадовая школа, бібліятэка, фонд якой налічвае 7035 кніг, крама, аддзяленне сувязі.

ШЧАЦІНКА, вёска ў Лабанаўскім сельсавеце. У студзені 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч дараваў М. Кгельдзе, войту магілёўскаму, вёску, якая раней належала пану С. Срадзінскаму, што ўцёк у Літву. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты (39 двароў, 276 жыхароў), потым належала графу Маркаву. У 1880 г.— 42 двары, 269 жыхароў. Акрамя земляробства, частка вяскоўцаў займалася калёсным промыслам. У 1910 г. адкрыта земская школа. У 1909 г.— 82 двары, 560 жыхароў, у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа (у 1925 г.— 57 вучняў). У 1926 г.— вёска (116 двароў, 654 жыхары). У 1928 г. створаны калгас «Іскра», які ў 1936 г. меў 52 каровы, больш за 100 свіней, 94 кані, 193 калоды пчол. Працавалі вадзяны млын, 2 кузні. У 1940 г.— 43 двары, 258 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 27 двароў, загубілі 9 жыхароў. Зараз у складзе саўгаса «Лабанаўка». У вёсцы 31 двор, 81 жыхар, ёсць клуб.

ЮДАЎКА, вёска ў Верамейскім сельсавеце. У 1862 г. памешчык меў тут 1574 дзес. зямлі, вадзяны млын і карчму. У 1909 г.— 2 двары, 23 жыхары, у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г.— 4 двары, 14 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Запаветы Леніна». Зараз у складзе саўгаса «Ударнік». У вёс-

цы 18 двароў, 41 жыхар, ёсць крама.

ЯЗЁРЫ, вёска, цэнтр Язёрскага сельсавета. Вядома ў XVI ст. У XVIII ст. цэнтр Язёрскага староства. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у ведамстве Магілёўскай казённай палаты (63 двары, 445 жыхароў), потым у прыватным уладанні. Меліся панскі дом і царква. У 1848 г.— 97 двароў. У 1857 г. заснаваны вінакурны завод (у 1913 г.— 12 рабочых, меўся паравы рухавік). У 1880 г.— 108 двароў, 578 жыхароў, дзейнічалі вадзяны млын, царква. Апрача земляробства, частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам. У 1909 г.— 173 двары, 1259 жыхароў, у Даўжанскай волаці Чэрыкаўскага павета. Існавала царкоўнапрыходская школа. У аднаўленчы перыяд працавала 4-гадовая школа, якой было перададзена памяшканне былога маёнтка. Працавала кузня. У 1931 г. арганізаваны калгас «Будаўнік». У 1926 г.— 271 двор, 1544 жыхары. У 1940 г.— 130 двароў, 397 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 117 двароў, загубілі 7 жыхароў. На могілках у брацкай магіле пахаваны 2 савецкія воіны і 1 партызан. Зараз у вёсцы 216 двароў, 597 жыхароў. Тут знаходзяцца комплекс буйной рагатай жывёлы, майстэрня па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, піларама, сярэдняя школа, Дом культуры, дзіцячы сад-яслі, бібліятэка, фонд якой налічвае 9988 кніг, крама, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт, ашчадная каса, сталоўка, фельчарска-акушэрскі пункт.

ЯЛОЎКА, вёска ў Лабанаўскім сельсавеце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) уласнае ўладанне Быкоўскіх (10 двароў, 105 жыхароў). У 1880 г.— 22 двары, 134 жыхары. Апрача земляробства, частка вяскоўцаў займалася сталярным промыслам. У 1909 г.— 43 двары, 282 жыхары, у Лабанаўскай волаці Чэрыкаўскага павета. У 1915 г. адкрыта земская школа. У аднаўленчы перыяд дзейнічалі 4-гадовая школа (у 1925 г.— 39 вучняў), хатачытальня, кузня. У 1926 г.— 55 двароў, 309 жыхароў, у 1940 г.— 54 двары, 183 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 51 двор, загубілі 2 жыхароў. Зараз у складзе саўгаса «Лабанаўка». У вёсцы 45 двароў, 93 жыхары. Ёсць ферма, крама.

Административно-территориальное устройство БССР. Мн., 1985. Т. 1.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Спб., 1889. Т. 14.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн. 1961. Т. III.

БелСЭ. Мн., 1975. Т. 8.

Тамсама. Мн., 1975. Т. 12.

Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861). Мн., 1966.

Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии (1860—1900). Мн., 1978.

Военно-статистическое обозрение Российской империи. Спб., 1848. Т. 8. Ч. 3. Отд. II.

Волости и важнейшие селения Европейской России. Спб., 1886. Вып. V.

Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков. Мн., 1984.

Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1972. Т. 2.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1940. Т. II.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Мн., 1953. Т. III.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986.

Календарь-справочник Могилевского земства за 1917 г. Могилев, 1916.

Нацистская политика геноцида и «выжженной земли» в Белоруссии, 1941—1944. Мн., 1984.

Опыт описания Могилевской губернии/Под ред. А. С. Дембовецкого. В 3-х кн. Могилев, 1882—1884.

Отчет, составленный канцелярией Могилевского губернатора по устройству в Чериковском, Климовичском и Мстиславльском уездах заводских конюшен для улучшения местной породы крестьянских лошадей. Могилев, 1893.

Памятная книжка Виленского учебного округа на 1874 г. Вильна, 1874.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1905 г. Могилев, 1905.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1907 г. Могилев, 1906.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1911 г. Могилев, 1911.

Памятная книжка Могилевской дирекции народных училищ на 1889—1890 учебный год. Могилев, 1889.

Памятная книжка Могилевской дирекции народных училищ на 1907—1908 учебный год. Могилев, 1908.

Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1983.

Спіс прамысловых прадпрыемстваў БССР. Мн., 1935. Вып. I—III.

Список населенных мест Могилевской губернии. Могилев, 1910.

Список церковно-приходских школ и школ грамоты Могилевской епархии.

Список фабрик и заводов Российской империи. Спб., 1914.

Указатель фабрик и заводов Европейской России. Изд. III. Спб., 1894.

Указатель фабрик и заводов Европейской России и царства Польского. Материалы для фабрично-заводской статистики. Спб., 1887.

Храмович Г. Зарево над Сожем. Мн., 1971.

Храмовіч Г. А. Тры партызанскія гады. Мн., 1981.

ЦДАСА ў Маскве, ф. 543, спр. 763.

Тамсама, ф. 1355, спр. 735.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 6, воп. 1, спр. 894, спр. 3044, спр. 3344; ф. 30, воп. 1, спр. 1312, спр. 1377, спр. 3282, спр. 3283, спр. 3284, спр. 3340, спр. 3341; воп. 2, спр. 3349, спр. 4531; воп. 3, спр. 1312, спр. 1377, спр. 6377; ф. 31, воп, 1, спр. 23/19; ф. 42, воп. 1, спр. 1124, спр. 1775, спр. 1842, спр. 2127, спр. 3524; воп. 2, спр. 3509, спр. 3511, спр. 3512, спр. 3514, спр. 3515, спр. 3516, спр. 3517, спр. 3518, спр. 3519, спр. 3521, спр. 3522, спр. 3523, спр. 3524, спр. 3525, спр. 3526, спр. 3527, спр. 3543; ф. 48, воп. 1, спр. 2850, спр. 2962, спр. 3918; ф. 130, с/р-31, воп. 3. спр. 11; ф. 332, воп. 1, спр. 292; 334, воп. 1, спр. 292, спр. 500.

Філіял Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці, г. Магілёў, ф. 15, воп. 2а, спр. 115.

Філіял Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці г. Крычаў. Назіральныя справы Чэрыкаўскага раёна. Ф. 510. Гістарычная даведка калгаса «Прагрэс». Ф. 543. Гістарычная даведка калгаса «Маладая гвардыя». Ф. 1117. Гістарычная даведка Ударнай МТС. Гістарычная даведка калгаса імя Сталіна. Гістарычная даведка калгаса «12-летие Октября». Гістарычная даведка калгаса «Запаветы Леніна».

Slownik geograficzny. T. 7. Warsawa, 1886. T. 9. Warsawa, 1888. T. 12. Warsawa, 1892. T. 13. Warsawa, 1893. T. 14. Warsawa, 1895.

У. Шчарбатаў.

Быў такі маёнтак

У даным артыкуле размова пойдзе аб гісторыі населеных пунктаў былога Чэрыкаўскага павета, якія ўваходзілі ў так званы Язёрскі маёнтак: Язёры, Доўгае, Сакалоўка, Рагаліна, Прыпёчына, Рынкоўка, Дубраўка, Мірагошч, Горкі, Журавель і Усохі. Гістарычнае апісанне пералічаных сёл і вёсак будзе некалькі сціслым, бо дакументальных матэрыялаў, якія ёсць у архівах, музеях, друкаваных выданнях, вельмі мала. Звесткі, на аснове якіх напісаны артыкул, утрымліваюцца ў наступных дакументах: матэрыялы генеральнага межавання Магілёўскай губерні 1783—1784 гг.; Агляды Магілёўскай губерні за 1897—1914 гг.; «Вопыт апісання Магілёўскай губерні 1882—1884 гадоў» у трох тамах пад рэдакцыяй А. С. Дамбавецкага; дакладныя запіскі ўпраўляючых Язёрскага маёнтка памешчыку і губернатару; справа аб забеспячэнні зямельнымі ўгоддзямі прычту Даўжанскай царквы; выкупныя акты, устаўныя граматы і іншыя матэрыялы па вызваленню сялян (1862—1870); Памятныя кніжкі Магілёўскай губерні і інш.

Вядома, што засяленне зямель, дзе размяшчаліся вышэйназваныя сёлы і вёскі, адбывалася яшчэ ў першабытнасці на стадыях мезаліту і неаліту. Аб гэтым сведчаць матэрыялы археалагічных раскопак, археалагічныя знаходкі, выпадкова выяўленыя ў розных месцах. Напрыклад, неалітычная сякера, знойдзеная ў в. Рагаліна.

Магчыма, што фарміраванне населеных пунктаў праходзіла тут на аснове ўсходнеславянскага пасялення. Яны паступова склаліся ў вёскі. На гэту сувязь указвае наяўнасць у гутарковай мове мясцовых жыхароў слоў-архаізмаў, існаванне розных старажытных абрадаў, якія захаваліся ад усходніх славян-радзімічаў. У XIV—XVIII ст. Чэрыкаўскі павет, як і ўся Беларусь, уваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага

і Рэчы Паспалітай. Аб гэтых старонках гісторыі вёсак амаль нічога невядома, якіх-небудзь дакументальных матэрыялаў не выяўлена.

У 1772 г. адбыўся I падзел Рэчы Паспалітай, па якому Ўсходняя Беларусь, у тым ліку Чэрыкаўскі павет, была далучана да Расіі. З 70-х гадоў XVIII ст. па канец 30-х — пачатак 40-х гадоў XIX ст. дзесяць населеных пунктаў Чэрыкаўскага павета — Язёры, Доўгая, Дубраўка, Горкі, Мірагошч, Журавель, Сакалоўка, Прыпёчына, Рагаліна і Рынкоўка — належалі маркізу Паўлу Хрыстафоравічу Маруцы і яго наследнікам. Прозвішча Маруцы хутчэй за ўсё франка-італьянскага паходжання: у той час у Расіі служыла нямала іншаземцаў. Маркіз быў дастаткова багатым чалавекам і, напэўна, займаў якую-небудзь высокую пасаду, бо яму быў падораны вялікі маёнтак, які знаходзіўся ў выгадным месцы.

З 40-х гадоў да пачатку 70-х гадоў XIX ст. Язёрскі маёнтак належаў графу, члену Дзяржаўнага Савета Расійскай дзяржавы, генерал-ад'ютанту ад артылерыі Сяргею Паўлавічу Сумарокаву. Граф жыў у Пецярбургу і зрэдку заязджаў у свой маёнтак, у якім большую частку года жыла яго жонка з сям'ёй. Пасля падпісання выкупных актаў са сваімі сялянамі ў 1869 г. Сумарокаў прадае землі маёнтка ў пачатку 70-х гадоў князю Аляксею Абаленскаму. Абаленскія валодалі маёнткам да 1917 г. Князь Аляксей гаспадарыў у маёнку да канца XIX ст., пасля яго смерці землі маёнтка атрымаў у спадчыну сын — Аляксей Аляксеевіч Абаленскі, адстаўны падпаручнік. У канцы першага дзесяцігоддзя XX ст. ён выбіраўся павятовым прадвадзіцелем дваранства. Князь памёр незадоўга да рэвалюцыі. Пасля яго смерці маёнткам валодала яго жонка — княгіня Абаленская. Яна была забіта ў 1917 г. у час рэвалюцыйных падзей.

Вызначыць паходжанне назваў указаных населеных пунктаў амаль немагчыма, розныя гіпотэзы выклікаюць сумненне, за выключэннем хіба толькі што Язёр. У канцы XVIII ст. Язёры называліся Азёры, а дзесьці з сярэдзіны XIX ст. з'явілася назва Язёры. Паходжанне слова Азёры указвае на сувязь назвы вёскі з наяўнасцю паблізу ад яе некалькіх азёр. Гэтая версія падцвярджаецца і старажыламі вёскі.

Як ужо гаварылася, у апошняй чвэрці XVIII ст. сёлы і вёскі Язёрскага маёнтка належалі маркізу Маруцы, чалавеку вельмі прадпрымальнаму і дзейнаму. Ён валодаў землямі па ніжняму і сярэдняму цячэнню р. Лабчанкі, а таксама ўздоўж абодвух берагоў р. Сож, прыблізна ад Горак і Мірагошчы да в. Журавель. Каля Сожа сяляне маркіза будавалі пласкадонныя лодкі-лайбы. У XVIII—XIX ст. рачныя судны будавалі наступных тыпаў: буйныя — баркі і берліны, сярэдніх размераў — плоці і лайбы і трохі меншыя — гіляры і дубы. Лайбы прадстаўлялі сабой лодкі даўжынёй 7—11 саж. (1 саж.— 213,36 см), або 15—23 м, шырынёй 4—7 арш. (1 арш.—71,12 см),або 3—5 м, выраблены з яловага лесу, коштам ад 150 да 400 р. Гэтыя лодкі мелі мачту і парус, замест даху на іх былі дзве будкі: адна ў пярэдняй частцы лодкі для рабочых, другая на карме — для гаспадара. Асадка лайбы ў вадзе была каля 3 вяршкоў (1 вяршок —4,44 см),або 12—15 см без грузу, ад 11 да 15 вяршкоў, або 45—60 сантыметраў з грузам да 2500 пудоў. Рухаліся яны з дапамогай вёслаў, месцамі і на парусах пры добрым надвор'і: да 50 вёрст (1 вярста — 1066 м) у дзень без паруса, з парусам — да 70 вёрст, супраць цячэння —30 вёрст без паруса і з парусам — 50 вёрст.

Лайбы маркіз здаваў у арэнду чэрыкаўскім і чавускім купцам. Яны

вазілі на іх розныя грузы ўніз па цячэнню Сожа для продажу. Грузілі смалу, пяньку, рагожы, сельскагаспадарчыя прадукты і везлі іх да р. Днепр, а потым яшчэ ніжэй да горада Крамянчуга.

На адваротным шляху везлі соль. Загружалі яе звычайна ў двух месцах: у Гомелі і Прапойску (цяперашні Слаўгарад), адкуль яна пастаўлялася ў гарады і мястэчкі Магілёўскай губерні.

Сяляне пана Маруцы займаліся ў асноўным вырошчваннем хлеба, выконвалі прыгонныя павіннасці, а таксама выплачвалі аброк як грашыма так і натурай. Сярод дадатковых прамысловых заняткаў можна выдзеліць пчалярства, возніцтва (зімой некаторыя сяляне, у асноўным жанчыны, звозілі розныя тавары на рачныя прыстані для сплаву вясной, а таксама ў Чэрыкаў і іншыя месцы). Акрамя палявых работ, жанчыны пралі воўну, ткалі палатно і сукно для сябе і памешчыка, а таксама на продаж для ўплаты грашовай сумы аброку, падаткаў, пакупкі неабходных у гаспадарцы тавараў. Рэштка выраблена й сялянамі прадукцыі звычайна прадавалася скупшчыкам і купцам, часта на месцы.

Мужчыны выконвалі не толькі палявыя работы, але нарыхтоўвалі лес, здабывалі дзёгаць, смалу, рабілі пяньку, працавалі на млынах гаспадара і г. д. У той час у кожным населеным пункце былі пабудаваны млыны. Так, у Язёрах на р. Азярэнка была невялікая сажалка (на месцы цяперашняга возера), каля якой стаяў млын, які дзейнічаў пры дапамозе вады ў веснавы і асенні час, летам толькі ў дажджлівы час. Тут абмалочвалі хлеб для патрэб памешчыка. Больш буйныя млыны размяшчаліся на р. Лабчанка: адзін з іх, у с. Доўгае, прыносіў даход памешчыку 85 р. у год, другі, у в. Прыпёчына,— 120 р. у год. На гэтых млынах абмалочвалі хлеб не толькі для пана, але і для сялян, мяшчан, усіх жадаючых за пэўную аплату.

Сярод сельскагаспадарчых культур пераважалі збожжавыя: жыта, авёс і іншыя, сеялі таксама бабы, рэпу, каноплі і г. д.

Сяляне займаліся і хатнім рамяством, самі рабілі неабходныя ў гаспадарцы прылады працы, прадметы ўжытку. Хаця былі і сяляне-рамеснікі, якія не працавалі на ворыве, а абслугоўвалі патрэбнасці пана і сялян: кавалі, ганчары, краўцы і іншыя. Гаспадарка, як сялянская, так і памешчыцкая, усё больш звязвалася з рынкам.

Зямельная плошча ўладанняў маркіза складала 36 898 дзес. 901 саж.: пад сядзібамі 239 дзес., пад ворывам — 1302 дзес., лесу — 21 330, сянных, няўкосаў — 1613 дзес., няўдобіц — 690 дзес. 901 саж. У маёнтку налічвалася 289 сялянскіх двароў, пражывала ў іх 2065 чал.

Сялом у той час называлася буйное пасяленне з царквой або валаснымі ўстановамі. Валасным цэнтрам маёнтка ў канцы XVIII — першай чвэрці XIX ст. былі Язёры, з другой чвэрці XIX ст.— сяло Доўгае. У Язёрах была аднакупальная царква, якая называлася Міхайлаўскай, па імені архангела Міхаіла. У сяле Доўгае размяшчалася Прэабражэнская аднакупальная царква, названая ў гонар аднаго з 12 галоўных свят хрысціянскай царквы — «прэабражэння» Ісуса Хрыста. У Язёрах размяшчаўся і панскі дом, у якім пражывала сям'я памешчыка.

З 40-х гадоў XIX ст. у сялян Язёрскага маёнтка з'явіўся новы гаспадар — граф Сумарокаў. Сам ён жыў у Пецярбургу, таму сваім землякам удзяляў мала ўвагі, даручыўшы кіраўніцтва гаспадаркай упраўляючым. У 40—50-х гадах XIX ст. упраўляючым быў Фінфіцік, з канца 50-х да сярэдзіны 60-х гадоў — Вінніцкі, з сярэдзіны 60-х

гадоў па пачатак 70-х гадоў — Калюбакін. Прадпрымальнасцю граф у адрозненне ад сваіх папярэднікаў не вызначаўся. Звестак аб пабудаваных у гэтыя гады мануфактурных прадпрыемствах, гандлёвай дзейнасці ў маёнтку няма. Хаця на 40-я гады XIX ст. прыходзіцца росквіт вотчыннай мануфактуры ў Чэрыкаўскім павеце. Сяляне як і раней выконвалі паншчынныя павіннасці, плацілі аброк. Маёнтак ўпраўляўся ў асноўным старымі метадамі, эксплуатацыя сялян была вельмі цяжкай. Памешчыца Сумарокава, якая большую частку жыла ў маёнтку, імкнулася максімальна выкарыстоўваць працу сялян. Так, пры будаўніцтве дамоў і пабудоў для прычту Даўжанскай царквы яна прымушала сялян працаваць не ў дні прыгону, адведзеныя для выканання розных павіннасцей, а ў вольны час. Амаль сем гадоў вялася бесперапынная барацьба памешчыцы з казённымі сялянамі наконт продажу пабудоў казне за больш выгадную для Сумарокавых суму.

19 лютага 1861 г. былі апублікаваны падпісаныя Аляксандрам II маніфест аб адмене прыгоннага права і Палажэнні аб вызваленні сялян. Па ўсёй Расіі ішло вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці. У Язёрскім маёнтку састаўленне выкупных актаў і падпісанне Устаўных грамат поўнасцю завяршылася ў 1869—1870 гг. Гэтыя дакументы былі падпісаны паўторна, бо састаўленыя раней, у першай палове 60-х гадоў, выкупныя акты не задавальнялі ні памешчыка, ні сялян. Сумарокаў скардзіўся Магілёўскаму губернатару, у земскі аддзел Міністэрства ўнутраных спраў Расіі і ў іншыя органы на няправільнае складанне выкупных актаў, спасылаючыся на тое, што ў разрад няўдобіц занесена частка добрых зямель, прыгодных для ворыва. Сяляне вёсак Рагаліна і Усохі скардзіліся на аднаманне ўпраўляючым графа Сумарокава Калюбакіным лугу і на нядобраякаснасць зямельнай надбаўкі. Была заведзена справа па гэтаму пытанню, якая цягнулася чатыры гады. У 1869 г. паміж сялянамі і памешчыкамі былі падпісаны выкупныя акты і Устаўныя граматы па кожнаму населенаму пункту: Прыпёчына, Сакалоўка, Язёры, Доўгае, Рынкоўка, Мірагошч, Горкі, Журавель, Рагаліна, Дубраўка і Усохі. Вёска Усохі была набыта Сумарокавым у сярэдзіне XIX ст. Сяляне атрымалі па 4 дзес. 1200 саж. зямлі — душавы надзел. Кожны селянін абавязваўся выплачваць штогод з душы ад 5 р. 40 к. да 6 р. 20 к. Граф Сумарокаў змог атрымаць зямлю і грашовы выкуп на спрыяльных для сябе ўмовах.

У 1863 г. у Польшчы, Літве і Заходняй Беларусі пачалося нацыянальна-вызваленчае антыфеадальнае паўстанне. Пасля паражэння на захадзе Беларусі паўстанне вясной 1863 г. перакінулася на ўсход Беларусі, галоўным чынам на Магілёўскую губерню. У Чэрыкаўскім павеце ў 1863 г. таксама адбываліся хваляванні польскай шляхты, рыхтавалася паўстанне, фарміраваліся паўстанцкія атрады. Спробы паўстанцаў узняць на выступленні сялян закончыліся няўдачай, а мясцовыя ўлады, выкарыстоўваючы нацыяналістычную прапаганду, падаўлялі з дапамогай сялян ачагі паўстання. Так, у данясенні ўпраўляючага маёнткам графа Сумарокава Вініцкага Магілёўскаму губернатару ад 10 мая 1863 г. паведамлялася аб змове польскай шляхты ў Чэрыкаўскім павеце. Упраўляючы з некаторымі іншымі чэрыкаўскімі дваранамі для спынення выступлення паўстанцаў выкарыстоўваў сялян. У памешчыцкім атрадзе знаходзілася каля 400 сялян маёнтка, узброеных каламі і зброяй. Удзел сялян у падаўленні паўстання выклікаў незадавальнен-

не мясцовага начальства, асабліва ў прадвадзіцеля і спраўніка, бо сяляне разграмілі некалькі дваранскіх дамоў, разграбілі абоз інсургентаў (паўстанцаў). Многімі дваранамі гэта было ўспрынята як бунт. Як мяркуецца, гэтыя дзеянні ўпраўляючага не спадабаліся графу. Упраўляючы быў звольнены са сваёй пасады Сумарокавым. У маёнтку неўзабаве з'явіўся новы ўпраўляючы, адстаўны капітан 1-га рангу Мікалай Калюбакін.

Як было сказана вышэй, у пачатку 70-х гадоў XIX ст. Сумарокаў прадаў свае землі князю А. Абаленскаму.

Новы ўладальнік маёнтка аказаўся больш прадпрымальным чалавекам, бо ў канцы XIX ст. амаль у кожнай вёсцы былі пабудаваны розныя прадпрыемствы. Вядома, што ў сярэдзіне 70-х гадоў XIX ст. у в. Прыпёчына знаходзілася сукнавальная фабрыка, якую арандаваў разам з млыном за 600 р. мешчанін Лявіцін. У с. Язёры быў вінакурны завод, які вырабляў спірт.

Больш разнастайнымі сталі промыслы сялян Даўжанскай воласці. Каб пракарміць свае сем'і, яны займаліся адыходнымі і мясцовымі промысламі. У 70—80-х гадах XIX ст. многія сяляне займаліся ляснымі промысламі: высечкай лесу, нарыхтоўкай і падвозам лясных матэрыялаў на станцыі і склады, сплавам лесу па Сожы. У анкетных даных за 1881 г. адзначаецца, што ў населеных пунктах воласці сяляне займаліся калёсным, сталярным, бандарным і іншымі мясцовымі промысламі. Калі калёсным промыслам займаліся не больш 1—2 гаспадарак ў сёлах і вёсках, то бандарным і сталярным — у сярэднім 3—4 двары. Напрыклад, у в. Прыпёчына 7 гаспадарак займаліся сталярным промыслам, у с. Язёры 6 гаспадарак займаліся бандарным промыслам.

Да пачатку 80-х гадоў XIX ст. павялічылася колькасць двароў і насельніцтва ў вёсках Даўжанскай воласці. У 1881 г. у с. Доўгае было 59 двароў, 360 чал., у Язёрах — 108 двароў, 578 чал., Прыпёчына — 41 двор, 225 чал., Рынкоўка — 33 двары, 218 чал., Сакалоўка — 47 двароў, 260 чал., Горкі — 12 двароў, 63 чал., Журавель — 40 двароў, 158 чал., Рагаліна — 65 двароў, 305 чал., Усохі — 37 двароў, 151 чал., Мірагошч — 53 двары, 253 чал.

У першыя гады XX ст. па ўсёй Расіі абвастраецца класавая барацьба паміж памешчыкамі і сялянамі. У 1904 — 1905 гг. у радзе населеных пунктаў Язёрскага маёнтка адбыліся выступленні сялян супраць памешчыка Абаленскага. У дакладных запісках упраўляючага маёнткам Горы Стоша магілёўскаму губернатару адзначаюцца хваляванні сялян у вёсках Мірагошч, Горкі, Прыпёчына, у с. Язёры. Напрыклад, 8 верасня 1904 г. у Язёрах сялянамі былі спалены складскія і іншыя памяшканні, якія належалі князю, а 27 снежня 1905 г. у в. Прыпёчына сяляне разграмілі дом Абаленскага.

Цэнтрам культуры, духоўнага жыцця ў сельскай мясцовасці ў той час былі царква і школа. Як указвалася вышэй, у с. Язёры размяшчалася Міхайлаўская царква, а ў с. Доўгае — Прэабражэнская, якая з пачатку XX ст. упамінаецца ўжо як Вазнясенская — у гонар рэлігійнага свята «ўзнясення» Ісуса Хрыста. Напэўна, змена назвы была звязана з перабудовай царквы.

У найбольш буйных сёлах і вёсках маёнтка ў паслярэформенны час знаходзіліся розныя вучэбныя ўстановы. У 1884 г. у Язёрах адкрываецца аднакласная царкоўнапрыходская школа, якая знаходзілася ў спецыяльна прыстасаваным для яе доме. У справаздачы Магілёўскай епархіі аб царкоўнапрыходскіх школах за 1888/89 навучальны год адзна-

чаецца, што настаўніцай у Язёрах з'яўляецца Настасся Чалоўская, якая закончыла курсы ў Магілёўскім пансіёне. Яна атрымала ад сельскага грамадства 75 р. і ад епархіяльнага вучылішчнага савета — 75 р. за вучэбны час. Настаўнікам закону божага быў свяшчэннік Міхайлаўскай царквы — Іван Матыска. У школе вучыліся 28 хлопчыкаў. Па даных Памятнай кніжкі Магілёўскай губерні за 1909 г. у 1908 г. настаўнікам Язёрскай царкоўнапрыходскай школы была Валянціна Цытовіч, якая закончыла Чэрыкаўскае жаночае вучылішча. Законавучыцелем быў свяшчэннік Міхайлаўскай царквы Рыгор Канстанцінавіч Кутарга.

У с. Доўгім у 1864 г. адкрылася двухкласнае пачатковае народнае вучылішча. Яно размяшчалася ў асобным, спецыяльна пабудаваным доме.

На ўтрыманне вучылішча штогод выдзялялася 100 р. з дзяржаўнага казначэйства і 100 р. ад мясцовага сялянскага грамадства. У 1870—1890 гг. настаўнікам у вучылішчы працаваў С. Я. Гарчакоў, які скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. Закон божы выкладаў свяшчэннік Даўжанскай царквы П. С. Вішнеўскі. Ён скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і працаваў у вучылішчы са дня яго адкрыцця, атрымліваў 25 р. У 1908 г. настаўнікамі ў Даўжанскім вучылішчы працавалі А. А. Калецкая і Марыя Клімовіч.

У пачатку XX ст. у в. Сакалоўка было адкрыта пачатковае народнае вучылішча. У 1908 г. у ім працаваў Я. Г. Чарчакоў.

У пачатковых навучальных установах дзяцей вучылі чытанню, пісьму, закону божаму, чатыром правілам арыфметыкі і царкоўным спевам.

Хочацца прывесці і некаторыя даныя аб вёсках, якія знаходзіліся побач з Язёрскім маёнткам.

У канцы 70-х гадоў XVIII ст. вёскі Ржавец і Лобча належалі ўдаве, калежскай саветніцы Залатухінай, якая атрымала іх у пажыццёвае карыстанне. У гэты час (даныя 1783 г.) у в. Лобча (у канцы XVIII — пачатку XIX ст. назва вёскі пісалася праз букву «П» — Лопча, таксама як і назва ракі — Лапчанка), было 39 двароў, у якіх пражываў 291 чал., а ў в. Ржавец было 33 двары, у якіх жыло 234 чал.

Сяляне памешчыцы Залатухінай знаходзіліся на аброку, выплачвалі па 2 р. у год з душы. Таму сяляне гэтых вёсак былі больш звязаны з рынкам. Яны займаліся не толькі традыцыйнымі сельскагаспадарчымі работамі — земляробствам, жывёлагадоўляй, але і ткацтвам — ткалі палотны на продаж, вываз.

Пасля смерці памешчыцы, у канцы XVIII ст., сяляне вёсак Лобчы і Ржавец перайшлі ва ўласнасць дзяржавы. Гэтыя вёскі адносіліся да Прапойскага казённага маёнтка, які аб'ядноўваў сялян дзяржаўных вёсак і кіраваў імі. Вядома аб цяжбе сялян Ржаўца і Лобчы з памешчыцай Язёрскага маёнтка графіняй Сумарокавай ў 1847—1853 гг. у сувязі з расходамі на будаўніцтва памяшканняў Прэабражэнскай царквы ў в. Доўгаль, прыхаджанамі якой з'яўляліся яны. У канцы XIX ст. сяляне Лобчы і Ржаўца займаліся рознымі промысламі: калёсным, бандарным і іншымі. У 1881 г. насельніцтва ў гэтых вёсках павялічылася. Так, у Лобчы быў 81 двор, дзе пражывала 385 чал., у Ржаўцы мелася 49 двароў, у якіх жыло 339 чал.

Вёска Вербеж (у канцы XVIII — пачатку XIX ст. называлася Вербліж), з канца 70-х гадоў XVIII ст. разам з населенымі пунктамі Лабанаўка, Шароеўка, Шчацінка належала пану графу Аркадзію Іванавічу Маркаву.

Маркаў атрымаў гэтыя вёскі ў спадчыну. Маёнтак быў даволі буйны, у ім налічвалася 246 двароў, дзе пражываў 1831 чал. Маёнтак Маркава крыху ўступаў маёнтку суседа маркіза Маруцы. У 1783 г. у в. Вербеж было 49 двароў, пражывала 245 чал. Сяляне вырошчвалі хлеб, сеялі лён, каноплі. Сялянскія гаспадаркі графа Маркава насілі прамысловы характар, было шырока распаўсюджана ткацтва, выраблялася сукно на продаж. У дакументах падкрэслівалася, што сяляне Маркава выглядалі больш заможнымі і жылі лепш, чым сяляне суседніх маёнткаў. У XIX ст., да вызвалення сялян, маёнткамі валодалі патомкі графа Маркава. У 1881 г. у в. Вербеж было 62 двары, дзе пражываў 261 чал.

Аб в. Гіжня ў спісах падараваных дваранам вёсак у канцы XVIII ст. не паведамляецца. Звесткі з больш позніх дакументаў (сярэдзіна — канец XIX ст.) указваюць на існаванне в. Гіжня некалькі стагоддзяў таму назад. У дакументах сярэдзіны — канца XIX ст. Гіжня паўстае даўно сфарміраванай вёскай, са склаўшыміся гістарычнымі традыцыямі. У 1881 г. у Гіжні было 79 двароў, у якіх пражывала 288 чал. Сяляне вёскі займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, рознымі промысламі: калёсным, сталярным, бандарным і іншымі. Такія вось кароткія звесткі з гісторыі вёсак Лобча, Ржавец, Вербеж і Гіжня Чэрыкаўскага павета ў XVIII—XIX ст.

М. Шымукенус.

На крутым беразе

Вёска Наркі размешчана ў 18 км ад раённага цэнтра і 6 км ад чыгуначнай станцыі Верамейкі.

Ёсць звесткі, што Наркі былі заснаваны ў 1676 г. дзвюма-трыма сем'ямі прыгонных сялян, якія збеглі ад прыгнёту польскіх паноў на ўсходнія землі. З вусных легендаў і паданняў, якія прыйшлося чуць ад старажылаў Макара Сцяпанавіча Лістраценкі і Восіпа Аўрамавіча Бандурына, даведваемся, што заснавальнікам новага пасялення быў нейкі Букавец (Цішка Баковец), а сваю назву вёска быццам бы атрымала ад таго, што першыя яе жыхары пасяліліся першапачаткова ў зямлянках-норах, на крутым беразе Козела.

Летапісныя звесткі аб заснаванні Наркоў адносяцца да яшчэ больш ранняга перыяду. Так, напрыклад, захавалася чалабітная палкоўніка Паклонскага цару Аляксею Міхайлавічу ад 13 снежня 1654 г. аб дараванні яму і яго казакам маёмасці і вёсак у Магілёўскім і Чавускім паветах. Цар ацаніў заслугі таго палкоўніка і адпісаў яму 9 вёсачак, у тым ліку і Наркі.

Яшчэ раней, у 1604 г., польскі кароль Сігізмунд III дараваў Наркі разам з некаторымі іншымі навакольнымі вёскамі сваім верным паслугачам, выхадцам з Маскоўскай дзяржавы Хрыпуновым.

Захаваліся дакументы, датаваныя 1594 г., дзе адзначаецца, што ў той час у Нарках было 9 валок зямлі, заселеных сялянамі.

У больш познім дакументе («Экономические замечания к планам генерального межевания») у 1787 г. запісана, што Наркі знаходзяцца на левым беразе р. Козел. У вёсачцы — дом для прыказчыка, простай будоўлі, драўляны. Ёсць мучны млын. На першае студзеня 1847 г. у в. Наркі было 3738 жыхароў: 1903 мужчыны і 1835 жанчын.

Да 1850 г. вёска належала памешчыку Строганаву. У сувязі з адсутнасцю ў яго прамых нашчадкаў і няспыннай барацьбой сялян за сваё

вызваленне, памешчык вырашыў «вызваліць» прыгонных. Але атрымаць сялянам вызваленне ад прыгнёту не ўдалося.

Яшчэ і зараз ад старых вяскоўцаў можна пачуць нямала жахлівых гісторый пра той час. Расказваюць, напрыклад, пра страшэнны голад. Елі крапіву, лебяду, канюшыну, ліс це ліпы і дуба. Многія наогул кідалі наседжаныя месцы і ехалі шукаць шчасця ў далёкія краі. Так, за перыяд з 1888 г. па 1911 г. з Наркоў у Сібір выехала каля 60 сямей. Шмат было адыходнікаў — цесляроў, шахцёраў, сталявараў.

Сумны знешні выгляд мела дарэвалюцыйная вёска. Нізкія, быццам прыплюснутыя, з падслепаватымі акенцамі і саломеннымі дахамі хаты. Асвятляліся звычайна лучынай і смалой.

Славіліся Наркі сваімі майстрамі — кавалямі, шорнікамі, ганчарамі, цеслярамі. Каля вусця р. Козел была смалакурня, дзе сяляне займаліся вырабам драўлянага вугалю, дзёгцю і шкіпінару з карэнняў сасны.

У другой палове мінулага стагоддзя пачынаецца гісторыя Наркоўскай школы. Дакладней, афіцыйныя звесткі аб яе дзейнасці вядомы з 1888 г. Сродкі на ўтрыманне царкоўнапрыходскай пачатковай школы ішлі ад царкоўнага прыхода. Настаўнікаў падбіраў Лабанаўскі поп з ліку скончыўшых двухкласнае вучылішча. Школа знаходзілася ў наёмным памяшканні. У 1895 г. школа размяшчалася ў хаце Аўчыннікавых, настаўнікам тады працаваў Рыгор Маркавіч Кухарэнка. Праз некаторы час школа стала земскай і сродкі на яе ўтрыманне збіралі самі вяскоўцы.

Першы школьны будынак у Нарках узведзены ў 1907. Тут ужо было чатыры класы. Настаўнічалі Сямён Сцяпанавіч Барбаро і Еўдакія Рыгораўна Чысцякова. Праз год школа стала народнай.

І. Ткачоў.

Павятовыя звесткі

Як былі апрануты службовыя людзі, якія і калі будаваліся цэрквы, колькі гэта каштавала, звесткі аб злачынствах і пажарах, эпідэміях і стыхійных бедствах, колькі зарабляла, напрыклад, прыслуга ў Чэрыкаве... Гэтыя і шмат іншых маленькіх штрышкоў да гісторыі Чэрыкаўскага павета вы знойдзеце ў прыведзенай ніжэй падборцы фактаў, узятых з архіўных дакументаў і старых кніг.

Служебный мундир в уезде в конце XVIII в., как и во всей губернии, был: «кафтан красный с палевыми бархатными лацканами, круглыми абшлагами и воротником; подбой и камзол палевого цвета, пуговицы белые»[1].

В имении помещицы Чериковского уезда Гайровой Соломеи (дер. Зеленковичи) летом 1800 г. случился пожар. Дело о ведении следствия о пожаре было начато 6 августа 1800 г., окончено 13 октября 1810 г.[2]

Путешествуя по Могилевской губернии в начале 40-х годов XIX в., Михаил Жданов писал о дороге из Чернигова в Могилев, проходившей и по Чериковскому уезду: «дорога оттеняется прекрасными деревьями. Березы, посаженные в царствование императрицы Екатерины II, достигли полного своего возраста; они укрепляют землю кореньями и удобряют песчаные и глинистые места падающими листьями. Где старые деревья сломаны бурею или срублены, там ежегодно подсаживаются новые»[3].

На строительство православной церкви в с. Селичах в 1839 г. было пожертвовано 50 руб. ассигнациями, 50 брусов яловых и 20 коп. гонту; 31 марта 1843 г.— 150 руб.; 8 декабря 1844 г.— 35 руб. ассигнациями; 19 марта 1845 г.— 15 руб. серебром[4].

В июле 1840 г. был ограблен швейцарский подданный Вебер Рудольф. Были похищены в большом количестве рогожи и мочалы. Дело по обвинению кричевских граждан Певзнера, Шамиловского, Натанова и др. в воровстве было начато 23 июля 1840 г., а окончено 17 октября 1852 г.[5]

1 мая 1842 г. в селе Гарезне сгорела православная церковь, вновь устроенная в 1839 г. на казенную сумму, со всею утварью, ризницею и богослужебными книгами, сгорели священноцерковнослужительские домы с принадлежностями[6].

В 1844 г. за неплатеж податей и недоимок в Чериковском уезде, по сведениям канцелярии могилевского губернатора, было заложено 53 имения и 7602 ревизских души[7].

В 1851 г. в с. Кошаны был построен деревянный дом на каменном фундаменте для священника приходской церкви. Сметная стоимость этого дома — 434 руб[8].

В августе месяце 1853 г., согласно распоряжению Министерства народного просвещения, в Чериковском уездном училище было введено чтение молитвы до и после учения[9].

За 1854 г. в Чериковском уезде родилось 2442 ребенка, умерло 1810 чел., было заключено 460 браков. По городу Черикову: родилось 185, в том числе две двойни, умерло 159 человек, заключено 33 брака[10].

14 ноября 1856 г. в Черикове был разрешен на общих основаниях прием частных каменных зданий, крытых железом, черепицею и цинком, в залог по казенным поставкам и подрядам на местные лишь надобности Могилевской губернии, кроме питейных откупов[11].

Накануне отмены крепостного права в уезде число помещичьих крестьян было: мужского пола 27 079, женского пола 28 257; дворовых людей: мужского пола 775, женского пола 772[12].

25 июня 1861 г. в Могилеве проводилась выставка и испытание крестьянских лошадей. Из соискателей представители Чериковского уезда удостоились наград за наружный вид своих лошадей: 1) дер. Бардичи, помещика фон-Бенкендорфа, временнообязанный крестьянин Малах Трофимов за кобылу рыжей масти, 4 лет, получил серебряную медаль, 15 р. сер. и похвальный лист; 2) с. Молостовки, помещика фон-Бенкендорфа, временнобязанный крестьянин Емельян Григорьев за кобылу серой масти, 6 лет, получил 6 руб. сер. и похвальный лист. Он же получил приз в 10 руб. сер. и при испытании лошадей в перевозке тяжестей[13].

В начале 60-х годов XIX ст. в Чериковском уезде народные училища имелись в м. Малятичах (15 учеников), с. Езерах (22), с. Самотеевичах (21), м. Краснополье (25), с. Новой Ельне (13), м. Кричеве (60), с. Долгом (49), с. Полуже (48 учеников). Второразрядные народные училища находились в с. Студенце (18 учеников), с. Дубровке (5), с. Добром (20 учеников)[14].

На должность предводителя дворянства Чериковского уезда в марте 1863 года баллотировались четыре кандидата из потомственных дво-

рян: М. М. Костровицкий, А. О. Чудоский, И. И. Глинко и А. И. Хлюдзинский. Костровицкий по большинству баллов был удостоен избрания в назначенную должность[15].

В г. Черикове после пожара, в 1863 г., истребившего церкви, осталась одна церковь деревянная, ветхая. В связи с этим «г. главный начальник края изволил признать необходимым воздвигнуть» здесь новую каменную церковь[16].

1 декабря 1865 г. при Чериковском приходском училище открыта женская семинария. Наставницей работала Дарья Закржевская. Законоучителем был Афанасий Абрамович. В семинарии в 1866 году занимались 33 девушки: из дворян и чиновников — 2, духовного звания — 5, городского сословия — 26. В основном все были православного вероисповедания (только двое — католического)[17].

Онуфриевское поселянское училище, по устройству его вновь, освящено 6 дня сего Октября 1865 г. и с 7 дня сего же месяца начались занятия с крестьянскими мальчиками[18].

По данным на 1866 г. на содержание приходского училища в г. Черикове расходовалось: из доходов недвижимых имений римско-католических монастырей — 114 р. 28 к., из городских доходов — 345 р. 72 к., т. е. всего 460 р. Училище это одноклассное, основано в 1837 г. В нем преподавали двое законоучителей и один учитель. К 1 января 1867 г. в училище занималось 33 учащихся, из них православных — 29, католиков — 4; по сословиям: дворян и чинов — 4, городских сословий — 29[19].

В пользу училищ в 1866 г. в уезде было пожертвовано: мировым посредником г. Бибиковым 123 руб. на обзаведение и жалованье учителю недавно открытого в деревне Устиновичи (имение его, Бибикова) нештатного училища. Помещиком Бенкендорфом уступлено под штатное училище в селе Старинка большой деревянный дом[20].

С разрешения помощника попечителя Виленского учебного округа в 1866 г. в уезде были созданы склады книг для продажи в г. Черикове у смотрителя уездного училища, в с. Самотеевичи у благочинного, в м. Краснополье и с. Долгом — у священников[21].

К январю 1867 г. штатных училищ в уезде было: мужских — 11, женских — 6. В них училось 409 мальчиков и 69 девочек. Часть средств, необходимых для содержания училищ, ассигновывались государственным казначейством. Остальное доплачивалось местными сельскими обществами. В 1866 г., например, было доплачено 1313 руб. Второразрядных училищ было 9, в них училось 263 человека. В приходском училище в Черикове училось 33 человека. Кроме того, в Черикове было 3 училища «ведомства государственных имуществ», в которых обучалось 126 учащихся[22].

29 сентября 1867 г. по просьбе благочинного Адама Гошкевича и священника Константина Бруевича для церквей сел Малятичи и Волымер Чериковского уезда были приобретены некоторые предметы церковной утвари. В частности для Волымерской церкви — напрестольное евангелие, одежды праздничного и траурного облачения, несколько икон и колокол, весом примерно пудов пятнадцать. Для Малятической церкви — напрестольный серебряный крест, два напрестольных облачения, две ризы священницкие с полным облачением[23].

При раскопках кургана около д. Клясино Чериковского уезда было найдено некоторое количество украшений. В 1893 г. Ю. И. Чоловский передал Могилевскому музею три височных кольца из серебряной проволоки, ожерелье из глиняных разной величины бус круглой и четырехгранной формы[24].

В ночь с 5 на 6 августа 1894 г. с целью ограбления близкими родственниками был убит ксендз Вородьковского костела Павел Габранич. Убийцы похитили 3000 руб. денег, заключающиеся в билетах Виленского Земельного банка, карманные золотые часы с такою же цепочкою, стоящие около 150 руб., шерстяную материю черного и зеленого цвета по 20 аршин на сумму около 44 руб., дюжину столовых серебряных ложек, бочонок водки около двух ведер, чаю три фунта, квитанцию Белицкого волостного правления на вклад в кассу 1300 руб., сахар в головке и колотый, револьвер[25].

Дисциплинарными мерами в школах уезда в конце XIX в. служили: замечание, выговор провинившемуся ученику, оставление его в классе на некоторое время после учебных занятий; в крайних случаях — стояние на ногах в классе во время урока около парты или за партой и обращение к родителям для принятия соответствующих мер к исправлению их детей. Вообще же заведывающие школами священники и учащие в них старались воспитывать учащихся в добрых навыках духом кротости, по возможности избегая мер наказания[26].

В 1896 г. была сдана в аренду земля разных угодий при околице Сосновицкая, всего 19 десятин, сроком на 12 лет, за 4 рубля в год, дворянину Павлу Стефановичу Беляцкому; земля разных угодий при околице Кривой Ниве, 11 дес. 1600 саженей, на 3 года, за 10 руб. в год, крестьянину Василию Григорьевичу Подобеду[27].

Обязательным предметом во всех церковноприходских школах было церковное пение. В 1896 г. особые хоры существовали при следующих церковноприходских школах: Телешевская, Студенецкая, Выдренская двухклассная. Число учеников, участвовавших в хорах, было от 10 до 30 человек.

Воскресные и праздничные чтения в последние годы XIX в. велись в Красовичской, Веремейской, Студенецкой, Горезинской, Выдренской, Телешевской церковноприходских школах. Чтения посещали не только учащиеся школ, но и взрослые. Предметом чтения были преимущественно жития святых и разные статьи религиозно-нравственного содержания. Праздничные чтения в школах, где организованы хоры, соединялись с пением общеупотребительных молитв и важнейших церковных песнопений[28].

По переписи 1897 года в Чериковском уезде проживало 150 277 человек. Из них: 134 640 — белорусы, 12 943 — евреи, 1048 — великоруссы, 682 — поляки[29].

Раскольников в уезде в 1897 г. было 178 душ обоего пола. По заявлению Чериковского Отделения Совета «раскольники живут в разных приходах». В уезде проживают: 2607 католиков, 32 протестанта, 11 112 евреев[30].

В 1897 г. население мужского пола по уезду составило: от одного года до 20 лет — 15 893 чел., от 20 до 30—8 532, от 31 до 40—6 606, от 41 до 50—5 940, свыше 50 лет — 4 384 чел. Всего: 41 355 чел. По роду занятий население подразделялось: священников и церковнослужите-

лей — 320, государственных служащих — 497, землевладельцев и земледельцев — 31 858, торговцев — 1 746, ремесленников — 412, фабричных — 222, извозчиков и ямщиков — 30[31].

В декабре 1896 — январе 1897 гг. в Черикове и еще 3 селениях разразилась эпидемия скарлатины. Заболело всего 191 чел., умерло 35 чел.[32]

По сведениям за 1897 г. в уезде была сдана в аренду земля разных угодий при хуторе Александровке, 2 дес. 400 саж., на 12 лет, за 3 руб. в год, мещанину Павлу Викентьевичу Чижу; земля при ок. Кривой Нивы, 11 десятин, на 3 года, за 11 руб. в год, крестьянке Анне Демьяновой Подобед[33].

В 12 в. от г. Черикова находился Охорский Преображенский третьеклассный мужской монастырь. Основан в XII в. В нем две церкви: 1) Преображенская, деревянная холодная; 2) Успенская, в связи с кельями деревянная, теплая. В 1899 г. земли при монастыре было 1080 дес. 1450 кв. сажней. Настоятелем монастыря служил игумен Тихон[34].

Особо установленные крестные ходы в 1899 г.: 30 июня из Успенской церкви с. Лобановки на источник «Бровгун»; 1 августа из Успенской церкви м. Краснополье на «криницу» «Красную»; в 10-ю пятницу по Пасхе из Покровской церкви м. Гор на источник; в 10-ю пятницу по Пасхе из Покровской церкви с. Кляпина на источник; в 2-й день Св. Троицы из Петро-Павловской церкви м. Студенца на источник[35].

Чудотворной и особо почитаемой иконой в Чериковском уезде была копия Ченстоховской иконы в Иоанно-Предтеченской церкви с. Соболи; праздник — 22 октября[36].

За различные преступления в 1899 г. в уезде было привлечено к суду 2195 мужчин и 375 женщин. Из них 618 мужчин и 122 женщины были оправданы. Остальные подверглись наказаниям: телесному, аресту, денежному штрафу, общественным работам, замечаниям и выговорам[37].

19 апреля 1901 г. в д. Горбавичах от неизвестной причины сгорело 40 крестьянских домов и 7 овинов, чем причинено убытка на сумму до 21 000 р. Ущерб жителям уезда от градобития в этом же году составил 8310 р. Пострадавшим от градобития и пожаров крестьянам оказано пособие: выдано в ссуду хлеба из общественных запасных магазинов в размере озимого до половины и ярового более половины запасов[38].

В 1909 г. в розничной продаже в г. Черикове 1 ф. ржаного хлеба стоил 4 коп., пшеничного хлеба — 7, соли — 1, мяса — 10—14, сахара — 16, керосина — 6 коп., сажень дров — 13—15 руб. Прислуга мужская получала 10—12 руб., женская 8—9 руб... Наемная плата квартир в г. Черикове в 1910 г. была: за квартиру из 7 или 8 комнат — 360 руб., 5-комнатную квартиру — 250 и за 3-комнатную — 120 руб. в год[39].

4 марта 1912 г. могилевским губернатором было удовлетворено ходатайство крестьянки Марины Азаровой об открытии ею в м. Кричеве курсов кройки, шитья и изящного рукоделия[40].

В имении Старинка княгини Кропоткиной 11 мая 1912 г. в 11 часов вечера сгорела картонная фабрика со всем оборудованием и около 14 700 пудов картона. Убытку причинено на сумму до 120 000 руб. Подозревается умышленный поджог[41].

Выпавшим 24 мая 1912 г. градом в деревне Холмах и Романьках Краснопольской волости выбито на крестьянских полях 253 десятины озимого и ярового хлеба и в дер. Журавах Мхиничской волости 25 мая этого же года выбито около 200 десятин озимого и ярового хлеба крестьян той деревни[42].

4 июня 1912 г. чериковский уездный исправник сообщал могилевскому губернатору: «В деревнях: Слобода, Сычеве, Юшновичах, Усполье и Киселевке Долговичской волости, Зорях и Глине Комаровичской волости, Мирогоще, Горках и Журавле Должанской волости, Антоновке, Сорочине и Воловниках 1-х и 2-х Малятичской волости, выпавшим 23 и 24 мая сего года градом повреждено до 596 десятин озимой ржи и в имении Горках княгини Оболенской повреждено 6 десятин хмеля. Кроме того, в деревне Воловниках 1-х градом убито 87 штук овец и искалечено до 100 штук овец. Сумма убытка исчисляется в 23 700 рублей[43].

В дер. Дерновой Палужской волости, 14 июня 1912 г. в 10 часов вечера при значительном ветре произошел пожар, коим уничтожено 62 крестьянских двора с надворными постройками, 10 овинов, 4 сарая, 5 амбаров и 5 бань, а также сгорело 2 коровы, 3 подтелка и 15 свиней. Пожар произошел от неисправного содержания дымовой трубы крестьянином Никитой Малаховым Титковым. Убытку пожаром причинено на 16 690 руб. Всего до пожара в этой деревне имелось свыше 100 дворов[44].

В дер. Козельской Буде 1-й Самотеевичской волости в ночь на 6-е июля 1912 года при сильном ветре произошел пожар, коим уничтожено 44 дома. Поджог совершил дворянин Евгений Курако. Во время этого пожара горящие головни сильным ветром были переброшены в соседнюю деревню Козельскую Буду 2-ю, где уничтожено 50 крестьянских домов с надворными постройками. Всего причинено убытка на 68 520 руб.[45]

25 июля 1912 г. в м. Кричеве Чериковского уезда от поджога при значительном ветре сгорело 118 обывательских домов с надворными постройками в том числе: частная аптека, земский приемный покой, еврейские школа и богодельня. Кроме того, уничтожено огнем 9 торговых лавок. Убытка причинено на 74 800 рублей[46].

В городе Черикове 30 июля 1912 года застрелился городской голова коллежский асессор Петровский, 50 лет, страдавший в последнее время нервным расстройством[47].

Учебный год в народных училищах на Чериковщине открывался 1 сентября и продолжался по 1 мая. Общее количество учебных дней во всех начальных школах, городских и сельских, при исключении из счета однодневных праздников, а также рождественских и пасхальных вакаций, должно простираться до 168—180. По отчетным сведениям за 1912 г. в Чериковском уезде в одноклассных сельских школах учебный процесс продолжался 160 дней[48].

В 1913 г. Строительным Отделением Могилевского Губернского правления разрешены к открытию в Чериковском уезде следующие фабрики и заводы: винокуренный завод в им. Горах; лесопильно-мукомольный завод в им. Кляпино; мельницы в с. Палужи и д. Чудянах[49].

[1] Плещеева. Обозрение Российской империи в нынешнем ея новоустроенном состоянии. Спб., 1790. С. 99.

[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь,ф. 2129, воп. 1, спр. 2.

[3] Путевые записки по России в двадцати

губерниях Михаила Жданова. Спб., 1843. С. 170.

[4] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2001, воп. 1, спр. 265, л. 22.

[5] Тамсама, ф. 2129, воп. 1, спр. 3.

[6] Тамсама, ф. 2001, воп. 1, спр. 198, л. 1.

[7] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 277.

[8] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2189, воп. 1, спр. 18.

[9] Тамсама, ф. 2277, воп. 1, спр. 18.

[10] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 567.

[11] Городские поселения Российской империи. Т. 3. Спб., 1863. С. 203—204.

[12] Крепостное население в России, по 10-й народной переписи. Стат. исследование А. Тройницкого. Спб., 1861. С. 33.

[13] Памятная книжка Могилевской губернии на 1863 год. Могилев, 1862.

[14] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2187, воп. 1, спр. 11.

[15] Тамсама, ф. 2001, воп. 1, спр. 933, л. 1.

[16] Вестник Юго-Западной и Западной России. Т. IV. Май. Спб., 1864. С. 250.

[17] Отчет по управлению народными училищами Могилевской губернии за 1866 год. Вильна, 1867. С. 51.

[18] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2189, воп. 1, спр. 439, л. 59.

[19] Отчет по управлению народными училищами Могилевской губернии за 1866 год. Вильна, 1867. С. 49.

[20] Тамсама. С. 28.

[21] Тамсама. С. 17.

[22] Тамсама. С. 5, 9, 11, 13.

[23] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2001, воп. 1, спр. 1028, л. 5.

[24] Описание Могилевского музея / Сост. М. В. Фурцев. Могилев, 1898. С. 72—73.

[25] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь ф. 2001, воп. 1, спр. 1488, л. 3—10.

[26] Отчет о состоянии церковно-приходских школ и школ грамоты в Могилевской епархии за 1895/96 учебный год. Могилев, 1897. С. 32.

[27] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2178, воп. 1, спр, 1, л. 129.

[28] Отчет о состоянии церковно-приходских школ и школ грамоты в Могилевской епархии за 1895/96 учебный год. Могилев, 1897. С. 33—40.

[29] Этнографическая карта Белорусского племени / Сост. Е. О. Карский. Спб., 1917. С. 15.

[30] Отчет о состоянии церковно-приходских школ и школ грамоты в Могилевской епархии за 1895/96 учебный год. Могилев, 1897. С. 4.

[31] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2187, воп. 1, спр. 11.

[32] Тамсама, спр. 48.

[33] Тамсама, ф. 2178, воп. 1, спр. 1, л. 132.

[34] Календарь для духовенства Могилевской епархии на 1899 год. Могилев, 1899. С. 139.

[35] Тамсама. С. 148.

[36] Тамсама. С. 141—142.

[37] Памятная книжка Могилевской губернии на 1901 год. Могилев, 1901. Приложение 30.

[38] Тамсама. С. 68—69.

[39] Список населенных мест Могилевской губернии. Могилев, 1910. С. XXXIV.

[40] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2001, воп. 1, спр. 2077, л. 1.

[41] Тамсама, спр. 2072, л. 2—4.

[42] Тамсама, л. 5.

[43] Тамсама, л. 6.

[44] Тамсама, л. 7.

[45] Тамсама, л. 22.

[46] Тамсама, л. 25.

[47] Тамсама, л. 23.

[48] Журнал совещания инспекторов народных училищ Могилевской губернии по вопросам начального образования в этой губернии от 28 ноября — 3 декабря 1913 г. Могилев, 1914. С. 2.

[49] Обзор Могилевской губернии за 1913 год. Могилев, 1915. С. 36.

С. Кагадзеева.

Славутыя землякі

Чыноўнік Ператц

Дзекабрыст Рыгор Абрамавіч Ператц нарадзіўся ў маёнтку Вусце Чэрыкаўскага павета. Маёнтак належаў яго багатаму дзеду. Дзед будучага дзекабрыста быў купцом, браў на водкуп маёнткі, заводы, гандлёвыя прадпрыемствы, удзельнічаў у справах князя Пацёмкіна па стварэнню флоту.

У 1820 г. Р. А. Ператц стаў членам тайнага таварыства. Пасля паўстання на Сенацкай плошчы Рыгор Абрамавіч зрабіў вывад, што трэба было з дапамогай артылерыі браць царскі палац, а не ісці на плошчу. Разам з таварышамі ён абмяркоўваў рэвалюцыйныя падзеі ў Італіі, вывучаў пытанне незадаволенасці сярод салдатаў і афіцэраў царскай гвардыі. З дазвалення Ф. Глінкі пры-

няў у таварыства некалькі чалавек.

У сваіх першых паказаннях, якія Р. А. Ператц даваў царскай следчай камісіі, ён прызнаўся, што прыняў яго ў тайнае таварыства Фёдар Глінка. Як і яго таварышы па барацьбе, выказаў незадавальненне царскім самадзяржаўем, лічыў, што патрэбна ісці па шляху Французскай рэвалюцыі.

Рыгора Абрамавіча саслалі ў Перм. Там ён знаходзіўся пад пільным наглядам паліцыі. У жніўні 1827 г. Ператца саслалі ў Усць-Сысольск, праз 12 гадоў — у Волагду. Толькі ў пачатку лютага 1840 г. Рыгора Абрамавіча прынялі на службу ў адну з дзяржаўных устаноў, а ў чэрвені 1845 г. ён быў звольнены ў чыне саветніка губернскага ўпраўлення. З 1846 г.— калежскі асэсар. У 1850 г. разам з жонкай і трыма сынамі паехаў у Адэсу. На гэтым звесткі аб дзекабрысце абрываюцца.

М. Мельнікаў.

Незвычайны чалавек

Успамінаючы дні сваёй маладосці, Г. В. Пляханаў гаварыў: «Вядомыя тады рэвалюцыянеры Краўчынскі, Клеменц, Рагачоў, Кавалік уяўляліся мне людзьмі недасягальнай велічы, незвычайнымі, я быў гатоў схіляцца перад імі».

Сяргей Піліпавіч Кавалік, вядомы арганізатар народніцкага руху ў Расіі, пражыў у Беларусі амаль палову свайго жыцця. Нарадзіўся С. П. Кавалік у 1846 г. Дзяцінства яго прайшло ў в. Сваткавічы Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні ў маёнтку бацькі, адстаўнога палкоўніка. Маці памерла, калі хлопчыку было 2 гады, і выхаваннем дзяцей займаўся бацька, чалавек мяккі, добразычлівы.

З 1856 г. Кавалік вучыўся ў кадэцкім корпусе і пераязджаў разам з усімі навучэнцамі з Масквы ў Вільню, а потым у Пецярбург. Ужо ў корпусе ён становіцца ўдзельнікам гуртка самаадукацыі, а потым, у час вучобы ў ваенным вучылішчы, займаецца хіміяй у невялікай лабараторыі, абсталяванай на ўласныя сродкі ў маленькім пакойчыку прыватнага дома. Вучыўся Сяргей Піліпавіч выдатна. Аднак яго вабіла не ваенная кар'ера, а універсітэт. Просьба сясцёр аб вызваленні Сяргея ад ваеннай службы па сямейных абставінах неўзабаве была задаволена. Кавалік паступіў ва універсітэт вольным слухачом, потым, здаўшы экзамены за класічную гімназію, быў залічаны студэнтам, але сродкаў на вучобу не было, і ён зноў стаў вольным слухачом.

Жаданне ўбачыць новыя мясціны прывяло яго ў Кіеў. Тут ён закончыў універсітэт па вышэйшаму разраду і атрымаў ступень кандыдата матэматычных навук. На Украіне пачалася і служба Каваліка. Ён быў абраны міравым суддзёй у адным з паветаў Чарнігаўшчыны. Аднак дзейнасць Каваліка выклікала нянавісць мясцовых улад і памешчыкаў, якім даволі хутка ўдалося дамагчыся праз сенат адмены выбараў. Ужо ў той час Сяргей Піліпавіч вёў актыўную прапаганду ў сялянскім асяроддзі. Разам з сябрамі ён збіраўся арганізаваць камуну ў Паўночнай

С. П. Кавалік.

Амерыцы. У пачатку 70-х гадоў Кавалік паехаў за мяжу, каб сустрэцца з Бакуніным і Лаўровым і абмеркаваць пытанні рэвалюцыйнай стратэгіі і тактыкі. Вярнуўшыся ў Расію, ён становіцца адным з самых актыўных арганізатараў і агітатараў, распачынае прапагандысцкую работу сярод рабочых і сялян, выязджае ў Маскву, Кіеў, Адэсу, Кастраму, Казань, Самару, Саратаў, становіцца адным з галоўных дзеячаў народніцтва, якое актывізавалася з восені 1873 г. Праз паўгода пачалося масавае хаджэнне ў народ, аднак царскаму ўраду ўдалося даволі хутка арыштаваць амаль усіх яго ўдзельнікаў. Частка з іх была адпраўлена ў ссылку або на радзіму пад нагляд паліцыі. С. П. Каваліка напаткаў лёс сяброў. Пасля нядоўгага знаходжання ў Саратаўскай і Самарскай губернях ён быў арыштаваны.

Спачатку Каваліка трымалі ў Петрапаўлаўскай крэпасці, потым перавялі ў дом папярэдняга зняволення. Адтуль ён двойчы спрабаваў уцячы. Другой спробе перашкодзіў выпадак. Светлай вясенняй ноччу С. Кавалік і П. Вайнаральскі на прасцінах спускаліся з акна трэцяга паверха турмы. У гэты час па вуліцы ехаў інжынер Чачулін, ён узняў на ногі паліцыю. Каваліка зноў адвезлі ў крэпасць. У кастрычніку 1877 г. адбыўся суд, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай працэса 193-х. 93 вязні памерлі, скончылі жыццё самагубствам або псіхічна захварэлі, не дачакаўшыся суда.

У студзені 1878 г. быў аб'яўлены прыгавор. С. П. Кавалік, П. І. Вайнаральскі, І. М. Мышкін, М. Д. Мураўскі, Д. М. Рагачоў атрымалі па 10 год катаргі.

Ні аковаў, ні абмежаванняў...

Міхаіл Сямёнавіч Кутарга — вядомы гісторык, член-карэспандэнт Расійскай Акадэміі навук, доктар філасофіі, нарадзіўся 6 ліпеня 1809 г. у Чэрыкаве. Ён скончыў Пецярбургскі універсітэт і Дэрпцкі прафесарскі інстытут. З 1835 г. пачаў працаваць выкладчыкам Пецярбург-

24 чалавекі звярнуліся да рэвалюцыйнай моладзі праз часопіс «Община» са словамі: «Мы ідзём з поля бітвы палоннымі, але мы сумленна выканалі свой абавязак... Ідзём, магчыма, назаўсёды... Мы па-ранейшаму застаёмся ворагамі сістэмы, якая дзейнічае ў Расіі, якая з'яўляецца няшчасцем і сорамам нашай Радзімы... Мы завяшчаем нашым таварышам па пераканаННях ісці з былой энергіяй і падвоенай бадзёрасцю да той святой мэты, з-за якой мы падвяргаліся праследаванню...» Разам з іншымі гэтае пісьмо падпісаў і Кавалік. Пасля адбыцця катаргі С. П. Каваліка адправілі ў Верхаянск.

Нарэшце Сяргею Піліпавічу дазволілі пераехаць у Іркуцкую губерню. Хутка ён перабраўся ў Іркуцк.

У 1898 г. Каваліку дазволілі выехаць у еўрапейскую частку Расіі. Ён абраў Мінск, дзе і прайшлі апошнія 28 год яго жыцця. Цудоўны матэматык, Кавалік знайшоў сабе пасаду толькі бухгалтара ў акцызным упраўленні. У гады першай сусветнай вайны ён служыў у «Земскім саюзе».

З усталяваннем Савецкай улады С. П. Кавалік, якому пайшоў тады восьмы дзесятак, нягледзячы на ўзрост, з энергіяй працаваў старшынёй губернскага зямельнага камітэта, потым у камісарыяце забеспячэння, выкладаў матэматыку ў політэхнічным інстытуце, быў старастам Мінскага аддзялення Таварыства паліткатаржан.

У 1926 г. Сяргей Піліпавіч Кавалік памёр. Пахаваны ён на вайсковых могілках у Мінску.

А. Малінін.

скага універсітэта, а ў 1869 г. перайшоў у Маскоўскі.

Фарміраванне светапогляду Кутаргі выпадае на перыяд, калі рускі лібералізм адыгрываў прагрэсіўную ролю; усе асноўныя ідэі Кутаргі звязаны іменна з гэтым прагрэсіўным этапам рускага лібералізму.

На працягу ўсёй сваёй выкладчыцкай і навуковай дзейнасці Кутарга выступаў супраць прыгонніцтва і самадзяржаўя. Ён яўна не спачуваў ідэям рускай дзяржаўнай школы і не лічыў манархічную дзяржаву вядучым пачаткам у гісторыі народа. У вучэбным плане лекцый Кутаргі ў 1864/65 навучальным годзе значыцца спецыяльная тэма: «Адрозненне паміж гісторыяй народа і гісторыяй дзяржавы». Сярод рускіх гісторыкаў-лібералаў свайго часу Кутарга быў адзіным, хто ўдзяляў вялікую ўвагу вывучэнню становішча рабоў.

Па сведчанню сучаснікаў, пачатак выкладчыцкай дзейнасці Кутаргі азнаменаваўся шэрагам ліберальных выпадкаў супраць мікалаеўскага рэжыму. Пасля вокрыку начальства гэтыя выпады спыніліся, але ў далейшым у працах Кутаргі працягваюць сустракацца асобныя крытычныя выказванні аб сучаснай яму рускай рэчаіснасці. Так, закранаючы становішча старажытнагрэчаскіх рабоў, Кутарга пісаў: «Вывучэнне палітычнага быту старажытных элінскіх рабоў прадстаўляе шмат цікавага, асабліва для нас, рускіх, таму што ў агульным становішчы тых рабоў выяўляецца надзвычайнае падабенства са становішчам былых у Расіі прыгонных і лад розных разрадаў афінскіх рабоў цалкам нагадвае спынены цяпер лад прыгонных людзей». Гэта супастаўленне становішча прыгонных у Расіі са становішчам рабоў характарызуе адносіны Кутаргі да прыгоннага права.

Супрацьпастаўляючы феадальна-дваранскаму парадку парадак бур-

М. С. Кутарга.

жуазнай дэмакратыі, Кутарга падкрэслівае, што яго палітычны ідэал не мае нічога агульнага з народнай рэвалюцыяй, якую ён называў сваявольствам. Паняцце свабоды ён пастаянна звязвае з буржуазнай «законнасцю».

Свабода і законнасць, гаворачы словамі Кутаргі, «складаюць духоўную і маральную патрэбнасць чалавека і, ніколі не разлучаючыся, ідуць у згодзе да адной мэты. Іх сукупнасць перадаецца зараз словамі: свабода і парадак».

Ліберальным сімпатыям Кутаргі больш за ўсё імпанавала французская гістарычная навука, стварыўшая перадавую для таго часу буржуазную тэорыю класавай барацьбы, адным з галоўных аўтараў якой быў Гізо. На гэту акалічнасць звярнуў увагу яшчэ М. Р. Чарнышэўскі. Гізо быў амаль адзіным з замежных гісторыкаў, вывады якога Кутарга, усё жыццё выступаўшы за самастойнасць рускай навукі, высока цаніў. Сляды ўвагі да буржуазнай тэорыі класавай барацьбы выразна высту-


ПОЛИТИЧЕСКОЕ УСТРОЙСТВО

ГЕРМАНЦЕВЪ

ДО

ШЕСТАГО СТОЛѢТІЯ.

БИБЛІОТЕКА МОСКОВСКОЙ ДУХОВНОЙ АКАДЕМІИ.

СОЧИНЕНІЕ

МИХАИЛА КУТОРГИ

Магистра философіи.

САНКТПЕТЕРБУРГЪ.

ПЕЧАТАНО ВЪ ТИПОГРАФІИ Х. ГЕНЦЕ.

1837.

Тытульны ліст сачынення М. Кутаргі.

паюць у працах Кутаргі. Трэба падкрэсліць, што ён скарыстаў гэту тэорыю да зусім іншага матэрыялу, чым французскія гісторыкі, і ў гэтым прымяненні пайшоў значна далей сваіх французскіх калег: у адрозненне ад французскіх гісторыкаў, рашуча ігнараваўшых становішча працоўных мас у сярэдзіне стагоддзя, Кутарга пачаў значнае даследаванне аб становішчы рабоў у Грэцыі і аб барацьбе іх з рабаўладальнікамі.

У працы «Аб навуцы і яе значэнні ў дзяржаве» Кутарга фармулюе задачы гістарычнай навукі. Ён зыходзіць з таго, што навука павінна мець нацыянальныя рысы, бо «ў розных народаў яна ўбіраецца ў розныя формы і як бы накладвае на сябе розную адзежу».

Разам з тым Кутарга лічыў, што запазычанні дасягненняў у чужога народа не толькі магчымы, але і неабходны, аднак яны служаць развіццю культуры народа толькі пры той умове, калі сам народ стварае сваю самабытную культуру; у процілеглым выпадку гэтыя запазычанні служаць толькі «вонкавым упрыгажэннем, даюць выгаду жыцця і выклікаюць вокамгненны бляск, па сутнасці ж бескарысныя і падманлівыя, таму што прыкрываюць невуцтва; гэта пазалота, не чыстае золата. Поспех грамадства залежыць ад самабытнай разумовай дзейнасці, неразлучнай з творчасцю».

На погляд Кутаргі, навука павінна быць перш за ўсё самабытнай, нацыянальнай. Асноўнай умовай яе развіцця з'яўляецца свабода думкі. «Няма патрэбы даказваць, што свабода думкі ёсць першая і самая галоўная ўмова, без якой навука не толькі не распрацоўваецца і не працвітае, але наогул не зараджаецца. Навука, як сам розум, не ведае ні аковаў, ні абмежаванняў, ні прадпісанняў... Свабода думкі ёсць жыццё, як кажуць, кроў і плоць навукі...» Кутарга падкрэслівае, што навука не церпіць якіх-небудзь вонкавых прадпісанняў, што «поспех грамадства залежыць ад самога грамадства», а не ад уздзеяння на яго звонку. Ва ўмовах царскіх парадкаў з іх цэнзурай і паліцэйскай апекай над навукай тэзіс Кутаргі аб свабодзе думкі меў прагрэсіўнае значэнне.

М. С. Кутарга сыграў вядучую ролю ў развіцці рускай гістарыяграфіі і ўсеагульнай гісторыі. Ён распрацаваў праблемы сацыяльнай і палітычнай гісторыі старажытнай Грэцыі, асабліва Афін. Упершыню ў сусветнай навуцы ў працы «Гісторыя Афінскай рэспублікі ад забойства Іпарха да смерці Мільтылда» (1848) спрабаваў паказаць становішча рабоў і вольнаадпушчаных. У 1858 г. выйшла яго праца «Персідскія войны», а ў 1894—1896 гг.— збор твораў у 2 тамах.

Усё сваё жыццё М. С. Кутарга вёў рознабаковую дзейнасць у галіне народнай асветы, бібліятэчнай справы, папулярызацыі гісторыі.

Амаль кожны год разам са сваім братам, доктарам медыцыны, С. С. Кутаргам прыязджаў ён у родныя мясціны, вёў культурна-асветную работу сярод сваіх землякоў.

Памёр М. С. Кутарга 26 мая 1886 г.

М. Алпатаў.

Доменшчык Курака

Курака Міхаіл Канстанцінавіч нарадзіўся 29 верасня 1872 г. у в. Казелле Чэрыкаўскага павета, вядомы металург, заснавальнік школы айчынных доменшчыкаў. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг. З 1890 г. працаваў на металургічных заводах поўдня Расіі каталём, гарнавым, старшым майстрам, начальнікам доменнага цэха. Зрабіў многа значных удасканаленняў і вынаходак у металургіі. У 1903 г. сканструяваў і пабудаваў першы ў Расіі скіпавы падымальнік і домну з аўтаматычным размеркаваннем шыхты; распрацаваў арыгінальную канструкцыю доменнага горна, укараніў муроўку з фасоннай вогнетрывалай цэглы і іншыя канструкцыі, многія з якіх выкарыстоўваюцца ў сучаснай доменнай вытворчасці. Пад кіраўніцтвам Куракі распрацоўваўся праект Кузнецкага металургічнага завода. Памёр 8 лютага 1920 г.

З успамінаў акадэміка І. П. Бардзіна аб М. К. Кураку

Меня жизнь столкнула с Михаилом Константиновичем Курако в 1911 году, когда я только что возвратился из Америки в подавленном настроении и недовольный судьбой своей...

Я как сейчас помню нашу первую встречу. Во время ознакомления с доменным цехом, на что я употреблял каждое воскресенье, ко мне подошел человек, совершенно не похожий на других. Немолодой, с живыми глазами и быстрыми, но лишенными суетливости, движениями, он своей одеждой — шляпа, сапоги, синяя тужурка — явно нарушал заводской стандарт. Он заговорил со мной. Это не был обычный, незначительный разговор случайно встретившихся людей, но полная интереса и вызывающая массу новых мыслей беседа. Он хотел знать обо всем, увиденном мною в Америке, но очень скоро мне стало ясно, что этот человек, никогда не покидавший России, угадал и уже знал все то, с чем я столкнулся в Новом Свете, и притом четче, яснее, чем я.

Свойство мечтать — участь молодых и не стареющих умов... Михаил Константинович Курако был одним из таких нестареющих умов...

Мы рисовали себе необычные заводы на русской земле. Взволнованная, разгоряченная фантазия уносила нас в сказочную страну технических чудес, где все механизировано, где процесс у домен точен как часы,

М. К. Курака.

Мемарыяльная дошка М. К. Кураку ля прахадной Днепрапятроўскага металургічнага завода імя Г. І. Пятроўскага.

а люди у горнов могут не бояться никаких неожиданностей.

Формирование молодого инженера, специалиста в той или иной области, начинается в учебном заведении, когда переходят к изучению специальных предметов, и на заводе, когда молодой инженер делает первые шаги к практической деятельности.

В этом отношении мне повезло. В институте и на заводе у меня были два прекрасных учителя, о которых я сохраняю самые лучшие воспоминания. Люди совершенно не похожие друг на друга по внешности, они имели очень много совершенно одинаковых черт.

Первый из них — профессор металлургии Василий Петрович Ижевский, один из тех работников науки, которые ищут возможно большей свези с практикой...

Другой... не был инженером, не имел никакого диплома. Но большой мастер-практик, он обладал знаниями и широким житейским опытом.

По внешнему виду Курако являлся прямой противоположностью Ижевскому. По внутреннему же подходу к работе, к своим ученикам, оба они были совершенно схожи. Они никогда не теряли своих учеников из виду...

О людях они оба судили не по одному какому-нибудь качеству, а по всей совокупности качеств. Это был подход своеобразной психотехники, разумной, правильной, доступной только крупным и умным учителям, к каким, несмотря на свою скромность и незаметность, принадлежал Василий Петрович.

То же и с Константинычем, как мы называли Курако. Его школу прошло множество инженеров, доменщиков, мастеров, горновых, молодых директоров...

Обычный мастер старого времени был самым противным существом. Это был человек, который знал дело детально, но не способен был к глубокому анализу — почему и от чего все происходит. Он знал, что работу нужно делать именно так, а не иначе. В лучшем случае он сообщал лишь кое-кому секреты своего умения, обычно же он никому ничего не говорил, считая их своим капиталом.

Такими мастерами был забит весь Донбасс, весь Урал. Эти люди никаких усовершенствований в металлургию внести не могли. Не могли они также принести никакой пользы и являлись объектом длительной эксплуатации со стороны иностранцев.

Очень редко встречались такие мастера, которые передавали свои знания, которые сами учились и учили других. К такого рода людям относился Курако. Он любил учить и любил учиться у тех, кого учит, потому что мы давали ему теорию, а сам он давал нам практику жизни, практику дела.

Несмотря на совершенно разные силы Василия Петровича Ижевского и Курако, можно сказать, что лозунг у них был один и тот же: ближе к жизни! У профессора Ижевского, например, было выражение, что учиться надо всю жизнь, учеником же надо быть возможно меньше. Курако говорил: «Тот не инженер, кто через полтора года не может быть начальником цеха. Это — не сменный инженер, это — просто бессмысленный инженер».

Оба они, таким образом, совершенно одинаково определяли пригодность человека к той или иной работе. Оба они строго относились к делу, каждый по-своему, несмотря на то, что одного из них — Ижевского, скромнейшего из всех профессоров,— никто, кроме его служителя Данилы, не боялся, перед Курако же, якобы страшным, когда он гневался, трепетали не только его подчиненные, но и кое-кто повыше.

Формула жизни была у них одна и та же. Оба они любили повторять, что инженеру нужна не только голова, но и руки.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРАКУРОРА МАГІЛЁЎСКАГА АКРУГОВАГА СУДА АБ СХОДЗЕ СЯЛЯН У В. КАЗЕЛЬСКАЯ БУДА, ЯКІ СКЛІКАЎ МІХАІЛ КУРАКА

Прокурор Могилевского окружного суда сообщал прокурору Киевской судебной палаты, что землевладелец Михаил Курако, крестьянин Емельян Горелый, крестьянин Алексей Макаренко, крестьянин Василий Тарабанов 6 августа 1906 г. в д. Козельской Буде, Чериковского у. перед толпой собранных из окрестных деревень крестьян произносили речи противоправительственного содержания, убеждали крестьян не платить податей и не давать правительству новобранцев... Собрав толпу местной крестьянской молодежи, они в своих речах призывали к ниспровержению властей. Свидетели Кухаревы подтвердили это. Обвиняемые виновными себя не признали...

ЦДГА Украіны ў Кіеве, ф. 317, воп. 1, спр. 3670, л. 1—3.

На зары рэвалюцыйнага руху ў Чэрыкаўскім павеце

Калі ў Чэрыкаве ўзніклі рэвалюцыйныя гурткі і хто ўваходзіў у іх састаў, дакладна невядома. Пакуль што не знойдзены канкрэтныя дакументальныя даныя. Аб падзеях рэвалюцыйнага напрамку ў павятовым цэнтры можна меркаваць толькі па ўспамінах яго ўдзельнікаў Эртмана і І. Л. Злотніка. Гэтыя ўспаміны надрукавалі «Известия Гомельского губернского комитета РКП» у 1923 і 1924 гадах. Яны прыводзяцца з нязначнымі скарачэннямі, поўнасцю захаваны стыль аўтараў. З першых вуснаў чытач мае магчымасць даведацца аб пачатку рэвалюцыйнай барацьбы ў Чэрыкаве, аб метадах яе вядзення, удзельніках, іх поглядах і прыхільнасцях.

З успамінаў Эртмана

Зарождение революционного движения в Чериковском уезде восходит к 90 гг. прошлого столетия.

Как и в других подобных ему по своему экономическому развитию уездах, предпосылками для распространения революционных идей, их восприятий, возникновения партийных организаций явились национальный гнет царизма... и помещичий гнет над крестьянством.

Правда, экономическая среда — отсутствие какой бы то ни было промышленности (если не считать нескольких мелких предприятий) и отсюда — промышленных рабочих — накладывала и не могла не наложить на зарождавшееся движение специфический отпечаток и делало медленным темп развития революционной работы, которая все же развивалась...

В марте 1897 года в гор. Чериков были сосланы в наказание за революционную деятельность три товарища — участники забастовки в Витебской губернии. Один из них — студент Гохберг, остальные два — рабочие слесари, Баркан и Блитчейн, которые устроившись на работе в кузнице М. Шпунта по Пропойской улице, стали развивать агитационную работу, пользуясь различными методами и способами.

Сорганизовав в этом же году «первую еврейскую рабочую школу» (так она была названа) и укомплектовав ее из рабочих подростков беднейшей части населения, упомянутая выше тройка энергично повела в стенах школы агитационную работу, для которой ученики-рабочие подростки представляли довольно хорошую почву. Однако эта работа не долго велась. Просуществовав всего несколько месяцев, школа бы-

ла закрыта предусмотрительными властями, пронюхавшими о том, что она носит политический характер.

С закрытием школы, однако, революционная работа тройки не прекратилась. Ее усилиями был создан комитет помощи подросткам; целью этого комитета было оказание содействия рабочим подросткам в устройстве их на работу у предпринимателей. Комитет существовал на отчисления от населения, проходившие под разными лозунгами. Кроме того, эта же тройка вела среди подростков, которых было до 45 человек, общеобразовательную работу, организовав своего рода вечерние курсы. На этих курсах рабочие-подростки проходили политэкономию и другие социально-общественные науки. Возрастной состав обучавшихся был от 15 до 25 лет. Первые курсы были открыты в мае месяце 1898 года в доме Белохвостова на квартире землемера Рапопорта...

Вторые курсы были в доме сапожника Ф. Кагана (Глухой пер.). Занятия производились после 14-ти часового рабочего дня, с 10 до 12 часов ночи. Занятия курсов производились и подпольно и открыто, но чуткое полицейское управление почувствовало, что в курсах есть что-то недоброе, и начало тормозить их работу, зная, что таковыми руководит также тройка.

Полицейское управление предъявило товарищам самые строгие требования. Они должны были три раза в день являться в полицейское управление. Этим самым их лишили возможности вести плановую работу. Наконец, в начале 1899 года... все трое товарищей были арестованы и содержались под стражей при местной полиции в течение двух месяцев (март — апрель).

Рабочие подростки, получившие уже от своих учителей некоторые понятия и представления о партиях, их задачах, начинают организовываться. В 1900 году, приблизительно в феврале месяце, под руководством той же тройки создается комитет из рабочих под названием «Коллектив».

Комитет состоял из 10 человек... Работа комитета заключалась в распространении литературы, организации забастовок... Хотя эта работа и не дала определенных результатов, но толкнула рабочих... на мысль о борьбе за освобождение от эксплуатации.

Такая работа комитета продолжалась до 2-го съезда РСДРП. Комитет поддерживал связь с Полесским комитетом РСДРП, откуда получалась литература: издания Женевской группы под редакцией Плеханова, книги по аграрному вопросу... Комитетом распространялись прокламации. Так была распространена прокламация под заголовком «Рабочий к солдату». Литература распространялась по нарядам исключительно по г. Черикову, в особенности по синагогам.

Прокламации расклеивались по столбам.

К этому времени истек срок ссылки тройки, которая,пробыв в Черикове пять лет, уехала обратно в Витебскую губернию...

В скором времени в Черикове появляется целый отряд товарищей (1903 г., август, сентябрь) из разных сторон России..., Левина, Вэрштейн, Блюман, М. Каган, которые стали продолжать дело тройки. Комитет находился на Краснопольской улице в доме Рысина, там происходили его заседания... В конце 1903 года в октябре месяце было созвано общее собрание в 3—4 верстах от г. Черикова по Пропойскому шоссе, по Краснопольской дороге, в ямах. Целью этого собрания были перевыборы коллектива. Председательствовал Левин. Комитет был переизбран. В состав его вошли большинством голосов: Эртман, Аскинази — чу-

лочница... Песин — колесник, Левин, Халинская Берта — портниха, П. Душкин — портной, Р. Каган — чулочница. Комитету был дан наказ связаться с м. Кричевом и Краснопольем.

На собрании присутствовало около 50-ти человек, и продолжалось оно всего 15 минут. Собирались по одиночке и по известным паролям, охраняли собрание рабочие патрули. Собрание проводилось ночью. Президиум Комитета был избран в составе 3-х товарищей Левина, Эртмана и Ф. Аскинази...

Требование «Бунда» на 2-м съезде нашли живой отклик у Чериковской организации с.-д., и в марте 1904 г. Чериковская организация перешла в «Бунд»...

В это время в России происходили забастовки рабочих, волна докатилась и до Черикова. В Чериков стали стекаться товарищи с различными взглядами, как, например, Б. Берлин — «Бунд», Исаак Дворкин, ныне исключенный из РКП — тогда (социал-демократ), меньшевик Веселый С. С. (ныне в Америке), Воронов — эсер... Эти товарищи, связавшись с комитетом «Бунда», вошли в общую организацию.

Для руководства политической борьбой с самодержавием было создано руководящее ядро под названием «Коалиционный комитет», состоящий из следующих товарищей: Воронов (эсер), Левин (бундовец), Молочников (с.-д. меньшевик), Гербштейн (с.-с.).

Вскоре началась борьба фракций, которая зачастую выливалась в «боевые» столкновения...

В 1905 году организация «Бунд» начала раскалываться на отдельные группировки, принадлежащие к различным партиям. Во главе группы бундовцев стоял Левин, меньшевиков — Молочников, с.-с.— Веселый и с.-д. большевиков — студент из Харькова (фамилия мне неизвестна).

На заседании «Коалиционного комитета» в августе 1905 г. в помещении Кругликова было принято постановление перенести всю тяжесть работы в деревню. Была выделена группа пропагандистов от всех организаций в количестве 4-х человек, которые были прикреплены к определенным районам.

Разразившиеся через некоторое время в Чериковском уезде грандиозные крестьянские бунты дали знать о результатах работы...

Известия Гомельского губернского комитета РКП. 1923. № 58. С. 87—90.

З успамінаў І. Л. Злотніка

...К революционному движению я примкнул с 1904 года, поэтому я, опуская рассказ до 1904 года, постраюсь осветить события с 1904 года.

Наиболее интересными моментами экономической борьбы являются забастовки чулочниц и портных.

В Черикове довольно широко было развито чулочное производство, организованное по системе мануфактуры со всеми качествами и прелестями «потогонной системы».

Владелец чулочной мастерской Инденбаум имел у себя на дому до 75 вязальных машин с количеством рабочих до 200, причем большую часть составляли подростки, которые выполняли вспомогательные работы. Кроме упомянутых 75 машин, у него работало еще до 200—300 машин в домах работниц... причем они были разбросаны не только в гор. Черикове, но и в ближайших местечках и деревнях; поэтому снятие с работы 75 человек... не приостановило бы жизни чулочного производства: материал поступал бы от одиночек, и забастовка была бы обречена на неудачу.

Таким образом, центр внимания следовало перенести на одиночек.

А они представляли из себя небла-

гоприятный материал по многим соображениям:

1) работавшие в предприятии были классово более развиты и организованы;

2) одиночки подвергались влиянию родителей. Были случаи, когда сознательная одиночка хотела бастовать и бастовала, но отец, чтобы не казаться неблагодарным «благодетелю», разделывался со своими дочками-«демократками», кто плетью, кто рукоприложением.

Заработная плата была весьма низкая — 10 копеек за дюжину чулок... одни иголки... стоили половину этого. Сырой материал — нитки — предприниматель выдавал по весу и принимал по весу чулки; разбежки между весом были неизбежны, все это засчитывалось за счет работниц, в массе своей безграмотных.

При такой обстановке организация забастовки представляла собой колоссальные трудности: надо было снять работниц, работавших в предприятии непосредственно, следить более чем за 75-ю одиночками в Черикове, за одиночками в Кричеве, Краснополье, Малятичах и других местечках.

Забастовка длилась более 2-х недель и окончилась победой.

Интересны некоторые приемы.

Явиться к предпринимателю с предъявлением требований, не замаскировавшись, было несколько опасно: раньше или позже он мог выдать полиции. Но еще труднее было вести переговоры с «отцами» и одиночками.

Извещения и предупреждения посылались одиночкам через... окно.

Записка привязывалась к камешку и вечером бросалась в комнату через окно, а для возмещения убытков за разбитое стекло прикладывался к записке гривенник.

В этой забастовке не пришлось применять методов экономического террора, зато при проведении забастовки портных мы широко этот метод практиковали.

Забастовка портных была очень упорная, продолжалась не менее 2-х месяцев, если память мне не изменяет.

Террор заключался в том, что у хозяев выламывались окна, причем каждому хозяину воздавалось по определенной пропорции, в зависимости от его упорства.

Организация самообороны произошла весьма своеобразно, и это настолько характерно для тихих местечек, что считаю не лишним рассказать о ней.

Погромная волна в 1905 году разлилась широко по стране, тревожное настроение передалось в Чериков.

Ждать погрома от местных жителей нельзя было: слишком тесно и согласно жили; воображение создавало фантазии, что партия «хулиганов» идет из Гомеля, в другой раз эта партия шла со стороны Кричева...

Стало очевидным, что самооборона необходима. Начали договариваться. На одной стороне — революционные организации, на другой — обывательская молодежь...

Мы решили действовать по-революционному: подсчитали, какая сумма денег потребуется, разложили эту сумму на отдельных граждан и приступили ко взысканию «контрибуции».

Подавляющая часть населения по первому предъявлению вносила назначенную сумму. Максимальный налог был 10 рублей.

Наиболее зажиточные семьи, числом примерно 8—10, отказывались. На них нужно было воздействовать.

К упорствующим приходила организованная группа человек до 40. Старший ставил условия: или деньги, или ночуем. Начинался торг, перебранка, тогда парни вынимали по

пачке махорки и закуривали. Махорочный дым влиял.

Таким путем была собрана нужная сумма, закуплено было оружие — 40 централок, 5 браунингов и достаточное количество патронов, которое пишущий эти строки привез из Могилева через Гомель в Чериков.

Дорога из Могилева в Чериков буквально была «засыпана», полиция следила, обыскивала дилижанс, так что пришлось окружным путем доставить этот багаж.

Не приходится говорить, что оружие хранилось у «организаций»: у каждой — «с.-с» и «Бунд» — в равных частях.

Сейчас Чериков представляет из себя захолустье, лет 18—19 тому назад еще больше.

Широкая волна революционного движения захватила нас только своим краешком.

Газеты получались на 4-й день (от железной дороги на 80—100 верст), так что реагировать на общие политические явления страны мы не всегда могли; информация о событиях получалась поздно.

1-е мая мы праздновали вместе со всем пролетариатом, и это было нашей гордостью.

Учебных заведений в Черикове было 2, начальное еврейское училище и «городское училище». В 1906 году старшие группы были настолько революционно настроены, что затеяли забастовку... на почве академических вопросов...

Требования заключали в себе чисто академические и бытовые вопросы школы... По изложении требований большинство их было выполнено...

Весь выпуск того года пошел из революционных соображений в народные учителя, за небольшим исключением. Ученики, уезжавшие в отпуск на каникулярное время, отвозили нелегальную литературу в деревню.

Немалую роль в деле поднятия классового самосознания и развития сыграла библиотека, которая в течение целого ряда лет существовала, как нелегальная...

Полицейский гнет был настолько силен, что не давал возможности легализовать библиотеку.

Невзирая на это, мы для подкрепления фонда библиотеки устраивали лотереи, многолюдные собрания, использовали «буржуазную интеллигенцию» и ее квартиры.

Известия Гомельского губернского комитета РКП. 1924. № 63—64. С. 92—94.

Юбілей вучылішча

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваюцца матэрыялы, прысвечаныя Чэрыкаўскаму народнаму вучылішчу. З гэтых матэрыялаў мы даведваемся, што Чэрыкаўскае народнае вучылішча пачало сваю дзейнасць у 1790 г. Першымі настаўнікамі былі прызначаны Фёдар Баравік і Васіль Антонавіч Кубліцкі-Піотух. На ўтрыманне вучылішча дзяржава выдзяляла 500 р. у год, з іх на аплату настаўнікам — 180 р. На сродкі гарадской думы была куплена мэбля для класаў і кватэр настаўнікаў. Да 1837 г. хлопчыкі і дзяўчынкі вучыліся разам, потым для дзяўчынак была арганізавана асобная змена. З 1837 г. Чэрыкаўскае вучылішча стала павятовым народным вучылішчам.

1 верасня 1890 г. быў урачыста адзначаны 100-гадовы юбілей вучылішча. Да свята быў падрыхтаваны гістарычны нарыс аб дзейнасці вучылішча. У нарысе адзначалася, што ўзровень адукацыі ў вучылішчы вельмі высокі. Дзеці шляхты і чы-

ноўнікаў нават да заканчэння курса маглі паступіць у гімназію, а дзеці падатковага саслоўя маглі ўладкавацца на працу ў розныя дзяржаўныя ўстановы. У дзень святкавання юбілею будынак вучылішча ўпрыгожылі. На франтоне сярод вянкоў з жывых кветак віднеліся лічбы: 1790—1890. Класныя пакоі прыбралі з яшчэ большай раскошай. Сцены пакрылі гірляндамі з зеляніны і кветак. Партрэт Гасудара абрамілі вялікім вянком. Свята выклікала цікавасць у жыхароў горада. Класы былі запоўнены публікай, значная частка якой з-за недахопу месца вымушана была заставацца на вуліцы. Спачатку пан дырэктар вучылішча выступіў з прамовай, потым святкаванне працягвалася па наступнай праграме: малебен, некалькі вучняў прачыталі вершы. Па заканчэнні ўсіх прысутных запрасілі на снеданне. У час снедання былі прапанаваны тосты: «за здароўе Гасудара Імператара», «за пана Міністра адукацыі» і інш. Тосты суправаджаліся адзінадушным «Ура!». У гонар юбілею гарадская дума выдзеліла 125 р., на якія вучылішча павінна было набыць ікону, а на ахвяраваныя прысутнымі на святе 19 р. 80 к. купілі ласункі для вучняў, а тым вучням, што чыталі вершы, далі па 1 р.

С. Грынкевіч.

Кнігадрукаванне ў Чэрыкаве

У зводным каталагу «Кніга Беларусі. 1517—1917» спецыяльны раздзел прысвечаны кнігам, выдадзеным на тэрыторыі Беларусі на рускай мове. «З'яўляючыся прадукцыяй беларускага кнігадрукавання і, значыць, прыналежнасцю беларускай культуры, адзначаецца ў прадмове да гэтага раздзела зводнага каталагу,— кніга на рускай мове, як і на беларускай,— каштоўная крыніца для вывучэння шэрагу важных праблем гісторыі развіцця грамадскай і навуковай думкі Беларусі...»

Як вядома, беларуская кніга, у тым ліку і на рускай мове, прайшла складаны шлях развіцця. Так, у гісторыі кнігавыдання XIX — пачатку XX ст. правамерна вылучыць 2 перыяды: дарэформенны (1801—1860) і парэформенны (1861—1917). Калі па першаму перыяду мы не можам нічога сказаць пра кнігавыдавецкую справу ў былым Чэрыкаўскім павеце, дык па другому — малюнак больш дакладны. У нагаданы перыяд кнігі на рускай мове друкаваліся ў 39 гарадах і мястэчках, у тым ліку і ў Чэрыкаве. Калі ў XVIII стагоддзі на рускай мове выдавалася 11 кніг, у першай палове XIX ст. 29, то за перыяд з 1861 па 1917 гады іх колькасць узрасла да 6508.

У гэты перыяд Чэрыкаў становіцца чацвёртым горадам у Магілёўскай губерні па колькасці выдадзеных кніг — 16 (19 — Орша*, 29 — Горкі, 17 — Мсціслаў).

Першыя друкаваныя рэчы тут з'явіліся яшчэ ў канцы XIX ст. Гэта былі «Устав Мстиславского общественного собрания» (1892) і «Инструкция для действительных членов и должностных лиц Мстиславского добровольного пожарного общества» (1895). Апошняя была надрукавана ў друкарні Д. М. Падземскага.

Пачатак XX ст. стаў новым этапам у разгортванні выдавецкай справы ў Чэрыкаве. У 1907—1910 гг. у Чэрыкаве дзейнічала друкарня З. М. Каганава, у якой былі надрукаваны: Агроськін Г. Е. «Таблица для вычисления кроквы, полукроквы, латы и полулаты в поры»; Захарэвіч І. «О городском самоуправлении»; а такса-

* Орша на той час уваходзіла ў склад Магілёўскай губерні.


ИНСТРУКЦІИ
ДЛЯ ДѢЙСТВИТЕЛЬНЫХЪ ЧЛЕНОВЪ И ДОЛЖНОСТНЫХЪ ЛИЦЪ
МСТИСЛАВЛЬСКАГО
ДОБРОВОЛЬНАГО ПОЖАРНАГО
ОБЩЕСТВА.
Типографія Д. Н. Подземскаго
ВЪ Г. ЧЕРИКОВѢ.
1895.

ПРАВИЛА
благоповеденія для
воспитанниковъ
Мстиславскаго
духовнаго училища.
Г. ЧЕРИКОВЪ.
ТИПОГРАФІЯ З. М. КАГАНОВА.
1910

Такія кнігі выдаваліся ў Чэрыкаве.

ма «Правила благоповедения для воспитанников Мстиславского духовного училища» і інш.

У гэты ж час тут пачынае выдавацца мастацкая літаратура. Так, у 1907 г. у Чэрыкаве, у друкарні З. М. Каганава былі выдадзены кнігі С. К. Тоўсціка «Жизнь во вселенной, познаваемая и постигаемая человеком» і вершы Марціна Маластоўскага «Духовные мотивы».

Адначасова з друкарняй З. М. Каганава ў Чэрыкаве існавала выдавецтва кніжнага склада Ш. Іофе.

У адной з гэтых устаноў у 1910 г. была выдадзена кніга ўжо нагаданага Сцяпана Канстанцінавіча Тоўсціка «Мысли и советы».

У пазнейшы час у Чэрыкаве друкаваліся каштарысы даходаў і расходаў Чэрыкаўскага павятовага земства Магілёўскай губерні (1912—1916), справаздачы павятовай земскай управы (1912—1916) і інш.

Сёння амаль што ўсе гэтыя выданні з'яўляюцца бібліяграфічнай рэдкасцю і маюцца толькі ў архівах, музеях, кнігасховішчах і публічных бібліятэках Масквы, Санкт-Пецярбурга.

А. Ярохін.

Яго вершы выдаваліся ў Чэрыкаве

У час збору матэрыялаў для кнігі «Памяць» маю ўвагу прыцягнула паведамленне, надрукаванае ў зборніку «Кніга Беларусі», што ў пачатку XX ст. у Чэрыкаве было выдадзена некалькі зборнікаў вершаў

Мартына Рыгоравіча Чарнова. Асаблівую цікавасць выклікаў псеўданім аўтара — Мартын Маластоўскі. Як вядома, у Чэрыкаўскім павеце існаваў населены пункт Маластоўка. Падумалася — мабыць, тут існуе якая-небудзь сувязь? Можа,яна і дапаможа знайсці патрэбныя звесткі пра невядомага сёння паэта,. яго творчасць?! На жаль, і ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь і ў бібліятэках не ўдалося адшукаць ніякіх біяграфічных звестак пра паэта. У зборніках вершаў М. Р. Чарнова, якія зараз захоўваюцца ў бібліятэках Масквы і Санкт-Пецярбурга і якія давялося прачытаць толькі з мікрафільмаў, гэтыя даныя таксама адсутнічаюць. Праўда змест некаторых радкоў даў падставу меркаваць, што аўтар пэўны час знаходзіўся на валасной службе:

...Хоть клясться, право, непристойно,
Но здесь клянуся головой;
Нет службы боле неспокойной
Как нынче службы волостной...

Ёсць некаторыя звесткі і аб яго сямейным становішчы, пры ўмове, што гэта прызнанне зроблена шчыра:

Мои советы исполняйте,
Но мне, добрейшие друзья,
Вы в холостьбе не подражайте,—
Скажу причину после я...

Вось і ўсё, што ўдалося даведацца.

Сёння нам вядомы толькі два зборнікі вершаў Мартына Маластоўскага. Яны ўбачылі свет у тыпаграфіі З. М. Каганава, што знаходзілася ў Чэрыкаве. Адзін з іх — «Духовные мотивы» — выдаваўся двойчы. Першы раз у 1907 г. Але пазнаёміцца давялося толькі з другім яго выданнем, датаваным 1912 г. Гэту кнігу М. Р. Чарноў прысвяціў памяці свайго брата настаўніка Івана Рыгоравіча Чарнова. Другі зборнік быў выдадзены ў 1911 г. і называецца «Интимное послание к друзьям». У ім мы і знайшлі прыведзеныя вышэй звесткі. Большасць вершаў, якія ўвайшлі ў гэтыя дзве кнігі, раскрываюць рэлігійныя пачуцці аўтара («Ангел», «Молитва», «Рай и ад», «Душа», «Пред иконою Девы Марии», «Православный храм» і г. д.), ёсць таксама і такія, што адлюстравалі яго адносіны да адмены прыгоннага права і да цара Аляксандра II («19 февраля», «Заря»), у некаторых змяшчаюцца парады сябрам, зробленыя ў жартоўнай форме. Нямала ўвагі М. Р. Чарноў удзяляе і такой бессмяротнай тэме, як вера, надзея, каханне. Дае аўтар і некаторыя звесткі, для нас асабліва цікавыя: пра норавы, панаваўшыя ў той час сярод некаторых жыхароў павятовага цэнтра, на нашу думку,— Чэрыкава, і аб заработку, які атрымлівала частка службовых людзей. Далей мы прапануем некаторыя яго вершы. Упершыню за многія дзесяцігоддзі чытачы маюць магчымасць азнаёміцца з імі.

Са зборніка «Духовные мотивы»

Православный храм

Приют духовной ты отрады,
Надежда веры ты святой,
Святая просьба ты отрады,
Стоишь высоко ты главой!
В часы душевного страданья
В тебе покой я находил;
В минуту с верой упованья
Ты мне просимое дарил.
Люблю тебя, о храм всеславный,
Люблю, что свято исполнял
Тот символ Церкви Православной,
Который Бог Сам завещал...
Ты, Церковь, свой обряд заветный
Хранить, решив о том вопрос...
Гордись! Ея глава несмертный,
А Божий Сын, Господь Христос!
Хранить тебя, как предки, будем,
Готовы жизнию дарить.
И посвященьям не забудем
Молитвы Господу взносить.

19 февраля

— Отчего сегодня, тятя,
Много так собралось в храме

И усердно молят Бога,
Как и ты молился сам.
Александра имя часто
Все в молитвах говорят.
«Упокой Его наш Боже»
Умилительно твердят?..
— Много лет уже минуло,
Как рабами были мы,
Как народ наш хлебопашен
Жил в цепях неволи-тьмы.
Александр наш Царь Великий
Цепи рабства разорвал...
Свет учения, свободу,
Землю, волю Он нам дал!
Оттого сегодня, детка,
Богу молятся с утра
И в молитвах поминают
Имя доброго Царя.
И младенец прослезенный
Ручки набожно сложил,
И молитву пред иконой
За Царя он сотворил.

Са зборніка «Интимное послание к друзьям»

Прошу, друзья, у вас прощенья
И всех знакомых мне девиц,
Но нынче мало так влеченья
Святой любви... в обоих лиц...

Теперь расчеты, положенье
И деньги главный идеал;
За то обычное явленье —
В семье гостит всегда скандал.
Я «Две любви» роман готовлю
И в нем с любовию святой,
Я вас, о други, познакомлю,—
С ея великой чистотой.
А до того, друзья дрогие,
Совет, позвольте, преподать:
Оставьте помыслы лихие
Побольше приданного брать!
Женитесь с чувством, расстановкой
И только по святой любви,
Проверив сердцем и головкой
Все чувства нежные свои.
Что может быть ея милее
В наставшей жизни трудовой?
И чем она в жене милее
Тем мужу легче жизни бой...
Женитесь вовремя, порою,
Чтоб жизни вкус не потерять.
Чтоб не была жена чужою;
Чтоб чрез нее не пострадать.

* * *

Иной жениться уж мечтает,
Коль служба чуть на стол дарит.
Другой и двести* получает —
Жениться вовсе не спешит.

С. Кагадзеева.

Ці быў такі музей?

Як вядома, адпаведна ўказу Сената ад 14 лютага 1911 г. у заходніх губернях, у тым ліку і ў трох беларускіх — Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай — былі ўтвораны земскія ўстановы — губернскія і павятовыя земскія сходы і ўправы. У Расіі земствы як органы мясцовага самакіравання былі ўведзены паводле рэформы 1864 г. Яны займаліся мясцовымі гаспадарчымі справамі: развіццём гандлю, земляробства, прамысловасці, будаўніцтвам і ўпарадкаваннем дарог. Акрамя гэтага ў кола іх інтарэсаў уваходзіла пачатковая асвета, медыцынскае абслугоўванне, развіццё шляхоў зносін, пошты і г. д.

Земствы цалкам падпарадкоўваліся мясцовым органам царскай улады. Галоўнай крыніцай даходаў земстваў былі падаткі з нерухомай маёмасці, так званыя грашовыя павіннасці, якія ішлі на ўтрыманне адміністрацыйна-судовых і земскіх устаноў, школ, лякарняў і г. д. Сяляне выконвалі пераважна натуральныя земскія павіннасці: будавалі і папраўлялі дарогі і масты, выстаўлялі фурманкі, забяспечвалі кватэрамі войскі, адбывалі паштовую павіннасць.

Праглядаючы «Каштарысы даходаў і расходаў на павятовыя земскія павіннасці па Чэрыкаўскаму павету Магілёўскай губерні на 1914 год», у тлумачальнай запісцы да іх, прадстаўленай Чэрыкаўскай Павятовай Земскай Управай трэццяму чаргова-

* Конечно, рублей в месяц (Прим. М. Молостовского).

му Павятоваму земскаму з'езду, я сустрэў такі запіс: «§ XI. Па гэтаму параграфу згодна маючых дакладаў Управы ўнесены новыя асігнаванні... на абсталяванне і ўтрыманне тэлефоннай сеці 16 177 рублёў, на ўтрыманне аўдыторыі і музея імя М. Ю. Лермантава 55 рублёў».

Далейшае азнаямленне з дакументамі паказала, што яшчэ 16 верасня 1913 г. (другі год існавання Земскай Управы) яна ўжо ўносіла прапанову выдзеліць у якасці ахвяравання 25 руб. на абсталяванне аўдыторыі і адкрыцця музея памяці М. Ю. Лермантава, але земскі сход павысіў гэтую суму да 55 руб.

Цікава адзначыць і такую дэталь. Гэты ж сход зацвердзіў на 1914 г. 800 руб. на ўрачыстыя ўшанаванні гістарычных падзей і правядзенне свят, звязаных з імі.

Застаецца пытанне, ці існаваў такі музей у Чэрыкаве, ці яго толькі спрабавалі стварыць.

А. Ярохін.

Манетныя скарбы Чэрыкаўшчыны

Тэрыторыя Магілёўшчыны, у тым ліку і Чэрыкаўшчыны, багата на манетныя скарбы — грашовыя каштоўнасці, схаваныя ў тайніках. Першымі збіральнікамі старажытных манет на Беларусі былі М. П. Румянцаў і І. Ф. Пяскевіч, якія стварылі ў Гомелі вялікія нумізматычныя калекцыі.

У другой палове XIX ст. рэгістрацыя і хаванне манетных знаходак пераходзіць ад прыватных збіральнікаў да дзяржаўных устаноў. З таго часу на Магілёўшчыне было выяўлена больш за 200 манетных скарбаў з антычных часоў да XIX ст.

Найбольш значная калекцыя манетных скарбаў належала былому музею пры Магілёўскім губернскім Статыстычным камітэце (1867—1919). Ён меў у прыватнасці калекцыю манет Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага XVI — XVII ст., а таксама арабскіх і заходнееўрапейскіх, рускіх асігнацый пачатку XIX ст. У нагаданую экспазіцыю ўваходзіла і частка скарбаў, якія былі знойдзены на Чэрыкаўшчыне.

Пошукі манетных скарбаў на тэрыторыі Магілёўскай вобласці працягваюцца да нашых дзён.

Найбольш значныя скарбы на Чэрыкаўшчыне былі знойдзены: у былой в. Баханы ў 1835 г.— 13 экз. сярэбраных талераў; у в. Горкі ў 1925 г.— сярэбраны пфенінг, схаваны ў XI ст., у в. Лабанаўка ў 1886 г.— сярэбраныя талеры Іспанскіх Нідэрландаў, схаваныя ў XVII ст.; у в. Лобча ў 1902 г.— 155 экз. сярэбраных чвэрцьталераў, паўталераў і талераў Іспанскіх Нідэрландаў, талераў Злучаных Правінцый, схаваных у 1672 г.; у в. Вохар у 1915 г.— 92 экз. сярэбраных грошай Чэхіі, схаваных у XV ст.; у в. Вудага ў 1927 г.— 236 экз. розных манет, схаваных у XVI ст.

Геаграфія знойдзеных манет адлюстроўвае багатыя міжнародныя сувязі продкаў сучасных чэрыкаўлян.

А. Ярохін.

З архітэктурнай спадчыны

Слоўнік некаторых тэрмінаў, якія сустракаюцца ў тэксце

КАНСОЛЬ — выступ у сцяне для падтрымкі некаторых частак будынка (карніза, балкона і інш.) або для ўстаноўкі на ім скульптур.

ЛЮКАРНА — невялікі аконны праём на даху, купальным пакрыцці, тымпане франтона або шчыта будынка.

ПАРТАЛ — архітэктурна афармлены галоўны ўваход у вялікі будынак.

РЫЗАЛІТ — частка будынка, якая выступае спераду і ідзе на ўсю яго вышыню.

ТЫМПАН — трохвугольнае поле франтона з жывапіснымі і скульптурнымі ўпрыгожваннямі.

ФРАНТОН — трохвугольная або цыркулярная верхняя частка фасада будынка, абмежаваная схіламі даху і карнізам.

ШАЛЁЎКІ—накладныя планкі вакол акна, дзвярэй.

ЭПОХА ЭКЛЕКТЫКІ — час, калі змешваліся ў адным будынку розныя стылі, запазычваліся формы і дэкор стылей папярэдніх эпох.

Сёння нам цяжка ўявіць архітэктурнае аблічча раёна ў мінулым, таму што захавалася толькі невялікая частка помнікаў, прадстаўленых пабудовамі сярэдзіны і канца XIX ст. У гэты час у архітэктуры назірала-

Бальніца. Знешні выгляд корпуса тэрапіі.



Бальніца. План будынка корпуса тэрапіі.

Бальніца. Зенітні выгляд корпуса хірургіі.



Бальніца. План будынка корпуса хірургіі.

ся расшырэнне тыпалогіі будынкаў. З'яўляюцца тэатры, музеі, клубы, бібліятэкі, бальніцы. У г. Чэрыкаве захаваліся два старыя корпусы, пабудаваныя ў XIX ст. Гэта часткі бальнічнага комплексу. Абодва будынкі размешчаны на адной лініі і павернуты галоўнымі фасадамі на вуліцу.

Корпус тэрапіі — гэта прамавугольны ў плане аднапавярховы будынак пад двухсхільным дахам. Бакавыя часткі пабудовы фланкіраваны неглыбокімі рызалітамі, завершанымі на фасадах трохвугольнымі франтонамі з люкарнамі ў тымпанах. У адным з рызалітаў знаходзіцца ўваход, упрыгожаны двухсхільным навесам на кансолях ажурнага чыгуннага ліцця. Вуглы выдзелены плоскімі лапаткамі. Фасады прарэзаны высокімі і шырокімі аконнымі праёмамі з шалёўкай.

Корпус хірургіі — аднапавярховы будынак, на плане П-падобнай формы. Архітэктурна-пластычнае рашэнне фасадаў корпуса хірургіі такое ж як і корпуса тэрапіі. Абедзве пабудовы вырашаны ў так званым «цагляным» стылі, які быў распаўсюджаны ў другой палове XIX ст.

У 30—40-я гады XIX ст. на Беларусі пачалі будаваць дарогі новага тыпу — шасіраваныя. У 1843 і

Станцыйны дом у в. Сакалоўка. Знешні выгляд.



Станцыйны дом у в. Сакалоўка. Чыгунныя ажурныя кансолі каля былога ўвахода.

1846 гг. у Расіі распрацоўваліся «ўзорныя» праекты станцыйных дамоў, якія будавалі каля шасіраваных дарог. У прыватнасці, на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна на былым тракце Масква — Варшава падобны станцыйны дом захаваўся паблізу в. Сакалоўка. Гэта аднапавярховы цагляны будынак пад высокім двухсхільным дахам. Кампазіцыйная трактоўка пабудовы простая і сіметрычная. План — прамавугольнай формы. Фасад, які выходзіць на шашу, выдзелены ў цэнтры рызалітам з нішай у выглядзе стральчатай арачкі. Над уваходам, прарэзаным у рызаліце, навісае казырок на чыгунных ажурных кансолях. Вокны простыя прамавугольныя без шалёўкі. Па вутлах дом планкіраваны прафіліраванымі лапаткамі. У профіль — стральчатая форма. Такія станцый-

Царква ў в. Камаровічы.

ныя дамы маглі будавацца ў формах класічных, «безстылявых». Паштовая станцыя ў Сакалоўцы выканана з выкарыстаннем гатычных элементаў — стральчатая форма профіляў лапатак і нішы.

30—40-я гады XIX ст.— час, калі класіцызм здае свае пазіцыі і наступае шматгранная і складаная эпоха эклектыкі. Аднак у сярэдзіне XIX ст. яшчэ з'яўляюцца будынкі, выкананыя ў стылі класіцызму. Асабліва гэта датычыцца культавых пабудоў, дзе найбольш моцныя традыцыі і змена стыляў адбываецца павольней. Такая пабудова захавалася ў в. Камаровічы. Гэта драўляная праваслаўная царква, пабудаваная каля дарогі на ўскраіне вёскі. Складаецца з традыцыйных чатырох зрубаў. Квадратны ў плане асноўны зруб увенчвае масіўны васьмярык са сферычным купалам. Да асноўнага прымыкае алтарны зруб. Ён прамавугольны, ніжэйшы, чым асноўны, накрыты трохсхільным дахам. Прамежны нізкі зруб злучае зрубы асноўны і бабінца з невысокай аднаяруснай званіцай. Паверхня сцен гарызантальна шалявана і прарэзана паўцыркульнымі аконнымі праёмамі ў неглыбокіх нішах. Над цэнтральнай прамавугольнай формы ўваходнай часткай устроены невялікі трохвугольны франтон на кансолях. У інтэр'еры храма плоскія столі, пад купалам — самкнутае скляпенне. На жаль, элементаў дэкору не захавалася. Далейшы лёс гэтага помніка вызывае трывогу ў сувязі з дрэннай яго захаванасцю.

У канцы XIX ст. на Беларусі з'явіліся так званыя эканамічныя паркі. Такія паркі спалучалі ў сабе рысы рэгулярнага і пейзажнага парку і разбіваліся каля памесцяў. Рэгулярная частка ўключала пладовы сад і алеі. Захаваліся такія паркі ў вёсках Вепрын і Юдаўка.

Парк у в. Вепрын быў разбіты ў маёнтку памешчыка Васілеўскага ў канцы XIX ст. Дом не захаваўся, а парк размешчаны на раўніннай тэрыторыі ў 10 га, праз якую па дыяганалі праходзіць глыбокі прыродны роў, заросшы арэшнікам і дубам. Цэнтральная ліпавая алея падзяляе парк на дзве часткі: усходнюю — з пладовым рэгулярным садам і заходнюю — пейзажную. На поўначы пейзажнай часткі знаходзіўся некалі панскі дом, вакол якога былі высаджаны кусты бэзу, бружмелю, язміну і акацыі. Ад месца, дзе знаходзіў-



Парк у в. Вепрын. Ліпавая алея.



Парк у в. Вепрын. Схема планіроўкі:
1 — месца, дзе быў сядзібны дом; *2* — парк; *3* — сад; *4* — вадаёмы; *5* — лесапарк; *6* — агароды.

ся дом, адыходзіць пад'язная алея, якая зарасла язмінам і злучае памесце з пас. Маёнтак. За ровам пейзажнай часткі размешчана альтанка з лістоўніцы. У цэнтры раней знаходзіліся агароды. Ад цэнтральнай алеі да рову вядзе арэхавая алея. Яблыневы сад ва ўсходняй частцы абмежаваны па перыметру ліпавымі алеямі, а ў цэнтры сада знаходзіцца

Парк у в. Вепрын.
Куток парку.

Парк у в. Юдаўка. Куток парку.



Парк у в. Юдаўка. Схема планіроўкі:
1 — месца, дзе быў сядзібны дом, *2* — месца, дзе быў млын; *3* — сажалка; *4* — парк; *5* — сад.

альтанка з ліп. У паўночнай частцы сада размяшчаліся парнікі і ружоўнік. На тэрыторыі парку было чатыры штучныя сажалкі: у пас. Маёнтак, на ўездзе ва ўсходнюю алею і дзве на тэрыторыі пейзажнай часткі парку.

У в. Юдаўка на беразе возера захаваліся рэшткі эканамічнага парку, што знаходзіўся ў маёнтку памешчыка Барэйкі. Парк быў закладзены ў пачатку XX ст. на ўзгорыстым рэльефе і займаў прамавугольную тэрыторыю ў 7 га, абмежаваную з поўдня ліпавай, з поўначы і захаду яловымі алеямі, а з усходу — невялікай штучнай сажалкай, якую называюць Юдаўскім возерам. Раздзелены парк на тры часткі: усходнюю, якая ўяўляе сабой вялікі лужок перад домам (не захаваўся). На лужку захаваліся асобныя кусты бэзу, якія некалі раслі абапал алеі, што вяла да возера. На ўсход ад дома рос акацыевы гай, к поўначы размяшчаліся кветнікі. Часткова захаваліся дубы, якія паўкругам абмяжоўваюць плошчу перад домам. Непадалёку ад сажалкі засталася частка ліпавай альтанкі. Заходняя частка парку раздзелена на дзве пад'язной ліпавай алеяй. Створаныя такім чынам участкі былі заняты пладовымі дрэвамі (захаваліся часткова). У паўднёва-ўсходнім кутку саду знаходзіцца круглая альтанка з клёну. У парку высаджаны ліпа, елка, дуб, акацыя, бэз, клён, вольха, яблыня, вішня, серабрыстая таполя.

А. Пятросава.

Вачыма відавочнікаў*

Аб тым, як жылі нашы продкі, напісана многа кніг і артыкулаў. Мы ж паспрабуем заглянуць праз стагоддзі і ўбачыць быт жыхароў Чэрыкаўскага павета вачамі іх сучаснікаў. Перанясёмся ў канец XVIII ст. Нізкія, цёмныя, з бярвення хаты сялян былі ў той час без сянец, складзены ў большасці выпадкаў з дробнага асінавага ці яловага лесу. Хаты знаходзіліся ўнутры двара, які абвудоўваўся хлевушкамі, амшанікамі (асобная хатка для паклажы, без печы—камора, свіран, кладоўка) і адкрытымі павецямі на слупах з плоскімі аднасхільнымі дахамі, крытымі, як і хаты, саломай. Каля сваіх двароў сяляне мелі маленькія агароды. Займаліся яны ў асноўным вырошчваннем хлеба. А. Мейер адзначае, што лепшыя землі для гэтага занятку былі каля м. Студзянец, паміж вёскамі Вепрын і Зоры, каля Камаровічаў, у ваколіцах Крычава.

Сялянскія жонкі летам займаліся жнівом, палявымі і агароднымі работамі, а зімой пралі для гаспадаркі пяньку, а для сябе лён і воўну. З уласнага свайго льну яны ткалі роўныя палотны, якія прадавалі па чатыры, а часам і па 5 капеек за аршын. З воўны ткалі сукно, якое валялі на сукнавальнях і дома фарбавалі ў цёмна-сінюю фарбу. Фарбу выраблялі з пупышак, якія сабіралі вясной з альховых дрэў. Пупышкі варылі з прымессю малой колькасці зробленай з сажы чэрні ці як яе яшчэ тут называлі «сапожного купороса». Паясы ў чорны колер яны фарбавалі пры дапамозе крушынавай кары. Існаваў і другі рэцэпт чорнай фарбы — «из ольховой коры, васильков, купоросу и железных выгорков». Чырвоную фарбу атрымлівалі «из корня луговой марионы, зеленицы, яблоневого листа и травы, называемой ими цветки», а жоўтую — «либо из щелока серьпухи и дрока, либо из яблоневой коры с квасцами, по здешнему — галуном».

Адзенне тутэйшых сялян складалася летам з пяньковых касталанаў ці, па-расійску,— балахонаў, а на пераплеценых аборамі накшталт латышоў нагах насілі яны сплеценыя з аднаго толькі лыка плоскія з петлямі каверзні ці з пяці лык пяцернікі; паверх сваіх касталанаў насілі яны зімою белыя даматканага сукна світы ці пафарбаваныя ў сінюю фарбу кафтаны два разы ў год, гэта значыць вясною і восенню, абстрыгаемай з авечак воўны. Летам сяляне пакрывалі свае галовы валенымі з белай воўны, накшталт рускіх вялікіх ад капелюша туляў, каўпакамі, а зімою, хоць і не ўсе, хадзілі з падвязнымі шапкамі.

Жанчыны летам насілі стракатыя з даматканага сукна панявы і каразейныя фартухі, а зімою — істалты ці безрукаўныя гарсеты. Іх выраблялі звычайна ці з каразеі, ці з даматканага сукна, а падчас з шоўку, абшывалі палатном з кудзельнымі мяшочкамі ці абручом для падтрымкі спадніц, зверху пакрывалі мужчынскімі світкамі. Валасы свае жанчыны плялі ў дзве касы, якія пакрывалі зборнікам з рожкамі, апошнія ўвівалі белаю з чатырох аршын палатнянаю наметкаю, канцы якой пакідалі ззаду, накшталт лопасцяў. Дзеўкі галовы «прыбіралі на яўрэйскі ўзор: запляталі ўверх дзвюма косамі з завязаным наперад бантам; лоб пакрывалі белымі павязкамі з розных тканін, а шыі свае з бабамі нараўне ўпрыгожвалі каралямі, у сярэдзіне якіх навешвалі часам выразаныя з веразубавай гартані костачкі, якія апраўляліся ў медныя

* Падрыхтавана па кнігах: 1. Андрэй Мейер. Описание Кричевского графства или бывшего староства в 1786 г.— Могилевская Старина. Сборник статей Могилевских губернских Ведомостей. Вып. II. Могилев, 1901. 2. Опыт описания Могилевской губернии (Под ред. А. С. Дембовецкого. Могилев, 1882. Кн. 1.

кольцы». У мястэчках жанчыны, якія жылі ў дастатку, адрозніваліся толькі тым, што насілі багатую вопратку і галовы свае адзявалі польскімі чорнымі з плісу ці аксаміту павязкамі. Гэтыя павязкі большай часткаю абшывалі ці шаўковымі карункамі, ці залатою сеткаю і насілі паверх каптура ці старадаўніх рускіх з вушкамі шапачак. Мяшчане адрозніваліся тым, што насілі адзенне на польскі шляхецкі ўзор.

Праз стагоддзе сялянскі двор меў ужо выгляд чатырохвугольніка, адзін бок якога займала хата са свіранам, другі і трэці — надворныя пабудовы, а чацвёрты — агароджа ці прадаўжэнне надворных пабудоў. Хата звычайна была ад 7 да 12 аршынаў даўжынёй і будавалася пераважна з сасновага лесу, а крылася саломай. У 1881 г. «было положено начало обливанию соломы для крытия крыш глиняным раствором, для возможного предохранения от пожаров». У гэты час хата каштавала ад 12 да 25 р., «постройка ея, с различными принадлежностями, от 20 до 25 р.». Значыць, сялянская хата каштавала ад 32 да 50 р. Аднак гэта цана не ўключала, напрыклад, вывазку лесу, моху, гліны на печ, іншыя работы, якія выконваў сам селянін ці яго сям'я. Фасад сялянскай хаты быў простым, без усялякіх упрыгожванняў. Заходзім у сенцы — з аднаго боку дзверы ў хату, з другога — дзверы ў свіран. У хаце ў правым вуглу (на куце) у аршыне ад столі — ікона, завешаная белым з расшытымі канцамі ручніком (набожнік); лаўкі знаходзяцца на вышыні ў адзін аршын ад падлогі ўздоўж правай сцяны і насупраць дзвярэй, з левага боку па даўжыні да палавіны сцяны на такой жа адлегласці ад падлогі — нары для пасцелі, якая складалася з гарохавай саломы, засланай грубай прасціной, у галавах — падушкі. К 80-м гадам XIX ст. амаль паўсюдна курныя печы былі заменены на печы з трубой. У хаце посуд: некалькі гліняных гаршкоў, чыгунны невялікі гаршчок ці два, патэльня, некалькі місак і балей, драўляныя лыжкі, дзяжа для выпечкі хлеба, кадка для вады, рагач для гаршкоў, качарга, звычайна драўляная, пара вёдзер, стол, пакрыты настольнікам хатняй работы, з узорам, на стале — хлеб і сальніца з соллю.

Надворныя пабудовы складаліся з хлевушкоў, перагароджаных для трымання жывёлы; яны будаваліся звычайна з дробнага лесу і крыліся саломай. Кожны з такіх хлевушкоў каштаваў 10—15 р., часам і дарожэй, у залежнасці ад якасці будаўнічага лесу. Надворныя пабудовы заканчваліся навесам (павеццю), пад які ставілі калёсы, клалі дровы.

Недалёка ад хаты знаходзіўся склеп, які складаўся з ямы, абкладзенай бярвёнамі. Зверху склеп таксама пакрывалі бярвёнамі і засыпалі зямлёй, з невялікімі дзвярыма для ўваходу. Над уваходам устройвалася невялікая паветка, якая мела назву скляпня. Тут звычайна знаходзіліся бочкі, кадкі, цэбры, вёдры і іншыя рэчы, не патрэбныя ў дадзены момант у хаце ці склепе.

У некалькіх сажнях ад двара, на агародзе, знаходзілася ёўня (гумно).

Маёмасць селяніна (акрамя пабудоў) складалася з адзення, жывёлы, гаспадарчых прылад, а ў некаторых і запасу збожжа. Верхняе адзенне ўключала світу і шубу. «Свита или жупан из сукна собственной работы белого цвета, у мужчин и женщин несколько разнится в покрое. Свит стараются иметь на каждого члена семьи по две, одну лучшую (совершенно белую) для праздников, другую обыкновенную (примараную, поношенную) для ежедневного употребления». Шуба шылася з аўчын. Галоўнейшыя члены сямейства стараліся мець па дзве шубы. З дамашняга сукна шыліся зімовыя

і ніжнія спадніцы для жанчын і штаны для мужчын. Для лета шылі адзенне палатнянае, а таксама кашулі хатняй работы. На галаву мужчыны надзявалі маргелку, ці магерку,— круглую белую шапку, зробленую з лямцу, а жанчыны — белую палатняную намётку, ці белую хустку, а на святы — квяцістую хустку, пакупную. Паясы для мужчын і жанчын розныя, таксама самаробныя, а для свята пакупныя. Лапці з лыка, у многіх для свята боты.

Асабліва каштоўнай у маёмасці сялян была жывёла. У сярэднім на адзін сялянскі двор у пачатку 80-х гадоў XIX ст. прыходзілася: «2 лошади, 2 коровы, 1 или 2 свиньи, 2—3 овцы. Птиц держат крестьяне в очень ограниченном количестве; гусей там, где этому благоприятствует местность; кур 2—4 и только вблизи городов и местечек несколько более».

Сяляне мелі наступныя гаспадарчыя прылады: «клещи самодельные, подкладка тоже, суконная с частью лямца, верх хомута, или крышка, суконная или из старого голенища, кожаная. Подуза или шлея плетеная из своей пеньки, оброть, или узла, тоже. Седелка своя. Упряжная телега домашней работы,— только колеса (катки) иногда покупные; сани, состоящие из двух полозьев с вязками, своей работы. Соха делается тоже каждым хозяином, но к ней два лемеша и наполок, железные, покупаются. Коса, серп, топор, нож, молоток, свердел и долото тоже покупаются. Прочее: бороны, вилы, грабли, цепи для молотьбы, лопаты для копанья огороднины — свои. Затем веревки для увязки возов, возжи и другие в хозяйстве мелочи крестьяне делают тоже сами».

Галоўны занятак сялян — земляробства. Сістэма гаспадаркі была трохпольная: папар, жыта і ярына. Вырошчвалі бульбу, каноплі, лён. Акрамя земляробства, сяляне займаліся пчалярствам, рыбалоўствам, паляўніцтвам.

У сваім жыцці сяляне прытрымліваліся старадаўніх звычаяў. Вось некаторыя з іх. У сялян быў звычай наладжваць у доме свечку ў гонар вядомага святога і хаця б раз у год перад гэтай запаленай свечкай і іконаю выбранага святога служыць малебен. Звычайна гэта рабілася восенню ці зімою, калі сяляне мелі больш вольнага часу. Адзін ці некалькі гаспадароў у складчыну куплялі воск і напярэдадні выбранага свята склікалі людзей для вырабу з яго свечкі. Гасцей частавалі. Зробленую свечку ставілі ў кадушку з жытам пад абразамі, маліліся Богу і разыходзіліся. На наступны дзень, гэта значыць у само свята, гаспадар запрашаў у дом свяшчэнніка служыць малебен у гонар выбранага святога. Свяшчэннік акрапляў святой вадой дом, двор і жывёлу гаспадара. Пасля яго ад'езду склікаліся госці, якіх гаспадар шчодра частаваў.

Свечка, якая належала некалькім гаспадарам, пасля сканчэння года пераносілася ў выбранае свята, па чарзе, да другога гаспадара таксама на год. Кожны год перад святам да свечкі прыбаўлялі воск, і праз некалькі гадоў яна важыла ўжо больш пуда. Тады гаспадар, ці гаспадары, калі воск купляўся некалькімі сялянамі, прадавалі свечку свяшчэнніку з агульнай згоды на воск, а ўтаргаваныя грошы ахвяравалі на царкву.

Каляды былі адным з самых любімых свят. Яны працягваліся з 25 снежня па 7 студзеня (па старому стылю). У гэтыя дні хадзілі адзін да аднаго ў госці. Маладыя хлопцы ўстройвалі «игрища», запрашалі музыкантаў і дзяўчат, пелі, танцавалі, ладзілі ўсялякія гульні. Збіраліся звычайна ў прасторнай хаце якога-небудзь вясёлага заможнага гаспадара, якога за гэта шчодра частавалі, ці у большасці выпадкаў, у карч-

ме, дзе пачастункі былі «под рукой».

У жыцці сялян немалую ролю адыгрывалі і розныя павер'і. Каб мець поспех у справах, лічылі сяляне, мала толькі ведаць справу, патрэбна «в особенности примечать, когда что сделать, нужно соблюдение известных примет». Прымет гэтых было мноства,і былі яны надзвычай разнастайнымі. Вось найбольш распаўсюджаныя з іх. Патрэбна прыкмячаць, калі зімой на дрэвах з'яўляецца шэрань. Калі раней Міколаў (6 снежня па старому стылю), то трэба сеяць ранні ячмень, а калі пазней гэтага дня, то — позні. Калі ў час зімы, на дарозе, ёсць чорныя лініі — быць ураджаю грэчкі, у адваротным выпадку лепш яе зусім не сеяць. На куццю перад калядамі, Новым годам і вадохрышчам прыкмячаюць, якая пагода вечарам. Калі неба яснае і многа зорак, то будзе ўраджай на грыбы. Трэба прыкмячаць, якое ў каго вока — добрае ці дурное. Так як у многіх бывае дурное вока, то не трэба нікому паказваць маладых, нядаўна нарадзіўшыхся жывёлін — ягнят, парасят, цялят і іншых, іначай яны прападуць.

Аднак, на думку сялян, бываюць не толькі ненаўмысныя сурокі, але і нядобрыя людзі, якія знарок напускаюць «порчу» на чалавека ці жывёлу. Гэта — «чараўнікі». Паводле павер'яў, ім паслухмяны ўсе чэрці, якія выконваюць усе іх пажаданні. Акрамя таго, чараўнік меў змея, які насіў яму ўсялякае дабро ў куфры і свірны. Так як чараўніка ўсе, у асноўным, баяліся, то ён карыстаўся асаблівай павагай і часта дапамагаў тым, хто жыў у нястачы, але хто карыстаўся яго дабрадзействам, у таго ў той жа момант замруць дванаццаць галоўных жыл; у самога ж чараўніка чэрці перад смерцю, нібыта, выцягваюць душу.

Згодна з павер'ямі, існавалі, быццам, і бязвінныя чары, але яны былі звязаны з вялікімі цяжкасцямі. Напрыклад, можна было дастаць кручок, якім «снискивается любовь всякой особы, затронутой им за платье», і вілачкі, якія аказвалі адваротнае дзеянне. Для гэтага трэба злавіць кажана і ў поўнач яго жывым закапаць у мурашнік, пайсці адтуль хутка, не азіраючыся, іначай, пачуўшы крык кажана, можна аглухнуць на ўсё жыццё, а калі хоць раз азірнешся — вечна будзеш глядзець тварам назад. Ісці трэба, не звяртаючы ўвагі ні на крык, ні на рогат, ні на якія спакусы чарцей, што ў гэты час праследуюць чалавека. Назаўтра замест кажана ў мурашніку застануцца толькі дзве костачкі — кручок, які называецца ў народзе «любистою», і вілачка.

Павер'і сведчаць, што ёсць жанчыны, якія могуць адбіраць у кароў малако, і мужчыны, якія робяць людзям зло. З такімі людзьмі, прапанавалі павер'і, не трэба сварыцца, лепш уступіць ім. Але калі ўжо здарыцца разгневаць такога злога чалавека, ці ён з зайдрасці, ці па злосці сваёй «пусціць немач», то трэба хутчэй шукаць дапамогі ў другога ведзьмара. Той дасць вады выпіць ці ўмыцца — і немач пройдзе.

Яшчэ крышку з сялянскіх павер'яў. У лесе не трэба без прычыны крычаць ці рагатаць, інакш раззлаваны лясун завядзе глыбока ў лес, і можна заблудзіць. Трэба прыкмячаць, калі вясною першы раз падала голас зязюля: калі ў гэты час лес яшчэ не апрануўся лістамі — цяжкі будзе год для людзей. Гэтаксама ў пачатку зімы — калі снег ляжа на не скінуўшы лісце лес, то цяжкім будзе год. Даведацца аб няшчасцях, якія могуць здарыцца ў доме, можна па паводзінах хатніх жывёл і птушак. Напрыклад, калі сабака вые,— быць бядзе ў доме, яшчэ горш, калі вые і рые зямлю адначасова. Але народная пагалоска кажа, што ёсць сродак, пры дапамозе якога ў гэтым

выпадку можна адвесці бяду ад свайго дома. Як толькі сабака завые, трэба стаць на ганак і сказаць ціхенька некалькі разоў — «на тваю галаву, на тваю галаву...» Запела курыца як певень — таксама быць бядзе. Але і тут ёсць сродак пазбавіцца гора. Трэба толькі курыцаю перамераць хату, і што прыйдзецца на парог — хвост ці галава — адсячы. Каб урадзілася добрая агародніна (капуста, агуркі і інш.), 24 чэрвеня на золку, жанчыны, распусціўшы валасы, у адных кашулях, аббягаюць тры разы грады, садзяцца пасярод іх, закручваюць валасы вакол галавы і павязваюць хусткі. Каб збавіцца ад чарвяка на капусце, прыхоўваюць той венік, якім парылі парадзіху ў лазні, і, калі чарвяк ужо завёўся, то венік параць у вадзе і пырскаюць гэтаю вадою капусту. Няўдалы хлеб бывае ад таго, што гаспадары востраць сваю сякеру тады, калі хлеб сядзіць у печы. Калі выпякаецца хлеб — не садзяць квактухі, а то не будзе ніводнага кураняці, усе яйкі папсуюцца.

Каб лепш зразумець душу і характар сялян, неабходна пазнаёміцца з іх песнямі. А былі яны розныя — калядныя і вясельныя, вясенніе і летніе, рэлігійныя і якія гучалі на вечарынках. Вось некаторыя песні, якія спяваліся ў канцы XIX ст. у вёсках і сёлах Чэрыкаўскага павета.

Калядныя песні і наогул песні, якія спяваюць зімою

Рана, рана куры папелі,
Святый вечар добрым людзям!
А раней таго дзеўка ўстала,
Па двару пахадзіла,
Званком пазваніла,
Кузняцоў пабудзіла:
— Уставайце, кузняцы, куйце тапары,
Цяшыце брусся, масціце масты,
Туда будуць іці тры празднічка:
Первый праснічак — Святое Ражтво,
Другій праснічак — Святое Васілле,
Трэцій праснічак — Святое Крашчэнне.
Ражтво — калядам прыгожство,
Васілле — калядам красілле,
Святое Крашчэнье — калядам прашчэнне.
Святый вечар добрым людзям!

* * *

Сказалі на моладца,
Што без весці прапаў,—
Ажно добрый моладзец
Удоль па вулушке прашоў,
Любімую песенку прасвістаў,
І мне, краснай дзевушке,
У церам галасок падаў:
— Выйдзі, выйдзі, дзевачка,
Выйдзі, душа, на савет.
— Я ж сядзела малада
Поздна вечарам адна,
А паліла малада
Воску белага свячу,
Дажыдала малада
Свайго мілага дружка.

Вясеннія песні

Ой, на морэ вутка купалася,
На сухадолі сушылася,
Ай дочка у маці прасілася:
— Ой, родная маці,
Пусці пагуляці,
Маладых карабельшчыкаў
У глаза павідаці.

* * *

Ляцелі гусі з Белыя Русі,
Селі, палі на сіне морэ,
На зялёный дубочак.
Дубочак звярнулі, мора скалыхнулі,
Самі пасядзелі, паляцелі.
З нашай любові нічога не будзет,
Любілісь, кахаліс, ацец-маці не зналі,
А як узналі, усю любоў разагналі.
Пайду я малада коло бераж ку-лугу,
Ці не ўстрэчуць з сваім мілым другам;
Устрэцілась з мілым у зялёным лугу,—
Здравствуй, сярдзечны дружок!
Із нашай любві нічога не вышла;
Пайду я к сінему мору долю іскаці;
На морэ сідзяць рыбаловы,
Удалы моладцы.
Эх вы, рыбаловы, закідайце сеці,
Лавіце маю долю.
Не ўлавілі долі, улавілі рыбы.

Летнія песні

Закурыўся сілен дробен дожджык
Да па чыстаму полю;

Зажурыўся да мой татачка родный
Па маей горкай долі,
Па маей горкай долі,
Па нялюбай дружыне;
Не курыся сілен дробен дожджык,
Да па чыстаму полю,—
Не журыся, мой татачка родный,
Па маей горкай долі,
Па нялюбай дружыне.
Што не ты мне даў
Ету горкую долю,
Нялюбую дружыну.

* * *

Па полю галубчык лятае,
Па полю сізенькій лятае,
Ён сваей галубкі шукае:
— Ідзе ж мая галубачка дзелася?
І дзе ж мая сізенькая дзелася?
Не з кем мне па полю лятаці,
Не з кем мне галубоў чэставаці.
Па двару хазяін ходзіць
А ён сваёй хазяюшкі ішчэт:
— І дзе ж ты мая хазяюшка дзелась?
Не з кем мне па двару хадзіці,
Не з кем мне сталоў засцілаці,
Не з кем мне жней чэставаці.

Вясельная песня (пелася на заручынах)

Ой, гаварыла пава з паваю,
Седзячы над вадою:
— Якаво табе, мая павачка,
Над быстрай ракою?
— Цяпер мне добрэ,
Цяпер харашо,
Як на дварэ пагода;
О як узнімуцца буйныя ветра,
Да ўсё дробныя дажджы,
Беражочкі змыюць,
Мяне павачку зрыюць.
— Якаво табе, красна дзевачка,
У татачкі за столікам?
— Цяпер мне добрэ,
Цяпер харашо,
Як у роднага таткі;
О як прыедуць пышны баяры
З маладым дзяцінкаю,
Дзевак разгонют,
Дзевак разгонют,
Мяне дзевачку возьмут.

С. Кагадзеева. Пераклад на бел. мову Т. Руткоўскай.

Са скарбаў народнай творчасці

Легенды

Асілкі

На курганах, што знаходзяцца паміж Студзянцом і сялом Касцюковічамі, каля ракі Мадуні, у чатырох вярстах адзін ад аднаго жылі такія моцныя магутныя асілкі, што маглі перакідваць адзін да другога стопудовыя камні і схопліваць іх на ляту, як мяч.

Запісаў настаўнік народнага вучылішча Г. Баршчэвіч у 1873 г. у в. Студзянец Чэрыкаўскага павета.

Бог і поп
[Чаму поп бярэ з жывога і мёртвага]

Адзін поп быў такі скупы, не дарыў нікога. Як прыдзець нішчы каторы, ён яго за руку і вон пхаць. Потым, адзін раз, у празднічный дзень еты поп пераадзеўся і ідзець з хаты, каб ужо абедню служыць. З'яўляецца яму старык і просіць у яго міласціны:

— Падары, бацюшка, Хрыста радзі!

Ён гаворыць:

— Вон! Ты відзіш, што я сабраўся на абедню. Вас не мала тут таскаецца. Вон!..

Старычок вараціўся вон, і поп за ім ідзець, і сабакамі яго затравіў. Ён махнуў рукою, еты старык,— не аказалася нічога. Толькі адзін поп да ён — ні двара, нічога. І места ета аказалася папу незнакомае. Ну, старык еты пашоў сваім пуцём, а поп еты за ім услед: баіцца ўжо адзін астацца. Ну і ішлі яны цэлы дзень. І дужа поп еты захацеў есць. Тады еты старык падходзіць — пасець пастух скаціну. Ён узяў адкупіў адна-

го барана, гаршчоначак там быў, што пастуху прыносілі есці, ён і гаршчоначак еты адкупіў і пайшлі. І баран за імі ўслед пашоў. Адыйшлі яны троху, вялеў ён папу разлажыць агонь. Агонь поп разлажыў, ну й разрэзалі барана етага. Выняў поп почкі дзве і сэрца. Старык гаворыць:

— Звары ета, а я засну. Потым мяне ўзбудзіш, як зварыш.

Поп еты гатаваў і дужа есць захацеў. Узяў адну почку з'еў. І лёг сам спаць і захроп. Устаець старык і на папа гаворыць:

— Уставай, будзем кушаць, што ты згатаваў.

Ён устаў, падаў яму кушанне. Бог памяшаў-памяшаў і гаворыць:

— І дзе ж ета адна почка дзелася?

Поп гаворыць:

— Я не знаю, я зварыў і лёг спаць сам.

— Ды што ты гаворыш, хто тут міжда намі быў?

Поп давай клясціся, бажыцца, што ета не ён з'еў. Старык еты гаворыць:

— Полна табе клясціся, можа, хто з'еў, як мы заснулі. Вазьмі астальное еш.

Поп еты даеў почку, сэрца і юшку пахлябаў.

— Ну пойдзем дальша.

Прайшлі некалькі — ляжыць куча золата на дарозе. Потым старык гаворыць:

— Да, вот і находка нам найшлася харошая. Як будзем дзяліць? — гаворыць.

А поп отвячаець:

— Ды як вы самі знаеце, дзядуля.

Ён узяў, разгарнуў на тры кучкі:

— Вот ета табе, а ета мне, а ета трэцяя часць таму, хто почку з'еў.

Папу стала жалка грошай, ён гаворыць:

— Я, дзядуля, з'еў почку.

— Ну да,— гаворыць.— Як грошы ўвідзеў, дык ты з'еў; ты ж мне раньша казаў, што ты не еў?

— Не,— гаворыць,— каб я праваліўся, як стаю! І так і етак, што я з'еў почку.

— Ну,— гаворыць,— калі не ты з'еў, бяры ж ету кучу і маю і сваю — няхай табе ўсё, калі ты даў дзве клятвы: адну — што не еў, а другую — што з'еў, як увідзеў золата. Тады ты пагаліўся на почку — з'еў, а цяпер — на золата.

І благаславіў яго:

— Будзеш ты браць з жывога і з мёртвага, і з беднага, і з багатага, і ўсё табе мала будзе.

Махнуў рукой — і стаў і дом той, і царква. А самога не стала.

Запісаў Е. Р. Раманаў у в. Золачава Чэрыкаўскага павета ад селяніна Барыса Германава, 37 г.

Баннік

У Чудзянах пайшла дзеўка замуж за старыка. І ніяк яна не звала яго, як стары чорт,— вэдлуг, шутак. І хлопчык у іх радзіўся. Ну, пайшла яна ў лазню і хлопчыка ўзяла. І гавора старыку:

— Я ж,— гавора,— послі лазні аслабею, дык ты, стары чорт, прыдзі і вазьмі хлопчыка. Пад лазнею пасядзі, я гукну цябе, ты й панясеш яго дамоў.

Ну, пашлі ў лазню, яна туды-сюды яго скарэй абмыла, дзверы расчыніла:

— Ці тут ты, стары чорт?

— Тут!

— Ну, на ж, вазьмі яго.

— А, давай, давай.

Яна аддала, ён і панёс.

Стала тагды яна мыцца, а мужык прыходзе:

— Прося, давай хлопца. Нешта ты доўга яго мыеш?

— Якога хлопца,— я ж табе аддала.

— Калі?

Стала ёй ета жалка, і яна абрабела...

Прыходзе дамоў — няма хлопца. Туды-сюды — так і панонічa няма.

Аддала старому чорту, ведама, банніку.

Запісаў Е. Р. Раманаў у с. Палуж Чэрыкаўскага павета ад селяніна Мікалая Паўлава.

Паданні

Адкуль Брацькавічы

Назва сяла Брацькавічы, гавораць, паходзіць ад некалі былога тут праваслаўнага мужчынскага Брацькаўскага манастыра, што стаяў сярод лесу, з якога з часам утварыліся ворныя палі.

Запісаў настаўнік А. Глінскі ў 1873 г. у с. Брацькавічы Чэрыкаўскага павета.

Шамаўшчына

У аднаго польскага караля служыў кухарам некта Шамаў. За нейкую важную паслугу кароль дараваў яму шляхецтва, даў яму зямлю і гэта ўрочышча, дзе ён і пабудаваў сабе дом амаль у лесе.

Аднойчы наняўся да яго ў работнікі адзін з шайкі разбойнікаў, выглядзеў месца і пайшоў.

Шамаў жыў багата, меў толькі адну дачку ды чалавекі чатыры парабкаў.

А той былы работнік з таварышамі забіў Шамава, абрабаваў і спаліў яго дом, у якім згарэлі і ўсе дакументы.

Унукі Шамава і цяпер жывуць у Мхінічах.

Запісаў настаўнік Жывапісцаў у 1872 г. у с. Мхінічы Чэрыкаўскага павета.

Узгорак Царковішча

Недалёка ад вёскі Красніцы пры рацэ Дзяражні ёсць гладкі насыпны ўзгорак, каля адной дзесяціны, абкапаны вакол некалькімі канавамі... На гэтым месцы некалі была царква, якая ў час набажэнства разам з людзьмі правалілася ў зямлю. Адзін рыбак гадоў дзесяць таму назад, лавіўшы рыбу ўначы, бачыў, як павыходзілі на прасуху, і чуў, як у ёй званілі і дзякі пелі, а тады ўзноў схавалася.

Запісаў настаўнік нар. вучылішча Г. Баршчэвіч у 1873 г. у с. Студзянец Чэрыкаўскага п. [Паданне пра царкву, што правалілася.]

Чарадзейная казка

Шчасце

Жылі два браты: адзін багаты, другі бедны. Гэты багаты і плашэй работаў, і харашо жыве; ну бедны, кажацца, і харашо работае, а жыве бедна — не шаньдзіць ні ў чом. Так ён, бедны, устае рана, смотрыць — у брата тая работа ўжо здзелана. Усё брат паперадзі.

Ну, даждалі яны ўрэмя, паехалі сеяць жыта. Потым гэты бедны брат рупіцца, як ба раней устаць і захваціць пярод, пасеяць раней брата — ці не лучча будзе. Прыязджае ён к сваёй паласе шчэ цёмна; чуе — сеецца братава жыта, чвікаюцца зярняты аб сяўно, і не відна хто, цёмна. І так, што не можа ён папярэдзіць брата ні ў чом. Даждалі ўрэмя; урадзіла жыта; багатага — таго лучча, а беднага — хужа. Потым ён послі жніва склаў сваё жыта ў копы. Тое худое і топчацца і травіцца, дык ён пайшоў сцярэч на ноч. А палосы з братам былі ўмесце. Сматрыць — ходзе па братняй паласе бурая карова, сабірае калосся, і па чужых палосах ходзе ды ў багатага брата капу носе. Тады прыйшла й на яго паласу і давай шчыпаць калосся з яго капы! Паймаў за рогі гэту карову і стаў яе наказываць, паймаўшы, цапком.

— Што ты,— гавора,— воўк цябе рэж! Што ты такая за карова: ідзе многа, туды й носіш, у нашых палосах бярэш?

Яна гавора яму:

— Я,— гавора,— не карова, а твайго брата Шчасце!

— Ну што ж,— гавора,— я яшчэ буду цябе біць: укажы,— гавора,— маё Шчасце!

— Да я,— гавора,— укажу і тваё Шчасце, не бі толькі мяне! Ідзі,— гавора,— у такім-то гамонішчы стаіць ліпа дуплінатая. І ў тэй ліпе тваё Шчасце ў карты гуляе з протчымі. Ты йдзі і бяры яго за хахол!

Ён пусціў тую карову і пайшоў к ліпе. Прыйшоў к ліпе, сматрыць — два ліцы гуляюць у карты. Ён тады тое за лоб, што карова ўказала:

— Ты што,— гавора,— у карты йграешь, а на мяне забываешь!

Яна тады гавора:

— Стой, не біся! Ты не тым занімаешся! Я б табе памагала, дык табе не трэба ні пахаць, ні касіць, а табе трэба занімацца таргоўлей!

А ён гавора:

— Чым мне занімацца таргоўлей — грошай у мяне няма?

— Ну вот,— гавора,— на табе на'сігнацыю два грошы, ідзі на базар і купі сабе, што трапіцца!

Ён прыходзе на базар. Носе чалавек бальшую шчуку прадаваць: перакінуў чэраз плячо і носе прадаваць. Ну, ён, гэты бедны чалавек, думае:

— Што купіць? Купіць ба сабе гэту рыбу — грошай толькі два грошы ў мяне!

Прыходзе к гэтаму чалавеку і думае: куплю, не куплю, а хоць патаргую, што ён за яе просе. І спрашуе:

— Што табе за рыбу?

Ён сказаў там капеек дваццаць ці трыццаць, а ў яго толькі два грошы. Ён кажа:

— Я б табе даў больша, ды няма больша ў мяне. Бяры, калі хочаш, два грошы!

Гэты чалавек насіўся-насіўся з гэтаю рыбаю — не дае больша ніхто, як ён пасуліў. Ён сустракае гэтага чалавека і гавора:

— Больша ніхто не дае, давай два грошы, бяры рыбу, пакармі дзяцей!

Ён узяў аддаў яму два грошы, узяў рыбу. Так ён прынёс гэту рыбу дамоў і прыказаў хазяйцы абчысціць і патрашыць. Так хазяйка выпатрашыла яе нутры і бросіла ў карыта. Потым пакарміла сямейство і астальное вынесла вон. Дажыдаючы начы, просяцца к яму нанач два купцы. Ён адказуе ім:

— Я рад пусціць вас, гаспада, дык мая хата гразна лі такіх людзей!

Потым яны адказалі:

— Ну што ж,— гавора,— у дарозе злучаецца ўсяк: ідзе худа, ідзе харашо, адначa нам нравіцца ў цябе пераначаваць!

Ён пусціў іх нанач, згатаваў рыбы, даў павячэраць — прыняў іх, чым мог. Потым яны пагасілі агонь і лягліспаць. Так і з гэтыя рыбы стала асіяць. Яны будзяць хазяіна гэтага:

— Што, хазяін, у цябе гэта ў карыце?

Ён гавора:

— А што ж,— гавора,— я вялеў хазяйцы выбрасіць нутры з рыбы вон, а яна — баба — убросіла ў карыта. Што, можа вам смярдзіць?

Яны гавораць:

— Не, гэта харашо, што яна не выбрасіла, ты нам прадай гэтыя нутры!

Ён гавора:

— Я не знаю, што яны стояць!

Яны гавораць:

— Мы знаем, што яны стояць, мы не хочам цябе абіждаць!

Пасматрэлі яны — у гэтых кішках драгацэнныя камні. Яны яму далі грошай, сколькі мелі.

Потым, дзеньгі гэтыя получомшы, ён узрадаваўся; апяць начаў спраўляць хазяйства, як у брата, купіў хлеба, справіў лашадзей і начаў занімацца, як і брат. Ну, потым, ці многа ці мала пажыў — зжыўся апяць, не шаньдзіць яму. Ну, зжыўся; апяць к ліпе Шчасця шукаць пайшоў.

Як ён прыйшоў, явілася яна яму і гавора:

— Я табе не казала гэтым занімацца!

Дае яна яму валасяную торбу і гавора:

— Як захочаш есць, дык гавары: стол з торбы!

Ну, пайшоў ён дамой. Прайшоў нямнога з гэтай торбай, канешне, есці хочацца, і надта ж палюбапісваць, што пакажацца з торбы. Так ён сказаў:

— Стол з торбы!

Аяўляецца яму ўсё: хлеб-соль, і піць, і есць — што яму ўгодна.

Ну, потым, пажыў ён з гэтаю торбаю, усім даволен; ну, не відзіць ніхто багацтва. Давай тады з братам мяняць: брат яму даў коней, кароў, усё, а ён брату торбу. Ну, брат разумны, думаець: нашто мне работаць, калі можна не работаючы жыць, і піць і есці. Ну, а тэй з братам прамяняў і 'пяць пражыў усё хазяйства, і пяць стаў бедзен. Апяць трэба іці к ліпе прасіць Шчасця. Прыходзе к ліпе, аяўляецца яму яго Шчасце:

— Ну, нашто ж ты ізвадзіў сваю торбу, што я табе дала? Ты быў сыт з сямействам! Хто ж табе вінават, што ты дурак! Учыць цябе трэба. Ну, дала ж я табе валасяную торбу, а цяперыча на табе залатую торбу. З гэтай торбай, як захочаш піць да есць, скажы: «Два з торбы!» А як будзеш сыт, дак гавары: «Два ў торбу!»

Ну, пайшоў ён дамоў. Вот ён прайшоў, любапытна яму. Прайшоўшы і гавора:

— Два з торбы!

Так яўляецца яму два малайца з дубінамі і давай яго карміць дубінамі, у два дручка, што не ўмеў жыць. Пакуль з гэтыя чэсці не ўздумаў сказаць:

— Два ў торбу! — дык яны ўсё яго дулі.

Ну, тады, папотчывалі яны яго, прыходзе дамой ён к брату з тою торбаю. І хваліцца брату:

— Ну вот, брат, тая торба была хараша, што я табе аддаў, ну, а сабе дастаў луччую — залатую!

Тэй давай прасіць яго:

— Давай, брат, замяняем!

Ну, канешне, тэй сагласен. Замянялі.

— Ну, вот жа, брат, на гэту ўжо не скажы: «Стол з торбы!» — а кажы: «Два з торбы!» А як станеш сыт, кажы: «Два ў торбу!»

Вот тэй, бедны, узяў сваю валасяную торбу і стаў жыць харашо. Тэя наўчылі два з торбы, як жыць, дос мяняць. І хазяйства багата звёў, і торбай залатой яго надзяліў. А багаты стаў рад. Патрэбавалася яму там піць ці есць, вот ён кажа:

— Два з торбы!

Ну, і аяўляюцца два з торбы з дручкамі потчываць; і потчывалі яго, пакуль ён не ўздумаў сказаць:

— Два ў торбу!

Ну і стаў зжывацца.

Запісаў Е. Р. Раманаў у 80-х гадах XIX ст. у в. Палуж Чэрыкаўскага павета ад селяніна Е. Азарава, 50 г., непісьменнага.

Прыказкі і прымаўкі

Без амбарáсу ані часу.

Свая хатка як родная матка.

Свату першая чарка і першая палка.

З дзіцячага фальклору. Гульні

У жмуркі

Удзельнікі гульні лічацца або мераюцца па палцы, і на каго прыйдзецца апошняе слова або хто возьме верх палкі, таму завязваюць вочы. Перад гэтым ён заганяе усіх «пад печ», у выніку чаго ўсе збіраюцца ў пэўнае месца, а той, каму завязваюць вочы, ідзе потым туды лавіць іх. Дзеці разбягаюцца адтуль і сляпому даводзіцца лавіць іх па ўсёй хаце. Першы, каго зловяць, замяняе сляпога і сам пачынае лавіць, а былы сляпец становіцца ў лік тых, хто хаваецца.

Гэта гульня называецца яшчэ і гульнёй у ката. Гуляюць у гэту гульню звычайна ў пакоі, таму дзеці лічацца, а не мераюцца. Калі выберуць ката, завязваюць яму вочы і вядуць (абавязкова ўсе) да дзвярэй. Кот бярэцца за ручку дзвярэй, а ўдзельнікі задаюць яму пытанні:

— Кот, кот, на чым стаіш?
— На дубе!
— За што трымаешся?
— За сук!
— Што на суку?
— Вуллі!
— Што ў вуллях?
— Пчолы!
— Што ў пчолах?
— Мёд.
— Каму да каму?
— Пані да пану!
— А нам што?
— Смала на лапаце!

Тады ўсе б'юць ката па спіне пад такт песенькі:

Апанас, Апанас,
Твая жонка ў нас.
Увалілась у квас.
Лаві сем год нас!

За апошнімі словамі стрымгалоў кідаюцца ад ката ў розныя бакі. «Па закону» ў цырымоніі праводзін ката да дзвярэй павінны ўдзельнічаць усе, але звычайна баязліўцы хаваюцца заўчасна хто пад стол, хто ў качарэжнік.

Замяняе ката першы, каго ён зловіць. Цырымонія праводзін ката паўтараецца над кожным катом.

Запісаў Е. Р. Раманаў у Чэрыкаўскім павеце. [Старажытная гульня, вядомая яшчэ ў Грэцыі.]

Жмуркі

У жмуркі гуляюць на двары, у полі, у лесе. Спачатку лічацца, каму жмурыцца.

Цынцу-валынцу,
Пятаму-ладаму,
Сікус-брыкус,
Радзівон, выйдзі вон!

Або:

Ходзіць кошка
Ля вакошка,
Маніць дзетак
Каля клетак:
— Ах вы, дзеткі,
Многа вас,
Красна шапка,
Проч ад нас!

Той, на каго прыйдзецца апошняе слова, выходзіць; хто застаецца апошнім, жмурыцца, стаўшы так, каб нічога не бачыць. Усе хаваюцца. Праз некалькі хвілін жмурка пытае:

— Ці ўжо?

Яму адказваюць:

— Ужо!

А калі хто-небудзь не паспеў яшчэ схавацца, то крычыць:

— Не шчэ! Не шчэ!

Калі ўсе схаваюцца, жмурка ідзе іх шукаць. Як толькі ён адыдзе ад месца, дзе жмурыўся, усе стараюцца заняць гэтае месца і «запляваца», гэта значыць плюнуць тут. Жмурка стараецца ў гэты час каго-небудзь злавіць і «зачурыць» (схапіць яго або дакрануцца і сказаць «чур!»). Тады жмуркай робіцца злоўлены.

Запісаў Е. Р. Раманаў у Чэрыкаўскім павеце.

Тэатральна-драматычныя элементы ў фальклорнай творчасці чэрыкаўлян

Траецкая гульня

Дзяўчаты ідуць у лес і, завіваючы на бярозе вянкі, спяваюць пад акампанемент скрыпак:

Русалачкі-земляначкі
На дуб лезлі, кару грызлі,
Звалiліся, забіліся
Тройца.

Пасля завівання вянкоў скачуць ля дрэў і, пляскаючы ў далоні, спяваюць:

Мы вяночкі завілі,
Мы гарэлачку папілі
І яечню паелі.

Потым самая старэйшая жанчына сядае на зямлю і робіць выгляд, што спіць. Дзяўчаты, пабраўшыся за рукі, танцуюць вакол яе, спяваючы. Раптам жанчына ўсхопліваецца з зямлі, падскоквае як толькі можна высока, робіць розныя грымасы і б'е па руках дзяўчат шматком прывязанага да кія палатна. Гэта выклікае вясёлы дружны смех у гульцоў і гледачоў.

Усе гэтыя цырымоніі адбываюцца ля дворнага ці сялянскага жыта. Адны з прысутных мужчын іграюць на скрыпках, астатнія з'яўляюцца гледачамі. Гэты вечар заканчваецца танцамі.

Запісала М. Чарноўская ў Чэрыкаўскім павеце.
[Старажытны і шырока вядомы на Беларусі звычай завівання на бярозе вянкоў тут спалучаецца з гульнёвым дзеяннем, меўшым калісьці магічную функцыю і сэнс.]

Легенды і паданні. Мн., 1983.
Чарадзейныя казкі. Ч. II. Мн., 1978.
Прыказкі і прымаўкі. Ч. 1, 2. Мн., 1976.
Дзіцячы фальклор. Мн., 1972.
Народны тэатр. Мн., 1983.

АД ЛЮТАГА ДА КАСТРЫЧНІКА*

У лютым 1917 г. у Расіі перамагла буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. На Беларусі, як і ва ўсёй краіне, склалася двоеўладдзе: Саветы — орган рэвалюцыйнай дэмакратыі і мясцовыя органы Часовага ўрада — орган буржуазнай улады. На пераломных этапах гісторыі, у тым ліку і ў час рэвалюцый, рашаючы ўплыў на развіццё працэсаў у краіне аказвалі падзеі, якія мелі месца ў сталічных гарадах і буйных прамысловых цэнтрах. Перыферыйныя раёны толькі прымалі палітычныя змены, як правіла, без вострых ускладненняў. Аналіз палітычнага становішча на падставе канкрэтных дакументаў дае магчымасць меркаваць, што ў сакавіку 1917 г. у Чэрыкаве і павеце сістэма двоеўладдзя не была рэалізавана. І толькі ў наступныя месяцы ў сувязі са стварэннем розных органаў Часовага ўрада і грамадскіх арганізацый тут з'явіліся элементы двоеўладдзя і нават шматуладдзя.

У Магілёўскай губерні, як і ў іншых месцах краіны, Саветы складаліся з прадстаўнікоў розных партый, пераважная роля ў іх належала партыям эсэраў і меншавікоў. У першыя месяцы рэвалюцыі не ўсюды былі сфарміраваны мясцовыя арганізацыі гэтых партый. Не было іх і ў Чэрыкаве. Дастаткова было некалькім прадстаўнікам гэтых партый аказацца ў кіраўніцтве грамадскіх арганізацый, як яны, на некаторы час, аказвалі ўплыў на іх палітычную лінію. Большасць дэпутатаў у першыя месяцы пасля рэвалюцыі былі беспартыйнымі. Фарміраванне Чэрыкаўскага Савета ішло некалькі месяцаў. У красавіку тут быў створаны Савет салдацкіх і афіцэрскіх дэпутатаў на чале з падпалкоўнікам Паліем — начальнікам павятовага воінскага ўпраўлення. Як сведчаць дакументы, у красавіку — маі была

* Матэрыял падрыхтаваны С. Кагадзеевай на падставе дакументаў, якія прадставіў П. К. Башко, канд. гіст. навук, ст. навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

створана рабочая секцыя Савета, якая аб'яднала нешматлікі атрад рабочых, рамеснікаў, саматужнікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі. У маі 1917 г. Чэрыкаўскі Савет ужо меў афіцыйную назву «Савет рабочых, салдацкіх і афіцэрскіх дэпутатаў», яго таксама ўзначальваў Палій, салдацкай секцыяй Савета кіраваў салдат В. П. Новікаў.

З канца красавіка 1917 г. на Беларусі ствараюцца зямельныя камітэты, у тым ліку павятовыя і валасныя. У Чэрыкаве, акрамя зямельнага камітэта, дзейнічалі павятовы і валасны харчовыя камітэты, у павеце — валасныя выканаўчыя камітэты, як падначальнае звяно павятовага выканаўчага камітэта, які быў сфарміраваны ў канцы сакавіка 1917 г. На пасаду павятовага камісара афіцыйна быў зацверджаны з 31 сакавіка старшыня павятовай земскай управы Палонскі. У органы Часовага ўрада на месцах уваходзілі ў асноўным прадстаўнікі розных класаў і слаёў, а таксама розных грамадскіх арганізацый.

У красавіку — маі былі сфарміраваны саюз служачых, урадавых і грамадскіх устаноў Чэрыкава (яго старшынёй стаў Кіркор), настаўніцкі саюз і іншыя арганізацыі. У чэрвені адбыўся з'езд сялянскіх дэпутатаў Чырыкаўскага павета, на якім быў выбраны выканкам павятовага Савета сялянскіх дэпутатаў. З'езд прайшоў пад уплывам эсэраў, некаторыя з іх да гэтага часу вярнуліся з турмаў, ссылак і з дзеючай арміі. Пасля заканчэння павятовага сялянскага з'езда адбылося аб'яднанне Саветаў. У пачатку ліпеня Чэрыкаўскі Савет ужо меў назву «Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў». Галоўная роля ў ім належала эсэрам, на якіх спадзявалася значная частка сялянскай масы. У Чэрыкаўскім павеце была развіта сельскагаспадарчая вытворчасць, таму большасць насельніцтва складалі

І. Е. Губараў.

Н. Н. Рабчаеў.

Ф. П. Цыбуля.

сяляне. Буйных прамысловых прадпрыемстваў ні ў горадзе, ні ў павеце не было. Існавалі дзесяткі дробных прадпрыемстваў, галоўным чынам саматужнага тыпу, якія спецыялізаваліся на апрацоўцы мясцовай сыравіны.

У 1917 г. у Чэрыкаўскім павеце было каля 168 тыс. жыхароў, у тым ліку каля 84 670 мужчын (у рабочым узросце — 42 200 чал.) і 83 287 жанчын (у рабочым узросце 42 900 чал.). Частка працаздольных мужчын была мабілізавана ў армію. На час перапісу насельніцтва ў павеце часова адсутнічала 24 452 чал., 21 285 чал. знаходзіліся ў дзеючай арміі. У гады першай сусветнай вайны ўраджэнцы Чэрыкаўшчыны служылі на розных франтах і флатах. Многія з іх загінулі. Сярод іх — І. Е. Губараў з в. Глінь, Н. Н. Рабчаеў і Ф. П. Цыбуля з в. Зоры і інш. Перад вайной

у Чэрыкаве было 6198 жыхароў. У 1917 г. там ужо зарэгістравана 6914 чал., у тым ліку 3303 мужчынскага і 3611 жаночага полу. На час перапісу ў горадзе адсутнічалі 46 жанчын і 158 мужчын. Апошнія ў большасці знаходзіліся ў арміі. Часова ў горадзе жыў 171 чалавек. У асноўным гэта былі бежанцы. У Чэрыкаве пражывалі людзі розных нацыянальнасцей: беларусаў і рускіх — 3438 чал., яўрэяў — 2757, палякаў — 713 чал. У 1917 г. у павеце было зарэгістравана 24 453 гаспадаркі сялянскага тыпу, 302 — прыватнаўласніцкія гаспадаркі, 119 гаспадарак не сялянскага тыпу. Каля 60—70 % сялянскіх гаспадарак адносіліся да катэгорыі бядняцкіх.

Цяжка жылося жыхарам павета паміж двума рэвалюцыямі 1917 г. Не хапала прадуктаў харчавання, тавараў першай неабходнасці. Расла сацыяльная напружанасць. Незадаволенасць насельніцтва вылілася ў стыхійныя хваляванні сялян. У зводцы Часовага ўпраўлення па справах міліцыі адзначалася, што некаторыя паветы Магілёўскай губерні, у тым ліку і Чэрыкаўскі, ахоплены «аграрным рухам». 10 красавіка Чэрыкаўскія землеўладальнікі тэлеграфавалі «аб хваляванні сялян, якія перашкаджаюць сяўбе палёў, здымаючы ў эканоміях рабочых і ваеннапалонных». Летам 1917 г. сялянскія хваляванні на Чэрыкаўшчыне сталі прымаць больш арганізаваны характар, паколькі захопы ўраджаю, сенакосаў і г. д. у некаторых месцах рабіліся на падставе рашэнняў валасных зямельных і іншых камітэтаў. Некаторыя валасныя камітэты ўстанаўлівалі таксы на пасьбу жывёлы, перамол хлеба, арэнду лугоў і палёў. Напрыклад, у памесці Васілеўскага «Вепрын» Дубровіцкай воласці мясцовыя сяляне згодна з пастановай валаснога зямельнага камітэта правялі ўзворванне часткі памешчыцкіх зямель пад жыта. Яны таксама пасвілі сваю жывёлу на палях эканоміі. Чэрыкаўскі і Крычаўскі зямельныя камітэты забаранялі нарыхтоўкі лясных матэрыялаў і паліва нават для патрэб абароны. У тэлеграме Часоваму ўраду з Чэрыкава, датаванай 23 ліпеня 1917 г., паведамлялася, што ў павеце мясцовыя арганізацыі не давалі магчымасці камісару прыпыніць супрацьпраўныя дзеянні зямельных камітэтаў, якія працягвалі раздаваць лугі сялянам без дазволу арэндатараў.

У сувязі з актывізацыяй правых сіл у жніўні 1917 г. чэрыкаўскі судовы следчы Дабжанскі арыштаваў некалькіх членаў зямельных камітэтаў. У сваёй тэлеграме ў адрас часовага ўрада, Выканкама Усерасійскага Савета сялянскіх дэпутатаў, Магілёўскага пракурора (усяго ў 8 адрасоў), датаванай 14 верасня 1917 г., Чэрыкаўскі сялянскі Савет паведамляў, што арышты маюць мэтай «дэзарганізаваць сялянства». Яны выклікаюць сур'ёзныя хваляванні сярод сялян. Асабліва апазіцыйны настрой панаваў у Крычаўскай і Маляціцкай валасцях. Аднак у сваім данясенні губернскі камісар Н. Друзкі-Сакалінскі адзначаў, што «самавольных арыштаў і перашкод да вызвалення няправільна арыштаваных не было, за выключэннем двух выпадкаў, калі па патрабаванню насельніцтва чынамі міліцыі былі арыштаваны былыя прыставы Чарняўскі і Бабічаў — абодва яны падвергліся хатняму арышту». У гэты час у павеце мелі месца і стыхійныя выступленні сялян. Так, у памесці Каменскага «Высокая Буда» Дубровіцкай воласці мясцовыя жыхары, прагнаўшы касцоў уладальніка, самачынна падзялілі паміж сабой 200 дзесяцін лугу і пачалі касьбу. У гэтым выпадку зварот да камісара аказаўся безвыніковым. 7 жніўня ў сваім данясенні ў Міністэрства харчавання арандатары Чэрыкаўшчыны паведамлялі, што сяляне павета

прысвойваюць сабе поўнасцю засеяныя палі жыта, працягваюцца захопы сенажаці. Спробы міліцыі спыніць іх дзеянні застаюцца безвыніковымі.

Нешматлікі атрад працоўных Чэрыкава таксама выказваў сваю незадаволенасць. Іх дзеянні ўліваліся ў агульны па ўсёй краіне паток забастовачнага руху. Так, у маі — чэрвені 1917 г. у Чэрыкаве адбылася забастоўка на панчошнай фабрыцы. Работніцы патрабавалі павелічэння заработнай платы на 25 %, паляпшэння ўмоў працы і ўстанаўлення васьмігадзіннага працоўнага дня. Уладзіць канфлікт спрабавалі Магілёўскі і Чэрыкаўскі Саветы, але гэта не дало станоўчых вынікаў, таму што прадпрымальнік не выконваў патрабаванняў рабочых. Апякунша панчошнай майстэрні малалетніх сірот у чэрвені 1917 г. паведамляла тэлеграмай міністру ўнутраных спраў: «Забаставалі ўсе 25 майстрых, патрабуючы ўмоў разаральных, становішча без таго крытычнае. Часова закрыла майстэрню. Павятовы камісар загадаў рэквізаваць на карысць майстрых машыны, матэрыялы. Маліла не дапускаць такой беззаконнасці, нечуванай пры старым рэжыме».

Летам 1917 г. у павеце актывізавалі сваю дзейнасць бальшавікі. На разгортванне сялянскага руху ў гэты час вялікае ўздзеянне аказвалі агітатары з рабочых і салдат, якія былі пасланы ў паветы і воласці бальшавікамі. Аднак, трэба зазначыць, што сярод агітатараў былі прадстаўнікі розных партый левага напрамку. Аб іх дзейнасці ў павеце паведамлялі, напрыклад, і мясцовыя памешчыкі. Адзін з іх, Масальскі, у тэлеграме, пасланай уладам, паведамляў, што ў Клімавіцкім і Чэрыкаўскім паветах многія сяляне «пад уздзеяннем узрушаных прамоў прыезджых... асоб утвараюць самаўпраўства і насілле, перашкаджаюць засеву палёў, травяць лугі, робяць вобыскі і пагражаюць расправай з землеўладальнікамі.» Аб узмацненні летам сялянскага руху на Магілёўшчыне паведамляў 9 чэрвеня ў сваёй тэлеграме ў міністэрства ўнутраных спраў магілёўскі губернскі камісар: «Па вяртанні з Петраграда сялянскіх дэпутатаў, якія прымалі ўдзел ва Усерасійскім сялянскім з'ездзе, аграрны рух у губерні змяніў свой характар. Валасныя і павятовыя зямельныя камітэты склалі пастановы аб неадкладнай раздачы лугоў, якія належалі прыватным уладальнікам, у арэнднае карыстанне суседнім бедным сялянам». Падобныя здарэнні мелі месца і на Чэрыкаўшчыне.

У сувязі з ліпеньскімі падзеямі ў Петраградзе Чэрыкаўскі Савет 11 ліпеня 1917 г. накіраваў ЦВК Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў тэлеграму, у якой выказаў давер Часоваму ўраду і свой пратэст супраць «гвалтоўнікаў і узурпатараў народнага імя». Як бачым, яна насіла антыбальшавіцкі характар.

Некалькі паскорылася палярызацыя палітычных сіл у Чэрыкаве ў перыяд выбарнай кампаніі ў гарадскую думу, якая пачалася летам 1917 г. Быў сфарміраваны саюз домаўладальнікаў, памешчыкі, частка заможных сялян і арандатараў аб'ядналіся вакол саюза зямельных уласнікаў. У гэты ж час эсэры, меньшавікі і іншыя прадстаўнікі левых сіл стварылі блок «рэвалюцыйна-дэмакратычнай і прагрэсіўнай групы грамадзян». У выніку выбараў у Чэрыкаўскую гарадскую думу, паводле паведамлення «Могилевских губернских ведомостей» ад 16 верасня 1917 г. прайшлі: ад польскага насельніцтва — 4 чал., аб'яднанага камітэта Чэрыкаўскай яўрэйскай арганізацыі — 5, домаўладальнікаў і землеўладальнікаў — 5, рэвалюцыйна-дэмакратычнай і прагрэсіўнай групы грамадзян — 5, праваслаўна-

га насельніцтва — 2 чал.

10 верасня 1917 г. адбыўся 2-і з'езд сялянскіх дэпутатаў Чэрыкаўскага павета. У яго рабоце прыняло ўдзел больш за 700 чалавек. Праходзіў ён пад відавочным уплывам эсэраў. З'езд выказаў падтрымку Часоваму ўраду і ЦВК Саветаў. Бальшавікі звязвалі рашэнне аграрнага пытання з карэннай перабудовай палітычнай сістэмы (да VI з'езда бальшавіцкай партыі — мірнымі сродкамі, а пасля яго — узброеным шляхам). Эсэры бачылі рашэнне гэтага пытання ў сувязі з работай Устаноўчага сходу, яны выступалі за рэфармісцкі шлях рашэння наспеўшых праблем. Як вядома, большую частку насельніцтва Чэрыкаўскага павета складалі сяляне, якім была бліжэй праграма эсэраў. Гэта і адлюстравалася ў ходзе работы сялянскага з'езда. Аднак, нягледзячы на падтрымку эсэраўскай лініі, восенню 1917 г. аграрныя беспарадкі і стыхійныя выступленні сялян павялічыліся. Напрыклад, 17 кастрычніка памешчык Цеханоўскі тэлеграфаваў Старшыні Савета Міністраў аб тым, што сяляне яго памесцяў у Клімавіцкім і Чэрыкаўскім паветах сякуць лес, губяць азімыя пасевы. Каб знізіць напружанасць у вёсках, выпрацаваць праграму ўзгодненых дзеянняў па прадухіленню масавых беспарадкаў 2 кастрычніка 1917 г. у Чэрыкаве адбылося сумеснае пасяджэнне павятовага зямельнага камітэта, прадстаўнікоў саюза зямельных уласнікаў, лесаўладальнікаў, грамадскіх арганізацый і розных устаноў. На ім прысутнічала 52 чалавекі. Аб гэтым факце паведамляла газета «Могилевская жизнь».

Восенню 1917 г. у Чэрыкаўскім павеце, як і па ўсёй краіне, праходзіла перадвыбарная кампанія па выбарах ва Устаноўчы сход. У пачатку кастрычніка павятовы выканкам сялянскіх дэпутатаў правёў праз сялянскія арганізацыі збор сродкаў для правядзення гэтай кампаніі. Таксама ён арганізаваў платныя і бясплатныя лекцыі для насельніцтва.

У 1917 г. у Чэрыкаве выдавалася газета «Голос Черикова».

Сацыяльная напружанасць у краіне ў кастрычніку 1917 г. дасягнула найвышэйшага ўзроўню. Краіна знаходзілася на парозе вялікіх падзей.

Са старонак газет*

Забастовка в Черикове

Уже в течение 2-х месяцев длится борьба рабочих Чериковской чулочной фабрики с предпринимателем. Были даже посланы делегаты от Могилевского Совета рабочих и солдатских Депутатов для улажения конфликта: но эта поездка не привела ни к чему. Предприниматель упорствует, и забастовка затягивается и грозит остановкой деятельности фабрики. Приехавший от Чериковского Совета рабочих и солдатских Депутатов [сообщил] о течении забастовки и о том, что предприниматель отказывается войти в соглашение с рабочими, мотивируя, что невыгодно дальше работать при создавшихся условиях.

Исполнительный Комитет Совета рабочих и солдацких Депутатов постановил командировать в Черикoв двух своих делегатов с тем, чтобы они уладили конфликт, разбирая его совместно с Чериковским Советом рабочих и солдатских Депутатов и не останавливаясь перед принятием

* Матэрыялы прадставіў П. К. Башко.

самых решительных мер.

Могилевский Исполнительный Комитет Совета рабочих и солдатских Депутатов, находя, что в настоящее время невозможно остановить работу фабрики, постановил потребовать передачи заведования ею в руки рабочих, если предприниматель откажется войти в соглашение с рабочими; а если он будет противодействовать проведению этой меры в жизнь, то арестовать его как государственного преступника, Исполнительный Комитет поручил делегатам принять все меры к тому, чтобы фабрика работала по-прежнему.

Молот. 1917. 29 июня.

Воззвание Чериковского исполнительного комитета Совета крестьянских депутатов

Чериковский исполнительный комитет Совета крестьянских депутатов выпустил воззвание, в котором говорит о том, что в г. Могилеве сорганизовался союз земельных собственников, что этот союз состоит исключительно из крупных помещиков, которые всеми силами стараются привлечь на свою сторону крестьян с тем условием, чтобы крестьяне отстаивали помещичью собственность в среде крестьянства; что по числу голосов, записавшихся в этот союз, помещики думают провести в Учредительное собрание закон о закреплении земель навсегда за ними.

Присоединяясь к воззванию в части проводимой нами, мы прибавляем от себя, что крестьянство не сумеет защитить своих интересов в союзе с помещиками, так как интересы их совершенно противоположны. И мелкое крестьянское землевладение, которое легче может пойти на приманку союза земельных собственников, одного должно не забывать, что интересы даже в защите своей мелкой собственности совершенно не найдут поддержки в союзе земельных собственников, как классе контрреволюционном, идущем по пути, отрицающему революционные завоевания.

Мелкое крестьянское землевладение, поскольку заинтересовано в том, чтобы его трудовая маленькая площадь земли осталась бы не «социализированной» по рецепту с(оциалистов)-рев(олюционеров) должно идти по революционному пути, предлагаемому соц(иал)-демократией, которая, строго ограждая интересы трудящихся и имея конечной целью социализацию не только земли, но и всякой частной собственности, однако считает, что в настоящее время еще невозможно оторваться от условий капиталистического строя, в котором радикальное изменение условий собственности в одной части повлечет за собой нежелательные явления регресса, т. е. обратного развития в будущем и нарушит нормальный ход процесса, идущего к настоящему социализму.

Наилучшим разрешением вопроса о мелком землевладении в настоящую революцию мы считаем, что мелкие хозяйства, нормы которых установит Учред(ительное) собр(ание), останутся во владении своих хозяев, с правом передачи их местным органам самоуправления или отдельным лицам, не имеющим земельного владения, но желающим обрабатывать ее. Защита же крупного землевладения противоречит интересам крестьянства одинаково мелкому, малоземельному и безземельному, являясь основой для эксплуатации крестьянских малоземельных масс при трудной уловимости доходности, зависящей часто от случайных природных условий, оно стоит на пути правильного экономического развития страны. Только тогда, когда оно будет отчуждено от помещиков и передано крупным органам местного самоуправления, которые сумеют продолжить и улуч-

шить культурное ведение в крупных хозяйствах, а также сумеют передать в арендное пользование те земли, в которых будут нуждаться местные землевладельцы — только при этих условиях возможен выход из того экономического и фининсового тупика, в котором находится страна. При технической отсталости, в какой держало самодержавие Россию, она не могла развиваться более или менее нормально и теперь лишь, после войны страна вступит на путь технического прогресса, который выведет Россию к социализму, поддерживать стремление к которому обязано все крестьянство. *М. Макарьина.*

Голос народа. 1917.27 августа.

Сообщение о бесплатных курсах для взрослых в Черикове

В Черикове в помещении высшего училища существуют бесплатные курсы для взрослых, учрежденные Советом рабочих и солдатских депутатов 5-го июня сего года, за время двухмесячного существования, т. е. до 5 августа на курсах состоялось 28 лекций, на которых слушателей пребывало 1223 человека. Многие лекции не состоялись из-за непогоды, а больше всего из-за митингов, проходивших во время, положенное для лекций.

Голос народа. 1917.7 сентября.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Падзеі, якія мелі месца ў перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, носяць складаны і супярэчлівы характар, патрабуюць аб'ектыўных і глыбокіх даследаванняў, архіўных пошукаў. Пакуль жа многае з таго, што адбывалася, не знайшло свайго адлюстравання ў фундаментальнай гістарычнай навуцы з улікам тых фактаў, якія зараз сталі вядомы. У раздзеле выкарыстаны публікацыі апошняга часу і архіўныя дакументы, якія раней не друкаваліся, што дае магчымасць больш аб'ектыўна падысці да ацэнкі з'яў таго суровага перыяду гісторыі.

Сярод удзельнікаў кастрычніцкіх падзей у Петраградзе былі і ўраджэнцы Чэрыкаўшчыны: камісар самакатнага батальёна А. І. Попель, С. Р. Васіленка, І. К. Громаў, М. Ф. Кажэўнікаў, матросы крэйсера «Аўрора» Ф. Шпакаў і С. Чыркоў. Ураджэнцы Чэрыкаўскага павета прымалі ўдзел і ва ўстанаўленні Савецкай улады ў розных рэгіёнах краіны. Напрыклад, загінулі ў ліку 26 бакінскіх камісараў М. Басін і Я. Зевін (гл. артыкул «Іх выклікаў час».) Сярод удзельнікаў II Усерасійскага сялянскага з'езда, які адбыўся 26 лістапада 1917 г., у якасці дэлегата прысутнічаў земляроб з в. Доўгая Чэрыкаўскага павета А. Р. Маскалёў. Вось што аб гэтым сведчаць архіўныя дакументы. «Паведамляем, што ў спісках II Усерасійскага з'езда Саветаў сялянскіх дэпутатаў ... сярод дэлегатаў з дарадчым голасам пад нумарам 67 значыцца Маскалёў Адам, Мандат № 12, дэлегат ад Выканаўчага камітэта сялянскай секцыі 45 пяхотнай дывізіі».

Насельніцтва Чэрыкаўшчыны паразнаму сустрэла кастрычніцкія падзеі. Сярод сялянства павета, а, як вядома, яно складала большасць насельніцтва, панавалі ў той час ідэі партыі эсэраў. (Трэба памятаць, што эсэры і меньшавікі з'яўляліся рэвалюцыйна-дэмакратычнымі партыямі сацыялістычнай арыентацыі.) У сваёй праграме эсэры прадугледжвалі рэфармісцкі шлях развіцця краіны, абапіраючыся на рашэнні Устаноўчага сходу. У аснове Дэкрэта аб зямлі, які быў абвешчаны з трыбуны II з'езда Саветаў, ляжала эсэраўская аграрная праграма. Большасць сялянскага насельніцтва Чэрыкаўшчыны было непісьменным, яно слаба разбіралася ў сутнасці бальшавіцкіх ідэй. Галоўнае для сялян было атрымаць зямлю. Абвяшчэнне Дэкрэта аб зямлі спрыяла таму, што ў лістападзе 1917 — красавіку 1918 г. большасць сялянства Чэрыкаўшчыны асцярожна павярнулася ў бок рэвалюцыі. Гэта адбылося таму, што сяляне, у тым ліку і заможныя слаі, былі зацікаўлены ў падзеле памешчыцкіх зямель. Супраць памешчыцкага землеўладання высту-

палі і кулакі, і беззямельныя сяляне і батрацтва. Трэба яшчэ ўлічваць і той факт, што ў гэты час большасць у Саветах павета складалі эсэры, ды і Савецкі ўрад да лета 1918 г. быў кааліцыйным: у яго ўваходзілі бальшавікі і левыя эсэры.

Аб пераважнасці эсэраўскага ўплыву ў павеце сведчаць даныя выбараў ва Устаноўчы сход, якія адбыліся па Магілёўскай выбарчай акрузе 12—14 лістапада 1917 г. Спіс эсэраў і сялянскіх дэпутатаў атрымаў 87,74 % галасоў ад агульнага ліку прагаласаваўшых, спіс Палескай арганізацыі РСДРП(б) атрымаў толькі 0,92 % галасоў. (Больш падрабязныя звесткі аб выніках гэтых выбараў знаходзяцца ў матэрыяле «Дакументы сведчаць».)

Устанаўленне Савецкай улады на Магілёўшчыне, у тым ліку і на Чэрыкаўшчыне, было складаным. Па-першае, у Магілёве знаходзілася Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, якую на час рэвалюцыі ўзначальваў А. Ф. Керанскі, а з 9(22) лістапада 1917 г.— генерал М. М. Духонін. Вакол Стаўкі пачалі групавацца сілы, якія не прынялі новага рэжыму. Па-другое, на Магілёўшчыне дыслацыраваліся легіёны былога царскага генерала Доўбар-Мусніцкага, які таксама знаходзіўся на антыбальшавіцкіх пазіцыях. Толькі пасля заняцца Стаўкі рэвалюцыйнымі войскамі на чале з М. В. Крыленкам, якое адбылося 20 лістапада (3 снежня) 1917 г., і яе рэарганізацыі з'явілася магчымасць пераходу ўлады ў губерні ў рукі Саветаў. Аднак не ва ўсіх Саветах меліся ўмовы, якія садзейнічалі б прыходу іх да ўлады. Так, напрыклад, аб бяздзейнасці Чэрыкаўскага Савета ў першыя паслярэвалюцыйныя месяцы, яго цяжкім фінансавым становішчы гаварыў чэрыкаўскі дэлегат на I з'ездзе Саветаў Магілёўскай губерні, што адбыўся ў снежні 1917 г. Ён ахарактарызаваў насельніцтва Чэрыкава, як «коснае і рэакцыйнае», падкрэсліў, што Савету даводзіцца працаваць у складаных абставінах — «наяўнасць малалікага гарнізона, контррэвалюцыя, якая звіла сабе гняздо ў Чэрыкаве якраз пасля 25 кастрычніка і якая мела падтрымку з боку сабатуючых чыноўнікаў». Толькі 10 студзеня 1918 г. III Магілёўскі губернскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў прыняў пастанову аб пераходзе ўлады ў рукі Саветаў, аб іх паўнамоцтвах і функцыях. «Губернскі з'езд рабочых, салдацкіх Саветаў пастанавіў: уся ўлада на месцах належыць Саветам...» — тэлеграма з такім тэкстам была адпраўлена ва ўсе паветы губерні. Падтрымліваючы рашэнне губернскага з'езда, Чэрыкаўскі павятовы Савет 19 студзеня 1918 г. прыняў пастанову аб пераходзе ўлады да Савета. У ёй, у прыватнасці, адзначалася, што «павятовы выканкам Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, аб'явіўшы аб пераходзе ўсёй улады да Саветаў, лічыць кожнага, хто акажа супраціўленне Савецкай уладзе, контррэвалюцыянерам і ворагам народа, ён будзе падвергнут ваенна-рэвалюцыйнаму суду». Прыняцце нарматыўнага акта аб пераходзе ўлады да Саветаў ад 19 студзеня, аднак, не азначала, што Савецкая ўлада была ўстаноўлена ўсюды ў вёсках. Яшчэ доўгі час у валасцях дзейнічалі старыя дзяржаўныя і грамадскія структуры, якія не заўсёды выконвалі пастановы вышэйшых органаў улады. Паказальны ў гэтай сувязі і факт існавання ў Чэрыкаве гарадской думы, якая спыніла сваю дзейнасць толькі ў маі 1918 г.

На першым з'ездзе Саветаў Чэрыкаўскага павета былі сфарміраваны новыя органы ўпраўлення, выбраны прэзідыум выканкама. Яго склалі пяць членаў: старшыня, два таварышы старшыні, два сакратары. Першым старшынёй Чэрыкаўскага Са-

вета быў выбраны М. Ф. Шашко. Потым гэту пасаду займалі М. І. Семяненка (некаторы час ён быў старшынёй павятовага рэўкама), Арлоў, Каралёў. Сакратаром павятовага выканкама быў Ц. Шчэрба. Аддзел народнай адукацыі складаўся з 9 чалавек, першым яго кіраўніком стаў М. І. Стапалянскі. Фінансавы аддзел узначаліў Таплёўкін. Першым ваенкамам быў выбраны Ф. П. Ціханаў. Аддзелам сацыяльнага забеспячэння кіраваў Г. К. Сотнікаў, аддзелам аховы здароўя — А. Ахіезер.

У студзені 1918 г. быў арганізаваны Магілёўскі губернскі зямельны аддзел. У складзе павятовых і пасялковых Саветаў зямельныя аддзелы былі арганізаваны ў асноўным у перыяд са студзеня па сакавік 1918 г. У большасці выпадкаў яны былі створаны на аснове рэарганізацыі зямельных камітэтаў. У сярэдзіне лютага Магілёўскі губернскі выканкам прыняў пастанову аб ператварэнні ўсіх зямельных камітэтаў у зямельныя аддзелы. У адпаведнасці з гэтай пастановай у губерні былі ліквідаваны зямельныя камітэты і арганізаваны ў складзе Саветаў зямельныя аддзелы. Першым кіраўніком Чэрыкаўскага павятовага земаддзела быў Шаўцоў. Потым аддзелам кіравалі Чыжэўскі, Каплуноў.

У адпаведнасці з Дэкрэтам аб зямлі Магілёўскі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт 29 лістапада 1917 г. выдаў загад аб перадачы ў распараджэнне зямельным камітэтам панскай маёмасці і зямлі. Потым гэта справа перайшла ў кампетэнтнасць земаддзелаў. Для ажыццяўлення зямельнай палітыкі павятовы і валасныя земаддзелы павінны былі правесці дакладны ўлік зямель, уладанняў і гаспадарак з іх жывым і нерухомым інвентаром, насеннага фонду, ствараць сельскагаспадарчыя кааператывы і накіроўваць іх работу.

Прамысловасць Чэрыкава ў гэты перыяд знаходзілася ў цяжкім ста-



А. Р. Маскалёў.

М. І. Семяненка.

М. І. Стапалянскі.

Ф. П. Ціханаў.

новішчы. У чэрвені 1918 г. газета «Звезда» паведамляла, што з 40 прадпрыемстваў і майстэрань, якія знаходзіліся ў горадзе, 28 не працавалі. Многія патрабавалі рамонту, але грошай, каб яго зрабіць, мясцовыя ўлады не мелі. Цяжарам давіла на насельніцтва беспрацоўе. Не лепшым было становішча і ў вёсках павета. Канфіскацыя і размеркаванне памешчыцкіх зямель абвастрылі сацыяльную напружанасць, нягледзячы на тое, што іх правядзенне падтрымлівалі розныя слаі сялянства. Але ўласныя інтарэсы ў іх былі неаднолькавыя. Кулакоў і заможных сялян не задавальняла норма падзелу зямлі (у павеце яна была: на працаздольнага члена сям'і — 2,5 га, непрацаздольнага — 1 га): існавала небяспека страты сваёй надзельнай і купленай зямлі. Да таго ж яны

жадалі атрымаць і частку памешчыцкай зямлі. Безумоўна, падобныя жаданні заможных сялян і кулакоў не маглі задаволіць беззямельных і малазямельных сялян. Новая ўлада падтрымлівала ў асноўным апошніх, што выклікала сацыяльную напружанасць у вёсцы.

У сувязі з надзяленнем сялян зямлёю, у цэнтры ўвагі мясцовых Саветаў паўстала пытанне аб забеспячэнні беднякоў цяглавай сілай і інвентаром. У адпаведнасці з Дэкрэтам аб забеспячэнні працоўных сельскагаспадарчымі прыладамі ад 25 красавіка 1918 г. у Чэрыкаўскім павеце ўлады пачалі размяркоўваць інвентар сярод бяднейшага сялянства, былі ўтвораны пракатныя пункты. У павеце было арганізавана 10 пракатных і зернеачышчальных станцый. За пракат сельскагаспадарчых прылад працы была назначана невялікая плата. Напрыклад, за малатарню плацілі 40 р., сеялку — 5, плуг — 1,5 р. у тыдзень. Беднякам прылады працы выдаваліся ў арэнду бясплатна, таксама выдзялялася насенне для сяўбы.

11 чэрвеня 1918 г. ВЦВК прызваў ствараць на месцах камітэты вясковай беднаты. Аб гэтым ішла размова і на першай павятовай канферэнцыі бальшавікоў 15 жніўня 1918 г. Нягледзячы на супраціўленне часткі сялянства, камбеды ствараліся ў розных валасцях Чэрыкаўскага павета. Летам 1918 г. камітэты беднаты былі арганізаваны ў Наваельнінскай, Палужскай, Брацькавіцкай, Старынскай і іншых валасцях. Усяго ў павеце было створана 12 валасных і 269 вясковых і гарадскіх камбедаў.

З утварэннем камбедаў на Чэрыкаўшчыне звязан і новы этап падзелу панскіх зямель. Гэта было выкліканa тым, што вясною падзел зямлі ў некаторых валасцях, дзе большасць у мясцовых Саветах складалі кулакі і заможныя сяляне, вёўся без уліку пажаданняў беззямельных і малазямельных сялян. Выканаўчыя функцыі ў новым падзеле панскай зямлі належалі камбедам. Некаторыя валасныя камбеды прымалі рашэнні, якія датычылі маёмасці не толькі памешчыкаў, але і кулакоў. Напрыклад, Маляціцкі валасны камбед на сваім пасяджэнні пастанавіў «пазбавіць кулакоў лішніх земляў і жывёлы». Не трэба забываць, што гэтыя «лішнія землі» кулакоў былі не толькі надзельныя, але і купленыя імі, гэта была іх уласнасць. У выніку другога падзелу зямлі частка беднякоў і сераднякоў атрымала дадаткова ад 0,2 да 1,5 дзес. зямлі. Усяго на першае лістапада 1918 г. фонд непрацоўных зямель (раллі і лугу) у Чэрыкаўскім павеце склаў 255,4 тыс. дзесяцін. Было размеркавана 115 тыс. дзесяцін зямлі.

У гэты час надзвычайны сялянскі з'езд, які адбыўся 26 чэрвеня 1918 г., прыняў пастанову аб падтрымцы і ахове Савецкай улады.

Аб накале барацьбы бальшавікоў і сіл, якія не падтрымлівалі іх дзеянні, сведчыць і факт роспуску бальшавікамі ў Чэрыкаве VI чарговага з'езда Саветаў, які адбыўся 5 верасня 1918 г. На гэтым з'ездзе левыя эсэры выступілі супраць арганізацыі камбедаў, крытыкавалі палітыку бальшавікоў, іх метады кіравання, патрабавалі разрыву цяжкага для Беларусі Брэсцкага міру. Як было сказана раней, эсэры карысталіся падтрымкай большасці насельніцтва павета, гэта сведчыць аб тым, што на з'ездзе яны выступілі выразнікамі інтарэсаў большасці. У выніку галасавання на з'ездзе прапановы эсэраў падтрымалі каля 300 чал., за бальшавікоў прагаласавала 70 чал. З 16 членаў павятовага выканкама — 9 былі эсэрамі, 4 — бальшавікамі, 3 — беспартыйнымі. Падтрымка большасцю дэлегатаў з'езда эсэраўскіх прапаноў не задаволіла бальшаві-

коў. Яны пакінулі з'езд, перайшлі ў іншы будынак і аб'явілі сябе часовай уладай у павеце. З'езд быў распушчаны. Па сутнасці гэта адлюстроўвала непрыняцце бальшавікамі іншай палітычнай пазіцыі, у даным выпадку пазіцыі левых эсэраў.

Аднак трэба адзначыць, што рашэнне аб роспуску VI з'езда Саветаў было падтрымана дэлегатамі павятовага з'езда камбедаў, які адбыўся 15 верасня 1918 г. І ў гэтым няма нічога дзіўнага. Дастаткова ўспомніць, што з боку эсэраў на VI з'ездзе Саветаў была прапанова — не ствараць камбеды. На з'ездзе камітэтаў беднаты павета была прынята пастанова аб неабходнасці больш актыўнай арганізацыі камбедаў. Таксама было разгледжана харчовае пытанне, прынята рашэнне ўзяць хлеб на ўлік, устанавіць цвёрдыя цэны на мануфактуру, жалеза і сельскагаспадарчыя прылады працы. Пад пагрозай смерці забараняўся продаж хлеба па спекуляцыйнай цане.

У сувязі з рашэннем вераснёўскага павятовага з'езда камбедаў пачаліся выбары ў падліковыя камісіі. У прыватнасці, у пачатку кастрычніка 1918 г. на Камаровіцкім валасным з'ездзе Саветаў была выбрана падліковая камісія для ўліку хлеба. Прынята рашэнне сыскваць пазямельны падатак з грамадзян воласці, якія мелі больш за 9 дзес. зямлі, камітэтам беднаты хлеб выдзяляць са скідкай 50 %. У гэты ж час у Даўговіцкай воласці функцыі валаснога Савета перайшлі да валаснога камітэта беднаты. Тут таксама была выбрана падліковая камісія.

У час канфіскацыі памешчыцкіх маёнткаў камбеды праводзілі ўлік іх маёмасці. Разам з гэтым яны ўлічвалі і пасевы азімых хлябоў на памешчыцкіх землях, якія былі засеяны восенню 1917 г. былымі гаспадарамі. Па закону гэтыя пасевы не падлягалі ўраўняльнаму размеркаванню, яны пераходзілі ў распараджэнне валасных Саветаў. Аднак некаторыя мясцовыя камітэты парушалі гэты закон. Вакол размеркавання памешчыцкага ўраджаю ішла вострая барацьба паміж Саветамі і заможнымі сялянамі, якія спрабавалі сарваць гэта мерапрыемства. Некаторыя валасныя Саветы, у якіх яны складалі большасць, прымалі пастановы аб размеркаванні пасеваў на корані, захаванні іх азімых пасеваў на арэндаваных памешчыцкіх землях. Так было, напрыклад, у Даўговіцкай воласці. У канцы ліпеня 1918 г. Чэрыкаўскі земаддзел адмяніў пастанову Даўговіцкага валаснога Савета аб размеркаванні ўраджаю на корані.

Восенню 1918 г. узмацнілася сацыяльная напружанасць у вёсках павета. Гэта было звязана з тым, што Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б) узяў курс на масавае стварэнне камун, іншых калектыўных гаспадарак. Праводзіўся ён без усякага ўліку настрою сялянства, асноўная частка якога жадала весці індывідуальную гаспадарку. У гэты перыяд у Беларусі, у тым ліку ў Чэрыкаўскім павеце, узнікалі сялянскія хваляванні.

Пытанне аб стварэнні на Чэрыкаўшчыне калектыўных гаспадарак узнімалася 28 лістапада 1918 г. на VII павятовым з'ездзе камбедаў. Яно выклікала сур'ёзныя спрэчкі, аднак у выніку было адобрана. На з'ездзе таксама абмяркоўвалася пытанне аб надзвычайным рэвалюцыйным падатку, была прынята пастанова аб перавыбарах валасных і пасялковых Саветаў. 6 снежня 1918 г. гэту пастанову падтрымаў Чэрыкаўскі павятовы камітэт РКП(б).

Да канца 1918 г. у павеце было арганізавана 20 камун, 13 калгасаў і 4 арцелі. Як сведчаць архіўныя матэрыялы, на адну калектыўную гаспадарку тут прыходзілася больш за 380 дзес. зямлі.

Камбеды да пачатку 1919 г. зліліся

з валаснымі і пасялковымі Саветамі, якія к гэтаму часу ў выніку перавыбараў сталі у асноўным бальшавіцкімі.

Павятовая партыйная бальшавіцкая арганізацыя была створана ў маі 1918 г. пад кіраўніцтвам М. Д. Шчарбітава, які і ўзначаліў яе. 12 студзеня 1919 г. у Чэрыкаве адбылася II павятовая партыйная канферэнцыя. На ёй прысутнічала 25 дэлегатаў, якія прадстаўлялі 200 членаў партыі і 325 кандыдатаў і спачуваючых. На канферэнцыі было падкрэслена, што ў павеце вядуць работу 22 партыйныя ячэйкі, сярод якіх 8 — у валасцях, 12 — у сёлах і 2 — у чырвонаармейскіх часцях. Таксама адзначалася, што поўнасцю з камуністаў складаліся павятовы выканкам, ваенны камісарыят і Надзвычайная камісія. З 88 членаў валасных Саветаў — 24 члены партыі і 58 спачуваючых. Такім чынам, відаць, што да пачатку 1919 г. органы мясцовай улады амаль поўнасцю складаліся з прадстаўнікоў партыі бальшавікоў і тых, хто падтрымліваў яе ідэі. Пазіцыі левых эсэраў у Саветах і іншых органах улады былі значна падарваны. Аднак іх ідэі яшчэ панавалі сярод сялянства.

Пра гэты перыяд гісторыі Н. Стужынская піша: «Непрыманне харчовай, аграрнай і нацыянальнай палітыкі, якую праводзіла Савецкая ўлада, выклікала вясной — летам 1919 г. актыўны працэс фарміравання паўстанцкіх атрадаў так званых «зялёных» у Горацкім, Рагачоўскім, Быхаўскім, Чэрыкаўскім паветах Гомельскай губерні. Для падаўлення паўстанцаў у Горкі сцягнулі немалыя сілы...» («Звязда», 28 мая 1992 г.).

У маі 1919 г. паўстала пытанне аб пераносе губернскага цэнтра з Магілёва ў Гомель. 25 мая адбыўся I Гомельскі губернскі з'езд Саветаў. На ім было аб'яўлена аб стварэнні Гомельскай губерні. Чэрыкаўскі павет увайшоў у яе склад, а ўся губерня — у склад РСФСР.

У гэты час амаль уся тэрыторыя Беларусі была захоплена палякамі. 26 красавіка 1919 г. прэзідыум Магілёўскага губернскага Савета прафсаюзаў звярнуўся да жыхароў губерні з адозвай, у якой прызваў насельніцтва папоўніць рады Чырвонай Арміі. У поўным саставе пайшлі на фронт некаторыя выканкамы мясцовых Саветаў, напрыклад Прапойскі валасны выканкам. За красавік — май 1919 г. у павеце пайшлі на фронт 120 камуністаў, галоўным чынам з гарадской арганізацыі. У гэты перыяд дзве арганізацыі распаліся: Мірагашчанская — пасля адыходу вайсковай часці і Наваельнінская — у сувязі з адыходам галоўных работнікаў у атрад асобага прызначэння.

Аб складаным фінансавым становішчы ў павеце ў час грамадзянскай вайны сведчыць і той факт, што ўлады не мелі грошай нават на ўтрыманне дзіцячага прытулку, што знаходзіўся ў Чэрыкаве. На 1 лютага 1919 г. у ім было 61 дзіця: школьнага ўзросту — 27 і дашкольнага — 34. Недахоп сродкаў на яго ўтрыманне прывёў да таго, што прыём сірот спыніўся.

Каб забяспечыць сем'і чырвонаармейцаў усім неабходным і скараціць плошчы незасеяных палёў, 10 ліпеня 1919 г. у павеце былі арганізаваны спецыяльныя органы. За некалькі месяцаў сваёй работы, як сведчаць справаздачы Чэрыкаўскага павятовага камітэта пасяўных плошчаў і камісіі па аказванню дапамогі чырвонаармейскім гаспадаркам, яны выдзелілі насеннага матэрыялу: 1960 пудоў — сем'ям чырвонаармейцаў і частцы бяднейшага сялянства; 2 тыс. пудоў — савецкім гаспадаркам; 90 пудоў — камуне «Рассвет» і 20 пудоў — Сафіеўскай школе малочнай гаспадаркі. Усяго было адпушчана насеннага матэрыялу 4070 пудоў, якіх хапіла б, каб засеяць

407 дзес. зямлі. За гэты час з мэтай аказання дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў пазыкай было абследавана 8 валасцей: Дубровіцкая, Лабанаўская, Студзянецкая, Брацькавіцкая, Старынская, Палужская, Даўговіцкая і г. Чэрыкаў.

Пад кантролем савецкіх органаў улады знаходзілася пытанне забеспячэння бедняцкага насельніцтва сельскагаспадарчым інвентаром. Было вырашана ўвесь атрыманы інвентар размяркоўваць выключна па пракатных станцыях. Да пачатку кастрычніка 1919 г. у павеце ўжо налічвалася 17 пракатных станцый, якія мелі 182 аднаконныя і параконныя плугі, 166 барон, 36 сеялак, 262 касы, 33 сенакасілкі, іншы сельскагаспадарчы інвентар. Да гэтага ж часу было выдзелена на аказанне дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў і іншыя расходы 115 тыс. рублёў, з іх 40 тыс. рублёў было дадзена саюзу кааператываў за дастаўку сельскагаспадарчага інвентару і 20 тыс. рублёў на ўтрыманне служачых.

У 1919—1920 гг. павялічылася дэзерцірства з радоў Чырвонай Арміі. Урад быў вымушаны стварыць спецыяльныя камітэты па барацьбе з дэзерцірствам. З 18 па 24 снежня 1919 г. Чэрыкаўскі павятовы камітэт партыі аб'явіў «Тыдзень абароны». Асноўная мэта гэтага мерапрыемства — збор прадуктаў харчавання і цёплага адзення ў насельніцтва, барацьба з дэзерцірствам.

Нягледзячы на складанае становішча ў першыя паслярэвалюцыйныя гады, на Чэрыкаўшчыне ў былых панскіх сядзібах адкрываліся клубы, бібліятэкі. У першай палове 1919 г. у Чэрыкаве пачала працаваць зубная амбулаторыя. Такія ж амбулаторыі намячалася стварыць ў Крычаве, Краснаполлі, Маляцічах.

З 1918 г. у Чэрыкаве выдавалася газета «Красный клич» — орган Чэрыкаўскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. 1 лістапада 1919 г. убачыў свет першы нумар газеты «Голос коммуниста» — орган Чэрыкаўскіх камуністаў. У той час рэдактарам газеты быў М. Ленскі-Дармянёў. Газета мела невялікі фармат, па знешняму выгляду нагадвала лістоўку. Друкавалася на рускай мове.

Незадавальненне часткі насельніцтва палітыкай і метадамі кіравання новай улады прывяло да антысавецкага паўстання, якое адбылося ў першых чыслах сакавіка 1920 г. у Быхаўскім, Прапойскім і Чэрыкаўскім паветах. Паўстаўшыя нападалі на мясцовыя валасныя і пасялковыя Саветы, захапілі некаторыя населеныя пункты. Яны распрацавалі план сваіх дзеянняў, мелі спецыяльны штаб, паміж вёскамі наладзілі конную сувязь. Мясцовая ўлада не змагла падавіць паўстанне. На дапамогу было накіравана некалькі спецыяльных ліквідацыйных атрадаў ад 8-й дывізіі. Яны складалі да 200 штыкоў, 7 шабель і 3 кулямётаў. Канчатковая ліквідацыя паўстання была даручана Заходняму сектару ВОХРа. За час падаўлення паўстання было арыштавана каля 600 чал. Забітымі і параненымі паўстаўшыя страцілі каля 50 чал. Сярод урадавых войск было забіта 10 чал.

Вясной 1920 г., нягледзячы на блізкасць польскага фронту, складанае становішча ў вёсках, сяляне рыхтаваліся да пасяўных работ. Гэтаму ж пытанню ўвагу ўдзялялі і органы ўлады. 17 красавіка адбылося аб'яднанае пасяджэнне ўсіх аддзелаў Чэрыкаўскага павятовага камітэта партыі і выканкама. На пасяджэнні было прынята рашэнне — аб'явіць у павеце «Тыдзень пашырэння пасяўных плошчаў». Для паспяховага яго правядзення была арганізавана спецыяльная камісія, якую ўзначаліў загадчык павятовага земаддзела Казлоў. Удзельнікі пасяджэння звярнуліся да працоўных

павета з заклікам, у якім прызвалі правесці сеў на палях маламаёмных і бясконных сем'яў чырвонаармейцаў, старых, удоў, сірот, непрацаздольных грамадзян. Правядзенне «Тыдня пашырэння пасяўных плошчаў» прынесла добрыя вынікі. Была засеяна амаль уся ворная зямля.

Вясной 1920 г. сялянам сучасных Чэрыкаўскага, Горацкага, Быхаўскага і Чавускага раёнаў быў дадзены нарад на працоўную павіннасць. Неабходна было выдзеліць на патрэбу Чырвонай Арміі 3000 падвод. Нягледзячы на цяжкае становішча, сяляне Чэрыкаўшчыны да пачатку ліпеня выканалі гэту павіннасць. Яны перавезлі 300 тыс. пудоў грузаў на патрэбу арміі. Была праведзена новая мабілізацыя ў армейскія рады. У чэрвені некаторыя паветы губерні, у тым ліку і Чэрыкаўскі, мабілізавалі ў Чырвоную Армію 2860 чал. У першую чаргу ў армію ішлі камуністы.

Восенню 1920 — у пачатку 1921 г. у Чэрыкаўскім павеце зноў адбыліся антысавецкія выступленні. У гэты час тут актыўна дзейнічалі атрады белых афіцэраў Белахвостава, Зязюліна, Прудніка ва, на мяжы Чэрыкаўскага і Рагачоўскага паветаў — Мельнікава.

У першыя паслярэвалюцыйныя гады мясцовыя органы ўлады прымалі меры для ліквідацыі непісьменнасці дарослага насельніцтва, адчыняліся дзіцячыя сады, працавалі мастацкія гурткі. У 1920 г. у павеце было 64 школы па ліквідацыі непісьменнасці. У 1920/21 навучальным годзе на Чэрыкаўшчыне працавала 275 школ першай ступені. У іх навучалася 19 620 дзяцей: 12 163 хлопчыкі і 7457 дзяўчынак. У гэтых школах працавала 505 настаўнікаў. У павеце таксама дзейнічалі дзесяткі школ другой ступені.

Колькасць насельніцтва ў Чэрыкаўскім павеце ў 1920 г. у параўнанні з 1917 г., па адных даных, паменшылася і склала 166 515 чал. (76 618 мужчын і 89 897 жанчын). Па іншых даных, у 1920 г. у павеце было зарэгістравана 171 006 жыхароў (84 886 мужчын і 86 120 жанчын). Часова адсутнічала 11 008 мужчын, 10 220 з якіх былі прызваны ў Чырвоную Армію, знаходзіліся ў харчовых атрадах, фарміраваннях Надзвычайнай камісіі і г. д. Па іншых прычынах часова адсутнічалі 788 чал., у тым ліку 75 жанчын.

Да канца грамадзянскай вайны ў павеце было ўзята на ўлік 25 090 сялянскіх гаспадарак і 1280 гаспадарак у мястэчках. Акрамя гэтага, у павеце налічвалася 11 камун, 241 арцель, 6 саўгасаў і 2193 іншыя гаспадаркі.

У сувязі з нацыяналізацыяй вытворчасці і зямлі фактычна была ліквідавана нешматлікая праслойка прамысловай і гандлёвай буржуазіі, памешчыкаў, зменшылася колькасць заможных сялян і павялічылася агульная колькасць гаспадарак. У 1920 г. да часовага найму рабочай сілы прыбягалі 1559 гаспадарак (без уліку скрытага найму). Ва ўмовах разрухі большасць гаспадарак займалася промысламі. Такіх гаспадарак было 17 029. У гэты ж час павялічылася колькасць гаспадарак, якія не мелі жывёлы і кароў: адпаведна ў 1920 г. іх зарэгістравана 4105 і 18 791, інвентару не мелі 1392 гаспадаркі, без усякага пасеву засталіся 397 гаспадарак, 454 сялянскія гаспадаркі не мелі пасеваў у полі.

У гады першай сусветнай і грамадзянскай войн загінулі сотні і сотні ўраджэнцаў Чэрыкаўшчыны, прадстаўнікоў розных класаў і сацыяльных груп, розных нацыянальнасцей. Гады вялікіх узрушэнняў падарвалі фізічныя, маральныя, інтэлектуальныя сілы большасці людзей. У павеце ўзраслі беспрацоўе,

спекуляцыя, злачыннасць. Голад і галеча цяжарам ляжалі на людзях. У перыяд рэвалюцыі і грамадзянскай вайны грамадства, на жаль, не знайшло мірных шляхоў рашэння наспеўшых праблем, а ідэя сусветнай рэвалюцыі патрабавала ўсё новых і новых ахвяр.

С. Аляксеева.

Дакументы сведчаць

Дакументы, якія прыводзяцца ніжэй, узяты з розных крыніц. Гэта і архіўныя матэрыялы, і паведамленні газет і часопісаў, што друкаваліся ў першыя гады пасля рэвалюцыі, і адпаведныя зборнікі, выдадзеныя ў перыяд існавання СССР.

Справаздачы аб рабоце партыйнай канферэнцыі, з'ездаў камбедаў, пратаколы і пастановы сходаў валасных камітэтаў беднаты характарызуюць стыль і метады кіравання ўлады, яе адносіны да іншага погляду на ўзнікшае пасля рэвалюцыі ў павеце сацыяльна-палітычнае становішча. Архіўныя дакументы, якія раней не друкаваліся, прадставіў П. К. Башко.

У падборцы спачатку прыведзены матэрыялы, якія адлюстроўваюць палітычныя падзеі ў павеце, затым тыя, у якіх разглядаюцца гаспадарчыя пытанні.

ТЭЛЕГРАМА САЮЗА ЗЯМЕЛЬНЫХ УЛАСНІКАЎ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА ГУБЕРНСКАМУ КАМІСАРУ, ГУБЕРНСКАЙ ХАРЧОВАЙ УПРАВЕ, ГАЛОЎКАМВЕРХУ

18 лістапада 1917 г.

Чериковская уездная продуправа разослала волостным продкомитетам распоряжение (об) описи и принятии на учет живого и мертвого инвентаря всех землевладельцев с запрещением продажи. Протестуем против этого незаконного распоряжения и просим (об) немедленной отмене такового. (В) уезде начались погромы усадеб. Просим немедленной защиты.

Союз земельных собственников Чериковского уезда.

ЦДВГА, ф. 2005, воп. 1, спр. 87, л. 40.

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ ВА ЎСТАНОЎЧЫ СХОД ПА ЧЭРЫКАЎСКАМУ ПАВЕТУ

	тыс. чел.	%
Список № 1. Губернский Совет крестьянских депутатов и губернская организация социалистов-революционеров	57 320	87,74
Список № 2. РСДРП (объединенная) и Бунд	847	1,29
Список № 3. Объединенная Еврейская социалистическая рабочая партия (ОЕСРП)	139	0,21
Список № 4. Еврейская социал-демократическая рабочая партия	103	0,15
Список № 5. Союз земельных собственников	1559	2,38
Список № 6. Партия народной свободы (кадеты)	616	0,94
Список № 7. ... и внепартийный демократический комитет	42	0,06
Список № 8. Белорусские организации	15	0,02
Список № 9. Еврейский национальный избирательный комитет	2786	4,26
Список № 10. Губернская Польская рада	1291	1,97
Список № 11. Полесский комитет РСДРП(б)	607	0,92

Всего действительных голосов 65325

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 863, воп. 1, спр. 3, л. 52—52 ад.

СПІС ВАЛАСНЫХ САВЕТАЎ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

Название волост. Советов	*Местонахождение*
1. Братьковичский	ст. Братьковичи
2. Белецкий	ст. Лобановка
3. Должанский	ст. Лобановка
4. Долговичский	ст. Малетичи
5. Дубровицкий	ст. Кричев
6. Краснопольский	ст. Краснополье
7. Кричевский	ст. Кричев
8. Комаровичский	ст. Чериков
9. Лобановский	ст. Лобановка
10. Малетичский	ст. Малетичи
11. Мхиничский	ст. Выдернка
12. Ново-Ельнянский	ст. Краснополье
13. Палужский	ст. Краснополье
14. Стеринский	ст. Краснополье
15. Самотевичский	ст. Гайдуковка
16. Студенецкий	ст. Костюковичи

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 813, воп. 1, спр. 1, л. 73.

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА АГІТАТАРА ДАСНІНА Ў ВЧК АБ ПАЕЗДЦЫ Ў ДАЎГОВІЦКУЮ ВОЛАСЦЬ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

16 студзеня 1918 г.

Сегодня, 9 января, я в качестве референта посетил Долговичскую вол. Чериковского у. Могилевской губ.

Весть о разгоне Учредительного собрания послужила на руку противникам большевизма. Высланный комитетом «спасения» некий агитатор Боголепов восстанавливал крестьян против Совета Народных Комиссаров и вообще против Советской власти, мотивируя тем, якобы большевики не признают избранников народа в лице членов Учредительного собрания. Я изо всех сил старался созвать волостной сход, но это мне не удалось ввиду того, что волосной комитет первого созыва, узнав, что я делегирован Военно-революционным комитетом, всяческим образом тормозил работу по созыву схода.

Тогда я собрал деревенский сход путем обхода квартир каждого из крестьян. На сход явился и вышеупомянутый Боголепов и принес провокационную телеграмку такого содержания: «В 12 час. в ночь на 8 января вместе с немецкой делегацией из Петрограда скрылись Ленин и Троцкий, захватив с собой все ценности и переписки; немцы в Ревеле. В Петрограде образовано министерство социалистов во главе с Черновым». Толпа поддалась этой гнусной клевете, и по подтверждении бывшего члена продовольственной управы мне грозил самосуд. Но вдруг на сход явился матрос кронштадского гарнизона, оказавшийся сыном крестьянина, в избе которого произошел этот случай. Этот матрос приехал в кратковременный отпуск и по пути заехал в Смольный за получением литературы и подтвердил мое заявление, что слухи эти носят исключительно провокационный характер и ни на чем не основаны. Толпа устремилась в сторону автора телеграммы в надежде потребовать у него объяснения или фактического подтверждения. Но каково было их удивление, когда они увидели, что его не оказалось. Он удрал по разоблачении его провокационной деятельности матросом. Это послужило им самым точнейшим фактом подтверждения моих слов, и они охотно согласились выслушать меня. Многие подходили просить прощения и потом заявляли, что все эти выходки есть следствие того, что деревня лишена литературы. Иногда появляются газетки органа «Известия ЦК крестьянских депутатов 1-го созыва» и анонимные листки, призывающие к разгрому уездного Совета ноябрьского созыва, и вообще восстанавливают против Советской власти и призывают расправляться «с врагами народа — большевиками», как с «немецкими шпионами». Другая литература отсутствует.

Недавно они в назвавшем себя членом ЦК крестьянских депутатов узнали сына ближайшего помещика и уездного исправника. Он, переодевшись в крестьянскую куртку и лапти, заявил, что попал в ЦК крестьянских депутатов как представитель от крестьян Рогачевского у. Могилевской губ., и призывал громить «жидов», т. к. они, как и большевики, немецкие шпионы. Но один из крестьян узнал его и вывел его перед толпой на чистую воду. Толпа присудила его к самосуду, но, благодаря содействию местного священника, ему удалось улизнуть. Все деревни сплошь и рядом наводнены такими субъектами, и деревенцы жалуются на то, что о них никто не заботится, [некому] растолковать им или прислать газету.

Так ходил я от одной деревни к другой, раскрывая глаза обманутым попами крестьянам. Теперь вообще попам стало труднее провоцировать ввиду того, что в деревню вернулось много солдат, которые уже мало-мальски приведены в сознание.

Авторитет народных комиссаров с каждым днем усиливается по мере того, как Советы проводят в жизнь декреты на местах. Так, в Дрибинскую вол. Чаусского у. явился солдат из дер. Каребы и, собрав волостной сход, сменил бывшего председателя волостного Совета правого эсера, которому было предъявлено в обвинение ряд подлогов, вплоть до злоупотреблений при выборах в Учредительное собрание.

Даснин

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т. 2. Мн., 1957. С. 788—789.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ АРЫШЦЕ БУЙНЫХ ЗЕМЛЕЎЛАДАЛЬНІКАЎ У ЧЭРЫКАВЕ Ў СТУДЗЕНІ 1918 Г.

В Могилевскую губернскую тюрьму доставлены из Черикова арестованные крупные землевладельцы — помещики: Вац[лав] Василевский, Влад[ислав] Василевский, кн. Радзивилл, секретарь «Союза земельных собственников» Л. Венюков и чериковский город[ской] голова д[окто]р М. Трженецкий. Все эти лица арестованы по ордеру губернского исполнит[ельного] ком[итета] Сов[ета] крестьянских рабочих и солдатских депутатов. Весь материал об этих лицах будет передан в следственную комиссию губ[ернского] исполкома.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т. 2. Мн., 1957. С. 829—830.

ПАСТАНОВА НАДЗВЫЧАЙНАГА СЯЛЯНСКАГА З'ЕЗДА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА АБ ПАДТРЫМЦЫ І АХОВЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

26 чэрвеня 1918 г.

Чериковский уездный чрезвычайный крестьянский съезд, обсудив вопрос о текущем моменте и о власти постановил: горячо приветствовать Советскую власть за ее преданность интересам трудового народа. Чериковский съезд заявляет, что трудовое крестьянство будет стойко и верно поддерживать власть Советов рабочих, солдатских и крестьянских депутатов, вместе с тем съезд заявляет, что и впредь власть должна быть создана только из представителей тех партий, которые показали свою непоколебимую преданность революции и народу не на словах, а на деле. Чериковский уездный чрезвычайный крестьянский съезд ни на минуту не сомневается, что рабочая и крестьянская власть, опирающаяся на могучие плечи всего трудового народа, быстро сумеет одолеть всех врагов революции, которые бесстыдно предают интересы всего народа своим саботажем и стараются подорвать власть Советов. Чериковский уездный чрезвычайный крестьянский съезд клеймит несмываемым позором партии соглашателей — правых эсеров и меньшевиков — эти партии прислужников буржуазии, окончательно смешавшиеся с рядами самых откровенных черносотенцев. Съезд с пренебрежением отмечает жалкий выкрик этих обанкротившихся политиканов по адресу демократической власти Советов Народных Комиссаров.

Да здравствует всемирная социальная революция!

Да здравствует беспощадная борьба с вековыми угнетателями!

Да здравствует Российская Социалистическая Федеративная Советская Республика!

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958, с. 68.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА САВЕТА МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ АБ ДАПАМОЗЕ ХЛЕБАМ НАСЕЛЬНІЦТВУ Г. МАСКВЫ

3 жніўня 1918 г.

1) Слушали о посылке хлеба в Москву для довольствия населения и рабочих гор. Москвы.

Постановили: заслушав телеграмму Народного комиссариата внутренних дел, переданную в копии из Облискомзапа за № 1062, о необходимости посылки хлеба для рабочих гор. Москвы и Петрограда, учитывая тот серьезный момент, когда костлявая рука голода хватает за горло Советскую власть, которая стоит только в защиту бедного класса и дала ему землю и волю, и что враги этой власти — капиталисты и помещики направляют все свои силы, чтобы путем голода задушить эту власть и повернуть рабочих и крестьян опять под свое владычество...

Поручить тов. Орлову немедленно приступить к уборке хлеба в имениях, засеянного бывшими помещиками, где это будет возможно, при помощи сельскохозяйственных машин, привлечь население и немедленно все собранное отправить в гор. Москву...

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С. 90—91.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ І ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ РКП(Б) ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

15 жніўня 1918 г.

На конференцию прибыло 33 делегата от нескольких ячеек, объединяющих 106 членов, официально состоящих в партии...*

Затем конференцией утверждается следующая повестка дня:

1) Текущий момент.
2) Доклады с мест.
3) Продовольственный вопрос и комитеты бедноты.
4) Организационный вопрос и текущие дела.

1) Текущий момент

По вопросу о текущем моменте выступил тов. Орлов, который сделал яркий доклад о внутреннем и международном положении Советской республики, предварительно обрисовав весь ход развития русской революции, всю предательскую работу международного капитала и его верных слуг — меньшевиков и эсеров.

По докладу единогласно была принята следующая резолюция: I Чериковская уездная конференция Коммунистической партии (большевиков), сознавая грозный час борьбы революционного коммунизма с буржуазией за власть, когда сплочение сил трудящихся масс есть единственное условие победы революции, постановила: призвать всех трудовых крест[ьян] и рабочих к вооруженной борьбе с контрреволюцией и тесному единению вокруг своих Советов рабочих и крестьянских депутатов. Мы, коммунисты, заявляем всему миру, что мы готовы и можем сражаться не только с социал-авантюристами и монархистами, но мы также готовы вести упорную борьбу с американским, германским и прочими буржуазными правительствами, тормозящими развитие мировой революции. И теперь, когда на горизонте загорается заря международного социализма, мы, коммунисты-большевики, обращаемся к вам, товарищи трудящиеся, с горячим призывом сплотиться единым революционным фронтом, чтобы дать жестокий отпор вашим вековым угнетателям. Мы верим, что в этой великой мировой борьбе, которая разгорается по всему классовому фронту, не империалисты выйдут победителями, а мы, трудящиеся массы.

Да здравствует коммунизм!

---

* Опущена вступительная речь председателя при открытии конференции.

2) Доклады с мест

Были заслушаны доклады от всех партийных организаций уезда. Все говорили одно, что в большинстве случаев в волостных и сельских Советах засели кулаки, которые тормозят партийную работу и не допускают организации комитетов деревенской бедноты. Все жаловались на отсутствие в уезде хороших работников, [на то], что деревня до сих пор положительно отрезана от всего живого мира из-за отсутствия газет и партийной литературы.

Постановлено: для самообороны от нападений кулацкой буржуазии на комитеты бедноты и партийные организации поручить уездному комитету партии принять меры к немедленному вооружению всех членов партии уезда и потребовать от военного комиссариата обезоружения всех кулаков в уезде и всех тех, кто не является членом Коммунистической партии. Требовать от уездного Совета немедленного ареста всех кулаков — членов волостных и сельских Советов, согласно декрету Совета Народных Комиссаров за нарушение Советской конституции. Поручить комитету партии выписать максимальное количество партийной литературы в долг с тем, чтобы последнюю посылать на имя партийных организаций для распространения среди населения, и вырученные за нее деньги уплатить конторам редакций и книжным складам, для чего комитету партии специально командировать человека в Москву.

3) Продовольственный вопрос и комитеты бедноты

Тов. Романов делает доклад о тяжелом продовольственном кризисе в Советской России, [возникшем] не потому, что в стране будто хлеба нет, а потому, что его не дают кулаки, закапывают в землю, гонят самогонку, спекулируют на нем. Он призывает конференцию к немедленному проведению в жизнь хлебной монополии. Тов. Щербитов параллельно с продовольственным вопросом дает подробный доклад о комитетах бедноты. Он видит в комитетах бедноты фундамент коммунистических обществ и призывает к немедленной организации всей деревенской бедноты в мощные профессиональные союзы, причем в эти союзы или комитеты бедноты должны приниматься независимо от их прошлой деятельности, взглядов и убеждений все бедняки, безлошадное и разорившееся крестьянство, т. к. нельзя ставить в вину человеку те преступления, за которые он понес наказание и которые совершались во время жестокого произвола и эксплуатации помещиками бедняков. Докладчик, критикуя, что такая дележка земли выгодна только кулакам, что чересполосица ведет к истощению земли, что в деревне много времени уходит на отыскание своих меж, делает выводы о необходимости и неизбежности коммунистической совместной обработки земли, а потому партия должна на таких началах воспитать комитеты бедноты, Советская власть должна снабдить их всеми сельскохозяйственными машинами, живым и мертвым инвентарем не только за счет государства, но и за счет деревенских кулаков. Только при этом условии комитеты бедноты подымут свое экономическое благополучие и будут усердно работать по выкачиванию излишков хлеба из рук богатеев деревни.

По докладу предлагается следующая резолюция, которая принимается единогласно.

Происходящий раздел земли в собственность оказался выгодным только для кулаков, у которых много скота, у которых живой и мертвый инвентарь налицо. Но безлошадным крестьянам-беднякам пользы от такой социализации земли никакой не получилось, поэтому эксплуатация рабочей силы и поныне развивается с успехом. Из этого следует, что освобождение бедняков — дело самих бедняков и только мощная организация деревенской бедноты в свои профессиональные боевые союзы — комитеты бедноты способна возродить деревенскую бедноту к жизни, освободить ее от экономического рабства кулаков.

I Чериковская уездная конференция коммунистов-большевиков считает своей священной обязанностью напрячь все свои усилия к повсеместной организации комитетов бедноты, спаянных между собой железной трудовой дисциплиной и воспитанных на строго коммунистических началах. Советская власть должна принять все меры к снабжению комитетов бедноты всеми предметами первой необходимости, живым и мертвым инвентарем, семенами и прочим не только за счет государства, но в первую очередь за счет кулаков. В комитеты бедноты допускаются все независимо от их политических взглядов и убеждений.

Конференция стоит на безусловном проведении в жизнь хлебной монополии во всероссийском масштабе и первым средством к этому считает комитеты бедноты,

которые должны взять у кулаков излишки хлеба на учет совместно с продовольственными отделами Советов.

4) Организационный вопрос

Докладчик тов. Подолякин подробно останавливается на необходимости развития партийной работы по всему уезду в целях успешной борьбы с буржуазией, мелкой и крупной, и со всей кулацко-поповской ватагой. Особенно же он подчеркивает необходимость партийной дисциплины и ради точного ее поддержания предлагает следующее:

1) Разъехавшись по местам, делегаты конференции должны позаботиться о повсеместной организации партийных ячеек.

2) В партию принимать людей надежных, решительных, преданных делу революции, отметая от себя всех предателей, хулиганов, соглашателей и врагов трудового народа.

3) Каждый член партии должен аккуратно вносить членские взносы; не внесший в течение 3 месяцев членского взноса исключается из партии.

4) Каждый член партии должен выписывать и читать свои партийные газеты.

5) Беспрекословно исполнять все постановления партии.

6) Всюду организовывать сельские и волостные комитеты бедноты.

7) В волостные и сельские Советы проводить своих партийных работников, которые всякий раз должны делать отчет партии о своей деятельности.

8) Каждому члену партии обязательно обучиться военному делу и быть вооруженным.

9) Все протоколы своих заседаний направлять* в уездный комитет партии.

10) Не вступать ни в какое соглашение с другими соглашательскими и социал-предательскими партиями меньшевиков и эсеров.

Настоящее принимается конференцией единогласно.

5) Текущие дела

По вопросу об образовании чрезвычайной пограничной комиссии по борьбе с контрреволюцией постановлено: образовать таковую в гор. Черикове над всеми уездами пограничной полосы Могилевской и Черниговской губ. Чериковский комитет партии считать не уездным, а районным.

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С. 189—193.

ПАСТАНОВА СХОДА СЯЛЯН НАВАЕЛЬНІНСКАЙ ВОЛАСЦІ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА АБ АРГАНІЗАЦЫІ КАМІТЭТАЎ БЕДНАТЫ

24 ліпеня 1918 г.

Заслушав доклад тов. Щербитова о необходимости взятия хлеба на учет, дабы излишки его правильно распределить среди населения трудовой республики, и принимая во внимание тяжелое положение деревенской бедноты, распыленной, неорганизованной, без живого и мертвого инвентаря, Новоельнинский волостной сход постановил приступить к немедленной организации комитетов бедноты в деревнях, которые должны заняться учетом всей бедноты волости, ее самоорганизацией, взятием на учет хлеба и живого и мертвого инвентаря у деревенских кулаков.

По вопросу о саботаже попов, отказавшихся сдать волостному Совету книги о записи родившихся и умерших, постановлено потребовать от попов немедленной сдачи книг, в противном случае привлечь их к суду за саботаж.

О распределении лугов постановлено наделить в первую очередь безземельных, затем малоземельных и т. д. по душам.

Звезда. 1918 г., 8 жніўня.

---

* В тексте «сообщать».

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ЗВЕЗДА» АБ АРГАНІЗАЦЫІ ЯЧЭЕК РКП(Б) І КАМБЕДАЎ У МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

3 верасня 1918 г.

...Чериковский у. Чериковская организация ведет жесточайшую борьбу с провокаторами и темными личностями, агитирующими против Коммунистической партии и Советской власти. Чериков сильно нуждается в литературе, которая едва доходит до него. Ведется работа по организации комитетов бедноты, которые во многих волостях уже организованы. Организация маленькая, членов около 15, но ведет работу по организации ячеек в волостях. 2 волостных комитета уже избрано. Еще 2 волостных ячейки организуются...

Звезда. 1918 г., 3 верасня.

СА ЗВОДКІ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ІНСТРУКТАРСКАГА ПАДАДДЗЕЛА АДДЗЕЛА ЎПРАЎЛЕННЯ ВОБЛВЫКАНКАМЗАПА АБ АРГАНІЗАЦЫІ КАМБЕДАЎ І БАРАЦЬБЕ З ЛЕВЫМІ ЭСЭРАМІ НА VI З'ЕЗДЗЕ САВЕТАЎ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА

5 верасня 1918 г.

После того, как на Чериковском съезде большинством была принята резолюция левых эсеров, фракция коммунистов покинула съезд. Тогда за отсутствием кворума съезд прекратил свою работу. Фракция большевиков объявила себя временной властью в уезде. Новый съезд назначен на 15 сентября.

По вопросу об организации комитетов бедноты революционной частью съезда было постановлено: немедленно приступить к повсеместной организации комитетов сельских, волостных и уездных. С 25 августа по 10 сентября все волостные Советы должны созвать волостные сходы комитетов бедноты, на которых избираются комитеты бедноты от 3 до 5 лиц. На 15 сентября созвать уездный съезд комитетов бедноты, который избирает уездный комитет бедноты от 5 до 9 лиц.

Для самообороны от нападений кулацкой буржуазии на комитеты бедноты и партийные организации поручить военному комиссариату принять меры к немедленному вооружению комитетов бедноты и обезоружению кулаков, согласно приказу Высшего военного Совета.

В продовольственном вопросе съезд стоит на безусловном проведении в жизнь хлебной монополии во всероссийском масштабе и взятии на учет фабрично-заводских продуктов производства и также немедленном установлении на них твердых цен...

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С. 198—199.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АДДЗЕЛА НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ ЧЭРЫКАЎСКАГА САВЕТА

не пазней лістапада 1918 г.

1. Преобразованы педагогические Советы средних учебных заведений.
2. Установлено выборное начало на административные должности.
3. Осуществлено отделение церкви от государства в пределах школьной жизни.
4. Разосланы анкетные листы, которые в настоящее время по мере заполнения их учащими (учителями), подготовляются к отправке в Облискомзап.
5. ...
6. Приступлено к составлению кандидатских списков по назначению на должность преподавателей. Отдел содержится из средств Совдепа — 4665 руб.

ЦДА Расіі, ф. 2306, воп. 15, спр. 26, л. 5.

З ПРАТАКОЛА VII ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА КАМБЕДАЎ ПА ПЫТАННЮ АБ НАДЗВЫЧАЙНЫМ РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ПАДАТКУ

28 лістапада 1918 г.

...Докладчиком выступает тов. Вержбицкий, который пояснил, что налог этот производится исключительно на Красную Армию, которая нам нужна, чтобы дать отпор союзной буржуазии. И на Чериковский у. пало [из] этого 10-миллиардного налога 7 300 000 руб. (Крики с мест: «Чериковский у. не выдержит эту сумму»).

Тов. Орлов [говорит:] Товарищи, когда была объявлена сумма налога, павшего на Чериковский у., я видел, что многие из вас инстинктивно дрогнули. Вы кричите, что Чериковский у. не в состоянии будет уплатить эту сумму. Имейте в виду, что с бедного крестьянина и рабочего требовать никто не будет. По приблизительному подсчету, мною добыты сведения, около 20 000 000 руб. денег находится в Чериковском казначействе и на руках. И много кулаков запрятали бутылки, набитые керенками, в землю. Так чего же нам, не имущим денег, если вы являетесь представителями бедноты, защищать интересы кулачества?

Предлагает следующую резолюцию:

«4 года войны ограбили большинство городского и сельского населения; но зато сосредоточили в руках немногочисленной городской и сельской буржуазии неимоверные барыши. Революция поставила своей задачей улучшить положение бедняка за счет богача, но богач, получив эту обязанность*, зарыл все свои капиталы в землю, где они лежат без движения, превратились в мертвый капитал.

Чериковский уездный съезд комитетов бедноты, учитывая нашествие всемирной контрреволюции, постановляет:

Принять все меры к недопущению того позорного положения, когда все эти отнятые у бедноты за время войны и принадлежащие ей, бедноте, богатства придет и ограбит чья-то чужая рука для того, чтобы нас же потом этими деньгами могли купить и продать. Поэтому съезд приветствует постановление Центрального Комитета о 10-миллиардном чрезвычайном налоге, для проведения которого съезд призывает всю революционную часть крестьянства приложить все усилия».

По оглашении резолюция ставится на голосование и принимается большинством голосов.

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С. 490—491.

З ПРАТАКОЛА VII ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА КАМБЕДАЎ ПА ЗЯМЕЛЬНАМУ ПЫТАННЮ

28 лістапада 1918 г.

По сообщению мандатной комиссии на съезд прибыло 193 делегата с правом решающего голоса, что составило кворум...

По земельному вопросу возникают довольно продолжительные прения. Высказывается целый ряд ораторов, говорящих против общественной обработки земли и за таковую. Причем несколько проникших на съезд кулаков поднимают шум, выражая этим нежелательность коммунистической обработки земли. Председатель неоднократно призывает [их] к порядку.

После прений заключительное слово предоставляется тов. Щербитову. Щербитов говорит: «Товарищи, я внимательно проследил за словами всех выступавших ораторов по земельному вопросу и убедился, что большинство из них, прибывших на съезд чистейшей воды бедняков, завтра согласны приступить только к коммунистической обработке земли. Но здесь есть наверное не меньше дюжины или больше кулаков, которые, видя, что все равно их столыпинская обработка земли на этом съезде принята не может быть, стараются сорвать съезд. Им не хочется стать наряду с каждым тружеником-бедняком и крайне нежелательно распрощаться с тем, что они за 5 руб. прошлое лето нанимали себе поденщика, а потом сбывали хлеб по 80 руб. пуд. Подобных явлений, где маленькая кучка кулаков против большинства беднейшего крестьянства старается провести свою политику, чтобы и в будущем нанять поденщика за 5 руб.,— это недопустимо. Вы, товарищи бедняки,

* Так в документе.

собрались сюда на съезд, чтобы [вы] сказать свое пожелание, свою нужду, а эти 10 кричал-горлопанов хотят своими сильными горлами заглушить вас. Так чего же с ними церемониться? Известно, что меньшинство должно подчиниться большинству.

Поэтому я предлагаю следующую резолюцию:

Чериковский уездный съезд комитетов бедноты из опыта последних 2 лет отмечает наступающее тяжелое истощение земли. Оно наступает потому, что в уезде до сих пор ведется чересполосная, мелкособственническая обработка земли; кроме того, все бывшие помещичьи земли в уезде в этом году почти не были удобрены. Вместе с тем как растет население, как земля в уезде все больше и больше дробится на мелкие полоски, крестьянство не в состоянии повести правильную обработку земли и неизбежно придет к пропасти.

Съезд комитетов бедноты единственным выходом из этого положения считает общественную обработку земли. Съезд поручает земельному отделу принять меры к скорейшей организации с[ельско]-х[озяйственных] коммун и трудовых артелей, а также повести сильную агитацию среди обществ уезда в том направлении, чтобы убедить население в необходимости и неизбежности общественной обработки земли. В отношении же вопроса относительно социализации земли того населения, которое не войдет в коммуны, земельный отдел должен работать в том же направлении, чтобы правильно учесть землю и по возможности равномерно распределить таковую между населением трудовой республики. Это же население общественными силами должно обрабатывать оставшиеся от распределения земли».

Означенная резолюция большинством голосов 148 против 45 принимается ...

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С. 491—492.

СПРАВАЗДАЧА АБ ДЗЕЙНАСЦІ ЧЭРЫКАЎСКАГА КАМІТЭТА ПАСЯЎНОЙ ПЛОШЧЫ І КАМІСІІ ПА АКАЗАННЮ ДАПАМОГІ ЧЫРВОНААРМЕЙСКІМ ГАСПАДАРКАМ ЗА ПЕРЫЯД З 10 ЛІПЕНЯ ПА 1 КАСТРЫЧНІКА 1919 г.

Не раней 1 кастрычніка 1919 г.*

В целях поднятия сельского хозяйства и уничтожения площади недосева, [возникшего] благодаря царскому правлению, с каждым днем разрушавшему [сельское хозяйство], Советская власть, власть самого порабощенного класса, задалась целью во что бы то ни стало не допустить разрухи хозяйства и спасти пролетариат от надвигающегося с каждым днем голода и обеспечить оставшиеся семьи призванных от всяких невзгод, оставленных в наследие капиталистической войной, правителями старой закваски. Советская власть, взвесив все это, организовала по всей РСФСР органы — оргасевы, исключительно следящие за поднятием сельского хозяйства, сокращением площади недосева и обеспечением обездоленных семей призванных. Со дня, т. е. с 10 июля сего года, своей организации оргасевом сугубое внимание обращено на обсеменение незасеянных полей, в первую очередь семейств красноармейцев и во вторую — советских организаций и беднейшего населения...

О сельскохозяйственном инвентаре

Во избежание тех ненормальных явлений в отношении приобретения гражданами сельскохозяйственного инвентаря и для более равномерного распределения такового между нуждающимися, Советской властью намечены следующие меры: весь полученный по плановому наряду мертвый инвентарь, равно и получаемый, исключительно распределять по прокатным станциям, сеть которых расширять как можно больше, т. е., если представляется возможность, то и в каждой деревне уезда, смотря по количеству получаемого инвентаря. Такой порядок несомненно предусмотрит на месте бедноту и, как факт, в первую очередь и снабдит ее инвентарем. Таким образом, оргасевом к существующим уже прокатным станциям открыты дополнительно при каждой волости и полученный сельскохозяйственный инвентарь, как то: соломорезок 12 штук, железных конных приводов 3 штуки,

* Датируется по содержанию.

круглых конных приводов 3 штуки, длинных конных приводов 3 штуки, плугов пароконных 50 штук, передков к плугам 50 штук, веялок с ручками 2 штуки, рукавов к веялкам 2 штуки, сит к веялкам 10 штук, молотилок конных 4 штуки, борон 3 штуки, ящиков к соломорезкам 20 штук, серпов 250 штук, плугов одноконных 110 штук, сепараторов 5 штук, бабок 20 штук, вил 20 штук, молотков 10 штук и брусков для кос 2400 штук, лемехов 50 штук и цепей 8 п. 10 ф.— равномерно по каждой станции распределен...

Чтобы имеемым исправным инвентарем нуждаемое население могло бы обработать свои земли, [такового] далеко не хватает, ввиду чего перед губоргасевом телеграфно возбуждено ходатайство о присылке в спешном порядке на первый случай хотя бы 250 штук одноконных плугов. О снабжении же прокатных и зерноочистительных пунктов полным комплектом сельскохозяйственного инвентаря своевременно представлена в губоргасев смета. Вследствие взвинчивания кустарными мастерскими, кузнецами с каждым днем невероятных цен, губоргасевом запроектировано по всей губернии при каждой прокатной станции открыть свои ремонтные мастерские, кроме того, и центральную производительную, на что уже отпущено 50 тыс. руб...

О землях государственного фонда

По имеемым заданиям и мероприятиям оргасева о взятой на учет в фонд государства незасеянной площади, примерно около 2 тыс. дес., ввиду чересполосного пользования и временного распределения помещичьих земель между хлеборобами по революционным условиям, нет возможности, и в этой области реальные меры не предпринимались*; что же касается реализации урожая хлебов и трав 1919 г. также средствами уоргасева не производилась, за отсутствием для этой цели государственного фонда посевов, за исключением советских хозяйств, которые своими силами свой урожай своевременно реализовали. Кроме вышепроизведенного, оргасев по своей инициативе совместно с уземотделом получаемых бракованных лошадей с конского завода распределяет исключительно по безлошадным и обездоленным семьям красноармейцев и беднейшего населения.

Уполномоченный Чериковского уоргасева Нетылько
Делопроизводитель**

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. Т. II. Мн., 1971. С. 207—210.

СПРАВАЗДАЧА АБ ДЗЕЙНАСЦІ ЧЭРЫКАЎСКАЙ ПАВЯТОВАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РКП(Б) ЗА МАЙ — СНЕЖАНЬ 1918 г.

Не раней 1 студзеня 1919 г.***

Чериковская организация Российской Коммунистической партии организовалась в мае месяце 1918 г. В первые дни организация насчитывала всего несколько товарищей, всего 3—4 человека. Это было как раз в то злопамятное время, когда засилье левых эсеров в Советах вообще, а в уездном в частности, было до крайности велико и борьба с ними была в полном разгаре. Основу этой организации положили тт. Орлов и Щербитов — единственные тогда коммунисты в уездном Совете. Вот этим-то двум товарищам пришлось вести борьбу с 13 человеками, так называемыми левыми эсерами и беспартийными, которые тогда заседали в уездном Совдепе. Но, несмотря на то, что эсеры были во много раз многочисленнее их и несмотря на всю ту деятельность, которую они проявляли с целью быть оставленными в уездном Совдепе, и тем самым иметь возможность проводить свою кулацкую политику, им в конце концов положительно ничего не удалось сделать, ибо наши два товарища настолько были сильны духом и так настойчиво работали, что совершенно не являлось никакой возможности их победить. Результаты их борьбы действительно видны. С тех пор Советы в большинстве своем состоят из коммунистов.

---

* Так в документе.
** Подпись неразборчива.
*** Дата окончания отчетного периода.

После окончательной победы над кулаками в Совете стали обращать серьезное внимание на организацию местной партии и ячеек в уезде. Нельзя сказать, что работа именно шла так, как она должна была идти; но нельзя также сказать, что ничего решительно не сделано. Ибо с таким ничтожным количеством партийных работников больше ни в коем случае сделать невозможно было. Факт тот, что за все время существования Советской власти в Чериковском у. ни в одном месте не было выступлений против Советов. С течением времени работа начала налаживаться, и организация пошла полным ходом. Местная Чериковская организация стала пополняться товарищами, прибывающими из других мест, а также местными рабочими, служащими и тому подобными лицами. Так что партия все крепла и крепла. В настоящее время уездным комитетом партии организованы в уезде ячейки, которые также приступают к правильному строительству жизни на местах.

В области организационной работы комитетом сделано следующее: всеми Совдепами в уезде, в том числе и уездным, руководит комитет партии. Все вопросы, имеющие более или менее важное решение, обсуждаются раньше в партии, а затем уже передаются на заключение в Совдеп, который в большинстве случаев утверждает постановление партии. В состав Совета входят 80 % коммунистов, остальные сочувствующие, и понятно, что фракция коммунистов проводит в жизнь все постановления коммунистического правительства.

В уезде в настоящее время организованы 22 ячейки, и понятно, что в тех волостях и селах, где ячейки имеются, работа в Совдепах и комитетах бедноты идет более успешно и скорее, чем в волостях, где ячеек не имеется. Из числа 22 ячеек, организованных в уезде, 8 организованы по волостям, 12 — по селам и 2 ячейки организованы в местных красноармейских частях. В одной из последних двух ячеек 15 человек, организована 18 ноября 1918 г., а в другой — 19 человек и организована 29 ноября того же года. Но постепенно число членов ячеек все более и более увеличивается. Так, ячейки в других красноармейских частях находятся в периоде организации. Что же касается профессиональных союзов, то таковых отдельных ячеек не имеется, но члены союзов состоят членами местных Коммунистических партий. Всего профессиональных союзов до настоящего времени в Чериковском у. было 5, и во всех их правлениях были и коммунисты. В настоящее время союзы находятся в периоде переорганизации и, следовательно, политический их оттенок будет виден впоследствии.

Ни в одном из кооперативов Чериковского у. ячеек не имеется, но состав их пайщиков разнообразный. Единственный кооператив, в правлении которого имеются коммунисты, так это только рабочий независимый. В области кооперативной работы партией было постановлено, чтобы все члены партии, кандидаты и сочувствующие непременно записались пайщиками в кооперативы таким образом, чтобы силы коммунистов были бы распределены по всем кооперативам более или менее равномерно для того, чтобы можно было посредством агитации вытолкнуть из правлений все буржуазные и мелкобуржуазные элементы. Что же касается союза кооперативов, который является одним из самых могущественных экономических аппаратов в уезде, то еще в сентябре месяце текущего года партией была выделена ревизионная комиссия в составе двух членов партии и представителя государственного контроля, коим и было поручено произвести строгую ревизию союза кооперативов. Было обращено также серьезное внимание на те личности, которые двигали этим аппаратом. И хотя партией было выяснено, что личности эти — элементы либеральные, партией в интересах самого дела личности удалены не были, а оставлены до тех пор, пока партия не в состоянии будет поставить во главе этого дела своих партийных работников, которые вполне сумеют справиться со всеми задачами кооперативного дела. В общем, в области организационной работы шаги партии довольно крупные. Вообще, где только чувствовалась необходимость в организаторе и тому подобном, партией немедленно посылались туда товарищи. Так, например, после издания Совнаркомом декрета о перевыборах волостных и сельских Советов партией сейчас же были выделены товарищи по числу волостей, по одному на волость, и разосланы на места для немедленного приведения в исполнение этого декрета, и результаты этих перевыборов довольно хорошие.

В области подготовки партийных работников партией были посланы в областную партийную школу четыре товарища и от информационно-инструкторского подотдела — два товарища. Что же касается своих школ и курсов, то таковые организовать не представлялось никакой возможности за неимением работников.

За время существования партии прочитано несколько лекций местными и приезжающими товарищами; число же прочитанных лекций указать невозможно за

неимением перед собою записи таковых. Митинги в первые месяцы организации устраивались довольно редко, но в настоящее время в сравнении с прошлым, митинги устраиваются довольно часто. Так, например, в настоящее время митинги устраиваются не менее одного раза в неделю, в то же время как раньше они вряд ли устраивались хотя бы раз в месяц. Посещаемость митингов довольно значительная. Большинство посетителей — красноармейцы и рабочие. Кроме того, были устроены митинги специально для красноармейцев. Главным образом, в устройстве митингов встречается задержка в помещениях, которых в городе совершенно не имеется.

Личный состав Чериковской организации: действительных членов 57 человек и кандидатов около 100 человек. Всего ячеек в уезде 22, из них 13 представили списки своих членов; остальные же, несмотря на неоднократные запросы, до сего времени не представили списки своих членов. Думалось, что на уездной конференции, которая была назначена на 22 декабря, согласно сделанному распоряжению, делегаты каждой ячейки прибудут с полными письменными докладами и списками; но ввиду разразившейся страшной непогоды делегаты не съехались, и тем самым подрайонный комитет лишился возможности представить полные доклады о деятельности каждой ячейки в отдельности, а также и списки последних.

Общее число членов и кандидатов ячеек, списки которых представлены, составляет 242 товарища, что вместе с Чериковской организацией составляет около 400 человек. Что же касается количества членов остальных 9 ячеек, то комитету партии по вышеуказанным причинам совершенно неизвестно.

Что же касается остальных более подробных сведений, то таковые будут представлены в самом непродолжительном времени, по получении таковых в свою очередь от волостных и сельских ячеек.

Председатель комитета*

Секретарь*

Борьба за Советскую власть в Белоруссии 1918—1920. Т. 1. С. 435—438.

СПРАВАЗДАЧА АБ ДЗЕЙНАСЦІ ЧЭРЫКАЎСКАЙ ПАВЯТОВАЙ КАМІСІІ ПА АКАЗАННЮ ДАПАМОГІ СЕМ'ЯМ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ

12 чэрвеня 1920 г.

Со дня организации комиссии по оказанию помощи красноармейским хозяйствам особое внимание было обращено на обследование и зарегистрирование семейств красноармейцев, призванных в ряды Красной Армии, для оказания таковым той или иной помощи. Для этой цели по волостям были назначены делопроизводители для более правильного учета красноармейских хозяйств. В первую очередь было приступлено к раздаче ссуд семьям красноармейцев: 16 волостям и гор. Черикову, причем все семейства красноармейских хозяйств по постановлению волкомиссии, а равно укомиссии были разделены на разряды: 1, 2, 3, 4, учитывая семейное положение. С приближением весенней полевой кампании укомкрасхозом было приступлено к запашке полей красноармейских хозяйств, для чего были разосланы по волостям семена, притом же проведена в жизнь «Неделя расширения посевной площади». Для этой цели назначены были по уезду от компарта инструктора, на коих лежала ответственность применять трудовую повинность на многолошадных граждан, вести правильный учет хлеба у имущих граждан и таковой раздать бедным семьям красноармейских хозяйств. Производилась раздача лошадей, находящихся в конском запасе, не годных к военной службе. Организована сельскохозяйственная мастерская в гор. Черикове, в каковой в первую очередь производится ремонт сельскохозяйственных орудий с прокатных станций, каковыми пользуются семьи красноармейцев. Производится ремонт плугов и пр.

С 1 мая 1920 г. производится раздача лошадей, конфискованных у дезертиров, которые выдаются семьям красноармейцев на временное пользование до представления дезертирами из воинской части документов. Ввиду ухода красноармейцев на

* Подпись неразборчива.

фронт некоторые семейства остались без средств к существованию за неимением рабочих рук. Таким семьям красноармейцев была оказана и оказывается помощь рабочими руками. Подготовлены документы для выдачи ссуд на вновь призванных на фронт красноармейцев, но за неимением кредита помощь таковым оказывать не представляется возможным. Срочно проводится в жизнь инструкция Гомельского губкомкрасхоза в целях поднятия на должную высоту работы укомкрасхоза, а равно и волкомкрасхозов, в остальном же производится планомерная текущая переписка.

Острая нужда ощущается [в связи с] неимением кредита, полным отсутствием бумаги и канцелярских принадлежностей; недостатком для засева полей красноармейских хозяйств; неполным штатом, что слишком тормозит работу; необходимы канцелярские работники: секретарь, бухгалтер, счетовод и конторщик, в противном случае ввиду расширения функции укомкрасхоза все делопроизводство замерзает. Имеется налицо один делопроизводитель, который не в силах [вести] всю работу укомкрасхоза. Необходима бумага для заготовки опросных листов, деньги для высылки делопроизводителям волкомкрасхозов в жалованье на разъезды и канцелярские расходы, что до сего времени таковым не отпускалось. За неисполнением нужд укомкрасхоза далее работу и оказание той или иной помощи семьям красноармейцев оказывать не представляется возможным и всякую ответственность укомкрасхозу приходится с себя слагать.

За председателя укомкрасхоза	*(подпись неразборчива)*
Секретарь	*(подпись неразборчива)*
Губинструктор	*В. Потемкин*

Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г.— июль 1920 г.). Сборник док. и мат. *Мн., 1961. С. 392—393.*

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ РАБОЦЕ ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНСКАЙ НАРАДЫ РКП

1—3 кастрычніка 1920 г.

Чериковский Уком (Ковалев). Перерегистрация производилась отдельно в городе и уезде. Из городской организации будет утверждено только 20 товарищей, а остальные 15 — за отсталость переведены в кандидаты. Один за пьянство и разврат исключен. Исключен также за невыполнение партийной дисциплины бывший предисполкома Семененко.

2-я продмобилизация выполнена. В дополнение к ним мобилизовано в качестве уполномоченных и агентов 20 тов. Агитационной литературы нет. Ведется устная агитация. Назначены в 5 волостях сходы, где будут ставиться продовольственные вопросы.

Съезд Советов прошел хорошо. Исполком избран из 8 коммунистов и 7 беспартийных. Беспартийных конференций состоялось 7. Из них 3 волостных, одна уездная, 4 конференции крестьянок.

Политическое состояние уезда благополучное. Отношение к власти хорошее.

Дезертирства в уезде нет. Бандитизм ликвидирован действиями назначенной тройки.

Материал «Недели крестьянина» отослан в Губком.

По постановлениям Губконференции ничего не сделано. Налаживаются отделы секретариат, Женотдел и Военно-трудовой.

Вопрос «о верхах и низах» не обсуждался. Чувствуется оторванность верхов от массы. Вопрос следует обсудить.

Для Красной Армии постановлено произвести неделю сбора обмундирования, выпустить листовку, поднять работу Воензага.

Вопросы докладчику:

Известно ли Укому, что в Черикове находятся профессора, 2 юриста, которые занимаются землепашеством. Используются ли все эти спецы?

Ковалев: Все спецы будут использованы в институте, который открывается в Черикове...

Известия Гомельского губернского комитета РКП (б). 1920, № 5. С. 19, 20.

АБ БАНДЫТЫЗМЕ Ў ЧЭРЫКАЎСКІМ ПАВЕЦЕ

Для борьбы с развивающимся бандитизмом в Чериковском уезде губком в начале ноября выдвинул командиром всеми вооруженными силами по борьбе с бандитизмом в Чериковском уезде тов. Фернебок, которому также должен подчиняться штаб уездтройки и милиции. Особому отделу 16-й армии было предложено работать в контакте со штабом и тов. Фернебоком. Тов. Чернявский, находящийся как уполномоченный Губкомом по продкампании, был утвержден как политический уполномоченный губкома по борьбе с бандитизмом. Ему также было поручено принять меры к привлечению местной организации к активной борьбе и помощи отряду.

Чериковскому укому было указано на недостаточно энергичную работу по борьбе с бандитизмом. В Чериков послан отряд из 80 чел. слушателей губпартшколы.

Известия Гомельского губернского комитета РКП(б). 1920, № 5. С. 32.

* * *

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БРАЦЬКАВІЦКАГА ВАЛАСНОГА САВЕТА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА АБ ПЕРАВЫБАРАХ САВЕТА І АРГАНІЗАЦЫІ КАМБЕДА*

30 жніўня 1918 г.

...3) Об организации волосного комитета деревенской бедноты, а в связи с этим вопросом о переизбрании волостного Совета. По рассмотрении вопроса об организации волостного комитета деревенской бедноты решено существующий президиум Совета подтвердить, за исключением заведующего земельным отделом, с окладом жалованья председателю Совета 300 руб. в месяц; заведующим хозяйственным отделом оказался избранным Сергей Ребянков с окладом жалованья 200 руб. в месяц, заведующим же продовольственным отделом оставлен Е. Чатневцев с окладом жалованья 250 руб. в месяц. А также организован волостной комитет деревенской бедноты, в каковой оказались избранными: председателем Помазков Григорий, а членом Осипенко Федор с уплатой жалованья председателю 300 руб. и члену [комбеда] 250 руб. в месяц с возложением на них учета хлеба у населения...

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ МХІНІЦКАГА ВАЛАСНОГА САВЕТА АБ КАНТРОЛЮ ЗА МЛЫНАМ І БАРАЦЬБЕ СА СПЕКУЛЯЦЫЯЙ

1 верасня 1918 г.

...6) Решали вопрос о взимании платы за помол зерна на ветряных мельницах и единогласно постановили: каждый владелец или арендатор ветряной мельницы обязан при первом требовании волостного Совета уплатить Совету за год 15 п. муки, если мельница работала на 1 осад (камень), и 20 п., если мельница работала на 2 осада.

7) Относительно Артеховской круподерки и мельницы постановили поручить Совету установить таковой же контроль, как и на Выдренской паровой мельнице...

8) Собрание единогласно постановило в пределах волости бороться самыми решительными мерами со спекуляцией всякого рода...

---

* Усе дакументы, акрамя апошняга (са справаздачы прадстаўніка Чэрыкаўскага павета на Магілёўскай харчовай нарадзе), надрукаваны ў зборніку дакументаў «Комитеты бедноты Белоруссии» (Мн., 1958).

З ПАСТАНОВЫ СХОДА ПРАДСТАЎНІКОЎ САВЕТАЎ І КАМБЕДАЎ ПАЛУЖСКАЙ ВОЛАСЦІ ПА ХАРЧОВАМУ ПЫТАННЮ І ІНШЫЯ

22 верасня 1918 г.

...3. По продовольственному делу собрание большинством голосов приняло следующую резолюцию, предложенную тов. Матвеенко. Всеми мерами содействовать учету хлеба в деревнях, точно определяя излишки и недостатки. Излишки на месте же распределить между голодающим населением волости по твердым ценам. Экономический хлеб, оставшийся от посева и уплаты за работу, доставить в волость для удовлетворения голодных под самым неослабным и тщательным контролем, чтобы хлеб не попал в руки лентяев и паразитов. Хлеб, выданный на посев по твердым ценам, должен быть в будушем году возвращен в хлебозапасный магазин. Для не имеющих средств выдавать хлеб в долг.

4. По вопросу об организации комиссариата по народному образованию при Совете собрание приступило к выборам такового. Избранными оказались Антон Матвеенко, Савелий Панкратенко, Андрей Екимченко и Самсон Астапенко.

5. По школьному вопросу принята следующая резолюция:

При участии членов волостного отдела по народному образованию и сельских Советов срочно озаботиться подысканием в деревнях помещений под школы, которые взять за плату или бесплатно по соглашению общества или владельца, плата за которые должна быть выдана опять-таки по усмотрению общества. Школьные помещения приготовить к 1 октября. Ремонт также отнести на обязанность общества. Кроме сего, ассигновать на приобретение книг и письменных принадлежностей 3000 руб. Ввиду того, что дер. Палуж нуждается в открытии второго комплекта при училище, собрание постановило открывшийся в с. г. комплект в хуторе Азанчевке перевести в дер. Палуж.

6. По вопросу об учреждении ответственной власти в деревнях собрание постановило:

Признавая теперешнее положение деревни расшатанным из-за отсутствия твердой ответственной революционной власти, немедленно организовать в деревнях выборную, а не очередную власть, которая должна отвечать перед высшей властью за неаккуратное исполнение своих обязанностей.

7. Текущие дела. Ввиду того, что арендаторы садов в имениях нарушали установленные таксы при продаже яблок, собрание постановило наложить контрибуцию на арендаторов: в имении Грибы — 3000 руб., в имении Гнилище — 1000 руб., в имении Горы — 500 руб. В эти же сады постановлено избрать контрольных, которые могли бы следить за арендаторами. Избранными оказались Марк Балабусов, Остап Курачов, Василий Хомченко и Петр Корнеенко. Суточное вознаграждение контрольным постановлено по 10 руб. в сутки из сумм, вырученных из контрибуций, наложенных на сады. Твердые цены на яблоки устанавливаются следующие: антоновка — 5 руб. за пуд и вообще все зимние яблоки, а на летние — не дороже 4 руб.

8. По вопросу о перевыборах волостного Совета собрание постановило:

Избрать ревизионную комиссию, которая могла бы проверить действия Совета. Избранными оказались Федор Кабысик, Егор Якименко и М. Зотов. Суточное вознаграждение ревизионной комиссии постановлено по 10 руб. в сутки. Суточные должны уплачиваться за счет виновных, т. е. за счет того лица, которое комиссией будет обнаружено, что оно действительно виновато. После чего приступлено к выборам Совета. Избранными оказались тт. Матвеенко, Шаблоков, Нетылько и Екименко и кандидаты Степан Кудрицкий и Матвей Зотов.

9. По вопросу о разделении волости на 2 единицы волостные постановили поручить Совету возбудить об этом ходатайство.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ДУБРОВІЦКАГА ВАЛАСНОГА КАМБЕДА АБ БУДАЎНІЦТВЕ МЛЫНА І ІНШЫЯ

20 кастрычніка 1918 г.

...2. Об отпуске заимообразно 12 000 руб. на устройство мельницы.

Постановили: 12 000 руб., находящихся в Чериковском к[азначейст]ве на хранении, вырученных от продажи ржи из хлебозапасного магазина, отпустить о[бщест]ву потребителей Дубровицкому заимообразно для устройства мельницы в имении Боровой.

3. Об уплате недоимок за 1917 г. и $^1/_3$ оклада 1918 г.

Постановили: недоимку за 1917 г. и $^1/_3$ оклада 1918 г. уплатить.

4. О добавлении члена Совета и взаимоотношениях к[омите]та бедноты и волостного Совета.

Постановили единогласно при 3 воздержавшихся: избрать Василия Федоровича Богдашева.

5. О переводе почты из волостного Совета в другое место.

Постановили: почтовое отделение оставить на месте.

6. Об обмолоте ржи в Вещинской экономии членом уездного земельного отдела Шнейдеровым.

Постановили: ходатайствовать перед уездным Советом о высылке комиссии для расследования дела Шнейдерова в Вещинской экономии.

7. Об училищах.

Постановили: подыскать немедленно под училище помещение, поручить волостному Совету немедленно обследовать положение всех училищных помещений и, где окажутся в неисправности, предписать о[бщест]ву оборудовать училищные помещения на свой счет самим, для чего могут быть национализированы свободные помещения кулаков и имущих; обществам оказывать всяческое содействие в тех мероприятиях по проведению в жизнь единой трудовой школы.

8. О выборе заседателей в народный суд.

Постановили: поручить волостному Совету выбрать из деревень от сотни 1 заседателя.

9. О выборе 2-го военного волостного комиссара.

Постановили: вопрос отклонить и поручить волостному военному комиссару выбрать по своему усмотрению.

10. О всеобщем обучении воинских частей [из] населения волости.

Постановили единогласно при 2 воздержавшихся: оказывать* содействие при учении таковых.

11. О добавлении жалованья сторожу волостного Совета.

Постановили: поручить волостному Совету добавить жалованье сторожу по своему усмотрению.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ НАВАЕЛЬНІНСКАГА ВАЛАСНОГА САВЕТА АБ МАЛАЦЬБЕ ЗБОЖЖА Ў НАЦЫЯНАЛІЗАВАНЫХ ПАМЕСЦЯХ, БАРАЦЬБЕ СА СПЕКУЛЯЦЫЯЙ І ЎЗЯЦЦІ ХЛЕБА НА ЎЛІК КАМБЕДАМІ

26 кастрычніка 1918 г.

...2. О молотьбе хлеба, находящегося в экономиях волости, постановили: произвести молотьбу хлеба, находящегося в имениях волости, за цену, установленную волостным Советом, считая рабочему без лошади 4 руб., а с лошадью 12 руб., с условием, что по окончании учета хлеба урожая 1918 г. все те лица, т. е. бедное население, не имеющее своего хлеба, должны получить хлеб, а кто имеет свой хлеб, то деньгами. Молотьбу начинать с 7 ч. утра и кончать в 4 ч. вечера, лошадей же кормить во время отдыха**; а также постановили вменить в обязанность всем сельским комитетам бедноты, чтобы они выслали по первому зову волостного комитета бедноты или волостного Совета лошадей без всяких отказов и сопротивления, а в случае отказа некоторых лиц, таковых представлять в волостной Совет, который должен принять все меры, согласно декрету [Совета] Народных Комиссаров, как [к] саботажникам, идущим против Советской власти.

3. О взятии [на учет] хлеба волостным комитетом бедноты.

По обсуждении означенного вопроса постановили: оказывать полное содействие комитету бедноты при учете хлеба, а также строго следить за всей спекуляцией хлеба; в случае же окажется какая-либо спекуляция хлебом, продажа на сторону [из] волости и [ли] зарытие в ямы, то таковое лицо немедленно арестовывается и представляется в Чрезвычайную комиссию по борьбе со спекуляцией...

---

* В тексте «давать».

** Слово неразборчиво.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ВАЛАСНОГА КАМІТЭТА І СТАРШЫНЬ ПАСЯЛКОВЫХ КАМБЕДАЎ ДАЎЖАНСКАЙ ВОЛАСЦІ

3 снежня 1918 г.

...4) Доклад о продовольственном вопросе, т. е. об удовлетворении Красной Армии.

Собрание постановило: удовлетворить Красную Армию путем собрания от граждан деревень фруктового сбора, а именно: с 1 надела земли — 5 ф., с 2 наделов — 15 ф., с 3 наделов — 30 ф., с 4 наделов — 1 п., а также собрание утверждает постановление Чериковского уездного съезда, утвержденного единогласно представителями от деревенских комитетов бедноты, и собрание приветствует Красную Армию, а также единогласно постановило сочувственно отнестись по отношению к фруктовому сбору для народной армии и немедленно поручить всем сельским Советам бедноты приступить к собиранию такового.

5. Доклад о национализации частной торговли.

Собрание единогласно постановило приветствовать постановление Чериковского уездного крестьянского съезда от 28 ноября 1918 г., т. е. о национализации частной торговли; передать торговлю в руки Советской власти.

6. Доклад об избрании политического комиссара по Должанской вол.

Собрание единогласно постановило избрание политического комиссара по Должанской вол. поручить президиуму волостного Совета деревенской бедноты.

7. Неочередной доклад фельдшера Должанского пункта Е. Курако относительно удовлетворения жалованьем из сумм Совета [за] каждый прослуженный месяц.

Собрание постановило удовлетворить просьбу фельдшера Курако и предоставить все права волостному Совету деревенской бедноты выдавать жалованье за прослуженные месяцы из сумм сего Совета, а также выдать за прослуженный месяц ноябрь.

8. Доклад об установлении таксы на лес и дрова каких бы то ни было пород.

Собрание единогласно постановило утвердить таксу, принятую на крестьянском уездном съезде 28 ноября 1918 г.

ПРАТАКОЛ СХОДУ БЕДНАТЫ ЛАБАНАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ АБ ПЕРАВЫБАРАХ САВЕТА, РАЗМЕРКАВАННІ ПАДАТКУ, РАСПАЎСЮДЖВАННІ ДРУКУ І ІНШЫЯ

4 снежня 1918 г.

1) О распределении единовременного чрезвычайного революционного налога между гражданами волости в сумме 196 234 руб.

Постановили: Распределение единовременного революционного налога между гражданами Лобановской вол. в сумме 196 234 руб. поручить одному члену волостного Совета бедноты и одному члену военного волостного комиссариата, коим поручается собрать сведения, на каких граждан и какая часть должна пасть революционного налога, и сведения эти в кратчайший срок сообщить Чериковскому уездному Совдепу.

2) О выборе волостного агента по распространению произведений* печати среди граждан волости.

Постановили: Выбор волостного агента по распространению произведений* печати среди граждан волости поручить волостному Совету; избрать человека, соответственного своему назначению.

3) О распределении равной подводной повинности между деревнями волости.

Постановили: [Для] распределения равной подводной повинности поручить волостному Совету вести наряд, какое количество подвод должна выслать под своз каждая деревня.

4) О переизбрании волостного Совета.

Постановили: Избраны в волостной Совет единогласно по числу 57 представителей следующие лица: Семен Малашенко, Прохор Силкин, по большинству голосов — Стефан Новиков, Ларион Поздняков и Федот Укруженко.

5) О переизбрании волостного военного комиссариата.

---

* В тексте «производства».

Постановили: В волостной военный комиссариат избраны большинством голосов военным комиссаром Павел Пухнавцев, политическим Михей Разумов и руководителем Федос Тукаленко.

6) О выделении комиссии для принятия от экс-президиума волостного Совета и волостного военного комиссариата всех дел и деловых бумаг.

Постановили: В комиссию большинством голосов избраны Яков Никоенко, Артем Турков и Кирилл Овчинников, коим назначить суточные деньги в размере 10 руб. в день

7) О распределении и о наделении в первую очередь продовольствием, т. е. фунтами, полученными за промол на мельницах, бедноты нашей Лобановской вол.

Постановили: Воспретить вывоз с мельниц, находящихся в районе Лобановской вол., фунтов хлеба, получающегося на промол до удовлетворения фунтами бедноты нашей волости.

8) Об уплате арендаторам мельниц денег за промол пуда хлеба.

Постановили: Ходатайствовать перед уездным продкомом, чтобы арендаторы получали плату на промол 10 коп. и 15 коп. за дерку, а остальную плату, получаемую сверх нормы, заключенной в контракте Лабановским волостным земотделом, возвратить Лобановскому волостному Совету для организации культурно-просветительного кружка; присовокупляется, что от арендаторов мельниц требуется строгое выполнение ремонта мельниц, согласно контракту.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ПРАДСТАЎНІКА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЕТА НА МАГІЛЁЎСКАЙ ХАРЧОВАЙ НАРАДЗЕ*

Очень частая сменяемость комиссаров не дала возможности поставить дело продовольствия как следует. В имениях хлеб был снят волостными советами и разделен меж крестьянами. Комитеты бедноты учет урожая произвели неправильно, сильно сократив цифру урожайности, а потому излишки по уезду выразились: в хлебе 38 541 пуд., в фураже 16 183 пуда, в масляничных семенах 2843 пуда, а нехватка по уездам выразилась: хлеба 59 870 пуд., фуража 63 925 пуд. Таким путем получается, что уезду для собственного пропитания не хватает хлеба 21 329 пуд., фуража 47 742 пуда. С 36-ти водяных мельниц уезда и 4-х паровых собрано за полугодие замола 8940 пудов. Собрано пожертнованием 1920 пудов хлеба. На плечах уездпродкома все время сидело огромное количество красноармейцев, как проходящих, так и находившихся на постоянных квартирах. С ними была масса трений и недоразумений. В уездпродкоме полное отсутствие финансовых средств. Кооперация работает хорошо, но распределение производит по паям. Товарообмен проводить затруднительно из-за несочувствия населения. Классовый паек среди сельского населения не проведен.

Могилевское губернское продовольственное совещание.— Могилев, 1919.

Іх выклікаў час

Сёння з болем у душы мы пазнаём праўду аб трагедыі многіх простых людзей у тую пару, якую мы ведалі як час «жорсткай класавай барацьбы за ідэалы камунізма». Складанымі становяцца і нашы адносіны да тых, хто кіраваў падзеямі таго часу, актыўна ўдзельнічаў у іх. М. Д. Шчарбітаў, М. В. Басін, Я. Д. Зевін... Кожны з іх пражыў нялёгкае, поўнае барацьбы жыццё. Яны верылі ў ідэалы рэвалюцыі і, не шкадуючы сябе, змагаліся за іх ажыццяўленне.

БАСІН МЭЕР ВЭЛЬКАВІЧ. Нарадзіўся ў Чэрыкаве ў 1890 г., бакінскі камісар. Член партыі бальшавікоў з 1912 г. З сям'і вадавоза. Скончыўшы рамеснае вучылішча ў Магілёве, з 1911 г. працаваў слесарам у Баку. Удзельнічаў у прафсаюзным руху, у арганізацыі бакінскай стачкі 1914 г., за што арыштаваны. З канца 1914 г. член праўлення прафсаюза рабочых нафтавай прамысловасці ў Баку. З вясны 1917 г. дэпутат Бакінскага Савета, з 8.7. 1917 г. член Бакінскага гаркама РСДРП(б). Адзін з кіраўні-

* Нарада прадстаўнікоў харчовых і кааператыўных органаў Магілёўскай губерні адбылася 2—5 сакавіка 1919 г. у Магілёве.

коў усеагульнай стачкі бакінскага пралетарыяту ў верасні 1917 г. З лістапада 1917 г. сакратар прэзідыума выканкама і рабочай секцыі Бакінскага Савета. З красавіка 1918 г. загадчык рабочай секцыі Бакінскага Савета народнай гаспадаркі. Забіты англійскімі інтэрвентамі 20 верасня 1918 г.

ЗЕВІН ЯКАЎ ДАВЫДАВІЧ (партыйныя псеўданімы Валодзя, Сава, Таварыш Павел). Нарадзіўся ў м. Маластоўка Чэрыкаўскага павета ў 1884 г. Адзін з 26 бакінскіх камісараў. Член партыі бальшавікоў з 1912 г. З сям'і дробнага гандляра. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг. У 1904—1912 гг. далучаўся да меншавікоў. Вёў рэвалюцыйную работу ў Баку, Бахмуце, Крывым Розе, Горлаўцы. З 1911 г. па накіраванні Екацярынаслаўскага камітэта РСДРП вучыўся ў партыйнай школе ў Ланжумо (каля Парыжа), слухаў лекцыі У. І. Леніна. З 1915 г. член Бакінскага камітэта РСДРП. Не раз арыштоўваўся (1907, 1908, 1912, 1916). Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. інструктар Маскоўскага Савета, вёў партыйную работу ў Серпухаве, Падольску, Арэхава-Зуеве, Іванаве і інш. З жніўня 1917 г. у Баку, адзін з кіраўнікоў усеагульнай стачкі ў верасні 1917 г. З красавіка 1918 г. член Бакінскага СНК, камісар працы. Забіты англійскімі інтэрвентамі 20 верасня 1918 г.

М. В. Басін.

Я. Д. Зевін.

М. З. Эртман

М. Д. Шчарбітаў.



Копія

Постановленіе №

1908 г. Марта 24 дня, г. Баку. Я. Начальникъ Бакинскаго Губернскаго Жандармскаго Управленія Полковникъ Кочинцовъ, въ виду имѣющихся свѣдѣній въ Управленіи о преступной дѣятельности Николаевича Яковлева Зевина

и руководствуясь 21-й ст. Положенія о Государственной Охранѣ, ВЫСОЧАЙШЕ утвержденнаго 14-го августа 1881 г., ПОСТАНОВИЛЪ: поименованнаго Якова Зевина

заключить подъ стражу въ Бакинскую тюрьму, впредь до разъясненія обстоятельствъ дѣла, копію сего постановленія препроводить Г. Прокурору Бакинскаго Окружнаго Суда, Г. Бакинскому Градоначальнику и въ мѣсто заключенія, о чемъ объявить задержанн

Подлинное за надлежащими подписями

Съ подлиннымъ вѣрно:

И. д. Адъютанта Управленія.

Поручикъ Боровковъ

у Бакинскому Градоначальнику

Пастанова аб арышце Я. Д. Зевіна.

ШЧАРБІТАЎ МІКАЛАЙ ДАРАФЕЕВІЧ. Нарадзіўся ў в. Кляпіна Чэрыкаўскага павета ў 1893 г. Удзельнік барацьбы за Савецкую

ўладу на Беларусі. З сялян. Член партыі бальшавікоў з 1917 г. З 1916 г. у арміі. У ліпені 1917 г.— лютым 1918 г. старшыня Рэчыцкага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Удзельнік устанаўлення Савецкай улады ў Рэчыцы, барацьбы з левымі эсэрамі ў Чэрыкаўскім павеце і стварэння Чэрыкаўскай павятовай арганізацыі РКП(б), сакратар павятовага камітэта партыі, загадчык аддзела Магілёўскага, потым Гомельскага губвыканкамаў. З мая 1919 г. у Чырвонай Арміі: начальнік палітаддзела 17-й (Заходні фронт) і 3-й (Паўднёвы фронт) дывізій, удзельнік штурма Перакопа. Памёр ад цяжкай хваробы ў 1921 г.

БелСЭ. Т. 2. Мн., 1970. С. 174. Т. 4. Мн., 1971. С. 553. Т. 11. Мн., 1974. С. 375.

ЭРТМАН МАЙСЕЙ ЗАХАРАВІЧ. Нарадзіўся ў 1880 г. у сям'і беднага сталяра ў г. Чэрыкаве. Бацькі не мелі сродкаў, каб вучыць сына, неставала сродкаў, каб пракарміць сям'ю, апрануць яе. Бацька з малых гадоў прывучаў хлопчыка да працы. У трынаццаць гадоў ён авалодаў спецыяльнасцю калесніка і амаль 15 гадоў прысвяціў гэтай працы. Але вымушаны быў шукаць шчасця ў розных гарадах краіны.

Працаваў у Гомелі, адтуль трапіў у Кіеў. Аднак, як ні стараўся, ледзь-ледзь удавалася звесці канцы з канцамі. У гэты час рэвалюцыйны рух па ўсёй краіне ішоў на пад'ём. Напярэдадні 1905 г. рэзка павялічылася колькасць забастовак і стачак, вулічных дэманстрацый, падпольных маёвак. Хваля рэвалюцыйнага руху захапіла маладога калесніка. Вось некаторыя даныя з яго анкеты. Паведамляецца, што ён прымаў удзел у 6 эканамічных стачках, у 3 вулічных дэманстрацыях, каля 300 разоў удзельнічаў у нелегальных масоўках і мітынгах, двойчы — ва ўзброеных выступленнях. У 1905 г. М. З. Эртман упершыню ўзяў у рукі зброю. Крыху пазней Майсей Захаравіч назаўсёды звязаў свой лёс з ленінскай партыяй.

Свае «універсітэты» М. З. Эртман прайшоў у ссылцы. Аднойчы ён збег з ссылкі, але на адной з чыгуначных станцый быў затрыманы. Больш за 10 гадоў правёў ён на суровай Поўначы пад наглядам паліцыі.

У 1917 г. М. З. Эртман вярнуўся ў Чэрыкаў. Тут яго выбралі інструктарам штаба Чырвонай Арміі. А з 1918 г. ён пачаў займацца пытаннямі ўладкавання людзей на работу.

Праз некаторы час ён быў выбраны членам камісіі Магілёўскага аддзела працы, займаўся арганізацыяй працы ў Оршы і Гомелі. Толькі ў верасні 1920 г. Майсей Захаравіч зноў вярнуўся ў Чэрыкаў, дзе стаў кіраваць камунальным аддзелам павятовага выканкама. 15 ліпеня 1921 г. ён быў выбраны старшынёй сельскага спажывецкага таварыства.

Апошнія гады жыцця М. З. Эртман узначальваў у Чэрыкаве аб'яднаны прафсаюзны камітэт.

Памёр М. З. Эртман у 1930 г., пахаваны ў гарадскім парку.

Ф. Рудзікаў.

Стварэнне партызанскага палка

РОЗЕ ВАЛЬДЭМАР РУДОЛЬФАВІЧ (11.3. 1897, Рыга — сакавік 1938), удзельнік грамадзянскай вайны на Беларусі, адзін з арганізатараў партызанскіх атрадаў у Магілёўскай губерні, у тым ліку і на Чэрыкаўшчыне.

Калі ў першыя месяцы Савецкай улады над Беларуссю навісла страшная небяспека і большую частку яе тэрыторыі занялі войскі Германіі і буржуазнай Польшчы, на дапамогу мясцовым чырвонагвардзейскім атрадам прыйшлі латышскія стралкі.

...Па старадаўняму шляху, што цягнецца ўздоўж р. Сож, з Мсціслаўля на Крычаў ішоў атрад узброеных людзей... Вось і Крычаў. Яшчэ 25 км, але ўжо па шашы Масква — Варшава, і будзе павятовы цэнтр Чэрыкаў. Паступілі звесткі, што да яго ваколіц дабраўся вораг і што ў гэтых мясцінах ёсць дзесятка паўтара разрозненых чырвонагвардзейскіх і партызанскіх атрадаў.

Губкам партыі і губвыканкам, якія знаходзіліся ў эвакуацыі ў Мсціслаўлі ў сувязі з тым, што Магілёў быў захоплены германскімі войскамі і польскімі легіянерамі, паставілі задачу: стварыць полк партызанскіх атрадаў. Паслалі чырвонагвардзейскі атрад, камандзір якога латышскі стралок Вальдэмар Розе і павінен быў узначаліць новае фарміраванне.

Ажыццявіць гэту задачу было не так проста: у Чырвонай Арміі камандзіры выбіраюцца. Той, каго рэкамендуюць губкам партыі і губвыканкам,— чалавек бездакорны, выйшаў з сям'і рабочых-металістаў, быў салдатам, за адвагу накіраваны ў ваенную школу, пасля сканчэння якой атрымаў чын прапаршчыка. Чын невялікі, але афіцэрскі. На гэтым могуць сыграць анархісты. Вось чаму хвалявaліся ў губкаме. Спакойным быў толькі камандзір-латыш. Ён быў упэўнены, што людзі, якія здзейснілі рэвалюцыю, стварылі Саветы, знойдуць правільнае рашэнне.

У Крычаве камандзір пазнаёміўся з двума мясцовымі актывістамі — намеснікам старшыні валаснога Савета Мацвеем Кісялёвым і камандзірам чырвонагвардзейскай роты Маркіянам Казловым (удзельнікам рэвалюцыі 1905 г.). Не трацячы часу, трое заселі за карту. Трэба было па магчымасці дэталёва ўнікнуць у сітуацыю. А сітуацыя была складаная.

На наступную раніцу кіраўнік Крычаўскага Савета і чырвоныя камандзіры праводзілі атрад Вальдэмара Розе. Разам з ім пайшла ў Чэрыкаў і Крычаўская чырвонагвардзейская каравульная рота.

Вясной 1918 г. у павятовы г. Чэрыкаў сцякаліся чырвонагвардзейскія і партызанскія атрады Чэрыкаўскага, Мсціслаўскага, Клімавіцкага, Чавускага і Рагачоўскага паветаў. Па рашэнню Магілёўскага губернскага камітэта партыі неабходна было стварыць полк партызанскіх атрадаў.

В. Р. Розе.

Як толькі Розе і яго атрад увайшлі ў Чэрыкаў, павятовы камітэт партыі, якім кіраваў былы вясковы настаўнік Мікалай Шчарбітаў, вырашыў у цэнтры горада склікаць мітынг.

І вось на плошчы стаяць 22 групы ўзброеных людзей. Самую небяспечную з іх узначальвае анархіст Храмянкоў. Ён абкладваў кантрыбуцыяй цэлыя вёскі, парушаў савецкія законы. Мясцовыя ўлады не ў сілах былі прызваць яго да парадку. Нямала было і такіх, хто збіўся з правільнага шляху, хаця адкрытым ворагам яшчэ не стаў. Яны таксама былі небяспечнымі. Тут жа — паплечнікі матроса Ламянкова. Атрад яго невялікі, аднак чырвонагвардзейцы да апошняга дыхання гатовы абараняць Савецкую ўладу. Побач чырвонагвардзейцы Крычава, якія прыйшлі з Маркіянам Казловым і Міхаілам Чыжом, чырвоныя партызаны Міхайла Шаблакова, атрад Вальдэмара Розе. Стаяць моўчкі, плячо ў плячо, штык у штык. Толькі людзі з атрада анархіста Храмянкова шумна размаўляюць. Храмянкоў праходжваецца гогалем. Ён упэўнены, што стане камандзірам палка.

Каля трыбуны невялікая група: сакратар Чэрыкаўскага павяткама партыі Мікалай Шчарбітаў, старшыня павятовага выканкама Шашкоў, малады камуніст Аляксандр Кавалёў, Вальдэмар Розе. Шчарбітаў паклікаў Храмянкова. Каля трыбуны аб нечым доўга спрачаліся. Нарэшце ўсё вырашана: перад сабраўшыміся на мітынг першым выступіць Храмянкоў, за ім — Розе. Кожны павінен растлумачыць сваю праграму, коратка расказаць сваю біяграфію, а таксама аб тым, як ведае ваенную справу. Толькі тады, усё абдумаўшы, чырвонагвардзейцы і партызаны вырашаць, каму быць камандзірам палка.

Дабіўшыся права выступаць першым, Храмянкоў ускочыў на трыбуну. Што мог сказаць чалавек, які прапаведваў «маці-анархію» як аснову жыцця? Калі ты дужэйшы — рабуй, п'янствуй, гуляй, забівай. Свабода без усялякіх абмежаванняў. У канцы прамовы ён усклікнуў, што іменна дзеля гэтага «змагаліся» яны і «пакутавалі». Для маскіроўкі дадаў, што рабаваць трэба буржуазію і заможных людзей (а рабавалі яны ў асноўным працоўны народ!). На гэтым Храмянкоў скончыў сваю прамову і сышоў з трыбуны. Плошча загула. Хтосьці абураўся, хтосьці крычаў у падтрымку.

На трыбуну падняўся Розе. Абвёў поглядам плошчу — мора галоў і вінтовак. Ён павінен перамагчы анархіста чаго б гэта не каштавала, у імя рэвалюцыі, у імя людзей, што сабраліся на плошчы.

— Не праў Храмянкоў,— загаварыў Розе.— Не для таго, каб рабаваць і п'янстваваць, каб страляць у сялян-працаўнікоў, гадамі, дзесяцігоддзямі пакутавалі ў царскіх турмах бальшавікі. Краіна ў небяспецы, ворагі з усіх бакоў, а Храмянкоў і яго дружкі замест таго, каб ваяваць супраць легіянераў, рабуюць працоўнага селяніна, бясчынствуюць, разбураюць наш тыл. Дык на каго ж працуюць гэтыя людзі, на рэвалюцыю ці яе ворагаў? Цяпер, таварышы чырвонагвардзейцы і чырвоныя партызаны, рашайце, як быць,— закончыў Розе і сышоў з трыбуны.

На плошчы стала ціха. На трыбуну падняўся сакратар павяткама партыі Мікалай Шчарбітаў, абвёў позіркам атрады і запытаў:

— Хто хоча бачыць камандзірам палка Храмянкова?

Над натоўпам, там, дзе стаяў атрад Храмянкова, паднялося рук 20, але некаторыя тут жа апусціліся.

— Хто за тое, каб камандзірам быў таварыш Вальдэмар Розе?

Натоўп зашумеў, перапоўніўся

гулам адабрэння. Сотні рук паднялі ся ўверх, магутнае «ўра» пракацілася над плошчай.

Камандзір палка Вальдэмар Розе на сваім белым кані прыўстае на стрэмёнах і аддае загад строіцца.

І байцы ідуць абараняць маладую рэспубліку Саветаў.

Па дарозе полк разрастаўся. У яго ўліліся атрады і групы Букетава, Ламянковых, Шаблакова, Рабцава, Вераб'ёва, Варанцова, Сарокіна, Карпава і іншых. Чырвонагвардзейцы рухаліся на захад. Першы цяжкі бой адбыўся каля Доўска, мястэчка, дзе скрыжоўваліся важнейшыя шашэйныя дарогі: Кіеў — Петраград і Масква — Варшава. Тут полк панёс першыя страты. У гэтым баі Розе звярнуў увагу на смелага конніка Герасіма Цярэшчанку. Спадабалася камандзіру палка, што Герасім быў не толькі храбрым, але і змагаўся з розумам, не горш, чым бывалы салдат. Таму і ўзяў да сябе камандзір палка ардынарцам адважнага юнака з в. Волчас, што на Чэрыкаўшчыне. Потым былі баі на Рагачоўшчыне. Часова полк спыніўся ў Рагачове.

Спачатку гэта воінскае фарміраванне называлася палком партызанскіх атрадаў Вальдэмара Розе, затым — 153-м стралковым палком 17-й Ніжнегародскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі.

Усёй рэарганізацыяй кіраваў В. Розе і камісар палка, былы данецкі шахцёр, Цімафей Піліпавіч Купрэеў.

Першы батальён палка, які быў створаны з ураджэнцаў Чэрыкава, Крычава і суседніх мястэчак і вёсак, узначаліў Журомскі. Камандзірамі батальёнаў, рот і ўзводаў у 153-м палку былі Міхаіл Чыж, Аляксандр Худчанка, Анатолій Шышко, Сямён Партноў з Чэрыкаўскага павета, Варончанка і Чаброў з Чэрыкава, Скібінскі і Сянкевіч з Сенненскага,

М. Шаблакоў.

Г. Цярэшчанка.

Бацанаў з Рагачоўскага, Ксяндзоў і Карпаў з Быхаўскага паветаў, Адман Эдгар — латыш.

З Рагачова полк з баямі прайшоў на Жлобін, Бабруйск, Асіповічы, Слуцк.

К пачатку 1919 г. полк Розе выйшаў на лінію Калінкавічы — Мазыр. Пачаліся жорсткія баі з пятлюраўцамі. Цягнуліся яны два месяцы.

Праціўнік перавышаў колькасцю, быў добра ўзброены.

Ведаючы, што да Пятлюры павінна падысці падмацаванне, Розе імкнуўся заняць лепшыя пазіцыі. На савеце камандзіраў было прынята рашэнне — паставіць Пятлюру ультыматум, каб прымусіць яго адступіць.

Каму даручыць небяспечную ролю ганца? Калі ўдасца схіліць Пятлюру да адступлення, будзе выратавана жыццё соцень чырвоных салдат. А калі Пятлюра не прыме ультыматум, то ён можа расправіцца з ганцом.

Погляд камандзіра затрымаўся на ардынарцы.

— Табе даручаю перадаць ультыматум,— сказаў камандзір.— Дваіх дам для аховы. Спадзяюся, што ты не асароміш Чырвоную Армію.

Вальдэмар Рудольфавіч перадаў Герасіму пакет, хвіліну памаўчаў, а потым абняў і пацалаваў.

...Пятлюра разарваў канверт, прачытаў, падняў вочы на Герасіма. Той стаяў побач і ледзь прыметна ўсміхаўся. Пятлюра ўскіпеў. Яму прапануюць здацца, і хто? Нейкі камандзір палка! А ультыматум перадаў хлапчук.

— Будзеш у мяне служыць,— сказаў Пятлюра.

— Калі рак на гары свісне!— пачуў у адказ.

Герасіма доўга катавалі. Яму звязалі рукі, завязалі вочы.

— Героем хочаш памерці! Памрэш сляпым.

Казакі шашкамі пасеклі героя.

У палку чакалі Герасіма. Цудам удалося выратавацца аднаму з чырвонаармейцаў, што суправаджалі Цярэшчанку. Ён і расказаў, як загінуў Герасім. Розе слухаў моўчкі, нахмурыўшы бровы.

А назаўтра пачаўся бой. 153-ці полк многа разоў хадзіў у атаку, цясніў пятлюраўцаў. Чырвонаармейцы адбілі цела Герасіма Цярэшчанкі. Пахавалі яго пад Корасценем.

Пасля перамогі ў баі за Корасцень, дзе нашы землякі нашчэнт разбілі ўкраінскіх нацыяналістаў, полк атрымаў загад павярнуць на поўнач і вызваліць раёны, захопленыя войскамі Германіі і буржуазнай Польшчы. Байцы палка разграмілі праціўніка пад Бабруйскам і ўварваліся ў горад. Жыхары радасна сустракалі калоны пераможцаў. Спераду пад чырвоным сцягам ехалі В. Розе і камісар Купрэеў. Атрад вызваляў Мінск, іншыя гарады і вёскі.

Прыйшоў дзень, і полк уступіў у сталіцу Літвы. Там сабраліся крычаўскія і чэрыкаўскія воіны — Сямён Партноў, Сцяпан Карагодаў, Мікалай Іўкін, Анатолій Шышко, Дзяніс Халондыраў і сфатаграфаваліся з сябрамі каля станкавага кулямёта.

Потым была гераічная абарона Вільнюса ад польскіх захопнікаў. За мужнасць і адвагу, праяўленыя у час абароны, камандзір 153-га стралковага палка В. Розе быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

М. Мельнікаў.

Памятныя дні

Важнымі матэрыяламі, якія даюць магчымасць саставіць уяўленне аб тых ці іншых падзеях, з'яўляюцца ўспаміны. Але трэба мець на ўвазе, што яны не заўсёды пацвярджаюцца дакументамі і часцей адлюстроўваюць суб'ектыўны погляд аўтараў.

З успамінаў Г. К. Сотнікава

Кастрычніцкую рэвалюцыю я сустрэў на фронце. Салдаты віншавалі адзін другога, і радасці не было канца. Апошні наш бой адбыўся на невялічкай рачулцы Стаход, у Заходняй Беларусі. Нашу дывізію разбілі. А з 1 студзеня па свету разляцеліся ленінскія дэкрэты. Салдаты пачалі брацца. Ненавісная ўсім вайна скончылася. Настаў заранак новага жыцця.

Вярнуўшыся з франтоў першай сусветнай вайны, салдаты-акопнікі сталі тымі людзьмі, якія ў родных мясцінах амаль усе ўключыліся ў барацьбу за Савецкую ўладу. Быў пачатак 1918 г. Ужо завяршылася Кастрычніцкая рэвалюцыя, ужо абляцелі ўвесь свет першыя дэкрэты Савецкай улады, але вёска хісталася. Многія не ведалі або не адважваліся — у які бок каму падацца, каму верыць. Былыя ж франтавікі (амаль кожны з іх) яшчэ там, у акопах

сустракаліся непасрэдна з бальшавікамі або слухалі іх прамовы. Таму салдаты аказаліся больш палітычна падрыхтаванымі, чым іх землякі. Яны, вядома, і дапамагалі мясцовым бальшавікам устанаўліваць Савецкую ўладу на сяле, тлумачылі палітыку новай улады вяскоўцам.

Сярод дэмабілізаваных салдат быў і я. Калі на Чэрыкаўшчыне пачалі арганізоўвацца Саветы салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, мне аднавяскоўцы аказалі вялікі давер — абралі дэпутатам Камаровіцкай воласці, а затым дэлегатам на першы павятовы з'езд Саветаў, які быў скліканы вясной 1918 г. На з'ездзе мяне абралі членам выканкама, а затым даручылі весці аддзел сацыяльнага забеспячэння.

Гэта былі шчаслівыя, хаця і трывожныя дні работы побач з М. Д. Шчарбітавым, які быў пачынальнікам усіх добрых спраў. Ён сам не баяўся, як кажуць, лезці ў агонь і ваду і асабістым прыкладам захапляў іншых, быў душой калектыву. Любілі і паважалі Мікалая Дарафеевіча за храбрасць, прынцыповасць, добрасумленнасць.

Дзесьці ў маі 1918 г. выклікае тав. Шчарбітаў мяне і яшчэ аднаго матроса, таксама члена павятовага выканкама (толькі вось прозвішча яго забыўся). Дык вось, тав. Шчарбітаў ставіць перад намі задачу — тэрмінова прыняць усе справы ад гарадской управы. Спакойна так сказаў, без лішніх слоў. Мы бадзёра адказалі: будзе зроблена. І толькі, калі выйшлі на вуліцу, прызадумаліся. Лёгка сказаць: прыняць справы, а хто іх ведае, гэтых таўстапузых — як яны сустрэнуць. Гарадскі ж галава Кашура-Масальскі раней быў гразой усяго Чэрыкава. Ну, што там, у нас — па нагану ў кішэні. Параіліся мы крыху і вырашылі — не сёння дык заўтра, а выкурваць управу прыйдзецца — значыць пайшлі.

Г. К. Сотнікаў.

Насцярожана сустрэлі нас служачыя ўправы. Сам галава надзьмуў сваю бычыную шыю, пачырванеў як рак, але на абвастрэнне адносін не пайшоў, зразумеў буржуй, што не той час.

— Чаго, хлопцы, прыйшлі?

— Прымаць справы,— адказваем.

— Хто ж вас накіраваў? — працягвае дапытвацца і яхідна дадае: — Я б такім нават гусей не даверыў пасвіць, не то што гарадскую ўправу прымаць.

Але калі паказалі даведку павятовага выканкама — панікнуў неяк адразу галава горада, прысмірэў. Дрыжачымі рукамі падаў нам ключы і прашыпеў:

— На гэтым усё, паперы ўсе на месцы, прымайце,— і нават пакланіўся.

Многа цікавых эпізодаў з тых часоў можна было б расказаць. Хаця я асабіста ведаў справай аддзела сацыяльнага забеспячэння, але ўдзельнічаць прыходзілася ў розных аперацыях — тут і харчразвёрстка, і барацьба з бандытамі, і многае іншае. Людзей не хапала, даводзілася ўсім быць разам на асабліва трывожных участках.

Мне хочацца расказаць яшчэ аб адным асабліва важным, на мой погляд, мерапрыемстве, што праводзілася ў барацьбе за адстойванне Савецкай улады на Чэрыкаўшчыне летам 1918 г.

А здарылася вось што. Неяк збірае ўсіх членаў павятовага выканкама тав. Шчарбітаў і гаворыць:

— Таварышы! Нам прадстаіць адказная задача — на працягу 24 гадзін сабраць подпісы ўсяго дарослага насельніцтва павета вось пад гэтым тэкстам.

Аказваецца, нехта з ворагаў сфабрыкаваў хлуслівы дакумент: быццам бы жыхары Чэрыкаўскага павета не жадаюць улады Саветаў, а хочуць далучыцца да Украінска-нямецкай буржуазнай Рады. Можа, так, а можа, крыху інакш называлася гэтая марыянетачная «дзяржава». Халера яе ведае. Але было нешта на скорую руку злепленае са сталіцай у горадзе Гомелі. Вось і ставілася задача — абвергнуць варожую хлусню.

Раз'ехаліся мы ва ўсе куткі павета. Мне даручылі правесці работу ў Камаровіцкай воласці. Жарэбчыка далі хутканогага (у памешчыка канфіскавалі). Выехаў я апоўдні. Вёсак трыццаць трэба было аб'ехаць. У першы дзень сабраў подпісы ў вёсках Зоры, Вусце, Вохар, Рэчыца, Глінь. Усё ішло добра. Вёска Вудага — першая няўдача. Там засеў белагвардзейскі капітан па прозвішчу Пруднікаў і цэлым атрадам наводзіў смуту сярод сялян. Да таго падбухторыў іх на дрэннае, што нават забіць мяне хацелі. Дзякуй аднаму добраму чалавеку — дапамог. Жыў там дзед Трыфан Бяляеў, ведаў мяне — з сынам я яго калісьці разам у школу хадзіў. Дык вось ён адвёў каня на ўскрай вёскі, а сам шапнуў мне. І я задворкамі паціху схаваўся. Не з-за страху за асабістае жыццё, а дзеля працягвання далейшай справы, дзеля захавання тых подпісаў, што ўжо сабраў, прыйшлося бегчы з гэтай вёскі.

Прыехаў у Камаровічы. Сабралі членаў валаснога камітэта. Параіліся. Было ў воласці сем або дзесяць коней. Разаслалі мы ганцоў па ўсіх вёсках. І трэба сказаць, сабраліся людзі да адзінага. Пачалі праводзіць мітынг. Я растлумачыў абстаноўку. Усе прагаласавалі супраць рады. Толькі думалі пачынаць збіраць падпісы, як слова папрасіў зноў той жа капітан. Аказваецца, і ён тут. Што ж, дэмакратыя ёсць дэмакратыя. Далі яму слова. Прыгожа гаварыў. Так гэта ў яго зладжана атрымліваецца — нібы ён самы лепшы сябра сялян, іх верны абаронца. Захісталіся людзі. Частка на бок ворага перакінулася. Зноў я выступаю. Толькі закончу прамову — кадэт слова бярэ. І так гадзіны тры або чатыры. Пачнем галасаваць — большасць мяне падтрымлівае. Давялося дзейнічаць па-іншаму. Сабраў усіх членаў валаснога выканкама і даю загад: закрыць вароты, праверыць наяўнасць зброі ў прысутных. Капітана толькі і бачылі. А людзі перасталі палохацца, усе да аднаго паставілі подпісы.

Сабраў паперы, збіраюся ў Чэрыкаў ехаць. А мне паведамляюць — зроблена засада ў лесе. Прыйшлося іншым шляхам дабірацца.

Дзесьці раніцай з усіх валасцей прыехалі пасланцы з дакументамі. Два мяшкі папер назбіралі. Запакавалі ўсе, сургучную пячатку паставілі, і павёз мяшкі сам Шчарбітаў з членам выканкама Сарокіным у Гомель. Даказаць буржуям трэба, што ўсе людзі Чэрыкаўскага павета за Савецкую ўладу гарой стаяць. Па дарозе на адной са станцый арыштавалі ворагі тав. Шчарбітава. Апазналі яго. Ён калісьці у тых мясцінах па заданню бальшавікоў праводзіў работу. Павёз у Гомель матэрыялы адзін Сарокін. Даставіў. Вярнуўся. Расказаў аб здарэнні ў дарозе. Тэрмінова была паслана тэлеграма ў Маскву паўнамоцнаму прадстаўніку Чычэрыну. У Маскве прынялі адпаведныя меры. Тыдні праз тры вярнуўся тав. Шчарбітаў. Раней быў чарнявы, а прыехаў увесь сівы.

Відаць, нялёгка прыйшлося нашаму таварышу ў логаве ворага.

Яшчэ мне вельмі хацелася б успомніць аб рабоце Чэрыкаўскага ваенкамата ў першыя гады Савецкай улады.

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі Чэрыкаўскае «павятовае воінскае прысутнае месца» было рэарганізавана ў камісарыят па ваенных справах. Былы воінскі начальнік палкоўнік царскай арміі Фінюцін быў звольнены з займаемай пасады і на яго месца мясцовы Савет назначыў чыноўніка Ціханава.

Камісарыят быў павінен займацца пастаноўкай на ваенны ўлік грамадзян, фарміраваннем воінскіх часцей з мясцовых жыхароў-франтавікоў. Асабліва вялікую работу праводзіў камісарыят, калі ім стаў кіраваць бальшавік Падалякін. Перш за ўсё ён пачаў падбіраць кадры з людзей, адданых рэвалюцыі. Загадчыкам агульным аддзелам быў назначаны Якаў Шавялёў (потым — палкоўнік Савецкай Арміі), аддзелам забеспячэння — Аляксей Мельнікаў (потым — пракурор Крычаўскага раёна), мабілізацыйным аддзелам — Павел Язёрскі, адміністрацыйна-гаспадарчым — Еўдакім Цацоха, аддзелам па фарміраванню і навучанню атрадаў Чырвонай Арміі кіраваў Аляксандр Захараў. У апошнім аддзеле служыў і я.

Шмат сіл для паляпшэння спраў камісарыята прыкладаў ваенкам Падалякін. Пры яго непасрэдным удзеле былі ўтвораны многія валасныя ваенкаматы. Так, ваенкамам Старынскай воласці быў назначан Курачкін (у 1919 г. яго расстралялі бандыты), Лабанаўскай — Маркін, Даўжанскай — Кампіцкі.

У 1918 г. на тэрыторыі павета размяшчалася некалькі партызанскіх атрадаў. Камандавалі імі Розе, Шылаў, Карпаў, Варанцоў і іншыя. Вось з гэтых атрадаў і пачалося фарміраванне першых часцей Чырвонай Арміі. Так, на аснове атрада Розе быў сфарміраваны Чырвоны полк. Мне запомнілася, што ў гэтым палку камандзірам роты быў Мікіта Каношка, камандзірам коннай разведкі — Фама Чаброў, коннага ўзвода — Дзмітрый Новікаў.

Пры райваенкамаце навучаліся, абмундзіроўваліся, а потым накіроўваліся на фронт не толькі былыя партызаны. У вёсках было многа былых франтавікоў, працоўнай моладзі. Іх трэба было прызываць на ваенную службу.

Паколькі спачатку Чырвоная Армія фарміравалася на добраахвотных пачатках, нам, работнікам райваенкамата, даводзілася праводзіць вялікую растлумачальную і агітацыйную работу сярод насельніцтва. Мы праводзілі мітынгі, сходы, гутаркі, арганізоўвалі вечары адпачынку, канцэрты, ставілі спектаклі.

Вялікую работу па маштабу і глыбіні пераўтварэнняў у першыя гады Савецкай улады павінны былі выканаць зямельныя аддзелы. Першы зямельны аддзел быў арганізаваны пры выканкаме Савета пад старшынствам Шаўцова. У 1919 г. аддзелам кіраваў Чыжэўскі, у 1920 — Каплуноў. Галоўнай задачай аддзела было правядзенне ў жыццё палажэння аб землеўпарадкаванні. У сферу дзеяння ўваходзіла ўсё сельскагаспадарчае жыццё павета: жывёлагадоўля, садоўніцтва, размеркаванне зямлі, ахова лесу на корані і інш. У сувязі з гэтым вялікая ўвага ўдзялялася агітацыйна-прапагандысцкай, растлумачальнай рабоце па сельскай гаспадарцы, чыталіся лекцыі, арганізоўваліся кароткатэрміновыя сельскагаспадарчыя курсы і шэраг іншых мерапрыемстваў.

У галіне жывёлагадоўлі была арганізавана заатэхнічная служба, бралася на ўлік племянная жывёла. Агранамічным пададдзелам кіраваў Цілюпа. Аграномамі працавалі Атрашкевіч, Бязлюдны, Адамовіч, Мацве-

еў, Аўрусін. Пры павеце і кожнай воласці агранамічнымі пададдзеламі ствараліся пракатныя пункты сельскагаспадарчых машын. Рэзка адчуваўся недахоп сельгасінвентару. Сяляне ахвотна бралі на пракат інвентар і машыны. У Лабанаўскім пракатным пункце агранамічным старастам быў Фішар, пры Палужскай воласці — Рыгор Нятылька, пры Крычаўскай — Кузьма Старадымаў і інш.

Для таго каб павялічыць колькасць інвентару, падоўжыць тэрмін яго службы была створана сельскагаспадарчая рамонтная майстэрня. Загадваў ёй Нісенгауз, інжынерам быў Фрайнгор. Кавалямі працавалі Аляксееў, Халіпскія.

Існаваў сельскагаспадарчы склад па продажу насельніцтву інвентару, машын і інш. Спачатку ўсе тавары і матэрыялы адпускаліся за грошы. А потым за хлеб, зерне. Саламарэзка каштавала 63 пуды жыта, плуг — 3—4 пуды, серп, цвікі і іншыя прадметы — па некалькі фунтаў.

У першыя гады Савецкай улады вельмі цяжка было пракарміць сям'ю, асабліва мнагадзетную. У земаддзеле вырашылі адкрыць грамадскую сталовую. Атрымалі дазвол. Сталоўка размясцілася ў доме Ліпніка (цяпер вуліца Пралетарская). Поварам быў І. Цыганкоў. Прадукты атрымлівалі ў саўгасе «Горы» (зараз Краснапольскі раён). Асноўным прадуктам быў ячмень. Зерне абдзіралі, а потым варылі суп, кашу. Гатавалі таксама кампот з сушаных яблыкаў без цукру. Калі Чэрыкаўскі выканкам пераехаў у Клімавічы, я звольніўся з работы. Але ў жніўні 1926 г. зноў вярнуўся ў Чэрыкаў і працаваў у лясной гаспадарцы да выхаду на пенсію.

Цяжкі быў той час, але шчаслівы. Хоць мы былі распранутымі, часам галадалі, нярэдка нам пагражала і смерць, аднак даручаную нам справу даводзілі да канца.

З успамінаў удзельнікаў грамадзянскай вайны

С. ЛАДЗЕСАЎ. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі я быў конюхам у князя Абаленскага. Дзень і ноч працаваў на стайні, каб зарабіць некалькі рублёў у месяц. Мяне мог зняважыць не толькі сам памешчык, а і любы з яго сям'і. Нават заездж чыноўнік не называў інакш як: «эй ты, быдла!».

Памятаю імперыялістычную вайну, на якую трапіў у 1915 г. Нас ўжо называлі не быдлам, а «храбрымі рускімі воінамі» і заклікалі не шкадаваць крыві і жыцця «за царабацюхну, Расію-матухну».

Адкрыць вочы, пазнаць праўду дапамог бальшавік Яфім Сцяпанавіч Марынчанка. Калі грымнула лютаўская рэвалюцыя, ён часта выступаў перад салдатамі, гаварыў, што вайна выгадная капіталістам і памешчыкам, а не простаму люду, заклікаў раззбройваць афіцэраў, самім выбіраць камандзіраў.

Восенню 1917 г. я атрымаў накіраванне ў Георгіеўскі батальён (там служылі толькі георгіеўскія кавалеры), які ахоўваў царскую Стаўку ў Магілёве. Адразу ж па прыбыцці ў батальён я даведаўся, што ў Магілёў едзе прапаршчык Крыленка з некалькімі тысячамі рэвалюцыйных матросаў. Бальшавіцкія агітатары праніклі ў батальён і заклікалі не страляць у сваіх, а пераходзіць на бок рэвалюцыі. Разам з некалькімі дзесяткамі салдат я так і зрабіў.

Вясной 1917 г. я прыйшоў дадому. Разам з бацькамі рыхтаваўся да сяўбы, калі пачуў, што ў Прыпечыне рабуюць насельніцтва польскія легіянеры. Дванаццаць язёрцаў, у тым ліку і я, пайшлі ў Чэрыкаў, дзе ўступілі ў атрад В. Р. Розе.

Цяжка было ваяваць — не хапала патронаў, вопраткі, абутку. Але ўсё ж мы адстаялі ад варожай навалы родную уладу.

Пасля грамадзянскай вайны прыехаў у родныя мясціны. Удзельнічаў у стварэнні камбедаў, калгасаў, адным з першых сам стаў калгаснікам.

З. І. ПРАСЯНЦОЎ. Царскую Расію нярэдка называлі матухнай, але гэтая матухна для рабочых і сялян была мачахай. У глыбіні народных мас нарастаў гнеў супраць эксплуататараў, і ў 1917 г. грымнула Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя.

Мы, сяляне-беднякі, з радасцю ўспрынялі вестку, што ўлада ў краіне перайшла ў рукі рабочых і сялян.

Назабыўны, хвалюючы час. Памятаю, як у канцы студзеня 1918 г. з Магілёўскага губсавета ў павет прыйшло распараджэнне аб утварэнні на месцах органаў народнай улады. Але перш за ўсё трэба было абяззброіць паліцыю і арганізаваць ахову памешчыцкіх маёнткаў. З гэтай мэтай у в. Прыпёчана і быў створан узброены атрад. У яго ўвайшлі Трафім, Нічыпар і Еўдакія Ламянковы, Макар, Сямён Прасянцовы, Максім Брылёў, Аляксей Мельнікаў і я. Камандзірам стаў франтавік Трафім Ламянкоў, камісарам — член РСДРП з 1917 г. Еўдакія Ламянкова. У нас была адна вінтоўка і 8 паляўнічых ружжаў.

Перш за ўсё вырашылі арыштаваць былога ўрадніка, памешчыцкага лоўчага, які жыў ва ўрочышчы Бакаў. Аднак калі мы падышлі да дома царскага паслугача, той пачаў страляць. Мы адказалі агнём. У ходзе перастрэлкі ўраднік быў забіты. У яго доме мы знайшлі дзве вінтоўкі і мноства патронаў.

З Бакава мы накіраваліся ў Горкі, дзе быў маёнтак княгіні Абаленскай. Тут таксама не абышлося без бою, бо памешчыцу ахоўвалі чэркесы. І ўсё ж такі маёнтак мы захапілі. Маёмасць і інвентар раздалі беднякам-сялянам.

Мне, разам з землякамі — членамі ўзброенага рэвалюцыйнага атрада, давялося ўдзельнічаць у захопе царскай стаўкі ў Магілёве. Я ў той час быў ужо байцом першага Магілёўскага Чырвонагвардзейскага атрада. Мы занялі чыгуначны вакзал, дэпо, станцыю і не прапусцілі да сэрца рэвалюцыі — Петраграда — контррэвалюцыйныя войскі. І тут з Чэрыкава і Прапойска на імя старшыні губвыканкама паступілі тэлеграмы, што на гэтыя гарады наступае дывізія польскіх легіянераў.

Наш атрад атрымаў заданне выступіць супраць ворага. Адну групу з 400 чал. і чатырма кулямётамі павёў на Чэрыкаў намеснік камандзіра атрада Ламянкоў. Другую, такую ж па колькасці, групу павёў на Прапойск камандзір Вераб'ёў.

Каля Прапойска нам паведамілі, што легіянеры ўзялі напрамак на пасёлак Карму. У белапалякаў было каля чатырох тысяч салдат і афіцэраў. Каля в. Гарадзішча мы іх дагналі і вырашылі даць бой. За ноч нашы разведчыкі разбурылі лініі сувязі, а камандзір расставіў па дарогах невялікія баявыя заслоны па 5—10 чал.

Раніцай наш атрад з боку хутара Вугал напаў на праціўніка ў Гарадзішчы, дзе размясціўся штаб легіянераў. Нечаканае нападзенне, адсутнасць сувязі зрабілі гармідар у стане ворага. Яшчэ большая паніка ўзнялася, калі легіянеры натыкнуліся на нашы заслоны. Наш атрад захапіў 27 падвод з харчаваннем і боепрыпасамі. Праўда, страцілі забітымі і параненымі прыкладна чвэрць байцоў, але працягвалі гнаць ворага. Пад Рагачовам дывізія легіянераў была акружана нашымі і рагачоўскімі партызанамі, латышскімі стралкамі. Вялікія страты панеслі польскія легіянеры.

Наш атрад атрымаў загад ісці ў тэрміновым парадку да Магілёва, які да гэтага часу занялі белапалякі. Спыніліся пад Старым Быха-

З. І. Прасянцоў.

Д. І. Старавойтаў.

вам. Тут пачаў фарміравацца з добраахвотнікаў і адданых Савецкай уладзе казакоў Быхаўскі конны партызанскі атрад. Камандаваць атрадам, які складаўся з 75 чал., стаў данскі казак Карпаў.

Многія з нас не ўмелі ваяваць у конным страі, валодаць шаблямі і пікамі. Таму конны атрад перадыслацыраваўся ў Крычаў, дзе некаторы час прысвяціў баявой вучобе. У той час палякі не вялі актыўных дзеянняў і невялікімі атрадамі раз'язджалі па вёсках павета, рабуючы насельніцтва, тэрарызуючы сем'і партызан і чырвонагвардзейцаў.

Мы атрымалі паведамленне, што ў Прыпёчына прыбыў такі атрад. Нехта данёс, што ў вёсцы шмат сем'яў партызан, і палякі пачалі шныраць па хатах. Яны збілі плёткамі старасту Мітрафана Марускова, сялян Засіма Мельнікава і Фядоса Агеева, калі тыя не ўказалі на партызанскія сем'і. Палякі вырашылі спаліць вёску, а перад гэтым сабраць харчовую кантрыбуцыю. Наш атрад выступіў з Крычава ў напрамку Доўгае. Мы зайшлі ў Чэрыкаў і папярэдзілі аб з'яўленні ворага атрад В. Р. Розе, які тут знаходзіўся.

Не даходзячы трох кіламетраў да Прыпёчына, мы спыніліся, і праз знаёмых я выклікаў свайго 15-гадовага брата Сцяпана і яго сябра Івана Агеева. Пад выглядам жабракоў яны разведалі сілы ворага, і мы нанеслі нечаканы ўдар.

Гэтыя некалькі эпізодаў з маёй баявой маладосці даюць некаторае ўяўленне аб тым, як нялёгка давалася ўстанаўленне новай улады.

Д. І. СТАРАВОЙТАЎ. Нарадзіўся я ў в. Тур'е былой Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета ў 1900 г. Сям'я наша была бядняцкая. У 17 гадоў застаўся сіратой. Вось і давялося пайсці па найму да пана Астанковіча і кулакоў.

Пасля перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі я, тады 18-гадовы юнак, уступіў у атрад Чырвонай гвардыі. Камандаваў ім баявы камандзір Вальдэмар Розе. У хуткім часе гэты атрад быў ператвораны ў 153-ці полк партызанскіх злучэнняў. Мяне накіравалі на курсы камандзіраў кулямётных каманд у г. Ржэў Цвярской губерні. Па заканчэнні курсаў выехаў у полк асобага назначэння штаба 15-й арміі ў якасці камандзіра кулямётнай каманды латышскага палка, камандзірам якога быў тав. Віліс Лаціс. Полк ваяваў на паўночна-заходнім фронце супраць генерала Юдзеніча. Першае баявое хрышчэнне я атрымаў на фронце ў раёне вёсак Усве, Ліцвякі, Калодзіжкі Віцебскай губерні. Прымаў удзел у баях за вызваленне гарадоў Гдова, Пскова, станцыі Патапава, Жогава. Пад Псковам уступіў у камсамол.

Пасля разгрому арміі Юдзеніча і Калчака наш латышскі полк быў перакінуты на Заходні фронт. У ліпені 1920 г. нашы часці вызвалілі Мінск, павятовы цэнтр — мястэчка Глыбокае, гарады Маладзечна, Навагрудак, Ваўкавыск, Гродна, Вільна і інш. Ваяваў на тэрыторыі Польшчы і ўдзельнічаў ва ўзяцці гарадоў Ломжа, Беласток. Ад г. Беластока давялося з цяжкімі баямі адступаць, прыкрываць адыходзячыя часці і эвакуіравацца за Беласток. За баявыя заслугі я быў прадстаўлены да ордэна Чырвонага Сцяга.

Пасля шпіталю ў канцы снежня 1921 г. мяне накіравалі ў распараджэнне Чэрыкаўскага ваеннага камісарыята. Памятаю, які вялікі ўрон быў нанесены грамадзянскай вайной народнай гаспадарцы. Выведзены з севаабароту вялікія плошчы зямлі, навокал разруха, голад. Трэба было брацца за аднаўленне жыцця. Райкам партыі даручыў мне заняцца ўмацаваннем камсамольскіх ячэек на вёсцы. У той час яны былі створаны ў вёсках Мірагошч, Шароеўка, Доўгае, Горкі, Дубраўка, Глінь, Наркі. Я быў выбраны членам павятовага камітэта камсамола. У хуткім часе мяне накіроўваюць на курсы ў г. Магілёў, па заканчэнні якіх пачаў працаваць у саўгасе «Елізавеціна» Краснапольскай воласці. У канцы 1923 г. мяне выбралі старшынёй камітэта прафсаюза работнікаў зямлі і лесу і адначасова намеснікам старшыні райпрафсавета. Старшынёй у гэты час працаваў Г. М. Эртман. На маю долю выпала работа аб'ядноўваць і арганізоўваць батрацкія камітэты, заключаць дагаворы з кулакамі, арганізоўваць арцелі лесарубаў, сплаўшчыкаў, прымаць людзей у члены прафсаюза, кіраваць прафсаюзнымі арганізацыямі.

У ліпені 41-га года пайшоў змагацца супраць нямецкіх акупантаў. Доўгія вёрсты франтавых дарог прывялі мяне ў Берлін. Аб гэтым сведчаць і баявыя ўзнагароды, фатаграфія ля Брандэнбургскіх варот і роспіс на сцяне рэйхстага.

Родам з Вепрына

Вузкія вуліцы. Хаты з маленькімі акенцамі і саламянымі дахамі. Адна манаполька, адна лаўка, прыходская школа — вось і ўсё аблічча вёскі Вепрын, у якой у 1894 г. у сям'і селяніна нарадзіўся Фёдар Кірылавіч Макштароў.

Невялікі зямельны надзел не мог пракарміць сям'ю Макштаровых у 11 душ. І таму пасля заканчэння чатырох класаў прыходскай школы Федзя Макштароў быў вымушаны пайсці парабкам да пана Васілеўскага. Ад цямна да цямна ён рабіў у полі, але рабская праца за кавалак хлеба ніколі не была мілай, і ў хуткім часе следам за старэйшым братам падаўся хлопчык на шахты Данбаса.

На шахце юнак пазнаёміўся са сваім земляком бальшавіком Міхаілам Шаўцовым, якому вельмі спадабаўся. Ён узяў Фёдара да сябе на кватэру. Станоўчы ўплыў на светапогляд юнака аказалі гутаркі Шаўцова аб жыцці рабочых і сялян. Пазней Макштароў знаёміцца з іншымі рэвалюцыянерамі, прысутнічае на іх сходах і маёўках.

У 1915 г. Фёдар Макштароў быў прызваны ў царскую армію. Яго часць стаяла на станцыі Палачыны, калі ён даведаўся, што ў Петраградзе рабочыя скінулі цара. Вестка ўзрадавала салдат, але вайна працягвалася, і Макштароў пачынае праводзіць сярод аднапалчан гутаркі аб спыненні вайны, за перамір'е. За гэта Фёдара арыштоўваюць, але па шчаслівай выпадковасці яму ўдаецца вырвацца на свабоду.

Ф. К. Макштароў.

У хуткім часе ён прыязджае ў родную вёску Вепрын. Пабыць тут доўга не давялося — ішла вайна — і ён падаўся ў партызанскі атрад, якім камандаваў Вераб'ёў. Усё было ў яго партызанскім жыцці: і налёты на панскія маёнткі, сутыкненні з ворагам на лясных сцежках, і смяротная пагроза.

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі Фёдар Макштароў прымае ўдзел у арганізацыі камітэта беднаты ў Вепрыне, на чале якога стаяў Патап Якушэнка. Сам жа разам з атрадам чырвонаармейцаў ідзе на фронт, дзе змагаецца ў складзе 1-й гаўбічнай артылерыйскай батарэі 17-й дывізіі. У 1919 г. Фёдар Кірылавіч уступае ў рады партыі балышавікоў. У гэтым жа годзе ён накіроўваецца ў палітшколу ў г. Віцебск. Па заканчэнні яе Макштароў едзе на Смаленшчыну ў якасці палітрука воінскай часці.

Вярнуўшыся ў Вепрын, Фёдар Кірылавіч адразу ж уключыўся ў справу. Ён узначаліў атрад па харчаразвёрстцы. У 1923 г. Макштароў стаў старшынёй Вепрынскага пасялковага Савета. Калі пачалася калектывізацыя — выступіў першым арганізатарам калектыўнай гаспадаркі. У 1931 г. жыхары Вепрына ўступілі ў калгас. Да 1941 г. ім кіраваў Фёдар Кірылавіч Макштароў.

У час Айчыннай вайны Ф. К. Макштароў знаходзіўся ў Казані. Тут на заводзе ён працаваў страшынёй рабочага камітэта. Дзень і ноч рабілі працоўныя завода знакамітыя «трыццацьчацвёркі».

Пасля перамогі Макштароў вяртаецца ў родны край. За аднаўленне роднай гаспадаркі ўзяліся людзі на чале са сваім старшынёй. Амаль усё прадстаяла занава адбудаваць, аднавіць. Калі калгас моцна стаў на ногі, Фёдар Кірылавіч перайшоў працаваць у сельскі Савет, а ў 1959 г. выйшаў на пенсію. Памёр ён у сакавіку 1973 г.

Ф. Рудзікаў.

Лёс

За зямлю і волю

«Каляснёў Антон Дзмітрыевіч нарадзіўся ў в. Вялікія Хутары Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні, быў членам партыі «Зямля і воля»... (З даведкі Дзяржаўнага архіва Чыцінскай вобласці.)

Жандары ўзялі яго ноччу. У доме зрабілі вобыск, знайшлі зброю. Даставілі ў дэпартамент паліцыі. Хто аказаўся правакатарам — Антон Каляснёў не ведаў. У памяці перабіраў падзеі апошніх дзён. Успомніў сход аднавяскоўцаў. Сяляне скардзіліся на вялікія падаткі і прыгнёт. Не ўтрымаўся тады і ён.

— Хопіць цярпець здзекі. Хай памешчыкі Бенкендорф, Бібікава, Крапоткін плацяць за нас падаткі. У іх уся зямля, а ў нас пяскі ды балоты.

Людзі падтрымалі, зашумелі:

— Цару аб гэтым напісаць трэба!

— І цар з імі заадно,— рэзка абарваў Каляснёў.— Зямля наша, і прыйшоў час адабраць яе ў памешчыкаў.

Яшчэ ішла бурная сходка ў пракуранай хаце, а да станавога прыстава ў Краснаполлі ўжо спяшаўся даносчык.

Антон Каляснёў з дзяцінства зведаў, што такое беззямелле, батрачыў. А потым прымкнуў да груп рэвалюцыйнай сялянскай моладзі, якія створаны былі ў вёсках Вялікія Хутары, Усцінавічы, Сафееўка, Карма-Пайкі. Яны называлі сябе землявольцамі, нарадавольцамі, а

тутэйшыя іх звалі «казачкамі».

У в. Вялікія Хутары групу такіх «казачкоў» узначальваў Антон Каляснёў, ва Усцінавічах — Антон Кіцікаў, у Сафееўцы — Бібікаў. Была група і ў Карма-Пайках. Усе яны былі ў адной арганізацыі, але захоўвалі строгую канспірацыю.

...Антон Каляснёў трымаўся стойка, усё прымаў на сябе. Як ні стараліся жандары дабіцца ад яго раскрыцця арганізацыі — нічога не выйшла.

Прыгавор быў суровы — 6 гадоў катаргі.

З залы суда паліткатаржаніна пад узмоцненым канвоем павезлі ў Сібір. Этап прыбыў на Казакоўскія горныя промыслы. Закаваны ў кайданы, Антон з раніцы да позняга вечара працаваў у забоі.

Працаваў і думаў. У рэдкія гадзіны адпачынку ўспамінаў родныя мясціны і тых, хто там застаўся, працягваючы барацьбу за зямлю і волю.

Катаржная работа выцягвала сілы, але трэба было трымацца, каб выжыць. І ён выжыў. Вызваленне прыйшло перад першай рэвалюцыяй ў Расіі. Вяртанне на радзіму затрымлівалі. Пасля катаргі перавялі на вольнае пасяленне, там жа, у Сібіры.

Мы наш, мы новы...

«У 1917 г. паступіў у першы дэмакратычны атрад і ваяваў супраць Керанскага на Заходнім фронце». (З архіўнай даведкі.)

Вестка аб звяржэнні цара застала А. Д. Каляснёва на Заходнім фронце сусветнай імперыялістычнай вайны. На фронце зблізіўся з бальшавікамі і паступова вызваляўся ад сваіх народніцкіх поглядаў.

Улада — Саветам, мір — народам, зямля — сялянам. Усё гэта было блізка і зразумела. Антон Каляснёў апынуўся ў гушчыні ўсіх палітычных падзей у Петраградзе, дзе бурна разгортвалася барацьба супраць палітыкі Часовага ўрада. Вядома, у чымсьці Антон яшчэ і сумняваўся, але ўсё канчаткова праяснілася пасля таго, калі яму давялося пачуць выступленне У. І. Леніна.

Каляснёў без ваганняў уступае ў дэмакратычны атрад і прымае ўдзел у барацьбе супраць Керанскага. Рэвалюцыйныя атрады перайшлі ў раёне Пулкаўскіх вышынь у наступленне і адкінулі казакоў...

А далей была не менш жорсткая барацьба з контррэвалюцыяй.

Па рашэнню палкавога камітэта вясной 1918 г. Каляснёў адпраўляецца ў Сібір для барацьбы за ўмацаванне там Савецкай улады.

Побач з Сяргеем Лазо

«У Забайкаллі ваяваў у атрадах Чырвонай Арміі з сакавіка 1918 па 1921 год пад камандаваннем Лазо, Жураўлёва...» (З архіўнага дакумента.)

У Забайкаллі арудавалі банды атамана Сямёнава, якія наступалі на Нерчынск і Чыту. Для барацьбы з сямёнаўшчынай Цэнтральны выканаўчы камітэт Саветаў Сібіры (Цэнтрасібір) утварыў Забайкальскі фронт на чале з Сяргеем Лазо. Вясной 1918 г. Антон Каляснёў арганізуе атрад чырвонаармейцаў Казакоўскіх промыслаў, які прабіраецца да станцыі Даурыя, дзе праходзіла лінія фронту.

Тут і сустрэўся Каляснёў з камандуючым фронту С. Лазо. А потым былі гарачыя баі. Белыя займалі сопкі на правым беразе р. Анон і мелі пазіцыйную перавагу. Лазо пераправіў атрады цераз рэчку і ўступіў у бой. Антон Каляснёў быў сярод атакуючых. Узяты былі Алавянінскія вышыні, пас. Барзю. Чырвонагвардзейцы рухаліся да станцыі Даурыя.

У ліпені банды Сямёнава былі адкінуты да кітайскай граніцы. Каман-

дуючы фронтам загадаў авалодаць апошнім апорным пунктам на гары Тавін-Талагой, дзе замацаваліся белабандыты. Антон Каляснёў штурмаваў вышыню крайнім левым флангам, што прымыкаў да пагранічнай р. Аргуні. 28 ліпеня 1918 г. вышыня была ўзята.

Але да канчатковай перамогі яшчэ было далёка. Мяцежны чэхаславацкі корпус наступаў на Чыту з боку Іркуцка. Сяргея Лазо перакідваюць для барацьбы з белачэхамі з Забайкальскага фронта на Прыбайкальскі. Становішча было складаным, утрымаць фронт не ўдалося. Зноў зашавяліліся банды Сямёнава. Савецкая ўлада ў Сібіры часова пала.

Па ўказанні Лазо чырвонагвардзейцы павінны былі вярнуцца ў свае сем'і — для нелегальнай работы на месцах і рыхтавацца да новых баёў.

...Антон Каляснёў вярнуўся ў Казакова, але ненадоўга. У сакавіку 1919 г., пасля паўстання рабочых промысла супраць сямёнаўшчыны, ён уліваецца ў партызанскі атрад спачатку Кіргізава, а затым Жураўлёва. Займае пасаду начальніка асобага аддзела атрада, становіцца агітатарам, выконвае многія адказныя даручэнні па фарміраванню чырвонагвардзейскіх партызанскіх груп і злучэнняў. Займаецца забеспячэннем іх зброяй і правіянтам, у якасці асобага ўпаўнаважанага змагаецца з дэзерцірствам.

Аб гэтым расказваюць дакументы таго часу:

«Мандат. Прад'явіцель гр. Каляснёў камандзіраваны Ваенна-рэвалюцыйным штабам 2-га раёна для правядзення мабілізацыі ў пасяленнях, размешчаных па Талінгую. Начальнік штаба А. Раздобраў. 30 сакавіка 1919 года.» «Мандат. Выдадзены Каляснёву А. Д., у тым, што ён сапраўды ўпаўнаважаны штабам 2-га раёна для арганізацыі атрадаў супраць засілля іншаземцаў і сямёнаўшыны. Кіргізаў. 6 красавіка 1919 г.»

І яшчэ:

«Мандат. Каляснёў Антон штабам корпуса ўпаўнаважаны фарміраваць атрады для барацьбы з сямёнаўшчынай і па назіранню за парадкам. Яму даручаецца аддаваць суду асоб за непрыстойныя ўчынкі і ажыццяўляць мерапрыемствы ў карысць Народна-рэвалюцыйнай арміі. Ліпень. 1920 г.»

Атрады паўстанцаў Забайкалля былі перафарміраваны ў палкі і дывізіі, а затым склалі Усходні фронт Народна-рэвалюцыйнай арміі, якая вяла барацьбу супраць сямёнаўшчыны і інтэрвентаў.

...20 красавіка 1919 г. завязаўся цяжкі бой на р. Аргуні пад с. Урупіна. Некалькі разоў кавалерыі і пяхоце даводзілася хадзіць у атаку. Упартасць чырвоных байцоў расла. У разгар бою Каляснёў быў паранены, але застаўся ў страі.

І пасля бою ў шпіталі ён доўга не затрымаўся. Настаў шчаслівы дзень вызвалення Чыты. Гарадскі Савет у падзячнай грамаце А. Д. Каляснёву пісаў: «Вы адзін з тых, хто смела глядзеў у вочы смерці, перанёс на сваіх плячах і голад, і холад, і хваробы, і бадзянні ў час грамадзянскай вайны.

Памяць пра вашы заслугі перад рабочымі і сялянамі Савецкай рэспублікі будзе вечнай.»

Агню душы не патушыць!

Як склаўся ў далейшым лёс А. Д. Каляснёва? Цяжкае раненне пад Урупінам зрабіла яго інвалідам на ўсё жыццё. Сям'я была вялікай: жонка, чатыры дачкі і сын. Пенсія мізэрная, а хвароба... Пастаянная нястача прымушала прасіць дапамогі. Ён прайшоў дзяржаўную праверку, у яго на руках было пасведчанне паліткатаржаніна і партызанскі білет за № 05708 чырвонагвардзейца і чырвонага партызана. Былі ўсе падставы, каб спакойна і забяспеча-

на дажываць старасць. Але так не атрымалася. Калі яму было асабліва цяжка, калі заўважаў, што працвітае зусім не тое, дзеля чаго рабілася рэвалюцыя, за што змагаліся рэвалюцыянеры-ленінцы, прама выказваў свае думкі.

...У 1937 г. Антон Дзмітрыевіч Каляснёў быў арыштаваны органамі НКУС па падазрэнню ў антысавецкай дзейнасці. Бясконца доўга цягнуліся дні зняволення. Перадумаў і пераацаніў вельмі многае.

У яго абарону выступілі старыя сябры па рэвалюцыйнай барацьбе.

«Каляснёў А. Д. у 1918 г. выступіў на барацьбу супраць атамана Сямёнава на Даурскім фронце, з 1919 г. ваяваў у атрадзе паўстанцаў Кіргізава па ліквідацыі банд» (былы камандзір брыгады Забайкальскай кавалерыйскай дывізіі Дзімаў).

«Ведаю Каляснёва Антона Дзмітрыевіча як першага актыўнага ўдзельніка партызанскага руху супраць белагвардзейцаў у Забайкаллі» (Цемнікаў).

«Ведаю Каляснёва А. Д. з ліпеня 1919 г. па сумеснай рабоце ў партызанскім атрадзе т. Жураўлёва. Каляснёў А. Д. адданы Савецкай уладзе, стойкі рэвалюцыянер» (Г. Е. Фадзееў, былы ад'ютант камандзіра роты).

Мужныя партызаны Забайкалля не пабаяліся сказаць сваё слова, і Каляснёў быў вызвалены.

... Маё знаёмства з Антонам Дзмітрыевічам пачалося ў канцы 50-х гадоў, калі ён на схіле сваіх гадоў вярнуўся ў родныя мясціны.

Нядоўга тут пражыў. Пахаваны на Краснапольшчыне ў 1960 г.

Л. Лабаноўскі.

Іх было чацвёра

У краязнаўчым музеі Хоцімскай сярэдняй школы № 1 у экспазіцыі «Вялікая Айчынная вайна» ёсць фотаздымкі чатырох братоў Яфрэменкаў з в. Бяседавічы Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці.

— У сям'і іх было чацвёра: Трыфан, Васіль, Карней і Марк,— расказвае загадчыца музея Валянціна Іванаўна Баурына,— на жаль, у жывых з іх нікога ўжо не засталося. Некалькі год назад у Маскве памёр самы малодшы з братоў Марк.

Чым жа праславіліся браты Яфрэменкі?

Васіль і Карней былі ваеннымі лётчыкамі. Першы з іх загінуў у небе над Ладажскім возерам, абараняючы «дарогу жыцця» з асаджанага ворагам Ленінграда, другі — у небе Севастопаля. Толькі нядаўна стала вядома, што былы лётчык 502-га штурмавога Таманскага авіяпалка маёр Карней Сямёнавіч Яфрэменка ў баях за Севастопаль 13 красавіка 1944 г. паўтарыў подзвіг Героя Савецкага Саюза капітана Гастэлы, накіраваўшы свой палаючы самалёт на варожы карабель.

Мужна змагаўся на фронце з ворагам і малодшы з братоў Яфрэменкаў — Марк Сямёнавіч, аб чым сведчылі яго баявыя ўзнагароды: два ордэны Леніна, тры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Чырвонай Зоркі, іншыя ордэны і медалі.

Службу ў радах Савецкай Арміі Марк Сямёнавіч закончыў у званні палкоўніка.

Менш пакуль вядома пра старэйшага з братоў Яфрэменкаў — Трыфана. Акрамя фотаздымка і невялікага каментарыя да яго ў музеі іншых звестак пакуль няма. Раптоўная смерць Марка Сямёнавіча не дазволіла сабраць пра яго старэйшага брата неабходны матэрыял. Вядома толькі, што з першых дзён Кастрычніцкай рэвалюцыі ён становіцца павятовым ваенным камісарам, удзельнічае ва ўмацаванні новай улады ў г. Клімавічы. У 1918 г. уступае

Т. Яфрэменка.

ў партыю. У наступным годзе Трыфан Сямёнавіч — ужо ваенны кіраўнік Чэрыкаўскага павятовага ваеннага камісарыята. Менавіта гэта акалічнасць і прывяла нас на Хоцімшчыну, каб даведацца хоць штонебудзь пра аднаго з першых вайскоўцаў на Чэрыкаўшчыне. К таму часу мы ўжо мелі ў руках адзін з дакументаў 1919 г., засведчаны подпісам кіраўніка чэрыкаўскага павятовага ваеннага камісарыята Трыфана Сямёнавіча Яфрэменкі. Гэта была аб'ява аб наборы на артылерыйскія курсы. А паколькі гэта рэдкае сведчанне нашай гісторыі, нагадаем яго цалкам і на той мове, на якой ён быў надрукаваны ў павятовай газеце.

«15-го мая в г. Смоленске открываются артиллерийские курсы для подготовки лиц, могущих занять должности младшего командного состава в полевой артиллерии.

1) На курсы принимаются лица, как уже состоящие на службе в армии, так и со стороны; в последнем случае — удовлетворяющие всем требованиям для приема в войска.

2) Для поступления требуются рекомендации органов, стоящих на платформе Советской власти и образовательный ценз не ниже высшего начального училища.

3) Продолжительность обучения — 1 год 7 месяцев, из них на подготовительном курсе 7 месяцев и 1 год — на специальном.

4) Лица, имеющие образовательный ценз не ниже 5-ти классов среднего учебного заведения могут быть приняты сразу на специальный курс.

5) Каждый поступающий обязывается по окончанию курса прослужить в Красной армии за каждый месяц обучения полтора месяца.

6) Все курсанты получают жалованье и все виды довольствия наровне с красноармейцами.

7) Окончившие полный курс выпускаются в войска командирами взвода.

8) Желающие поступить подают о сем заявление на имя заведующего курсами с приложением: а) партийной рекомендации, б) аттестата об образовании. Не имеющие аттестата подвергаются поверочному испытанию.

9) Прием заявлений и выдача справок ежедневно от 10 до 2 часов дня в г. Смоленске, в штабе Военно-окружного комиссариата (Блонье, быв. губернаторский д., комн. Окарту) или почтой по тому же адресу.

Военнослужащие подают заявление по команде.

Приемные испытания и начало курсов 15 мая с. г.

Чериковский уездный военный Комиссар — Мясников

Руководитель — Ефременко

Нач. канцелярии — Шевелев

Делопроизводитель (подпись)»

У музеі давялося даведацца яшчэ і пра тое, што бацька гэтай сям'і Сямён Яфрэменка памёр у 1917 г. і дзяцей выхоўвала маці. Сям'я жыла бедна, таму, падрастаючы, браты заўсёды дапамагалі адзін аднаму. Але большая частка клопатаў выпала на долю Трыфана, як старэйшага ў сям'і.

А. Ярохін.

Першы рэдактар

Неяк падчас прагляду экспанатаў аднаго са школьных музеяў на Краснапольшчыне на вочы трапілася чвэртка старой газеты. Мільганула знаёмае прозвішча. Прыгледзеўся, так і ёсць: Антон Зорскі. Але чаму рэдактар? Навёў даведку пра газету. Адказалі, што гэта — былая павятовая газета.

Далейшы пошук прывёў у Нацыянальную бібліятэку Рэспублікі Беларусь. У Бібліяграфічным паказальніку «Газеты Беларускай ССР 1917—1975» удалося знайсці наступныя тлумачэнні пра чэрыкаўскую павятовую газету (да першага раянавання БССР Краснапольская воласць уваходзіла ў Чэрыкаўскі павет Магілёўскай вобласці): «Красный клич»: орган Чериковского уездного Совдепа. 1918, 7 августа — 1919.— Загл.: 1918 № 1 (7 авг.) — 1919 № 10 (1 апр.) Известия Чериковского уездного Совдепа.

1918 № 1—27; 1919 № 1—14 (41) (1 мая)».

Больш істотнага ўдакладніць не ўдалося. Але і гэтага было нямала, бо стала вядома, што пісьменнік Антон Зорскі быў адным з першых рэдактараў чэрыкаўскай павятовай савецкай газеты.

Нагадаліся расказы маёй першай настаўніцы Веры Яфімаўны Крысанавай з Каз-Рудапольскай сямігадовай школы на Краснапольшчыне пра пісьменніка і яго сям'ю, пра ўдзел у будаўніцтве паслякастрычніцкага жыцця ў раёне. Потым я сустрэў яго імя сярод фельетаністаў газеты «Праўда» і ўрэшце рэшт выйшаў на яго творчасць канца 20-х пачатку 30-х гадоў. А цяпер вось у мяне ў руках былі і доказы яго журналісцкай дзейнасці.

Антон Яфімавіч Зорскі (Майсеенка) нарадзіўся ў 1894 г. у в. Малюшын Краснапольскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Але паколькі афіцыйнай біяграфіі яго пакуль няма, спашлюся на звесткі, якія сабраны аб ім у Краснапольскай раённай бібліятэцы імя М. Ткачова.

«Імкненне да ведаў дало яму магчымасць у 1914 г. стаць настаўнікам Палужскай сельскай школы. У 1917 г. А. Я. Зорскі быў выбраны сакратаром зямельнага камітэта Палужскага валаснога выканкама, а пасля кастрычніка 1917 г.— старшынёй сельскага Савета ў Палужы. У 1918 г. ён уступіў у рады бальшавіцкай партыі. Тады ж з'яўляюцца і яго першыя вершы, селькораўскія заметкі. Ён працуе ў рэдакцыі газет «Новая деревня», «Известия Витебского губкома», з'яўляецца адказным сакратаром «Крестьянской газеты».

Усяго А. Зорскі апублікаваў звыш 100 вершаў. У асноўным жа ён быў майстрам кароткага апавядання. Апавяданні Антона Яфімавіча «Пастух» (1928), «Нарад» (1929), «Сухастой» (1930), «Садзік» (1932) выходзілі ў Маскве і Ленінградзе паасобнымі выданнямі...

А. Я. Зорскі быў членам Саюза сялянскіх пісьменнікаў*, а затым — кандыдатам у члены Саюза Савецкіх пісьменнікаў.

Ён пражыў нядоўгае, але яркае жыццё».

Адразу ж агаворымся. Калі весці гаворку пра творчую спадчыну Антона Яфімавіча, дык трэба абавязкова нагадаць яго п'есу «Корань зла», якая ўбачыла свет у Дзяржаўным выдавецтве мастацкай літаратуры ў Маскве ў 1932 г.

А вось што расказвае сам пісьменнік пра той час:

«Першы раз мяне выклікалі на працу ў гомельскую губернскую га-

---

* Статут Усерасійскага Саюза сялянскіх пісьменнікаў быў прыняты на ўстаноўчай канферэнцыі сялянскіх пісьменнікаў 9 мая 1921 г. у Маскве.

зету «Новая деревня». У гэтай газеце я прапрацаваў дзве зімы. Затым мяне выклікалі на працу ў віцебскую губернскую газету, дзе я таксама прапрацаваў дзве зімы...

У 1926—1927 г. зноў працаваў у гомельскіх газетах «Новая деревня» і «Полесская правда».

У маі 1928 г. мяне выклікалі ў Маскву на працу ў «Крестьянскую газету», на гэтай працы я знаходжуся і зараз. (Сведчанні пісьменніка адносяцца да 7 красавіка 1933 г.»).

Расказваючы пра лёс гэтага чалавека, нельга абысці маўчаннем і такі момант з яго біяграфіі, як рэпрэсіі з боку таталітарнага рэжыму. Па пэўнаму збегу акалічнасцей справа А. Я. Зорскага пачалася амаль адначасова са справай яго добра знаёмага савецкага пісьменніка, акцёра і рэжысёра Міхаіла Апанасавіча Булгакава, аўтара шырока вядомага твора пра Майстра і Маргарыту.

Не шмат чаго нам вядома і пра далейшы лёс Антона Яфімавіча. Зноў жа спашлёмся на звесткі з Краснапольскай раённай бібліятэкі:

«У пачатку Вялікай Айчыннай вайны А. Я. Зорскі ўступае ў рады народнага апалчэння і ўдзельнічае ў баях з ворагам на подступах да Масквы. Восенню 1941 г. Антон Яфімавіч загінуў смерцю героя».

А. Ярохін.

УДЗЕЛЬНІКІ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ І ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

Д. В. Антоненка.

Н. М. Боміхаў.

М. К. Брылёў.

І. М. Буцянаў.

АБІРАЛАЎ Феадосій Сафронавіч, нарадзіўся ў в. Шароеўка ў 1892; ваяваў у партызанскім атрадзе В. Розе; памёр у 1969.

АНДРЭЕНКА Мартын Дзямідавіч, нарадзіўся ў в. Верамейкі ў 1896; памёр 16 лютага 1977.

АНТОНЕНКА Дзмітрый Васільевіч, нарадзіўся ў г. Чэрыкаў у 1898; ваяваў супраць Калчака, Дзянікіна, Юдзеніча; памёр у 1985.

АЎСЕЕНКА Давыд Вавілавіч, нарадзіўся ў в. Рынкоўка ў 1892; памёр у 1985.

БАНДУРЫН Ануфрый.

БАНДУРЫН І. А.

БЕЛАХОНАЎ Д. Б.

БЕЛАХОНАЎ І. Б.

БЕЛАХОНАЎ Ф. Ф.

БОМІХАЎ Нікіфар Міхайлавіч, нарадзіўся ў в. Вепрын у 1898, з пачатку 1918 — у радах Чырвонай Арміі, удзельнік баёў з нямецкімі акупантамі на Украіне, з Юдзенічам пад Петраградам; памёр у 1961.

БРЫЛЁЎ Максім Кірылавіч, нарадзіўся ў в. Прыпечына ў 1894; у гады грамадзянскай вайны ваяваў у першым Магілёўскім Чырвонагвардзейскім атрадзе; змагаўся з белапалякамі; памёр у 1980.

БУЦЯНАЎ Ілья Маркавіч, нарадзіўся ў в. Зоры ў 1899; ваяваў супраць белапалякаў; прымаў удзел у вызваленні Пінска, Кобрына, Брэста; памёр у 1976.

ВАПРУЧКОЎ Д. А.

ВАСІЛЕНКА Сяргей Рыгоравіч, нарадзіўся ў в. Зоры ў 1894; удзельнік штурму Зімняга палаца.

ВЕНГЕРАЎ Міхей.

С. Р. Васіленка.

І. К. Громаў.

Ф. С. Губараў.



П. С. Далецкі.



С. У. Елісееў.

М. І. Зімонін.

А. А. Кавалёў.



М. Ф. Кажэўнікаў.

М. С. Кісялёў.

У. М. Міхееў.



Г. І. Новікаў.



П. М. Петражыцкі.

ГЕНЕРАЛАЎ Аляксей Лукіч, нарадзіўся ў в. Язёры ў 1893; памёр у 1986.

ГРОМАЎ Іван Кузьміч, нарадзіўся ў г. Чэрыкаў у 1895; служыў на крэйсеры «Аўрора»; удзельнік кастрычніцкіх падзей у Петраградзе; памёр у 1979.

ГРЫШЧАНКОЎ Капітон Емельянавіч, нарадзіўся ў в. Верамейкі ў 1894; памёр 22 мая 1970.

ГУБАРАЎ Ф. С.

ДАЛЕЦКІ Парфен Савельевіч, нарадзіўся ў в. Лабанаўка ў 1892; у час кастрычніцкіх падзей знаходзіўся ў Петраградзе; у пачатку 1918 даставіў у Чэрыкаў літаратуру і газеты з Смольнага; памёр у 1968.

ДУДАРАЎ Т. А.

ЕЛІСЕЕЎ Сямён Усцінавіч, нарадзіўся ў в. Верамейкі ў 1896; у 1919 быў прызваны ў Чырвоную Армію; памёр у 1972.

ЗАХАРАНКА Іван Якаўлевіч, нарадзіўся

А. І. Попель.

І. І. Прахарэнка.



В. Ф. Сазонаў.

Д. Ф. Серыкаў.

А. А. Татарэнка.

С. І. Чыркоў.

Р. А. Шаблоўскі.

І. І. Шастапалаў.

Ф. І. Шпакаў.

ў в. Гронаў у 1892; ваяваў у партызанскім палку В. Розе; памёр у 1967.

ЗІМОНІН Міхаіл Іванавіч, загінуў у 1918.

КАВАЛЁЎ Аляксандр Антонавіч, нарадзіўся ў г. Чэрыкаў ў 1899; загінуў у 1942.

КАЖЭЎНІКАЎ Міхаіл Фёдаравіч, нарадзіўся ў в. Верамейкі ў 1885; прымаў удзел у штурме Зімняга палаца; памёр у 1972.

КАЙСАРЭНКА Кірыл.

КІСЯЛЁЎ Мацвей Сямёнавіч, нарадзіўся 18 лістапада 1896; памёр у 1942.

КРУМЛІКАЎ Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў в. Лобча ў 1896.

КУРЫЛЕНКА Іван Афанасьевіч, нарадзіўся ў г. Чэрыкаў у 1895; удзельнік штурму Зімняга палаца; памёр у 1975.

МАРКАЎ Іосіф Аляксандравіч, нарадзіўся у 1898.

МІХЕЕЎ Уладзімір Мацвеевіч, нарадзіўся ў в. Верамейкі ў 1895; памёр 5 ліпеня 1979.

НОВІКАЎ Галакціён Ігнатавіч, нарадзіўся ў в. Верамейкі ў 1895; памёр 2 жніўня 1982.

ПЕТРАЖЫЦКІ Платон Міхайлавіч, нарадзіўся ў Чэрыкаве ў 1894; ваяваў супраць Дзянікіна і белапалякаў; памёр у 1960.

ППКО К. Д.

ПОПЕЛЬ Адам Іванавіч, нарадзіўся ў в. Сакольнічы ў 1895; удзельнік кастрычніцкіх падзей у Петраградзе; памёр у 1962.

ПРАХАРЭНКА Іван Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1900; ваяваў пад камандаваннем Н. А. Шчорса; памёр у 1975.

РАМАНЯТАЎ Е. С.

САЗОНАЎ Васіль Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1897.

САКАЛОЎ Дзям'ян Андрэевіч, нарадзіўся ў в. Глінь у 1897; памёр ў 1985.

СЕРЫКАЎ Даніла Фёдаравіч, нарадзіўся ў в. Наркі ў 1896; памёр у 1960.

СОТНІКАЎ Георгій Кузьміч, нарадзіўся ў в. Зоры ў 1895; ваяваў супраць Калчака; памёр у 1985.

ТАТАРЭНКА Аляксандр Азаравіч, нарадзіўся ў в. Язёры ў 1897; памёр у 1971.

УРУПІН Н. М.

ЧАХЛОЎ Е. К.

ЧЫРКОЎ Сяргей Іванавіч, нарадзіўся ў в. Малінаўка ў 1892, служыў на крэйсеры «Аўрора»; удзельнік кастрычніцкіх падзей у Петраградзе, памёр у 1961.

ШАБЛАКОЎ Міхаіл, нарадзіўся ў в. Гронаў; ваяваў у партызанскім атрадзе В. Розе; загінуў у 1919.

ШАБЛОЎСКІ Рыгор Анісімавіч, нарадзіўся ў Чэрыкаве ў 1895; ваяваў у складзе Чапаеўскай дывізіі; памёр у 1982.

ШАСТАПАЛАЎ Іосіф Іванавіч, нарадзіўся ў в. Шароеўка ў 1898; памёр у 1990.

ШПАКАЎ Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1897; удзельнік штурму Зімняга палаца; памёр у 1977.

ЮРЧАНКА Піліп Васілевіч, нарадзіўся ў в. Чудзяны ў 1892; памёр у 1968.

ЧАС НАДЗЕЙ І СТРАТ

Закончылася грамадзянская вайна. Аднаўленне народнай гаспадаркі Чэрыкаўшчыны, як і ўсёй Беларусі, было цяжкай і складанай справай. Зменшыліся ў параўнанні з даваеннымі пасяўныя плошчы, валавыя зборы зерня, знасіўся сельскагаспадарчы інвентар, не хапала цяглавай сілы, многія сяляне засталіся без жылля. Запусцелыя палі, разбураныя прадпрыемствы, нястача — вось якая спадчына засталася працоўным.

X з'езд РКП(б) (сакавік 1921) прыняў рашэнне аб пераходзе ад харчовай развёрсткі да харчовага падатку. Новая эканамічная палітыка атрымала падтрымку сялянскіх мас на Чэрыкаўшчыне. На X павятовым з'ездзе Саветаў (красавік 1921) «дэлегаты горача віталі Савецкую ўладу і Кампартыю, адобрылі ўвядзенне харчпадатку». У рэзалюцыі Студзянецкага валаснога з'езда Саветаў ад 19 лістапада 1921 г. гаворыцца: «Прымаючы да ўвагі тое, што новая эканамічная палітыка Савецкай улады дае магчымасць развіццю буйной прамысловасці і ўздыму сельскай гаспадаркі, таксама дае магчымасць развіццю незалежнага тавараабароту паміж горадам і вёскай, прызнаць яе правільнай і аказаць усялякае садзейнічанне правядзенню яе ў жыццё».

Замена харчразвёрсткі харчпадаткам падахвоціла сялян вырабляць больш прадукцыі. З'явілася магчымасць прадаваць рэшткі ўраджаю пасля выплаты харчпадатку. Пашыраліся пасяўныя плошчы, патрэбна было насенне. Сяляне атрымлівалі пазыку ад дзяржавы (гл. артыкул «Дакументы сведчаць»).

У 1921—1922 гг. голад ахапіў Паволжа. Сяляне Чэрыкаўскага павета адгукнуліся на бяду. Яны пасылалі прадукты харчавання, бралі дзяцей на сваё ўтрыманне. Газета «Новая деревня» 22 лістапада 1921 г. паведамляла: «Сяляне вёскі Тур'е Краснапольскай воласці Чэрыкаўскага павета сабраліся ў дзень чацвёртай гадавіны Кастрычніка і вынеслі наступную пастанову: разумеючы цяжкі момант для дзяржавы, аказаць сваю дапамогу галадаючым Паволжа і павесці барацьбу з гаспадарчай разрухай. У той жа дзень было сабрана 25 пудоў прадуктаў у дапамогу галадаючым і ўся вёска прыступіла да нарыхтоўкі дроў для дзяржавы».

У звароце Чэрыкаўскага павяткама РКП(б) і выканкама да сялян павета ў снежні 1921 г. гаварылася: «...Небывалым у гісторыі голадам ахоплены больш 10 губерній Паволжа, якія заўсёды з'яўляліся жытніцай Расіі, асновай нашага харчовага дабрабыту. Там зараз да 30 мільёнаў рабочых і сялян паміраюць галоднай смерцю. Вы, сяляне, з гонарам выканалі патрабаванне рабоча-сялянскага ўрада. Вы хутка здалі насенную пазыку і жыта па харчпа-

датку і гэтым далі магчымасць засеяць азімыя палеткі галоднага Паволжа. Стогны галодных нашлі гарачы водгук у Вашых сэрцах, і Вы добраахвотным ахвяраваннем аказваеце ім брацкую дапамогу і падтрымку».

3 снежня 1921 г. газета «Новая деревня» пісала: «У вёс. Піцэнка Палужскай вол. Чэрыкаўскага п. выбралі новы сельсавет. Грамадзяне, якія ўвайшлі ў Савет, аб'явілі сябе на агульным сходзе сялян абаронцамі Савецкай улады. Праз тыдзень, зноў на вясковым сходзе, гэтыя ж грамадзяне прапанавалі сялянам не здаваць зерня ў лік харчпадатку і павялі агітацыю супраць дапамогі галадаючым. Сяляне не прынялі прапанову сельсавета і здалі харчпадатак цалкам. Аб усіх дзеяннях сельсавета было перададзена ў валвыканком, і новы кулацкі сельсавет быў распушчаны».

Архіўныя даныя сведчаць аб тым, што ў 1921 г. у Чэрыкаўскім павеце рабіліся захады, каб паспяхова правесці веснавую сяўбу. З 1 да 15 красавіка быў аб'яўлены «Двухтыднёвік чырвонага аратага». Паўсюдна арганізоўваўся збор жалеза. Газета «Новая деревня» (1 мая 1921 г.) паведамляла, што ў Чэрыкаўскім павеце было сабрана да 1000 пудоў абломкаў жалеза і сталі. Працоўныя горада дапамагалі сялянам, праводзілі рамонт сельскагаспадарчага інвентару. У зоне ўвагі ў першую чаргу былі беднякі, сем'і чырвонаармейцаў. Ім дапамагалі насеннем, фуражом, жывёлай, цяглавай сілай, сельскагаспадарчымі прыладамі працы. Арганізоўваліся пракатныя пункты сельскагаспадарчых машын. Сельгасінвентару не хапала, таму сяляне ахвотна бралі яго на пракат. У Лабанаўскім пракатным пункце агранамічным старастай быў Фішар, пры Палужскай воласці — Рыгор Нятылька, пры Крычаўскай — Кузьма Старадымаў.

Паступова аднаўлялася гаспадарка і горада Чэрыкава. Вясной 1921 г. Чэрыкаўскі павятовы пасяўкам адпусціў у якасці пазыкі насельніцтву горада насенне: канюшыны 300 пудоў, проса 8, ячменю 30, грэчкі 25, ільну 49 пудоў. Па магчымасці праводзіліся работы па ўпарадкаванню горада. У 1922 г. было выкапана больш за 400 сажняў вадасцёкавых канаў, праведзена зрэзка, падсыпка і планіроўка двух вуліц горада, рамантаваліся і насцілаліся тратуары, аднаўляліся старыя і капаліся новыя калодзежы, рамантаваліся будынкі. Да 1923 г. у Чэрыкаве было 875 жылых і 971 нежылая пабудовы, 129 заставаліся яшчэ разбуранымі і 69 недабудаванымі. Да 1927 г. на вуліцах былі ўстаноўлены ліхтары, адрамантаваны масты і шляхі мясцовага значэння, упарадкаваны вуліцы на ўскраіне горада і пад'езд да Сожа.

У 1923 г. насельніцтва горада налічвала 5613 чал.: 12,6 % рабочых, 26,68 служачых, 3,3 прыслугі, 25,86 гаспадароў з наёмнымі рабочымі, 1,22 людзей свабодных прафесій, 29,78 % іншых.

Паводле сельскагаспадарчага перапісу 1920 г., у Чэрыкаўскім павеце было 6 саўгасаў, 11 камун, 241 арцель. Калгасы не былі папулярныя. Характэрнай рысай калектыўных гаспадарак з'яўлялася абагульненне маёмасці. Ступень абагульнення была даволі высокая. Яна прадвызначалася статутам сельгасарцелі, зацверджаным у 1922 г. Наркамземам БССР. Згодна з гэтым статутам, уступаючы павінен быў «усю сваю аднаасобную гаспадарку, увесь свой жывы і мёртвы інвентар, запасы насення і пабудовы, тэхнічныя прадпрыемствы і майстэрні» перадаць у распараджэнне арцелі. Забаранялася мець «асобныя лапікі зямлі». Больш заможныя сяляне не рашаліся аддаць «апошнюю карову і кавалак агарода, не ведаючы загадзя вы-

Члены Чэрыкаўскага выканаўчага камітэта: у першым радзе (знізу) — Шашко, Гарагляд, Шалюпа, Каплуноў, Паторын; у другім радзе — Міхайлоўскі, Ахіезер, Круглікаў, Сёмкін, Чыжэўскі, Недасекін; у трэцім радзе — Партноў, Паплаўскі, Лазараў. 1922 г.

нікаў арцелі». Нават беднякам і былым чырвонаармейцам цяжка было прыняць адразу статут, які рабіў «усё агульным і нічога маім». Такім чынам, сялянства не было падрыхтавана да такой ступені абагульнення. Не выпадкова гэты перыяд называлі «мёртвым сезонам» у развіцці сельскай гаспадаркі.

Тым часам у вёсцы ўсё больш расло нездавальненне дзяржаўнай палітыкай («ваенны камунізм», харчразвёрстка і іншыя меры). Сяляне імкнуліся ліквідаваць органы непажаданай улады, «весці няспынную партызанскую вайну з бальшавікамі...»

Восенню 1922 г. у Чэрыкаўскім павеце становішча абвастрылася. Тут, паводле даных ДПУ, налічвалася да 150 эсэраў і меншавікоў, якія садзейнічалі ўзброеным выступленням. Дарэчы, 16 жніўня 1922 г. больш 300 чалавек паднялі паўстанне ў Маляціцкай воласці. Супраць іх выступіў атрад чырвонаармейцаў і чэкістаў у складзе 100 чалавек. Бой быў цяжкі, і колькасць атрада давялося павялічыць на 30 чалавек. Гэтага аказалася дастаткова.

Па ўспамінах П. Хадыкі (былы супрацоўнік органаў АДПУ — НКУС БССР), для затрымання банды на чале з Піліпам Котавым стварылі зводны атрад з войск АДПУ і міліцыі пад камандаваннем С. П. Партнова. Намеснікам яго прызначылі работніка міліцыі Сцяпана Гуміна.

Першая схватка адбылася на Мядведаўскіх хутарах. Завязаўся бой, у якім загінулі камандзір узвода Хранкоў і шаснаццаць байцоў. З другога боку загінулі 30 чалавек. Пазней Котаў даведаўся, што вайсковая часць, якая была расквартаравана ў Краснаполлі, часова адазвана ў Чэрыкаў. Выкарыстаўшы гэты момант, Котаў і яго людзі з'явіліся ў Краснаполлі, расстралялі старшыню валаснога выканкама Уладзіміра Калеснікава, акружылі памяшканне мясцовай міліцыі, дзе знаходзіліся начальнік міліцыі А. І. Савекін і дзяжурны І. Т. Карасёў. Міліцыянеры ўступілі ў бой і загінулі.

Зводны атрад Партнова дагнаў Котава каля вёскі Калодзецкая, акружылі яго ў раёне Касцюковічаў. Расстраляўшы ўсе патроны, Котаў выскачыў з хаты

Прэзідыум Чэрыкаўскага выканаўчага камітэта. 1922 г.

з сякерай у руках. Яны сышліся ў рукапашным баі са Сцяпанам Гуміным. Злаўчыўшыся, Гумін вырваў у яго з рук сякеру і нанёс смяртэльны ўдар.

У снежні 1917 г. у Чэрыкаўскі павет Магілёўскай губерні уваходзіла 16 валасцей. З 2 лютага 1919 г. павет у складзе РСФСР, з 26 красавіка 1919 г.— Гомельскай губерні. У 1923 г. воласці былі ўзбуйнены, іх стала восем: Брацькавіцкая, Краснапольская, Крычаўская, Маляціцкая, Наваельнінская, Прапойская, Самацеевіцкая, Чэрыкаўская. З сакавіка 1924 г. павет па межах адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення 1920 г. перададзены БССР. 2 чэрвеня 1924 г. павет аб'яднаны з Клімавіцкім і атрымаў назву Калінінскага з цэнтрам у м. Клімавічы. Аб'яднаны павет налічваў 1062 сельскіх населеных пунктаў і 10 населеных пунктаў гарадскога тыпу, 339 579 чалавек насельніцтва.

17 ліпеня 1924 г. другая сесія ЦВК БССР прыняла пастанову «Аб адміністрацыйна-гаспадарчым дзяленні БССР», згодна з якой быў утвораны Чэрыкаўскі раён у складзе Калінінскай акругі. 20 жніўня гэтага ж года раён быў падзелены на 15 сельсаветаў: Вепрынскі, Верамейскі (Верамееўскі), Глінскі, Горацкі (Горкаўскі), Язёрскі, Зябенскі, Камянкоўскі (Каменскі), Лабанаўскі, Мірагошчанскі (Мірагашчанскі), Рэчыцкі, Рынкоўскі, Ушакоўскі, Халмоўскі (Халмянскі), Чэрыкаўскі, Шароеўскі. 24 верасня 1926 г. Чэрыкаўскі сельсавет ліквідаваны ў сувязі з утварэннем Чэрыкаўскага гарсавета. З 9 чэрвеня 1927 г. да 26 ліпеня 1930 г. раён ўваходзіў у склад Магілёўскай акругі. 5 снежня 1931 г. Верамейскі (Верамееўскі) сельсавет быў перададзены Чавускаму раёну, але 20 студзеня 1932 г. вернуты ў склад Чэрыкаўскага раёна. З 20 лютага 1938 г. раён у складзе Магілёўскай вобласці.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 16 верасня 1959 г. і рашэннем Магілёўскага аблвыканкама ад 17 лістапада 1959 г. Чэры-

каўскі раён быў ліквідаваны, тэрыторыя яго была перададзена Крычаўскаму раёну. Улічваючы прапановы аб неабходнасці разузбуйнення раду раёнаў рэспублікі, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 30 ліпеня 1966 г. быў утвораны Чэрыкаўскі раён у межах 1959 г.

У 1924/25 гаспадарчым годзе на Беларусі ўпершыню быў уведзены раённы бюджэт. З'явілася магчымасць больш шырока весці гаспадарчае і культурнае будаўніцтва. Сельская гаспадарка таго часу ўяўляла наступную карціну. Агульная выкарыстоўваемая ў раёне плошча зямлі складала 105 111 дзес.* У асабістым карыстанні сялян знаходзілася 84 725 дзес. зямлі (7762 гаспадаркі), з якіх 8114 і 7127 дзес. былі заняты адпаведна сенажацямі і лясамі ды кустамі. Астатняя колькасць сялянскай зямлі (прыкладна 57 892 дзес.) лічылася ворнай. У валоданні калектыўных гаспадарак і арцелей, а іх у той час налічвалася 4, знаходзілася 337 дзес. зямлі. Усе землі, якія раней належалі ўладальнікам маёнткаў (19 826 дзес.) былі размеркаваны паміж сялянамі.

Назіраліся выпадкі арэнды зямлі. Зямлю здавалі ў асноўным перасяленцы і ўдовы. У якасці арандатараў выступалі сераднякі і заможныя сяляне. Сенажаці, як правіла, здаваліся ў арэнду на год, ворная зямля і лясныя вырубкі — на тры. Ворная зямля арандавалася найчасцей за грошы. З боку райвыканкама ажыццяўляўся кантроль за арэндными здзелкамі. Арэнда мела станоўчае значэнне для бяднейшых і аслабленых серадняцкіх гаспадарак, якія дзякуючы здачы зямлі атрымлівалі неабходныя сродкі для аднаўлення сваіх гаспадарак.

Ураджайнасць асноўных відаў культур у 1925 г. складала: жыта — 35 пудоў з дзес., аўса — 45, грэчкі — 40, бульбы — 600, пшаніцы — 45, ячменю — 45. У параўнанні з даваенным ураджай быў даволі малы. Галоўная прычына — нізкі ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама спустошанасць глебы.

У 1925 г. у раёне налічвалася 229 беззямельных гаспадарак, 374 двары мелі па $^1/_2$ дзес., 2272 — да 3 дзес., 2675 — да 6 дзес., 2200 — да 12 і больш дзес.

Развівалася і жывёлагадоўля. Усяго мелася 12 610 коней, 15 960 кароў, 22 387 свіней, 34 674 авечкі. Але разам з тым 8,5 і 5,5 % гаспадарак раёна не мелі адпаведна коней і кароў, па карове і каню мелі адпаведна 47,8 і 61,7 % гаспадарак. А вось па тры і больш коней і кароў мелі таксама адпаведна 2,9 і 8,3 % двароў. У Чэрыкаве знаходзіўся адзіны на ўвесь раён ветэрынарны пункт з адным фельчарам.

Як сведчыць статыстыка, стан лугоў у раёне вельмі пагоршыўся ў гэтыя гады з-з таго, што водаадводныя каналы не ачышчаліся. Збор сена з дзесяціны заліўнога лугу складаў 135 пудоў, сухадольнага — 80. Усяго ў раёне мелася 750 дзес. забалочаных лугоў. Нагляд за імі вялі чатыры меліяратыўныя таварыствы, якія аб'ядноўвалі 224 члены.

Што датычыць садоў, то плошча іх была невялікая. Пладовых гадавальнікаў у раёне не было, але асобныя сяляне пачыналі ўжо іх закладваць. Кожная сялянская гаспадарка мела агарод, які задавальняў не толькі ўласныя патрэбы. На продаж селянін вёз у асноўным капусту і цыбулю.

У раёне налічвалася 179 пасек з 2678 сем'ямі пчол. Існавала пчалярскае таварыства, якое аб'ядноўвала 46 пасек. Працавалі два сельскагаспадарчыя крэдытна-кааператыўныя таварыствы і адно сельскагаспадар-

* Дзесяціна — мера зямельнай плошчы, роўная 1,09 га.

чае, якое налічвала 1603 пайшчыкі. Пры адным таварыстве дзейнічала цагельня, пры другім — пракатны пункт і збожжаачышчальная станцыя. Было ачышчана рознага насення 7438 пудоў. Больш за ўсё патрабаваліся крэдыты на развіццё жывёлагадоўлі, закупку машын і насення, будаўніцтва. Сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства крэдыт давала на шасцімесячны тэрмін.

Лясы ў раёне займалі 18 105 дзес. Асноўныя лясныя масівы знаходзіліся ў паўднёвай частцы раёна, паўночная частка была бязлеснай.

Ёсць звесткі адносна прамысловасці, якая была прадстаўлена 24 прадпрыемствамі: 1 вінаачышчальны склад, 1 вінакурны завод, 1 мукамольна-лесапільны завод, 2 паравыя млыны, 14 вадзяных млыноў, 3 смалакурні і 2 цагельныя заводы. На гэтых прадпрыемствах працавала 58 чал. На карысць мясцовага бюджэту арэнда млыноў давала 103 000 р.

Што ж вырабляла ў гэты час? Спірт, цэгла, мука, крупы, дзёгаць, смала, шкіпінар, дошкі. Спірт адпраўлялі ў Дзяржспірт, мука і іншыя вырабы заставаліся на месцах для задавальнення патрэб насельніцтва.

У раёне былі распаўсюджаны наступныя промыслы: кравецкія (78 прадпрыемстваў, 88 працуючых), шавецкія (33; 52), кавальскія (37; 52), аўчынныя (6; 7), скураныя (7; 9), сталярныя (12; 17), слясарныя (7; 7), смалакурныя (3; 7) цагельныя (2; 5), ваўначоскі (8; 9), вяровачныя (2; 4). Існавала сталярная арцель, шавецкая і працкалектыў швейнікаў, а таксама 6 спажывецкіх кааператываў з 8 крамамі, з якіх 2 знаходзіліся ў раённым цэнтры. Спажывецкая кааперацыя налічвала 1481 чал. У асноўным гэта былі сераднякі. Паявы капітал кааператываў складаў 7078 р. 99 к.

Адзіны рынак спажывецкага характару размяшчаўся ў раённым цэнтры. Сувязь з ім падтрымлівалася кааперацыяй праз Акрсаюз і Акрсельсаюз. Кірмашовыя дні ў раённым цэнтры былі два разы на тыдні. Гандлявалі сельгаспрадуктамі, драўляным і гліняным посудам. На год прыходзілася прыкладна сем вялікіх кірмашоў, з якіх тры праводзіліся на вёсцы.

Што датычыць камунальнай гаспадаркі, то па гарадскому добраўпарадкаванню ў 1925 г. амаль нічога не рабілася з-за адсутнасці сродкаў. Толькі часткова былі адбудаваны тратуары даўжынёй 300 пагонных метраў, пасаджаны дрэвы. На вёсцы добраўпарадкаваннем займаліся гаспадары дамоў.

Хутчэйшаму аднаўленню сельскай гаспадаркі спрыяла крэдытная сістэма. Побач з дзяржаўнай крэдытнай сістэмай існавала сетка кааператыўнага крэдыту. Сялянскія гаспадаркі атрымлівалі грашовыя крэдыты. Гэта давала магчымасць скараціць колькасць бясконных, бескароўных, безынвентарных сялянскіх гаспадарак, пашырыць пасевы бульбы і іншых культур. У сістэме размеркавання крэдытаў, аказання дапамогі беднаце значную ролю адыгралі камітэты сялянскай грамадскай узаемадапамогі, якіх налічвалася 15. Раённы камітэт аб'ядноўваў і накіроўваў іх дзейнасць. У аснову работы камітэта быў пакладзены прынцып дабрачыннасці. Матэрыяльны фонд раённага камітэта на 1 студзеня 1925 г. складаў 934 р., а сельскіх — 1272 р. За год было выдадзена дапамогі з фонду раённага камітэта 853 р. З фонду сельскіх камітэтаў малазабяспечаныя сем'і атрымалі грашыма 269 р. і 2220 пудоў хлеба. Акрамя гэтага, раённы камітэт унёс уклад і ў забеспячэнне дзейнасці культасветустаноў. Дастаткова сказаць, што на яго сродкі была адкрыта хата-чытальня, выдзяляліся грошы і на камплектаванне школ-сямігодак.

Першы «чырвоны абоз» Рынкоўскага і Глінскага сельсаветаў. 1929 г.

Каму ў першую чаргу дапамагалі камітэты? Галоўным чынам дзейнасць камітэтаў накіроўвалася на падтрымку сем'яў чырвонаармейцаў (у 1925 г. іх было зарэгістравана камітэтамі 98), інвалідаў (104), бясконных (138), пагарэльцаў (46), беднякоў (681). За 1924—1925 гг. дапамогу атрымалі: 87 сем'яў чырвонаармейцаў, 92 інваліды, 48 сем'яў інвалідаў, 74 пагарэльцы і 235 беднякоў, 115 бясконных гаспадарак.

XV з'езд ВКП(б) (1927) прыняў праграму калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Работа па стварэнню калгасаў і саўгасаў была разгорнута і на Чэрыкаўшчыне. Першай на шлях калектыўнай працы станавілася бедната. Таму спачатку калгасы аб'ядноўвалі пераважна бяднейшыя слаі вёскі і былі невялікімі гаспадаркамі. Так, у 1928 г. у Горкаўскім сельсавеце арганізавалі калгасы імя Крупскай і «Шлях сацыялізму», у Язёрскім — імя Леніна. Праз год у Горкаўскім сельсавеце — «Белвёска», імя Сталіна, «Янава», у Мірагашчанскім — «Светлы шлях», у Глінскім — «Чырвоная зорка».

Сяляне разлічвалі на лепшае жыццё пры калектыўным гаспадараванні. Прыязджалі ўпаўнаважаныя з Чэрыкава, угаворвалі ўступаць у калгасы, будучае малявалі чароўнымі фарбамі. Так, у 1929 г. у в. Лобча прыехаў упаўнаважаны, начальнік міліцыі Войтаў. Ён гаварыў аб тым, што за лепшую долю трэба змагацца разам. Беднякі, якія не мелі нават каня, падалі заявы ў калгас. Фядос Зайцаў, Раман Чумакоў, Іван Гатоўцаў, Цімох Клюйкоў, Сяргей Качаеў, Яўмен Елістратаў, Павел Прахарэнка, Канстанцін Аўчыннікаў, Пётр Качаеў у ліку першых сталі калгаснікамі калгаса «Чырвоны ўсход». У гэты час яшчэ скарыстоўвалі метады пераканання, агітацыі, уплыву станоўчага прыкладу. Вёску Глінь, напрыклад, акружалі 27 хутароў. У 1929 г. тут арганізаваўся калгас «Іскра». 90 сялянскіх сем'яў сталі яго членамі, з хутароў — не спяшаліся. Актыў беднаты праводзіў тлумачальную работу сярод заможных сялян.

Калгасы больш-менш забяспечваліся насеннем, угнаеннямі, сельскагаспадарчай тэхнікай, крэдытамі. У гэтым была іх перавага перад аднаасобнымі гаспадаркамі. Калгасы дзе-нідзе станавіліся прыкладам вядзення гаспадаркі, асабліва для беднаты. Узяць, напрыклад, калгас «Чырвоны Кастрычнік» Вепрынска-

га сельсавета. Неўраджайнай лічылася зямля гэтай гаспадаркі. Але калгаснікі пачалі ўносіць угнаенні, увялі севазварот, палепшылі апрацоўку глебы і дабіліся павелічэння ўраджайнасці палёў. За прададзены дзяржаве хлеб набывалі аўтамашыны, жняяркі, трактарныя малатарні, бульбакапалкі, конныя граблі і інш. Машыны, як вядома, аблягчалі цяжкую сялянскую працу. Людзі бачылі ў гэтымі перавагу калгаснага ладу.

У перабудове сельскай гаспадаркі прымаў удзел рабочы клас. У перыяд калектывізацыі было накіравана ў вёску 25 тыс. перадавых рабочых. Над Магілёўскай акругай шэфстваваў машынабудаўнічы завод «Чырвонае Сормава». Дванаццаць сармаўчан-дваццаціпяцітысячнікаў прыехалі ў Чэрыкаўскі раён, у іх ліку А. П. Еўдакімаў, П. В. Осіпаў, М. І. Юрлоў, А. П. Малафееў, І. В. Паўлаў, М. Ф. Бакулаў. Яны пасяліліся ў слабодцы Сталыпіна на ўскраіне Чэрыкава, якую пазней перайменавалі ў Сормава.

У канцы 1929 г. уся Магілёўская акруга і 15 раёнаў іншых акруг Беларусі былі аб'яўлены раёнамі суцэльнай калектывізацыі. Магілёўскі акруговы выканаўчы камітэт у лютым 1930 г. вырашыў закончыць калектывізацыю да веснавой сяўбы.

Найбольш актыўна сталі ствараць калгасы на Чэрыкаўшчыне ў 1930—1931 гг. Па ўліку на 5 чэрвеня 1931 г. у Чэрыкаўскім раёне было 87 калгасаў. З прыняццем курсу на суцэльную калектывізацыю фарсіраванне тэмпаў арганізацыі калгасаў станавілася больш сілавым. Ігнараваўся настрой сялян, іх нежаданне адмовіцца ад уласнай гаспадаркі. У пагоні за высокімі тэмпамі калектывізацыі ўжывалі метады прымусу ў адносінах да сялян. Магілёўскі акруговы камітэт партыі даў указанне аб 25-працэнтным зніжэнні нормаў землекарыстання для ўсіх сялян, што не ўступілі ў калгасы. Аднаасобнікам жылося цяжка. Яны не мелі магчымасці атрымліваць крэдыты, былі цяжкасці з набыццём насення, тэхнічнага інвентару. Іх гаспадаркі абкладваліся падаткам. Такім чынам, палітыка ў развіцці сельскай гаспадаркі вымушала селяніна ў пераважнай большасці рабіць выбар на карысць калгаса. Супраціўленне не мела сэнсу, бо ва ўмовах таталітарнай сістэмы, з яе развітой рэпрэсіўнай машынай, любое яўнае ці ўскоснае супраціўленне існуючаму ладу і генеральнай лініі партыі было асуджана на паражэнне.

Ц. І. Касценіч жыў на хутары Гатчына, працаваў на ўласнай гаспадарцы і не жадаў нічога іншага. І вось за гэта чалавек працы быў высланы ў Паўночны край. Толькі ў 1989 г. з яго было знята кляймо «ворага народа». Такі ж лёс напаткаў В. Д. Клюйкова, А. С. Крычко і многіх іншых людзей Чэрыкаўшчыны. Вядома, у ходзе калектывізацыі паўсюдна назіраліся перагібы адносна серадняцкіх і нават бядняцкіх гаспадарак. «Камбеды» з наганамі раскулачвалі тых, хто карміў сябе і мог пракарміць іншых. Пры гэтым патрашылі куфары, склепы, здымалі абутак і адзежу, гналі з двара каня, кароў, авечак, гусей.

Вось як раскулачвалі Хведара Мацвеевіча Асмалоўскага. «Як хацелі, так і вараціліся ў яго хаце, на падворку. Нячшасныя дзве каровы ды парка коней было ў Хведара, крыху хлеба ў гумне. Але, відаць, дужа даймалі 20 дзесяцін зямлі, кожны камяк якой расцерлі гаспадар з сям'ёй сваімі рукамі.

Старога Антона Асмалоўскага, як памятаю, з печы цягнулі, а ён усё выў і прасіў не чапаць. У пабеленых даматканых штанах, у світцы, лапцікі на нагах. І старую следам на вуліцу ў адной паддзёўцы выгналі. А ўсяе кулацкай гаспадаркі — трое коней, ды 25 дзесяцін зямлі, падзеленай на траіх хлопцаў з долей на трох дачок. Старых на голенькія сані пасадзілі, маленькі вузельчык з адзежай

Члены праўлення калгаса «Чырвоны Кастрычнік» і работнікі Вепрынскага сельсавета. 1933 г.

на калені кінулі і звезлі некуды. Ні слыху, ні дыху, хоць бы якія страшэнныя абдзіралы былі, а то ж мазалём усё нажывалі»,— успамінае Г. Касценіч.

Да кулакоў залічвалі сераднякоў і раскулачвалі іх, адлучалі ад зямлі людзей, якія хацелі і ўмелі працаваць. З. Д. Дуброўскі быў зняты з работы па сацыяльнаму становішчу. Ён добрасумленна працаваў інспектарам райфа ў Чэрыкаве. Але жыў заможна, і яго залічылі ў кулакі, таму і з работы знялі. Потым яго гаспадарку прызналі серадняцкай і спрабавалі аднавіць на рабоце. Менавіта ў тыя гады, калі народ пазбавілі ўласнасці і сродкаў да існавання, ён пачаў губляць цікавасць да працы. З цягам часу аказалася, што моцны гаспадар на вёсцы проста неабходны.

Архіўныя матэрыялы сведчаць аб тым, што пасяўныя і ўборачныя кампаніі ў некаторых калгасах праходзілі неарганізавана. Зацягваліся тэрміны ўборкі бульбы. Частка збожжа заставалася ў стагах, якія былі складзены абы-як, таму меліся страты. Неналежным быў і догляд абагуленай жывёлы, частымі былі яе захворванні і падзёж.

У другой палове кастрычніка 1930 г. у 16 калгасах раёна бульба была не ўбрана з 206 гектараў. Назіраліся нядбайныя адносіны калгаснікаў да агульнай справы і нават да дапамогі, якую аказваюць ім рабочыя брыгады і інш. («Чырвоны сормавец»). У некаторых калгасах гніло і псавалася збожжа, каноплі, пшаніца і інш. («Іскра» Глінскага сельсавета, «Чырвоны сормавец», «Белвёска» Халмянскага, «Шлях сацыялізму» Горкаўскага сельсавета і г. д.). Не ладзілася праца ў названых калгасах. Не было зацікаўленасці ў калгаснікаў, часта яны не выходзілі на работу. Зусім слаба скарыстоўвалі тэхніку. У калгасе «Белвёска», напрыклад. Не на належным ўзроўні ў калгасах было і будаўніцтва свінарнікаў і кароўнікаў.

У пачатку 30-х гадоў слабай заставалася матэрыяльна-тэхнічная

база сельскай гаспадаркі. На 1 студзеня 1933 г. у раёне налічвалася 98 калгасаў. Было калектывізавана 4660 гаспадарак, што складала 65,2 %. Дарэчы, усяго ў раёне было 7150 гаспадарак. А вось якая тэхніка была ў распараджэнні калгасаў: 25 сенакасілак, 53 конныя граблі, 85 жняярак-самаскідак, 2 снопавязалкі, 20 бульбакапалак, 57 радковых сеялак, 8 трактароў, 8 складаных малатарняў. Нават з арганізацыяй МТС асноўным транспартным сродкам заставаліся калёсы, а цяглавай сілай — коні. Чэрыкаўская МТС мела 20 трактароў, абслугоўвала ў 1935 г. 26 калгасаў, у 1936 г.— 52. У 1936 г. Чэрыкаўскім райвыканкамам была прынята пастанова аб арганізацыі новай МТС у раёне. «Лічыць неабходным арганізаваць новую МТС з цэнтрам на ст. Верамейкі..., у новай МТС будзе налічвацца ворыўнай плошчы 19 727 га, а ў Чэрыкаўскай МТС 22 896 га». У 1939 г. у двух МТС налічвалася 84 трактары. У гэты час у 94 калгасы было аб'яднана 6946 сялянскіх гаспадарак (96,3 %). Паводле тытульнага спіса 1931 г., у раёне налічвалася 21 прадпрыемства з колькасцю працуючых 200 чал. Асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі былі: у Чэрыкаве арцель «Экспарт», рабочых у сярэднім за паўгоддзе 1932 г. налічвалася 32 чал., арцель «Цагельбуд», рабочых — 36, вінзавод у в. Вусце, рабочых — 33. Сельская гаспадарка спецыялізавалася ў жывёлагадоўча-бульбяным напрамку. Пасяўная плошча раёна ў 1932 г. складала 43 774 га, у тым ліку збожжавых культур 70,3 %, пад бульбай 16,0, пад тэхнічнымі культурамі 5,6, пад травамі 5,1 і пад іншымі культурамі 3 %. Тэрыторыя раёна складала 107 766 га, насельніцтва 44 943 чал.

Гісторыя сведчыць аб тым, што быў адток калгаснікаў з калгасаў. Гэта стала магчымым тады, калі былі крыху адпушчаны адміністрацыйныя ціскі (артыкул «Галавакружэнне ад поспехаў» і інш.). Паспешліва створаныя калгасы хутка распадаліся.

Так, у Нарках упершыню стварыўся калгас у 1929 г. Ён меў назву «Чырвоны сормавец». Апрача вяскоўцаў, у яго ўвайшлі асобныя бядняцкія сем'і з пасёлкаў Карма, Чырвоны і інш. Гаспадарка была малалікая па колькасці людзей і бедная па матэрыяльна-тэхнічных сродках. Большасць сем'яў се-



Першы вучэбны трактар у трактарнай школе. 1934 г.

раднякоў насцярожана аднеслася да новай формы гаспадарання. Старшынёй калгаса быў Ціхан Авяр'янавіч Дудараў, членам праўлення — Дзямід Апанасавіч Вапручкоў — тутэйшыя сяляне. Аднак калгас хутка распаўся. Потым ён зноў быў арганізаваны пад назвай «Чырвоны сцяг». Яго ўзначаліў Васіль Іванавіч Шчаўлікаў. Дарэчы, у 1933 г. старыя і малыя выйшлі за ваколіцу сяла, каб убачыць першы трактар. Гэта быў старэнькі «фардзон». Праз год паступіла ў Наркі аўтамашына-палутарка. Першым шафёрам быў Яўмен Белахонаў, першым трактарыстам — Пётр Кандратаў, першая жанчына-трактарыстка Марыя Белахонава.



Я. Б. Белахонаў.



М. П. Белахонава.

Стаханаўцы. У 30-я гады так называлі перадавікоў вытворчасці, якія ў некалькі разоў перавыконвалі зменныя заданні, з'яўляліся ініцыятарамі сацыялістычнага спаборніцтва за датэрміновае выкананне абавязацельстваў. Працоўны шлях народа быў сапраўды гераічным. Была вера ў правільнасці жыццёвага ўкладу, хоць і даводзілася працаваць у даволі цяжкіх і складаных эканамічных і сацыяльных умовах.

Восенню 1935 г. стаханаўскія метады працы ўпершыню былі выкарыстаны калгаснікамі-льнаводамі. У кастрычніку 1935 г. адбыўся Усебеларускі злёт ударніц-ільнотрапальшчыц. Праходзіў ён у Мінску. З усёй рэспублікі з'ехаліся сюды калгасніцы-ўдарніцы, ільнотрапальшчыцы, адказныя за лён. Яны расказалі аб метадах сваёй работы, аб тым, як трэба апрацоўваць лён, каб дабіцца найлепшай якасці льновалакна. Удзел у рабоце гэтага злёту прымала Анюта Казначэева — адказная за лён ў 4-й брыгадзе калгаса імя Калініна Глінскага сельсавета.

Пазней яна ўспамінала: «Пасля таго, як я пабывала на злёце, работа ў нас пайшла куды лепш. Азнаямленне з правільнымі метадамі апрацоўкі лёну дало значны штуршок уперад. Павысілася сама выпрацоўка. Вось Наста Секушэнка. Яна апрацавала адна больш 5 пудоў лёну, і калі раней лён здавалі 8—10 нумароў, дык зараз здаём 10—12».

У снежні 1935 г. сабраліся на першы злёт стаханаўцы Чэрыкаўскага раёна. У адозве злёту гаварылася аб неабходнасці разгарнуць стаханаўскі рух у раёне. Рады стаханаўцаў множыліся.

На лесанарыхтоўках першымі ініцыятарамі новых метадаў работы сталі калгаснікі калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Вепрынскага сельсавета Сямён Марчанка і Дзяніс Шаўцоў. 20 снежня 1935 г. яны далі 56,18 кубаметраў запалкавай асновы. Прыклад з іх узялі іншыя калгаснікі гэтага калгаса і калгаса «Экспарт». 23 снежня перамаглі ў спаборніцтве Я. Барсукоў і П. Мазікаў. Яны нарыхтавалі за дзень 57,5 кубаметраў сасны. Асаблівым днём стаў дзень 26 снежня для Васіля Міхава і Сямёна Марчанкі. Яны ўстанавілі ўсебеларускі рэкорд, нарыхтавалі 94,71 кубаметраў сасны. У калгасе «3-ці рашаючы» Вепрынскага сельсавета брыгадзір Цацоха вывозіў за дзень па 5 кубаметраў пры норме 1 кубаметр на конедзень.

2-гі Усесаюзны з'езд калгаснікаўударнікаў (люты 1935) прыняў прыкладны Статут сельскагаспадарчай арцелі, які абагульніў вопыт вядзення калектыўнай гаспадаркі. Калгасы пачалі атрымліваць зямлю на вечнае карыстанне.

У кастрычніку 1935 г. калгас «Бальшавік» адным з першых атрымаў акт № 032976 на вечнае карыстанне зямлёй

у колькасці 898,18 га. Гэты калгас быў арганізаваны ў 1931 г. у в. Бакунавічы з васьмі бядняцкіх двароў. Сход, на якім абмяркоўвалася пытанне аб арганізацыі калгаса, праходзіў бурна. Выступленне актывіста Кузьмы Сіўцова неаднаразова перарывалася выкрыкамі з залы тых, хто быў супраць калгаса. Піліп Гуркоў, Савелій Фралоў, Марк Фралоў і іншыя сталі першымі калгаснікамі. Старшынёй калгаса выбралі Кузьму Сіўцова. Цяжкімі былі першыя крокі сельгасарцелі. Але ў 1935 г. калгас датэрмінова выканаў хлебапастаўкі, прадаў дзяржаве 10 т хлебных лішкаў. Меў поўнасцю ўкамплектаваныя малочнатаварную і свінатаварную фермы, тут гадавалася таксама 40 цялят. Брыгадзіры і радавыя калгаснікі, конюхі і даглядчыкі — усе добрасумленна працавалі на калгаснай вытворчасці. Вось прозвішчы некаторых: К. Фралова, М. Кандрусёва, В. Базылёў, А. Радзькоў, Л. Разумкоў.

Для развіцця спаборніцтва, ударніцтва арганізоўваліся сельскагаспадарчыя выстаўкі. У лістападзе 1935 г. у Чэрыкаве адбылася раённая сельскагаспадарчая выстаўка. Тут былі прадстаўлены аддзелы жывёлагадоўлі, паляводства, ільнаводства, садоўніцтва, механізацыі сельскай гаспадаркі і аддзел кустарных вырабаў.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка ў Маскве ў 1939 г. падвяла вынікі сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы. Чэрыкаўскі раён быў прадстаўлены пяццю калгасамі: імя Варашылава, «Сцяг працы», «Ленінскі шлях», «Чырвоная зорка», «VI з'езд Саветаў». Рашэннем выставачнага камітэта гэтыя гаспадаркі былі занесены на дошку гонару выстаўкі.

У наступным годзе ў выстаўцы ўдзельнічала 19 гаспадарак раёна: «Бальшавік», імя Будзённага Мірагашчанскага сельсавета, імя Будзённага Рэчыцкага сельсавета, імя Калініна Глінскага сельсавета, «Камінтэрн», імя Калініна Горкаўскага сельсавета, «Чырвоны Кастрычнік», «Чырвоны сормавец», «Ленінскі шлях», «Краіна Саветаў», «Чырвоная зорка», «Чырвоны будаўнік», «Чырвоны ўсход», «VI з'езд Саветаў», «Шлях сацыялізму», «Чырвоны араты», імя Варашылава, «Чырвоны пераможнік». Дарэчы, Магілёўскую вобласць прадстаўлялі 449 гаспадарак.

На Чэрыкаўшчыне былі майстры высокіх надояў і прываг жывёлы. У калгасе «Чырвоны сормавец» у сярэднім за 1937—1939 гг. вырошчвалі 34 цяляці. Прычым сяредненесутачная прывага да шасцімесячнага ўзросту складала 650 г на галаву. У той жа час у гаспадарцы на адну свінаматку атрымлівалі 15,2 парасяці. Звяно калгаса «Чырвоны сормавец», якое ўзначальваў О. Е. Сіманаў, у 1938—1939 гг. здымала па два ўраджаі льновалакна з адной плошчы. Дасягненне кіраўніка звяна было адзначана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Звяно А. А. Цацохі з гэтага ж калгаса атрымлівала па 18,4 ц ільновалакна з гектара.

На Усебеларускай нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі (студзень 1940) О. Е. Сіманаў гаварыў: «У нашым Чэрыкаўскім раёне 94 калгасы. Раней з гэтай колькасці 30 калгасаў зусім не сеялі тэхнічных культур. Чаму? У гэтых калгасах гаварылі, што добры лён на нашых землях не расце, і таму тэхнічныя культуры тут былі не ў пачоце. Там жа, дзе сеялі лён, ураджай яго не перавышаў 1,5 цэнтнера з гектара. Пры гэтым валакно было як пакля — 3-га і 4-га нумароў.

У 1936 г., азнаёміўшыся з дасягненнямі перадавікоў-ільнаводаў, параіўшыся з аграномамі, я рашыў вырасціць добры лён у сваім калгасе. Першы мой вопыт увянчаўся поспехам, і ўжо ў 1938 г. я паставіў перад сабой задачу атрымаць не толькі адзін добры ўраджай ільну, але зняць два ўраджаі з адной плошчы. Некаторыя гаварылі, што гэтага не можа быць, што Сіманаў хоча на вярбе грушы вырасціць. Але я смела пайшоў да мэты і дабіўся свайго.

Калгаснікі в. Чудзяны атрымліваюць акт на вечнае карыстанне зямлёй. 1935 г.

У 1939 г. у калгасе было арганізавана 4 ільнаводчых звяны. Засеялі льну 25 гектараў. Выдзелілі рэкордны ўчастак у 2 гектары і атрымалі з яго ў адзін год першы ўраджай ільновалакна па 15,8 цэнтнера з гектара, другі — па 4,9 цэнтнера. Чатыры калгасы нашага раёна паследвалі майму прыкладу і таксама знялі ў адзін год з адной і той жа плошчы па два ўраджаі льну».

У в. Горкі ў 1936 г. ад адной каровы атрымлівалі па 3038 кг малака. Загадчыца фермы Соф'я Дзямідава была дэлегатам нарады калгаснікаўударнікаў у Маскве. Адной з першых трактарыстак у Чэрыкаўскай МТС была Аляксандра Фёдараўна Дзмітрыева. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за ўзорнае выкананне ўрадавага задання па ўвядзенню правільных севазваротаў у калгасах БССР у 1939 г. былі ўзнагароджаны лепшыя аграномы. Сярод узнагароджаных Граматай Вярхоўнага Савета БССР быў старшы аграном Чэрыкаўскага райземаддзела Іосіф Саламонавіч Аўрусін. Ён асабіста распрацаваў і забяспечыў увядзенне севазваротаў у 20 калгасах.

У даволі цяжкім стане знаходзілася народная адукацыя. За гады імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў многія школы былі разбураны, абсталяванне зрабілася непрыгодным. Падручнікаў амаль не было. Востры недахоп адчуваўся ў сшытках і пісьмовых прыладах. Школы дрэнна забяспечваліся палівам.

Перш за ўсё неабходна было здзейсніць усеагульную адукацыю для дзяцей, а таксама паскорыць ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. Аднак мала было настаўнікаў наогул, з вышэйшай адукацыяй асабліва. Даводзілася выкладаць па некалькі прадметаў.

У 1920 г. пачала працаваць Леменская вопытна-паказальная школа-камуна (гл. артыкул «Школа-камуна»).

Па ўспамінах А. В. Бруевіча, заработная плата настаўнікаў выплачвалася натурай: 5—6 кілаграмаў мукі, некалькі пачак запалак, 300—400 грамаў солі, 200—300 грамаў цукру, паўлітра альбо літр газы — вось амаль і ўсё.



О. Е. Сіманаў.



С. Дзямідава.

Настаўнікі мэтанакіравана працавалі над перабудовай школы, актыўна ўдзельнічалі ў культурным жыцці горада. Так, святочнае афармленне горада цалкам ускладвалася на таленавітага мастака Леменскай школы-камуны І. В. Грушэўскага. Настаўнік музыкі і спеваў К. В. Гатальскі арганізаваў хор і прыцягваў да спеваў дарослых, стварыў струнны квартэт, у склад якога ўваходзілі А. А. Дашэўскі, Л. І. Валюжэніч, К. В. Гатальскі, А. Н. Руткоўская. Ніводнае гарадское свята не абыходзілася без выступлення квартэта.

У 1924/25 навучальным годзе пачала працаваць 2-я сямігадовая школа. У сувязі з адкрыццём новых школ у вёсках і ад'ездам настаўнікаў, якія не жадалі вывучаць беларускую мову, патрабаваліся новыя кадры. На базе 2-й сямігадовай школы былі створаны курсы па перападрыхтоўцы настаўнікаў гарадскіх школ. У летні перыяд арганізоўвалася перападрыхтоўка настаўнікаў сельскіх школ. Пры гэтай жа школе было вырашана адкрыць педагагічныя курсы з адным годам навучання. Выпускам гэтых курсаў (20 чалавек) папоўніўся выкладчыцкі састаў.

У 1924/25 навучальным годзе працавала 45 школ. У наступным годзе вучні селі за парты ў 51 школе. Дзейнічала дзве сямігодкі, з 8126 дзяцей школьнага ўзросту вучылася 3813 чалавек, або 46,9 %. Нагадаем, што ў папярэднім навучальным годзе школай было ахоплена 40,6 % дзяцей. Асабліва мала вучылася дзяўчат. Выкладанне ўсіх дысцыплін у школах было на беларускай мове. У гэты час вялася мэтанакіраваная работа па адраджэнню мовы, нацыянальнай культуры, дзяржаўнасці.

Але пазней пачаліся адваротныя працэсы, у выніку чаго адбылося вынішчэнне духоўнасці, мовы і культуры беларускага народа. На Беларусі ў гарадах не стала беларускамоўных школ, а ў хуткім часе і ў вёсках.

Значная частка школ размяшчалася ў наёмных памяшканнях, многія з іх не адпавядалі ўмовам творчай працы. У 1925/26 навучальным годзе на рамонт і абсталяванне школ з раённага бюджэту было выдзелена 4,9 тыс. рублёў.

Каб далучыць працоўных да актыўнага ўдзелу ў жыцці, неабходна было не толькі навучыць іх грамаце, але і правесці работу па іх палітычнай асвеце. Цэнтрамі культурна-асветнай работы павінны былі стаць хаты-чытальні, клубы. У раёне дзейнічала 3 дзяржаўныя і 22 грамадскія хаты-чытальні, 4 дзяржаўныя і 32 грамадскія пункты па ліквідацыі непісьменнасці, бібліятэка, прафсаюзны клуб, палітшкола. Пры хатах-чытальнях працавалі сельскагаспадарчыя, палітычныя, драматычныя, харавыя і іншыя гурткі. Жыхары раёна выпісвалі 1137 экземпляраў газет і 94 часопісы.

У 1939 г. у раёне налічвалася 46 пачатковых школ (110 настаўнікаў, 3,5 тыс. вучняў), 13 няпоўных сярэдніх школ (118 настаўнікаў, 3,7 тыс. вучняў), 4 сярэднія (68 настаўнікаў, 1,9 тыс. вучняў), 1 ветэрынарны тэхнікум (14 выкладчыкаў, 459 навучэнцаў). Дарэчы, першы выпуск у Чэрыкаўскім ветэрынарным тэўнікуме адбыўся 27 студзе-

ня 1935 г. 39 выпускнікоў (у пераважнай большасці калгаснікі) сталі працаваць у жывёлагадоўлі.

Сетка культурных устаноў у гэты час была прадстаўлена клубамі і дамамі культуры (6), хатамі-чытальнямі (14), бібліятэкамі (20) з кніжным фондам 20,6 тыс. кніг. На 1 студзеня 1940 г. колькасць распаўсюджаных газет па раёну дасягнула 7000 экземпляраў. Было выпісана таксама 600 экземпляраў часопісаў.

Паводле архіўных даных, работу культасветных устаноў нельга назваць добрай. Існавалі хаты-чытальні, пры іх бібліятэкі. Але недастаткова праводзілася культурна-асветнай работы сярод працоўных, асабліва ў Лабанаўскай, Зябенскай, Шароеўскай хатах-чытальнях. У тых складаных умовах эканамічнага і палітычнага жыцця работнікі культасветустаноў аказаліся заложнікамі існуючага ладу. Яны праводзілі ў жыццё палітыку гэтага ладу, абумоўленую сталінскім рэжымам.

«Моднай» была ў той час атэістычная прапаганда. У газеце «Сацыялістычная перамога» рэгулярна друкаваліся артыкулы, у якіх высмейваліся рэлігійныя забабоны. З цягам часу антырэлігійная прапаганда набыла сапраўды «ваяўнічыя» формы. І ў рэшце рэшт гэта вылілася ў закрыццё, разбурэнне храмаў, рэпрэсіі супраць святароў. У лепшым выпадку ў царкве размяшчалася школа, як, напрыклад, у Язёрах. У асноўным жа храмы пуставалі ці служылі складамі для зерня. Быў зняты з пасады загадчык радыёвузла г. Чэрыкава за трансляцыю радыёперадач рэлігійнага вучэння польскага касцёла.

Безумоўна, прыходы ў цэрквах скарачаліся. У Верамейках, напрыклад, святар Выбарны адмовіўся служыць у царкве і здаў ключы ў сельсавет. Пазней здарылася і больш трагічнае. Сёння мы ведаем імёны святароў, якія былі пазбаўлены волі і нават жыцця толькі за прыналежнасць да рэлігійнага культу. П. І. Вульковіч, Ф. А. Галубенка, Я. А. Кастрыцкі, П. Ц. Чэрныш, М. М. Старадомскі пазналі пакуты канцлагераў. З нямым пытаннем «Завошта?» адбывалі яны пакаранне.

Афіша аб прадстаўленні спектакля ў Нардоме.

Асаблівы інтарэс да гэтых трагічных старонак гісторыі тлумачыцца перш за ўсё імкненнем выкрыць сталінізм у мінулым і не дапусціць яго паўтарэння. Не дапусціць тых часоў, калі даваліся распараджэнні наконт тэрмінаў зняцця царкоўных званоў, каб райзагі выканалі план па збору бронзы. У 1936 г. Чэрыкаўскі райвыканкам даручыў старшыні

райзага Варончанку і старшыні Зябенскага сельсавета Гатоўцаву зняць званы з Галаўчанскай царквы на працягу трох дзён.

Сёння цяжка «вярнуцца» на шмат гадоў назад і яшчэ цяжэй усвядоміць і зразумець тое, што адбывалася. Гартаючы старонкі газет 1937 г., можна прачытаць, што год пачаўся ў дзелавым, спакойным рытме. Газеты заклікаюць змагацца «за стаханаўскую сустрэчу веснавой сяўбы». Але паступова пачынаюць з'яўляцца паведамленні аб «наймітах фашыстаў, тэрарыстах і шкоднікаў з троцкісцка-зіноўеўскай шайкі, якія разам з кулакамі шкодзяць нашай Савецкай краіне». І мы маем магчымасць гаварыць аб вельмі горкай старонцы нашага жыцця. Называюць розныя лічбы рэпрэсіраваных у Беларусі. Гэтыя лічбы ўдакладняюцца. Зразумела адно: знішчэнне людзей было масавым. За памылку на рабоце, па ананімнаму даносу і пад такім мудрагелістым ярлыком, як «заклятыя ворагі народа — япона-германа-польскія, троцкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія шпіёны і бандыты».

Адным з такіх «шпіёнаў» быў ураджэнец Чэрыкаўскага павета Канстанцін Іванавіч Кернажыцкі (1902), гісторык, кандыдат гістарычных навук, даследчык гісторыі распаду феадалізму і фарміравання капіталізму на Беларусі. Адзін са складальнікаў зборніка дакументаў «Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах» (т. 1, 1936). У 1926 г. ён скончыў БДУ, працаваў у Інстытуце гісторыі АН БССР і БДУ дацэнтам да 1937 г. Чаму толькі да 1937 г.? А таму, што 11 снежня 1937 г. яго арыштавалі. У выніку фізічнага ўздзеяння ён паказаў, што з 1921 г. быццам бы з'яўляўся ўдзельнікам нацыянальна-фашысцкай нацдэмаўскай арганізацыі, быў вымушаны прызнаць сваё дачыненне да шпіёнскай дзейнасці на карысць спецслужбаў Польшчы.

Чалавека прымусілі нагаварыць на самога сябе. К. І. Кернажыцкі заяўляў следчаму, што, дзейнічаючы ва ўрон інтарэсам СССР, ён як агент польскай разведкі з 1934 г. збіраў звесткі аб размяшчэнні фабрык, заводаў, выпускаемай імі прадукцыі, месцазнаходжанні калгасаў, саўгасаў, пагалоўі жывёлы, настроі сялянства, даваў інфармацыю аб рэльефе мясцовасці, аэрадромах, дарогах, мастах.

Але, нягледзячы на націск, Канстанцін Іванавіч спрабаваў сказаць праўду. 21 лістапада 1938 г. у прысутнасці пракурора адмовіўся ад сваіх ранейшых паказанняў аб шпіёнскай дзейнасці і аб дачыненні да троцкізму. Заявіў пракурору, што даваў ілжывыя паказанні пад маральна-фізічным уздзеяннем. Заявіў, што абгавораны сведкамі. Напрыклад, абвінавачвалі Канстанціна Іванавіча ў тым, што ён адмаўляў магчымасць перарастання буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную, адмаўляў вучэнне Маркса і Леніна аб класавай барацьбе, «працягваў нацыянал-фашысцкую тэорыю аб бяскласавасці Беларусі» і быў звязаны з «ворагамі народа» і інш.

Пасля таго, як абвінавачванне К. І. Кернажыцкага ў асабліва небяспечных злачынствах супраць дзяржавы адпала, яго фактычна судзілі за змест навуковых прац. 30 студзеня 1939 г. следства па крымінальнай справе на К. І. Кернажыцкага № 31620 было завершана, а вынесеная па ёй пастанова накіравана на разгляд у пазасудовым парадку на Асобую нараду НКУС СССР. Пратакол пастановы Асобай нарады ад 14 мая 1939 г. сведчыць, што арыштаваны быў асуджаны да папраўча-працоўных работ у лагерах на восем гадоў. Канчатковы тэрмін пакарання таксама быў вызначаны —11 снежня 1945 г., якога абвінавачваемы не дачакаўся. 28 лютага 1942 г. ён памёр у лагернай бальніцы.

Пастановай Ваеннага трыбунала Беларускай ваеннай акругі № 899 ад 5 чэрвеня 1958 г. пастанова Асобай нарады НКУС СССР ад 14 мая 1939 г. у адносінах да К. І. Кернажыцкага была адменена, а справа спынена з-за адсутнасці ў дзеяннях абвінавачваемага саставу злачынства. Рэабілітаваны Канстанцін Іванавіч быў і як вучоны.

Са ста аднаго першага сакратара райкамаў і акружкамаў партыі, якія ўдзельнічалі ў рабоце III пленума ЦК КП(б)Б (ліпень 1937), толькі 8 чалавек пазбеглі рэпрэсій. У тым ліку і сакратар Чэрыкаўскага райкама партыі І. Д. Вятроў. А вось старшыня райвыканкама В. Д. Кучаравы быў «выкрыты» і арыштаваны за «развал савецкай работы». Праўда, у хуткім часе ўсе «абвінавачванні» супраць яго былі адхілены. (Гл. артыкул «Старшыня райвыканкама». Дарэчы, на пленуме падводзіліся вынікі «работы» Малянкова і Якаўлева (Эпштэйна) па «выкрыццю» ў Беларусі партыйных і савецкіх работнікаў, завербаваных замежнай разведкай.

Хваля тэрору захапіла простых людзей. Адных расстралялі адразу без суда і следства. Другія трапілі ў лагеры і памерлі там ад голаду, холаду, хвароб. Трэцім пашчасціла вярнуцца дадому і праз усё жыццё пранесці вялікі боль за несправядлівасць. У чым віна калгасніка з в. Наркі Д. Б. Белахонава ці калгасніка з в. Кліны В. С. Іванова, старшыні калгаса з той жа вёскі Ф. К. Іванова, цесляра з в. Мірагошч А. Т. Слабодцава і многіх іншых простых людзей? Гэтыя людзі не «ворагі народа», не «агенты замежнай разведкі», а бязвінныя ахвяры.

29 кастрычніка 1989 г. у Магілёве ўстаноўлены памятны знак ахвярам сталінскіх рэпрэсій — шасцімятровы крыж. Цяжка не згадзіцца з Т. Раманьковай, старшынёй Магілёўскага абласнога таварыства ахвяр сталінізму «Мартыралог Беларусі»: «Дзень 29 кастрычніка стаў днём вяртання і аднаўлення памяці, аднаўлення справядлівасці, гонару і годнасці тых людзей, якіх зганьбілі і пазбавілі жыцця сталінскія каты на Магілёўшчыне. Гэта першае месца ў нашай вобласці, дзе на месцы масавых расстрэлаў устаноўлены памятны знак ахвярам сталінскага тэрору. Людзі цяпер будуць ведаць, што гэта за месца, будуць прыходзіць сюды, каб ушанаваць памяць ахвяр рэпрэсій. І калі-небудзь на гэтым месцы будзе пабудаваны мемарыяльны комплекс ахвярам рэпрэсій».

Нягледзячы на цяжкасці і нават драматычныя падзеі, у людзей не згасала надзея на тое, што ўпартая праца прывядзе іх да лепшай будучыні. Але ў многія сем'і жыхароў Чэрыкаўшчыны прыйшлі пахавальныя лісты з савецка-фінляндскай вайны. І надыходзіў час яшчэ больш жорсткіх і цяжкіх выпрабаванняў.

Падрыхтавала Г. Берліна.

Дакументы сведчаць

20—30-я гады. Нялёгкі і супярэчлівы час. Побач ужываліся працоўны ўздым, энтузіязм людзей, іх ударная праца і жорсткая сістэма кіравання, нагнятання атмасферы падазронасці, пошукаў «ворагаў народа». Новыя даследаванні і публікацыі, дакументы і ўспаміны даюць магчымасць сучаснікам асэнсаваць праўду гісторыі, разабрацца ў складанасці тагачаснага жыцця. Матэрыялы Беларускага дзяржаўнага архіва прадстаўлены Г. Берлінай.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ЧЭРЫКАЎСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ САВЕЦКАЙ ГАСПАДАРКАЙ 1921 г.

Несмотря на неблагоприятные условия: отсутствие денежных знаков в период спешных полевых работ, отсутствие натурплаты, острого недостатка в тяговой силе и рабочих рук, отсутствие продовольственного пайка в течение 6-ти месяцев за отчетный период Усовхозом были произведены следующие работы по периодам.

Зимний период (январь — март)

На 1-е января 1921 г. во всех совхозах уезда фуража состояло (в пудах):

		получено от Продорганов
сена	5968	2722
соломы	1028	5276
овса	96	
субори	187	417
мякины	450	—
древесного сена	—	2278
шароек	—	21
брюквы	207	—
бураков	228	—

Наличие живого инвентаря и его движения по 1-е июня видно из нижеприведенной таблицы.

Виды животных	Состояние на 1-е января	Прибыло	Убыло	Примечание
Лошадей	52	—	17	Убыль лошадей произошла от падежа от разных заболеваний, рогатого скота и свиней часть от убоя как бракованных и часть от падежа
Коров	65	—	12	
Нетелей	72	—	4	
Телят до 1 г.	24	23	11	
Волов	29	—	10	
Быков	14	2	2	
Овец	—	13	1	
Свиней	—	3	—	
Гусей	2	14	—	
Уток	1	9	—	

В течение зимнего периода производился ремонт сельхозинвентаря, построек, работы по подготовке семенного материала и некоторые работы в садах.

Весенний период (апрель — июнь)

К началу весеннего периода имелось в совхозах посевного материала (в пудах): картофеля 2625, гречихи 169, пшеницы 7, ячменя 7. Получено семенного материала от Продорганов (в пудах): овса 1475, ячменя 220, гречихи 300, вики 320, клевера 62 (из райотделения), льна 90, кормовой свеклы 24.

Состояние живого инвентаря к началу весенних полевых работ во всех совхозах нужно признать почти удовлетворительным. Что же касается условий подготовки почвы, то таковые нужно признать неблагоприятными ввиду спешности работ и острого недостатка в тяговой силе, с посевом тоже приходилось запаздывать, несмотря на все это в текущем году было засеяно (в десятинах): овса 77, ячменя 23,5, гречихи 41,5, картофеля 24, корнеплодов 3,5, яровой пшеницы 1, вики 33,5, клевера 48.

Посев был исключительно машинный разбросной. Вызвано это недостатком тяговой силы. Как видно из вышеприведенных данных, почти весь посевной материал был получен от Продорганов и нужно отметить, что этот материал не отличался доброкачественностью, был очень засорен и с малой всхожестью, а поэтому всходы были не очень дружны, а поля впоследствии засорены, что, конечно, и отразилось на урожае. Из вышеуказанных обстоятельств видно, что об опытно-показательной работе нельзя было и думать и лишь в двух совхозах были заложены опыты с различными видами пара, согласно разработанной и одобренной агрономическим совещанием программы. О результатах этих опытов можно будет судить лишь в 1922 году. Что касается сортового посевного материала яровых хлебов, то таковым совхозы в текущем году не располагали. Огородами в 1921 г. была занята площадь в 14 десятин.

Ввиду плохой всхожести семян (семена капусты и моркови оказались вовсе не всхожими) урожай получился сравнительно слабый.

Для будущего года заготовлено огородных семян в совхозах своими силами: брюквы 5,5 ф.*, свеклы столовой 1 п.*, свеклы кормовой 13 ф., огурцов 10 ф., фасоли 2 п., салаты 1 ф., морковь 5,5 ф.

* 1 фунт — каля 0,41 кг, 1 пуд — 16,38 кг.

В этот же период производилась подготовка парового поля, причем таковая была различна в зависимости от вида пара, так как под пар занятой вспашка в некоторых совхозах была произведена с осени, в других раннею весной с вывозкой навоза, запашкой его и посевом вики. Пара раннего зеленого первая вспашка была произведена в начале мая и закончена в начале июня ввиду недостатка тяговой силы.

Уборный период (июль — сентябрь)

В текущем году было отведено и убрано луга 318,5 дес. За отсутствием денежных средств и натурплаты уборка луга производилась в большинстве случаев сдачей с части ($^1/_2$ — $^1/_3$), своими силами убрано 96 дес. Виковой смеси убрано 27 дес. Укоса клевера не было, потому что клевер, посеянный в прошлом году, ввиду плохой всхожести семян пропал.

Всего собрано сена 15 918 п. По совхозам это количество таково: Елизаветино — 4618 п. Грибы — 1800, Горы — 2800, Холоблин — 700, Болин — 3500, урочище Лемень — 2500 п.

Уборка ржи происходила при крайне неблагоприятных условиях ввиду недостатка тяговой силы, а также рабочих рук. Уборка ржи, несмотря на работу жнеек, производилась исключительно за натурплату зерном. За уборку во всех совхозах нужно было отдать 468 п. ржи, но ввиду последовавшего запрещения платы зерном таковая до сих пор еще не отдана. Соль же, отпущенная Губсовхозом в количестве 115 п., для реализации урожая почти вся ушла на свозку (за отсутствием тяговой силы) и срочный обмолот ржи для сдачи 2600 п. Упродкому и на оплату поденных рабочих. Всего убрано ржи 136,5 дес., средний урожай с десятины 40 п., собрано ржи 5570 п. зерна и 9398 п. соломы, сдано Упродкому 2600 п., осталось на посев и продовольствие 2970 п.

Под второй укос было оставлено лишь 12 дес. заливного луга в совхозе Грибы и собрано около 350 п. сена. Заготовка древесного сена по вышеуказанным причинам не производилась.

Из собранного урожая на посевной материал можно рассчитывать лишь на овес и картофель. Что касается собранного фуража, то на имеющийся скот сена будет недостаточно, соломы и зерна не хватит. Хлебного пайка также не хватит. Озимой ржи на 1922 г. засеяно 142 дес. Посев производился исключительно машинный разбросной и лишь незначительная площадь (25 дес.) с опытно-показательной целью (рядовой посев). Объясняется это все теми же причинами, т. е. недостатком тяговой силы. Посев произведен отсортированным зерном.

Общий отчет

За время с 1 июня по 1 октября произошли следующие изменения в живом инвентаре: убыло лошадей 6, из них 2 возвращены Литбелу, 4 пали от сибирской язвы, коров 17, из них 15 возвращены Литбелу, 2 пали от сибирской язвы, быков 1, пал от болезни. Прибыло телят от отела 4, жеребят 1, поросят 5 шт. Получено из Горок 22 поросенка.

За отчетный период молока поступило 120 446 стаканов. Роздано рабочим и служащим (паек) 65 263 стакана, на корм скоту 26 674 стакана, масла получено 5,5 п., сдано Продорганам 2 п. 3 ф.

Что касается построек, то таковых, за исключением двух совхозов, находится в достаточном количестве, но почти все они требуют того или иного ремонта. За отчетный период было отремонтировано пять жилых помещений (квартиры для рабочих и служащих), 3 сарая и вновь построен погреб. Необходимые же постройки предполагается возвести путем переноса таковых из ближайших бывших имений.

Мертвого инвентаря в совхозах не вполне достаточно, к тому же некоторый требует ремонта, производить который при настоящих условиях очень затруднительно за недостатком ремонтных мастерских.

В настоящее время ощущается недостаток в более сложных машинах: рандалях, жнейках, конных граблях, сортировках, соломорезках и отчасти в боронах.

Технических производств в совхозах уезда нет, за исключением 2 кузниц, работа каковых сводилась исключительно для нужд совхозов, хотя были случаи, когда работа производилась окрестному населению на отработ. Что касается рабочей силы в Усовхозе и совхозах, то она в настоящее время такова: служащих 45, рабо-

чих постоянных 87, сроковых 31, поденных рабочих за отчетный период было 4724 дня.

В текущем году сады совхозов использовались своими силами. Общий урожай выразился в 4500 п. Из этого количества 50 % было сдано Упродкому в сушеном виде, остальные же 50 % были израсходованы как натурплата за производство сельхозработ во всех отраслях хозяйства. Нужно отметить, что в текущем году 50 % урожая сада оказало большую поддержку ввиду отсутствия денежных средств, тем более что найти рабочие руки за деньги представляло большую трудность.

Прадставіў А. Ярохін.

Магілёўскі абласны дзяржаўны архіў, ф. 435, воп. 1, спр. 1, л. 1. Копія.

ЗВОДКА ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАСЯЎКОМА АБ ВОДПУСКУ НАСЕННАЙ ПАЗЫКІ НАСЕЛЬНІЦТВУ г. ЧЭРЫКАВА І СЯЛЯНАМ ПАВЕТА

11 мая 1921 г.*

Отпущено семенного материала на обсеменение полей в весеннюю кампанию текущего 1921 г.: овса 15 500 пуд., ячменя 4198 пуд., гречихи 1677 пуд., проса 200 пуд., льняного семени 3509 пуд.

Семена распределены между населением гор. Черикова и уезда в нижеследующем порядке:

№ п/п	Название населенных мест	Овса	Проса	Ячменя	Гречихи	Льна
1	Белицкая	754	12	150	50	120
2	Братьковичская	1000	12	200	95	420
3	Долговичская	507	12	100	50	120
4	Должанская	1014	12	320	150	120
5	Дубровицкая	1000	12	250	100	120
6	Комаровичская	754	12	215	80	200
7	Краснопольская	754	12	250	80	220
8	Кричевская	754	12	150	80	200
9	Лобановская	845	12	240	65	300
10	Малятичская	754	12	100	50	200
11	Мхиничская	1000	12	300	100	150
12	Ново-Ельнянская	754	12	240	100	150
13	Палужская	1000	12	250	120	500
14	Самотеевичская	1000	12	200	80	300
15	Старинская	500	12	200	80	120
16	Студенецкая	1000	12	205	85	220
17	Гор. Чериков	300	8	30	25	49
	Итого:	13 690	200	3400	1400	3509

* Дата адпраўлення губвыканкому Чэрыкаўскім павяткамам РКП(б).

Восстановление народного хозяйства Гомельской губернии (1921—1925 гг.). Гомель, 1960. С. 117.

З БЮЛЕТЭНЯ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ*

Памяти погибших товарищей по революционному посту от руки бандитов.

Продфронт: член РК КП(б) тов. Курочкин — в октябре 1920 г.; член РКСМ тов. Коган — в ноябре 1920 г.; красноармеец комдеза тов. Зосимов — в ноябре 1920 г.

Посевкампания: тов. Максимов Оршанского у., тов. Гаюн З. Сосницкого у. Черниговской губ.— инструкторы губпосевкома.

* Бюлетэнь быў выдадзены да X з'езда Саветаў Чэрыкаўскага павета, які адбыўся 22 красавіка 1921 г.

Лапацуев Андрей — крестьянин Ново-Ельнинской вол., член ячейки РКП(б) убит 29 марта 1921 г. Спите спокойно, дорогие товарищи, Вы умерли, но память о Вас в честном народе не умрет никогда.

Восстановление народного хозяйства Гомельской губернии (1921—1925 гг.). Гомель, 1960. С. 65—66.

ПРЫВІТАННЕ XII ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ У. І. ЛЕНІНУ

1 снежня 1922 г.

XII очередной уездный съезд Советов Чериковского у., приступая к обсуждению государственных и местных задач, приветствует Всероссийский Центральный Исполнительный комитет и вождя мировой революции товарища Ленина.

Съезд заявляет, что трудящиеся Чериковского у. верны пролетарской революции и будут стойко стоять на страже завоеваний Красного Октября.

Уездный съезд Советов шлет горячий привет Красной Армии, зорко охраняющей интересы и мирный труд Советской Республики.

Письма трудящихся Белоруссии В. И. Ленину. 1917—1924. 3 изд. Мн., 1980. С. 121.

ВЫНІКІ АБСЛЕДАВАННЯ ГУБКАМАМ ЧЭРЫКАЎСКАЙ ПАВЯТОВАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РКП

люты 1923 г.

Чериковская организация насчитывает 118 членов и 45 кандидатов, из них в городской организации 46 членов и 12 кандидатов, объединенные в четырех ячейках, остальные 72 члена и 33 кандидата разбросаны по уезду и объединены в 14 ячейках.

По политической зрелости организацию можно разбить на 3 группы: к первой относятся товарищи, окончившие губпартшколы, которых насчитывается 15. Ко второй группе относятся товарищи, окончившие упартшколу, и ответственные работники со средней подготовкой, каковых насчитывается 38. Третью группу составляют товарищи политически почти неграмотные, большинство из деревенских ячеек, которых насчитывается до 100.

Общеполитическое состояние уезда благополучно, доверие крестьян и рабочих масс к коммунистической партии углубляется, что свидетельствует успешное проведение выборной кампании Советов, благоприятно закончившаяся продкампания, своевременное выполнение денежных налогов, только что закончившаяся массовая кампания беспартийных конференций крестьян, успешное проведение кооперативной кампании.

Укомом последнего созыва достигнуты значительные результаты, в смысле организационного укрепления партийной организации, усиления влияния во всех областях советского, хозяйственного строительства, усиления связи с рабочими и крестьянскими массами, в результате чего партийная организация приобрела достаточный авторитет.

Известия Гомельского Губернского Комитета РКП. 1923. № 40. С. 38—40.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ПРАЎЛЕННЯ ЧЭРЫКАЎСКАГА РКС

14 снежня 1930 г.

408. Аб нарыхтоўках па калгасах.

Катэгарычна прапанаваць усім старшыням калгасаў здаць у самым хутчэйшым парадку ўсе лішкі збожжа ўсіх відаў і тэхнічных культур, згодна плану хлебанарыхтовак, як у абавязковым парадку, а таксама і ў масавым добраахвотным парадку.

Старшыням наступных калгасаў: «Шлях сацыялізму», «Чырвоны пераможнік» і «Янава» Горкаўскага с/с і «Сталін» Язёрскага с/с за тэндэнцыю размеркавання калгаснікам усіх лішкаў збожжа паставіць на від.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 338, воп. 1, спр. 110, л. 46. Копія.

ТЭЛЕГРАМА БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ

28 снежня 1930 г.

Адсутнічанне статутаў сельскагаспадарчых арцеляў, тармазіцца праца па арганізацыі і афармленні новых калгасаў. Праўленне Чэрыкаўскага РКС просіць у хутчэйшым парадку выслаць як мага большую колькасць гэтых статутаў.

Адначасова з гэтым просьба даць дазвол на пераапрацоўку і пуск у ход маслабоек, маючыхся ў калгасах. Звесткі на маслабойкі прадстаўлены вам своечасова. Аб выніках паведаміць праўленню РКС.

Праўленне РКС

Сакратар

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 338, воп. 1, спр. 110, л. 48. Копія.

ПАСТАНОВА БЮРО ЧЭРЫКАЎСКАГА РК КП(б)Б АБ ЗДЗЕКАХ НАД СЕЛЬКОРАМ ЗАХАР'ЕВЫМ НЕКАТОРЫМІ РАБОТНІКАМІ САЎГАСА «УДАРНІК»

4 лістапада 1935 г.

Праверкай, праведзенай сакратаром РК т. Вятровым, матэрыялаў «Крестьянскай газеты» і асабістых заяў селькора т. Захар'ева ўстаноўлена, што нам. дырэктара саўгаса «Ударнік» Дзяменцьеў — сын былога абшарніка, на працягу больш году здзекаваўся над актыўным селькорам і рэдактарам насценгазеты саўгаса т. Захар'евым за тое, што апошні сістэматычна як у цэнтральным і раённым друку, а таксама ў рэдагуемай ім насценгазеце саўгаса ўскрываў вапіючыя факты: раскрадванне сацыялістычнай маёмасці і іншыя зладзейскія махінацыі ў саўгасе, прамым удзельнікам якіх з'яўляўся Дзяменцьеў.

Тав. Захар'еў своечасова ўскрыў факты раскрадвання 25 свіней з фермы саўгаса, факты засмечанасці саўгаса класава варожымі элементамі, няправільныя праводкі ў бухгалтэрыі, хуліганска-антысеміцкія праявы з боку Дзяменцьева, а парторг саўгаса т. Кумейша, разам з ім дырэктар саўгаса т. Лабко замест неадкладнага прыняцця мер па ліквідацыі гэтых брыдот — перадаверыліся Дзяменцьеву і без усякіх падстаў знялі з работы Захар'ева, прычыны прыпісалі Захар'еву, што нібы ён сын пана і жандарма, што пры першай праверцы было аправергнута.

З усіх камуністаў — членаў пярвічнай арганізацыі саўгаса толькі т. Левіт на партыйных сходах кваліфікаваў гэта як адкрытыя здзекі над селькорам Захар'евым, што пацягнула за сабой прыняцце рада арганізацыйных мер з боку парторга Кумейшы ў адносінах т. Левіта.

Як факт прытуплення рэвалюцыйнай пільнасці, перадавер'я класава варожым элементам з боку Кумейшы бюро РК лічыць, тое што нават пасля беспадстаўнага знятця з работы Захар'ева, па ініцыятыве Дзяменцьева і Кумейшы дырэктар саўгаса т. Лабко пісьмова паведаміў у другі саўгас (куды на работу паступіў Захар'еў), што апошні — сын пана, у выніку чаго Захар'еў у другі раз быў беспадстаўна знят з работы.

Пасля прамога ўказання сакратара РК т. Вятрова аб прадстаўленні адпаведнай работы Захар'еву да канчатковага расследвання справы Кумейша рашуча адмовіў у гэтым Захар'еву.

Расцэньваючы ўсе гэта як прамое здзекаванне над актыўным селькорам з боку прахадзімца Дзяменцьева і прытуплення рэвалюцыйнай пільнасці з боку члена партыі Кумейшы, бюро РК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Паставіць пытанне перад Магілёўскім свінаводтрэстам аб неадкладным знятці з работы нам. дырэктара саўгаса Дзяменцьева.

2. Член партыі Кумейша за прытуплення рэвалюцыйнай пільнасці, за перадавер'е Дзяменцьеву безумоўна заслугоўвае выключэння з партыі, але, прымаючы пад увагу, што апошні рашуча прызнаў сваю памылку, бюро РК абмяжоўваецца абвяшчэннем яму суровай вымовы з апошнім папярэджаннем, знятцем з работы парторга і пастаноўкай пытання перад пленумам РК аб вывадзе яго са складу пленума РК КП(б)Б.

3. Дырэктару саўгаса тав. Лабко за штампаванне шкодных загадаў Дзяменцьева і не партыйныя, па сутнасці, адносіны да праверкі справы селькора Захар'ева абвясціць вымову. Прапанаваць тав. Лабко неадкладна ачысціць саўгас ад прабраўшыхся туды кулакоў і прыняць энергічныя меры к выяўленню саобшнікаў Дзяменцьева ў раскрадванні сацыялістычнай маёмасці саўгаса.

4. Справу аб здзеках над Захар'евым з боку Дзяменцьева перадаць судова-следчым органам. Прапанаваць тт. Лісічкіну і Мельнікаву на аснове прамога ўказання пракурора СССР следства закончыць на працягу не больш 3-х дзён, суд правесці ў паказальным парадку з удзелам бакоў.

Бюро РК адзначае, што справа селькора Захар'ева яшчэ лішні раз паказвае аб наліччы фактаў прытуплення рэвалюцыйнай пільнасці, адсутнасці бальшавіцкай самакрытыкі ў некаторых звеннях райпартарганізацыі, што асобныя члены партыі не зрабілі для сябе адпаведных вынікаў з урокаў праверкі партдакументаў.

Бюро РК абавязвае парторгаў:

а) гэта рашэнне бюро РК прапрацаваць на чарговых партыйных сходах пярвічных партарганізацый;

б) на гэтых партсходах паказаць, як класавы вораг (тыпа Дзяменцьева) выкарыстоўвае камуністаў у сваёй барацьбе супраць партыі;

в) даручыць інструктару РК т. Эстэркіну на партсходзе пярвічнай партарганізацыі саўгаса, а таксама на сходах рабочых саўгаса растлумачыць сутнасць гэтага рашэння бюро РК.

5. Адмяніць пастанову бюро РК ад 14.V.35 г., якой бюро РК падцвердзіла рашэнне пярвічнай партарганізацыі саўгаса аб вынясенні вымовы т. Левіту і зняцці яго з работы, як няправільнае.

Сакратар РК КП(б)Б Вятроў.

Газета «Сацыялістычная перамога», 20 лістапада 1935 г.

З ПРАТАКОЛАЎ ПАСЯДЖЭННЯ ПРЭЗІДЫУМА ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

1936 г.

Слухалі:

§ 15. Заяву гр-кі в. Луцішча Верамееўскага сельсавета Мацкевіч Ганны Пятроўны аб аднаўленні яе ў выбарчых правах. Пазбаўлена выбарчых праў як дачка кулака, раскулачанага і высланага ў 1930 г. за межы БССР.

Прымая пад увагу, што ў час раскулачвання і высылкі яе бацькі за межы БССР, яна мела ад роду толькі 16 год, выбарчых праў пазбаўлена не была і адразу пасля раскулачвання гаспадаркі бацькі выехала ў г. Ленінград, дзе працавала на грамадска-карыснай працы, з'яўляецца ўдарніцай і за ўдарную работу прэміравана, увесь час з 1930 г. жыла на самастойны заработак незалежна ад бацькоў, чаму на падставе пункта «н» арт. 22 і арт. 44 інструкцыі аб выбарах у Саветы БССР, гр-ку Мацкевіч Ганну Пятроўну ў выбарчых правах вастанавіць.

§ 16. Заяву гр-кі в. Каркоўшчына Верамееўскага сельсавета Жаркевіч Софіі Максімаўны аб аднаўленні яе ў выбарчых правах. Пазбаўлена як дачка кулака, раскулачанага і высланага ў 1930 г. за межы БССР.

Прымая пад увагу, што ў час раскулачвання і высылкі яе бацькі за межы БССР, яна мела ад роду толькі 15 год, выбарчых праў пазбаўлена не была і адразу пасля раскулачвання бацькі уехала ў г. Ленінград, дзе працавала і зараз працуе на грамадска-карыснай працы і ўвесь час з 1930 г. жыве на самастойны заработак незалежна ад сваіх бацькоў, чаму на падставе пункта «н» арт. 22 і арт. 44 інструкцыі аб выбарах у Саветы БССР, гр-ку Жаркевіч Софію Максімаўну ў выбарчых правах вастанавіць.

§ 22. Заяву гр-на г. Чэрыкава Беленкага Абрама Вульфавіча аб аднаўленні яго ў выбарчых правах. Пазбаўлены як быўшы арандатар млыноў да 1928—29 гг.

Паколькі скаргнік толькі на працягу 2-х год (1934—35 гг.) займаецца грамадска-карыснай працай, а да гэтага з часу спынення арэнды пражываў на непрацоўныя даходы, чаму хадайніцтва аб аднаўленні яго ў выбарчых правах адхіліць.

§ 332. Заяву гр-на гор. Чэрыкава Шнаніра Калмана Янкелевіча аб аднаўленні яго ў выбарчых правах. Пазбаўлен як быўшы гандляр.

Паколькі скаргнік, спыніўшы гандаль у 1929 годзе, з якога часу працуе выключна на грамадска-карыснай працы і лаяльна адносіцца да мерапрыемстваў уладу,

чаму на падставе 41 арт. інструкцыі аб выбарах у Саветы БССР, аднавіць яго ў выбарчых правах.

§ 337. Заяву гр-н в. Каркоўшчына Верамееўскага сельсавета Маркевіча Максіма і Жаркевіч Акуліны аб аднаўленні іх у выбарчых правах. Пазбаўлены як кулакі, індывідуальна абкладзены.

Паколькі скаргнікі грамадска-карыснай працай не займаюцца, чаму ў хадайніцтве аб аднаўленні іх у выбарчых правах адмовіць.

§ 338. Заяву гр-на гор. Чэрыкава Адзельнага Платона Нікіфаравіча аб аднаўленні яго ў выбарчых правах. Пазбаўлены як быўшы стражнік у час 1908 па 1917 г.

Адмовіць.

§ 444. Заяву гр-на г. Чэрыкава Глагоўскага Сямёна Абрамавіча аб аднаўленні яго ў выбарчых правах. Пазбаўлены як быўшы гандляр хлебам, сыравінай ільнопрадукцыі, меўшы лясны склад пакупкі і перапрадажы лясных матэрыялаў, акрамя гэтага пазычаў грошы на працэнты і ад гэтых непрацоўных даходаў выключна і пражываў, не займаясь грамадска-карыснай працай.

Паколькі скаргнік пасля спынення гандлю не займаецца грамадска-карыснай працай, пражывае на сродкі атрымання ім ад непрацоўных даходаў, у хадайніцтве аб аднаўленні яго ў выбарчых правах адмовіць.

§ 487. Заяву гр-на в. Хаўмы Хаўмянскага сельсавета Ткачова Івана Навумавіча аб аднаўленні яго ў выбарчых правах. Пазбаўлены выбарчага права як кулацкая гаспадарка, індывідуальна абкладзеная ў 1931 годзе.

Паколькі скаргнік з часу пазбаўлення яго ў выбарчых правах займаецца грамадска-карыснай працай толькі на працягу 2-х год, чаму у хадайніцтве аб вастанаўленні яго ў выбарчых правах адмовіць.

§ 488. Заяву гр-кі г. Чэрыкава Ліўшыц Броні Хаімаўны аб аднаўленні яе ў выбарчых правах. Пазбаўлена на падставе таго, што яе муж да 1930 г. трымаў цагельны завод з ужываннем наймовай сілы.

Прымая пад увагу, што гр-ка Ліўшыц Броня Хаімаўна з 1930 г. знаходзіцца на ўтрыманні сваёй дачкі Ліўшыц Рэвекі Яфімаўны, якая знаходзіцца на службе у Наркамаце мясцовай прамысловасці АССР у якасці эканаміста-планавіка, аднавіць гр-ку Ліўшыц Б. Х. у выбарчых правах.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 6, воп. 1, спр. 3044, л. 22, 54, 108—110. Копія.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА АБ ТЭЛЕФАНІЗАЦЫІ І РАДЫЁАБСЛУГОЎВАННІ Ў РАЁНЕ

3 студзеня 1936 г.

Прэзідыум райвыканкома адзначае, што становішча тэлефанізацыі ў раёне і радыёабслугоўванне працоўных мас пастаўлена яўна нездавальняюча, з прычыны старой ізношанай апаратуры тэлефоннай станцыі і прамой расхлябанасці апарата райаддзела сувязі і апарата работаючага па абслугоўванню радыё працоўных. З боку работнікаў тэлефанізацыі і радыёабслугоўвання праяўляюцца няўважлівыя адносіны да кліентуры і працоўных. Такое становішча здарылася дзякуючы непрыняццю адпаведных мер з боку загадчыка райаддзела сувязі тав. Рабкова і засмечанасці апарата зусім непрыгоднымі, некваліфіцыраванымі работнікамі, зусім не заінтарасованымі паляпшэннем работы сувязі і радыёабслугоўвання.

... прэзідыум РВК пастанаўляе:

1. Абавязаць загадчыка райаддзела сувязі тав. Рабкова зараз жа прыняць меры к упарадкаванню работы па тэлефанізацыі і радыёабслугоўванні працоўных у раёне, ачысціў апарат ад асоб, не заінтарасованых работай, праяўляючых бюракратычныя адносіны да паслуг працоўных.

2. Прапанаваць заг. райаддзела сувязі тав. Рабкову зараз жа рашуча паставіць пытанне перад упаўнаважаным НК сувязі тав. Валодзька аб уключэнні ў першачарговы план работ па пераабарудаванню тэлефоннай станцыі і ўстанаўленні новай апаратуры.

3. Абавязаць тав. Рабкова прыняць неадкладныя меры да паляпшэння справы радыёабслугоўвання працоўных мас, на працягу 10-дзённага тэрміну адрамантаваць і прывесці ў іспраўнасць усе радыёкропкі маючыя па калгасам раёна, аднасова даручыць тав. Рабкову паставіць пытанне перад камітэтам радыёабслугоў-

вання аб знятці з работы загадчыка радыёвузла ў гор. Чэрыкаве тав. [Ц]імашкову за бяздзейнасць і трансляцыю радыёперадач рэлігійнага вучэння польскага касцёлу.

4. Папярэдзіць заг. райаддзела сувязі тав. Рабкова, што, калі ім на працягу пяці дзён не будуць устранены няўважлівыя адносіны апарата тэлефоннай станцыі і радыёабслугоўвання да кліентаў і працоўных, расхлябанасць сярод работнікаў апарата райаддзела сувязі і не будзе ўстаноўлен парадак і цвёрдая дзяржаўная дысцыпліна сярод працаўнікоў свайго апарата, будзе пастаўлена пытанне аб знятці яго з работы і прыцягненні да адказнасці.

Старшыня Чэрыкаўскага райвыканкома Ратайка

Сакратар Чэрыкаўскага райвыканкома Удалы

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 6, воп. 1, спр. 3044, л. 11. Копія.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

13 студзеня 1936 г.

§ 18. Аб пераглядзе пастановы прэзідыума РВК ад 13/XII-1935 г. (прат. № 35) аб зацвярджэнні пастановы агульнага сходу членаў с/г арцелі «Будаўнік» Шароеўскага сельсавета аб выключэнні з членаў с/г арцелі калгасніцы Граськовай Марыны за парушэнне працоўнай дысцыпліны, выразіўшае ў самавольным уходзе яе мужа на пабочныя заработкі.

Паколькі гр-ка Граськова Марына за час знаходжання членам с/г арцелі «Будаўнік» Шароеўскага сельсавета за парушэнне працоўнай дысцыпліны ў калгасе не прыцягвалася да іншых мер выхавання і пакарання, прадугледжаных арт. 17 статуту с/г арцелі і дала абяцанне добрасумленна працаваць у калгасе і беражна адносіцца да калгаснай маёмасці, чаму пастанову сваю ад 13/XII-1935 г. і пастанову агульнага сходу членаў с/г арцелі «Будаўнік» Шароеўскага сельсавета аб выключэнні з калгаса Граськовай адмяніць і ўстанавіць яе членам с/г арцелі.

§ 26. Аб адводзе участка для электрастанцыі ў г. Чэрыкаве.

Паставіць у свядомасць Белдзяржпраект аб тым, што свабодная тэрыторыя, не занятая гарадской пабудовай, на якой распаложан быўшы вінакуранны завод, прадстаўляецца пад электрастанцыю ў меры, патрэбнай дзеля размяшчэння прадпрыемства (электрастанцыі).

Участкі гарадской забудовы, прылягаючыя да тэрыторыі завода, павінны быць точна паказаны ў плане і адвод гэтых участкаў пад электрастанцыю павінен вытварацца ў выпадку крайняй неабходнасці і па магчымасці абайсціся без перасялення жыльцоў.

З'емку ўчастку вытварыць у радыусе 200 метраў і ў пастаяннае карыстанне электрастанцыі перадаць плошчу 5—6 га, не падвергнутай гарадской забудове.

Старшыня Чэрыкаўскага райвыканкома Ратайка

Сакратар Удалы

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 6, воп. 1, спр. 3044, л. 23, 24. Копія.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА АБ СТАНЕ МЛЫНОЎ

13 лютага 1936 г.

Прэзідыум райвыканкома адзначае, што нягледзячы на тое, што ў 1935 годзе ўсе млыны, знаходзячыя ў ведзенні райпрамкамбіната, прыведзены ў парадак (зроблены капітальны рамонт, укладзена 22 631 руб. капіталаўкладанняў), аднак работа млыноў і іх гаспадарчае становішча і выкананні імі планаў памольнага збору з'яўляюцца далёка нездавальняючым (план памзбору выканан на 46 %).

Прычынамі дрэннай работы млыноў па раёну і дрэннага выканання памольнага збору з'яўляюцца: адсутнасць па шэрагу млыноў адпаведных кадраў (Чэрыкаўская, Вусцянская), налічча фактаў раскрадання памзбору, дрэнная пастаноўка адчота і ўчотнасці, несвоечасовая вывазка памольнага збору і адсутнасць належнага кантролю на млынах з боку камбіната, кантралёра і сельскіх Саветаў. Па млынах, знаходзячых у ведзенні калгасаў (Забачэўскі — калгас імя Варашылава Каменскага с/с, Жытнеўскі — калгас «Пабеда» Верамееўскага с/с, Зябенскі — калгас «Дабраволец» Зябенскага с/с), не зроблена ніякага рамонту і на гэтых млынах вельмі дрэннае выкананне плана памольнага збору, а таксама дрэнна выконваецца пастанова СНК у частцы авансавай здачы памольнага збору калгасамі.

Выходзячы з чаго райвыканком пастанаўляе:

1. Абавязаць дырэктара райпрамкамбіната тав. Зайкевіча, старшынь саветаў пад старшынствам нам. старшыні РВК тав. Шаха неадкладна праверыць увесь склад работнікаў млыноў па раёну, ачысціць млыны ад класава чуждых элементаў і забяспечыць млыны работнікамі з лепшых калгаснікаў. Усю гэту работу закончыць не пазней чым 1-га сакавіка 1936 года.

2. Абавязаць тав. Зайкевіча і кантралёра млыноў тав. Карнюшанка ўстанавіць сістэматычны кантроль і праверку правільнасці ўзымання памольнага збору, а таксама ўстанавіць сталы ўчот і адчотнасць па млынах, каб папярэдзіць раскраданне гарнцавага збору.

3. Абавязаць т. Зайкевіча і старшынь саветаў, на тэрыторыі якіх па млынах маецца невывезены гарнцавы збор, на працягу пяці дзён забяспечыць вывазку яго. Адначасова прыняць усе меры да забеспячэння выканання млынамі плана памольнага збору.

4. Абавязаць следчага тав. Мельнікава на працягу 10 дзён разгледзець і скончыць следствам усе справы ... аб раскраданні памольнага збору і вінаватых прыцягнуць да крым. адказнасці.

5. Улічваючы, што на працягу шэрагу год Камаровіцкая мельніца не рамантавалася і знаходзіцца ў полуразрушаным становішчы, на рамонт якой трэбуецца 300—400 к/м лесаматэрыялу, чаму абавязаць заг. лясгаса т. Курэка адпусціць патрэбную колькасць лесаматэрыялу з бліжайшых лясных дач, прылягаючых да Камаровіцкага млына ўрочышча «Сечыха» Горкаўскага с/с.

6. Прапанаваць калгасам, у ведзенні якіх знаходзяцца млыны, на працягу 1936 г. адрамантаваць іх і прывесці ў поўную іспраўнасць і работаспасобнасць.

Старшыня райвыканкома Ратайка

Сакратар райвыканкома Удалы

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 6, воп. 1, спр. 3044, Л. 56. Копія.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ПЛЕНУМА ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

27 сакавіка 1936 г.

Слухалі: Даклад аб ходзе ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва (Дакл. ст. інспектар асветы т. Вінаградаў).

Пастанавілі: ... па раёну да канца 1936 года належыць абучыць 900 чал. непісьменных і 1700 чал. малапісьменных. Між тым зараз абучэннем ахоплена непісьменных 729, малапісьменных 511 чал. Па школах маюць месца частыя зрывы заняткаў, дрэннае наведванне (Язёрскі, Шароеўскі, Лабанаўскі і др. саветы). Большасць саветаў раёна не зварачваюць увагі на поўную і своечасовую яўку н/п і м/п, яшчэ да гэтага часу ў радзе саветаў і калгасаў не зразумелі, што пытанне ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці пастаўлена 17 з'ездам ВКП(б), з'яўляецца важнейшай пастановай, абавязковай для кожнага работніка сельсавета, калгаса, прафсаюза і г. д.

У далейшым пленум лічыць неабходным:

1. У мэтах поўнага выяўлення н/п і м/п па раёну абавязаць старшынь саветаў правесці да 6-га красавіка 1936 года поўны ўчот непісьменных і малапісьменных па сельсаветах да 50 гадовага ўзросту, прыцягнуў да гэтай работы Культсекцыі, настаўніцтва і культактыў горада і вёскі.

2. Пленум абавязвае саветы на працягу пяці дзён арганізаваць пры ўсіх сельса-

ветах і гарсавеце секцыі па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, старшынямі гэтых секцый павінны быць старшыні саветаў і забяспечыць разгортванне іх работы.

3. Пленум абавязвае саветы ўключыць у план работ прэзідыума заслухоўванне на прэзідыумах саветаў справаздачы школ па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці.

4. Пленум абавязвае Інспектарыят асветы на працягу 2-х дзён давесці планы навучання на 1936 год па сельсаветах, уключыўшы ў план у першую чаргу ўсіх дапрызыўнікаў 1914, 1915, 1916 гг. нараджэння і падлеткаў 14—18 год.

5. Пленум абавязвае саветы, калгасы, саўгасы і МТС забяспечыць школы па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці належным абсталяваннем (газай, апалам, лампамі), адначасова абавязаць інспектарыят асветы і райсаюз на працягу 10 дзён забяспечыць школы падручнікамі і школьнымі пісьмовымі прыладамі.

6. Прапанаваць саветам там, дзе для поўнага разгортвання работы школ па ліквідацыі н/п і м/п не хапае школьных памяшканняў, скарыстаць памяшканні хат-чытальняў, бібліятэк, чырвоных куткоў і г. д.

7. Абавязаць інспектарыят асветы, старшынь саветаў і старшынь калгасаў арганізаваць на час заняткаў пры школах дзіцячыя пакоі, дзе ў гэтым будзе адчуваща неабходнасць.

8. Лічыць неабходным у асобных выпадках практыкаваць прымацаванне да непісьменных і малапісьменных культармейцаў і абучэнне непісьменных на даму.

9. Пленум абавязвае прэзідыум РВК на кожным пасяджэнні прэзідыума заслухоўваць не менш 2 справаздач школ і аднаго старшыню сельсавета аб ходзе ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці.

10. Абавязаць старшынь саветаў і старшынь калгасаў строга прытрымлівацца вызначаных тэрмінаў правядзення заняткаў па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці у працягу 4-х дзён у тыдзень, вызваляя на гэты час ад работы ўсіх н/п і малапісьменных.

11. Абавязаць інспектарыят асветы палепшыць аперацыйнае і практычнае кіраўніцтва работай школ па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, перыядычна правярая іх работу на месцы.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 6, воп. 1, спр. 3044, л. 98—99. Копія.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА ПА ДАКЛАДУ ПРАМАРЦЕЛЕЙ АБ ІХ ДЗЕЙНАСЦІ

24 мая 1936 г.

Прэзідыум райвыканкома адзначае, што нягледзячы на ўсе магчымасці поўнасцю выканаць план па арцелях, аднак у рэзультаце нераспарадзіцельнасці кіраўніцтва арцелей планы імі не выкананы і выкананне іх знаходзіцца пад пагрозай зрыву, асабліва па швейнай і кузнечнай арцелях. Невыкананне прамфінпланаў першага квартала тлумачыцца тым, што старшыні арцелей амаль нічога не зрабілі ў галіне забеспячэння неабходнымі матэрыяламі з мясцовых рэсурсаў і спадзяюцца выключна на атрыманне тавараў з цэнтралізаваных фондаў. Асобныя арцелі (кузнечная) затаварана неліквідам і пры адсутнасці крэдытаў не разгарнула работу калёснага цэха. Абсалютна з'яўляецца недапушчальным надзвычайная нізкая вытворчасць працы і якасць выпускаемай прадукцыі, асабліва сапожнай арцелі.

Выходзячы з чаго, прэзідыум райвыканкома пастанаўляе:

1. Абавязаць старшынь прамарцелей сапожнай тав. Брука, партняжнай тав. Злаціна і кузнечнай тав. Каліпскага забяспечыць узняцце вытворчасці працы па арцелях і выпуск добраякаснай прадукцыі, папярэдзіўшы іх, што за выпуск недобраякаснай прадукцыі ў далейшым яны будуць прыцягнуты да адказнасці.

2. У мэтах лепшага абслугоўвання калгаснікаў у перыяд уборачнай і хлебазагатавіцельнай кампаніі абавязаць старшынь прамарцелей арганізаваць брыгады па рамонту абутку, вопраткі, с/г машын і інвентара, абавязаўшы старшынь к/саў забяспечыць рамонтныя брыгады прамарцелей кватэрамі і харчаваннем за ўстаноўленую плату.

3. Абавязаць старшыню сапожнай арцелі тав. Брука прыняць меры да разгортвання работы па загатоўцы свіных скур, праводзячы правільнае і своечасовае атаварванне здатчыкаў свіных скур прамтаварамі па ўстаноўленых нормах.

4. Абавязаць райсаюз з атрымліваемых у планавым парадку хлапчатку і іншыя тавары вылучаць партняжнай арцелі для перапрацоўкі 3 % атрымліваемай мануфактуры. Адначасова абавязаць тав. Злаціна паставіць пытанне перад сваімі цэнтральнымі арганізацыямі аб павелічэнні водпуска тавараў для перапрацоўкі ў партняжнай арцелі.

5. Улічваючы затаваранасць кузнечнай арцелі неліквідам, што ў значнай меры адбіваецца на фінансав[ым] становішч[ы] арцелей, чым затрудняецца разгортванне нармальнай работы арцелей і асабліва калёснага цэха, паставіць пытанне перад Бекустпрамсаюзам аб водпуску кузнечнай арцелі неабходных крэдытаў.

6. Абавязаць старшынь прамарцелей прыняць неадкладныя меры да разгортвання культасветнай работы ў арцелях, значна палепшыў работу клуба кустпрамарцелей. Адначасова абавязаць горсавет аказаць усямерную дапамогу прамарцелям у разгортванні, ажыўленні і паляпшэнні культасветнай работы ў прамарцелях.

Нам. старшыні райвыканкома Шах

Сакратар райвыканкома Удалы

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 6, воп. 1, спр. 3044, л. 15. Копія.

ДАНЫЯ АБ КОЛЬКАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЁНА ПА СТАНУ НА 1-е СТУДЗЕНЯ 1938 г.

Вепрынскі сельсавет 2236 чалавек, Верамейскі 1958, Глінскі 3684, Горкаўскі 2759, Зябенскі 1222, Каменскі 1108, Лабанаўскі 2510, Мірагашчанскі 1576, Рынкоўскі 1610, Рэчыцкі 4582, Ушакоўскі 1769, Халмянскі 2901, Шароеўскі 2021, Язёрскі 2943. Горад Чэрыкаў налічваў 5440 чалавек. Агульная колькасць насельніцтва 38 319 чалавек.

Магілёўскі абласны дзяржаўны архіў, ф. 7, воп. 1, спр. 1, л. 7. Копія.

ЧЭРЫКАЎСКІ РАЁН У 1939 г.

Короткая экономіка-статыстычная характарыстыка

Административный центр — гор. Чериков
Количество населения в центре — 6,3 тыс. чел.
Ближайшая железнодорожная станция — Кричев
Расстояние от станции — 30 км
Ближайшая пароходная пристань — Пропойск
Расстояние центра от пристани — 30 км
Название реки — Сож
Количество сельсоветов — 14
Всего населения в районе — 40,4 тыс. чел.
Количество рабочих и служащих — 2943 чел. (на 1.IV.37 г.)
Площадь земельных и лесных угодий — 108 333 га
в том числе: пахоты 43 690 га; пад садами 368 га; сенокоса 12 702 га; леса 30 494 га; пастбищ и выгонов 5326 га

Количество пром. торфболот 10
Площадь в границах промзалежи 695 га } по данным на 1. I. 1937 г.
Запасы торфа 15,6 млн м^3

Запасы минеральных полезных ископаемых на 1.I.1938 г.: глины — 534,1 т. м^3.

Число элетростанций — 3
Их мощность — 40 кВт
Количество предприятий — 6
В них занято рабочих — 137
Валовая продукция — 761 т. р. (в ценах 1926/27 гг.)
Крупнейшие предприятия: винзавод
Добыча торфа (за 1939 г.) — 5,3 тыс. т
Программа лесозаготовок: заготовка — 45 т. к/мтр, вывозка — 41,0 т. к/мтр

Посевная площадь

Культуры	Всего, га	В том числе			
		кооп. сектор	колхозы	в т. ч. обсл. МТС	единоличные хозяйства
Всего	35 172	31	31 949	30 580	201
В том числе:					
зерновые и бобовые	24 336	19	23 487	22 438	126
лён	1700	—	1586	н/св.	5
конопля	435	—	405	»	1
силосные	9	—	9	»	—
картофель	6477	11	4517	»	60
огор. кул.	365	1	128	»	6
корнеплоды	40	—	40	»	—

Количество МТС — 2 на 1.VII.39 г., в них тракторов — 84
Количество колхозов — 94, в них хозяйств — 6946
Количество единоличных хозяйств — 266
Процент коллективизации по хозяйствам — 96,3

Лечебная сеть и медкадры на 1.I.1939 г.

Всего больниц — 2
В них коек — 120
Количество фельдшерских и фельдшерско-акушерских пунктов — 10
Количество акушерских пунктов — 1
Количество колхозных родильных домов — 2
Количество: врачей 6, фельдшеров 16, акушерок 18, медсестер 23
Количество ясель постоянных 1
В них мест 25
Ясель сезонных 47
В них мест 1200

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 31, воп. 3, спр. 25, л. 76—78. Копія.

Яшчэ дзве ахвяры

Да шматлікага мноства ахвяр, якія загінулі ў барацьбе з унутранымі і знешнімі ворагамі рэвалюцыі за справу рабочых і сялян, дабавіліся яшчэ дзве ахвяры: Трафім і Еўдакія Ламянковы, забітыя ў ноч на 2 студзеня ў Чэрыкаўскім раёне. Абодва слаўныя члены Камуністычнай партыі, аддана абараняючыя інтарэсы беднаты, загінулі ахвярамі зладзейскіх выстралаў кулакоў. Забойства нашых таварышаў Ламянковых дастаткова пераканаўча паказвае, што кулацтва ў барацьбе сваёй супраць беднаты не спыняецца ні перад чым, ажно да забойства лепшых барацьбітоў рабочага класа і сялянства.

Вечная памяць нашым таварышам Ламянковым, якія аддалі сваё жыццё за справядлівую справу. Смерць забойцам Ламянковых.

Бюро Калінінскага
акружкома КП(б)Б.

Газета «Наш працаўнік», 9 студзеня 1925 г.

Ламянковым пагражалі. І ноччу 2 студзеня, ёа стрэльбы на блізкай адлегласці, спячыя Ламянковы былі забіты. Шасцімесячнае дзіця, якое спала між

імі, засталося жывым і было толькі апалена порахам.

Трафім Яфімавіч Ламянкоў нарадзіўся ў 1895 г. у в. Прыпёчына Чэрыкаўскага павета ў беднай сялянскай сям'і. На траіх братоў бацька пакінуў адзін надзел зямлі, і яны вымушаны былі батрачыць у маёнтку пана Абаленскага. Трафім некалькі год працаваў на шахтах Данбаса, дзе і сустрэўся з Еўдакіяй — дачкой шахцёра-камуніста. У гады першай сусветнай вайны Трафім — марак Балтыйскага флота. Калі пачалася рэвалюцыя, ён становіцца пад сцягі бальшавікоў. У сваю вёску вяртаецца ў шынялі, з вінтоўкай у руках. У пачатку 1918 г. арганізоўваецца рэвалюцыйны атрад. Акрамя Трафіма і Еўдакіі, у яго састаў уваходзілі Нічыпар Ламянкоў, Захар Іванавіч Прасянцоў, Максім Кірылавіч Брылёў, Кузьма Юр'евіч Марускоў, Макар Карпавіч Прасянцоў, Сямён Канстанцінавіч Прасянцоў, Аляксей Засімавіч Мельнікаў. Трафім Ламянкоў становіцца камандзірам рэвалюцыйнага атрада, а яго жонка — камісарам. На рахунку гэтага атрада мноства аперацый, накіраваных на барацьбу за ўмацаванне органаў Савецкай улады. (Гл. успаміны З. І. Прасянцова).

Ф. Рудзікаў.

Дзеці спяваюць «Інтэрнацыянал»

1921 год. Голад ахапіў Паволжа. Па краіне ідзе збор прадуктаў для галадаючых. У Чэрыкаў прыйшла ўрадавая тэлеграма. Паведамлялася, што з Гомеля па р. Сож выйшаў параход з дзецьмі з Паволжа. Дзяцей трэба было сустрэць на прыстані ў г. Прапойску (зараз Слаўгарад) і размясціць па дзіцячых дамах і школах.

Ледзьве жывых, галодных дзяцей з Вяткінскай і Казанскай губерняў неабходна было выратаваць ад смерці. Рускія і татары, башкіры і чувашы, удмурты і марыйцы — усе 136 чалавек патрабавалі асаблівай увагі да сябе, клопатаў, бо былі вельмі аслабленыя.

Старшыня выканкама павятовага Савета настаўнік Фёдар Піліпавіч Каралёў, будучы акадэмік, буйны спецыяліст па гісторыі савецкай педагогікі, вырашыў амаль адразу ж пачаць заняткі ў школе. Гэта было не так проста. Некаторыя дрэнна ведалі рускую мову, ды і падыход да дзяцей павінен быць асаблівы. Многія з іх ужо бачылі смерць сваіх блізкіх.

Рабяты з Леменскай школы-камуны арганізавалі агітбрыгаду і выступалі з канцэртамі ў сёлах. А плата была адна — прадукты, прадукты і яшчэ раз прадукты. Сяляне грузілі іх на вазы і везлі ў дзіцячыя дамы, дзе жылі дзеці з Паволжа. Паступова паміж мясцовымі і прыезджымі рабятамі складваліся добрыя сяброўскія адносіны. Педагогі замянялі ім бацькоў.

Жнівень 1923 года. Надышла пара дзецям Паволжа развітацца са сваімі беларускімі сябрамі. На прыстані Прапойска мнагалюдна. На лёгкай рачной хвалі ледзь пагойдваецца параход. Зараз ён возьме на борт вялікую групу хлопчыкаў і дзяўчынак. Капітан з імі знаёмы. Каля двух гадоў назад ён прывёз іх з Гомеля, змарнелых ад голаду. І не верылася капітану, што ўсе выжылі. На палубу падняліся ўсе 136 дзяцей. Яны нешта крычалі, махалі рукамі сваім выратавальнікам і сябрам, якія прыйшлі праводзіць іх, пажадаць шчаслівай дарогі.

Раздаўся працяжны гудок парахода. Матрос падышоў да трапа, каб падняць яго. Стала ціха і на беразе і на параходзе. Маўчалі дзеці. Якія словы падзякі знайсці на развітанне? І раптам моцны хлапечы голас заспяваў «Інтэрнацыянал». У адзін момант юнага спевака падтрымалі

Выхаванцы Леменскай школы-камуны. 1924 г.

дзесяткі галасоў. Капітан узяў пад казырок. Матросы выцягнуліся па камандзе «смірна». І на беразе, і на параходзе пелі і плакалі людзі. Раптам капітан махнуў рукой і, павярнуўшыся, знік у рубцы — не вытрымаў стары марак. Параход павольна адышоў ад берага.

М. Мельнікаў.

Удостоверение

Дано таковое школьному работнику тов. Николаеву А. А. в том, что он командируется Чериковским уисполкомом и отделом благоустройства в город Гомель в качестве ответственного уполномоченного по доставке из города Черикова 136 детей Вятской и Казанской губерний, реэвакуированных на родину, посему просьба по всем учреждениям, органам оказывать тов. Николаеву самое широкое содействие в деле выполнения им возложенных на него обязанностей. К начальнику пароходной пристани «Пропойск» просьба: оказать тов. Николаеву полное содействие в посадке детей на пароход, отправляющийся на город Гомель 1 августа сего года за счет Гомельского губоно, которое оплатит их перевозку по представлении ему счета.

Настоящее удостоверение действительно по 10 августа 1923 года. Изложенное подписями и приложением печати удостоверяется.

Арыгінал знаходзіцца ў Чэрыкаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Школа-камуна

У першыя гады Савецкай улады ў гарадах, на важных вузлавых станцыях і рачных прыстанях бадзяліся вялікія групы беспрытульнікаў — вынік двух войнаў. Ствараліся пастаянныя камітэты дапамогі дзецям, працавалі асобыя камісіі па справах малалетніх злачынцаў. Арганізоўваліся інтэрнаты для беспрытульных падлеткаў, узнікалі спецыяльныя працоўныя камуны, розныя дзіцячыя прыёмнікі і г. д.

У 1919 г. да У. І. Леніна з прапановай арганізаваць працоўную доследна-паказальную школу-камуну звярнуўся вядомы рэвалюцыянер Панцеляймон Мікалаевіч Лепяшынскі. У хуткім часе школа пачала працаваць на радзіме яе арганізатара — у сяле Ліцвінавічы Кармянскага раёна.

У 1920 г. па тыпу Ліцвінавіцкай школы была створана новая доследна-паказальная школа ў былым маёнтку Васілеўскага — Лемень, каля Чэрыкава. На чале гэтай школы-камуны стаў брат П. М. Лепяшынскага — Мадэст Мікалаевіч. Яго імя навечна ўпісана ў гісторыю Чэрыкаўшчыны. З 1922 г.— гэта Леменская доследна-паказальная школа-камуна II ступені імя У. І. Леніна. У школе-камуне раскрыўся педагагічны талент Мадэста Мікалаевіча, які трагічна загінуў, ратуючы дзяцей ад небяспекі. У 1924 г. школа-камуна была ператворана ў школу сялянскай моладзі.

Школа мела зямельны ўчастак у 22 дзес., які выкарыстоўваўся пад яравыя і бульбу, пад агарод і луг.

Навучэнцамі і выхаванцамі школы спачатку былі страшакласнікі чэрыкаўскіх школ, потым многа дзяцей прывезлі з галадаючых раёнаў Паволжа, пасля вялікае папаўненне прыбыло з дзіцячых дамоў Халобліна і Клінцоў. Прымаліся ў школу таксама дзеці сялянскай і местачковай беднаты, у першую чаргу круглыя сіроты.

У 1922/23 навучальным годзе тут займалася 189 вучняў, якія не толькі вучыліся, але і працавалі ў кузні, у полі, у лесе. Вольны час праводзілі ў гуртках: марксісцкім, літаратурным, драматычным, сельскагаспадарчым, музычна-харавым. Майстэрству гульні ў шахматы, гімнастыцы, плаванню вучыў сваіх выхаванцаў Мадэст Мікалаевіч. У Лемені была створана адна з першых у рэспубліцы футбольная каманда.

У школе-камуне дзейнічалі органы вучнёўскага самакіравання. Вышэйшым органам яго быў агульны сход. Выканаўчы камітэт школы складаўся з 25 чалавек, яго прэзідыум — з 5 чалавек. Працавалі камісіі: працоўная, гігіенічная, прадуктовая і гаспадарчая. Выходзіў рукапісны часопіс.

Леменская школа-камуна выпусціла каля 150 чалавек, сярод іх — член-карэспандэнт АН БССР І. В. Гутараў, акадэмік АН БССР П. Ф. Ракіцкі, кампазітар І. І. Любан і інш.

Ісак Ісакавіч Любан

Любоў да мастацтва, панаваўшая ў Леменскай школе-камуне, дапамагла аднаму з яе выхаванцаў — Ісаку Любану — правільна вызначыць свой жыццёвы шлях. Нарадзіўся ён 23 сакавіка 1906 г. у Чэрыкаве. Быў сёмым па ліку дзіцём у сям'і рабочага-печніка. Бацька памёр незадоўга да нараджэння свайго апошняга сына. Жылося неймаверна цяжка, голадна, вопраткі амаль не было, аб школе ніхто ў сям'і і не марыў. Таму, як толькі з'явілася магчымасць, маці аддала малодшага сына ў Чэрыкаўскі прытулак. Так ва ўзросце сямі гадоў спазнаў Ісак цану горкаму прытулкаваму хлебу і сіроцкім «навукам», якія ўбіваліся ў дзіцячыя галовы розгамі ды аплявухамі. Але пакідаць прытулак хлопчык і не думаў: вельмі хацелася яму вучыцца і стаць пісьменнікам.

Пачалася імперыялістычная вайна, жыццё станавілася ўсё горшым, прытулкавыя галадалі, а неўзабаве іх зусім перасталі карміць. Рабяты сталі разбрыдацца па гарадах, наймаліся на работу да багатых людзей.

З адкрыццём Леменскай школы-камуны магчымасць трапіць у яе ча-

тырнаццацігадоваму падлетку паказалася незвычайным шчасцем. Ён быў адным з самых непаседлівых, дапытлівых выхаванцаў і вельмі хутка выявіў незвычайныя здольнасці да музыкі. Пачаў пець у хоры, іграў у музычным гуртку на самых розных інструментах, з захапленнем падбіраў на раялі мелодыі песень.

Неўзабаве Ісак стаў старастай, затым паўнаўладным «гаспадаром» духавога аркестра. Гукі труб, барабана грымелі ў школе з раніцы да вечара, а потым рэпетыцыі перанеслі ў бліжэйшы лес, хоць гэта было і небяспечна.

Закончыўшы апошні клас школы-камуны, Любан атрымаў накіраванне на вучобу ў Мінск. У кастрычніку 1924 г. у Мінскі музычны тэхнікум было пададзена звыш васьмісот заяў. У пакой прыёмнай камісіі Любан увайшоў даволі смела. Да гэтага часу ён паспеў авалодаць многімі інструментамі духавога аркестра, іграў на скрыпцы, альце, віяланчэлі, домбры, гітары. Праверылі яго слых і музычную памяць, а даведаўшыся, што ён сам апрацаваў некалькі народных песень, пасадзілі за фартэпіяна і папрасілі сыграць. Любан убачыў сваё прозвішча ў спісах прынятых у тэхнікум па класу кампазіцыі Якава Васілевіча Прохарава.

Першы ўрок прынёс мала прыемнага. Настаўнік праверыў яго запісы і апрацоўкі народных песень. Хутка ў нотных сшытках, якімі Ісак ганарыўся, не засталося амаль ніводнай старонкі не перакрэсленай уздоўж і ўпоперак. Аказалася, што яго работа была вельмі далёкая ад сапраўднай музыкі, а тым больш ад творчай працы кампазітара.

Займацца даводзілася многа, але кожны ўрок, кожны вучэбны дзень прыносіў студэнту штосьці новае, цікавае, патрэбнае. Чытаючы зборнік вершаў Ф. Багушэвіча, ён заўважыў, што быццам адкрыў для сябе паэта нанава, некаторыя вершы запомніў на памяць і мімаволі паўтараў іх. Слова нараджала ў яго душы мелодыю. Ісак напісаў раманс. Другі раманс ён напісаў на словы Янкі Купалы «Дзве долі». Хутка гэтыя дзве рэчы гучалі ў выкананні Прохарава. Першы поспех радаваў педагога і падбадзёрваў студэнта.

І. І. Любан.

Наступныя, больш глыбокія творы, Любан напісаў на тэкст верша Я. Коласа «Ноч». Другой сур'ёзнай работай кампазітара, напісанай на чацвёртым курсе тэхнікума, была песня «Восень» на словы Я. Купалы.

За чатыры гады, праведзеныя Любанам у Мінску, яго прозвішча як папулярнага кампазітара, кіраўніка самадзейнасці, камсамольскага важака, лектара і нястомнага прапагандыста музыкі стала шырока вядомым у сталіцы Беларусі. Пасля заканчэння тэхнікума яму была ўручана пуцёўка ЦК камсамола Беларусі на адказную работу ў якасці мастацкага кіраўніка музычнага вяшчання беларускага радыё. Ён вельмі хутка ўвайшоў у курс справы, змог падшукаць сабе дзейных памочнікаў, аб'яднаць вакол музычнай рэдакцыі выканаўцаў-энтузіястаў.

Прыкладна з 1928 г. пры творчай арганізацыі беларускіх пісьменнікаў пачалі групавацца і кампазітары. Спачатку гэта насіла паўафіцыйны характар, а потым была створана аўтаномная секцыя кампазітараў, а Любана выбралі яе адказным сакратаром.

Першая палова трыццатых гадоў была даволі насычаным перыядам у творчасці кампазітара. З'яўляюцца яго работы, яго новыя творы, масавыя песні, рамансы. Вялікай папулярнасцю карыстаецца «Песня дукорскіх партызан».

У 1932 г. секцыя кампазітараў была ператворана ў Саюз савецкіх кампазітараў Беларусі, а Ісака Любана выбралі яго старшынёй. 1935 г. прынёс Любану значную творчую ўдачу: упершыню кампазітар звярнуўся да жанру буйнога цыклічнага вакальна-сімфанічнага твора. Хутка ствараецца ансамбль беларускай народнай песні і танца, кіраўніцтва гэтым ансамблем даручаюць Любану.

Пачалася Вялікая Айчынная вайна. На трэці дзень вайны кампазітар добраахвотнікам пайшоў у армію. Любана залічваюць на курсы камісараў. Па заканчэнні курсаў у званні старшага палітрука ён накіроўваецца на Заходні фронт у 115-ю асобную стралковую брыгаду 5-га гвардзейскага корпуса. Потым яго назначаюць камісарам асобнага стралковага батальёна.

У суровыя дні вайны Ісак Ісакавіч напісаў некалькі песень, яны прынеслі яму званне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР. У чэрвені 1942 г. па рашэнню камандавання І. І. Любан адкамандзіроўваецца ў распараджэнне палітупраўлення Заходняга фронту і атрымлівае пасаду камісара ансамбля песні і танца Заходняга фронту.

Пасля заканчэння вайны кампазітар зняў з сябе ваенную форму. У Мінск не вярнуўся. Але творчых сувязей з Беларуссю не парываў, супрацоўнічаў з беларускімі кінематаграфістамі.

І. І. Любан аўтар вакальна-сімфанічнай сюіты «Граніца ў пясках», сюіты «Калгасная вечарынка», песень «Бывайце здаровы», «Толькі з табою», «Не шукай», «Наш тост», «Дарагая Беларусь». Пісаў музыку да спектакляў («Несцерка» ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа), кінафільмаў («Новы дом», у сааўтарстве з І. Дунаеўскім, «Беларускі канцэрт», «Палеская легенда», «Гадзіннік спыніўся апоўначы»). Памёр у 1975 г.

Ф. Рудзікаў.

Незабыўныя гады

З успамінаў І. В. Гутарава

Гутараў Іван Васілевіч [2(15).4.1906, в. Воўкаўка Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні] — беларускі літаратуразнавец і фальклярыст. Член-карэспандэнт АН БССР (1953). Доктар філалагічных навук і прафесар (1949). З сялян. Выхаванец Леменскай школы-камуны. Скончыў БДУ (1928). Выкладаў у Магілёўскім палітасветным і педагагічным інстытутах (1928—1938). Удзельнік партызанскага руху на Беларусі. Працаваў загадчыкам аддзела навукі, літаратуры і мастацтва Упраўлення прапаганды і агітацыі ЦК КПБ (1947—1951), у БДУ, загадчыкам сектара фальклору (1957—1967) Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Аўтар даследаванняў па рускай і беларускай літаратуры, эстэтыцы, беларускім фальклоры, склаў хрэстаматыю «Вуснапаэтычная творчасць беларускага народа» (1959, з С. Васілёнкам), зб. «Сучасны беларускі фальклор» (1936). Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума іншымі ордэнамі і медалямі. Памёр у 1967 г., пахаваны ў сасновым бары паблізу Лемені побач з магілай Мадэста Лепяшынскага.

Мы жылі, рыхтавалі ўрокі, спалі і трымалі асабістыя рэчы ў вялікіх светлых пакоях. Апраналіся спачатку адвольна, хто як мог. Потым мелі аднолькавай формы выхадную вопратку з нейкай вельмі трывалай тканіны — «чортавай скуры». Дзяўчынкі насілі плацці простага і зручнага крою, хлопчыкі — штосьці накшталт талстоўкі з паясом і звычайныя штаны. Абутак быў самы разнастайны.

Зімою мы займаліся, як і ў звычайных школах, па ўстаноўленых праграмах, агульнапрынятых планах і раскладах. У нас былі добра абсталяваныя, паводле тых часоў, майстэрні — сталярная, слясарная, кравецкая, шавецкая, пераплётная. Праца ў гэтых майстэрнях па асабістаму выбару навучэнцаў была абавязковай для усіх. Інструктарамі ў майстэрнях працавалі штатныя спецыялісты з ліку членаў педсавета і вылучаныя з ліку выхаванцаў камуны без акладу.

У майстэрні трэба было працаваць па некалькі гадзін штодзённа або выканаць пэўнае заданне. Асабіста я любіў у слясарнай майстэрні рабіць розныя ключы і дэталі да вучэбных дапаможнікаў. Асабліва захапляўся сталярнай справай.

Карысныя працоўныя навыкі мы набывалі ў працэсе самаабслугоўвання: нарыхтоўвалі, перавозілі і пілілі дровы, палілі ў печах, мылі падлогу, чысцілі пасуду, мылі бялізну, абслугоўвалі кухню, прыбіралі ў класах, пакоях, палілі ў лазні. Улетку рабілі клумбы, садзілі і даглядалі кветкі, пасвілі жывёлу, нарыхтоўвалі для яе кармы, сеялі і жалі збажыну. Праца была часткай нашага жыцця, вучобы і стала асабістай патрэбай на ўсё жыццё.

Аднак у Лемені наша праца была школьна-спажывецкай, а не грамадска прадукцыйнай. Мы выконвалі толькі тую працу, якая патрэбна была для школы. Мы не падмянялі сабой сялян на лузе, дрывасекаў у лесе. Кожны з нас павінен быў адказваць за даручаную яму справу.

Зразумела, што галоўнае месца ў нашым жыцці займала вучоба. Стварэнню спрыяльных умоў для вучобы ў Лемені было падпарадкавана ўсё, пачынаючы ад адкрытых і закрытых пасяджэнняў педсавета, методыкі выкладання, сістэмы школьнага самакіравання і канчаючы ўнутраным распарадкам дня і дзейнасцю гігіенкома.

І. В. Гутараў.

Уставалі мы па званку, умываліся ў прышкольным возеры, незалежна ад таго — было гэта лета ці зіма, пасля снедалі і ішлі ў класы, якія былі размешчаны на сонечным баку будынка. Колькі доўжыўся ўрок — не памятаю, але ніколі не забыцца, як весела і хутка яны праходзілі. Урокі былі аднолькава актыўнымі і для настаўнікаў і для вучняў. Спачатку выкладчыкі расказвалі новы матэрыял, пасля ішлі пытанні, адказы на іх, затым хто-небудзь з вучняў паўтараў растлумачаны матэрыял і нарэшце рашаліся прыклады. Дамашнія заданні даваліся ў выключных выпадках.

Памятаю, рыхтаваліся мы даць канцэрт для жыхароў Чэрыкава. Дзяўчынак і музычныя інструменты павезлі на падводзе. Астатнія ўдзельнікі канцэрта накіраваліся ў горад напрасткі па заснежанай сцяжынцы. Па дарозе даведаліся пра велізарнае гора, якое напаткала нашу краіну: памёр Ленін. Дадому вярталіся невялікімі групкамі. Было цёмна. Працяжна шумелі высокія сосны. Самотна кугакалі совы. Святло ў нашым памяшканні ніхто не запальваў. Мы з Любанам апынуліся ў паўпадвальным пакоі, дзе складваліся музычныя інструменты. Хутка разбушавалася мяцеліца. У коміне жаласна скуголіў вецер. Любан быў задуменны: ён задумваўся над тым, як у музычных гуках перадаць усё тое, што адбываецца ў грамад-

скім жыцці, у прыродзе, у чалавечай душы. Жалобныя гадзіны, дні і тыдні праходзілі ў нейкім паўзабыцці. На чытанне ўрадавых паведамленняў сыходзіліся ціха, з апушчанымі галовамі.

Жыццё і сістэма выхавання ў школе-камуне прывучылі нас усялякае гора пераносіць моўчкі. Ды і каго паклічаш на дапамогу? Звычайна дзеці ў час небяспекі, альбо калі іх хто-небудзь пакрыўдзіць, клічуць маму. Многія з нас нават ніколі не вымаўлялі гэтае маленькае, але такое дарагое слова, бо маці нашы памерлі ад хвароб, голаду і холаду, нават не паспеўшы як след разгледзець першай усмешкі дзіцяці.

Яны вучылі нас

З успамінаў П. Ф. Ракіцкага, выхаванца, а потым настаўніка Леменскай школы-камуны

Ракіцкі Пётр Фаміч [2(15).8.1903, в. Кустоўніца Мазырскага павета Мінскай губерні] — беларускі вучоны ў галіне агульнай біялогіі, генетыкі і селекцыі, доктар біялагічных навук, акадэмік АН БССР. Сфармуляваў і эксперыментальна абгрунтаваў панящце аб полі дзеяння гена. Упершыню ў СССР пачаў даследаванні па радыяцыйнай генетыцы млекакормячых. Вывучаў узаемадзеянне паміж зменлівасцю і адборам. Распрацаваў шэраг пытанняў генетыкі колькасных прыкмет і генетычных асноў селекцыі жывёл. Памёр у 1977 г.

Калі ў думках вяртаешся ў былое, міжволі знаходзіш падзеі, якія пакінулі след на ўсё жыццё. Думаю, што ў дауніверсітэцкі перыяд для мяне вельмі важнымі былі адносіны з Лепяшынскім — спачатку ў Чэрыкаве, потым у Леменскай школе, аб якой хочацца расказаць.

У Чэрыкаў Лепяшынскія прыехалі ў пачатку 1918 г. Мадэст Мікалаевіч загадваў школай (былой гімназіяй), а Зінаіда Мікалаеўна, яго сястра, выкладала там рускую мову і літаратуру.

Каржакаваты, з сівой бародкай, вельмі стрыманы чалавек, Мадэст Мікалаевіч, калі гаварыў нават на абстрактныя тэмы, гэта выглядала неяк асабліва. У школе ён хутка заваяваў давер'е і аўтарытэт сярод настаўнікаў і вучняў. Матэматыку ён выкладаў дакладна, лагічна, цаніў у вучнях самастойнасць, асабліва пры рашэнні задач, разлічаных на кемлівасць.

Зінаіда Мікалаеўна адрознівалася ад брата экспансіўнасцю. На ўроках яе вочы гарэлі, голас звінеў, і разам з ёй загараліся мы, часам усхоплівалiся з месц. Калі ж Зінаіда Мікалаеўна пачынала чытаць сваім чаканным і чыстым голасам вершы або прозу, мы ўсе заміралі. Пазней мне даводзілася слухаць многіх цудоўных дэкламатараў — Яхантава, Закушняка, Андронікава, і, пры ўсёй павазе да іх таленту, магу смела аднесці Зінаіду Мікалаеўну да таленавітых майстроў слова. У 1918 г. я пазнаёміўся з старэйшым братам Лепяшынскіх Панцеляймонам Мікалаевічам.

У 1919 г. Мадэст Мікалаевіч звярнуўся да мясцовай улады з хадайніцтвам — даць для школы-камуны былы маёнтак Лемень, размешчаны на беразе Сожа. Пасля ўцёкаў у Польшчу памешчыка Васілеўскага ў гэтым маёнтку некаторы час гаспадарнічала банда крымінальнікаў, якія выдавалі сябе за «маракоў-анархістаў». Будынак быў двухпавярховы, уцалеў прасторны падвал, сярэдняя частка якога служыла складам, а па два бакі ад склада былі памяшканні з вокнамі. Тут можна было размясціць кухню, сталовую, а таксама спальні вучняў.

Выканаўчы камітэт дапамог грашыма і матэрыяламі, выдзеліў цес-

ляроў, печнікоў. Асноўную работу ўзяліся выканаць самі вучні. Вясковыя хлопцы, як правіла, мелі навыкі ў цяслярнай і сталярнай справе. На ўпарадкаванні школы-камуны працавалі ўсё лета. З нашага выпускнога класа Мадэст Мікалаевіч адабраў 20 найбольш фізічна моцных хлопцаў, якія першымі пасяліліся ў Лемені і пачалі абжываць, асвойваць школу.

У жніўні 1920 г. у Лемень пераехалі Мадэст Мікалаевіч, Зінаіда Мікалаеўна з сынам Колем, дачкой Ганнай і дзвюма дзяўчынкамі — Мурай і Ірай Касакоўскімі, асірацелымі пасля смерці бацькі, былога дырэктара гімназіі. Пераехаў у Лемень і Міхаіл Іванавіч Кернажыцкі з жонкай Аляксандрай Іванаўнай, выкладчык гісторыі Мікалай Данілавіч Падабед, а ў канцы жніўня пасяліліся вучні трох старэйшых класаў.

У пачатку 1921 г. у Чэрыкаве праходзіў настаўніцкі з'езд. З'езд прыняў рэзалюцыю, у якой ухваліў вопыт леменскай школы-камуны, хоць многія настаўнікі ў той час адносіліся да гэтага вопыту адмоўна, альбо, у лепшым выпадку, вельмі стрымана.

Перада мной фотакопія пасведчання, якое выдавалася выпускнікам школы-камуны. У пераліку прадметаў, акрамя звычайных — алгебры, геаметрыі, фізікі і г. д., значыліся і такія: матэматычны аналіз, гісторыя культуры (апрача ўсеагульнай гісторыі), палітэканомія, законазнаўства. У выпускным класе ў хаду былі камбінаваныя задачы, якія ўключалі адначасова матэрыял з алгебры, геаметрыі і трыганаметрыі, і мы нават спаборнічалі — хто больш зможа рашыць такіх задач. А «страшныя» дыферэнцыялы і інтэгралы здаваліся нам простымі ў выкладанні Мадэста Мікалаевіча.

Зінаіда Мікалаеўна ніякімі запісамі і канспектамі не карысталася, яе метад выкладання — суцэльная імправізацыя. Яе ўрокі літаратуры вучні любілі і лічылі самымі цікавымі.

П. Ф. Ракіцкі.

М. М. Лепяшынскі.

З. М. Лепяшынская.

Хімію ў нас выкладаў Пётр Мікалаевіч Лепяшынскі, а спевы і музыку Міхаіл Іванавіч Кернажыцкі, які ў свой час скончыў Пецярбургскую кансерваторыю. Гэта быў касцяк педагагічнага саставу школы. У Чэрыкаве было шмат настаўнікаў, аднак Мадэст Мікалаевіч падбіраў іх для Леменскай школы-камуны вельмі асцярожна, рабіў стаўку на моладзь.

Вельмі самастойнай фігурай сярод моладзі быў Мікалай Данілавіч Падабед. Ён скончыў настаўніцкі інстытут, нейкі час працаваў інспектарам. Потым выказаў жаданне выкладаць у Лемені гісторыю і геаграфію. Да вучняў Мікалай Данілавіч адносіўся па-бацькоўску цёпла, а Мадэста Мікалаевіча лічыў вышэйшым аўтарытэтам.

Выкладчыкам фізікі быў малады настаўнік Навум Ільіч Ахіезер, сын

чэрыкаўскага ўрача, які скончыў сяредняю школу на два гады раней за мяне. Вучыцца далей не паехаў, пад уплывам Лепяшынскага застаўся настаўнічаць спачатку ў Чэрыкаве, а потым у Леменскай школе. Навум Ільіч быў выдатным педагогам і абаяльным чалавекам.

У 1920 г. я не мог і падумаць, што апынуся ў складзе педагагічнага калектыву школы-камуны. Быў я тады вучнем выпускнога класа і выконваў грамадскія абавязкі — загадчыка бібліятэкай і сакратара педагагічнага савета, а дакладней, сакратара школы, вёў усю дзелавую перапіску і справаздачнасць. Вясна 1921 г. Пасля выпускнога вечара большасць маіх аднакласнікаў раз'ехаліся — хто ў Ленінград, хто ў Маскву, хто ў Кіеў — паступаць у інстытуты. Мадэст Мікалаевіч прапанаваў мне застацца ў школе выкладчыкам. Ён даверыў мне выкладанне прыродазнаўства, якое ўключала батаніку, заалогію і асновы эвалюцыйнага вучэння. Мабыць, з пункту гледжання сучасных патрабаванняў я быў пасрэдным настаўнікам. Мае веды ў біялогіі былі вельмі скромнымі, бо атрыманы яны былі толькі шляхам самаадукацыі. Але чаго не зробіць смеласць маладосці! У Леменскай школе-камуне я працаваў да лета 1923 г.

29 верасня 1922 г. Мадэста Мікалаевіча не стала. Кіраўніцтва школай прыняў Пётр Мікалаевіч. Ён разумеў, што пры ўсіх намаганнях Зінаіды Мікалаеўны, Міхаіла Іванавіча і астатніх настаўнікаў замяніць Мадэста Мікалаевіча будзе цяжка.

Прайшоў яшчэ адзін навучальны год. У пачатку жніўня 1923 г. Саша Масальскі, Міша Зубовіч і я паехалі ў Маскву.

1200 вёрст па Беларусі

З падарожнага блакнота

Сярод тых волатаў думкі і духу, якія стаялі каля вытокаў утварэння Беларускай рэспублікі і вызначэння статусу яе дзяржаўнасці, адно з першых месц, безумоўна, належыць слаўнаму сыну зямлі нашай, вядомаму дзяржаўнаму дзеячу Аляксандру Рыгоравічу Чарвякову. Ён сябраваў з многімі беларускімі пісьменнікамі, у тым ліку і з Міхасём Чаротам, які суправаджаў А. Чарвякова ў многіх паездках па рэспубліцы. Наведалі яны ў 1924 г. і Чэрыкаў.

13 чэрвеня

...Ужо надыходзіў вечар, і мне прыйшлося патарапіць Аляксандра Рыгоравіча ехаць далей...

Застанавіліся ў Прапойску. Тут спаткалі Чарвякова зусім ужо арганізавана, з чырвонымі сцягамі.

— Ня-хай жы-ве ўсе-бе-ла-рускі ста-рас-та та-ва-рыш Чар-вя-коў! — несліся па вуліцы гучныя выкрыкі камсамольцаў і піянераў, якія стаялі каля воласці ў стройных шэрагах... Начальнік міліцыі падышоў з рапартам, як гэта і водзіцца. Прыйшлося толькі пазнаёміцца са школьнай выстаўкай, дзе вучні, камсамольцы і піянеры, прымусілі разам з імі сфатаграфавацца...

Пад гучнае «ўра» шматлікай грамады мы пакінулі Прапойск.

У чырвоным бляску заходзячага сонца купаліся бярозы і сосны абапал дарогі... Здалёку пачалі паказвацца сярод зеляніны будынкі... Гэта віднеўся Чэрыкаў...

Чэрыкаў быў раней павятовым горадам, а зараз толькі воласць... Ужо агартаў змрок сваімі чорнымі скрыдламі гэты ў далёкай глушы Магілёўшчыны гарадок. Як нам мясцовыя запрапанавалі, паехалі за тры вярсты за горад, у школу-камуну.

Спачатку па дарозе з глыбокімі выбоямі, а пасля па звілістай дарозе

сярод густога сасновага лесу аўтамабіль прымчаў нас у быўшы маёнтак Лемень, дзе і змяшчалася вядомая ўсёй акрузе школа-камуна.

Школа-камуна заснавана вядомым палітычным і грамадскім дзеячам Лепяшынскім, які тут жа трагічна скончыў сваё жыццё... Яго забадаў бык, ад якога яму прыйшлося бараніць вучня.

Камунары-леменцы, як іх усе называюць,— рабоча-сялянская моладзь... Усе як адзін здаровыя, загарэлыя хлопцы... Дзяўчаты-камунаркі таксама выглядаюць бадзёра і прыгожа... Пытаем, як пайшлі ў камуну... Цікава апавядаюць, як прыйшлося ім разрываць з хатнімі, як трудна было першы год наладзіць гаспадарку і заваяваць той аўтарытэт, якім яны зараз карыстаюцца як перад савецкімі і партыйнымі ўстановамі, так і перад усім грамадствам...

— Першы год, калі пайшлі ў камуну,— апавядае камунар, вясковы хлопец,— трымалі такую-сякую сувязь з бацькамі. Прыходзілася іншы раз хлеба ды бульбы захапіць, каб хоць чым-колечы пажывіцца... Ну, а цяпер справу так паставілі, што ў вёску ехаць не трэба,— усё сваё маем... Вось ідзіце паглядзіце.

Аляксандр Рыгоравіч адправіўся з некалькімі камунарамі пазнаёміцца з фермаю, з агародамі, памяшканнем, дзе жылі камунары...

А грамада камунараў і камунарак мяне апанавала, каб я абавязкова сам пачытаў ім свае вершы...

— Мы ўжо ведаем, што вы пішаце вершы, і не выпусцім з камуны, пакуль не пачытаеце. У нас таксама ёсць шмат паэтаў. Нам цікава пазнаёміцца з беларускай паэзіяй. Мы не можам нідзе дастаць беларускай літаратуры. Толькі газету палучаем — «Савецкую Беларусь»...— І тут жа мне падалі дадатак да газеты — «Радавую Рунь», дзе быў надрукаваны мой верш.

Пасля прачытання аднаго з маіх вершаў і некалькіх слоў аб беларускай літаратуры, аб напрамку беларускай паэзіі грамада камунараў засталася надзвычайна задаволеная.

— Усё гэта знаёма нам,— казалі хлопцы і дзяўчаты,— у нас так і гавораць, у нас усе гэтыя малюнкі ў жыцці ёсць, якія гэтак паэтычна беларуская літаратура апісвае... Блізкае нам...

А пасля камунаркі папрасілі аглядзець самыя прыгожыя мясціны абшараў камуны... Мы, чалавек дзесяць, селі ў лодку і паплылі па глыбокім, наўкола заросшым дрэвамі возеры, якое знаходзілася кроках у дваццаці ад памяшкання... Не даязджаючы да берага возера, я пачуў народныя беларускія спевы. Гэта на высокім ганку камунарскага будынка камунары акружылі Аляксандра Рыгоравіча і пяялі яму беларускія песні...

Было зусім цёмна, калі мы вярталіся ў Чэрыкаў. Адзін з камунараў, бойкі, зухаваты хлопец, падсеўшы з намі пад'ехаць у горад, цікава апавядаў нам, як ён і яшчэ два камунары хадзілі пехатою ў Мінск, каб раздабыць сродкі на існаванне камуны...

Вечарам у мясцовым садзе адбыўся мітынг з выпадку прыезду ўсебеларускага старасты. Сабраўся ўвесь Чэрыкаў...

Гарачыя прамовы прывітання Чарвякову, якія гаварыліся мясцовымі працаўнікамі, камсамольцамі і піянерамі, выклікалі буру воплескаў грамады... Апошнім слова ўзяў Чарвякоў. Пры словах яго прамовы аб міжнародным становішчы, што «мы павінны заўсёды ўлічваць тыя абставіны, што на нас у любы момант можа насунуцца навальніца, і быць да гэтага гатовымі...», сапраўды загрукацеў гром... Чорныя хмары заслалі неба. Пачала раз-пораз асвечваць бліскавіца... Узняўся вецер... Дрэвы шумелі і гнуліся да

зямлі... Пачалі падаць буйныя кроплі дажджу... На гэтым мітынг прыйшлося закончыць...

14 чэрвеня

З самага рання тав. Чарвякоў пачаў абыходзіць бібліятэку, дзіцячы сад, школы і некаторыя савецкія ўстановы...

Мне прыйшлося ў сямёхгодцы прачытаць лекцыю аб беларускай літаратуры і пазнаёміць з некаторымі беларускімі творамі прыгожага пісьменства. Апрача вучняў і настаўнікаў на лекцыю прыйшлі і камунары-леменцы, якія раней прасілі ў іх чытаць гэту лекцыю. У школе адбываліся зачоты. Пасля лекцыі паслухаць, як вучні здаюць зачоты, быў запрошаны тав. Чарвякоў...

Пачуўся гудок аўтамабіля. Гэта шафёр Васільеў напамінаў, што пара ехаць далей, каб я паклікаў Аляксандра Рыгоравіча.

Стройныя шэрагі... камсамольцаў і піянераў, вучні і настаўнікі праводзілі нас гучным «ура!». Дзве дзяўчынкі-камунаркі падалі ў аўтамабіль два букеты кветак. На чырвоных стужках, якімі былі перавязаны кветкі, было напісана: «Усебеларускаму старасту тав. Чарвякову ад леменцаў!!». Мы паехалі далей.

Міхась Чарот.

Друкуецца па кн.: Чарвякоў А. Р. ...Я ніколі не быў ворагам. Мн., 1992. С. 168—170.

За годам — год

З успамінаў Л. І. Валюжэніча, былога дырэктара 2-й Чэрыкаўскай школы

Яшчэ да першай сусветнай вайны працаваў я настаўнікам пачатковых школ у Чэрыкаўскім павеце. З 1923 па 1934 — у сярэдняй школе Чэрыкава. У гэты час я меў шчасце сустракацца з многімі цікавымі людзьмі: Майсеем Эртманам, Пракопам Рабцавым, Грыгор'евым, Кацярынай Васілеўнай Грыгор'евай, якая вучылася разам з М. І. Ульянавай, была ў эміграцыі ў Парыжы, Жэневе, дзе сустракалася з У. І. Леніным, Г. В. Пляханавым.

Ніколі не забуду першых будаўнікоў савецкай улады ў Чэрыкаўскім павеце — сакратара павятовага камітэта партыі Максіменку, старшынь павятовага выканкама Князева, Сліўкіна, Лоцманава, загадчыкаў аддзелаў Лукашова, Нікалаева, Стапалянскага, ваеннага камісара Лявонава. Гады сцёрлі з памяці імёны іншых слаўных змагароў за пабудову новага жыцця ў прысожскім краі.

Нарадзіўся я ў в. Глупікі Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Сям'я наша складалася з 9 чалавек. Бацька — сляпы, непісьменны, маці непісьменная простая сялянка. Шэсць братоў і адна сястра. Апрача мяне і малодшага брата, у школе ніхто не вучыўся. Да новага ўраджаю сям'і ніколі не хапала хлеба, і я з бацькам звычайна хадзіў да багатага суседа пазычаць яго.

Пачатковую школу я скончыў паспяхова і па парадзе настаўніка А. Р. Шавала паступіў у царкоўна-настаўніцкую школу ў Крычаве. У 1905 г. скончыў школу з правам выкладання граматы ў школах. Год давялося працаваць па найму ад грамады за сорак рублёў, на другі год стала крыху лепш. Аднак я разумеў, што толькі набыўшы настаўніцкую кваліфікацыю і больш глыбокія веды, змагу атрымаць права на выкладанне ў пачатковай школе. Набыў падручнікі і пачаў рыхтавацца да экзаменаў. Вясной 1909 г. паспяхова вытрымаў экзамены пры чэрыкаўскім гарадскім вучылішчы. Тут пры прыходскай школе праходзіў месячную практыку. У канцы таго ж года быў прызначаны загадчыкам

народнай школы в. Савінічы цяперашняга Клімавіцкага раёна.

Пачалася першая сусветная вайна. У ліку многіх настаўнікаў быў прызваны ў армію і накіраваны на фронт. У разгар грамадзянскай вайны пайшоў у Чырвоную Армію, дзе знаходзіўся да 1922 г.

Дэмабілізаваўшыся з радоў Чырвонай Арміі, я закончыў вучобу ў інстытуце. У 1923 г. быў прызначаны настаўнікам Леменскай доследна-паказальнай школы-камуны другой ступені імя У. І. Леніна. Школа-камуна аб'ядноўвала ў адзін спаяны дружбай калектыў хлапчукоў і дзяўчынак камунараў, педагогаў і іх сем'і.

Работа ў школе-камуне дала мне многае. У верасні 1924 г. мяне прызначылі дырэктарам 2-й Чэрыкаўскай сямігадовай школы. І я змог выкарыстаць набыты вопыт у арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Сямігодка размяшчалася ў трох невялікіх будынках. Настаўнікі жылі на прыватных кватэрах. Пачатковыя класы камплектаваліся дзецьмі гарадскога насельніцтва. У V—VII класы прымалі таксама выпускнікоў вясковых школ першай ступені.

Мясцовыя органы ўлады жыва ўнікалі ў школьнае жыццё. Да пачатку новага навучальнага года было адрамантавана паўразбуранае двухпавярховае памяшканне ў цэнтры горада. Неўзабаве школе прысвоілі імя Цішкі Гартнага.

Вядома, былі ў нас і цяжкасці. У бібліятэцы мала было кніг, не хапала падручнікаў, дапаможнікаў, прыбораў і рэактываў. Мала было выкладчыкаў з вышэйшай адукацыяй.

Коратка аб культурным жыцці тагачаснага Чэрыкава. Прафесійныя артысты ў тыя гады не наведвалі глыбінныя раёны. Але аматары сцэны арганізоўвалі канцэрты. Працаваў у школе таленавіты выкладчык малявання І. В. Грушэўскі. Дзякуючы яго старанням, у школе развіўся талент многіх юных мастакоў. Дакладна не памятаю, у якім годзе ў Ленінградзе была арганізавана Усесаюзная выстаўка дзіцячай мастацкай творчасці. 2-я сямігодка г. Чэрыкава на гэту выстаўку накіравала некалькі партрэтаў, пейзажаў, жанравых малюнкаў, падрыхтаваных нашымі юнымі мастакамі. Экспанаты былі заўважаны. Здольнага юнака Ліберфарба тады ж выклікалі ў Маскву і ўладкавалі ў мастацкае вучылішча.

Л. І. Валюжэніч.

З павагай і шчырым захапленнем успамінаю свайго даўняга таварыша па працы К. В. Гатальскага. Працавалі разам у Леменскай школе-камуне. Пасля Гатальскі аж да самай смерці працаваў у чэрыкаўскіх школах. Гэта быў сапраўдны энтузіяст эстэтычнага выхавання моладзі.

Школьныя справы не засланілі сабой пераўтварэнні, што адбываліся ў эканамічным жыцці. Давялося мне і маім таварышам прымаць непасрэдны ўдзел у калектывізацыі. Неяк павятовы камітэт партыі атрымаў паведамленне, што ў Вепрынскім калгасе пачалося самавольнае расцягванне маёмасці. Стварылі камісію з ліку работнікаў павятовага камітэта партыі і выканаўчага камітэта, актывістаў — усяго 21 чалавек. У Вепрыне сабралі людзей па ўчастках і разам з членамі валаснога савета пацікавіліся, чаму пачалося разбазарванне абагуленага зерня.

Аказалася, што завадатарамі сталі не калгаснікі, а людзі, прагныя да нажывы. Разабраліся. Дзякуючы праведзенай растлумачальнай рабоце першы ў раёне калгас працягваў жыць і набіраць сілы.

Сямігодка імя Цішкі Гартнага

Каму не вядома сёння імя Цішкі Гартнага? Цішка Гартны — Зміцер Фёдаравіч Жылуновіч — выдатны дзяржаўны і грамадскі дзеяч, старшыня першага Часовага ўрада Беларусі, акадэмік АН БССР, вядомы пісьменнік. Адзін з тых, хто стаў на Беларусі ахвяраю сталіншчыны, спачатку на Першым Усебеларускім з'ездзе Саветаў у 1918 г., затым у 1931 г.— «За свядомае правядзенне нацыянал-апартуністычнай і нацыянал-дэмакратычнай лініі, за ўдзел у антыпартыйных групоўках КП(б)Б, за сувязь з чужымі і варожымі справе пралетарыяту нацдэмаўскімі і фашысцкімі элементамі і як з'яўляючыся рупарам варожых сіл, якога выкарыстоўвала ў сваіх мэтах нацдэмаўская контррэвалюцыя ў барацьбе з дыктатурай пралетарыяту» быў выключаны з радоў партыі, і, нарэшце, у 1936 г. быў арыштаваны. Пасля жорсткіх катаванняў і допытаў Цішка Гартны захварэў і трапіў у славутую на той час Магілёўскую спецпсіхбальніцу, у адной з палат якой памёр 11 красавіка 1937 г. І толькі зусім нядаўна ён быў рэабілітаваны.

Цікавы факт біяграфіі Ц. Гартнага звязаны з наведваннем ім горада па-над Сожам. У 20-я гады Цішка Гартны вельмі многае зрабіў для папулярызацыі гісторыі і асабліва рэвалюцыйнага руху Беларусі, станаўлення нацыянальнай школы, адраджэння традыцый і мовы беларускага народа. Мусіць, справы беларусізацыі і прывялі Цішку Гартнага ў Чэрыкаў у 1926 г.

Вось як апісваў Ц. Бусел наведванне Гартным Чэрыкаўскай школы-сямігодкі. Цішка Гартны «абыходзіў усе класы і рабіў пытанні на беларускай мове. Ён так спадабаўся вучням, што ўсе яны глядзелі проста яму ў вочы і рабілі часта добры адказ на яго пытанне». Беларускі пісьменнік і член ЦВК рэспублікі пакінуў у школьнай кніжцы такі запіс: «Быў у другой сямігодцы — зрабіла добрае ўражанне з боку выгляду і знаёмства дзяцей з беларускай мовай. Асабліва вынес прыемнае ўражанне ад нулявой групы. Пераконваюся лішні раз, што асвета будзе ў шмат разоў пладавіцей, калі цалкам пяройдзе на беларускую мову. Добрае ўражанне ад загадчыка т. Дзем'янюка і часткі настаўнікаў».

У школе некалькі дзён прыгадвалі прыезд цікавага госця, а потым узнікла думка — надаць сямігодцы імя Цішкі Гартнага. З вышыні сённяшняга дня гэта прапанова бачыцца нейкай дзівацкай. Але на той час было модным надаваць заводам, шахтам, навучальным установам, калгасам імёны вядомых жывых сучаснікаў.

У сямігодцы адбыўся агульны сход, на якім была прынята пастанова наступнага зместу: «Дзякуючы таму, што 2-я Чэрыкаўская школа-сямігодка з'яўляецца па свайму складу чыста пралетарскай школай, дзе вучацца выключна дзеці сялян, гарадской беднаты і савецкіх працаўнікоў і школа вядзе працу ў пралетарскім напрамку, выконвае ўказанні правадыроў рэвалюцыі і партыі, а Цішка Гартны з'яўляецца першым пралетарскім паэтам і працаўніком па будаўніцтву Беларусі — калектыў школы просіць РАНА паклапаціцца перад уладай аб прысваенні школе імя Цішкі Гартнага і назваць яе: Чэрыкаўская школа-сямігодка імя Цішкі Гартнага».

Пасля таго як мясцовыя ўлады далі згоду на перайменаванне школы, настаўнікі і вучні адправілі тэлеграму Гартнаму. Было гэта 31 снежня.

«У час шостай гадавіны існавання БССР 2-я Чэрыкаўская сямігодка просіць вашай згоды аб перайменаванні школы ў імя першага старшыні рабоча-сялянскага ўрада БССР — першага пралетарскага паэта Цішкі Гартнага. Вучні школы — выключна незаможныя сяляне Беларусі — запэўніваюць, што панясуць Вашы пралетарскія матывы ў вёску, каб давесці яе цераз нацыянальнае пытанне да камунізму».

Адказу доўга чакаць не давялося. «Шчыра дзякую за ўспамін. Даю згоду. Цішка».

Праўда, сямігодцы нядоўга давялося насіць імя гэтага чалавека.

М. Карпечанка.

Вёска майго дзяцінства

Успаміны І. М. Старавойтава, ураджэнца в. Горкі*

Вёска Горкі знаходзіцца за 15 кіламетраў на поўнач ад Чэрыкава. Назва, мабыць, звязана з тым, што яна размешчана на гарах. Па паўночна-ўсходняй і паўднёвай межах працякае неглыбокая рэчка Волчас. У яе ўпадае крынічны прыток, які цячэ ўздоўж вёскі. Некалі вельмі даўно ў вёсцы было каля 20 двароў, вакол лясы ды балоты.

Пасля рэвалюцыі асноўная частка вёскі — 55 двароў — размяшчалася ўздоўж гары, каля падножжа якой і працякаў прыток. На процілеглай гары было 16 двароў. Гэту частку вёскі называлі Кавалёўка. У баку ад дарогі таксама на гары знаходзілася 9 двароў. Там жа была і прыходская царква. Вёска налічвала 320—360 жыхароў, у сем'ях было ад 3 да 7 чалавек.

Большасць гаспадароў — 53 — мелі па 9—10 гектараў зямлі, восем — па 7—8 гектараў, дванаццаць — па 5, пяць — па 12—15 гектараў і дзве сям'і зямлі не мелі.

У нашай вёсцы пераважала пясчана-гліністая глеба, у асноўным ралля з невялікімі лугамі. Прырэчныя лугі належалі памешчыкам, на іх дазвалялася пасвіць жывёлу вясной да Юр'ева дня і пасля сенакосу.

Асноўным заняткам сялян было земляробства. Сеялі ў асноўным жыта. Яравы палетак складалі ячмень, авёс, грэчка і бульба. Вакол двароў сеялі каноплі. Пянька ішла ў асноўным на гаспадарчыя патрэбы, частку яе прадавалі. З зерня атрымлівалі смачны канапляны алей, макухай кармілі цялят. Пад каноплі адводзілі лепшыя ўчасткі і штогод уносілі арганічныя ўгнаенні. Лён таксама засявалі на лепшых землях. Паравы клін служыў выпасам для жывёлы да Пятрова дня, а затым яго ўзорвалі пад азімыя.

Звычайна кармоў для жывёлы не хапала. Вясной можна было бачыць нямала худых кароў. Пасля рэвалюцыі лугі памешчыка перайшлі ў карыстанне жыхароў вёскі. Акрамя гэтага, каля Сожа былі адведзены сенажаці, якімі карысталіся сумесна. Сена дзялілі па жэрабю, складвалі яго ў аднолькавыя копы. Сельскагаспадарчыя работы выконваліся ўручную. Плугі і бароны, косы і сярпы, цапы і вілы — вось прылады вытворчасці. Старанная апрацоўка палёў, своечасовыя сяўба і ўборка ўраджаю, яго захаванне і эканомнае расходаванне дазвалялі жыхарам вёскі зводзіць канцы з канцамі. У вёсцы не было бяздомных жабракоў і галадаючых. У асноўным былі сярэднія сялянскія гаспадаркі. Крыху багацей жылі толькі пяць двароў.

Хаты з надворнымі будынкамі былі двух відаў. У большасці двары былі закрытыя. Хата да 30—40 квадратных метраў з сенцамі і свірнам,

* Гл. артыкул «Родам з Чэрыкаўшчыны».

з навесам і склепам, хлявамі для жывёлы складалі закрыты двор з варотамі і форткай. Адкрытыя двары адрозніваліся хлявамі для жывёлы і другімі пабудовамі меншых памераў. Размяшчаліся яны па адной лініі. З другога боку двара рабілі дашчаты плот.

У кожным двары мелася гумно. Гумны былі розныя па памерах. Там складвалі салому, сена. Гумны абсталёўвалі сушылкамі з дрывяным ацяпленнем і токам для малацьбы. Сушыльныя печы размяшчаліся на вялікай глыбіні, каб не загараліся снапы.

Звычайна хата ад хаты знаходзілі ся на невялікай адлегласці, таму пажары часта знішчалі іх. Так, у 1912 г. згарэла больш чым 25 дамоў, амаль столькі ж у 1918 г. Пры пажарах званілі званы ў царкве і людзі спяшаліся на тушэнне пажараў. Патрабавалася, каб у кожным двары была бочка з вадой, бусак і рыдлёўка. Але гэта, наколькі мне памятаецца, не выконвалася. Ваду пры пажарах бралі з прытока, бо ў калодзежах не хапала.

Існаваў парадак начной аховы вёскі. На высокім шасце была прымацавана дошчачка з надпісам «начны вартаўнік». Каля чыйго дома стаіць шост, той і павінен вартаваць. Здаралася, шост за дзень «абыходзіў» усю вёску, але ніхто так і не выходзіў на варту.

Нядзеля лічылася святам, многія хадзілі ў царкву, не працавалі. Але ў час уборкі ўраджаю ці сенакосу працавалі. Выключэннем быў Ільін дзень. Лічылася, што ў гэты дзень не мінуць навальніцы, пажару ці іншай бяды. Асаблівым святам быў вялікдзень. Звечара варылі смачную ежу, пяклі пасху, фарбавалі яйкі. Усё гэта свяцілі ў царкве. Раніцай вярталіся з царквы і разгаўляліся. Перад вечарам каля царквы пачыналася гульня «пракатванне яек» па дошцы. Калі яйка не падала ў ляжачае на лужку, яно заставалася на карысць арганізатараў гульні. Было цікава сачыць за гульнёй. Святочна адзначаліся каляды. На свята Пятра і Паўла каля царквы праводзіўся кірмаш. З Чэрыкава і Крычава прывозілі дзіцячыя цацкі, ласункі. А часам можна было купіць і недабраякасныя пернікі. Тады настрой псаваўся. Звычайна ігралі на гармоніку, дарослыя танцавалі. Назаўтра моладзь і некаторыя дарослыя адпраўляліся ў «Бразкун»: каля вёскі Юдаўка мелася капліца. У гэты дзень там было набажэнства і асвячэнне вады*. Ваду бралі толькі дарослыя. На Юр'еў дзень пастухам выносілі булку хлеба, міску масла, сыр. Прычым усё гэта гаспадыні выносілі раніцай, калі выганялі кароў на пашу. Іншыя святы таксама адзначаліся, але не так шырока.

Да рэвалюцыі амаль усе жыхары вёскі старэйшага пакалення былі непісьменнымі, не ўмелі нават распісацца. Чытаць і пісаць вучыліся толькі ў арміі ці працуючы ў горадзе. Макар Пухоўскі ў час службы ў царскай арміі іграў на скрыпцы. Іграў, калі вярнуўся ў вёску. Яго сын Якаў вывучыўся іграць на гармоніку, другі сын стаў барабаншчыкам. Склаўся сямейны аркестр. Ігралі ў асноўным на вяселлях.

З арганізацыяй у вёсках царкоўнапрыходскіх і земскіх школ усе дзеці з сямігадовага ўзросту пачыналі вучыцца. Многія мае вяскоўцы паступілі вучыцца ў Чэрыкаўскую адзіную працоўную школу. Не забыць нашых дарагіх настаўнікаў, якія прыклалі шмат намаганняў для нашага грамадзянскага станаўлення. Так, настаўніца Марыя Аляксандраўна Кожачкіна з Магілёва адначасова праводзіла ўрокі ў чатырох класах. Адны пісалі, другія рашалі задачы, трэція малявалі, чацвёртыя

* Гл. артыкул «Легенда і праўда аб Наркоўскай крыніцы».

адказвалі каля дошкі. Марыя Аляксандраўна прывівала нам любоў да прыроды, павагу да людзей, чэснасць і праўдзівасць. Да гэтай пары памятаю «Барадзіно», апавяданні «Пятачок загубіў», «Не хлусі», «Як замярзаў селянін Арэф'еў». Выпускныя экзамены аб заканчэнні пачатковай Горкаўскай школы праходзілі ў святочных абставінах. Адначасова іх трымалі вучні чатырох класаў. Настаўнікі задавалі самыя разнастайныя пытанні. Старшынёй камісіі быў генерал, земскі начальнік.

За навучанне дзяцей у школе бацькі давалі настаўнікам бульбу, муку, тлушч і іншыя прадукты харчавання. Настаўнікі рыхтавалі дзяцей да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. З нашай невялікай вёскі выйшлі 9 урачоў, 4 юрысты, 2 інжынеры, 2 палкоўнікі, педагог, аграном, эканаміст, фармаколаг. Мы ўдзячны Пятру Канстанцінавічу Янкоўскаму, Цярэнцію Харытонавічу Дзем'янюку, Яфіму Саламонавічу Аўрусіну, Ілыі Сцяпанавічу Нявінскаму, Рыгору Паўлавічу Гатальскаму. Пад кіраўніцтвам Р. П. Гатальскага быў створаны школьны хор. Песні, якія мы пелі, запамяталіся на ўсё жыццё.

Вялікай падзеяй у вёсцы быў прыезд страхавога інспектара, які прымаў страхоўку за пабудовы і вечарамі праводзіў гутаркі з вяскоўцамі. Звычайна гэтыя гутаркі прысвячаліся сельскай гаспадарцы. Напрыклад, калі і як сеяць агуркі, грэчку і інш.

Да рэвалюцыі пры воласці ў Камаровічах быў фельчарскі пункт. Але туды сяляне звярталіся рэдка. Часцей першую дапамогу аказвалі бабкі. Роды прымала бабка Ефрасіння, за што ёй давалі палатно, грошы. Здаралася, што парадзіхі і паміралі. Бабка Фацім'я лячыла хворых травамі пры захворванні сэрца і суставаў. Пры страўнікава-кішэчных расстройствах у дзяцей парады давала бабка Антаніна. Загаворамі ад розных хваробаў лячыў дзед Васіль, прычым даваў піць ваду, ім загаворваную. Асабліва верылі яго слову пры ўкусах людзей і хатніх жывёл драпежнікамі. Была адна ўмова — звяртацца да дзеда Васіля не пазней заходу сонца пасля ўкусу.

Дзеці ў нашай вёсцы, як і ў іншых, часта хварэлі адром, воспай, каростай, сыпным тыфам. Часам і паміралі ад гэтых хвароб. Дарослыя часцей хварэлі запаленнем лёгкіх. Самым аўтарытэтным медыкам у Чэрыкаўскай бальніцы (па даступнасці) лічыўся фельчар Іоселеў. Ён ахвотна прыязджаў да хворых, лячыў банькамі, націраннямі. Летам рабіў супрацьвоспенныя прышчэпкі. За гэта яму давалі яйкі. У 1918 г. амаль усе жыхары вёскі захварэлі сыпным тыфам. Хворыя заставаліся ў хатніх умовах. Фельчар з Чэрыкава Пастрэвіч наведвала хворых, чым магла лячыла. Але праз некаторы час заразілася і памерла. Тады памерла звыш 15 жыхароў вёскі. Медпункт у нашай вёсцы быў арганізаваны ў 1927 г.

Да рэвалюцыі ў вёсцы была прыватная лаўка Захара Меера. Там прадавалася соль, газа, мыла, запалкі, тытунь і асобныя віды мануфактурных вырабаў. Часта прадавалася піва. За іншымі таварамі ездзілі ў Чэрыкаў. У насельніцтва скуплялася пянька, збожжа. Другую лаўку трымаў Сцяпан Батура. Закупку ў насельніцтва ён не рабіў. Тут можна было купіць усё тое, што і ў лаўцы Меера. Ды яшчэ чай з пернікамі. У гэтай лаўцы іграў патэфон. Памятаю, ігралі пласцінку «Ухарь купец — удалой молодец».

Пасля рэвалюцыі было арганізавана Горкаўскае спажывецкае таварыства. Яно аб'яднала ўсіх жадаючых, незалежна ад месца жыхарства. Пайшчыкамі сталі жыхары многіх вёсак. Уступны ўзнос быў 5 рублёў. Выбралі праўленне таварыства з ліку аўтарытэтных сялян, а

таксама назіральны савет. Спачатку таварыства займалася толькі гандлем. Тавары закуплялі ў горадзе і рэалізоўвалі іх пайшчыкам. Цэны ўстанаўлівала праўленне таварыства з улікам арганізацыйных выдаткаў. Цвёрдыя цэны вызначаліся дзяржаўным каталогам на соль, запалкі, газу, тытунь, мыла.

Значны прыбытак быў ад продажу нітак, іголак, мануфактуры. У насельніцтва скуплівалі асабліва шмат зерня, пянькі і бульбы. Зерне здавалі дзяржаве. Пазней была арганізавана маслабойня, дзе пераапрацоўвалі каноплі ў алей і макуху. У простых умовах адзін майстар спраўляўся з гэтай няхітрай вытворчасцю. Была спроба арганізацыі цагельнага завода. Аднак гліна аказалася непрыгоднай для абпалу цэглы.

Праўленне таварыства ў складзе 7 чалавек выбіралася на сходзе пайшчыкаў адкрытым галасаваннем. Старшынёй стаў Макар Сяргеевіч Маслакоў, які скончыў рамеснае вучылішча. Платнай была толькі пасада старшыні, бухгалтара, яго памочніка і загадчыка гандлёвай лаўкай. Астатнія члены праўлення працавалі на грамадскіх пачатках. Праўленне таварыства трымала справаздачу перад павятовым таварыствам. У 1924 г. Маслакоў паступіў ва універсітэт.

У нашай вёсцы шмат было майстравых людзей, якія выконвалі розныя работы за ўмераную плату. Майстрам кавальскіх работ быў Якаў Архіпавіч Цыпікін. Ён меў кузню, тачыў сярпы, падкоўваў коней і выконваў розныя дробныя заказы.

Васіль Карпавіч Казлоў рабіў аконныя рамы і колы для вазоў. Сяляне-цесляры будавалі дамы, прычым часта талакой. Паблізу быў млын. Там малолі зерне, абдзіралі пшаніцу, ячмень і грэчку. Кравец Васіль Базылёў шыў кажухі, армякі, часцей за ўсё ў хаце заказчыка. Днём яго кармілі там, дзе ён працаваў, на ноч хадзіў дадому. Маці расказвала, што ён браў вучняў. Але на працягу трох гадоў не паказваў ім сакрэтаў кравецкага майстэрства. Толькі пасля трох гадоў работы вучань мог стаць майстрам. Звычайна ніхто не вытрымліваў такога тэрміну.

У невялікай нашай вёсцы меўся староста з мясцовых сялян, які, здаралася, не ўмеў ні чытаць, ні пісаць. Я застаўся за гаспадара ў 1914 г., меў пачатковую адукацыю. Стаў дапамагаць чытаць паперы, якія атрымлівалі з воласці, рэгулярна наведваў сходкі. Усе гаспадарчыя пытанні вырашаліся на сходках — наём пастухоў, вартаўнікоў палёў і многае іншае. Прымаліся рашэнні без галасавання, але пры агульнай згодзе. Пратаколы не вяліся, толькі пісьмовыя адказы і спісы староста засведчваў крыжыкам. Сходкі і староста былі абмежаваны ў паўнамоцтвах, бо атрымлівалі распараджэнні з воласці — Камаровіч.

З пачаткам першай імперыялістычнай вайны прыціхла вёска. Не стала чуваць песень і танцаў. А ў хуткім часе салдаткі пачалі атрымліваць паведамленні аб прапаўшых без вестак, аб загінуўшых. Клопаты аб сям'і ляглі на плечы жанчын. Пачаліся цяжкасці з купляй неабходных тавараў. Ездзілі ў Рослаўль, каб набыць соль. Соль выменьвалі на прадукты харчавання. Не хапала мыла. Бялізну мылі ў шчолаку.

Па прыгавору магілёўскага генерал-губернатара двое сялян з вёскі Горкі Васіль Карпавіч Казлоў і Сяргей Яўменавіч Маслакоў былі высланы на вольнае пасяленне ў Краснаярскі край на тры гады. Іх западозрылі ў сувязі з рэвалюцыянерамі. Мабыць, высачылі перасылку лістовак. Жонка Маслакова падавала прашэнне аб адмене высылкі, бо на руках у яе заставалася шасцёра дзяцей. На прашэнні была рэзалюцыя:

адмовіць. Гэтыя людзі адбылі тэрмін і вярнуліся дадому.

Цень Чарнобыля знішчыла вёску Горкі, маю радзіму, мой любы кут. Але яна ў маёй памяці назаўсёды.

Легенда і праўда аб Наркоўскай крыніцы

Пагалос людскі даносіць, што на скрыжаванні сцяжынак, толькі прыкметных зверу і рэдкаму чалавеку, з-пад зямлі ўдарыў некалі ключ сілы моцнай. Пенна-белы струмень вады з шумам узняўся высока ў неба, а перазвон каменьчыкаў разнёсся вёрст на шэсць. Старыя і малыя збягаліся на грукат вады, хрысціліся ў страху, баючыся падступіцца да ключа, бласлаўляючы святога Паўла, які ў свой дзень паслаў людзям цуд зямны.

Так з'явілася на Чэрыкаўшчыне свята Бразкуна, накладзенае на дзень Паўла, па сугучнасці супадаючае з шумлівым гаманком вады сцюдзёнай. Набожныя наркоўцы, хаты якіх часцяком успыхвалі ад пажараў, зрабілі зруб, паставілі крыж драўляны. Вада супакоілася ў акуратным зрубе з невялікім адтокам. Людзі абвешалі крыж ручнікамі. З'явілася ў іх надзея, што не будзе няшчасцяў. На другі год зрабілі адпраўленне крыніцы па ўсіх хрысціянскіх звычаях. Яшчэ праз лета мужыкі побач са студняй зладзілі капліцу. Бабы прынеслі іконы, ручнікі. Мясцовая царква падарыла падсвечнікі, лампадку.

Па паданні, з усіх куткоў навакольных пацягнуліся да крыніцы людзі нямоглыя, якія пакутавалі ад цяжкіх хвароб. Шукалі і знаходзілі збаўленне ад болю.

Калі ішло пагалоўнае ачышчэнне ад рэлігійных перажыткаў, было загадана трактарысту Лістраценку згарнуць крыніцу. Аднак бульдозер ён падагнаў не да зруба, а пад вокны праўлення калгаса.

Крыніцу ўсё ж прыдушылі вялізным валуном, карэнішчамі старых соснаў, рэшткамі разбуранай, разрабаванай капліцы. Але, бы па той біблейскай легендзе, праз дзень бураломy як і не было. Крынічка была акапана нечай клапатлівай рукой і, як ні ў чым не бывала, стаяў ля вады крыж. Вада цягнула да сябе як і раней чысцінёй і прахалодай.

Складана ўстанавіць, колькі разоў сталёвая рыдлёўка згортвала, спірала дыханне ключа і колькі разоў нечая добрая душа выслабаняла яго да жыцця. Як і тое, якімі праўдамі і няпраўдамі хавалі наркоўцы вялікую ікону з лікамі святых Пятра і Паўла. Нават у вайну ўратавалі.

Цяпер крыніца набыла спрадвечны выгляд. Пастараўся той жа самы Іван Макаравіч Лістраценка. Разам з вяскоўцамі пачысціў ключ, папраўіў зруб, узяў пад «серабранку» крыжы і драўляную імправізаваную сцяну.

Нарэшце свята Пятра і Паўла вылілася ў сапраўднае народнае свята. Ішлі і ехалі сюды людзі — са слоікамі, збанкамі, бутэлькамі. Да вады са святой крыніцы. Усім можна было прайсці пад гістарычнай вясковай іконай, што з'яўлялася знакам здароўя і спакою. А потым лікі святых Пятра і Паўла паплылі ў людскім натоўпе ў Наркі. Па традыцыі ікона захоўваецца да наступнага лета ў адной з вясковых хат. Сёлета (1992 г.— **рэд.**) яна у чырвоным куце святліцы Кацярыны Фядосаўны Райкінай. Як выказалася жанчына, будзе яна прыглядаць за іконай і за крыніцай. Каб жыла цуд-вада, давала моцы і целу і духу.

А. Хныкава.

Работнікі Чэрыкаўскага павятовага камітэта камсамола (злева направа): у першым радзе — Крывялёва, Хутарэцкі, Іофе; у другім радзе — Любан, Лявіціна. 1922 г.

З гісторыі камсамольскага руху

У сярэдзіне 1919 г. невялікая група моладзі з энтузіязмам узялася за арганізацыю ў Чэрыкаве ячэйкі Камуністычнага Саюза Моладзі. Спачатку ў яе ўваходзіла шэсць чалавек — Касакоўскі, Любан, Фрыдберг, Лявіцін, Ніна Хутарэцкая і Мацвей Хутарэцкі. 10 жніўня 1919 г. адбыўся першы сход павятовай моладзі, на якім прысутнічала 10 юнакоў. Сход адзінагалосна вырашыў стварыць павятовую ячэйку Камуністычнага Саюза Моладзі. У першую ж суботу ячэйка прыняла ўдзел у камуністычным суботніку, заявіўшы грамадскасці аб сваім існаванні. Першым сакратаром камсамольскай ячэйкі быў выбраны адзін з былых актыўных камсамольцаў малады камуніст Мацвей Хутарэцкі.

У 1920 г. у Чэрыкаўскім павеце дзейнічалі камсамольскія арганізацыі: Чэрыкаўская гарадская, Крычаўская, Краснапольская, Маляціцкая, Тур'еўская, Сакольніцкая, Хацілаўская, Ржавецкая. Маладыя людзі ўступалі ў камсамол часам насуперак волі бацькоў. Рыгора Фельдмана, напрыклад, бацька пабіў так, што юнак страціў слых, але ў камсамол уступіў. Усім сэрцам успрымала моладзь праўду камуністаў, жыла дружна, цікава. Вялікіх хат у Чэрыкаве на той час не было. Спачатку камсамольцам даводзілася туліцца ў адным пакоі за кошт пацяснення гаспадароў. Пазней дом багацея Махавера быў ператвораны ў клуб. Збіраліся па вечарах, пры газавай лямпе. Маладыя людзі былі малаадукаванымі, але з настойлівасцю працавалі над сабой, чыталі, вучыліся, набіраліся вопыту. Шукалі, памыляліся, спрачаліся.

Паступова камсамольскія ячэйкі ўзніклі ў Камаровічах, Зорах, Нарках і іншых. Для аказання практычнай дапамогі ў вёскі былі накіраваны камсамольцы з Чэрыкава і Крычава. У ліку іх Любан, Лявіцін, Крывялёва, Іофе і іншыя. Узнікла неабходнасць больш планамернага і арганізаванага кіраўніцтва камсамольскім рухам. Было вырашана склікаць павятовую канферэнцыю і стварыць павятовы камітэт камсамола.

Канферэнцыя адбылася зімой 1921 г. На ёй прысутнічалі прадстаўнікі шасці камсамольскіх арганізацый. Быў створаны павятовы камітэт камсамола, сакратаром выбралі Хутарэцкага.

У ліку першых мерапрыемстваў павятовага камітэта было выданне камсамольскай газеты. Выйшла ўсяго некалькі нумароў яе з вялікім інтэрвалам, бо было цяжка з паперай і паліграфічнымі матэрыяламі. Занялася камсамолія і работай сярод дзяўчат і жанчын. Гэту справу даручылі Ніне Хутарэцкай. Была створана сетка дэлегацкіх сходаў (дэлегацкія сходы ў той час былі формай арганізацыі жанчын). Іх задачай было весці растлумачальную работу сярод жанчын і моладзі, накіраваную на ўкараненне новых элементаў быту, стварэнне дзіцячых устаноў, антырэлігійнае выхаванне, удзел жанчын у камітэтах беднаты, сельсаветах. Праводзілася работа па павышэнню палітычнага ўзроўню камсамольцаў, прыцягненню іх да ўдзелу ў агульнапартыйных і агульнадзяржаўных справах. Многія камсамольцы ехалі ў вёску для правядзення мерапрыемстваў па харчпадатку. Рабочая моладзь шукала адказы на злабадзённыя пытанні. Яна хацела зразумець сэнс гістарычных падзей.

Вялікі размах у той час атрымала мастацкая самадзейнасць, якую ўзначальвала камсамольская ячэйка. Вось што піша камсамолка 20-х гадоў Ф. Р. Каданэр: «Чэрыкаў — мая радзіма. Тут я нарадзілася, расла, вучылася і ў 1924 г. закончыла школу-камуну. Цікавым было маё жыццё ў юнацкія гады. Была камсамолкай, удзельнічала ў мастацкай самадзейнасці ў «Сіняй блузе». Так называўся калектыў самадзейных артыстаў. У час выступленняў мы апраналіся ў форму — сінюю талстоўку і сінюю спадніцу і шаравары. Як правіла, выступленні пачыналіся з агітмантажа.

М. А. Венгераў — адзін з першых камсамольцаў в. Наркі.

Ф. Р. Каданэр.

З нумарамі мастацкай самадзейнасці мы выязджалі ў Быхаў, Гомель, Краснаполле.»

З архіўных дакументаў бачны ініцыятыўныя дзеянні камсамольскай ячэйкі Чэрыкава. Так, камсамольцу рабочаму-малатабойцу Лявіціну было даручана абслугоўваць гужавы транспарт, Паўлючэнка займаўся нарыхтоўкай дроў для мясцовых устаноў. Ніна Хутарэцкая арганізавала на ўскрайку горада хату-чытальню, камсамолец Любан вёў там асветна-масавую работу.

У цяжкі час, калі на франтах грамадзянскай вайны было складанае становішча, многія камсамольцы ішлі ў Чырвоную Армію. Камсамол адправіў на фронт 20% свайго асабовага саставу. Сярод іх былі Касакоўскі, Красоўскі, Эйдлін і іншыя. Мабілізацыя моладзі праходзіла ў абстаноўцы вялікага палітычнага ўздыму. Праходзілі сходы, мітынгі, выпускаліся заклікі. Тыя, хто не трапіў на фронт, аказвалі дапамогу Чырвонай Арміі ўсім, чым маглі. Так, была створана майстэрня па пашыву адзення для Чырвонай Арміі. Называлася яна «Ваензаг». Для арганізацыі майстэрні патрэбны былі швейныя машыны. Толькі пасля вялікай растлумачальнай работы сярод саматужнікаў іх удалося атрымаць і адкрыць майстэрню. Праца-

Актывісты Чэрыкаўскай камсамольскай ячэйкі. 1928 г.

вала там моладзь на чале з Хутарэцкім.

Камсамольцы і моладзь збіралі сродкі на ўзбраенне, на абсталяванне шпіталяў, дапамагалі сем'ям чырвонаармейцаў. Дзяўчаты даглядалі параненых, збіралі цёплыя рэчы. Гомельская губерня (у якую ўваходзіў Чэрыкаўскі павет) здала 700 паўкажушкоў для чырвонаармейцаў.

11 снежня 1926 г. адбылася раённая канферэнцыя камсамола. Быў абраны новы састаў членаў райкама камсамола — 21 чалавек. Сакратаром Чэрыкаўскага бюро райкама камсамола стаў Мінін. Раённая арганізацыя складалася з 23 ячэек, якія аб'ядноўвалі 563 чалавекі. Дзяўчат было 87. Вясковых ячэек налічвалася 19, гарадскіх — 3, школьных — 1. У Рэчыцы, Ушаках і Лабанаўцы было па некалькі ячэек.

* * *

Мацвей Яфімавіч Хутарэцкі нарадзіўся ў 1903 г. у в. Усохі Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1914 г. разам са сваёй сям'ёй пераязджае ў Чэрыкаў. Сродкамі для існавання яго сям'і былі заробкі сяцёр і братоў, якія працавалі па найму ў мясцовых саматужнікаў. Дзякуючы клопатам сям'і Мацвей атрымлівае магчымасць вучыцца спачатку ў пачатковай школе, а затым у гарадскім вучылішчы. Тут вучыліся ў асноўным дзеці ніжэйшых слаёў гараджан і сялян з бліжэйшых вёсак. Выкладчыкі, асабліва інспектар, груба абыходзіліся з навучэнцамі. Таму ў 1917 г. у вучылішчы ўзнік першы пратэст, у якім прымаў удзел Мацвей.

Знаёмства з рэвалюцыйнай літаратурай, удзел у мітынгах і сходах, якія праходзілі ў Чэрыкаве і на якіх ішла палітычная барацьба, садзейнічалі фарміраванню бальшавіцкіх поглядаў Хутарэцкага. У красавіку 1919 г. мясцовая партыйная арганізацыя прыняла яго ў члены РКП(б). Першым і важнейшым партыйным даручэннем было стварэнне маладзёжнай арганізацыі.

Вясной 1920 г. ваенная абстаноўка ў краіне абвастрылася, і ў ліку іншых добраахвотнікаў Хутарэцкі трапіў на фронт. Накіравалі яго ў Смаленск, у распараджэнне Палітычнага ўпраўлення Заходняга фронту, адтуль — у Гатчыну, пад

Петраград. На фронце Хутарэцкі быў паранены і з палявога шпіталю яго накіравалі ў Ржэў, а потым у Маскву, у пяты эвакашпіталь.

Пасля дэмабілізацыі Хутарэцкі вярнуўся ў Чэрыкаў і прыступіў зноў да работы ў камсамоле. У 1921 г. ён быў выбраны сакратаром павятовага камітэта камсамола. А ў хуткім часе яго абралі ў састаў губкама камсамола на пасаду загадчыка арганізацыйнага аддзела і яму давялося расстацца з камсамолам Чэрыкаўшчыны.

Ф. Рудзікаў.

З успамінаў аднаго з першых камсамольцаў 20-х гадоў в. Манастырок І. Нікеенкі

Моладзь вёскі Манастырок Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета вельмі туманна ўяўляла становішча ў краіне. Чырвонагвардзейцы — Антон Хромчанка, Павел Нікеенка, Павел Міхеенка — часта наведваліся ў вёску да родных і расказвалі, як арганізоўваецца моладзь Чэрыкаўшчыны ў маладзёжныя саюзы. Гаварылі, што ў далейшым будуць арганізаваны хаты-чытальні, пункты па ліквідацыі непісьменнасці, раілі нам заняцца гэтымі пытаннямі.

Прапановы старэйшых моцна западалі ў маладыя душы. І вось аднойчы браты Міхаіл і Пракоп Хромчанкі сабралі манастыркоўскіх рабят на бераг Сожа. Яны сказалі, што толькі што вытрымалі паядынак з бацькам і ён згадзіўся аддаць палавіну дома пад хату-чытальню.

Моладзь пачала наводзіць у памяшканні парадак. Збілі лаўкі, паліцы для кніг, дасталі стол, напісалі лозунгі на абгортачнай паперы. На сценах павесілі партрэты У. І. Леніна, Я. М. Свярдлова. Пакой ператварылі ў культурную ўстанову. На веснічках Пракоп Хромчанка напісаў вывеску «Хата-чытальня».

Члены першай камсамольскай ячэйкі в. Шароеўка.

З адкрыццём у вёсцы хаты-чытальні моладзь пацягнулася сюды на вячэрні агеньчык. Праводзіліся гучныя чытанні кніг. У вёску пачалі дастаўляць газеты. Мала хто мог чытаць, у большасці прыходзілі паглядзець малюнкі. Была адна газавая лямпа, але газу эканомілі. У асноўным смалілі лучыну ў пячурках.

Мішу Хромчанку выбралі загадчыкам хаты-чытальні, Прошу Хромчанку — бібліятэкарам, Сямёну Лукашэнку, Васілю Міхеенку, Аляксею і Жэні Нікеенкам даручылі збор кніг для бібліятэкі. Яфім Лебедзеў адказваў за арганізацыю пункта ліквідацыі непісьменнасці.

Карціна ўяўлялася такая. На лаўках, абрубках ля печы і проста на

подлозе сядзелі барадатыя, апранутыя ў армякі і латаныя паўкажушкі мужчыны, побач з імі жанчыны. Усе яны імкнуліся адолець цяжкую для іх грамату, бо «настаўнікам» даводзілася амаль кожную літару параўноўваць з нейкім прадметам. Занятка працягваліся да таго часу, пакуль не раздаваліся галасы: «Рабяты, больш не можам, аловак з рук падае, рука нямее. Ды і заўтра патрэбна рана ўставаць. Лепш заўтра закончым». Мужчыны распрамлялі стомленыя спіны, даставалі кісеты з курывам, жанчыны павязвалі хусткі і разыходзіліся.

Заможныя сяляне неахвотна адпускалі сваіх дзяцей у хату-чытальню. На вечарах вельмі мала было дзяўчат, маці прымушалі іх выконваць розную хатнюю работу. Але ў хуткім часе ў гурток пачалі запісвацца і дзяўчаты. Першымі прыйшлі Маша і Жэня Крымцовы, Хрысціна і Ганка Котавы, Сцепаніда і Ірына Нікеенкі. Яны таксама хацелі мець якія-небудзь даручэнні. Ім даручылі чытаць кнігі, аказаць дапамогу ўдаве Анастасіі Нікеенка і іншым жанчынам, мужы якіх загінулі на грамадзянскай вайне. За гэтымі дзяўчатамі пачалі заходзіць і іншыя. Так паступова вакол хаты-чытальні згуртоўваўся вясковы маладзёжны актыў з юнакоў і дзяўчат.

Актыўная работа маладзёжнай групы ў Манастырку ператварыла хату-чытальню ў культурны цэнтр вёскі, дзе пачалі праходзіць «сходкі», на якіх вырашаліся грамадскія справы. Уважліва прыслухоўваліся маладыя да ўсяго, што адбывалася ў Чэрыкаўскім павеце. Стараліся і самі ўнесці ўклад у агульную справу. Культармейцы хадзілі па дамах і пераконвалі сялян у неабходнасці падтрымліваць уладу Саветаў, ісці ў гурткі лікбеза. Жаданне працаваць было вялікае, нягледзячы на адсутнасць вопыту. «Настаўнікі» вучыліся самі і вучылі іншых.

Неяк Прошу Хромчанку было даручана пачытаць вечарам Чэхава. Згадзіўся юнак, але калі сабралася аўдыторыя, то аказалася, што апавяданняў няма. Хромчанка не разгубіўся і ўзяў з паліцы першую трапіўшую пад рукі кнігу. Як жа ўсе здзівіліся, калі ён пачаў чытаць пра хваробы жывёлы. Але кніга выклікала інтарэс у слухачоў, і пазней быў арганізаваны сельскагаспадарчы гурток.

Непрыкметна моладзь пачала заваёўваць аўтарытэт сярод дарослых. Калі некаму трэба было нешта напісаць або хто не спраўляўся з малацьбой ці ўборкай, моладзь ахвотна ішла на дапамогу. Аднойчы на агульным сходзе вырашалася пытанне аб зборы хлеба, абутку і адзення для патрэб Чырвонай Арміі. Міша Хромчанка прапанаваў падрыхтаваць спектакль і ўвесь збор перадаць у фонд Чырвонай Арміі. Згадзіліся і пачалі рыхтаваць п'есу. Ад жадаючых паглядзець яе не было адбою. Цана білета — адзін фунт жыта. Праўда, сталых прапускалі бясплатна. Памяшканне, дзе адбыўся спектакль, было нічым іншым, як пуняй. Паколькі заваявалі сабе славу «артыстаў», то адважыліся паказаць спектакль і ў суседніх вёсках. Вынік паездак — дзве фурманкі хлеба, якія потым былі перададзены Чэрыкаўскаму паветваенкамату і адпраўлены на фронт.

У 1918 г. я пайшоў у Чырвоную Армію. А ў наступным годзе мяне прынялі ў камсамол. Калі ў 1920 г. у Лемені была адкрыта школа-камуна, па рэкамендацыі савета хаты-чытальні туды былі накіраваны манастыркоўскія актывісты Аляксей Нікеенка, Мікалай Лебедзеў, Яўген Нікеенка. Прошу Хромчанку паслалі ў сельскагаспадарчую школу. У мінулым дзеці беднякоў закончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы і сталі спецыялістамі: Яўген — аграномам, Мікалай — ветурачом,

Аляксей — юрыстам. Некаторыя свой лёс звязалі з Чырвонай Арміяй.

З успамінаў камсамольца 30-х гадоў Ф. Раманенкі

У 1928 г. была створана першая камсамольская ячэйка ў Верамейскім сельсавеце. У яе ўваходзілі восем чалавек: С. Гаўрыш, Т. Андрэенка, П. Аўраменка, Ф. Кароткі, І. Іваноў, Р. Свірыдаў, А. Малярова, І. Максімаў. Кожны з іх дастойна пражыў жыццё, ніхто не заплямiў свайго імя.

Вялікую, складаную работу выконвалі камсамольцы, моладзь у пачатку 30-х гадоў. Складанасць заключалася ў тым, што слабымі былі сродкі інфармацыі. Не было радыё, газеты дастаўляліся прыкладна раз у тыдзень. Уся інфармацыя аб жыцці краіны ў асноўным ішла цераз сельскі Савет па праваду.

У населеных пунктах праходзілі сходы, на якіх ставілася пытанне аб арганізацыі калгасаў. Моладзь горача агітавала за новае, калектыўнае жыццё. Камсамольцы вельмі дапамагалі старшыні сельскага Савета, камуністу Волкаву — чалавеку з цвёрдым, валявым характарам. Хочацца адзначыць, што ў 1929 г. без асаблівых перагібаў у Верамейках утварыўся калгас.

Вельмі цяжка прыйшлося камсамольцам з в. Каркоўшчына. Хоць і невялікай яна была, але двойчы даводзілася тут арганізоўваць калгас. На адным са сходаў востра ставілася пытанне: як жыць далей? У гэты час праз акно варожай куляй у час выступлення быў забіты камсамолец Рыгор Свірыдаў.

Асаблівым аўтарытэтам у маладзёжным асяроддзі карысталася Соф'я Гаўрыш — першы камсамольскі сакратар. Стройная, у колішняй форме камсамольскага работніка (з рамянём і партупеяй), яна выклікала павагу. Нават мы зайздросцілі Гаўрыш.

Як і паўсюдна, у вёсцы працавала царква. Камсамольцы і моладзь так накіроўвалі атэістычную работу, што мясцовы прыход намнога скарацiўся. Канцэрты мастацкай самадзейнасці, гучныя чытанні і спрэчкі да другіх пеўняў — гэта навізна вабіла людзей.

У 1929 г. у сельсавеце пачала працаваць хата-чытальня. Першым «ізбачом» быў Іван Цацоха. У распараджэнне Цацохі быў перададзены дом святара з трох пакояў і раяль; дарэчы, іграць на ім ніхто не ўмеў. Цацоха быў імклівым, мэтанакіраваным чалавекам. Ён сабраў фонд кніг, і мы з задавальненнем чыталі ўслых шырокай аўдыторыі. Разам з Цацохам мы рыхтавалі цікавыя вечары адпачынку, канцэрты мастацкай самадзейнасці, чыталі Беднага, Купалу, Коласа, афармлялі шматлікія лозунгі, плакаты. І праз дзесяцігоддзі з павагай і любоўю ўспамінаю Цацоху.

У 1933 г. Верамейская пачатковая школа стала сямігодкай, хату-чытальню зачынілі. Першыя камсамольцы пайшлі кожны сваёй дарогай. Соф'я Гаўрыш Чэрыкаўскім райкамам камсамола была накіравана на вучобу ў савпартшколу. Андрэенка і Малярова паступілі ў педагагічныя навучальныя ўстановы. Мяне і трох маіх аднагодкаў калгас адпусціў у школу ФЗВ будаўнікоў у Магілёў. Мы ўсе вельмі хацелі вучыцца і цягнуліся да ведаў.

У 1936 г. я вярнуўся ў сваю родную школу пасля заканчэння Магілёўскага педінстытута настаўнікам роднай мовы і літаратуры. А разам са мной настаўнікамі матэматыкі і пачатковых класаў — Цымбарэвіч і Маціясевіч. Усе мы былі камсамольцамі. Мясцовая арганізацыя адразу ўмацавалася трыма членамі: камсоргам стаў завуч сямігодкі Іван Марозаў — чалавек ініцыятыўны, духоўна багаты. У 1938 г. яго прынялі кандыдатам у члены КПСС.

Успамінаючы камсамолію трыццатых гадоў, яшчэ раз пераконваешся, што кожны з нас жыў з верай у шчаслівую будучыню.

З успамінаў Ф. Ф. Шаўбунова

Нарадзіўся я ў в. Тур'е ў сям'і селяніна. Скончыў пачатковую школу, потым вучыўся ў Чэрыкаўскай школе. У камсамол уступіў у 1924 г. Да гэтага часу ў нашай вёсцы ўжо існавала камсамольская ячэйка. Арганізаваў яе мой аднавясковец Д. І. Старавойтаў, які вярнуўся з грамадзянскай вайны. Мне даручылі кіраўніцтва піянерскай арганізацыяй. Кожны тыдзень я сустракаўся з хлопчыкамі і дзяўчынкамі. Мы развучвалі песні, рэпеціравалі п'есы, якія паказвалі на вясковай сцэне. Дарэчы, сцэну зрабілі самі.

Разам з другімі камсамольцамі — Антонам і Стафанам Старавойтавымі, Мітрафанам Агеенка, Максімам Кадзелай, Анісімам Сафеенка і іншымі — я актыўна ўключыўся ў правядзенне калектывізацыі.

Па рэкамендацыі сакратара райкама камсамола Васіля Рыбакова я паступіў у Магілёўскі палітыка-асветны тэхнікум і пасля яго заканчэння атрымаў накіраванне на Віцебшчыну.

У 1934 г. мяне прызвалі ў рады Чырвонай Арміі. Калі служыў у арміі, быў кіраўніком палітгуртка, палітінфарматарам у сваім узводзе. У 1939 г. я ўступіў у партыю і быў накіраваны на работу ў органы міліцыі.

Вялікая Айчынная вайна застала мяне, выпускніка Ленінградскай школы палітработнікаў міліцыі, у Брэсце. З нас, учарашніх курсантаў, стварылі мабільную групу па знішчэнню варожых дэсантаў. Многія мае сябры загінулі ў першыя дні вайны. А мне выпаў цяжкі шлях адступлення.

У Мінску нашаму атраду было дадзена заданне выехаць у Ленінград, каб удзельнічаць у эвакуацыі з горада дзяцей, а таксама каштоўнасцей. Пазней я аказаўся ў Калінінскай вобласці, потым на Украіне — у Варашылаўградскай вобласці, дзе працаваў начальнікам райаддзела міліцыі.

У 1947 г. я вярнуўся ў свой раён. Працаваў інструктарам райкама партыі, потым намеснікам дырэктара Чэрыкаўскай МТС, старшынёй калгаса «Чырвоны Кастрычнік», на савецкай і партыйнай рабоце.

Часам думкамі пераносішся ў далёкае мінулае. У канцы 1918—1919 гг. на Чэрыкаўшчыне праводзілася кампанія па стварэнню камун. Была створана камуна і ў в. Тур'е — у маёнтку памешчыка Астанкевіча. Панскі двор знаходзіўся ў маляўнічым месцы на беразе р. Вудагі. Побач было возера, вялікі сад. Маёнтак акружаў лес. Памешчыку належалі два вялікія дамы і некалькі меншых, шмат «халодных» пабудоў. На беразе Вудагі стаяў вадзяны млын. Усё гэта, а таксама жывёла, сельскагаспадарчы інвентар было перададзена камуне.

Спачатку ў камуну ўступіла 20 сялян з навакольных вёсак: Тур'е, Шароеўка, Вербеж і інш. Першымі камунарамі з в. Тур'е былі: Ягор Паўлаў з сям'ёй з чатырох чалавек, Васіль Зубараў — пяць чалавек, Карп Зубараў з сям'ёй, Фёдар Зубараў — чатыры чалавекі, Герасім Зубараў — чатыры чалавекі, Прохар Фралоў — тры чалавекі; з в. Шароеўка: Самуіл Церашкоў — чатыры чалавекі, Іван Мельнікаў — тры чалавекі, Мітрафан Сляпцоў з сям'ёй, Васіль Антоненка — чатыры чалавекі; з в. Вербеж: Андрэй Гладкоў — чатыры чалавекі і інш.

Усе члены камуны былі бясконныя беднякі, пастухі, парабкі. Ганна Карпава (па мужу Аляксеенка) — парабчанка памешчыка Васілеўскага, Андрэй Гладкоў — парабак з в. Вербеж, Зубаравы — усе вяско-

выя пастухі. Узначальваў Тур'еўскую камуну Міхаіл Макаравіч Фралоў.

Усе камунары жылі ў дамах памешчыка Астанкевіча. Там была кухня, грамадская сталовая. У сельскагаспадарчых пабудовах знаходзіліся коні, каровы, свінні, птушкі (індыкі). Для апрацоўкі зямлі карысталіся плугамі, баронамі, з машын — малацілкамі, веялкамі, сарціроўкамі і інш. Зямельны ўчастак складаўся прыкладна з 250 дзес. лепшых зямель. Астатняя памешчыцкая зямля была падзелена паміж беднатой. Усё, што выраблялася камунай, ішло ў агульны фонд. Называлася камуна «Чырвоны араты».

На аснове гэтай камуны ў 30-х га-

Ф. Ф. Шаўбуноў.

В. М. Рыбакоў.

дах быў створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік». На месцы панскага двара вырас невялікі пасёлак Юны Пахар, які ўваходзіў у гэты калгас.

ПАЧАЛІ СТВАРАЦЦА КАЛГАСЫ

5 чэрвеня 1931 г.

Горкаўскі сельсавет: «Белвёска» (5.VIII.1929)*, «Сталін» (1929), «Шлях сацыялізма» (1928), «Крупскай» (1928), «Янава» (21.IX.1929), «Чырвоны пераможнік» (15.VIII.1930), «Чырвоны маяк» (27.II.1931), «Будзённы» (20.II.1931), «Новы шлях» (7.II.1931), «Піянер» (8.I.1931), «Варашылаў» (1931), «Чырвоны сцяг» (1931), «Новы труд» (1931), «Ударнік» (1931), «Пралетарый» (1931); **Чэрыкаўскі:** «Чырвоны сормавец» (15.II.1930), «Варашылаў» (1931), «Молатаў» (1931), «Эмес» (25.III.1925); **Лабанаўскі:** «Культура» (23.III.1930), «Іскра» (18.V.1930), «Пабеда» (29.I.1931), «Соцземлядзеліе» (16.II.1931), «Клім Варашылаў» (9.II.1931), «Серп і молат» (25.II.1931), «Камунар» (Грозны) (1931), «Вольны труд» (1931), «Светлы» (1931), «Чырвоны сцяг» (1931); **Мірагошчанскі:** «Светлы шлях» (15.VIII.1929), «Авангард» (15.I.1931), «Знамя труда» (1.III.1931), «Варашылаў» (1931), «Будзённы» (10.III.1931); **Рэчыцкі:** «Чырвоная зорка» (23.IV.1930), «Кастрычнік» (6.V.1928), «Чырвоны гігант» (ліпень 1930 г.), «На варце» (23.II.1931), «Будзённы» (10.II.1931), «6-ы з'езд Саветаў» (1931), «Варашылаў» (26.II.1931), «Баявік» (25.II.1931), «Чырвоная ніва» (1931); **Рынкоўскі:** «Чырвоны ўсход» (20.IV.1930), «Чырвоная Беларусь» (11.IV.1930), «Карла Маркса» (верасень 1930), «6-ы з'езд Саветаў» (28.I.1931); **Глінскі:** «Іскра» (1.III.1930), «Прасвет» (21.II.1921), «Чырвоная зорка» (IX.1929), «Пабядзіцель» (1.I.1931), «Чырвоны партызан» (1931), «Першамайскі» (1931), «Клім Варашылаў» (1931), «Чырвоны пахар» (1931); **Зябенскі:** «Чырвоны пераможнік» (10.IV.1930), «Дабраволец» (1931); **Язёрскі:** «Ленін» (XII.1928), «Іскра» (8.XII.1930), «Звязда» (таксама), «Праўда» (10.II.1931), «Ільіч» (студзень 1931), «Чырвоны будаўнік» (1931), «Муравейнік» (1931), «Варашылаў» (1931), «Пабеда» (1931), «Чырвоны Кастрычнік» (1931), «Першамайскі» (1931); **Верамееўскі:** «12 год Кастрычніцкай рэвалюцыі» (2.III.1930), «Аб'яднанне» (X.1930), «Чырвоная звязда» (II.1930), «Пабеда» (II.1931), «Чырвоны луч» (1931); **Ушакоўскі:** «Сталін» (III.1930), «Чырвоны штурмавік» (1.III.1931), «Чырвоны камунар» (1931); **Халмянскі:** «Камінтэрн» (5.II.1930), «Чырвоная зара» (30.X.1930), «13 год Кастрычніцкай рэвалюцыі» (13.X.1930), «Чырвоны маяк» (1931); **Шароеўскі:** «Колас» (26.XII.1930), «Новы свет» (1/III.1931), «Сталін» (1931), «Чырвоны Кастрычнік» (1932); **Каменскі:** «Варашылаў» (1931), «Іскра» (1931), «Першамайскі» (1931); **Вепрынскі:** «Чырвоны Кастрычнік» (1931).

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 251, воп. 1, спр. 118, л. 92. Копія.

* У дужках дата арганізацыі калгаса.

А. П. Маісеенка.

Л. А. Маневіч.

Першыя старшыні калгасаў і актывісты калгаснага руху

БАЛАРЧАНКА Прохар Ільіч (1898—1965) — ураджэнец в. Ігнатаўка Клімавіцкага раёна. У 1930 г. старшыня калгаса «Чырвоная зорка» Рэчыцкага сельсавета, пазней старшыня калгаса «Другая пяцігодка» (в. Вусце). З 1938 г.— старшыня Шароеўскага сельсавета. У 1941 г. прызваўся ў рады Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі ў красавіку 1946 г. працаваў на розных пасадах.

ГАЛАЎНЁЎ Іван Васілевіч (1911—1942) — ураджэнец в. Рагаліна Язёрскага сельсавета. Працаваў у Чэрыкаўскай МТС, у 1935—1936 гг.— брыгадзірам трактарнай брыгады, з 1939 г.— загадчыкам майстэрні па рамонту трактароў і сельскагаспадарчых машын. У часы Вялікай Айчыннай вайны змагаўся ў тыле ворага ў Чэрыкаўскім партызанскім атрадзе.

ГАЛАЎНЁВА (Шах) Марыя Аляксееўна (1914) — ураджэнка в. Тур'е. Адна з першых камсамолак Тур'еўскай камсамольскай ячэйкі. Прымала актыўны ўдзел у стварэнні калгасаў. Скончыла курсы трактарыстаў, і па яе пачыну ў Чэрыкаўскай МТС была арганізавана жаночая брыгада трактарыстак.

ГРЫШЧАНКОЎ Капітон Емяльянавіч (1894—1970) — ураджэнец в. Верамейкі. З 1930 да 1936 г. першы старшыня калгаса «Пабеда» Верамейскага сельсавета.

ГРЫШЧАНКОЎ Раман Герасімавіч (1904—1982) — ураджэнец в. Верамейкі. У 1931—1933 гг. працаваў старшынёй Верамейскага сельсавета, першы старшыня калгаса «Бальшавік» Верамейскага сельсавета. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КАРПЕНКА Трафім Іосіфавіч (1885—1954) — ураджэнец в. Мірагошч. Першы старшыня калгаса ў в. Лабанаўка.

МАІСЕЕНКА Аляксей Паўлавіч (1882—1947) — ураджэнец Чэрыкава. Першы старшыня калгаса імя Молатава (1929—1934), з 1944 да 1946 г. працаваў старшынёй калгаса «Чырвонае Сормава».

МАНЕВІЧ Леў Аронавіч (1901—1959) — ураджэнец Чэрыкава. Першы старшыня калгаса «Чырвонае Сормава» (Чэрыкаў), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

МАКШТАРОЎ Фёдар Кірылавіч (1894—1973) — ураджэнец в. Вепрын. Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1925 г. старшыня Вепрынскага сельсавета, першы старшыня калгаса «Чырвоны Кастрычнік» у в. Вепрын.

Мінулае вёскі

З аповядаў Паўла Лосева, які жыў у в. Журавель

Да рэвалюцыі дрэнна жылося сялянам в. Журавель Мірагашчанскага сельсавета. У большасці гаспадароў вёскі ніколі не хапала хлеба і бульбы, а некаторыя мелі свой хлеб, пакуль праходзіла ўборка. Канчалі ўбіраць, выходзіў і хлеб. Не хапала корму і для жывёлы, сена было мала, уся сенажаць, за малым выключэннем, належала суседняму магнату князю Абаленскаму. Сялянам, мяркуючы «па-гаспадарску», прыходзілася па надзвычайна высокіх цэнах браць у арэнду кавалак сенажаці ў гэтага князя. А каб заплаціць, трэба было зімой вазіць панам і купцам-махлярам калоды.

Зямлю і сенажаць Журавельскага «грамадства» абкружала зямля князя Абаленскага, з аднаго боку маёнтак Горкі, з другога — Язёры. Ніякай магчымасці не было сялянам пазбавіцца панскай «ласкі», кожны неяк пападаўся да пана. Бывала, узыдзе конь ці карова

на панскую зямлю або ў лес, бягуць панскія наймíты, заганяюць жывёлу ў маёнтак, і калі гаспадар — уласнік жывёлы не жадае за парушэнне панскіх межаў папасці пад суд, ён павінен адпрацаваць у пана ўстаноўленую колькасць дзён.

Не менш пана душыла сялян малазямелле. Усяго перад рэвалюцыяй больш чым на 500 душ было 65 надзелаў зямлі. Няўгноеная, бедная глеба давала нізкі ўраджай. У вёсцы ж было толькі 2 гаспадаркі, што мелі такой зямлі па 2 надзелы. У астатніх зямлі было ад аднаго надзела і менеў, амаль не палова гаспадарак мелі па паўнадзела, каля 2,5 га на гаспадарку.

На летні перыяд, каб было дзе пасвіць жывёлу, уся вёска заключала з панам дагавор на права выгана жывёлы ў вызначаныя ўчасткі лесу, на адведзеныя пад выпас землі і балоты. І за гэта вёска абавязалася пану касіць і ўбіраць, жаць жыта, вывозіць гной і г. д. Адным словам, выходзіла так, што больш сяляне працавалі на пана, чым на сябе.

На ўсю вёску было 2 пісьменных, гэта Рухлянкоў Прохар і Ляксееў Цімох. Да чаго бедна жылі, відна хаця б з таго, што ніхто ў вёсцы не меў ботаў, а калі, бывала, хто купіць мультановую рубашку альбо чорныя штаны, дык усе дзіву даюцца: «Глядзеце, у крамнай адзежыне ходзіць чалавек!».

Сярод нашага лугу было возера, у якім я часта ўкрадкам лавіў рыбу. Даведаўся аб гэтым пан і прапанаваў, каб наша вёска заплаціла яму арэндную плату за лоўлю рыбы. Справа разбіралася самым сур'ёзным чынам. Тры гады падрад валендаліся мы з панам па судах.

Падыходзіць, бывала, жніво, трэба жаць панскае жыта за пасьбу жывёлы, з сіл выбіваюцца жанчыны за доўгі жнівеньскі дзень. А каб працавалі спарней — панскі прыказчык стаіць тут. Сажнуць — пан увечары дае па кілішку спірту, каб ахвотней ішлі да спакою, ды каб менш аб чым думалі. Асабліва гэтага баяліся і князь і багацеі.

Вось такім было наша жыццё. А потым пачалі гаварыць пра калгасы. У 1929 г. арганізаваўся калгас і ў нашай вёсцы. Называўся ён «Светлы шлях». Ініцыятарам арганізацыі калгаса быў Васіль Шчаўлікаў. Спачатку ў калгас уступіла 21 гаспадарка, потым пайшлі аднаасобнікі — 60 гаспадарак. І да 1935 г. амаль уся вёска была ў калгасе. На малочнатаварнай ферме налічвалася 135 галоў жывёлы, 35 авечак, была арганізавана і свінаферма. Крыху лепей сталі жыць калгаснікі. На працадзень атрымлівалі да двух кілаграмаў зернавых і па пяць кілаграмаў бульбы.

Само жыццё вызначыла

Успаміны Г. З. Лукашэнкі, арганізатара першага ва Ушаках таварыства па калектыўнай апрацоўцы зямлі

1929 год. Памятаю, прыехаў прадстаўнік Савецкай улады з Чэрыкава, аддзяліў нам 14 гектараў лепшай зямлі ад былых уладанняў князя Абаленскага. Справа была новая, незнаёмая. Таму тыя, хто жыў па тым часе больш-менш няблага, аднесліся да яе з недаверам. А яшчэ больш заможныя гаспадары дык проста здзекаваліся. Само жыццё вызначыла, каму аб'ядноўвацца. Напрыклад я, прыйшоўшы з фронту імперыялістычнай вайны, як кажуць, застаўся гол, як сакол. Бацька аддзяліў мяне, не даўшы на развітанне нічога — бо і даваць не было чаго. Мыкалі гора і астатнія 6 чалавек нашай камуны. Браты Дзмітрый і Прохар Яскевічы, Ілья Лукашэнка, шматдзетны Ермалай Лосеў, Васіль Лукашэнка. Прохар Герасімавіч Яскевіч да ўсяго быў у нас рахункаводам.

Агульную зямельку засеялі бульбай, ячменем, аўсом, канаплямі, якія прынеслі, колькі ў каго было. Усё ўрадзіла добра. Ураджай падзялілі паміж членамі камуны, пакінуўшы частку на насенне. Атрымлівалася так, што сабралі, тое сабе і аставілі. Гэта былі першыя крокі.

У канцы 1930 г. да нас прыслалі арганізоўваць калгас рабочага-піла-

рамшчыка з Сормава 25-тысячніка Еўдакімава. Актыўны ўдзел у стварэнні калгаса прыняў таксама першы старшыня Ушакоўскага сельсавета Ягор Касмачоў, які быў родам з Пільні. Назвалі гаспадарку «Чырвоны штурмавік». Спачатку ў яе запісалася 40 двароў. Усялякае было. Аднаго разу члены калгаса пачалі зносіць дамоў абагулены сельгасінвентар. Але такіх момантаў было мала. Раней абяздоленыя і бяспраўныя, людзі ў калектыўнай працы хацелі бачыць сваю апору, надзею на лепшае жыццё. Цяжкім быў 1933 год, год небывалай засухі і голаду. Але разам з калгасам вытрымалі гэтае выпрабаванне і яго людзі.

На першых часах абагуленую жывёлу трымалі ў памяшканнях асобных гаспадароў. Напрыклад, у жыхароў Ушакоў Івана Копелева, Рамана Котава. Але памалу абжываліся, распачыналі сваё, няхай невялікае будаўніцтва. Ужо быў у гаспадарцы сепаратарны пункт па вырабу смятаны, якую на конях адвозілі ў Чэрыкаў. Крыху пазней з Чэрыкава прыгналі ў вёску трактар. Гэта была падзея! Да смешнага часам даходзілі адносіны да машын тых, хто ўпершыню бачыў сталёвага каня. Асобныя нават хрысціліся, убачыўшы машыну. Другія казалі, маўляў, конь добры, ды гною ад яго не чакай... Так калгас «Чырвоны штурмавік» паступова станавіўся на ногі, мацнеў. Перад самай вайной купілі першую аўтамашыну, ды толькі нашу працу перапыніла вайна.

Каго раскулачвалі?

Расказала жыхарка г. Чэрыкава Г. Касценіч

У Сяннёнцы нашай спрадвеку аднаасобна жылі. Людзі цягавітыя, працавітыя. Рэдка калі які сын аддзяляўся ад бацькавай хаты, а ўсё больш дзеўкі замуж выходзілі. Недалёка, у суседнія вёскі. А моладзі, моладзі ў нас было. Да мяне мой каханы на спатканне хадзіў з вясламі ракаў і з чаромхай. Сянна тады была чысцей слязы, а зараз чарнатой узялася. Хоць і аднаасобнікамі лічыліся, але кучыліся сусед з суседам. Калі жніво наступала, а ў еўнях пачыналі цапы грукацець, то спяшаліся адпрацаваць пазычаную бульбу, жыта. Зямлю ж на душы дзялілі, ды яе не заўсёды хапала, каб і на ежу пасеяць, і хоць на нейкую напратку. У нашай сям'і надзелу было дзесяць дзесяцін, а як бацька на заробкі з'ездзіў, то яшчэ прыкупілі пяць. Так і называлі той лапік «шахцёрскі», бо бацька ў забоі сем гадоў працаваў. Спачатку дзевяць едакоў было за сталом, а потым паменшала — «іспанка» выкасіла.

Вёсачка наша тулілася паміж цяністых лясоў, падобна мноству хуторкоў Чэрыкаўскага, Краснапольскага, Клімавіцкага паветаў. Усяе культуры — бліжэйшая царква ў Гарэзне. Айцец Аляксандр са сваімі малітвамі і пропаведзямі — адзіны прасвет у культуру і жыццё. Пра газеты і часопісы сяннёнцы ведалі толькі ад яўрэяў-рызнікаў, прывозіўшых бялюткую муку, шкло, нізкі тараноў, каралі дзеўкам і ўсялякую дробязь.

У царкоўнапрыходскай школе многія грамаце вучыліся. Але грошай у бацькоў звычайна хапала на чатыры зімы.

Цяперака ўсе нешта крычаць, бастуюць, ваююць, а мы проста працавалі: на двары, на лузе, у лесе. Жаніліся, радзіліся, хавалі. Зрэдку-зрэдку вайной вёска на вёску хадзілі. Маладым усё не было куды сілы дзяваць. Але каб брат супраць бра-

та, ці сын супраць бацькі — крый Божа.

Неразбярыха чакала сяннёнцаў, калі ў канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў пайшло наступленне на царкву, на аднаасобніка. Розныя кніжачкі рэвалюцыйныя чытаць амаль усе пачалі. А потым пра калгасы ўсчалі тарахцець. Казалі, што нават жонкі будуць агульныя. Ды такога, хвала Усявышняму, не здарылася. Найперш мы з Асінаўкай, Гуткай, Астравамі ў калгас «Чырвоная зорка» з'ядналіся. Сцёглі на агульны двор цяглавую сілу, жыўнасць, таго-сяго, на чым аруць ды сеюць. Змітрок Маслівец старшынстваваць стаў. Тады нешта разбрыліся, а потымку зышліся, назву новую ўзялі. «VII з'езд Саветаў» пачалі празывацца, а што за з'езд — ліха яго ведае. Далучыліся да нас ужо з Лысаўкі. Дужа плакалі людзі, калі асабліва кароў са сваіх двароў на калгасны на вяроўках вялі. Усё бабы бегалі падкінуць жменю сена карміцелькам. І па конях надта гаравалі. Ведаеце, неяк прыціхла ўсё, бы перад канцом якім. Ні гармоні, ні бубна не чуваць. Ускалыхнуліся дужа, калі Гарэзненскую царкву патрашыць сталі. Як паляцелі званы з макаўкі вобзем, дык старыя думалі канец свету прыходзіць. Дошкі з боскай абіцелі пасадралі, склеп у ёй утварылі. Жах і толькі. Айцец Аляксандр немаведама куды скрыўся, бо актывісты ўсё гразілі «патлатага» прыгваздзіць.

У нашых ваколіцах усё больш Асмалоўскіх было. Я — таксама з гэтага прозвішча. Памятаю, як кулачыць пачалі майго дзядзьку Івана Нічыпаравіча. Спачатку беднага даймалі, чаго аднаасобнікам жыве, на багацце яго зуб тачылі. А набытку ў таго было ўсяго нічога. Кабылка Карка, на якой і сеяў і вазіў, ды карова з цялушкай. Дужа вока пякла сельсаветчыкам веялка, якую Іван купіў на грошы, зароблены ў шахце. Ручная, але заводская. А яшчэ малацілку сабе прыдбаў, прасядзеўшы гадкоў дзесяць пад зямлёю. Век нікога не наймаў. Усё з сынамі ды дочкамі на пожні ці на ярыцы. Чацвёра дзяцей падымаў, а жонку хворасці адольвалі. Хацеў чалавек па-людску жыць. Застаўшыся ў старэнькай бацькавай хаце, скляпаў сарайчык, лазню. Цягаў на сабе калоды. На пянушку абедаў, пакуль крыху пастроіўся. А вось як выкапаў на двары калодзеж сваімі рукамі, каб па ваду за кіламетр не хадзіць, дык і ўвогуле чужым стаў для новых улад. 25 дзесяцін зямлі, купленых крывёй і потам,— бяльмом у воку многім сталі. Пачалі хадзіць па двары, апісваць, прарочыць зямельку далёкую, халодную. Назначылі дзень выселак, але Іван атруціўся. Толькі перад смерцю ўсё прабачэння ў жонкі прасіў. Але падворак яго ўсе роўна рабавалі.

Гора было і толькі. А неяк прыбягае дамоў дачка Тоня і плачучы расказвае, як усёй школай бегалі глядзець на раскулачванне Мацяёнка — Хведара Мацвеевіча Асмалоўскага. Аднафамільцам быў нам стары. Як хацелі, так і вараціліся ў яго хаце, на падворку.

А што з жонкай дзядзькі было? А нічога, пасля смерці мужа ў дачкі ў суседняй вёсцы памерла, і ўсё прасіла, каб кожны год за бацьку свечку ў царкве ставіла, бо нікога ніколі не пакрыўдзіў чалавек. Так я і рабіла, пакуль слабасць не пахіснула. Як-ніяк другую сотню два гады назад размяняла.

Каго кулачылі? Не ведаю як дзе, а ў нас, хто дзень у дзень, ад зары да зары на ніве сваёй гібеў. У нас Міхась Асмалоўскі дзве кладоўкі хлеба за ўсё-ўсё насыпаў, дык падчыстую вымелі. А як падступіліся ўжо да хаты Піліпа Жабыкі ў Гутцы, дык думалі, што ў людзей д'ябал усяліўся. Надта старалася Домна Карпачова, дэпутат. Жыў Піліп з 22 дзесяцін, па бёрнышку хату зляпіў, са-

док пасадзіў бушны. Калі аддзяліўся ад бацькі, то ў лазеньцы напачатку туліўся. Усё марыў уласны куток мець. Жыццё яму дачку хворую падкінула, не магла без пабочнай помачы пераступаць. Сказалі — аддаў у калгас Піліп кабылку, зерне звёз. Дык не, з'явіліся высяляць. Піліпа выгналі на вуліцу, у падполле за бульбай палезлі. Да клубеньчыка выцягнулі. Бацьку на падводу пасадзілі, а хворая Антоля слупам стаіць, як людзі да сцяны прысланілі. Мармыча нешта Піліп, галавой гойдае, ні з таго ні з сяго распранацца пачаў да нацельнага, бы вар'ят які. Бабы тут шумець пачалі. А Манька Падабед давай на саветчыкаў крычаць ды бульбу назад у ямку пнуць, каб Антоля з голаду не памерла.

Звезлі некуды Піліпа, і усё хадакі ў раён хадзілі, каб вызваліць яго. Доўга ў турме прабыў Піліп, але вярнуўся. Ды дом заняты быў. Пасялася ў ім Домна Карпачова. Як ні паглядзім, а Піліп, якога старэйшая дачка з Антоляй да сябе ў суседнюю вёску забрала, ля сваёй хаткі блудзіць. Ненармальны стаў, пры нянопўным розуме, і памёр хутчэй за сваю дачку. Не давядзі, Божачка, бачыць такое. Не біў, не ламіў, не сільнічаў чалавек, сваёй крывёй, гарбом зарабляў, а падчыстую абабралі, бы пажар прайшоў які.

У нас Васіль Асмалоўскі жыў. Многія пайшлі ў калгас, а ён — на падсочку. Разоў колькі падступаліся, каб падаваў заяву, а ён упіраўся. Гаварыў, што ў лесе большую капейку на дзяцей заробіць. Дык аднойчы надвячоркам нейкія людзі прыезджыя забралі яго. Толькі Домна была са сваіх. Забралі з канцамі.

І ці толькі яго аднаго? Сагналі на край света белага Бернатовічаў, Пашкевічаў, Арцюшэўскіх. Без следу прапалі Андрэй Попель, Іван Хомчанка, Іван Судзілоўскі. Дайшло да таго, што на пасаду старшыні некага з маладых было ставіць. Прызначылі сілком 92-гадовага Дзмітрыя Асмалоўскага. Ён, дарэчы, і ў вайну кіраваў калгасам. Дрэнна гаварыць пра нябожчыкаў нягожа, але скажу, што Домна згінула па наводцы нашых людзей у акупацыю. Занадта ганарлівая была, на чужое зарылася, у чужым куце абжывалася, без прычыны кулачыць людзей бралася. Не даравалі. Данеслі на Домну ў паліцыю, а на яе сясцёр — не.

Ціснулі як маглі на чалавека, у калгас заганялі, не разбіраючыся, не чакаючы згоды. Але ж неяк звыкліся з новым укладам, дык усё роўна так і было. Баяліся, што і нас куды-небудзь у пекла адправяць. Слухаліся брыгадзіра, які зычным голасам загадваў. Па 50—70 сотак за дзень і я арала. У баронах хадзіла, за «палачку». Але калі-нікалі саціну на спадніцу давалі. Гоні сялянскай рукі патрабавалі. Роўненька-роўненька, у адзін плужок, аралі, лугі аканаўлівалі. А былі лугі заліўныя, такія дагледжаныя, што птушка не знаходзіла кусціка гняздо звіць. Карча нідзе не знайшоў бы.

Верыце не верыце, вельмі доўга па начах мроілася, што прыйдуць і пачнуць у хаце трэсці, бульбу ды хлеб выграбаць, апошняе надзяванне забіраць. Глякі з канапляным алеем і тое за штандару запіхвалі. Каб дзецям было на чым блін спекчы. Падалей засоўвалі кублы з салам. Мы грачыху на крупадзёрку ў Мохаўку на Краснапольшчыне насілі, а ячмень — у Брацькавічы на Касцюкоўшчыне. Масла збівалі ў Госліве на маслабойні. Усё хваляваліся, каб і там што кулачыць не сталі.

Запісала А. Хныкава.

Чэрыкаўскі раён у 30-я гады

Чэрыкаўскі раён размяшчаецца паміж 53° 25′ і 53° 49′ паўночнай шырыні і 31° 06′ і 31° 42′ усходняй даўжыні. Раённы цэнтр — г. Чэрыкаў. Бліжэйшая чыгуначная станцыя — Крычаў (32 км) і ст. Верамейкі (25 км).

Раён складаецца з 14 сельсаветаў і 1 гарсавета. Мяжуе на паўночным усходзе — з Крычаўскім раёнам, на паўднёвым усходзе — з Клімавіцкім, на поўдні — з Краснапольскім, на захадзе — са Слаўгарадскім і на паўночным захадзе — з Чавускім.

Агульная тэрыторыя 107 766 га, у тым ліку зямель сельскагаспадарчага прызначэння 70,3 %, лясоў 29,2 %, зямель гарадоў і іншага прызначэння 0,5 %. З зямель сельскагаспадарчага прызначэння ўжыткоўнай 92,4 %, неўжыткоўнай 7,8 %. Усяго насельніцтва ў раёне 44 943 чалавек. Нацыянальны склад раёна ў працэнтах: беларусаў 92,03, яўрэяў 0,33, палякаў 0,03, рускіх 0,23, літоўцаў 0,05, латышоў 0,02, іншых 0,31.

Па тытульнаму спісу 1931 г. у раёне налічвалася 21 прадпрыемства, з лікам рабочых 200 чалавек. Прадпрыемствы гэтыя падзяліліся так: электрастанцый 2, кузнечная арцель 1, смалакурная 1, цагельны завод 1, цагельная арцель 1, воўначасальная 1, абутковая 1, швейная 1, фарбавальня 1, сталярная 1, паравы млын 1, вадзяных млыноў 2, вадзяных млыноў з крупарушкамі 2, крупарушак 3, хлебапякарня 1, бровар 1.

У 1932 г. існавала 8 дзяржаўных, 8 кааператыўных, а ўсяго 16 прамысловых прадпрыемстваў. Працавала 219 чалавек.

Спажыўкааперацыя раёна мае 11 сельпо з гандлёвай сеткай 32 адзінкі (9980 пайшчыкаў).

У раёне выяўлены наступныя карысныя выкапні: гліны — у в. Мірагошч і ўр. Круты Роў, ур. Баранаў Лог, Лубянец; пяскі — у в. Ветрына і Гронава; фасфарыты — у в. Вагар, Вусце, Гронаў, Мірагошч, Ветрына, Селішча, Горкі, Журавель і с. Міхалін; крэмень — у в. Горкі; жалязнякі — у в. Вохар. Па ўсім раёне налічваецца 2010 га балот са значнымі запасамі торфу.

Саўгасаў у раёне 2: «Чэрыкаў», са свінагадоўчай спецыялізацыяй, плошчай сенапахаці 1877 га і рабочых 69; «Ударнік» са свінагадоўчай спецыялізацыяй, плошча сенапахаці — 1548,5 га і рабочых 101.

Сетка навучальных устаноў раёна: 54 чатырохгодкі, у іх 145 настаўнікаў і 4734 вучні, 12 ШКМ, дзе 42 настаўнікі і 2965 вучняў. Працэнт пісьменнасці па раёну 92,8.

Партарганізацыя раёна складаецца з 25 ячэек, з агульнай колькасцю камуністаў 279 чалавек. Налічваецца 36 камсамольскіх ячэек, якія аб'ядноўваюць 570 камсамольцаў.

У раёне ёсць палітаддзел, арганізаваны пры саўгасе «Чэрыкаў».

У раёне выдаецца раённая газета «Сацыялістычная перамога».

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Усе раёны БССР. Мн., 1933. С. 340—342.

* * *

У 1926 г. у Чэрыкаве пражывала 4442 чалавек. Асноўным заняткам жыхароў горада было земляробства, дробны гандаль і рамесніцтва. Зямельная плошча складала 2461 дзес., у тым ліку пад раллю было занята 1846,6 дзес., сенакос 39, дрыгву 95, лес 174, нявыкарыстанай зямлі налічвалася 307 дзес. Сельскай гаспадаркай займаўся 391 двор, такім чынам на кожную гаспадарку прыходзілася 4,75 дзес. зямлі. Гэта зямля засявалася наступнымі культурамі: жытам 420 дзес., пшаніцай 43,5, ячменем 112, аўсом 48,

грэчкай 399, вікай 18, бульбай 150, ільном 7, каноплямі 2, просам 0,5, іншымі культурамі 46 дзес. У Чэрыкаве знаходзілася 327 коней, 430 кароў, 631 авечка, 355 свіней. Аднаго каня мела 291 гаспадарка, двух — 11, трох — 4 гаспадаркі. З сельскагаспадарчых прылад жыхары мелі 2 сахі, 322 плугі, 392 бараны, 5 малацілак, 5 веялак, 31 саломарэзку.

26—27 верасня 1926 г. адбылася раённая сельскагаспадарчая выстаўка, на якой насельніцтва горада дэманстравала 115 экспанатаў, 16 з іх былі адзначаны прэміямі. На тэрыторыі горада дзейнічала сельскагаспадарчая арцель «Эмес», у якую ўваходзіла 7 сем'яў (35 чалавек). Прамысловасць была прадстаўлена дзяржаўным лесапільна-мукамольным заводам (9 чалавек), прыватным млынам (4 чалавекі) і смалакурняй (3 чалавекі). Саматужная вытворчасць была нязначнай. Апрацоўкай металу займаліся 38 чалавек, апрацоўкай дрэва 21, апрацоўкай мінералаў 4, харчовай вытворчасцю 23, вытворчасцю скураных і мехавых вырабаў 4, апрацоўкай воўны 3, вырабам адзення і прадметаў туалету 76, апрацоўкай пянькі 3 чалавекі. Дзейнічала спажывецкая (320 членаў, 2 крамы) і сельскагаспадарчая (185 членаў, 1 крама) кааперацыі.

Гарадскі бюджэт Чэрыкава складваўся з мясцовых зборaў і падаткаў, прыбыткаў ад камунальнай маёмасці і камунальных прадпрыемстваў, ад продажу непатрэбнай маёмасці, адлічэнняў ад дзяржаўнага прамысловага падатку. Сродкі гарсавет размяркоўваў паміж кіраўніцкім апаратам, навучальнымі ўстановамі, дзіцячымі садамі, бібліятэкай, Нардомам і партпрафклубам, дапрызыўным пунктам, расходаваў на пенсіі і дапамогі, камунальную гаспадарку і іншыя патрэбы. У Чэрыкаве было 2 пажарныя каманды (65 чалавек), 6 машын, 6 вадавозак, 7 драбін.

Працавалі хата-чытальня, бібліятэка, Народны дом, партпрафклуб. У трох школах (2 сямігодкі і 1 яўрэйская школа) навучалася 80 % дзяцей горада. Улетку дзейнічалі 3 дзіцячыя пляцоўкі. Жыхары горада выпісвалі ў 1926 г. 429 газет і часопісаў. Працавала прыймальная радыёстанцыя.

У 1931 г. насельніцтва Чэрыкава складала 5062 чалавек. У горадзе знаходзіліся ўрачэбны участак са стацыянарам на 35 ложкаў і зубным кабінетам, амбулаторыя гарадскога тыпу, аптэка. Тут жа была трахаматозная бальніца гарадскога тыпу на 40 ложкаў у сувязі са значным распаўсюджваннем гэтай хваробы.

Пашыраўся лік прамысловых прадпрыемстваў. У 1935 г. працавалі дрэваапрацоўчая, рамонтная, кравецкая і шавецкая майстэрні, 2 цагельныя, 2 смалакурныя заводы, лесапільня, маслазавод, хлебапякарня, электрастанцыя, вадзяны млын, 2 кузні.

У раёне было 2 саўгасы, адзін з іх знаходзіўся ў Чэрыкаве. Спецыялізаваўся на свінагадоўлі, меў пад сенажаццю 1877 га, у саўгасе працавала 69 чалавек.

А. Шчарбатаў.

Гісторыя выключэння з калгаса

Здаралася, што з калгасаў беспадстаўна выключалі бядняцкія і серадняцкія гаспадаркі. У газеты, райкалгассаюзы ішлі скаргі калгаснікаў. Наркамземам і Калгасцэнтрам БССР была прынята пастанова «Аб парадку разгляду спраў пры выключэнні з калгаса» ад 3 жніўня 1932 г. Згодна з гэтай пастановай, пытанне аб выключэнні калгаснікаў са складу калгаса магло вырашацца на агульным сходзе калгаснікаў большасцю

галасоў. На сходзе павінна было прысутнічаць не менш дзвюх трэціх членаў арцелі. У пратакол агульнага сходу неабходна было падрабязна запісаць усе прычыны, па якіх выключаецца калгаснік. Пазнаёмімся з іншым падыходам да гэтай справы.

ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА № 8 ПАСЯДЖЭННЯ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ Ў КАЛГАСЕ «КУЛЬТУРА».

18 лютага 1931 г.

Прысутнічалі:

1. Хайкін сябр РКС.
2. Кавалёў сябр с/с.
3. Карпенка адк. сакр. яч. КПБ.
4. [...] батрачка — калгасніца.
5. Раманята Л. бяднячка— —«—.
6. Мельнікаў І. батрак — калгаснік.

Слухалі: Аб т. Мурашку Антосю, быўшы чыноўнік у працы калгаса ніякога дзела не прымаў. Да ўступлення ў калгас разбазарваў маёмасць.

Ухвалілі: т. Мурашка Антося выключыць з сяброў к-са.

З арыгіналам згодна.

Рахункавод:

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 338, воп. 1, спр. 110, л 16. Копія.

З ПІСЬМА АНТОНА ПЯТРОВІЧА МУРАШКІ Ў РЭДАКЦЫЮ «КРЕСТЬЯНСКОЙ ГАЗЕТЫ»

5 ліпеня 1931 г.

...18 гадоў я праслужыў на станцыі Мінск былой Маскоўска-Брэсцкай чыгункі ў якасці..., а потым вагаўшчыком, памочнікам наглядчыка пакгауза і апошніх 4 гады наглядчыкам пакгауза. У 1903 годзе перавёўся на станцыю Лібава Таварная былой Лібава-Роменскай чыгункі ў якасці наглядчыка пакгауза. У 1917 годзе я звольніўся і прыехаў на радзіму. У пенсіі за чыгуначную службу мне было адмоўлена ў сувязі з тым, што я меў гаспадарку і 9 дзесяцін зямлі. Усё, што я меў у гаспадарцы — інвентар, збожжа на абсемяненне яравых 26 пуд., жыта 18 пуд., бульбы 70 пуд., 1 каня, 2 каровы, я здаў у калгас «Культура» вёскі Лютраўка Лабанаўскага с/с, які арганізаваўся ўвосень 1929 г. 18 лютага 1931 г. мяне выключылі з калгаса па чыстцы, што відаць па копіі пратакола № 8, якую прыкладваю. Усё, што ўказана ў пратаколе, хлусня. Што я не чыноўнік, відаць з пашпарта... і што я не разбазарваў маёмасць, а здаў усё, што было, гэта пацвердзілі ўсе члены калгаса на агульным сходзе і крычалі гэта подласць. На што цяперашні старшыня калгаса Новікаў адказаў калгаснікам, што пастанову камісіі па чыстцы ён адмяніць не можа. Камісія па чыстцы, акрамя таварыша Хайкіна і былога старшыні Карпенка, заявіла на тым жа агульным сходзе, што іх ашукалі і што яны падпісвалі пратакол не за выключэнне Мурашкі, а за выключэнне іншых, сапраўдных шкоднікаў.

Што датычыцца таго, што я ў працы калгаса ніякога ўдзелу не прымаў, гэта таксама хлусня. Нягледзячы на старасць, я прасіў работу і працаваў усё лета на ўборцы. Увосень я прастудзіўся на малацьбе і хварэў 6 тыдняў.

...і яшчэ я стаў шкоднікам за тое, што патрабаваў акуратна выходзіць на работу, а таксама прасіў старшыню Карпенка і тав. Хайкіна высветліць, дзе падзеліся 10 калгасных авечак, якіх па падліку не хапала, хто іх з'еў, да гэтага часу не высветлена. За гэта мяне праўленне выключыла з калгаса. Абагулілі пад калгас мой садок з 15 дрэў, які ад хаты знаходзіцца ў адным сажні, прысядзібны агарод аднялі, далі толькі 10 сотак, дзе я пасеяў 6 пудоў бульбы. Вярнуць мне здадзеную ў калгас маёмасць праўленне адмовілася і ў адлічэнні працэнтаў на старых непрацаздольных таксама адмоўлена. Нібыта такі лозунг ёсць, хто не працуе, той не есць, а маёй маёмасцю калгас карыстаецца.

Што мне і маёй сям'і застаецца рабіць, калі мы ўсе інваліды працы і непрацаздольныя. Сям'я мая зараз складаецца з трох душ, дзяцей няма. Мне 74 гады, жон-

ка хворая, страціла зрок, 62 гады, сястра жонкі, удава... Звяртаюся з просьбай расследаваць маю справу аб неправільным выключэнні мяне з калгаса. Пры расследаванні выявяцца сапраўдныя шкоднікі. Я ў клопатах ужо 4 месяцы і ўсё атрымліваю адказы.

Садок у мяне аднялі неправільна. Ні ў адным калгасе Чэрыкаўскага раёна садкі не абагульнялі. Гэта толькі ў нас. Прашу вашага хадайніцтва, каб я мог карыстацца садком. Гэта будзе хоць маленькі, але пражытак для маёй сям'і. Просім разгледзець гэта пытанне хутчэй, бо калгаснікі ўжо робяць праверку і пачынаюць зрываць недаспелыя яблыкі, гаворачы, што гэта нашы. На адказ прыкладваю 2 паштовыя маркі і прашу прабачэння, што патурбаваў.

Антон Пятровіч Мурашка.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 338, воп. 1, спр. 110, л. 8—13. Арыгінал.

АКТ ПА ДАРУЧЭННЮ ЧЭРЫКАЎСКАГА РКС

2 жніўня 1931 г.

Я, інструктар Князькоў, высвятляў справу на месцы аб выключэнні з калгаса Мурашка Антося (калгас «Культура»). На месцы высветлілася, што ён маёмасці не разбазарваў і ў працы ў калгасе часткова ўдзельнічаў. Але па высвятленню аб яго ранейшых паводзінах паказваюць калгаснікі .... Гр-н Мурашка Антось у 1930 г. быў замечан у вараўстве жыта з гумна і ўзяцця каровы з абагуленага стада. За што Мурашка палучаў пакаранне — вымову. Так што далейшае прэбываніе Мурашка Антося ў калгасе немагчыма, і камісія па чыстцы зрабіла правідлова, што выключыла Мурашку Антося.

Інструктар РКС Князькоў.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 338, воп. 1, спр. 110, л. 6. Арыгінал.

ЧЭРЫКАЎСКАМУ КАЛГАССАЮЗУ

2 лістапада 1931 г.

З дасланага Вамі матэрыялу па справе аб выключэнні са складу сяброў калгаса «Культура» Лабанаўскага с/с Антося Мурашкі выстарчальна не ўстаноўлена правідловасць выключэння.

Як відаць з пратакола камісіі па чыстцы калгаса «Культура» ад 18/II-г.г., Мурашка Антось выключаецца з калгаса, як былы чыноўнік, не прымаўшы ніякага ўдзелу ў працы калгаса і разбазарваючага перад уступленнем у калгас маёмасць.

Пры праверцы на месцы правідловасць выключэння Мурашкі, зробленай інструктарам Калгассаюза і зафіксаванай у складзеным ім ад 2/VIII-г.г. акце, устаноўлена, што Мурашка маёмасці не разбазарваў і ў працы калгаса часткова ўдзельнічаў. У сваёй скарзе Мурашка тлумачыць, што ён актыўна ўдзельнічаў у працы калгаса, за выключэннем часу сваёй хваробы. Між іншым, інструктарам РКС на месцы ўстаноўлена, што Мурашка Антось у 1930 г. быў замечан у крадзяжу з гумна жыта і ўзяцця каровы з абагуленага статку. Прычым новыя акалічнасці, раней пры чыстцы не ўстаноўленыя, паслужылі, мабыць, падставай для пацвярджання РКС пастановы аб выключэнні Мурашкі камісіі па чыстцы калгаса. Уноў адкрыўшыеся акалічнасці дэталёва не ўстанаўліваюць віноўнасці Мурашкі, бо ўказваецца, што Мурашка быў толькі замечаны ў крадзяжу жыта з гумна, чым, аднак, не ўстанаўліваецца самы факт кражы і прыналежнасці аб'екта кражы.

Чаму Калгасцэнтр БССР просіць растлумачыць падрабязней, калі гэта неабходна будзе, праверыўшы на месцы, ці быў учынен Мурашкай крадзеж жыта і каму яно належала, а таксама пры якіх акалічнасцях Мурашка з абагульненага статку ўзята была карова, пасля чаго матэрыялы пераслаць з Вашым заключэннем Калгасцэнтру не пазней 10/XI-31 г.

Сябр праўлення Калгасцэнтра

Юрысконсульт Гулякевіч.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 338, воп. 1, спр. 110, л. 4. Копія.

НА АДНОСІНУ БЕЛКАЛГАСЦЭНТРА

3 снежня 1931 г.

Высветліўшы ў другі раз на месцы пра выключэнне са складу калгаса гр-на Мурашка Антося (калгас «Культура» Лабанаўскага с/с), паведамляю, што гр-н Мурашка выключан са складу калгаса камісіяй па чыстцы не правідлова, як мной было раней указана ў акце. Але на месцы ўстаноўлена, што Мурашка раней служыў на чыгунцы весаўшчыком і наглядчыкам на таварнай станцыі. Пасля Кастрычніковай рэвалюцыі Мурашка стаў жыць на гаспадарцы ў вёсцы Лютраўка Лабанаўскага с/с і меў у сваёй гасп... батрака і батрачку. Паследні батрак быў у 1926 годзе, на якога маецца дагавор. Мурашка мае непрацаздольную сям'ю з 3 душ. За час прэбывання ў калгасе Мурашка прымаў удзел у працы, але не актыўны, як ён піша ў сваёй скарзе, хоць ён і мае 74 гады, ... Мурашка выпрацаваў каля 29 працадні. Мурашка меў пакаранне за крадзеж жыта з калгаснага гумна, прынадляжачага калгасу, якое абнаружана было ў яго амбары і за замену каровы з абагуленага стада. За ўсё гэта праўленнем калгаса Мурашка быў выключан з калгаса, але агульны сход гэтай пастановы не зацвердзіў, а даў Мурашку вымову.

А пагэтаму з свайго боку лічу прэбыванне ў калгасе Мурашка немагчымым. Таму камісія па чыстцы дэталёва не указала на недапушчальныя выпадкі Мурашкам як сябром калгаса.

Інструктар РКС Князькоў.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 338, воп. 1, спр. 110, л. 2. Арыгінал.

Па ліку пятая

Агаф'я Іванаўна Фядосенка — старшыня калгаса, а затым старшыня сельскага Савета, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Нарадзілася ў 1896 г. у сям'і селяніна Івана Аляксеевіча Сахненкі. Была яна па ліку пятай.

— Зямлі ў мяне не было,— успамінаў пазней І. А. Сахненка,— не было і каровы. Жылі бедна, а сям'я расла. Шыў шубы, іншую вопратку з матэрыялаў дамашняга вырабу. Летам з жонкай хадзілі працаваць да паноў. Такі лёс чакаў і дзяцей. Як толькі дзеці падрасталі, іх адпраўлялі ў заработкі.

Але хто з бацькоў не марыць аб лепшай долі дзяцей? Малодшую Агаф'ю аддалі вучыцца ў Верамейскую прыходскую школу. І хоць астатнім членам сям'і працаваць прыходзілася яшчэ больш, дзяўчынку ад вучобы не адрывалі, пакуль не скончыла. Да таго ж, у яе выявіліся добрыя здольнасці.

Бацькі вельмі хацелі вучыць малодшую дачку далей, марылі аб паступленні ў Чэрыкаўскае вучылішча. Але сродкаў, каб плаціць за вучобу, не было. З гэтага часу ў Агаф'і пачалося другое жыццё. Служыла ў чэрыкаўскіх багацеяў, працавала ў панскіх фальварках. Незадоўга да рэвалюцыі дзяўчына пакідае родныя мясціны і ў пошуках лепшага жыцця адпраўляецца ў Маскву. Працавала на шакаладнай фабрыцы. У кастрычніцкія дні сялянская дзяўчына прайшла сапраўдную рэвалюцыйную школу. Работніцы фабрыкі (іх было большасць) актыўна дапамагалі чырвонагвардзейцам.

А. І. Фядосенка.

Праз некалькі гадоў вяртаецца Агаф'я Сахненка ў родныя мясціны. Працуе на зямлі. Тут знайшла свайго суджанага, выйшла замуж і прыняла прозвішча Фядосенка.

Рабочая школа жыцця і рэвалюцыйнай барацьбы, якую А. Фядосенка зведала ў Маскве, не праходзяць дарэмна. У пару калектывізацыі вёскі Агаф'я Іванаўна ў ліку першых уступае ў калгас, які ствараўся тады ў в. Паходавічы.

Прынцыповасць і настойлівасць жанчыны не засталіся незаўважанымі аднавяскоўцамі. У 1934 г. камуністы і камсамольцы вылучылі яе на пасаду брыгадзіра. Кандыдатура была падтрымана калгаснікамі.

Ішоў час, і некалі адстаючая брыгада стала лепшай у калектыўнай гаспадарцы. Не ведала пакою брыгадзір нават ноччу. Калі, бывала, бачыла, што жывёла не дагледжана, карміла, паіла сама. А неруплівы калгаснік у гэты час назіраў за яе працай. І гэта для лайдака было самым вялікім пакараннем.

Вясной 1937 г. А. І. Фядосенка выбіраюць старшынёй праўлення калгаса «Бальшавік». Яшчэ з большым энтузіязмам узялася яна за арганізацыйнае ўмацаванне гаспадаркі, павяла барацьбу за больш высокія ўраджаі.

Наступны год быў адзначаны яшчэ больш значнай падзеяй у жыцці Агаф'і Іванаўны. Яна становіцца членам урада, дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі, старшынёй Верамейскага сельскага Савета. Сакратар Чэрыкаўскага РК КПБ І. Д. Вятроў пісаў у 1938 г. у раённай газеце «Сацыялістычная перамога»: «Жыццёвы шлях кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР тав. Фядосенка Агаф'і Іванаўны — гэта шлях соцень і тысяч савецкіх жанчын-сялянак, якія дзякуючы перамозе сацыялізму ў нашай краіне, дзякуючы бацькоўскім клопатам партыі аб людзях, з цёмных, малаадукаваных, прыціснутых бядой у мінулым, выраслі ў выдатных кіраўнікоў, дзяржаўных дзеячаў».

Праца старшыні сельскага Савета захапіла жанчыну. Яна заўсёды сярод людзей. Шмат увагі ўдзяляе рабоце школ, клубаў, клапоціцца аб развіцці калгасаў, рамонце дарог.

Вайна. А. І. Фядосенка працягвала работу па эвакуацыі людзей, дзяржаўнай і калгаснай маёмасці, калі ў Верамейкі ўварваліся фашысты. Здраднікі першым назвалі прозвішча дэпутата Вярхоўнага Савета БССР. Яна не прыняла прапановы ворага аб супрацоўніцтве.

Пахавалі А. І. Фядосенка тайком ад фашыстаў. Зараз на месцы захавання ў Верамейках стаіць абеліск з чырвонай зоркай. Адна з вуліц вёскі носіць яе імя.

Ф. Рудзікаў.

Старшыня райвыканкама

З прыездам у раён Віктар Дзмітрыевіч Кучаравы адразу акунуўся ў справы. Верны сваёй прывычцы быць сярод людзей, ён большую частку часу імкнецца бываць у калектывах, актывізуе работу мясцовых Саветаў. Вядомую цікавасць тут прадстаўляюць дакументы. У той час райвыканкам шмат працаваў над ліквідацыяй малапісьменнасці. У распрацаваных пры непасрэдным удзеле Кучаравага мера-

прыемствах гаворыцца: «...другая пяцігодка — не толькі ліквідацыя непісьменнасці, а і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. А гэтаму ў нас мала ўдзяляецца ўвагі, асабліва райана, якое аднесла гэтую работу на другі план. А ў нас 1830 чал. непісьменных, 2957 — малапісьменных. Таму абавязак райана сумесна з райкомам камсамола не пакінуць па-за ўвагай усіх 14—18-гадовых падлеткаў і работу пра-

водзіць у адпаведнасці з патрабаваннямі партыі. Для ліквідацыі малапісьменнасці варта паўней выкарыстоўваць магчымасці хат-чытальняў, чырвоных куткоў».

Прынцыпова, зацікаўлена, не затушоўваючы недахопы, вырашаў пытанні Віктар Дзмітрыевіч. Такі стыль работы выразна акрэсліваецца ва ўсіх яго дзеяннях і ўчынках. Гэта было яго жыццёвае крэда, мера ўласнай годнасці і ацэнка дзеянняў другіх. Ён востра і прынцыпова выступаў на раённых партсходах, пленумах райвыканкама. І, вядома, не кожнаму было даспадобы такое. У прыватнасці, бюро райкама партыі 22 сакавіка 1937 г. указала першаму сакратару райкама КП(б)Б І. Д. Вятрову і старшыні райвыканкама В. Дз. Кучараваму на тое, што ва ўзаемаадносінах паміж імі няма патрэбнага ўзаемаразумення.

У рэшце рэшт Віктара Дзмітрыевіча абвінавацілі ў тым, што ён пакрывае людзей, якія выкарыстоўваюць антысавецкія метады ў рабоце. Гэта здарылася летам 1937 г. А праз год у адным з дакладаў 22 мая 1938 г. канстатавалася, што Віктар Дзмітрыевіч выкрыты і арыштаваны «за развал савецкай работы».

Нечаканы і жорсткі ўдар лёсу. Тым больш для чалавека, які ўсяго сябе аддаваў рабоце, многае рабіў для развіцця эканомікі і культуры раёна. Віктар Дзмітрыевіч з дапамогай жонкі Б. Х. Сухавіцкай — члена партыі з 1925 г.— дабіваецца перагляду яго справы. Пры больш дэталёвым знаёмстве ўсе «абвінавачванні» супраць Кучаравага В. Дз. былі адхілены.

Віктар Дзмітрыевіч у лістападзе 1938 г. зноў вяртаецца ў Чэрыкаўскі раён. Ён вырашыў даказаць гэтым, што не ў крыўдзе на людзей, якія нашкодзілі яму.

19 лістапада 1938 г. Віктара Дзмітрыевіча прызначаюць начальнікам райліта раёна. Менш чым праз

В. Дз. Кучаравы.

месяц бюро райкама партыі ўсклала на Кучаравага В. Дз. партыйнае даручэнне: быць палітруком вучэбнага пункта райсавета Асавіяхіма. 13 снежня таго ж года Віктар Дзмітрыевіч едзе на курсы палітрукоў Асавіяхіма ў Бабруйск. Там ён папоўніў свае веды і, вярнуўшыся ў Чэрыкаў, цалкам аддаўся новай рабоце.

22 лютага 1939 г. Віктара Дзмітрыевіча прызначаюць на новы ўчастак работы. Ён — дырэктар Чэрыкаўскай школы механізацыі сельскай гаспадаркі, рыхтуе тэхнічныя кадры.

А калі пачалася вайна з белафінамі, Віктар Дзмітрыевіч просіцца на фронт. І дабіваецца свайго: ён — старшы палітрук палка 8-й стралковай дывізіі, а з 11 лютага 1940 г.— батальённы камісар.

Вось наградны ліст, прадстаўлены Ваенным Саветам 13-й арміі, падпісаны камкорам Парусінавым і карпусным камісарам Запарожцам: «Таварыш Кучаравы Віктар Дзмітрыевіч быў адным з лепшых палітработнікаў палітаддзела 8-й стралковай дывізіі. Энергічны, ініцыятыўны, уважлівы і чулы таварыш, ён хутка заваяваў аўтарытэт у людзей, з якімі працаваў.

Таварыш Кучаравы загінуў смерцю героя 12 лютага ў баях за Кірку Ледолаа. Напярэдадні, 11 лютага, таварыш Кучаравы быў назначан камісарам першага батальёна 151-га

стралковага палка. Таварыш Кучаравы старанна рыхтаваў свой батальён да наступлення, правяраў боездольнасць рот, гутарыў з байцамі, заклікаў іх да смелых, рашучых дзеянняў супраць ворагаў Радзімы.

На другі дзень ён павёў свой батальён у бой. Пад прыкрыццём бронешчыткоў батальён прасоўваўся да супрацьтанкавых надаўбняў праціўніка. Таварыш Кучаравы ішоў наперадзе байцоў свайго батальёна. Калі батальён наблізіўся да абарончай лініі праціўніка, таварыш Кучаравы падняўся з заклікам «За Радзіму, уперад! За мной!». І павёў байцоў наперад.

Варожая куля раніла таварыша Кучаравага ў нагу, але ён працягваў, падбадзёрваючы байцоў, паўзці наперад! Параўняўшыся з чырвонаармейцам Тарасавым, тав. Кучаравы сказаў яму: «Перадай камісару і сябрам, што калі я памру, то памру за Радзіму героем». Пасля гэтага ён падняўся і з крыкам «За мной, таварышы! Перамога за намі!» зноў павёў байцоў за сабой. У гэты час другая варожая куля паразіла таварыша Кучаравага.

Таварыш Кучаравы дастойны высокага звання Героя Савецкага Саюза».

Яно яму было прысвоена 7 красавіка 1940 г. Грамата Героя Савецкага Саюза на імя камісара батальёна Віктара Дзмітрыевіча Кучаравага была падпісана ў 1963 г.

Л. Лявінскі.

ЗАКЛЮЧНАЯ ПРАМОВА В. Дз. КУЧАРАВАГА НА ПЛЕНУМЕ ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

27 сакавіка 1936 г

Пленум раённага выканаўчага камітэта склікан не выпадкова, асабліва ў такі адказны час. Скліканне пленума выклікана выключна нездавальняюч[ым] становішч[ам] з падгатоўкай да вясновага севу па раёну. Каб ліквідаваць адставанне з падгатоўкай да вясновага севу, бюро РК і прэзідыум РВК паслалі 65 асоб з раённага актыву ў калгасы і саветы. Аднак гэта мер[а] недастаткова, калі старшыні калгасаў і брыгадзіры і старшыні саветаў будуць бяздзейнічаць па мерапрыемствах падняцця ўраджайнасці. Даклады, прасланыя пленумам, і выступленні старшынь саветаў і калгасаў кажуць аб паслабленні работы калгасаў і саветаў у падрыхтоўцы да першай стаханаўскай вясны і не могуць задаволіць пленум, асабліва ў галіне правядзення мерапрыемстваў па павышэнні ўраджайнасці. Усё гэта адставанне з падгатоўкай да севу тлумачыцца недысцыплініраванасцю нашага актыву і гэта падцвярждаецца тым, што назначанае пасяджэнне гэтага пленума на 11 гадзін, едва пачалі работу пленума ў 3 гадзіны дня, як гэта магчыма характарызаваць як не дробнабуржуазнай распушчанасцю рада ўдзельнікаў пленума, з чым у далейшым патрэбна весці рашучую барацьбу. Па шэрагу калгасаў не хапае насення, а па шэрагу калгасаў маецца некандыцыйнае зярно, гной вывозіцца дрэнна, план выканан толькі на 32 % і нельга верыць, што коні заняты на лесавывазках, калі план лесавывазак выканан на 42 %. Задачы, пастаўленыя ЦК і СНК аб павышэнні ўраджайнасці,раёнам не выкананы, нягледзячы, што ўсе саветы і калгасы іх знаюць дастаткова. План загатоўкі і вывазкі торпу выканан толькі на 50 %, вытворчыя планы па брыгадах не складзены, план лесавывазак не выканан і гэта ўсё ўсугубляе выкананне мерапрыемстваў па вясновaму севу, так як мы не маем права не выконваць дзяржаўных заданняў.

Сац. спаборніцтва паміж саветамі, калгасамі, брыгадамі, звеннямі, асобнымі калгаснікамі разгорнута слаба. Стаханаўскія метады работы не падхвачаны, не зроблена вывадаў, што пры адсутнасці стаханаўскіх метадаў работы, мы не зможам забяспечыць паспяховага і дабраякаснага выканання мерапрыемстваў пасяўной кампаніі. Саветы і калгасы да гэтага часу не заняліся пытаннем арганізацыі дзетясляў і пляцовак і праяўляюць ігнарыраванне жаночай працы ў калгаснай вытворчасці. Слаба работае МТС у галіне выбаркі і вывазкі гаручага, да гэтага часу не вывезена 13 тон, што можа адбіцца на паспяховую работу трактарнага

парка. МТС, як і райза, літаральна не ведаюць становішча сваіх калгасаў і калгасных кадраў. Правы саветы і калгасы, якія крытыкавалі работу райза за позняе давядзенне планаў пасяўной кампаніі, які апушчан толькі 16—20 сакавіка г. г. Трэба старшыням саветаў і старшыням калгасаў зразумець, што выкананне дабраякасна вясновага севу азначаец... паляпшэнне матэрыяльных і культурных запатрабаванняў калгаснікаў і выкананне ўказання тав. Сталіна аб барацьбе на працягу 3—4 год за 7—8 мільярдаў пудоў зярна. Работнікі саветаў у большасці вопытныя, знаюшчыя работу. Да гэтага часу няма яшчэ барацьбы за сапраўднае бальшавіцкае выпаўненне плана жывёлагадоўлі. Такі выпадак, як 83 аборты конематак і невыясненне прычын да гэтага часу, мне, як новаму чалавеку, здаецца, калі прыняць пад увагу вялікае распаўсюджванне па раёну эпідэміі менінгіта і чумы, інфекцыонныя аборты конематак, за якія ветперсанал скрывае драпежніцкія адносіны да каня паасобных жулікаў, надзвычай вялікі адыход маладняку, свіней, цялят, ягнят, як напрыклад: калгасы «Чырвоны штурмавік» Ушакоўскага сельсавета, «Светлы шлях» Мірагашчанскага сельсавета, у якіх на 30 % адыхода па цялятах і на 100 % адыхода па маладняку свіней, даюць мне на пленуме райвыканкома прадумаць аб недобрасумленнай рабоце ст. ветурача тав. Лукашэнка, участковых ветфельдшараў і заатэхнікаў райза. Выступленне дырэктара МТС тав. Лучанскага паказала, што альбо ён не разумее ролі МТС ці ён радзі красівай шуткі выступіў. Работнікі райза і МТС зачастую даюць распараджэнне калгасам, не аналізіруя правільнасць і змест сваіх распараджэнняў. Аграперсанал не ў дастатковай ступені працуе над павышэннем ураджайнасці і ўмацаваннем калгасаў. Пленум райвыканкома праслухаў аб становішчы ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці па раёну. Праўда, гэта пытанне пастаўлена са спазненнем, нада прама сказаць, што гэтаму важнаму пытанню не даецца належнай увагі з боку саветаў і калгасаў і нават прэзідыума РВК, што сведчыць аб тым, што толькі паўтары-дзве нядзелі як прэзідыум РВК пачаў заслухоўваць гэтыя пытанні на прэзідыуме РВК, заслухоўвая асобных дырэктараў школ і старшынь саветаў. Трэба паняць, што неграматных паслаць у армію мы не можам. Патрэбна саветам і калгасам помніць, што яны павінны стварыць усе ўмовы для непісьменных і малапісьменных, каб яны маглі рэгулярна наведываць школы. Некаторыя саветы ў выкананні фінплана схаваліся за сярэднія раённыя лічбы і не арганізавалі да гэтага часу поўнае выкананне фінплана па ўсіх паказчыках. Трэба помніць, што такой расхлябанасці цярпець далей немагчыма і мы вымушаны будзем весці самую рашучую барацьбу з праяўленнем усякага рода расхлябанасці і недысцыплініраванасці, прыцягваць да адказнасці парушыцелей цвёрдай дзяржаўнай дысцыпліны.

Давайце, таварышы, цаніць лепшых, даюшчых высокія абразцы работы. Нам адставаць няма падстаў і мы ўпаўне спасобны і можам выпаўніць усе задачы, пастаўленыя перад намі партыяй і ўрадам і выведзем раён у адзін з перадавых раёнаў нашай ардэнаноснай БССР.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 6, воп. 1, спр. 3044, л. 99—101. Копія.

За авалоданне тэхнікай

З пісьма курсантак-трактарыстак Чэрыкаўскай МТС да ўсіх дзяўчат-калгасніц Чэрыкаўскага раёна

...Перш чым папасці на курсы трактарыстаў пры Чэрыкаўскай МТС, нам прыйшлося сустрэцца з такімі з'явішчамі, калі некаторыя адсталыя калгаснікі і старшыні калгасаў гаварылі: «Гэта не жаночая справа, якія могуць быць дзяўчаты-трактарысткі».

Некаторых з нас праўленні ўпарта не адпускалі на курсы, але, нягледзячы на гэта, мы ўсё ж засталіся вучыцца. Праўда, былі і некаторыя з нас, якія паслухаліся адсталых думак і прыйшлі на курсы з вялікай апаскай, а можа, і на самой справе нам будзе цяжка асвоіць трактар. І вось цяпер, правучыўшыся 2 з паловай месяцы, мы парашылі звярнуцца да вас, дзяўчат-калгасніц, і падзяліцца з вамі вопытам нашай вучобы.

Нас абучалася на курсах 17 дзяўчат, прычым трое дзяўчат вучыліся ў групе на адзін месяц раней скліка-

най. Яны ўжо скончылі курсы трактарыстаў. Адна з іх тав. Аляксеенка, як лепшая курсантка, паслана на курсы пам. камбайнераў, другая тав. Мельнікава першая ва ўмовах Чэрыкаўскага раёна павяла трактар на калгасныя палі. Нас засталося на курсах 14 дзяўчат. З боку праўленняў калгасаў мы і да апошняга часу атрымліваем слабую дапамогу, але ўсё ж па вучобе не адстаём, маюцца сярод нас выдатнікі і да выпуска падыходзім з добрымі ведамі па засваенню тэхнікі трактарнай справы.

Мы заклікаем вас, дзяўчат-калгасніц, пры адкрыцці набора на курсы трактарыстаў ісці вывучаць трактары, бо цяжкасцей у гэтым няма, было б толькі жаданне. Мы ганарымся тым, што хутка станем трактарысткамі, дакажам на справе, на што здольны жанчыны.

Васількова, Пухоўская, Маскалёва, Тамашова, Кавалёва, Балматкова, Секушэнка, Разумова, Салянкова, Шах, Касмачова, Раманава, Зычкова, Халаева.

Газета «Сацыялістычная перамога», 16 красавіка 1936 г.

Трактарыстка Арына

Ананій Сямёнаў слыў у Сакалоўцы вясковым асветнікам, чалавекам вучоным, бо нягледзячы на тое, што ў самога за плячыма было ўсяго тры класы царкоўнапрыходскага вучылішча, настаўнічаў у мясцовай пачатковай школе, адкрываючы вясковай дзятве шлях у краіну ведаў. Хоць і не вельмі адукаваны, Сямёнаў цягнуўся да ўсяго новага, перадавога, рабіў усё для таго, каб яго дзеці вучыліся. Калі пачалася калектывізацыя, сям'я яго адной з першых уступіла ў калгас. У той час на вёсцы толькі і гаворкі было пра незвычайных «жалезных» коней. На курсы трактарыстаў у горад падаваліся вясковыя хлопцы, у ліку іх быў і сын Ананія — Аляксандр.

І вось ужо перастаў быць дзівам трактар, які мог замяніць некалькі коней адразу. Новае стала звычайным. Але калі праз нейкі час на курсы трактарыстаў паехала Арына Сямёнава, гэта выклікала вельмі шмат розных размоў. Дзеўка! Ды на трактар!.. Арына ж, паспяхова скончыўшы курсы ў Крычаве, вярнулася ў Сакалоўку. А праз нейкі час з таго ж Крычава прыгнала трактар сваім ходам. Усе вяскоўцы з захапленнем глядзелі, як коціць па пыльнай дарозе маленькі ХТЗ, а за рулём сядзіць гордая і шчаслівая Арына. Дзятва з галёканнем кінулася насустрач. Спыніўшы трактар, Арына спрытна саскочыла на зямлю, звярнулася да малых:

— А ну, хуценька нясіце анучы якія. Машыну чысціць трэба.

Мігам хлапчукі разбегліся, і праз колькі часу разам з Арынай пачалі выціраць пыл з трактара. Кожнаму хацелася дакрануцца да машыны.

— Ну і Арына! Малайчына,— у адкрытую хвалілі і жанчыны, і мужчыны.— Гэта ж трэба — трактарам упраўляе.

— А што ім упраўляць? — з усмешкай гаварыла Арына.— Тут усё проста. Машына паслухмяная, нават сама ездзіць можа.

— Не можа быць! — засумняваліся вяскоўцы.

І тады Арына ліха крутанула раздругі завадной ручкай, а калі трактар залапатаў, па-хлапечу ўскочыла на сядзенне і кранулася з месца. Потым павярнула руль так, каб трактар хадзіў па кругу, і затым, прывязаўшы яго вяроўкай, саскочыла на зямлю. І на табе дзіва! Трак-

тар сам, без чалавека, зрабіў некалькі кругоў.

Доўга памяталі ў вёсцы гэты жарт Арыны. Жарты жартамі, а трактара чакала поле. Для Арыны Сямёнавай пачаліся працоўныя тыдні. І цяжкія, і радасныя. Дзень у дзень выязджала араць. Бывала, ледзь толькі кароў пачынаюць выганяць на пашу, Арынін ХТЗ лапоча ўжо дзесьці каля Гарэлага балота.

Гаручае падвозілі на конях у поле. Туды ж хто-небудзь са сваякоў прыносіў Арыне і абед, а часам і вячэру. Так, і вячэру, бо ў гарачы час восеньскіх або веснавых работ забывалася дзяўчына пра ўсё, нават пра вечарынкі, на якіх сяброўкі скакалі любімую полечку.

У хуткім часе пра Арыну загаварылі як пра перадавую трактарыстку. Яе імя не раз значылася ў спісах удзельнікаў раённых і абласных злётаў перадавых трактарыстаў Магілёўшчыны.

Усю сябе аддавала Арына Сямёнава рабоце. Нават тады, калі нарадзілася дзіця, прасядзела з ім толькі зімовыя месяцы, а вясной зноў узялася за руль трактара, разам з усімі выехала ў поле. Так і працавала, пакідаючы дзіця ў канцы загонкі на руках суседскай дзяўчынкі. Спыніць трактар на якую-небудзь хвіліну, пакорміць малое, крышачку пагулькае, ды і зноў за работу.

С. Сямёнаў.

Ён хату пакінуў, пайшоў ваяваць

Гэта было ў далёкай Іспаніі. На світанні 12 лютага 1937 г. на адным з участкаў Харамскага фронту 14-я Інтэрнацыянальная брыгада перайшла ў рашучае наступленне. На пярэдні край абароны праціўніка рухаліся дзесяткі савецкіх танкаў Т-26. У першых радах наступаючых ішоў 2-і ўзвод трэцяй танкавай роты, у складзе якога былі валанцёры з Бабруйска. Беларускія добраахвотнікі вырашылі справа абысці аліўкавы гай. І як раз тут франкісты падрыхтавалі супрацьтанкавую засаду. У выніку моцнага агню адзін танк рэспубліканскай арміі загарэўся, у другога была падбіта хадавая частка. Танк камандзіра ўзвода Георгія Міхайлавіча Склязнёва трапіў у траншэю і засеў там. Экіпаж у саставе Г. М. Склязнёва, К. Д. Чарненкі і Н. І. Касагава змагаўся з насядаўшым ворагам.

Калі вярнуліся два танкі рэспубліканцаў з пашкоджанымі гарматамі і кулямётамі і паведамілі, што экіпажу Склязнёва не ўдасца вывесці танк з траншэі, па трывозе былі падняты першы і трэці ўзводы, якія прыйшлі на дапамогу. Але было ўжо позна: экіпаж гераічна загінуў. Змагаўся ён да канца, да апошняга снарада. Аб гэтым подзвігу даведалася ўся рэспубліканская армія. Сярод загінуўшых быў ураджэнец в. Старая Беліца Чэрыкаўскага раёна К. Д. Чарненка.

Канстанцін Дзмітрыевіч Чарненка нарадзіўся ў 1911 г. у беднай сялянскай сям'і. Дзяцінства Косці было вельмі і вельмі цяжкім. Сям'я была вялікая. Каб хутчэй выйсці ў самастойнае жыццё, Косця паступіў у тэхнікум, які закончыў праз тры гады. То былі незабыўныя трыццатыя — час індустрыялізацыі краіны, аснашчэння тэхнікай Чырвонай Арміі. Узброеным Сілам патрабаваліся спецыялісты, якія б добра валодалі баявой тэхнікай. К. Д. Чарненку накіравалі ў танкавую школу. Ён упарта авалодваў навейшай тэхнікай і ў хуткім часе стаў выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Стала вядома, што фашысцкія ге-

нералы паднялі мяцеж супраць рэспубліканскага ладу Іспаніі. Лепшыя людзі з усяго свету пакінулі свае хаты, свае сем'і, ішлі абараняць свабоду іспанскага народа. Выказаў жаданне змагацца добраахвотнікам у радах рэспубліканскай арміі і К. Д. Чарненка. Ён увайшоў у лік тых, хто першымі ўступілі ў адкрытую барацьбу з наступаўшым фашызмам. За ратныя подзвігі на іспанскай зямлі К. Д. Чарненка быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі.

В. Калеснікаў.

Іх называлі стаханаўцамі

Прозвішчы працаўнікоў сельскай гаспадаркі Чэрыкаўшчыны, якія былі занесены на дошку гонару Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве ў 1939 г., паказчыкі іх дасягненняў у вытворчасці.

АГІНСКАЯ Феадора Кліменцьеўна, звеннявая калгаса «Шлях сацыялізму» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю льновалакна 9,7 ц з плошчы 1 га.

АЛЬТШУЛЕР Лейба Абрамавіч, загадчык свінагадоўчай таварнай фермы калгаса «Чырвоны сормавец» — у сярэднім за 1938—1939 гг. на ферме вырасцілі па 15,3 парасяці на свінаматку пры пагалоўі 16 матак.

АСТАПЕНКА Кацярына Сільвестраўна, свінарка калгаса «Шлях сацыялізму» — у сярэднім за 1938—1939 гг. вырасціла 15,4 парасяці на свінаматку.

АЎДЗЕЕНКА Іван Яфімавіч, старшы конюх калгаса імя Будзённага — вырасціў у 1939 г. 27 жарабят ад 27 конематак.

АЎРУСІН Іосіф Саламонавіч, старшы аграном Чэрыкаўскага райземаддзела — увёў 20 севазваротаў з агульнага ліку 30 севазваротаў раёна.

БАГДАНАВА Вера Герасімаўна, звеннявая калгаса «Чырвоная зорка» — у сярэднім за 1938—1939 гг. атрымала ўраджай ільновалакна 8,1 ц з плошчы 1 га.

БАНДАРЭНКА Піліп Аляксеевіч, старшы конюх калгаса «Шлях сацыялізму» — вырасціў у 1939 г. 35 жарабят ад 35 конематак.

БАТУРА Марфа Мінаўна, даярка калгаса «Шлях сацыялізму» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася надою малака 2737 л на фуражную карову мясцовай пароды.

БАТУРА Міхаіл Герасімавіч, загадчык малочнатаварнай фермы калгаса «Шлях сацыялізму» — у сярэднім за 1938—1939 гг. ферма атрымала сяреднесутачную прывагу цялят мясцовай пароды да шасцімесячнага ўзросту 660 г. на галаву пры поўным захаванні маладняку.

БАЧАНКОЎ Іван Майсеевіч, бухгалтар калгаса «Чырвоны сормавец» — узорна паставіў улік і справаздачнасць калгаса, дабіўся датэрміновага складання гадавых справаздач.

БРЫНДЗІКАЎ Андрэй Кандратавіч, конюх калгаса імя Будзённага — вырасціў у сярэднім за 1938—1939 гг. 9 жарабят ад 9 конематак.

БУЛАХАВА Праскоўя Ігнатаўна, аўчар калгаса імя Сталіна — у сярэднім за 1938—1939 гг. вырасціла 170 ягнят да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак.

ВАРАНКОЎ Несцер Уладзіміравіч, конюх калгаса «Чырвоны ўсход» — вырасціў у 1939 г. 23 жарабяці ад 23 конематак.

ВАСІЛЬКОЎ Васіль Піліпавіч, брыгадзір калгаса «Сцяг працы» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабіўся ўраджаю насення канюшыны па 3,95 ц з гектара, з плошчы 2,50 га.

ВАСІЛЬЕВА Марыя Еўдакімаўна, цялятніца калгаса імя Варашылава — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася сяреднесутачнай прывагі цялят да шасцімесячнага ўзросту 645 г на галаву пры поўным захаванні маладняку.

ГАНЧАРОЎ Максім Якаўлевіч, конюх калгаса «Серп і молат» — вырасціў у 1939 г. 9 жарабят ад 9 конематак.

ГРАМЫКА Ефрасіння Аўрамаўна, звеннявая калгаса імя Молатава — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю льновалакна 8 ц з гектара з плошчы 3 га.

ГУРАНКОЎ Пракоп Абрамавіч, конюх калгаса «Іскра» — у 1938—1939 гг. вырасціў 5 жарабят ад 5 конематак.

ДАЛЬКОЎ Максім Прохаравіч, землеўпарадкавальнік райземаддзела — выканаў план увядзення правільных севазваротаў на 127,8 %.

ДАЛЕЦКАЯ Марыя Сцяпанаўна, свінарка калгаса «Чырвоны сормавец» — за 1938—1939 гг. у сярэднім вырасціла 16 парасят на свінаматку.

ДАНАДЗЬЕВА Марыя Васілеўна, цялятніца калгаса імя Другой пяцігодкі — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася сяреднесутачнай прывагі цялят 607 г на галаву пры поўным зберажэнні маладняку.

ДРАЗДОВА Марыя Мінаўна, цялятніца калгаса імя Сталіна — у сярэднім за 1938—1939 гг. вырасціла 21 цяля, дабіўшыся сяреднесутачнай прывагі на галаву 647 г.

ДУМШАНКОВА Матрона Сідараўна, даярка калгаса «12-годдзе Кастрычніка» — у

сярэднім за 1938—1939 гг. надаіла ад кожнай каровы па 1775 л малака.

ЕМЯЛЬЯНАВА Хрысціна Канстанцінаўна, чабан калгаса імя Молатава — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася па атары авечак-метысаў пароды прэкас выхаду 160 ягнят ад адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак.

ЖАЛАНАВА Ганна Захараўна, цялятніца калгаса «Бальшавік» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася сярэднесутачнай прывагі цялят да шасцімесячнага ўзросту 605 г на галаву, пры поўным захаванні маладняку.

ЗАЙЦАВА Акуліна Антонаўна, звеннявая калгаса «Іскра» — у сярэднім за 1938—1939 гг. атрымала ўраджай ільновалакна 9 ц з гектара на плошчы 1 га.

ЗІМОНІНА Еўдакія Ціханаўна, звеннявая калгаса «Іскра» — у 1939 г. атрымала ўраджай ільновалакна 11,5 ц з плошчы 1,5 га.

ЗУЕЎ Усцін Іванавіч, адказны па бульбе калгаса «Чырвоная зорка» — у 1939 г. дабіўся ўраджаю бульбы 247 ц з плошчы 1,15 га.

ІВАНОВА Яўгенія Абрамаўна, звеннявая калгаса імя Калініна — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю ільновалакна 8,5 ц з плошчы 1 га.

КАЗАНКОЎ Елісей Іванавіч, конюх саўгаса «Трэці рашаючы» — у 1939 г. атрымаў 11 жарабят ад 11 конематак.

КАНАЗОБКА Надзея Максімаўна, звеннявая калгаса «Чырвоная зорка» — у сярэднім за 1938—1939 гг. атрымала ўраджай ільновалакна 8 ц з гектара.

КАРКОЗАВА Кацярына Фёдараўна, даярка калгаса «Другая пяцігодка» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася надою 2562 л малака на карову.

КАРНЕЕНКА Фяўронія Макараўна, звеннявая калгаса імя Сталіна — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю ільновалакна 8,25 ц з гектара на плошчы 1 га.

КАТОЎСКІ Пётр Апалонавіч, конюх калгаса імя Калініна — у 1939 г. вырасціў 7 жарабят ад 7 конематак.

КЛІМАВА Еўдакія Аляксееўна, аўчар калгаса «Вольная праца» — у сярэднім за 1938—1939 гг. па атары метысаў пароды прэкас атрымала выхаду 146 ягнят да адбіўкі на 100 матак.

КОПЕЛЕВА Аляксандра Міхайлаўна, брыгадзір калгаса «Бальшавік» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю ільновалакна 7,6 ц і льнасемя — 5,5 ц з гектара на плошчы 2 га.

КРАЎЦОВА Наталля Яўменаўна, даярка калгаса «Камінтэрн» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася надою малака 2651 л на фуражную карову.

КСЯНДЗОВА Ганна Якаўлеўна, звеннявая калгаса імя Сталіна — у сярэднім за 1938—1939 гг. атрымала ўраджай ільновалакна 8 ц з плошчы 1 га.

КУДРАЎЦАЎ Пахом Васілевіч, загадчык пасекай калгаса «Камінтэрн» — у сярэднім за 1937—1939 гг. пасека атрымала валавы збор мёду 52 кг і воску 0,99 кг на пераізімаваўшую пчаласям'ю з 97 пчаласямей.

КУРАЛЕНКА Ігнат Цярэнцьевіч, брыгадзір калгаса імя Калініна — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабіўся ўраджаю ільновалакна 8,2 ц з гектара, насення льну 4,7 ц з гектара.

ЛЯСЯНКОЎ Сцяпан Радзівонавіч, рахункавод калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Вепрынскага сельсавета — узорна паставіў улік і справаздачнасць у калгасе, дабіўся датэрміновай здачы справаздач.

ЛОСЕВА Ефрасіння Андросаўна, даярка калгаса «Штурмавік» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася надою малака 2537 л і вырасціла 14 цялят ад 14 кароў.

МАЛАШАНКА Ганна Іосіфаўна, звеннявая калгаса «Чырвоны Кастрычнік» — у 1939 г. дабілася ўраджаю ільновалакна 8,1 ц з гектара, ільнасемя 5 ц з гектара з плошчы 1,50 га.

МАРЧАНКА Марыя Астапаўна, цялятніца калгаса імя Варашылава — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася сярэднесутачнай прывагі цялят да шасцімесячнага ўзросту 630 г кожнага пры поўным зберажэнні маладняку.

МАСКАЛЁЎ Васіль Маркавіч, загадчык авечкагадоўчай таварнай фермы калгаса імя Калініна — у сярэднім у 1938—1939 гг. ферма атрымала ад мясцовых авечак 155 ягнят да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак.

МАСКАЛЁЎ Васіль Фёдаравіч, брыгадзір калгаса «Сцяг працы» — у сярэднім за 1938—1939 гг. атрымаў ураджай насення канюшыны 3,95 ц з гектара з плошчы 2,50 га.

МЕЛЬНІКАЎ Рыгор Андрэевіч, аўчар калгаса «Хваля рэвалюцыі» — у 1938 г. вырасціў 16 парасят на свінаматку, у 1939 г. дабіўся па атары авечак метысаў пароды прэкас выхаду 160 ягнят на 100 матак і пакрытых ярак.

МІРОНАВА Наталля Прохараўна, загадчыца МТФ калгаса «Чырвоны сормавец» — у сярэднім за 1938—1939 гг. ферма атрымала сярэднесутачную прывагу цялят да шасцімесячнага ўзросту 670 грамаў пры поўным захаванні маладняку.

МІРОНАЎ Самуіл Дзмітрыевіч, звеннявы калгаса «Іскра» — у 1939 г. атрымаў ураджай збожжавых 22 ц з гектара на плошчы 10 га.

МОТУЗ Сяргей Іванавіч, інспектар па каняводству райземаддзела — у сярэднім за 1938—1939 гг. план штучнага асемянення конематак па раёну выканаў на 117 %, зажарабляемасць конематак 94,6 %.

МУРАШКІН Феакціст Сямёнавіч, конюх калгаса імя Будзённага — у 1939 г. вырасціў 10 жарабят ад 10 конематак.

НІКІФАРЭНКА Міхаіл Прохаравіч, конюх калгаса «Чырвоная зорка» — вырасціў у 1939 г. 12 жарабят ад 12 конематак.

НІКІЦЕНКА Фрол Арцёмавіч, брыгадзір калгаса імя Калініна — у 1939 г. дабіўся ўраджаю льновалакна 8 ц з гектара, ільнасемя — 5 ц.

ПАДДАНІКАЎ Іван Іванавіч, брыгадзір калгаса «VI з'езд Саветаў» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабіўся ўраджаю насення канюшыны 3,4 ц з гектара.

ПАЎЛОЎСКІ Эдуард Пятровіч, конюх калгаса «Хваля рэвалюцыі» — у 1939 г. вырасціў 7 жарабят ад 7 конематак.

ПРОХАРАВА Праскоўя Ананьеўна, член калгаса «Чырвоны сормавец» — у сярэднім за 1938—1939 гг. атрымала ўраджай ільновалакна 18,4 ц з плошчы 1 га.

ПУХОЎСКАЯ Кацярына Іванаўна, звеннявая калгаса «Шлях сацыялізму» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю ільновалакна 8,5 ц з гектара, з плошчы 1,5 га.

РАГОЎСКІ Мікалай Цімафеевіч, брыгадзір калгаса «Шлях сацыялізму» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабіўся ўраджаю з гектара ўкоснай канюшыны 54 ц і насення канюшыны 4 ц з плошчы 3 га.

РАДЗЬКОВА Лукер'я Авяр'янаўна, звеннявая калгаса «Чырвоная зорка» — у сярэднім за 1938—1939 гг. атрымала ўраджай ільновалакна 8,65 ц з плошчы 1 га.

РАЗІКАВА Ганна Іосіфаўна, цялятніца калгаса імя Сталіна — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася сярэднесутачнай прывагі цялят 640 г пры поўным захаванні маладняку.

РАМАНЕНКА Пелагея Аляксандраўна, цялятніца калгаса «Чырвоны пераможнік» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася сярэднесутачнай прывагі цялят да шасцімесячнага ўзросту 650 г на галаву пры поўным захаванні маладняку.

РУЗДОЎ Мікіта Васілевіч, аўчар калгаса імя Молатава — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабіўся па атары авечак метысаў пароды прэкас выхаду 173 ягнят да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак.

РУЛЕНАВА Салоха Іванаўна, авечкавод калгаса «Чырвоны сцяг» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася па атары авечак метысаў пароды прэкас выхаду 167 ягнят да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак.

РУПАКОЎ Фёдар Фаміч, аўчар калгаса «Чырвоны Кастрычнік» — у сярэднім за 1938—1939 гг. вырасціў 146 ягнят да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак.

САЛОНАЯ Варвара Паўлаўна, даярка калгаса «Чырвоны Кастрычнік» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася надою 2770 л малака на фуражную карову мясцовай пароды і вырасціла 13 цялят ад 13 кароў.

СЕКУШЭНКА Праскоўя Аўрамаўна, звеннявая калгаса імя Калініна — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю ільновалакна сярэдняга нумару 14 па 8 ц з гектара на плошчы 2 га.

СІМАНАЎ Ошэр Ельевіч, звеннявы калгаса «Чырвоны сормавец» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабіўся па два ўраджаі ільновалакна з адной і той жа плошчы; ад першага ўраджаю 13,8 ц, а другога — 4,7 ц з гектара, з плошчы 1,25 га.

СІЎЦОВА Софія Архіпаўна, член калгаса «Чырвоная зорка» — у сярэднім за 1938—1939 гг. атрымала ўраджай ільновалакна 8,55 ц з плошчы 1 га.

СКРОБАЎ Рыгор Аляксандравіч, конюх калгаса «Чырвоны сцяг» — у 1939 г. вырасціў 7 жарабят ад 7 конематак.

СОБАЛЕВА Ефрасіння Андрэеўна, цялятніца калгаса «Чырвоны Кастрычнік» — у сярэднім у 1938—1939 гг. дабілася сярэднесутачнай прывагі цялят да шасцімесячнага ўзросту 625 г на галаву, пры поўным захаванні маладняку.

СТАРАВОЙТАВА Марыя Міхайлаўна, звеннявая калгаса імя Сталіна — у 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю 10 ц ільновалакна з плошчы 1 га.

СТАРАВОЙТАЎ Раман Ульянавіч, конюх калгаса «Чырвоны Кастрычнік» — вырасціў у 1938—1939 гг. 11 жарабят ад 11 конематак.

СЦЕПАНЕНКА Аляксей Іванавіч, трактарыст Ударнай МТС — у 1939 г. выпрацаваў на трактары У-2 415 га.

ТАМАШОВА Варвара Васілеўна, звеннявая калгаса «Іскра» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю ільновалакна 8,25 ц на плошчы 1 га.

ТАРАРОЕЎ Васіль Фёдаравіч, загадчык свінагадоўчай таварнай фермы калгаса «Шлях сацыялізму» — у сярэднім за 1937—1939 гг. ферма вырасціла па 15,63 парасяці на свінаматку ад 23 матак.

ХРАМЫХ Фёдар Сільвестравіч, конюх калгаса «Чырвоны будаўнік» — у 1939 г. вырасціў 7 жарабят ад 7 конематак.

ХРОМЧАНКА Марыя Мікалаеўна, цялятніца калгаса імя Будзённага — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася сярэднесутачнай прывагі цялят мясцовай пароды да шасцімесячнага ўзросту 757,7 г пры поўным захаванні маладняку.

ЦАЦОХА Настасся Аксёнаўна, член калгаса «Чырвоны сормавец» — у сярэднім у 1938—1939 гг. атрымала ўраджай ільновалакна 18,4 ц з плошчы 1 га.

ЦЕРБАЎ Ціт Лявонавіч, загадчык свінагадоўчай таварнай фермы калгаса імя Калініна — у сярэднім за 1937—1939 гг. на ферме вырасцілі 15,3 парасяці на свінаматку пры пагалоўі 23 свінаматкі.

ЦЕРАХАВА Агаф'я Антонаўна, цялятніца калгаса «Гігант» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася сярэднесутачнай прывагі цялят 570 г пры поўным захаванні маладняку.

ЦІМАФЕЕНКА Хрысціна Прохараўна, цялятніца калгаса «Чырвоная зорка» — у сярэднім за 1938—1939 гг. вырасціла 28 цялят з сярэднесутачнай прывагай да шасцімесячнага ўзросту 680 г на галаву..

ЦІТОЎ Іван Арцёмавіч, землеўпарадка-

вальнік райземаддзела — план землеўпарадкавальных работ па раёну выканан на 131,2 %, уведзены правільны севазварот у 22 калгасах.

ЦУРАНАВА Марыя Апанасаўна, звеняявая калгаса «Чырвоны будаўнік» — у 1939 г. атрымала 10 ц ільновалакна і 8,2 ц ільнасемя з 1 га.

ЦЫГАНОЎ Дзмітрый Кандратавіч, чабан калгаса «Чырвоны Кастрычнік» — у сярэднім за 1938—1939 гг. па атары авечак метысаў пароды прэкас атрымаў 155 ягнят на 100 матак і пакрытых ярак.

ЦЯПІНА Ганна Мітрафанаўна, даярка калгаса «Чырвоны Кастрычнік» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася надою малака 1700 л на 1 фуражную карову мясцовай пароды.

ЧАРНЯК Юрый Сцяпанавіч, конюх калгаса «Чырвоны сцяг» — у 1939 г. вырасціў 5 жарабят ад 5 конематак.

ЧАРТКОВА Таццяна Іванаўна, брыгадзір калгаса імя Сталіна — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю льновалакна 8,65 ц з гектара і льнасемя 5,5 ц.

ЧУПІКАВА Лукер'я Пятроўна, звеняявая калгаса «Бальшавік» — у сярэднім у 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю льновалакна 8,75 ц з гектара з плошчы 2 га.

ШМАРЫКА Аляксандр Паўлавіч, заатэхнік па племянной справе райземаддзела — у 1938—1939 гг. увёў у 5 калгасах правільны севазварот і афарміў 130 кандыдатаў на УСГВ 1940 г.

ЯЗІКАЎ Герман Фёдаравіч, садавод-агароднік калгаса «Гігант» — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабіўся ўраджаю яблыкаў 60,7 ц з гектара на плошчы 12 га.

ЯКІМЕНКА Іларыён Сцяпанавіч, трактарыст Чэрыкаўскай МТС — у сярэднім за 1938—1939 гг. выпрацаваў на трактары ХТЗ 355 га.

ЯКУШАВА Наталля Андрэеўна, звеннявая калгаса «Новы шлях» — у 1939 г. атрымала ўраджай ільновалакна 8,1 ц з плошчы 1 га.

ЯЛЬЦОЎ Павел Апанасавіч, брыгадзір калгаса «Чырвоная зорка» — у 1939 г. дабіўся ўраджаю бульбы 245 ц з гектара на плошчы 1,25 га.

ЯНЧАНКА Арсен Сяргеевіч, брыгадзір калгаса імя Молатава — у сярэднім за 1938—1939 гг. дабіўся ўраджаю збожжавых 17 ц з гектара, з плошчы 33,50 га.

ЯФРЭМЕНКА Кандрат Сцяпанавіч, член калгаса «Другая пяцігодка» — у 1939 г. атрымаў ураджай ячменю 24,4 ц з гектара з плошчы 1 га.

Гартаючы падшыўкі

Па старонках раённай газеты «Сацыялістычная перамога» за 1935, 1936, 1940 гг.

Газета першых гадоў выдання не захавалася. Але 5 мая 1936 г. выйшаў яе 500-ы нумар. У матэрыяле «Шлях газеты» паведамлялася, што колькасць чытачоў з 1200 у 1932—1933 гг. павялічылася да 3000 і больш у 1936 г. Спачатку адзіным работнікам рэдакцыі газеты быў рэдактар. Газету друкавалі ў Магілёве, потым у Крычаве. Пры гэтым здараліся частыя зрывы. Таму газета выходзіла калі праз 2 дні, калі праз 10.

У канцы ліпеня 1933 г. пачалася арганізацыя друкарні ў Чэрыкаве. З Касцюковічаў атрымалі маленькую друкарскую машыну, з Гомеля і Мінску — шрыфт і паліграфічнае абсталяванне. У канцы кастрычніка быў выпушчаны першы нумар у Чэрыкаўскай друкарні. Газета выходзіла 12 разоў у месяц.

Паступова рос тыраж газеты, павялічвалася колькасць пісем у рэдакцыю, значна выросла актыўнасць селькораў. У ліку першых былі Дзяніс Мельнікаў, Раман Чумакоў, Андрэй Рабцаў і іншыя. За 1935 г. у рэдакцыю паступіла каля 1500 пісем, з якіх 750 былі пасланы для прыняцця мер, а астатнія выкарыстаны ў газеце. Выходзіла 18 нумароў газеты ў месяц. Тыраж яе ў 1939 г. вырас да 3500 экземпляраў.

7 лістапада 1935 г.

10-ЦІ ГАДОВАЯ ШКОЛА ДА 18-Й ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

Тры гады таму назад 1-я Чэрыкаўская сямігодка была ператворана ў поўную сярэднюю школу-дзесяцігодку. Будынак, дзе зараз змяшчаецца ПСШ, да рэвалюцыі спачатку быў занят пад памешчыцкі клуб пана Галынскага, потым у ім змяшчалася гімназія, у якой навучаліся сынкі памешчыкаў, чыноўнікаў, духавенства і вясковых кулакоў.

Пасля рэвалюцыі ён быў адведзен для школы і дзеці працоўных, якія раней нават не мелі права заходзіць у гэты будынак, атрымалі поўную магчымасць навучацца ў ім. Шко-

ла — равесніца Кастрычніка — за гады свайго існавання выхавала сотні культурных, усебакова развітых людзей, адданых будаўнікоў сацыялістычнага грамадства.

З кожным годам усё больш і больш пашыраецца школа. Нават два апошнія гады з'яўляюцца вялікім тэрмінам, за які школа карэнным чынам змяніла сваё аблічча. Калі параўнаць становішча школы ў 1933/34 навучальным годзе з сучасным становішчам, атрымаецца здзіўляючая розніца.

Так, у 1933/34 годзе ў школе навучалася 410 вучняў, зараз — 620, прычым настаўнікаў было 17, з якіх 5 з вышэйшай адукацыяй, зараз настаўнікаў 23, з іх з вышэйшай адукацыяй 7, з сярэдняй — 16. Піянерская арганізацыя ўзрасла з 100 да 160 чалавек і 134 акцябрат. Школа мае 113 лепшых ударнікаў вучобы, якія вучацца на «выдатна» і «добра» і сістэматычна дапамагаюць у вучобе адстаючым вучням.

Акрамя акадэмічных заняткаў, вучнямі праводзіцца вялікая пазашкольная культмасавая работа, працуюць музычны, харавы, драматычны і іншыя гурткі. Для падняцца палітычнага ўзроўню вучняў у школе створан гурток бягучай палітыкі, на занятках якога распрацоўваецца газетны матэрыял і матэрыял VII кангрэса Камінтэрна.

У аснову ўсёй работы школы паложана гістарычная пастанова ЦК і СНК аб школе. Паміж вучнямі разгорнута сацспаборніцтва, заключаны ўмовы паміж класамі, паасобнымі вучнямі і піянерамі. Праз спаборніцтва некаторыя вучні дабіліся лепшых вынікаў. Так, пры праверцы сац. умоў вучаніца 4-га класа піянерка Левіна Л. расказала вучням аб сваёй вучобе, аб тым, як яна дабілася лепшых паказчыкаў у вучобе. На працягу 1 чвэрці навучальнага года ў Левінай не было ніводнага прагула і спазнення, заўсёды ўважліва слухала тлумачэнні настаўнікаў, прымала ўдзел у грамадскім жыцці школы. Па ўсім дысцыплінам мае адзнакі «выдатна».

Такіх вучняў у школе нямала. Але нараду з дасягненнямі ёсць яшчэ і некаторыя недахопы, больш усяго, так сказаць, гаспадарчага парадку. Школа ў дастатковай колькасці не забяспечана апалам, няма неабходных дробных гаспадарчых рэчаў.

Значным тормазам у рабоце школы з'яўляецца недахоп падручнікаў, сшыткаў, пісьмовых прылад.

Асноўнай нашай задачай ёсць і будзе добрая пастаноўка вучэбна-выхаваўчай работы, якую трэба арганізаваць так, каб з нашай школы выходзілі людзі глыбока засвоіўшыя асновы навукі.

Канцавая, Шухман

2 сакавіка 1936 г.

ВЫПУСК ТРАКТАРНАЙ ШКОЛЫ

29 лютага г. г. Чэрыкаўская трактарная школа выпусціла для сацыялістычных палёў 85 трактарыстаў. Сярод выпускнікоў маецца 27 выдатнікаў вучобы, якімі ганарыцца трактарная школа. З ліку выдатнікаў вучобы 7 прэміравана кнігамі «Трактар» і грашовымі прэміямі па 15—20 рублёў, астатнім выдатнікам вучобы дырэкцыяй абвешчана падзяка за добрае навучанне.

Выступаўшыя выдатнікі вучобы дзякавалі дырэкцыі і выкладчыцкаму персаналу за добрае выхаванне і абавязаліся на месцы работы стаць лепшымі стаханаўцамі, даваць самыя высокія паказчыкі выпрацоўкі на трактар.

Злацін

4 сакавіка 1936 г.

СТАХАНАЎСКАЯ БРЫГАДА НА ХЛЕБАПЯКАРНІ

Чэрыкаўская хлебапякарня ніяк не магла поўнасцю задаволіць патрэбнасці раёна ў хлебе і белабулач-

ных вырабах. Для таго каб забяспечыць поўнасцю раён хлебам дырэктар хлебапякарні т. Гнілякевіч упарта патрабаваў расшырэння хлебапякарні: пабудовы новых пячэй і г. д.

Але варта было кіраўніцтву райсаюза з дапамогаю прадстаўніка Белкаапсаюза т. Паташнікава арганізаваць рабочыя месцы, правільна расставіць рабочых, аслабаніць кваліфікаваных рабочых ад чорнай работы, як-то: падноскі дроў і г. д., як брыгада № 2 на чале з брыгадзірам тав. Куляшовым перакрыла норму на 181,2 % пры адначасовым скарачэнні брыгады ад 6 да 4-х.

Услед за брыгадай т. Куляшова на пякарні разгортваецца барацьба за стаханаўскія нормы выпечкі і ў астатніх брыгадах. Рабочыя стаханаўскай брыгады павысілі свой заробак. Калі раней майстар т. Куляшоў зарабляў пяць рублёў у дзень, то цяпер — 10 руб. 45 кап., рабочыя Жукаў, Старавойтаў І. і Старавойтаў К. зараблялі па 4 руб. 25 кап., то цяпер зарабляюць па 8 руб. 44 кап. Калі раней пякарня не магла задаволіць хлебам нават горад, то цяпер забяспечвае поўнасцю патрэбнасць раёна.

Аднак кіраўніцтва хлебапякарні замест таго каб па-сапраўднаму, пабальшавіцку ўзначаліць стаханаўскі рух баючыся таго, што, моў, не будзе куды дзець хлеб сталі на шлях затрымлівання разгортвання стаханаўскага руху. Так, 27-га лютага інспектар па хлебапячэнні і гандлю Давыдзенка забараніў стаханаўскай брыгадзе выпякаць тры абароты, матывуючы тым, што няма куды дзяваць хлеб, у той час, калі ў крамах сельпо не было ў прадажы хлеба. Такім чынам, замест таго каб арганізаваць бесперабойны гандаль хлебам і белабулачнымі вырабамі ва ўсіх крамах, Давыдзенка знайшоў «лепшы» выхад для разгрузкі экспедытарскай,— астанавіць стаханаўскі рух.

Праўленне райсаюза ацаніла гэты паступак з боку Давыдзенкі, як антыдзяржаўны і зняло яго з работы і перадало на разгляд РК ЛКСМБ аб магчымасці прабывання яго ў радах камсамола.

Адначасова праўленне райсаюза абавязала дырэктара хлебапякарні т. Гнілякевіча стварыць неабходныя ўмовы для рабочых хлебапякарні з тым, каб дабіцца не толькі адной стаханаўскай брыгады, а поўнасцю стаханаўскай пякарні, бо такія людзі, як Куляшоў, Старавойтавы, Жукаў паказалі, што пры правільнай арганізацыі і вывучэнні тэхналогіі працэса можна дабіцца і дабіліся рэкорднай выпечкі хлеба і што Куляшовых і Жукавых маецца на пякарні яшчэ не мала, астаноўка толькі за тым, каб кіраўніцтва хлебапякарні ўзначаліла і арганізавала стаханаўскі рух.

Азерскі

5 мая 1936 г.

БЫЦЬ СЕЛЬКОРАМ НАВУЧЫЛА ГАЗЕТА

У раённую газету я стаў пісаць з першых дзён яе выхаду ў свет. У першы перыяд сельскораўскай дзейнасці заметкі мае рэдка пападалі на старонкі газеты, але я працягваў пісаць і цяпер амаль усе заметкі друкуюцца. Рэдакцыя дапамагла мне, вучыла, як пісаць, давала заданні па асобных пытаннях. Я быў абраны рэдактарам насценнай газеты ў сваім калгасе «Серп і молат», праз якую асвятляў жыццё калгаса, разаблачаў жулікаў і класава варожых элементаў. Па сігналах насценгазеты ў калгасе правялі чыстку, у рэзультаце якой выгналі Пазняковых, Сцельмаховых і Машковых.

У 1933—34 гг. разаблачыў кіраўніцтва калгаса на чале з Ганчаровым і Сцелькіным, як жулікаў і шкоднікаў.

Сваю сельскораўскую работу я

спалучаў з арганізацыйна-масавай работай у калгасе па правядзенню важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўрада.

Многія нездаволены мной, як селькорам, асабліва антыкалгасныя элементы, аб якіх я пісаў заметкі. Але гэта не можа прынізіць селькораўскай работы, наадварот пяро маё яшчэ будзе вастрэй і словы больш меткімі, каб біць у цэль без промаху.

Рабцаў Андрэй

21 ліпеня 1940 г.

УРУЧЭННЕ ЗНАЧКА «МАЙСТРУ КАМБАЙНАВАЙ УБОРКІ»

17 ліпеня ў горадзе Крычаве адбылася куставая нарада камбайнёраў і льноцерабільшчыкаў МТС 8 раёнаў вобласці. На нарадзе прысутнічала звыш 20 камбайнераў і льноцерабільшчыкаў Чэрыкаўскай і Ударнай МТС.

Удзельнікі нарады абмяняліся вопытам сваёй работы; лепшыя камбайнеры расказвалі аб тым, як яны падрыхтаваліся да высокаякаснай уборкі ўраджаю з калгасных палёў.

Прадстаўнік абласнога зямельнага аддзела ўручыў асоба вызначыўшымся камбайнерам значкі «Майстру камбайнавай уборкі». У нашым раёне такую чэсць заваявалі два камбайнеры Чэрыкаўскай МТС — т. т. Нікіфарэнка і Шах.

У сувязі з атрыманнем значка майстар камбайнавай уборкі тав. Нікіфарэнка заявіў: «Па норме МТС я павінен на сваім камбайне выпрацаваць 200 гектараў. Мае абавязацельствы — даць 450 гектараў. Гэта будзе дастойным адказам на штодзённыя клопаты партыі і ўрада аб нас, камбайнерах».

31 ліпеня 1940 г.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЯСЛІ НЕ АРГАНІЗАВАНЫ

Адсутнасць дзіцячых ясляў у калгасе «Шлях сацыялізма» Горкаўскага сельсавета адчуваецца асабліва востра цяпер, у час уборкі ўраджаю. У калгасе налічваецца каля 40 жанчын з малымі дзецьмі. Значная частка іх пазбаўлена магчымасці выходзіць на палявыя работы.

Яшчэ і цяпер не позна выправіць памылку. Для арганізацыі дзетяслей у калгасе ёсць усе ўмовы.

СТАХАНАЎЦЫ ЎБОРКІ

Калгасніцы Соф'я Бандаравая і Марыя Захарэнка (калгас імені Леніна Горкаўскага сельсавета) з першых дзен уборкі перавыконваюць нормы выпрацоўкі ў паўтара разы і больш. Гэта — калгасніцы трэцяй брыгады, якая ў цэлым добра арганізавала работу на ўборцы. Дружна, як адзін, выходзяць калгаснікі на работу. Яны прыкладаюць усе намаганні к таму, каб хутка і без страт убраць ураджай.

* * *

З першых дзён уборкі работа ў калгасе «Бальшавік» праходзіць арганізавана. На жніво штодзённа выходзіць не менш 300—350 калгасніц.

Па-стаханаўску работаюць на жніве Лёкса Копелева, Еўдакія Лахманенка, Акуліна Новікава (брыгада № 2), Еўдакія Саракула, Хадося Буцянава (брыгада № 8), Ліда Цыркунова (брыгада № 1), Саламонія Іванова (брыгада № 7) і рад другіх. Гэтыя калгасніцы штодзённа выконваюць свае нормы на 200—250 працэнтаў.

Адданая работа калгаснікаў вырашае лёс уборкі. За надзвычайна кароткі тэрмін зжата жыта і ячменя звыш 125 гектараў. Усе снапы складзены ў бабкі. За ўраджаем наладжана пільная ахова. На кожнае поле вылучан спецыяльны вартаўнік. Праз дзень-два калгас прыступіць да звозкі і абмалоту хлеба новага ўраджаю.

Да пачатку ўборачных работ калгас завяршыў сенакашэнне. Усё сена з плошчы 300 гектараў звезена ў гумны, а астатняе згрэбена і складзена ў копны. Калгас датэрмінова разлічыўся з дзяржавай па сенапастаўках.

Я. Злацін

21 жніўня 1940 г.

ПРАГУЛЬШЧЫК АСУДЖАН

Дзмітрый Мяшкоў — качагар Усцінскага спіртзавода. 1 жніўня зрабіў прагул без уважлівых прычын. Справа аб ім была перадана суду. Нарсуд 2-га ўчастка прыгаварыў прагульшчыка Мяшкова Д. С. да чатырох месяцаў прымусправы па месцу работы з адлічэннем 15 прац. ад заработнай платы.

25 жніўня 1940 г.

БЯСКЛОПАТНАЕ ПРАЎЛЕННЕ

Вясной гэтага года ў краіне зарадзіўся выдатны рух за пабудову ў кожным калгасе ўласнага вадаёма. Пачын арцелі «Железнодорожник» Талаўскага раёна (Варонежская вобласць) быў падхоплен паўсямесна. Многія калгасы ўжо закончылі будаўніцтва вадаёмаў.

Калгасу «Шлях сацыялізма» Горкаўскага сельсавета таксама трэба было ўзяцца за гэту справу. Тут на месцы пасёлка будуецца цэлая вёска, а вадаёма няма. Вёска размяшчаецца кругом вялікага балота, якое ніякай карысці не прыносіць. А на гэтым месцы можа быць выдатны вадаём: некалі тут было возера.

Кіраўніцтва калгаса не паклапацілася аб стварэнні вадаёма. Не клапоціцца яно і аб будаўніцтве новых калодзежаў, у той час, як у пасёлку не хапае вады,— на тры дзесяткі двароў ёсць усяго адзін калодзеж.

1 верасня 1940 г.

БУДАЎНІЦТВА РЭСТАРАНА

Арцель Харчпром заканчвае будаўніцтва рэстарана ў горадзе Чэрыкаве, на рагу вуліц Камсамольскай і Карла Маркса. Асноўныя будаўнічыя работы закончаны. Вытварана ўжо штукатурка, складзены печы.

На будаўніцтва рэстарана затрачана каля 50 000 рублёў.

РОСТ ЗБЕРАЖЭННЯЎ ПРАЦОЎНЫХ

З ростам дабрабыту працоўных растуць і іх зберажэнні. На 1 студзеня г. г. у раённай ашчадкасе захоўвалі свае зберажэнні 1548 укладчыкаў, агульная сума ўкладаў дасягала 539 616 рублёў.

Да 1 жніўня лік укладчыкаў павялічыўся на 120 чалавек, а сума ўкладаў узрасла на 156.310 рублёў.

Растуць зберажэнні працоўных і ў сельскіх мясцовасцях.

4 верасня 1940 г.

РЭКАНСТРУКЦЫЯ РАДЫЁВУЗЛА

Поўным ходам ідуць работы па рэканструкцыі Чэрыкаўскага радыёвузла. Пасля рэканструкцыі магутнасць вузла павялічыцца ў 20 разоў з 25 да 500 ват.

Карэнным чынам пераабсталёўваецца старое памяшканне. Разам з ім будуецца новае каменнае памяшканне энергабазы. Радыёвузел будзе атрымліваць энергію ад сваёй уласнай электрастанцыі магутнасцю ў 25 конскіх сіл.

Будаўнічыя работы выкананы на 75 працэнтаў. Завезена ўжо частка неабходнай апаратуры і рухавік.

11 верасня 1940 г.

СТАХАНАЎСКАЯ ВЫПРАЦОЎКА

Выдатных рэзультатаў на касьбе грэчкі ў калгасе «Чырвоны Сцяг»

Лабанаўскага сельсавета дабіўся калгаснік другой брыгады А. Шчарбуноў. 6-га верасня ён скасіў 2,1 гектары грэчкі. У сярэднім за дзень Шчарбуноў скашвае 1,75 гектара.

Калгаснік гэтай жа брыгады Феакціст Белахонаў у сярэднім выкашвае за дзень 1,65 га. Максімальная яго выпрацоўка — 1,9 гектара.

БУДАЎНІЦТВА САНІТАРНАЙ СТАНЦЫІ

У Чэрыкаве заканчваецца будаўніцтва памяшкання санітарнай станцыі. У сучасны момант праводзяцца ўнутраныя работы: насцілка падлогі, кладка пячэй. Санстанцыя пачне дзейнічаць к XXIII гадавіне Кастрычніка.

22 верасня 1940 г.

РАЁН АТРЫМАЕ ЎЛАСНУЮ ЧАРАПІЦУ

Саўнарком БССР задаволіў хадайніцтва мясцовых арганізацый аб пабудове ў Чэрыкаўскім раёне чарапічнага завода. Для гэтай мэты ўжо адпушчана 24 тысячы рублёў.

У сучасны момант выбіраецца пляцоўка для будаўніцтва.

Завод будзе выпускаць звыш 100 тысяч штук чарапіцы ў год. Пры поўным яго асваенні можна павялічыць выпуск прадукцыі ў некалькі разоў.

29 верасня 1940 г.

ПРАКЛАДКА ЦЭМЕНТЫРАВАНЫХ ТРАТУАРАЎ

Камунальны аддзел выканкома гарсавета праводзіць работы па замене дашчатых тратуараў цэментыраванымі. Да гэтага часу зроблены цэментыраваныя тратуары на чотнай старане Камсамольскай вуліцы — ад вул. Карла Маркса да Смаленскай, даўжынёй каля 400 метраў.

9 кастрычніка 1940 г.

15 000 ЭКЗЕМПЛЯРАЎ КНІГ

Расце кніжны фонд Чэрыкаўскай раённай бібліятэкі. У сучасны момант у бібліятэцы налічваецца 15 тысяч экземпляраў кніг. За 9 месяцаў бягучага года кніжны фонд папоўніўся 1500 экземплярамі. Колькасць чытачоў раённай бібліятэкі на сённяшні дзень дасягае 1750 чалавек.

20 кастрычніка 1940 г.

УДЗЕЛЬНІК БАЁЎ З БЕЛАФІНАМІ Ў РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «САЦ. ПЕРАМОГА»

16 кастрычніка г. г. рэдакцыю газеты «Сацыялістычная перамога» наведаў удзельнік баёў у Фінляндыі Васілій Савельевіч Фралоў. За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў тав. Фралова медаллю «За адвагу».

Васілій Фралоў — камсамолец. Да ўхода ў Чырвоную Армію па мабілізацыі (верасень 1939 г.) ён работаў у калгасе «Бальшавік» Ушакоўскага сельсавета рахункаводам. Быў сакратаром пярвічнай КСМ арганізацыі. Тав. Фралоў удзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

У дружаскай гутарцы з супрацоўнікамі рэдакцыі тав. Фралоў расказаў аб некаторых эпізодах баявога жыцця, аб гераізме, мужнасці і доблесці байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі.

20 кастрычніка 1940

НА 2 МЕСЦЫ — 10 ЗАЯЎ

Згодна Пастановы Урада СССР аб прызыве калгаснай і гарадской

моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА, калгас «Чырвоны сормавец», які налічвае каля 100 членаў ва ўзросце ад 14 да 55 год, павінен будзе выдзяляць штогодна 2-х чалавек. У гэтым годзе на 2 месцы ёсць 10 кандыдатаў — дзесяць юнакоў падалі заявы з просьбай накіраваць іх у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы або школы ФЗА.

Сярод падаўшых заявы большасць рабят, якія прымаюць актыўны ўдзел у калгаснай рабоце. 14-гадовы юнак Нікалай Раманенка выпрацаваў у калгасе 110 працадзён, Іван Прохараў — 70 працадзён.

На вучобу мы пашлем лепшых рабят, якія будуць выдатна вучыцца і па-стаханаўску працаваць.

27 кастрычніка 1940 г.

НА НОВАЙ БУДОЎЛІ

Яшчэ ў верасні мінулага года Чэрыкаўскі лясгас, зыходзячы з рашэнняў XVIII з'езда партыі аб выкарыстанні мясцовых сыравінных рэсурсаў, запраектаваў будаўніцтва невялікага дрэваапрацоўчага прадпрыемства на базе гідраэнергіі.

Будаўніцтва такога завода дыктавалася наступнымі акалічнасцямі. У 31 квартале Вепрынскай дачы (урочышча «Толчея»), у 3-х кіламетрах ад Чэрыкава быў некалі нядрэнны вадаём. Такім чынам, стварэнне пруда не прадстаўляла асаблівых цяжкасцей. Акрамя таго, тут захавалася старая земляная плаціна. Нарэшце, паблізу ёсць у дастатковай колькасці неабходная сыравіна.

Завод павінен перапрацоўваць дравесныя адыходы, выпускаць вырабы шырокага спажывання, на якія ў раёне вельмі вялікі попыт (гонта, клёпка, тара і г. д.). Асаблівае значэнне мае выраб кровельнага матэрыялу.

З красавіка 1940 г., калі пачалося будаўніцтва, к сучаснаму моманту зроблены ўжо такія аб'екты, як мост даўжынёй у 12 метраў і ўсе водазатрымліваючыя збудаванні. Заканчваецца пабудовай рабочы цэх, турбінная камера. Падыходзяць к канцу работы на другім баку земляной плаціны, дзе павінна быць устаноўлена воданепранікальная гліняная праслойка.

Да 1 лістапада бягучага года павінна быць закрыта вада і створан пруд, у які вясной 1941 г. запраектавана пусціць 2—3 тысячы штук малька зяркальнага карпа.

Пуск завода ў 1940 г. затрымліваецца з прычыны адсутнасці асноўнага рухавіка — турбіны, якую трэба атрымаць на заводзе імені Сталіна ў г. Бабруйску. Няма яшчэ таксама ні аднаго жылога дома, што стварае значныя труднасці з размяшчэннем рабочых.

В. Краўчанка

15 лістапада 1940 г.

ГРАШОВЫЯ ДАХОДЫ КАЛГАСА «ЧЫРВОНЫ СОРМАВЕЦ»

У мінулым годзе калгас «Чырвоны сормавец» (гарсавет) атрымаў 124 тысячы рублёў грашовых даходаў. Даходы ад падсобнай гаспадаркі — цагельнага завода, ваўначоскі і фарбарні — склалі 56 тысяч рублёў, ад жывёлагадоўлі — 27 тысяч рублёў і г. д.

Сёлета, нават па няпоўных падліках, грашовыя даходы калгаса значна павялічыліся. Так, цагельны завод даў за 10 месяцаў каля 65 тысяч руб. даходу, ваўначоска і фарбарня — 11 тысяч руб. У тры разы больш даходаў (26 тысяч руб.) атрымана ад продажу гародніны.

24 лістапада 1940 г.

УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ЛЕСАРУБАЎ І ВОЗЧЫКАЎ

Абмеркаваўшы зварот стаханаўцаў Стаўбцоўскага леспрамгаса, лесарубы Вепрынскага лесаўчастка ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва лесарубаў і возчыкаў і ўзялі на сябе абавязацельствы датэрмінова выканаць план лесазагатовак 1940 г.

Брыгады лесарубаў тт. Шаўцова, Сончыка і Юдачкіна абавязаліся штодзённа перавыконваць нормы выпрацоўкі ў тры разы і выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва ўсіх лесарубаў Чэрыкаўскага леспрамгаса.

1 снежня 1940 г.

У ШКОЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

Бібліятэка пры Губіншчанскай школе налічвае да 4000 кніг. Сярод іх — кнігі класікаў рускай літаратуры: Пушкіна, Гогаля, Л. Талстога, М. Горкага і іншых. Многа ёсць твораў беларускіх пісьменнікаў — Я. Коласа, Я. Купалы, З. Бядулі, К. Крапівы і г. д.

Бібліятэкар т. Баськоў добра арганізаваў работу. Да 400 вучняў школы з'яўляюцца абанентамі бібліятэкі. Прыкладна адна дзесятая частка з іх кожны дзень абменьвае кнігі.

5 снежня 1940 г.

ГОД РАБОТЫ НАРОДНЫХ ВЫБРАННІКАЎ

24 снежня 1939 г. працоўныя раёна выбіралі сваіх дэпутатаў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. З агульнага ліку 18 425 выбаршчыкаў 18 324 прынялі ўдзел у галасаванні.

Характэрныя даныя аб дэпутатах. У раённым Савеце дэпутатаў працоўных з 35 дэпутатаў — 11 жанчын. З агульнага ліку дэпутатаў — 22 члены ВКП(б), 1 камсамолец і 12 беспартыйных.

У састаў райсавета было выбрана 7 радавых калгаснікаў, 1 старшыня калгаса, 1 рабочы, заняты непасрэдна на вытворчасці, прадстаўнікі савецкай інтэлігенцыі, кіруючыя партыйныя і савецкія работнікі і інш.

З 310 дэпутатаў, выбраных у сельскія Саветы па раёну,— 242 калгаснікі, з іх 107 жанчын. У ліку выбраных — 105 членаў партыі, 16 камсамольцаў. Палавіна дэпутатаў выбрана ў мясцовыя Саветы ўпершыню.

Прайшоў год з дня выбрання мясцовых органаў улады — Саветаў, і зараз магчыма падвесці некаторыя вынікі іх работы.

Трэба адзначыць, што ў абсалютнай большасці дэпутаты апраўдваюць давер народа, актыўна змагаюцца за ажыццяўленне важнейшых гаспадарча-палітычных задач.

Узяць, напрыклад, дэпутата Рэчыцкага сельсавета тав. Антонава, які зараз працуе старшынёй выканкома Рэчыцкага сельсавета. Ён быў радавым калгаснікам, потым брыгадзірам і вось зараз стаў кіраўніком буйнейшага ў раёне сельсавета.

Тав. Антонаў паказвае ўзор савецкага работніка, арганізатара мас. Ён прыцягвае да актыўнай работы дэпутатаў сельсавета, перадавых калгаснікаў. Гэта дазволіла яму вывесці сельсавет у перадавыя ў раёне. Рэчыцкі сельсавет першым выканаў хлебапастаўкі, пастаўкі бульбы, выканаў фінплан і інш. Калгасы гэтага сельсавета з'яўляюцца перадавымі па ўраджайнасці і прымяненню агратэхнікі.

Добра працуе дэпутат райсавета Еўдакія Герасімаўна Яльцова. Яна ўмела спалучае вытворчую работу з грамадскай. З'яўляецца адным з лепшых рахункаводаў у рэспубліцы, неаднаразова прэміравана за доб-

рую пастаноўку ўліку. У той жа час Еўдакія Герасімаўна на працягу некалькіх год узначальвае льнаводчае звяно свайго калгаса. Як перадавік ураджайнасці, яна з'яўляецца ўдзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У перыяд правядзення падпіскі на пазыку Еўдакія Герасімаўна забяспечыла ў дзень выдання ўрадавага дэкрэта 100-працэнтны ахват новай пазыкай усіх калгаснікаў і збор усёй сумы грошай па падпісцы.

Актыўны ўдзел у рабоце райсавета прымае дэпутат, член выканкома настаўніца Тамара Васільеўна Цілюпа. Яна ўзнагароджана медалём «За трудовое отличие». Працуючы настаўніцай і старшынёй райкома прафсаюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ, Тамара Васільеўна прымае актыўны ўдзел у рабоце выканкома, выконвае грамадскую работу. Яна, напрыклад, правяла старанную праверку работы Леменскага дзіцячага дома, унесла рад каштоўных прапаноў па паляпшэнню яго работы.

Значных поспехаў дабіўся дэпутат сельсавета, які зараз працуе старшынёй выканкома Глінскага сельсавета, тав. Дземяненка.

Актыўна працуюць дэпутат райсавета тав. Агінская і дэпутат абласнога Савета тав. Саланая, узнагароджаная за поспехі ў галіне жывёлагадоўлі Малым сярэбраным медалём. Трэба адзначыць дэпутата гарсавета ўрача тав. Карначэнка, дэпутатаў сельсаветаў тт. Ярмоленка, Яфрэменка і іншых.

У выніку перабудовы работы мясцовых Саветаў, актыўнага ўдзелу ў рабоце народных выбраннікаў наш раён мае поспехі ў выкананні важнейшых сельскагаспадарчых работ (пастаўкі хлеба, бульбы, закупка хлеба, пад'ём зяблівa і г. д.). Заметна павысілася працоўная дысцыпліна на прадпрыемствах і ў калгасах, памножыліся рады перадавікоў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Аднак асобныя сельсаветы зацягваюць выкананне важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Гэта, у прыватнасці, Зябенскі і Шароеўскі сельсаветы, старшынямі якіх з'яўляюцца тт. Пеўзнер і Мельнікаў. Гэтыя таварышы павінны палепшыць сваю работу, каб выбаршчыкі не «пракаталі іх на вараных». Нельга забываць аб тым, што перад кожным выбраннікам народа стаіць адказная задача — з дня ў дзень працаваць на паляпшэнне дабрабыту сваіх выбаршчыкаў, свайго народа.

Для таго каб работа мясцовых Саветаў нашага раёна была найбольш пладатворнай, неабходна ажывіць работу пастаянна дзеючых камісій, прыцягнуць да работы ў іх шырокі актыў рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі.

Дэпутаты сельскіх Саветаў павінны памятаць, што яны нясуць адказнасць за калгасную вытворчасць. Зараз іх увага павінна быць звернута на тое, каб завяршыць усе сельскагаспадарчыя работы гэтага года, стварыць недзялімыя фонды ў калгасах, правесці размеркаванне даходаў. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на падрыхтоўку да веснавой сяўбы, на выкананне дзяржаўнага плана развіцця жывёлагадоўлі, на ўмацаванне працоўнай дысцыпліны.

Н. Лукашоў.

Падрыхтавала Г. Берліна.

Чэрыкаўская метэаралагічная станцыя

Заснавана ў 1886 г. на паўднёвай ускраіне Чэрыкава, з 1930 г.— у цэнтры горада. Працавала да 1909 і ў 1930—1936 гг. Назіранні за перы-

яд 1886—1890 гг. вяліся па праграме метэастанцый 3-га разраду, за перыяды 1891—1909 і 1930—1936 гг.— метэастанцый 2-га разраду. Матэрыялы назіранняў паказальныя для тэрыторыі 25—35 км вакол станцыі. Назіранні вяліся за тэмпературай паветра, ападкамі, снегавым покрывам і атмасфернымі з'явамі. Працягласць перыяду з сярэднесутачнымі тэмпературамі вышэй 0 °С 230 сут, вегетацыйны перыяд 187 сут, беззамаразкавы — 154 сут. Апошні замаразак у паветры ў сярэднім 2 мая, першы — 4 кастрычніка. Сярэднямесячная тэмпература паветра ў студзені ад —2,3 (1899) да —11,6 °С (1896), у ліпені ад 15,0 (1935) да 20,2 °С (1931). Гадавы абсалютны мінімум тэмпературы паветра ніжэй за —35 °С назіраецца раз у 20 гадоў. Максімальная вышыня снегу за зіму ў сярэднім 18 см, у асобныя гады — да 45 см.

З. Таўціева.

І засталіся толькі фотакарткі

У Сакалоўцы, у адной з хат, здзівіла вялікая колькасць рамачак з фотакарткамі. Адкуль прыйшла першая фотакартка на вёску? Хто першы шчоўкнуў перад вяскоўцамі затворам фотаапарата? І ў той і ў гэтай хаце прыпамінаюць Саракалетавых хлопцаў — Сцёпку і Андрэя. Казалі, што быццам бы Сцёпка вучыўся на лётчыка. І вось неяк летам прыехаў з братам на пабыўку. Разам з сабой яны прыцягнулі нейкую вялікую чорную скрыню, паглядзець на якую збеглася ўся вёска. Пасля гаварылі, як пра нешта звышнатуральнае.

— Саракалетавы хлопцы картачкі рабіць будуць.

І столькі таямнічага было ў гэтых словах. Расказваюць так. У спякотны дзень, такі, што ажно млела лістота на вербах, якія кучаравіліся ля хаты Саракалетавых, на мурожную траву ў цяньку паселі бабы і мужыкі, хлопцы і дзяўчаты, а дзятва насілася па вуліцы ўзад-уперад. Кожны чакаў цуда. Кожны хацеў на свае вочы пабачыць, як гэта з яго будуць рабіць фотакартачку. Думалі, што хлопцы з хаты выйдуць, а яны са склепа вылезлі — са звычайнага, вясковага, і неслі тую самую загадкавую чорную скрыню. Потым Сцёпка доўга ўстанаўліваў яе на трох нагах, а Андрэй тым часам прымацоўваў да каржакаватага вярбовага ствала белую прасціну, напятую на драўляную раму. Людзі цікавалі за кожным іх рухам, нават гоману не было чуваць. Хацелася запаветную картачку. Калі прыгатаванні скончыліся, старэйшы Андрэй сказаў:

— Ну, хто першы жадае зняцца?

Жанчыны пацяснулі плячыма, а дзяўчаты сарамліва адступілі назад. Хтосьці з мужыкоў падзадорыў:

— Гапка, сядай на ўслончык! На што дык смелая і баявая, а тут нечага здрэйфіла.

— А што? І сяду! — адазвалася Гапка.— Рукі сюды, галаву вышэй! — закамандаваў Сцёпка. Потым нешта чараваў, схаваўшы галаву пад чорную лахманіну. Потым сказаў «увага!», і ў чорнай скрынцы пачуўся лёгенькі шчаўчок.

— Гэта і ўсё? — здзівілася цётка Гапка, калі Сцёпка падзякаваў ёй.

Як прыпамінаюць вяскоўцы, у той дзень ля прасціны садзіліся пад вярбу Пятрок Баранаў, Грышка Ляўкоў, Іван Яфрэмаў, Акуліна Астапава. На малых, як гаварылі Сцёпка з Андрэем, не хапіла пласціны. Дзеці здзівіліся, што дарослыя ўлезлі ў пласціны, а яны, меншыя па росту, не.

Фотакарткі Саракалетавы хлопцы зрабілі, як і абяцалі, дні праз тры.

А вось другое абяцанне не стрымалі: не прыехалі ні ў наступнае лета, ні ў наступную восень. Ніколі больш не з'явіліся ў вёсцы. Пачалася вайна. Немцы ўшчэнт спалілі вёску, і скарб людскі загінуў у агні. Рэдка ў якой хаце захаваліся фотакарткі, зробленыя хлопцамі Саракалетавымі.

А. Хныкава.

Вернутыя імёны

Дзесяткі гадоў людзі жылі ва ўмовах самавольства і беззаконнасці, павальных рэпрэсій, якім былі падвергнуты мільёны сыноў і дачок нашага народа. Завесу над страшнымі тайнамі, якія захоўваліся за сямю пячаткамі спецаддзелаў, спецархіваў, прыўзняў XX з'езд КПСС. Але і на сённяшні дзень да канца невядомы імёны без віны загінуўшых. Многае ў архівах не захавалася, а многае захавалася ў выглядзе асобных звестак.

Паводле Пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб ходзе рэалізацыі ў Мінскай вобласці заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць пытанні рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 20—80 гадоў», работу па рэабілітацыі рэпрэсіраваных грамадзян, па ўвекавечанню іх памяці, устанаўленню і прывядзенню ў належны стан месцаў іх пахавання трэба весці больш актыўна і мэтанакіравана. Шлях да праўды нялёгкі. Але ідзе работа ў архівах, людзям вяртаюць іх чэсныя імёны. Ніжэй прыводзіцца спіс рэабілітаваных жыхароў Чэрыкаўскага раёна (адказны за прадстаўлены спіс рэдактар раённай газеты «Заклік Ільіча» І. І. Сулімаў). Па многіх прычынах спісы не могуць быць поўнымі і дакладнымі. Пошук на гэтым не канчаецца. Будзем спадзявацца, што новыя імёны чэрыкаўлян таксама знойдуць сваё месца на старонках кніг «Памяць».

АБІРАЛАЎ Аўрам Калістратавіч, нарадзіўся ў 1890 г., пражываў у в. Шароеўка, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 5 лютага 1930 г., высланы на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1990 г.

АГЕЕЎ Ягор Кірылавіч, нарадзіўся ў 1880 г., пражываў у в. Тур'е, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 30 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ*. Рэабілітаваны ў 1989 г.

АДДЗЕЛЬНЫ Платон Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1878 г. у в. Вудага, пражываў у Чэрыкаве. Рэпрэсіраваны 15 жніўня 1938 г. Справа спынена ў 1939 г.

АЛЕСАЎ Трафім Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1899 г. і пражываў у в. Рагаліна, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

АНАНІЧ Іосіф Палікарпавіч, нарадзіўся ў 1889 г. Рэпрэсіраваны 11 верасня 1935 г., засуджаны на 2 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990 г.

АНДРЭЕЎ Апанас Платонавіч, нарадзіўся ў 1884 г., пражываў у в. Рынкоўка, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 6 жніўня 1937 г. Рэабілітаваны ў 1961 г.

АНДРЭЕНКА Андрэй Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1904 г., пражываў у в. Забачэў, працаваў машыністам вадапампавай станцыі на ст. Верамейкі. Рэпрэсіраваны 4 ліпеня 1944 г., засуджаны на 20 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1967 г.

АРЛОЎ Яфім Антонавіч, нарадзіўся ў 1886 г. і пражываў у в. Губеншчына, калгаснік калгаса імя Калініна. Рэпрэсіраваны 9 сакавіка 1933 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэалібітаваны ў 1958 г.

АРЦЮШЭЎСКІ Эдуард Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1905 г. у в. Антонаўка Дзяржынскага раёна, рабочы Чэрыкаўскай МТС. Рэпрэсіраваны 24 жніўня 1937 г., расстраляны ў Магілёве 11 студзеня 1938 г. Рэабілітаваны ў 1989 г.

АСІПЕНКА Сідар Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1917 г. у в. Шчацінка, ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны 23 студзеня 1943 г. Вызвалены 16 красавіка 1943 г. Рэабілітаваны ў 1953 г.

АСМАЛОЎСКІ Кузьма Венядзіктавіч, нарадзіўся ў 1884 г. і пражываў у в. Астравы, селянін. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення у ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960 г.

АЎСЯННІКАЎ Андрэй Іванавіч, нарадзіўся ў 1877 г., пражываў у в. Дубраўка, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 1 верасня 1937 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961 г.

АЎСЯННІКАЎ Васіль Андрэевіч, нарадзіўся ў 1911 г. у в. Цітаўка, пражываў у в. Дубраўка, калгаснік калгаса «17 партз'езд». Рэпрэсіраваны 11 лістапада 1936 г., за-

* ППЛ — папраўча-працоўны лагер.

суджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990 г.

АЎЧЫННІКАЎ Мікалай Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1905 г. і пражываў у в. Вербеж, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27 снежня 1932 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1959 г.

АЎЧЫННІКАЎ Платон Аўрамавіч, нарадзіўся ў 1873 г. і пражываў у в. Лобча, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1975 г.

АФАНАСЬЕЎ Дзямід Іванавіч, нарадзіўся ў 1879 г. і пражываў у в. Вербеж, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 19 лістапада 1937 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1969 г.

АФАНАСЬЕЎ Іван Дзям'янавіч, нарадзіўся і пражываў у в. Журавель, калгаснік. Рэпрэсіраваны 27 снежня 1932 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1991 г.

БАГАЧОЎ Сямён Ягоравіч, нарадзіўся ў 1896 г. і пражываў у в. Зябень, селянін. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960 г.

БАГДАНОВІЧ Павел Вікенцьевіч, нарадзіўся ў 1901 г. у в. Луніно Уздзенскага раёна, пражываў у в. Халменка, калгаснік калгаса «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 25 красавіка 1938 г., расстраляны 21 верасня 1938 г., пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1989 г.

БАГДАНСКІ Ілья Іванавіч, нарадзіўся ў 1888 г. і пражываў у в. Вербеж, пячнік. 29 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. 30 сакавіка 1944 г. памёр. Рэабілітаваны ў 1959 г.

БАГДАНСКІ Ілья Іванавіч, нарадзіўся ў 1888 г. і пражываў у в. Вербеж, пячнік. Рэпрэсіраваны 18 ліпеня 1937 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1959 г.

БАГДАНСКІ Іпат Пятровіч, нарадзіўся ў 1876 г. і пражываў у в. Вербеж, калгаснік. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1959 г.

БАГДАНСКІ Захар Іпатавіч, нарадзіўся ў 1906 г. і пражываў у в. Вербеж, калгаснік. Рэпрэсіраваны 27 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1959 г.

БАГДАНСКІ Канстанцін Іванавіч, нарадзіўся ў 1894 г. і пражываў у в. Вербеж, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1959 г.

БАГДАНСКІ Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1891 г. і пражываў у в. Вербеж, калгаснік. Рэпрэсіраваны 29 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1959 г.

БАЛАБУЁЎ Фама Стафанавіч, нарадзіўся ў 1885 г. і пражываў у в. Доўгая, селянін. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г.

БАНДУРЫН Іосіф Аўрамавіч, нарадзіўся ў 1901 г. у в. Наркі, чырвонаармеец 1-й роты 173-га батальёна. Рэпрэсіраваны 14 лістапада 1942 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1986 г.

БАНДОВА Агаф'я Акімаўна, нарадзілася ў 1905 г., пражывала ў в. Вохар, калгасніца. Рэпрэсіравана 1 снежня 1944 г. Рэабілітавана ў 1945 г.

БАРКОЎ Васіль Сільвестравіч, нарадзіўся ў 1912 г. і пражываў у в. Вербеж, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагеры. 12 мая 1942 г. памёр. Рэабілітаваны ў 1959 г.

БАРАНАЎ Кірыла Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1900 г. у в. Халмянская Слабада, пражываў у в. Камаровічы. Рэпрэсіраваны 8 жніўня 1938 г., расстраляны. Рэабілітаваны 29 ліпеня 1959 г.

БАРАДУЛІН Андрэй Маркавіч, нарадзіўся ў 1876 г. і пражываў у в. Казбуда, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 28 красавіка 1936 г. Рэабілітаваны ў 1939 г.

БАРЦОЎ Іван Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1880 г., пражываў у в. Горкі, раскулачаны. Рэпрэсіраваны ў 1929 г., адбываў пакаранне ў Архангельскай вобласці. Рэабілітаваны ў 1992 г.

БАРЦОВА Акуліна Міхайлаўна, пражывала ў в. Горкі, раскулачана. Рэпрэсіравана ў 1929 г., адбывала пакаранне ў Архангельскай вобласці. Рэабілітавана ў 1992 г.

БАРЦОЎ Аляксандр Іванавіч, пражываў у в. Горкі, раскулачаны. Рэпрэсіраваны ў 1929 г. Рэабілітаваны ў 1992 г.

БАРЦОЎ Барыс Іванавіч, пражываў у в. Горкі, раскулачаны. Рэпрэсіраваны ў 1929 г., адбываў пакаранне ў Архангельскай вобласці. Рэабілітаваны ў 1992 г.

БАРЦОЎ Іван Іванавіч, пражываў у в. Горкі, раскулачаны. Рэпрэсіраваны ў 1929 г., адбываў пакаранне ў Архангельскай вобласці. Рэабілітаваны ў 1992 г.

БАРЦОЎ Міхаіл Іванавіч, пражываў у в. Горкі, раскулачаны. Рэпрэсіраваны ў 1929 г., адбываў пакаранне ў Архангельскай вобласці. Рэабілітаваны ў 1992 г.

БАРЦОВА Ніна Іванаўна, пражывала ў в. Горкі. Рэпрэсіравана ў 1929 г., адбывала пакаранне ў Архангельскай вобласці. Рэабілітавана ў 1992 г.

БАРЦОЎ Уладзімір Іванавіч, пражываў у в. Горкі, раскулачаны. Рэпрэсіраваны ў 1929 г., адбываў пакаранне ў Архангельскай вобласці. Рэабілітаваны ў 1992 г.

БАРАНАЎ Аўтаном, нарадзіўся ў 1896 г., пражываў у в. Вусце, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г.

БАРАНАЎ Раман Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1892 г., пражываў у в. Прыпёчына, калгаснік. Рэпрэсіраваны 3 студзеня 1933 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962 г.

БАРСУКОЎ Ілья Паўлавіч, нарадзіўся ў 1889 г., пражываў у в. Вепрын, працаваў лесніком у Чэрыкаўскім лясгасе. Рэпрэсіраваны 22 снежня 1944 г. Рэабілітаваны ў 1945 г.

БАСЬКОЎ Аляксандр Ніканавіч, нарадзіўся ў 1895 г. і пражываў у в. Касцюкоўка, калгаснік калгаса «Новы шлях». Рэпрэсіраваны 31 мая 1937 г., засуджаны на 6 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1966 г.

БАСЯНКОЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1894 г. у Чэрыкаўскім раёне, чырвонаармеец, пражываў у с. Каменка Алтайскага раёна. Рэпрэсіраваны 22 ліпеня 1945 г., засуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены 22 ліпеня 1953 г. Рэабілітаваны ў 1955 г.

БАЦАНОЎ Мікалай Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1922 г., пражываў у в. Горкі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 10 мая 1944 г. 31 мая 1944 г. справа спынена.

СТАРАСЦІН Рыгор Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1894 г., пражываў у в. Прыпёчына, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962 г.

СТАРАСЦІН Рыгор Мікітавіч, нарадзіўся ў 1899 г. у в. Прыпёчына, пражываў у Чэрыкаве, калгаснік калгаса імя Молатава. Рэпрэсіраваны 22 чэрвеня 1941 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962 г.

СТАРАВОЙТАЎ Арцём Арсенцьевіч, нарадзіўся ў 1896 г., пражываў у в. Рэчыца, старшыня калгаса імя Будзённага. Рэпрэсіраваны 14 студзеня 1933 г., прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1964 г.

СТАРАВОЙТАЎ Мітрафан Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1894 г. і пражываў у в. Галоўчыцы, земляроб. Рэпрэсіраваны 14 красавіка 1933 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ умоўна. Рэабілітаваны ў 1989 г.

СТАРАВОЙТАЎ Несцер Фаміч, нарадзіўся ў 1888 г. у в. Горкі, пражываў у в. Паходавічы, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 2 студзеня 1935 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Адбываў пакаранне ў Карагандзе — Кáрлаг. Дата вызвалення невядома. Рэабілітаваны ў 1989 г.

СТАРАВОЙТАЎ Савелій Цярэнцьевіч, пражываў у в. Рэчыца, калгаснік калгаса імя Будзённага. Рэпрэсіраваны 14 студзеня 1933 г. Рэабілітаваны ў 1964 г.

СТАРАВЕРАЎ Марк Іванавіч, нарадзіўся ў 1893 г., пражываў у в. Прудкі, селянін. Рэпрэсіраваны 5 чэрвеня 1920 г. Справа спынена Асобым аддзелам 15 ліпеня 1920 г.

СТАЛЯРОЎ Еўдакім Апанасавіч, нарадзіўся ў 1865 г., пражываў у Чэрыкаве, калгаснік. Рэпрэсіраваны 18 студзеня 1933 г., высланы на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1963 г.

СТАРАДОМСКІ Міхаіл Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1872 г., пражываў у Чэрыкаве, святар. Рэпрэсіраваны 6 жніўня 1937 г., засуд-

жаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1956 г.

СУДЗЯЛОЎСКІ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1908 г. у в. Астравы. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960 г.

СУРГАЧОЎ Васіль Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1894 г., пражываў у Чэрыкаве, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 22 сакавіка 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Дата вызвалення невядома. Рэабілітаваны ў 1989 г.

СЦЕСАЎ Мікалай Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1907 г. і пражываў у в. Губеншчына, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 9 сакавіка 1933 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958 г.

СЦЯПАНАЎ Пётр Ільіч, нарадзіўся ў 1880 г., пражываў у Чэрыкаве, вартаўнік. Рэпрэсіраваны 22 мая 1946 г., засуджаны на 6 гадоў спецпасялення. Рэабілітаваны ў 1947 г.

СЯМЁНАЎ Ціхан Навумавіч, нарадзіўся ў 1888 г. у в. Васькоўка, чырвонаармеец. Рэпрэсіраваны 5 верасня 1920 г. Рэабілітаваны 23 верасня 1920 г.

ТАЛКАЧОЎ Яфім Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1885 г. у в. Ходасы Мсціслаўскага раёна, пражываў у в. Вусце, працаваў бухгалтарам Крычаўскай базы па нарыхтоўцы збожжа. Рэпрэсіраваны 21 жніўня 1949 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962 г.

ТАМАШОЎ Міхей Пятровіч, нарадзіўся ў 1902 г. у в. Дубраўка, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., расстраляны. Месца смерці і дата пахавання невядомы. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ТКАЧОВА Хрысанфа Аляксандраўна, нарадзілася ў 1895 г. і пражывала ў в. Вудага. Рэпрэсіравана 17 лютага 1930 г., выслана на Поўнач. Дата вызвалення невядома. Рэабілітавана Вярхоўным судом БССР.

ТРАМБАЧОЎ Фядот Майсеевіч, нарадзіўся ў 1896 г. у в. Ждановічы Дрыбінскага раёна, пражываў у в. Вуглы, працаваў брыгадзірам калгаса «Чырвоная зара». Рэпрэсіраваны 13 чэрвеня 1937 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960 г.

ТРУСАЎ Рыгор Спірыдонавіч, нарадзіўся ў 1910 г. у в. Вусце, ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны 22 жніўня 1942 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Адбываў пакаранне ў Паўночным лагеры НКУС СССР. Рэабілітаваны ў 1958 г.

ТРУСАЎ Сямён Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1900 г. і пражываў у в. Зябень, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961 г.

УЛАДЗІМІРАЎ Рыгор Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1884 г., пражываў у Чэрыкаве, працаваў цесляром у гарсавеце. Рэпрэсіраваны 4 снежня 1941 г. Рэабілітаваны ў 1964 г.

ФЁДАРАЎ Прохар Паўлавіч, нарадзіўся ў 1892 г., пражываў у в. Мірагошч, цясляр калгаса «Сцяг працы». Рэпрэсіраваны 18 ліпеня 1937 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1956 г.

ФІЛІМОНЕНКА Іван Давыдавіч, нарадзіўся ў 1875 г., пражываў у в. Гронаў, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 7 сакавіка 1933 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ФІЛІМОНЕНКА Трафім Іванавіч, нарадзіўся ў 1902 г., пражываў у в. Гронаў, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 7 сакавіка 1933 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ФУФАЁЎ Барыс Вісарыёнавіч, нарадзіўся ў 1898 г. у Чэрыкаве, памочнік начальніка першага аддзялення (абозна-рэчыўны аддзел БВА). Рэпрэсіраваны 3 ліпеня 1938 г. Рэабілітаваны ў 1940 г.

ХАЗАНАЎ Даніла Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1921 г. у Чэрыкаве, ваеннаслужачы. Дата рэпрэсіі невядома. Рэабілітаваны ў 1945 г.

ХАЛАМЕЕЎ Васіль Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1920 г. у в. Шароеўка, ваеннаслужачы. Дата рэпрэсіі невядома. Рэабілітаваны ў 1964 г.

ХОБАТАЎ Васіль Лук'янавіч, нарадзіўся ў 1910 г. у в. Рагаліна, працаваў кухарам у шпіталі ў г. Кіраваградзе. Рэпрэсіраваны 17 чэрвеня 1944 г. Рэабілітаваны 17 кастрычніка 1964 г.

ХРОМЧАНКА Пракоп Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1906 г., пражываў у в. Манастырок, калгаснік. Рэпрэсіраваны 5 студзеня 1933 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Вызвалены 20 снежня 1936 г. Рэабілітаваны ў 1958 г.

ЦАПУРА Мартын Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1903 г. у в. Дуб Быхаўскага раёна, пражываў у в. Селішча, працаваў грузчыкам у раённай нарыхтоўчай канторы. Рэпрэсіраваны 1 верасня 1937 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ЦАЦОХА Іван Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1921 г. у Чэрыкаве, чырвонаармеец 729-га стралковага палка. Рэпрэсіраваны 10 лістапада 1941 г. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання, з турмы ўцёк. Рэабілітаваны 15 студзеня 1948 г.

ЦЕХАН Іван Вікенцьевіч, нарадзіўся ў 1870 г. і пражываў у в. Прыволле, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8 лютага 1930 г., расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ЦЕХАН Ігнат Вікенцьевіч, нарадзіўся ў 1868 г. і пражываў у в. Прыволле, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 1 лютага 1930 г., расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ЦІТОЎ Герасім Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1876 г., пражываў у Чэрыкаве. Рэпрэсіраваны 8 ліпеня 1938 г., 29 кастрычніка 1938 г.

расстраляны, пахаваны ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1983 г.

ЦІТОЎ Пётр Мікітавіч, нарадзіўся ў 1904 г. у в. Доўгая, ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны 8 лютага 1943 г. Рэабілітаваны 20 лютага 1943 г.

ЦІТОЎ Яфім Яўменавіч, нарадзіўся ў 1919 г. у в. Журавель, радавы. Рэпрэсіраваны 29 верасня 1943 г. Рэабілітаваны 17 студзеня 1944 г.

ЦІХАНАЎ Васіль Данілавіч, нарадзіўся ў 1892 г. і пражываў у в. Зябень, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., расстраляны. Дата смерці і месца пахавання невядомы. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ЦІХАНКОЎ Сяргей Піліпавіч, нарадзіўся ў 1886 г. у в. Тур'е, пражываў у Чэрыкаве, калгаснік калгаса імя Молатава. Рэпрэсіраваны 8 ліпеня 1938 г., расстраляны. Рэабілітаваны ў 1969 г.

ЦЫБУЛЯ Усцін Мікітавіч, нарадзіўся ў 1886 г. і пражываў у в. Зоры, селянін. Рэпрэсіраваны 26 снежня 1932 г., расстраляны. Рэабілітаваны ў 1962 г.

ЦЫГАНКОЎ Міхей Данілавіч, нарадзіўся ў 1900 г., пражываў у в. Халоблін, вартаўнік. Рэпрэсіраваны 26 чэрвеня 1945 г. Рэабілітаваны 20 жніўня 1945 г.

ЦЫГАНКОЎ Нічыпар Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1889 г. у в. Папіхінка Клімавіцкага раёна, пражываў у в. Вепрын, селянін. Рэпрэсіраваны 7 жніўня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1962 г.

ЦЯРЭШЧАНКА Аляксей Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1913 г. у в. Волчас, ветфельчар 72-га кавалерыйскага палка. Рэпрэсіраваны 11 снежня 1936 г., засуджаны на 6 гадоў пазбаўлення волі. Адбываў пакаранне ў Паўночна-Усходнім лагеры НКУС СССР. У 1942 г. вызвалены. Рэабілітаваны ў 1956 г.

ЧАРТКОЎ Іван Архіпавіч, нарадзіўся ў 1880 г. і пражываў у в. Губеншчына, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ЧЫННЫ Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1874 г. і пражываў у в. Вепрын. Рэпрэсіраваны 10 студзеня 1933 г., высланы на 5 гадоў на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1962 г.

ЧЭН-ДЖЫ-СЯН Міхаіл, нарадзіўся ў Пекіне, кітаец, пражываў у Чэрыкаве, займаўся гандлем. Рэпрэсіраваны 28 студзеня 1933 г. Рэабілітаваны 23 сакавіка 1933 г.

ЧЭПІКАЎ Сямён Іванавіч, нарадзіўся ў 1903 г. у в. Зоры, ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны 29 мая 1943 г., засуджаны на 7 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962 г.

ЧЭРНЫШ Пётр Цярэнцьевіч, нарадзіўся ў 1873 г. у Чарнігаўскай вобласці, служыцель рэлігійнага культу, пражываў і працаваў у в. Камаровічы. Рэпрэсіраваны 8 студзеня 1935 г., высланы на 5 гадоў у Казахстан. Дата вызвалення невядома. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ЧЭХАЎ Ігнат Макаравіч, нарадзіўся ў 1877 г. і пражываў у в. Вепрын, калгаснік. Рэпрэсіраваны 10 студзеня 1933 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1962 г.

ШАМРО Уладзімір Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1915 г. у в. Прудок Крычаўскага раёна, пражываў у Крычаве, працаваў у Чэрыкаўскім райкаме партыі. Рэпрэсіраваны 15 кастрычніка 1943 г., расстраляны. Рэабілітаваны ў 1971 г.

ШАПЯЛЕЎЦАЎ Глеб Васілевіч, нарадзіўся і пражываў у Чэрыкаве, працаваў бухгалтарам. Рэпрэсіраваны 16 кастрычніка 1943 г., засуджаны на 7 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960 г.

ШАЎКУНОЎ Аляксей Карпавіч, нарадзіўся ў 1902 г. і пражываў у в. Сакалоўка, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 20 студзеня 1933 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ШАЎЦОЎ Андрэй Маркавіч, нарадзіўся ў 1901 г. у в. Васькоўка, чырвонаармеец. Рэпрэсіраваны 22 жніўня 1940 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958 г.

ШМЫГІН Міхаіл Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1917 г., пражываў у в. Вусце, селянін. Рэпрэсіраваны 10 сакавіка 1951 г. Рэабілітаваны УАМДБ Мінскай вобласці.

ШНЭЙДАР Ягор Конанавіч, нарадзіўся ў 1881 г., пражываў у в. Гронаў дзесятнік Вепрынскага леспрамгаса. Рэпрэсіраваны 7 сакавіка 1933 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ШПАКОЎСКІ Лявонцій Раманавіч, нарадзіўся ў 1914 г. у в. Лучнікі Слуцкага раёна, пражываў у Чэрыкаве, працаваў настаўнікам Чэрыкаўскай сярэдняй школы. Рэпрэсіраваны 29 верасня 1937 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 28 кастрычніка 1939 г.

ШТУКАРОЎ Васіль Міхеевіч, нарадзіўся ў в. Журавель. Рэпрэсіраваны 26 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1991 г.

ШУМІЛІН Апанас Іванавіч, нарадзіўся ў 1901 г. і пражываў у в. Князёўка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., расстраляны. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ШУМІЛІН Рыгор Піліпавіч, нарадзіўся ў 1884 г. і пражываў у в. Шароеўка, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 14 лютага 1930 г. Справа спынена, вызвалены 9 сакавіка 1930 г.

ШУМІЛІН Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1899 г. і пражываў у в. Князёўка, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 14 красавіка 1933 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ШЫЛАЎ Пётр Паўлавіч, нарадзіўся ў 1876 г., пражываў у в. Вохар, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ШЭВЯЛЕЎ Нічыпар Іванавіч, нарадзіўся ў 1887 г. і пражываў у в. Гронаў, цясляр. Рэпрэсіраваны 23 красавіка 1938 г. Рэабілітаваны 25 снежня 1938 г.

ЯВОРАЎСКІ-АКУЛІЧ Ілья Іванавіч, нарадзіўся ў 1882 г. у в. Старынка Гродзенскай вобласці, працаваў у Чэрыкаве аграномам райземаддзела. Рэпрэсіраваны 23 жніўня 1937 г., 11 студзеня 1938 г. расстраляны. Рэабілітаваны ў 1967 г.

ЯЗВІНСКІ Фелікс Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1880 г., у в. Язвіна Уздзенскага раёна, пражываў у Чэрыкаве, калгаснік калгаса імя Молатава. Рэпрэсіраваны 13 сакавіка 1938 г. Рэабілітаваны ў 1938 г.

ЯКІМЕНКА Васіль Яфімавіч, нарадзіўся ў 1914 г., пражываў у Чэрыкаве, рабочы Крычаўскага цэментнага камбіната. Рэпрэсіраваны 18 жніўня 1937 г., у 1945 г. вызвалены. Рэабілітаваны ў 1962 г.

ЯЛЬЦОЎ Андрэй Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1889 г., пражываў у в. Вохар, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27 снежня 1939 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ЯЛЬЦОВА Еўдакія Герасімаўна, нарадзілася ў 1906 г., пражывала ў в. Міхлін, калгасніца. Рэпрэсіравана 9 красавіка 1949 г. Рэабілітавана 10 лістапада 1949 г.

ЯНЧЫН Сяргей Георгіевіч, нарадзіўся ў 1914 г., пражываў у в. Баровая, селянін. Рэпрэсіраваны 22 снежня 1944 г. Рэабілітаваны ў 1946 г.

ЯРМОЛЕНКА Яфрэм Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1888 г., пражываў у в. Чудзянская Слабада, працаваў шаўцом. Рэпрэсіраваны 22 снежня 1944 г. Рэабілітаваны 9 лістапада 1946 г.

ЯСКЕВІЧ Прохар Герасімавіч, нарадзіўся ў 1888 г., пражываў у в. Ушакі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ЯСКЕВІЧ Сяргей Аўрамавіч, нарадзіўся ў 1885 г., пражываў у в. Ушакі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 22 снежня 1944 г. Рэабілітаваны ў 1945 г.

ЯЎГЕНАЎ Георгій Яўціхавіч, нарадзіўся ў 1886 г. у в. Ярмоленка, пражываў у в. Карэнец Крычаўскага раёна. Рэпрэсіраваны 18 чэрвеня 1937 г., 1 кастрычніка 1937 г. расстраляны, пахаваны ў Магілёве. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ЯФРЭМЕНКА Павел Савельевіч, нарадзіўся ў 1903 г. і пражываў у в. Вусце, ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны 22 жніўня 1940 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958 г.

ЯФРЭМЕНКА Рыгор Стафанавіч, нарадзіўся ў 1909 г. у в. Вусце, ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны 22 жніўня 1940 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958 г.

Калі кніга была падрыхтавана да выдання, сталі вядомы новыя імёны рэабілітаваных.

АВЕРЧАНКА (Аветчанка) Навум Апанасавіч, нарадзіўся ў 1893 г. і пражываў у в. Шчацінка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1961 г.

АГЕЕЎ Яфрэм Паўлавіч, нарадзіўся ў 1877 г. у в. Каркоўшчына. Рэпрэсіраваны 18 ліпеня 1937 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г.

АСМАЛОЎСКІ Васіль Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1878 г. і пражываў у в. Сененка, калгаснік калгаса «Чырвоная зорка». Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989 г.

АСТАПЕНКА Стафан Кузьміч, нарадзіўся ў 1892 г. і пражываў у в. Волчас, цясляр, працаваў на ст. Крычаў. Рэпрэсіраваны 6 жніўня 1937 г., 19 верасня 1937 г. расстраляны ў Магілёве. Месца пахавання невядома. Рэабілітаваны ў 1989 г.

АЎЧЫННІКАЎ Кірыла Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1872 г. і пражываў у в. Наркі. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

БУДАГОЎСКІ Рыгор Іванавіч, нарадзіўся ў 1885 г. і пражываў на хутары Язловіца, калгаснік калгаса «Чырвоная зорка». Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ГАНЧАРОЎ Міхаіл Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1905 г. і пражываў у в. Лабанаўка, працаваў у сельпо. Рэпрэсіраваны 22 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ГЛІНКОЎ Осіп Аўрамавіч, нарадзіўся ў 1882 г. і пражываў у в. Маляцін, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 24 студзеня 1932 г., прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Аб расстрэле даных няма. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ДАНІЛОВІЧ Матрона Рыгораўна, пражывала ў Чэрыкаве. Рэпрэсіравана ў 1930 г., раскулачана. Рэабілітавана ў 1992 г.

ДАНІЛОВІЧ Пётр Пятровіч, нарадзіўся і пражываў у Чэрыкаве. Рэпрэсіраваны ў 1930 г., раскулачаны. Рэабілітаваны ў 1992 г.

ДЗМІТРЫЕЎ Апанас Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1886 г. і пражываў у в. Балванаўка, працаваў у калгасе. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ЕЖАЛЕЎ Лявон Барысавіч, нарадзіўся ў 1880 г. і пражываў у в. Язёры, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ЕЎДАКІМЕНКА Кузьма Андрэевіч, нарадзіўся ў 1906 г. у в. Маляцін, пражываў у в. Лабанаўка, земляроб. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ЖУКАЎ Яфім Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1914 г. і пражываў у в. Шчацінка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ЖЫГАЛАЎ Даніла Васілевіч, нарадзіўся ў 1878 г. і пражываў у в. Наркі. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

КАВАЛЁЎ Аляксей Іванавіч, нарадзіўся ў 1875 г. і пражываў у в. Наркі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

КАВАЛЁЎ Сяргей Самуйлавіч, нарадзіўся ў 1915 г. і пражываў у в. Наркі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

КАВАЛЁЎ Фядос Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1872 г. і пражываў у в. Шчацінка. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

КАНАПЕЛЬКІН Андрэй Васілевіч, нарадзіўся ў 1897 г. і пражываў у в. Шчацінка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1961 г.

КАСАРЭНКА Васіль Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1894 г. і пражываў у в. Наркі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г., высланы на 3 нады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

КАСАРЭНКА Павел Іванавіч, нарадзіўся ў 1897 г. і пражываў у в. Наркі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1961 г.

КІСЯЛЕЎ Сямён Антонавіч, нарадзіўся ў 1897 г. і пражываў у в. Маляцін, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г., прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Аб расстрэле даных няма. Рэабілітаваны ў 1989 г.

КОШАЛЕЎ Павел Зіноўевіч, пражываў у в. Рынкоўка, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930 г., раскулачаны. Рэабілітаваны ў 1992 г.

КОШАЛЕВА Лідзія Паўлаўна, пражывала ў в. Рынкоўка. Рэпрэсіравана ў 1931 г., раскулачана. Рэабілітавана ў 1992 г.

КОШАЛЕВА Марыя Яфрэмаўна, пражывала ў в. Рынкоўка. Рэпрэсіравана ў 1931 г. Рэабілітавана ў 1992 г.

КРУЖАЛІН Ігнат Данілавіч, нарадзіўся ў 1886 г. і пражываў у в. Лабанаўка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 28 снежня 1932 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ЛЕГАНЬКОЎ Апанас Фядосавіч, нарадзіўся ў 1899 г. і пражываў у в. Лютраўка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ЛЯШКО Юрый Кандратавіч, нарадзіўся ў 1886 г. і пражываў у в. Наркі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

МАКАРАНКА Андрэй Пятровіч, нарадзіўся ў 1899 г. і пражываў у в. Шчацінка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г. высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1961 г.

МАРОЗАЎ Яфім Васілевіч, нарадзіўся ў 1900 г. і пражываў у в. Наркі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 23 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

МАШКОЎ Пётр Архіпавіч, нарадзіўся ў 1877 г. і пражываў у в. Лабанаўка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

МЕЛЬНІКАЎ Іоў Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1883 г. у в. Беліца, пражываў у в. Касцюшкавічы Крычаўскага раёна, калгаснік. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

МІНІН Нічыпар Малахавіч, нарадзіўся ў 1896 г. у в. Выдранка Краснапольскага раёна, пражываў у Чэрыкаве, працаваў у леспрамгасе. Рэпрэсіраваны 23 чэрвеня 1941 г., засуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г.

НАДЗЬКІН Глеб Верамеевіч, нарадзіўся ў 1884 г. у в. Язёры, калгаснік. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ПАЗНЯКОЎ Іларыён Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1886 г. і пражываў у в. Лабанаўка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

ПАРФЁНАЎ Андрэй Харытонавіч, нарадзіўся ў 1882 г. у в. Рэкта Быхаўскага раёна, пражываў на хутары Драгунскі Чэрыкаўскага раёна, калгаснік калгаса «Чырвоны камунар». Рэпрэсіраваны ў верасні 1932 г., засуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ПАРФЕНЕНКА Герман Піліпавіч, нарадзіўся ў 1884 г. і пражываў у в. Гронаў, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Рэпрэсіраваны 1 студзеня 1933 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ПАШЭНКА Васіль Фядотавіч, нарадзіўся ў 1883 г. і пражываў у в. Касар, рабочы саўгаса «Ударнік». Рэпрэсіраваны 6 сакавіка 1937 г., 9 верасня 1937 г. расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ПАШКЕВІЧ Сямён Фаміч, нарадзіўся ў 1877 г. і пражываў на хутары Астравы, калгаснік калгаса «Чырвоная зорка». Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989 г.

САМУЙЛЕНКА Іван Паўлавіч, нарадзіўся ў 1904 г. у в. Наркі, пражываў у в. Шчацінка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961 г.

САМУЙЛЕНКА Сямён Паўлавіч, нарадзіўся ў 1901 г. і пражываў у в. Наркі, калгаснік. Рэпрэсіраваны 24 снежня 1932 г., засуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

САРАНЕНКА Пракоп Лявонавіч, нарадзіўся ў 1879 г. у в. Лабанаўка, пражываў у пас. Грозны Лабанаўскага сельсавета, калгаснік калгаса «Камунар». Рэпрэсіраваны 6 жніўня 1937 г., 19 верасня 1937 г. расстраляны ў Магілёве. Рэабілітаваны ў 1989 г.

САРОЧАНКА Сафон Васілевіч, нарадзіўся ў 1890 г. і пражываў у в. Лабанаўка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25 снежня 1932 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1961 г.

СЕРЫКАЎ Кузьма Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1873 г. і пражываў у в. Наркі. Рэпрэсіраваны 12 снежня 1932 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1961 г.

СІВАКОВА Алена Сцяпанаўна, нарадзілася ў 1917 г. і пражывала ў Чэрыкаве. Рэпрэсіравана ў 1930 г., раскулачана. Рэабілітавана ў 1992 г.

СІЛЯЕЎ Фёдар Іовіч, нарадзіўся ў 1885 г. і пражываў у Чэрыкаве. Рэпрэсіраваны 15 жніўня 1938 г., 13 лістапада 1938 г. расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958 г.

СЦЕЛЬКІН Уладзімір Сідаравіч, нарадзіўся ў 1876 г. і пражываў у в. Лабанаўка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 26 снежня 1932 г., высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1961 г.

СЯМЁНАЎ Дзмітрый Андрэевіч, нарадзіўся ў 1902 г. і пражываў у в. Язёры, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 30 снежня 1932 г., засуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1989 г.

УРУПІН Марк Апанасавіч, нарадзіўся ў 1881 г. у Чэрыкаве, працаваў вартаўніком Чэрыкаўскага гарадскога парку. 5 жніўня 1939 г. засуджаны на 6 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988 г.

Воіны-землякі, якія загінулі ў савецка-фінляндскую вайну 1939—1940 гг.

ВЕПРЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРОВАЯ

ДАНАДАЕЎ Ілья Захаравіч, нарадзіўся ў 1906, радавы, прапаў без вестак у студзені 1940.

КАЖАМЯКА Ларыён Яфімавіч, нарадзіўся ў 1908, радавы, прапаў без вестак у студзені 1940.

КАРКОЗАЎ Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1912, радавы, прапаў без вестак у 1940.

ВЁСКА ВЕПРЫН

МАКАРАНКА Апанас Германавіч, нарадзіўся ў 1914, радавы, загінуў у 1940.

ВЁСКА ГРОНАЎ

ЛЕБЕДЗЕЎ Мікіта Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1914, радавы, загінуў у 1940.

ПАСЁЛАК МАЙСКІ

ЯНЧЫН Антон Пракопавіч, нарадзіўся ў 1885, радавы, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЁСКА НОВА-МАЛІНАЎКА

КУДРАЎЦАЎ Макар Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1911, радавы, загінуў 23.2.1940.

ВЁСКА ХАЛМЫ*

ДРАЧОЎ Іван Еўдакімавіч, нарадзіўся ў 1911, радавы, прапаў без вестак 26.1.1940.

ВЁСКА ЧУДЗЯНЫ

УСЦЯНЕНКА Яфрэм Данілавіч, нарадзіўся ў 1888, радавы, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЕРАМЕЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ДЗЕНІСЕНКА Антон Яўсеевіч, радавы.

ІЛЬІН Рыгор Сідаравіч, радавы, загінуў у 1940.

---

* Злілася з в. Малінаўка.

РЭЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВОХАР

БАРАНОЎСКІ Уладзімір Васілевіч, радавы, загінуў 21.1. 1940.

ГАРДЗЕЕЎ Васіль Якімавіч, загінуў у сакавіку 1940.

ГРЫБУНОЎ Яфім Навумавіч, радавы, загінуў 11.3.1940.

ЖМАКІН Фёдар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1910, радавы, загінуў у 1939 у Заходняй Беларусі.

ЗАЙЦАЎ Іван Мацвеевіч, радавы, загінуў у 1940.

МАРТЫНЕНКА Аляксей Сусоевіч, нарадзіўся ў 1915, радавы, загінуў у 1939 у Заходняй Беларусі.

СІЎЦОЎ Яўсей Пракопавіч, радавы, загінуў 21.4.1940.

СТАРАВОЙТАЎ Яфім Парфенавіч, радавы, загінуў 27.1.1940.

ЧАБРОЎ Фядот Купрэевіч, нарадзіўся ў 1901, загінуў у 1940.

ШАСЦЯРНЯ Макар Максімавіч, нарадзіўся ў 1910, радавы, загінуў у сакавіку 1940.

ЯГОДКІН Іван Еўдакімавіч, радавы, загінуў у 1940.

ЯГОДКА Навум Ягоравіч, загінуў 27.3.1940.

ЯШЧАНКА Архіп Майсеевіч, загінуў у сакавіку 1940.

І. П. Саракула.

І. М. Буцянаў.

Дз. Я. Рабчаеў.

І. Ф. Очтаў.

СОРМАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЫМАЧ

САРАКУЛА Іван Піліпавіч, загінуў у 1940.

ВЁСКА ГЛІНЬ

ПАНАСЕНКА Карп Аляксеевіч, загінуў 3.3.1940.

РУЛЯКОЎ Павел Сяргеевіч, загінуў 11.3.1940.

ВЁСКА ГОРКІ

УЛАСЕНКА Герасім Дзмітрыевіч, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЁСКА ЖУРАВЕЛЬ

АСТАПЕНКА Ціхан Аляксеевіч, прапаў без вестак у 1940.

ВЁСКА ЗОРЫ

БУЦЯНАЎ Іван Маркавіч, загінуў у 1940.

РАБЧАЕЎ Дзям'ян Якаўлевіч, загінуў 22.6.1940.

ВЁСКА ТУР'Е

ФРАЛОЎ Іосіф Лук'янавіч, загінуў у 1940.

ВЁСКА ЯМКІ

ОЧТАЎ Іван Фролавіч, нарадзіўся ў 1910 у в. Зоры, радавы, загінуў 8.2.1940.

УШАКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАГРУДЗЕНКА Фама Іванавіч.

ДУХОЎСКІ Іван Ягоравіч, нарадзіўся ў в. Пільня, загінуў у 1940.

ЗІМАНКОЎ Нічыпар Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1902, радавы.

КАНДРУСЁЎ Філімон Фядонавіч, нарадзіўся ў 1907.

ЛЕШАКОЎ Сямён Лукіч, загінуў 31.1.1940.

ПШАНІЧНЫ Гаўрыла Юр'евіч, нарадзіўся ў 1909 г.

ПШАНІЧНЫ Нікан Юр'евіч, нарадзіўся ў 1900, лейтэнант, прапаў без вестак.

ПЫЦІКАЎ Павел Іванавіч, нарадзіўся ў 1909, радавы



СІЎЦОЎ Міхей Васілевіч, радавы, загінуў у сакавіку 1940.

СІЎЦОЎ Павел Фёдаравіч, радавы, загінуў у 1940.

ЯЗЁРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА Міхлін

АГЕЕЎ Цімафей Фёдаравіч, радавы, загінуў 3.3.1940.

1941

1945

ШЛА ВАЙНА СВЯШЧЭННАЯ

Беларусь адна з першых падверглася нападу фашысцкіх орд. Нягледзячы на колькасную перавагу нямецкіх войск, нашы воіны вялі цяжкія баі, аказвалі жорсткае супраціўленне наступаючым дывізіям ворага.

Ход ваенных дзеянняў у пачатку вайны быў складаным для Чырвонай Арміі. Войскі Заходняй асобай ваеннай акругі ўступілі ў бой раз'яднанымі, неслі вялікія страты, у выніку чаго вымушаны былі адступаць у глыб краіны. Праціўнік захапіў Мінск і накіраваў асноўныя сілы на Магілёў. Тут, на паўднёвым крыле Заходняга фронта, на Магілёўскім напрамку дзейнічала 13-я армія. У выніку 23-дзённых баёў было збіта, падбіта і знішчана: самалётаў — 24, танкаў — каля 200, матацыклаў — каля 400, аўтамашын — каля 500. Было таксама знішчана 15 тысяч і ўзята ў палон 2 тысячы нямецкіх салдат і афіцэраў.

Праціўнік страціў надзею захапіць г. Магілёў з ходу, панёс вялікія страты, фарсіраваў р. Днепр на поўнач і на поўдзень ад Магілёва, імкнуўся акружыць групоўку войск 4-й і 13-й армій. Нашы войскі, не вытрымаўшы націску фашысцкіх танкавых кліноў, сталі адыходзіць. Камандуючы 2-й танкавай групы Гудэрыян пасля фарсіравання Дняпра адразу ж павёў наступленне на важныя вузлы дарог — Прапойск (цяпер Слаўгарад), Крычаў і Чавусы. Каб стрымліваць наступленне варожых сіл у гэтых напрамках, для падмацавання часцям 13-й арміі прыбыла 132-я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра Сяргея Сямёнавіча Бірузова. Дывізія высадзілася з вагонаў на станцыі Чавусы, сканцэнтравалася і заняла абарону 12 ліпеня 1941 г. на паўднёвым захадзе ад Чавус.

Лявей 132-й стралковай дывізіі дзейнічала 137-я стралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка Івана Ціханавіча Грышына. Так, на дваццаты дзень вайны баі дакаціліся да Чэрыкаўскага раёна. 12 ліпеня 1941 г. 55-я стралковая дывізія 4-й арміі заняла дваццацікіламетровы фронт абароны па ўсходняму берагу р. Сож — ад Прапойска да Старой Каменкі.

На поўнач ад 55-й стралковай дывізіі абаранялася на р. Проні 42-я стралковая дывізія, якой часова камандаваў палкоўнік М. Е. Козыр. Яе падраздзяленні знаходзіліся толькі ў найбольш важных у тактычным плане пунктах. На поўнач ад 42-й стралковай дывізіі змагаўся 45-ы стралковы корпус на чале з генералам Э. Я. Магонам. Такім чынам, ад Чавус да Прапойска праходзіла суцэльная лінія абароны з часцей 13-й і 4-й армій.

Перадавыя часці Гудэрыяна лічылі, што яны ўжо вырваліся на аператыўны прастор, і таму спакойна рухаліся па дарогах у напрамку Чавус



Карта баявых дзеянняў 13-й арміі на рубяжах рэк Днепр, Сож.

у паходных калонах. Супраць іх 132-я стралковая дывізія выставіла ўсё, што мела. 425-ы артполк адкрыў агонь двума дывізіёнамі. Фашысты не чакалі ўдару нашых часцей, у калонах узнікла замяшанне, не вельмі дакладна немцы сталі разгортвацца ў баявыя парадкі. Наступальны парыў чырвонаармейцаў і камандзіраў быў нястрымным, яны гналі гітлераўцаў некалькі кіламетраў і вызвалілі шэраг вёсак. Было знішчана некалькі фашысцкіх танкаў і бронемашын, многа салдат і афіцэраў.

Атрымаўшы нечаканы адпор, Гудэрыян адмовіўся ад паўторнага лабавога ўдару. Яго танкавыя часці сталі абцякаць дывізію з флангаў, гукі бою даносіліся ўжо з боку Крычава. Над дывізіяй закружылі варожыя самалёты, якія безупынна бамбілі і абстрэльвалі баявыя парадкі.

Дывізія працягвала бой з праціў-

нікам, хаця ведала, што злева фронт ужо прарваны. Спыніць ворага было немагчыма. На правым флангу літаральна стагнала зямля, байцы адыходзілі, аказваючы пры гэтым упартае супраціўленне. З усіх батарэй засталася толькі адна гармата, ды і тая хутка змоўкла. Каля разбітых гармат ляжалі загінуўшыя і цяжка параненыя артылерысты. Побач з камандзірам дывізіі грымнуў выбух, яго адкінула ўбок, кантузіла, параніла ў падбародак, але ён застаўся ў страі. У сваіх мемуарах Сяргей Сямёнавіч Бірузоў піша:

«Так, гэта быў ужо сапраўдны бой, цяжкі і кровапралітны. З паветра нас безупынна бамбілі фашысцкія самалёты. На зямлі цяснілі танкі, і пад іх гусеніцамі перш за ўсё гінулі тыя, хто спрабаваў выратаваць сваё жыццё ганебнымі ўцёкамі. Многія толькі тут упершыню ўбачылі, як падаюць мёртвымі іх таварышы, скошаныя кулямі або асколкамі, як сыходзяць крывёю тыя, з кім яны зусім яшчэ нядаўна елі з аднаго кацялка, спалі побач, дзяліліся радасцямі і горам. Нямала мы ў той дзень перажылі, і кожны канчаткова зразумеў, што вайна — гэта жорсткая і бязлітасная барацьба, якая патрабуе намагання ўсіх маральных і фізічных сіл, найвялікшай стойкасці, вытрымкі і рашучасці ахвяраваць сабой у імя Радзімы».

Куды больш цяжка давялося, аднак, леваму суседу 132-й стралковай дывізіі, на стыку з якім вораг наносіў свой галоўны ўдар. Тут бой дасягнуў найвышэйшага напружання. Увесь гэты раён, здавалася, заліты быў крывёй і ахоплены полымем. Гарэлі падпаленыя гітлераўцамі вёскі, падбітыя танкі, аўтамашыны. Смурод і дым віселі над зямлёй. У гэта месца прыбыў камандзір 20-га стралковага корпуса генерал С. І. Яромін. У складзе 20-га стралковага корпуса знаходзіліся 132-я і 137-я стралковыя дывізіі. Камандзіры гэтых дывізій С. С. Бірузоў і І. Ц. Грышын былі выкліканы на камандны пункт генерала С. І. Яроміна. Камандуючы 13-й арміяй перадаў Яроміну загад — прабівацца з акружэння на ўсход. «Іншага выбару,— успамінае Бірузоў,— у нас не было, мы рыхтаваліся адыходзіць да р. Сож на поўнач ад Прапойска. Прарыў акружэння намячалася пачаць у ноч на 14 ліпеня 1941 года».

С. С. Бірузоў.

І. Ц. Грышын.

Г. А. Тэр-Гаспаран.

Сам С. І. Яромін вырашыў адыходзіць са 160-й дывізіяй. Пазней стаў вядомы трагічны лёс гэтай дывізіі. У дваццатых числах ліпеня 1941 г. дывізія і ўпраўленне 20-га корпуса панеслі вялікія страты.

55-я стралковая дывізія, заняўшая абарону каля Прапойска, поўным ходам вяла абарончыя работы. Праціўніка перад дывізіяй яшчэ не было. Падпалкоўнік Тэр-Гаспаран, які прыбыў са штаба арміі, далажыў аб змяненні абстаноўкі на фронце. 10—11 ліпеня нямецкія войскі фар-

сіравалі Днепр. Да вечара 14 ліпеня яны прасунуліся на сто кіламетраў і захапілі Мсціслаў, пагражаючы з поўначы Крычаву. Для 55-й стралковай дывізіі склалася цяжкае становішча. 2-гі дывізіён 84-га артпалка быў тэрмінова накіраваны ў раён на поўнач ад Крычава для сумесных дзеянняў з часцямі 6-й стралковай дывізіі, каб не прапусціць немцаў да горада.

55-я стралковая дывізія атрымала новае заданне. Зрабіўшы ў ноч на 15 ліпеня трыццацікіламетровы марш, яна сканцэнтравалася ў лясах на поўдзень ад Чэрыкава. На світанні дывізіі быў дадзены загад: неадкладна вярнуць 107-ы стралковы полк з 1-м дывізіёнам 84-га артпалка да Прапойска. Аказалася, што нямецкія танкі ўварваліся ў Прапойск. Разведчыкі далажылі, што немцы прарвалі абарону на р. Лабчанцы, прытоку Сожа, у дванаццаці кіламетрах на захад ад Чэрыкава. Там абараняўся 333-і полк 6-й стралковай дывізіі. Людзей у ім засталося мала, артылерыі зусім не было. Полк не змог адбіць танкавага ўдару і адышоў да пераправы цераз Сож у раёне вёсак Мірагошч і Журавель.

Падпалкоўнік Тэр-Гаспаран, не чакаючы распараджэння са штаба корпуса, прыняў рашэнне перакінуць часці 55-й стралковай дывізіі цераз раку з тым, каб утрымаць Чэрыкаў. Але ажыццявіць гэтага не ўдалося — нямецкія танкі падыходзілі ўжо да горада.

Батальёны 111-га стралковага палка, якія паспелі пераправіцца на паўднёва-заходнюю ўскраіну Чэрыкава, адразу ўступілі ў бой. Але праз гадзіну пасля пачатку бою нямецкія танкі ўварваліся ў Чэрыкаў. Тэр-Гаспаран загадаў батальёнам адысці зноў на ўсходні бераг ракі. Ноччу, з 15 на 16 ліпеня 1941 г. вораг заняў Чэрыкаў.

Нягледзячы на адступленне, нашы вайсковыя часці геаічна змагаліся, наносячы адчувальныя ўдары па гітлераўцах. Каб прасунуцца ад Дняпра да Сожа, фашыстам спатрэбілася шмат часу. На Сожы яны пратапталіся яшчэ паўмесяца. З першых дзён вайны названыя вышэй рэкі сталі сур'ёзнымі рубяжамі, дзе перамоўвалася жывая сіла і тэхніка праціўніка. Абарона на р. Сож мела асаблівае значэнне ў ходзе Смаленскай бітвы. У выніку яе быў сарваны план гітлераўцаў імгненна захапіць Маскву.

У жорсткіх баях страчвалі сілы савецкія воіны. У час пераправы цераз р. Сож загінуў камандзір 13-га механізаванага корпуса генерал-маёр Пётр Мікалаевіч Ахлюсцін, загінуў на Чэрыкаўшчыне і камандзір 20-га стралковага корпуса С. І. Яромін. Аддалі свае жыцці ў баях за раён і многія іншыя байцы і камандзіры Чырвонай Арміі.

Асобныя групы воінаў працягвалі змагацца з ворагам на акупіраванай тэрыторыі, прарываючыся на ўсход. Многія з іх уліваліся ў партызанскія атрады. У жніўні 1941 г. на базе падпольных груп раёна і воінаў, якія не выйшлі з варожага акружэння, быў арганізаваны Асобны Чэрыкаўскі атрад. З восені 1941 г. па красавік 1942 г. на тэрыторыі Чэрыкаўскага і Крычаўскага раёнаў дзейнічаў асобны партызанскі атрад «Анатоля». Сваімі ўдарамі ён наносіў ворагу вялікія страты.

На Чэрыкаўшчыне наступіў новы этап у барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў: разгортвалася партызанская вайна, пачалі дзейнічаць падпольшчыкі.

Склад Чэрыкаўскага падпольнага райкама КП(б)Б: сакратар Храмовіч Георгій Антонавіч (з ліпеня 1941 па кастрычнік 1943). Члены райкама: Шчаўлікаў Васіль Піліпавіч (з ліпеня 1941, загінуў у 1942), Гаспадарык Аляксандр Максімавіч (з ліпеня 1941, загінуў у 1942).

У жніўні 1941 г. у склад падпольнага райкама былі кааптаваны: Кроль Леў

Майсеевіч (загінуў у 1941), Васькавец Сцяпан Фёдаравіч (загінуў у 1941).

Сакратары падпольных партыйных арганізацый раёна: гарадской — А. М. Гарбаты, Вепрынскай — Л. М. Кроль, Зябенскай — Л. А. Кукуй, Мірагашчанскай — М. Л. Іваноўскі, Язёрскай — Г. Н. Харытонаў, Горкаўскай — В. А. Базылёў, Рэчыцкай — Арцём Кавалёў, Глінскай — М. І. Сапянкоў, Верамейскай — Е. С. Кавалёў, Халмянскай — В. С. Раканаў.

У першыя дні акупацыі народным мсціўцам было асабліва цяжка — вакол панавала разгубленасць, няўпэўненасць, паміж імі амаль не было ніякай сувязі, не кажучы ўжо пра вопыт.

Фашысты ўстанавілі ў раёне жорсткі рэжым. Яшчэ нядаўна шумлівы і вясёлы Чэрыкаў быў ператвораны ў горад смерці і пакут. Не лепш было і ў раёне. 18 лістапада 1941 г. газета «Правда» ў вячэрняй зводцы Саўінфармбюро пісала аб звярыных учынках фашыстаў у в. Наркі Чэрыкаўскага раёна. У зводцы паведамлялася, што ў названай вёсцы гітлераўцы згвалцілі і закатавалі да смерці сялянак Жыгалаву, Серыкаву, Урупіну. У в. Халмы фашысцкія вылюдкі замучылі шэсць пятнаццацігадовых дзяўчат.

У першыя дні акупацыі раёна былі расстраляны старшыня Верамейскага сельсавета, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР Агаф'я Іванаўна Фядосенка, актывіст калгаснага будаўніцтва, удзельнік падполля Іван Аляксеевіч Гузнякоў.

Асабліва фашысты здзекаваліся над людзьмі яўрэйскай нацыянальнасці — 238 чалавек, у тым ліку дзеці і старыя, былі расстраляны гітлераўцамі.

Вялікая бяда напаткала і жыхароў в. Рагаліна. Аднойчы ў вёску прыйшлі фашысцкія каты. Яны падазравалі жыхароў у сувязі з партызанамі. Гітлераўцы сагналі каля 100


Немецко-фашистские мерзавцы продолжают насилия и издевательства над мирным населением городов и деревень Белоруссии. Отряд немецких солдат, прибывший в селение Костюковка, отнял у крестьян все имущество. Крестьянка Дригулина Ксения попросила немецкого офицера оставить белье ее четырех детей. Озверевший фашист избил женщину, а затем застрелил ее. Всех четверых детей Дригулиной немецкие солдаты бросили в погреб и закидали землей. В деревне Норки фашисты изнасиловали и замучили насмерть крестьянок Жигалову, Серикову и Урупину. В деревне Халмы фашистские изверги зверски замучили шесть пятнадцатилетних девушек. В городе Ельске фашисты посадили на баржу и вывезли на середину реки Припять пятьсот местных жителей. Пять дней заключенные не давали пищи. Затем немецкие солдаты затопили баржу вместе с находившимися в ней людьми.

З аператыўнай зводкі Саўінфармбюро «Праўда», 18 лістапада 1941 г.

чалавек у будынак і спалілі іх. У агні загінулі людзі і вёска.

Што ўяўляў сабой Чэрыкаў для гітлераўцаў? На працягу двух год вайны горад быў цэнтрам акругі, у які ўваходзіла дзесяць раёнаў. Чэрыкаў гітлераўцы выбралі не выпадкова. Горад размешчаны далёка ад чыгункі. Фашысты думалі, што іх не будуць трывожыць магілёўскія партызаны. З другога боку, лёгка можна было арганізаваць абарону горада ад народных мсціўцаў, бо круты бераг р. Сож аддзяляў акупантаў ад лясоў на поўдні, «гарантавала» бяспеку і адкрытая мясцовасць з усходу і поўначы. Але гітлераўцы памыляліся. Партызаны пастаянна наносілі ўдары па ворагу, знішчалі жывую сілу і тэхніку працiўніка.

НА ТЭРЫТОРЫІ ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЁНА Ў 1941—1943 ГГ. ДЗЕЙНІЧАЛІ НАСТУПНЫЯ ПАРТЫЗАНСКІЯ АТРАДЫ:

720-ы асобны атрад. Сфарміраваны ў кастрычніку 1942 г. у Быхаўскім раёне на базе групы Ф. С. Тарасевіча — Г. А. Храмовіча, якая вылучылася з 620-га атрада, і групы Я. А. Курпачэнкі. З лістапада 1942 г. па красавік 1943 г. уваходзіў у склад 4-й Клічаўскай брыгады. 14 красавіка 1943 г. па рашэнню Магілёўскага падпольнага абкама КП(б)Б перабазіраваны ў Чэрыкаўскі раён, дзе дзейнічаў самастойна.

З часцямі Чырвонай Арміі злучыўся 1 кастрычніка 1943 г., налічваў 297 партызан. З іх мужчын 278, жанчын 19, беларусаў 216, рускіх 72, украінцаў 5, іншых нацыянальнасцей 4, членаў ВКП(б) 15, кандыдатаў у члены ВКП(б) 18, членаў ВЛКСМ 58, беспартыйных 206.

Камандзіры атрада: Тарасевіч Фёдар Сцяпанавіч (кастрычнік 1942 — студзень 1943), Храмовіч Георгій Антонавіч (студзень — жнівень 1943), Жмуроўскі Пётр Усцінавіч (жнівень — кастрычнік 1943). Камісары: Храмовіч Георгій Антонавіч (кастрычнік 1942 — студзень 1943), Фёдараў Мікалай Пятровіч (сакавік — кастрычнік 1943). Начальнікі штаба: Фёдараў Мікалай Пятровіч (кастрычнік 1942 — сакавік 1943), Віктарэнка Аляксандр Міхайлавіч (сакавік—жнівень 1943), Тапілін Васіль Пятровіч (жнівень — кастрычнік 1943).

721-ы асобны атрад. Арганізаваны ў маі 1943 г. рашэннем упаўнаважанага Магілёўскага падпольнага абкама КП(б)Б па Паўднёва-Усходняй зоне на базе партызанскай групы А. М. Гарбатага — А. В. Львова, якая дзейнічала ў Чэрыкаўскім раёне з жніўня 1941 г.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, 1 кастрычніка 1943 г., атрад налічваў 248 партызан. З іх мужчын 139, жанчын 7, беларусаў 121, рускіх 9, украінцаў 4, іншых нацыянальнасцей 12, членаў ВКП(б) 7, кандыдатаў у члены ВКП(б) 1, членаў ВЛКСМ 33, беспартыйных 105. Дэмаграфічныя даныя на 102 чалавекі не ўстаноўлены.

Камандзір атрада Гарбаты Аляксандр Мікалаевіч (май — кастрычнік 1943). Камісар Львоў Аляксандр Васілевіч (май — кастрычнік 1943). Начальнік штаба Сільчанка Віктар Сямёнавіч (май — кастрычнік 1943).

15-ы асобны атрад. Заснаваны ў жніўні 1943 г. загадам камандзіра палка «Трынаццаць» на базе партызанскай групы І. Н. Ваўчкова, арганізаванай у маі 1943 г.

Атрад дзейнічаў у Чэрыкаўскім і Прапойскім раёнах. З часцямі Чырвонай Арміі злучыўся 2 кастрычніка 1943 г., налічваў 432 партызаны. З іх мужчын 413, жанчын 19, беларусаў 316, рускіх 103, украінцаў 9, іншых нацыянальнасцей 4, членаў ВКП(б) 20, кандыдатаў у члены ВКП(б) 10, членаў ВЛКСМ 107, беспартыйных 295.

Камандзір атрада Ваўчкоў Іван Нічыпаравіч (жнівень — кастрычнік 1943). Камісар Касмачоў Яфім Арцёмавіч (жнівень — кастрычнік 1943). Начальнік штаба Афанасьеў Аляксандр Аляксеевіч (жнівень — кастрычнік 1943).

41-ы асобны атрад. Арганізаваны ў чэрвені 1942 г. у адпаведнасці з загадам упаўнаважанага ЦК КП(б)Б па Гомельскай вобласці на базе групы С. М. Карзюкова, якая дзейнічала з лета 1941 г. Да 25 мая 1943 г. называлася атрадам «Вечаркова» (псеўданім С. М. Карзюкова), затым 41-ы.

Атрад дзейнічаў у Краснапольскім, Чэрыкаўскім, Прапойскім раёнах. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, 1 кастрычніка 1943 г., налічваў 440 партызан. З іх мужчын 337, жанчын 36, беларусаў 305, рускіх 47, украінцаў 8, іншых нацыянальнасцей 13, членаў ВКП(б) 19, кандыдатаў у члены ВКП(б) 20, членаў ВЛКСМ 83, беспартыйных 251. Дэмаграфічныя даныя на 67 чалавек не ўстаноўлены.

Камандзіры атрада: Карзюкоў Сямён Мікалаевіч (чэрвень 1942 — кастрычнік 1943), Каўпаносаў Васіль Нічыпаравіч (жнівень — кастрычнік 1943, в. а.). Камісары: Ушаў Авяр'ян Іванавіч (верасень 1942 — сакавік 1943), Кузняцоў Мікіта Цітавіч (сакавік — жнівень 1943), Марчанка Пётр Мікітавіч (жнівень — кастрычнік 1943). Начальнікі штаба: Бурцаў Барыс Антонавіч (чэрвень — верасень 1943), Тычынскі Гераль Аляксандравіч (верасень — кастрычнік 1943).

42-гі асобны атрад. Заснаваны ў чэрвені 1942 г. на базе груп М. М. Мікіціна і В. Я. Гапеева, якія дзейнічалі ў Прапойскім і Чэрыкаўскім раёнах. Называўся атрад «Трынаццаць», а з 25 мая 1943 г.— 42-гі.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, 1 кастрычніка 1943 г., атрад налічваў 248 партызан. З іх мужчын 239, жанчын 9, беларусаў 206, рускіх 38, украінцаў 2, іншых нац. 2, членаў ВКП(б) 11, кандыдатаў у члены ВКП(б) 10, членаў ВЛКСМ 24, беспартыйных 203.

Камандзіры атрада: Мікіцін Мікалай Макаравіч (чэрвень 1942 — жнівень 1943), Каралёў Генадзь Андрэевіч (жнівень — кастрычнік 1943). Камісар Гапееў Васіль Яўхімавіч (чэрвень 1942—кастрычнік 1943). Начальнік штаба Гаўрылаў Ілья Максімавіч (чэрвень — кастрычнік 1943).

Асобны атрад «Анатоля». Заснаваны ў жніўні 1941 г. у Чэрыкаўскім раёне з групы ваеннаслужачых, якія не выйшлі з варожага тылу. На час арганізацыі налічваў 32 партызаны (камандзір—Грышын Анатоль — псеўданім, сапраўднае прозвішча не ўстаноўлена; загінуў).

Дзейнічаў у Чэрыкаўскім і Крычаўскім раёнах. Зімой частка асабовага саставу пайшла на ўсход, каб папасці ў савецкі тыл. Партызаны, якія засталіся ў тыле ворага, загінулі ў баях з карнікамі 21—22 студзеня 1942 г. каля вёсак Волчас Крычаўскага, Камаровічы Чэрыкаўскага раёнаў.

Асобны Чэрыкаўскі атрад. Заснаваны ў жніўні 1941 г. на базе падпольных груп Чэрыкаўскага райкама КП(б)Б, з жыхароў в. Вепрын і ваеннаслужачых, якія не выйшлі з варожага тылу. У кастрычніку група ваеннаслужачых пайшла ў савецкі тыл, а партызаны, якія засталіся, на чале з Г. А. Храмовічам перабазіраваліся вясной 1942 г. у Бабруйскі, затым у Клічаўскі раёны, дзе ўліліся ў Кіраўскі атрад.

Камандзір атрада — Храмовіч Георгій Антонавіч.

Асобны атрад «Алеся». Заснаваны 6 чэрвеня 1942 г. на базе групы А. Л. Кастроўскага — І. М. Пяроўскага, створанай у Клімавіцкім раёне ў маі 1942 г., і іншых (пазней групы праводзілі аперацыі самастойна).

Атрад дзейнічаў у Клімавіцкім, Чэрыкаўскім і Крычаўскім раёнах да 29 верасня 1942 г., затым выйшаў у савецкі тыл. На дзень выхаду налічваў 33 партызаны. З іх мужчын 21, жанчын 12, беларусаў 23, рускіх 9, украінцаў 1, членаў ВКП(б) 1, кандыдатаў у члены ВКП(б) 2, членаў ВЛКСМ 15, беспартыйных 15.

Камандзір партызанскага атрада № 720 П. У. Жмуроўскі (злева) і камісар атрада М. П. Фёдараў.

В. С. Сільчанка.

Я. А. Касмачоў.

Камандзір атрада Кастроўскі Аляксей Лявонавіч («Алесь», май — верасень 1942, загінуў). Камісар Пяроўскі Іосіф Мікалаевіч (май — верасень 1942).

Асобны атрад «Валянціна Маёрава». Створаны 4 ліпеня 1942 г. на базе партызанскай групы, якая дзейнічала з мая 1942 г. у Крычаўскім, Чэрыкаўскім, Касцюковіцкім і Краснапольскім раёнах. Атрад называўся па псеўданіму камандзіра П. І. Шмоніна («Валянцін Маёраў»).

29 верасня 1942 г. атрад выйшаў у савецкі тыл. На дзень выхаду атрад налічваў 30 партызан. У атрадзе былі толькі мужчыны. З іх беларусаў 7, рускіх 17, украінцаў 2, іншых нацыянальнасцей 4, членаў ВКП(б) 2, кандыдатаў у члены ВКП(б) 5, членаў ВЛКСМ 10, беспартыйных 13.

Камандзір атрада Шмонін Павел Іва-

навіч (ліпень — верасень 1942). Камісар Траянаў Якаў Данілавіч (ліпень — верасень 1942).

Узросшая актыўнасць партызан ні днём, ні ноччу не давала спакою захопнікам. У адказ гітлераўцы праводзілі карныя аперацыі супраць народных мсціўцаў. Яны імкнуліся адрэзаць партызан ад населеных пунктаў, блакіраваць іх у лясах. У выніку карных аперацый перастаў існаваць атрад «Анатоля». Яго камандзір загінуў у баі.

23 кастрычніка 1941 г. гітлераўцамі быў блакіраваны Асобны Чэрыкаўскі партызанскі атрад на яго галоўнай базе ва ўрочышчы Манастырок. Атрад панёс вялікія страты. Быў паранены камандзір Г. А. Храмовіч. У гэтым баі загінула Слюнькіна, інструктар РК ЛКСМБ, у атрадзе яна ўзначальвала камсамольскую работу.

Пазней, не без дапамогі здраднікаў, пачаліся аблавы, вобыскі, арышты. Трапляе ў рукі гестапа член падпольнага райкама партыі Аляксандр Васілевіч Гаспадарык, дзе пасля жорсткіх допытаў загінуў.

У снежні 1941 г. у баях супраць карнікаў загінулі сакратар падпольнай Вепрынскай партыйнай арганізацыі Леў Максімавіч Кароль, намеснік камандзіра партызанскага атрада па палітчасці Сцяпан Фёдаравіч Васькавец, камандзір узвода Арсен Нічыпаравіч Букзееў, член Вепрынскай падпольнай арганізацыі, сувязная падпольнага райкама партыі Паліна Патапаўна Кукчанка, член Верамейскай падпольнай арганізацыі Рыгор Яўламп'евіч Марчанка, сувязны-разведчык райкама партыі Павел Савельевіч Нікеенка, разведчыцы партызанскага атрада Ніна Пятроўна Нікеенка, Соф'я Маргелаўна Кукчанка, падпольшчык Павел Раманавіч Малашанка.

У гады акупацыі ад рук фашыстаў загінулі: член падпольнага райкама партыі Васіль Піліпавіч Шчаўлікаў, Кірыл Цітавіч Кутаў, Ніна Іванаўна Бяляцкая, Валянціна Якаўлеўна Цітовіч, Емяльян Сяргеевіч Кавалёў, Арцём Кавалёў, Іван Васілевіч Галаўнёў, Захар Іосіфавіч Якушэнка, Цімафей Іванавіч Максіменка, Васіль Мітрафанавіч Цілюпа, Павел Сідаравіч Міхненка і многія іншыя.

За сувязь з партызанамі па загаду каменданта Чэрыкава былі расстраляны Марыя Сотнікава, Рыгор Сарочанка, акружэнцы Аляксей Мішын, Аляксей Капленка, Віктар Салаўёў.

У 1941 г. у барацьбе з гітлераўцамі загінула нямала мужных патрыётаў. Астатнія пайшлі ў глыбокае падполле. Народным мсціўцам заставацца ў раёне стала небяспечна. Райкам партыі прымае рашэнне аб перабазіраванні партызан у бранскія лясы.

Масавымі рэпрэсіямі фашысцкія акупанты імкнуліся зламаць волю савецкіх людзей. Але народ не скарыўся, са зброяй у руках адстойваў незалежнасць Айчыны. Пад уплывам перамог Чырвонай Арміі на тэрыторыі раёна актывізуецца партызанскі рух. Народныя мсціўцы перашкаджалі гітлераўцам «гаспадарыць» на Чэрыкаўшчыне. Вясной 1943 г. у раён вяртаецца 720-ы партызанскі атрад. Фарміруецца Чэрыкаўскі падпольны райкам партыі РКП(б)Б у новым саставе: сакратар — Г. А. Храмовіч, члены райкама — Н. П. Галенка, Н. А. Фёдараў, М. Л. Іваноўскі, І. І. Касцючэнка. Ствараецца ваенна-аператыўная група, камандзірам яе прызначаецца Г. А. Храмовіч, начальнікам штаба — М. С. Буднікаў, яго намеснікам — М. Н. Купрыяшын. Камандзірам 720-га партызанскага атрада зацвярджаецца П. У. Жмуроўскі. Да гэтага часу фарміруецца і новы састаў падпольнага райкама ЛКСМБ на чале з Іванам Іванавічам Касцю-

чэнкам. Ствараецца таксама новы 721-ы партызанскі атрад, якім камандуе Л. В. Гарбаты. Камісарам партызанскага атрада быў А. В. Львоў, начальнікам штаба — В. С. Сільчанка. У гэты час на тэрыторыі раёна дзейнічалі і другія партызанскія атрады.

Партызаны знішчалі не толькі жывую сілу і тэхніку ворага, але праводзілі і вялікую агітацыйную работу сярод насельніцтва. Распаўсюджваўся падпольны друк: лістоўкі, звароты, зводкі Саўінфармбюро.

У раёне ў гэты час было ўжо створана 25 камсамольска-маладзёжных груп. Вялікую дапамогу мясцовай моладзі па арганізацыі камсамольскай работы ў тыле ворага, па разгортванню «рэйкавай вайны» аказвала інструктар ЦК ВЛКСМ Клаўдзія Аляксандраўна Маркава (Моськіна). Яна зарэкамендавала сябе бясстрашнай валявой падпольшчыцай.

Вясной 1943 г. на Чэрыкаўшчыну прыйшло партызанскае злучэнне «Трынаццаць» пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза С. В. Грышына. Злучэнне садзейнічала аб'яднанню партызанскіх атрадаў у раёне. Неўзабаве ствараецца трэці Чэрыкаўскі атрад (на аснове групы І. Н. Ваўчкова) пад № 15, камандзірам яго быў Ваўчкоў, камісарам Я. А. Касмачоў. У раёне ўжо дзейнічалі тры партызанскія атрады: 720, 721 і 15-ы, якія налічвалі 977 партызан.

Цесна стала ворагу на зямлі прысожскага краю, партызаны знішчалі паліцэйскія гарнізоны, участкі, пускалі пад адхон дзесяткі эшалонаў. Гэта барацьба перамолвала акупантаў у тыле і адцягвала вялікія сілы фашыстаў з фронту, што садзейнічала хутчэйшаму іх разгрому.

Набліжаўся светлы дзень вызвалення Беларусі ад карычневай чумы. Важную місію па вызваленню рэспублікі выконвалі байцы 50-й арміі. 25 верасня 1943 г. яе перадавыя палкі ўступілі на беларускую зямлю. У наступны дзень вызвалены Хоцімск, затым Касцюковічы, Клімавічы, Мсціслаў. 30 верасня быў ачышчаны ад гітлераўцаў Крычаў. Але немцы ўмацаваліся ў Чэрыкаве. Вызвалены вёскі Вохар, Рэчыца, а горад гітлераўцы ўтрымлівалі ўпарта. Больш 25 кулямётных кропак, 12 артылерыйскіх і мінамётных батарэй налічвала абарона Чэрыкава. Адышоўшыя часці 707-й і 129-й пяхотных дывізій гітлераўцаў занялі падрыхтаваныя рубяжы на крутым беразе Сожа. Але не толькі адзін бераг быў умацаваны фашыстамі. Яны пакінулі ў лесе, за Сожам, 211-ю пяхотную дывізію, ператварылі в. Вепрын у магутны апорны пункт.

У гэты час сельскі Савет з Верамеек пераехаў у пас. Масток. Ён размясціўся ў маленькай хаце на ўскраіне пасёлка ў напрамку в. Юдаўкі. Устанавілі палявы тэлефон. Каля яго заўсёды знаходзіўся дзяжурны. У Масток перавезлі астатнюю зброю.

У канцы чэрвеня ў сельскі Савет прыехаў сакратар райкама Г. А. Храмовіч. Ён сустрэўся з Гузняковым і Фядосенка. Было вырашана ўсю калгасную жывёлу гнаць на ўсход. І тут я зразумеў, што баі ідуць дзесьці недалёка.

Праз некалькі дзён вечарам да сельскага Савета пад'ехаў Гузнякоў і сказаў, каб мы пагрузілі на воз усе паляўнічыя ружжы (іх было каля 20), зняў палявы тэлефон і паехаў у лес. Нам загадаў чакаць яго. Стала зразумела, што вораг, як кажуць, ужо каля нашых варот.

Гузнякоў вярнуўся ноччу. Мы ўсе накіраваліся ў в. Верамейкі. Каля лесу спыніліся. Гузнякоў папрасіў дапамагчы яму пагрузіць на воз бідоны з вадкім палівам, якія былі схаваны ў жыце. Мінулі лес. Спыніліся каля могілак. Коней пакінулі, а самі накіраваліся на вакзал. Было ціха. Ніводнага чалавека вакол. Зайшлі ў пакой дзяжурнага. «А ця-

А. Г. Новікаў.

В. А. Ткачоў.

пер за работу»,— сказаў ён і першы пачаў ламаць апараты. Усё, што можна было знішчыць, знішчылі. Білі ламамі, камянямі. Калі ўсё абсталяванне станцыі вывелі са строю, вярнуліся на могілкі і паехалі да хлебапякарні. «Узрыўчаткі няма, давядзецца карыстацца гаручай сумессю»,— ціха сказаў Гузнякоў.

Калі пад'ехалі да хлебапякарні, заўважылі, што вокны і дзверы там паламаны. Замест пячэй ляжалі кучы цэглы. Іван Аляксандравіч усміхнуўся: «Малайцы, нехта добра папрацаваў». Потым Гузнякоў адпусціў нас дадому.

У Верамейкі прыйшлі немцы. У лесе размясцілася нейкая часць. Пабыла нядоўга. Аднойчы пад вечар Ваня Міхееў, Вася Ткачоў і я прыйшлі да Федзі Ткачова. Потым прыйшоў Іван Аляксандравіч Гузнякоў. Ён быў стомлены. «У лясах многа кінутай зброі, добра было б сабраць яе і схаваць».

Мы, гэта Федзя Ткачоў, Ваня Тулееў, Коля Цімашэнка, Вася Ткачоў і я, усё зрабілі, як сказаў Іван Аляксандравіч. Сабралі зброю ў лясах паміж вёскамі Верамейкі, Беліца, Асінаўка. Каля былога пасёлка Луцішча знайшлі маленькае возера. Змазалі зброю, у асноўным вінтоўкі і некалькі ручных кулямётаў, кінулі ў ваду.

Неяк днём сабраліся ісці ў пасёлак Абрубец. У гэты час наляцелі карнікі і расстралялі Івана Аляксандравіча Гузнякова, Фядосенку, Карнюшчанку. Шукалі Сямёна Усцінавіча, але ён паспеў знікнуць.

Да глыбокай восені збіралі зброю і патроны. З надыходам зімы вёска быццам вымерла. Людзі нічога не ведалі, як ідзе вайна, дзе знаходзіцца фронт. Пасля кастрычніцкіх святаў да мяне прыйшоў Федзя Ткачоў, прынёс напісаную ад рукі зводку Саўінфармбюро. Ён хадзіў у пас. Масток і в. Наркі, сустрэўся з нашым былым настаўнікам Іванам Аляксеевічам Марозавым. Ад яго ён даведаўся, што на тэрыторыі раёна дзейнічае падпольны райкам, што трэба ўключацца ў барацьбу з фашыстамі, распаўсюджваць зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі, што падпольную работу ў раёне ўзначальвае Георгій Антонавіч Храмовіч.

Да пачатку мая 1942 г. выконвалі гэту работу. Федзя Ткачоў сустракаўся з Марозавым, які даваў нам даручэнні. Да сакавіка толькі ён бачыўся з настаўнікам. А ў адзін з сакавіцкіх дзён Федзя Ткачоў перадаў, што Марозаў хоча пагутарыць з усімі намі. Распрацавалі план сустрэчы. Усе, па розных напрамках, у розны час едуць за дровамі ў лес паміж пас. Масток і в. Забачэў. Так і зрабілі. Насеклі дроў, паклалі на вазы. Чакаем. А Марозава няма. Сталі хвалявацца. Паявіўся ляснік Васілій Мітрафанавіч Меранцоў, а праз некалькі хвілін Марозаў. Размова працягвалася каля гадзіны. Паведамілі аб сваіх справах, аб тым, што сабралі зброю. Марозаў даручыў нам весці пастаянны нагляд за рухам на чыгунцы, запамінаць, што перавозяць немцы. Потым на сустрэчу з Марозавым мы хадзілі па чарзе.

Пасля майскіх святаў Ваня Міхееў паведаміў нашай групе, што Марозаў загадаў перавезці схаваную

зброю ў вызначанае месца. Ужо тады ў Верамейках размясціўся буйны нямецкі гарнізон. Разам з намі выконваць гэта даручэнне павінны былі Яфім Антонавіч Ткачоў і Анатоль Варфаламеевіч Елісееў. Быў распрацаваны план. Марозаў прыязджае да Верамейскай бальніцы на павозцы. Адтуль, абмінаючы чыгуначны пераезд у в. Верамейкі, праз лес (былы Арлоў хутар) на гэтым кані далей едзе Лёня Аўдзееў. А Марозаў вяртаецца ў пас. Масток. Астатнія рознымі шляхамі дабіраюцца да Луцішча. Грузім зброю, едзем лесам цераз чыгуначны пераезд каля в. Селішча ў раёне пас. Масток. Калі план ужо быў распрацаваны, даведаліся, што Яфім Ткачоў і Толя Елісееў сталі паліцаямі. Аперацыю давялося адкласці. Пры сустрэчы Марозаў растлумачыў, што служыць у паліцыю яны пайшлі па заданню падпольнага райкама. Зброю вывезлі праз некалькі дзён, як і было запланавана. Пры выездзе з лесу нас сустрэў Толя Елісееў, а каля пераезда Міша Краўцоў. Яны дапамаглі без прыгод праехаць гэты небяспечны ўчастак. Каля пас. Масток нас чакалі Марозаў і два партызаны.

Летам сорак другога сталі часцей распаўсюджвацца зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі. Матэрыялы размнажалі на пішучай машынцы, якую хавалі ў маім хляве. Выкарыстоўвалі сшыткі.

Днём у чэрвені — ліпені амаль усе жыхары знаходзіліся на ўборцы сена. Таму вырашылі дастаўляць прапагандысцкую літаратуру ноччу. Лістоўкі, зводкі, газеты клалі так, каб не знясло ветрам. Раніцай іх маглі прачытаць вяскоўцы прама ў полі.

У канцы вясны ці ў пачатку лета ў Верамейках пасяліўся Іван Меранцоў. Як потым высветлілася, яго накіраваў да нас сакратар падпольнага РК КП(б)Б Храмовіч Г. А. для актывізацыі працы нашай падпольнай арганізацыі. Мы пачалі мініраваць чыгунку, псавалі тэлефонную сувязь. Падразалі тэлеграфныя слупы, падарвалі дзве жалезабетонныя трубы цераз невялікія рэчкі на чыгуначным палатне. Рух цягнікоў быў спынены на некалькі дзён.

Неяк Іван Меранцоў паведаміў нам, што камандаванне партызанскага атрада № 720 цікавіцца Верамейскім гарнізонам, што пажадана было б скласці план яго размяшчэння. Выканаць гэта заданне было даручана Ваню Міхееву, Толю Елісееву, Івану Меранцову, а таксама Краўцовай Марыі і Лысенка Ларысе, якія працавалі на кухні сталовай нямецкага гарнізона ў Верамейках.

У хуткім часе партызаны разграмілі гэты гарнізон. Фашысты панеслі цяжкія страты. Пасля гэтага ўзмацніліся рэпрэсіі. Але мы працягвалі праводзіць дыверсійныя аперацыі. Неяк ноччу замініравалі дзве воданапорныя вежы і дзве воданапорныя калонкі на ст. Верамейкі. У гэтых аперацыях прынялі ўдзел Федзя Ткачоў, Толя Елісееў, Вася Ткачоў, Міша Краўцоў і я. Выбухі пачулі, калі былі ўжо ў лесе. Вады на ст. Верамейкі не было да самага вызвалення вёскі Чырвонай Арміяй.

Заставацца ў Верамейках стала небяспечна. Многім прыйшлося пайсці ў партызанскі атрад № 15, дзе ўдзельнічалі ў баявых аперацыях. Нам удалося падпаліць дзве нямецкія аўтамашыны. Група пад кіраўніцтвам Івана Меранцова пусціла пад адхон эшалон паміж Верамейкамі і Ратнай. Мы ўзрывалі рэльсы на ўчастку Селішча — Пераможнік. У ліпені, калі мы знаходзіліся ў лесе, да нас прыязджаў Яфім Арцёмавіч Касмачоў, камісар партызанскага атрада № 15 і Іван Аляксеевіч Марозаў. Мне даручылі дабрацца да

Верамеек і даставіць пішучую машынку ў атрад. Заданне было складаным. Ішоў ноччу праз в. Селішча. Наскочыў на засаду, пачалася страляніна. Дзень правёў у лесе. У наступную ноч здолеў забраць машынку.

У канцы жніўня 1943 г. мы прыбылі ў в. Жытнёў у атрад. Нас запісалі ў кнігу ўліку. Неаднойчы члены нашай групы ўдзельнічалі ў баявых аперацыях. З Савецкай Арміяй аб'ядналіся ў раёне р. Проні. Пасля вызвалення Чэрыкава многія з нас уліліся ў рады Савецкай Арміі.

І рэквіем і гімн

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Чэрыкаўскага антыфашысцкага падполля журналіст І. П. Дзенісенка нарадзіўся ў 1913 г. у в. Наркі Чэрыкаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Перад вайной працаваў адказным сакратаром чэрыкаўскай раённай газеты «Сацыялістычная перамога». Добраахвотна пайшоў на фронт. Трапіў у акружэнне і вярнуўся ў родную вёску. У 1941 г. стварыў падпольныя камсамольскія групы ў вёсках Наркі і Юдаўка. Па заданню Чэрыкаўскага падпольнага райкама КП(б)Б у сакавіку 1942 г. уладкаваўся пісарам у акруговую паліцыю. Узначаліў у Чэрыкаве падпольную групу, з 1943 г.— Чэрыкаўскі антыфашысцкі камітэт. Пад кіраўніцтвам І. П. Дзенісенкі былі праведзены дыверсіі на электрастанцыі, лесазаводзе, у механічных майстэрнях, хлебапякарні. Акрамя палітычнай і дыверсійнай работы, актыўна займаўся разведкай (мянушка «Іон»). Па даносу праваката ра 5.6.1943 г. яго арыштавалі. Пасля жорсткіх катаванняў 5.7.1943 г. расстралялі.

І. П. Дзенісенка пісаў вершы. Аўтар паэмы пра пагранічніка «Сямён Лагода» (1938). Уцалелыя рукапісы захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва ў Мінску.

На ўшанаванне памяці І. П. Дзенісенкі ў Чэрыкаве на будынку, у якім гітлераўцы трымалі яго перад расстрэлам, у 1967 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

І. П. Дзенісенка.

Тыя ж самыя вёскі абапал пясчаных дарог, той жа вераб'іны грай на правадах, і, як з той начы, чорная норка перакрэслівае дарогу, тыкаецца мордай у крута зрэзаны бераг і — назад, пад колы машыны...

Той жа клён на вуліцы імя Дзмітрыевай у Чэрыкаве. Праўда, раней не было мемарыяльнай дошкі насупраць клёна. Вось гэтай: «Тут, у камеры смертнікаў, правёў свае апошнія гадзіны...» На выездзе з Чэрыкава гэтыя ж вербы стаялі. І малады сасняк — як зварочваеш на Глінь. Іншы, але такі ж малады. Тут апошні раз ён бачыў неба, зямлю, чыстую ваду Удожкі... Млын... Роў...

Гэта было пятага ліпеня сорак трэцяга года. Яшчэ не высыпалі чырвонагаловыя падасінавікі, не цвіў лясны гваздзік. Кветка змагання. Рукі яго былі звязаны. На левым баку грудзей чырвоная зорка — мішэнь для кулі. Было яму трыццаць гадоў.

«Мая мілая, мая дарагая Леначка! Я жыву апошнія мінуты. Цяпер да мяне прыйшлі пан суддзя, пан Адам

і аб'явілі, што прыгавор зацверджаны і што я буду расстраляны...»

Слёзы?.. Я дарэмна нагадаў вам гэтыя радкі, Алёна Іванаўна, але ж мне трэба ведаць, хто такі пан Адам...

— Паліцай. Знаёмы. Калі Івана арыштавалі, я кінулася прасіць, каб дапамог. А ён: «Не прасі. Твой муж хацеў і мяне здаць партызанам...» Я выбегла на вуліцу. Памятаю цёмнае неба, клён. Ён там і цяпер стаіць. Гэты клён у вершы, каторы муж сынам прысвяціў...

Маўчым. А радкі верша, выкінутага на волю з-за кратаў турэмных, не хочуць маўчаць у памяці:

За окошком камеры моей
Клен стоит, едва скривившись станом.
Я прижмусь к решетке поплотней,
Говорок соседа слушать стану.

Что он скажет, островерхий мой?
Что он слышит, прислонившись к тыну?
Может, скоро ль я уйду домой,
Может, скоро ль я навек загину?

Злополучный ветер налетел,
И опутал, и согнул беднягу.
Я упорно, страстно жить хотел,
Потому в могилу, верно, лягу.

Клен стоит, шатаясь и скрипя,
Клен шумит и шепчет, шепчет глухо,
Будто бы сказать мне торопясь,
Чтоб чужого не коснулось слуха.

«Я сегодня под дождем промок
И потрепан ветром ураганным.
Ты — как я — забыт и одинок,
Ты опутан злобными врагами.

Не тоскуй, приятель, не грусти:
Есть всему конец на этом свете.
Мне при жизни с места не сойти,
Ты — ходить не будешь после смерти.

Если я переживу твой век,—
Подрастут твои детишки-крошки,—
Будь уверен, добрый человек,
Про тебя им расскажу немножко».

И умолк... Не шелохнется лист.
Молчаливы блеклые сережки.
А из сердца... слезы пролились...
И в глазах...
О, не смотри, прохожий!

У Глінскім аддзяленні сувязі ціха: уся гамана — там, за вёскай, дзе ўбіраюць ураджай. Зрэдку, праўда, той-сёй завітае. Стары чалавек пытаецца ў Алёны Іванаўны пра пасылку ад сына і атрымоўвае яе. Каму — пісьмы, каму тэлеграмы. Потым зноў кантора пустуе, зноў клубок пражытага разматваецца асцярожна і вельмі нялёгка:

— Калі мужа расстралялі, Лёню было два гадкі, а Колю шэсць месяцаў. Яшчэ на маіх руках Валя засталася, малая таксама. Коля памёр. А Лёня цяпер у мяне госціць.

Пазнаёміліся мы з Іванам у трыццаць шостым. Праз два гады запісаліся. Год пажылі, ён паехаў у Мінск. З гады працаваў у газеце «Советская Белоруссия». Кватэры мы не знайшлі. Вярнуліся. Зноў стаў працаваць у Чэрыкаўскай рэдакцыі. Далі нам кватэру... Вайна ўсё шчасце параскідала...

На шашы Брэст — Масква дзень і ноч грукацелі танкі, аўтамашыны. Воінскія часці ішлі на захад, бежанцы — на ўсход, а затым — усе разам на ўсход. У гэтым калаўроце Іван Дзенісенка шукаў сваё месца, і вось на зборным пункце ў Чэрыкаве, развітваючыся з сястрой Марыяй, перадае ёй томік Маякоўскага, любімага паэта. І рукапісы сваіх новых вершаў. Але жонка і дзеці ў Зорах, маці, сястра ў Нарках не доўга заставаліся без бацькі, мужа, сына, брата. Воінская часць, з якой адыходзіў Дзенісенка, трапляе пад Крычавам у акружэнне, і ён, хворы на рэўматызм і сэрца, а цяпер, пасядзеўшы ў балотах,— зусім падбіўшыся, прабіваецца дадому.

Зноў — Зоры, Наркі... Наўкол вайна, а ён — у матчынай хаце. Што далей? На немца працаваць не прымушаюць, не, ды хіба гэтага дастаткова? Аднойчы паліцаі загадалі ехаць з абозам. Сказаў, што хворы, не можа. Прымушаючы, збілі да



Старонка апошняга пісьма І. П. Дзенісенкі.

крыві, але настаяў на сваім — не паехаў.

Раней сціплы і ветлівы з усімі, ён стаў нястрыманым, нервовым. З кім ні сустракаўся — душу выліваў адкрыта, не тоячы агіды да новых парадкаў. Небяспека хадзіла следам, але ён нібы не заўважаў яе. Аднойчы, калі з'явіўся на вуліцы сярод вясковай моладзі і пачаў адкрыта смяяцца над «белымі свіннямі» (так называў фашыстаў), падышоў мясцовы настаўнік Іван Марозаў: «Давай пройдземся»... Яны пасябравалі.

Стрыманы і глыбакадумны чалавек, Марозаў аказаў вялікі ўплыў на Дзенісенку. Настаўніца Наркоўскай школы Ганна Іванаўна Ткачова памятае, як у суседніх Верамейках, у царкве, у час служэння, з'явіліся Дзенісенка і Марозаў, а з імі — лістоўкі, напісаныя ад рукі на паперы з вучнёўскага сшытка. Яна падышла да Дзенісенкі, якога добра ведала, спытала, хто раскідаў. Ён не схаваўся: «Мы. Маўчы толькі».

Лістоўкі са зводкамі Саўінфармбюро пранікалі ў многія суседнія вёскі, а неяк увосень, сярод ночы, запалалі хаты наркоўскіх паліцаяў. Уранні стала вядома, што забіты паліцай Урупін. І ніхто не ведаў, што ўсё гэта рабілася рукамі Дзенісенкі, Марозава і акружэнцаў, якія прыжыліся ў Нарках «зяцямі».

Матчына хата тулілася ля самага лесу. Неяк увосень Дзенісенка вярнуўся з лесу ўзрушаны, як ніколі. «Мне прызнаўся, што пойдзе працаваць да немцаў,— прыгадвае сястра Марыя.— Ды што ты, кажу. Мяне не пускаў працаваць, а сам цяпер... Ён сказаў, што так трэба».

Праўда, у чэрыкаўскую камендатуру з'явіўся не тады, увосень, і не зімой, а ўжо сакавіцкай талай дарогай. Уладкавацца на работу дапамог перакладчык Сакалоўскі, былы настаўнік. І вось паліцэйская форма, на рукаве — СД. Гэтыя літары ведалі ўсе, іх баяліся старыя і малыя, іх праклінялі. Аднойчы да Івана падышла маці. «Навошта, сынок, адзеў чужое? Цябе ж свае ж людзі заб'юць у гэтым мундзіры». Ён доўга глядзеў ёй у вочы. Не даказваў. Толькі папрасіў: «Не хвалюйся, мама, не плач...» Так нават родная маці не ведала, які боль і якая сіла б'юцца пад гэтым чужым мундзірам. Не здагадвалася, што перш, чым апрануць яго...

Былы сакратар Чэрыкаўскага падпольнага райкама партыі Георгій Антонавіч Храмовіч шмат пазней паведаў: сустрэча паміж імі адбылася ў лесе праз сувязнога лесніка Меранцова. Размова ішла аб тым, каб Дзенісенка ўладкаваўся працаваць у нямецкія акупацыйныя органы і пачаў там дыверсійную работу. «Дзенісенка расказаў,— пісаў пасля

Храмовіч,— што калі ён прыйшоў у Чэрыкаў уладкоўвацца на работу па заданню падпольнага райкама, бургамістр Шаркевіч і гаўрэднер (акруговы прапагандыст) хацелі, каб ён працаваў у аддзеле прапаганды. Яму абяцалі добры аклад і г. д., але Дзенісенка катэгарычна адмовіўся працаваць у аддзеле прапаганды. Ён не мог пісаць і гаварыць супраць свайго народа, супраць Радзімы. За адмову яму пагражалі расстрэлам, канцлагерам, але Дзенісенка настаяў на сваім. Ён ужо тады быў на валаску ад смерці за сваю адмову».

Так пачалася новая, самая гераічная і драматычная старонка ў жыцці патрыёта — апошняя ў яго жыцці.

Працуючы сакратаром Чэрыкаўскай акруговай паліцыі, Дзенісенка доўгі час прагна шукае і не знаходзіць — не па сваёй віне — сувязь з партызанамі, падпольным райкамам, дзейнічае па сутнасці адзін. Калі ж у чэрыкаўскія лясы заходзіць атрад Перапечкіна і Дзенісенка наладжвае з ім сувязь — як бы набірае другое дыханне. Праводзіцца аперацыя па здачы партызанам ушакоўскай паліцыі (36 паліцэйскіх, 5 кулямётаў, 38 вінтовак, гранаты); шырыцца агітработа сярод палякаў, якія рамантавалі дарогу на Маскву, рыхтуецца іх пераход да партызанаў разам з дарожнай тэхнікай; збіраецца інфармацыя аб паліцэйскім гарнізоне, карных нямецкіх часцях, варожай агентуры і нарэшце — распрацоўваецца план здачы партызанам чэрыкаўскай паліцыі. Да падрыхтоўкі гэтай аперацыі Дзенісенку ўдаецца падключыць начальніка паліцыі Васіля Гуленку. Яго дзейнасць у варожым логаве становіцца ўсё больш смелая і рызыкоўная. Але да рызыкі не прывыкаць.

Некалькі дзён ішоў дождж. Гэтых дзён хапіла для здрады.

— Што выдаў Самусёў, муж крыкнуў мне з акна камеры,— прыгадвае Алёна Іванаўна.— Самусёў

Мемарыяльная дошка, устаноўленая ў г. Чэрыкаве на доме па вул. Дзмітрыевай, 27.

камандаваў паліцэйскай трыццаткай, і яму таксама было прапанавана пераходзіць да партызан.

Перада мной апошняе пісьмо Дзенісенкі, напісанае за некалькі гадзін да расстрэлу:

«Мая мілая, мая дарагая Леначка! Я жыву апошнія мінуты... Мілая Леначка. Я спачуваю табе. Вельмі і вельмі табе цяжка. Але бяда забудзецца. Беражы сябе, беражы сваё здароўе, беражы дзяцей, мілых добрых дзяцей. Я іх больш не ўбачу...

Дарагая жонка! Мая апошняя просьба — беражы сябе і дзяцей. Навучы дзяцей розуму, навучы, як жыць на свеце...»

Мы выходзім на вуліцу. Верасень сонечны, цёплы, сухі. На вёсцы пахне садавінай, асабліва слівамі — паўз плот. Яны аж усыпалі дрэвы і, пераспелыя, ці не бродзяць там жа на дрэвах. Ціхая цяплынь і духмянасць. Ціха нават ля школы. Ма-

быць, да перапынку, пакуль урок. Мірнае жыццё валадарыць зямлёй — як гімн. Але ж зямля не забыла і рэквіем...

— Ён чакаў, што партызаны вызваляць яго... Быў спакойны, калі я прыходзіла. Можа, каб мяне суцешыць. Адзін раз падбегла да акна камеры... Мяне фашысты схапілі. Пасадзілі. Затым выпусцілі. Памятаю, сабралася бегчы да яго раніцай. А жонка Гуленкі, Людміла, прыйшла да мяне... Іх няма ўжо, кажа. Не ідзі.

На гэтай ціхай вуліцы, слухаючы няроўны голас, які то спяшаецца нешта сказаць, то змаўкае, у сённяшняй мірнай восені, я разумею, што подзвіг Івана Дзенісенкі ўжо тады жыў побач з подзвігам гэтай ціхай жанчыны, яго жонкі, што цяжар, які сабе на плечы ўзваліў ён, паміма яго волі клаўся і на яе жаночае сэрца. Жонка паэта і журналіста, жонка салдата, акружэнца, зусім хворага чалавека, для многіх — паліцая і здрадніка, жонка падпольшчыка-патрыёта, над галавою якога так блізка і доўга вісела сякера фашысцкага ката...

Ён любіў людзей і хацеў, каб людзі пра яго думалі добра.

Штыком я дрался и пером.
Я в битве лег костьми своими,
И, может, кто-нибудь добром
Хоть раз мое вспомянет имя.

Даўно Чэрыкаў залячыў раны вайны. Падняліся новыя прыгожыя будынкі. Шумяць шматгадовыя ліпы, клёны. Не, не забудуць людзі подзвіг паэта-журналіста.

В. Карамазаў.

Аб'ява гарадской камендатуры

Антаніна Ягораўна Сарочанка доўгі час захоўвала аб'яву камендатуры г. Чэрыкава, якая сведчыла, што яе бацька Рыгор Ігнатавіч Сарочанка і тры салдаты-акружэнцы, якія жылі на хутары Светлым, былі расстраляны за сувязь з партызанамі. Гэты дакумент яна перадала ў Чэрыкаўскі музей. Першая яго палова напісана на нямецкай мове, другая — на рускай.

«Городская комендатура г. Черикова, 19 ноября 1941 года

Объявление

Частному населению ставится в известность, что 16 ноября 1941 года расстреляно 4 русских гражданина:

1. Сароченко Григорий рождения 10 января 1904 г. д. Лобановка
2. Мишин Алексей рождения 6 февраля 1917 г. д. Горки
3. Капленко Алексей рождения 10 марта 1922 г. д. Алексеевка
4. Соловьев Виктор рождения 10 апреля 1918 г. д. Голобаново

У всех 4-х было найдено оружие и все они держали связь с партизанами»

На хутары Светлым жыла сям'я Рыгора Сарочанкі. Па стану здароўя ў армію яго не прызвалі. Калі Чэрыкаўскі раён быў акупіраваны немцамі, Сарочанка збіраў і хаваў у сваім доме зброю, каб перадаць яе партызанам.

Аднойчы, прыйшоўшы з малацьбы, Рыгор сказаў сваёй жонцы Еве Цімафееўне, што ў іх гумне чалавек памірае ад ран і што трэба забраць параненага ў дом. Ім аказаўся Аляксей Мішын. Да Сарочанкі стала забягаць іх пляменніца Таццяна Міхненка, якая дапамагала параненаму. Медыкаментаў не было, лячылі народнымі сродкамі.

І вось аднойчы ў хату да Рыгора ўварваліся немцы і паліцаі, забралі Сарочанку і Мішына. Яшчэ двое ак-

ружэнцаў, якія пражывалі на хутары Светлым, таксама былі арыштаваны.

Праз два дні Рыгора выпусцілі, а на трэці зноў забралі. Пэўна фашысты разлічвалі, што на волі Сарочанка выведзе іх на падполле ці на партызан. Яны сачылі за кожным яго крокам, але пралічыліся. Тады яны пачалі дапытваць Еву Цімафееўну. Білі прыкладамі, ставілі каля выкапанай ямы, вазілі ў Лабанаўскі паліцэйскі ўчастак. Нічога не дабіўшыся, адпусцілі.

Р. І. Сарочанка.

Ева Цімафееўна з Насцяй Сцельскінай, у доме якой жыў адзін з акружэнцаў, падаліся ў Чэрыкаў з надзеяй даведацца аб лёсе арыштаваных. У камендатуры немцы прыгразілі: «Ідзіце адсюль, пакуль цэлыя! Расстралялі вашых мужыкоў». А праз некаторы час ля варотах двара Евы Цімафееўны Сарочанка павесілі аб'яву, якую яна і захавала.

З ЗАГАДА КАМАНДУЮЧАГА АБАРОНЧЫМІ ВОЙСКАМІ І КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПОЎКІ АРМІЙ «ЦЭНТР» АБ ЗАПЛАНАВАНЫХ АКЦЫЯХ СУПРАЦЬ САВЕЦКІХ ПАРТЫЗАН

На основании представленных дивизиями предложений о проведении операций против партизан настоящим я приказываю о проведении следующих акций против партизан:

А. 221-я охранная дивизия

Операция «Ойле» («Сова») по уничтожению находящихся в районе Чериков — Пропойск — Краснополье вражеских частей и усмирению этой территории.

Начало операции — 2.8.1942 г., предварительно согласовать.

Участвующие силы — 3 батальона.

З ПАВЕДАМЛЕННЯЎ НЯМЕЦКАГА КАМАНДАВАННЯ

221-я охранная дивизия

...Мощное нарастание бандитской деятельности в районе южнее Новозыбкова, а также на магистральном шоссе УП между Пропойском и Чериковом. Здесь почти ежедневно совершаются нападения на автомашины.

...В ходе операции по очищению местности южнее Черикова арестовано для проверки 103 чел.

...На магистральном шоссе УП, юго-западнее Черикова, партизанами обстреляна и сожжена легковая автомашина, 2 чел. ранены.

З Пацдамскага архіва. Пераклаў з нямецкай Г. Бялькевіч.

Смерці глядзелі ў вочы

З успамінаў Р. Х. Ткачова, былога члена Чэрыкаўскай падпольнай арганізацыі

У верасні 1941 г. я атрымаў раненне пад Кіевам. Вярнуўся да сваёй маткі ў в. Вудагу. Фронт адкаціўся далёка на ўсход. У раёне гаспадарылі немцы. Перада мной паўстала пытанне: што рабіць? Не мог я сядзець склаўшы рукі і чакаць часу вызвалення роднай зямлі.

У вёсцы пражывала настаўніца Дударава Валянціна Міронаўна.

Р. Х. Ткачоў.

Вырашыў параіцца з ёй. Думаў, можа, яна падкажа. Не раз я вёў з ёю размову аб тым, што трэба было б устанавіць сувязь з падполлем ці партызанамі, што нельга ў такі цяжкі для краіны час не ўдзельнічаць у барацьбе з фашызмам.

І я не памыліўся. Аднойчы, гэта было ў сакавіку 1942 г., Дударава паведаміла, што разам з ёю я павінен з'явіцца ў Чэрыкаў, каб сустрэцца з адным чалавекам. Як аказалася, гэтым чалавекам быў Іван Піліпавіч Дзенісенка. Моцнае ўражанне выклікаў ён у мяне. Іван Піліпавіч прапанаваў мне пайсці працаваць у Чэрыкаўскую паліцыю. Спачатку я адмаўляўся — як, маўляў, на мяне паглядзяць людзі. Тады Дзенісенка спакойна, але ўпэўнена сказаў, што выконваць трэба тую работу, якая прынясе больш карысці Радзіме.

Я згадзіўся. Пайшоў памочнікам пісара Глінскай воласці. Іван Піліпавіч папярэдзіў, што бургамістр і начальнік паліцыі здраднікі, а сакратар Дружанкоў Іван Еўдакімавіч — наш чалавек, што сувязь я буду падтрымліваць з ім толькі праз Дудараву. Ён параіў падабраць надзейных людзей. Для пачатку паралізаваць дзейнасць Глінскай паліцыі, распаўсюджваць зводкі Саўінфармбюро. Так я стаў членам падпольнай арганізацыі, якой кіраваў І. П. Дзенісенка.

Пры наступных сустрэчах Дзенісенка ставіў перад нашай Глінскай антыфашысцкай групай новыя задачы.

Мы займаліся не толькі агітацыйнай работай, але і дыверсіямі. Знішчылі сенасклад, падпалілі дом, дзе размяшчалася канцылярыя валаснога бургамістра і начальніка паліцыі. На пажары згарэлі спіскі моладзі, якая падлягала адпраўцы ў Германію, падазроных асоб і іншыя дакументы. Напярэдадні пажару я вынес многа чыстых бланкаў, якія затым былі выкарыстаны падпольшчыкамі і партызанамі, сакрэтную дакументацыю бургамістра.

Аднак становішча абвастрылася. За намі пільна сачылі. СД і жандармерыя праводзілі начныя аблавы, амаль кожны дзень на світанні за рэчкай Вудагай чуліся аўтаматныя чэргі. Там расстрэльвалі савецкіх людзей.

Мы не збіраліся ісці ў лес. Пайсці — значыць асудзіць многіх сваіх сяброў на расстрэл і канцлагер.

Падпольшчыкі без патрэбы не рызыкавалі. Але ў арганізацыю пранікліправакатары. Пачаліся арышты. Сярод іншых арыштавалі і мяне, а таксама Валянціну Міронаўну Дудараву. Пачалося следства. Знайшліся баязліўцы і здраднікі. Аказаўся здраднікам і начальнік раённай паліцыі Цемераў, які падтрымліваў сувязь з падполлем. Яго арыштавалі разам з намі. У час следства мне арганізавалі з ім вочную стаўку, дзе Цемераў выдаў сябе канчаткова. Ён запэўніў фашыстаў, што я ўзначальваў Глінскую падпольную групу. Затым гітлераўцы арганізавалі Цемераву ўцёкі. Хацелі ўкараніць свайго чалавека ў рады партызан.

Я знаходзіўся ў камеры смяротнікаў, але з дапамогай падпольшчыкаў мне ўдалося ўцячы. У хуткім часе я выкрыў здрадніка. Баючыся помсты, Цемераў не пайшоў да мяс-

цовых партызан, а далучыўся да 13-га атрада С. В. Грышына. Тут здраднік і атрымаў па заслугах.

Рана фашысты святкавалі перамогу. Урон падполлю яны нанеслі значны, але ліквідаваць яго ім не ўдалося. У раёне былі створаны новыя патрыятычныя групы, якія працягвалі барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У пачатку барацьбы

З успамінаў С. Г. Лукашэнкі, былой разведчыцы-сувязной Чэрыкаўскага падпольнага райкама партыі

У ліпені 1941 г. я добраахвотна пайшла ў дзеючую Чырвоную Армію. Восенню, пад Бранскам, часць, у якой служыла, трапіла ў акружэнне. Пасля ўпартых баёў нямногім удалося прарвацца да сваіх. На рацэ Дзясне загінуў камандзір часці. Група байцоў, што засталіся ў жывых, рассеялася па бранскіх лясах. Куды падацца? Вырашыла вярнуцца дамоў, ва Ушакі. Шлях назад быў доўгім і пакутлівым. А калі вярнулася, зноў паўстала пытанне: што рабіць? Адседжвацца ў тыле, жыць спакойна і чакаць, калі вызваляць — не ў маім характары. І я пачала шукаць сустрэчы з партызанамі. Хадзіла ў в. Манастырок, распытвала людзей, якія, на мой погляд, маглі быць звязаны з падполлем і партызанамі. Аднак усе мае намаганні былі дарэмнымі. Ніхто нічога не сказаў.

Аднойчы пачула стральніну. Яна то ўзмацнялася, то заціхала. Я выйшла з дому і пайшла ў тым напрамку. Бой быў дзесьці на бальшаку Ушакі — Бакунавічы. Вакол ужо ўсё заціхла, але я працягвала ўпарта ісці. Раптам мяне супыніў мужчына ў цывільнай вопратцы і прыказаў ісці следам за ім. Па дарозе паспела заўважыць, што тут пасля бою размясціўся на адпачынак якісьці партызанскі атрад. Партызаны прыводзілі ў парадак абмундзіраванне і зброю. Нехта вазіўся каля захопленых у ворага аўтамашын, гатавалі абед.

Мяне прывялі ў штаб. І як я ўзрадавалася, калі ўбачыла Георгія Антонавіча Храмовіча, які працаваў да вайны другім сакратаром Чэрыкаўскага райкама партыі. Расказала яму аб сваіх планах, жаданні змагацца ў партызанскім атрадзе. Мне ж прапанавалі стаць сувязной-разведчыцай. Прызнацца, я не адразу згадзілася. Мне здавалася, што я са зброяй у руках павінна змагацца з фашыстамі. Але Георгій Антонавіч пераканаў, што такое заданне важней, чым быць радавым байцом у атрадзе. Далі мне падпольную мянушку «Надзежда», устанавілі асноўны і запасны паролі для сувязі і месца для явак.

У гэты ж дзень атрымала першае заданне — аднесці пісьмо сакратара падпольнага райкама партыі ў Чэрыкаў і перадаць яго акруговаму бургамістру Шаркевічу. У нядзелю пайшла ў Чэрыкаў на базар. Сустрэлася з сувязной Антанінай Радзівонаўнай Зелянковай, перадала ёй пісьмо і атрымала ад яе данясенне з разведданымі. Пра сябе падумала, што гэта вельмі простае заданне. Наступнае было складаней. Камандаванне атрада накіравала мяне ў в. Пільню, што на бальшаку Чэрыкаў — Краснаполле. Патрэбна было

С. Г. Лукашэнка.

пранікнуць у фашысцкі гарнізон і завербаваць сувязнога. Два дні «гасцявала ў радні». Там пазнаёмілася з Васілём Васілевічам Волкавым, які і стаў новым падпольшчыкам-сувязным.

Атрад рыхтаваўся да баявой аперацыі на шашы Масква — Варшава. Неабходна было знішчыць мост цераз р. Лабчанку. На шашы працавала дарожна-будаўнічая група, якая складалася з палонных палякаў. Падпольны райкам партыі вырашыў адначасова ўстанавіць сувязь з палякамі, выведаць іх настрой. Я атрымала заданне прайсці па шашы і разведаць, якая ахова на мосце, яе ўзбраенне, ці ёсць дзот. Патрэбна было пагаварыць з палякамі і вырашыць, ці можна з імі супрацоўнічаць.

Пераправілася цераз Сож і пайшла ў бок Чэрыкава. Мост цераз Лабчанку быў у ста метрах ад кантрольна-прапускнога пункта. Часавы не праверыў дакументаў. Шкада, што не затрымалі, лепш можна было ўсё разгледзець. Мост невялікі. З аднаго боку ніякіх умацаванняў не відаць. На супрацьлеглым беразе бачу шалаш. Вырашыла загаварыць з паліцаем, які стаяў на варце, але ён толькі ляснуў затворам. Усё ж многае паспела заўважыць. Праз некалькі дзён мост быў знішчан разам з аховай — пяццю паліцаямі.

Затым наладзіла сувязь з палякамі. Дапамагла мне ў гэтым Антаніна Радзівонаўна Зелянкова. А было гэта так. Я часта насіла лістоўкі ў Чэрыкаў, перадавала падпольшчыкам заданне райкама, а ад іх атрымлівала данясенні, медыкаменты, сабраныя Шурай Нікеенка. Аднойчы я вярталася з горада па шашы. Недалёка ад в. Сакалоўка немцы ўстанавілі пост, што было для мяне нечаканасцю. Затрымлівалі кожнага, правяралі дакументы і нават рабілі вобыск. У маёй карзіне было некалькі ўзрываценяў. «Цяпер усё, канец»,— падумала я. Побач адпачывала група палякаў. Непрыкметна паставіла сваю карзіну сярод рабочых інструментаў. Ведала, што палякі не раз выручалі савецкіх людзей. Да мяне падышлі гітлераўцы, праверылі дакументы. Пакруцілі «аусвайс», які выдаў мне бургамістр Ушакоўскай воласці. Запыталіся, чаму іду гэтай дарогай. Ушакі знаходзіліся на другім баку Сожа, і з Чэрыкава ездзілі і хадзілі туды другой дарогай. Мяне хацелі арыштаваць. Дапамаглі палякі. Яны сказалі, што я іх добрая знаёмая, прыношу ім прадукты, а адзін нават назваў сваёй нявестай. Калі праверка скончылася, я хацела даведацца, як завуць маіх выратавальнікаў. «Якое гэта мае значэнне? — запытаўся «жаніх».— Завіце мяне Стэфанам».

У кастрычніку 1941 г. атрад пасля цяжкіх баёў на некаторы час пакінуў раён. Летам 1942 г. ён вярнуўся ў чэрыкаўскія лясы. Я зноў наладзіла сувязь з атрадам. Камандаванне атрада стала даваць мне складаныя заданні, якія патрабавалі рызыкі і смеласці. Выконвала іх добрасумленна і з гонарам, за што і была ўзнагароджана медалём «За адвагу».

Не вярнуліся

З успамінаў В. Н. Канапелькі, сына Бяляцкай Ніны Іванаўны — падпольшчыцы Дубраўскай антыфашысцкай арганізацыі

У сярэдзіне ліпеня 1941 г. у нашу в. Дубраўку з'явілася група савецкіх ваеннаслужачых, якія прасілі цывільную вопратку. Некаторыя з іх пераапрануліся і пайшлі, а шасцёра засталіся. Яны пасяліліся ў дамах мясцовых жыхароў, у тым ліку і ў нас. У гэты час вярнуліся дамоў ураджэнцы Дубраўкі, якія працава-

лі да вайны настаўнікамі ў суседніх вёсках, Мікалай Фёдаравіч Украженка і Іван Раманавіч Малаткоў. Мая маці, Ніна Іванаўна Бяляцкая, і Паліна Патапаўна Кукчанка добра ведалі іх. Яны таксама працавалі настаўнікамі ў Дубраўскай пачатковай школе.

Усе сталі збірацца ў нас дома. Аднойчы ноччу я падслухаў размову пра радыёпрыёмнік і зразумеў, што створана падпольная група. М. Украженка і І. Малаткоў пачалі шукаць зброю. На гэты час я і мае сябры І. Герасімаў, А. Сарокін і Т. Свірыдзенка сёе-тое ўжо раздабылі. Падпольшчыкі вельмі здзівіліся, калі мы перадалі ім тры вінтоўкі, паказалі месца, дзе былі схаваны ручны кулямёт і некалькі скрынак з патронамі. З лесу прынеслі скрынкі з запаламі.

Аднойчы на гары нашага дома я ўбачыў чалавека, ён спаў. Маці сказала, что гэта яе дзядзька і што я павінен маўчаць. Потым не раз бачыў гэтых «дзядзькаў» на гары. Пазней даведаўся, што сярод іх былі Г. А. Храмовіч і А. М. Гаспадарык, члены падпольнага райкама партыі.

Збіраліся падпольшчыкі часта. Мне і маім сябрам таксама давалі заданні. Па просьбе Паліны Кукчанка і маёй маці ў гэтыя дні мы накіроўваліся да школы, выбіралі зручнае месца і назіралі за рухам на дарозе, якая вяла з Гіжні і з Рынкоўкі на Дубраўку.

Але аднойчы здарылася бяда. Наляцелі немцы. Маці разбудзіла мяне і сястру Ліду і сказала, каб мы гналі свіней да гумна. Думала, што фа-

Н. І. Бяляцкая.

шысты прыехалі пажывіцца, як было ўжо не раз. Але каля гумна нас затрымалі гестапаўцы. Адзін з іх спытаў: «Дзе твой бацька?» Я адказаў, што ён загінуў на фінскай вайне. Далей нас не прапусцілі. Я агледзеўся: вакол вёскі — ланцуг карнікаў, матацыклы, машыны. А з вёскі даносіліся крыкі і плач, чулася страляніна. Нас хутка адпусцілі. Калі мы падышлі да сваёй хаты, я ўбачыў, што каля сцяны стаяць мая маці, П. П. Кукчанка, С. М. Кукчанка, П. І. Лахманкова, П. Р. Малашэнка, М. Ф. Украженка і сем ваеннаслужачых, якія бывалі ў нашым доме (імёнаў іх я не ведаю). Побач стаяў і «дзядзька». Гэта быў Аляксандр Максімавіч Гаспадарык. «Яны бунтаўшчыкі»,— крычалі фашысты. Мяне і сястру забрала к сабе суседка Хрысціна Кукчанка. З акна я бачыў, як здзекаваліся над арыштаванымі. Іх білі прыкладамі, затым загналі ў адкрытыя машыны і ўсіх павезлі ў Магілёў. Назад ніхто не вярнуўся. У засценках іх доўга катавалі. Нічога не дабіўшыся, пакаралі.

Суджана жыць

З успамінаў В. М. Дударавай, былой сувязной, члена Наркоўскай падпольнай арганізацыі

18 чэрвеня 1941 г. быў апошні званок і апошні педсавет у Асінаўскай сярэдняй школе Чавускага раёна, дзе я працавала выкладчыцай беларускай мовы ў 5—10 класах, а 21 чэрвеня я павінна была ехаць у Рагачоў. Але пачалася вайна. Вестка гэта ашаламіла. Бацькі мае жылі ў Данецкай вобласці. Да іх не дабрацца. Вырашыла пайсці ў в. На-

В. М. Дударава.

ркі, пашукаць сваякоў. На дарозе знайшла газету. На першай старонцы быў надрукаваны зварот ЦК КП(б)Б да насельніцтва часова акупіраваных раёнаў. Я зразумела, што маё месца побач з тымі, хто пачаў барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Спачатку дзейнічала адна. Дапамагала байцам, якія выйшлі з акружэння. Насіла ім у лес ежу, хавала ад немцаў. А калі ў Нарках Іван Піліпавіч Дзенісенка стварыў падпольную групу з мясцовай моладзі, у яе ўвайшла і я. Мне даручылі вывучаць настрой людзей у вёсках Вудага, Глінь, Наркі, Маляцін, Губіншчына, Янаў і іншых. Потым удзельнічала ў перапісу насельніцтва. Даныя перадала ў партызанскі атрад № 15, якім кіраваў Іван Нічыпаравіч Ваўчкоў.

Рэгулярна выходзіла на сувязь з Дзенісенкам і Храмовічам Г. А. Аднойчы Іван Піліпавіч сказаў мне, што фашысты рыхтуюцца насільна вывезці моладзь у Германію і што патрэбна сабраць усіх і схаваць у лесе. Тады многія выратаваліся ад фашысцкага рабства.

Неяк да нас прыехаў Міхаіл Раманятаў, брат якога служыў у паліцыі. Ён папярэдзіў, што гестапаўцы збіраюцца арыштаваць мяне за сувязь з партызанамі. Я пакінула дом цёткі і паехала ў в. Вудагу. Але выратавацца не ўдалося. 5 чэрвеня 1943 г. арыштавалі Дзенісенку, а на наступны дзень схапілі і мяне. Трымалі ў адзіночнай камеры на тэрыторыі камендатуры. Штодзённа па два-тры разы праз увесь Чэрыкаў вадзілі на допыт. Вочная стаўка з Дзенісенкам. Іван Піліпавіч змучаны, скатаваны. Немец звяртаецца да яго: «Гэта Валя Дударава?» Іван Піліпавіч маўчыць. Немец пытаецца ў мяне: «Гэта Іван Дзенісенка?» Маўчу і я.

Памятаю, прывялі мяне на чарговы допыт раніцай. Моцна білі, цягалі за валасы, сцябалі бізуном. Я страціла прытомнасць. Аблілі вадой. Колькі прайшло часу, цяжка сказаць. Але апрытомнела. Побач вядро, мокрыя шматкі маёй сукенкі. У пакой увайшоў паліцай з Наркоў. Звяртаюся да яго: «За што мяне так б'юць? Я ж не ведаю Дзенісенку, нічога не ведаю аб партызанах». У адказ пачула: «Ты лжэш. Я бачыў цябе з Дзенісенкам. Ты ведаеш, дзе партызаны. З цябе трэба выцягнуць усе жылы, тады ўсё скажаш». І зноў катаванні. Ледзь жывую выцягнулі на вуліцу і кінулі на зямлю ў двары турмы. Калі ачуняла, паспрабавала расплюшчыць вочы. Адно вока перастала бачыць.

Доўга здзекаваліся фашысты. Але я вытрымала, не пачулі яны ад мяне ніводнага слова. Быў суд. Прыгаварылі да расстрэлу. Затым расстрэл замянілі канцэнтрацыйным лагерам. Разумела, што чакае катарга, а затым і смерць. У Польшчы ўцякла з эшалона. Злавілі. Пасадзілі ў другі і павезлі ў Аўстрыю. Там будавала дарогу — насіла зямлю, каменне. Знемагала ад цяжкай працы, голаду, нуды.

Вызваліла Чырвоная Армія. Яна прынясла выратаванне ўсім, хто знаходзіўся ў лагерах смерці.

Стала сувязной

Антаніна Радзівонаўна Зелянкова нарадзілася ў 1907 г. у г. Чэрыкаве. З сялян. Вучылася ў Чэрыкаўскай гімназіі. Пасля сканчэння курсаў настаўнікаў з 1930 г. па 1934 г. працавала ў школе в. Бакунавічы Ушакоўскага сельскага Савета, а потым у Мірагашчанскай няпоўнай сярэдняй школе. Перад вайной скончыла Крычаўскае педвучылішча і Мазырскі пединстытут. У гады Вялікай Айчыннай вайны была сувязной падпольнага райкама партыі, партызанскага атрада М. Ц. Перапечкіна і іншых атрадаў. Узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, многімі медалямі. Савет ветэранаў 50-й арміі ўзнагародзіў яе памятным знакам «Ветэран 50-й арміі». Памерла ў 1983 г.

А. Р. Зелянкова.

Калі пачалася вайна, Антаніна Радзівонаўна Зелянкова вырашыла эвакуіравацца. Але пад Рослаўлем шлях на ўсход перагарадзілі фашысты. Вярнулася ў Мірагошч. Устанавіла сувязь з падпольным райкамам партыі і па яго заданню пераехала жыць у Чэрыкаў. Стала сувязной. «Тоня» — яе падпольная мянушка — падыходзіла для гэтай работы. Яна была смелай, дысцыплінаванай, патрабавальнай да сябе, вытрыманай. Падпольны райкам партыі падтрымліваў праз Антаніну Радзівонаўну сувязь з патрыётамі, якія дзейнічалі ў Чэрыкаве. Яна таксама перадавала неабходную інфармацыю разведвальна-дыверсійнай групе М. Ц. Перапечкіна, якая пазней выросла ў вялікі партызанскі атрад. Васіль Мітрафанавіч Цілюпа, які па прапанове райкама ўладкаваўся на працу ў млыновым трэсце, праз Тоню перадаваў падпольнаму райкаму партыі і партызанам важныя разведвальныя даныя. Цесна супрацоўнічала Зелянкова з кіраўніком Чэрыкаўскай падпольнай арганізацыі Іванам Піліпавічам Дзенісенкам. Антаніна Радзівонаўна прыгадвала:

— Да вайны я мала ведала Івана Піліпавіча. Асабіста мы не былі знаёмы, чытала яго матэрыялы ў газетах. А сустрэліся мы ў лютым 1942 г. Фашысты выгналі чэрыкаўлян на рамонт дарогі. Да мяне падышоў чалавек у форме паліцая і сказаў, што яму неабходна пагаварыць са мной. Я спужалася, падумала, што паліцыя даведалася пра лістоўкі, якія я напярэдадні распаўсюджвала ў горадзе. Супакоілася, калі ён назваў сябе. Гэта быў Дзенісенка. З таго часу я акуратна выконвала ўсе яго даручэнні. А аднойчы ў нас была кароткая сустрэча. Іван Піліпавіч паспеў сказаць мне ўсяго некалькі слоў: «Добра. Дзякую. Чытаю ўсё». Я не ведала, хто яго паслаў працаваць у паліцыю, з кім ён падтрымліваў сувязь, а запытацца баялася. Гэта быў смелы, мужны, добры, клапатлівы чалавек. І ў справах, і ў думках.

Антаніна Радзівонаўна атрымала заданне наладзіць сувязь з рабочымі дарожна-будаўнічай каманды, якая складалася з палякаў. Яна часта заходзіла да іх. І кожны раз пасля яе наведвання ў казармах знаходзілі лістоўкі з паведамленнямі аб перамогах Чырвонай Арміі на фронце, аб мужнай барацьбе польскага народа за сваё вызваленне.

Вопытная разведчыца не толькі выконвала ролю сувязной. Яна стварыла падпольную групу школьнікаў,

якія дапамагалі ёй у арганізацыі дыверсій.

З данясенняў партызанскай разведчыцы-сувязной А. Р. Зелянковай

«Уважаемая Лидия Тихоновна!

Приходи завтра, т. е. 16.11.42 г., в Чериков, будут выступать артисты из Кричева. Среди этих артистов есть наши советские пленные, молодые ребята. Возможно передашь как-либо товарищам, и они сумеют проникнуть в Чериков на этот вечер.

15.11.42 г. С приветом Тоня»

«Лида!

Завтра черные вороны (т. е. полиция) будут ехать в направлении Краснополья. 15 машин. Все вооруженные. С передней и задней машины по пулемету. Среди немцев будет человек 15 (сыщиков-собак тоже и полицаев). Поэтому пусть отряд будет осторожнее. Желаю успехов. Я». На адвароце прыпіска: «Листовки, брошюры раздала коекому... Там они пойдут дальше. Письмо Соколовскому отдала. Пока молчит. Я сама за его боюсь. Что он мне ответит и что меня ждет, не знаю. Все».

Дзякуючы гэтым разведданым калона паліцаяў і немцаў была разгромлена.

«Тихоновна!

Немцы, собаки и частично полицаи собираются, вернее выезжают на партизан в направлении к Пропойску. В Чериков ждут прибытия много немцев, но как будто не на подкрепление, а на отдых, это остатки разбитых частей с фронта. В Черикове среди немцев и полицаев очень большое волнение. Ганс отправил жонку домой. Все».

«Тов. Копелева! Полицаи выехали в количестве 14 машин. Направление Кричев — Чаусы, на партизан. 14/8 и 15/8 шесть машин выехали з полицией на Оршу. Массовый отпуск немцев домой в отпуск. Но в Черикове немцы еще есть. Есть в Пильне, Веприне, Краснополье. Будьте бдительны, готовится крупное наступление на партизан со всех сторон: Кричев, Краснополье, Пропойск, Гомель, Чаусы. Хотят окружить лес. Будьте подготовлены и осторожны. Ожидают новых танков».

На адвароце лістка (вокладка кнігі): «Срок нападения не могу точно узнать. Есть решение фельдкамендатуры сжечь Лобановку и Шароевку. Часть лошадей с Лобановки немцы угнали в Чериков. Аркадий и Василий еще живы, но в слабом состоянии. Я была на днях в Кричеве, всего два часа. В Кричеве массовый угон населения, но и массовый уход населения в лес. При встрече больше что расскажу».

Аднойчы яна атрымала ад маці настаўніцы Лідзіі Ціханаўны Копелевай 150 лістовак з прыпіскай: «Неадкладна распаўсюдзіць!». «Як гэта зрабіць?» — думала яна з трывогай. Тады ў яе часта бывалі вучні і часцей за другіх — падлеткі Толя Поклад і Лёня Пілат. Яны заўважылі заклапочанасць Зелянковай і спыталі:

— Што ў вас здарылася, Антаніна Радзівонаўна?

Настаўніца расказала ім пра лістоўкі, і хлопцы дапамаглі ёй выканаць заданне. Яны падзялілі горад на ўчасткі і пайшлі распаўсюджваць лістоўкі. Вылазка прайшла паспяхова. Неўзабаве насельніцтва Чэрыкава ўпершыню даведалася пра навіны на франтах. Пасля гэтага Зелянкова з дапамогай сваіх сувязных часта распаўсюджвала лістоўкі ў горадзе і вёсках.

Самыя розныя заданні атрымлівала Антаніна Радзівонаўна ад партызанскіх атрадаў.

Пад мянушкай «Леля»

У ноч з 22 на 23 лютага 1942 г. у дзверы школы моцна пастукаліся. Праз грукат чуваць была нямецкая гаворка і лаянка. Ліхтарыкі, як воўчыя вочы, гляделі ў вокны. Дзверы адчыніліся.

— Ты Валянціна Цітовіч?

Яна не паспела адказаць. Эсэса-

вец груба пхнуў яе і ўвайшоў у кватэру. Валянціну і яе маці Лідзію Восіпаўну паставілі тварам да сцяны і загадалі трымаць рукі на патыліцы. Прачнуўся і заплакаў малы сын Валянціны. Яго кінулі к нагам жанчын і не дазволілі ўзяць на рукі.

Пачаўся вобыск. Эсэсаўцы ўчынілі сапраўдны пагром: школьную і Валіну бібліятэкі, наглядныя дапаможнікі, геаграфічныя карты знеслі ў адзін з класаў і падпалілі. Старую маці з унукам выгналі на вуліцу, а Валянціну Якаўлеўну павялі з сабой.

Хто ж такая была Валянціна Цітовіч? Рыхтуючыся да падпольнай работы, райкам падбіраў сувязных, явачныя кватэры, ствараў ядро будучага партызанскага атрада. Валянціна Якаўлеўна Цітовіч, настаўніца Зябенскай школы Чэрыкаўскага раёна, адмовілася эвакуіравацца і дала згоду супрацоўнічаць з партызанамі, уступіць кватэру для явак.

Нямецка-фашысцкія захопнікі акупіравалі тэрыторыю раёна і пайшлі на ўсход, а ў тыле ворага разгаралася партызанская барацьба. Валянціну ўжо не задавальняла роля гаспадыні явачнай кватэры. Яна імкнулася да актыўнай дзейнасці. У партызанскі атрад яна пайсці не магла. На яе ўтрыманні былі маленькі сын і маці. У канцы чэрвеня 1941 г. Валянціна стала партызанскай сувязной-разведчыцай. Яе падпольная мянушка «Леля». Валянціна выконвала небяспечныя і цяжкія заданні, якія патрабавалі кемлівасці і велізарнай мужнасці.

Пры воласці немцы стварылі паліцэйскі ўчастак. Не заўсёды падпольшчыкі маглі сустракацца асабіста. На ўзлеску, які прымыкаў да в. Зябень, наладзілі «паштовую скрынку». Для гэтага скарысталі дупло старой асіны. Такі тайнік быў добры летам і восенню. Зімой ён не прыгодны, дэмаскавалі сляды. Але і тут

В. Я. Цітовіч.

знайшлі выхад, наладзілі яго ў кармакухні на былой калгаснай ферме. «Леля» апускала туды свае данясенні і там жа знаходзіла для сябе чарговае заданне. А калі неабходна было тэрмінова сустрэцца, яна падавала сігнал — вывешвала каляровы халат на вяроўку, як бы для прасушкі.

Валянціна Якаўлеўна хадзіла на заданні ў Чэрыкаў і Крычаў, у вёскі, дзе знаходзіліся гарнізоны праціўніка ці паліцэйскія ўчасткі, дастаўляла звесткі аб ворагу, распаўсюджвала лістоўкі.

Падпольны райкам уладкоўваў сваіх людзей на пасады бургамістраў, старастаў у вёсках, пасылаў у паліцыю. З дапамогай Валянціны бургамістр Зябенскай воласці стаў працаваць на партызан.

«Леля» была асцярожнай, але дзейнічала смела і рашуча. Аднойчы ў школу знянацку наляцелі паліцаі. На стале ляжала лістоўка, якую прынеслі партызаны. Валянціна не разгубілася — прыкрыла лістоўку нямецкай газеткай «Новый путь», якая друкавалася на рускай мове. Паліцаі шукалі двух партызан-разведчыкаў, якіх прыкмецілі, калі тыя ішлі з лесу да школы. Яны абшарылі ўсю школу, злазілі на гару, а партызаны стаялі за кніжнай шафай у пакоі Валянціны.

Неяк Валянціна вярталася з Чэрыкава. У вёсцы Вепрын яе затрымалі. У той час немцы шукалі дэсантную групу лейтэнанта Плотніка-

Мемарыяльная дошка, устаноўленая на будынку школы ў в. Зябень.

ва. Хапалі ўсіх, мужчын і жанчын. Перш чым схапілі Валянціну, яна паспела знішчыць кампраметуючыя дакументы. Пакінула толькі «аўсвайс». Пяць дзён яе пратрымалі ў халоднай лазні, здзекаваліся на допытах, патрабавалі прызнання. З сінякамі і кровападцёкамі вярнулася яна дамоў. Вызваліць Валянціну дапамог бургамістр Зябенскай воласці, які супрацоўнічаў з партызанамі. Ён сабраў подпісы аднасяльчан, якія сцвярджалі, што настаўніца лаяльна адносіцца да «новага парадку». Допыт і пабоі не спужалі Валянціну, не аслабілі волю да барацьбы. Яна яшчэ актыўней узялася за вельмі патрэбную партызанам работу.

У канцы верасня 1941 г. камандаванне партызанскага атрада вырашыла зрабіць налёт на мястэчка Краснаполле. Карты Краснаполля ў партызан не было. Не ведалі яны, колькі фашыстаў знаходзіцца ў мястэчку і якое ў іх узбраенне, дзе размешчана камендатура, раённая ўправа, казармы, пасты і агнявыя кропкі. На гэтыя і іншыя пытанні партызаны чакалі адказу.

У Краснаполлі сувязных не было. Каго паслаць? Патрэбен смелы і вопытны чалавек. Выбралі Валянціну Якаўлеўну Цітовіч. Яна ўжо не раз паспяхова выконвала самыя адказныя заданні. Валянціна з ахвотай згадзілася. Яе дэтальна праінструктавалі, пропуск дасталі праз зябенскага бургамістра.

У мястэчка Валянціна паехала з сувязным з в. Фёдараўка. Вечарам сувязны вярнуўся і паведаміў, што жанчыну (імя і прозвішча Валянціны ён не ведаў) паспяхова даставіў на месца. У Краснаполлі Валянціна Якаўлеўна спынілася ў знаёмай настаўніцы, якая была сапраўднай сяброўкай і патрыёткай. Удваіх яны абхадзілі ўсё мястэчка, аб усім даведаліся і падагулілі даныя разведкі. Валянціна выдатна выканала баявое заданне. Вярнулася жывой і здаровай. А праз два дні партызаны разгромілі раённую ўправу і казарму паліцаяў. У паспяховым правядзенні баявой аперацыі была вялікая заслуга Валянціны Якаўлеўны Цітовіч.

Здарылася так, што ў кастрычніку батальён эсэсаўцаў знянацку акружыў партызанскі атрад. У лес карнікаў на досвітку прывялі здраднікі з в. Манастырок Лебедзеў і Барысаў. У тую раніцу загінула многа народных мсціўцаў, у тым ліку і сакратар падпольнага райкама ЛКСМБ Надзя Слюнькіна. Атрад вымушаны быў адысці ў Хоцімскі, а затым у Кляцянскі раён. Падпольны райкам і камандаванне атрада не змаглі абвясціць усіх сваіх сувязных аб часовым адыходзе з раёна. Валянціна пачала ствараць падпольную антыфашысцкую арганізацыю. Падпольшчыкі раздабылі дэтэктарны радыёприёмнік, слухалі Маскву, перапіс-

валі зводкі Саўінфармбюро і распаўсюджвалі сярод насельніцтва.

Фашысцкія ўлады адбіралі ў насельніцтва цёплыя рэчы. «Бліцкрыг» праваліўся. Стала зусім холадна. Салдатаў трэба было адзець у цёплае абмундзіраванне. Зябенская падпольная антыфашысцкая арганізацыя, якой кіравала Валянціна Цітовіч, прызывала насельніцтва хаваць цёплыя рэчы, прадукты, жывёлу, нічога не даваць ворагу. Маці Валянціны, Лідзія Восіпаўна, актыўна дапамагала дачцэ, пякла хлеб для партызанаў. Дзейнасць падпольшчыкаў не спынялася.

Ядром арганізацыі сталі В. Я. Цітовіч, Мікіта Паплыка, Іван Саўчанка і Міхаіл Сакалоў. Яны дзейнічалі вельмі смела і нярэдка забывалі аб канспірацыі. Гэта і стала прычынай правалу. У ноч на 23 лютага 1942 г. разам з Валянцінай былі арыштаваны Паплыка, Саўчанка і Сакалоў. Восем дзён яны знаходзіліся ў засценках гестапа. Восем дзён нечалавечых катаванняў і здзекаў. Восем дзён страшэнных пакут. Валянціна і яе сябры нічога не сказалі, нікога не выдалі.

2 сакавіка 1942 г. змучаную, змардаваную, апранутую ў падранае паліто Валянціну Якаўлеўну разам з іншымі павезлі за р. Сож па дарозе ў в. Гронаў. Іх жывымі кінулі ў роў. Прагучала аўтаматная чарга...

Так загінула бясстрашная партызанская разведчыца, беспартыйная настаўніца Валянціна Якаўлеўна Цітовіч.

З ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б АБ МЕРАХ ПА ПАЛЯПШЭННЮ СУВЯЗІ І КІРАЎНІЦТВА ПАДПОЛЬНЫМІ ПАРТЫЙНЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ І ПАРТЫЗАНСКІМІ АТРАДАМІ БЕЛАРУСІ

31 студзеня 1942 г.

В связи с приближением фронта к территории Белорусской республики и необходимостью улучшения руководства и связей с подпольными партийными организациями и партизанскими отрядами ЦК КП(б)Б постановляет:

Поручить тов. Калинину организовать связь с подпольными областными и районными партийными организациями. Кроме связи, через посылаемых работников использовать рации, забросив их вместе со связными в районе Гомель, Чечерск, Узда, Калинковичи, Орша, Сиротино, Чериков, обеспечив связных явками, организовав через Разведуправление РККА обеспечение посылаемых ЦК КП(б)Б в тыл врага радистов соответствующими кодами, шифрами, а также прием передач на свои радиоприемники и передачу полученных шифровок ЦК КП(б)Б.

Предложить всем подпольным партийным организациям областей и районов широко развернуть среди населения агитмассовую разъяснительную* работу о победоносном наступлении Красной Армии... Активизировать работу всех партизанских отрядов. Используя имеющееся оружие, создать новые партизанские отряды, уничтожать живую силу и технику отступающего противника, взрывать мосты, полотно железных и шоссейных дорог, связь, базы с горючим, продовольствием.

Бюро ЦК КП(б)Б Белоруссии обращает внимание подпольных партийных организаций на возможность использования, после тщательной проверки, в партизанских отрядах бойцов Красной Армии, оставшихся в окружении, а также военнообязанных, которые не были своевременно отмобилизованы и уведены в глубь страны.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1967. Т. 1. С. 139—140.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА № 720

Начальнику Белорусского штаба партизанского движения тов. Калинину

* Слово «разъяснительную» приписано чернилами.

Итоговый доклад партизанского отряда № 720, вышедшего из тыла противника 1-го октября 1943 г. после освобождения района действий [Чериковского] частями Красной Армии

Партизанский отряд № 720 организовался 8-го октября 1942 года в Кировском районе Могилевской области по инициативе капитана т. Тарасевича Ф. С., ст. политрука т. Храмовича Г. А., лейтенанта т. Курпаченко Я. А., мл. политрука т. Федорова Н. П. из двух групп при следующих обстоятельствах.

В июле 1942 года из Клического района вышел из окружения партизанский отряд № 620 им. Чапаева. Командир отряда лейтенант т. Михолап М., комиссар отряда ст. политрук т. Храмович Г. А. При продвижении отряда далее на восток в Краснопольском районе 15 сентября 1942 года от отряда № 620 отделилась группа в количестве 22 человека: командир группы капитан т. Тарасевич Ф. С., комиссар группы, комиссар отряда № 620 ст. политрук т. Храмович Г. А.

2-го октября 1942 года группа капитана т. Тарасевича встретилась в Быховском районе «Хачинского леса» около д. Дабужа с группой лейтенанта т. Курпаченко и договорились на совместное движение в Кличевский район для получения дальнейших указаний от Кличевского оперативного центра. В пути следования обе группы объединились в отряд, присвоив ему № 720. Отряд возглавили: командир отряда капитан т. Тарасевич Ф. С., комиссар отряда ст. политрук т. Храмович Г. А., зам. командира отряда лейтенант т. Курпаченко Я. А., начальник штаба мл. политрук т. Федоров Н. П. В дальнейшем в руководстве отрядом № 720 произошли изменения: 20 февраля 1943 года приказом Кличевского оперативного центра командир отряда № 720 капитан т. Тарасевич Ф. С. освобожден от занимаемой должности и назначен командиром 8-й Рогачевской бригады. Командиром-комиссаром отряда № 720 назначен комиссар отряда ст. политрук т. Храмович Г. А. 1-го марта 1943 года начальник штаба отряда № 720 мл. политрук т. Федоров Н. П. был переведен на должность комиссара отряда № 720 решением Могилевского подпольного обкома КП(б)Б. Начальником штаба назначен капитан т. Викторенко А. М. 8-го августа 1943 года командир отряда № 720 ст. политрук т. Храмович Г. А., являясь одновременно секретарем Чериковского райкома КП(б)Б, от должности командира отряда № 720 освобожден. Командиром отряда № 720 назначен мл. политрук т. Жмуровский П. У. 14-го августа 1943 года начальником штаба отряда № 720 назначен лейтенант т. Топилин В. П.

В начале организации, партизанский отряд № 720 состоял из 44 человек, с 8-го октября 1942 года по 1-е января 1943 года вырос до 100 человек. С 1-го января 1943 года до 1-го июля 1943 года до 200 человек. С 1-го июля 1943 года до 1-го сентября 1943 года до 297 человек. В момент выхода из тыла отряд насчитывал 297 человек. Кроме того, отряд имел 88 человек перебежчиков из полиции и других немецких формирований, не вошедших в списки партизан, а сохранившиеся при отряде для передачи Красной Армии и органам НКГБ.

При выходе из тыла противника отряд № 720 соединился с Красной Армией без 3-й роты, которая будучи на задании по сохранению урожая 1943 г. и населения от угона в немецкое рабство находилась в северной части района за р. Сож, не смогла выйти из тыла, а отошла глубже в тыл врага.

Общий состав отряда, вышедшего из тыла, составлял 200 человек, из которого 98 человек переданы в ряды Красной Армии (50-я армия).

Создавался отряд № 720 преимущественно из местного населения, которого было в отряде 228 человек и окруженцев, которых было в отряде 42 человека.

За боевые действия представлено было к наградам 63 партизана.

В начале организации отряд имел вооружение: пулеметов станковых ДС 1, пулеметов ручных 6, винтовок 35, автоматов 2, револьверов и пистолетов 8.

При выходе из тыла и соединении с частями Красной Армии без 3-й роты имелось вооружения в отряде: пулеметов станковых 4, пулеметов ручных 14, винтовок 206, автоматов 9, минометов 50 мм 1, револьверов и пистолетов 22.

Оружие и боеприпасы добывали в лесах, оставленное Красной Армией в 1941 году и в боях. Взято у врага патронов 25 000, мин и снарядов 70 штук. Кроме этого разыскано в лесах взрывчатого вещества (тола) 200 килограммов и 50 000 патронов, оставленных Красной Армией в 1941 году. От Белорусского штаба партизанского движения оружия и боеприпасов отряд не получал. Материальное обеспечение отряда производилось исключительно за счет изъятия продуктов и обмундирования у полицейских, бургомистров и других немецких служак, а также за счет трофеев, захваченных у противника. Заготовка продуктов производилась путем выезда отдельных групп на хозяйственные и боевые операции.

За время существования отряда в результате проведения боевых действий и диверсий уничтожено: немцев 205, предателей, полиции и других немецких служак 169. За это же время на сторону отряда перешло полицейских и изменников из частей РОА 112 человек. Всего было проведено боевых операций по разгрому вражеских гарнизонов 7, устроено засад 6, проведено диверсий 15, выходов на появляющегося противника по захвату им урожая 2, выходов на рельсовую войну 2.

Характерные боевые операции:

1. Организация крушения вражеского эшелона на железной дороге Могилев — Рогачев 11 ноября 1942 года. Диверсионная группа под командованием зам. командира отряда лейтенанта т. Курпаченко Якова Аксеновича в количестве 8 человек продвигалась к месту, намеченному для подрыва вражеского эшелона на железной дороге Могилев — Рогачев на участок между 15-м разъездом и ст. Золотое Дно. Дорога сильно охранялась. На перегоне выставлен патруль. Кроме патрулей в бункерах, построенных на каждом километре, находилось до 10 фрицев, которые освещали полотно железной дороги ракетами и прекращали освещение при появлении поезда. Смелые диверсанты обманули бдительную охрану врага. Приготовив заряд и мину с часовым механизмом, они подошли к полотну железной дороги и залегли на близком расстоянии. В 2 часа прошел патруль, а через 20 минут стал приближаться поезд. Минер т. Шмыдов К. Я. и лейтенант т. Курпаченко Я. А. стремительным броском достигают полотна железной дороги, ставят мину и отбегают в выбранное заранее укрытие. Шум поезда заглушает действия диверсантов, а взрыв, последовавший через 10 минут после постановки мины, грохот валющихся под откос вагонов и вопли фрицев дали возможность партизанам отойти в лес. Вражеский эшелон с живой силой спущен под откос 8-ю килограммами тола. Подорван паровоз, уничтожено 5 вагонов, свыше 150 фрицев убито и ранено.

2. Разгром вражеского гарнизона в д. Чудяны Чериковского района 20 сентября 1943 года.

В д. Чудяны немцы создали сильно укрепленный гарнизон полиции. Во главе полиции был заядлый изменник. Фамилия неизвестна. Фашисты наградили его двумя железными крестами за образцовую службу. Существование укрепленного гарнизона в д. Чудяны давало возможность немцам контролировать дорогу Климовичи — Чериков, обеспечивало накопление сил для борьбы с партизанами, а главное, грабить и угонять население в Германию из близлежащих деревень. Из д. Чудяны совершались частые налеты полиции и немцев на леса, находящиеся поблизости к д. Чудяны, что не давало возможности дислоцироваться в них партизанам. Командование отряда № 720 решило совместно с отрядом № 47 уничтожить укрепленный гарнизон д. Чудяны. Казарма, в которой находился гарнизон, была обнесена двойной стеной толщиной до метра каждая, высотой в два метра, снабженной амбразурами и ходом сообщения между стенами. По углам внешней стены имелись дзоты с обстрелом по фронту и флангам. Состав гарнизона 70 полицейских. Вооружение одна 45 мм пушка, один миномет 50 мм, один станковый пулемет, 4 ручных пулемета, 50 винтовок и 2 автомата при большом запасе боеприпасов.

Сведения об укреплениях, силе противника и его вооружении были добыты через агентурную разведку и проверены войсковой разведкой отряда № 720.

Разгромом гарнизона д. Чудяны преследовалась цель уничтожения опорного пункта немцев, при помощи которого они проводили карательные налеты. Операция планировалась к исходу ночи, на рассвете. Отряд № 47 в составе 2-х рот имел задачу отвлечь силы противника с южной стороны укреплений, для чего в 4.00 он начал обстрел из 45 мм пушки и 2-х ротных минометов, предварительно окопавшись на расстоянии 800 метров от наружной стены укреплений. Рота отряда № 720 подползла к укреплениям до открытия огня с северной стороны, маскируясь, вышла на исходный рубеж для штурма укреплений и их атаки внутри. Подготовка операции и ее осуществление проходили согласно намеченному плану, разработанному по инициативе командира отряда № 720 т. Жмуровского и командира отряда № 47 т. Липкина.

В ходе боевых действий создалась благоприятная обстановка для выполнения операций. После короткого обстрела из пушки и минометов враг в панике начал бежать. Начальник полиции подорвался на мине, поставленной полицаями для борьбы с партизанами. И только помощник начальника полиции с 2-мя полицейскими отстреливались в течение 3—5 минут из одного автомата и 2-х винтовок. Ответным огнем они были уничтожены. Казарма и дзот были взорваны и сожжены.

Убито 4 полицейских. Остальные разбежались. Захвачен 1 станковый пулемет, 3 ручных пулемета, 20 винтовок, 1 миномет и свыше 15 000 патронов. Кроме этого, в качестве трофеев достался склад с зерном 6 тонн, предназначенным для увоза в Германию. Сдались в плен 20 полицейских с оружием. Потерь отряды не имели.

Отряд № 720 задания по взрыву путей на железной дороге не имел, однако решил принять участие в рельсовой войне, совместно действуя с отрядом № 47 в операции 3-го августа 1943 года на железной дороге Кричев — Климовичи.

Движение к месту операции отряд проводил скрытно, только ночью, обходя расположенные по пути следования гарнизоны. Партизанам, участвующим в операции, пришлось более чем полутора суток находиться без пищи, форсировать болото протяжением более 3-х километров, находясь по пояс в воде. Для руководства операцией было создано объединенное командование из комиссара отряда № 720 т. Федорова Н. П., комиссара отряда № 47 т. Калимулина В. В. и командиров рот из отряда № 720 т. Жмуровского и из отряда № 47 т. Липкина.

Пройдя весь путь с большими трудностями, роты добрались к железной дороге необнаруженными противником. Заранее распределили силы для обстрела будок охраны железной дороги, по организации охраны на направлениях вероятного подхода противника и проведения взрывов. Рота отряда № 720 имела задачу взорвать 120 рельс, блокировать две будки охраны и организовать засаду для прикрытия групп на железной дороге со стороны ст. Климовичи.

Подразделения и группы своевременно заняли свои места и по единому сигналу вступили в схватку с охраной железной дороги. Противник от внезапного удара пришел в замешательство и панически бежал со своих постов, не произведя ни единого выстрела. Подрывники четко и быстро заложили взрывчатку и начали взрывы. Задание было выполнено полностью и без потерь. Отряд № 720 взорвал 120 рельс, две кирпичные будки охраны и 40 вагонов порожняка, находившегося на разъезде Михеевичи. Благодаря четким действиям подразделений и групп разведки местности и внезапности противник понес большие потери...

Разведывательная работа в отряде проводилась исключительно с целью получения данных о противнике, его расположении и передвижении. Она осуществлялась при помощи войсковой разведки. Агентурная разведка проводилась развед. подразделением оперативной группы при Чериковском райкоме КП(б)Б.

Печатный агитационный материал издавался в отряде. Он печатался в типографии соседних по месту расположения отряда. С июня месяца 1943 г. по 1-е октября 1943 года выпускались ежедневные листовки со сводками Совинформбюро. Выпущено 5 листовок с обращением к населению по вопросам спасения населения от угона в Германию, сохранения урожая 1943 г., разоблачения бандитских действий немецких и полицейских палачей; с призывом к населению развертывания партизанской борьбы с отступающим противником и по другим вопросам. В отряде регулярно, один раз в неделю, выпускалась печатная газета, которая использовалась среди партизан и населения.

Командир партизанского отряда № 720
мл. политрук Жмуровский

Комиссар п[артизанского] о[тряда] № 720 Федоров

Начальник штаба лейтенант Топилин

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 4, спр. 107, л. 1—7.

Вяселле не адбылося

Аляксей Васілевіч Пядухаў нарадзіўся ў 1920 г. у в. Сухія Гаі Варонежскай вобласці. З сялян. Службу у Чырвонай Арміі праходзіў у Віцебску ў 56-м артылерыйскім, потым у 18-м казачым палку.

З першых дзён вайны Аляксей Пядухаў удзельнічаў у бесперапынных, цяжкіх баях. Некалькі разоў трапляў у акружэнне, выходзіў з яго, зноў змагаўся з ворагам. Многія яго таварышы па службе загінулі ў міжрэччы Сожа і Проні. Мала хто ўцалеў. Параненых фашысты дабівалі.

Пядухаў таксама быў паранены і да глыбокай восені хаваўся ў лесе. Стаў партызанам, разведчыкам, ка-

мандзірам аддзялення.

У красавіку 1943 г. 720-ы партызанскі атрад, у якім змагаўся Пядухаў, пайшоў з Клічава ў напрамку Чэрыкава. У мястэчку Ціхінічы Рагачоўскага раёна ў атрад павінны былі ўліцца сілком мабілізаваныя немцамі паліцаі. На гэтае заданне накіравалі ўзмоцнены ўзвод з разведчыкамі.

Здарылася непрадбачанае. У нядзелю адзін з паліцаяў наладзіў пышнае вяселле. Камандаванне атрада прыняло рашэнне: бою не пачынаць, вяселле не разганяць, а з'явіцца пад выглядам гасцей, забраць тых, хто пойдзе ў атрад, і знішчыць здраднікаў. Разведчыкі надзелі на рукавы белыя павязкі, як у паліцаяў, і накіраваліся ў мястэчка. Прыкрываць іх на агародах застаўся ўзвод партызан.

У той дзень варту неслі паліцаі, што рыхтаваліся перайсці да партызан. Абмяняўшыся паролямі, разведчыкі ўвайшлі ў мястэчка. Прыблізіліся к дому, дзе ішло вяселле. Партызаны, што заставаліся на агародах, пакінуўшы сваіх вартавых на выхадах з мястэчка, таксама накіраваліся туды. Вяселле было ў разгары, самагон ліўся ракою, гоман, гвалт. Разведчыкі спыніліся на парозе. У кутку каля печы стаялі вінтоўкі.

Убачыўшы незнаёмага паліцая, гаспадар запрасіў яго да стала, і тут жа насцярожыўся. Вызвалі падазронасць перш за ўсё зброя і адзенне Пядухава. У яго быў трафейны нямецкі аўтамат, а паліцаю, нават старшаму ў воласці, насіць такую зброю не дазвалялася. Значыць, гэта высокае начальства, але абмундзіраванне не начальніцкае: звычайнае, не па форме, адзенне, якое насілі вясковыя паліцаі.

Учуў няладнае і начальнік валаснога паліцэйскага ўчастка. Ён падаў знак сваім і тыя пачалі вылазіць з-за

А. В. Пядухаў.

стала. Пядухаў хутка сцяміў і скамандаваў:

— Ні з месца! Рукі ўверх!

Некалькі паліцаяў, што сядзелі бліжэй да парога, кінуліся да зброі. Але было позна. На іх глядзелі ствалы аўтаматаў і вінтовак. Начальнік валасной паліцыі, які сядзеў на ганаровым месцы, побач з жаніхом і нявестай, выскачыў у акно, але адразу ж трапіў у рукі партызан. Усіх паліцаяў узялі без адзінага выстралу. Жыхары мястэчка з удзячнасцю праводзілі народных мсціўцаў. Частка моладзі пайшла разам з партызанамі.

Летам 1943 г. у Чэрыкаўскім раёне дзейнічала ўжо некалькі атрадаў і брыгад. У пагранічных вёсках партызанскай зоны з'явіліся партызанскія камендатуры — своеасаблівыя заставы. Адна з такіх застаў была ў в. Бакунавічы. Камендантам яе назначылі Аляксея Пядухава. У абавязкі камендатуры ўваходзіла: весці разведку на Чэрыкаў, выдаваць туды пропускі, правяраць тых, хто прыходзіў у партызанскую зону, трымаць сакрэты на подступах да вёскі, лавіць шпіёнаў і дастаўляць «языкоў».

Служба ў камендатуры была небяспечнай. Аляксей жа і яго хлопцы лічылі яе чамусьці нуднай. На самай справе — сядзі ў сакрэце, як той вартаўнік каля свірна ці на агаро-

дзе. Ды яшчэ з гэтымі жанчынамі важдайся: адной хочацца на кірмаш у Чэрыкаў схадзіць, другой — да сваякоў ў суседнюю вёску.

Іншая справа «языкі». Аляксей і яго разведчыкі прыводзілі іх у штаб амаль кожны дзень. Каб старшыя камандзіры не сварыліся за такое празмернае захапленне, «языкоў» бралі розных. Сёння паліцая прывядуць, праз дзень карніка-эсэсаўца, затым афіцэра ці радавога немца. Аднойчы ўзялі адразу траіх: нямецкага лейтэнанта, унтэр-афіцэра і радавога — шафёра з матацыклам.

Было гэта так. Алёша з Пятром Натычкам паехалі вярхом на конях правяраць сакрэты. Непадалёку ад бальшака Чэрыкаў — Вепрын яны спешыліся, коней пакінулі ў ельніку, а самі пайшлі к дарозе. Там у сакрэце ляжалі Мікалай Рыбакоў і Аркадзь Садоўскі. З боку в. Вепрын, дзе стаяў нямецкі гарнізон, пачуўся шум матацыкла. Хутка ён застракатаў побач на дарозе і спыніўся. Немцаў было трое. Яны, пэўна, лічылі гэта месца бяспечным, інакш малой групай не паехалі б.

З каляскі вылез лейтэнант і пайшоў у лес, якраз туды, дзе ляжалі партызаны. Аляксей і Пётр падкраліся ззаду і павалілі афіцэра на спіну, шапкай заткнулі яму рот, падцягнулі штаны, звязалі рукі і ногі і занеслі далей у кусты. Аркадзь застаўся з афіцэрам, а трое вярнуліся да бальшака. Прайшло мінут дзесяць. Салдат пачаў сігналіць. Унтэр-афіцэр памкнуўся ісці ў лес, але перадумаў, нешта сказаў салдату. Той пачаў сігналіць гучней і працяжней.

Хлопцы глядзелі на Аляксея. Чаго ён чакае? Даць бы чаргу з аўтамата па немцах і айда! Але ў Алёшы быў іншы план. Добра было б захапіць жывымі ўсіх траіх, разам з матацыклам.

Унтэр-афіцэр не вытрымаў, сышоў з дарогі і пачаў прабірацца праз прыдарожны хмызняк. Як толькі ён выйшаў з хмызняку, хлопцы схапілі яго, заткнулі рот і звязалі. Матацыкліст, пэўна, пачуў шорах і насцярожыўся, але хутка супакоіўся. Партызаны выскачылі на дарогу і скамандавалі:

— Хэндэ хох!

Салдат паспрабаваў завесці матацыкл, ды не паспеў. Алёша вельмі хацеў прыехаць у штаб на матацыкле, але ўсе не маглі размясціцца на ім. Машыну прыйшлося знішчыць. Палонных прывялі на заставу ў Бакунавічы.

Пядухава і яго аддзяленне разведчыкаў перавялі на сакрэтную заставу на бальшак Чэрыкаў — Краснаполле. Тут Аляксей з сябрамі-разведчыкамі летам 1943 г. праяўляў сапраўды партызанскую знаходлівасць і адвагу. Не было такой ночы, каб яны не абстралялі які-небудзь фашысцкі гарнізон — у Вепрыне, Чудзянах ці ў Чэрыкаве. Яны вялі, па сутнасці, вайну нерваў. Не давалі гітлераўцам спакою ні днём, ні ноччу.

Аднойчы на бальшаку Чэрыкаў — Краснаполле Алёшу ўдалося, і не першы раз за яго баявую дзейнасць, сутыкнуць паміж сабой праціўніка. Немцы і паліцаі суправаджалі абоз, які накіроўваўся ў краснапольскі гарнізон. Партызаны-разведчыкі раздзяліліся на дзве групы. Адна завязала бой з аховай абозу. На дапамогу ахове з гарнізона, што стаяў у в. Пільня, немцы выслалі падраздзяленне салдат, каля сарака чалавек. Другая група партызан абстраляла гэта падраздзяленне. Кароткімі перабежкамі немцы пайшлі ў наступленне. Варожыя групы збліжаліся. Партызаны непрыкметна адышлі за балоцістую рачулку Рэкту, а немцы распачалі бязлітасны бой паміж сабою. Страты неслі абодва бакі. Ахове абозу не было куды адступаць, а гітлераўцы з пільнянскага гарнізона спрабавалі акружыць

яе і знішчыць. Доўга б яшчэ біліся паміж сабой немцы, калі б не прыйшло падмацаванне з Чэрыкава. Толькі тады разабраліся, што ваявалі са сваімі.

У другі раз Алёша прапанаваў узарваць мост на балоцістай рэчцы Сянна, прытоку Сожа. Мост знаходзіўся каля в. Пільня, дзе размясціўся варожы гарнізон. Узарваць мост ён вырашыў сярод белага дня, на вачах у праціўніка, з дапамогай замініраванага плыта. Ноччу да моста падысці нельга — немцы высеклі ўвесь хмызняк уздоўж ракі і з наступленнем цемнаты ўзмоцнена пускалі асвятляльныя ракеты. Вырашылі падвесці плыт да моста на адлегласць прыкладна сто метраў, затым пусціць яго па цячэнню.

У лесе змайстравалі плыт з чатырох бярвён, перавязалі іх лазняком. На плыт палажылі кілаграмаў дваццаць толу ды яшчэ столькі ж аманалу. Уставілі два ўзрывальнікі, да іх прымацавалі дзве жэрдкі з такім разлікам, што калі адна жэрдка не закране сваю, то другая закране насціл моста. Паміж жэрдкамі ўмацавалі велізарны партрэт Гітлера, аблажылі яго яловымі лапкамі, паабкручвалі чорнымі анучамі, якія імітавалі жалобны крэп. Збудаванне назвалі «яхтай фюрэра», хаця нехта прапанаваў назваць «катафалкам Гітлера».

Самым цяжкім і небяспечным было вывесці «яхту» на сярэдзіну ракі. За гэту справу ўзяўся Пядухаў. Ён раздзеўся і, штурхаючы перад сабой плыт, пагнаў яго па цячэнню ракі. Калі з-за павароту паказаўся мост, Алёша нырнуў і паплыў да берага пад вадой.

Вартавыя, убачыўшы плыт, які павольна набліжаўся да іх, схапіліся было за зброю. Але, заўважыўшы партрэт Гітлера, апусцілі рукі. Як страляць па фюрэру. Праўда, існаваў строгі і ясны загад — страляць па ўсім, што будзе рухацца да моста. Але на інструктажы ніхто не гаварыў, як быць, калі паплыве партрэт Гітлера. Страляць без загаду? Няма дурняў. За Гітлера не даруюць. Вартавыя далі сігнал трывогі. Як толькі начальнік каравула з салдатамі дабеглі да сярэдзіны моста, прагучаў магутнай сілы ўзрыў.

На наступны дзень з Чэрыкава прыбыла спецыяльная камісія, каб расследаваць абставіны ўзрыву моста. Але следства нічога не дало — сведкаў не засталося.

Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў кастрычніку 1943 г. Пядухаў чатыры месяцы змагаўся ў знішчальным батальёне на Чэрыкаўшчыне. Пасля пайшоў у армію. Служыў разведчыкам у гвардзейскім мінамётным палку. Двойчы быў паранены. Закончыў баявы шлях у Германіі. Узнагароджаны двума ордэнамі і некалькімі медалямі. У 1946 г. дэмабілізаваўся, вярнуўся на радзіму. Працаваў машыністам у дэпо.

Бой ля Пільні

На лясной дарозе паміж Чэрыкавам і Пільняй 720-ы і 721-ы атрады і атрад М. Т. Перапечкіна зрабілі засаду. Сядзелі доўга, але праціўнік не паяўляўся. Атрады зняліся і перайшлі бліжэй да в. Галынец на той жа дарозе, але ўжо паміж Пільняй і Краснаполлем. Выставілі заставу каля леснічоўкі Невіцкай. Ад камандзіра аддзялення разведкі Аляксея Пядухава паступіла данясенне, што падраздзяленне праціўніка, магчыма разведка, асцярожна рухаецца па дарозе на Пільню з другога боку. Уперадзе — некалькі сялянскіх павозак — свайго роду мінашукальнікі.

Пераходзіць на старое месца не было часу. Разведчыкам было загадана ў бой не ўступаць і, калі фашысты будуць мяняць асабісты сас-

таў гарнізона ў Пільні, не перашкаджаць. Гарнізон Пільні павінны змяніць, вяртаючыся з Краснаполля.

Немцы да Пільні даехалі спакойна. Там зрабілі адпачынак-прывал. Хутка ў раёне нашай засады з'явілася разведка праціўніка, ужо без сялянскіх павозак уперадзе. Засада была зроблена ў месцы, дзе дарога перасякала невялікае поле. Матацыклісты ў суправаджэнні браневіка выехалі на паляну, абстралялі ўзлескі і памчаліся далей. У гэты час разведчыкі данеслі, што ў раёне Невіцкай з'явіўся буйны партызанскі атрад, які рухаецца на захад. Гэта былі падраздзяленні арлоўскіх і бранскіх партызан. Да іх быў тэрмінова накіраваны Пётр Кубышкін, начальнік разведкі чэрыкаўскіх атрадаў. Калі камандаванне толькі што прыбыўшых атрадаў жадае прыняць удзел у баі, няхай атрады выйдуць на дарогу Невіцкая — Пільня і ўдараць па праціўніку з тылу.

Як толькі праехала разведка праціўніка, нашы падрыўнікі хутка замініравалі дарогу. Але раптам з боку Краснаполля пачуўся трэск матацыкла. Гэта ўскладніла справу. Калі матацыклы падарвуцца, асноўная калона не пойдзе без новай, больш уважлівай разведкі і бакавой аховы. Затаіўшы дыханне, мы глядзелі на дарогу. Праскочылі! Добра!

Прыскакаў сувязны ад Кубышкіна. Конь у пене. Сувязны радасна далажыў:

— Прыбыўшыя атрады прапанову прынялі. Накіраваліся ў бок Пільні.

Таксама вельмі добра! Вось толькі «рама» ўсё кружыцца над лесам. Не заўважыла б.

З боку Пільні пачуўся шум матораў. Нарэшце паказалася і галава калоны. Уперадзе танкетка з паўадчыненым люкам. Потым — аўтамашына са знятым брызентам. З машын ва ўсе бакі, як калючкі вожыка, тырчаць ствалы вінтовак і аўтаматаў. Танкетка і бронетранспарцёр ужо перасеклі поле, падыходзяць да лесу. Што такое? Няма выбуху! Так яны схаваюцца ў лясной частцы дарогі. І раптам выбух магутнай сілы страсянуў зямлю. Танкетка рванулася ўлева і замерла на месцы. Партызаны адкрылі агонь. У танкетку і бронетранспарцёр паляцелі гранаты. Яны задымілiся. Гітлераўцы пасыпаліся з машын. У гэтай частцы дарогі кюветаў няма. Ёсць маленькія канаўкі для сцёку дажджавой вады. Уцалеўшыя схаваліся пад машыны, у канаўках, і адкрылі агонь. Але, як правіла, у такіх выпадках агонь праціўніка хаатычны, беспрыцэльны. Праціўнік жа знаходзіцца пад шматслойным агнём.

Пакідаючы за сабой дымавы след, у неба ўзвіліся дзве чырвоныя ракеты. Сігнал для атакі. Нават скрозь шум бою ў хвасце калоны выразна чуецца моцны агонь. Гэта ўдарылі нашы нечаканыя памочнікі.

— Ура-а-а! — Партызаны кінуліся ў атаку. Няспынны грукат, выбухі. Гэта на аўтамашынах рвуцца боепрыпасы. Уцалеўшыя гітлераўцы падымаюць рукі. Бой працягваўся не больш паўгадзіны. Разгром поўны. Нямногім удалося схавацца. Узвод 1-й роты пад камандаваннем Вані Русакевіча, узвод 2-й роты Мішы Дубаносава і два ўзводы з атрада М. Т. Перапечкіна накіраваліся на прачэсванне лесу. Яшчэ некалькі гітлераўцаў было захоплена ў палон.

З ДЗЁННІКА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ АСОБНАГА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА № 721 У МАІ 1943 г.— ВЕРАСНІ 1943 г.

8.5.43. Заминировали шоссе Москва — Варшава у пос. Гронов, шлях Веремейки — Чериков и шлях Веремейки — Янов. Минировали Сильченко, Тидеман, уч[аствовали] Файтельсон, Ивановский, Тищенко.

Руководитель: Сильченко В. Результат: на шоссе Москва — Варшава подорвалась автомашина, убит шофер и ранен грузчик (машина с зерном).

29.6.43. Ушел на засаду взвод вместе с ротой от [ряда] 720 на шлях Чериков — Краснополье встречать обоз с продовольствием.

12.7.43. Ушла на задание группа Германов Егор, Богородов Егор, Тюлев Ефим, Чураков Игнат. Задача: минировать большак Чериков — Краснополье. Минер — Тюлев Ефим. Руководитель: Германов Е. Результат: Уничтожена автомашина, четыре немца. На другой мине подорвалась лошадь.

24.7.43. Гр[уппа] Безрученко, Карпаков, Губернаторов, Денисенко, Колесников, Москалев. Заминировали ж. д. Могилев — Жлобин в р-не 15 разъезда. Руководитель: Безрученко. Результат: спущен под откос один эшелон, выведен со строя паровоз и 17 ваг[онов].

27.7.43. Группа 11 человек убыла на засаду на шлях Чериков — Пильня. Руководитель: Тидеман. Результат: обстреляли 2 немецких автомашины. Одна выведена из строя, убито 12 немцев. Прервана связь между Чериковом и Пильней.

6.8.43. Отправлена группа — уничтожить мосты по большаку Гомель — Пропойск. Комиссар Львов, Федоров, Суходольский, Бурко. Руководитель: Львов А. Результат: уничтожено три моста, один — двенадцать метров и два по 22 метра длиной.

15.8.43. Группа Файтельсон, Тидеман, Подобед, Богородов Е., Бондарев П., Германов И., Котов убыла с заданием поймать изменников в районе дер. Пильня. Руководитель: Файтельсон, Тидеман. Результат: взят один изменник.

16.8.43. Отряд вышел по заданию взять скот с г. Черикова и встретить людей, идущих в отряд. Руководитель: Горбатый, Львов. Результат: часть людей встречена. Скот в назначенное время не выгнали.

с 18.8 по 20.8.43. Группа Безрученко, Фролов И., Марченко, Алещенко, Дударенок убыли с задачей уничтожить связь на шоссе Москва — Варшава. Руководитель: Безрученко. Результат: уничтожено девять столбов.

27.8. 43. Отправлена группа в м. Краснополье в количестве семи человек для встречи изменников, посланных в отряд связными. Руководитель: Горбатый. Результат: перешло в отряд 7 человек с оружием.

6.9.43. Группа Денисенко, Алещенко, Сивцов Ив., Игнатенко, Евменков убыла уничтожить связь на шоссе Москва — Варшава. Руководитель: Алещенко. Результат: уничтожено проволочной связи четыре пролета и восьмилинейного кабеля.

14.9.43. Первый и третий взвод убыли на выполнение правительственного задания по взрыву жел. дор. полотна в районе Климовичи и по разгрому гарнизона полиции Чудяны. Руководители: Викторенко, Файтельсон. Результат: взорвано жел. дор. полотна 3 км. Разгромили куст полиции. Взяты трофеи: пулемет, автомат, 27 винтовок, миномет ротный и 82 мины к нему, пистолет и др.

20.9.43. Убыла группа выгнать скот из деревень от немцев. Руководитель: Горбатый. Результат: скот выгнан из деревень Мирогощ, Журавель, Горки в колич. 300 голов.

27.9.43. Убыл на задание взвод с задачей обстрелять с орудий гор. Чериков, где было большое скопление противника. Руководитель: Горбатый. Результат: обстреляли гор[од]. Немцы устроили погоню за пушкой с танком и бронемашиной. Убит повозочный и пара лошадей, оставлена выведенная из строя пушка.

29.9.43. Минировали шлях Веприн — Чериков, гр[уппа] 3 чел. Результат: уничтожена одна автомашина и 4 немца.

Командир п[артизанского] о[тряда] 721 Горбатый

Комиссар п[артизанского] о[тряда] 721 Львов

Начальник штаба, техник-интендант 2 ранга Сильченко

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4279, воп. 1, спр. 2, л. 3—13.

ДАНЯСЕННЕ НАЧАЛЬНІКУ ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА № 721

Доношу до Вашего сведения, что группа партизан 721 отряда, находящаяся на территории Лобановского, Веремейковского и Горковского с[ельских] сов[етов] с 15.09.43 г. по 1.10.43 г. проделала следующую работу.

16 сентября: 1) На ст. Веремейки выведен со строя сепаратор сливкоотделителя (Протасов). 2) Отравлено 20 тонн зерна на зерноскладах ст. Веремейки (Поворов). 3) Подложено 2 английских мины к эшелону, в котором на площадках находились автомашины (Ткачев).

17 сентября: 1) Толом взорвана путь на 4 км ст. Веремеек на направлении Кричев (Дольнисков).

18 сентября: 1) Подложены 2 английских мины к эшелону с горючим (Ткачев). 2) Подложены мины в водокачке на ст. Веремейки, но они не взорвались (Иванов).

22—23 сентября: 1) В ночь на 23 взорваны колонки водокачки на ст. Веремейки (Ткачев, Иванов). 2) Подложена английская мина на ст. Веремейки около бункера с левой стороны (Ткачев).

27 сентября: 1) Разрушен мост около Нарков (5 чел.). 2) Были в засаде в лесу с 3 ч. дня.

1 октября: Встретили Красную Армию.

Морозов И. А.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4279, воп. 1, спр. 2, л. 11.

І колькі б ні прайшло часу...

З успамінаў У. У. Цідземана, былога камандзіра разведкі 721-га партызанскага атрада

Было гэта ў красавіку 1943 г. Камандаванне атрада вырашыла паслаць у разведку за р. Сож групу партызан, у склад якой увайшлі Віктар Сільчанка, Мікалай Іваноўскі, Яфім Файцельсон і я. Нам трэба было ўдакладніць абставіны ў раёне чыгуначнай станцыі Верамейкі, наладзіць там агентурную сувязь. Памятаю, выйшлі мы з в. Старынка днём. Пераправіліся каля хутара Гракі цераз Сож і падышлі да шашы Масква — Варшава. Паставілі міну і падаліся ў лес. Кругом зелянела трава, стаялі лужы, а я ў валёнках і галошах. Ногі мокрыя, ісці цяжка. Каля адной з вёсак нас абстралялі паліцаі, але праследаваць пабаяліся. Да ночы наступнага дня дабраліся да Верамеек. Пастукаліся ў дом, дзе жыў стары пчалавод, знаёмы Іваноўскага. Пазнаўшы яго, стары адчыніў дзверы, вынес хлеба, мёду. Дамовіліся, што назаўтра вечарам прывядзе на сустрэчу з намі свайго старэйшага сына, які жыве на станцыі Верамейкі. Вырашылі прыцягнуць яго да падпольнай работы. Ведаючы, што на такія сустрэчы іншы раз прыходзяць няпрошаныя госці, мы раней назначанага часу размясціліся на ўскрайку лесу і сталі сачыць за пасёлкам, садам, домам старога. Дачакаўшыся прыцемкаў, я і Файцельсон асцярожна накіраваліся ў бок дома, а Сільчанка з Іваноўскім засталіся для прыкрыцця.

У. У. Цідземан.

Убачыўшы нас, стары пчалавод пабялеў, замітусіўся, стаў тлумачыць, што сын ледзь не выдаў яго немцам, што ён не прыйдзе, таму што баіцца і немцаў, і партызан. Мы зразумелі, што для падпольнай работы патрэбна шукаць другога чалавека. У хуткім часе на станцыі Верамейкі дзейнічала падпольная камсамольска-маладзёжная група на чале з В. Ткачовым і В. Івановым.

Пайсці і не прычыніць шкоды акупантам не хацелася. Замініравалі ўчастак чыгуначнай дарогі, бальшак і вярнуліся ў атрад. Аб усім даклалі камандзіру А. М. Гарбатаму, камісару А. В. Львову, начальніку штаба В. С. Сільчанку.

У гэтыя дні ў атрад прыбывала папаўненне. Новых людзей неабходна было навучыць партызанскай справе. Мяне, як разведчыка-падрыўніка, назначылі камандзірам разведкі атрада і даручылі рыхтаваць групу падрыўнікоў.

Атрад рос. Не хапала зброі, боепрыпасаў. Навучыліся выплаўляць тол з артылерыйскіх снарадаў і мін. Гэту вельмі небяспечную работу даручылі Васілю Сівакову, ураджэнцу в. Глінь. Смелы і знаходлівы партызан-разведчык побач з в. Казакоўка абсталяваў «завод». Раздабыў невялікі чыгунны кацёл, падвесіў яго над кастром і кіпяціў у ім ваду. Перад тым, як апусціць у яго снарад ці міну, спецыяльным трымальнікам адкручвалі ўзрыванебяспечную боегалоўку. У кіпятку тол плавіўся і яго вылівалі ў падрыхтаваныя скрынкі ці проста ў выкапаныя побач невялікія ямкі, дзе тол застываў.

Узброіўшыся, мы пачалі выконваць баявыя заданні. Хадзілі на бальшак Чэрыкаў — Краснаполле, паставілі тры процітанкавыя міны на ўчастку дарогі недалёка ад Чэрыкава. Аперацыя прайшла паспяхова: падарваліся двое нямецкіх салдат. Паставілі на гэтым жа месцы процітанкавую міну. І зноў удача: падарвалася аўтамашына з пяццю фашыстамі. Нам спадабаўся гэты ўчастак дарогі. Паставілі яшчэ тры процітанкавыя міны ў шахматным парадку. У хуткім часе паказаўся нямецкі абоз, які ішоў з Чэрыкава ў Краснаполле. Абоз ішоў прама на міны. Пачуўся выбух. Параконка і трое салдат узляцелі ў паветра. Абоз спыніўся. Фашысты загадалі, каб дзве сялянскія падводы ехалі спераду. Лёгкія сялянскія падводы паспяхова праехалі замініраваны ўчастак. Але як толькі на міну наехала цяжкая ваенная павозка, зноў прагучаў выбух. Загінула яшчэ двое салдат. Верхам на кані пад'ехаў маёр і стаў крычаць на салдат. У гэты момант конь наступіў нагой на міну. Загінулі і маёр, і конь.

Аднойчы, пераправіўшыся цераз Сож каля пас. Карма Гомельскай вобласці і дачакаўшыся цемнаты, наведалі старасту. Мы ведалі ад аднавяскоўцаў, што шкоды людзям ён не робіць, абавязкі свае выконвае, як гаворыцца, з-пад палкі. Зайшлі ў будынак гарадской управы, забралі дакументы, аблігацыі і грошы, якія былі сабраны ў сялян для немцаў. Адыходзячы, я сарваў са сцяны партрэт Гітлера. Пры мініраванні дарогі загарнуў у яго адну з мін.

Мы схаваліся ў зарасніку прыдарожнага хмызняку і сталі чакаць. Было дзесяць гадзін раніцы, калі ўдалечыні паказалася нямецкая калона. Бачылі, як узарвалася першая аўтамашына, затым другая. З аўтамашын пачалі скакаць салдаты, прагучалі выбухі ад узрываў проціпяхотных мін. Калона спынілася. Паявіліся мінёры і пачалі ачышчаць дарогу. Раптам у руках аднаго з іх нешта забялела і пачуўся выбух. Гэта спрацавала міна, загорнутая ў партрэт фюрэра. Забраўшы забітых і параненых, немцы паехалі, а мы, дачакаўшыся цемнаты, узяліся за

сваю звычайную справу — мініраванне.

Важным для нас аб'ектам была в. Манастырок. Яна стаяла на беразе Сожа. У трох кіламетрах ад яе праходзіла шаша Масква — Варшава, у двух — знаходзілася в. Мірагошч, правей Чэрыкаў, дзе размясціліся нямецка-паліцэйскі гарнізон, камендатура і іншыя фашысцкія ўстановы. З Чэрыкава цераз Сож ідзе бальшак у раённы цэнтр Краснаполле, па якім часта снуюць акупанты. З в. Манастырок можна было кантраляваць становішча ў Чэрыкаве, весці разведку. Але ў вёсцы жыло некалькі сем'яў паліцаяў. Камандаванне атрада вырашыла акружыць вёску і запрасіць усіх паліцаяў на размову... Паліцаі паабяцалі больш не браць у рукі зброі. На тым іх і адпусцілі да сем'яў. А разведчыкі асталяваліся ў лесе і трымалі пад кантролем усё навакольле.

Праз сястру паліцая Дуню Шмыцікаву і жонку паліцая Фрузу Шахоўскую вырашылі завербаваць следчага гестапа Кісціна. Аднойчы ў доме Шахоўскіх, куды была запрошана Дуня, якая знаходзілася ў сужыцці з Кісціным, Гарбаты і Львоў завялі размову аб тым, што хутка прыйдуць нашы і тады здраднікам не мінуць бяды. Мы параілі Дуні падумаць і перадаць Кісціну нашу прапанову аб супрацоўніцтве.

Праз два дні яна паведаміла, што Кісцін спужаўся, баіцца, што партызаны яго заб'юць. Але пасля паўторнай размовы Кісцін завагаўся і запытаў, што ён павінен рабіць. Яму далі першае заданне: перадаць праз Дуню спіскі тайных агентаў гестапа ў Чэрыкаве і ў вёсках, а Дуні і Фрузе выдаць спецыяльныя дакументы, па якіх яны маглі б свабодна хадзіць у Чэрыкаў як яго людзі. Заданне Кісцін выканаў. Камандаванне атрада вырашыла асабіста пазнаёміцца з Кісціным, але ён доўга не згаджаўся, відаць, баяўся. Тым часам у Чэрыкаве партызаны ўзарвалі лесапільны завод і невялікую электрастанцыю. Да партызан перайшоў мясцовы доктар. У каменданцкім узводзе ўправы паявіліся жадаючыя ваяваць на баку партызан. Асмялеў і Кісцін. Даў згоду на сустрэчу, якая адбылася на лузе, што паміж вёскамі Манастырок і Мірагошч. Потым мы атрымалі ад яго шмат важных звестак. Сувязь з намі Кісцін падтрымліваў праз Дуню і Фрузу.

Але аднойчы Дуня паведаміла, што немцы пачалі сачыць за Кісціным. Ён паспеў перадаць, што яго выдаў Лутаў — бургамістр в. Мірагошч, які бачыў, як Кісцін тройчы перапраўляўся цераз Сож і прагульваўся ў бок в. Манастырок, а там партызаны. Кісцін спужаўся, не вытрымалі нервы, і ён спрабаваў застрэліцца. Толькі выпадкова застаўся ў жывых. Мы даведаліся, што ён знаходзіцца ў Чэрыкаўскім шпіталі. Вырашылі распрацаваць план рэабілітацыі Кісціна перад немцамі, а заадно разлічыцца з Лутавым. Гарбаты і Львоў склалі пісьмо на імя Лутава, у якім сардэчна дзякавалі за выкананне задання па ўзрыву электрастанцыі, лесапільнага завода і за іншыя справы, за тое, што змог скампраметаваць перад немцамі халуя Кісціна. Але як зрабіць, каб пісьмо трапіла ў рукі нямецкага каменданта. Заданне было небяспечнае і рызыкоўнае. Згадзіліся выканаць яго Дуня і Фруза. Прыдумалі такую версію: быццам у в. Манастырок у хлопчыкаў убачылі нейкую паперу. Зацікавіліся. Гэта было пісьмо Лутаву ад партызан. Сказалі хлопчыкам, што ідуць у Чэрыкаў праз Мірагошч і паабяцалі перадаць яго самому Лутаву. Дзеці згадзіліся. Некалькі разоў прарэпеціравалі ўсё і накіраваліся ў Чэрыкаў.

Жанчыны зрабілі ўсё так, як іх навучылі. І ўсё ж іх арыштавалі, трымалі двое сутак. Некалькі разоў

вадзілі на допыты. Трымаліся Дуня і Фруза ўпэўнена, і немцы паверылі ім. Лутаў быў арыштаваны. Яго доўга дапытвалі, білі, а затым вывелі на замініраваную партызанамі дарогу, дзе ён і падарваўся на міне. А Кісцін заявіў немцам, што ён заўсёды быў барацьбітом за «новы парадак» і сябрам «вялікай Германіі». І калі яго сталі падазраваць, ён не змог знесці гэтага і вырашыў скончыць самагубствам. Гэта здалося немцам праўдападобным, і яны пранікліся павагай да Кісціна. Крышку счакаўшы, ён зноў выйшаў на сувязь.

Фронт прыбліжаўся, немцы пачалі эвакуіраваць свае ўстановы з Чэрыкава. Кісцін кіраваў гэтай работай, адначасова ён перадаў партызанам шмат важных звестак. Паведаміў, што фашысты будуць пераганяць дзве вялікія партыі жывёлы. Мы адбілі жывёлу і раздалі яе насельніцтву вёсак Манастырок, Старынка, Ушакі, Кісцін забяспечыў многіх жыхароў Чэрыкава спецыяльнымі пропускамі ў партызанскую зону і гэтым выратаваў іх ад угону ў Германію. У хуткім часе Кісцін прыйшоў у атрад.

Памятаю, як хлапчукі паведамілі, што на лузе за Сожам недалёка ад в. Манастырок у кустах хаваюцца восем чалавек у нямецкай форме. Я, Васіль Сівакоў і Васіль (па мянушцы «Белы мядзведзь»), асядлаўшы коней і пераправіўшыся цераз раку, выехалі на луг. У апошні час у атрад прыйшло каля 100 уласаўцаў, і мы падумалі, што, магчыма, і гэтыя ідуць да нас. Але нікога не сустрэлі і накіраваліся да в. Горкі. Раптам з-за дрэў мы ўбачылі хвост нямецкага абоза, які выцягнуўся на шашы Масква — Варшава. За абозам у ста метрах ад апошняй падводы, калываючыся і цягнучы па зямлі вінтоўку, плёўся п'яны фрыц. Рашэнне паспела вакамгненна. Васіль, прышпорыўшы каня, памчаўся да фашыста, схапіў яго за каўнер і ўцягнуў у сядло. Немца мы прывезлі ў Манастырок, дзе знаходзілася камандаванне атрада. Ноччу дапыталі працверазеўшага ваяку, а раніцай, пастроіўшы на вуліцы вёскі роту ўласаўцаў і карнікаў, якія перайшлі на наш бок, вывелі палоннага немца. Убачыўшы строй людзей у нямецкай форме, салдат разгубіўся. Але Валодзя Гарчакоў пераклаў яму словы камандзіра: «Гэта тыя, хто раней змагаўся супраць партызан, а цяпер перайшлі на наш бок, каб біць захопнікаў». Фашыста паставілі спераду калоны і строй накіраваўся ў лагер атрада.

Наша разведка ўстанавіла, што на шашы Масква — Варшава, недалёка ад хутара Гракі, стаіць 76-міліметровая гармата. Мы вырашылі яе сцягнуць. Я з разведчыкамі Васілём Сіваковым, Васілём Германавым і Уладзімірам Карасталёвым пераправіліся цераз Сож у раёне в. Дабранка. Падабраліся да гарматы. Побач нямецкі дзот і вартавы. Вывучылі абставіны і вырашылі вартавога не чапаць, а гармату браць заўтра.

Вызвалі з атрада ўзвод пад камандаваннем Е. П. Файцельсона і ноччу зноў пераправіліся цераз Сож. Група партызан засталася будаваць плыт, астатнія ж асцярожна рухаліся ўперад. Двое з вяроўкамі падкраліся да гарматы і заарканілі яе. Прыўзняўшы станіну, яны падалі нам знак. Паціху гармата пачала адпаўзаць ад дзота. Потым партызаны пакацілі яе да Сожа пад аховай групы прыкрыцця. Калі ўскацілі гармату на плыт, зразумелі, што ён не вытрымае. Умацавалі яго і пачалі пераправу, але плыт пачаў тануць. Вярнуліся назад і яшчэ раз умацавалі яго бярвёнамі. Цяпер ён ішоў добра. Аперацыя прайшла паспяхова. Узвод Е. П. Файцельсона адправіўся ў лагер, а я з разведчыкамі на новае заданне.

Праз некалькі дзён украдзеная гармата, якую ўстанавілі каля в.

Манастырок, зрабіла першыя выстралы па гнязду немцаў і іх халуёўпаліцаяў у Чэрыкаве.

З гэтага часу партызаны 721-га атрада пачалі рэгулярна абстрэльваць раённы цэнтр. Гэтым яны вызвалі не толькі паніку сярод немцаў, але і ўсялілі веру ў чэрыкаўлян у нашу сілу і хуткую перамогу.

Гармата не давала спакою немцам. І яны вырашылі знішчыць яе. Фашысты накіравалі да мяркуемай агнявой пазіцыі аўтамашыну з салдатамі. Я і трое разведчыкаў — І. Карасталёў, Л. Котаў і В. Сівакоў — адправілі гармату з разлікам у атрад, а самі затрымаліся каля рачулкі, якая перасякала лясную дарогу на Манастырок. Раптам мы пачулі гул матора, а затым убачылі і машыну. Яна спынілася метраў за 40—50 ад вады. Некалькі салдат накіраваліся да рэчкі. У гэты момант мы адкрылі агонь. Немцы адкрылі агонь у адказ. Сілы былі няроўнымі, і мы, адстрэльваючыся, пачалі адыходзіць. Немцы таксама баяліся аказацца акружанымі ў лесе. Яны развярнулі машыну і паехалі ў Чэрыкаў.

А гармата яшчэ не раз дапамагала нам нішчыць ворага. Асабліва праславілася яна пры разгроме варожага гарнізона каля в. Пільня. У гэтым баі ўдзельнічалі 720-ы, 721-ы атрады і атрад М. Т. Перапечкіна.

З БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА № 15

К 16 августа 1943 года по приказу командования 13 партизанского полка и указаниям секретаря Чериковского подпольного РК КП(б)Б т. Храмовича был сформирован партизанский отряд 15. С первых дней мы начали боевую деятельность: громили полицейские точки, уничтожали немецких шпионов, диверсантов, изменников Родины. Силами отряда добыли 20 карабинов, 39 СВТ, 15 немецких винтовок, 190 русских винтовок, 25 револьверов, 4 бинокля, 7 пулеметов, один ротный миномет, 5 пистолетов ТТ, 105 гранат, 6 винтовочных урезков. 41 винтовку сделали умельцы отряда.

1. Отряд участвовал в выполнении правительственного задания — рельсовой войне. Взорвано железнодорожных путей на протяжении 5 км на участке Кричев — Чаусы.
2. Пущен под откос эшелон противника с живой силой и скотом.
3. Подорвана водонапорная труба водокачки — 4 колодца между Забочевым и ст. Веремейки.
4. Порезана телеграфная связь, идущая из ст. Веремейки на водокачку Забочева.
5. Подорвано 17 мостов на шоссейных и грунтовых дорогах.

В результате боевых действий взято у противника: пять технически исправных автомашин, из них одна бронемашина. Выведено из строя 4 автомашины. Взято на базах противника один мотоцикл и 7 велосипедов.

С 16.8.43 года по 1.10.43 года уничтожено немецких солдат и офицеров — 41, в том числе начальник ОВС большого обоза обер-лейтенант дважды награжденный орденами, со всеми документами. Взято в плен 3 немецких солдата.

Взято в плен и разоружено:

1. Власовцев — 56 с вооружением 3 пулемета, 30 винтовок, 13 гранат и 9753 патрона.
2. Полицейских — 42.

При отступлении немцев силами отряда задержано:

1. Служащих и рабочих предприятий немецкой армии — 36.
2. Быв. военнослужащих немецкой армии — 112.
3. Военнослужащих Чериковского района — 301.
4. Предателей родины — 22. Все они переданы в ОКР «Смерш» 21-й СД.

Командир отряда 15 Волчков
Комиссар отряда 15 Космачев

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 4, спр. 105, л. 1, 2.

У засадзе, дазоры, сакрэце

З успамінаў А. А. Афанасьева, былога начальніка штаба Чэрыкаўскага партызанскага атрада № 15

А. А. Афанасьеў.

Становішча было такое, што дазор чакала жорсткая і ўпартая схватка болей чым з сотняй узброеных да зубоў немцаў. Старшы дазора накіраваў у штаб коннага сувязнога з данясеннем і за дапамогай. Партызаны вялі меткі абстрэл з засады. Немцы ж раптам развярнуліся і, кінуўшы сваіх афіцэраў, якія трапілі ў бяду, уцяклі ў бок Чэрыкава.

Коннаму аддзяленню пад камандаваннем В. П. Гольцава, якое прыбыло на дапамогу, рабіць у Шароеўцы ўжо не было чаго. Кароткі бой быў скончаны. Дазор з пяці чалавек лёгка расправіўся з залёгшымі ў кювет двума афіцэрамі. Але заядламу шафёру Гольцаву і тут знайшлася работа. Ён хутка агледзеў машыну, адзначыў, што бензабак прабіты і ўвесь бензін выцек, усё ж другое было ў парадку. У вёсцы адшукаў бутэльку бензіну, злучыў яе гумавай трубкай з карбюратарам і, трымаючы бутэльку паміж ног, завёў «Опель-капітана» і памчаўся ў аб'езд штаба атрада. Бензабак ён запаяў, і легкавы «опель» папоўніў тэхніку атрада.

Імкнучыся авалодаць бальшакамі і некаторымі прасёлачнымі дарогамі ў партызанскай зоне, немцы групай у некалькі дзесяткаў коннікаў без папярэдняй разведкі мясцовасці напралом паспрабавалі прабіцца праз в. Наркі ў напрамку в. Каменка, а затым на бальшак, які вёў да Чавус. А магчыма, яны хацелі хутчэй збегчы на захад і без разведкі непрыкметна праскочыць г. Чавусы. У іх на шляху каля пасёлка Жытнёў цераз рэчку Вудага стаялі мост і млын. Увесь левы бераг быў нізінны, а мясцовасць і дарога да моста з боку Наркоў больш чым на паўкіламетра адкрытыя.

У гэтым месцы, на правым высокім і лясістым беразе, партызаны зрабілі засаду, вырашылі правучыць фашыстаў. У засадзе знаходзіўся бранявік, на якім умацавалі два ручныя кулямёты. Прапусцілі частку коннікаў цераз мост і з адлегласці 100—150 м з высокага берага адкрылі смяртэльны агонь з флангаў, а затым і ў лоб. Расправа з ворагам была кароткай. Толькі асобным коннікам удалося вышмыгнуць з гэтай пасткі.

Наша баявая група страціла аднаго чалавека — Аляксандра Валошына. Ён касіў ворага з кулямёта, які знаходзіўся на браневіку. Фашысцкая куля трапіла яму ў галаву. Валошын загінуў. Пахавалі яго ў пасёлку Жытнёў каля дарогі паміж высокіх дрэў. Пахавалі з партызанскімі ўшанаваннямі.

Праз два дні амаль такая ж аперацыя, толькі нечаканая для нас і ворага, была праведзена ў в. Шароеўцы. На гэты раз бой не з конніцай, а з механізаванай калонай.

У партызанскім дазоры было шасцёра. Раніцай старшы дазора, пакінуўшы ў сакрэце толькі аднаго чалавека, павёў астатніх у вёску снедаць. У хуткім часе з Чэрыкава міма сакрэта праскочыла калона з пяці грузавых аўтамашын з немцамі.

Малады партызан, які застаўся ў сакрэце, задрамаў. Калі прачнуўся

і ўбачыў машыны, разгубіўся і нават не зрабіў папераджальнага выстралу. Ён так спужаўся, што прасядзеў да канца бою ў вадасцёкавай трубе пад бальшаком.

Калона аўтамашын гэтак жа раптоўна ўехала ў в. Шароеўку і, не затрымліваючыся, рушыла далей. Але на яе шляху перад в. Лабанаўка быў разабраны мост.

У самы разгар снедання пачуўся шум матораў. Дазор з пяці чалавек апынуўся ў тыле калоны. Вырашылі выпраўляць становішча. Партызаны кінуліся даганяць ворага і ўступілі з ім у няроўны бой. Раптоўнасць і меткі агонь з блізкай адлегласці выратавалі партызан. Немцы, нічога не зразумеўшы, у паніцы пакідалі ўсе машыны і сталі ўцякаць цераз ручай у бок в. Вербеж і далей у Чэрыкаў.

ЗАГАД № 4

АД 9 ЖНІЎНЯ 1943 г.

В целях срыва приказа немецких властей о мобилизации населения в Германию, в целях освоения и охвата всего Чериковского района, в целях роста и вооружения отрядов Приказываю: командиру парт[изанского] отр[яда]720 выделить роту, и отр[яду] 721 не меньше взвода для отправки и действий в западной части района. Отправить 9.8.43 г.

Секретарь Чериковского РК КПБ,
ком[анди]р военно-оперативной группы
стар[ший] политр[ук] Храмович

Нач. штаба воен[но]-опер[ативной] группы Будников

Пом. нач. штаба воен[но]- опер[ативной] группы
л[ейтенан]т Купряшин*

Читали: к-р 720 к-р 721

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4238, воп. 1, спр. 1, л. 2.

З ПРАТАКОЛА № 7 ПАСЯДЖЭННЯ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РК КП(б)Б АД 13 ЖНІЎНЯ 1943 г.

Присутствуют секретарь РК КПБ т. Храмович, члены РК КП(б)Б Ивановский, Федоров, Костюченко, Голенко, член Могилевского подпольного обкома КП(б)Б т. Никифоров

Повестка дня

1. О создании военно-оперативной группы РК КП(б)Б
2. Утверждение кадров

Слушали: о создании военно-оперативной группы РК КП(б)Б. (Докладывает т. Храмович)

Постановили:

1. Отменить решение РК КП(б)Б от 7 августа 43 г. о создании военно-оперативной группы.

---

* В других документах Куприяшин.

2. На основании решения обкома от 28 июня 1943 г. (о создании военно-оперативной группы при РК КП(б)Б) создать военно-оперативную группу РК КП(б)Б в следующем составе: командир военно-оперативной группы т. Куприяшин М. Н., начальник штаба военно-оперативной группы Будников М. С. и пом. начальника штаба Хромов М. К.
3. Тов. Куприяшина ввести в члены РК КП(б)Б.

Слушали: о начальнике штаба п/о 720 (докладывает командир п/о 720 т. Жмуровский)

Постановили: утвердить начальником штаба п/о 720 т. Томилина В. П.

Секретарь РК КП(б)Б *Храмович*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4170, воп. 1, спр. 1, л. 9, 10.

РАЗВЕДДАНЯСЕННЕ ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЁНА НА 31 ЖНІЎНЯ

Разведкой В-о группы установлено, что в г. Черикове находятся:

1. Обучающийся резерв 300 чел. (немцев).
2. Рабочий батальон 50 чел. (поляки).
3. Ремонтный батальон с обозом.
4. Обозная группа 100 чел. (немцы).
5. Состав комендатуры 50 чел. (немцы).
6. Черная сотня 98 чел. (русские).
7. Городской полиции 56 чел. (ОД).
8. Полиции СД (следственный отдел) 10 чел.
9. Охрана комендатуры 25 чел.
10. Конный взвод 20 чел.

В гарнизоне Пильня на 26 августа находилось: немцев 40 чел., изменников 8 чел., при вооружении, 1 б[роне]м[ашина], 1 р[отный] м[иномет], 2 ст[анковых] п[улемета], 3 р[учных] п[улемета], 13 автоматов.

Все данные получены от агентурной разведки, находящейся в г. Черикове.

Получено от [нач]альника разв[едки] в[оенно]-о[перативной] гр[уппы] Записал пом. нач. шт[аба] Хромов

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4238, воп. 1, спр. 2, л. 52.

ЗАГАД № 10 ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ ЧЭРЫКАЎСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РК КП(б)Б АД 1 ВЕРАСНЯ 1943 г.

Приказ уполномоченного Могилевского обкома КП(б)Б о создании продовольственных баз, а также создание неприкосновенного запаса бойца отрядами 720 и 721 не выполнен, к выполнению которого никаких причин не было, а поэтому приказываю:

§№ 1. К 10 сентября отряду 720 заготовить 2 тонны муки.

§2. Отрядам 720 и 721 создать неприкосновенный запас бойца, заготовив сухарей по 3 кг на бойца и по 1 кг мясных изделий к 7 сентября.

Командирам подразделений вести строгий контроль над сохранением неприкосн[овенного] запаса бойца.

Секретарь Чериковского подпольного РК КП(б)Б
ст. политрук Храмович

К[оманди]р в[оенно]-о[перативной] гр[уппы]
Чериковского РК КП(б)Б л[ейтенан]т Куприяшин

Нач. штаба в[оенно]-о[перативной]
гр[уппы] л[ейтенан]т Будников

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4238, воп. 1, спр. 1, л. 7.

РАЗВЕДДАНЯСЕННЕ ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ НА 13 ВЕРАСНЯ 1943 г.

Агентурной разведкой, находящейся в г. Черикове установлено, что в город прибыло до 5000 мадьяр и немцев. Прибыли из г. Кричева. Городская полиция усилена до 300 чел., в наряды не посылается, а обучается военному делу.

В Пильню прибыло до 300 человек мадьяр и немцев, по-видимому, с целью установления гарнизона. По пути следования на Пильню колонна нашла на минное поле, в результате чего 1 мадьяр убит, несколько ранено.

Получено от нач. разв[едки] в[оенно] -о[перативной] гр[уппы]
Записал пом. нач. шт[аба] в[оенно] -о[перативной] гр[уппы]

Хромов

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4238, воп. 1, спр. 2, л. 52.

АПЕРАТЫЎНАЕ ДАНЯСЕННЕ НА 27.9.43 г. ЧЭРЫКАЎСКАЙ ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ

1. Через Чериков 26 и 25 войсковые части не двигались, но было движение обозов и беженцев.
2. С Климович на Чериков через Веприн 24 и 25 двигались немецкие части (пехота на автомашинах и конница).
3. С Краснополья на Чериков 25 и 26 сентября движения воинских частей не было. 26 сентября из Краснополья в Пильню прибыло большое количество скота (более 1000 гол.) и эвакуированные полицейские с их семьями.
4. 26.09.43 г. из Черикова в Пильню на подводах прошло около 100 чел. мадьяр и русских полицейских. Предполагается, что они прибыли для отправки скота из Пильни на Чериков.
5. 26.9.43 г. немцами был произведен осмотр берега р. Сожа против д. Добрянка.
6. От Черикова до Добрянки по берегу р. Сожа военных сооружений нет и не производятся.
   26.9.43 г. сожжены д. Веприн и Слобода, на лугу сожжены стога сена.
7. Трасса Чериков — Пильня контролируется мадьярами. В Лимени стоят 80 чел., 3 км от Лимени к Пильне стоит взвод мадьяр со штабом, на вооружении имеются минометы.
8. Гарнизон Пильни состоит из 120 чел. с пушками и минометами.

27.9.43 г. Пом. нач. шт. воен.-опергр[уппы] Хромов

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4238, воп. 1, спр. 2, л. 48.

У адным страі

У ліку партызан, якія змагаліся на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна, былі прадстаўнікі розных народаў былога Саюза. Баявое братэрства памнажала сілы, умацоўвала веру ў перамогу над ворагам. У гэтым артыкуле расказваецца пра двух сыноў Грузіі.

Андрэй Гвасалія

Падпольшчыка і партызана капітана Андрэя Платонавіча Гвасалію, ураджэнца г. Міха-Цхакая, многія ў атрадзе называлі Андруша. У пачатку вайны ён камандаваў ротай, якая ў 1941 г. у раёне Магілёва трапіла ў акружэнне. Савецкія воіны стаялі насмерць. Але ж фашысты атакавалі з усіх бакоў. Варожае кальцо сціскалася. Здавалася, што паратунку няма. Капітан Гвасалія вядзе байцоў на прарыў. Жменя бай-

цоў ашаламіла ворага. Штыкамі і прыкладамі пралажылі яны сабе дарогу праз варожыя ланцугі, знішчылі пры гэтым шмат гітлераўцаў. Яны вырваліся з акружэння і пайшлі на ўсход.

Восенню 1941 г. зноў акружэнне ў раёне Бранска, зноў цяжкія, крывапралітныя баі. Гвасалія быў паранены. Яго часць засталася ў тыле ворага. Пачаліся доўгія вандраванні. Нягледзячы на зімовую сцюжу і завеі, холад і голад, ішлі байцы на ўсход, да сваіх. Але знясіленыя, змучаныя прайсці праз лінію фронту яны не змаглі. Тады Аляксей Яўмененка, ураджэнец Чэрыкаўскага раёна, прапанаваў вярнуцца ў Беларусь, уступіць у партызанскі атрад і там працягваць барацьбу з ненавісным ворагам. Рашэнне прынята. Капітан Андрэй Гвасалія, лейтэнант Аляксей Яўмененка, сяржант Іван Жукаў вярнуліся ў Чэрыкаўскі раён. Яны не кінулі зброі, не знялі ваеннай формы, захавалі ўсе дакументы.

У той час падпольны райкам партыі падбіраў людзей для нелегальнай работы ў г. Чэрыкаве, на чыгуначнай станцыі Верамейкі і ў іншых населеных пунктах, дзе стаялі варожыя гарнізоны. Камуністы Гвасалія і Яўмененка і камсамолец Жукаў былі накіраваны на падпольную работу.

Больш года мужныя воіны змагаліся супраць ворага ў складзе падпольнай арганізацыі на станцыі Верамейкі і ў вёсцы. Гвасалія ўзначальваў дыверсійна-баявую групу. Дзейнічалі смела, лоўка, рашуча. Некалькі разоў узрывалі вадакачку, замарожвалі водаправод, выводзілі са строю стрэлкі і пункт сувязі на станцыі Верамейкі, знішчалі склады, пускалі пад адхон варожыя эшалоны з жывой сілай і тэхнікай, палілі цыстэрны, вагоны.

Калі саставы з боепрыпасамі і тэхнікай затрымліваліся на станцыях,

А. П. Гвасалія.

гітлераўцы бралі іх пад узмоцненую ахову. Практычна, падысці да іх было нельга. Але Гвасалія падыходзіў. Ён пераапранаўся ў нямецкую форму і прабіраўся на станцыю. На вачах у фашыстаў падыходзіў да саставу і, выгадаўшы момант, прымацоўваў магнітныя міны да цыстэрны ці вагона.

Верамейская падпольная партыйная арганізацыя займалася не толькі дыверсійнай работай. Падпольшчыкі вялі прапаганду сярод насельніцтва, ратавалі моладзь ад угону ў фашысцкае рабства.

У канцы сакавіка 1943 г. сумеснымі намаганнямі партызан 13-га палка С. В. Грышына і падпольшчыкаў быў знішчаны фашысцкі гарнізон на станцыі Верамейкі. Пасля бою падпольшчыкі перайшлі на партызанскі метад барацьбы з ворагам. Узнік новы Чэрыкаўскі партызанскі атрад № 15. Капітан Гвасалія быў назначан камандзірам адной з рот.

Аднойчы на шашы Варшава — Масква рота Гвасаліі разграміла калону акупантаў. Захапілі непашкоджаны бронетранспарцёр. У роце знайшоўся вадзіцель. Тры дні раз'язджаў Андрэй Гвасалія на бронетранспарцёры па бліжніх тылах варожых часцей, знішчаючы жывую сілу і тэхніку. Гітлераўцы не раз у паніцы абстрэльвалі свае адзіночныя бронетранспарцёры.

1 кастрычніка 1943 г. партызанскія атрады Чэрыкаўскай ваенна-

С. А. Папалашвілі.

аператыўнай групы злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі. У дзеючую армію пайшоў і капітан Гвасалія. У чэрвені 1944 г. ён загінуў, вызваляючы г. Бабруйск.

Сакрат Папалашвілі

9-я механізаваная брыгада, у якой служыў лейтэнант Папалашвілі, у першы дзень Вялікай Айчыннай вайны ўступіла ў бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Савецкія воіны мужна адбівалі атакі гітлераўцаў. На некалькі гадзін удалося ўтрымаць лінію абароны. Асобныя падраздзяленні брыгады пераходзілі ў контратаку, уступалі ў рукапашныя схваткі. Але сілы былі няроўныя. Брыгада панесла вялікія страты і стала адступаць. Вораг працягваў наступленне. Супраць падраздзяленняў брыгады гітлераўцы вялі агонь з усіх відаў зброі, гармат. Прымяняліся самалёты, танкі, артылерыя. Брыгада трапіла ў акружэнне. Яе воіны асобнымі групамі сталі адступаць на ўсход.

Разам з групай байцоў прарываўся за лінію фронту і Сакрат Папалашвілі. Не адзін раз уступалі яны ў жорсткія схваткі з гітлераўцамі. Апошні бой, у якім Сакрат прымаў удзел, адбыўся недалёка ад р. Сож. Групу савецкіх воінаў выявілі разведчыкі фашысцкай часці. Яны паведамілі аб гэтым свайму камандаванню. Немцы пачалі наступленне. Байцы вырашылі даць бой. Вораг разлічваў хутка расправіцца з імі. Жменька храбрацоў аказала ўпартае супраціўленне. Гітлераўцы акружылі савецкіх воінаў і пачалі весці прыцэльны агонь. Нашы байцы занялі кругавую абарону. Бой прымаў усё больш напружаны характар. Савецкія воіны не адзін раз пераходзілі ў контратаку. Некалькі разоў завязваліся рукапашныя схваткі. У адной з такіх схватак быў цяжка паранены лейтэнант Папалашвілі. Ён змог адпаўзці ў кусты і там страціў прытомнасць.

Раненага байца знайшлі мясцовыя жыхары, схавалі яго ў надзейным месцы. Доўга ён не мог апрытомнець, бо раны былі цяжкія. Паступова да яго вярталася жыццё. Толькі восенню 1942 г. Сакрат змог устаць на ногі. Ад насельніцтва даведаўся, што ў тыле ворага разгортваецца партызанскі рух. Праз надзейных людзей ён знайшоў сувязі з камандаваннем партызанскага атрада, які дзейнічаў ва ўсходніх раёнах Магілёўскай вобласці. Пасля непрацяглай гутаркі камандзір атрада сказаў:

— Ну што, лейтэнант, вопытныя людзі, з добрай ваеннай падрыхтоўкай нам вельмі патрэбны. Набірайся сілы, знаёмся з абстаноўкай і прыступай да выканання абавязкаў. Мы вырашылі накіраваць цябе ў разведку.

Так Сакрат Папалашвілі стаў разведчыкам 720-га партызанскага атрада. Гэта было восенню 1942 г. Не памылілася камандаванне атрада, прызначыўшы лейтэнанта разведчыкам. Ён умела выконваў заданні, змог хутка ўстанавіць кантакты з мясцовым насельніцтвам, з падпольшчыкамі, у многіх населеных пунктах падабраў надзейных сувязных. Не адзін раз ён прабіраўся ў г. Магілёў, сустракаўся там з падпольшчыкамі, здабываў каштоўныя звесткі

аб колькасці варожых гарнізонаў, сістэме іх умацавання. Часта Сакрат вёў разведку на шашэйных і чыгуначных дарогах, устанаўліваў інтэнсіўнасць руху транспарту, магчымыя падыходы да палатна дарогі. Разам з падрыўнікамі мініраваў шашэйную дарогу на ўчастку Рагачоў — Рослаўль, рабіў дыверсіі на чыгуначнай дарозе Магілёў — Крычаў.

Неўзабаве камандаванне атрада прызначыла Сакрата Папалашвілі камандзірам узвода асобна дзеючай роты 720-га партызанскага атрада. Узвод лейтэнанта прымаў удзел у баявых аперацыях па разгрому варожых гарнізонаў, у дыверсіях на дарогах, у баях з падраздзяленнямі гітлераўцаў. Ва ўсіх сітуацыях Папалашвілі праяўляў смеласць і знаходлівасць, кемлівасць і ініцыятыву.

Восенню 1943 г. Чэрыкаўскі раён быў вызвалены часцямі Савецкай Арміі. 720-ы партызанскі атрад злучыўся тут з савецкімі войскамі. Толькі адна рота, у якую ўваходзіў узвод Папалашвілі, была перакінута за лінію фронту ў варожы тыл і там працягвала баявыя дзеянні. У гэты час тут вялі барацьбу два партызанскія палкі С. В. Грышына і А. С. Дзямідава. Партызаны дзейнічалі ў прыфрантавой паласе ворага, наносілі яму адчувальны ўрон. Але праводзіць баявыя дзеянні было вельмі складана і цяжка. Партызаны адчувалі вострыя недахоп боепрыпасаў, прадуктаў. Гітлераўцы з усіх бакоў павялі наступленне супраць партызан. Байцы аказаліся ў блакадзе.

Неабходна было шукаць выйсце. Спробы прарвацца праз лінію фронту поспеху не мелі. Тады было прынята рашэнне прарваць блакаду і пайсці на захад і ў варожым тыле працягваць барацьбу.

Рота 720-га атрада рабіла прарыў на поўдзень ад г. Быхава. Неабходна было фарсіраваць Днепр, перайсці шашэйную і чыгуначную дарогі.

Пасля падрыхтоўкі партызаны пайшлі на прарыў. З крыкамі «ўра» кідаліся яны на варожыя ланцугі. Гітлераўцы адкрылі агонь, але было позна. Партызаны прарвалі кола блакады і кінуліся ўперад. Адыход роты прыкрываў узвод лейтэнанта Папалашвілі. Многія байцы загінулі і цаной уласнага жыцця забяспечылі адыход сваіх таварышаў. Гэта быў апошні бой лейтэнанта Папалашвілі. Ён загінуў мужна.

І. Саўчанка.

Па сігналу ракеты

З успамінаў А. І. Палякова, былога камісара батальёна асобнага партызанскага палка «Трынаццаць»

Часць, у якой служыў Васіль Рэмарчук з в. Крачкоўкі, што на Украіне, трапіла ў акружэнне. З групай воінаў прабіраўся з акружэння і камандзір гарматы Васіль Рэмарчук. Але прабіцца не ўдалося: фронт быў ужо далёка. Пасля доўгіх пошукаў Васіль трапіў у праслаўлены партызанскі полк Героя Савецкага Саюза Сяргея Уладзіміравіча Грышына. У хуткім часе ён ваяваў у складзе асобнага партызанскага палка «Трынаццаць» на пасадзе камандзіра аддзялення 3-га батальёна. Жыццярадасны, душэўны хлопец прыйшоўся па душы камсамольцам батальёна. Яны выбралі яго сваім важаком.

Актыўныя дзеянні партызанскага палка ў прыфрантавой паласе сур'ёзна занепакоілі немцаў. Камандаванне групы арміі «Цэнтр» прыняло рашэнне знішчыць полк. Але партызаны даведаліся аб тым, што ў Смаленску фарміруецца спецыяльнае злучэнне, задачай якога ставіцца знішчэнне партызанскага палка Грышына. На чале карнай экспедыцыі былі пастаўлены два генералы.

З гэтай прычыны Грышын жартаваў: «Аж два генералы! Ці не занадта многа на аднаго капітана».

Але 3 сакавіка 1943 г. партызанам стала не да жартаў. Паўтара месяца ішлі цяжкія баі. Ва ўмовах амаль поўнага акружэння партызаны не маглі забяспечыць сябе боепрыпасамі і харчаваннем. Таму Масква дала каманду на выхад палка ў Беларусь. Развітальным акордам на Смаленшчыне быў бой ля в. Танды.

Да Цёмнага лесу заставалася некалькі дзесяткаў кіламетраў, калі дзяўчына з в. Багатоўкі паведаміла, што рыхтуецца пастка: гітлераўцы баяліся знаходжання ў Беларусі такой магутнай баявой адзінкі, як полк Грышына. Паведамленне было прынята да ведама, і полк змяніў свой маршрут. Але гітлераўцы ўжо ведалі аб месцазнаходжанні палка. У в. Грабалава прыйшлося прыняць бой. Супраць партызан наступала каля дзвюх рот фашыстаў з гарматамі і мінамётамі. Але партызаны раптоўным ударам спачатку адкінулі ворага, потым больш чым напалавіну знішчылі. Шлях быў свабодны.

Набліжалася першамайскае свята 1943 г. Партызаны вырашылі яго адзначыць новымі баявымі аперацыямі. Вораг не чакаў тут буйнага партызанскага злучэння і нёс вялікія страты (раёны дзеяння атрада — Крычаўскі, Чэрыкаўскі, Слаўгарадскі, Чавускі). Былі вызвалены цэлыя сельсаветы. У вызваленых населеных пунктах праводзіліся мітынгі, сходы. Прыток у рады народных мсціўцаў значна ўзрос. Камандаванне палка вырашыла разграміць ворага настанцыях Чавусы і Верамейкі. Удзел у аперацыі прымалі тры батальёны. Аперацыі папярэднічала вялікая падрыхтоўка, але вялася яна пад вялікім сакрэтам. Нават камандзіры рот не ведалі планаў камандавання палка. Для імітацыі спакойнай абстаноўкі ў в. Бярозаўка Слаўгарадскага раёна для насельніцтва і партызан ставіўся канцэрт мастацкай самадзейнасці. Раптоўна пачуўся сігнал трывогі і батальёны разышліся на заданне. На чале калоны, якая ішла на Верамейкі, быў Васіль Рэмарчук. Ён перад гэтым двойчы хадзіў у Верамейкі на разведку і добра ведаў усе подступы да станцыі.

Па сігналу зялёнай ракеты ўдарыла партызанская гармата. Але хутка яна змоўкла — перакасіла снарад. Васіль Рэмарчук, карыстаючыся разгубленасцю гітлераўцаў, павёў групу байцоў на штурм казармы. Не чакаўшыя нападу паліцэйскія былі перабіты, а начальніка паліцыі Рэмарчук павёў на допыт да камандзіра ўзвода Шабанава. Штурмавы атрад падпаліў казарму і рушыў на станцыю знішчаць стрэлкі, вагоны, будынак станцыі. І ніхто не ведаў, што ў гэты час Васіль Рэмарчук сцякае крывёю на адной з вуліц — яго цяжка параніў у спіну адзін з уцалеўшых паліцэйскіх.

Пасля бою разведка данесла, што паранены Васіль Рэмарчук трапіў у рукі ворага. Як расказалі жыхары Верамеек, бургамістр Пратасаў загадаў прынесці некалькі кускоў сала і боханаў хлеба. Усё гэта паклалі каля Васіля. Ворагі здзекаваліся над ім і сабраўшымся жыхарам Верамеек гаварылі, што партызаны напалі з мэтай грабяжу насельніцтва. Калі бургамістр нагнуўся са здзеклівай усмешкай да Васіля, той сабраў апошнія сілы і плюнуў у твар здрадніку. Увесь дзень яго катавалі, хацелі прымусіць расказаць аб партызанах. Але ён маўчаў. Пад вечар Васіля, праткнутага штыкамі і коллямі, кінулі яшчэ жывым у яму за Верамейкамі. Пры гэтым сабралі насельніцтва і загадалі глядзець, як будзе пакараны кожны, хто ўзніме руку на нямецкага салдата або паліцэйскага.

Аднак здраднікі сталі яшчэ больш баяцца народнай помсты. Станцыя

Верамейкі ім ужо здавалася ненадзейным пунктам абароны. Таму яны перабраліся ў в. Губеншчына. Губеншчынскі гарнізон яны лічылі непрыступным: вакол вёскі былі вырыты акопы, устаноўлены доты і дзоты, зроблены кулямётныя гнёзды.

Цяжка перажывалі партызаны гібель свайго таварыша. За яго смерць яны вырашылі жорстка адпомсціць. Гарнізон у Губеншчыне быў разгромлены. Ніводнаму паліцэйскаму не ўдалося ўцалець.

...Мінулі цяжкія гады. Але памяць аб героях неўміручая. На месцы гібелі Васіля Рэмарчука стаіць помнік. Сюды ідуць удзячныя людзі, каб пакланіцца праху мужнага воіна, аддаць яму даніну павагі.

Пад дахам ночы

Са справаздачы былога камісара партызанскага атрада «Валянціна Маёрава» Я. Д. Траянава

Траянаў Якаў Данілавіч нарадзіўся 21 сакавіка 1908 г. у в. Іматаўка Дубровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. З 1930 г. служыў у Чырвонай Арміі. Скончыў Ленінградскае ваеннае вучылішча сувязі, Ваенна-палітычную акадэмію імя Леніна. З чэрвеня 1941 г. на фронце Вялікай Айчыннай вайны. З ліпеня 1942 г. камісар партызанскага атрада «Валянціна Маёрава».

Четвертого августа 1941 г. мне удалось бежать из фашистского плена. Сделал попытку перейти линию фронта, но безуспешно. Вернулся в родную деревню. Случайно нашел брошюру с обращением ЦК КП(б)Б и Верховного Совета БССР об организации сопротивления в тылу врага и создании партизанских отрядов. Связался с подпольем. Начал вести разъяснительную работу среди населения. А в апреле 1942 г. уже собралась группа. Мы пришли к единому мнению, что надо организовать партизанский отряд и громить врага в тылу. Четвертого июля 1942 г. на собрании был избран командир отряда Шмонин Павел Иванович, комиссаром избрали меня. И отряд начал действовать, хотя оружия по существу у нас не было.

Шестого июля мы получили сведения о том, что полицейские деревни Веприн насильственно конфискуют у населения зерно и другие продукты, приготовленные для вывоза и снабжения немецкой армии, что они рьяно выполняют указания фашистских властей по всем видам заготовок. Нам стало также известно, что активизировало свою деятельность вепринское лесничество. Решили разоружить вепринскую полицию и разгромить лесничество. Ночью отряд совершил нападение на 36 полицейских, находившихся в деревне. Восемь из них были захвачены и разоружены, остальные разбежались. В эту же ночь партизаны предложили лесничему сдать оружие, 38 000 денег, отпущенных немцами на лесозаготовку и лесовывозку, казенный хлеб и табак, выданные для тех же целей. Однако лесничий не стал выполнять наши требования, начал отстреливаться. И после повторного предупреждения он продолжал сопротивление. Тогда командир отряда приказал окружить и сжечь дом. Находившийся в нем лесничий, а также хранившиеся в доме табак, свыше 200 патронов сгорели. Лесничество прекратило свою работу, полиция на время затихла.

После успешно проведенной операции бургомистр Холмянской волости Шахов обещал немецким властям, что уничтожит наш отряд. Он собрал полицейских всех деревень и сосредоточил их при волости. В ночь на восьмое июля командование приняло решение разгромить волость вместе с полицией. Разработа-

ли план, который удачно претворили в жизнь. Полицейские были разогнаны, разрушены волость и молочно-сепараторный пункт, документы изъяты и сожжены. Шахову вместе с семьей удалось бежать в Чериков.

Не давали мы покоя противнику. На 11 июля партизаны наметили новые объекты для уничтожения. На этот раз решили разгромить дорожно-ремонтный отряд немцев во главе с офицером, Речицкую волость и полицию. Выбрали мы эти объекты не случайно. Разведчица нашего отряда Нина Янченко доложила, что немецкий отряд в количестве 15 человек размещается в помещении бывшей почты и охраняется одним часовым. Речицкая полиция (28 человек) охраняет волость и патрулирует по улице.

Нас было 15 партизан. Разделились на две группы. Первая, восемь человек, во главе с командиром партизанского отряда, должна была уничтожить немцев. Вторая, во главе со мной — разгромить волость и разбить отряд полиции. Снять часового поручили Лобанову, Шмонину и Мишину, гранатометчику Павлову. Обе группы вступали в бой одновременно.

Ночью мы подошли к объектам и окружили их. Немецкого часового первая группа около здания не обнаружила. Шмонин и Лобанов решили разбудить немцев и вызвать их на улицу. Немцы встали, зажгли свет. Двое вышли на крыльцо. В этот момент Лобанов и Мишин из револьверов в упор убили фашистов. Лобанов бросился в дом. Но тут гитлеровец, ведя огонь через окно, ранил его. Мочалов, защищая Лобанова, ранил стрелявшего немца. Павлов бросил в комнату гранату. Но она не взорвалась. Немцы закрыли дверь на завал, погасили свет и открыли через окна стрельбу. Группа залегла и открыла ответный огонь.

Вторая группа в это время выполнила свою задачу: отряд полиции рассеян, захватили в здании волости двух полицейских, 22 русские винтовки, изъяли документы волости. Затем мы присоединились к первой группе.

Разъяренные этой неудачей, немцы расстреляли четырех полицейских Речицкой полиции, перевели остатки разгромленного нами дорожно-ремонтного отряда в Кричев.

27 августа отряд решил провести операцию по уничтожению сена, заготовленного для немецкой армии в деревне Речица на шоссе Кричев — Чериков. По данным разведки сено охранялось одним полицейским. В ночь на 28 августа отряд в количестве 16 человек приблизился к намеченной цели. Но оказалось, что сено находится рядом с волостью и его охраняет не один полицейский, а группа в количестве 30 человек, вооруженных двумя пулеметами. Полицаи, подпустив нас на близкое расстояние, открыли огонь. Мы открыли ответный. Обстановка складывалась не в нашу пользу. Решили перестрелку прекратить, уйти в деревню Комаровичи, захватить там бургомистра и начальника полиции, привести их в Речицу, заставить самих сжечь сено, заготовленное ими для немцев.

Отряд прибыл в Комаровичи на рассвете. Бургомистра Малашенко захватили спящим в чужом доме, а начальника полиции Маршалко не застали, его успела предупредить дочь бургомистра. Маршалко бежал в Чериков. В это же время мы получили сведения, что на Удожской мельнице хранится много хлеба, предназначенного для снабжения немцев. На мельницу отправился командир с двумя партизанами. Захватив хлеб, его раздали местным жителям. Операция затянулась. Сбежавший начальник полиции успел привести отряд карателей. Деревню окружили и снова начался тяжелый

бой. Возвратились партизаны из Удожки. По пути они уничтожили предателей — бургомистра и его дочь.

Силы оказались неравны. Против нас действовало подразделение, насчитывавшее 150 карателей. Пришлось покинуть деревню и направиться в Колынский лес. В бою были убиты два карателя. К сожалению, потери понесли и мы.

По пути на свою базу, совместно с группой партизан отряда «Чапая» устроили засаду на шоссе Кричев — Чериков. Обстреляли две машины немцев, идущих из Черикова на Кричев. По данным, поступившим из Кричева, уничтожили 8 и ранили 3 немецких салдата.

Так, несмотря на свою малочисленность (28 человек), партизанский отряд «Валентина Майорова» вел борьбу с немецко-фашистскими захватчиками в тылу врага.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 4, спр. 125, л. 48—51.

Недапетая песня

Наступіў снежань сорак першага. У Чэрыкаве, акруговым цэнтры дзесяці раёнаў, акупіраваных гітлераўцамі, з'явіліся афішы, у якіх паведамлялася, што адбудуцца канцэрты харавога ансамбля. Дырыжор ансамбля Генадзь Лузенін, вядучы саліст Аляксандр Акаёмаў. Падпольшчыкі не на жарт захваляваліся. Што гэта за ансамбль? Адкуль з'явіўся?

Партызанскі разведчык Васіль Мітрафанавіч Цілюпа атрымаў заданне — пазнаёміцца з артыстамі, даведацца, хто яны такія, як апынуліся ў тыле ворага, які ў іх настрой. Выканаць гэта заданне яму аднаму было цяжка, таму такое ж заданне атрымала і Антаніна Радзівонаўна Зелянкова. У хуткім часе Васіль Мітрафанавіч паведаміў, што артысты выклікалі добрае ўражанне, што ён запрасіў іх да сябе і пагутарыў за шклянкай чаю. А праз некалькі дзён і Зелянкова перадала, што маскоўскія артысты хочуць сустрэцца з кіраўніком падпольнага цэнтра.

Сустрэча адбылася ў лесе на левым беразе Сожа, каля пас. Лемень. На яе прыйшоў Аляксандр Акаёмаў. Ён расказаў, што ў кастрычніку 41-га франтавы ансамбль трапіў у вёску, занятую немцамі. Увесь ансамбль аказаўся ў палоне, а затым у Крычаўскім лагеры смерці. Каб застацца жывымі, згадзіліся працаваць у немцаў. Спадзяваліся на сустрэчу з партызанамі. Партызаны паверылі артыстам, вырашылі праз іх наладзіць надзейную сувязь з падпольшчыкамі, весці разведку. Быў устаноўлены пароль, для сувязі падабралі некалькі «паштовых скрынак».

Здарылася так, што арыштавалі салістку ансамбля Лідзію Бархатаву. Некалькі разоў прыводзілі ў гестапа Лузеніна і Акаёмава па справе Бархатавай. Кроў стыла ў жылах, калі бачылі арыштаваную. Гітлераўскія каты не вырвалі ў яе прызнання, і праз некалькі дзён Лідзію расстралялі.

Прайшло два тыдні. Ансамблю зноў дазволілі выступаць перад насельніцтвам. Лузенін і Акаёмаў распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі і марылі аб актыўнай барацьбе са зброяй у руках. Больш за ўсё канцэртаў давалі ў Чэрыкаве, дзе знаходзілася акруговае начальства, сюды ж адводзіліся часці на перафарміраванне. Артысты збіралі поўныя даныя аб іх, нават нумары часцей. Лузенін і Акаёмаў імкнуліся хутчэй устанавіць сувязь з чалавекам, аб якім гаварылі партызаны пры сустрэчы ў лесе. Неяк раніцай, на трэці дзень знаходжання ў Чэрыкаве, да іх падышоў чалавек у палі-

Г. П. Лузенін.

А. І. Акаёмаў.

цэйскай форме. Гэта быў адзін з кіраўнікоў Чэрыкаўскай падпольнай арганізацыі Іван Дзенісенка. Каля двух гадзін працягвалася размова. Дзенісенку цікавіла ўсё: як артысты трапілі на фронт, як стваралі ансамбль, захацеў паслухаць іх біяграфіі.

Акаёмаў нарадзіўся ў 1903 г. у г. Ражку Разанскай вобласці ў сям'і святара. У пятнаццаць гадоў пайшоў працаваць на чыгунку падсобным рабочым. З дзяцінства любіў пець. У 1923 г. паступіў у Маскоўскую кансерваторыю, але праз год яго выключылі як прафесійна непрыгоднага. Сапраўднай прычынай выключэння было сацыяльнае паходжанне. Акаёмаву ўдалося паступіць у студыю імя Станіслаўскага і адначасова ў музычны тэхнікум імя Рубінштэйна. Пазней зноў паступіў у кансерваторыю, якую скончыў у 1929 г. Напярэдадні вайны працаваў дацэнтам у Маскоўскай кансерваторыі і салістам на радыёцэнтры. У армію пайшоў добраахвотнікам у ліпені 1941 г.

Лузенін нарадзіўся ў 1909 г. у Пярмі ў сям'і патомнага каваля. Марыў стаць музыкантам. У 1928 г. паспяхова скончыў Пермскае музычнае вучылішча, затым Маскоўскую кансерваторыю. Пасля вучобы яго пакінулі ў кансерваторыі выкладчыкам на дырыжорска-харавым факультэце. У 1936 г. скончыў аспірантуру і працаваў намеснікам дэкана. Напярэдадні вайны кіраваў хорам пры опернай студыі і працаваў галоўным дырыжорам Маскоўскай дзяржаўнай абласной філармоніі. На фронт Лузенін таксама пайшоў добраахвотнікам, разам з Акаёмавым. Разам стваралі франтавы ансамбль песні і танца, разам трапілі ў лагер, разам пачалі весці падпольную работу ў тыле ворага.

Вызваліцца з лагера Акаёмаву і Лузеніну дапамаглі падпольшчыкі. У лагеры, нягледзячы на жорсткі рэжым, была створана падпольная група, у якую ўваходзілі ўрачы і камандзіры. Падпольшчыкі многім выратавалі жыццё. Ім выгадна было, каб Лузенін і Акаёмаў выйшлі на волю. Праз іх падпольная група хацела наладзіць сувязь з партызанамі, перадала даныя аб праціўніку некалькіх раёнаў.

Аляксандр Акаёмаў і Генадзь Лузенін выконвалі складаную і небяспечную работу, але настойліва прасілі дазволіць ім займацца дыверсіямі. Яны пераканалі Дзенісенку, што маюць магчымасць падкладваць міны пад аўтамашыны, вагоны, цыстэрны з гаручым, пакідаць іх у памяшканнях з немцамі. У снежні 1942 г. Акаёмаў і Лузенін уключыліся ў дыверсійную работу. За снежань 1942 г. і студзень 1943 г. ім выдалі каля дзесятка магнітных мін, якія яны падкладвалі ў Крычаве, Рослаўлі, Клімавічах, Касцюковічах і іншых гарадах Чэрыкаўскай акругі.

Аднойчы Акаёмаў і Лузенін вырашылі ўзарваць залу ў час канцэрта, на якім прысутнічалі гітлераўцы і некалькі высокіх чыноў мясцовай адміністрацыі. Перад тым у іх адбылася сустрэча з сувязной Антанінай Зелянковай, якая атрымала ад іх інфармацыю і перадала новыя заданні. На развітанне Акаёмаў сказаў: «Магчыма, мы бачымся ў апош-

ні раз». Ён перадаў Зелянковай запіску, дзе было напісана: «Памятайце пра нас. Артысты Акаёмаў і Лузенін. Масква». Яны свядома ішлі на смерць, замініравалі сцэну, на якой знаходзіліся самі. Міну завялі на 9 гадзін вечара. У гэты час на сцэне павінна была выступаць нямецкая трупа. Падпольшчыкі ішлі на рызыку, міна магла выбухнуць і раней. На жаль, калі ўзарвалася міна, у зале нікога не было. Аб'явілі паветраную трывогу, і ўсе гледачы апынуліся ў бомбасховішчы.

З восені 1942 г. за Акаёмавым і Лузеніным пастаянна сачылі шпікі. Нарэшце здрадніку Макарэнку ў г. Крычаве, дзе пастаянна пражывалі артысты, удалося заваяваць іх давер. На шчасце, правакатар ведаў толькі дваіх.

9 ці 10 лютага 1943 г. Акаёмава і Лузеніна арыштавалі. Іх пасадзілі ў адзіночныя камеры. Доўга дапытвалі, патрабавалі прызнання і выдачы падполля. Але нічога не дабіліся.

Вечарам, у люты мароз, іх вывезлі за р. Сож, ва ўрочышча Прудок. Акаёмаў быў босы. Яны ішлі, падтрымліваючы адзін аднаго. На краю ямы ў апошнюю хвіліну іх жыцця Акаёмаў запеў «Арлёнка». Голас гучаў у вячэрняй цішыні як прызыў да барацьбы, яго падтрымаў Генадзь Лузенін. Песню сяброў абарвала кулямётная чарга...

У імя жыцця

15 верасня 1942 г. з 620-га атрада вылучылася ініцыятыўная група, у якую ўваходзіла да сарака партызан, і быў створаны 720-ы атрад. Праз два месяцы ён налічваў ужо больш за трыста чалавек.

У новым атрадзе не было ўрача. Начальнікам санчасці назначылі Агнію Сцяпанаўну Старадворскую. Яна несла адказнасць за медыка-санітарнае становішча ўсяго атрада, ды і не толькі атрада. Медыцынскі персанал праводзіў вялікую працу сярод насельніцтва партызанскіх зон.

Праца медыкаў у ваенны час была складанай і цяжкай, асабліва ў тыле ворага, ва ўмовах партызанскай барацьбы. І нават калі байцы адпачываюць, медыкі працягваюць працаваць. Заўсёды ёсць параненыя і хворыя. Акрамя таго, патрэбна своечасова праверыць санітарны стан у атрадзе і ў бліжэйшых населеных пунктах. Часта прыходзяць з вёсак, просяць доктара.

Харчаваліся партызаны дрэнна і нерэгулярна. Тыднямі, а калі і па некалькі месяцаў без гарачай яды, у час блакады таго горш — на галодным пайку. Прыходзілася есці неядомыя ягады, сырыя грыбы і сырую агародніну. Людзі атручваліся, пакутавалі ад расстройства жывата. Медыкаментаў жа не хапала. Пасля кожнага бою было шмат параненых. Цяжкапараненых патрэбна было неадкладна аперыраваць. Хірургічнага інструменту амаль не было, стэрыльнага матэрыялу, абязбольваючых сродкаў таксама, не заўсёды быў спірт, больш карысталіся самагонам. Перавязачным матэрыялам часцей за ўсё служыла бялізна. Аўтаклава для стэрылізацыі не было, яго замяняў звычайны касцёр, а ў вёсцы — жалязка. Кіпяцілі інструменты ў кацялках альбо чыгунках. І вельмі часта рабілі гэта пад варожым абстрэлам.

Вось у такіх умовах працавалі медыкі пад кіраўніцтвам Агніі Сцяпанаўны. Дзякуючы іх самаадданай працы ў атрадзе не было ніводнага выпадку інфекцыйных захворванняў. Вопыт аперацыйнай сястры, які набыла Агнія Сцяпанаўна ў мірны час, спатрэбіўся зараз. Яе мацярынскія адносіны да параненых і хворых, умелыя і лоўкія рукі пры апра-

А. С. Старадворская.

Р. Д. Калінкіна.

цоўцы ран аблягчалі пакуты. Агнія Сцяпанаўна выконвала абавязкі начальніка санчасці да паяўлення ўрача. У ліпені 1943 г. яе перавялі ў роту 720-га атрада, якая дзейнічала асобна. Рота знаходзілася на правабярэжжы Сожа. Камандаваў ёю Ціт Храмовіч, а палітруком быў Аляксандр Зяцькоў. У кастрычніку 1943 г. рота не змагла разам з другімі атрадамі Чэрыкаўскай ваенна-аператыўнай групы злучыцца з наступаўшымі часцямі Чырвонай Арміі. З баямі яна адышла на захад, у міжрэчча Дняпра і Проні. Там разам з 13-м Смаленскім і 15-м партызанскім палкамі, атрадам «За Савецкую Беларусь» трапіла ў блакаду. Гэта была адна з самых цяжкіх блакад для партызан. Вораг меў перавагу і ў жывой сіле, і ў тэхніцы, і ў тактычным манеўраванні. Жорсткія баі працягваліся 24 дні. Было многа параненых і кантужаных. У такіх абставінах баявая памочніца Агніі Сцяпанаўны — Рэня Калінкіна, сама знямоганая ад холаду, голаду і празмернай стомленасці, рабіла ўсё магчымае, каб выратаваць жыццё параненых. Яна аказвала не толькі першую неадкладную дапамогу, але і аперыравала. Часта здаралася так, што аперацыю пачынала на адным месцы, а заканчвала на другім. Рэня ўсе свае сілы і ўменне без астатку аддавала баявым сябрам, як магла аблягчала пакуты параненых.

Загінула Агнія Сцяпанаўна Старадворская, здзейсніўшы свой апошні подзвіг. Перад пачаткам блакады рота Ціта Храмовіча напала на адзін з нямецкіх маёнткаў, створаных акупантамі на калгасных землях. Завязаўся бой. Да немцаў падаспела дапамога. Прыйшлося адыходзіць. У гэты час быў цяжка паранены палітрук Аляксандр Зяцькоў. Агнія Сцяпанаўна пад кулямі ва ўвесь рост пабегла да яго. І тут сама была паранена, але да палітрука дабегла. Не звяртаючы ўвагі на сваё раненне і кулі, яна пачала рабіць перавязку Зяцькову. Схілілася над ім. Другая куля аказалася для Агніі Сцяпанаўны смяротнай. Так загінула партызанская доктарша Старадворская.

Не толькі куляй і штыком

Умовы патрабавалі цеснага ўзаемадзеяння ўзброенай і ідэалагічнай барацьбы супраць ворага. Гебельсаўскія органы прапаганды разгарнулі шалёную актыўнасць па дэзінфармацыі насельніцтва акупіраваных тэрыторый. У вялікай колькасці прысылалі сюды рознага роду лістоўкі, звароты, плакаты, «дакументальныя» выданні, ілюстраваныя часопісы. Выдаваліся газеты акруговых аддзелаў прапаганды.

Гітлераўцы актыўна вялі і вусную прапаганду. Чэрыкаўскі акруговы гаўрэднер і супрацоўнікі яго аддзела раз'язджалі па гарадах і раённых цэнтрах, заглядвалі ў буйныя населеныя пункты, дзе стаялі нямецкія гарнізоны.

Выкрыццё гебельсаўскай хлусні не выклікала вялікіх цяжкасцей, але нас было мала. Трапіць у горад і населеныя пункты было амаль немагчыма. Лягчэй правесці дыверсію ці



Смерть немецкім оккупантам!

Братья и сестры! Рабочие, крестьяне и интеллигенция ЧЕРИКОВЩИНЫ

Наша героическая Красная Армія под руководством геніального вождя і полководца маршала Советского Союза тов. Сталіна гонит гітлеровскую армію на запад, освобождая от фашістскіх мерзавцев родные города і деревні. Красная Армія, закаленная в жестокіх боях, научілась біть і гнать немцев. Только за період зімнего наступленія Красная Армія освободіла от немецкіх захватчиков территорію в 480 тыс. кв. кілометров. Она уничтожіла за эту зиму на советско-германском фронте 850 тысяч солдат і офіцеров. Свыше 300 тыс. гітлеровцев захвачено в плен. Враг потерял более 20 тыс. орудій, около 10 тысяч танков і свыше 5 тыс. самолетов.

За это же время войска союзных армій полностью очістілі от італо-немецкіх войск Северную Африку і занялі свыше 300 квадратных кілометров італьянской территоріі на островах в Средіземном море.

Наша доблестная авіація і авіація наших союзников, превосходствуя над італо-немецкой авіаціей, громіт регулярно важные промышленные центры, военные объекты і коммуникаціі врага. Важные заводы Германіі і Італіі взлетают в воздух.

Істінные сыны своей родіны—Красные партізаны ні на один час не дают спокоя фашістскім разбойнікам в тылу.

Кончілісь успехі немецкой арміі, гітлеровскіе кровопійцы і іх лакеі, подлые Шеркевічі, Мослаковы і др. предателі і іменнікі родіны чувствуют свой блізкій конец.

Гітлеровское правительство, выдавая спасті себя от гібелі об'явіло всеобщую мобілізацію людей і ресурсов Германіі. Эту мобілізацію распространілі і на все оккупированные страны. В Чериковском районе немцы проводят так-же мобілізацію, они под разными предлогами вызывают мужчин от 16 до 60 лет в полицію в комендатуру на медосмотр і под сілой оружія, страхом смерті отправляют іх на каторгу в Германію ілі-же для пополненія рядов поліціі і „народной арміі", заставляя сражатся за інтересы подлых захватчиков.

Дорогіе братья і сестры! Чериковскій РК КП(б)Б призывает вас, не ідіте на немецкую провокацію, не давайте себя угонять в немецкую кабалу, не ідіте служіть кровавым ізвергам. Срывайте все мероприятія немецкіх властей, не давайте немцам хлеба і другіх продуктов, уничтожайте гітлеровскіх захватчиков, іх склады, техніку, мосты шосейные і железные дорогі, і лініі связі. Помогайте партізанам в іх борьбе с фашістами, беріте оружіе і вступайте в партізанскіе отряды для быстрейшего ізгнанія с нашей родной земли ненавістных захватчиков. Всем-же, кто служит немецкім властям, еще есть возможность іскупіть свою віну перед родіной, подумайте об этом. Настанет час, когда будет уже поздно. Честной работой в пользу родіны і Советской власті вы можете іскупіть свою віну. Только единой борьбой против ненавістного врага в тылу мы поможем Красной Арміі в быстрейшем освобожденіі нашей родіны от фашістскіх захватчиков і выполнім долг гражданина перед родіной.



Чериковскій РК КП(б)Б.

Смерть немецкім оккупантам!

Дорогие братья, сестры, рабочие и крестьяне Чериковщины!

Наша славная Красная Армія с 12 іюля сего года перешла в контрнаступленіе на различных направленіях фронта. Севернее і восточнее г. Орла наші часті прорвалі сільно укрепленную лінію фронта і продвінулісь вперед более чем на 80 клм., освободів от гітлеровцев сотні населенных пунктов. Только за два дня наступательных боев нашей Красной Арміей взято в плен более 2000 немецкіх солдат і офіцеров. Уничтожено 393 танка, 323 орудія, 360 самолетов, убіто свыше 14000 солдат і офіцеров.

Войска наших союзников, высадившісь на острове Сіцілія, успешно развівают наступленіе. На острове Сіцілія імі занято 7 городов, 6 аэродромов, захвачено большое количество пленных.

Немцы і подлые ізменнікі—поліцейскіе, бургомістры і прочіе, чувствуя свою немінуемую скорую гібель, наряду с угоном молодежі в Германію поставілі перед собой задачу, как можно скорее выкатать із населенія полностью урожай этого года.

Чериковскій районный комітет Коммуністической Партіі (большевиков) Белоруссіі призывает вас принять все меры к тому, чтобы ваш хлеб урожая этого года не попал в рукі фашістскіх ізвергов. Срывайте всякіе продовольственные заготовки, не сдавайте ім хлеба і другіх продуктов ни одного килограмма. Весь обмолоченный хлеб прячьте подальше от врага.

Помніте, что гнуетному произволу немецкіх палачей наступает конец. Красная Армія освободіт вас от этіх кровопійцев.

Чериковскій РК КП(б)Б.

Прочітав—передав другому.

Лістоўкі Чэрыкаўскага падпольнага райкама КП(б)Б.

ўзброены налёт, чым пранікнуць у горад у якасці агітатара. Мы маглі толькі пераправіць туды абмежаваную колькасць лістовак. І так было да стварэння падпольных арганізацый.

К 1942 г. райкам набыў вопыт палітычнай работы сярод насельніцтва. Але самым важным было тое, што ў хуткім часе была ўстаноўлена сувязь з Вялікай зямлёй, з Цэнтральным камітэтам КП(б)Б, а затым з Беларускім штабам партызанскага руху. Пачалі рэгулярна атрымліваць адтуль газеты, лістоўкі, брашуры. Паявілася рацыя. Сталі слухаць Маскву, прымаць і распаўсюджваць зводкі Саўінфармбюро. Падпольны райкам партыі два-тры разы ў месяц выпускаў звароты да насельніцтва. Некалькі пазней пачала выходзіць міжраённая падпольная газета.

Газеты і лістоўкі ў асноўным распаўсюджвалі падпольныя партыйныя, камсамольскія і іншыя патрыятычныя арганізацыі. Чэрыкаўскай падпольнай арганізацыі, якой кіраваў Іван Дзенісенка, адводзілася вялікая роля ў гэтай справе. У горадзе амаль кожны дзень з'яўляліся нашы лістоўкі на ўсіх рэкламных шчытах, на агароджах цэнтральных вуліц, на будынках, дзе размясціліся камендатура і іншыя фашысцкія ўстановы. Але часцей, чым у іншых месцах, з'яўляліся лістоўкі і звароты там, дзе быў аддзел прапаганды. Гэта выводзіла гаўрэднера з раўнавагі, вызывала ў яго шалёную злосць. Ён патрабаваў ад начальніка жандармерыі, каб варту неслі не паліцаі, а жандары. Не дапамагло і гэта. Пар-

тызанскія лістоўкі рэгулярна з'яўляліся на нямецкіх загадах і распараджэннях, на партрэтах Гітлера. Фашысты вымушаны былі зняць партрэты свайго фюрэра з вуліц.

З лета 1942 г. партызаны распаўсюджвалі па ўсіх дзесяці раёнах Чэрыкаўскай акругі свае лістоўкі і газеты, часопісы, брашуры, што прыбывалі з Вялікай зямлі. Развозілі іх нашы раз'язныя разведчыкі і сувязныя Аляксандр Акаёмаў і Генадзь Лузенін. Яны дастаўлялі лістоўкі і газеты ў Рослаўль, Клімавічы, Касцюковічы, Журавічы і іншыя месцы. На шашы ад Журавічаў да Рослаўля антыфашысцкія лістоўкі распаўсюджвалі палякі-падпольшчыкі на чале з Кулем. Яны змайстравалі на шашы некалькі тайнікоў для нелегальнай літаратуры. Такі спосаб быў больш бяспечным. Нават у выпадку, калі гітлераўцы знойдуць такі тайнік, падпольшчыкам нічога не пагражала. Цяжэй прыходзілася Акаёмаву і Лузеніну. Яны не толькі перавозілі лістоўкі і газеты, але і самі расклейвалі іх. Калі ж наладзілі сувязь з падпольнымі патрыятычнымі арганізацыямі ў гарадах акругі, яны нелегальную літаратуру перадавалі гэтым арганізацыям.

Гітлераўцы былі бяссільны супрацьпаставіць нашай агітацыі і прапагандзе што-небудзь дзейнае. Работнікі гаўрэднера ішлі на ўсякія хітрыкі, ілжывасць і падман, але ў гэтым і была іх слабасць. Гебельсаўцы гаварылі і абяцалі адно, а эсэсаўцы і СД тварылі другое. Гебельсаўцы абяцалі сялянам зямлю, а фельдкамендатуры перадавалі ўсе лепшыя калгасныя і саўгасныя землі ва ўласнасць нямецкім памешчыкам. Гебельсаўцы абяцалі мір і справядлівы парадак, а эсэсаўцы расстрэльвалі і вешалі бязвінных людзей. Яны збудавалі шыбеніцы на плошчах і цэнтральных вуліцах гарадоў і вёсак. Кідалі людзей у машыны-душагубкі, турмы, палілі жывымі ў крэматорыях, запаўнялі равы трупамі мужчын і жанчын, старых і дзяцей.

З мэтай скампраметаваць партызан СД пачала ствараць фальшывыя «партызанскія» атрады, якія рабавалі насельніцтва, марадзёрствалі, насілавалі жанчын і дзяўчат, забівалі людзей. У в. Старынка яны не пашкадавалі нават старасту — свайго стаўленіка. Нашы сувязныя неадкладна паведамлялі ў атрад аб з'яўленні наваяўленых «партызан», і мы тут жа грамілі іх. Тады гітлераўцы пайшлі на новую правакацыю. Сталі пасылаць пад выглядам «партызанскіх» атрадаў агдкаманды, якія ветліва размаўлялі з насельніцтвам, асуджалі зверствы акупантаў, прызывалі брацца за зброю, а праз дзень-два ўрываліся ў гэтыя вёскі і палілі хаты. Тых жа, хто спачуваў ім як партызанам, карміў ці аказваў тую ці іншую дапамогу, расстрэльвалі на месцы.

Насельніцтву было цяжка разабрацца і адрозніць сапраўдных партызан ад правакатараў. Тым больш, што праз Чэрыкаўскі і Краснапольскі раёны перамяшчалася многа незнаёмых партызан з усходу на захад. Нашы агітатары ездзілі па вёсках, гутарылі з насельніцтвам, расказвалі аб фашысцкіх правакацыях, прызывалі к пільнасці і, у выпадку з'яўлення незнаёмых партызан, прапанавалі зараз жа паведамляць у штаб атрада, а пазней — у штаб ваенна-аператыўнай групы. Акрамя гэтага, камандаванне партызанскіх атрадаў актывізавала разведвальную і дазорную службы. Правакацыі гітлераўцаў былі сарваны.

У 1943 г. узнікла партызанская зона ў трох сумежных раёнах — Чэрыкаўскім, Прапойскім і Краснапольскім. У вёсках было разгромлена шмат нямецкіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў, ліквідаваны валасныя ўправы, а старасты самі разбеглiся. У распараджэнні акупантаў і

гебельсаўскіх прапагандыстаў засталіся толькі гарады і раённыя цэнтры. Вёскі для іх сталі недаступнымі. Тады немцы пачалі раскідваць свае прапагандысцкія матэрыялы з самалётаў.

К гэтаму часу мы стварылі матэрыяльную базу для прапаганды друкаванай літаратуры. Тры друкарні абслугоўвалі сем усходніх раёнаў Магілёўскай вобласці. Выпускаліся раённыя і міжраённыя газеты, друкаваныя лістоўкі-звароты. Зводкі Саўінфармбюро распаўсюджваліся кожны дзень і паўсюдна. У двух партызанскіх атрадах — 15-м і 721-м Чэрыкаўскай ваенна-аператыўнай групы былі створаны агіткалектывы, якія ўзначальвалі, як правіла, камісары атрадаў ці сакратары партыйных бюро. У 720-м атрадзе дзейнічала чатыры агіткалектывы — па аднаму ў кожнай роце і ў часці, якая займалася гаспадаркай. Кожны агіткалектыў меў акрэсленую, замацаваную за ім зону. Камісар 15-га атрада Яфім Касмачоў і палітрук 3-й роты 720-га атрада Аляксандр Зяцькоў праводзілі агітацыйна-масавую работу на правабярэжжы Сожа. Яны падтрымлівалі пастаянную сувязь з падпольшчыкамі верамейскага куста, Лабанаўскага, Шароеўскага, Глінскага і Язёрскага сельсаветаў. Камсамольцы Федзя Ткачоў, Саша Новікаў, Лёня Аўдзееў, Вася Іваноў, Ваня Меранцоў, Толя Елісееў і іншыя сумяшчалі агітацыйную і дыверсійную работу на станцыі Верамейкі і ў прылягаючых вёсках. Яны гутарылі з насельніцтвам, расклейвалі лістоўкі падпольнага райкама КП(б)Б ці зводкі Саўінфармбюро і абавязкова падкладвалі міны пад цыстэрны з гаручым ці пад вагоны з боепрыпасамі. Асабліва вылучыліся Федзя Ткачоў, Вася Іваноў, Саша Новікаў і Лёня Аўдзееў.

Кіраўнікі агіткалектываў палітрукі 1-й і 2-й рот 720-га атрада Аляксандр Стаўцаў і Леанід Абрамаў, камісар 721-га атрада Аляксандр Львоў узначальвалі агітацыйную работу на левабярэжжы Сожа ад Крычава да Краснаполля. Яны ж падтрымлівалі сувязь і дастаўлялі лістоўкі і газеты падпольшчыкам у вёскі Вепрын, Чудзяны і Пільню, дзе знаходзіліся моцныя нямецкія гарнізоны. У жніўні — верасні 1943 г. партызаны разгромілі гэтыя гарнізоны.

Падпольшчыкамі г. Чэрыкава кіраваў непасрэдна сакратар падпольнага РК КП(б)Б. Тлумачылася гэта тым, што неабходна было прытрымлівацца выключна строгай канспірацыі. Было многа правалаў, асабліва ў 1941 г. Мы ўпэўніліся, што падпольшчыкі з Чэрыкава, значная частка якіх працавала ў нямецкіх установах, маглі пазбегнуць правалу толькі тады, калі іх будзе ведаць абмежаваная колькасць людзей. Нават некаторым сувязным не называлі мы сапраўдных імён і прозвішчаў падпольшчыкаў, ведалі іх толькі па мянушках.

Асабістыя сустрэчы арганізоўвалі вельмі рэдка. Сувязь ажыццяўлялі праз сувязных і «паштовыя скрынкі». Зводкі Саўінфармбюро штодзённа дастаўлялі ў «паштовыя скрынкі», адкуль іх бралі падпольшчыкі і распаўсюджвалі ў горадзе.

Патрэбна ўспомніць кіраўніка агіткалектыву палітрука гаспадарчай часці 720-га атрада П. Д. Таўкача. Гэта быў пажылы чалавек, па прафесіі сувязіст, па роду сваёй службы ён прыязджаў амаль ва ўсе вёскі партызанскай зоны і ў населеныя пункты, якія прылягалі да гарнізонаў праціўніка. Многія яго ведалі асабіста.

Для Таўкача гаспадарчая і палітычная дзейнасць былі непадзельнымі. Ён больш, чым іншыя, прасіў у райкаме партыі агітацыйнай літаратуры, ахвотна распаўсюджваў яе сярод насельніцтва. Павел Данілавіч часта прабіраўся ў вёскі, дзе ста-

ялі гарнізоны ворага. Людзі чакалі яго з нецярпеннем. Ён праводзіў цікавыя, насычаныя канкрэтнымі і зразумелымі прыкладамі гутаркі на палітычныя тэмы. П. Д. Таўкач добра ведаў тэлефонную справу. Ён не толькі падслухоўваў размовы праціўніка, але і ўстройваў так, што лінія заставалася цэлай, а карыстацца ёю не маглі. І цяжка было выявіць пашкоджанне.

Палітрук 2-й роты 720-га атрада Леанід Абрамаў як кіраўнік агіткалектыву сумяшчаў агітацыйную работу з удзелам у мастацкай самадзейнасці. Выступленні Абрамава і яго агітатараў перад насельніцтвам суправаджаліся песнямі, танцамі і кароценькімі аднаактавымі п'есамі-скетчамі. Леанід сам быў добрым імправізатарам, экспромтам складаў прыпеўкі і парадыйныя песенькі. Асаблівым поспехам ён карыстаўся ў моладзі.

Многія камандзіры, такія, як начальнік штаба 721-га атрада Віктар Сільчанка, камандзір 1-й роты 720-га атрада Міхаіл Фёдараў, камандзір асобнага кулямётна-мінамётнага ўзвода Міхаіл Дубаносаў, начальнік разведкі Пётр Кубышкін, памочнік начальніка штаба ВОГ Міхаіл Хромаў і многія іншыя, былі добрымі агітатарамі і пастаянна сумяшчалі баявую дзейнасць з палітычнай.

Вялікую дапамогу партыйным органам у палітычнай рабоце сярод партызан і насельніцтва аказвалі камсамольскія арганізацыі: падпольны райкам ЛКСМБ, які ўзначальваў Іван Касцючэнка, атрадныя і падпольныя арганізацыі. Іван Касцючэнка займаў дзве пасады — сакратара райкама ЛКСМБ і палітрука групы разведкі. Ён пастаянна знаходзіўся ў руху. Інструктаваў кіраўнікоў падпольных камсамольскіх арганізацый, стварaў новыя, хадзіў на самыя небяспечныя аперацыі, пранікаў з разведчыкамі ў гарнізон праціўніка, даваў заданні падпольшчыкам. І заўсёды памятаў аб агітацыйнай рабоце.

Успамінаецца такі выпадак. У ліпені 1943 г. Іван пайшоў на правы бераг Сожа, правёў там пасяджэнне райкама, на якім прынялі ў камсамол верамейскіх падпольшчыкаў Сашу Новікава, Лёню Аўдзеева, Ваню Меранцова, Васю Іванова і іншых. Затым пабываў у в. Наркі, Жытнёў, Юдаўка. Нарэшце выраШыў схадзіць на станцыю і ў в. Верамейкі на сустрэчу з падпольшчыкамі. Была нядзеля, на базар і ў царкву сцякалася многа народу з навакольных вёсак. Фашысты ў такія дні часта рабілі аблавы на моладзь для адпраўкі ў Германію. І калі б не падпольшчыкі, якія служылі ў паліцыі, Івана таксама адправілі б у Германію ці як партызана павесілі б.

Агітацыйную работу праводзілі не толькі партыйныя і камсамольскія арганізацыі. У ёй прымала ўдзел усё насельніцтва, беспартыйныя рабочыя і сяляне, інтэлігенцыя — урачы, настаўнікі, аграномы.

У в. Нова-Малінаўка пражываў 64-гадовы калгасны пчалавод Пахом Кудраўцаў. Ён прымаў удзел у першай сусветнай вайне, добра ведаў немцаў і стаў выдатным агітатарам. Пахом Кудраўцаў не выступаў з прамовамі на пасяджэннях, але ў сваіх размовах з аднавяскоўцамі і нават з паліцаямі з дапамогай прыказак і прымавак умела агітаваў за Савецкую ўладу. Дзмітрый Асмалоўскі з в. Сененка, як і Пахом Кудраўцаў дапамагаў партызанам і падпольшчыкам зброяй, прадуктамі харчавання і даходлівым словам агітатара. У в. Лысаўка з 1941 г. дзейнічала група патрыётаў. У яе ўваходзілі Анастасія Селівестраўна Турчанка, жонка яе брата Ксенія Герасімаўна, стараста Антон Афанасьевіч Юдзянкоў і іншыя. Гэта група дапамагала партызанам не толькі матэрыяльна. Падпольшчыкі сабралі значную

колькасць зброі, у тым ліку чатыры ручных кулямёты і адзін станковы, многа боепрыпасаў. З першых дзён акупацыі і да вызвалення раёна яны з'яўляліся сувязнымі і разведчыкамі падпольнага райкама партыі і мясцовага партызанскага атрада.

Анастасія Селівестраўна, якая ўзначальвала гэту групу, была добрым, дысцыплінаваным канспіратарам, рызыкавала, але прадумана. Падпольшчыкі за ўвесь час страцілі толькі аднаго чалавека — А. А. Юдзянкова. Антона Афанасьевіча расстралялі гітлераўцы за тое, што ён забяспечваў партызан прадуктамі харчавання, адзеннем, абуткам і не выконваў распараджэнняў акупацыйных улад. Анастасія Селівестраўна Турчанка прыцягнула да падпольнай работы свайго брата Савелія Селівестравіча Ярмоленку з в. Чудзяны. Ён перадаваў партызанам звесткі аб карным атрадзе, які пастаянна знаходзіўся ў Чудзянах. Група А. С. Турчанка распаўсюджвала партызанскую друкаваную літаратуру, прысланыя з Вялікай зямлі газеты, брашуры, зводкі Саўінфармбюро і іншыя матэрыялы.

Гітлераўцы не хацелі мірыцца з паражэннем у ідэалагічнай барацьбе. Аднойчы яны наляцелі ў в. Глінь. Але як толькі гебельсаўскія агітатары пачалі выступаць перад сілком сагнанымі жыхарамі, партызаны акружылі вёску. Завязаўся бой.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Храмович Г. А. Три партизанских года. 2-е изд. Мн., 1981. Пераклад на бел. мову Т. Руткоўскай.

Змагалася моладзь

Склікаць камсамольскую канферэнцыю перашкодзіла наступленне гітлераўцаў на партызан. Яна адбылася першымі днямі чэрвеня 1943 г. На канферэнцыі прысутнічалі прадстаўнікі адзінаццаці камсамольскіх арганізацый (восем падпольных і тры атрадныя). З дакладам аб рашэннях лютаўскага (1943) Пленума ЦК КП(б)Б і задачах камсамольскіх арганізацый выступіў Іван Касцючэнка. У спрэчках прыняло ўдзел болей дзесяці чалавек.

Цікавымі і змястоўнымі былі выступленні сакратароў падпольных камсамольскіх арганізацый Вольгі Чарняковай, Федзі Ткачова і Ані Меранцовай. Яны падзяліліся вопытам работы сваіх арганізацый, расказалі аб цяжкасцях, з якімі прыходзіцца сутыкацца маладым патрыётам.

Асабліва ў складаным становішчы знаходзілася Верамейская камсамольская арганізацыя. На станцыі Верамейкі размясціўся гітлераўскі гарнізон. Выходзіць з вёскі без спецыяльнага пропуска не дазвалялася. Тады хлопцы і дзяўчаты з Верамеек і Наркоў сталі выкарыстоўваць у якасці явачнай кватэры царкву.

Выступіўшыя на канферэнцыі камсамольцы атрадных арганізацый узялі на сябе абавязацельства адкрыць асабовы баявы рахунак.

Канферэнцыя прыняла пастанову-зварот да моладзі раёна, дзе гучаў прызыў да актыўнай барацьбы з ворагам, да стварэння новых патрыятычных груп. Выбралі падпольны райкам ЛКСМБ. У склад яго ўвайшло тры чалавекі — Іван Касцючэнка, Фёдар Нікіфараў і Уладзімір Цідземан. Сакратаром падпольнага райкама зацвердзілі Івана Касцючэнку, які фактычна ўжо працаваў на гэтай пасадзе з мая.

На тэрыторыі раёна к маю 1943 г. дзейнічала 8 падпольных камсамольскіх арганізацый (па 3—5 чалавек у кожнай). К верасню іх было ўжо 27. Вялікую дапамогу ў арганізацыі камсамольскага падполля аказаў упаўнаважаны абкама ЛКСМБ П. Е. Астапенка.

Моладзь збірала зброю і боепры-

І. І. Касцючэнка.

Е. І. Серыкава (Гузнякова).

пасы. Па заданню камандавання партызанскіх атрадаў займалася разведкай. Распаўсюджвала сярод насельніцтва лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, звароты і заклікі, літаратуру і газеты, якія прыбывалі з Вялікай зямлі. Многія юнакі ўдзельнічалі ў дыверсіях, хадзілі праваднікамі з групамі падрыўнікоў.

Вялікую разведвальную і агітацыйную работу праводзіла падпольная камсамольская арганізацыя, якая была створана яшчэ ў жніўні 1941 г. Надзеяй Слюнькінай у в. Манастырок. Нязменным сакратаром гэтай арганізацыі была Маруся Міхненка. Членамі арганізацыі з'яўляліся дзве дачкі гаспадыні канспіратыўнай кватэры падпольнага РК КП(б)Б Таццяны Антонаўны Міхненка — Людміла і Таня, дачка сувязнога Паўла Нікеенкі — Жэня, а таксама Марыя Нікеенка. У снежні 1941 г. Марыю Нікеенка расстралялі гітлераўцы. Аднак гэта не зламала волю камсамольцаў. Яны сталі больш асцярожнымі, без патрэбы не рызыкавалі. Гэта арганізацыя перадала ў атрад 3 кулямёты, 3 нямецкія аўтаматы, скрынку патронаў, 2 веласіпеды, 9 процітанкавых мін.



Чашковскому райкому ЛКСМ(б)
от ком-на Ткачева Федора Митрофан

Заявление.

Прошу райком комсомола принять меня в ряды комсомольцев, так как я желаю вступить в партизанский отряд комсомольцев и обещаю исполнить все что мне будет поручено

Просителя Ткач

Заява Ф. М. Ткачова.

Восенню 1941 г. Іван Дзенісенка стварыў падпольную маладзёжную групу, у якую ўваходзілі яго сястра Марыя, Вольга Чарнякова, Аня Меранцова. У 1942 г. гэта група значна выросла і падзялілася на дзве падпольныя камсамольскія арганізацыі — Наркоўскую і Юдаўскую. Сакратаром Наркоўскай арганізацыі была Вольга Чарнякова (падпольная мянушка «Рая»). Акрамя яе, яшчэ чатыры чалавекі: Марыя Дзенісенка, Кацярына Серыкава і дзве сястры — Паліна і Шура Кавалёвы.

Гэта арганізацыя падрыхтавала і накіравала ў атрад пятнаццаць чалавек са зброяй, пераправіла дзесяць вінтовак, адзін ручны кулямёт, больш двух тысяч патронаў, некалькі дзесяткаў гранат і мін. Сістэматычна праводзіла антыфашысцкую агітацыю сярод насельніцтва, распаўсюджвала лістоўкі і газеты, вяла разведвальную работу. Самай актыўнай была Вольга Чарнякова. Яна хадзіла ў гарнізоны праціўніка і некалькі разоў у Чавусы, каб правесці разведку на станцыі і аэрадроме. Здабытыя звесткі дапамаглі 13-му палку разграміць 14 мая 1943 г. варожы гарнізон на станцыі і вывесці са строю ўсё абсталяванне, стрэлкі і пад'язныя пуці. Патрыёты праводзілі дыверсіі і самастойна. Часта выводзілі са строю сувязь на бальшаку Чавусы — Чэрыкаў і на чыгуначнай дарозе Крычаў — Магілёў. Знішчылі болей дваццаці гітлераўцаў.

Юдаўскую арганізацыю ўзначальвала Аня Меранцова. Арганізацыя налічвала чатыры чалавекі. Як і Наркоўская, яна аказвала вялікую дапамогу партызанскім атрадам, вяла прапаганду сярод насельніцтва. Юдаўская і Наркоўская арганізацыі падтрымлівалі паміж сабой сувязь і дзейнічалі ў многіх выпадках сумесна.

Самай вялікай падпольнай камсамольскай арганізацыяй была Верамейская. Стварыў яе і стаў сакратаром Федзя Ткачоў. Члены: Саша Новікаў, Вася Іваноў, Лёня Аўдзееў, Ваня Меранцоў, Толя Елісееў і іншыя — усяго 32 чалавекі. Патрыёты ўдала сумяшчалі масава-палітычную і разведвальную дзейнасць з дыверсійнай. Яны не раз выводзілі са строю стрэлачную гаспадарку, пункт сувязі, замарожвалі водаправодныя трубы, што ішлі ад вадакачкі да станцыі. Падлажылі болей трыццаці мін пад цыстэрны з гаручым і вагоны з боепрыпасамі.

Па рашэнню камсамольскай арганізацыі Толя Елісееў пайшоў у паліцыю. Ён не толькі інфармаваў арганізацыю аб стане спраў і планах гітлераўцаў, але і сам удзельнічаў у дыверсіях. Так, стоячы на варце, Толя прапусціў сваіх сяброў да складцэйгаўза. Калі змяніўся з паста, на складзе ўспыхнуў пажар.

Душой камсамольскай арганізацыі стаў Федзя Ткачоў. Ён паказваў прыклады мужнасці і смеласці, знаходлівасці і бязмежнай любові да Радзімы. Ні адна аперацыя не абыходзілася без яго ўдзелу. Вось вытрымкі з дзённіка баявых дзеянняў за верасень 1943 г.:

16/IX падложаны дзве магнітныя міны пад эшалон з аўтамашынамі. Выканаўца Ткачоў.

17/IX падложаны дзве міны на вадакачцы ст. Верамейкі. Выканаўца Ткачоў.

22/IX падложаны дзве міны ў эшалон з гаручым. Выканаўца Ткачоў.

Л. І. Аўдзееў.

У в. Горкі сакратаром камсамольскай арганізацыі быў Алёша Крыянкоў. Рабяты пераправілі ў атрад 16 вінтовак, бінокль, 300 патронаў, дзесятак гранат.

Як ствараліся падпольныя камсамольскія арганізацыі і ў якіх умовах яны працавалі, можна прасачыць на такім прыкладзе. Адразу ж пасля акупацыі раёна гітлераўцы размясцілі ў в. Пільня гарнізон. Вёска стаяла на бальшаку Чэрыкаў — Краснаполле. Устанавілі каменданцкую гадзіну. Забаранілі моладзі збірацца па вечарах. Настаў цяжкі час. Насельніцтва пазбавілі ўсіх правоў. За малейшае парушэнне «новага парадку» — расстрэл, шыбеніца ці канцлагер.

Але гэта не спалохала патрыётаў. Камсамолкі Поля Волкава і Надзя Марыненка спачатку дапамагалі сувязному партызан — роднаму дзядзьку Паліны — Васілю Васілевічу Волкаву. Дзяўчатам лягчэй было выйсці днём з вёскі і перадаць партызанскім разведчыкам даныя аб варожым гарнізоне. В. В. Волкаў, пераканаўшыся, што юныя памочніцы выконваюць правілы канспірацыі, прыцягнуў іх да збору зброі і боепрыпасаў, якія заставаліся на палях, дзе праходзілі баі. Калі вакол вёскі сабралі ўсё і схавалі ў надзейным месцы, дзяўчаты і сын Волкава Саша пачалі цягаць патроны ў гітлераўцаў.



Смерть немецким оккупантам!

Германия – страна рабов, голода и смерти

Юноши и девушки Черіковского района.

Немецко-фашистский лагерь переживает тяжелый военный кризис. Озверелый враг – Гітлер і его клика, чувствуя свою неизбежную гибель, готовит нові злодеяния, новые авантюры. Гітлеровцы проводят „тотальную мобілізацію" они насильно, под страхом оружія, і смерті, угоняют юношей і девушек Белоруссії на каторжные работы в Германію.

Фашісты заставляют белорусскую молодежь ковать оружіе против своіх братьев, сестер і отцов.

Молодой Черіковчанін! Каждый вывезенный в Германію заженет немца, который пришел на нашу землю, чтобы вешать, насіловать твою сестру, мать, убіват твоего отца, брата. Каждый снаряд, пуля, отлитые руками белоруса на немецком заводе, несет смерть твоей семье, увелічівает потоки священной крові наших братьев сестер.

До нас дошлі коммунічные документы письма юношей і девушек, насільно угнаных немцами на каторжный труд в фашістскую Германію. Белорусская девушка Мэруся Д. пішет родителям із г. Зоненберга: „Я нахожусь в городе Зоненберге, работаем мы на фабріке. Жіем мы в бараке 150 человек, спім на соломе. Работать заставляют много, а кормят суном із трави. Мамі, вы хоть ешіте картошку, а я бы теперь в нашу паеласть, тогдабы хоть і умереть. Как трудно! Я вся похудела, мамочка! Мы жіем в бараках за рєшеткой, как тюремные. Не проходіт одного дня, чтобы я не поплакала. Как, подумаю, на что идет труд наш рук, так і зальюсь слезамі. Лучше-б было мне умереть, чем работать на этой фабріке. Дорогіе родітелі! Ох, как мне трудно жіть, я сама незнаю, что мне делать! Н. досипаю не допьющь і не заснешь. Еслібы, насильственно дубіны засунул, чтобы не відеть нічего. Прощайте. Остаюсь ваша еще жівая дочь Маруся".

Молодой Черіковчанін! Ты слишіш стоны твоіх братьев і сестер, насільно вывезенных немцами на чужбіну? Ты відіш политые кровью дороги, по которым гнали в Германію наших бліских і знакомих? Зверская расправа с населенієм оккупірованных районов Белоруссії, ті зверства не прошлі мимо нас. Черіковчане, фашістскіе звері подкрались как бандіты і с опушкі леса сожглі деревню Бакуновічі і Ушакі. Сейчас томятся в германских лагерях, сотні вывезенных в Германію молодых черіковчан работающіх под насілієм оружія на фабріках і заводах Германії, которые работают по 16-18 часов в сутки, а кормят іх баландой.

Юноши і девушкі Черіковского района, срывайте гітлеровскую „тотальную мобілізацію"! Ідіте в партізанскіе отряды, уходіте в леса при появленії партізанских отрядов не давайте увезіть вас в Германію. Германія – страна рабов, голода і смерті. Час рассчитаться за издевательства над нашим народом – вот долг каждого молодого патріота. І мы должны выполніть этот долг с честью.

Черіковскій райком ЛКСМБ.

Прочітав – передай другому.

Лістоўка Чэрыкаўскага падпольнага райкама ЛКСМБ, 1943 г.

У пачатку 1942 г. акупанты разгарнулі шумную кампанію па «добраахвотнай» вярбоўцы юнакоў і дзяўчат на работы ў Германію. Моладзі абяцалі залатыя горы: высокія заработкі, добры харч, цікавае і культурнае жыццё. У Пільні добраахвотнікаў не знайшлося. Тады немцы загадалі, каб староста перапісаў усіх працаздольных ад 16 гадоў і старэйшых. Меркавалі праверыць іх на медкамісіі і фізічна здаровых сілком павезці ў Германію.

Было некалькі спосабаў пазбегнуць адпраўкі на чужыну. Пайсці ў паліцыю. Але гэта азначала здрадзіць Радзіме. Спачатку не чапалі тых, хто працаваў у акупантаў. Але ў гарнізоне рабочых месцаў было мала. Лепшым выхадам было дастаць медыцынскую даведку аб хваробе. Але дзе яе ўзяць? Заставалася яшчэ адна магчымасць — жаніцьба. Яе скарыстоўвалі многія. Хто браў сапраўдны шлюб, а хто — фіктыўны.

Надзя Марыненка, Поля і Зіна Волкавы ўладкаваліся на працу ў гарнізонную кухню пасудніцамі. Часова бяда абмінула. Мала таго, яны атрымалі пропускі, якія давалі права хадзіць вечарам і ноччу. А для сувязных гэта вельмі важна. У хуткім часе Зіне даручылі вазіць малако. Яна часта ездзіла ў навакольныя вёскі — Ушакі, Кажамякіна, Фёдараўку, Галоўчыцы і іншыя. Васіль Васілевіч Волкаў неадкладна скарыстаў гэты выпадак. Праз Зіну ён стаў перадаваць партызанам усе разведданыя. А з атрада яна прывозіла лістоўкі і газеты.

З'яўленне ў гарнізоне лістовак і газет выклікала страшэнны перапалох у гітлераўцаў. Пачаліся павальныя вобыскі, некалькі дзён нікога не выпускалі з вёскі. Але лістоўкі працягвалі паяўляцца. Зіна была на падазрэнні. За ёю пачалі сачыць. Але Зіна была асцярожнай. Яна хавала газеты і лістоўкі на дне павозкі ў тайніку, у хамуце каня і нават у бітонах з малаком. І ні разу не папалася.

У 1942 г. камсамольская група папоўнілася новымі рабятамі. У яе ўвайшлі Косця Крыжэвіч, Вася Давыдзенка, Міша Духоўскі. Цяпер іх налічвалася сем чалавек. Цэлая камсамольская арганізацыя. Вырашылі прыняць прысягу. У партызанскай замянілі некаторыя словы, а замест «уступаючы ў рады партызан» напісалі «у падпольную арганізацыю» і паставілі свае подпісы.

Паступова рабяты перайшлі к дыверсіям. Немцы аднавілі смалакурны завод. Доўга рыхтавалі яго да пуску. Меркавалася, што з Чэрыкава прыедуць камендант і бургамістр раёна на адкрыццё завода. Падпольшчыкі сарвалі гэтыя планы. У іх былі іншыя.

Яшчэ ў пачатку вайны яны схавалі каля сцен завода аманал, якім рабочыя падрывалі карчы. У ноч напярэдадні пуску завода рабяты прабраліся да свайго тайніка, уставілі капсуль, злучылі яго з доўгім бікфордавым шнурам і падпалілі. Пакуль шнур гарэў, смельчакі паспелі вярнуцца дамоў. Узрыў атрымаўся магутны. Здэтаніраваў аманал, які прывезлі самі немцы і склалі ў будынку завода. Сцены і абсталяванне былі разбураны. Прычыну ўзрыву немцы не ўстанавілі. Так Косця Крыжэвіч, Саша Волкаў, Вася Давыдзенка і Міша Духоўскі ўпершыню ў сваім жыцці правялі значную дыверсію.

Вёска Пільня стаіць на беразе Сянны. Рака невялікая, але ля вёскі ўтварыўся плёс шырынёй прыкладна 40—45 м. Летам гітлераўцы часта купаліся ў рэчцы, папярэдне выставіўшы на супрацьлеглым беразе ў лесе варту. Спадзеючыся на яе, вялі сябе бесклапотна, зброю і адзенне пакідалі без догляду. І нечакана ў іх стала прападаць зброя. Спачатку знік аўтамат, затым вінтоўка.

Рабяты ўвайшлі ў смак і ўжо бралі адначасова па 3—4 аўтаматы. Тады немцы выставілі варту непасрэдна каля адзення і, калі хто паварочваў у бок ракі, стралялі не папярэджваючы.

У гарнізоне было некалькі мінамётаў сярэдняга калібру. Яны заўсёды знаходзіліся на баявых пазіцыях. Пры малейшым шуме ў лесе з іх адкрывалі агонь. Аднойчы ўсе мінамёты выйшлі са строю. Мінамётны разлік атрымаў раненні. Калі сталі высвятляць прычыну, аказалася — у мінамётах пясок.

Зброю, патроны і гранаты рабяты хавалі на могілках. Вось чаму павальныя вобыскі ў вёсцы не давалі вынікаў. Зброя, прапаўшая ў немцаў, быццам скрозь зямлю правальвалася. Але яе яшчэ трэба перадаць партызанам. За гэта ўзяліся Вася Давыдзенка і Міша Духоўскі.

Косця Крыжэвіч стаяў у дазоры. У выпадку з'яўлення гітлераўцаў ён павінен быў даць сігнал трывогі. Вася і Міша адкапалі зброю, размеркавалі паміж сабой груз і накіраваліся да партызан. Адышлі метраў сто — і раптам немцы.

Як высветлілася потым, гітлераўцы западозрылі рабят, калі тыя выходзілі з вёскі, і пачалі сачыць за імі. Змаглі непрыкметна падкрасціся да могілак. Васю і Мішу доўга дапытвалі тут жа на могілках, білі, але яны не выдалі сяброў. Пасля катаванняў іх расстралялі. Некалькі дзён забаранялі хаваць. Косцю Крыжэвічу ўдалося выратавацца. Гітлераўцы доўга шукалі трэцяга хлопчыка ў вёсцы, але так і не знайшлі.

У ліпені 1943 г. у 721-м атрадзе з'явіўся новы чалавек. Ён прасіў прыняць яго ў партызаны. Гаварыў, што збег з крычаўскага лагера, калі палонных выводзілі на працу. З выгляду быў не вельмі сыты, але і не вельмі змучаны. Многа расказваў пра лагерныя пакуты, здзекі, катаванні і іншыя страшныя рэчы. Рваўся ў бой, каб адпомсціць фашыстам за здзекі. На ім было рванае адзенне,

і гэта была адзіная прыкмета, што ён вязень.

Пачалі праверку. Сувязныя з Крычава паведамілі, што адміністрацыя лагера аб'явіла аб пошуках ваеннапалоннага, які ўцёк, апісалі яго выгляд. Гэтыя прыкметы сходзіліся з прыкметамі чалавека, які прыбыў у атрад. Але Поля Волкава і Надзя Марыненка перадалі, што бачылі ў вёсцы незнаёмага чалавека ў цывільнай вопратцы. У гарнізоне ён пражыў пяць дзён, нікуды не выходзіў. Яны прыкмецілі гэтага чалавека ў сталовай, калі прыбіралі посуд. Апісалі як ён выглядае. Прыкметы супалі.

Новапрыбыўшага арыштавалі. Калі старанна абшукалі, у лахманах знайшлі атрутныя рэчывы ў парашках. Спачатку ён адмаўляў, што гэта атрутныя рэчывы. Тады яму прапанавалі выпіць шклянку вады, у якой разбавілі парашок. Піць адмовіўся. Прыйшлося даваць паказанні.

У лагеры для ваеннапалонных ён ніколі не быў і не мог быць. Па нацыянальнасці немец. Доўга жыў у Савецкім Саюзе, добра ведаў рускую мову, меў воінскае званне гаўптмана (капітана). Яго мэта — атруціць камандны састаў, у першую чаргу М. Т. Перапечкіна і Г. А. Храмовіча.

У хуткім часе ў партызанскі атрад прыйшлі Поля і Надзя. Іх залічылі ў разведку і ўзнагародзілі медалямі «За адвагу». Косця Крыжэвіч ужо на фронце атрымаў узнагароды, але не дажыў да светлага Дня Перамогі.

Усе 27 камсамольскіх арганізацый раёна па меры магчымасці вялі агітацыйную і разведвальную работу, дапамагалі партызанам зброяй, боепрыпасамі, харчаваннем, рыхтавалі і накіроўвалі людзей у атрады.

Смела сталі на шлях барацьбы з акупантамі Каця Тарасевіч, Вера Барысенка, Ваня Міхееў, Надзя Цярэнцьева, Валодзя Чарненка,Саша Кажэўнікаў, Жэня Карабец, Зіна Ігнатава, Надзя Сідарэнка, Вася Семянкоў, Ксенія Семянкова, Вара Рухленкава, Саша Лешакова і іншыя.

Акрамя тэрытарыяльных, існавалі атрадныя камсамольскія арганізацыі. Яны паказвалі прыклад арганізаванасці, дысцыпліны, баявітасці, былі сапраўднымі памочнікамі партыйных арганізацый.

Сакратар падпольнага РК ЛКСМБ І. І. Касцючэнка ў дакладной запісцы ўпаўнаважанаму ЛКСМБ П. Е. Астапенку аб баявых дзеянных камсамольскіх арганізацый за жнівень 1943 г. пісаў, што камсамольцамі атрадаў пушчана пад адхон 5 эшалонаў праціўніка, знішчана больш 10 аўтамашын. Маладыя партызаны ўдзельнічалі ў разгроме варожых гарнізонаў у Дубровіцы, Чудзянах, Вепрыне і ў іншых населеных пунктах. Выканалі заданне па «рэйкавай вайне». Вялікую дапамогу аказалі ў стварэнні новых атрадаў і папаўненні ўжо дзейнічаючых людзьмі і ўзбраеннем. Міхаіл Алесаў, напрыклад, здаў у атрад 2 станковыя і 3 ручныя кулямёты, 41 вінтоўку, у тым ліку 11 СВТ, 3000 патронаў, 7 пісталетаў розных сістэм. Усяго камсамольцы дабылі і здалі партызанам 2 мінамёты, 3 станковых і 7 ручных кулямётаў, 5 аўтаматаў, 87 вінтовак, 333 гранаты, 25 мін розных калібраў, 30 узрывальнікаў, 75 кг толу.

Падпольным райкамам ЛКСМБ за кароткі час — чэрвень і ліпень 1943 г.— было падрыхтавана з камсамольцаў 33 мінамётчыкі, 50 падрыўнікоў і 45 кулямётчыкаў.

Камсамольцам Пецю Канавалаву і Валодзю Цідземану было толькі па 17 гадоў, калі іх назначылі камандзірамі ўзводаў разведкі. Федзя Аўраменка ў 17 гадоў стаў камсоргам буйнейшага 720-га атрада, Косця Шмідаў у 18 гадоў — старшым мінёрам, а яго брат Ваня Шмідаў у 16 гадоў — ліхім разведчыкам. Камса-

мольцы браты Русакевічы займалі ў атрадзе камандныя пасады. Сярэдні, Іван, узначальваў узвод, малодшы, Максім,— аддзяленне. Валодзя Доўбня ў 17 гадоў камандаваў аддзяленнем разведкі. Федзя Нікіфараў стаў намеснікам камандзіра роты. Цераха Сяброўскага назначылі камандзірам узвода. Алёша Салаўёў камандаваў дыверсійнай групай. Чатырнаццацігадовы Арнольд Урублеўскі, якога ў камсамол прынялі ў атрадзе, хадзіў з падрыўнікамі на чыгуначную дарогу і ў разведку, часта праз варожыя пасты прабіраўся ў Магілёў. Там правёў некалькі дыверсій.

Ф. І. Аўраменка.

Лепшых з камсамольцаў прымалі ў партыю. Летам 1943 г., як толькі Федзю Аўраменку, Валодзю Цідземану, Пецю Натычку, Мішу Дубаносаву, Федзю Нікіфараву, Валодзю Доўбню і іншым споўнілася па 18 гадоў, іх прынялі кандыдатамі ў члены ВКП(б).

Акрамя тэрытарыяльных і атрадных камсамольскіх арганізацый, на ўліку падпольнага райкама ЛКСМБ знаходзілася болей 70 камсамольцаў-адзіночак, якія, як правіла, з'яўляліся сувязнымі альбо разведчыкамі. Усе яны вялі агітацыйную работу сярод насельніцтва, многія з іх удзельнічалі ў дыверсіях. У асноўным яны жылі ў гарадах і вёсках, дзе размяшчаліся гарнізоны праціўніка, на раз'ездах чыгуначных дарог і ў малых пасёлках. Таму дзейнічалі часцей за ўсё ў адзіночку.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Храмович Г. А. Три партизанских года. 2-е изд. Мн., 1981. Пераклад на бел. мову. Т. Руткоўскай.

Я была вязучай

З успамінаў В. З. Чарняковай (Галенка), былога сакратара Наркоўскай падпольнай камсамольскай арганізацыі

Нарадзілася я ў в. Наркі. Скончыла Верамейскую няпоўную сярэднюю школу. У 1939 г. Магілёўскае дашкольнае педагагічнае вучылішча. Працавала выхавальніцай, калі пачалася вайна. Фашысты прасоўваліся на ўсход. Дакацілася вайна і да Магілёўшчыны. Выклікаў сакратар гаркама камсамола і прапанаваў застацца ў тыле ворага. Згадзілася. Вырашыла вярнуцца ў родную вёску. Сталі вяртацца дамоў і жыхары вёскі, былыя воіны, што трапілі ў акружэнне. Сярод іх Іван Дзенісенка, Іван Марозаў і іншыя. Ужо восенню 1941 г. была створана група, якая пачала дзейнічаць. Мы выконвалі рэкамендацыі Чэрыкаўскага падпольнага райкама камсамола. Слухалі Маскву, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро сярод насельніцтва, збіралі зброю. Арганізатарам і душой нашай групы стаў Іван Дзенісенка. Мы часта збіраліся ў яго дома, абмяркоўвалі пытанні, звязаныя з падпольнай работай. Іван лічыў, што патрэбна актыўней весці барацьбу з фашыстамі і іх памагатымі.

У кастрычніку 1941 г. члены нашай арганізацыі спалілі тры хаты, якія належалі здраднікам, забілі старасту.

Двойчы мне прыходзілася хадзіць на яўкі ў Магілёў. Шлях ад Наркоў да Магілёва быў нялёгкі. Апухалі ногі, ды трэба было вытрымаць. Да-

В. З. Чарнякова (Галенка).

памагала і тое, што побач была сяброўка — Аня Меранцова. Часта траплялі ў небяспечныя становішчы, але заўсёды знаходзілі выйсце з іх.

У сакавіку 1942 г. Дзенісенка па заданню падпольнага райкама партыі пайшоў служыць у паліцыю. Сувязь з ім падтрымлівалі ў асноўным праз яго сястру Марыю. Не было побач Дзенісенкі, і ў мяне прыбавілася абавязкаў.

Летам 1943 г. мне выдалі пропуск у 720-ы і 15-ы партызанскія атрады і 13-ы партызанскі полк. Па заданню камандзіра С. В. Грышына і сакратара падпольнага райкама партыі Г. А. Храмовіча я павінна была вывучыць становішча ў в. Асінаўка, дзе размясціўся варожы гарнізон. Здабытыя мною звесткі вельмі дапамаглі партызанам. Яны адным ударам знішчылі гітлераўцаў.

У жніўні 1943 г. атрымала новае заданне. У Чавусы, дзе знаходзілася фашысцкая школа перакладчыкаў, прыбылі нямецкія падраздзяленні. Рыхтавалася карная аперацыя супраць партызан. Мне неабходна было даведацца, колькі ўсяго прыбыло чалавек, чым узброены, калі мяркуюць пачаць аперацыю. Заданне было цяжкае. Разведчыца, якую паслалі ў Чавусы раней, не вярнулася.

Я была вязучая. Але на гэты раз у в. Галачоўка мяне затрымалі. Абшукалі. Нічога не знайшлі. Паглядзелі пашпарт. Там усё было ў парадку, стаяў чавускі штамп. Аднак мяне не адпусцілі. Пасадзілі на адну з павозак і павезлі ў Чавусы. У галаву лезлі розныя думкі, разумела, што можа здарыцца ўсё, што магу нават загінуць. Не ведала тады, што разведчыца, якую пасылаў падпольны райкам партыі, была схоплена і павешана ў парку ў той жа вёсцы, дзе былі расстраляны дзве мае сувязныя Надзя і Нюра.

Становішча, у якое трапіла, мне здавалася бязвыхадным. Але мне хацелася жыць, выканаць заданне. Я аглядзела паліцаяў і сярод іх убачыла «старых знаёмых». Калі хадзіла ў разведку ў Асінаўку, гадала ім на картах (і гэта прыходзілася рабіць). Закралася слабая надзея. Едзем далей. Бачу, бяжыць пляменнік Віля. Кінуўся на грудзі, стаў плакаць. Я зноў пачала прасіцца, даказваць, што ніякага дачынення да партызан не маю. Паверылі. Адпусцілі.

Назад вярталася праз лес, у адзенні старой бабкі. І зноў ледзь не загінула. Наступіла на міну. Калі раздаўся выбух, страціла прытомнасць. Ачуняўшы, убачыла, што мяне адкінула ўбок. Усё абышлося лёгкім перапалохам. У Жытнёве мяне сустрэлі камандзір 15-га партызанскага атрада Іван Нічыпаравіч Ваўчкоў і камісар атрада Яфім Арцёмавіч Касмачоў. Перадала здабытыя звесткі, расказала аб сваіх прыгодах.

Колькі было яшчэ ўсякіх выпадкаў. Рызыкаваць прыходзілася на кожным кроку, але ў той час пра гэта не думалася.

Маю работу ў падполлі адзначылі. Узнагароджана медалямі «За адвагу» і «За баявыя заслугі».

Пасля вызвалення Чэрыкаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працавала ў райкаме камсамола. Затым, са зменай сямейных абставін, пераехала ў Светлагорск. Працавала загадчыцай дзіцячым садам.

«Мядзведзь» і «Вавёрка»

З успамінаў Г. В. Меранцовай, былога сакратара Юдаўскай падпольнай камсамольскай арганізацыі

Г. В. Меранцова.

Вайна застала мяне ў Магілёве, дзе я працавала выхавальніцай у дзіцячым садзе. Разам з Вольгай Чарняковай на цягніку дабраліся да станцыі Верамейкі. Вольга пайшла ў Наркі, а я ў Юдаўку да свайго бацькі Васіля Міхайлавіча Меранцова. Ноччу схавалі дакументы і рэчы, а 25 ліпеня 1941 г. наляцелі немцы. У той дзень да нас завітаў Емяльян Сяргеевіч Кавалёў, каб перадаць бацьку ўказанне сакратара Чэрыкаўскага падпольнага райкама партыі аб тым, якую патрэбна праводзіць работу на акупіраванай тэрыторыі. Дамовіліся, што бацька і я будзем падтрымліваць сувязь з падполлем Чэрыкава. Кавалёў папярэдзіў, што аб гэтым у Юдаўцы ніхто не павінен ведаць.

Бацьку прапанавалі ўладкавацца на працу да немцаў лесніком. Яму далі мянушку «Мядзведзь», мне — «Вавёрка».

Мы ўсе дапамагалі бацьку. Я насіла ў лес ежу. Маці пякла хлеб, рабіла адвары з траў, чарнічныя кісялі. Мы кармілі і лячылі салдат, якія трапілі ў акружэнне ці ўцяклі з-пад канвою.

Бацька часта браў у лес мяне і брата Ваню. Мы збіралі зброю, хавалі яе, а затым перадавалі партызанам.

У канцы верасня 1941 г. бацька прынёс зводку Саўінфармбюро і папрасіў мяне як мага хутчэй перапісаць 15 экземпляраў. Разам з братам разнеслі іх па навакольных вёсках. Актыўна дапамагалі нам Ваня Міхееў, Лёня Аўдзееў, Саша Новікаў, Вася Ткачоў. Яны расклейвалі лістоўкі на вуліцах, у пякарні, на вадакачцы і іншых людных мясцінах.

Часта хадзілі да чыгункі. Назіралі за рухам нямецкіх эшалонаў. Запаміналі, колькі іх праходзіла, чым гружаны. Усе звесткі перадавалі камандаванню партызанскага атрада № 15, непасрэдна І. М. Ваўчкову і Я. А. Касмачову. Выконваць такія заданні было нялёгка і небяспечна. Але мы разумелі, што гэта неабходна для скарэйшага вызвалення беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ужо зімой сорак другога года стала расці камсамольская арганізацыя. Да падпольнай работы я прыцягнула Кацярыну Трафімаўну Царанкову, Ешалёву Еву, Шаўцову Вольгу, Раманятава Алёшу і іншых.

Нашу работу пастаянна накіроўваў падпольны райкам партыі. Аднойчы да нас прыйшлі Е. С. Кавалёў і Н. В. Марозаў. Яны прапанавалі бацьку ўладкаваць брата Ваню працаваць на чыгунку. Як я зразумела, патрэбна гэта было для таго, каб наладзіць сувязь з ваеннапалоннымі палякамі, якія рамантавалі чыгуначныя і шашэйныя дарогі, масты. З іх дапамогай можна было здабываць каштоўныя звесткі, неабходныя партызанам і падпольшчыкам, праводзіць дыверсійную работу. Разам з братам на чыгуначнай дарозе працаваў і Міша Рамашэўскі, які ўдзельнічаў у падпольнай рабоце.

Нельга не ўспомніць, як палякі-дарожнікі дапамаглі партызанам вывесці са строю дарожную тэхніку, якую немцы прывезлі для рамонту

дарогі на Прапойск. Дамовіліся, што партызаны адкрыюць агонь па ахове з лесу, а палякі ў гэты час тэрмітнымі шарыкамі падпаляць гаручае, якое трымалі побач з машынамі. Так і зрабілі. Дарожная тэхніка згарэла.

Пасля я не раз перадавала партызанам звесткі, здабытыя ў палякаў ці падпольшчыкаў А. П. Гвасаліі і А. Т. Яўмененкі. Звесткі аб праціўніку партызаны атрымлівалі праз паштовую скрынку «дубок».

Нашы камсамольцы займаліся не толькі зборам інфармацыі. Мы дастаўлялі партызанам узрыўчатку, зброю, а аднойчы бацька прынёс ад Івана Піліпавіча Дзенісенкі магнітныя міны, толавыя шашкі з бікфордавым шнурам. Мы аднеслі ўсё на чыгуначную дарогу, на ўчастак Пераможнік — Драніха — Асавец. Калі за станцыяй Асавец пачалі ўзрывацца эшалоны, мы зразумелі, што не дарэмна рызыкавалі, што сваімі справамі набліжаем светлы дзень вызвалення.

Калі Чырвоная Армія перайшла ў контрнаступленне ў раёне Курскай дугі, усе ажылі душой. Актыўна ўключылася ў барацьбу супраць ворага ўсё насельніцтва: зрывалі мерапрыемствы нямецка-фашысцкіх улад, хадзілі ў разведку, збіралі газеты, якія скідвалі з самалётаў, знішчалі лініі сувязі, палілі склады. Мой бацька, Васіль Міхайлавіч Меранцоў (сувязны падпольнага райкама) злавіў у лесе начальніка паліцыі станцыі Верамейкі, звязаў яго і даставіў у штаб партызанскага атрада. Калі ж прагучаў заклік падпольнага райкама КП(б)Б падрыхтаваць пераправу для наступаючай Чырвонай Арміі, усе, хто змог, пайшлі секчы лес.

Пасыльны раённай управы

Калі пачалася вайна, яму споўнілася толькі пятнаццаць гадоў. Нарадзіўся ён у сям'і калгасніка. Уся іх сям'я — бацька, маці і пяць сыноў — з першых дзён акупацыі як маглі змагаліся з гітлераўцамі. Ухіляліся ад працы на ворага, не плацілі налогаў, сабатавалі ўсе мерапрыемствы акупацыйных улад. Спрабавалі наладзіць сувязь з падпольшчыкамі і партызанамі. Але толькі ў 1942 г. удалося звязацца з 720-м атрадам. А здарылася гэта так.

Міша хадзіў па вёсках, якія знаходзіліся каля лесу ці ў самым лесе. Аднойчы ён трапіў у в. Ляцягі, дзе дзейнічала падпольная арганізацыя, якую ўзначальваў П. П. Емяльянаў. Новыя людзі, якія нечакана паяўляліся ў населеных пунктах, вызывалі недавер і падазронасць. На шчасце, Павел Емяльянаў добра ведаў сям'ю Бондаравых. Міша папрасіў, каб яго ўзялі ў партызанскі атрад. Емяльянаў сказаў аб просьбе Мішы Ціту Храмовічу, але камандаванне атрада вырашыла пакінуць яго ў якасці сувязнога і разведчыка.

Міша рэгулярна праз Емяльянава перадаваў атраду звесткі аб праціўніку. Разам са сваімі братамі збіраў зброю, боепрыпасы і адсылаў іх партызанам. Распаўсюджваў сярод насельніцтва лістоўкі і газеты. У 1943 г. Мішу пайшоў семнаццаты год. Каб не адправілі ў Германію, бацькі ўладкавалі яго на работу. Ён стаў працаваць пасыльным у раённай управе. Гэта давала права свабодна хадзіць па горадзе, нават па раёне і збіраць звесткі аб ворагу.

Увесну 1943 г. быў створаны 43-і партызанскі атрад. Емяльянаў разам з падпольшчыкамі пайшоў у атрад. Быў назначан палітруком роты. Міша Бондараў падтрымліваў сувязь з Паўлам Пятровічам.

Атрад хутка рос. У яго ўлілося многа новых людзей. Праверыць усіх было цяжка. З'явіўся сярод пар-

тызан і былы бургамістр Старынкаўскай воласці Кудраўцаў. Яго прыставілі да кулямёта, але 24 ліпеня 1943 г. ён уцёк у гарнізон. Пасяліўся ў будынку раённай управы.

Кудраўцаў многа ведаў пра партызан, іх дыслакацыю, колькасць, аб некаторых сувязных. Яго неабходна было прыбраць. Але зрабіць гэта ў сценах управы няпроста. Ды і хто возьмецца за выкананне такога рызыкоўнага задання? Выбар паў на Мішу Бондарава. Хлопец ён быў каранасты, шыракаплечы, фізічна здаровы, смелы і кемлівы. Як пасыльны раённай управы меў пастаянны пропуск. Не выклікаючы падазрэння, мог зайсці ў любы кабінет. Прывесці прыгавор у выкананне намецілі на 25 ліпеня, на наступны дзень пасля ўцёкаў. Прыходзілася спяшацца, каб здраднік не паспеў расказаць гітлераўцам усё, аб чым даведаўся.

25 ліпеня была якраз нядзеля, і каля будынка ўправы стаяў толькі адзін вартавы. Гэта некалькі спрашчала задачу. Міша пранік у будынак праз чорны ход, хутка знайшоў пакой, у якім знаходзіўся Кудраўцаў. Апошні насцярожыўся, але Бондараў прыкінуўся прастачком, як бы нічога не ведаў аб тым, што Кудраўцаў уцёк ад партызан. Здраднік клюнуў і, відавочна, ужо марыў аб новай удачы — выдачы фашыстам партызанскага разведчыка. Калі правакатар расслабіўся і пільнасць яго прытупілася, Міша вокамгненна нанёс яму ўдар нажом і хутка пакінуў будынак. Адразу ж накіраваўся ва ўрочышча Камарова Балота, дзе яго чакаў П. П. Емяльянаў з партызанамі. Але праз пятнаццаць мінут Мішу дагналі на машыне немцы. Прывезлі ў камендатуру, доўга білі і катавалі. Ён страціў прытомнасць.

Потым Міша доўга думаў: «Хто мог выдаць? Чаму так здарылася?» А калі на трэці дзень прывялі для апазнання прыбіральшчыцу, здагадаўся: «Вось хто выдаў!» Жанчына прыбірала будынак і бачыла, як Міша ўвайшоў праз чорны ход, а затым хутка выбег. З цікавасці яна заглянула ў пакой, дзе знаходзіўся Кудраўцаў. Убачыла, што той забіты, і паведаміла вартавому, а той выклікаў начальства.

Праз нядзелю Бондарава перавезлі ў Чэрыкаў. Пасадзілі ў адзіночную камеру. Зноў пачаліся допыты і катаванні. Дапытвалі падчас тры следчыя разам. Міша нікога не выдаў, перанёс усе катаванні. Яму прабілі чэрап, пакалечылі нагу.

У сярэдзіне верасня 1943 г., калі Чырвоная Армія ўжо была побач, гітлераўцы выгналі ўсіх зняволеных на размініраванне шашы. Трапіў у гэтую групу і Міша. Суправаджалі зняволеных мадзьяры. Ад іх даведаліся, што той, хто застанецца жыць пасля такога варварскага размініравання, будзе расстраляны. Сталі лавіць момант, каб уцячы. І калі дайшлі да той часткі шашы, што была ў лесе, зняволеныя кінуліся ў розныя бакі. Варта пачала страляць, але беспрыцэльна. Усе, хто мог хутка бегаць, уцяклі. Уцёк і Бондараў. Калі Мішу пазней пыталі, як яму ўдалося ўцячы з пакалечанай нагой, ён адказваў: «Вельмі хацелася жыць...»

Гэта было ў Верамейках

З успамінаў І. В. Меранцова, былога члена падпольнай арганізацыі

Гітлераўцы і здраднікі прыклалі нямала намаганняў, каб падавіць супраціўленне ў Верамейках. Але ніякім тэрорам не ўдавалася паставіць людзей на калені. У Верамейках і суседніх вёсках у першай палове жніўся з'явіліся сувязныя легендарнага партызанскага атрада «Ана-

І. В. Меранцоў.

толя»-Таіра, за галаву якога немцы абяцалі вялізную ўзнагароду, як і за кожнага з яго першых трыццаці двух партызан — сыноў больш дзесяці нацыянальнасцей, воінаў, якія трапілі ў акружэнне. Дапамагалі «Анатолю» — татарскаму настаўніку — афіцэры Чырвонай Арміі і мы, падлеткі. Вобраз яго застаўся ў памяці на ўсё жыццё. Атрад першы час размяшчаўся непадалёку ад вёсак Жытнёў, Наркі, Верамейкі, Юдаўка, Грамабой.

У саміх Верамейках сабралася група маладых рабят, якія далі слова змагацца з ворагам і запэўнілі сваю настаўніцу Г. В. Маціясевіч, што будуць рабіць усё, каб выканаць свой свяшчэнны абавязак.

Яшчэ да прыходу немцаў старшына Ваня Клюеў з Іркуцка паказаў камсамольцу Лёню Аўдзееву, піянеру Валодзю Лосеву і іх сябрам, як страляць з пісталета, растлумачыў, што барацьбу з фашыстамі варта весці смела, але асцярожна, з розумам. Ён быў вельмі задаволены, калі даведаўся, што мы вучыліся ў школе АСААВІЯХІМа. Настаўнікамі нашымі былі таксама Пётр Рабцаў, Віталь Цымбарэвіч, Фама Раманенка. Юныя патрыёты напярэдадні прыходу фашыстаў атрымалі ружжы і ахоўвалі лінію сувязі. Гэта былі Лёня Аўдзееў, Федзя Ткачоў, Ваня Міхееў, Коля Цімашэнка, Вася Ткачоў, Саша Новікаў, Коля Арлоў, Жэня Князеў, Аляксей Андрэенка, Міша Ярмоленка, Вася Сімага, Косця Раманенка, а таксама многія іншыя. Рабяты збіралі і закопвалі зброю, тапілі яе ў азярынцы.

Акрамя названых вышэй, актыўны ўдзел ў зборы зброі прымалі Коля Елісееў і Ваня Іваноў. Нехта данёс на верамейскіх камсамольцаў ужо ў першыя дні акупацыі. Да дому Лёні Аўдзеева пад'ехала легкавая машына. У ёй былі самыя страшныя карнікі — фельджандары, тайная палявая паліцыя, насіўшая спецыяльныя бляхі на шыі. Пачаўся допыт. Лёню зблыталі з кімсьці з Івановых. Пэўна, з эвакуіраваўшымся дзядзькам Леаніда — дырэктарам МТС І. Ф. Івановым. Лёня, які крыху разумеў нямецкую мову, скеміў, што ў немцаў ёсць прыкметы ўсіх камсамольцаў і камуністаў Верамеек, нават колер валасоў вядомы. Як хутка знайшліся здраднікі-даносчыкі! Трэба было нешта прадпрымаць.

Усе сабраліся ў Вані Міхеева. Абмяркоўвалі, як быць. Вырашылі і надалей збіраць зброю.

У хуткім часе загінулі дарослыя дарадчыкі рабят Гузнякоў і Кавалёў. А яны забяспечвалі юных патрыётаў лістоўкамі, накіроўвалі іх у бліжэйшыя вёскі з небяспечным грузам: у Каркоўшчыну, Старую Беліцу, Жытнёў. Вясной 1942 г. камсамольцы Федзя Ткачоў, Міша Краўцоў, Ваня Міхееў, Лёня Аўдзееў, Коля Цімашэнка, Саша Новікаў, а таксама я сабраліся ў ціхім месцы, у лесе за Верамейскай бальніцай. Да нас прыйшоў настаўнік І. А. Марозаў, саратнік падпольшчыка Івана Дзенісенкі. Ён гаварыў аб значэнні барацьбы ў тыле ворага, як весці сябе на допытах. Мы прасілі Івана Афанасьевіча даць нам складанае заданне. Ён адказаў, што параіцца на базе. Было вырашана, што на сустрэчу з ім будзем хадзіць пачаргова. Агульнымі намаганнямі былі здабыты важныя звесткі: колькасць гарнізона немцаў, паліцыі, справы старасты і бургамістра, колькі і якіх эшалонаў прайшло

праз Верамейкі, які настрой у жыхароў і куды вывезена зерне.

Летам нешта здарылася, і Марозаў загадаў прыходзіць на сустрэчу з ім толькі ў выключных выпадках. Ён сказаў, калі патрэбна будзе сустрэцца, то прышлюць у Верамейкі мяне, паколькі я жыў у суседняй в. Юдаўцы з бацькам. Я стаў прыходзіць часта.

Дыверсійная работа актывізавалася. Патрэбна было знішчыць сувязь ад Верамеек у бок Чэрыкава, Чавус і Крычава. Начамі мы палілі слупы, зматвалі дрот і тапілі ў балоце. Аднойчы рабяты вярталіся з дыверсіі. Іх спынілі паліцэйскія на чале з намеснікам начальніка паліцыі, п'яным у сцельку Мурачовым. Пасадзілі іх у склеп. Нічога не дабіўшыся на допытах, запатрабавалі самагону і сала. Мы знайшлі самагон і сала, і рабят выпусцілі. Ад партызан цераз мяне рабяты атрымалі наганяй за неасцярожнасць. Месяц ім не давалі заданняў.

Але вось паступіў загад вывезці сабраную зброю. Як заўсёды сустрэліся ў царкве ў Верамейках. Зайшлі на двор, распрацавалі план. Вечарам нагрузілі дзве павозкі зброяй у лесе каля бальніцы і накіраваліся ў раён пас. Чарнышын. Пазней прыйшла падзяка ад камандавання партызан, здзіўленых тым, што рабяты сабралі столькі зброі і так хутка даставілі на базу. Калі немцы пачалі забіраць рабят на работу ў Германію, падпольшчыкі пачалі ўладкавацца на працу на чыгунку. Многім удалося гэта. Але немцы нам не давяралі, кантралявалі вельмі строга. Толькі чэх Этвін і паляк Янак абаранялі нас, не раз выратоўвалі ад смерці. Этвін быў памочнікам майстра, а Янак служыў у ахове.

У нас з'явіўся старэйшы сябра — былы камандзір Чырвонай Арміі Аляксей Яўмененка. Яго парады былі выключна важнымі. Аднойчы Этвін сказаў, што хацеў бы перадаць для партызан асабліва важныя звесткі, прасіў не палохацца яго. Ён усё бачыў і абараняў рабят. Аднойчы арыштавалі мяне і Мішу Рамашэўскага. Мы сядзелі ў бункеры. Нас дапытвалі. Потым арыштавалі і майго бацьку. Выратаваць мяне і бацьку дапамаглі Этвін і Янак, якія працавалі ўжо на партызан. Аляксей Яўмененка працягваў апякаць нас, даваў чытаць «Правду», лістоўкі Саюінфармбюро, расказваў аб становішчы на фронце, патрабаваў строга захоўваць канспірацыю.

Вясной 1943 г. вырашылі зрабіць дыверсію. Позна вечарам на чале з Яўмененкам ішлі па балоце ўздоўж дарогі ў бок станцыі Крычаў. На ёй і ўзарвалі варожы эшалон. Немцы адкрылі шалёны агонь, але мы прайшлі. Раніцай на рабоце, як і прадказаў Яўмененка, нас паслалі на ліквідацыю вынікаў аварыі. Пасля хадзілі яшчэ на адну дыверсію, але ўжо з партызанамі-грышынцамі. Была ўзарвана чыгунка ля в. Ляхі. Аднойчы Георгій Сотнікаў з Чэрыкава, жонка якога была пакарана за сувязь з партызанамі, перадаў нам дзве міны. Доўга не маглі іх закласці. Нарэшце паставілі ў буксы вагонаў. Эшалон узарваўся ў час руху. Удзельнічалі і ў «рэйкавай вайне».

Вяртанне падпольнага райкама партыі і камсамола вясной 1943 г. значна актывізавала нашу работу. Затым прыйшоў загад усім падпольшчыкам пайсці ў партызаны. Замініравалі і ўзарвалі водаразборныя калонкі, катлы воданапорных вежаў і пайшлі ў лес.

Пачаліся нялёгкія партызанскія будні. А ў кастрычніку 1943 г. сустрэліся на р. Сож з Чырвонай Арміяй, сталі яе байцамі. У саставе 440-га палка 64-й стралковай дывізіі 50-й арміі Болдзіна мы і змагаліся. Многія з нас вызвалялі Магілёў, а Перамогу сустрэлі ў Берліне.

Юныя разведчыкі

Былая настаўніца, стаўшая разведчыцай і сувязной падпольнага райкама партыі, Антаніна Радзівонаўна Зелянкова была незадаволена паводзінамі сваіх выхаванцаў. Колькі разоў яны абяцалі, што будуць дзейнічаць асцярожна, але не трымаюць свайго слова. «Ну, якая, скажыце, небяспека,— пярэчыў Лёня Пілат,— прыляпіць паліцаю лістоўку на спіну, калі ён п'яны, ледзьве на нагах трымаецца».

Лёня даўно ўжо лічыў сябе самастойным чалавекам. Па заданні Антаніны Радзівонаўны ён часта выходзіў на шашу, сачыў за рухам машын, запамінаў іх нумары і эмблемы, прыкмячаў, які груз вязуць.

Але Лёню хацелася большага. Вось, напрыклад, перадаў дзядзьку Івану запіску: «Лемень і Манастырок на адной дарозе 12.10». А што гэта значыць? Лёня ведаў, што Лемень — гэта пасёлак, Манастырок — вёска, знаходзяцца яны на адной дарозе. Гэта кожнаму вядома. Дзядзька Ваня сам пра гэта ведае. Нешта цікавае хаваецца за гэтымі словамі. А запытацца нельга. Палічаць балбатуном. Цётка Тоня (так называў ён Антаніну Радзівонаўну) папярэджвала, што падпольшчыкі не павінны ні аб чым пытацца.

Лёню хацелася падрываць эшалоны, хадзіць у разведку, далучаць новых рабят да падпольнай работы. Параіўся з цёткай Тоняй. Калі дазволіла стварыць цімураўскую каманду, хлопец адчуў сябе на сёмым небе. К ліпеню 1943 г. падпольная цімураўская каманда папоўнілася новымі рабятамі. Першым прыйшоў Толя Поклад — сябар Лёні.

Работы хапала на ўсіх: расклейвалі лістоўкі, звароты падпольных райкамаў партыі і камсамола да насельніцтва і моладзі. У населеныя пункты часта прыбывалі фашысцкія войскі на адпачынак ці перафармiраванне. Цімураўцы першымі даведваліся аб гэтым. Яны праколвалі шыны аўтамашын, падлівалі ваду ці падсыпалі соль у бензін. З бухгалтарскай дакладнасцю падлічвалі колькасць машын, баявой тэхнікі на шашы Масква — Варшава.

Спраў у цімураўцаў было шмат. Адны выконвалі баявыя заданні падпольшчыкаў, другія дапамагалі тым, хто меў у гэтым патрэбу. Пакутуе жанчына-бежанка, плачуць дзеці, просяць есці, а ў доме ні кавалка хлеба, ні кроплі малака. І раптам у малога ў руках буханка хлеба. «Дзе ўзяў?» — пытаецца маці. «Хлопчык даў». І на самай справе — па вуліцы хутка крочыў хлопчык-падпольшчык. Ён спяшаўся, яго чакалі новыя справы.

Ужо некалькі месяцаў Лёня працуе ў хлебапякарні. У асноўным адсюль пачынаюцца «гаспадарчыя аперацыі». Выехала, напрыклад, з пякарні машына з хлебам, а яе ўжо чакаюць партызаны. Цімураўцы даведваюцца, калі павязуць хлеб у суседні гарнізон і паведамляюць аб гэтым партызанскім сувязным. Тыя — у атрад. Вось адкуль з'яўляўся хлеб у сем'ях чырвонаармейцаў, партызан і бежанцаў.

Фашысты адступалі, цярпелі паражэнне за паражэннем. Зверству іх не было канца: расстрэльвалі ні ў чым ні павінных людзей, палілі, вешалі. У такіх абставінах Лёня і яго сябры не маглі сядзець злажыўшы рукі. Не стрымалі слова, якое давалі Антаніне Радзівонаўне, вырашылі рызыкнуць. І Лёня са сваім сябрам Толем Покладам спалілі пякарню.

А было гэта так. Аднойчы з машыны, якая падвозіла муку, Толя сцягнуў каністру з бензінам і схаваў яе ў дровы. Выбраўшы зручны момант, перанёс каністру ў памяшканне і замаскіраваў за печчу. У канцы працоўнага дня — гэта было позна вечарам — Толя схаваўся паміж мяшкамі мукі. Шэф сам правяраў пякарню

перад закрыццём, але Толю не заўважыў. Калі наступіла глыбокая ноч, Толя абліў бензінам сцены і частку поду печы з такім разлікам, каб не адразу ўспыхнула полымя. Падрыхтаваўшы ўсё гэта, падпаліў дровы каля печы, а сам вылез у акно. Там чакаў яго Лёня Пілат. Ён сачыў за аховай знадворку.

Юныя змагары былі ўжо далёка ад небяспечнага месца, калі ўспыхнуў пажар. Патушыць яго было немагчыма. Згарэлі ўвесь будынак, абсталяванне і запасы мукі.

З ліпеня 1943 г. на шашы Масква — Варшава перыядычна паяўлялася многа фашысцкай тэхнікі і рознага роду абозаў. Як правіла, абозы цягнуліся на захад, а тэхніка і боепрыпасы — на ўсход. Немцы баяліся савецкай авіяцыі і на днёўку затрымліваліся ў Чэрыкаве і яго наваколлі.

Антаніна Радзівонаўна перадала Лёню і Толю магнітныя міны, якія былі пастаўлены на запланаваны раней час. Хлопцам заставалася падлажыць іх пад бензавоз ці машыну з боепрыпасамі.

Але як падысці да машыны? Рабяты пераапраналіся ў лахманы і пад выглядам жабракоў выпрошвалі ў немцаў хлеб, бадзяліся каля тэхнікі. Як толькі падварочваўся зручны выпадак, яны падкладвалі міны. Калі не хапала мін, хлопцы праколвалі шыны аўтамашын самаробнымі вострымі шыламі, выпускалі бензін з каністраў, а зрэдку наладжвалі пажар.

У верасні 1943 г., перад адступленнем гітлераўцаў, цімураўцы паступілі ў распараджэнне групы лейтэнанта Міхаіла Хромава. Група атрымала загад — не даць фашыстам і іх прыхвасням знішчыць астаткі будынкаў у Чэрыкаве. З дапамогай рабят група Хромава расправілася з эсэсаўцамі-падпальшчыкамі, выратавала шмат людзей і будынкаў. У штаб партызанскай брыгады нават прывялі камандзіра падпальшчыкаў — эсэсаўца Ганса Сіха і здрадніка — акружнога бургаміст-ра Шаркевіча.

У хуткім часе разам з усімі юныя цімураўцы сустракалі Чырвоную Армію, якая вызваліла Чэрыкаў.

Г.Антановіч.

Апошні загад

Фронт набліжаўся. На шашы Масква — Варшава паявіўся бесперапынны паток машын, ваеннай тэхнікі, гужавога транспарту.

Наша авіяцыя наносіла бомбавыя ўдары па адступаўшаму праціўніку. На шашы, асабліва каля мастоў, у гэтыя мінуты тварылася нешта неверагоднае. Гэта, відаць, і паслужыла прычынай таго, што жывёлу, якую адабралі ў насельніцтва Смаленскай і іншых абласцей, фашысты вырашылі гнаць на захад не па шашы, а па левабярэжжу, прасёлачнымі дарогамі.

Прапусціць такую магчымасць партызаны, зразумела, не маглі. Спачатку мелі намер захапіць гурт жывёлы ў раёне Чэрыкава, калі яе ў абход моста пагоняць па лесе. Потым даведаліся, што за першым ідуць яшчэ. Вырашылі не пужаць немцаў, каб наступныя гурты яны не перагналі на заходні бераг Сожа да шашы. Няхай гоняць далей да Прапойска, а потым можна будзе захапіць іх адначасова.

Першы гурт захапіў М. К. Хромаў са сваімі людзьмі ў Бакунавічах, другі — у в. Хрыстафораўка і трэці, які гналі чамусьці па дарозе на Краснаполле, перанялі каменданцкі і гаспадарчы ўзводы. Суправаджалі кожны гурт некалькі паліцэйскіх і двое-трое нямецкіх салдатаў старэчага ўзросту. Гналі жывёлу чалавек дзесяць няўзброеных пастухоў, сілком мабілізаваных. Калі партызаны

адкрылі агонь, ніхто не аказаў супраціўлення. Трафеяў было многа, адной жывёлы аказалася 1500 галоў.

Праціўнік адступаў па трох дарогах: з Краснаполля праз Старынку на Прапойск, з Касцюковічаў праз Пільню і Бакунавічы да шашы Масква — Варшава і па дарозе Клімавічы — Вепрын — Чэрыкаў.

Усім асабовым саставам весці баявыя дзеянні партызаны не маглі. Патрэбна было ратаваць насельніцтва ад угону на захад, адбіваць налёты карнікаў. Партызанам прыйшлося мяняць тактыку. Яны стваралі баявыя рухомыя групы, ад раптоўных удараў якіх гітлераўцы неслі вялікія страты.

Рабілася гэта так. Баявыя групы прапускалі галоўную паходную заставу і бакавыя дазоры немцаў, а калі паяўлялася асноўная калона, адкрывалі шчыльны прыцэльны агонь, Падлічваць страты ворага не мелі ні часу, ні магчымасці. Гітлераўцы, апамятаўшыся, разварочваліся ў баявыя парадкі. Тады партызаны знімаліся з пазіцый і адыходзілі.

Баявыя групы пастаянна знаходзіліся ў руху. Гэта вымотвала сілы. Падтрымлівала маральна толькі надзея на хуткую сустрэчу са сваімі.

25 верасня 1943 г. партызанская разведка ў Хоцімскім раёне сустрэлася з разведкай 50-й арміі. Пётр Кубышкін пабываў у штабе арміі. Яго прыняў камандуючы генерал-лейтэнант І. В. Болдзін. Партызаны атрымалі баявое заданне — заняць брод цераз Сож у раёне в. Хрыстафораўка і падрыхтаваць пераправу.

Партызаны ў той час дыслацыраваліся ў раёне Манастырка, стараючыся быць бліжэй да раённага цэнтра і да галоўных дарог, па якіх адступаў вораг. Не чакаючы з задання ўсіх груп, пакінуўшы ў лагеры роту, якая блакіравала дарогу Чэрыкаў — Краснаполле, і нарыхтоўшчыкаў лесу для пераправы, усе атрады накіраваліся да Сожа па маршруту Манастырок — Ушакі — Бакунавічы. Ішлі адкрыта, авіяцыя праціўніка больш не пагражала. У паветры поўнымі гаспадарамі былі нашы самалёты.

Каля в. Ушакі, на дарозе Пільня — Бакунавічы, партызаны разгромілі групу фашыстаў. Па дакументах забітых высветлілася, што гэта гітлераўцы з пільнянскага гарнізона.

У Бакунавічах пакінулі 1-ю роту 720-га атрада, якая на выпадак бою павінна была нанесці ўдар па праціўніку з тылу. Атрады ж занялі абарону ў раёне в. Хрыстафораўка, каля броду цераз р. Сож. Праціўнік паявіўся прыцемкам. Гэта была галаўная паходная застава. Яна прайшла праз Бакунавічы і накіравалася па дарозе ў бок Хрыстафораўкі. Затым паявілася калона праціўніка і невялікі абоз — грузавыя машыны і павозкі. Калона зрабіла прывал на заходняй ускраіне Бакунавічаў, відаць чакаючы сваю разведку.

1-я рота старшага лейтэнанта Міхаіла Фёдарава з прыданым яму падраздзяленнем заняла пазіцыі на высотках па абодва бакі ад дарогі. Калі гітлераўцы расселіся і адкрылі свае ранцы, Фёдараў скамандаваў:

— Агонь!

Кулямётныя і аўтаматныя чэргі сцебанулі па ворагу. Дарэмна афіцэры, размахваючы пісталетамі, спрабавалі арганізаваць абарону. Ніхто іх не слухаў. Узнікла паніка. Амаль у гэты ж час пачалася перастрэлка і каля пераправы, дзе галаўная застава наткнулася на партызанскія сакрэты.

Партызаны Фёдарава падняліся ў атаку. Калі 720-ы і 721-ы атрады, што спяшаліся на дапамогу, падышлі да Бакунавічаў, праціўніка там ужо не было. Толькі на дарозе і ў прыдарожным хмызняку валялася сорак дзевяць трупаў.

У ноч на 1 кастрычніка воіны 50-й

арміі фарсіравалі Сож і авалодалі Чэрыкавам. Вялікую дапамогу ў гэтай аперацыі аказалі партызаны. Яны яшчэ да падыходу часцей Чырвонай Арміі падрыхтавалі тры пераправы цераз Сож. Нарыхтаванага лесу хапіла і для навядзення часовага моста цераз раку. Падпольшчыкі з Чэрыкава і навакольных вёсак наладжвалі завалы па дарогах, нарыхтоўвалі лес, вывелі са строю чыгунку на ўчастку Крычаў — Чавусы, цалкам знішчылі сувязь. У Верамейках падарвалі стрэлкі, семафор і частку рэек на подступах да станцыі. Партызанскія атрады Чэрыкаўскага, Краснапольскага і Крычаўскага раёнаў наладжвалі засады на шашы, абстрэльвалі калоны ворага, зрывалі работы па пабудове ўмацаванняў на правым беразе Сожа. Вельмі дапамаглі ў гэтай справе дзве гарматы (76- і 45-міліметровыя). Але не хапала снарадаў. Стралялі толькі тады, калі немцы прыступалі да працы. Выпускалі па два-тры снарады, і мабілізаванае насельніцтва разбягалася. Разведчыкі наносілі ўсе нямецкія ўмацаванні на карту, выкарыстоўваючы данясенні падпольшчыкаў і сувязных.

Яшчэ больш за тыдзень пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі партызанскія атрады працягвалі заставацца самастойнымі падраздзяленнямі. Чакалі загаду БШПР аб расфарміраванні. Стварылі знішчальны батальён, які, выконваючы заданні камандавання 50-й арміі, праводзіў баявыя аперацыі па ачыстцы левабярэжных лясоў ад груп праціўніка. Нарэшце прыбылі прадстаўнікі ЦК КП(б)Б і БШПР — В. І. Закурдаеў і А. Г. Бондар. Яны прывезлі загад аб расфарміраванні атрадаў.

У вызначаны дзень на ўскраіне Чэрыкава перад будынкам сельскагаспадарчага тэхнікума, адзінага будынка, не разбуранага немцамі пры адступленні, выстраіліся 720, 721 і 15-ы атрады. Было зразумела, што ўперадзе новы, не менш суровы перыяд барацьбы.

Апошні раз партызаны чэрыкаўскіх атрадаў стаялі ў страі. Прагучала каманда:

— Смірна-а!

У наступіўшай цішыні зачыталі загад БШПР.

— Усе партызаны непрызыўнога ўзросту, інваліды, а таксама назначаныя на пэўныя пасады застаюцца працаваць у раёне. Астатнія накіроўваюцца на ваенна-палявы прызыўны пункт.

Амаль цалкам з партызан сфарміравалі асобны лыжны батальён. Намеснікам камандзіра гэтага батальёна назначылі старшага лейтэнанта Міхаіла Фёдарава, а камандзірамі рот і ўзводаў сталі былыя партызанскія камандзіры Міхаіл Буднікаў, Аляксей Носаў, Міхаіл Хромаў, Міхаіл Дубаносаў і іншыя.

Вопытных, смелых байцоў і камандзіраў набылі ад расфарміраваных партызанскіх атрадаў нашы воінскія часці.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 1 КАСТРЫЧНІКА 1943 г.

В течение 1 октября на Могилевском направлении наши войска, продолжая развивать наступление, продвинулись вперед от 10 до 20 километров и, форсировав реку Сож, овладели городом Чериков, а также заняли более 340 других населенных пунктов, ... среди которых... Молятичи, Комаровка, Губенщина, Веприн, Бакуновичи...

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 2 КАСТРЫЧНІКА 1943 г.

На Могилевском направлении наши войска, продолжая наступление, продвинулись вперед от 10 до 12 километров, заняли свыше 270 населенных пунктов, в том числе крупные населенные пункты Каменка, Шароевка, Ржавец, Припечино, Старая Каменка... и железнодорожные станции Веремейки...

Сообщения Советского Информбюро. М., 1945. Т. 5. с. 162, 163.

За горад на Сожы

З успамінаў генерал-маёра М. Д. Максімцава

Міхаіл Данілавіч Максімцаў нарадзіўся 19.1.1909 г. у слабадзе Расош Варонежскай губерні ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння ў 1930 г. Варонежскага індустрыяльнага тэхнікума працаваў прарабам на будоўлі, затым быў прызваны ў Чырвоную Армію. У 1941 г. закончыў Ваенна-інжынерную акадэмію імя В. В. Куйбышава. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, М. Д. Максімцаў знаходзіўся на фінскай граніцы. Спачатку ваяваў на Выбаргскім напрамку, а з чэрвеня 1941 г.— на Бранскім фронце камандзірам 559-га асобнага сапёрнага батальёна 229-й стралковай дывізіі 50-й арміі. Будучы начальнікам штаба інжынерных войск 50-й арміі, удзельнічаў у вызваленні Калужскай, Тульскай, Бранскай абласцей. У 1943 г. у складзе 50-й арміі ўдзельнічаў у баях на Курскай дузе, фарсіраваў рэкі Дзясну, Сож, Днепр, вызваляў Бранск, Крычаў, Чэрыкаў. З 1944 г. начальнік аператыўнага аддзела штаба інжынерных войск 2-га Беларускага фронту, вызваляў Магілёў, Мінск, Гродна. У 1945 г. удзельнічаў у планаванні і правядзенні Усходне-Прускай, Усходне-Памеранскай, Берлінскай аперацый, фарсіраваў Віслу, Одэр, Эльбу. У 1951 г. закончыў Акадэмію Генеральнага штаба і служыў начальнікам інжынерных войск Закаўказскай ваеннай акругі. Звольнены з радоў Савецкай Арміі ў 1955 г. Генерал-маёр М. Д. Максімцаў узнагароджаны ордэнам Багдана Хмяльніцкага I ступені, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, узнагародамі ПНР, многімі медалямі. Ганаровы грамадзянін г. Чэрыкава.

М. Д. Максімцаў.

Бітва за Сож, якую вялі войскі 50-й арміі раніцай 29 верасня, не спынялася ні днём, ні ноччу. Палкі 369-й стралковай дывізіі генерала Лазарэнкі далёка прайшлі на поўнач ад Крычава, 238-я стралковая дывізія генерала Краснаштанава авалодала в. Рэчыца і на левым беразе Сожа — в. Вохар. А Чэрыкаў усё стаяў, як крэпасць на Сожы (так любілі фашысцкія заправілы з акруговай камендатуры называць сваю рэзідэнцыю — Чэрыкаў).

413-я Далёкаўсходняя стралковая дывізія рыхтавалася на світанні 30 верасня аднавіць атакі на Вепрын. Слава гэтай дывізіі пранеслася па ўсёй краіне яшчэ ў лістападзе 1941 г., калі яна прыбыла за тысячы кіламетраў з Далёкага Усходу і са станцыі, разгрузіўшыся, уступіла ў бой. У дзень святкавання 24-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі гэта дывізія нанесла контрудар па групоўцы генерала Гудэрыяна, які імкнуўся ў гэты дзень авалодаць Тулай. Так далёкаўсходнікі азнаменавалі гадавіну Кастрычніка. У гэтыя дні газеты «Правда» і «Известия» пісалі, што контрудар далёкаўсходнікаў, ажыццёўлены 7 лістапада 1941 г., прымусіў Гудэрыяна адмовіцца ад узяцця Тулы з поўдня. А калі ён вырашыў узяць Тулу з усходу, то і тут яму набілі морду далёкаўсходнікі.

Кожны полк гэтай дывізіі мае сваю гісторыю, сваіх герояў. Нямецкаму камандаванню яшчэ ў баях за Тулу знаёмы баявы почырк гэтай дывізіі. Ужо два гады 413-я Далёкаўсходняя дывізія змагалася ў складзе войск 50-й арміі, яна яе гонар. Колькі ні змянялася злучэнняў у арміі, а далёкаўсходнікі ішлі на захад

той дарогай, якой ішла армія.

Калі войскі арміі ўступілі на беларускую зямлю, пасля вызвалення гэтай дывізіяй вёсак Судзілы і Родня, камандуючы арміяй генерал Болдзін І. В. выклікаў да сябе камандзіра дывізіі палкоўніка Хахлова Івана Сцяпанавіча і паставіў задачу 413-й: авалодаць бастыёнам на Сожы — Чэрыкавам. Калі камандзір 46-га стралковага корпуса генерал Эрастаў К. М. пачаў прасіць камандарма не забіраць з яго корпуса далёкаўсходнікаў, Болдзін адказаў: «Ведаеце, Канстанцін Максімавіч, вам сорамна крыўдзіцца на мяне за гэта. У вас у корпусе Карачоўская дывізія, якую вы нацэлілі на Крычаў, дывізія генерала Краснаштанава, якая будзе вызваляць Клімавічы, а далёкаўсходнікам я даю Чэрыкаў». Памаўчаўшы крыху, камандарм сказаў: «Замест 413-й вы атрымаеце з сённяшняга дня дывізію, якая першай уступіла на зямлю Беларусі, якая пасля вызвалення Хоцімска знаходзіцца там на адпачынку. Вы атрымаеце 108-ю стралковую, паважанага вамі камандзіра палкоўніка Церымава Пятра Аляксеевіча. Але не кідайце яе ў бой дарэмна, беражыце для Проні. Пасля Сожа там будзе галоўнае».

Гэтая размова адбылася 27 верасня. Так, далёкаўсходнікі падпарадкаваліся непасрэдна камандарму. Пераадолеўшы рачулкі Лабжанка, Перавалочка і Бароўка, знішчаючы часці 211-й пяхотнай дывізіі праціўніка, байцы-далёкаўсходнікі пачалі атакі на Вепрын, сядлаючы ўсе дарогі, якія вялі да Чэрыкава.

А 26 верасня 1943 г., пераадолеўшы варожыя баявыя парадкі, начальнік разведкі Чэрыкаўскай партызанскай брыгады Пётр Кубышкін перайшоў лінію фронту і даставіў у штаб 50-й арміі данясенне, без якога цяжка было б вызначыць, як браць Чэрыкаў. Камандарм генерал Болдзін, начальнік штаба арміі генерал Брылёў і начальнік аператыўнага аддзела палкоўнік Саўчанка заслухалі яго на камандным пункце арміі ў Хоцімску. Іван Васілевіч Болдзін папрасіў разведчыка перадаць самыя цёплыя пажаданні чэрыкаўскім партызанам і заклікаць іх прыкласці ўсе сілы, каб дапамагчы часцям 50-й арміі фарсіраваць Сож і вызваліць ад фашыстаў г. Чэрыкаў.

П. А. Кубышкін.

Кубышкін паказаў на карце, дзе ў лесе, недалёка ад берага, ляжаць штабелі сухіх бярвенняў, удакладніў скрытыя падыходы да ракі і зручнае месца, дзе можна навесці мост з плытоў.

Калі левы сусед 50-й арміі — 3-я армія генерала Гарбатава вяла бой за райцэнтр Краснаполле, наша 413-я Далёкаўсходняя дывізія акружыла нямецкі гарнізон у в. Вепрын і прыступіла да яго знішчэння. У гэты час 1320-ы стралковы полк з партызанамі з 720-га атрада фарсіравалі р. Сож каля в. Мірагошч і павялі наступленне на Чэрыкаў. Адступаючыя часці 211-й фашысцкай дывізіі і ўласаўцы імкнуліся да броду цераз Сож ля Аляксандраўкі 2-й, але дзве партызанскія роты з 720-га і 721-га атрадаў арганізавалі засаду, і, як толькі адступаючыя калоны выцягнуліся ўздоўж дарогі Бакунавічы — Хрыстафораўка, партызаны ўдарылі з усіх бакоў. Бой быў кароткім, але жорсткім. 49 афіцэраў і ўласаў-



Мост цераз р. Сож, узведзены ў час вызвалення г. Чэрыкава.

цаў былі знішчаны, больш сотні ўзята ў палон. А ў гэты час на дарозе, што ідзе з Краснаполля на Чэрыкаў, кулямётны ўзвод партызанскай брыгады зрабіў засаду і, калі часці 324-й стралковай дывізіі генерала Сідуліна павялі наступленне на в. Пільню, партызаны ўдарылі з тылу і адступаючыя часці рассеяліся па лясах.

Атакі 413-й Далёкаўсходняй дывізіі на Чэрыкаў узмацняліся з кожнай гадзінай. Шмат'ярусныя дзоты, урэзаныя ў круты бераг, палівалі бесперапынным свінцовым дажджом люстра Сожа, а мінамётныя батарэі, пастаўленыя ў равах, за Варшаўскай шашой, навясным агнём перакрывалі доступ да ракі нашым часцям. Часам здавалася, што нямецкае камандаванне падцягнула да Чэрыкава артылерыю і мінамёты часткі сваіх адступаючых дывізій. Відавочна, так яно і было, бо, страціўшы Крычаў у ноч з 29 на 30 верасня, застаўшуюся артылерыю немцы перамясцілі сюды. Камандуючы арміяй генерал Болдзін увесь дзень 30 верасня не пакідаў 413-й дывізіі, бо тут, у Чэрыкаве, вырашаўся канец усёй бітвы за Сож. Генерал патрабаваў ад начальніка інжынерных войск арміі палкоўніка Чапурава С. Ф. паскорыць пабудову моста ў Крычаве і пераправіць танкі 233-га палка, а дывізіі генерала Краснаштанава нанесці ўдар па Чэрыкаву па Варшаўскай шашы.

Усё мясцовае насельніцтва гарадоў Клімавічы і Крычаў выйшла на Сож, каб дапамагчы сапёрам пабудаваць мост. Корпусны інжынер Віктар Іванавіч Немцаў двое сутак не адыходзіў ад ракі, пакуль не былі перапраўлены першыя танкі за Сож. У гэты час з 1322-га стралковага палка Далёкаўсходняй дывізіі і сапёраў былі створаны штурмавыя групы. Разам з разведчыкамі Чэрыкаўскай партызанскай брыгады яны з наступленнем цемнаты вечарам 30 верасня праніклі ў горад і павялі барацьбу з падпальшчыкамі, блакіравалі дзоты.

Але і гэтага паказалася мала генералу Болдзіну для хутчэйшага авалодання Чэрыкавам. Выклікаўшы да сябе камандзіра 324-й стралковай дывізіі генерала Сідуліна, ён загадаў яму перадаць частку паласы свайго наступлення 110-й стралковай дывізіі, праз лясы і балоты прабіцца да в. Манастырок і фарсіраваць р. Сож, асядлаць Варшаўскую

шашу, адрэзаць шлях да адступлення фашыстам з Чэрыкава.

Пакуль ішоў бой за Манастырок, партызаны вывелі з завадзей замаскіраваныя плыты і навялі плывучы мост цераз Сож. Перадавыя часці 324-й дывізіі з ходу прыступілі да пераправы па гэтаму мосту. Пад цяжарам зброі і аўтамашын мост пайшоў глыбока ў ваду, але пераправа войск нарастала з кожнай гадзінай. Партызанскі атрад № 15 пад камандаваннем Ваўчкова сумесна з 1093-м стралковым палком вызвалілі в. Журавель, а рота 720-га партызанскага атрада, якую ўзначальваў Ціт Антонавіч Храмовіч, перарэзала Варшаўскую шашу і захапіла мост цераз р. Лабчанку.

1 кастрычніка 1943 г. Чэрыкаў быў вызвалены. Адступаючы пад напорам Чырвонай Арміі, нямецкае камандаванне ў лютасці задалося мэтай сцерці горад Чэрыкаў з твару зямлі, ператварыць яго ў «зону пустыні». Каты наважваліся выгнаць усё насельніцтва ў Германію, і толькі дзякуючы мужнасці і адвазе савецкіх воінаў і партызан гэта не было ажыццёўлена.

На мітынгу чэрыкаўляне паклялі ся не шкадуючы сваіх сіл усё аддаць для перамогі над ненавісным ворагам. З Чэрыкаўскай брыгады многа партызан пайшло змагацца ў рады 50-й арміі. Быў створаны знішчальны батальён пад камандаваннем Купрыяшына М. М., які на працягу тыдня вылоўліваў уцякаўшых фашыстаў і ўласаўцаў. Жыхары вёсак уключыліся ў гэтую аперацыю.

Для размініравання Варшаўскай шашы ад Крычава да р. Проні былі кінуты мінёры-партызаны і ўсе сапёрныя часці арміі. Партызаны і мясцовыя жыхары ўказвалі на тыя месцы, дзе ўстаноўлены зарады з «пякельнымі машынамі». Пабудова моста цераз р. Сож з'явілася доказам любві чэрыкаўлян да Чырвонай Арміі і выканання сваёй клятвы, данай на мітынгу. Два тыдні людзі не пакідалі ракі, і гэта збудаванне, створанае сумеснай працай сапёраў і чэрыкаўлян, служыла доўгі час пасля заканчэння Айчыннай вайны.

Агонь вялі мінамётчыкі

З успамінаў В. А. Лукіна, былога камандзіра мінамётнага ўзвода 1320-га стралковага палка 413-й Далёкаўсходняй дывізіі

Васіль Аляксандравіч Лукін нарадзіўся ў 1924 г. у в. Красніцы Іванаўскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1942 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Закончыў Падольскае пяхотнае вучылішча. З красавіка 1943 г. прымаў удзел у баявых дзеяннях у якасці камандзіра мінамётнай роты 1320-га стралковага палка. Удзельнік разгрому імперыялістычнай Японіі. Да 1979 г. служыў у радах Савецкай Арміі. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Ганаровы грамадзянін г. Чэрыкава.

30 верасня 1943 г. наш 1320-ты стралковы полк, фарсіраваўшы невялікую лясную рачулку Сянну, вызваліў в. Вепрын, што ў 6—7 км ад Чэрыкава. Мы добра бачылі, як на процілеглым беразе гарэлі падпаленыя фашыстамі драўляныя пабудовы Чэрыкава. Байцы і камандзіры хацелі хутчэй вызваліць чэрыкаўлян з фашысцкай няволі, не даць немцам знішчыць горад.

Наш батальён сканцэнтраваўся на ўскраіне Вепрына. Да вёскі вельмі блізка падступаў лес, які надзейна хаваў нашы падраздзяленні ад фашысцкай авіяцыі. І вось атрымалі загад: фарсіраваць Сож па мосце, які ўцалеў, і разам з партызанамі ўварвацца ў Чэрыкаў.

Партызаны паказалі нам найбольш зручныя падыходы да рэчкі і моста. Але немцы бесперапынна іх бамбілі. У небе над намі ішлі паветраныя баі.

В. А. Лукін.

Як толькі перадавыя роты наблізіліся да моста, ён узляцеў у паветра. Тады камандаванне прыняло рашэнне фарсіраваць Сож уброд і на падручных сродках. Нашу мінамётную роту паўзводна прыдалі стралковым ротам 3-га батальёна. Узвод, які ўзначальваў я, быў прыданы 8-й стралковай роце і павінен быў падтрымліваць яе агнём мінамётаў. Я загадаў узяць два мінамёты і міны (колькі магчыма) і ўброд фарсіраваць раку. Мы былі ўжо на заходнім беразе ракі, калі адна з фашысцкіх бомб трапіла ў плыт, на якім знаходзіўся мінамётны разлік і асноўная частка боепрыпасаў. Загінуў камандзір разліку сяржант Г. Мачалаў і малады салдат Ужакоў.

Пад моцным агнём нямецкіх кулямётаў стралковая рота залягла. З паўночнай ускраіны горада вяла агонь артбатарэя праціўніка. Выявіўшы пазіцыю аднаго з кулямётаў, накрылі яе агнём двух мінамётаў. Але скончыліся міны, запас іх знаходзіўся на другім беразе. Я папрасіў у камандзіра стралковай роты некалькі салдат, узяў чатырох мінамётчыкаў, і мы накіраваліся за боепрыпасамі. Пры пераправе цераз раку мяне параніла асколкам у шчаку, лёгкія раненні атрымалі яшчэ двое салдат. І ўсё ж дабраліся з мінамі да пазіцый двух мінамётаў. Гэта было вельмі дарэчы: немцы пачалі контратаку, і агонь нашых мінамётаў прымусіў іх залегчы, а затым і адысці.

Выкарыстаўшы паўзу, арганізавалі яшчэ адзін рэйс па міны на ўсходні бераг. У хуткім часе наш старшына пераправіў дастатковую колькасць іх на самаробным плыце.

Нарэшце мы ўварваліся на прырэчныя вулачкі Чэрыкава. Першае, што ўбачылі,— гэта мноства абгарэлых трупаў. Фашысты ў бяссільнай злосці знішчалі мясцовых жыхароў. Гэта вестка маланкай абляцела байцоў і вызвала столькі нянавісці да ворага, што нашы роты і батальёны, літаральна на плячах у фашыстаў, уварваліся ў Чэрыкаў і ачысцілі яго ад захопнікаў. Не затрымліваючыся ў Чэрыкаве, пайшлі далей на захад і ўжо праз суткі вялі баі на другой беларускай рэчцы — Проні.

Пабрацімы

Першыя дні вайны. Аляксандр Сямёнаў сэрцам адчуў, што яго месца цяпер там, на перадавой. Перадаў трактар прычэпшчыку, а сам пайшоў у Багданаўку, дзе быў размешчаны мабілізацыйны пункт. Залічылі ў дзеючую армію, прыпісалі да вайсковай часці.

1942 год. Пры наступленні ў раёне Сычоўкі на Смаленшчыне фашысты падбілі танк Аляксандра Сямёнава. Члены экіпажа баявой машыны затаіліся, даўшы ворагу зразумець, што ў машыне жывых не засталося. А калі бой заціх, Аляксандр вылез з машыны, агледзеў яе. Параіўшыся, вырашылі, што трэба прабрацца да сваіх і папрасіць дапамогі, каб выцягнуць баявую машыну з вогненнага тылу. Не пакідаць жа яе ворагам, тым больш, што пашкоджанне не такое ўжо і вялікае — адрамантаваць можна. Камандзір танка Павел Радзівілаў вырашыў непрыкметна прабрацца да сваіх, а Аляксандр застаўся сцерагчы машыну.

Бой зацягнуўся. Варта было толькі паказацца нашым танкам, якія

ішлі на выручку, як фашысты адкрывалі па іх шквальны агонь.

Так мінуў дзень, мінула ноч. Мінулі і наступныя суткі. І яшчэ адны. Аляксандр Сямёнаў сядзеў у падбітым танку. А мароз пад трыццаць градусаў. Карчанелі рукі, ногі. Да металу нельга было дакрануцца. Ды і харч скончыўся. Але баец не паў духам, не пакінуў машыну, ды нават і думкі такой не было. Дачакаўся ўсё-такі. Калі нашы адкінулі праціўніка, пад'ехалі сябры-танкісты, замянілі гусеніцу, і Аляксандр Сямёнаў з Паўлам Радзівілавым зноў павялі машыну ў бой.

Полк прарыву, у складзе якога апынуліся сябры, наносіў рашучыя ўдары па ворагу. Пад націскам нашых войск гітлераўцы адступалі. Усюды на вызваленых тэрыторыях танкісты бачылі радасныя, усхваляваныя твары людзей. Сустрэчы гэтыя былі хвалюючымі, надоўга заставаліся ў памяці. Аляксандра хвалявала і тое, што яго полк вось-вось уступіць на тэрыторыю роднай Беларусі.

І той доўгачаканы дзень настаў. 25 верасня 1943 г. танкавы полк пры падтрымцы воінаў іншых злучэнняў з боем выціснуў ворага з Касцюковіч. Кароткая перадышка. Далейшы шлях на Краснаполле, Прапойск (цяпер Слаўгарад). Вельмі хацелася Аляксандру вызваляць Чэрыкаў і родную вёску Мірагошч, што раскінулася на высокім беразе Сожа. Нібыта разгадаўшы думкі байца, камандаванне аддало загад змяніць курс, узяўшы кірунак на Чэрыкаў.

Раніцай 27 верасня танк Аляксандра Сямёнава першым уварваўся ў в. Вепрын. Яна была добра знаёма механіку-вадзіцелю. Глядзеў Аляксандр на апусцеўшыя палі, на папялішчы, і сэрца сціскалася ад болю. Хацелася помсціць ворагу і помсціць. Помсціць за кроў людскую, за спаленыя хаты, за здзекі над людзьмі, якія ні ў чым не былі вінаватыя. За Вепрынам — недалёка Чэрыкаў, а там і да Мірагошча — рукой падаць.

А. А. Сямёнаў.

Адступаючы, фашысты знішчалі ўсё на сваім шляху. Танкісты ўжо не раз бачылі гэта. Вось і цяпер Павел Радзівілаў высунуўся з вежы, узяў бінокль і акінуў позіркам луг, што цягнуўся ў бок Гронава. На лузе віднеліся невялічкія стажкі сена, што жыхары нарыхтавалі для жывёлы і не паспелі перавезці ў вёску. Фашысцкія салдаты бегалі ад стога да стога і падпальвалі сена. Аляксандр, нічога не кажучы, развярнуў танк, пад'ехаў бліжэй. Цяпер як на далоні відаць быў луг, постаці ворагаў, якія, зрабіўшы сваю чорную справу, збіраліся адыходзіць.

Байцы пераглянуліся.

— Агонь па гадах — вырвалася ў Паўла.

Грымнула гармата.

— Агонь!

Яшчэ снарад, яшчэ...

Падалі ад снарадаў ворагі. А жывыя ў паніцы кідаліся наўцёкі...

Фашысты імкнуліся ўтрымаць Чэрыкаў. Яны ўзарвалі мост цераз рэчку. А назаўтра пад вечар нашымі сапёрамі ўжо быў узведзены пантонны мост у раёне в. Манастырок. Але... ён не вытрымліваў цяжкіх танкаў. Тады пад бесперапынным агнём насупраць Чэрыкава быў зроблены другі, больш надзейны мост.

Па ім пайшлі танкі... І хутка горад быў ачышчаны ад ворага.

— Дзе ж тваё сяло? — спытаў Павел.

— Вунь яно,— Аляксандр паказаў на вёску, якая віднелася.

— Заедзем,— цвёрда сказаў Радзівілаў.

— А начальства?

— Дазволіць...

Ім дазволілі. Ды і як не дазволіць, калі вось яна, родная вёска, зямля родная, на якую ўжо больш чым два гады не ступала нага Аляксандра. А там жа родныя, блізкія.

Калі бой заціх, паехалі ў Мірагошч. Вось і родны дом. Аляксандр зайшоў. Пуста. Выйшаў на вуліцу — таксама нікога. Потым з бліндажа высунулася ўскалмачаная галава дзядулі-суседа. Ён пазнаў Сашку. Вылез з бліндажа, абняў, пацалаваў. І расказаў стары, што Аляксандрава жонка з дзецьмі хаваюцца ў лесе. Пайшлі ў лес, што побач з вёскай. Адшукалі родных. Аляксандр прытуліў да сябе жонку, пагладзіў дзіцячыя галоўкі і, развітаўшыся, зноў паехаў у свой полк.

Па дарозе Павел гаварыў, што яму вельмі спадабаліся тутэйшыя мясціны і што, скончыўшы вайну, ён паедзе не на сваю Кіеўшчыну, а вось сюды, на Чэрыкаўшчыну, у гэтую прыгожую вёску з нейкай незразумелай назвай Мірагошч. Маўляў, ажанюся тут і будзем працаваць разам трактарыстамі.

І зноў цяжкія баі. На гэты раз на Проні. Як ні ўпарціліся, ні супраціўляліся ворагі, але не маглі вытрымаць націску нашых войск. Яны працягвалі цясніць фашыстаў на захад.

Бой пад старым Быхавам. Вось на прыцэле аказаўся танк Радзівілава. Адзін снарад пашкодзіў матор. Ад другога заклініла вежу. Трэці, чацвёрты... Танк ахапіла полымя. Члены экіпажа выбраліся ў ніжні люк. А праз некалькі гадзін экіпаж імчаўся ў бой ужо на другой машыне. І зноў трапілі пад прамы абстрэл. І зноў пашкоджаны танк. Байцы нейкім цудам вырваліся з агню і заляглі з аўтаматамі.

І тут здарылася непапраўнае: Павел загінуў ад варожай кулі. Аляксандр падышоў да камандзіра палка і папрасіў дазволу адвезці труп камандзіра танка ў Мірагошч на вясковыя могілкі. Той не стаў пярэчыць, тым больш, што танкіст Сямёнаў заставаўся пакуль без машыны.

Над магілай свайго сябра Аляксандр пакляўся адпомсціць ворагу. За ўсё адпомсціць.

І ён помсціў. Няшчадна граміў ворага Аляксандр Сямёнаў пры вызваленні Гродна, Беластока і іншых вялікіх і малых населеных пунктаў.

Вярнуўся Аляксандр у вёску пры ордэнах і медалях. Працаваў трактарыстам. На магіле свайго таварыша паставіў абеліск. Выдаецца вольная хвіліна і ён спяшаецца да яго. Пастаіць, памаўчыць, пакладзе на магілку палявыя кветкі. Прыгадае, як, бывала, Павел збіраўся прыехаць у Мірагошч на пастаяннае жыхарства...

Некалькі гадоў назад Сямёнаў памёр: сказаліся нягоды ваеннага ліхалецця, далі знаць цяжкія раненні. Яго пахавалі побач з Паўлам.

...Два абеліскі пад высокімі стромкімі соснамі. Адзін — на магіле ўкраінца Паўла Радзівілава, другі — беларуса Аляксандра Сямёнава. Вечным сном спяць пабрацімы ў зямлі, за якую змагаліся, за якую не шкадавалі свайго жыцця.

С. Сямёнаў.

У радах вызваліцеляў

Васіль Савельевіч Круглікаў нарадзіўся ў в. Вепрын Чэрыкаўскага раёна. У чэрвені 1941 г. добраахвотна ўступіў у рады Чырвонай Арміі. На фронце з са-

кавіка 1942 г. Ваяваў з фашыстамі пад Харкавам, на Доне, удзельнічаў у абароне Сталінграда. Вызваляў Арол, Гомель. Удзельнічаў у баях пад Бабруйскам і Мінскам.

Цяжкія і крывапралітныя баі вялі нашы войскі ва Усходняй Прусіі. У гэтых баях удзельнічаў і Васіль Савельевіч Круглікаў. За вызваленне г. Кёнігсберга (цяпер г. Калінінград) быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Потым быў Берлін. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях за Берлін, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Але асабліва запомніліся ветэрану баі за вызваленне роднага Чэрыкаўскага раёна. Разам са сваім 3-м батальёнам 858-га палка Круглікаў вызваляў вёскі Зябень і Чудзяны. Вылучыўся камсорг батальёна Васілій Круглікаў і пры фарсіраванні Сожа.

За гады вайны быў двойчы паранены (пад Харкавам і Мінскам), двойчы кантужаны (пад Сталінградам і пры вызваленні Навагрудка, што ў Гродзенскай вобласці).

Радзіма высока ацаніла ратныя подзвігі Васіля Савельевіча Круглікава. Ён узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна» і іншымі.

В. С. Круглікаў

Я. І. Зарубскі.

Рыгор Фёдаравіч Лугоўскі родам з в. Закальнае Любанскага раёна Мінскай вобласці. Ужо на другі дзень вайны ён быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію, «захапіўшы» з сабой трактар, на якім працаваў у саўгасе. Ён прыбыў у 32-гі аўтабраняполк, залічылі яго ў 1-ы батальён. Пазнаў горыч адступлення, удзельнічаў у крывапралітных баях за Чэрыкаў. Горад палаў у агні. Пад націскам перавышаючых сіл праціўніка савецкія воіны пакінулі Чэрыкаў і з баямі адышлі за Сож. Далей былі Клімавічы, Хоцімск...

Тысячы кіламетраў па нялёгкіх франтавых дарогах праехаў на сваім аўтамабілі вадзіцель зенітна-артылерыйскай установкі Рыгор Лугоўскі. Наступіў верасень 1943 г. Лугоўскі ў складзе 715-га зенітна-артылерыйскага палка зноў на роднай беларускай зямлі. І зноў Чэрыкаў. Але на гэты раз баі за вызваленне шматпакутнага горада. Разлік гарматы Лугоўскага разам з іншымі разлікамі вёў меткі агонь па праціўніку. У хуткім часе над Чэрыкавам узвіўся пунсовы сцяг перамогі.

Рыгор Фёдаравіч Лугоўскі мае баявыя ўзнагароды: ордэны Айчыннай вайны I ступені і Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

Яўген Іосіфавіч Зарубскі нарадзіўся ў в. Вепрын Чэрыкаўскага раёна. У Чырвоную Армію быў прызваны ў ліпені 1941 г. Пасля заканчэння палкавой школы яго накіравалі ў дзеючую армію на Заходні фронт. Удзельнічаў у баях пад Масквой, у аперацыі «Багратыён». У час вызвалення роднай в. Вепрын і г. Чэрыкава камандзір аддзялення сяржант Зарубскі дзейнічаў смела і рашуча. Рота, у якой ён служыў, забяспечвала бесперапынную сувязь наступаючым падраздзяленням, паспяхова выконвала баявыя задачы.

Яўген Іосіфавіч Зарубскі мае дзяржаўныя ўзнагароды.

Нельга забыць

На Чэрыкаўшчыне, як і на ўсёй Беларусі, не знойдзецца ніводнай вёскі, якую б не закранула трагедыя мінулай вайны.

У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёскі Бакаў, Гойкаў, Гарадзец, Міхалін, Прыпёчына, Рагаліна, Сакалоўку, Таржоў, Шароеўку. Толькі

ў Рагаліне фашысты забілі 26 жыхароў. Амаль кожная вёска на Чэрыкаўшчыне ў гады акупацыі стала вогненнай.

Беліца. Да вайны было 80 двароў, 340 жыхароў. У час акупацыі гітлераўцы спалілі 75 двароў. **Багданаўка.** Да вайны ў вёсцы было 16 двароў, 50 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 16 двароў. **Вінаград,** пасёлак. Да вайны было 20 двароў, 81 жыхар. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 20 двароў. **Вымач.** Да вайны ў вёсцы было 29 двароў, 116 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 28 двароў. **Грыўкі,** пасёлак. Да вайны было 40 двароў, 120 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 40 двароў. **Язёры.** Да вайны было 130 двароў, 397 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 117 двароў, забілі 7 жыхароў. **Ялоўка.** Да вайны было 54 двары, 183 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 51 двор, загубілі 2 жыхароў. **Заазер'е,** пасёлак. Да вайны было 20 двароў, 83 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 20 двароў. **Звязда,** пасёлак. Да вайны было 18 двароў, 72 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 18 двароў. **Карма,** пасёлак. Да вайны было 10 двароў, 33 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 10 двароў. **Крывая Слабада,** пасёлак (зараз не існуе). Да вайны было 26 двароў, 194 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 23 двары. **Латышчына.** Да вайны было 23 двары, 71 жыхар. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 23 двары. **Майораўшчына** (зараз не існуе). Да вайны было 16 двароў, 59 жыхароў. У сакавіку 1943 г. гітлераўцы спалілі 16 двароў. **Міхлін.** Да вайны было 30 двароў, 92 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 30 двароў. **Новая Слабада.** Да вайны было 18 двароў, 72 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 18 двароў. **Навіна,** пасёлак (зараз не існуе). Да вайны было 9 двароў, 40 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 9 двароў. **Новы Свет,** пасёлак (зараз не існуе). Да вайны было 35 двароў, 141 жыхар. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 10 двароў. **Пілікаў** пасёлак (зараз не існуе). Да вайны было 10 двароў, 36 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 10 двароў. **Пілікаўшчына,** пасёлак (зараз не існуе). Да вайны было 4 двары, 15 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 4 двары. **Паліпень.** Да вайны было 35 двароў, 143 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 35 двароў. **Рассвет** (зараз не існуе). Да вайны было 7 двароў, 22 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 7 двароў. **Рэмідоўшчына.** Перад вайной было 13 двароў, 52 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 13 двароў. **Селішча.** Да вайны было 17 двароў, 67 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 13 двароў. **Селішча,** пасёлак (зараз не існуе). Да вайны было 24 двары, 96 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 24 двары. **Халадня.** Да вайны было 13 двароў, 51 жыхар. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 13 двароў. **Ямкі.** Да вайны было 19 двароў, 57 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 18 двароў*.

Звесткі аб другіх пацярпеўшых вёсках прыводзяцца ў артыкуле «З гісторыі вёсак Чэрыкаўшчыны».

З успамінаў Еўдакіі Якаўлеўны Саўкінай, жыхаркі в. Рагаліна

У сакавіку 1943 г. у нашай вёсцы партызанамі ў перастрэлцы быў забіты паліцай, які хадзіў па вёсцы разам з другімі паліцаямі — давалі людзям нарад на работу.

Здраднік,які застаўся ў жывых, паведаміў аб здарэнні ў в. Язёры, дзе знаходзілася шмат паліцаяў і немцаў. У гэты ж дзень яны з'явіліся ў вёсцы, пачалі хапаць людзей. Арыштавалі Мікалая Іванавіча Гапеева, гаспадара дома, ля якога быў забіты паліцай, а таксама матку, жонку і сястру. Схапілі таксама майго бацьку Якава Іванавіча, некаторых маладых хлопцаў. Арыштаваных павялі пад Язёры, дзе яны і былі расстраляны. Акрамя гэтага, на расстрэл многіх вяскоўцаў адправілі ў Чэрыкаў.

* Даныя прыведзены па кн.: «Нацистская политика геноцида и выжженной земли в Белоруссии 1941—1944.Мн.,1984.

Пазней нашы жанчыны даведаліся аб месцы расстрэлу нашых вяскоўцаў. Трэба было ж загінуўшых пахаваць. Хаця і гэта, калі не атрымаеш дазволу, магло б каштаваць жыцця кожнай з нас.

Употай дабраліся да магілы, лепш сказаць, да ямы. Без рыдлёвак, рукамі адкопвалі сваіх блізкіх, выцягвалі іх на паверхню. Сярод жанчын я была самая маладая, нягледзячы на страх перад немцамі, нябожчыкамі, выкапала, пазнала свайго бацьку.

На чацвёрты дзень пасля расстрэлу жыхары вёскі павезлі загінуўшых на калёсах на вясковыя могілкі. Немцы і паліцаі, даведаўшыся аб гэтым, пачалі з Язёр абстрэльваць могілкі. Праўда кулі нікога не закранулі. Пахаваўшы нашых блізкіх, з заплаканымі і засмучанымі тварамі накіраваліся па сваіх дамах.

У самым пачатку вайны я страціла сваю малалетнюю сястру. Яна трапіла пад кулі гітлераўцаў.

Нацярпеліся ад ворага і тады, калі ён уцякаў. У гэты час мы хаваліся па лясах. Перад самым прыходам нашай арміі фашысты спалілі нашу вёску. Не было дзе жыць людзям. Будавалі зямлянкі, пазней пачалі ўзводзіць хаты, як кажуць, вылазіць з зямлі.

Цяжка знайсці словы, каб перадаць жудаснасць ваеннага часу. Не дай Бог, каб некалі гэта паўтарылася.

З успамінаў Аляксандры Іванаўны Прасянцовай, жыхаркі в. Прыпёчына

Мой старэйшы брат Сцяпан да вайны быў старшынёй мясцовага калгаса, малодшы брат Іван працаваў у сельпо. Сцяпан удзельнічаў у фінскай вайне, а таксама ў паходзе па вызваленню заходніх абласцей Беларусі.

Калі пачалася Вялікай Айчынная вайна, Сцяпана і Івана чамусьці не ўзялі на фронт. Пазней мне гаварылі, ды я і сама здагадвалася, што яны пакінуты на акупіраванай тэрыторыі для выканання нейкага важнага задання. У справы іх я не ўмешвалася. Працавалі яны ў Чэрыкаве. Раптам у 1942 г. па даносу іх арыштавалі, не знайшоўшы доказу сувязі з партызанамі,немцы адпусцілі іх. Потым,у жніўні 1942 г. яны зноў былі схоплены і расстраляны.

Калі немцы адступілі, нам практычна вяртацца было некуды. Усё згарэла, не засталося, як кажуць, ні двара, ні плота. Гэта было восенню 1943г. У агні згарэлі, у каго было, збожжа, салома, сена. Калі хто і выратаваў сваю жывёлу, карміць яе было нечым. Не лепей было і людзям. Ледзь-ледзь выйшлі на вясну. Па зярнятку збіралі насенне, каб засеяць калгасныя палі і потым атрымаць ураджай.

З успамінаў Варвары Фокаўны Баранавай, жыхаркі в. Сакалоўка, 84 гады

Перад адступленнем немцаў усе нашы вяскоўцы: жанчыны, старыя, малыя пайшлі ў лес. Хто мог, браў з сабой жывёлу, каб выратаваць яе ад рабаўнікоў. Збіралася ў лес і я. Але крыху спазнілася, у мяне ж было трое малалетніх дзяцей. У хату зайшлі ўзброеныя людзі ў незнаёмай мне форме. Некаторыя размаўлялі на рускай мове. Магчыма, гэта былі ўласаўцы, мо паліцаі, хто іх ведае. Яны пачалі лавіць на двары курэй, забралі апошняе збожжа, забралі і карову, якая была нашай карміцелькай. Дзеці плакалі. Стала гаварыць ім, каб яны не плакалі, не палохаліся, бо гэта ж рускія. Потым звярнулася да ўласаўцаў: «Хіба можна ў сваіх людзей адбіраць апошняе? Як жа мы будзем жыць?» «Замолчи, будешь лезть, застрелим»,— агрызнуўся адзін з іх, адначасова замахнуўшыся на мяне прыкладам вінтоўкі.

Потым у лесе мы ўбачылі зарава над нашай вёскай. «Гарыць Сакалоўка»,— гаварылі людзі. Так яно і атрымалася.

Не дачакалася мужа, Міхаіла Рыгоравіча. Загінуў ён у канцы вайны.

З успамінаў Кацярыны Пятроўны Галайды, жыхаркі в. Рагаліна

Бацька мой, Пётр Лаўрэнцьевіч, і брат, Іван, дапамагалі партызанам, чым маглі. Збіралі зброю, патроны, якія перапраўлялі ў лес. У бацькі была рацыя. Нейкім чынам у 1942 г. пра дзейнасць бацькі і брата, а таксама другіх вяскоўцаў стала вядома гітлераўцам. Паліцаі і немцы схапілі бацьку і брата, забралі таксама Сцяпана Алёсава, Сцяпана Маісеенку, Фядона Сівакова, Лукер'ю Баранаву (яна даставала для партызан прадукты). Усяго тады ўзялі і расстралялі ў Чэрыкаве 10 чалавек.

Цяжка ўспомніць той час, калі вораг здзекаваўся над нашымі людзьмі, над нашымі вёскамі. Згарэла ў агні і наша Рагаліна, паліцаі і гітлераўцы падпалілі яе перад тым, як уцячы.

Запісаў І.Сулімаў.

АКТ АБ ЗВЕРСТВАХ НЯМЕЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У г. ЧЭРЫКАВЕ

1. Со дня прихода немцев в г. Чериков, т. е. с 16 июля 1941 года, начался дикий произвол, безудержные грабежи и массовые расстрелы мирного населения.

Немецко-фашистские изуверы, руководимые комендантом полковником Фишер, заведующим окружным сельскохозяйственным управлением (зондер-фюрером) Ген, начальником жандармерии лейтенантом Ритер, ограбили поголовно все население города, всех колхозников, а также захватили имущество, принадлежащее государственным предприятиям и учреждениям, общественным организациям и колхозникам, колхозам,— постройки, скот, машины и инвентарь, запасы сырья, полуфабрикаты и продовольствие.

2. Боясь ночных нападений партизан и частей Красной Армии, немцы с первых же дней оккупации начали жечь деревянные постройки на окраине города.

В дальнейшем, когда фронт передвинулся на Восток, пожары в городе не прекращались.

Планомерное разрушение городского хозяйства фашистские варвары закончили грандиозным пожаром, учиненным ими накануне своего отступления.

Из 893 строений осталось всего 23. Сгорели или были взорваны 3 школы-десятилетки, веттехникум, автошкола, народный дом, лесопильный завод, 2 больницы, баня, почта, леспромхоз, завод райпищепрома, 2 хлебопекарни, помещение райкома и райисполкома и т. д.

3. С первого же дня немецкие изуверы начали систематически истреблять мирное население.

От одиночных расстрелов немцы перешли к массовым убийствам мирного населения.

Так, например, в октябре 1941 года гитлеровцы объявили о переселении всего еврейского населения города в другое место. С этой целью около 500 евреев было согнано к нардому. После этого их пригнали в урочище Мостовое, что у мельницы, и расстреляли.

Цветущий белорусский город Чериков был превращен немцами в застенок гестапо. Каждую ночь пригоняли гестаповцы в дом Останковича, в Мухином переулке, десятки граждан и подвергали их мучительным пыткам.

27 июня 1943 года был арестован по доносу одного из предателей гражданин Шевелев. 400 ударов палками получил Шевелев.

По мере того, как он терял сознание, палачи приводили его в чувство и продолжали экзекуцию. В результате этого спина Шевелева превратилась в сплошную кровоточащую рану, а на его черепе было обнаружено 11 пробоин.

Жену командира Веру Федорову пытали раскаленным железом, вгоняли ей иголки под ногти и т. д.

В страшных мучениях погибли депутат Верховного Совета БССР Агафия Федосенко, секретарь нарсуда орденоносец Королев, агроном совхоза Иван Бруев, счетовод Капустенко и многие другие, причем немцы под страхом смертной казни не разрешали убирать трупы. Иван Бруев, например, очень долгое время лежал там, где его настигла вражеская пуля, на огородах позади больницы.

4. Несколько окрестных деревень немцы сожгли вместе с их жителями. В огне погибли жители деревень Рогальня, Припечино, Бакуновичи.

5. Немцы использовали местное население для разминирования минных полей, установленных некогда Красной Армией. Связывая колхозников цепями, немецкие солдаты с автоматами в руках гнали их впереди себя через минные поля. В результате подорвались на минах колхозники Фрол Очтов, Михаил Шрамов и многие другие.

6. Издевательствам немцев не было границ. Каждый старался придумать что-нибудь новое. Зимой 1941 г. немцы согнали свыше 400 колхозников и горожан на строительство моста через р. Сож.

Одному из офицеров показалось, что работы идут слишком медленно. Тогда он приказал всем советским гражданам раздеться догола и лечь на снег. Все без исключения были выпороты.

Особенно зверской расправе подверглись военнопленные — бойцы и командиры Красной Армии. Немцы пытали их голодом. Совершенно голодных, измученных людей фашисты погнали в Чаусы, за 40 км. Тех, кто лишался сил или падал, конвоиры прикалывали штыками. 73 человека погибли в пути от Черикова до Чаус.

7. Зарегистрированы многочисленные факты издевательства фашистов над женщинами и девушками, которых фашистские скоты насиловали прямо публично. Так, например, немецкие солдаты схватили среди белого дня Евдокию Х. и Ольгу Т. и изнасиловали тут же на площади.

8. Несколько сот человек немцы угнали на каторгу в Германию. Вначале они пытались создать видимость добровольной вербовки, но затем, когда из этого ничего не получилось, стали хватать первых попавшихся жителей прямо на улице. Всех попавшихся немцы бросали в машину и увозили на станцию.

9. Отступая под натиском Красной Армии, немцы в безумной ярости задались целью стереть город Чериков с лица земли, превратить его в «зону пустыни». Палачи намеревались угнать все уцелевшее население в Германию, а город сжечь. Тех, кто не хотел уходить из родного дома или пытались скрыться в лесу, немцы убивали или бросали живыми в огонь. Так, погибли Василий Шинкарев, Роман и Ефросинья Старовойтовы, Василий Шурупа и другие.

Одинокие старики Пимен Ивашков 70 лет и Марфа Дыкова 63 года — слезно умоляли немцев пожалеть их старость и не трогать домов. Слезы стариков только развеселили людоедов, они, смеясь, подожгли хаты, а самих хозяев живыми бросили в огонь.

Все вышеизложенное — только небольшая часть тех зверств, которые чинили немцы за два года своего пребывания в Чериковском районе.

Акт подписали жители г. Черикова — Ивановский Н. Л.
Черников В. Е.
Шевелев З. С.
Шинкарев Ф. К.

И представители Красной Армии
1943 г.

Арыгінал акта захоўваецца ў Чэрыкаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

За мужнасць і гераізм

Чатыром ураджэнцам Чэрыкаўскага раёна прысвоена ганаровае званне Героя Савецкага Саюза. Трое з іх атрымалі яго на франтах вайны, адзін — змагаючыся ў партызанскім атрадзе. А колькі іх, адважных сыноў і дачок Чэрыкаўшчыны, чые ратныя подзвігі, цяжкая праца на вайне і ў тыле ворага адзначаны ўзнагародамі Радзімы? Іх шмат. Наш расказ пра чатырох герояў — толькі малая доля той удзячнасці, якую выказваюць ім землякі за вялікі ўклад у справу разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў, за выратаваныя свабоду, гонар і незалежнасць сваёй Бацькаўшчыны.

Камандзір штурмавой групы

Герой Савецкага Саюза (21.7. 1944) Лаўрэнцій Васілевіч Дземянкоў нарадзіўся 15.7.1918 г. у в. Сакалоўка Чэрыкаўскага раёна. З сялян. Закончыў 1-е Омскае ваенна-пяхотнае вучылішча (1941), Усесаюзны завочны фінансава-эканамічны інстытут (1959). У Чырвонай Арміі з1938 г. З сакавіка 1942 г. на Ленінградскім і Карэльскім франтах. Праславіўся пры фарсіраванні р. Свір і прарыве абароны ворага ў раёне г. Лабейнае Поле Ленінградскай вобласці. Стралковы ўзвод пад камандаваннем лейтэнанта Л. В. Дземянкова гранатамі знішчыў два дзоты, чым садзейнічаў паспяховаму наступленню нашых часцей. 23.6.1944 г. тройчы штурмаваў варожыя траншэі. Быў паранены, але не пакінуў поля бітвы. Пасля вайны працаваў у органах МУС і КДБ, палкоўнік запасу.

Сорак другі год. Карэльскі фронт. Кругом адзін снег. Ён акутаў і без таго непраходныя лясы і балоты, заваліў вёскі, замёў дарогі, надаўбні, равы, калючы дрот. І дзесьці тут пралягла мяжа, што раздзяліла два полюсы, два міры.

28 снежня лейтэнанта Лаўрэнція Дземянкова і двух яго таварышаў выклікалі ў штаб дывізіі. Патрэбна было захапіць «языка». І не простага. Калі неабходна — весці разведку боем. Раён дзеяння — вышыня, што ў пяці кіламетрах ад лініі фронту.

Каля паўночы тры групы разведчыкаў, адну з якіх узначальваў Лаўрэнцій Дземянкоў, з розных бакоў накіраваліся ўбок праціўніка. Нашы стралялі, свяцілі ракетамі — адцягвалі ўвагу ворага.

Разведчыкі асцярожна рэзалі дрот, намацвалі і абясшкоджвалі міны. Іх было многа. «Як бульбы на полі»,— падумалася Дземянкову.

На досвітку ўваткнуліся ў абарону белафінаў, знялі часавых, «закрылі» дзве зямлянкі, захапілі процітанкавую гармату і з яе ж знішчылі дзот, які вельмі перашкаджаў рухацца ўперад на правым флангу. Але тут «языка» не ўзялі.

Дземянкоў загадаў сваёй групе ісці далей. Праскочылі яшчэ метраў трыста ўглыб варожай абароны і акапаліся. Па рацыі Дземянкоў паведаміў абстаноўку намесніку камандзіра палка. Але атрымаць далейшых указанняў не паспеў: завухкалі мінамёты, узнялася кругом зямля. Рацыя выйшла са строю. Разведчыкі апынуліся ў акружэнні.

Дземянкоў паслаў аднаго сувязнога, затым другога. Але яны загінулі

Л. В. Дземянкоў.

ад выстралаў «кукушак» — снайпераў, што хаваліся сярод развесістых елак. Засталося адно — умоўлены сігнал ракетамі: «Дайце агонь на мяне». І зноў няўдача: снарады кладуцца далёка ўбаку, нават не кранаюць фашысцкіх мінамётаў. Тады лейтэнант падае знак — адыходзіць да першай лініі варожай абароны і трымацца там да загаду.

Белафіны не шкадавалі мін і куль. Яны былі ўпэўнены, што рускія трапілі ў трывалую пастку. Некалькі разоў на працягу дня падымаліся яны ў атаку, але кожны раз акружаныя разведчыкі адбіваліся. А міны клаліся ўсё гусцей. Усё гарачэй станавілася тут, на маленькім кавалку зямлі.

Дземянкоў кінуў гранату ў групу белафінаў, якія беглі насустрач, і ўпаў, аглушаны рэзкім штуршком у лоб. На шчасце, куля фінскага снайпера трапіла прама ў каску каля зорачкі, але не закранула галаву.

Нехта трывожна закрычаў:

— Камандзіра забілі!

Дземянкоў умомант ускочыў на ногі:

— Я жывы. Усім заставацца на месцах, сачыць за праціўнікам.

Да яго падбег камандзір другой групы малодшы лейтэнант Дзятчанка:

— Што рабіць? Загаду адыходзіць няма, а патроны скончыліся... Злоснае шыпенне міны перарвала яго словы.

Ачуняў Дземянкоў за брустверам. Планшэта няма. Кажух на спіне парваны на шматкі. Шавяльнуўся — тупым болем аддало ў паясніцы. «Асколкам, пэўна»,— пранеслася ў думках. Рот як бы соллю набіты. Сплюнуў — кроў. Побач Дзятчанка, забіты напавал.

Лаўрэнцій Васілевіч прыўзняўся: фіны, кідаючы гранаты, скакалі ў акопы, лезлі ўрукапашную. Дземянкоў даў чаргу з аўтамата. Упалі. Агледзеўся — упрадзе лагчына. Там можна ўмацавацца. Падцягваючыся на руках, ён папоўз. Адстрэльваўся, пакуль не скончыліся патроны. Чуваць было, што бой перамясціўся ўбок нашай абароны і паступова затухаў. «Значыць, вырваліся,— з палёгкай уздыхнуў лейтэнант.— Значыць, трэцяя група паспела даставіць «языка»...

Апускалася ноч. Буйнымі камякамі паваліў снег. Дземянкоў прыладзіўся ў ямцы пад вершалінай разбітай елкі.

Ён чуў, як усю ноч па полю хадзілі, шукалі параненых, дабівалі іх нажамі. Забітых раздзявалі, а затым ставілі каля дротавай загароджы.

Дземянкоў сціснуў зубы ў бяссільнай злосці. Аўтамат з пустым дыскам дапамагчы не мог. Спіна здранцвела. Слабасць разлілася па ўсім целе. Стукала ў вісках. Часам наступала забыццё.

Зімовы дзень згасае хутка. Наступіла другая ноч. Без ежы, без сну, у заваленай снегам яме. У дадатак да ўсяго — падмарозіла. Пад раніцу зусім побач, кроках у пяці, зноў зашамацеў снег. Нехта глуха вылаяўся. Нашы!

Дземянкоў застагнаў...

Яго знайшлі, пацягнулі. На пагорку іх асвяціла ракета. Хвастанулі з усіх бакоў кулямётныя чэргі. Двое так і не ўсталі болей. Параніла і таго байца, што нёс Дземянкова.

У шпіталі Лаўрэнцій Васілевіч сустрэўся са сваім выратавальнікам і ад хвалявання доўга нічога не мог сказаць, а толькі трос і трос яго абедзве рукі.

Месяц правёў Дземянкоў у шпіталі. Тут і спазнаў страшную вестку. Аказалася, што ў часці яго ўжо занеслі ў спіскі без вестак прапаўшых і паведамілі аб гэтым родным. Лаўрэнцій Васілевіч паспяшаўся напісаць матцы, але... яе ўжо не было ў жывых. Яна не перанесла весткі аб гібелі старэйшага сына... Цяжкім каменем лягло гэтае гора на душу

лейтэнанта Дземянкова. Ён зноў і зноў хадзіў на самыя рызыкоўныя заданні, браў «языка» там, дзе гэта было амаль немагчыма.Ордэн Чырвонай Зоркі — лепшае сведчанне таму.

20 чэрвеня 1944 г. Дземянкова вызвалі да камандзіра дывізіі. У назначаны час тут сабралася многа ўзводных, якіх Лаўрэнцій Васілевіч добра ведаў. Усе чакалі чагосьці значнага.

Генерал быў немнагаслоўным:

— Перад вамі ставіцца адказная задача. Па загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага мы пераходзім у рашучае наступленне па ўсім фронце. Наступіў час канчатковага вызвалення нашай зямлі ад фашысцкай нечысці. Вы назначаецеся камандзірамі атрадаў прарыву, будзеце кіраваць штурмавымі групамі, за якімі пойдуць галоўныя сілы.

Тры гады стаяў тут вораг, усё аблытаў калючым дротам, набудаваў магутных дотаў і дзотаў, у некалькі радоў замініраваў увесь бераг. А сёння нашы часці падышлі ўшчыльную да гэтых цвярдынь і сталі на зыходныя пазіцыі каля горада Ладзейнае Поле, паміж Анежскім і Ладажскім азёрамі, побач з рэчкай Свір. Заўтра — бой.

...Вечарам да Дземянкова сталі адзін за другім падыходзіць афіцэры:

— Кулямётчыкі прыбылі ў ваша распараджэнне...

— Сапёры...

— Мінамётны ўзвод...

— Разлік процітанкавых ружжаў...

Шматлікія прадстаўнікі рознага роду зброі склалі адзін ударны кулак — перадавую групу прарыву варожай абароны. Дзесьці там, за гушчаром дрэў, чакалі ўмоўнага сігналу іншыя такія ж штурмавыя атрады. Лаўрэнцій Васілевіч уважліва ўглядаўся ў процілеглы бераг шырокай і бурнай ракі. Здавалася, што там, акрамя дзікіх няходжаных лясоў і балот, нічога няма. Але лейтэнант ведаў: адразу каля абрыву — першая лінія абароны праціўніка. Яе трэба прарваць з ходу, пасля пераправы, затым укліниіцца ўглыб прыкладна на кіламетр, захапіць тракт і не даваць гітлераўцам падцягваць сілы да месца прарыву. Цішыня раптам раскалолася, зямля вухнула, загудзела. На тым беразе замільгалі ўсполахі ўзрываў у грозна-дымным тумане. Ажыў лес. Дзесяткі лодак кінуліся ўперад. У кожнай — па пятнаццаць-дваццаць салдат. Грабуць хто вяслом, а хто — дошкай, жэрдкай. Хутчэй, хутчэй. Але вораг паспеў апамятацца. Паласнулі па вадзе доўгія і кароткія чэргі, рака ўспенілася, ад бартоў лодак паляцелі шчэпкі. Калі да берага заставалася якіх-небудзь дваццаць метраў, побач з лодкай Дземянкова ўзмятнуўся слуп вады. Лодку падкінула і перавярнула. Кулямёт вокамгненна пайшоў на дно. Цяжкія боты і сумка с боепрыпасамі цягнулі ўніз. Сілы пакідалі салдат. І раптам крык Дземянкова:

— Станавіся ўсе! Тут мелка!

Першая лінія абароны была зламана адразу. Рэшткі ворага беглі ў паніцы ўверх па траншэях. Праціўнік не вытрымаў імклівага націску штурмавой групы і паспешна стаў адступаць. Спроба байцоў на плячах ворага ўварвацца ў акопы гэтага рубяжа поспеху не мела. Штурмавая група наткнулася на міннае поле, ззаду якога была дротавая загароджа ў тры рады. А на вышыні знаходзіўся дзот, агонь з якога не даваў магчымасці байцам лейтэнанта ісці ўперад — з пярэдняй амбразуры біла 75-міліметровая гармата, з бакавых — кулямёты.

Лейтэнант Дземянкоў разумеў, што ўперад не пройдзеш, пакуль не будзе знішчаны дзот. Баявое заданне, якое выконвала яго група ва ўзаемадзеянні са штурмавой групай

лейтэнанта М. П. Бераставенкі, было пад пагрозай зрыву. Варожы дзот трэба ўціхамірыць. Камандзір узвода паслаў добраахвотнікаў і сапёраў. Ім удалося падабрацца да варожай агнявой кропкі і закідаць яе гранатамі. Прагучала адначасова некалькі выбухаў, і дзот замаўчаў.

Тады лейтэнант Дземянкоў падняўся ва ўвесь рост і крыкнуў:

— За Радзіму! Уперад!

За ім рынуліся салдаты, праклалі сабе шлях праз завал, пераадолелі па праходу мінное поле і выбілі праціўніка з акопаў. Праз некалькі хвілін штурмавая група выйшла на дарогу Сартавала — Петразаводск. Мэта, якая стаяла перад яго ўзводам, была дасягнута, і цяпер лейтэнант павінен замацаваць за сабой заваяваны рубеж.

— Заняць абарону ўздоўж шашы,— загадаў ён.— Падрыхтавацца да контратакі праціўніка. Не прайшло і паўгадзіны, як штурмавы атрад быў гатовы да бою. Байцы схаваліся ў варонках ад мін і снарадаў, укрыліся за валунамі, выкапалі сабе стралковыя ячэйкі. Лейтэнант выставіў на больш небяспечныя ўчасткі кулямёты, а на танканебяспечныя — бранябойшчыкаў, некалькі чалавек назірала за ворагам. У хуткім часе яны паведамілі, што вораг пачынае атаку. Але Дземянкоў заўважыў гэта раней, чым назіральнікі, і даўно загадаў падрыхтавацца да бою. Каля батальёна варожай пяхоты рушыла на пазіцыі штурмавога атрада лейтэнанта Дземянкова. Але ён не спяшаўся аддаваць загад, чакаў, калі вораг падыдзе бліжэй. Затым скамандаваў:

— Агонь!

Ударыў дружны залп. Многа фашыстаў засталося ляжаць на зямлі, але астатнія працягвалі ісці ўперад. Варожыя шарэнгі радзелі, і наступіла хвіліна, калі фашысты спыніліся, а затым кінуліся наўцёкі. Ім наўздагон ударыў яшчэ адзін дружны залп.

— Спыніць агонь, берагчы патроны! — перадаў па ланцугу Дземянкоў загад, і над пазіцыяй узвода павісла цішыня.

Цягнулася яна нядоўга. Вораг зноў пайшоў у контратаку і зноў быў спынены і адкінуты на зыходны рубеж. Але ў хуткім часе праціўнік пачаў атакі з усіх бакоў. Ворагу ўдалося адрэзаць атрад Дземянкова ад асноўных сіл.

...Ішла сёмая гадзіна бою, калі на дапамогу Дземянкову прыйшоў узмоцнены ўзвод лейтэнанта М. Бераставенкі. Яго салдаты прайшлі той жа шлях, што і байцы Дземянкова, але з правага фланга. Два ўзводы вялі бой у акружэнні да таго часу, пакуль на выручку ім не прыйшлі дэсантнікі, скінутыя ў тыл ворага каля 22 гадзін вечара. Яны ўдарылі па фашыстах з тылу, а з фронту на штурм пайшлі асноўныя сілы палка. Вораг не вытрымаў двайнога ўдару і стаў паспешна адступаць. Абарона праціўніка была прарвана, і ў прарыў кінулася ўся 272-я стралковая дывізія.

Раніцай лейтэнанту Дземянкову, які працягваў ісці ўперадзе палка, загадалі прыняць камандаванне стралковай ротай. Рота лейтэнанта вызваліла гарады Алянец, Відліцу, Сальмы, Піткяранту. Пры штурме апошняга Дземянкоў быў цяжка паранены. 6 ліпеня 1944 г. рота Дземянкова падышла да вышыні перад Піткярантай. Тут і завязаўся цяжкі бой. Вышыня некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі. Калі рота ў апошні раз авалодала гэтым пунктам, у яе складзе заставалася ўсяго 17 чалавек. На вяршыні адзін з параненых салдат праціўніка выпусціў па Дземянкову чаргу з аўтамата.

Пасля шпіталю Дземянкова адправілі на лячэнне ў глыбокі тыл. Там і даведаўся Лаўрэнцій Васілевіч, што яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Ф. Цярэнцьеў.

Зорны след

Герой Савецкага Саюза (15.8.1944) Піліп Іванавіч Кавалёў нарадзіўся 27.11.1916 г. у в. Гойкаў Чэрыкаўскага раёна. З сялян. Беларус. З 1935 г. працаваў у саўгасе, на заводзе, брыгадзірам Чэрыкаўскай МТС. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941 г., з чэрвеня 1942 г. у тыле ворага ў Беларусі, з ліпеня 1943 г. камандзір групы падрыўнікоў 255-га партызанскага палка. Загінуў у баі 17.3.1944 г. каля в. Пярунова Кіраўскага раёна. Пахаваны ў в. Боркі Кіраўскага раёна.

Ён пражыў кароткае жыццё. Шмат год прайшло з дня гібелі, але Піліпа Кавалёва памятаюць і сёння: у в. Гойкаў, дзе нарадзіўся, на Магілёўшчыне, Гомельшчыне.

— Я ведаю іх сям'ю,— успамінае старажыл Гойкава Фёдар Апанасавіч Марчанка.— Мы з бацькам Піліпа доўгі час працавалі ў цяслярнай брыгадзе. На ўсе рукі майстар быў Іван Пятровіч. У Камаровічах школу, электрастанцыю будавалі, пажарнае дэпо ў Чэрыкаве, мост на Сожы рамантавалі... Такі разважлівы, ціхі і працалюбівы. І дзеці ў іх такія ўдаліся.

А дзяцей у сям'і Кавалёвых гадавалася сямёра: чатыры сыны і тры дачкі. Не так проста было іх выхаваць. З досвітку да цямна працавалі. Трохі палягчэла, як калгас стаў, ды не зусім: як-ніяк сямёра расло. Старэйшыя, вядома, рана пайшлі з дому. А Піліп вучыўся ў школе, дапамагаў бацькам. Скончыў сем класаў і стаў працаваць у саўгасе. Толькі нядоўга так было. Старэйшы брат зваў да сябе ў Запарожжа. У той час нікому не давала спакою слава «Днепрагэса». І ён накіроўваецца ў няблізкі горад. Вырасшы ў вёсцы, сярод лесу, з дзяцінства прывыкшы да зямлі, юнак не мог застацца ў горадзе. Ён вяртаецца ў родны Гойкаў і паступае на курсы трактарыстаў пры МТС, якая ў той час абслугоўвала іх калгас.

А з Захаду паспявала вайна. Аб ёй мала гаварылі ўслых, але кожны адчуваў яе прыбліжэнне. Піліпа прызвалі ў рады Чырвонай Арміі. Учарашняму трактарысту прыйшлося служыць у бронетанкавых войсках, дзе і сустрэў ён Вялікую Айчынную вайну на паўночных рубяжах Бацькаўшчыны.

У франтавых зводках таго часу часцей за ўсё ўспаміналіся назвы гарадоў і вёсак Беларусі, Украіны, Прыбалтыкі. Але і на самой Поўначы, на Карэльскім перашыйку ішлі жорсткія баі. Гітлераўскае камандаванне ніяк не магло дабіцца значнага поспеху. Яно кідала ў бой усё новыя і новыя сілы. У адным з такіх баёў і быў паранены Піліп Кавалёў. Думалася — не выжыве. Але маладосць, дактары, жаданне хутчэй вярнуцца ў строй перамаглі. Ён стаў на ногі. Толькі ўрачэбная камісія аказалася няўмольнай: нягодны для страявой.

І Піліп стаў рыхтавацца да работы ў тыле ворага. Вывучаў падрыўную справу, на палігоне падрываў масты, іншыя аб'екты. І летам 1942 г. у складзе дэсантнай групы ўпраўлення разведкі быў закінуты ў Гомельскую вобласць. Іх сустрэлі прадстаўнікі 255-га партызанскага атрада. Яго камандзір Міхаіл Марусаў, сам лейтэнант Чырвонай Арміі,

П. І. Кавалёў.

вельмі абрадаваўся пасланцам з Вялікай зямлі, у якіх аказалася 100 кілаграмаў толу, міны, аўтаматы, іншы ваенны рыштунак. І вельмі хутка падрыўнікі заявілі аб сабе. На прыкладзе аўтамата Піліпа Кавалёва спачатку з'явілася адна, потым другая зарубка. І колькасць іх працягвала ўвесь час расці, адзначаючы ўзарваныя масты, аўтамабілі, варожыя эшалоны. Цяжка было з узрыўчаткай, але выручала партызанская кемлівасць. Знаходзілі неразарваўшыяся снарады і выплаўлялі з іх тол. У партызанскім атрадзе ўвесь час дыміла «толавая кухня», на варожых камунікацыях грымелі ўзрывы. Сярод падрыўнікоў нават было своеасаблівае спаборніцтва: хто больш узарве эшалонаў. І пераўзысці групу Піліпа Кавалёва ніхто не змог. Толькі падрыўнікі Аркадзя Нобкіна нараўне ішлі з імі.

З дня ў дзень расло майстэрства маладых падрыўнікоў. Выдатна змагаліся і камсамольцы-партызаны. Крыху пазней, у 1943 г. з іх быў сфарміраваны камсамольска-маладзёжны атрад. Сваё нараджэнне ён адзначыў разгромам фашысцкага гарнізона непадалёку ад Старога Сяла, што на Рагачоўшчыне. У гэтым баі было захоплена 3 кулямёты, 2 мінамёты, вінтоўкі і 8000 патронаў. Гарачы бой завязаўся з эсэсаўцамі ў в.Залоззе. «За кулямётам Лёня Аляксандраў, камсамольскі сакратар,—піша ў сваёй кнізе «Райком у падполлі» былы сакратар Рагачоўскага падпольнага РК КП(б) І. У. Зуевіч.— Ён адбіў першую атаку, але за ёй пачалася другая. Кулямёт замаўчаў. Вось да кулямёта прыпаў Віталь Журомскі. А Піліп Кавалёў адбіваецца гранатамі. 18 гітлераўцаў знайшлі сабе магілу ля Залоззя».

У той час фронт набліжаўся да Рагачова. Усё ажыўленей станавіўся рух на шашы і чыгуначных дарогах, якія ўзмоцнена ахоўваліся і днём і ноччу. І ўсё ж у пачатку ліпеня 1943 г. Піліп Кавалёў зрабіў дзве зарубкі на прыкладзе аўтамата. І сябры ўшчувалі Піліпа:

— Пападзе табе, Кавалёў, ад камандзіра — так зрэзаў прыклад.

Але,вядома, гэта быў жарт. Піліпа любілі байцы і камандзіры за спакойны і лагодны характар, за баявыя справы. Ён заўсёды першы ішоў на самыя рызыкоўныя аперацыі. Вось і ў тую халодную вясну палку паступіў загад: узмацніць удары па камунікацыях. Не адзін раз рота Кавалёва выходзіла на заданне. Партызаны выбралі шашу Магілёў — Бабруйск асноўным аб'ектам для засад і дыверсій.

19 сакавіка 1944 г. засада таксама прайшла ўдала. У кароткім, жорсткім баі варожая калона была разгромлена. У кюветах, на дарозе гарэлі машыны, валяліся трупы фашыстаў. Падняўшыся на ўвесь рост Кавалёў крыкнуў:

— З перамогай вас, хлопцы!

І тут з другога боку шашы з-за валуна ўдарыла аўтаматная чарга. Вось што ўспамінае далей у сваёй кнізе І. Зуевіч: «Цяжкім і самотным быў вясновы дзень: мы хавалі свайго любімца. 19 эшалонаў і 30 аўтамашын падарваў ён асабіста, нямала правёў другіх смелых аперацый. Трынаццаць дыверсійных груп падрыхтаваў Піліп Кавалёў. Ля выкапанай магілы выстраен полк. Камісар А. Н. Захараў гаворыць развітальныя словы.

Трохразовы салют. Далёка-далёка пакаціла лясное рэха».

У лютым 1944 г. Піліп Кавалёў быў прадстаўлен да звання Героя Савецкага Саюза. Не дачакаўся ён радаснага дня. Высокае званне яму было прысвоена пасмяротна.

Я. Лявінскі.

На крылах перамогі

Герой Савецкага Саюза (22.2.1939) Яўген Макаравіч Нікалаенка нарадзіўся 17.9.1905 г. у в. Вудага Чэрыкаўскага раёна. З сялян. Беларус. Скончыў акадэмію Генштаба (1952). У 1935—1941 г. камандзір звяна, атрада, эскадрыллі, начальнік ваеннай авіяшколы, камандзір авіядывізіі, намеснік камандуючага, камандуючы ВПС акругі. Вызначыўся ў 1939 г. пры выкананні спецыяльнага ўрадавага задання. У Айчынную вайну на Паўднёвым, Крымскім, Заходнім, Паўднёва-Заходнім, 3-м Беларускім франтах — камандуючы ВПС арміі, фронту, намеснік камандуючага паветранай арміяй. Удзельнік баёў пад Масквой, у Крыму і Усходняй Прусіі. Да 1955 г. Я. М. Нікалаенка знаходзіўся на адказных пасадах у ВПС. Памёр 16.4.1961.

Я. М. Нікалаенка.

Памяць не падуладна часу. Ліпеньскія дні 1939 г. былі спякотнымі. У паветры трымаўся пах свежаскошанай травы, духмяны водар паспеўшай збажыны. У той дзень незвычайнае ажыўленне панавала на дарозе Вудага — Чэрыкаў. Чарада ўвітых кветкамі павозак рухалася ў бок раённага цэнтра. Чуваць былі бадзёрыя галасы і перазвон званочкаў.

Чэрыкаўшчына славіла свайго героя. Пасля паспяховага выканання спецыяльнага задання Савецкага ўрада ў родныя мясціны прыехаў зямляк, Герой Савецкага Саюза Яўген Макаравіч Нікалаенка. Прыехаў, як сын прыязджае да любімых бацькоў і гасцінных суседзяў. У ліпавым парку Чэрыкава адбыўся мітынг. Паглядзець на героя, паслухаць, што скажа, хацелася ўсім. Таму людзей сабралася столькі, што, як кажуць, яблыку недзе было ўпасці. Яўгена Макаравіча сустрэлі апладысментамі, воклічамі «Ура», «Няхай жыве наш доблесны паветраны флот!», «Слава герою!»

Літаральна на руках дужымі хлопцамі з Вудагі быў узняты на трыбуну сярэдняга росту, каржакаваты, чорнавалосы падпалкоўнік авіяцыі з Залатой Зоркай Героя, ордэнамі Леніна і Чырвонага Сцяга на грудзях. Пасля славутага лётчыка Грыцаўца, які ваяваў у Іспаніі, Яўген Макаравіч Нікалаенка стаў новай гордасцю.

Яўген Макаравіч Нікалаенка быў сярэднім у сям'і. Ён вызначаўся вялікай дысцыплінаванасцю, вострым розумам і цягай да ведаў. Больш за ўсё любіў кнігі пра падарожнікаў і смелых людзей. Пасля заканчэння пачатковай школы з 1918 па 1924 г. навучаўся ў Чэрыкаўскай школе. Тут ён з захапленнем слухаў урокі Мадэста Мікалаевіча Лепяшынскага, які, будучы дырэктарам школы-камуны ў Лімені, запрашаўся ў Чэрыкаўскую школу. Менавіта гэты выдатны педагог здолеў прывіць дапытліваму хлапчуку вялікую прагу да ведаў, заахвоціў яго да тэхнічнай творчасці, растлумачваў яму складаныя пытанні, якія выходзілі за рамкі школьнай праграмы.

Яшчэ за школьнай партай праявілася здольнасць Жэні да матэматыкі і фізікі. Педагогі лічылі, што яму трэба выбраць навуковую дзейнасць. Але нечакана для ўсіх у чэрвені 1924 г. ён ад'язджае ў Ленінград і ўладкоўваецца на работу. Хіба мог юнак прызнацца, што паездка гэтая выклікана дзвюма прычынамі: у Ленінградзе цяжка захварэў брат-

студэнт, якому была патрэбна яго дапамога, і затоеная мара стаць лётчыкам. Ён захапляўся славутым рускім пілотам Несцеравым, іншымі смелымі паветраплавальнікамі.

Праз тры гады збылася мара. Спачатку ён паступае ў ваенна-тэарэтычную школу Ваенна-Паветраных Сіл Чырвонай Арміі, потым у школу лётчыкаў. Курсант Нікалаенка звярнуў на сябе ўвагу выкладчыкаў сваёй мэтанакіраванасцю, жаданнем у дасканаласці ведаць матэрыяльную частку самалёта. Ён праводзіць доўгія гадзіны без адпачынку ў лабараторыях на трэнажорах і дабіваецца свайго — становіцца лепшым сярод курсантаў. Таму пасля заканчэння школы Яўгена пакідаюць інструктарам па пілатаванню, а крыху пазней — па вышэйшаму пілатажу.

Шэсць год знаходзіўся Яўген Макаравіч на гэтай пасадзе. За гэты час ён падрыхтаваў не адзін атрад чырвоных сокалаў. Ды і сам не забываў аб тым, што ён пілот. Захаваўся рапарт Я. М. Нікалаенкі на імя камандавання аб прадстаўленні яму магчымасці служыць у войсках. Сэрца і розум падказвалі ваеннаму лётчыку, што на захадзе збіраюцца хмары ваеннай небяспекі. У чэрвені 1937 г. Яўген Макаравіч Нікалаенка назначаецца камандзірам авіяэскадрыллі.

Баявая біяграфія Нікалаенкі пачынаецца ў 1938 г. з удзелу ў вызваленчай вайне кітайскага народа з японскімі захопнікамі. Сотні савецкіх людзей тады добраахвотна выказалі жаданне прыйсці на дапамогу кітайскім патрыётам у барацьбе з ворагам. У сакавіку 1938 г. такім добраахвотнікам стаў капітан Нікалаенка. Тут камандзір знішчальнай эскадрыллі і атрымаў баявое хрышчэнне. У яго дзённіках таго суровага часу ёсць запіс: «Сёння другі вылет. Не паспеў узняцца — да хваста прыстроіўся самурай. Іду стопарам уніз, а потым вырываюся і б'ю па ворагу. З другой чаргі сцярвятнік падае, пакідаючы дымны след...»

За час удзелу ў баявых дзеяннях Я. М. Нікалаенка асабіста збіў 6 самалётаў і ў саставе групы яшчэ 10. А колькі разоў прыходзіў на дапамогу таварышам па зброі! У лістападзе 1938 г. ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. 23 лютага наступнага года газета «Правда» змясціла Указ ЦВК СССР аб прысваенні Я. М. Нікалаенку ганаровага звання Героя Савецкага Саюза.

Пасля вяртання з Кітая падпалкоўнік Нікалаенка быў начальнікам авіяшколы. Неўзабаве, ужо ў званні палкоўніка, ён прызначаецца намеснікам камандуючага Кіеўскай асобнай ваеннай акругай, а напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны — камандуючым ВПС Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі.

Яўген Макаравіч належыць да той катэгорыі военачальнікаў, якія вызначаліся выключнай працаздольнасцю і чалавечай сціпласцю. Нягледзячы на высокія званні і пасады, ён заставаўся простым, даступным і ў вышэйшай ступені патрабавальным да сябе чалавекам. Не раз ён гасцінна прымаў прыязджаючых па розных справах землякоў, аказваў ім усялякую дапамогу.

Вайна застала генерал-маёра авіяцыі Я. М. Нікалаенку на баявым пасту. Праз месяц пасля яе пачатку ён узначальвае ваенна-паветраныя сілы 5-й арміі Паўднёва-Заходняга фронту. З уласцівай яму энергіяй і настойлівасцю новы камандарм дабіваецца, каб авіяцыя разам з наземнымі войскамі наносілі моцныя ўдары па гітлераўцах, робіць усё, каб пабольш знішчыць жывой сілы і тэхнікі ворага.

На ўсё жыццё запомніў генерал

Нікалаенка дзень 31 ліпеня 1941 г., калі атрымаў прызначэнне камандаваць ваенна-паветранымі сіламі Рэзервнага фронта, якім камандаваў тады выдатны савецкі палкаводзец Г. К. Жукаў. Менавіта тады авіятары сумесна з іншымі родамі войск рыхтавалі першы магутны ўдар па фашысцкіх войсках — разгром немцаў пад Масквой. У дзённіку з'явіўся запіс Нікалаенкі: «Г. К. Жукаў — ваенны талент, у якога можна павучыцца. Усяму — нават падцягнутасці і акуратнасці. Не любіць мнагаслоўя. Адразу прыступае да справы. Вельмі здзівіўся, калі стаў распытваць аб жонцы і сыне, іх здароўі».

Ваенны лёс генерала Нікалаенкі склаўся так, што яму прыходзілася знаходзіцца там, дзе было найбольш цяжка і небяспечна, дзе патрабавалася канцэнтрацыя думкі, пачуццяў і волі военачальніка. Ён асабіста лётаў на баявыя заданні — удзень і ўначы. Маладыя лётчыкі маглі многаму павучыцца ў генерала. У асабістай кніжцы Нікалаенкі ёсць запіс аб тым, што да кастрычніка 1943 г. ён зрабіў 140 баявых вылетаў, з іх 30 — начных.

Майстэрства генерала Я. М. Нікалаенкі асабліва праявілася ў наступальных аперацыях 3-га Беларускага фронту. Падзеі тых дзён былі насычаны масавым гераізмам і легендарнай мужнасцю салдат і афіцэраў. Нікалаенка асабіста кіраваў авіяцыйнымі злучэннямі. У сваёй аўтабіяграфіі ён адзначае, што ў час баявых дзеянняў гэтага перыяду яму даручалася планаванне, арганізацыя ўзаемадзеянняў з наземнымі войскамі і фактычна кіраванне авіяцыйнымі злучэннямі.

Упраўленне і кіраўніцтва аперацыямі, асабісты прыклад славутага авіяцыйнага генерала забяспечвалі поспех. Яго крылатыя сокалы атрымлівалі перамогу за перамогай над ворагам — у Беларусі, ва Усходняй Прусіі, пры штурме Кёнігсберга і авалоданні портам і базай Пілау. Толькі ў гэтых аперацыях за мужнасць і гераізм 28 лётчыкам 1-й паветранай арміі было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Баявыя заслугі генерал-лейтэнанта авіяцыі, славутага сокала Я. М. Нікалаенкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны высока ацаніла Радзіма. Побач з Залатой Зоркай Героя на яго грудзях заззялі два ордэны Леніна, два ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Суворава II ступені, Кутузава II ступені, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, баявыя медалі.

Адгрымелі апошнія залпы Вялікай Айчыннай вайны, і генерал Я. М. Нікалаенка вярнуўся да навучання маладых пілотаў. Ён дапамагаў ім авалодваць навейшай авіяцыйнай тэхнікай. У 1957 г. па стану здароўя ён выходзіць у адстаўку, едзе ў Ленінград, дзе калісьці навучыўся лятаць. Цяжкахворы Яўген Макаравіч працягвае весці ваенна-патрыятычную работу. Яго не стала ў 1961 г. Развітваючыся з генералам, нехта з яго баявых сяброў сказаў: «Няхай памёр ты, але ў сэрцы смелых і моцных духам заўсёды будзеш жывым прыкладам».

У. Базылёў.

Наступала грозная браня

Герой Савецкага Саюза (24.03.1945) Уладзімір Раманавіч Яўсеенка нарадзіўся 22.11.1922 г. у в. Рынкоўка Чэрыкаўскага раёна. З сялян. Беларус. У Чырвонай Арміі з 1941 г. Удзельнік вызвалення Украіны, Малдавіі, Венгрыі. Механік-вадзіцель танка гвардыі ст. сяржант У. Р. Яўсеенка вылучыўся ў жніўні 1944 г. пры вызваленні Румыніі і фарсіраванні р. Серэт. Экіпаж танка ў баях за гарады Бырлад, Фокшані, Бузэу знішчыў 5 самаходных установак,

У. Р. Яўсеенка.

5 гармат і больш 400 гітлераўцаў, захапіў 8 мінамётаў, 400 вінтовак і 10 ручных кулямётаў, першым прарваўся да моста цераз р. Серэт, знішчыў 3 артбатарэі і трымаў мост да падыходу падмацавання.

Пасля вайны да 1961 г. працаваў у Томску намеснікам начальніка трэста «Сібэлектрамантаж».

У абліччы гэтага чалавека не варта вышукваць штосьці незвычайнае. Твар, якіх сотні і тысячы ўбачыш у натоўпе і не звернеш увагі — самы звычайны твар. Нос «бульбінкай». Постаць таксама непрыкметная. Але пры больш блізкім знаёмстве з Уладзімірам Раманавічам Яўсеенкам вас уразіць прамы позірк уважлівых вачэй, сціпласць чалавека, які, прыняўшы на свае плечы нялёгкую славу Героя, не страціў і па сённяшні дзень гэтай сціпласці. Мне прыгадаўся момант, калі Уладзімір Раманавіч разам з таварышамі, якія наведалі Чэрыкаўшчыну ў святочныя дні вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў, прыйшоў да нас развітацца. Як ён быў уражаны, усхваляваны, калі яму ўручылі сціплы падарунак — кніжкі беларускіх пісьменнікаў аб мінулай вайне.

— Я даўно не жыву ў Беларусі,— сказаў ён тады,— але пастаянна адчуваю, што я сын зямлі беларускай.

Вось і зараз перад яго вачыма паўстаюць тыя прыгожыя мясціны: хата за ракой, пакрытая саломай, каля ганка — стары клён. Іх, дзяцей, абавязкам было ў дзень, калі пяклі хлеб, нарваць з клёну разлапістых лістоў, на якія потым увішныя рукі маці клалі белыя кругляшы цеста. Пах свежай падсмажанай хлебнай скарынкі Уладзімір Раманавіч запомніў назаўсёды. Але Яўсеенкі тады хлеб пяклі не часта, не гаворачы ўжо пра булкі. У сям'і толькі дзяцей шасцёра, і хоць быў кавалак зямлі, карова, конь, не хапала сродкаў, каб усе былі і сыты, і апрануты. І бацька вырашыў: едзем у Сібір абжываць тамашнюю зямлю. Сям'я жыла светлымі марамі, бо дзеці адзін за адным падрасталі, былі падрыхтаваны да самастойнага жыцця. Але мірныя планы перарвала вайна. У гэта не хацелася верыць, пакуль вайна не пастукала ў дзверы. Уладзімір Яўсеенка трапіў у авіятэхнічнае вучылішча, а пасля яго заканчэння — у танкавы полк, дзе патрэбна было ў дасканаласці вывучыць бронемашыны, танкі. У 1943 г. прыйшоў час «панюхаць» пораху на фронце. Гэта быў 2-гі Украінскі фронт, 6-я гвардзейская Чырванасцяжная танкавая армія. Насіць імя гвардзейца і ганарова і нялёгка. Гэтага звання Уладзімір быў удастоены за ўдзел у Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, за яе атрымаў і першую сваю ўзнагароду — медаль «За адвагу». Вельмі сімвалічна, што паслужны спісак будучага героя пачынаўся менавіта вось так — з адзнакі яго мужнасці і адвагі. А пазней танкісты пераканаліся, што адвага — рыса характару Яўсеенкі такая ж, як і сціпласць, і сумленнасць,— рыса, характарызуючая сапраўднага чалавека.

Першая ўзнагарода, асабліва памятная, як і падзеі, звязаныя з ёй. Фашысты ў шалёнай лютасці спрабавалі разарваць кальцо, якое нашы часці замкнулі вакол Корсунь-Шаўчэнкаўскай групіроўкі. Атакі ішлі адна за другой. На адну з дарог вораг кінуў да 90 танкаў. Нягледзячы на пераўзыходзячыя сілы, рух праціўніка быў спынен. Танкам Яў-

сеенкі былі знішчаны два танкі і адна самаходная ўстаноўка праціўніка. Фашысты распачалі новы манеўр — варожая пяхота абышла трыццацьчацвёркі і зайшла ў тыл.

Нянавісць да чужынцаў, да агрэсараў і захопнікаў ахапіла кожнага савецкага воіна. І танк Яўсеенкі разпораз выяўляў гэтую нянавісць згусткамі рыжага агню, трапнымі чэргамі. Кулямёт біў бесперапынна. Тут выручаў Уладзімір. Калі танк вёў бой з месца, ён, як механік-вадзіцель, па сутнасці, бяздзейнічаў і ў гэты час зараджаў дыскі кулямёта.

У жніўні 1944 г. танкавая брыгада, у якой служыў Яўсеенка, перайшла ў наступленне пад Ясамі. Гэта была ўжо румынская зямля. Горад Бырлад. Вораг наладжваў засады, мініраваў дарогі, але нішто не магло спыніць баявы парыў нашых войск. Фашысты не спадзяваліся, што савецкія танкі пройдуць прасёлачнымі дарогамі праз горы, і не чакалі ўдару ў гэтым напрамку. А танкі з маршу ўступілі ў бой за горад. Уладзімір бачыць, як услед за стрэлам пераварочваецца нямецкая гармата, а другая папала пад гусеніцы танка. Да ночы палавіна горада ўжо ў руках вызваліцеляў. Раніцай танк Яўсеенкі атакаваў чыгуначную станцыю, падбіў адзін з цягнікоў. Фашысты ў паніцы ўцяклі. Так было захоплена тры эшалоны са зброяй і боепрыпасамі.

Горад Бузэу. Начная атака не ўдалася, і камандаванне прымае рашэнне — выдзеліць тры танкі і паслаць іх у засаду ў тыл ворага, каб перахапіць шашу і чыгунку. У ліку гэтых траіх і танк Яўсеенкі. На світанні, як і задумана, тройка, удала прайшоўшы варожы тыл, нечакана ўрываецца на чыгуначную станцыю, дзе, гатовыя да адпраўкі, стаяць эшалоны з танкамі, аўтамашынамі, усюдыходамі. Першыя ж стрэлы прымусілі фашыстаў уцякаць. Станцыя захоплена, але танкі імчаць далей. Вось паказаўся аэрадром. Каб не выявіць сябе, танкісты па пасевах кукурузы абыходзяць яго і выходзяць на тылавыя дарогі горада.

Гэты рэйд залічыў на рахунак экіпажа тры самаходныя гарматы і адзін танк, знішчаную жывую сілу праціўніка. Нельга не ўспомніць і бой за горад Факшані. Знішчана самаходка, бронетранспарцёр, к вечару горад наш, гарыць аэрадром. Але, здаецца, што і машыне перадалося захапляючае пачуццё не спыняцца, ісці ўперад, граміць ворага. І танк Яўсеенкі вырваўся за горад і першым падышоў да моста цераз раку Серэт. Трапным агнём была знішчана ахова. Не марудзячы, танкісты перайшлі на супрацьлеглы бок ракі і забяспечылі ахову моста да таго часу, пакуль не падышлі асноўныя сілы. За гэту аперацыю ўсе члены экіпажа танка былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Т. Аляксандрава.

Ад першага да апошняга

З успамінаў М. С. Міхеева, былога камандзіра батарэі 80-га артылерыйскага палка 76-й стралковай дывізіі

Міхаіл Сяргеевіч Міхееў нарадзіўся ў 1921 г. у в. Язёры Чэрыкаўскага раёна. З сялян. У 1936 г. уступіў у камсамол. З 1938 г. па красавік 1941 г. працаваў шахцёрам у Данбасе. З красавіка 1941 г. у Чырвонай Арміі. З чэрвеня 1941 г. па май 1945 г. на франтах Вялікай Айчыннай вайны: удзельнічаў у баях на Украіне, абарончых і наступальных баях на Волхаўскім і Ленінградскім франтах, штурмаваў Берлін. Ад радавога байца, камандзіра гарматы, камандзіра ўзвода вырас да камандзіра батарэі. У пасляваенныя гады служыў у Савецкай Арміі камандзірам батарэі аператыўна-стартавых ракет. З 1947 г. па 1987 г. працаваў у народнай гаспадарцы. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай

вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі, многімі медалямі.

М. С. Міхееў.

Першыя дні Вялікай Айчыннай вайны засталі мяне на Заходняй граніцы, на Украіне, дзе служыў радавым у артылерыйскай часці. Пазнаў горыч адступлення. Быў паранены і эвакуіраваны ў тыл. Пасля шпіталю ў снежні 1941 г. быў накіраваны на абарону Ленінграда. Удзельнічаў у цяжкіх абарончых і наступальных баях на Волхаўскім і Ленінградскім франтах, зняцці блакады Ленінграда і вызваленні Ленінградскай вобласці. Успамінаю 12 студзеня 1943 г., калі атрымалі загад на падрыхтоўку да прарыву блакады. Было гэта ў 9 гадзін 30 мінут раніцы. Батарэя 132-міліметровых гаўбіц, якой я камандаваў, сваім агнём пачала душыць і разбураць доты, дзоты, наглядальныя пункты, зямлянкі, хады зносін. Мы вялі агонь з адкрытых пазіцый.

Камандзіры батарэй і ўзводаў пастаянна знаходзіліся ў баявых парадках наступаючых, праяўлялі ініцыятыву, мужнасць і ўменне. Трапны агонь артылерыі змёў контратакуючых фашыстаў. Пад яго прыкрыццём байцы ўпэўнена ішлі ўперад. Войскі поўнасцю вызвалілі Ленінградскую вобласць, уступілі на тэрыторыю Эстоніі.

Прыйшлося фарсіраваць р. Нарву. Ноччу на плытах, лодках, проста на падручных сродках перапраўляліся воіны. Разам з пяхотай і ўзводам упраўлення батарэі я таксама пераправіўся на варожы бераг. Сувязісты наладзілі сувязь. Агнём батарэі знішчалі жывую сілу і тэхніку гітлераўцаў. Аднак фашысты не змірыліся са стратай пазіцый. Па некалькі разоў кідаліся ў контратаку, каб скінуць нас у рэчку. Мы трымаліся. У няроўных схватках пасля трохдзённага бою гітлераўцам удалося прасачыцца ў нашу абарону. Стварылася цяжкае становішча. Я прыняў рашэнне: выклікаць агонь батарэі на сябе. Сотні фашысцкіх салдат і афіцэраў паляглі ад трапных выстралаў батарэі. Атакі ворага захліпнуліся. Плацдарм байцы ўтрымалі. А неўзабаве войскі перайшлі ў наступленне.

Але былі страты і сярод нас. Як памяць аб вайне, застаўся ў грудзях невялічкі асколак варожага снарада. За гэты бой я быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

Зноў шпіталь. Пасля лячэння мяне адкамандзіравалі на 1-ы Беларускі фронт. Прызначылі камандзірам 6-й батарэі 2-га дывізіёна 80-га артылерыйскага палка 76-й стралковай дывізіі.

Пачаліся баі на тэрыторыі Германіі. 20 красавіка 1945 г. нашы часці авалодалі г. Бернау, важным стратэгічным пунктам на шляху да Берліна. Вельмі добра памятаю, што адсюль воіны нашай батарэі выпусцілі першы артылерыйскі снарад па Берліну. Гэта быў незабыўны дзень. А баі за Бернау былі вельмі цяжкімі. Горад прыкрываў Берлін, да якога было, як кажуць, рукой падаць. Агнявыя сродкі праламілі крапасную сцяну, якой ён быў апяразаны. У пралом пайшлі танкі, самаходкі з аўтаматчыкамі на брані. Увесь час артылерысты сваім агнём расчышчалі пяхоце шлях. Праціўнік не вытрымаў націску і пачаў адыходзіць. Гарнізон крэпасці выкінуў белы сцяг.

А да рэйхстага, фашысцкага логава, заставалася больш дзесяці кіламетраў. Каля чатырох гадоў чакалі мы гэтага моманту. Прыйшоў я сюды дарогай вайны ад Ленінграда. І вось час канчатковай расплаты з фашыстамі наступіў. Цяжка перадаць словамі тую радасць, якая ахапіла ўсіх нас. Гэта быў апошні варожы рубеж. І вось камандзір палка аддае загад:

— Па Берліну, агонь!

Напэўна, мы ніколі так імкліва і старанна не дзейнічалі. Мы выкацілі гарматы і прамой наводкай знішчалі фашысцкія танкі, перайшоўшы ў контратаку. Воіны 6-й батарэі, якой я камандаваў, у гэтым баі падавілі сем агнявых кропак ворага, падтрымлівалі і суправаджалі пяхоту, білі ворага ўсімі відамі зброі. За мужнасць і адвагу многія нашы батарэйцы былі ўзнагароджаны. Мне ўручылі ордэн Чырвонай Зоркі.

На правым беразе Эльбы правёў свой апошні бой, спіхнулі фашыстаў у раку. На левым беразе ракі ўжо стаялі амерыканскія часці.

Змоўк гром гармат. Ніхто з нас яшчэ не мог паверыць у тое, што скончылася вайна. Шчасцем і радасцю свяціліся твары маіх сяброў-артылерыстаў: выстаялі, дайшлі, перамаглі. І, нарэшце, як і многія мае таварышы, я зрабіў надпіс на сцяне рэйхстага. І хоць у жыцці я ніколі не пісаў вершы, але ў гэты ўсхваляваны час прыйшлі ў галаву радкі: «Предупрежденье всем, кого в бою повергла наша сила, от Ленинграда мы пришли сюда за тем, чтобы война к нам больше не ходила».

Атакі з неба

З успамінаў І. А. Ткачова, былога лётчыка-штурмавіка

Вайсковую форму я надзеў яшчэ ў 1940 г. у Ленінградскай авіяшколе, а калі пачалася вайна, знаходзіўся ў Харкаўскай школе, дзе выконваў абавязкі ваентэхніка. Адсюль і пачаўся адлік вогненных гадоў. Пакараным шляхам вучобы пераваліфікаваўся ў Варонежы на лётчыка самалёта У-2. Але вайна патрабавала больш дасканалай тэхнікі і новых кадраў. І я перавучваюся на лётчыка самалёта Іл-2. Наша асноўная задача была бамбіць. Але часта так складвалася абстаноўка, што прыходзілася ўступаць і ў бой са знішчальнікамі ворага.

Аднойчы, над возерам Балатон, насустрач нашым самалётам нечакана з-за воблакаў выскачыла эскадрылля нямецкіх «месераў». Сілы былі няроўныя, і бой быў жорсткі. У гэтым баі былі збіты 3 варожыя самалёты. Не менш жорсткім быў паветраны бой, калі нашы лётчыкі атакавалі калону варожых танкаў, і зноў мы выйшлі пераможцамі. У гэтым баі мне не пашанцавала — самалёт быў падбіты, а сам паранены. Але духам я не паў. Павярнуў машыну ў бок да сваіх. І раптам над венгерскай в. Кішкунлацхаза заглух матор. Давялося выскачыць з парашутам.

Успамінаецца і такі баявы эпізод. Летам 1944 г. у Румыніі нашы лётчыкі, выкарыстоўваючы воблакі, атакавалі адступаючага ворага. Шмат было знішчана яго тэхнікі і жывой сілы. У гэтым баі мне ўдалося падпаліць штабную машыну, за што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Восенню 1944 г. мой самалёт быў зноў падбіты. Машына ўпала ў балота. Я — паранены, стралок загінуў. За палётам падбітага штурмавіка назіралі жыхары. З бліжэйшага пасёлка прыбеглі венгерскія патрыёты і аказалі мне першую дапамогу, а затым пасля 6-дзённага лячэння пераправілі на савецкі аэрадром.

Вайна ёсць вайна, яна патрабавала не толькі мужнасці, а і кемлівасці.

На ўсё жыццё запомніўся мне такі выпадак. Пасля вялікіх дажджоў Дунай выйшаў з берагоў і вада затапіла наш аэрадром.

Самалёты нагадвалі буслоў на балоце, здавалася, што баявая тэхніка на працяглы час стала на прыкол. Але хіба можна сядзець склаўшы рукі, калі лютуе вораг, калі гінуць баявыя сябры. Мы знайшлі невялічкую паласу з цвёрдым грунтам і наперакор стыхіі пры дапамозе падручных сродкаў адбуксіравалі на яе самалёты, якія праз два дні бамбілі варожыя пазіцыі.

У адным з баёў мне давялося запаліць нямецкі транспартны самалёт, але перамога дасталася вялікай цаной. Нямецкія знішчальнікі падбілі наш «Іл». Самалёт страціў кіруемасць. Я атрымаў лёгкае раненне. Два дробныя асколкі трапілі ў вока. Давялося зрабіць вымушаную пасадку на нейтральнай зямлі.

Часта пры розным надвор'і прыходзілася ляцець у разведку. І калі не ўдавалася «мірным шляхам» выявіць баявыя пазіцыі ворага, даводзілася выклікаць агонь на сябе, а затым фатаграфаваць мясцовасць з агнявымі кропкамі і вялікай колькасцю фашысцкіх войск. За смелыя вылазкі, за каштоўныя звесткі я быў удастоены ордэнаў Славы II і III ступеняў, а потым і ордэна Айчыннай вайны II ступені.

У гады вайны пілатуемы мной самалёт паяўляўся ў небе Украіны, Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Венгрыі, Германіі.

Пасля вайны я доўгі час настаўнічаў, вёў ваенна-патрыятычную работу, напісаў гісторыю роднай в. Наркі, дапамагаў краязнаўчаму музею ў зборы каштоўных матэрыялаў і звестак.

Камандзір батарэі з в. Лобча

Напэўна, не знойдзецца такога ветэрана вайны, які б не ўспомніў свой франтавы шлях.

Ёсць што ўспомніць і нашаму земляку, жыхару в. Лобча Кандрату Емяльянавічу Захараву, ветэрану Вялікай Айчыннай вайны. Ён, як і многія слаўныя сыны Айчыны, зведаў ліхалецце тых год, мужна і бясстрашна набліжаў радасны і светлы дзень Перамогі.

Разгрузіўся полк 26 чэрвеня ў г. Себіж Калінінскай вобласці. Да вечара ён ужо разгарнуўся па фронту на зыходнай пазіцыі. У 15—20 км ад артылерыстаў грымела кананада, ішлі кровапралітныя баі. Нашы байцы стрымлівалі пераўзыходзячыя сілы ворага. Раніцай 27 чэрвеня камандзір узвода кіравання батарэі размясціўся на вызначаным яшчэ з вечара наглядальным пункце, адкуль павінен быў весці карэкціроўку агню батарэі. У бінокль аглядваў мясцовасць, дзе-нідзе паросшую хмызняком. Раптам ён заўважыў групы ўзброеных людзей. «Свае»,— падумаў лейтэнант. Але, прыгледзеўшыся лепш, зразумеў, што гэта фашысты. «Вось яны якія. Ідуць нахабна, быццам у сябе дома»,— адзначыў К. Е. Захараў. Лейтэнант упершыню ўбачыў ворага, які ўжо некалькі дзён таптаў зямлю Айчыны. Кандрат Емяльянавіч падняў трубку тэлефона, паведаміў у штаб палка і батарэі аб ворагу. Праўда, там ужо ведалі, што ў раёне батарэі К. Е. Захарава прарваліся гітлераўскія аўтаматчыкі. Камандаванне палка адразу загадала К. Е. Захараву, каб яго ўзвод прыступіў да карэкціроўкі агню. Ударылі залпы гармат. Снарады клаліся блізка. Праз некаторы час яны ўжо траплялі ў цэль.

Потым наляцела фашысцкая авіяцыя. Доўга бамбіла пазіцыю батарэі

палка. Некалькі бомб упала непадалёку ад назіральнага пункта Захарава. Шанцавала, асколкі са свістам праляталі, не закрануўшы артылерыстаў яго ўзвода. Нягледзячы на бамбёжку, моцны агонь стралковай зброі ворага, батарэя працягвала свой першы няроўны бой. На кароткі час затрымалі фашыстаў. Ад батарэі засталося толькі дзве гарматы, многа загінула байцоў, шмат было забіта коней, на якіх цягалі гарматы, боекамплекты. Загінуў у гэтым баі і камандзір батарэі старшы лейтэнант Косаў. Камандзір палка загадаў Захараву прыняць пад каманду батарэю і з застаўшыміся сіламі ісці пад Ржэў. Многія байцы і камандзіры батарэі, у тым ліку і К. Е. Захараў, за гэты бой былі ўзнагароджаны медалямі «За адвагу».

У раёне Ржэва батарэя ўлілася ў рэгулярнае войска. Потым была расфарміравана. На гэты раз Кандрата Емяльянавіча назначылі камандзірам узвода кіравання батарэі, 664-га гаўбічнага палка, які з'яўляўся рэзервам камандуючага фронту. Ён удзельнічаў у баях пры абароне Масквы. У студзені 1942 г. быў паранены ў нагу. Доўгі час лячыўся ў шпіталях. Цяжка ўспрыняў К. Е. Захараў рашэнне камісіі ўрачоў: не годны для страявой службы. Накіравалі выкладчыкам у Ленінградскае артылерыйскае вучылішча, якое ў той час знаходзілася ў Кастраме. Кандрат Емяльянавіч не шкадаваў сіл, энергіі, каб перадаць свае веды, баявы вопыт курсантам. У той жа час К. Е. Захараў стаў дабівацца, каб яго адправілі ў дзеючую армію. Напісаў некалькі рапартаў. Яго імкненне разумеў і падзяляў начальнік вучылішча. Але ж былі і такія, што здзіўляліся, маўляў, што чалавеку, які мае сур'ёзнае раненне, трэба дзякаваць Богу, што застаўся жывым. Перамогу ж можна дачакацца і ў тыле. Упартасць Захарава не была дарэмнай. Ён дабіўся свайго: атрымаў накіраванне ў дзеючую армію. Трапіў на першы Украінскі фронт, у 968-ы артылерыйскі полк 395-й стралковай дывізіі. Камандаваў батарэяй. І тут зарэкамендаваў сябе адважным і мужным камандзірам. У гэтым вайсковым злучэнні К. Е. Захараў і сустрэў Перамогу, якую сам жа і набліжаў. Ратны шлях К. Е. Захарава ў гады вайны адзначаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, Чырвонай Зоркі і многімі медалямі.

С. Антонаў.

Рызыкуючы жыццём

Было гэта ў суровы 1941 г. У адным з жорсткіх баёў часці «жалезнай» дывізіі адстойвалі свае пазіцыі. Але вельмі няроўныя былі сілы. Парадзеўшыя, стомленыя ў баях падраздзяленні трапілі ў варожае кальцо. У крытычны момант вырашана было выратаваць святыню дывізіі — ганаровы рэвалюцыйны Чырвоны Сцяг УЦВК. Зрабіць гэта даручылі траім, сярод іх быў і старшы палітрук Аляксандр Васілевіч Барбашаў. Абадраныя, галодныя прабіраліся яны праз фашысцкія кардоны. На ўскраіне в. Анюціна, што на Чэрыкаўшчыне, давялося ўступіць у бой. Ён працягваўся да таго часу, пакуль

Д. М. Цяпін.

былі патроны. Старшы палітрук Барбашаў падняўся на ўвесь рост з узнятым над галавой аўтаматам, але гарачы свінец апаліў яму сэрца.

І мёртвых расстрэльвалі фашысты, нібы баяліся, што тут, на сваёй зямлі, яны могуць уваскрэснуць. Усю ноч у в. Анюціна працягваліся п'яныя оргіі. «Адальюцца вам нашы слёзы. Прыйдзе і наша свята»,— шаптаў тады былы салдат рускай арміі, удзельнік баёў пад Порт-Артурам і Мукдэнам, кавалер Георгіеўскіх крыжа і медалі Дзмітрый Мікалаевіч Цяпін, які бачыў схватку траіх нашых салдат з падраздзяленнем фашыстаў. Але не мог ён, стары, бяззбройны, дапамагчы байцам.

«Даруйце, мілыя... Апошнюю паслугу саслужу вам...» — І ноччу, узяўшы з сабой верных людзей, ён перанёс загінуўшых на полі бою на могілкі. Не маглі тады даведацца аб прозвішчах склаўшых галовы. Усе яны без дакументаў аказаліся. Толькі ў аднаго, што і мёртвы не выпускаў з рук зброі, знайшлі... баявы сцяг.

І мёртвымі засталіся салдаты на пасту. Аб гэтым не было запісана ў паставой ведамасці, аб гэтым значылася ў сэрцы старога салдата. Тут была нябачная вахта нязменных вартавых. Баявая служба цягнулася 28 месяцаў...

Дачакаўся свята Дзмітрый Мікалаевіч Цяпін. Толькі паявіліся ў сяле першыя воінскія падраздзяленні Чырвонай Арміі, расправіў вусы і бараду стары, быццам дзесятак год скінуў, памаладзеў...

— Мне самага старшага начальніка,— патрабаваў ён ад афіцэра.

— Вам дзеля чаго, дзядуля? — пыталі ў яго.

А хутка Дзмітрый Мікалаевіч дакладваў:

— ...Я хачу перадаць баявы сцяг.

І святыню даставілі па прызначэнню. Зноў тысячы кіламетраў прайшлі пад гэтым сцягам салдаты Самара-Ульянаўскай «жалезнай» дывізіі. Вызвалялі Беларусь і Украіну... За Бярдзічаў атрымалі ганаровую назву Бярдзічаўскай...

Помнік Д. М. Цяпіну.

За выратаванне баявога сцяга адной са старэйшых дывізій Чырвонай Арміі грамадзяніна-патрыёта Дзмітрыя Мікалаевіча Цяпіна ўзнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга. Ён стаў ганаровым салдатам праслаўленай «жалезнай». Яму прысвоілі званне старшыны. У казарме першай роты першага батальёна стаіць яго ложак. Штогод ў вялікія традыцыйныя святы прыязджаў з Анюціна ў родны полк старшына Дзмітрый Мікалаевіч Цяпін. І тады ўжо на правым флангу роты стаяў той, якому тут такі гонар і павага. І замест прывычнага: «Ганаровы салдат роты Цяпін знаходзіцца ў доўгатэрміновым

адпачынку» чулася яшчэ бадзёрае «Я».

Ён разам з усімі прысутнічаў на ўрачыстых сходах, разам з ротай хадзіў на заняткі, не адзін раз выступаў перад тымі, хто ў праслаўленым палку яшчэ ўсяго некалькі месяцаў.

І, нягледзячы на свае 83 гады, старшына яшчэ бойка расказваў аб сваіх паходах і баях, аб руска-японскай вайне і першай сусветнай, аб грамадзянскай і Вялікай Айчыннай, аб тых людзях, якія выкавалі перамогу, забяспечылі жыццё маладому пакаленню. Успамінаў ён і Аляксандра Васілевіча Барбашава, старшага палітрука, які перадаў яму эстафету з баявым сцягам.

Н. Мацвееў.

У буднях вайны

З успамінаў В. Ф. Малахава, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

У 1939 г. я вырашыў звязаць свой лёс з ваеннай службай. Паступіў у Адэскае артылерыйскае вучылішча. Скончыў яго перад самым пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Здарылася так, што наш артполк фарміраваўся ў г. Магілёве і каля 80 працэнтаў асабістага складу былі беларусы. Сярод іх шмат чэрыкаўлян. Мы злучыліся з 96-й стралковай дывізіяй, якой камандаваў падпалкоўнік Шэпетаў. З вялікімі цяжкасцямі і стратамі выйшлі з акружэння. Сувязь з камандаваннем была страчана, а тэхніка аказалася без паліва. Аднак мы прабіліся да складаў гаруча-змазачных матэрыялаў. Гэта дало магчымасць аказаць гітлераўцам рашучае супраціўленне. Дзесяткі нашых салдат і афіцэраў паказвалі ўзоры мужнасці і гераізму. У хуткім часе дывізіі было прысвоена званне Гвардзейскай, а камандзір атрымаў званні Героя Савецкага Саюза і генерал-маёра.

В. Ф. Малахаў.

Мне ўспамінаецца такі выпадак. Будучы камандзірам узвода разведчыкаў, я атрымаў заданне абследаваць некалькі вёсак. Мы адправіліся на грузавіку. З усімі перасцярогамі заходзілі ў першыя тры вёскі. Немцаў там не аказалася. У чацвёртую ўехалі смела, упэўненыя, што і там ворагаў не будзе. І горка памыліліся. Вёска была літаральна нашпігавана варожай пяхотай і баявой тэхнікай. Выратавала нас кемлівасць і храбрасць шафёра. Ён не разгубіўся і як ні ў чым не бывала працягваў спакойна ехаць. Немцы ўступалі нам дарогу і нават віталі. Магчыма, яны падумалі, што мы здаёмся ў палон. А магчыма прынялі за сваю, пераапранутую разведку. Адным словам, мы спакойна мінулі вёску і хутка дабраліся да сваіх.

Самыя жорсткія баі разгарнуліся ў 1942 г., калі фашысты, атрымаўшы адпор пад Масквой, рушылі на поўдзень. Памятаецца, як у адным з баёў штаб нашага палка трапіў у акружэнне. Сцяг палка аказаўся ў палаючай машыне. Выключную мужнасць прадэманстраваў лейтэнант Авечкін, які выратаваў сцяг.

А ў хуткім часе загінуў намеснік камандзіра палка маёр Каберыдзе. Нашы страты былі даволі значныя. Многа таварышаў пахавалі на зямлі Харкаўшчыны. Нямецкая прапаган-

да трубіла, што пасля паражэння пад Харкавам рускім войскам ужо не апамятацца. Час паказаў хлуслівасць гэтай заявы.

У адным з баёў я атрымаў раненне і трапіў у шпіталь у г. Тбілісі. 7 верасня 1942 г. вярнуўся ў свой полк. У гэты час баі ішлі на Паўночным Каўказе. Трэба было бачыць, з якой мужнасцю байцы змагаліся за кожную пядзю сваёй зямлі. Памятаецца, як 62-я марская брыгада знішчыла каля 100 нямецкіх танкаў на подступах да горада Арджанікідзе (цяпер Уладзікаўказ). Былі выпадкі, калі воіны ўскоквалі на прайшоўшы цераз акоп танк і падпальвалі яго на хаду.

Пасля Сталінграда наступіў пералом у вайне. Але ў адступаўшых немцаў яшчэ больш прыбавілася жорсткасці. З гэтага перыяду мне запомніўся выпадак, які адбыўся каля невялікага данбаскага г. Ямы. Наша разведка трапіла ў глыбокі тыл ворага. Наступіў дзень. Хавацца было недзе. Запрасілі штаб палка, затым дывізіі: што рабіць? Адказ быў адзін — чакаць. Але разведчыкі не хацелі бяздзейнічаць. Яны пачалі паведамляць дакладныя ардынаты размяшчэння нямецкіх войск і аб'ектаў. Хутка запрацавала наша артылерыя. Немцы ніяк не маглі зразумець, адкуль такая дакладнасць. А разведчыкі працягвалі карэкціраваць агонь, пакуль немцы не былі поўнасцю знішчаны.

У кастрычніку 1944 г. нас перакінулі ў Прыбалтыку для знішчэння варожай групоўкі ў раёне Рыгі — Ліепаі. Я камандаваў батарэяй. Непадалёку ад Ліепаі батарэя знішчыла шмат танкаў праціўніка. За гэты бой многія воіны атрымалі ўзнагароды.

Пры фарсіраванні Одэра наша падраздзяленне аказалася адным з першых на варожым беразе. Неабходна было тэрмінова наладзіць тэлефонную сувязь з камандаваннем. Тэлефаніст яфрэйтар Клімкін Ягор Пятровіч тры разы пад шквальным агнём пераплываў раку на бервяне.

Аказалася, што да вайны ён быў плытагонам і былая прафесія дапамагла яму наладзіць сувязь.

Я ўдзельнічаў у шматлікіх баях. Апошні — штурм Берліна. Мы ганарыліся тым, што закончылі вайну, дабілі фашыстаў у іх логаве.

Ад Тулы да Брно

З успамінаў Т. Саўкіна, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

Вайна застала мяне на Чэрыкаўшчыне. У той час я працаваў старшынёй Язёрскага сельсавета. Па абавязку службы з першых гадзін вайны прыйшлося займацца мабілізацыяй людзей. Але калі гаварыць праўду, то не верылася, што гітлераўцы далёка пранікнуць на нашу тэрыторыю. Кожны дзень мы чакалі весткі, што вораг адкінуты ад граніцы. Але весткі прыходзілі несуцяшальныя: захоплены Брэст, Гродна, Пінск. Кожны з нас імкнуўся на фронт, бо лічыў, што іменна без яго і атрымліваецца так дрэнна.

На 29 чэрвеня 1941 г. усё мужчынскае насельніцтва сельсавета, годнае для службы ў арміі, было мабілізавана. А на другі дзень з павесткай у кішэні я быў ужо ў ваенкамаце. Атрымаў накіраванне ў запасны полк, які дыслацыраваўся ў в. Лушчэвінка Крычаўскага раёна. Ужо ў палку даведаўся, што немцы падыходзяць да Чэрыкава. Але аб гэтым можна было і здагадацца — вечарамі было добра чуваць кананаду, і заходні край неба палыхаў зарывам. Горка і балюча было глядзець на ўсё

гэта. Там жа засталася родная в. Халоблін, бацькі. Усе рваліся ў бой, але ваенныя дарогі вельмі непрадбачаныя — праз некалькі дзён я быў ужо ў г. Людзінава Смаленскай вобласці. Там атрымаў накіраванне ў 97-й запасны полк 3-й арміі і прызначэнне на пасаду палітрука роты.

Баявое хрышчэнне атрымаў на р. Ака Тульскай вобласці. Немцы рваліся да Масквы. Не звяртаючы ўвагі на страты ў жывой сіле і тэхніцы, гітлераўцы амаль круглыя суткі штурмавалі нашы пазіцыі. Ведалі, што Тула — гэта не толькі кузня зброі, але і прамая дарога на Маскву.

Але мы выстаялі. І не толькі выстаялі, але і адкінулі ворага за Аку і нават захапілі плацдарм на другім яе беразе. І вось тут, каля в. Навасель, я быў паранены.

У строй зноў уступіў у ліпені 1943 г. Да таго часу мне было прысвоена воінскае званне капітана. Я ўжо лічыўся бывалым афіцэрам-франтавіком. Трапіў на 2-гі Украінскі фронт, дзе стаў камандаваць стралковай ротай. З баямі прайшлі Румынію, потым уступілі ў Венгрыю. Нялёгкі быў гэты шлях, вехамі якога з'яўляліся вызваленыя гарады і брацкія магілы таварышаў.

На ўсё жыццё засталася ў памяці вышыня 237. Гэтая вышыня была найвышэйшай кропкай паблізу г. Балашадзермата і таму — стратэгічна важнай. Але ўсе спробы авалодаць вышынёй заканчваліся беспаспяхова: на вышыні быў дот з кулямётам. Ноччу мяне выклікалі на КП палка і паставілі задачу: да раніцы дот павінен быць захоплен. Добра абмеркавалі мы гэта заданне і прыйшлі да вываду: аперацыю правесці малымі сіламі, без лішняга шуму.

Пад раніцу з групай аўтаматчыкаў я наблізіўся да вышыні. Некалькі гадзін паўзлі па гары, пакуль дасягнулі вяршыні. Падхапіліся і кінуліся ў атаку прама перад дотам. Схватка была кароткая, але жорсткая. Вышыню захапілі. У гэтым баі я быў кантужаны выбухам гранаты. У шпіталі даведаўся, што за той бой я ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Так ужо давялося, што я, прайшоўшы з баямі амаль усю Еўропу, пасля шпіталя трапіў у Чэхаславакію. Але паваяваў нядоўга,— зноў атрымаў цяжкае раненне. У адным з начных баёў у час наступлення быў прашыт наскрозь кулямётнай чаргой. Адна куля трапіла ў пазванок. Санітары мяне знайшлі і даставілі ў шпіталь г. Брно. Тут я і сустрэў Перамогу.

Ганаровая місія

З успамінаў І. Ф. Юрчанкі, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

На ваенную службу быў прызваны ў пачатку кастрычніка 1940 г. Накіравалі мяне ў 29-ю авіябазу Ваенна-Паветраных Сіл Чарнаморскага флота. А калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, я ўжо знаходзіўся пад г. Нікалаевам на аэрадроме, што каля станцыі Вадапой. У пачатку ліпеня 1941 г. залічылі ў знішчальны батальён марской пяхоты. Баявое хрышчэнне атрымаў у баі супраць нямецкіх танкаў, што прарваліся ў раёне станцыі. Бутэлькамі з гаручай сумессю падпаліў адзін.

Пад націскам сіл праціўніка наш батальён адышоў ад г. Херсона, пераправіўся на левы бераг Дняпра і падышоў да пабярэжжа Чорнага мора каля в. Бехцеры. Адсюль цеплаходам перабраліся на востраў Цетдра (Цетдраўская каса), што ў 40 км

ад Адэсы. На востраве пабудавалі аэрадромную пляцоўку для нашых знішчальнікаў, якія вялі паветраныя баі над Адэсай. Тут жа, на востраве, удзельнічаў у разгроме двух гітлераўскіх дэсантаў (марскога і паветранага), спрабаваўшых захапіць востраў, каб блакіраваць абаронцаў Адэсы з мора. У пачатку лістапада 1941 г. воінскія падраздзяленні, што знаходзіліся на востраве, былі на плаўсродках перакінуты на абарону Севастопаля. Я трапіў у 20-ю авіябазу, якая дыслацыравалася на аэрадроме Херсонскага маяка пад Севастопалем.

10 снежня 1941 г. я быў паранены ў правую нагу. На крэйсеры «Камінтэрн» у ліку іншых параненых абаронцаў Севастопаля мяне адправілі ў шпіталь. 7 жніўня 1942 г., ужо знаходзячыся ў складзе 55-га асобнага батальёна марской пяхоты пад Новарасійскам каля Цэмескай бухты, быў цяжка кантужаны ў галаву. Эвакуіравалі ў Геленджык, а адтуль у ваенна-марскі шпіталь. Пасля лячэння зноў 29-я авіябаза. У пачатку верасня 1944 г. добраахвотна стаў мараком аднаго з батальёнаў Чарнаморскага флота, у складзе якога высадзіўся дэсантам паміж партамі Бургас і Варна, удзельнічаў у вызваленні Балгарыі. Быў камсоргам роты.

Чэрыкаўскі падпольны РК КП(б)Б на чале з Г. А. Храмовічам яшчэ за два месяцы да вызвалення раёна стварыў аддзел народнай асветы. Узначаліў яго адважны партызан-падрыўнік, настаўнік па прафесіі, А. С. Буцанец. Перад вайной Андрэй Сямёнавіч скончыў тры курсы Магілёўскага педінстытута, працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры. Ён устанаўлівае сувязі з былымі настаўнікамі — сувязнымі атрада Іванам Афанасьевічам Марозавым, Софіяй Галакціёнаўнай Лукашэнка, Антанінай Радзівонаўнай Зелянковай, якія добра ведалі людзей, што да вайны былі выкладчыкамі ў школах. З іх дапамогай Андрэй Сямёнавіч правёў вялікую работу па аднаўленню сістэмы народнай асветы. З 65 школ раёна к 1943 г. захаваліся толькі Халмянская сямігодка і сем пачатковых школ. Астатнія былі спалены акупантамі. Складаліся спісы школьнікаў, збіраліся падручнікі і школьныя прылады. Яшчэ да прыходу ў Чэрыкаў Чырвонай Арміі амаль для ўсіх школ раёна былі падабраны вопытныя спецыялісты. Так, дырэктарам Верамейскай сярэдняй школы была назначана настаўніца Н. Ф. Максіменка, Губеншчанскай — Е. М. Карніенка, Ушакоўскай сямігодкі — С. Г. Лукашэнка. На другі дзень пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — 2.10.1943 г. адбылася нарада раённага партыйна-савецкага актыву. Загадчык райана А. С. Буцанец звярнуўся да дэлегатаў, старшынь сельскіх Саветаў, старшынь калгасаў з просьбай дапамагчы падабраць памяшканні для школ, абсталяванне і інвентар. Прысутныя горача адгукнуліся на гэты прызыў, дзякуючы чаму ўжо 11 кастрычніка пачаліся заняткі ва ўсіх школах. Праўда, большасць з іх апынулася ў складаных умовах — памяшканні былі непрыстасаванымі, не хапала падручнікаў, сшыткаў, пісьмовых прылад. 10 кастрычніка 1943 г. тыражом у 500 экз. выйшаў першы пасля вызвалення нумар газеты «Сацыялістычная перамога».

Пэўныя намаганні рабіліся падпольным райкамам партыі і ў другіх напрамках. Успамінаючы падзеі тых



Пралетарыі ўсіх краёў, яднайцеся!

Сцяжок камандзіру акупантаў.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ПЕРАМОГА

Орган Чэрыкаўскага РК КП(б)Б і Райсавета Дэпутатаў Працоўных.

№ 2 | субота | 16 кастрычніка 1943 г. | № 2

„УСЕ НАШЫ СІЛЫ—НА ЗАХАВАННЕ НАШАЙ ГАРАЧАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, ЧЫРВОНАГА ФЛОТА."

Ад Совецкага Інформбюро.

(З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 14 КАСТРЫЧНІКА).

НА ПРАЦЯГУ 14 КАСТРЫЧНІКА НАШЫ ВОЙСКІ, ЗЛАМАЎШЫ СУПРАЦЬЎЛЕННЕ ПРАЦЯЎНІКА, ПАСЛЯ ЖОРСТКІХ БАЁЎ ЗАНЯЛІ Г. ЗАПАРОЖЖА.

ЗАРАЗ ЦІЎЦЬ БАІ ЗА Г. МЕЛІТОПАЛЬ. НАШЫ ВОЙСКІ ПЕРАРЭЗАЛІ Ў 2-х МЯСТАХ Ж. Д. КРЫМ-МЕЛІТОПАЛЬ. ЦІЎЦЬ ВУЛІЧНЫЯ БАІ ЗА ГОРАД ГОМЕЛЬ.

Зноў на вызваленай зямлі

Першы сход старшынь сельсоветаў і калгасаў раёна

Адзін з першых нумароў раённай газеты, які выйшаў пасля вызвалення.

гадоў, былы першы сакратар Магілёўскага абкама КП(б)Б І. Н. Макараў пісаў:

«За два месяцы да прыходу Чырвонай Арміі пачаў дзейнічаць і райздраўаддзел на чале з начальнікам медыка-санітарнай службы Чэрыкаўскай ваенна-аператыўнай групы І. П. Шаталавым. Іван Пятровіч, былы палкавы ўрач у каўкорпусе генерала П. А. Бялова, добра разумеў, што будучыя райбальніцу, паліклініку, сельсавецкія здраўпункты ліхім кавалерыйскім наскокам ураз не стварыць. Па крупінках збіраў ён разам са сваімі супрацоўнікамі медыцынскае абсталяванне, шукаў дасведчаных людзей, арганізоўваў збор і нарыхтоўку лекавых траў. З падборам кадраў яму было куды цяжэй, чым А. С. Буцанцу, але ўжо на другі дзень пасля вызвалення Чэрыкава нашымі войскамі ўрачыста адкрыліся раённыя ўстановы па ахове здароўя. Здраўпункты ж на месцах сталі пасапраўднаму працаваць праз два-тры месяцы. Вялікую дапамогу аказаў супрацоўнікам І. П. Шаталава шпіталь 50-й арміі на чале з маёрам медыцынскай службы Маўчанавым.

...Ініцыятыўных, талковых работнікаў падабраў падпольны райкам партыі і на іншыя адказныя пасады. Начальнікам канторы сувязі назначылі палітрука гасчасці ваенна-аператыўнай групы П. Д. Тоўкача (да 1941 г. працаваў сувязістам). Даваенны бухгалтар, а затым разведчык Н. П. Галенка ўзначаліў раённую кантору Дзяржбанка. Перадавы ў мірны час трактарыст, былы камандзір партызанскай групы І. Н. Калодзяжны стаў дырэктарам Чэрыкаўскай МТС». (Макараў І. Н. Жывая Зямля. Мн., 1985. С. 146.)

Адразу ж пасля вызвалення раёна аднаўляецца работа Чэрыкаўскага РК КП(б)Б. Першым сакратаром стаў Г. А. Храмовіч, былы сакратар падпольнага райкама партыі. Старшынёй райвыканкама назначылі Т. Шубіна, сакратаром райкама камсамола стаў І. І. Касцючэнка. Былі падабраны старшыні для сельскіх Саветаў і старшыні калгасаў. Узнавілі сваю работу іншыя арганізацыі і службы раёна.

13 кастрычніка 1943 г. адбыўся агульны сход старшынь сельскіх Саветаў і калгасаў. Адкрыў яго Г. А. Храмовіч. У дакладзе былі прыведзены ашаламляльныя лічбы і факты аб зверствах, якія чынілі фашысты на Чэрыкаўшчыне ў гады акупацыі. Пазней гэтыя страты падлічылі больш дакладна. Было расстраляна і закатавана 653 чалавекі, 456 чалавек вывезена ў Германію. У агні загінула шмат жыхароў з вёсак Рагаліна, Прыпёчына, Бакунавічы, многія загінулі пры размініраванні дарог, на допытах. Здзекам не было канца. Да вайны ў раёне налічвалася 6937 сялянскіх дамоў, засталося 2248, у райцэнтры з 916 толькі 84 дамы засталіся цэлымі. Вайна знішчыла 1379 калгасных і грамад-

скіх будынкаў, 4 бальніцы, 17 медпунктаў, усе прамысловыя прадпрыемствы, установы культуры. Немцы вывезлі 2068 галоў буйной рагатай жывёлы, 1871 каня, 2445 свіней, 4514 авечак, знішчылі ўраджай збожжавых на плошчы 5684 га. Страты, панесеныя раёнам, склалі 310 млн рублёў.

Натуральна, што перад працаўнікамі горада і вёсак паўстала цяжкая задача — у самы кароткі тэрмін залячыць раны, нанесеныя вайной, як мага хутчэй наладзіць мірнае стваральнае жыццё.

У прынятай на сходзе старшынь сельскіх Саветаў пастанове ўказвалася, што да 25 кастрычніка неабходна закончыць уборку і абмалот збожжавых, копку бульбы, прадугледжвалася адрамантаваць усе масты, шасэйныя дарогі. Быў вызначаны тэрмін завяршэння сяўбы азімых, стварэння кармавой базы для жывёлы, калгаснага будаўніцтва. Асаблівая ўвага была звернута на размяшчэнне ўсіх сем'яў, якія асталіся без прытулку, у прыватных дамах і ўцепленых зямлянках. Рабочую сілу і лесаматэрыялы для пабудовы вырашана было выдзеліць у першую чаргу сем'ям чырвонаармейцаў, партызан, інвалідам. Намецілі таксама арганізаваць сярод насельніцтва добраахвотны збор прадуктаў харчавання ў фонд Чырвонай Арміі.

Жанчыны, падлеткі і старыя, што складалі ў гады ліхалецця асноўную рабочую сілу, запрагліся ў плугі і бароны, уручную абмалочвалі хлеб, да крывавых мазалёў касілі. Людзі гатовы былі вынесці любы цяжар, аддаць апошні кавалак хлеба, каб толькі наблізіць канчатковы разгром ворага, пачуць доўгачаканае слова «Перамога». У пастанове Чэрыкаўскага РК КП(б)Б і райсавета працоўных ад 31 кастрычніка 1943 г. указвалася: «Накіраваць на фронт 140 коней з павозкамі». Па ініцыятыве камсамольцаў раёна арганізоўваліся «чырвоныя абозы» з падарункамі для Чырвонай Арміі.

В. А. Лукін, які прымаў удзел у вызваленні Чэрыкава і пазней быў удастоены звання ганаровага грамадзяніна гэтага горада, успамінаў: «22 лютага 1944 года перад пачаткам наступлення ў дывізію прыбыла дэлегацыя Чэрыкаўшчыны. Перад байцамі і камандзірамі нашага 1320-га стралковага палка выступіў загадчык ваенным аддзелам Чэрыкаўскага райкама партыі таварыш Касмачоў. Воінам былі ўручаны падарункі».

Па ўсіх вёсках раёна арганізоўваўся добраахвотны збор прадуктаў і грашовых сродкаў. Падпіска на другую Дзяржаўную пазыку прайшла за адны суткі. Было падпісана аблігацый на 324 758 р., прычым здадзена наяўных грошай 269 966 р. Многія жыхары аддавалі асабістыя зберажэнні на пабудову танкаў, самалётаў. Еўдакія Драчова з Халмянскага сельсавета, прапануючы свой невялікі ўклад, сказала: «У мяне ёсць 150 р. і ўсе іх аддаю на ўмацаванне магутнасці нашай Радзімы. Немцы палкамі выкалочвалі з нас хлеб і грошы. Заклікаю ўсіх калгаснікаў аддаць свае зберажэнні на ўмацаванне магутнасці нашай слаўнай Чырвонай Арміі».

На працягу восені 1943 г. і зімы 1944 г. насельніцтвам Чэрыкаўскага раёна было нарыхтавана і перададзена для Чырвонай Арміі 2540 ц збожжа, 18 226,5 ц бульбы, 1047,3 ц мяса, 893,4 ц агародніны, 2744,8 ц сена.

Радзіма высока ацаніла ўклад працаўнікоў тылу ў перамогу над ворагам. Больш 60 жыхароў раёна былі ўзнагароджаны медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

Надзвычайна цяжкімі былі першыя крокі, накіраваныя на аднаўленне разбуранай гаспадаркі. І не

толькі таму, што вялікае гора і боль за родных і блізкіх, за сваю зняважаную Радзіму параніла душы людскія — часам не было нават за што зачапіць рукі. Людзі па крупінках збіралі ўсё, што не знішчылі і не вывезлі фашысты. Прайшло ўсяго толькі чатыры месяцы пасля вызвалення раёна, а механізатары сабралі схаваныя насельніцтвам ад фашыстаў 3500 запасных частак для трактароў, 500 лемяшоў, на 90 т нафтатары. Неўзабаве на машынным двары паявілася 28 трактароў і 3 камбайны.

Увесь раён ператварыўся ў будаўнічую пляцоўку. У хуткім часе былі пушчаны 4 млыны, падрыхтаваны да работы 4 смалакурныя заводы, адчыніліся шавецкая і кравецкая майстэрні, цырульня, пошта, сталовая, лазня. Актыўна вялося аднаўленне жылога фонду. У 1944 г. было пабудавана 295 новых дамоў, падрыхтавана 600 зрубаў, адбудавана 20 кузняў. На пабудову дамоў было адпушчана 3,5 млн. рублёў. Для інвалідаў, удоў, сірот на сродкі дзяржавы пабудавана за гэты час 30 дамоў.

Напрыклад, у калгасе «Гігант» Рэчыцкага сельсавета, дзе гітлераўцы спалілі 215 жылых дамоў, ужо к 1946 г. было пабудавана 64 дамы і ўсяго тры сям'і засталося жыць у зямлянках. У Лабанаўскім сельсавеце са 143 спаленых дамоў было пабудавана 95 і падрыхтавана 32 зрубы. Хаця ў цэлым на 1 студзеня 1946 г. у Чэрыкаўскім раёне жыло ў зямлянках 996 сем'яў калгаснікаў, у тым ліку 47 сем'яў інвалідаў Айчыннай вайны, 75 сем'яў дэмабілізаваных з Чырвонай Арміі.

У гаспадарках раёна інтэнсіўна будаваліся кароўнікі, канюшні, свінарнікі, іншыя збудаванні сельскагаспадарчага прызначэння. Было створана 2 МТС. Дырэктарам адной з іх, Чэрыкаўскай, назначылі ў ліпені 1947 г. А. С. Валаткоўскага, успаміны якога змешчаны ў гэтай кнізе.

Цяжкі працэс станаўлення прайшла і другая МТС — Ударная. Яна размясцілася побач з в. Верамейкі. Ва ўспамінах былога зампаліта гэтай МТС В. Е. Церахава маюцца прозвішчы брыгадзіраў трактарных брыгад, якія ад цямна да цямна не пакідалі калгасных палеткаў, дабіваліся высокіх вынікаў: Мікалай Дударaў, Алена Шэпелева, Купчанка, Белахонаў, Шчуплянкова і іншыя.

Шырокі водгук у той час атрымаў прызыў працаўнікоў Алтая, Кубані і іншых абласцей да хутчэйшага пасляваеннага пад'ёму сельскай гаспадаркі. 17 красавіка 1947 г. у раённай газеце «Сацыялістычная перамога» публікуецца тэкст сацыялістычных абавязацельстваў працоўных раёна.

Камсамольцы і моладзь сельгасарцелі «Юны араты» Шароеўскага сельскага Савета таксама выступілі са зваротам да ўсёй моладзі Чэрыкаўскага раёна — актыўна ўдзельнічаць у пад'ёме разбуранай вайной сельскай гаспадаркі. У 1947 г. кожны малады калгаснік выпрацаваў ад 250 да 320 працадзён. Гэта дало магчымасць арцелі паспяхова правесці пасяўную, своечасова і без страт убраць ураджай, разлічыцца з дзяржавай і выдаць на працадзень па 1,2 кг збожжа і 5,5 кг бульбы.

Камсамольцы Вепрынскай сямігадовай школы ўзялі шэфства над калгаснай птушкафабрыкай. 11 лістапада 1948 г. на старонках раённай газеты звеннявая калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Вепрынскага сельсавета Еўдакія Баравікова дзялілася вопытам атрымання высокага ўраджаю:

«Другі год я працую даяркай. Падлічыла свае магчымасці і вырашыла, што ўдзень у свабодны час я магу працаваць у полі. Калі ў калгасе стваралі звяно высокага ўраджаю, я папрасіла, каб і мяне залічылі ў гэта звяно. У склад звяна ўвайшло 12 чалавек камсамольцаў



Пасяджэнне Чэрыкаўскага райвыканкама праводзіць П. П. Тарасенка, 1948 г.

і несаюзнай моладзі. Мяне назначылі кіраваць звяном. Мы далі слова, што вырасцім па 200 ц бульбы з гектара на плошчы 4,5 га. Мы святкавалі дзень нашай працоўнай перамогі. Камсамольскае слова стрымалі».

Аднаўленне гаспадарак, МТС, самаадданасць сельскіх працаўнікоў давалі магчымасць хутка павялічваць пасяўную плошчу. Ужо ў 1947 г. у параўнанні з мінулым яна ўзрасла на 3236 га. Толькі азімых у раёне пасеялі на 1104 га больш. У 1948 г. даваенную пасяўную плошчу асвоілі 43 сельгасарцелі, а 29 калгасаў нават перавысілі яе. І яшчэ штрых, які падвёў рысу пад адным з самых цяжкіх вынікаў вайны — у раёне не засталося ніводнай сям'і, якая б пражывала ў зямлянцы. К гэтаму часу былі адноўлены ўсе даваенныя прамысловыя прадпрыемствы, пушчана ў дзеянне буйнейшая новабудоўля — суднабудаўнічая верф, якой да вайны не было. Пабудаваны новы цагельны завод з гофманскай печчу. Выпуск прадукцыі мясцовай прамысловасці дасягнуў даваеннага ўзроўню. Пэўныя зрухі былі дасягнуты і ў галіне адукацыі — працавалі 3 дзесяцігодкі і 14 сямігодак. Агульная колькасць навучэнцаў склала каля 8 тыс. чалавек. Пры суднаверфі адкрылася школа ФЗА, дзе дзесяткі падлеткаў набывалі розныя прафесіі: кавалёў, цесляроў, суднабудаўнікоў і іншыя. У кожным з 14 сельсаветаў раёна адчыніліся хаты-чытальні, у раённым цэнтры 2 бібліятэкі — раённая і пры парткабінеце. У Рэчыцкім сельсавеце пачала працаваць сельская бібліятэка. У раённым цэнтры і на суднаверфі абсталяваны гукавыя кінаўстаноўкі, сельскую мясцовасць абслугоўвала гукавая кінапересоўка.

Крок за крокам працоўныя раёна пераадольвалі разруху і цяжкасці пасляваеннага перыяду. У 1967 г. прадукцыя прамысловых прадпрыемстваў значна перавысіла даваенны ўзровень, расшырыліся пасевы азімых і яравых культур, яны занялі плошчу ў 33 282 га. На ўзбраенні сельскіх механізатараў знаходзілася значная колькасць тэхнікі: 301 трактар, 97 збожжаўборачных і 44 сіласаўборачных камбайнаў, 32 бульбакапалкі, 207 грузавых аўтамабіляў. У раёне налічвалася 225 трактарыстаў-машыністаў і камбайнераў, 112 шафёраў. У сельскагаспадарчую вытворчасць укараняўся севазварот, перадавы вопыт лепшых гаспадарак.

Удзялялася ўвага ахове здароўя.

Цэнтральная плошча г. Чэрыкава.

У раёне было 3 бальніцы на 150 ложкаў, 19 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, дзіцячая і жаночая кансультацыі, санэпідэмстанцыя, паліклініка. У сістэме медыцынскага абслугоўвання працавала 24 урачы, 29 фельчараў, 67 медыцынскіх сясцёр.

Ажывілася культурнае жыццё раёна — працаваў Дом культуры, 17 сельскіх клубаў, адчыніліся раённая, дзіцячая і 12 сельскіх бібліятэк з агульным кніжным фондам, які складаў 182 тыс. экземпляраў. Працавала 51 школа, у тым ліку 10 сярэдніх, у якіх займалася 5717 навучэнцаў. Многія вучні Манастыркоўскай пачатковай школы з удзячнасцю ўспамінаюць свайго настаўніка Д. Т. Лушчаева, які аддаваў душу любімай справе. І не выпадкова яму першаму ў раёне было прысвоена ганаровае званне заслужанага настаўніка БССР. Такой жа ўзнагародай была адзначана і праца дырэктара Чэрыкаўскай сярэдняй школы В. І. Камандзенкі, дырэктара Вусценскага дзіцячага дома Т. С. Ігнаценкі.

К гэтаму часу было адчынена 16 паштовых аддзяленняў сувязі, устаноўлена 6080 радыётрансляцыйных пунктаў. Кожная сям'я выпісвала газеты і часопісы. Значнай падзеяй было адкрыццё дома адпачынку «Сож», у якім адначасова магло размясціцца 254 чалавекі. У асабістым карыстанні грамадзян мелася 18 легкавых аўтамабіляў і 500 матацыклаў.

Кожная пяцігодка мела свае адметныя рысы. Цяжкай выдалася дзевятая (1970—1975), калі раён не выканаў планавых паказчыкаў. Давалі аб сабе знаць цяжкасці ў эканоміцы, якія абвастрыліся ў краіне, шматлікія нявырашаныя праблемы. Не спыняўся адток сялян у гарады. Гэта не магло не адбіцца і на сацыяльна-эканамічным развіцці раёна. Патрэбны былі пэўныя намаганні з боку працоўных раёна, кіраўніцтва, каб зменшыць уплыў адмоўных тэндэнцый. У наступнай пяцігодцы гаспадаркі раёна атрымалі прадукцыі амаль на 100 млн рублёў, замест 63 млн у мінулай. Было здадзена ў эксплуатацыю 23 775 кв. м жылля, больш чым за дзве папярэднія пяцігодкі. У Рэчыцы, Вепрыне, Язёрах справілі навасельле тыповыя школы, уступілі ў строй 3 дзіцячыя сады на 230 месц. У цэнтры Чэрыкава ўзняўся трохпавярховы будынак раённага вузла сувязі. Дзейнічалі раённы, 3 сельскія дамы культуры, 25 клубаў. Кніжны фонд бібліятэк налічваў больш за 300 тыс. тамоў. У гуртках самадзейнасці прымала ўдзел

2000 калгаснікаў, рабочых і служачых. Ва ўсіх працоўных калектывах былі створаны спартыўныя арганізацыі, якія аб'ядноўвалі ў сваіх радах каля 3,5 тыс. аматараў фізкультуры і спорту.

У 1986 г. узнікае раённае аграпрамысловае аб'яднанне, здадзены ў эксплуатацыю свінаводчы комплекс на 54 тыс. галоў у год. У раслінаводстве створана 27, а ў жывёлагадоўлі 54 гаспадарча-разліковыя падраздзяленні, 26 малочнатаварных ферм пераведзена на паточна-цэхавую сістэму арганізацыі працы.

За перамогу ў рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 70-годдзя Кастрычніка раён атрымаў пераходны Чырвоны Сцяг ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ.

У гэты нялёгкі перыяд адраджэння зруйнаванага вайной жыцця шмат людзей праяўляла высокі працоўны энтузіязм. Не толькі чэрыкаўлянам, але і многім людзям за межамі раёна добра знаёмы прозвішчы Е. С. Белавусавай, М. А. Марчанкі, М. І. Суворава, А. І. Царкова — ткачыхі, будаўніка, шафёра і шахцёра. Самаадданай, таленавітай працай на карысць Радзімы яны заслужылі высокіх узнагарод. Кожнаму з іх прысвоена званне — Герой Сацыялістычнай Працы. Вядомым стала і прозвішча даяркі з саўгаса «Шароеўка» Таццяны Аляксееўны Сляпцовай. Яшчэ ў 1966 г. яна ўзяла высокі на той час рубеж — надаіць ад кожнай каровы па 3000 кг малака — і з поспехам дасягнула яго. Т. А. Сляпцова адна з першых у раёне ўдастоена высокай узнагароды — ордэна Леніна. Такія ўзнагароды атрымалі і свінарка саўгаса «Чэрыкаўскі» С. П. Міронава, хлебароб В. Ц. Карнюшчанка, лесаруб С. С. Курылін, шахцёр Ф. Я. Новікаў, механізатар М. А. Софін.

У ліку першых былі ўзнагароджаны: ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — цялятніца калгаса імя Ільіча Л. І. Баштала, даярка калгаса «Прагрэс» В. П. Кузьмянкова, даярка калгаса «Іскра» Т. І. Нікіценка, ордэнам «Знак Пашаны» — даярка саўгаса «Ударнік» М. Ц. Кажамякіна, даярка саўгаса «Сцяг» Л. С. Котава, даяркі калгаса «Маладая гвардыя» С. Я. Паўлюкова, Т. І. Стаблецкая, даглядчык жывёлы калгаса «Праўда» І. Д. Секушэнка.

Многія працаўнікі Чэрыкаўскага раёна не раз былі ўдзельнікамі Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі. У 1973 г. калгасніца калгаса «Другая пяцігодка» Надзея Ферапонтаўна Уласава была ўзнагароджана бронзавым медалём і грашовай прэміяй. Такія ж узнагароды атрымалі і калгаснікі гэтай гаспадаркі М. Н. Яфрэменка, Р. М. Казачэнка, Н. А. Зубарава, брыгадзір П. У. Паўлушкін, свінарка саўгаса «Лабанаўка» У. М. Сафроненка, даглядчык жывёлы калгаса «Маладая гвардыя» Е. С. Максіменка, брыгадзір эксперыментальнай базы «Чэрыкаў» А. Ц. Аляксеенка, рабочы гэтай гаспадаркі В. Ц. Карнюшчанка. Многія былі ўзнагароджаны граматамі, занесены на дошкі гонару, а прозвішча кінамеханіка з в. Верамейкі Леаніда Рыгоравіча Козырава занесена ў Кнігу працоўнай славы існаваўшага ў той час Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па кінематаграфіі.

Чэрыкаўская зямля багата таленавітай інтэлігенцыяй, сярод якой ёсць вучоныя і пісьменнікі, кампазітар і мастак, аб якіх расказваецца ў гэтай кнізе.

У раёне клапоцяцца аб выхаванні павагі да чалавека працы, да тых людзей, што, не шкадуючы свайго жыцця, мужна сталі на абарону Радзімы ў цяжкі для яе час. Праводзяцца сустрэчы моладзі з ветэранамі, ускладаюцца кветкі да помнікаў і абеліскаў, створаны гісторыка-краязнаўчы музей. Некаторыя вулі-

цы Чэрыкава носяць назвы добра вядомых у раёне людзей, ушаноўваюць імёны ганаровых грамадзян горада. Гэта стварае пэўныя ўмовы для захавання добрых традыцый, перадачы іх наступным пакаленням. Гісторыя сведчыць, што маральная сіла народа, яго здольнасць да прагрэсу маюць непарыўную сувязь з яго адносінамі да сваёй спадчыны.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна ў 80-я гады адбывалася ў нялёгкіх умовах. У краіне не былі пераадолены застойныя з'явы ў эканоміцы, валюнтарысцкія метады кіравання сельскай гаспадаркай. Спробы знайсці выйсце з крызісу шляхам перабудовы грамадскага жыцця ў рамках аднапартыйнай камандна-адміністрацыйнай сістэмы поспеху не мелі. Цяжкім выпрабаваннем для жыхароў раёна абярнулася аварыя на Чарнобыльскай АЭС (гл. артыкул «Пад чорным крылом Чарнобыля»).

Складаныя працэсы перабудовы эканомікі і адраджэння духоўнага жыцця, якія пачалі адбывацца ў Беларусі пасля прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, знайшлі свой адбітак і на Чэрыкаўшчыне. У пачатку ажыццяўлення зямельнай рэформы ў раёне праведзена інвентарызацыя зямель калгасаў, саўгасаў і іншых землеўладальнікаў. Быў створаны спецыяльны фонд мясцовых Саветаў. На першым этапе яму было перададзена 807 га зямель, затым уключана яшчэ 1929 га. У гэты час 404 сям'і пашырылі зямельныя ўчасткі, 610 грамадзян Чэрыкава атрымалі зямлю пад агароды. За 1991 г. і ў першай палове 1992 г. былі ўтвораны тры сялянскія (фермерскія) гаспадаркі. Адна размешчана на тэрыторыі Рэчыцкага сельскага Савета ў в. Вусце, на плошчы 50 га, а дзве другія плошчай 5 і 10 га на тэрыторыі Сормаўскага сельскага Савета.

Пры раённай цэнтральнай бібліятэцы пачаў дзейнічаць клуб аматараў беларускай мовы «Спадчына». У школах вывучаецца не толькі гісторыя рэспублікі, але і роднага краю. У апошні час абудзіўся рух за адраджэнне і дасканалае вывучэнне беларускай мовы. Гэта дае магчымасць не толькі вучням, але і дарослым, усяму насельніцтву раёна выйсці на шырокую дарогу азнаямлення са спадчынай бацькоў і дзядоў.

Пэўныя перамены ў жыцці раёна адлюстроўваюць і іншыя падзеі. З'явіліся малыя прадпрыемствы, якія разам з фермерскімі гаспадаркамі ўносяць пэўны ўклад у развіццё эканомікі раёна. Малое прадпрыемства «Астра», напрыклад, неаднаразова выступала спонсарам цікавых мерапрыемстваў. Многія жыхары, працоўныя калектывы ўнеслі ахвяраванні на будаўніцтва царквы. У горадзе і раёне працягваецца газіфікацыя. На плошчы горада ў гонар 50-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адкрыты мемарыяльны знак.

Сацыяльна-эканамічнае становішча раёна ў перыяд пераходу эканомікі да рыначных адносін адлюстравана ў звароце Чэрыкаўскага раённага Савета народных дэпутатаў у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і Дзяржкамчарнобыль: «Рэзка знізіліся даходы большасці насельніцтва, яны дасягнулі крытычнай адзнакі, за якой ужо рэальна намячаецца голад і галеча. Зарплата механізатараў і жывёлаводаў застаецца мізэрнай і не дае магчымасці забяспечыць сям'ю, у асаблівасці дзяцей, экалагічна чыстымі прадуктамі. Ва ўмовах фінансавага банкруцтва гаспадаркі не могуць забяспечыць вядзенне сельскагаспадарчых работ у адпаведнасці з патрабаваннямі радыяцыйна небяспечнай тэхналогіі, якая патрабуе ў 1,5 раза больш матэрыяльных затрат». У гэтым дакуменце, надрукаваным у раённай газеце 16 студзеня 1993 г.,

гаворыцца пра крытычнае становішча ў працоўных калектывах, якія не могуць эканамічна выжыць у рыначных умовах. Адбываецца спад вытворчасці, скарачэнне рабочых месц, што прыводзіць да беспрацоўя.

У раёне ўведзены абмежаванні на спажыванне электраэнергіі, звадкаванага газу.

Апынуўшыся ў цяжкіх умовах, многія людзі разгубіліся. Ідэалы, за якія яны змагаліся, аказаліся нязбытнымі. Адно стала зразумелым— шлях да лепшага жыцця патрабуе яшчэ шмат намаганняў і працы.

Падрыхтаваў Р. Маслоўскі.

З ДАВЕДКІ АРГІНСТРУКТАРСКАГА АДДЗЕЛА І СЕКТАРА СТАТУЛІКУ ЦК ЛКСМБ АБ ВЫКАНАННІ ПАСТАНОВЫ ЦК ЛКСМБ АД 27 ВЕРАСНЯ 1943 Г. «АБ БЛІЖЭЙШЫХ ЗАДАЧАХ КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ Ў РАЁНАХ ВЫЗВАЛЕННЯ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ» КАМСАМОЛЬСКІМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ.

...Комсомольцами Чериковского района восстановлено 9 мостов, десятки километров шоссейных и грунтовых дорог. На этих работах участвовало более 200 комсомольцев.

Комсомольцами Лобановского сельского Совета отремонтировано 6 мостов, комсомольцами дер. Речицы — 1 мост. Комсомольцы и молодежь деревень Веприн, Глинки, Озерская, Рынковка, Горки, Речица и Шароевка в общей сложности провели более 30 воскресников по починке дорог и мостов, чем способствовали быстрейшему продвижению на запад частей Красной Армии.

Комсомольцы дер. Зябенка, проявив личную инициативу, на протяжении 5 км выкопали ямы, подвезли столбы и оказали помощь в восстановлении телефонной связи.

Комсомольские организации Хотимского, Чериковского и Костюковичского районов за проявленную заботу о воинах Красной Армии имеют благодарность от командования фронта.

Комсомольцы и молодежь Чериковского района для восстановления кирпичного завода собрали на развалинах города свыше 50 тыс. кирпичей.

По инициативе райкома комсомола в городе силами комсомольцев и молодежи восстанавливается Дом социалистической культуры, на работах по восстановлению которого принимают участие все первичные организации.

Большая работа проведена комсомольцами и молодежью Мстиславского, Краснопольского, Хотимского, Чериковского районов по очистке городов и селений после варварского их разрушения отступающей немецко-фашистской армией.

Большая работа проведена комсомольцами Чериковского района. Комсомольцами выстроено 20 землянок семьям фронтовиков и партизан. Комсомольцы Глинского сельского Совета выкопали картофель, построили погреб и отремонтировали жилье матери Героя Советского Союза Е. М. Николаенко.

Комсомольцы Речицкого сельского Совета убрали урожай семьям военнослужащих Застреловой, Клишинской, Овсянниковой и др. Многие первичные комсомольские организации имеют много благодарностей за проявленную заботу.

Огромная работа проделана по восстановлению школ и организаций всеобщего обучения детей, выявлению детей-сирот, родители которых погибли от рук немецко-фашистских палачей, и устройстве их приюта.

Райкомы комсомола оказывали большую практическую помощь партийным и советским органам в деле подбора и выдвижения проверенных комсомольско-молодежных кадров на руководящую советскую, хозяйственную и культурную работу. Только Чериковским РК ЛКСМБ выдвинут на руководящую работу в колхозы 101 чел.— 5 председателей колхозов, 45 бригадиров, 31 счетовод, 20 кладовщиков.

Заведующий сектором учета и статистики ЦК ЛКСМБ Дубаневич

Инструктор организационного инструкторского отдела ЦК ЛКСМБ Коваленко

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 63, воп. 8, спр. 6, л. 413—421. Арыгінал.

Агні калгаса

З артыкула А. Пысіна ў газеце «За Радзіму» ад 3 сакавіка 1948 г.

Рака Вудага з'яўляецца адным з шматлікіх прытокаў сівога Сожа. Яшчэ да вайны ў «Чырвоным аратым» пагаворвалі аб тым, каб перагарадзіць яе воды плацінай. Напад нямецкіх захопнікаў спыніў стваральную працу калгаснікаў, прыйшлося на некалькі год адкласці ажыццяўленне плана. Але думка аб калгаснай гідраэлектрастанцыі не пакідала нікога. І таму як толькі калгаснікі сталі абмяркоўваць свой пяцігадовы план, аб будаўніцтве станцыі загаварылі сур'ёзна, падзелавому і намецілі яго на 1947 год.

— Няхай мужчыны працуюць на будаўніцтве, а мы, жонкі, справімся за сябе і за іх на гаспадарцы,— заявіла на агульным сходзе калгасніца Ліда Паўлава.

Яе горача падтрымалі ўсе жанчыны. Быў складзены каштарыс, па якому на будаўніцтва калгас адпусціў 250 тыс. рублёў. Запрасілі інжынера.

На Вудазе яшчэ ляжаў лёд, а ў бары ўжо разносіўся вясёлы перастук сякер, на бераг падвозілі бярвенні, зноў закіпела будаўніцтва.

— Усё для будоўлі, уключыць лямпачку Ільіча да 30-годдзя Кастрычніка! — кінула баявы лозунг калгасная камсамольская арганізацыя.

Напярэдадні 30-й гадавіны Вялікага Кастрычніка былі ўстаноўлены турбіна і генератар, закончаны лінейныя работы. А ў дзень свята лямпачка Ільіча ўспыхнула ў кожным доме, асвяціла калгасную вуліцу, заліла святлом кароўнік, канюшню і другія пабудовы.

Калгасная гідраэлектрастанцыя дае 26 кілават энергіі. Яе хапае не толькі для асвятлення. Ужо ўстаноўлен млын, паслугамі якога карыстаюцца нават суседзі. У гэтым годзе калгаснікі мяркуюць устанавіць цыркулярную пілу і гонтарэзку. Па ўсіх падліках гідраэлектрастанцыя ў бліжэйшы час апраўдае затраты на яе, на многа аблегчыць працу калгаснікаў.

У тыя пасляваенныя...

З успамінаў А. С. Валаткоўскага

Чэрыкаўскую МТС я прыняў у 1947 г. ад былога дырэктара Івана Цацохі. Спадчына аказалася больш чым сціплая: 16 трактароў ХТЗ, 7 «Універсалаў», адзін камбайн «Камунар», ды адна ледзьве жывая кабыла, якая павінна была замяніць адсутнічаўшыя аўтамашыны. Я ведаў, што МТС як да вайны, так і пасля была самай адстаючай у вобласці. Але гэта акалічнасць і зрабіла ўплыў на маё рашэнне пайсці іменна сюды працаваць, калі першы сакратар абкама т. Карасёў прапанаваў мне выбар.

А. С. Валаткоўскі.

Ужо ў першыя дні недахопаў у рабоце МТС выявілася нямала. Спачатку я не ведаў да чаго прыкласці рукі, каб хутчэй вывесці калектыў з прарыву. У наблізіўшуюся зіму, а затым вясну мы прыклалі ўсе на-

Кіруючы састаў і перадавікі вытворчасці Чэрыкаўскай МТС, 1950 г.

маганні, каб якасна адрамантаваць тэхніку. Прыйшоў і першы станоўчы вынік — павялічылася вытворчасць машынна-трактарнага парку і гадавы план 1948 г. быў выкананы на 128 %, сярэдняя норма выпрацоўкі на 15-моцны трактар дасягнула 649 га. За поспехі ў працы Чэрыкаўская МТС была занесена на абласную і рэспубліканскую дошкі гонару, тры чалавекі атрымалі ўрадавыя ўзнагароды, у тым ліку і я ордэн «Знак Пашаны». У 1949 г. бюро Магілёўскага абкама партыі таксама станоўча ацаніла нашу работу, а міністр сельскай гаспадаркі Беларускай ССР за выкананне дагаворных работ з калгасамі, а іх у зоне нашай МТС было 14, узнагародзіў станцыю аўтамашынай ГАЗ-67.

У наступныя гады наш калектыў таксама быў у ліку перадавых сярод МТС Магілёўскай вобласці. І ўсё гэта дзякуючы таму, што ў нас працавала шмат ініцыятыўных, добрасумленных людзей. Сярод іх загадчык майстэрні Какорын, брыгадзіры трактарных брыгад Разумаў, Баркоў, Губараў, Агееў, камбайнер Саракула. Вельмі старанна працаваў сталяр Веліканаў, які потым закончыў тэхнікум і стаў таленавітым механікам. Нельга не ўспомніць намесніка па палітчасці Някрасава, які заўсёды знаходзіўся сярод механізатараў, дапамагаў ім якасна выконваць заданні. Самым маладым у калектыве быў тады М. Е. Панасенка, яго спачатку назначылі ўчотчыкам, а потым загадчыкам нафтабазы. За ўвесь перыяд маёй працы ў МТС, а гэта каля дзевяці год, я не памятаю выпадку, каб па віне нафтабазы быў зрыў у забеспячэнні машын гаруча-змазачнымі матэрыяламі.

Аб інтэнсіўным развіцці тэхнічнага абслугоўвання калгасаў у той час сведчаць і некаторыя лічбы. Калі ў 1955 г. я здаваў справы новаму дырэктару Буранкову, у сувязі з ад'ездам на вучобу ў Харкаўскі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, то Чэрыкаўская МТС ужо налічвала 72 трактары розных марак, 37 камбайнаў С-4, 14 ільноцерабілак, 14 аўтамашын, 82 адзінкі другой сельскагаспадарчай тэхнікі.

Што і казаць, шмат мы працавалі ў тыя цяжкія пасляваенныя гады, каб хутчэй паставіць на ногі нашу гаспадарку, палепшыць жыццё.

Рыхтавалі кадры механізатараў

З успамінаў В. С. Собалева

У 1951 г. Магілёўскім абласным упраўленнем сельскай гаспадаркі я быў накіраваны настаўнікам у Чэрыкаўскае вучылішча механізацыі. Неўзабаве назначылі завучам. Размясцілася вучылішча ў маляўнічым месцы, на левым беразе р. Сож у в. Манастырок, у памяшканнях, што належалі раней суднаверфі. Вядома было, што дырэктар вучылішча А. А. Гарбаты, які ўзначальваў гэтую навучальную ўстанову яшчэ да вайны, у час акупацыі разам з былым завучам А. В. Львовым узначаліў партызанскі атрад.

Натуральна, што адным з важнейшых клопатаў у той час быў клопат аб кадрах настаўнікаў. Многіх з іх скасіла вайна, другія змянілі прафесію, але тым не менш асноўны касцяк хутка сфарміраваўся. У ліку першых настаўнікаў былі П. С. Ганчурын, М. К. Жуткін, В. І. Жыгуноў, Н. Р. Кузьміцкі, В. К. Камандскі, Ю. Е. Аўрусін, Е. В. Шабутова, Е. Е. Шутава, Т. Г. Лукашова, Н. І. Новікаў. Інструктарамі па ваджэнню працавалі А. Т. Шмаянкоў, Ю. І. Смірноў, І. Ф. Крэч, Н. М. Грыневіч, Л. К. Негаціна і іншыя.

Калектыў вучылішча разумеў, што для нармальнай арганізацыі вучэбнага працэсу неабходна матэрыяльная база. Адсутнасць вучэбных кабінетаў, майстэрань, класаў для тэарэтычных заняткаў стварала вялікія цяжкасці. Яшчэ горш абстаяла справа з вучэбнай тэхнікай — адсутнічалі трактары, камбайны, аўтамабілі, прычапны інвентар. Аднак энтузіязм, малады задор і гарачае жаданне ўнесці свой уклад у аднаўленне народнай гаспадаркі, панаваўшыя ў калектыве, дапамаглі пераадолець і гэту цяжкасць. За параўнальна кароткі тэрмін сіламі настаўнікаў, інструктараў і навучэнцаў былі адрамантаваны, пераабсталяваны і ўкамплектаваны неабходнай тэхнікай і вучэбнымі дапаможнікамі кабінеты для практычных заняткаў: па трактарах, сельгасмашынах, механізацыі жывёлагадоўлі, слясарная майстэрня. Да меўшыхся ў вучылішчы калёснага трактара «Універсал», гусенічнага «ХТЗ-НАТИ», аўтамабіля ГАЗ-АА дабавілася іншая, больш сучасная сельскагаспадарчая тэхніка, у тым ліку па механізацыі жывёлагадоўчых ферм. Дала першы электрычны ток стацыянарная электрастанцыя, была абсталявана кузня, так як усе рамонтныя работы і тэхабслугоўванне тэхнікі рабіліся сваімі сіламі.

В. С. Собалеў.

Усё гэта расшырала магчымасці вучылішча — у ім рыхтавалі трактарыстаў, механікаў-камбайнераў, шафёраў. Праводзілася таксама перападрыхтоўка трактарыстаў, працавалі курсы брыгадзіраў трактарных брыгад. На вучобу ў Чэрыкаўскае вучылішча накіроўвалася моладзь з Хоцімскага, Краснапольскага, Слаўгарадскага, Крычаўскага, Кіраўскага раёнаў. Колькасць навучэнцаў дасягала 460 чалавек. Вучылішча жыло цікавым паўнакроўным жыццём.

У 1961 г. яно было зліта з вучылішчам у г. Мсціславе. Туды ж

была пераведзена частка настаўнікаў і інструктараў, перададзена вучэбная тэхніка. Я быў накіраваны ў Чэрыкаўскую сяроднюю школу на пасаду завуча па вытворчаму навучэнню.

Ішло ўзбуйненне

У пасляваенныя гады ў Чэрыкаўскім раёне адбываўся працэс узбуйнення калектыўных гаспадарак за кошт аб'яднання больш дробных. Архіўныя матэрыялы даюць нейкае ўяўленне аб гэтым працэсе.

Калгас **«Кастрычнік»** Вепрынскага сельсавета, цэнтр в. Вепрын. Прыкладна ў 1930 г. рашэннем агульнага сходу жыхароў в. Вепрын Вепрынскага сельсавета была створана сельскагаспадарчая арцель (калгас) ім. Сталіна з цэнтрам у в. Вепрын. У 1958 г., згодна з рашэннем выканкама Чэрыкаўскага раённага Савета дэпутатаў працоўных, у склад гэтага калгаса ўвайшлі калгасы: «Чырвоны Кастрычнік» — в. Вепрын, «Трэці рашаючы» — в. Гронаў. Цэнтрам узбуйненага калгаса стала в. Вепрын Вепрынскага сельсавета. У 1959 г. агульны сход калгаснікаў калгаса ім. Сталіна вырашыў перайменаваць гаспадарку ў калгас «Рассвет», а ў снежні 1962 г. калгас «Рассвет» быў названы калгасам «Кастрычнік» з цэнтрам у в. Вепрын.

Калгас **«Бальшавік»** Сормаўскага сельскага Савета, цэнтр в. Зоры. У 1930 г. рашэннем агульнага сходу жыхароў в. Зоры Глінскага сельскага Савета была арганізавана сельскагаспадарчая арцель (калгас) «Бальшавік». У 1947 г. ад калгаса «Бальшавік» адышлі вёскі Багданаўка, Ямкі, Латышчына, на базе якіх быў створаны калгас «30-годдзе Кастрычніка» з цэнтрам у в. Ямкі. У ліпені 1950 г. рашэннем Чэрыкаўскага выканкама і рашэннем агульных сходаў калгаснікаў калгасаў Глінскага сельсавета калгасы «30-годдзе Кастрычніка», «Чырвоная зорка», «Бальшавік» аб'ядналіся ў калгас «Бальшавік». Цэнтрам аб'яднанага калгаса стала в. Зоры. 24 лістапада 1960 г. калгас «Бальшавік» увайшоў у склад Рэчыцкага сельсавета. Зараз гэта гаспадарка ўваходзіць у склад Сормаўскага сельскага Савета.

Калгас ім. **Ільіча** Рэчыцкага сельсавета, цэнтр в. Рэчыца. У 1932 г. на тэрыторыі Рэчыцкага сельсавета былі створаны сельскагаспадарчыя арцелі (калгасы): «Ленінскі шлях», «Чырвоная зорка», «Праца Леніна», «На варце», якія рашэннем Чэрыкаўскага райвыканкама і па жаданню саміх калгаснікаў аб'ядналіся ў калгас «Ленінскі шлях» — цэнтр в. Вохар. Калгасы ім. Будзённага і ім. Варашылава аб'ядналіся ў калгас ім. Будзённага, цэнтр в. Рэчыца. У 1959 г. калгас ім. Будзённага стаў называцца калгасам ім. Ільіча, а ў лістападзе гэтага ж года быў аб'яднаны з калгасам «Ленінскі шлях». У 1963 г. рашэннем агульнага сходу калгаснікаў калгас «Ленінскі шлях» стаў калгасам ім. Ільіча Рэчыцкага сельскага Савета з цэнтрам у в. Рэчыца. У 1979 г. калгас ім. Ільіча быў аб'яднаны з калгасам «Другая пяцігодка».

Калгас **«Іскра»** Сормаўскага сельсавета, цэнтр в. Вудага. У 1930 г. былі створаны сельскагаспадарчыя арцелі (калгасы) ім. Калініна (в. Вудага) і «Іскра» (в. Глінь). У 1950 г. (10 лістапада) на агульным сходзе калгаснікаў пастанавілі аб'яднаць калгас ім. Калініна Глінскага сельсавета і «Піянер» у сельгасарцель ім. Калініна. Цэнтрам аб'яднанага калгаса стала в. Вудага. У 1955 г. калгасы ім. Калініна (в. Вудага) і «Іскра» (в. Глінь) аб'ядналіся ў калгас ім. Хрушчова з цэнтрам у в. Глінь,

які ў 1958 г. быў названы калгасам «Праўда». У 1960 г. калгас «Праўда» ўвайшоў у склад Рэчыцкага сельсавета. У 1963 г. на базе калгаса «Праўда» былі створаны дзве гаспадаркі: калгас «Праўда» (в. Глінь) і калгас «Іскра» (в. Вудага). Да калгаса «Іскра» адышлі ў асноўным землі і населеныя пункты былога калгаса ім. Калініна.

Калгас **«Краіна Саветаў»** Рэчыцкага сельсавета, цэнтр в. Камаровічы. Прыкладна ў 1930 г. была створана сельскагаспадарчая арцель (калгас) «Краіна Саветаў» (в. Камаровічы). Да гэтай гаспадаркі ў 1950 г. былі далучаны калгасы «VI з'езд Саветаў» (в. Камаровічы-2) і ім. Варашылава (в. Гойкаў). У снежні 1956 г. агульны сход калгаснікаў вырашыў далучыць да гэтай гаспадаркі калгас «Гігант» (в. Халоблін). У сакавіку 1960 г. да калгаса «Краіна Саветаў» далучыўся калгас «Рассвет».

Калгас **«Прагрэс»** Язёрскага сельсавета, цэнтр в. Сакалоўка. У 1930 г. рашэннем агульнага сходу калгаснікаў в. Сакалоўкі была арганізавана сельскагаспадарчая арцель (калгас) «Іскра». У 1950 г. калгасы «Іскра» (в. Сакалоўка), «Праўда» (в. Прыпёчына) Язёрскага сельсавета і «Авангард» (в. Бакаў) Мірагашчанскага сельсавета аб'ядналіся ў калгас «Іскра» (цэнтр в. Сакалоўка). У 1959 г. да калгаса «Іскра» была далучана гаспадарка «Шлях да камунізму» (в. Доўгая), і ў гэтым жа годзе калгас «Іскра» стаў насіць назву «Прагрэс».

Калгас **«Чырвоны араты»** Ушакоўскага сельсавета, цэнтр в. Галоўчыцы. У 1930—1932 гг. рашэннем агульнага сходу жыхароў в. Галоўчыцы была арганізавана сельскагаспадарчая арцель (калгас) «Чырвоны араты» з цэнтрам у в. Галоўчыцы Зябенскага сельсавета. У 1950 г. калгасы Зябенскага сельсавета «Чырвоны араты» (в. Галоўчыцы), «Перамога» (в. Піленка), «Чырвоны пераможнік» былі аб'яднаны ў адну сельскагаспадарчую арцель (калгас) «Чырвоны араты». У 1959 г. рашэннем агульнага сходу калгаснікаў узбуйненых калгасаў Зябенскага сельсавета «Добраахвотнік» (цэнтр в. Зябень) і «Чырвоны араты» аб'ядналіся ў адзін калгас «Чырвоны араты» з цэнтрам у в. Галоўчыцы.

Калгас **«Маладая гвардыя»** Ушакоўскага сельсавета, цэнтр в. Ушакі. У 1930 г. была арганізавана сельскагаспадарчая арцель (калгас) «Чырвоны штурмавік» з цэнтрам у в. Ушакі. У ліпені 1950 г. рашэннем агульнага сходу калгаснікаў гаспадаркі калгасы «Чырвоны штурмавік» (в. Ушакі), «Бальшавік» (в. Бакунавічы), ім. Сталіна (в. Пільня) аб'ядналіся ў калгас ім. Сталіна. У лістападзе 1959 г. гэта гаспадарка стала называцца калгасам «Маладая гвардыя» з цэнтрам у в. Ушакі.

В. Бачкавая.

Гартаючы падшыўкі

Па старонках раённай газеты «Заклік Ільіча» за 1943—1970 гг*.

21 кастрычніка 1943 г.

ЗДРАДНІК АТРЫМАЎ ПА ЗАСЛУГАХ

19 кастрычніка 1943 года Ваенна-Палявы Суд разбіраў справу былога бургамістра горада Чэрыкава і раёна Шыркевіча.

23 месяцы гэты подлы сабака, верны халуй фашызма, праслужыў бургамістрам, за гэты час многа поту, слёз і крыві пралілося ў працоўных горада Чэрыкава і раёна.

Дзесяткі людзей прымусова адпраўлены ў Германію, сотні сем'яў засталіся без кароў і вопраткі, дзесяткі і сотні людзей замучаны, рас-

* Да 1959 г. газета насіла назву «Сацыялістычная перамога».

стрэлены і сасланы ў канцлагеры — вось толькі няпоўны пералік злачынстваў фашысцкага халуя Шыркевіча.

Адсюль зразумела, чаму з такой ненавісцю і прызрэннем слухалі прысутнічаўшыя паказанні Шыркевіча аб тым, што ён, падтрымліваючы рэгулярную сувязь з Гестапо, выдаваў камуністаў і партызан; сабіраў звесткі аб савецкім актыве і спісы дасылаў у камендатуру; сістэматычна здзекваўся над працоўнымі, якія звярталіся ў яго «ўстанову».

Вось чаму, калі Суд удаліўся на нараду і сакратар РК КП(б)Б тав. Храмовіч, расказаўшы на мітынгу аб злачынствах Шыркевіча, унёс прапанову — прасіць Ваенна-Палявы Суд прыгаварыць здрадніка Шыркевіча к павешанню, 980 чалавек дружнымі апладысментамі падтрымалі гэтую прапанову.

Выступаўшыя на мітынгу, тав. Кубышкін, Зубараў В., Палякова, Курнопа, Агеенка і іншыя — усе ад імя народа прасілі Ваенна-Палявы Суд аб павешанні нягодніка Шыркевіча.

УЗЯЛІСЯ ЗА РАБОТУ

Адразу ж пасля прыхода часцей Чырвонай Арміі Чэрыкаўская МТС дзейна распачала сваю аднаўленчую работу па збору трактароў і аўтамашын.

За кароткі час поўнасцю адрамантавана 5 трактароў, з іх 4 зданы для патрэб Чырвонай Арміі.

З 21 кастрычніка будзе працаваць кузнечная майстэрня па рамонту трактароў і аўтамашын, усе неабходныя інструменты для майстэрні ўжо сабраны.

НАЛАДЗІМ СУВЯЗЬ

Зараз працоўныя горада Чэрыкава, раёна актыўна ўзяліся за аднаўленне гаспадарчага і культурнага жыцця ў раёне.

Вялікую ролю ва ўсёй гэтай рабоце павінна адыграць сувязь як у самім горадзе Чэрыкаве, так і сувязь раёна з сельсаветамі і калгасамі.

На падставе гэтага работнікі Чэрыкаўскай райканторы сувязі ўзялі на сябе абавязак к дню 26-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі пабудаваць 2 тэлефонных лініі ў горадзе Чэрыкаве, а таксама злучыць тэлефоннай сувяззю наступныя ўстановы: РК КП(б)Б, Райсавет дэпутатаў працоўных, Гарсавет, НКДБ, Райваенкамат і др.

30 мая 1946 г.

БУДАЎНІЦТВА БАРЖЫ

Калектыў Чэрыкаўскай суднаверфі прыступіў да будаўніцтва баржы грузападʼёмнасцю ў 700 тон. Такая вялікая баржа тут будуецца ўпершыню.

7 лістапада 1947 г.

З РУІНАЎ І ПАПЯЛІШЧАЎ

З першых дзён вызвалення раёна ад немцаў распачалося будаўніцтва. Вялізарную дапамогу ў гэтай справе аказала і аказвае дзяржава. На аднаўленне і новае будаўніцтва жылых дамоў у вёсках і раённым цэнтры адпушчана звыш 3,5 мільёна рублёў. Акрамя таго, для загінуўшых воінаў, інвалідаў Айчыннай вайны, удоў і сірот на сродкі дзяржавы заканчваецца будаўніцтва 30 жылых дамоў.

Толькі ў гэтым годзе пабудавана 576 дамоў, у тым ліку за перыяд ударнага месячніка — 102 жылых дамы.

8 сакавіка 1948 г.

ЗНАТНЫЯ ЖАНЧЫНЫ РАЁНА

За выдатную работу па аднаўленню калгасаў пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў узнагароджаны медалём «За доблестный труд в Великой Отечественной войне 1941—1945 гг.» 65-гадовая звеннявая сельгасарцелі імя Сталіна Горкаўскага сельсавета Карнеенка Феўронія, 75-гадовая калгасніца Дар'я Антонаўна Шамро з калгаса «3-ці рашаючы» Вепрынскага сельсавета, Іванова Ніна Якаўлеўна — работніца Чэрыкаўскай МТС, заатэхнік Лукашова Аляксандра і шмат іншых.

6 чэрвеня 1948 г.

РАСЦЕ ПАГАЛОЎЕ ЖЫВЁЛЫ

Хуткімі тэмпамі аднаўляюць арцельную жывёлагадоўлю калгаснікі сельгасарцелі імя Будзённага Мірагашчанскага сельсавета. План развіцця буйной рагатай жывёлы за бягучы год выканан на 130 працэнтаў, няспынна расце і пагалоўе другіх відаў грамадскай жывёлы.

12 верасня 1948 г.

КАШТОЎНЫ ПАЧЫН КАЛГАСНІКАЎ

Не так даўно ў калгасе «Чырвоны пераможнік» Зябеньскага сельсавета адбыўся агульны сход, на якім калгаснікі абмеркавалі пытанне аб укамплектаванні жывёлагадоўчай фермы арцелі. Выдатны пачын развіў калгаснік Сяргей Кацапаў. У сваім выступленні ён заявіў:

— Заўтра я аддам на калгасную ферму цялёнка. Гэта будзе мой уклад у развіццё калгаснай жывёлагадоўлі. Спадзяюся, што мой прыклад будзе горача падтрыман усімі калгаснікамі.

Каштоўны пачын Сяргея Кацапава сапраўды знайшоў шырокае падтрыманне. Назаўтра на жывёлагадоўчую ферму арцелі калгаснікі здалі 12 цялят. Многія абавязаліся здаць на папаўненне фермы парасят, авечак і курэй.

Вестка аб ініцыятыве калгаснікаў арцелі «Чырвоны пераможнік» хутка распаўсюдзілася ва ўсе калгасы сельсавета. Па прыкладу сваіх суседзяў члены сельгасарцелі «Добраахвотнік» здалі на калгасную ферму 33 цялёнкі і трох парасят. Многа маладняку жывёлы далі ў гэтыя дні калгасам члены сельскагаспадарчых арцелей «17-ы партз'езд», «Чырвоны араты» і другіх.

3 кастрычніка 1948 г.

ШПАЛЫ ДЛЯ ЧЫГУНАК

Сёлетняй вясной калектыў Чэрыкаўскага леспрамгаса абсталяваў і пусціў у дзеянне завод па вырабу шпал для чыгунак. На аднаўленне стальных магістраляў краіны работнікі шпалзавода адправілі па рацэ Сож дзесяткі плытоў са шпаламі. Завод сістэматычна выконвае сваю вытворчую праграму на 125—130 працэнтаў.

17 красавіка 1949 г.

ДЛЯ КАЛГАСНАЙ ПЧОЛАПАСЕКІ

Вялікай павагай сярод членаў сельгасарцелі «Праца Леніна» Рэчыцкага сельсавета карыстаецца калгаснік Нікіта Аўдзеевіч Драбінка. Гэтую павагу ён заслужыў шчырымі клопатамі аб развіцці арцельнай гаспадаркі. Ён рашыў стварыць калгасную пчолапасеку. Сельгасарцель не мела свабодных сродкаў для набыцця пчоласямей. Тады Нікіта Аўдзеевіч прапанаваў праўленню калгаса пчол, якія знаходзяцца ў яго асабістым карыстанні. Днямі

тав. Драбінка здаў 10 пчоласямей у сельгасарцель для развядзення калгаснай пчолапасекі.

19 мая 1949 г.

РАСКАРЧОЎВАЮЦЬ ХМЫЗНЯК

Калгаснікі сельгасарцелі імя Сталіна Каменскага сельсавета ў гэтым годзе распрацоўваюць 70 гектараў хмызняку. 35 гектараў хмызняку ўжо распрацавана. Тут пасеяна 8 гектараў ільну і 27 гектараў аўса.

Зараз калгаснікі цярэбяць хмызняк пад азімае жыта. Ужо падрыхтавана плошча ў 7 гектараў.

18 чэрвеня 1949 г.

НОВАБУДОЎЛІ КАЛГАСА «ІСКРА»

У сельгасарцелі «Іскра» Глінскага сельсавета распачата будаўніцтва кароўніка ўмяшчальнасцю на 100 галоў. На будоўлі працуе брыгада пад кіраўніцтвам вопытнага цесляра Уладзіміра Рызвянкова. Будуецца тыпавая канюшня на 50 коней, школа, памяшканне для праўлення калгаса, дзе таксама будзе размешчан калгасны клуб.

21 жніўня 1949 г.

САМААДДАНАЯ ПРАЦА

Калгасніцы сельгасарцелі «Іскра» Лабанаўскага сельсавета Акуліне Зайцавай 85 год. Але яна актыўна ўдзельнічае ва ўсіх калгасных работах. Яна абавязалася зжаць у гэтым годзе больш 3-х гектараў збожжа. Штодзённа Акуліна Зайцава зжынае 0,25—0,30 га збажыны.

20 красавіка 1950 г.

НА БУДАЎНІЦТВЕ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

Паспяхова ідзе будаўніцтва Ушакоўскай гідраэлектрастанцыі. Завяршаецца адсыпка плаціны. Нарыхтоўваюцца шпунтавыя палі. Вытвараецца забіўка круглых паляў.

Многія калгаснікі значна перавыконваюць нормы выпрацоўкі.

Пуск электрастанцыі намечан на дзень 33-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

1 чэрвеня 1950 г.

НОВЫЯ МАШЫНЫ

Машынна-трактарныя станцыі раёна папаўняюцца новымі машынамі. У ліку атрыманых машын Чэрыкаўскай МТС — тры самаходных камбайны і тры магутных малатарні «МК-1100».

Работаць на новых машынах будуць высокакваліфікаваныя механізатары.

13 ліпеня 1950 г.

АБ'ЯДНАННЕ КАЛГАСАЎ

З кожным днём усё шырэй разгортваецца рух калгаснага сялянства за аб'яднанне дробных калгасаў. За апошнія дні калгасы «Іскра» і «Праўда» Язёрскага сельсавета і сумежная з імі сельгасарцель «Авангард» Мірагашчанскага сельсавета аб'ядналіся ў адну буйную калектыўную гаспадарку. Узбуйнены калгас «Іскра» мае ўласную гідраэлектрастанцыю. Адкрыліся неабмежаваныя магчымасці для дальнейшага шпаркага развіцця ўсіх галін калгаснай вытворчасці.

Старшынёй узбуйненай сельгасарцелі калгаснікі адзінадушна абралі камуніста Аляксандра Сямёнава.

22 лютага 1951 г.

15 ПАДЗЯК ВОІНА-ВЫДАТНІКА КОЗЫРАВА

Ураджэнец Чэрыкаўскага раёна гвардыі малодшы сержант Козыраў

з'яўляецца выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі. У сваім падраздзяленні ён таксама з'яўляецца кінамеханікам і да гэтай работы адносіцца з усёй добрасумленнасцю.

Вось што піша газета «Тревога» аб нашым земляку:

«Кінамеханік гвардыі малодшы сержант Козыраў добрасумленна адносіцца да сваёй работы. Ён заўсёды дасканала сочыць за станам апаратуры. Дзякуючы яго беражлівасці і акуратнасці не было выпадку, каб здарылася хаця б малейшая затрымка ў дэманстрацыі кінафільмаў з-за няспраўнасці апаратуры.

Пятнаццаць падзяк атрымаў воін-выдатнік і прыкладны кінамеханік нашага падраздзялення гвардыі малодшы сержант Козыраў».

29 сакавіка 1951 г.

ЛІТАРАТУРА ДЛЯ КАЛГАСНЫХ БІБЛІЯТЭК

За апошні час многія калгасы раёна стварылі ўласныя бібліятэкі і папаўняюць іх кніжны фонд.

Сур'ёзную дапамогу ва ўкамплектаванні калгасных бібліятэк аказваюць райком камсамола, райбібліятэка і грамадскасць горада.

Райком камсамола сумесна з райбібліятэкай арганізавалі збор літаратуры сярод гарадскога насельніцтва і за кароткі тэрмін сабралі больш 1000 кніг.

Сабраныя экземпляры кніг ужо пераданы дзевяці калгасным бібліятэкам. У бягучым годзе мяркуецца давесці кніжны фонд калгасных бібліятэк да 7 тысяч экземпляраў.

15 красавіка 1951 г.

У РАЙКОМЕ КП(б)Б І РАЙВЫКАНКОМЕ

Бюро райкома КП(б)Б і райвыканком прынялі рашэнне аб устанаўленні раённай Дошкі гонару.

На раённую Дошку гонару будуць заносіцца калгасы — перадавікі сацыялістычнага спаборніцтва на веснавой сяўбе па рашэнню бюро РК КП(б) і райвыканкома з апублікаваннем у раённай газеце.

3 чэрвеня 1951 г.

УРУЧЭННЕ ПРЭМІІ ПЕРАДАВІКАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

Выканком Чэрыкаўскага райсавета дэпутатаў працоўных, разгледзеўшы вынікі сацыялістычнага спаборніцтва калгасаў раёна па выкананню дзяржаўнага плана лесанарыхтовак і вывазак асенне-зімовага сезона 1950—1951 года, прызнаў пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве рад калгасаў. Вызначаны прэміі лепшым ініцыятарам і арганізатарам спаборніцтва:

1. Старшыні калгаса імя Ракасоўскага Халмянскага сельсавета т. Лушчаеву — веласіпед.
2. Старшыні калгаса імя Дзімітрава Язёрскага сельсавета т. Хацкалёву — ручны гадзіннік.
3. Шафёру — калгасніку калгаса «Іскра» Глінскага сельсавета т. Кавалёву — патэфон.

2 жніўня 1951 г.

ЦАГЕЛЬНЫ ЗАВОД У КАЛГАСЕ

У бягучым годзе калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоная Беларусь» Рынкаўскага сельсавета пабудавалі новы цагельны завод з напольнай печчу. Завод працуе на поўную магутнасць. За летні перыяд выпушчана больш 15 тысяч цэглы.

Вытворчасць цэглы на ўласным заводзе дасць калгасу магчымасць інтэнсіўна весці будаўніцтва гаспадарчых збудаванняў, сэканоміць значныя сумы сродкаў і матэрыялаў.

5 жніўня 1951 г.

У СЕЛЬСКАЙ ХАЦЕ-ЧЫТАЛЬНІ

Язёрская хата-чытальня — адна з лепшых у нашым раёне. Сельская моладзь, калгаснікі ў вольны ад работы час збіраюцца сюды, каб паслухаць цікавую гутарку, даклад, пачытаць свежы нумар газеты, абмяняць у бібліятэцы кнігу. Многія маладыя калгаснікі займаюцца ў гуртках мастацкай самадзейнасці.

У вёсцы Прыпёчына, дзе размешчана гэта хата-чытальня, умеюць арганізаваць культурны адпачынак працаўнікоў вёскі. Вялікая заслуга ў гэтым партыйнай і камсамольскай арганізацыі.

9 верасня 1954 г.

400 ПРАЦАДЗЁН ЗА 8 МЕСЯЦАЎ

Член сельгасарцелі «Іскра» Глінскага сельсавета Цыганкоў Грыгорый Кузьміч за 8 месяцаў гэтага года выпрацаваў на розных работах 400 працадзён, у тым ліку 56 працадзён на жняярцы, якой ён убраў 112 гектараў збажыны.

4 лістапада 1954 г.

СТО ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ДАХОДУ

Хлебаробы калгаса «Камінтэрн» вялікую ўвагу ўдзяляюць развіццю садоўніцтва. У бягучым годзе на рахунак калгаса ад саду паступіла 100 тысяч рублёў.

12 снежня 1954 г.

РАДЫЁФІКАЦЫЯ КАЛГАСНАЙ ВЁСКІ

Радыё трывала ўваходзіць у быт калгаснікаў. У калгасах раёна абсталяваны і працуюць пяць радыёвузлоў. Радыёфікацыя калгаснай вёскі прадаўжаецца. Устанаўліваецца новы радыёвузел у калгасе «Ленінскі шлях» Рэчыцкага сельсавета. Пры актыўнай дапамозе калгаснікаў сувязісты ставяць слупы і падводзяць лінію. У дзень навагодняга свята радыё загаворыць у 150 дамах гэтага калгаса.

22 верасня 1955 г.

ВЕТРАРУХАВІКІ Ў КАЛГАСЕ

На свінагадоўчай ферме калгаса імя Хрушчова Глінскага сельсавета ўзводзіцца ветраны рухавік, энергія якога будзе выкарыстана для механізацыі працаёмкіх работ. Гэта другі па ліку ветрарухавік у калгасе.

1 лістапада 1956 г.

КАЛГАСНЫ КЛУБ

Добры перадсвяточны падарунак атрымалі гэтымі днямі калгаснікі сельгасарцелі «Камінтэрн»: тут дабудаван і здан у эксплуатацыю клуб. Клуб разлічан на 350 месц, у ім чатыры асобных памяшканні, добрая глядзельная зала. На адкрыццё клуба сабралася каля чатырохсот калгаснікаў. З дакладам на ўрачыстым сходзе выступіў старшыня калгаса тав. Нікіценка. Ён расказаў аб поспехах, якія дасягнуты калгаснікамі за апошні час.

Пасля ўрачыстага схода сіламі калектыва мастацкай самадзейнасці раённага Дома культуры для калгаснікаў быў дан канцэрт.

3 сакавіка 1957 г.

ДРАЎНІНА — ДАНБАСУ

Калектыў рабочых Чэрыкаўскага калгаса выконвае ганаровую задачу — вядзе нарыхтоўку і вывазку руднічных стоек для шахтаў Данбаса. Уступіўшы ў сацыялістычнае спаборніцтва ў чэсць выбараў у мясцовыя Саветы, лесгас па становішчу на 1 сакавіка выканаў план нарых-

товак драўніны для Данбаса. У бліжэйшыя дні будзе закончана квартальнае заданне і па вывазцы руднічных стоек.

10 студзеня 1959 г.

КУПІЛІ ЎЛАСНУЮ ТЭХНІКУ

Днямі хлебаробы калгаса «Шлях да камунізма» Язёрскага сельсавета набылі ўласную тэхніку: трактары, зернявыя і бульбаўборачныя камбайны, сеялку для пасадкі кукурузы квадратна-гнездавым спосабам. Кошт тэхнікі складзе больш 250 тысяч рублёў.

12 снежня 1968 г.

НОВЫ ЦЭХ БЫТКАМБІНАТА

Камбінат бытавога абслугоўвання адкрыў новы цэх. У ім вырабляецца вагонка для абшыўкі дамоў і другіх мэт. Прадугледжана таксама вытворчасць дзвярэй, аконных рам і іншых сталярных вырабаў.

1 студзеня 1970 г.

РАЁН У РЫШТАВАННЯХ

Парадавалі будаўнікі галаўчанскіх дзяцей, пачаўшых навучальны год у новай школе. Жыхары вёскі Лобча атрымалі новы прасторны магазін, кіёск бытавога абслугоўвання. Такі ж кіёск адкрыты і ў Язёрах. Калгаснікі саўгаса «Ударнік» таксама атрымалі добры падарунак ад будаўнікоў — новую лазню. Калгаснікі сельгасарцелей «Іскра», імя Кірава, «Чырвоны араты», «Перамога» атрымалі шмат новых жылых дамоў.

29 студзеня 1970 г.

17 ПАРАСЯТ АД СВІНАМАТКІ

Не першы год спаборнічаюць паміж сабой свінаркі эксперыментнай базы «Чэрыкаў» В. А. Курыліна і Е. І. Далецкая. І летась сяброўкі яшчэ ў пачатку года рашылі памерацца, хто атрымае і захавае больш парасят ад свінаматкі. Цяпер вынікі спаборніцтва падведзены. Лепшы вынік у Вольгі Анісімаўны Курылінай. Ад кожнай з 25 замацаваных свінаматак яна атрымала па 17 парасят. Дбайная свінарка перадала на дарошчванне 425 галоў.

НОВАЯ АТС

У Чэрыкаве здадзена ў эксплуатацыю новая аўтаматычная тэлефонная станцыя на 500 нумароў. Увод яе ў дзеянне дазволіць у бліжэйшы час удвая павялічыць тэлефанізацыю раёна. Прадугледжана ўстанавіць новыя, больш магутныя АТС у Вепрыне і Верамейках.

Падрыхтаваў Р. Маслоўскі.

Святло Лімені

У гэтым эсэ пісьменнік В. Карамазаў, ураджэнец Чэрыкаўшчыны, расказвае пра тое, як прыйшло да яго адкрыццё харaства родных мясцін, малюе каларытныя партрэты землякоў, якія сталі прататыпамі герояў яго літаратурных твораў.

Неяк увосень, калі я быў у Чэрыкаве, мы з мамай завіталі да дзядзькі Рыгора, мамінага роднага брата. На згоне зімы ў наступным годзе ён памёр, а тады яшчэ тупаў з кійком у руцэ — яму ішоў дзевяты дзесятак. Павёў нас у свой сад. Падвёў да дзвюх яблынь — пачаў успамінаць:

— А ці ведаеш, Нюська, колькі ім гадоў?

— Ведаю, што многа. Я была дзяўчынкаю, а яблыні ўжо тады былі немаладыя.

— Ты мне кажаш!.. Я за цябе старэйшы, а і то колькі сябе помню, столькі і гэтыя яблыні яблыкамі абсыпаныя. Іх яшчэ наш бацька садзіў. Яшчэ хлапчуком.

Успаміналі, гадалі, прыкідвалі і пагадзіліся, што яблыням больш як па сотні гадоў. А між тым і сёлета, ужо без дзядзькі, цвілі і зноў яблыкамі абсыпаліся.

Без добрага прыгляду, вядома, гэткі век не жылі б і не радзілі б. Але і дзядзька Рыгор, і мой дзед Анісім былі выдатнымі садоўнікамі, ведалі любое дрэва, любілі і сад, і лес, рабілі ў свой час і леснікамі. Кажу «і леснікамі», бо даўжэй, як лесніком, дзядзька служыў на граніцы, быў кадравым афіцэрам, у дваццатыя гады — у Чапаеўскай дывізіі, а дзед Анісім меў вельмі чулае сэрца — такія тады ў лесніках доўга не хадзілі. Дый у руках у яго было рамяство, блізкае да мастацтва, якое не горш і карміла, і да душы ляжала: ён быў славуты рымар і маляр, а як расказвае мама, дык і болей таго — мастак. Са скуры мог зрабіць любую штуковіну, нават лакавыя чаравічкі паненкам, але раскідацца не любіў і абшываў толькі коней. Шыў сёдлы, аброці, шлеі, вупраж аздабляў строчкамі, кутасамі, металічным наклёпам, разьбою. Для шыкоўных карэт і фаэтонаў шыў са скуры падушкі, тыя ж карэты і фаэтоны пакрываў фарбамі, лакам, размалёўваў. Усюды, на кожным раменьчыку, на кожнай спіцы клаў аздобу вельмі высокага густу. І ў касцёл, і ў вялізны, на два прастолы праваслаўны сабор, якія стаялі ў Чэрыкаве, на самыя далікатныя работы заўсёды клікалі Анісіма Шаблоўскага — майго дзеда. Ён, высокі і грузны, узлазіў на высозныя купалы, пакрываў іх і крыжы золатам, і калі, як любіць расказваць мама, прыходзіў па святах з дзецьмі ў сабор, дык яму, як шаноўнаму госцю, бацюшка падносіў просвірку на сподку, хоць дзед, звычайны рамеснік, быў і небагаты чалавек.

Строма Сажа, дзе я нарадзіўся, вельмі маляўнічая. Па строме стаяць хаткі, лазенкі, крывулькі-сцежкі бягуць, нібы дажджавыя ручаіны, з гары да Сажа, раскідаючы крывулькі-платы, равы і ровікі пасабляюць ім ствараць тое бязладдзе, якое чаруе душу. І ўжо адсюль — толькі пераплывеш Сож — пачынаецца Ліменская пушча, ці, як усё яшчэ кажуць старыя людзі, Васілеўшчына — колішнія надзелы ліменскага пана Васілеўскага.

З ёю, Ліменшчынай, звязана ўсё жыццё маіх сваякоў па маці — Шаблоўскіх. І дзедава. І маміна. А пасля — і маё. Першы раз я адчуў яе як штосьці надзвычай роднае, сваё, кроўнае, як сцены роднае хаты, як маміны ці бацькавы рукі і голас, на самым пачатку вайны, калі мне было сем год, толькі-толькі я разагнаўся на восьмы, калі мы, бацькі і дзеці, спусціліся з гары на мост, каб па ім уцячы ў лес ад немцаў, якія былі ўжо зусім блізка,— гарачыя баі ішлі на Проні, пад Прапойскам, за трыццаць кіламетраў ад Чэрыкава. Мост цераз Сож быў драўляны, высозны і доўгі, з аграмаднымі фермамі ўверсе і быкамі ўнізе, а тады, на той узрост, здаваўся самым вялізным у свеце — ён нас, малых, і прываблівaў, як адно з самых-самых цудаў свету, і палохаў. І што там, на ім, рабілася! Людзі, коні, машыны, каровы, козы, а на вазах — свінні, куры, гусі, авечкі, і ўсё гэта — крычала, раўло, галасіла, плакала. А тут яшчэ, калі мы ўзышлі на мост са сваімі клункамі, у небе над нашымі галовамі з'явіўся чорны крыж нямецкага самалёта! Ён кружыў нізка над мостам, выбіраючы момант, каб кінуць бомбы, і пад ім, тым крыжам,

яшчэ большы жах ахапіў усё жывое. Смерць была і ўверсе — той чорны крыж, і ўнізе — чорная вада ракі. Храплі, вырываючыся з хамутоў, коні, трашчалі парэнчы моста, пачалі страшэнна раўці каровы, але ніштo нікога ўжо спыніць не магло, і людская рака вынесла нас у пушчу. І вось тады, здаецца, да мяне прыйшло сваё, не з расказаў мамы, а ўжо сапраўды сваё адчуванне Ліменскай пушчы: тут не было ўлады чорнага крыжа, смерць засталася там, ззаду, на адкрытым прасторы моста і ракі, а тут, у пушчы, быў паратунак, было жыццё, і гэта ўсе адчулі адразу, адчулі нават і мы, дзеці. Тое маё першае і самае, мабыць, вострае адчуванне пушчы як адзінай сілы ратунку запомнілася на ўсё жыццё. І яшчэ адно адчуванне запомнілася з таго часу — як адкрыццё, сваё, той самай пушчы. Яно звязана з пушчанскімі начлегамі. Яно ўвайшло ў душу ад лясных вогнішчаў, вакол якіх збіраліся ўсе: мама, бацька, сястра, сваякі і чужыя людзі, якія сядзелі сярод сваіх для мяне як свае таксама. Яно — ад той лясной цемені і зыркага святла вогнішчаў, ад цішыні, то лагоднай, як маміна на сон песенька, то вусцішнай, ад раптоўных уначы ўскрыкаў птушак, ад гаманы ля вогнішча, ціхай і таямнічай, зусім не такой, як удзень, ад вусцішнага пошуму дрэў над галавою. О-го, тыя вогнішчы, тое начное жыццё вакол іх! Калі б мець талент Івана Сяргеевіча Тургенева,— пашэрхлі б фарбы і гукі нават «Бежына лугу». Дык вось адтуль да мяне прыйшло адчуванне пушчы як таямнічае глыбіні, якую не разгадаць нікому і ніколі. Гэтае адчуванне пазней неяк мянялася, мабыць, з усё большым вопытам жыцця ў ёй, але ўвогуле засталося. Яно пачало мяняцца тады, як скончылася вайна і мы, вярнуўшыся з бежанства, зноў жылі на сваім чэрыкаўскім беразе — у зямлянцы. Хаты пагарэлі, бераг быў пусты, здзічэлы, а пушча за Сажом, надзіва, стаяла тая самая — магутная, непахісная, велічная — і мы, хлапчукі, падрослыя і пасталелыя за вайну, хутка і рашуча праклалі туды свае сцежкі-дарожкі.

А ўсё ж і тое пасляваеннае адкрыццё пушчы — грыбное ды ягаднае — не было яшчэ сапраўдным яе адкрыццём, каб на ўсю шырыню ды глыбіню. Самае-самае адкрыццё Ліменшчыны прыйшло да мяне пазней, ужо ў сталыя гады, калі пушчанскія сцежкі прывялі да пушчанцаў, жыхароў гэтага ляснога краю, і калі многія з іх сталі маімі блізкімі сябрамі. Адным з іх, нават ці не першым з іх, быў Аляксандр Васільевіч Карпенка — ляснічы Лімені, не проста ляснічы, а яе, Лімені, душа. У той час я толькі-толькі скончыў універсітэт, рабіў у раённай газеце, блізка ад Чэрыкава будаваў дом і ў Лімень прыязджаў па лес.

Што ўспамінаецца з тых дзён, дзён завязі нашае дружбы з Аляксандрам Васільевічам? Многае, вельмі многае. І вельмі шкада, што пра многае не раскажу свету, людзям — не паспею. Хоць штосьці і расказаў. Хоць бы і ў «Пушчы».

Успамінаецца летняя пагодлівая раніца. Сонца паднялося па-летняму рана, але расы на травах яшчэ не высушыла, яшчэ кантора лясніцтва на замку, а ля канторы нас, кліентаў, поўна сабралася. Адзін на аднаго глядзяць, пазнаюць ці не пазнаюць, часцей — не пазнаюць, кожны сам сабе думае: і адкуль вас, людцаў, столькі нагнала, за вамі ці атрымаеш той лес, які трэба? Адкуль нагнала? Каб жа толькі са сваіх лясных вёсак ці хоць са свайго раёна, а то ж з суседніх раёнаў, нават і не суседніх, далёкіх. Старыя, што і ногі ледзь валакуць, інваліды, мужчыны ў самай сіле, якіх бервяно, асабліва камель, вельмі любяць, жанчыны, таксама адна на адну непадобныя, маладзейшыя і старэй-

шыя, падлеткі — усе чакаюць ляснічага, моляць бога, каб ён сёння прыйшоў пакладзісты, добры. І вось ён выходзіць дарогаю з лесу, адзін ці з леснікамі, тэхнікамі. Усе, хто ля канторы, хто ляжаў ці сядзеў пад клёнам, на ганку, пад ганкам на мурагу, хто дзе драмаў ці спаў, падхопліваюцца дружненька, як па камандзе, атрасаюцца, зашпільваюцца, прыводзяць сябе ў парадак. А ён падыходзіць нетаропка, здароўкаецца, строга аглядае ўсіх, амаль кожнага — у твар, зазіраючы ў вочы, і тады толькі, усіх, здаецца, заўважыўшы, пра кожнага штосьці падумаўшы, падымаецца на ганак. Здымае з чэпа ўвесісты замок, адчыняе дзверы, пераступае цераз парог, а за ім — першымі абавязкова ішлі тэхнікі, затым леснікі, рабочыя, конюх Анані Якаўлевіч Зарэцкі і ўжо следам за імі ўсімі — кліенты. Гэты парадак быў тут абавязковы для ўсіх і свята захоўваўся.

Але я сам яго ці не парушыў, не назваўшы ліменскага бухгалтара Уладзіміра Іванавіча Мядзведзева. А чалавек гэта быў рэдкасны. Пра яго хадзілі легенды. У асноўным пра яго талент паесці і выпіць. І то была не брахня. Праўда. Я сам бываў у адной з ім кампаніі і магу засведчыць, што ён адразу мог з'есці калі не паўкабана, то сцягно — як не бывала, ці два кілаграмы сала, ці вядро бульбы, ці... І выпіць адпаведна. Але чаму і не з'есці, калі важыў за восем пудоў? Аднойчы я прывёз яму пачытаць раман Рабле «Гарганцюа і Пантагруэль». Не, узваліць на сваю галаву гэтакую работу ён не рызыкнуў, але тое-сёе, выбарачна, прачытаў і рагатаў ад душы. Казаў мне: «Бедны быў бы твой Гарганцю, калі б я сеў побач з ім да кабанчыка!»

Пра ўсё гэта я менш за ўсё хацеў тут расказваць — так атрымалася. Я хацеў сказаць, што чалавек Уладзімір Іванавіч быў добры, а сваё месца ў лясніцтве лічыў калі не першым, дык другім абавязкова. Ён ведаў, што грошы кіруюць светам, а ўсе грошы былі ў яго сейфе, ключы ад якога ляжалі ў яго кулаку. І таму калі ляснічы заходзіў у кантору, то следам за ім ішоў ён, ліменскі бухгалтар Уладзімір Іванавіч Мядзведзеў, які ў душы лічыў сябе ўсё ж першым чалавекам Лімені.

Дык вось дні гэтыя, калі збіраліся кліенты, называліся тут «вялікімі сходамі». Ляснічы і бухгалтар сядзелі за адным сталом пасярод пакоя, а вакол іх — людзі адусюль, знаёмыя і незнаёмыя, хітрыя і шчырыя, сумленныя і ўрвіцелі, здаровыя і хворыя, такія, каму трэба паболей, і такія, каму хопіць і менеў. А калі мець на ўвазе нарад, то ўсім трэба было болей, як у тым нарадзе. На хату звычайна чалавеку выпісвалі пяць кубоў, а ці з тых пяці хату паставіш? Іх і да падаконня не хопіць. Чалавек тады і мудрыў, як узяць болей. Ілгалі, кралі, спойвалі леснікоў — хто як мог, хто на што быў здатны. Тут і ляснічаму, калі ў яго душа — не камень, ой як цяжка. Усім памагчы хацелася, а як ты ўсім паможаш? І ўсё ж памагаў ён многім, асабліва старым, бяднейшым, слабейшым. А хітрым, хапугам, хто наравіў з іншым лесніком прапіць хвою ці дуб, ходу не даваў. Людзі ведалі яго круты нораў, хаваліся, але і ён іх бачыў наскрозь: хто што думае, хто чым дыхае, хто ў які бок верне. І таму тут, у канторы, у дні «вялікіх сходаў», ішла не проста выпіска лесу, а ціхая, як быццам непрыкметная, вайна за чалавека, за праўду, за лес. Ляснічы не спяшаўся выпускаць людзей з канторы, з кожным завязваў гаворку не толькі пра лес, але і пра сям'ю, пра вёску. Раптам успомніць, як той ці іншы кліент прыязджаў летась, пазалетась, дзесяць гадоў назад, што ён тады ў лесе браў, як браў. А то згадае мінулае Ліменшчыны, калі яна была за панам Васілеўскім, тыя лясныя па-

радкі, тых леснікоў, выйдзе і на часы ранейшыя, на лясныя ўказы Пятра Першага — смелыя, мудрыя, часам жорсткія, а то і смешныя, як на цяперашні розум,— на тое мінулае нашага лесу, калі яго сплаўлялі па Сажы і Дняпры ў Азоўскае і Чорнае моры, дзе ён ішоў на будаўніцтва першага рускага ваеннага флоту, калі яшчэ гэты лес належаў князю Пацёмкіну, а той якраз і будаваў, па даручэнні царыцы Екацярыны, першыя ваенныя фрэгаты і дрэдноуты. А то, бывала, падпісваючы лесарубны білет, згадае па нейкай аналогіі дзеда Піпку, як той служыў фурманам у пана Васілеўскага — дзед Піпка тады жыў у суседняй вёсцы,— ці дваццатыя гады, калі ў маёнтку адкрылася школа-камуна, якую ўзначалілі браты і сёстры Лепяшынскія, сваякі вядомага рэвалюцыянера-ленінца Панцеляймона Лепяшынскага. Таксама цікавая, багатая старонка Лімені.

Звычайна чалавек, атрымаўшы білет на лес, спяшаецца хутчэй схаваць яго ў кішэню ды ляцець да сваіх сасонак, ялінак, бярозак. Лясніцы гэтакіх не любіў. Ён сам ніколі не спяшаўся ні са словам, ні з выпіскаю білета, а хто спяшаўся — той кантору пакідаў самы апошні. Яму важней за ўсё на свеце было пагаварыць з чалавекам, зразумець яго, хоць словам дапамагчы. А цяпер, праз шмат гадоў, мне здаецца, што тыя размовы з людзьмі Васільевіч вёў і дзеля мяне, для мяне, тады яшчэ маладога газетчыка, пачынаючага пісьменніка — даваў мне ўрокі людскога жыцця на будучае. І ўрокі тыя аказаліся незабыўнымі. Дзіву даюся, як спавядаліся яму людзі, давяралі самы патаемны свой боль, якая шчырасць была паміж іх.

Раман «Пушча» я напісаў значна пазней, тады пра раман не думаў, наогул ці я думаў, што тое, людское, некалі ляжа ў радкі маіх твораў, але цяпер бачу, што ў душы маёй раман пісаўся ўжо тады, у лясной лімінскай канторы, па-за яе сценамі, дзе лясы і лясы, дзе Сож, лясныя крыніцы, лугі, тыя лясныя дарогі і сцежкі, якія — я гэта зразумеў — не адзін год хавающца ад чалавека, пакуль не прызнаюць яго сваім, сабе патрэбным.

У мяне часта пытающца, хто такі Валошка, герой рамана, дзе я яго знайшоў, хто такі Зімавец, другі герой рамана. Пытанні гэтыя для мяне цяжкія, і я рады, што пра гэта не пытающца хоць на Ліменшчыне — там усё ведаюць. Але і там я неаднойчы тлумачыў, што нельга ў Валошку бачыць толькі Васільевіча, у іх розныя сем'і, розны ўзрост і яшчэ шмат чаго рознага. Але ў той жа час алень рогі не схавае — відаць кожнаму, у каго ёсць вочы. І сам сабе я прызнаюся: Валошка — Васільевіч, хоць і не думаў, калі пісаў, што гэтакім будзе падабенства. Адналькавыя характары, душы, погляды на свет, на людзей, на прыроду. Дый вонкавага нямала агульнага: захапленне зверам, слончынай цягаю, бакасінымі шлюбнымі песнямі, рознымі драбніцамі лясного жыцця, іншаму воку зусім непрыкметнымі. Валошка і лесапасадачныя машыны робіць тыя самыя, што і Васільевіч. І філосафы абодва. Ды і лёс у абодвух нялёгкі. І што абурае. Хай бы жыццё іх ускладнялі нейкія заганы характараў, а то ж наадварот — багацце натуры, талент.

Я неаднойчы бачыў, як у Лімень прыязджала начальства, лясное і нелясное, і як Васільевіч побач з тымі, ад каго залежаў, каму падначальваўся, выглядаў чалавекам і спецыялістам шмат разумнейшым, цікавейшым, мудрэйшым. Такім людзям, па шчырасці кажучы, жыць і працаваць цяжка, асабліва калі яшчэ і душа сумленная, праўдзівая, і натура ўпартая. Вось ён і звольніўся «па ўласным жаданні». Паехаў працаваць аж у іншую воб-

ласць. Але сям'ю сарваць з наседжанага месца, дом прадаць не паспеў, як адчуў, што нідзе яму спакою не будзе, акрамя як у Лімені. Помню, як пасля прызнаваўся: «Вярнуўся я ў Лімень і бачу, што машыны, мною выдуманыя, лес садзяць, мае станкі на лесазаводзе крояць дошчачку, на лузе, які я асушаў самаробным экскаватарам, леснікі траву ў пояс косяць, лес, які сам садзіў, шуміць-расце. І зашчымела сэрца: як жа я ўсё гэта быў кінуў?»

На лясную службу, аднак, ужо не вярнуўся. Працаваў то дыспетчарам на аўтабазе, то механікам на лесазаводзе, то рабочым. Хваробы прычапіліся — на пенсію выйшаў.

Нядаўна заехаў да яго. Сядзіць за сталом, начапіўшы на нос акуляры, выразае з ліпы ножычкам скульптуру грэчаскай багіні, заступніцы лясоў і звяроў. Работа не закончана, а ўжо відаць, што робяць яе рукі мастака. Ведаю: ніколі раней не браўся ён за гэтую работу, а вось узяўся, як вольны час з'явіўся, і атрымоўваецца што трэба. І настрой добры. Жартуе, усміхаецца. А ўсё ж і жарты, і ўсмешка — праз нейкую тугу, глыбока схаваную. Туга, мабыць, па сапраўднай рабоце. Па Лімені.

Дзе логіка? Чалавеку таленавітаму, сумленнаму толькі б і рабіць тое, што ён можа, што любіць рабіць, а ён вымушаны кінуць работу. Каму гэта трэба? Яму самому — не. Дзяржаве? Не. Дык каму? Мой Валошка Лімені не пакідае, ва ўсякім выпадку — на плошчы аднаго рамана, хоць цяжка яму, як і Васільевічу. Поўнага суладдзя са светам у іх абодвух няма. Цяпер вось думаю, што пра Валошку я пісаў, увесь час перажываючы за Васільевіча, пад яго вельмі моцным уплывам. Гэта, відаць, добра, але, можа, і не зусім добра. Можа, мне не хапіла свае ўлады над героем.

Зноў ахвота вярнуцца ў кантору лясніцтва, да людзей. Вось тут, адразу ля дзвярэй, звычайна сядзеў на сваёй бензапіле Коля Кандратаў. Ён працаваў пільшчыкам, валіў і крыжаваў лес — камусьці і гэта рабіць трэба. Заўсёды вясёлы, жартаўлівы, рагатун і насмешнік, ён асабліва здзіўляў усіх у лесе з пілою ў руках. І без пілы. Стане ў адным месцы сярод дрэў, доўгія рукі з пілою працягне да камля — дрэва ўжо ляжыць, а за ім тут жа другое, трэцяе, пятае. З месца, здаецца не сыдзе, пілы не заглушыць — ужо вакол яго светла-светленька, сонечна, чысценька, быццам і не расло тут нічога. І дрэвы заўсёды ляжаць так, як трэба Колю. Ніводнае не завісне на іншай дзераві не заўпарціцца, не зачэпіцца, куды Коля вокам пакажа — там яно ўжо і ляжыць. Здавалася, што ён на тыя камлі і не глядзіць — то нешта расказвае, то жартуе, то спявае,— яны самі перад ім кладуцца, адно за адным. А то стаім над якім камлём удвух, утрох, учатырох — як яго ўзяць? Падсоўваем калы, крэкчам, на далоні паплёўваем, а ён не даецца. Коля падыдзе. Спачатку рагатне з нас, як паветра лішняе з грудзей выпусціць, потым усіх развядзе аграмаднымі рукамі ад камля, з канца, танчэйшага, адзін падхопіць, паставіць «на папа», прысядзе пад яго, адной рукою абхопіць таўсцейшы канец, камель, адным рухам сабе на клуб ускіне — і панёс. Мы за ім следам, хапаемся, каб памагчы, баімся, каб не надарваўся, а ён, Коля, нясе і рагоча. А то, бывала, коціш бервяно па лагах на машыну — адзін канец у кузаў на «лісіцу», другі на прычэп,— падкоціш пад борт, а вышэй ускінуць ужо ні ў кога сілы няма: крэкчаш-крэкчаш... І раптам бервяно лягчэе на тваім плячы, на руках, плыве, нібы само па сабе, угару і ляціць у кузаў. Азірнешся: Коля стаіць за спінаю, смяецца ўсім сваім вялізным прывабным тварам. Ён

Сустрэча ў Ліменскім лясніцтве: унізе (злева направа) Віталь Шаблоўскі, пісьменнік Віктар Карамазаў, Ягор Лісікаў; уверсе Мікола Клімаў, Аляксандр Карпенка і паэт Рыгор Барадулін.

быў далёка не прыгажун, але я рэдка сустракаў чалавека, які б гэтак прыгажэў, смеючыся, рагочучы. Рабіў за дзесяцёх, але заўсёды без крыку, без злосці, здавалася, што і без поту, весела. Высокі, хударлявы, а косць буйная, душа шырокая — хоць рабіць, хоць гуляць. Адным словам — сіла! Артыст! Быў чалавек!..

Кажу, на жаль,— быў.

Каля Лімені, ад вёскі метраў трыста, у спелым сасновым лесе ёсць могілкі. Кожны раз, прыехаўшы сюды, а бываю я тут даволі часта і падоўгу, едучы міма праз лес, спыняюся, пастаю над магілкаю Мадэста Мікалаевіча Лепяшынскага, у школе-камуне якога вучыўся мой дзядзька Саша, які рана памёр, яшчэ да вайны, над магілаю Івана Васілевіча Гутарава, майго, па універсітэце, прафесара, які, памёршы ў Мінску, пакінуў запавет, каб яго пахавалі тут, у ліменскім лесе, побач з Лепяшынскім, у камуне якога таксама вучыўся. А праз дзве магілкі — курганок Колі Кандратава. Стаю і думаю: як гэта так здараецца ў жыцці? Чалавек удаўся магутны, прырода яму дала столькі сваёй сілы і прыгажосці, столькі любові да жыцця, да людзей, здавалася, што жыць такі чалавек будзе калі не вечна, дык доўга, вельмі доўга, а ён і да сарака не дажывае. І ад чаго памёр? Кажуць — надарваўся ў рабоце. А хто калі бачыў, каб ён падрываўся. Ён жа заўсёды, ваюючы з дрэвам, жартаваў і рагатаў. Вось загадка прыроды! Адно курганок застаўся ад такога чалавека, ад усяго таго, што было. Як гэта так?

І не мая заслуга, што душу, сілу, натуру сваю Коля Кандратаў аддаў майму Клімашу з «Пушчы». Ён яго выбраў і ў мяне, здаецца, аб тым не спытаўся. Я сам знаходзіўся ў палоне Колевай непаўторнай натуры. Але аддаў ён сябе не аднаму Клімашу. Ад яго — і Міцька Курнопа. Ён, Коля, нібы падзяліў сябе на іх двух. Аднаго яму было мала. І вось тут я сам дзіўлюся: як гэта атрымалася.

Часам і не ведаеш, пакуль працуеш над творам, з каго пішаш свайго героя, нават і любімага. Напішаш — тады раптам пазнаеш у ім кагосьці са сваіх блізкіх, жывых ці былых жывых.

Гэтак атрымалася з Нікодымам. З каго пісаў — не ведаў, не думаў. А напісаўшы, убачыў у ім свайго дзеда Анісіма. І не толькі душа ягоная ў Нікодыма, але і справа жыцця, хай сабе не ўся, хай сабе часцінка.

Затое вось да дзеда Ягора, Ягора Захаравіча Лісікава, адразу, як сышліся, пачаў прыглядацца з пэўным прыцэлам. І не адзін я ў гэтым павінен — ён сам таксама. Адразу гэтак сябе паказаў. А паказаць сябе ён

можа. І любіць. Помню, як прыехалі да мяне ў Лімень Валодзя Караткевіч, Янка Брыль і Рыгор Барадулін. Ну, чым вітаць гасцей? Юшкай, вядома, на маляўнічым беразе Сіняга возера. А якая юшка без дзеда Ягора? І ён пастараўся — добрых лінёў злавіў. Было вогнішча на беразе пад хвоямі, была юшка, былі песні, размова. А дзеду Ягору гэтага мала: «Што за паеты без вершаў?» Валодзя Караткевіч чытаў «Заяц варыць піва», а стары аж скакаў ад асалоды і прапаліў штаны, ды адзаду, на далікатным месцы. «І як мне,— казаў,— ісці да бабы?» Паставіў сушыць вясло, а на яго надзеў Рыгораў берэт. Сабраліся ад'язджаць — берэта няма. «Дзе, дзед, берэт?» А ён рагоча: «Буслам аддаў». Амаль гэтак і атрымалася; праз год заехаў я ў ліменскую кантору, гляджу — на галаве ў лесніка Рыгораў берэт. Дзе, пытаюся, узяў? А ён і кажа: «На Сінім бура зламала хваіну, дык гняздо шэрай чаплі з яе звалілася, а ў гняздзе тым і гэты берэцік быў. Заржавеў на дажджах ды сонцы, злямчыўся, але на галаву ўзлез». Пасля Барадулін напіша пра гэта ў вершы «Ліст у Ліменскае лясніцтва». І яшчэ раз парадуе дзеда Ягора. Ад той сустрэчы і здымак застаўся: усе сядзяць на беразе Сіняга табунком, пісьменнікі і леснікі, а дзед Ягор асобна, наперадзе, прыкурвае ад вялізнай, большай за самога сябе, галавешкі. «Гэта,— кажа,— мой лепшы палтрэт на фоне ўсёй беларускай літаратуры».

Чым уразіў мяне дзед Ягор з першай сустрэчы? Сваёй еднасцю з прыродай: ракой, азёрамі, лугам, лесам. «У прыродзе трэба быць ціхім, як рыбіна»,— казаў ён і сам, слухаючы, не варушыўся, гадзінамі мог сядзець ціха, не кажучы ні слова, хоць пагаварыць любіў. «У прыродзе трэба мець доўгія вушы, вострыя вочы,— казаў.— Тады такога наслухаешся, такое ўбачыш, чаго і ва сне не бывае». Сам, бывала, з лодкі на бераг вылезе, закурыць і маўчыць — слухае. «А што ноч? Гэта не значыць, што калі ноч, дык і сон павальны. Прырода ўсю ночку працуе. Тады, вядома, калі ты яе разумееш, чуеш. А як глухі, дык табе і здаецца, што яна маўчыць, спіць». Сам бачыў і чуў яе дзіўна, кожную яе праяву, кожны шолах, за кожным шолахам паэму чытаў. А як мог расказваць! Аднойчы ўлетку я, прыехаўшы, раскінуў на беразе Сажа палатку, і там ён хутка знайшоў мяне. Вечар сядзелі каля вогнішча. Спачатку ўсё спяшаўся дадому, «да бабы» — дарэчы, яна ў яго, Хадора, дужа строгая,— а пасля і на бабу забыўся, да раніцы, пакуль не развіднела, «плёў кашы» — пра сады, грады, сваю маладосць. Была пара, калі пайшла пладажэрка, і ён пачаў з яе, адкуль яна бярэцца і як з ёю ваяваць, а з пладажэркі перакінуўся на жанчын і пачаў сыпаць «анекдотамі са сваёй кухні». Яго анекдоты, вядома,— тое, што было з ім, Ягорам Захаравічам, але расказвае так, быццам усё было з іншымі. Вось — пра бабу, якая не любіла, калі яе мужык хадзіў на паляванне. «А якая баба любіць таго паляўнічага, што прыносіць дадому пустыя кішэні? Ці таго лаўца, які ловіць паветра? Любой гэтакі не па губе». І вось гэтая — усё хавала ад мужыка патранташ. Аднойчы стала на парозе, дзверы загарадзіла, не пускае, зноў за патранташ хапаецца. Ну не біцца з ж бабаю? На, бяры. Але што ты з ім рабіць будзеш? А яна, доўга не думаючы, яго ў печ. А была раніца: у печы дровы гарэлі, чыгуны стаялі. Кінула патранташ у агонь і стаіць, рукі ў бокі, смяецца, як з дурня: ну, маўляў, што ты цяпер рабіць будзеш, куды з пустымі стваламі пойдзеш? А мужык спачатку і разгубіўся быў, але скеміў, што гэта зараз пачнецца — таксама вочы павесялелі: ну і ну, баба, зараз ты ў мяне абразумішся. Тут у печы і па-

Рака Сож.

чалася вайна — патроны пачалі рвацца. Баба — на падлогу, ляжыць і не дрыгае. А мужык плюнуў на ўсё гэтае ды з хаты: сама кашу завары-ла — сама і расхлёбвай. Расказваў усё гэта дзед Ягор як быццам не пра сябе, анекдот, але ўсюды «я» ды «баба мая». Як жа было паверыць, што гэта анекдот? Хоць і ведаю: са стрэльбай дзед Ягор не ходзіць, ён з тых рыбакоў, якія на паляўнічых плятуць несусвеціцу, як на самых заклятых сваіх ворагаў. На гэта, мабыць, што я ведаю, і ён разлічваў. Але пасля з'явілася ў мяне яшчэ і такая думка: ці не Хадора цябе некалі і адвадзіла ад стрэльбачкі?

Не так даўно, вясною, сустрэў яго ў Чэрыкаўскім лясгасе. Глядзіць вясёлым вокам, усміхаецца:

— А рыбка, Віцька, пялешчыцца?..

Ну як было не зразумець празрысты намёк? Трэба нам на Сажы сустрэцца. Але спяшаўся я тады ў Крычаў. Заўсёды некуды бяжым, спяшаемся. Пасля і сам шкадаваў, што яшчэ раз не пасядзеў з дзедам Ягорам на беразе Сажа ці на Сінім возеры, што даўно мы з ім вогнішча не раскладалі.

Калі развітваліся, у вачах у старога я заўважыў даўно знаёмую тугу праз далікатную ўсмешку. Часта і здаўна яна перарастае ва мне ў маю ўласную тугу — без усмешкі.

З гэтай тугою — праз усмешку — ён аднойчы сказаў мне:

— Эх, каб я быў паэтам!..

Яму заўсёды гэтага не хапала: выказаць свету сваю душу і душу прыроды, якую ён ведае як сваю. Аб гэтым яго вечная туга. Адсюль, ад гэтае тугі, і тое, што сказаў пры апошняй сустрэчы: «А рыбка пялешчыцца?..» Ён шукае сустрэчы з чалавекам, якому можа хоць крыху, хоць у нейкай малой меры выказацца, аддаць тое, што адчувае і ведае, што нажыў з гадамі, іншым людзям, а праз асобных людзей, можа, і ўсяму свету, і такім чынам вызваліць душу ад цяжару, ад тугі, або, як неаднойчы казаў, «вызваліць душу ад грэху». На яго думку, выходзіць, насіць у сабе тое, што можна выказаць свету, насіць у сабе, не выказваючыся,— гэта «насіць у сабе грэх».

І што вось тут мне рабіць? Трэба ехаць да дзеда Ягора. Усё кінуць і ехаць. Тым больш што і дзед Гарох з «Пушчы» — не ўся, прызнаюся, глыбіня і паўната дзеда Ягора. Пакуль што не ўся. І трэба ехаць.

Тут і мая радасць, і маё засмучэнне. Радасна, што жыве дзед Ягор, што я магу бясконца слухаць

яго, пераліваць у сябе, а потым і ў свае творы, яго думкі, перажыванні, вопыт жыцця. Тут як бы жыццё чужое цябе прызнала, табе адкрылася, і твор твой гэтага чакае, патрабуе. Але ёсць і засмучэнне: відаць, ніколі не ўдасца, каб жыццё гэтае схапіць на ўсю глыбіню, чарпануць да самага дна, наліць ім твор з берагамі, ні кроплі не згубіўшы па дарозе. І вось тут, думаючы пра ўсё гэта, памятаючы пра «грэх» дзеда Ягора, зразуметы ім як немагчымасць «излить миру» сваю душу, я аднойчы выразна адчуў, як не адчуваў раней, сваю пісьменніцкую задачу — найгалоўнейшую: пасобіць дзеду Ягору вызваліцца ад яго цяжкога «граху» перад светам. Адчуў я гэта той, калі не памыляюся, ноччу, улетку, калі паставіў на беразе Сажа палатку, а дзед Ягор знайшоў мяне і мы да раніцы, пакуль у небе зоркі не пагаслі, вялі бяседу. І з таго часу разуменне сваёй задачы я не змяніў. Можа, шырэй яе зразумеў з часам? Бо ўбачыў, што бяда старога — не толькі яго бяда. Хіба Васільевіч не пакутуе гэтым самым: выказацца перад светам? Нядаўна разгарнуў раённую газету — яго, Васільевіча, артыкул: «Верабей». Пра вераб'я артыкул. Спытаў: аказалася, што не першы яго артыкул у газеце. Пісаў пра асіну, пра бярозу, пра грыбы. І цікава напісана: сваё, не чужое, свае сустрэчы з асінамі, бярозамі, вераб'ямі, грыбамі. А Коля Кандратаў хіба быў іншы? Хіба яго шчырая, ад душы, работа і рогат не былі жаданнем выказацца перад людзьмі? Дый усе ліменцы гэтакія.

Ведаю, што цяжкая ў мяне задача. Але, як кажуць, назваўся груздом — скачы ў кошык. Расказаць пра такіх людзей, як Ягор Захаравіч, Васільевіч, Коля Кандратаў, усе іншыя ліменцы, шчыруны мае ліменскае пушчы, паказаць свету іх жыццё, душы і думкі, пакуты і радасці, можа, мне і не па сілах. Але колькі тых сіл ёсць — трэба рабіць. Бо, калі і далей па шчырасці, бачу, што і дзед Ягор, і Васільевіч на мяне спадзяюцца. Не магу я цяпер ужо сам-насам са сваім «грэхам» пакінуць дзеда Ягора.

З гэтымі думкамі мне трэба, дый ахвота, яшчэ раз вярнуцца ў Лімень, ужо зімовую, засыпаную снегам, да Петрака Кірылавіча Ерафеева, ліменскага егера, да ўспаміну пра яго самога і яго Тарзана, выдатную сібірскую лайку. Мы тады абклалі дзікоў на вяселлі і аднаго ўзялі. Але крыху пазней, калі ўжо цямнела, калі збіраліся вяртацца ў леснічоўку, Тарзан зноў падняў дзікоў. Сабака счапіўся з імі, а Пятрок быў блізка — стрэліў і ўклаў тым адным стрэлам не толькі свінню, але і Тарзана, хоць паміж імі, свіннёй і сабакам, было добрых дзесяць крокаў. Куля прайшла праз свінню і рыкашэтам ад косці прашыла сабаку. Тры дні Пятрок піў гарэлку і плакаў несуцешна, як дзіця, і слёз сваіх перад людзьмі не саромеўся, не хаваў. А я глядзеў на яго гэтакага і прыгадваў колішні Петракоў расказ-успамін, як недзе на пачатку вайны ён трапіў у палон і як амаль усю вайну, тры гады, немцы ганялі яго па лагерах смерці. Апошнім акордам, самым трагічным, быў сусветна вядомы Майданак. Тады, слухаючы Петрака, я здзіўляўся: як чалавек усё гэтае вытрываў, як выжыў? Цяпер падумаў іначай: як, такое перажыўшы, ён захаваў яшчэ і слёзы для Тарзана? І не адзін я гэтак думаю, не адзін я гэта ўсё ведаю. Ведаюць ліменцы, уся наша пушча. Ведаюць ліменскія алені. Гэта ж ён, Пятрок Кірылавіч, гадоў дваццаць назад прыняў іх, перасяленцаў, у пушчу, і з таго часу даглядае, падкормлівае, бароніць ад ваўкоў і злых людзей, то ўвесну выпускае іх з вальеры ў лес на волю, то на зіму зноў збірае ў вальеру, калі ім становіцца цяжка без яго прыгляду, за кожным ходзіць па следзе, за кожнага хварэе сэр-

цам. Бывае, што і аплача каторага, як Тарзана. Гэта ж спачатку да яго, Петрака Кірылавіча, а пасля ўжо да Міны ў «Пушчы», пад яго леснічоўку, пад самае Петракова акно, а пасля ўжо пад Мінава, з-пад таго мацёрага воўка, абліваючыся крывёю, прыбегла алянуха Пані. Ведала, што толькі Пятрок уратуе яе ад смерці. І ці ён вінаваты, што не быў тады ў Асечы?

Дык вось калі я мастацкім словам здымаю цяжар з душы дзеда Ягора, то думаю ў гэты час і пра Петрака Ерафеева. Што гэта так, можна зразумець хоць бы па апавяданні «Апошняе паляванне з лайкай».

Такія ў мяне землякі, такая ў мяне Лімень — Лісань з маёй «Пушчы». І хатак у ёй ужо зусім небагата, тых, у каторых яшчэ цёплыя печы, усяго тры, усяго-наўсяго, а для мяне яна, Лімень,— мацярык, жывы сёння і ў вечнасці, які я, ведаю, не здолею спасцігнуць усімі сваімі раманамі, аповесцямі, апавяданнямі і эсэ,— тымі, якія ўжо напісаў, і тымі, на якія спадзяюся, бо вельмі хочацца напісаць.

В. Карамазаў.

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ПРАЦАЙ

Чэрыкаўская зямля заўсёды славілася працавітымі людзьмі. Гэта асабліва ярка праявілася ў цяжкія пасляваенныя гады, у наступныя пяцігодкі мірнай стваральнай працы. У гэты перыяд ордэнамі і медалямі Радзімы было ўзнагароджана больш за сто працаўнікоў Чэрыкаўскага раёна. Многія з іх сталі ўдзельнікамі Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі, узнагароджаны граматамі, занесены на дошкі гонару.

БЕЛАВУСАВА Ева Селівестраўна. Нарадзілася ў 1925 г. у в. Лабанаўка Чэрыкаўскага раёна. Пасля заканчэння няпоўнай сярэдняй школы паступіла на вучобу ў школу фабрычна-заводскага навучання шаўковай фабрыкі «Магвалакно».

Пасля вайны працавала піянерважатай у Чэрыкаўскім раёне. У 1948 г. прыйшла працаваць на завод штучнага валакна прадзільшчыцай. Першай у цэху Белавусава ўстанавіла рэкордны выпуск прыгоднай прадукцыі — замест 96 % стала даваць 99 і больш. Пра свае метады работы Ева Селівестраўна ахвотна расказвала сяброўкам, паказвала, як праводзіць асобныя аперацыі на машыне. У адрозненне ад іншых яна працавала дзвюма рукамі, сумяшчаючы некаторыя аперацыі. Так, левай рукой спыняла электраверацёны, а правай у гэты час адводзіла варонкатрымальнік. Усё гэта паскарала работу. Белавусаўскую «акадэмію» прайшлі сотні маладых прадзільшчыц. У дзень 50-годдзя Міжнароднага жаночага дня Еве Селівестраўне, як лепшай прадзільшчыцы завода, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 марта 1960 г. было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Е. С. Белавусава.

МАРЧАНКА Міхаіл Авяр'янавіч. Нарадзіўся ў 1934 г. у в. Гойкаў Чэрыкаўскага раёна. Пасля заканчэння ў

1950 г. Крычаўскай школы фабрычна-заводскага навучання ён у ліку другіх лепшых выпускнікоў быў накіраваны ў Мінск, на адраджэнне горада з руін. Праз некаторы час маладому спецыялісту даверылі ўзначаліць брыгаду, якая ўзводзіла корпусы радыятарнага завода. Пасля службы ў Савецкай Арміі М. А. Марчанка па пуцёўцы камсамола паехаў на будоўлі Усць-Каменагорска. Як спецыялісту высокага разрада яму давяралі будаўніцтва складаных аб'ектаў. У 1965 г. за высокія паказчыкі ў выкананні заданняў 8-й пяцігодкі брыгадзіру будаўнікоў М. А. Марчанку быў уручаны ордэн Леніна. У 1971 г. за выкананне планаў будаўніцтва і ўвод у дзеянне вытворчых магутнасцей, жылых дамоў і аб'ектаў культурна-бытавога прызначэння М. А. Марчанку было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

СУВОРАЎ Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся ў 1921 г. у в. Гронаў Чэрыкаўскага раёна ў сям'і рабочага. Бацька яго працаваў плытагонам на Гронаўскім лесаўчастку. Ён дачасна памёр, пакінуўшы на выхаванне жонкі траіх дзяцей. Рана прыйшлося пазнаць Мікалаю Іванавічу, што такое праца. Зусім юнаком ён пайшоў працаваць на лесаўчастак грузчыкам. А затым стаў слесарам. Калі адкрыліся курсы па падрыхтоўцы вадзіцеляў аўтамабіляў, першым падаў заяву. У 1938 г. ён атрымаў правы і сеў за руль лесавоза. Вайна застала Мікалая Іванавіча ў Ленінградзе. Ён ваяваў на Волхаве, удзельнічаў у бітве на Курскай дузе і закончыў вайну ў Берліне. Асабіста распісаўся на паверженым рэйхстагу. Савецкі ўрад высока ацаніў ратны подзвіг М. І. Суворава. Ён узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За адвагу», «За абарону Ленінграда», «За перамогу над Германіяй», «За ўзяцце Берліна».

Вярнуўшыся дамоў, Суораў зноў сеў за абаранак лесавоза. На розных марках машын прыйшлося яму папрацаваць за гэтыя гады. Не было такога выпадку, каб Суораў не выканаў намечанага плана. Па 5—6 тыс. кубаметраў драўніны ў год дастаўляў ён з дзялянак на ніжні склад. Аб добрасумленнай працы вадзіцеля сведчылі такія факты: яму прысвоены званні «Ганаровы майстар лесанарыхтовак і лесасплаву», «Выдатнік сацыялістычнага спаборніцтва БССР». У 1952 г. Мікалай Іванавіч быў узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць». У 1963 г. яму было прысвоена званне ўдарніка камуністычнай працы. А 28 кастрычніка 1966 г. за працоўныя поспехі Мікалай Іванавіч Суораў быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Самым знамянальным для яго быў 1971 г., калі яму было прысвоена высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

М. А. Марчанка.

М. І. Суораў.

ЦАРКОЎ Андрэй Іванавіч. Нарадзіўся ў 1897 г. у в. Вербеж Чэрыкаўскага раёна, у сям'і селяніна-бедняка. З ранняга дзяцінства пазнаў цяжкасць хлебаробскай працы — ужо ў 13 гадоў сеяў, касіў, пасвіў жывёлу. У 18 гадоў стаў шахцёрам і гэтай працы прысвяціў усё жыццё. Да 1912 г. працаваў забойшчыкам у Данбасе на Бросаўскім рудніку Паўднёва-Заходняй чыгункі. Затым пераехаў на Далёкі Усход у г. Сучан (зараз Партызанск Прыморскага краю). Працаваў забойшчыкам, мацавальшчыкам, праходчыкам, потым начальнікам шахты). Перад вайной А. І. Царкоў перайшоў на руднік Кіўда Амурскай вобласці, дзе загадваў вентыляцыяй штольні, быў горным майстрам па вентыляцыі Кіўдзінскага шахтаўпраўлення. З гэтай пасады і пайшоў у 1952 г. на пенсію.

Царкоў быў адным з першых, хто падтрымаў ініцыятывы Аляксея Стаханава. Ён смела ўкараняў перадавыя метады, якія забяспечвалі значны рост прадукцыйнасці працы, унёс вялікі ўклад у аднаўленне і будаўніцтва вугальных шахтаў. Самаадданая праца шахцёра была высока ацэнена — 28 жніўня 1948 г. яму

А. І. Царкоў.

В. Ц. Карнюшчанка.



С. С. Курылін.

С. П. Міронава.

было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Ганаровы шахцёр узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі «За працоўную адзнаку», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», шматлікімі дыпломамі і граматамі. Памёр у 1958 г.

* * *

КАРНЮШЧАНКА Васіль Цярэнцьевіч. Нарадзіўся ў 1937 г. у в. Тур'е Чэрыкаўскага раёна. У 1961 г. закончыў вучылішча механізацыі ў в. Манастырок. З 1970 г. пачаў працаваць звеняявым па вырошчванню збожжа ў брыгадзе Тур'е эксперыментальнай базы «Чэрыкаў». За высокія паказчыкі ў працы спачатку быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», 12 снежня 1973 г.— ордэнам Леніна.

КУРЫЛІН Сцяпан Сільвестравіч. Нарадзіўся ў 1910 г. у в. Гронаў Чэрыкаўскага раёна. Працаваў лесарубам на Сахаліне. За шматгадовую працу на лесанарыхтоўках у 1953 г. узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр у 1986 г.

МІРОНАВА Софія Пятроўна. Нарадзілася ў 1920 г. у в. Паходавічы Чэрыкаўскага раёна. З 1945 г. стала працаваць у саўгасе «Чэрыкаўскі» спачатку даяркай, затым на свінаферме. Яе прозвішча з году ў год заносілася на Дошку гонару гаспадаркі, яе выбіралі дэпутатам сельскага, гарадскога і раённага Саветаў дэпутатаў працоўных. У 1966 г. узнагароджана ордэнам Леніна.

ПОСПЕХ С. П. МІРОНАВАЙ

Імя старэйшай свінаркі эксперыментальнай базы «Чэрыкаў» добра вядома ў нашым раёне. Яна ініцыятар сацыялістычнага спаборніцтва жывёлаводаў раёна за датэрміновае выкананне планаў восьмай пяцігодкі. Нямала давялося папрацаваць С. П. Міронавай, каб справіцца з узятым на 1970 г. абавязацельствам.

І вось вынікі: дбайная працаўніца зняла з адкорму і здала на мясакамбінат 876 галоў свіней. На яе рахунку 51 400 кілаграмаў атрыманай прывагі. Такіх паказчыкаў не дабілася летась ні адна свінарка раёна. Дарэчы заўважыць, што Софія Міронава здае жывёлу на мясакамбінат высокай вагой, кожны адкормнік — у сярэднім 126 кілаграмаў.

«Заклік Ільіча», 19 студзеня 1971 г.

НОВІКАЎ Фёдар Якаўлевіч. Нарадзіўся ў 1903 г. у Чэрыкаве. Працаваў шахцёрам спачатку пад Екацярынбургам, затым у г. Енакіева Данецкай вобласці. У 1945 г. узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Знамянальным для Ф. Я. Новікава быў 1951 год, калі яму прысвоілі званне «Ганаровы шахцёр», узнагародзілі ордэнам Леніна. Памёр у 1976 г.

СЛЯПЦОВА Таццяна Аляксееўна. Нарадзілася ў 1927 г. у в. Шароеўка Чэрыкаўскага раёна. З 1961 г. працавала даяркай, памочнікам брыгадзіра на жывёлагадоўлі ў саўгасе «Шароеўка». За высокія паказчыкі ў працы ў 1966 г. узнагароджана ордэнам Леніна, у 1971 г.— ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. З 1971 г. на пенсіі.

СОФІН Мікалай Анісімавіч. Нарадзіўся ў 1929 г. у в. Тур'е Чэрыкаўскага раёна. Пасля службы ў Савецкай Арміі працаваў на конным заводзе. З 1957 г. па 1958 г.— слесар-мантажнік Чэрыкаўскага кансервава-сушыльнага завода.

У 1959 г. закончыў курсы механізатараў і пачаў працаваць на эксперыментальнай базе «Чэрыкаў». На працягу шэрагу год быў звеннявым па вырошчванню бульбы, дабіваўся высокіх ураджаяў. У 1973 г. узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, у 1978 г.— ордэнам Леніна. З 1990 г. на пенсіі.

ГАЛКІН Іван Максімавіч. Нарадзіўся ў 1929 г. у в. Аніна Маскоўскай вобласці. Яшчэ да службы ў Савецкай Арміі атрымаў спецыяльнасць шафёра, якая затым вельмі спатрэбілася, калі ён пераехаў жыць у Чэрыкаў і ўладкаваўся працаваць у раённым аб'яднанні «Сельгастэхніка». І з года ў год ён быў перадавіком вытворчасці, стараннай і добрасумленнай працай заваяваў аўтарытэт у калектыве. Іван Максімавіч не толькі актыўна займаўся грамадскай работай, але вызначыўся і як лепшы рацыяналізатар у «Сельгастэхніцы». Толькі за гады дзевятай пяцігодкі эканамічны эфект ад яго прапаноў склаў 4800 р. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі і «Знак Пашаны».

КОЖЫН Іван Васілевіч. Нарадзіўся ў 1937 г. у в. Вазнясенка Цюменскай вобласці. З 1976 г. пачаў працаваць на Чэрыкаўскім дрэваапрацоўчым заводзе. Штогод перавыконвае вытворчыя заданні. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

КАМПІЦКАЯ Софія Сямёнаўна. Нарадзілася ў 1938 г. у в. Заазер'е Чэрыкаўскага раёна. Працоўны шлях пачала ў 1956 г. рабочай дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка № 147 Палескага раёна Калінінградскай вобласці. У 1958 г. пачала працаваць у саўгасе «Чэрыкаўскі». З 1969 г. працавала ў эксперыментальнай базе «Чэрыкаў» учотчыцай, а з 1971 г.— брыгадзірам паляводчай брыгады. Выбіралася дэпутатам і членам раённага Савета дэпутатаў, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1975). За самаадданую працу ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

МАЁРАВА Вера Сямёнаўна. Нарадзілася ў 1933 г. у в. Вепрын Чэрыкаўскага раёна. Пасля заканчэння Клімавіцкага саўгаса-тэхнікума па накіраванню працавала ў Віцебскай вобласці, затым учотчыцай па племянной справе ў калгасе

Ф. Я. Новікаў.

Т. А. Сляшцова.

І. М. Галкін.

С. С. Кампіцкая.

«Кастрычнік» Чэрыкаўскага раёна. З 1973 г. па 1986 г. працавала на свінаферме. У 1980 г. была выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Пасля адсялення ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС у 1990 г. пераехала ў Мінск.

НАВУМАЎ Васіль Данілавіч.
НАВУМАЎ Іван Данілавіч.

БРАТЫ НАВУМАВЫ

Доўгі час у саўгасе «Язёрскі» працуюць механізатарамі браты Васіль Данілавіч і Іван Данілавіч Навумавы. Яны сталі сапраўднымі майстрамі сваёй справы. За гады працы ў саўгасе дасканала вывучылі ўсю сельскагаспадарчую тэхніку. Гэта садзейнічае добраму выкананню любой даручанай работы.

Браты неаднаразова дабіваліся значных паказчыкаў у спаборніцтве. Яны не шукаюць выгаднай ці нявыгаднай працы, дзякуючы старанню, добрасумленным адносінам да справы дасягаюць поспеху.

Каторы год запар працуюць браты ў складзе гасразліковага кормаздабываючага атрада. Васіль Данілавіч і Іван Данілавіч з'яўляюцца машыністамі самаходных комплексаў

В. С. Маёрава.

Н. І. Сцяпулькіна.

КСК-100 і робяць ўсё магчымае, каб паспяхова справіцца з ускладзенымі на іх абавязкамі.

Шматгадовая, добрасумленная праца братоў адзначана высокімі ўзнагародамі. Васіль Данілавіч мае ордэны Кастрычніцкай Рэвалюцыі і «Знак Пашаны», Іван Данілавіч — ордэн «Знак Пашаны» і медаль «За працоўную адзнаку».

«Заклік Ільіча», 19 лістапада 1988 г.

ПАНЦЯЛЕЕВА Ганна Андрэеўна. Нарадзілася ў 1943 г. у в. Беражное Канатаўскага раёна Сумской вобласці. З 1967 г. працуе ў Чэрыкаўскай МПМК-280 у якасці тынкоўшчыцы-муляра. Вызначылася як высокакваліфікаваны спецыяліст, актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця. За бездакорную працу ў 1981 г. была ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы II ступені, у 1986 г.— ордэнам Працоўнай Славы III ступені, медалём «Ветэран працы».

СЕКУШЭНКА Леанід Кузьміч. Нарадзіўся ў 1933 г. у в. Вудага Чэрыкаўскага раёна. Шмат гадоў узначальваў звяно па вырошчванню бульбы ў калгасе «Іскра» і дабіваўся высокіх стабільных ураджаяў. Узнагароджаны ў 1973 і ў 1978 гг. ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За працоўную доблесць». Памёр у 1988 г.

СЦЯПУЛЬКІНА Надзея Іванаўна. Нарадзілася ў 1951 г. у пас. Звязда Чэрыкаўскага раёна. Пасля заканчэння ў 1971 г. Клімавіцкага саўгаса-тэхнікума працавала памочнікам брыгадзіра комплекснай брыгады па жывёлагадоўлі ў калгасе «Маладая гвардыя». Калектыў фермы, якую яна ўзначаліла, пастаянна дабіваўся высокіх паказчыкаў па вытворчасці і продажу малака і мяса, неаднаразова выходзіў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве сярод жывёлаводаў раёна. За добрасумленную працу Н. І. Сцяпулькіна неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі райвыканкама. У 1985 г. была выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі — **СЫЧОВА Ларыса Фёдараўна** (1978, галоўны аграном эксперыментальнай базы «Чэрыкаў»)*.

Заслужаны работнік культуры — **ЛЯВІНСКІ Яўген Яўгенавіч** (1989, рэдактар раённай газеты «Заклік Ільіча»).

Заслужаны ўрач — **КУТАСАЎ Іван Елісеевіч** (1966, галоўны ўрач Чэрыкаўская райбальніцы).

Заслужаныя настаўнікі: **АЎСЕЕНКА (Сільчанка) Тамара Васільеўна** (1974, настаўніца Глінскай СШ); **АКСЁНАВА Вера Максімаўна** (1970, настаўніца Язёрскай СШ); **БАРКОВА Ядвіга Міхайлаўна** (1976, дырэктар Мірагашчанскай васьмігадовай школы); **КАМАНДЗЕНКА Васіль Іванавіч** (1963, дырэктар Чэрыкаўскай СШ); **ІГНАЦЕНКА Таццяна Сяргееўна** (1965, дырэктар Вусцянскага дзіцячага дома); **КРЫВАЛАПАВА Тамара Трафімаўна** (1968, настаўніца Халмянскай СШ); **КУЗЬМЕНЧЫК Паліна Іванаўна** (1961, настаўніца Чэрыкаўскай СШ); **ЛУШЧАЕЎ Дзмітрый Ціханавіч** (1955, настаўнік Манастыркоўскай пачатковай школы); **ПРАЎДЗІКАВА Валянціна Захараўна** (1975, настаўніца Чэрыкаўскай СШ).

* * *

Заслужаны настаўнік РСФСР — **ЦАРКОЎ Мікалай Прохаравіч** (настаўнік СШ № 159 у Санкт-Пецярбургу).

* У дужках даецца год прысваення звання, пасада і месца працы ўзнагароджанага на той час.

Л. Ф. Сычова.

Я. Я. Лявінскі.

І. Е. Кутасаў.

Т. В. Аўсеенка (Сільчанка).

В. М. Аксёнава.

Т. С. Ігнаценка.

В. З. Праўдзікава.



М. П. Царкоў.

Іх імёнамі названы вуліцы

БАСІН Меер Велькавіч (гл. артыкул «Іх выклікаў час»).

БОЛДЗІН Іван Васілевіч. Савецкі ваеначальнік, генерал-палкоўнік (1944), удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Нарадзіўся 15.8. 1892 г. у в. Высоцкая Інсарскага раёна Мардовіі. З 1914 г. у арміі, удзельнік першай сусветнай вайны, ст. унтэр-афіцэр. У 1917 г. член палкавога і дывізіённага камітэта. У 1919 г. добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную Армію. Закончыў курсы «Стрэл» (1923), курсы ўдасканалення вышэйшага начсаставу пры Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзе (1926 і 1930), Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе (1936). У час грамадзянскай вайны камандаваў ротай, батальёнам, палком на Заходнім фронце. Пасля вайны камандзір палка, дывізіі, стралковага корпуса. З 1938 г. камандуючы войскамі Калінінскай ваеннай акругі. У 1939 г. узначальваў конна-механізаваную групу, якая ўдзельнічала ў паходзе ў Заходнюю Беларусь. З кастрычніка 1939 г. камандуючы войскамі Адэскага, з чэрвеня 1940 г. нам. камандуючага войскамі Заходняй асобнай ваеннай акругі. У пачатку Айчыннай вайны праявіў арганізатарскія здольнасці і мужнасць: узначаліў групу войск, адрэзаную ад асноўных сіл Заходняга фронту, у выключна складанай абстаноўцы паспяхова вывеў яе з акружэння. З лістапада 1941 г. камандаваў 50-й арміяй, якая абараняла Тулу, удзельнічала ў баях пад Калугай, контрнаступленні пад Масквой, Курскай бітве. У час вызвалення Бела-

І. В. Болдзін.

А. М. Гаспадарык.

М. Ф. Дзмітрыева.

русі часці арміі фарсіравалі Проню, Днепр, Бярэзіну, вызвалялі Чавусы, Магілёў, Гродна, ліквідавалі ворага ў мінскім «катле», удзельнічалі ў вызваленні Польшчы, ва Усходне-Прускай аперацыі. З красавіка 1945 г. нам. камандуючага 3-м Украінскім фронтам. Пасля вайны камандаваў арміяй, войскамі Сібірскай ваеннай акругі, быў першым нам. камандуючага войскамі Кіеўскай ваеннай акругі. З мая 1958 г. у Групе генеральных інспектараў Міністэрства абароны СССР. Памёр 28.3. 1965 г. Імя І. В. Болдзіна носяць вуліцы ў гарадах Быхаў, Гродна, Клімавічы, г. п. Хоцімску.

ГАСПАДАРЫК Аляксандр Максімавіч. Адзін з арганізатараў партызанскай барацьбы ў Чэрыкаўскім раёне ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Нарадзіўся ў 1889 г. у в. Студзенка Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Удзельнік першай сусветнай вайны з 1914 г. У перыяд Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. выбран членам дывізіённага салдацкага камітэта. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на партыйнай і гаспадарчай рабоце ў Барысаўскім, Бягомльскім і Чэрыкаўскім раёнах. Дэлегат І Усебеларускага з'езда Саветаў (1919). Напярэдадні Айчыннай вайны інструктар Чэрыкаўскага райкама КП(б)Б. Пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі падпольнай работы і партызанскага руху. З ліпеня 1941 г. член Чэрыкаўскага падпольнага райкама КП(б)Б. Схоплены фашыстамі і ў лютым 1942 г. расстраляны.

ДЗМІТРЫЕВА Марыя Фёдараўна. Савецкая лётчыца-выпрабавальніца. Нарадзілася 12.3. 1907 г. у Чэрыкаве. У 1928 г. па пуцёўцы райкама камсамола накіравана ў Харкаўскую лётную школу. З 1931 г. працавала слесарам на авіяцыйным заводзе пры Цэнтральным аэрагідрадынамічным інстытуце М. Е. Жукоўскага (ЦАГІ), адначасова вучылася на завочным аддзяленні Ваенна-паветранай інжынернай акадэміі ім. М. Е. Жукоўскага. Прымала ўдзел у стварэнні першынца савецкай грамадскай авіяцыі пасажырскага самалёта «Максім Горкі». У 1934 г. выбрана дэпутатам Массавета, сакратаром партячэйкі ЦАГІ. Загінула 18.5.1935 г. у час трэніровачнага палёта на самалёце «Максім Горкі».

АБ УВЕКАВЕЧАННІ ПАМЯЦІ ДЗМІТРЫЕВАЙ М. Ф., ЗАГІНУЎШАЙ ПРЫ КАТАСТРОФЕ САМАЛЁТА «МАКСІМ ГОРКІ»

Пастанова прэзідыума Чэрыкаўскага РВК ад 22.V.1935 г.

Задаволіць хадайніцтва партыйных і прафсаюзных арганізацый горада Чэрыкава аб перайменаванні былой Завальнай вуліцы ў вуліцу імя Дзмітрыевай.

Старшыня РВК Ратайка

Сакратар РВК Трафімаў

З пісьма Марусі Дзмітрыевай сваім братам і маці.

«Заўтра Першае Мая — свята працоўных. У вас, мабыць, ужо заканчваецца сяўба, а мы выконваем вытворчую праграму, рыхтуемся да 1-га Мая і заўтра горда і радасна прадэманструем свае дасягненні. Мне пашчасціла бачыць адно з велізарнейшых дасягненняў будоўлі працоўных — метрапалітэн. Ах, якая прыгажосць! Я прабыла там гадзіну і абсалютна не адчувала, што я пад зямлёй — усё так выдатна зроблена».

КАВАЛЁЎ Піліп Іванавіч. Удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Гомельскай і Магілёўскай абласцей у гады Вялікай Айчыннай вайны (гл. артыкул «Зорны след»).

КУЧАРАВЫ Віктар Дзмітрыевіч. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. (гл. артыкул «Старшыня райвыканкама»).

ЛЕПЯШЫНСКІ Мадэст Мікалаевіч. Удзельнік рэвалюцыйнага руху, педагог. Нарадзіўся ў 1878 г. у в. Ліцвінавічы Кармянскага раёна Гомельскай вобл. Закончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (1900). У 1900—1906 гг. працаваў выкладчыкам на Гомельшчыне. Пасля заканчэння Пецярбургскага універсітэта (1911) выкладаў матэматыку ў Бярдзічаўскім рэальным вучылішчы. Удзельнік першай сусветнай вайны. За рэвалюцыйную агітацыю сярод салдат прыгаворан да смяротнай кары, заменена пажыццёвай катаргай. У час лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. вызвалены. У 1917—1918 гг. сакратар Кармянскага валаснога выканкама. З 1918 г. настаўнік матэматыкі, дырэктар Чэрыкаўскай гімназіі. У 1920 г. сумесна з М. І. Кернажыцкім арганізаваў у в. Лемень Чэрыкаўскага павета ўзорна-паказальную школу-камуну (з 1922 г. Леменская ўзорна-паказальная школа-камуна ім. У. І. Леніна), якую ўзначальваў да апошніх дзён жыцця (гл. артыкул «Школа-камуна»). У школе-камуне ярка раскрыўся яго педагагічны талент, шырока рэалізаваліся яго наватарскія педагагічныя ідэі аб злучэнні навучання з вытворчай працай, сістэме вучнёўскага самакіравання. Трагічна загінуў 29.9.1922 г. Імя М. М. Лепяшынскага было прысвоена піянерскай дружыне Чэрыкаўскай сярэдняй школы № 1, занесена ў Кнігу народнай славы раёна.

СЛЮНЬКІНА Надзея Андрэеўна. Удзельніца партызанскага руху на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Нарадзілася ў 1920 г. у Чэрыкаве. Працавала загадчыцай школьнага аддзела Чэрыкаўскага райкама камсамола, адначасова старшай піянерважатай Чэрыкаўскай сярэдняй школы, вяла вялікую работу па патрыятычнаму выхаванню моладзі. У перыяд акупацыі раёна нямецка-

Н. А. Слюнькіна.

В. П. Шчаўлікаў.

фашысцкімі захопнікамі актыўна ўключылася ў барацьбу супраць ворага. З ліпеня 1941 г. разведчыца 720-га партызанскага атрада. 10 кастрычніка 1941 г. гітлераўцы, высачыўшы базу атрада ва ўрочышчы Астоўскі Ручай (каля в. Манастырок), напалі на яе. Н. А. Слюнькіна загінула ў гэтым баі. Пахавана на месцы гібелі, дзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

ШЧАЎЛІКАЎ Васіль Піліпавіч. Удзельнік грамадзянскай вайны і партызанскага руху на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Нарадзіўся ў 1897 г. у в. Журавель Чэрыкаўскага раёна. У гады грамадзянскай вайны знаходзіўся ў складзе 1-й Коннай Арміі. У перыяд калектывізацыі старшыня калгаса на радзіме. Актыўна садзейнічаў устанаўленню новага жыцця на сяле. Напярэдадні Айчыннай вайны загадчык аддзела Чэрыкаўскага райкама КП(б)Б. З ліпеня 1941 г. член Чэрыкаўскага падпольнага райкама КП(б)Б, камандзір групы асобнага Чэрыкаўскага партызанскага атрада. Загінуў у баі ў снежні 1941 г. каля в. Драгунскія Хутары Чэрыкаўскага раёна. Пахаваны на радзіме, на магіле пастаўлен абеліск.

ШЧАРБІТАЎ Мікалай Дарафеевіч. Удзельнік барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады на Беларусі (гл. артыкул «Іх выклікаў час»).

Ганаровыя грамадзяне

ДЗЕРГАЧОЎ Андрэй Макаравіч. Нарадзіўся ў 1919 г. у в. Кулікава Слаўгарадскага раёна. Працаваў адказным сакратаром нарсуда і пракуратуры Слаўгарадскага раёна. З 1939 г. у радах Чырвонай Арміі, удзельнік Вялікай

А. М. Дзергачоў.



К. А. Маркава (Моськіна).

І. Ф. Мілехін.

І. Р. Прахарэнка.

П. П. Тарасенка.

Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі з 1946 г. загадчык аддзела, сакратар Горацкага РК КП(б)Б, у 1955—1959 гг.— другі сакратар Чэрыкаўскага РК КП(б)Б, 1959—1961 гг.—старшыня калгаса «Краіна Саветаў» Чэрыкаўскага раёна. Затым працаваў інспектарам раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі, сакратаром парткама саўгаса «Чэрыкаўскі», старшынёю Чэрыкаўскага РК народнага кантролю. У 1968—1976 гг. нам. старшыні Чэрыкаўскага райвыканкама. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна Чэрыкава прысвоена за вялікі ўклад у развіццё народнай гаспадаркі раёна.

ЛУКІН Васіль Аляксандравіч (гл. артыкул «Агонь вялі мінамётчыкі»).

МАКСІМЦАЎ Міхаіл Данілавіч (гл. артыкул «За горад на Сожы»).

МАРКАВА (МОСЬКІНА) Клаўдзія Аляксандраўна. Былы інструктар ЦК ЛКСМБ. У 1942—1943 гг. выконвала заданне ЦК ВЛКСМ і Цэнтральнага штаба партызанскага руху па арганізацыі камсамольскай работы ў акупіраваных раёнах. Званне ганаровага грамадзяніна г. Чэрыкава прысвоена за заслугі ў арганізацыі падпольнай камсамольскай работы на Чэрыкаўшчыне.

МІЛЕХІН Іван Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1917 г. у в. Алпеева Урыцкага раёна Арлоўскай вобласці. У радах Чырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1943 г. у якасці камандзіра батальёна 413-й стралковай дывізіі ўдзельнічаў у вызваленні Чэрыкава. Закончыў баявы шлях пад Варшавай. Пасля заканчэння Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзе ўдзельнічаў у разгроме імперыялістычнай Японіі. З 1971 г. палкоўнік запасу. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна Чэрыкава прысвоена за ўмелае кіраўніцтва воінскімі падраздзяленнямі пры вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ПРАХАРЭНКА Іван Рыгоравіч. Нарадзіўся ў 1919 г. у в. Сергуцінка Усурыйскага раёна Прыморскага краю. Працоўную дзейнасць пачаў з 1936 г. трактарыстам Суйфунскай МТС. У Чырвонай Арміі з 1940 г., удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З лістапада 1944 г. працаваў дырэктарам Казіміраўскай МТС Магілёўскага раёна, а ў 1956—1960 гг.— дырэктарам Чэрыкаўскай МТС, у 1960—1966 гг.— дырэктар саўгаса «Чэрыкаўскі». Перад выхадам на пенсію быў упраўляючым Чэрыкаўскім раённым аб'яднаннем «Сельгастэхніка». Мае дзяржаўныя ўзнагароды. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена за вялікі ўклад у развіццё сельскай гаспадаркі раёна. Памёр у 1986 г.

ТАРАСЕНКА Павел Паўлавіч. Нарадзіўся ў 1909 г. у в. Андэколава Горацкага раёна. Працаваць пачаў з 1925 г. батраком на кулацкай гаспадарцы. У 1929—1931 гг.— сакратар Асталопаўскага сельсавета Горацкага раёна. У 1931 г. прызваны ў рады Чырвонай Арміі. У 1933—1937 гг.— старшыня Парыненскага сельсавета Горацкага раёна, у 1937—1941 гг.— загадчык Горацкага райфо. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі да 1950 г. працаваў старшынёй Касцюковіцкага, а з 1950 г. па 1959 г. Чэрыкаўскага райвыканкама. У 1959 г. у ліку трыццацітысячнікаў накіраваны старшынёй у калгас «Прагрэс» Чэрыкаўскага раёна, які і ўзначальваў больш чым дзесяць год. З 1970 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна Чэрыкава прысвоена за вялікі ўклад у развіццё народнай гаспадаркі раёна.

ХРАМОВІЧ Георгій Антонавіч (гл. артыкул «Партызаны дзейнічалі»).

Родам з Чэрыкаўшчыны

АХІЕЗЕР Навум Ільіч. Вучоны ў галіне матэматыкі, член-кар. АН УССР (1934), лаўрэат прэміі імя П. Л. Чэбышава (1948). Нарадзіўся ў 1901 г. у Чэрыкаве, у сям'і ўрача. Па прапанове М. М. Лепяшынскага пасля заканчэння сярэдняй школы (1918) некаторы час выкладаў фізіку ў Леменскай школе-камуне. Матэматычныя дасягненні Н. І. Ахіезера датычацца да тэорый апраксімацыі, дыферэнцыяльных і інтэгральных апаратараў. Яму належаць выдатныя заслугі ў стварэнні Харкаўскай матэматычнай школы, ён быў бяззменным на працягу 25 год старшынёй Харкаўскага матэматычнага таварыства. Многія пакаленні студэнтаў Харкаўскага універсітэта з захапленнем слухалі лекцыі Н. І. Ахіезера, якія ўражвалі глыбінёй і арыгінальнасцю. За 1971—1980 гг. Н. І. Ахіезер напісаў шмат артыкулаў, надрукаваў 3-е выданне шырока вядомай манаграфіі ў двух тамах «Тэорыя лінейных аператараў у гільбертавай прасторы», падрыхтаваў 2-е выданне «Лекцый па варыянтнаму падлічванню». За перыяд творчай дзейнасці Н. І. Ахіезер надрукаваў 128 прац, шматлікія з якіх былі вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Памёр 3.6.1980 г.

БЛЕХМАН Эці Абрамаўна. Нарадзілася 7 жніўня 1904 г. у Чэрыкаве. Закончыла Леменскую школу-камуну ў 1923 г., праз год паступіла ў Ленінградскі дзяржаўны універсітэт на хімічны факультэт. Пасля заканчэння універсітэта працавала на Ягор'еўскай фарбавальна-аддзелачнай фабрыцы загадчыцай хімічнай лабараторыі.

З 1937 да 1942 г. працавала ў Цэнтральным навукова-даследчым інстытуце баваўняна-папяровай прамысловасці старшым хімікам. За вынаходніцтва «Спосаб вырабу незгараючай тканіны» ў 1942 г. Эці Абрамаўне было прысвоена званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР.

З 1943 да 1949 г. старшы інжынер Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута супрацьпажарнай абароны МУС СССР. Па прадстаўленню Міністэрства сельскагаспадарчага машынабудавання СССР атрымала аўтарскае пасведчанне на вынаходніцтва «Спосаб атрымання негаручых замяніцеляў лінолеума».

У 1949 г. паступіла ў мастацка-вытворчыя майстэрні аб'яднанай дырэкцыі Дзяржаўнага Акадэмічнага Вялікага тэатра і Крамлёўскага Палаца з'ездаў інжынерам-хімікам, потым працавала загадчыцай цэха вогнеахоўнага насычэння. Атрымала тры аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы. У 1961 г. абараніла дысертацыю на званне кандыдата тэхнічных навук.

ВАРОНЧАНКА Уладзімір Парфенавіч. Генерал-маёр танкавых войск. Нарадзіўся ў 1908 г. у Чэрыкаве. З 1917 г. па 1924 г. вучыўся ў Чэрыкаўскай школе другой ступені. У 1925—1926 гг.— чорнарабочы на Смаленскай біржы працы. У 1926—1927 гг.— паштальён у Кардзімаўскім аддзяленні сувязі Смаленскай вобласці. Восенню 1927 г. паступіў на вучобу ў ваенную школу імя ВЦВК, пасля сканчэння якой накіраваны ў артылерыю, а затым у танкавыя войскі.

Н. І. Ахіезер.

У. П. Варончанка.

Р. Д. Гарбутовіч.

А. Ц. Дыкаў.

Скончыў бронетанкавую акадэмію імя Маршала Савецкага Саюза Р. Я. Малінoўскага. У маі 1942 г. па асабістаму жаданню Варончанка накіраваны на фронт. Удзельнічаў у абароне Масквы. Закончыў вайну ў Берліне. У пасляваенны час займаў высокія камандныя пасады ў злучэннях Савецкай Арміі. За ўзорнае выкананне заданняў камандавання і праяўленыя пры гэтым мужнасць і адвагу Уладзімір Парфенавіч Варончанка ўзнагароджаны ордэнам Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Суворава і Кутузава, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, многімі медалямі, польскім ордэнам «Крыж храбрых». Памёр у 1971 г.

ГАРБУТОВІЧ Рыгор Данілавіч. Беларускі вучоны ў галіне торфараспрацовак, планавання паліўнай прамысловасці, кандыдат тэхнічных навук. Нарадзіўся 22.1.1909 г. у Чэрыкаве. Вучыўся ў Леменскай школе-камуне (1921—1924). З 1928 г. працаваў настаўнікам Хоцімскай сямігадовай школы. Пасля заканчэння Беларускага політэхнічнага інстытута (1935) быў накіраваны на адно з падмаскоўных торфапрадпрыемстваў. З 1936 г. намеснік галоўнага інжынера, а з 1937 г. галоўны інжынер торфапрадпрыемства «Пятроўскае», у 1939—1942 гг. намеснік галоўнага інжынера Свярдлоўскага торфатрэста, у 1942—1954 гг. галоўны інжынер торфапрадпрыемства «Манетнае». Р. Д. Гарбутовіч унёс шмат новага ў спосаб здабычы торфу, займаўся выпрабаваннем вопытных машын і механізмаў. У 1954 г. назначан галоўным інжынерам аднаго з самых буйнейшых торфапрадпрыемстваў краіны «Назія», размешчанага каля Ленінграда, дзе працягваў актыўную навукова-даследчую дзейнасць. У 1957—1964 гг. галоўны спецыяліст па паліву Дзяржплана БССР, затым намеснік дырэктара па навуковай рабоце інстытута торфу АН БССР. З 1970 г. вучоны сакратар навуковага савета АН БССР, а з 1973 г. і міжрэспубліканскага рэгіянальнага навуковага савета па праблеме «Навуковыя асновы вывучэння рацыянальнага выкарыстання і аховы прыродных рэсурсаў Палесся, басейнаў Прыпяці і Днястра». Р. Д. Гарбутовіч аўтар больш як 80 надрукаваных навуковых прац, мае сем аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтва, з'яўляўся членам рэдкалегіі бібліяграфічнага даведніка «Палессе». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі. З 1974 г. персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння.

ДЫКАЎ Аляксей Цярэнцьевіч. Нарадзіўся ў 1903 г. у Чэрыкаве. Пасля заканчэння Ленінградскай прамакадэміі імя І. В. Сталіна ў 1938 г. быў назначаны дырэктарам Ваенна-механічнага інстытута, затым пераведзены на такую ж пасаду ў МВТУ імя Баўмана. У 1955 г. атрымаў вучоную ступень кандыдата тэхнічных навук, затым доўгі час працаваў дацэнтам кафедры тэхналогіі матэрыялаў політэхнічнага інстытута імя М. І. Калініна. Сааўтар кнігі «Прагрэсіўны рэжучы інструмент у машынабудаўніцтве». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Памёр у 1977 г.

ЖЫРКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч. Беларускі мовазнавец, заслужаны дзеяч на-

вукі БССР (1951), кандыдат педагагічных навук (1944). Нарадзіўся 1.10. 1899 г. у в. Залесавічы Чэрыкаўскага павета. З сялян. Скончыў БДУ. Удзельнік грамадзянскай і Айчыннай войнаў. Працаваў настаўнікам, выкладчыкам у Магілёўскім педагагічным інстытуце (1933—1941), у БДУ (1943—1969), у 1953—1968 гг. — загадчык кафедры беларускай мовы. Аўтар падручнікаў для сярэдняй і васьмігадовай школ, прац па пытаннях беларускай літаратурнай мовы. Памёр 13.8.1984 г.

М. І. Жыркевіч.

В. Ф. Карамазаў.

КАРАМАЗАЎ Віктар Філімонавіч. Беларускі пісьменнік. Нарадзіўся 27.6. 1934 г. у Чэрыкаве. Маленства прайшло і тут, на беразе Сожа, і ў суседнім Крычаве, і на Волзе, у вёсцы Тургенева пад Ульянаўскам, куды закінуў 1941 г., вайна і бежанства. У 1958 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і стаў журналістам-газетчыкам. Першай газетаю была Чэрыкаўская раённа «Сацыялістычная перамога». Тут надрукаваны першыя нарысы і апавяданні. Потым — праца ў газетах «Магілёўская праўда», «Звязда», «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Полымя», на Беларускім тэлебачанні, літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў БССР. Першыя літаратурныя творы з'явіліся ў 1957 г. У 1968 выйшла першая кніга апавяданняў «Падранак». Побач з апавяданнямі ў кнігу ўвайшоў лірычны дзённік «Ліменскі сшытак», дзе аўтар упершыню прызнаўся чытачу ў сваёй любові да роднай Чэрыкаўшчыны, лясоў Ліменшчыны, яе людзей. Лірычныя інтанацыі, прадметна-рэчавая пластыка малюнка і вобраза, псіхалагічны аналіз героя твораў сталі адметнасцю і наступных кніг: «Па талым снезе», «Спіраль», «Дзень Барыса і Глеба», першай аповесці «Пагоннік». Мастацкі свет гэтых кніг — прырода, жыццё чалавека ў прыродзе, ісціны дабра і зла, іх вечнае процістаянне і асобая ўвага да свету дабрыні, любові, шчодрасці. Жыццё пісьменніка ў прыродзе асабліва поўна і глыбока выяўлена ў рамане «Пушча» (1979), дзе эпас зліўся з лірызмам, проза жыцця з яго паэзіяй. Чэрыкаўцы адразу пазналі ў рамане свае цудоўныя куточкі прыроды, сваіх людзей, якія сталі прататыпамі герояў рамана. У гэтым аўтар пазней і сам прызнаецца ў эсэ «Мая Лімень», у іншых публіцыстычных выступленнях. Працуючы над раманам, ён часта выступае з публіцыстычнымі артыкуламі ў абарону лесу, поля, рэк і азёр, супраць іх знішчэння, збяднення. З'яўляюцца яго эсэ «Векавое», кніга нарысаў «Вясёлка сярод зімы». Перажытае і перадуманае выліваецца і ў літаратурныя сцэнарыі для кінафільмаў. Па сцэнарыях Віктара Карамазава здымаюцца мастацкі тэлефільм «Зялёныя фрэгаты», дакументальныя стужкі. Пісьменнік шмат падарожнічае па Беларусі, краіне, свету. У жанры падарожжаў піша аповесць-эсэ «Глядзіце ў вочы лемуру» — пра жыццё і прыроду на астравах Індыйскага акіяна — Мадагаскары, Маўрыкіі, Сейшэлах, вялікі нарыс-эсэ «Мая Калева» — пра жыццё ў Карэліі. «Проста ўспомніў я цябе» — таксама эсэ-падарожжа, у цэнтры якога вобраз выдатнага беларускага паэта Аляксея Пысіна — на фоне сусветных падзей, жыцця аўтара эсэ ў Парыжы. Эсэістыка, новы і арыгінальны ў беларускай літаратуры жанр, адзін з любімых жанраў Віктара Карамазава. Свае лепшыя эсэ ён арганічна аб'ядноўвае ў кнізе «Проста ўспомніў я цябе» і ў 1990 г. становіцца лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Кастуся Каліноўскага. У гэты ж час пісьменнік працуе над творамі прозы. У друку з'яўляецца першая частка яго вялікага рамана «Бежанцы». Гэта ўжо 1941 г., вайна, лёс беларусаў, якіх войны, голад, рэпрэсіі гоняць з роднай зямлі, рассейваюць па свеце. У аснову твора кладзецца ўласны лёс пісьменніка, яго бацькоў, сваякоў,



А. А. Марачкін.

землякоў і тэма бежанства выходзіць за рамкі 1941 г., яна выносіць на старонкі рамана людскія лёсы стогадовай даўнасці, часоў прымусовай калектывізацыі і раскулачвання, сталінскіх турмаў і лагераў, нарэшце — бежанства з-пад чарнобыльскай смерці. І тут чытачы рамана зноў пазнаюць Чэрыкаўшчыну, яе дарогі, вёскі, лясы. Пісьменнік працягвае працаваць над раманам, а на свет з'яўляецца яго новая аповесць «Крыж на зямлі і поўня ў небе» пра мастака-жывапісца Бялыніцкага-Бірулю, які нарадзіўся на Магілёўшчыне і стаў сусветна вядомым пейзажыстам. Аповесць зноў у плане эсэ, лірычная і гістарычная, напісаная як бы дуэтам, у два галасы — Віктарам Карамазавым і самім Вітольдам Каэтанавічам, героем аповесці. Не забывае пісьменнік і апавяданне. З гэтага жанру ён пачынаў, з ім прыйшоў у літаратуру. І па-ранейшаму яго шануе. У самыя апошнія гады ім створаны апавяданні «Дзяльба кабанчыка», «Галапагосы», «Сцяпан, Дзіч і Цырля», «Жанчына ў чорным і Афган», «Маладзічок дэмакратыі», «Гарэла свечачка ў акне»... І сярод іх — «Супраць неба, на зямлі», у якім землякі пісьменніка зноў пазнаюць свой край, сваю вёску. Але ўжо вёску радыяцыйнай зоны. Жорстка скатаваную, пакрыўджаную, абяздоленую. Такую, якая яна сёння— у зоне чарнобыльскай бяды.

ЛЮБАН Ісак Ісакавіч. Беларускі і рускі кампазітар (гл. артыкул «Школа-камуна»).

МАЛЕВІЧ Яўген Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1910 г. у Чэрыкаве. У 1936 г. закончыў Кіеўскі стаматалагічны медыцынскі інстытут. У Вялікую Айчынную вайну служыў у шпіталях для параненых у сківіцу і твар. У пасляваенныя гады Яўген Сцяпанавіч прысвяціў сябе навукова-педагагічнай дзейнасці, а ў 1951 г. яго выбралі дацэнтам Днепрапятроўскага медыцынскага інстытута. Пасля абароны доктарскай дысертацыі (1959) яму было прысвоена вучонае званне прафесара. З 1963 г.— дэкан факультэта стаматалогіі і загадчык кафедры па гэтай спецыяльнасці. Памёр Я. С. Малевіч у 1973 г. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, шматлікімі медалямі.

МАРАЧКІН Аляксей Антонавіч. Беларускі жывапісец. Нарадзіўся 10.3. 1940 г. у в. Язёры Чэрыкаўскага раёна. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут у 1972 г. Удзельнік мастацкіх выставак з 1966 г. Працуе пераважна ў галіне станковага жывапісу ў жанрах партрэта, тэматычнай карціны, пейзажа, нацюрморта. Творчасці ўласціва пачуццё гістарызму, паэтычная асэнсаванасць падзей мінулага. Стварыў серыю партрэтаў выдатных дзеячаў гісторыі і культуры Беларусі: «Цётка» (А. Пашкевіч, 1976), «Пачатак. Ф. Скарына» (1978), «Я. Драздовіч» (1979), «М. Гусоўскі» і «Вераніка і Максім» (1981) і іншыя. Рамантычная і сімволіка-алегарычная трактоўка вобразаў і тонкае гучанне фарбаў вылучаюць тэматычныя карціны «Мара пра палёт» (1974), «Успамін аб маёй вёсцы» (1977), «Чаканне» (1979), партрэты і пейзажы мастака.

МАРТЫНАЎ В. А. Нарадзіўся 14.6. 1920 г. у Чэрыкаве. У 1938—1941 гг. вучыўся ў Ленінградскім інстытуце інжынераў воднага транспарту, затым па спецмабілізацыі быў накіраваны ў 2-е Ленінградскае Чырванасцяжнае артылерыйскае вучылішча. Прымаў удзел у баях на Паўночна-Заходнім фронце ў складзе 171-й ордэна Суворава Ідрыцка-Берлінскай стралковай дывізіі (1942—1943), быў цяжка паранены. Пасля шпіталя вярнуўся ў Ленінград і працаваў выкладчыкам кафедры Ваенна-марской падрыхтоўкі ў інстытутах воднага транспарту, ваенна-механічным. Але яго асноўная навукова-педагагічная дзейнасць звязана з Ленінградскім механічным інстытутам, дзе ён прайшоў шлях

ад асістэнта да загадчыка спецыяльнай кафедры. У 1972 г. В. А. Мартынаву была прысвоена вучоная ступень доктара тэхнічных навук, затым (1974) вучонае званне прафесара. Мае 44 навуковыя працы, 25 вынаходніцтваў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі, а таксама знакам «Вынаходнік СССР».

ПАСТРЭВІЧ Аляксандр Іванавіч. Нарадзіўся 1.9.1897 г. у Чэрыкаве. Удзельнік грамадзянскай вайны, генерал-маёр (1940). З 1917 г. у Чырвонай гвардыі, потым у Чырвонай Арміі на Усходнім, Паўднёвым і Паўночным франтах — камандзір роты, батальёна, палка. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У Айчынную вайну з 1941 г. на Паўднёвым, Заходнім, Сталінградскім, Данскім і 3-м Беларускім франтах — камандзір стралковай дывізіі, паветрана-дэсантнага корпуса. Скончыў паскораны курс Ваеннай акадэміі Генеральнага штаба (1944). Пасля вайны на адказных пасадах у Савецкай Арміі. З 1952 г. пайшоў у запас. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 іншымі ордэнамі.

ПАПЧАНКА Міхаіл Данілавіч. Ваенны дзеяч, генерал-маёр. Нарадзіўся 1.10.1901 г. у в. Гойкаў Чэрыкаўскага раёна ў сям'і беднага селяніна. Скончыў чатырохкласнае земскае вучылішча, а затым двухкласнае вучылішча Міністэрства народнай асветы. З ранняга дзяцінства ў летнія месяцы працаваў па найму ў памешчыка. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі сям'я атрымала зямлю, быў на сваёй гаспадарцы. У чэрвені 1920 г. прызвалі ў РККА. Удзельнічаў у вайне з белапалякамі. У ліку лепшых чырвонаармейцаў у снежні 1920 г. быў накіраваны на вучобу на 31-я Смаленскія курсы чырвоных камандзіраў. Скончыў іх у верасні 1921 г. Да лютага 1930 г. займаў камандныя пасады ў часцях Ленінградскай пагранічнай акругі. Пасля яе заканчэння ў маі 1940 г. яму было прысвоена воінскае званне палкоўніка. Са снежня 1937 г. па жнівень 1940 г. займаў пасаду камандзіра 2-га мотастралковага палка Асобнай мотастралковай дывізіі асобага назначэння, які ахоўваў важнейшыя аб'екты сталіцы. У чэрвені 1940 г. Папчанку перавялі ў Ленінград на пасаду камандзіра 13-га мотастралковага палка войск НКУС, які нёс адказнасць за аб'екты дзяржаўнага

У. А. Мартынаў.

М. Д. Папчанка.

прызначэння. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, полк быў разгорнуты ў 21-ю мотастралковую дывізію войск НКУС (у далейшым 199-я стралковая дывізія), якая змагалася на паўночным захадзе (Парасазерскі кірунак) і на паўднёвым захадзе (Лужскі абаронны рубеж) ад Ленінграда. У верасні 1941 г. дывізія заняла абарону і затрымала праціўніка каля сцен Ленінграда, пад Урыцкам, у напрамку галоўнага ўдару фашысцкіх войск. У чэрвені 1942 г. М. Д. Папчанка фарміруе ў Кранштаце з асабовага саставу Балтыйскага флота 56-ю асобную стралковую брыгаду, якая да студзеня 1943 г. займала абарону на Араніенбаўмскім плацдарме, у лютым змагалася на Іванаўскім пятачку і фарсіравала Няву каля Іванаўскіх парогаў, у сакавіку ўдзельнічала ў Краснаборскай наступальнай аперацыі. У красавіку на базе трох асобных стралковых брыгад (56 , 102 і 138-й) была сфарміравана 124-я стралковая дывізія. У першыя месяцы Міхаіл Данілавіч быў намеснікам камандзіра, а з ліпеня 1943 г. і да самага канца вайны — камандзірам дывізіі. Пад яго камандаваннем дывізія прымала ўдзел у многіх значных аперацыях Ленінградскага фронту: у наступальных баях на Сінявінскіх балотах (жнівень 1943), пасля заканчэння якіх заняла абарону на левым беразе Нявы; у наступленні і вызваленні Мгі і іншых населеных пунктаў. У выніку гэтага стала называцца «Мгінскай» і была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга (студзень 1944). Удзельнічала ў наступальных, а затым у цяжкіх абаронных баях на плацдарме паўднёва-заходняй Нарвы (сакавік — красавік 1944), у дэсантных

аперацыях на астравах Выбаргскага заліва (чэрвень 1944). У верасні 1944 г. М. Д. Папчанку прысвоілі воінскае званне генерал-маёра, 124-ю дывізію перакінулі ў Беларусь. У лістападзе яна ўвайшла ў склад 39-й арміі (3-ці Беларускі фронт) і была перадыслацыравана ва Усходнюю Прусію. Дывізія ўдзельнічала ў прарыве абароны праціўніка, прайшоўшы з баямі ад Пількаплена праз Меляукен да прадмесцяў Кёнігсберга (студзень 1945), займала абарону на Земландскім паўвостраве (люты — сакавік), удзельнічала ў пераможным штурме фашысцкай цытадэлі (красавік 1945). У маі — чэрвені 1945 г. 124-я дывізія разам з усёй 39-й арміяй была перакінута ў Манголію. Калі закончылася вайна супраць японскіх мілітарыстаў на Далёкім Усходзе, дывізія была выведзена ў раён ст. Даурыя і расфарміравана, а М. Д. Папчанка накіраваны на Вышэйшыя акадэмічныя курсы акадэміі Генеральнага штаба. Закончыў іх у студзені 1947 г. і быў прызначаны камандзірам праслаўленай 8-й гвардзейскай стралковай дывізіі імя генерала Панфілава, а ў жніўні 1949 г.— камандзірам 12-га горнастралковага корпуса. У кастрычніку 1950 г. накіраваны ваенным саветнікам у КНР. У ліпені 1956 г. вяртаецца на Радзіму, а ў лістападзе таго ж года выходзіць у запас па стану здароўя. Памёр 24.12.1970 г. Ратная праца генерал-маёра М. Д. Папчанкі адзначана ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Суворава II ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі і многімі медалямі.

СЕРЫКАЎ Іван Арцёмавіч. Беларускі балетмайстар, дзеяч самадзейнага мастацтва, заслужаны дзеяч культуры БССР (1968). Нарадзіўся 2.7.1919 г. у в. Наркі Чэрыкаўскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1945—1961 гг. балетмайстар ансамбля песні і танца Беларускай ваеннай акругі, кіраўнік Віцебскага народнага ансамбля песні і танца «Маладосць» (з 1961), які дасягнуў пад яго кіраўніцтвам значнага выканальніцкага майстэрства. За гады працы з ансамблем падрыхтаваў 35 канцэртных праграм. Ставіў танцы ў вядучых прафесіянальных калектывах рэспублікі. Сярод лепшых пастановак: вакальна-харэаграфічная кампазіцыя «На

Р. Ц. Сівакоў.

зямлі беларускай», карагод «Вяночкі», танец «Дударыкі» ў Дзяржаўным акадэмічным народным хоры БССР, танцы «Груздаўская полька» і «Маталіха» ў Дзяржаўным ансамблі танца БССР, танцы «Межаўская кадрыля», «Прыдзвінскія закаблукі», карагод «Ой у полі пры даліне», песні «Жніўная», «Вясельная», «Лянівая жонка», вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі «Беларуская вяснянка», «Гульні і скокі ў Прыдзвінні» ў ансамблі «Маладосць». Выязджаў з калектывам у іншыя краіны.

СІВАКОЎ Рыгор Ціханавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. у в. Рагаліна Чэрыкаўскага раёна ў сялянская сям'і. Працоўную дзейнасць пачаў з 1939 г. у якасці настаўніка пачатковай школы ў в. Рэчыца. У ліпені 1941 г. добраахвотнікам пайшоў на фронт. Вялікую Айчынную вайну пачаў салдатам, закончыў камандзірам артылерыйскай батарэі. За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля дэмабілізацыі з радоў Савецкай Арміі ў 1946 г. працаваў інструктарам Чэрыкаўскага РК КПБ. Закончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б, працаваў у органах дзяржаўнай бяспекі рэспублікі, затым дырэктарам сярэдняй школы. Некаторы час узначальваў Мінскі гарадскі аддзел народнай адукацыі. З 1962 г. па 1975 г. Р. Ц. Сівакоў працаваў дырэктарам сярэдняй школы № 65 г. Мінска. Адначасова займаўся навукова-педагагічнай дзейнасцю. У 1975 г. абараніў кандыдацкую дысертацыюі і атрымаў званне кандыдата педагагічных навук. У апошнія гады жыцця працаваў у Мінскім педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага. З'яўляецца аўтарам навуковых прац па

ваенна-патрыятычнаму выхаванню маладога пакалення. За вялікія заслугі на педагагічнай ніве быў адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі. Яму прысвоена званне «Выдатнік народнай асветы БССР». Памёр у 1986 г.

СІЎЦОЎ Іван Кузьміч. Беларускі пісьменнік. Нарадзіўся 27.12.1922 г. у в. Бакунавічы Чэрыкаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Чэрыкаўскай сярэдняй школы паступіў у Ленінградскае авіятэхнічнае вучылішча. У час Вялікай Айчыннай вайны — авіямеханік. У сувязі з цяжкай хваробай у 1944 г. дэмабілізаваны. Два гады працаваў у Чэрыкаўскім райкаме партыі. У 1948 г. скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б) Беларусі. Працаваў у Магілёўскім абкаме партыі інструктарам, загадчыкам сектара друку (1948—1950), у рэдакцыях часопісаў «Бярозка» (1950—1952), «Беларусь» (з 1952). Некалькі вершаў змясціў у франтавым друку. Аўтар аповесці для дзяцей «Самыя юныя» (1949), рамана «Нягоды і радасці» (1960). Памёр 9.11.1959 г.

СТАРАВОЙТАЎ Іван Мацвеевіч. Беларускі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі, доктар медыцынскіх навук (1958), прафесар (1966), заслужаны дзеяч навукі БССР (1966). Нарадзіўся 25.5.1903 г. у в. Горкі Чэрыкаўскага раёна. З сялян. У 1929 г. скончыў БДУ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1937 г. на кафедры акушэрства і гінекалогіі Мінскага медыцынскага інстытута. З 1958 г. загадчык кафедры. Асноўныя навуковыя работы датычацца пытанняў прафілактыкі пупочнага сепсісу нованароджаных, родаў пры папярочным размяшчэнні плода, прафілактыкі і лячэння пасляродавых хвароб, лячэння гнойных запаленняў прыдаткаў маткі, арганізацыі акушэрска-гінекалагічнай дапамогі ў рэспубліцы. Узнагароджаны двума ордэнамі, медалямі. На пенсіі з 1976 г.

У свой час «Медыцынская газета» ў артыкуле «Старавойтавы» пісала пра дынастыю ўрачоў. Справа ў тым, што не толькі жонка І. М. Старавойтава працавала медыкам, але дзеці і ўнучкі пайшлі па іх слядах.

ЯГОРАЎ Уладзімір Дзям'янавіч. Генерал-палкоўнік, міністр унутраных спраў Беларусі (1990—94). Нарадзіўся

І. К. Сіўцоў.

І. М. Старавойтаў.

У. Дз. Ягораў.

7.11.1939 г. у в. Рэчыца Чэрыкаўскага раёна. У 1958 г. закончыў Магілёўскае культурна-асветнае вучылішча імя Н. К. Крупскай і працаваў дырэктарам Чэрыкаўскага раённага Дома культуры. З 1958 г. па 1962 г.— служыў у радах Савецкай Арміі. У 1967 г. Уладзімір Дзям'янавіч закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут. Выбіраўся сакратаром Магілёўскіх гаркама і абкама камсамола, старшынёй Камітэта маладзёжных арганізацый рэспублікі, сакратаром ЦК камсамола Беларусі. Пасля заканчэння Вышэйшай школы КДБ СССР (1979) працаваў у КДБ у Мінску. У 1981 г. быў назначаны начальнікам УУС Брэсцкага аблвыканкама, потым першым намеснікам міністра ўнутраных спраў Беларусі. З 1985 г.— міністр унутраных спраў Латвіі; пасля працаваў кіраўніком Прадстаўніцтва МУС СССР у Афганістане, начальнікам Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце МУС СССР. У 1990 г. Вярхоўным Саветам рэспублікі прызначаны міністрам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь. У. Д. Ягораў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і ме-

А. С. Яскевіч.

далямі, мае ўзнагароды Рэспублікі Афганістан.

ЯСКЕВІЧ Алесь (Аляксандр) Сямёнавіч. Беларускі літаратуразнавец, крытык, кандыдат філалагічных навук (1965), член Саюза пісьменнікаў. Нарадзіўся 12.6.1934 г. у в. Ушакі Чэрыкаўскага раёна. Скончыў БДУ у 1958 г. У 1958—1960 гг. журналіст. З 1964 г. навуковы супрацоўнік інстытута літаратуры АН БССР. Друкуецца з 1958 г. Аўтар манаграфіі і літаратурна-крытычных кніг «Карані маладога дрэва» (1967), «Ад слова — да вобраза» (1968), «Грані майстэрства» (1974), «У свеце мастацкага твора» (1977), «Выхад за круг» (1986), «Станаўленне беларускай мастацкай традыцыі» (1987). Адзін з аўтараў даследаванняў «Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы» (1972), «Пытанні паэтыкі» (1974), «Нараджэнне новага мастацтва» (1980), «Рытмічная арганізацыя мастацкага тэксту» (1991). Даследуе мастацка-філасофскі аспект творчасці беларускіх пісьменнікаў, сувязі фальклору і літаратуры, праблемы творчага метаду, мастацкага перакладу, вывучае структуру мастацкага вобраза, рытм прозы і верша.

ЯЎМЕНАЎ Леанід Фёдаравіч. Беларускі паэт, доктар філасофскіх навук (1977), чл.-кар. АН БССР (1991). Нарадзіўся 22.7.1932 г. у Чэрыкаве. У 1955 г. скончыў БДУ, затым Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1962). У 1954—1958 гг. сакратар Мінскага гаркама ЛКСМБ, з 1970 г. у апараце ЦК КПБ, з 1971 г. у Сакратарыяце ЮНЕСКО ў Парыжы, з 1974 г. загадчык кафедры БДУ, у 1982 г. загадчык аддзела навукі, інфармацыі па грамадскіх навуках АН БССР. У 1986—1988 гг. пастаянны прадстаўнік Беларусі ў Камісіі па правах чалавека ААН. З 1987 г. старшыня гэтай камісіі. Друкавацца пачаў з 1949 г. Зборнік вершаў «Чужая планета» (1980) напісаны пад уражаннем знаходжання паэта ў Канадзе і Францыі. У ім пераклікаюцца пачуцці павагі да іншых народаў і краін з пачуццямі любові да Радзімы. У зборніку «Блізкія далі» (1983) піша пра харство прыроды, праблемы яе зберажэння, апявае маральную веліч чалавека працы. З'яўляецца перакладчыкам сучаснай французскай і франкамоўнай паэзіі.

Воіны Савецкай Арміі — ураджэнцы Чэрыкаўшчыны, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку

МАСЛЯНКОЎ Віталь Леанідавіч. Нарадзіўся 16.3.1962 г. у в. Глінь Чэрыкаўскага раёна. Беларус. У 1979 г. скончыў Глінскую сярэднюю школу. Працаваў у Магілёве на заводзе «Строммашына». У 1981 г. прызваны ў Савецкую Армію Магілёўскім РВК, скончыў ваеннае вучылішча. Служыў у Афганістане. Старшы лейтэнант лётчык-штурман В. Л. Маслянкоў загінуў 27.4.1985 г. Пахаваны ў в. Глінь.

ПАЛЯКОЎ Аляксандр Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1963 г. у в. Верамейкі Чэрыкаўскага раёна. Беларус. У 1978 г. скончыў 8 класаў сярэдняй школы № 32 г. Магілёва, у 1981 г.— Магілёўскае ПТВ № 33 металістаў. У кастрычніку 1981 г. прызваны ў Савецкую Армію Магілёўскім ГВК. Служыў у Афганістане. Сяржант А. М. Палякоў загінуў у баі 6.9.1983 г. Пахаваны ў Магілёве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу».

ПРУДНІКАЎ Пётр Міхайлавіч. Нарадзіўся 23.1.1955 г. у в. Вепрын Чэрыкаўскага раёна. Беларус. У 1971 г. скончыў 8 класаў Вепрынскай сярэдняй школы, у 1975 г.— Мінскі політэхнічны тэхнікум. У 1975 г. прызваны ў Савецкую Армію Мінскім РВК. Пасля тэрміновай службы звязаў свой лёс з арміяй, скончыў курсы прапаршчыкаў. З 1980 г.

служыў у Афганістане. Прапаршчык П. М. Пруднікаў загінуў 3.5.1981 г. Пахаваны ў в. Вепрын. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьма камандавання часці бацькам П. М. Пруднікава

Рады сообщить, что Ваш сын Пётр честно и добросовестно выполняет свой воинский долг перед нашей великой социалистической Родиной. Находясь за рубежом родной страны, он с гордостью носит звание гражданина страны Советов. За короткий срок успешно овладел сложной воинской специальностью, проявляет высокую дисциплинированность, оказывает помощь молодым воинам в их нелегком ратном труде во имя мира на земле.

Выражаем Вам большое командирское спасибо за хорошее воспитание сына, за то, что Вы привили ему лучшие качества нашего советского человека...

С уважением командир Маяков.

З пісьма П. М. Пруднікава родным

Решил написать вам еще одно письмо. У вас там что-то, по-видимому, случилось. Ты ведь обещала писать в неделю одно письмо. А уже вот которую неделю ничего нету. Но я тебя не упрекаю, что ты не пишешь. Я знаю, тебе очень тяжело сейчас. Посевная началась. Да? Работы невпроворот, помощь нужна, да некому помочь. Все разъехались, разлетелись по разным концам земли. Вася, Нина и Таня хоть изредка да помогают чем-нибудь. А от меня еще никакой отдачи не было. Вот вырастили помощника. Да? Но я обещаю, что вот здесь закончу службу, перееду в Союз служить, а потом все отработаю.

О себе что писать? Все идет нормально. Пока не болею. В прошлом письме я писал, что поедем в другую провинцию. Уже съездили и вернулись обратно в свой лагерь. Здесь у нас баня есть своя. Построили из камней и глины. Даже с парилкой и душем. Вот где благодать. Здесь ведь «афганец» как задует, так пыли везде слой в два пальца. А дует он каждый день. Обычно во время обеда и после. Если не успели пообедать до того, как он задует — значит, уже не пообедаешь. В бане приходится мыться каждый день.

Вчера была пасха. Помню, как мы ходили за яйцами к крестному... Порой вспоминается дом, деревня. А иногда вспоминаются годы учебы. За те 3,5 года я чертнул жизни больше, чем за годы учебы в школе... А часто вспоминается Польша. И тянет туда, обратно в эту Польшу. Зачем — не знаю. Ведь с ней у меня связано многое. И становление на самостоятельную жизнь (хотя самостоятельно начал жить еще после восьми классов), и свадьба моя, и все остальное, чего не опишешь... Но я надеюсь и уверен, что все будет нормально, и у нас появится третий семьянин, а у тебя, мать, еще один внук или внучка.

В. Л. Маслянкоў.

А. М. Палякоў.

П. М. Пруднікаў.

Вот и все, что я хотел написать. Пиши, мать, как у тебя здоровье. Нина мне написала, что отец тоже себя неважнецки чувствует...

На этом заканчиваю. Поздравляю с майскими праздниками...

З пісьма камандавання часці жонцы П. М. Пруднікава

Здравствуйте, уважаемая Раиса Федоровна!

Сообщаем, Вам, что Ваш муж, Прудников Петр Михайлович, принимая участие в оказании интернациональной помощи ДРА, неоднократно проявлял образцы мужества и героизма. 3 мая 1981 года подразделение, в котором находился Петр, принимало участие в уничтожении крупной банды мятежников, засевшей в горах. Бой был жестоким. Бандиты не сдавались. Во время боя многие его товарищи были ранены. В одном из ущелий засели бандиты, они укрылись за скалами. Прапорщику Прудникову Петру Михайловичу была поставлена задача занять удобную позицию и уничтожить противника.

При занятии позиции во время перебежки выстрелом из ущелья он был убит.

В. Л. Судзянкоў.



А. М. Таратынка.

А. А. Фралоў.

Светлая память о Вашем муже, проявившем героизм и мужество, большую человеческую выдержку, навсегда останется в наших сердцах...

Командир войсковой части
Высоцкий

Заместитель командира по политической части
Лешев

СУДЗЯНКОЎ Васіль Лявонавіч. Нарадзіўся 1.1.1959 г. у в. Драгунскія Хутары Чэрыкаўскага раёна. Беларус. У 1974 г. Васіль скончыў Кажамякінскую васьмігадовую школу, у 1976 г.— Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча, у 1980 г.— Ленінградскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вучылішча. З 1983 г. служыў у Афганістане. Старшы лейтэнант В. Л. Судзянкоў загінуў 9.4.1985 г. Пахаваны ў в. Другунскія Хутары. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ТАРАТЫНКА Аляксандр Мікалаевіч. Нарадзіўся 6.2.1968 г. у в. Баравая Чэрыкаўскага раёна. Беларус. У 1982 г. Аляксандр скончыў 8 класаў Халмянскай сярэдняй школы, у 1984 г.— тэхнічнае вучылішча. Потым працаваў трактарыстам у саўгасе «Знамя» Чэрыкаўскага раёна. У 1986 г. прызваны ў Савецкую Армію Чэрыкаўскім РВК. Служыў у Афганістане. Радавы А. М. Таратынка загінуў 19.4.1987 г. Пахаваны ў в. Баравая. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьма А. М. Таратынкі родным

...Вот мы, наконец, вернулись на базу. Я от вас получил два письма. Очень обрадовался. Вы спрашиваете, почему я так долго не писал. Я вам еще раз объясняю. За меня не волнуйтесь, все будет хорошо. А письма не пишу потому, что на базе мы почти не находились. Я бы вам с удовольствием рассказал, что было за этих два месяца. Но это в письме невозможно. Вот я вам пишу, а через неделю мы снова уходим на операцию и тоже на длительное время. И все туда же. На пакистанскую границу.

Я вас прошу: за меня не волнуйтесь, а, наоборот, гордитесь, что вашему единственному сыну выпала такая доля — служить на этой проклятой афганской земле...

З пісьма камандавання часці бацькам А. М. Таратынкі

В период выполнения интернационального долга гвардии рядовой Таратынко Александр Николаевич проявил высокие морально-политические и боевые качества, преданность делу Коммунистической партии и социалистической Родине, выполняя боевое задание, верный военной присяге, проявлял стойкость и отвагу, высокую организованность и мужество.

19 апреля 1987 года гвардии рядовой Таратынко Александр Николаевич погиб, выполняя священный долг советского воина по оказанию помощи народу ДРА.

Подвиг Вашего сына будет ярким примером беззаветного служения нашей любимой Родине, Коммунистической партии и советскому народу. Память о Вашем сыне гвардии рядовом Таратынко Александре Николаевиче навсегда сохранится в сердцах его боевых товарищей...

Врио командира войсковой части
Токмаков

Заместитель командира по политчасти
Ямпольский

ФРАЛОЎ Анатоль Апанасавіч. Нарадзіўся ў 1945 г. у в. Гронаў Чэрыкаўскага раёна. Загінуў пры выкананні воінскага абавязку ў Чэхаславакіі ў 1968 г.

Пад чорным крылом Чарнобыля

Аварыя, якая здарылася 26 красавіка 1986 г. на Чарнобыльскай АЭС, абярнулася вялікай бядой для жыхароў Беларусі. На яе тэрыторыю атамны вулкан выкінуў звыш 70 працэнтаў радыяцыйнага попелу. Не абмінула чорнае крыло Чарнобыля і Чэрыкаўшчыну. Радыеактыўныя выкіды забрудзілі больш 30 вёсак раёна, у якіх пражывала 3966 чал., у тым ліку 339 дзяцей. У зону першачарговага адсялення аднесены вёскі Бакунавічы, Каменка, Малінаўка, Манастырок, Нова-Малінаўка, Чудзяны. У зоне наступнага адсялення апынуліся Бліжняя Рэчыца, Вепрын, Вохар, Дубраўка, Журавель, Зоры, Зябень, Каменка, Калюцін, Камаровічы, Кліны, Лісань, Пілёнка, Сцяпанаў, Таржоў, Ушакі, Халменка.

З землекарыстання выключана 10 тыс. га сельгасугоддзяў. У сувязі з гэтым скарацілася сельскагаспадарчая вытворчасць збожжа, бульбы, малака і мяса. Зменшылася таксама вытворчасць тавараў народнага ўжытку, бытавыя паслугі, істотна зменяцца і іншыя сферы дзейнасці.

Адным з драматычных бакоў гэтай катастрофы з'яўляецца тое, што ад людзей на працягу некалькіх гадоў утойвалі праўду аб яе маштабах і небяспецы. Кіруючых партыйных функцыянераў не вельмі хваляваў лёс людзей, іх будучыня. У першую чаргу яны імкнуліся захаваць аўтарытэт таталітарнай сістэмы. Таму і павялічыліся ў многа разоў людское гора і пакуты.

Перад мясцовай уладай паўстала шмат праблем. У снежні 1988 г. па патрабаванню дэлегацыі Чэрыкаўскага і яшчэ трох пацярпеўшых раёнаў урадам рэспублікі прынята пастанова «Аб неадкладных мерах па паскарэнню рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы па ліквідацыі ў Беларускай ССР вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС у частцы перасялення і пераўладкавання насельніцтва». На 1 студзеня 1991 г. у чыстыя зоны было пераселена 1259 сем'яў. Для жыхароў, якія падлягаюць першачарговаму адсяленню, выдзяляюцца кватэры ў розных населеных пунктах.

Адначасова прыкладваюцца намаганні на тое, каб стварыць нармальныя ўмовы пражывання ў зоне з дапушчальным узроўнем радыяцыі. Праводзіцца пашпартызацыя ўсіх падворкаў на ступень радыеактыўнага забруджвання, распрацавана спецыяльная сістэма кантролю за чыстатой прадуктаў харчавання, і не толькі за тымі, што вырабляюцца ў раёне, але і за тымі, што ўвозяцца. Праводзяцца рэкамендуемыя вучонымі мерапрыемствы, што маюць дачыненне да правільных рацыёнаў харчавання. Асаблівая ўвага ўдзяляецца дзецям. Аказваецца дапамога пацярпеўшым ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і замежнымі краінамі. Аднак час паказаў, што мер, якія прымаюцца ў раёне, яўна недастаткова і ажыццяўляюцца яны вельмі павольна.

Абстаноўка застаецца напружанай. У адпаведнасці з рашэннем Чэрыкаўскага раённага Савета народных дэпутатаў № 15—28 ад 23.5.91 г. даручана спецыялізаванай камандзе ГА вобласці пахаваць населеныя пункты раёна, з якіх адселены жыхары. Людзям цяжка прымірыцца з думкай, што вось так, назаўсёды, знікнуць з твару зямлі іх родныя вёскі. Усіх хвалюе адно балючае пытанне — як складзецца далейшы лёс зямлі іх продкаў, ці вернецца да яе жыватворная сіла і прыгажосць.

Аб тым, якія падзеі адбываліся ў раёне пасля чарнобыльскай аварыі, расказваецца ў наступнай падборцы матэрыялаў і дакументаў.

Як гэта адбывалася

Друкуецца са скарачэннем з «Магілёўскай праўды» за 23, 24 мая 1991 г. Артыкул меў назву «Адлік часу вядзе Чарнобыль».

Я не прэтэндую на ролю летапісца. Спадзяюся, што чарнобыльскае летазлічэнне знойдзе адлюстраванне ў кнігах, карцінах, песнях. Забыць сваю гісторыю — значыць, кінуць у небыццё не адно пакаленне. З Чарнобылем жыць вечна. Час ахрысціў і жыхароў Чэрыкаўшчыны «чарнобыльцамі». Ім, як і іншым пацярпеўшым ад атамнай катастрофы, не даставала праўдзівай інфармацыі, не бралася пад увагу, ігнаравалася такая цудоўная рыса людзей, як цярплівасць, жаданне выбрацца разам з бяды. У тыя памятныя красавіцкія, у святочныя майскія дні 1986-га дастаткова было даць людзям арыенціры, як лепш ахаваць сябе і дзяцей ад радыеактыўнага пылу, нябачнага ворага, аб якім ведалі толькі з расказаў аб Хірасіме і Нагасакі, з плакатаў ГА і ўспамінаў ваенных.

Чарнобыльскі летапіс пачаўся ўжо. Няхай яшчэ раз ажывуць у памяці асобныя перыяды жыцця «зоны», прамільгнуць лічбы, прозвішчы. Людзі разабраліся ўжо, хто дапамагаў і дапамагае ім у журботны час. Гісторыя раскладзе ўсё па паліцах, кожны факт набудзе свой сэнс. Удакладніць, папоўніць яе змогуць людзі «зоны», хто быў вымушаны зняцца, бы птушка, з роднага гнязда, у свет белы і каму прадстаіць жыць на зраненай зямлі, лячыць яе.

Інфармацыя аб аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі прыйшла ў Чэрыкаўскі раён з экранаў тэлевізараў. Паведамленне заняло некалькі хвілін. Гэта потым пачаліся шматгадзінныя спрэчкі, дыскусіі на розных узроўнях, у самых разнастайных аўдыторыях. Тады ж, у перадапошнія дні красавіка 1986-га, невялікі Чэрыкаў і яго сельскія населеныя пункты рыхтаваліся да першамайскіх свят: падчышчалі вуліцы, падфарбоўвалі парканы. Працавалі трактары на палетках, статкі жывёлы апробвалі першае вясновае зялёніва, нельга было дагукацца ў дом дзяцей, бо надвор'е шчадрыла такім духмяным водарам клейкай лістоты таполяў, бяроз, саладкавасцю вербалозаў.

А потым была і сама дэманстрацыя на цэнтральнай плошчы горада. І ніхто з нас не думаў, што інфармацыя з Чарнобыля праз гады абернецца і для нас словам «эвакуацыя».

Прапарцыянальна паступаючай з друку, радыё і тэлебачання інфармацыі аб выніках чарнобыльскай аварыі раслі рознага роду чуткі і домыслы. Чэрыкаўляне шчыра спачувалі тым чарнобыльцам, літаральна замуштроўвалі пытаннямі першых добраахвотнікаў з горада і раёна, хто адпраўляўся ў камандзіроўку ў Чарнобыль і яго «зону». Са страхам глядзелі, што будзе з гэтымі людзьмі. Не, дрэннага нічога пакуль што з імі не было. Аднак размовы, падмацаваныя фактамі мясцовага жыцця, рабілі сваю справу.

Першымі рэціраваліся з раёна некаторыя ўрачы, асобныя работнікі кіруючага звяна. Тады двум з «дзерціраў-камуністаў» быў прад'яўлены рахунак як «баязліўцам» у сувязі з вынікамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У простых людзей і ў 1986, і ў 1987 гадах яшчэ і ў думках не было, што тэрыторыя раёна ў «брудных радыеактыўных плямах». Ледзь-ледзь прасочваліся чуткі накшталт «адзін ваенны гаварыў, што дасталося ўсяму Прысожжу». З прыкрасцю канстатавалі, што і на гэты раз нашы начальнікі ды медыкі на вышыні неразваротлівасці, незразумелай палітыкі чакання. З-за адсутнасці аб'ектыўнай інфармацыі «супрацьрадыяцыйныя» парашкі

людзям пачалі выдаваць дзесьці ў канцы трэцяга тыдня пасля паведамлення аб аварыі на ЧАЭС. Парашкі фасаваліся і раздаваліся прыкладна з такой «дабаўкай» — дапамогуць яны цяпер, як хваробе кашаль. Але пад нагнятанне ўсеагульнага псіхозу лекі прымаліся. У спешным парадку рабіліся накрыўкі на калодзежы, і ў той жа час заставаліся адкрытымі шматлікія крыніцы. З мэтай прафілактыкі ў кабінеты, на рабочыя месцы прыносілі шчоткі, рэкамендавалі менш бываць на вуліцы, насіць галаўныя ўборы, абмежаваць гульні дзяцей на свежым паветры і інш. І ўсё гэта гаварылася са слоў, а не зыходзіла з ліставоў штабоў Грамадзянскай абароны.

Напружанне ўзрастала, хоць афіцыйнай інфармацыі аб стане раёна пасля чарнобыльскай аварыі не было. Першы выбух пачуццяў адбыўся, калі ў 1987 г. закрылі дзіцячы санаторый у Багданаўцы — здраўніцу рэспубліканскага значэння. Ужо да гэтага часу прасочвалася інфармацыя аб радыеактыўных «плямах». Сэнс слова «прафілактыка» страчваў першапачатковае значэнне. Многія сачылі за друкам, вылоўліваючы кожнае слова пра радыяцыю. З рук у рукі пераходзіў часопіс «Знание — сила» з артыкулам вучонага Д. М. Градзінскага, які выказваў пункт гледжання наконт выпадання радыеактыўных ападкаў і наступнага ўздзеяння радыенуклідаў на арганізм дарослых, і асабліва дзяцей. Але гэта было толькі ў 1988 г. (жнівень). Трактоўка публікацыі была самая разнастайная. Але галоўнае — біла ў самае сэрца: калі б усё было ў парадку, то не рабілі б даплату жыхарам 25 вёсак з 1986 г. (па 30 р. на кожнага пражываючага, плюс дадатковы харчовы паёк). Не панаехала б столькі вайсковых.

Дарэчы, з'яўленне ваенных машын на тэрыторыі раёна для дэзактывацыі выклікала ў першыя дні вялікую сумятню. Ужо ў той час рушыліся ўсе сумненні наконт сцвярджэння «нічога такога не здарылася». З усёй дакладнасцю мацнела ўпэўненасць «нас падманваюць». Прыязджаўшыя генерал Кунцэвіч і вучоны Волкаў у адкрытую гаварылі, што пражываць у раёне небяспечна, і асабліва ў Чудзянах, Малінаўцы, Вепрыне, Бакунавічах, Ушаках... Ва ўсіх 25 вёсках, якія пасля лютага 1989 г., на чацвёртым годзе пасля чарнобыльскай аварыі, нарэшце, рассакрэцілі. А да гэтага тэрміну ніхто толкам нічога не ведаў.

Да гэтага часу нарадзіўся і пачаў набываць абрысы гаротна ўваходзячы ў гісторыю пасёлак «Майскі». Нарэшце, з усесаюзнай трыбуны прагучалі словы «чыстая» і «брудная» прадукцыя, «дэзактывацыя» на тэрыторыі, далёкай ад Чарнобыля і 30-кіламетровай зоны. Наяўныя ў глебе радыенукліды засмечваюць расліны, а значыць, і корм для жывёлы. А значыць, малако і мяса ўтрымліваюць радыенуклідаў больш дапушчальнай нормы, і іх нельга ўжываць у ежу. Дзяржаграпром рэспублікі распрацаваў аператыўныя (а ці настолькі аператыўныя?) неабходныя рэкамендацыі па вядзенню жывёлагадоўлі і раслінаводства. У выніку першачарговых мерапрыемстваў — унясенне павышанай колькасці мінеральных угнаенняў, утрыманне жывёлы за некалькі месяцаў да забою на «чыстых» кармах, гэта значыць, паступіўшых з незасмечанай радыенуклідамі зоны... Вялікае значэнне ў той час надаецца правядзенню гідрамеліярацыйных мерапрыемстваў. Гэта ўсё дало магчымасць знізіць у 2,5 раза колькасць «бруднай» ялавічыны і малака. Дарэчы сказаць, у раёне менавіта за прайшоўшыя пасля чарнобыльскай аварыі гады ўпершыню з'явіліся даярка-чатырохтысячніца — Т. А. Цыбуля з калгаса «Бальшавік» — і 35

даярак-трохтысячніц. Гэта гаворыць пра тое, што людзі працавалі, а не панікавалі.

Ужо ў 1986—1989 гг. у раёне было заасфальтавана больш за 60 км унутрыгаспадарчых дарог, машынных двароў, тэрыторыі вакол дзіцячых садоў, жывёлагадоўчых ферм, пракладзена 70,6 км водаправода, асталявана 2 артэзіянскія шчыліны, узведзена 17 душавых і адна лазня. Здадзена ў красавіку 1989 г. пральня ў Чэрыкаве. Спецыялісты Мінскага трактарнага завода ўжо ў 1986 г. распрацавалі і вырабілі доследны ўзор герметызаванай кабіны. Трактары з імі паступілі ў раён у 1988 г., але — адзінкі.

«Вайна» радыяцыі, здаецца, была аб'яўлена па ўсіх напрамках. Толькі пройдуць доўгія, знясільваючыя душы людскія, гады, пакуль усвядоміцца бязмэтнасць угроханых мільённых сродкаў у «зону» на курс бяспечнага пражывання — шчыльнасць радыенуклідаў не пакідае гарантый на пражыванне. А мізэр кампетэнтнай інфармацыі рабіў нядобрую справу, павялічваючы стрэсы і нервознасць.

Вельмі дапамаглі ў гэтым плане і вучоныя. У 1987 г. цішком-маўчком на ферму калгаса «Кастрычнік» тытулаваныя медыкі з Бараўлян завезлі ў клетках партыю мышэй і пацукоў. Сярод мясцовых жыхароў прайшлі стрыманыя чуткі (так яно аказалася і на самой справе) — грызуны прывітыя клеткай ракавай пухліны.

У першы год пацукоў і мышэй пала нямнога, а вось на другі, трэці на іх напаў павальны мор. Прыязджаўшыя ў паўгода ці радзей мінскія спецыялісты толькі нешта занатоўвалі, забіралі выжыўшых асобін і прывозілі новых. На ўсе роспыты адказвалі, што ўсё як трэба, без адхіленняў, як і меркавалі.

Паддоследныя — гэта пераканне трывала засела ў свядомасці людзей, якія з вялікай небяспекай паглядвалі на падворак Пяргаевых, куды перабазіравалі клеткі з фермы. У адной вёсцы жылі лабараторныя пацукі і дзеці. Адсяленне «Кастрычніку» засвяціла толькі ў 1991 г., ясна вызначыўшы галоўнае: сваю бяду трэба адольваць уласнымі сіламі. Прысутнасць паддоследных пацукоў, раздадзеныя даяркам і механізатарам накапляльнікі радыенуклідаў — для эксперымента, ніякіх страховак для жыцця гэта не дае. На забруджаных тэрыторыях, якія не могуць даць чыстую прадукцыю, немагчыма жыць чалавеку.

Згодна з пастаўленымі Дашкаўскай доследнай станцыяй картамі, у 1986 г. павінны былі быць выключаны з севазвароту ў саўгасе «Сцяг» (найбольш забруджаная гаспадарка) 5 га ворыва (радыяцыйныя землі), 14 — сенажацяў, 17 — пашы. А ўжо ў 1989 г., згодна з больш правільнымі картамі, адпаведна па ўказаных паказчыках — 36496,287 га, плюс 50 га прысядзібных участкаў. Можна апрацоўваць толькі 1250 га. Спісаны амаль усе меліяраваныя землі. Калі прагледзець карты забруджанасці глебы 1989 г., то яны рэзка адрозніваюцца ад карт 1986 г. Ступень забруджанасці на апошніх указана вельмі нізкая. Дарэчы, падобныя карты, удакладненыя, даставерныя ў раёне з'явіліся толькі ў 1988 г., а да гэтага яны з'яўляліся сакрэтнымі і ляжалі пад замком у сейфах. Забруджанасць жа на некаторых участках у саўгасе «Сцяг» па цэзію-137 складала ад 100 да 1000 і больш кюры на квадратны кіламетр. Сярэдні паказчык — 146 кюры на квадратны кіламетр, як пачалі адзначаць у афіцыйных матэрыялах у 1989 г.

У 1987 г. быў выключаны з плана будаўніцтва комплекс на 3000 галоў адкорму буйной рагатай жывёлы і жылы пасёлак у саўгасе «Сцяг». Па мерках таго «перыяду» комплекс і

пасёлак траплялі ў «чыстую» зону гаспадаркі. Але ўсё ж аргументы былі і такімі: навошта будаваць, можа, людзей прыйдзецца высяляць? Ды ці атрымаецца «чыстае» мяса? Але саўгас, паводле даных 1987—1988 гг., даваў «чыстае» мяса. У красавіку 1988 г. з'явіліся канчатковае рашэнне, з грыфам аблвыканкама ў маі таго года: дазволіць будаўніцтва Майскага. Хоць і выказваліся сумненні наконт размяшчэння будучага комплексу ў «Сцягу» (прапаноўваліся пляцоўкі ля Гронава, у раёне эксперыментальнай базы «Чэрыкаў», саўгаса «Ударнік»), усё ж канчатковы варыянт застаўся за гэтай гаспадаркай.

Паралельна з абмеркаваннем пытання забруджанасці тэрыторыі радыенуклідамі ў 40 і больш кюры на квадратны кіламетр шырокім струменем хлынулі дыскусіі наконт малых доз апраменьвання, у прыватнасці, ад 5 і вышэй кюры. Пад такую «норму» трапляў і Чэрыкаў. Раён толькі паспяваў сустракаць камісію за камісіяй, адна аўтарытэтней за другую. Да мая 1988 г. прадстаўнікоў вышэйшых эшалонаў кіраўніцтва на Чэрыкаўшчыне не было. Найбольш «ураджайным» на самыя розныя камісіі, праверкі аказаўся 1989 г. Чым больш гаварылі члены ўрадавых камісій, тым больш пытанняў з'яўлялася ў людзей, і разам з тым не змяншалася пачуццё страху, няўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

З самага пачатку сур'ёзнай ацэнцы вынікаў радыяцыі і магчымым мерам процістаяння ёй перашкодзіла чахарда з так званымі «дапушчальнымі» нормамі радыяцыі — паказчыкамі, якія размяжоўваюць бяспеку ад небяспекі. Гэтыя паказчыкі скакалі ўжо на працягу амаль чатырох год. Напрыклад, у 1986 г. дапушчальнымі былі 70 бэр, потым — 50, 35. І ніхто не ўпэўнены ў тым, што і гэтыя 35 бэр не будуць зніжацца далей.

Не было ў людзей і дакладнага прадстаўлення наконт тэндэнцыі да зніжэння паказчыкаў забруджанасці глебы. А менавіта на гэтым базіруецца ўся праграма пражывання людзей на «забруджанай» тэрыторыі. Медыкі сцвярджалі: самае небяспечнае — гэта падвяргацца нямоцнай, але пастаяннай радыяцыі. Уплыў малых доз радыяцыі на арганізм згубны. Гэта, нарэшце, прызналі ў 1989 г. Значыць, трэба было нешта рабіць, каб дапамагчы людзям справіцца з бядой. Да прыняцця адзінай Дзяржаўнай праграмы ў вобласці пачалі распрацоўваць сваю.

А прадстаўнічыя людзі, члены групы экспертаў, адну з якіх узначальваў намеснік Старшыні Бюро Савета Міністраў СССР па паліўна-энергетычнаму комплексу В. В. Мар'ін, у гэты час праводзілі сустрэчу з актывам вобласці, на якой прысутнічалі і прадстаўнікі Чэрыкаўскага раёна, абвінавачвалі зноў людзей «зоны» ў панікёрстве. Вучоныя Інстытута біяфізікі, Міністэрства аховы здароўя СССР К. І. Гардзееў, А. М. Лягінская, начальнік аддзела Дзяржкамгідрамета СССР Н. К. Гасіліна зноў давалі гарантыі бяспечнага пражывання ў спрэчнай зоне.

Але веры не было. Бо верылі ж вучоным, што ў 1986 г. нічога не адбылося. Прафесар К. І. Гардзееў яшчэ ў 1986 г. гаварыў, што наступнай вясной усе будзе чыста. Але ж вясной і высветлілася: нельга піць малако, хадзіць у лес. Яшчэ тады вучоныя абяцалі далажыць абстаноўку ў Маскве, але далажылі ці не, гэта невядома. І на гэтай сустрэчы ўказвалася, што Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі Г. С. Таразевіч толькі праз тры гады пасля чарнобыльскай катастрофы, 18 красавіка 1989 г. пабываў у «зоне». Абяцаў разабрацца, але словы і справы павіслі ў паветры.

Ваяжы ў Чэрыкаў не спыняліся. У сакавіку 1989 г. у раёне працавала «высокая» кампетэнтная камісія вучоных, медыкаў на чале з намеснікам міністра аховы здароўя БССР В. С. Казаковым. У чарговы раз ускалыхнулася грамадскасць горада і раёна. Былі падрыхтаваны запіскі, у якіх людзі прасілі даць адказ на самыя надзённыя пытанні. Але і на гэты раз, на жаль, акрамя расплыўчатасці ды няпэўных абяцанняў, нічога сабе жыхары Чэрыкаўшчыны не атрымалі. Бы бомба, узарвалася інфармацыя наконт таго, што ў Чудзянах людзі набралі ўжо больш дваццаці бэр за прайшоўшыя пасля чарнобыльскай аварыі гады. Сказанае пра гэта з вуснаў такой кампетэнтнай камісіі павялічыла ступень нервовасці сярод жыхароў раёна. А галоўнае, і на гэты раз медыкі нічога талковага не прапаноўвалі, толькі канстатавалі ды прагназіравалі.

Хваля незадаволенасці ўзнікла і ад таго, што дзяцей з «зоны» аздараўлівалі ў асноўным у Чавусах, Магілёве. Аздараўленчы перыяд усяго 24 дні.

Як ні дзіўна было ў тую сустрэчу, члены прыехаўшай камісіі замест канкрэтных адказаў на пытанне пра дазіметры пачалі прыпалохваць прысутных у зале Чэрыкаўскага ДК цаной на іх. Выходзіла, што прыбор можна набыць за тры сотні. Але людзі былі згодны купіць дазіметр у складчыну, абы толькі толк быў.

Калі кранулі праблему харчовага забеспячэння, то паважаныя таварышы нічога лепшага не маглі прыдумаць, як назваць грэцкія крупы стратэгічным прадуктам.

Засталіся пытанні ў чэрыкаўлян такога парадку: чаму замоўчана аб тым, што ў комплексе мерапрыемстваў па ліквідацыі вынікаў катастрофы прадугледжана павышанае ўнясенне ў глебу мінеральных угнаенняў, а значыць, заведамае павышэнне ў прадуктах нітратаў і нітрытаў, чаму няма карт радыеактыўнай забруджанасці.

Адначасова з вучонымі-фізікамі, энергетыкамі ў раён зачасцілі, асабліва ў 1989 г., медыкі. У красавіку гэтага года ў горад і вёскі наведалася выязная брыгада медыцынскіх работнікаў Інстытута радыяцыйнай гематалогіі і пералівання крыві і Мінскага медінстытута. У той час жыхары Чэрыкаўшчыны, пры ўсім сваім жаданні і просьбах, не атрымалі ніякай інфармацыі, акрамя закалыхванняў. Толькі ў студзені 1990 г. з прыпіскай, што, нарэшце, дазволена медыкам рассакрэціць вынікі сваёй работы ў тагачасны перыяд, выявілася зусім несуцяшальная карціна. Медыкі тады абследавалі ў раёне 1600 дзяцей і падлеткаў і правялі ацэнку дынамікі здароўя па даных медыцынскай дакументацыі больш чым у 3500 дзяцей. Даныя трывожныя. Практычна здаровых дзяцей — 7—10 %. Расце колькасць дзяцей і падлеткаў з павелічэннем шчытападобнай залозы I і II ступеняў, вегетасасудзістымі дыстаніямі, анемічным сіндромам. Павялічылася група часта і доўга хварэючых дзяцей і дзяцей групы рызыкі па гіпатырэозу і запаленчых захворваннях шчытападобнай залозы, а таксама рэзка ўзрасла колькасць дзяцей з хранічным захворваннем насаглоткі.

Але ўсіх гэтых і іншых фактаў бацькі не ведалі ні ў час знаходжання камісіі, ні пасля яе ад'езду. Амаль год. Наўкола былі толькі адны «нельга»: нельга ў лес, на рэчку, есці ягады, грыбы... Першапачаткова дзяцей «зоны жорсткага кантролю» літаральна засадзілі ў «зону», зрабіўшы распарадак, прадугледжваючы знаходжанне школьніка ў памяшканні да дзесяці і больш гадзін. Маларухомасць у спалучэнні з вітамінным голадам і пастаяннымі размовамі аб радыяцыі рабілі сваю

справу. Загнаныя на асфальт і ў сцены будынка дзеці былі пазбаўлены прывычнай волі, у іх пачалі пагаршацца зрок, апетыт, псіхалагічны стан. Не лепшым чынам адчувалі сябе і дзеці гарадскіх школ, дашкольных устаноў. Дзеці хварэлі, нервавaліся бацькі, і цярпенню іх прыйшоў канец. У адчаі, у роспачы, у бяссіллі атрымаць праўдзівыя, зразумелыя адказы на прамыя пытанні жыхары горада, некаторых вёсак сабраліся на мітынг на цэнтральнай плошчы Чэрыкава 1 чэрвеня, у Міжнародны дзень абароны дзяцей.

Некаторыя кіраўнікі раённага звяна думалі, што прыйшоў канец свету, бо ў якія гэта вякі вось так «бунтавалі» жыхары глыбінкі? Завязалася перапалка паміж партыйнымі, савецкімі работнікамі, прадстаўнікамі медыцынскай службы і праваахоўных органаў. Не бачачы віноўнікаў са сталічных фірм, гнеў свой людзі абрушылі на сваіх кіраўнікоў. Тыя былі сапраўды ў ролі стрэлачнікаў. Першым у адкрыты шчыры дыялог з сабраўшыміся на плошчы ўступіў першы сакратар райкама партыі А. І. Князіў. У выніку некалькіх гадзін спрэчак, абмеркаванняў, зневажанняў стыхійна ўзнікла рашэнне: або едзем за праўдай у Маскву, дзе працаваў I з'езд народных дэпутатаў СССР, або арганізоўваем забастоўку. Вечарам 1 чэрвеня аўтобус з «прадстаўнікамі народа», якіх назвалі прама на мітынгу, выехаў у сталіцу.

Дзве ўзбуджаныя ночы, праведзеныя ў салоне аўтобуса на набярэжнай Масквы, кароткія размовы-сустрэчы ля гасцініцы «Масква» з народнымі дэпутатамі В. Я. Галаўнёвым, З. М. Ткачовай, Алесем Адамовічам, першым сакратаром ЦК КПБ Я. Я. Сакаловым, старшынёй БРК прафсаюзаў У. І. Ганчарыкам выліліся ў галоўнае для прыехаўшых — «вялікія і малыя бацькі нашы» нічога пераканаўчага не сказалі. Падобна гістарычным хадакам, пабываўшым у гасцях у Леніна, чацвёра прадстаўнікоў правінцыяльнай Чэрыкаўшчыны трапілі на прыём да Старшыні Савета Міністраў СССР М. І. Рыжкова. Менавіта гэтым чацвярым трэба было данесці да ведама людзей, апынуўшыхся ў радыеізатопных шчамках, што распрацоўваецца Дзяржаўная праграма (досыць пульхны талмуд, убачаны ў Саўміне) па ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС.

У прасторным саўмінаўскім кабінеце станоўча вырашылася пытанне са «стратэгічным» прадуктам, дадатковым харчовым пайком, фондамі дзіцячага харчавання.

У роўнядзь адкатаных прамоў высокіх асоб цяжка было прарвацца голасу правінцыялаў, якія хацелі раз і назаўсёды пачуць, як жыць, што рабіць на параненай зямлі, як ахаваць сябе, а галоўнае, дзяцей ад радыяцыі. Трохгадзінная нязладжаная музыка размовы закончылася высокім акордам — прапановай запрасіць і на чэрыкаўскую зямлю экспертаў міжнароднага класа.

Выдадзены талоны на харчаванне, завезены ў райпаліклініку «СІЧ» (лічыльнік імпульсаў чалавека), пуцёўкі на аздараўленне — усё гэта некалькі супыніла хвалю нервовасці.

Міністр аховы здароўя СССР Я. І. Чазаў абяцаў яшчэ раз праверыць усё. І як было не ўспомніць яго абяцанкі, калі ў адзін з сонечных чэрвеньскіх дзён на левым беразе Сожа апусціўся верталёт. Адпачываючыя дзеці і дарослыя таропка ўзнялі галовы, сціх прывычны гул галасоў. Найбольш спрытныя плыўцы перамахнулі раку. З верталёта выйшлі двое ў ахоўных касцюмах і масках. Узялі некалькі проб вады, глебы, адмаўляючыся ўступаць у размову, і зніклі ўнутры верталёта. Праз лічаныя мінуты бераг Сожа апусцеў. Па-

садка верталёта зноў навяла жах, што на рэчцы нельга купацца, загараць, лавіць рыбу. Вепрынцы, якім усё ж давялося пагаварыць з верталётчыкамі, былі катэгарычнымі:

— Зямля брудная. Дзецям жыць ні ў якім разе нельга.

Дык як жа ўсё-такі быць?! Здавалася б, нарэшце гэта высветліцца з прыездам экспертаў міжнароднага класа. Як і было абяцана, прадстаўнікі МАГАТЭ і САЗ 22 чэрвеня 1990 г. завіталі на Чэрыкаўшчыну, у невялікую залу Дома культуры.

Перагортваю яшчэ раз тыя нервозныя старонкі жыцця землякоў і дзіву даюся. Мы шукалі канкрэтных рэкамендацый, шляхоў паратунку, а што атрымалася на справе? Агітацыю за правільныя дзеянні ўлад па забеспячэнню бяспечнага пражывання на забруджанай зямлі, ды 35-бэрную канцэпцыю за жыццё.

На парадак дня з усёй вастрынёй паўставала адсяленне, але між тым у «зоне жорсткага кантролю» працягвалі здымаць верхні слой глебы, асфальтаваць, пракладваць водаправод. Усё гэта аказвалася непатрэбным. Людзі, не чакаючы агульнага перасялення, пачалі зрывацца з хат.

З'яўляюцца бясхозныя землі, паміраюць вялікія і малыя вёскі: Кліны, Каменка, Чудзяны, Малінаўка, Нова-Малінаўка. На парозе — Вепрын, адна з буйных і прыгожых вёсак, лёс перасяленца напаткаў калгас «Краіна Саветаў»...

Хворую зямлю, як і жывую істоту, трэба лячыць. Менавіта ў гэтым напрамку і пачало сваю дзейнасць на землях былога саўгаса «Сцяг» навукова-вытворчае аб'яднанне «Надзея». Сваёй мэтай яно ставіць ачышчэнне зямлі ад радыенуклідаў, перапрацоўку бруднай прадукцыі, перапрафіліроўку вытворчай занятасці насельніцтва.

А. Хнькава.

Дакументы сведчаць

ЗВАРОТ

28 лютага 1991 г. адбылася сустрэча Прэзідэнта СССР, Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова з партыйна-гаспадарчым актывам Магілёўскай вобласці (у г. Быхаве). На гэтай сустрэчы Прэзідэнту быў перададзены зварот, падпісаны ад імя жыхароў раёна старшынёй раённага Савета народных дэпутатаў, першым сакратаром РК КПБ А. І. Князівым.

Прэзідэнту Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС тав. Гарбачову М. С.

Паважаны Міхаіл Сяргеевіч!

Падтрымліваючы ўзяты Вамі курс на далейшае рэфарміраванне існуючай сістэмы, захаванне і абнаўленне Саюза як федэрацыі суверэнных рэспублік, навядзенне парадку ў краіне, разумеючы ўсю складанасць рашаемых Вамі праблем, жыхары Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў той жа час звяртаюцца да Вас, Міхаіл Сяргеевіч, з просьбай удзяліць больш пільную ўвагу раёнам, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Нам, пражываючым і працуючым у адным з найбольш забруджаных радыенуклідамі раёне Магілёўшчыны, сітуацыя прадстаўляецца крайне складанай і небяспечнай. Практычна на працягу пяці апошніх год мы знаходзімся ў чарнобыльскім капкане. Пражываючы на вёсцы — не карыстаемся дарамі прыроды, нашы дзеці пазбаўлены магчымасці нармальна развівацца, вучыцца. Мы ўсе пазбаўлены натуральнай патрэбнасці чалавека — жыць паўнакроўным жыццём.

У гандлёвую сетку раёна крайне недастаткова пастаўляецца фруктаў і агародніны.

У адпаведнасці з Праграмай перасялення людзей з забруджанай тэрыторыі, неабходна адсяліць жыхароў сямі гаспадарак раёна. Аднак гэта праграма рэалізуецца недапушчальна марудна. І ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі склалася

катастрафічная сітуацыя з кадрамі. У калгасах і саўгасах адчуваецца востры недахоп сельскагаспадарчай тэхнікі. У сувязі з гэтым мы звяртаемся да Вас, Прэзідэнта СССР, з просьбай садзейнічаць рашэнню наступных пытанняў:

1. Паскорыць будаўніцтва жылых пасёлкаў у чыстай зоне з тым, каб у 1991 г. завяршыць адсяленне жыхароў найбольш забруджаных вёсак. Прыняць адзіную канцэпцыю паказчыкаў для адсялення людзей. Завяршыць будаўніцтва пасёлка «Майскі», для чаго пабудаваць школу, дзіцячы сад, Дом культуры, комплексна-прыёмны пункт.

2. Рашыць сацыяльныя пытанні для насельніцтва, якое застаецца пражываць на забруджанай тэрыторыі. Паскорыць будаўніцтва газаправода, перагледзець плату за электраэнергію для гарадскіх жыхароў пацярпеўшых раёнаў з мэтай пераводу жылля на электраацяпленне. Забяспечыць насельніцтва раёна за лік віноўнікаў аварыі дазіметрычнымі прыборамі.

3. Павялічыць колькасць сямейных пуцёвак для аздараўлення насельніцтва ў летні перыяд.

4. Распрацаваць доўгатэрміновыя прагнозы стану здароўя насельніцтва і вядзенне сельскагаспадарчай вытворчасці.

5. Забяспечыць работу груп сацыёлагаў і псіхолагаў на забруджаных тэрыторыях па спецпраграме.

6. Поўнасцю задаволіць патрэбнасці пацярпеўшых раёнаў у кадрах медыцынскіх работнікаў, педагогаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі.

7. Забяспечыць жыхароў раёна легкавымі аўтамабілямі з мэтай паездак у чыстыя рэгіёны для нарыхтоўкі дароў прыроды.

8. Забяспечыць насельніцтва па медыцынскіх нормах чыстай агароднінай і фруктамі.

9. Паставіць гаспадаркам, якія перасяляюцца на чыстыя тэрыторыі, недастаючую сельскагаспадарчую тэхніку (спісак прыкладваецца).

10. Забяспечыць медыцынскія ўстановы раёна неабходным спецыяльным абсталяваннем.

11. Прыняць рашэнне аб пералічэнні налогу з абароту ў забруджаных раёнах у мясцовы бюджэт. Папоўніць бюджэт раённых Саветаў за лік віноўнікаў чарнобыльскай катастрофы.

ЗОНЫ АДСЯЛЕННЯ

У сувязі з Дзяржаўнай праграмай па ліквідацыі ў Рэспубліцы Беларусь вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, распрацаванай на 1990—1995 і наступныя гады, па Чэрыкаўскаму раёну ў зону першапачатковага адсялення аднесены наступныя вёскі:

I этап адсялення 1989—1990 гг.

Каменка	—	41	дом	78 жыхароў
Малінаўка	—	148	-«-	364 -«-
Нова-Малінаўка	—	30	-«-	73 -«-
Чудзяны	—	137	-«-	323 -«-

II этап адсялення 1990—1991 гг.

Бакунавічы	—	101	-«-	265 -«-
Манастырок	—	44	-«-	72 -«-

У сувязі з Пастановай ВС БССР ад 19.07.90 г. № 163-XII у зону далейшага адсялення аднесены вёскі:

Бліжняя Рэчыца	—	33	дамы	67 жыхароў
Вепрын	—	386	-«-	928 -«-
Вохар	—	104	-«-	230 -«-
Дубраўка	—	38	-«-	81 -«-
Журавель	—	62	-«-	120 -«-
Зоры	—	157	-«-	429 -«-
Зябень	—	31	-«-	74 -«-

Калюцін	—	6	-«-	7	-«-
Камаровічы	—	121	-«-	312	-«-
Каменка	—	41	-«-	78	-«-
Кліны	—	19	-«-	35	-«-
Лісань	—	33	-«-	67	-«-
Пілёнка	—	11	-«-	29	-«-
Сцяпанаў	—	42	-«-	76	-«-
Таржоў		6	-«-	12	-«-
Ушакі	—	132	-«-	340	-«-
Халменка	—	22	-«-	50	-«-

Намеснік старшыні
Чэрыкаўскага райвыканкама, старшыня
камісіі па ліквідацыі вынікаў
аварыі на ЧАЭС В. Пармёнаў.

ПЕРАЛІК

населеных пунктаў, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС, у якіх у адпаведнасці з пунктамі 25 артыкула 33, артыкуламі 55—56 Закона Беларускай ССР «Аб сацыяльнай абароне пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» уводзяцца аплата працы работнікаў па павышаных дзяржаўных тарыфных стаўках (здзельных расцэнках) і пасадавых акладах і даплаты да стыпендый студэнтаў і навучэнцаў прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, пенсій і дапамог грамадзян з улікам узроўню радыеактыўнага забруджвання

I. Населеныя пункты, у якіх устанаўліваецца надбаўка ў размеры 20—30 %.

г. Чэрыкаў, Вепрынскі сельскі Савет — пасёлак Майскі; Верамейскі сельскі савет: Бельгійскі, Калода, Карма, Красны, Ясная Паляна, Ясная Зара; Язёрскі сельскі Савет: Вінаград, Грыўкі, Язёры, Заазер'е, Звязда, Міхлін, Новая Слабада, Новы Свет, Паліпень, Прыпёчына, Рэмідоўшчына, Рагаліна, Селішча, Сакалоўка, Шыманы; Лабанаўскі сельскі Савет: Васькоўка, Гіжня, Доўгая, Лобча, Рынкоўка; Сормаўскі сельскі Савет: Анюціна, Горкі, санаторый «Сонейка», Загурковішча, Карма, Лашчавіна, Масткова, Палом, Вудага; Ушакоўскі сельскі Савет: Галоўчыцы, Міхайлаўка.

II. Населеныя пункты, у якіх устанаўліваецца надбаўка ў размеры 30—50 %.

Вепрынскі сельскі Савет: Баровая, Гронаў; Язёрскі сельскі Савет — Бакаў; Рэчыцкі сельскі Савет: Гойкаў, Міхалін, Перамога, Рэчыца, Вусце, Халоблін; Сормаўскі сельскі Савет: Вымач, Глінь, Латышчына, Багданаўка, Тур'е, Ямкі, санаторый «Сож»; Ушакоўскі сельскі Савет — Князёўка.

III. Населеныя пункты, у якіх устанаўліваецца надбаўка ў размеры 50—75 %.

Вепрынскі сельскі Савет — Кліны; Рэчыцкі сельскі Савет: Бліжняя Рэчыца, Камаровічы, Вохар, Прасвет, Сцяпанаў, Таржоў; Сормаўскі сельскі Савет: Журавель, Зоры; Ушакоўскі сельскі Савет: Дубраўка, Зябень, Ушакі, Халменка, Пілёнка.

IV. Населеныя пункты, у якіх устанаўліваецца надбаўка 75—100 %.

Вепрынскі сельскі Савет: Вепрын, Каменка, Лісань, Малінаўка, Нова-Малінаўка, Асавец, Калюцін, Чудзяны; Сормаўскі сельскі Савет — Манастырок; Ушакоўскі сельскі Савет: Бакунавічы, Лысаўка, Астравы.

Упраўляючы справамі Савета
Міністраў Беларускай ССР
Н. Каўко

РАШЭННЕ ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЁННАГА САВЕТА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

23 мая 1991 г.

О захоронении строений в населенных пунктах, из которых отселены жители

В результате аварии на Чернобыльской АЭС 25 населенных пунктов района оказались в зоне загрязнения радионуклидами с плотностями по цезию-137 свы-

ше 15 Ки/км². В соответствии с Государственной программой по преодолению последствий в Белорусской ССР катастрофы на ЧАЭС и постановлением ЦК КП Белоруссии и Совета Министров БССР от 19 января 1990 года № 20 жители этих населенных пунктов подлежат переселению с последующим захоронением строений.

В целях предотвращения дальнейшего распространения загрязнения территории района и области исполнительный комитет районного Совета народных депутатов решил:

1. Начиная с 1 июня с. г. произвести снос и захоронение строений в населенных пунктах: в первую очередь по Вепринскому сельскому Совету — Калютин, Н. Малиновка, Каменка, Клины; во вторую очередь по Ушаковскому сельскому Совету Холменка, Пиленка, Князевка, Зябень, Дубровка; по Речицокому сельскому Совету Б. Речица, Победа, Гойков, Торжев, Степаново; по Сормовскому сельскому Совету — Журавель.

2. Просить Могилевский облисполком выделить специализированное предприятие «Радон» для выполнения работ по сносу и захоронению указанных населенных пунктов.

3. УКСу райисполкома (т. Шестопалов А. Н.) совместно с архитектором района (т. Дуркин В. П.) до 1.06.91 г. разработать, согласовать и утвердить план-задание по сносу и захоронению строений на населенные пункты первой очереди.

4. Правлению райпотребсоюза (т. Демидович П. П.) с 1.06.91 г. обеспечить трехразовое питание работников специализированного предприятия «Радон».

5. Директору лесхоза (т. Ходос А. А.) временно предоставить жилплощадь работникам спецпредприятия в д. Лимень.

6. Председателям исполкомов сельских Советов народных депутатов Вепринского (т. Крупский С. Г.), Ушаковского (т. Савицкий В. М.), Речицкого (т. Хайченежда», колхозов «Красный пахарь» и имени Ильича (тт. Дорошкевич О. Н., Тишкевич П. П., Исаченко А. Н.) оказывать необходимую помощь работникам спецпредприятия при захоронении населенных пунктов.

7. Контроль за выполнением данного решения возложить на заместителя председателя райисполкома (т. Перменов В. А.) и районный штаб гражданской обороны (т. Шулаков А. Л.).

Председатель районного Совета А. И. Князив
Управляющий делами исполкома М. Н. Древило

Бяды не прасілі

Артыкул былога старшыні Чэрыкаўскага раённага Савета народных дэпутатаў А. І. Князіва друкуецца са скарачэннем з раённай газеты «Заклік Ільіча» ад 24 красавіка 1991 г.

26 красавіка 1991 г. споўнілася пяць год з дня страшэннай аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Яна сваёй нябачнай рукой унесла карэктывы ў жыццё і лёс нашага беларускага народа. Значную частку тэрыторыі рэспублікі пакрыла крыло радыеактыўнага пылу. Захапіла яно і нашу Чэрыкаўшчыну, якая лічылася курортнай зонай. Зараз мы не можам спаўна карыстацца дарамі прыроды, сельгаспрадукцыяй. Людзі, пражываючыя ў зонах моцнага радыеактыўнага забруджвання, вымушаны здымацца з абжытых мясцін і падавацца туды, дзе няма радыенуклідаў. Нельга не зразумець людзей, якіх апаноўвае роспач, хваляванне ў сувязі з перасяленнем.

Добра, калі яны едуць арганізавана, горш, калі пакідаюць родныя мясціны па адным. Чарнобыльская трагедыя прынесла насельніцтву не толькі гора, а і мноства праблем. Не выконваюцца тэрміны абавязковага адсялення людзей, бо маруднымі тэмпамі вядзецца будаўніцтва жылля, аб'ектаў сацкультбыту ў чыстых зонах. І людзі вымушаны дагэтуль затрымлівацца ў небяспечных населеных пунктах.

Адселеная вёска.

Калодзеж, з якога ніхто не п'е.

У раёне выкананы значны аб'ём работ па дэзактывацыі, правядзенню аграхімічных і меліярацыйных мерапрыемстваў. Але, нягледзячы на гэта, абстаноўка застаецца напружанай.

Назіраецца значны адток людзей, што адмоўна сказваецца на кадравым забеспячэнні народнай гаспадаркі раёна. Не хапае будаўнікоў, механізатараў, жывёлаводаў, дыпламаваных спецыялістаў сельскай гаспадаркі, педагогаў. Асабліва заклапочвае той факт, што нашы медустановы не маюць патрэбнага штата ўрачоў, сярэдняга медыцынскага персаналу. Недахоп гэтых спецыялістаў не дазваляе наладзіць належнае медыцынскае абслугоўванне насельніцтва.

У цэлым у раёне наладжана неблагое забеспячэнне людзей прадуктамі харчавання. Але ў нашы магазіны вельмі рэдка завозяцца садавіна, агародніна, другая вітамінная прадукцыя.

Заклапочвае і тое, што нашы дзеці не маюць магчымасці добра вучыцца. Бо яны вымушаны за тысячы кіламетраў ездзіць аздараўляцца і там працягваюць вучобу. Трэба прызнаць, што такія паездкі карысці мала прыносяць. Лепш было б выдзяляемыя сродкі выкарыстаць для пабудовы здраўніц у чыстай зоне Беларусі. Было б добра, каб і дарослыя аздараўляліся ў сваіх пансіянатах і дамах адпачынку.

Жадае лепшага і рашэнне сацыяльных пытанняў для насельніцтва, якое застаецца пражываць на тэрыторыі, забруджанай радыенуклідамі. Неаднаразова раённы Савет народных дэпутатаў, райкам КПБ узнімалі пытанне перад Саветам Міністраў БССР, ЦК Кампартыі рэспублікі, міністэрствамі і ведамствамі наконт перагляду кошту электраэнергіі для жыхароў горада Чэрыкава з мэтай пераводу кватэр на электраацяпленне. Закраналіся пытанні і аб належным забеспячэнні раёна кадрамі патрэбных прафесій, павышанымі матэрыяльнымі фондамі, рэсурсамі.

У сувязі з радыеактыўнай абстаноўкай у раёне скарачаецца аб'ём нарыхтоўкі лесу. Цяжкія абставіны ў нас і ў рашэнні жыллёвага будаўніцтва ў горадзе. Вялікая колькасць сямей стаіць у чарзе на атрыманне жылля, многія з іх перасяленцы.

Неадкладна патрабуецца будаўніцтва ў райцэнтры Дома культуры, аптэкі, фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Не церпіць адкладу і ўвядзенне рада аб'ектаў сацыяльна-бытавога прызначэння на сяле.

Неаднаразова кіраўніцтва раёна ўзнімала пытанне перад рознымі вы-

сокімі інстанцыямі наконт хутчэйшага павелічэння тэмпаў будаўніцтва жылля для перасяленцаў. Колькі ж можна ім цярпець у зонах? Зрываюць планы адсялення з-за таго, что ў Беларусі не хапае будаўнічых магутнасцей. Дагэтуль у раёне не праведзена пашпартызацыя падворкаў. А чалавеку патрэбна ведаць, ці можна тут жыць, весці гаспадарку.

Хвалюе нас і такое пытанне: што рабіць з тымі населенымі пунктамі, якія пакідаюць людзі? Тут могуць узнікаць пажары ад самазагарання, а то і ад падпальвання несумленнымі людзьмі. Разам з дымам радыенукліды падымуцца ўгару і зноў выпадуць дзесьці на чыстых тэрыторыях. Тут патрэбна высокая свядомасць і адказнасць людзей за свае ўчынкі.

Прайшло ўжо пяць год з дня трагедыі, выкліканай аварыяй. За гэты час, як кажуць, нацярпеліся нашы людзі. Ад няўвагі, неразваротлівасці вышэйстаячых арганізацый у плане вырашэння наспелых праблем, звязаных з катастрофай. Кіраўніцтву раёна даводзіцца бываць у кабінетах розных высокіх начальнікаў, каб «прабіць» многія пытанні ў сувязі з аварыяй. Мы імкнемся да таго, каб нас, чарнобыльцаў, не забывалі, не пакідалі ў бядзе. Нашым людзям надакучылі абяцанкі. Справіцца нам са стаячымі праблемамі вельмі цяжка. Прыняты Закон аб сацыяльнай абароне пацярпеўшых ад аварыі. Каб яго ператварыць у жыццё, спатрэбяцца вялікія сродкі.

Калі грунтоўна падысці да праблемы, то можна адзначыць, што бяды гэтай мы не прасілі. Таму ліквідацыяй вынікаў аварыі павінны займацца ўсе.

Аварыя многаму навучыла. Аб ёй не трэба забываць ні на гадзіну. Пакуль жа нашых людзей акружае гора.

Лёс перасяленцаў

Зразумела, няма магчымасці прасачыць лёс усіх людзей, якіх чарнобыльская бяда зняла з родных мясцін. Як уладкаваліся яны, ці загойвае час раны душы? Частковае ўяўленне аб гэтым даюць пісьмы, падрыхтаваныя ўласным карэспандэнтам «Магілёўскай праўды» А. Хныкавай. Перасяленцам, з якімі сустрэлася карэспандэнт, можна сказаць, пашанцавала — яны атрымалі кватэры не дзе-небудзь, а ў самой сталіцы.

Я — інвалід з дзяцінства, маю другую групу. Размяняла сёмы дзесятак. Разам з маці, 1904 года нараджэння, жылі ў Зорах, што на Чэрыкаўшчыне. Каму гэта цікава, як цягнулі лямку дзве нягеглыя жанчыны, але не было чаго дужа на ўвесь свет белы наракаць. З помаччу людской і боскай кольвек змагаліся, апошнімі, дзякуючы людзям, на вёсцы не былі. З месца абжытага змусіла зняцца чарнобыльскае ліха. Па пасведчанню чарнобыльцаў атрымалі добрае жыллё. Не трэба з вадой, дровамі валтузіцца, магазіны побач.

Калі б не такі паспешлівы і вымушаны ад'езд, то, магчыма б, у іншым выпадку пры пераездзе ўлічылі б многае. А то ў нас атрымалася наступнае. Нам выдалі чамусьці два ордэры, і, выходзіць, падзялілі адну сям'ю на дзве, хоць маці на момант наваселля было без малага дзевяноста гадоў. За мной лічылася 17 квадратаў жылля, за старой — адзінаццаць.

Праз два месяцы маці памерла, пакінуўшы мяне ў адзіноце. Ад смутку і гора, з-за адрыву ад свае хаты дачасна здала, бо кожную мінуту яе адольвалі ўспаміны. Я засталася. Здаўшы дом, сад, не атрымаўшы пакуль ніякіх грошай. Цяпер, зыходзячы з ордэраў, на нашай жылплошчы



Карта радыяцыйнага забруджвання.

свабодны пакой, і мне ўпарта ківаюць, што сюды заселяць чалавека. Калі я пачала аспрэчваць гэта, прыгразілі перасяліць у іншы кут.

Не, на харомы я не заляцалася ніколі. Проста,як хворы чалавек, хачу спакою, а таму нярвуюся за новага жыхара. Калі б хто надукаваў мяне пра два ордэры! Калі б ведала такое, то ніколі б не краналася з месца. Але ж за пяць месяцаў жыцця ў новай кватэры з маці, спраўна плаціўшы за жыллё, неяк абвыкліся ўжо, пачалі пакрыху супакойвацца нервы.

Я была ў выканкоме, спрабавала нешта даказваць і паказваць, але са мной размаўлялі настолькі груба, што разбярэдзілі душу, што давялося выклікаць «хуткую».

Маё гора — вялікае гора. Дапамажыце мне, каб спакойна магла жыць, бо я страціла радзіму, хату, сваю зямлю. Каб яна спрахла тая Чарнобыльская станцыя! Тут мы, перасяленцы, табуном ходзім па вуліцы, няма да чаго прычаліцца, ні блізкіх, ні родных. Дапамажыце, Хрыстом богам прашу, набыць спакой, калі ёсць што святое ў душы. У мяне скрыўленне пазваночніка, тазабедранага сустава і астэаміэліт касцей. Я ледзь перасоўваюся з кійком, і не магу шкандыбаць па кабінетах начальнікаў. Пачуйце, людзі добрыя!

Е. Грынькова.

* * *

Калі перабраліся ў сталіцу, то ўсе заталдычылі пра саракагадовы стаж. І хоць было ваўком завый, калі пра пенсію пачала думаць. Такая несправядлівасць атрымліваецца. Я з васьмі гадкоў пайшла пасвіць свіней з Новікавай Верай. А потым пайкі палола, жала ў адзін серп. Я была малалеткай, аднак пайкі набівалі падворна, на душу. Спраўлялася цераз сілу, бо маці мая была інвалідам. Яна страціла руку на калгасным таку, калі мяла лён. Так што якая маці была памочніца. Угнацца за дарослымі было вельмі цяжка. І даводзілася мне ўставаць золачкам, а класціся спаць з расічкай. Не надта шмат магла зрабіць маці адной рукой.

Я працавала заўсёды, пакуль і замуж пайшла. Але работы не перапыняла. Пасвіла падцёлкаў, цялят з Новікавай Праскоўяй і з Ляшчовай Верай. Цягалі ваду цэбрам, на жываце кармы насілі за сотні метраў, ездзілі салому мёрзлую скубсці. Якія страшэнныя былі рукі, як галовачка раскеплівалася! Пра заробкі слёзна ўспомніць. Але ўсе мае труды на маці-інваліда закацілі. Я ж, выходзіць, нейкім гультаём была. Але жызню маю мае аднагодкі пацвердзіць могуць — Вольга Муратава, Ліда Баглік. Я ж напячвалася на ўсю сілачку, пакуль туберкулёзу лёгкіх не падхапіла. А да таго ж дзяцей нарадзіла і ні разачку ні ў водпуску, ні ў дэкрэце не была. Усё капейку здабывала. Сем гадоў была пад наглядам урачоў, а як толькі выкараскалася, дык адразу на работу пайшла. Не на лёгкую, на ферму даяркай. І вось толькі гэты перыяд у маёй працоўнай кніжцы бачны. А тыя злашчасныя гады, калі па здароўю не магла і блізка мінімум адолець, не ў разлік?

Горачка, чарнобыльская віхура закінула нас з мужам, бы тыя пясчынкі, за сотні кіламетраў ад Вепрына. Ужо і не ведаю, дзе хто знаходзіцца, да каго дагукацца, з якога боку да праўды падабрацца. Тут хадзіць-брадзіць — сабе вар'яцтва здабываць. Усе сваімі думкамі заняты, а ты як хочаш. Патрэбны дакументы, сведкі, папраўкі нейкія, а толкам ніхто сказаць не можа. Здагадвайся. Дужа добра маё пражыццё ведаў Дзмітрый Лявонавіч Сталяроў, але яго даўно на свеце няма. Царства яму нябеснае. Калгас наш «Кастры-

чнік» на новае месца перабраўся, усе сейфы вывезлі, калі тыя паперы разбяруць — аднаму Богу вядома. Калі чаго па дарозе не страціцца. Усё ў галаве блытаецца, і гавару блытана. Але спадзяваюся, што можа хто маё пісьмо пачытае, па прозвішчу адгукнецца.

Я зараз хворая, муж таксама ляжыць. Урачы, не хачу грашыць, ходзяць да нас. Але, калі б на сваёй зямліцы-матухне былі, то і ногі дзебялейшымі былі б. І паперкі розныя хутчэй бы знайшліся.

Пасмакаваўшы жыцця ў далечыні ад родных сцен, і на смяротным ложку закажу, каб ніколі са сваёй хаты старыкі не рушылі. Хоць бачком, хоць з цапком, ды лепш па палавіцах, чым па паркету з ваннай. Лепш са сваім начальнікам-прасцяком, чым з драўляным інтэлігентам. Свой душой адходлівы, а чужы — непрабіваемы.

Нацярпеліся людзечкі нашы, ведаю. Надзі Макштаровай нават не давалі бялізну прапаласкаць, а з яе дзевачкай чыстыя дзеці за парту не садзіліся. А Петраку Мікалайкаву ўсё шыбку на комін цягалі. Усяго і не раскажаш. Ведаю, што яны назад вярнуліся, у Чэрыкаве хаты пакуплялі. І я ўсё да такое ж думачкі. Дамоў бы. Гатова лапатай тую радыяцыю скрэбсці. А чалавек мой дапякае, каб не тузалася. Была там, куды пасадзілі, і людзей больш не турбавала. Дык я ж і не думала каму дакучаць. Вось каб толькі не гэтыя гадочкі пеклавання ў калгасе.

В. Сарокіна.

Світанка не дачакаўся...

Указ Президиума
Верховного Совета БССР
О награждении тт. Игнатова А. В. и Курилина А. М. медалью «За отличную службу по охране общественного порядка»

За храбрость и самоотверженные действия, проявленные при исполнении служебного долга, наградить от имени Президиума Верховного Совета СССР медалью «За отличную службу по охране общественного порядка» милиционера-водителя отдела внутренних дел исполкома Чериковского районного Совета народных депутатов Могилевской области Игнатова Александра Валентиновича (посмертно) и слушателя Минской высшей школы Министерства внутренних дел СССР Курилина Александра Михайловича.

Председатель Президиума
Верховного Совета БССР
Г. ТАРАЗЕВИЧ.

11 января 1988 года.
г. Минск.

Калі паступіў у райаддзел унутраных спраў гэты ракавы званок, там дзяжурыў старшы лейтэнант Аляксей Іосіфавіч Дзямідаў. Справа заключалася ў тым, што кіраўнік групы студэнтаў Магілёўскага педінстытута прасіў парады і дапамогі: жывуць яны ў клубе в. Верамейкі. Толькі што скончыўся кінафільм, а моладзь не разыходзіцца. Але ж студэнтам трэба адпачываць. Узважыўшы ўсе варыянты і магчымасці, А. І. Дзямідаў прымае рашэнне: паслаць у Верамейкі малодшага сяржанта А. Ігнатава.

У гэты час у райаддзеле знаходзіўся слухач Мінскай Вышэйшай школы МУС СССР Саша Курылін, які выказаў пажаданне таксама выехаць па вызаву. Атрымаўшы згоду,

адразу пайшоў да машыны.

У Верамейкі прыбылі за поўнач. Каля клуба — цёмна, нікога няма. Вырашылі вярнуцца ў райаддзел. І раптам на вялікай хуткасці каля іх прамчалася машына. Ледзь не ўдарыўшыся ў дрэва, чыхнуўшы, яна заглухла. А. Ігнатаў спыніўся, падышоў да яе. У кабіне сядзелі трое: усе п'яныя. І яны спяшаліся на танцы.

— Аддайце ключы ад машыны, няхай кіраўнікі гаспадаркі заедуць за імі заўтра, а вы ідзіце дадому, праспіцеся,— стаў угаворваць Сідарава, Канаплёва і Рабцава міліцыянер. У адказ — лаянка, пагрозы. Можна толькі ўявіць, што маглі нарабіць гэтыя трое, пакінь міліцыянер іх у машыне. Як зграя ваўкоў, рыскалі яны на саўгасным транспарце ў пошуках прыгод, адчуваючы сябе каралямі мясцовага значэння. Іх душа жадала вострых адчуванняў. І яны здзекаваліся над міліцыянерамі, у п'яным выглядзе куражыліся, зневажалі малодшага сяржанта. Рабцаў аказаўся самым здагадлівым — збег.

У міліцэйскі «уазік» селі так: за рулём — Саша Ігнатаў, за яго спіной — Саша Курылін, побач двое затрыманых. Пагроза, лаянка ў адрас міліцыянераў не спыняліся. Крыху праехалі і спыніліся.

— Выходзьце па аднаму, буду вас абшукваць,— сказаў А. Ігнатаў.

— Не пасмееш, «мент»,— хрыпеў Канаплёў. Але выйшаў. Вобыск нічога не даў.

Праехалі яшчэ. І раптам Курылін убачыў, што хлопец, які сядзеў побач, рэзка нахіліўся да вадзіцеля. Імгненна слухач кінуўся на яго, пацягнуў на сябе. І адразу — цемра, правал... Апошнім намаганнем волі Саша схваціўся за куртку злачынцы, і яна засталася ў яго руках.

Колькі цягнулася бяспамяцтва — Саша не ведаў. Апрытомнеў — на пярэднім сядзенні ляжаў Ігнатаў. Усе дзверы былі расчынены. З цяжкасцю выбраўся, сеў за руль. Толькі паспеў развярнуць машыну, каб ехаць назад у Верамейкі, як зноў страціў прытомнасць. Калі ачуняў, вырашыў паўзці да людзей. Бо ў машыне заставаўся таварыш, яму патрэбна дапамога. Аб тым, што Ігнатаў памёр праз 15 мінут пасля здрадніцкага ўдару ў спіну, ён даведаецца пазней.

А. В. Ігнатаў.

А. М. Курылін.

А пакуль, сабраўшы волю ў кулак, з цяжкасцю пераадольваючы кожны метр, ён поўз да вёскі, трацячы прытомнасць. Яна была так блізка і так недасяжна. Нейкіх 500—700 м Курылін адолеў ледзь не за дзве гадзіны. Пастукаў у першы дом. Не адчынілі. Другім быў дом Н. Анішчанка. Сазваніўшыся з міліцыяй, даведаўшыся, што ёсць такі супрацоўнік, гаспадыня адчыніла дзверы. Курылін паведаміў у райаддзел аб здарыўшымся, вызваў «хуткую». І толькі ў машыне «хуткай дапамогі» ён з жудасцю ўсвядоміў: яго таварыш, Саша Ігнатаў, мёртвы.

Яму не было яшчэ і 23 год. Узрост, калі ўсё наперадзе.

Вырашылі пахаваць Сашу Ігнатава на яго радзіме — у в. Сялец Мсціслаўскага раёна. Вельмі любіў ён месца, дзе нарадзіўся і вырас. Праводзілі яго ўсе. Не пайшлі ў школу старшакласнікі. Для іх Саша быў не проста сябрам, але і дарадчыкам, настаўнікам.

Пахавалі міліцыянера на вяско-

вых могілках, каля самай дарогі, дзе не змаўкае паток жыцця, якое ён вельмі любіў і з якім так рана разлучыўся.

І. Андрэева.

Жыве памяць пакаленняў

Адкрыццё дзяржаўнага гістарычна-краязнаўчага музея ў Чэрыкаве, без перабольшвання, з'явілася значнай грамадска-палітычнай падзеяй. Да яе рыхтаваліся даўно, яшчэ да 1983 г., калі была прынята пастанова партыі і ўрада рэспублікі аб яго адкрыцці. І гэта было не проста чыёсьці жаданне, а патрэбнасць, жыццёвая неабходнасць. Бо гісторыя нашага краю вельмі цесна звязана з гісторыяй роднай Беларусі і яе суседзяў. І на ўсіх этапах ураджэнцы з чэрыкаўскай зямлі былі ў ліку тых, хто памнажаў славу Айчыны.

Аб усім гэтым думалася ў дзень адкрыцця музея. Ганаровае права адкрыць яго было дадзена па даручэнню бюро райкама КПБ і выканкама райсавета народных дэпутатаў першаму сакратару райкама партыі Васілю Мікалаевічу Новікаву. Ён падкрэсліў, што А. В. Луначарскі назваў музей велічнай памятнай кнігай чалавецтва. І без музейнай работы многае з гераічнага мінулага народа было б згублена і забыта.

Тав. Новікаў В. М. спыніўся на слаўнай гісторыі раёна.

— Асаблівая радасць у нас, ветэранаў,— сказаў у выступленні на адкрыцці музея старшыня раённага Савета ветэранаў вайны Андрэй Макаравіч Дзергачоў,— экспазіцыі музея будуць дапамагаць вывучэнню гісторыі краю, выхаванню моладзі. Гэтую ж думку выказала і васьміклясніца сярэдняй школы № 1 г. Чэрыкава Ірына Казлова. Яна сказала, што сваёй пошукавай работай, сваімі справамі піянеры і школьнікі будуць садзейнічаць далейшай рабоце музея.

Стваральнікі музея: унізе (злева направа) Т. А. Матусевіч, Ф. Ц. Рудзікаў (першы дырэктар музея), дазорац Б. Я. Вярцінская, уверсе — мал. навуковы супрацоўнік Л. У. Трусава, дазорац Г. П. Сафеенка, мал. навуковы супрацоўнік М. П. Царкоў, В. М. Жураўлева.

* * *

Аб музеі расказаў яго заснавальнік і дырэктар Фёдар Цярэнцьевіч Рудзікаў.

— Як вядома, афіцыяльнае рашэнне стварыць у Чэрыкаве музей было прынята на бюро ЦК Кампартыі рэспублікі ў красавіку 1983 г. Але перш чым гэта здарылася, была праведзена вялікая падрыхтоўчая работа, без якой адкрыццё музея было б немагчымым. А з прыняццем пастановы партыі і ўрада ўсё было пастаўлена на практычную аснову. Пад музей быў выдзелен будынак былога раённага вузла сувязі. Будаўнікі тагачаснага міжкалгасбуда пры вялікай актыўнасці яго кіраўніка Мядзведзева Анатоля Васілевіча зрабілі рамонт і рэканструкцыю памяшкання пад музей. І мы, чэрыкаўляне, будзем помніць аб гэтым з удзячнасцю.

Была праведзена вялікая работа па збору экспанатаў, класіфікацыі залаў, стварэнню экспазіцый. Ёй займаліся раённы Дом піянераў і школьнікаў, амаль усе сярэднія школы, шматлікія аматары. Усіх назваць проста немагчыма, але нельга не ўспомніць Георгія Кузьміча Сотнікава, Захара Іванавіча Прасянцова, Дзмітрыя Іванавіча Старавойтава, Івана Архіпавіча Ткачова, Бэлу Якаўлеўну Вярцінскую. Іх уклад у збор экспанатаў асабліва важкі.

...Не абышлося без бескарыслівай дапамогі і нашых землякоў Аляксандра Васілевіча Фралова, Мікалая Антонавіча Храмушына, Людмілы Аляксееўны Аўдзіенка, Мікалая Прохаравіча Царкова. Дапамагалі ствараць музей райсельгастэхніка, ДЭУ-215, ДОЗ і асабліва — райсельгасэнерга, якое выканала ўсе падсветкі і другія электрамантажныя работы.



Фрагмент экспазіцыі музея.

Напружаная работа працягвалася тры гады. За гэты час аформлены 6 залаў — прыроды, дарэвалюцыйны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Ліменскай школы-камуны, Вялікай Айчыннай вайны, сучаснага перыяду, а таксама этнаграфічны вугалок. Усяго ў нас сабрана звыш 6 тыс. экспанатаў, а ў экспазіцыі — каля 4,5 тыс.

Л. Яўгенаў.

Чэрыкаўскі паляўнічы заказнік

Быў створаны ў 1960 г. на падставе пастановы Савета Міністраў БССР тэрмінам на 10 год. Пазней тэрмін дзейнасці заказніка двойчы прадаўжаўся. Плошча яго склала 70,2 тыс. гектараў і ахоплівае пэў-

ныя лесараслінныя зоны на тэрыторыі Чэрыкаўшчыны, а таксама ўгоддзі Краснапольскага і Слаўгарадскага раёнаў. Мерапрыемствы, што праводзіліся ў заказніку, дазволілі павялічыць колькасць дзікіх жывёл і птушак многіх відаў. На 1 сакавіка 1991 г. тут налічвалася 818 дзікоў, 244 ласі, 203 алені, 315 баброў, 83 глушцы, 247 цецерукоў, 7 барсукоў, 52 куніцы, 642 касулі, 163 лісіцы, 1200 зайцаў, 255 курапатак, 78 вавёрак, шмат іншай жыўнасці.

Згодна з пастановай Савета Міністраў рэспублікі ад 10.7.1991 г. «Аб паляўнічых заказніках рэспубліканскага значэння», Чэрыкаўскаму паляўнічаму заказніку тэрмін дзейнасці не прадоўжан. Паводле рашэння Магілёўскага аблвыканкама і Чэрыкаўскага райвыканкама, угоддзі заказніка перададзены лесапаляўнічым гаспадаркам лясгаса і раённага Савета таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Легендарныя «грышынцы» на Чэрыкаўшчыне

23 і 24 мая 1992 г. у в. Верамейкі адбылася сустрэча ветэранаў-партызан асобага партызанскага злучэння «13», якім камандаваў Герой Савецкага Саюза С. У. Грышын. Баявыя дзеянні гэтага падраздзялення звязаны і з Чэрыкаўшчынай. Былыя партызаны прынялі ўдзел у мітынгу-рэквіему, усклалі кветкі на брацкую магілу воінаў.

Герой Савецкага Саюза С. У. Грышын.

Удзельнікі сустрэчы.

Творчасць з берагоў Сожа

Раённая газета «Заклік Ільіча» ў 1989 г. адзначыла свой 70-гадовы юбілей. Сем дзесяцігоддзяў раёнка піша не толькі гісторыю роднага краю, а і аб'ядноўвае аматараў мастацкага слова, літаратурнай творчасці. Дзверы літаратурнага аб'яднання пры раённай газеце адчынены для ўсіх, хто захапляецца літаратурай.

І кожны гістарычны прамежак часу існавання раённай газеты быў звязаны з яркімі асобамі, якія з'яўляліся ідэйнымі паплечнікамі пачынаючых літаратараў у раёне. Гэта можна сказаць і ў адрас журналіста Івана Дзенісенкі, які працаваў у рэдакцыі ў 40-х гадах (гл. артыкул «І рэквіем і гімн»).

Многае звязвае літаратурнае аб'яднанне пры раёнцы з вядомым беларускім паэтам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР Аляксеем Пысіным. З 18 лютага па верасень 1956 г. ён рэдагаваў раёнку. І вельмі многа зрабіў сваім аўтарытэтам, талентам па актывізацыі дзейнасці літаб'яднання. Пазней творчую эстафету прыняў Іван Аношкін, будучы вядомы ў вобласці і рэспубліцы пісьменнік. Ён, як рэдактар раённай газеты, як пісьменнік, удыхнуў і свой творчы струмень у жыццё літаратурнага аб'яднання. Пачынаў свой журналісцкі, пісьменніцкі шлях у раёнцы і Віктар Карамазаў. Яго першыя вершы, апавяданні, нарысы былі прадстаўлены на суд чытача менавіта на старонках раённай газеты (гл. артыкул «Родам з Чэрыкаўшчыны»).

Многія чытачы ў свой час з задавальненнем чыталі на старонках газеты творы не толькі вядомых пісьменнікаў, нашых землякоў, а і тых, хто толькі спрабаваў свае сілы ў літаратуры. Каму невядомы раннія гумарэскі, апавяданні былога супрацоўніка райгазеты Валянціна Крыжэвіча. Напісаны проста, без узнёсласці. Але кожны твор мае сваю тэму, ідэйную накіраванасць, завершанасць.

Прыкметны след у рабоце літаб'яднання пакінулі такія супрацоўнікі газеты, як Іван Сурман, Дзмітрый Лапцеўскі, Алена Хныкава, былыя рэдактары газеты Яўген Лявінскі, Віктар Іваноў.

Трэба адзначыць, што літаратурнае аб'яднанне пры раёнцы многае зрабіла і робіць для таго, каб развіць творчыя сілы, здольнасці аматараў мастацкага слова. Сярод іх людзі розных узростаў і прафесій. У раёне многім вядома імя селькора, калгасніка Івана Вераб'ёва. Пісаў вершы, больш за ўсё яму ўдаваліся лірычныя. Ветэранам літаб'яднання лічыцца і Сцяпан Максіменка, калгаснік, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, партызан. Адважна ваяваў, быў паранены, стаў інвалідам. Спрабаваў свае сілы ў напісанні замалёвак, гумарэсак, вершаў. Творчасць Сцяпана Максіменкі самабытная. Адным з актыўных членаў літаб'яднання з'яўляецца і педагог Іван Макштароў. Піша байкі, вершы. Тэмы баек бярэ з жыцця. Удаюцца аўтару і лірычныя вершы, у творах адчуваецца своеасаблівы стыль, почырк паэта. Галоўныя тэмы аўтара: тэма радзімы, прыроды, лірыка. Знаходзілі і знаходзяць разуменне ў чытачоў, у членаў літаб'яднання і паэтычныя радкі Віктара Гардзеева, Людмілы Аліфір, Алега Сорына. Вершы, напісаныя імі, вызначаюцца філасафічнасцю, шчырасцю, своеасаблівасцю адлюстравання з'яў жыцця, асабістых перажыванняў аўтараў. Даволі часта ў раённай газеце з'яўляюцца вершы і Уладзіміра Сухацерына, па прафесіі ён журналіст. Многія яго паэтычныя радкі знаходзяць добры водгук у чытачоў. Пры жыцці добрым і верным сябрам літаб'яднання быў Аляксандр Карпянкоў, які працаваў у лясной гас-

падарцы. Дзякуючы свайму асаблівaму светаўяўленню, мастацкаму мысленню пісаў цудоўныя па зместу, багатыя па моўных фарбах нарысы аб людзях, прыродзе.

На пасяджэннях літаб'яднання ў рэдакцыі абмяркоўваюцца творы, асабістыя творчыя планы пачынаючых літаратараў. Сюды часта запрашаюцца вядомыя паэты і празаікі, землякі, што служыць добрай і аўтарытэтнай школай для гурткоўцаў.

У розныя часы частымі жаданымі гасцямі ў рэдакцыі былі пісьменнікі Аляксей Пысін, Іван Аношкін, Віктар Карамазаў.

Для многіх членаў літаб'яднання на ўсё жыццё запамяталася сустрэча з Уладзімірам Басько, Віктарам Дайліда, Гаўрылам Шутэнкам, якая адбылася ў лютым 1980 г. Пісьменнікі расказалі аб сваёй творчасці, цікавіліся справамі рэдакцыі, давалі грунтоўныя парады пачынаючым літаратарам.

Вучоба гурткоўцаў праводзіцца і на старонках газеты, дзе друкуюцца рэцэнзіі на творы пачынаючых. Нярэдка ў раённым друку выступалі і выступаюць пісьменнікі.

Прыкметны ўклад у пошук у раёне талентаў, развіццё творчых здольнасцей у школьнай моладзі ўнесла былая супрацоўніца раёнкі Алена Хныкава. Зараз яна ўласны карэспандэнт газеты «Магілёўская праўда». Яна доўгі час была кіраўніком гуртка «Юнкор», створанага пры рэдакцыі. Гурткоўцы яе вучыліся сакрэтам журналісцкай і літаратурнай творчасці. Многія з іх у далейшым звязалі свой лёс або з журналістыкай, або паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы на філалагічныя факультэты.

Члены літаратурнага аб'яднання падтрымліваюць сувязь не толькі з тымі пісьменнікамі, землякамі, якія жывуць у вобласці, рэспубліцы, а і з тымі, каго лёс далёка закінуў ад Беларусі. Вось характэрны прыклад. Многія літаратурныя творы Герасіма Саўкіна, ураджэнца в. Баровая, былі надрукаваны ў перыядычных выданнях Марыйскай АССР. Дзякуючы літаратурнаму аб'яднанню пры раёнцы чытачы раёна змаглі даведацца аб творчасці свайго земляка.

Не губляе газета сувязі і з тымі, хто некалі быў звязаны сваім лёсам з Чэрыкаўшчынай. У свой час доўга падтрымлівалася сувязь з І. Івановым, ваеннаслужачым, які праходзіў службу ў Прысожскім краі. У па эта надоўга занатавалася ў памяці харaство гэтага цудоўнага краю.

У многіх і многіх творах членаў літаб'яднання прысутнічае тэма Чарнобыля. Варта адзначыць адну з характэрных асаблівасцей творчасці членаў раённага літаб'яднання, землякоў. Шмат пішуць аб Чэрыкаўшчыне, Прысожскім краі. Гэта сведчыць аб патрыятызме, вялікай любві аўтараў да радзімы. У свой час Іван Сурман напісаў верш пра Чэрыкаў. Самадзейны кампазітар Валерый Ігнаценка напісаў да яго музыку. Так нарадзілася «Песня пра Чэрыкаў». І гэта песня — своеасаблівы гімн шматпакутнаму гораду на р. Сож.

Аматары літаратурнага слова не спыняюцца на дасягнутым. Яны працягваюць пісаць гісторыю свайго краю, народа.

І. Сулімаў.

Населеныя пункты Чэрыкаўскага раёна*

Гарадскі Савет: г. Чэрыкаў, пас. Лімень, Вепрынскі сельскі Савет: вёскі Баровая, Вепрын, Гронаў, Калюцін, Каменка, Кліны, Лісань, Малінаўка, Нова-Малінаўка, Чудзяны, пасёлкі Асавец, Майскі; Верамейскі сельскі Савет: вёскі Верамейкі, Вудага, Забачэў, Калода, Каменка, Касар, Ляхі, Наркі, Новая Беліца, Селішча, Старая Беліца, Юдаўка, Ясная Зара; пасёлкі Бельгійскі, Гарадзец, Красны, Карма, Масток, Халадня, Чарнышын; Лабанаўскі сельскі Савет: вёскі Васькоўка, Гіжня, Доўгая, Дубраўка, Каменка, Лабанаўка, Лобча, Пабеда, Падлом'е, Рынкоўка, Шчацінка, Ялоўка, пасёлкі Адраджэнне, Грамабой, Жытнёў, Зара, Зялёны Дуб, Падбудкі, Светлы; Рэчыцкі сельскі Савет: вёскі Бліжняя Рэчыца, Вохар, Вусце, Гойкаў, Камаровічы, Міхалін, Пабеда, Рэчыца, Сцяпанаў, Таржоў, Халоблін; Сормаўскі сельскі Савет: вёскі Анюціна, Багданаўка, Вымач, Горкі, Глінь, Журавель, Загуркавішча, Зоры, Латышчына, Лютраўка, Манастырок, Мірагошч, Тур'е, Шароеўка, Ямкі, пасёлкі Лашчавіна, Масткова, Юны Пахар; Ушакоўскі сельскі Савет: вёскі Астравы, Бакунавічы, Галоўчыцы, Драгунскія Хутары, Дубраўка, Зябень, Князёўка, Лысаўка, Міхайлаўка, Піленка, Пільня, Ушакі, Халменка; Язёрскі сельскі Савет: вёскі Бакаў, Вербеж, Міхлін, Новая Слабада, Паліпень, Прыпёчына, Рагаліна, Ржавец, Сакалоўка, Селішча, Шыманы, Язёры; пасёлкі Вінаград, Грыўкі, Заазер'е, Звязда, Карпаўскі, Новы Свет, Рэмідоўшчына.

Населеныя пункты Чэрыкаўскага раёна, якія выключаны з уліковых даных (па стану на 1.1.1990 г.)

Назва населенага пункта	Дата выключэння	Прычына
1	2	3
Верамейскі сельсавет		
в. Паходавічы	Рашэнне Магілёўскага аблвыканкама № 322 ад 23.8.1986 г.	Злілася з в. Верамейкі
Лабанаўскі сельсавет		
пас. Гром	»	Зліўся з в. Пабеда
пас. Малінкі	»	Жыхары перасяліліся ў іншыя населеныя пункты
пас. Навінка	»	»
пас. Рассвет	»	»
пас. Слава	»	Зліўся з в. Пабеда ў 1968 г.
Рэчыцкі сельсавет		
пас. Гарадзішча	»	Жыхары перасяліліся ў іншыя населеныя пункты
в. Замастоўе	»	Злілася з в. Зоры ў 1968 г.
Сормаўскі сельсавет		
пас. Звязда	»	Жыхары перасяліліся ў іншыя населеныя пункты

* Прыведзены населеныя пункты, якія стаялі на дзяржаўным уліку на 1.11.1991 г.

в. Крывая Слабада	»	Злілася з в. Язёры
пас. Локці	»	Жыхары перасяліліся ў іншыя населеныя пункты
Ушакоўскі сельсавет		
пас. Гута	Рашэнне Магілёўскага аблвыканкама № 372 ад 3.9.1971 г.	Жыхары пераселены ў іншыя населеныя пункты
пас. Воўчыя Боркі	»	Зліўся з в. Вепрын
Вепрынскі сельсавет	Рашэнне Магілёўскага аблвыканкама № 473 ад 30.11.1976 г.	У 1975 г. жыхары пераселены ў іншыя населеныя пункты
пас. Варацец		
пас. Вясёлы Станок	»	»
пас. Ключавая Грыва	»	Жыхары пераселены ў іншыя населеныя пункты
в. Халмы	»	Злілася з в. Малінаўка
пас. Чудзянская Слабада	»	Зліўся з в. Чудзяны
пас. Язлавіцы	»	Жыхары пераселены ў іншыя населеныя пункты
Верамейскі сельсавет		
пас. Абрубец	»	У 1976 г. жыхары перасяліліся ў іншыя населеныя пункты
Лабанаўскі сельсавет		
пас. Клін	»	»
Рэчыцкі сельсавет		
пас. Кістоўня	»	Зліўся з в. Вудага
пас. Печкі	»	Жыхары пераселены ў іншыя населеныя пункты
Сормаўскі сельсавет		
в. Сормава	Рашэнне Магілёўскага аблвыканкама, 1977 г.	Перанесена ў гарадскую мяжу
Верамейскі сельсавет		
в. Каркоўшчына	Рашэнне Магілёўскага аблвыканкама, 1987 г.	Жыхары пераселены ў іншыя населеныя пункты
пас. Глыбокі Лог	»	»
Лабанаўскі сельсавет		
пас. Акцябр	»	»
пас. Востраў	»	»
Рэчыцкі сельсавет		
пас. Палом	»	»
пас. Прасвет	»	»

Помнікі гісторыі і культуры Чэрыкаўскага раёна

г. Чэрыкаў

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (гіст.). Вул. К. Маркса, у парку Перамогі. Пахаваны 191 воін і 3 патрызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ці памерлі ад ран у кастрычніку 1943—1944 гг. Сярод пахаваных — воіны 413-й стралковай дывізіі 50-й арміі Бранскага фронту, што загінулі ў баях пры вызваленні Чэрыкава ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 1.10.1943 г., і партызаны 720-га асобнага атрада. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Будынкі бальніцы (архіт.).*

Дом, дзе быў зняволены Дзенісенка Іван Піліпавіч — адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Чэрыкаўскага антыфашысцкага падполля (гіст.). Вул. Дзмітрыевай, 27.

Магіла ахвяр фашызму (гіст.). За 1 км ад горада, злева ад аўтамабільнай дарогі Чэрыкаў — Крычаў, каля лесу. Пахаваны 253 жыхары горада і навакольных вёсак, расстраляныя ў лістападзе 1941 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Магіла ахвяр фашызму (гіст.). За 1 км на поўнач ад горада, на ўзлеску. Пахаваны 7 жыхароў горада, расстраляных 29.12.1941 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Магіла барацьбітоў за Савецкую ўладу (гіст.). Вул. Ленінская, у парку. Пахаваны ўдзельнікі барацьбы за ўстанаўленне і ўмацаванне Савецкай улады ў Чэрыкаўскім р-не М. З. Эртман, С. Н. Цывіна і Захараў. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам (гіст.). Вул. Болдзіна, у скверы. На ўшанаванне памяці 235 воінаў, партызан і падпольшчыкаў — ураджэнцаў Чэрыкава, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну на франтах і ў партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1955 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя: воін са сцягам і партызанка.

Помнік землякам (гіст.). Каля эксперыментальнай базы «Чэрыкаў» Магілёўскай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі, у скверы. На ўшанаванне памяці 237 воінаў-землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у 1964 г. узведзена мемарыяльная сцяна.

Помнік Леніну Уладзіміру Ільічу (гіст.). На Цэнтральнай пл., перад Домам Саветаў. Скульптура У. І. Леніна ўстаноўлена ў 1985 г.

Радзіма Басіна Меера Велькавіча, аднаго з бакінскіх камісараў (гіст.).

Радзіма Кутаргі Міхаіла Сямёнавіча, гісторыка, чл.-кар. Расійскай Акадэміі навук, доктара філасофіі (гіст.).

Радзіма Любана Ісака Ісакавіча, беларускага кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь (гіст.).
(гіст.).

в. Вепрын, цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызана (гіст.). Ва ўсходняй частцы вёскі. Пахаваны 68 воінаў, якія загінулі пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у кастрычніку 1943 г., і партызан, што загінуў у 1942 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна з вянком.

Магіла савецкага воіна (гіст.). За 1 км на поўдзень ад вёскі, на ўскраіне лесу. Воін загінуў у ліпені 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Парк (архіт.).

в. Верамейкі, цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх актывістаў (гіст.). За 1 км на поўнач ад вёскі, на могілках. Пахаваны старшыня Верамейскага сельсавета А. І. Фядосенка, сакратар партарганізацыі сельсавета П. П. Карнюшчанка і старшыня калгаса «Чырвоная зорка» І. А. Гузнякоў, расстраляныя ў жніўні 1941 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Імем А. І. Фядосенкі і І. А. Гузнякова названы вуліцы ў Верамейках. У 1966 г. на магіле пастаўлена стэла.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (гіст.). Каля будынка чыгуначнай станцыі Верамейкі. Пахаваны 93 воіны і 3 партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—1943 гг. ці памерлі ад ран. Сярод пахаваных — воіны 385-й стралковай дывізіі, што загінулі 5.10.1943 г. пры вызваленні вёскі. У 1966 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна з вянком.

Помнік воінам-вызваліцелям (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі, справа ад дарогі на в. Лабанаўка. У 1973 г. у гонар воінаў-вызваліцеляў пастаўлена стэла.

в. Вудага, Верамейскі сельсавет

Помнік землякам (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1977 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя: воін і партызанка.

Радзіма Нікалаенкі Яўгена Макаравіча, Героя Савецкага Саюза, генерал-лейтэнанта авіяцыі (гіст.).

в. Вусце, Рэчыцкі сельсавет

Магіла савецкіх ваеннапалонных (гіст.). За 2 км на захад ад вёскі, каля лесу. Пахаваны 2 воіны, расстраляныя ў 1941 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Глінь, Сормаўскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.).

---

* Апісанне архітэктурных помнікаў прыведзена ў артыкуле «З архітэктурнай спадчыны».

У цэнтры вёскі, у скверы. Пахаваны 14 воінаў, якія загінулі 15.10.1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў ці памерлі ад ран у 1944 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна з вянком.

в. Горкі, Сормаўскі сельсавет

Стаянкі, курганны могільнік (археал.).*

в. Гронаў, Вепрынскі сельсавет

Курганны могільнік, паселішча (археал.).

Царква (архіт.).

Помнік землякам (гіст.). Каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 27 жыхароў вёскі, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1977 г. пастаўлены помнік — скульптуры воіна і жанчыны, 2 бетонныя пліты і дошка з імёнамі загінуўшых.

в. Журавель, Сормаўскі сельсавет

Курганны могільнік, стаянка (археал.). Паміж урочышчамі Мел і Чорны Бераг, на правым беразе р. Сож. 43 насыпы вышынёй 1—3 м, дыяметрам 6—8 м.

Магіла Шчаўлікава Васіля Піліпавіча (гіст.). На могілках. Член Чэрыкаўскага падпольнага райкама КП(б)Б В. П. Шчаўлікаў загінуў у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у снежні 1941 г. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Зоры, Сормаўскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На могілках. Пахаваны 4 воіны, якія загінулі ў баі супраць нямецка-фашыцскіх захопнікаў у ліпені 1941 г. У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

в. Зябень, Ушакоўскі сельсавет

Мемарыяльная дошка Цітовіч Валянціне Якаўлеўне — партызанскай сувязной-разведчыцы (гіст.). На будынку школы. Устаноўлена ў 1966 г.

в. Камаровічы, Рэчыцкі сельсавет

Гарадзішча (археал.).

Помнік землякам (гіст.). Каля будынка праўлення калгаса «Краіна Саветаў». На ўшанаванне памяці землякоў — воінаў, партызан, ахвяр фашызму, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1983 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна з аўтаматам.

Царква (архіт.).

в. Лабанаўка, цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На могілках. Пахаваны 12 воінаў, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. у баях пры вызваленні тэрыторыі раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

пас. Лімень, Чэрыкаўскі гарадскі Савет

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На могілках. Пахаваны 4 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. і 1943 г. Ў 1973 г. на магіле пастаўлена стэла.

Магіла Гутарава Івана Васілевіча, беларускага літаратуразнаўцы і фальклярыста (гіст.). На могілках.

Магіла Лепяшынскага Мадэста Мікалаевіча, кіраўніка Леменскай доследна-паказальнай школы-камуны імя У. І. Леніна (гіст.). На могілках.

в. Лобча, Лабанаўскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На могілках. Пахавана 12 воінаў, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. у баях пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран. У 1951 г. на магіле пастаўлена стэла.

Брацкая магіла савецкіх лётчыкаў (гіст.). Каля канторы саўгаса «Наватар». Пахаваны экіпаж самалёта 60-га бамбардзіровачнага авіяпалка 11-й авіядывізіі: капітан М. М. Нікалаеў, старшы лейтэнант І. П. Багатыроў, старшына Ф. А. Сылка, якія загінулі 11.7.1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск, перад ім — лопасці прапелера.

в. Манастырок, Сормаўскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На могілках. Пахаваны 6 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Месца размяшчэння Чэрыкаўскага падпольнага райкама КП(б)Б (гіст.). За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Крынічка, з правага боку ад дарогі на Чэрыкаў (2 км ад яе).

в. Мірагошч, Сормаўскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На могілках. Пахаваны 12 воінаў, якія загінулі ў кастрычніку — лістападзе 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі раёна ці памерлі ад ран. У 1949 г. на магіле пастаўлена стэла.

Магіла Радзівілава Паўла Мікітавіча (гіст.). На могілках. Лейтэнант Чырвонай Арміі П. М. Радзівілаў (нарадзіўся ў 1922 г.) загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў 22.3.1943 г. У 1951 г. на магіле пастаўлена стэла.

в. Наркі, Верамейскі сельсавет

Гарадзішча (археал.).

в. Пільня, Ушакоўскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1941 г. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Прышчына, Язёрскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (гіст.). На могілках. Пахаваны 65 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран у 1941 г. і кастрычніку 1943 г. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

* Апісанне археалагічных помнікаў прыведзена ў артыкуле «Зямля нашых продкаў».

в. Рагаліна, Язёрскі сельсавет

Помнік землякам (гіст.). Каля будынка школы, у скверы. На ўшанаванне памяці 100 жыхароў вёскі, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1975 г. пастаўлена стэла з імёнамі загінуўшых.

в. Рынкоўка, Лабанаўскі сельсавет

Радзіма Яўсеенкі Уладзіміра Раманавіча, Героя Савецкага Саюза (гіст.).

в. Рэчыца, цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызана (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 26 воінаў і 1 партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у кастрычніку 1943 г. ці памерлі ад ран у 1944 г. У 1966 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна з вянком.

Помнік землякам (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 365 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1979 г. пастаўлены помнік — двухфігурная скульптурная кампазіцыя.

в. Сакалоўка, Язёрскі сельсавет

Магіла Пяркова Аляксандра Іванавіча (гіст.). За 2 км на захад ад вёскі, злева ад аўтамабільнай дарогі Чэрыкаў — Слаўгарад. Капітан Чырвонай Арміі А. І. Пяркоў (нарадзіўся ў 1906 г. у в. Чаплыгіна 2-е Фацежскага р-на Курскай вобл.) загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 26.10.1943 г. У 1944 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1982 г. пастаўлены помнік — скульптурныя фігуры воіна і жанчыны.

в. Тур'е, Сормаўскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 і 1943 гг. У 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Гарадзішча (археал.).

в. Ушакі, цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 12 воінаў, якія загінулі ў верасні — кастрычніку 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Курганныя могільнікі (археал.).

Помнік землякам (гіст.). У скверы, насупраць будынка праўлення калгаса «Маладая гвардыя». На ўшанаванне памяці 91 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1977 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя: воін і жанчына.

в. Юдаўка, Верамейскі сельсавет

Гарадзішча (археал.).

Парк (археал.).

в. Язёры, цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў (гіст.). На могілках. Пахаваны 2 воіны, якія загінулі ў 1941 г. і 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1966 г. на магіле пастаўлена стэла.

Магіла Лебедзева Уладзіміра Іванавіча (гіст.). На могілках.

Разведчык-падрыўнік У. І. Лебедзеў нарадзіўся ў 1924 г. у г. Ялец Ліпецкай вобл. У верасні 1942 г. закінуты з групай на акупіраваную нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыю Магілёўскай вобл. Удзельнічаў у баявых аперацыях: у верасні 1942 г. у падрыве браняпоезда на ўчастку чыгункі Гарадок — Невель, у канцы кастрычніка 1942 г.— чыгуначнага саставу на ўчастку Рагачоў — Быхаў. 12.12.1942 г. пры выкананні баявога задання быў цяжка паранены і захоплены гітлераўцамі ў палон. Пасля катаванняў павешаны 15.12.1942 г. У 1965 г. на магіле пастаўлена стэла.

Помнік землякам (гіст.). У цэнтры вёскі, у скверы. На ўшанаванне памяці 121 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1965 г. пастаўлены абеліск.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобл. Мн., 1986.

ЗМЕСТ

Да чытача 17

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ 19

Археалагічныя помнікі каменнага і бронзавага вякоў (31). Археалагічныя помнікі жалезнага веку (32). Нашчадкі Радзіма (32). З сівой даўніны (34). З апісання граматы Стэфана Баторыя... (47). Пісьмо наказнога гетмана Івана Залатарэнкі... (48). Гасударава грамата наказному гетману Івану Залатарэнку... (48). З «Магілёўскай хронікі» Трафіма Раманавіча Сурты і Юры Трубніцкага (49). Пацвярджальная грамата праў і пераважнасцяў яўрэям мястэчка Чэрыкава... (49). Пацвярджальная каралеўская грамата на карыстанне магдэбурскім правам, дадзеная гораду Чэрыкаву (50). Пацвярджальная каралеўская грамата, дадзеная гораду Чэрыкаву (51). Каралеўскі рэскрыпт, дадзены Мікалаю Пацу, старосту Крычаўскаму, у ахову праў чэрыкаўскіх мяшчан (54). Упамінальны ліст караля Аўгуста III Рэчыцкаму вайскому Міхаілу Кялчэўскаму... (54). Пасля I падзелу Рэчы Паспалітай (55). Са справаздачы магілёўскага губернатара за 1804 г. ... (65.) З запіскі магілёўскага губернскага прадвадзіцеля дваранства... (66). Дазвол на пабудову рымска-каталіцкай царквы ў с. Інвандор (67). Яны пісалі пра Чэрыкаўшчыну (67). З запісак падарожніка (69). У парэформенны час (70). Данясенне магілёўскага губернатара міністру ўнутраных спраў... (87). З пратакола пасяджэння Магілёўскай палаты крымінальнага суда... (88). Адрэзкі зямлі ў сялян вёсак Мірагошч і Горкі... (89). Запіска Чэрыкаўскага павятовага прадвадзіцеля дваранства... (91). Разгром сялянамі памешчыцкага двара... (91). Пратакол дазнання... (92). Рапарт Магілёўскай следчай камісіі А. П. Беклямішаву... (93). Ведамасці спраў аб канфіскацыі ў казну зямель... (94). Хадайніцтва свяшчэнніка А. Бекарэвіча... (95). Паведамленне аб сутыкненні служачых у памесці Студзянец з сялянамі в. Студзянец... (95). Данясенне магілёўскага губернатара таварышу міністра ўнутраных спраў... (96). Тэлеграма праўлення таварыства бр. Цярэшчанкаў міністру ўнутраных спраў... (96). Паведамленне аб паўстанні сялян 5 вёсак у Палужскай воласці (96). З рапарта чэрыкаўскага павятовага спраўніка магілёўскаму губернатару... (97). Данясенне магілёўскага губернатара міністру ўнутраных спраў... (99). Аб расправе магілёўскага губернатара над сялянамі... (100). Аб непрыгоднасці школьных будынкаў земскіх вучылішчаў... (101). Падпал сялянамі кардоннай фабрыкі... (102). Якім ён быў — павет Чэрыкаўскі?.. (102). Горад над Сожам (104). Чэрыкаў у пачатку XX стагоддзя — вачыма сведкі (110). Апісанне валасцей Чэрыкаўскага павета (112). Мястэчкі Чэрыкаўскага павета (117). З гісторыі вёсак Чэрыкаўшчыны (119). Быў такі маёнтак (137). На крутым беразе (143). Павятовыя звесткі (144). Чыноўнік Перацц (150). Незвычайны чалавек (151). Ні аковаў, ні абмежаванняў... (152). Доменшчык Курака (155). Паведамленне пракурора Магілёўскага акруговага суда... (157). На зары рэвалюцыйнага руху ў Чэрыкаўскім павеце (157). Юбілей вучылішча (161). Кнігадрукаванне ў Чэрыкаве (162). Яго вершы выдаваліся ў Чэрыкаве (163). Ці быў такі музей? (165). Манетныя скарбы Чэрыкаўшчыны (166). З архітэктурнай спадчыны (167). Вачыма відавочнікаў (173). Са скарбаў народнай творчасці (178). Ад лютага да кастрычніка (184). Са старонак газет (188).

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ 191

Тэлеграма Саюза зямельных уласнікаў... (199). Вынікі выбараў ва Устаноўчы сход па Чэрыкаўскаму павету (199). Спіс валасных Саветаў Чэрыкаўскага павета (200). Дакладная запіска агітатара Дасніна... (200). Паведамленне аб арышце буйных землеўладальнікаў... (201). Пастанова надзвычайнага сялянскага з'езда... (201). З пратакола пасяджэння Чэрыкаўскага павятовага Савета Магілёўскай губерні аб дапамозе хлебам насельніцтву г. Масквы (202). З пратакола пасяджэння I партыйнай канферэнцыі РКП(б) Чэрыкаўскага павета (202). Пастанова схода сялян Наваельнінскай воласці... (204). Паведамленне газеты «Звезда» аб арганізацыі ячэек РКП(б) і камбедаў у Магілёўскай губерні (205). Са зводкі арганізацыйна-інструктарскага пададдзела Аддзела ўпраўлення Воблвы-

канкамзапа... (205). Са справаздачы аддзела народнай адукацыі Чэрыкаўскага Савета (205). З пратакола VII Чэрыкаўскага павятовага з'езда камбедаў па пытанню аб надзвычайным рэвалюцыйным падатку (206). З пратакола VII Чэрыкаўскага павятовага з'езда камбедаў па зямельнаму пытанню (206). Справаздача аб дзейнасці Чэрыкаўскага камітэта пасяўной плошчы і камісіі па аказанню дапамогі чырвонаармейскім гаспадаркам... (207). Справаздача аб дзейнасці Чэрыкаўскай павятовай арганізацыі РКП(б) за май — снежань 1918 г. (208). Справаздача аб дзейнасці Чэрыкаўскай павятовай камісіі па аказанню дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў (210). Са справаздачы аб рабоце Гомельскай губернскай нарады РКП (211). Аб бандытызме ў Чэрыкаўскім павеце (212). З пратакола пасяджэння Брацькавіцкага валаснога Савета... (212). З пратакола пасяджэння Мхініцкага валаснога Савета аб кантролю за млынам і барацьбе са спекуляцыяй (212). З пастановы схода прадстаўнікоў Саветаў і камбедаў Палужскай воласці па харчоваму пытанню і іншыя (213). З пратакола пасяджэння Дубровіцкага валаснога камбеда аб будаўніцтве млына і іншыя (213). З пратакола пасяджэння Наваельнінскага валаснога Савета аб малацьбе збожжа ў нацыяналізаваных памесцях... (214). З пратакола пасяджэння валаснога камітэта і старшынь пасялковых камбедаў Даўжанскай воласці (215). Пратакол сходу беднаты Лабанаўскай воласці аб перавыбарах Савета... (215). Са справаздачы прадстаўніка Чэрыкаўскага павета на Магілёўскай харчовай нарадзе (216). Іх выклікаў час (216). Стварэнне партызанскага палка (219). Памятныя дні (222). Родам з Вепрына (229). Лёс (230). Іх было чацвёра (233). Першы рэдактар (235). Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны (236). Час надзей і страт (239). Са справаздачы аб дзейнасці Чэрыкаўскага ўпраўлення савецкай гаспадаркай (255). Зводка Чэрыкаўскага пасяўкома... (258). З бюлетэня Чэрыкаўскага павятовага з'езда Саветаў (258). Прывітанне XII Чэрыкаўскага павятовага з'езда Саветаў У. І. Леніну (259). Вынікі абследавання губкамам Чэрыкаўскай павятовай арганізацыі РКП (259). З пратакола пасяджэння праўлення Чэрыкаўскага РКС (259). Тэлеграма Белкалгасцэнтру (260). Пастанова бюро Чэрыкаўскага РК КП(б)Б... (260). З пратаколаў пасяджэння прэзідыума Чэрыкаўскага райвыканкама (261). Пастанова прэзідыума Чэрыкаўскага райвыканкама... (262). З пратакола пасяджэння Чэрыкаўскага райвыканкама (263). Пастанова прэзідыума Чэрыкаўскага райвыканкама... (263). З пратакола пасяджэння пленума Чэрыкаўскага райвыканкама (264). Пастанова прэзідыума Чэрыкаўскага райвыканкама... (265). Даныя аб колькасці насельніцтва... (266). Чэрыкаўскі раён у 1939 г. (266). Яшчэ дзве ахвяры (267). Дзеці спяваюць «Інтэрнацыянал» (268). Школа-камуна (269). Незабыўныя гады (272). Яны вучылі нас (274). 1200 вёрст па Беларусі (276). За годам — год (278). Сямігодка імя Цішкі Гартнага (280). Вёска майго дзяцінства (281). Легенда і праўда аб Наркоўскай крыніцы (285). З гісторыі камсамольскага руху (286). Пачалі стварацца калгасы (293). Першыя старшыні калгасаў і актывісты калгаснага руху (294). Мінулае вёскі (294). Само жыццё вызначыла (295). Каго раскулачвалі? (296). Чэрыкаўскі раён у 30-я гады (299). Гісторыя выключэння з калгаса (300). Па ліку пятая (303). Старшыня райвыканкама (304). Заключная прамова В. Дз. Кучаравага на пленуме... (306). За авалоданне тэхнікай (307). Трактарыстка Арына (308). Ён хату пакінуў, пайшоў ваяваць (309). Іх называлі стаханаўцамі (310). Гартаючы падшыўкі (313). Чэрыкаўская метэаралагічная станцыя (321). І засталіся толькі фотакарткі (322). Вернутыя імёны (323). Воіны-землякі, якія загінулі ў савецка-фінляндскую вайну 1939—1940 гг. (340).

ШЛА ВАЙНА СВЯШЧЭННАЯ 343

У дні ліхалецця (354). Абараняючы кожную пядзю (357). Зрабілі ўсё, што змаглі (361). Бераг левы, бераг правы (369). Партызаны дзейнічалі (372). Так мы пачыналі (383). І рэквіем і гімн (386). Аб'ява гарадской камендатуры (390). З загада камандуючага абарончымі войскамі... (391). З паведамленняў нямецкага камандавання (391). Смерці глядзелі ў вочы (391). У пачатку барацьбы (393). Не вярнуліся (394). Суджана жыць (395). Стала сувязной (397). Пад мянушкай «Леля» (398). З пастановы ЦК КБ(б)Б... (401). Са справаздачы партызанскага атрада № 720... (401). Вяселле не адбылося (404). Бой ля Пільні (407). З дзённіка баявых дзеянняў асобнага партызанскага атрада № 721... (408). Данясенне начальніку штаба партызанскага атрада № 721 (410). І колькі б

ЗМЕСТ

ні прайшло часу... (410). З баявой дзейнасці Чэрыкаўскага партызанскага атрада № 15 (414). У засадзе, дазоры, сакрэце (415). Загад № 4... (416). З пратакола № 7 пасяджэння Чэрыкаўскага падпольнага РК КП(б)Б... (416). Разведданясенне ваенна-аператыўнай групы... (417). Загад № 10 ваенна-аператыўнай групы... (417). Разведданясенне ваенна-аператыўнай групы... (418). Аператыўнае данясенне... (418). У адным страі (418). Па сігналу ракеты (421). Пад дахам ночы (423). Недапетая песня (425). У імя жыцця (427). Не толькі куляй і штыком (428). Змагалася моладзь (433). Я была вязучай (439). «Мядзведзь» і «Вавёрка» (441). Пасыльны раённай управы (442). Гэта было ў Верамейках (443). Юныя разведчыкі (446). Апошні загад (447). З аператыўных зводак... (449). За горад на Сожы (450). Агонь вялі мінамётчыкі (453). Пабрацімы (454). У радах вызваліцеляў (456). Нельга забыць (457). Акт аб зверствах нямецкіх захопнікаў у г. Чэрыкаве (460). За мужнасць і гераізм (462). Камандзір штурмавой групы (462). Зорны след (466). На крылах перамогі (468). Наступала грозная браня (470). Ад першага дня да апошняга (472). Атакі з неба (474). Камандзір батарэі з в. Лобча (475). Рызыкуючы жыццём (476). У буднях вайны (478). Ад Тулы да Брно (479). Ганаровая місія (480). Адзін з шасці (482). Франтавічкі (483). Загінуўшыя ўдзельнікі камуністычнага падполля, партызаны, асобы, якія актыўна садзейнічалі партызанскаму руху і камуністычнаму падполлю, члены іх сем'яў, жыхары партызанскіх зон і раёнаў, што падвергліся фашысцкаму тэрору (486). Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні Чэрыкаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і пахаваны на яго тэрыторыі (493). Воіны-землякі, якія загінулі і прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны ў 1941—1945 гг. (504).

У МІРНАЙ ПРАЦЫ 583

З даведкі аргінструктарскага аддзела... (591). Агні калгаса (592). У тыя пасляваенныя... (592). Рыхтавалі кадры механізатараў (594). Ішло ўзбуйненне (595). Гартаючы падшыўкі (596). Святло Лімені (602). Вызначыліся працай (612). Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь (616). Іх імёнамі названы вуліцы (617). Ганаровыя грамадзяне (619). Родам з Чэрыкаўшчыны (621). Воіны Савецкай Арміі — ураджэнцы Чэрыкаўшчыны, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку (628). Пад чорным крылом Чарнобыля (631). Як гэта адбывалася (632). Зварот (638). Зоны адсялення (639). Пералік населеных пунктаў, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню... (640). Рашэнне аб захаванні пабудоў у населеных пунктах... (640). Бяды не прасілі (641). Лёс перасяленцаў (643). Світанка не дачакаўся... (646). Жыве памяць пакаленняў (648). Чэрыкаўскі паляўнічы заказнік (649). Легендарныя «грышынцы» на Чэрыкаўшчыне (650). Творчасць з берагоў Сожа (651). Населеныя пункты Чэрыкаўскага раёна (653). Помнікі гісторыі і культуры Чэрыкаўскага раёна (655).

ГОСУД. ПУБЛИЧНАЯ ИСТОРИЧЕСКАЯ БИБЛИОТЕКА РСФСР
№_____ г.

Прадстаўнікі грамадскасці Чэрыкаўскага раёна, якія прымалі ўдзел у пошуку і зборы матэрыялаў для Хронікі Памяць: Б. Я. ВЯРЦІНСКАЯ, І. І. ГАЎРЫЛАЎ, В. К. ГАЛАБАРОДКА, В. М. ЖУРАЎЛЁВА, Л. П. КОЛАСАВА, Т. А. МАТУСЕВІЧ, З. І. ПРАСЯНЦОЎ, Р. К. СОТНІКАЎ, Д. І. СТАРАВОЙТАЎ, Л. Ф. СЫЧОВА, Д. Р. ФОНКАЦ.